Валентына Пашкевіч

Англьска-беларускі СЛОЎНІК

English-Belarusian DICTIONARY

Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва
Belarusian Institute of Arts and Sciences

КОЛАС

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ НАВУКІ Й МАСТАЦТВА

ВАЛЕНТЫНА ПАШКЕВІЧ

АНГЕЛЬСКА-БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК

BELARUSIAN INSTITUTE OF ARTS AND SCIENCES

VALENTYNA PASHKEVICH

ENGLISH-BELARUSIAN DICTIONARY

About 30,000 entries

Edited by Siarhiej SHUPA

Minsk
Kolas Publisher
2006

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ НАВУКІ Й МАСТАЦТВА

ВАЛЕНТЫНА ПАШКЕВІЧ

АНГЕЛЬСКА-БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК

Каля 30 000 словаў

Пад рэдакцыяй Сяргея ШУПЫ

Менск
Выдавец Зьміцер Колас
2006

УДК 811.111'374=161.3
ББК 81.2 Англ-4
П 22

Editorial Staff:
Zora Kipel (head of the Editorial Board, until March 2003),
Jan Zaprudnik (head of the Editorial Board, after April 2003).
Members of the Editorial Board: Anthony Adamovich, Michael Bachar, Thomas E. Bird (English-language editor), Vitaut Kipel, George Repetski, Alla Romano, Vasil Rusak, Zmicier Sauka, Anton Shukieloyts, Siarhiej Shupa, Alexander Silwanowicz, George Stankevich, John Stanley, Alena Yurevich, Vera Zaprudnik.

Рэдакцыйная калегія:
Зора Кіпель (старшыня рэдкалегіі, да сакавіка 2003 г.),
Янка Запруднік (старшыня рэдкалегіі, ад красавіка 2003 г.).
Сябры рэдкалегіі: Антон Адамовіч, Міхась Бахар, Томас Бэрд (рэдактар ангельскай часткі), Вера Запруднік, Вітаўт Кіпель, Алла Романо, Васіль Русак, Юрка Рапецкі, Зьміцер Саўка, Аляксандар Сільвановіч, Юрка Станкевіч, Джон Стэнлі, Антон Шукелайць, Сяргей Шупа, Алена Юрэвіч.

Publication funded by the Piotra Kreceuski Foundation, Belarusian Institute of Arts and Sciences, Belarusian Charitable Fund (London, UK), the Belarusian Coordinating Committee of Canada, public subscription and donations.

Слоўнік створаны за кошт Фундацыі ймя Пётры Крэчэўскага, Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва, Беларускага Харытатыўнага Фонду (Лёндан), Беларускага Каардынацыйнага Камітэту Канады, грамадзкае падпіскі й ахвяраваньняў.

ISBN 985-6783-15-1

© The Pashkevich Family; The Belarusian Institute of Arts and Sciences, 2006

FOREWORD

The availability of bilingual dictionaries testifies, as nothing else does, to the state of the language and culture of a country. It witnesses as well to the potential of the country to connect to the rest of the world.

Unfortunately, during the fifteen years of its independence as the Republic of Belarus, for various reasons, translation lexicography did not extend beyond small dictionaries for schools. As in previous years, the Belarusian-Russian and Russian-Belarusian dictionaries, and the recently published Polish-Belarusian dictionary, have been fortunate exceptions. The world's most widely used languages, however – such as English, French, or Spanish – have not been part of the Belarusian lexicograpahic process.

This dictionary is the first English-Belarusian reference work of such scope. It contains about 30,000 entries.

The dictionary is a result of many years of labor by Valentyna Pashkevich and certain members of the Belarusian Institute of Arts and Sciences in the United States and Canada.

The need for a substantial English-Belarusian dictionary is obvious – its absence hinders significantly the use of Belarusian language in international contacts, in teaching English, and in translating. Until now, Russian lexicographic aids had to be used in Belarus for such purposes. In translating, for example, from English into Belarusian, the use of Russian language as an intermediary was unavoidable. The goal of this dictionary is to free the Belarusian user from the need to use such an intermediary.

Unlike the Russian lexicographic tradition, familiar to the Belarusian user, this dictionary uses the American variant of English, as more widely accepted in the world. This relates to the spelling, pronunciation and semantics of words and phraseology. Spelling in the Belarusian section follows the rules of "tarashkevitsa" as normativized by The Belarusian Classical Spelling (Vilnius-Miensk, 2005).

The Editorial Board is aware of the pioneering nature of their work – to plow the first furrow on the uncultivated lexicographic field with limited resources was not easy. In such an effort, flaws may result. The Board will be grateful for critical response sent to:

Belarusian Institute of Arts and Sciences
164-34 Gothic Drive
Jamaica, NY 11432
USA

АД РЭДАКЦЫІ

Наяўнасьць перакладных дзьвюхмоўных слоўнікаў, бадай як нішто іншае сьведчыць пра стан нацыянальнай мовы і культуры ва ўмовах пашырэньня міжнародных кантактаў краіны. На жаль, з шэрагу розных прычынаў за пятнаццаць гадоў незалежнага існаваньня Рэспублікі Беларусь перакладная лексыкаграфія ў краіне не ўзьнялася вышэй за ўзровень маленькіх слоўнічкаў для школьнага ўжытку. Шчасьлівы вынятак складаюць, як і раней, беларуска-расейскія і расейска-беларускія слоўнікі, а таксама выдадзены нядаўна польска-беларускі слоўнік, аднак найбольш пашыраныя мовы сьвету – як прыкладам ангельская, французская, гішпанская – дагэтуль заставаліся не ахопленыя беларускім лексыкаграфічным працэсам.

Гэты слоўнік – першы ангельска-беларускі слоўнік такога памеру. У ім зьмешчана каля 30 тысячаў слоўнікавых артыкулаў.

Слоўнік стаўся вынікам шматгадовай працы Валентыны Пашкевіч ды групы супрацоўнікаў Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва (БІНіМ) у ЗША і Канадзе.

Патрэба ў агульным ангельска-беларускім слоўніку большага памеру відавочная – адсутнасьць такога слоўніка значна абмяжоўвае ўжываньне беларускай мовы ў міжнародных кантактах, у працэсе навучаньня ангельскай мове, пры перакладах. Дагэтуль у Беларусі дзеля гэтых мэтаў даводзілася карыстацца расейскімі лексыкаграфічнымі дапаможнікамі, і пры перакладзе, напрыклад, з ангельскай мовы на беларускую, расейская мова непазьбежна выступала як мова-пасярэдніца. Мэта гэтага слоўніка – дапамагчы беларускаму карыстальніку пазбавіцца гэткага пасярэдніцтва.

У адрозьненьне ад звыклай для беларускага карыстальніка расейскай слоўнікавай традыцыі, у ангельскай частцы слоўніка ўжыты не брытанскі, а амэрыканскі варыянт ангельскай мовы як больш пашыраны ў сьвеце. Гэта датычыць асаблівасьцяў правапісу, вымаўленьня, сэмантыкі словаў і фразэалёгіі. У беларускай частцы ўжываецца "тарашкевіца" ў сучаснай нармалізаванай форме, замацаванай у зборы правілаў "Беларускі клясычны правапіс" (Вільня-Менск, 2005).

Рэдкалегія ўсьведамляла наватарскі характар сваёй працы – пракладаць абмежаванымі сіламі першыя барозны на няўробленай лексыкаграфічнай ніве было ня лёгка. Рэдкалегія будзе ўдзячная ўсім, хто прышле свае крытычныя водгукі і заўвагі на адрас:

Belarusian Institute of Arts and Sciences
166-34 Gothic Drive
Jamaica, NY 11432
USA

NOTES FOR THE USER

ENTRY STRUCTURE

The typical entry includes English word(s) (in bold type), pronunciation [in square brackets; according to the International Phonetic Alphabet], the designation(s) of part of speech, Belarusian equivalent(s) with indication of gender, and illustrating English phrase(s) with Belarusian rendition(s).

Belarusian synonyms are separated by a comma or semi-colon depending on the semantic proximity. Further lexic subdivisions are indicated by Arabic numbers and letters а), б), в), etc.

autonomy [ɔːˈtɑːnəmi] n., pl. **-mies** 1. аўтано́мія *f.*
а) самаўра́д -у *m.*, самакірава́ньне *n.*; незале́жнасьць *f.*
б) пра́ва на самакірава́ньне. 2. аўтано́мная дзяржа́ва.
3. самасто́йнасьць *f.*

ENTRY-WORD SPELLING, PRONUNCIATION, AND STRESSES

This dictionary follows American usage and spelling. For some words, British spelling is given preceded by the abbreviation "Brit." Alternative spelling variants within American transcription are also indicated.

In pronunciation, the mark [ˈ] indicates stress on the ensuing syllable: if placed above, the stress is primary, if below, the stress is secondary. Pronunciation is not provided for entries consisting of two or more components (as **absentee landlord** or **bill of exchange**). Their pronunciation is found under each word separately.

Round parentheses around a letter or a word (words) indicate alternative spelling or usage.

In all Belarusian words other than monosyllabic the stress is provided, with the exception of the letter -ё- which is always stressed.

HOMONYMS

Homonyms are marked by Roman numerals: I, II, etc.

mail I [meɪl] – n. 1. по́шта. 2. карэспандэ́нцыя *f.*
3. пашто́вы тра́нспарт...
mail II [meɪl] n. 1. кальчу́га *f.* 2. браня́ *f.*, па́нцыр -у *m.* ...

ALPHABETICAL ORDER OF ENTRY-WORDS

Entries comprising two or more words are alphabetized as if they were one word (letter by letter). For example, the entry **want ad** precedes the entry **wanting**.

SUBJECT AND STYLE INDICATORS

For clarity, subject and style indicators are provided.

Subject: **Bot.** (Botany), **Mus.** (Music), **Psych.** (Psychiatry).
Style: **Sl.** (Slang), **Figur.** (Figurative), **Obsol.** (Obsolete).

PARTS OF SPEECH DESIGNATORS

- adj. = adjective – прыметнік
- adv. = adverb – прыслоўе
- interj. = interjection – выклічнік
- n. = noun – назоўнік
- p.p. = past participle – дзеепрыметнік мінулага часу
- prep. = preposition – прыназоўнік
- pref. = prefix – прэфікс, прыстаўка
- pres. p. = present participle – дзеепрыметнік цяперашняга часу
- pron. = pronoun – займеньнік
- p.t. = past tense – мінулы час
- v. = verb – дзеяслоў
- v.i. = verb intransitive – непераходны дзеяслоў
- v.t. = verb transitive – пераходны дзеяслоў

GRAMMATICAL FORMS OF THE ENTRY-WORD

If an entry-word is used as, for example, noun, verb, and adjective, each part of speech is marked by a designator with a dash. For example:

master ['mæstər] – n. 1. а) гаспада́р -а́ *m.*, улада́льнік -а *m.*
б) капіта́н гандлёвага су́дна...
– adj. 1. галóўны: ***a master bedroom*** галóўная спа́льня.
2. высóкакваліфікава́ны...
– v.t. 1. адóльваць, асíльваць, апанóўваць, перамага́ць;
падпарадкóўваць сабе...

semiweekly [ˌsemi'wi:kli] – adj. паўтыднёвы
– adv. двойчы на ты́дзень
– n. паўтыднёвік -а *m.* (*ча́сапіс, газэ́та*)

NOUNS

Irregular nouns have their plural form indicated:

buddy ['bʌdi] n., pl. **-dies** Informal 1. блíзкі ся́бра, калéга -і *m.* 2...
buffalo ['bʌfəlou] – n., pl. **-loes, los** or esp. coll. **-lo** бу́йвал -а *m.*, бу́йваліца *f.*; амэрыка́нскі бізóн ...
goose [gu:s] n., pl. **geese** 1. гусь *f.* 2. Informal ду́рань -ня *m.*, дурнíца, разява́ка -і *m. & f.*
mouse [maʊs] – n., pl. **mice** [maɪs] 1. мыш, мы́шка *f.* 2. Comput. мыш *f.* 3. нясьме́лы, сарамлíвы чалаве́к...

The gender of Belarusian nouns is indicated by an italicized letter.

f. = feminine – жаночы
m. = masculine – мужчынскі
n. = neuter – ніякі

In Belarusian nouns of masculine gender the Genitive ending is given. (In rare cases the Genitive form is spelled out: акар *акра*, госьць *гасьця*, стол *стала*). The unchanging part of the word is separated from the changeable part by a bar:

walker ['wɔ:kər] n. 1. пешахóд -а *m.*, хадóк -акá *m.*...
wallet ['wɑ:lət] n. кашалёк -лькá *m.*, партмана́т -а *m.*

When Belarusian synonymous masculine nouns follow one another and have identical Genitive endings, then one ending is given for all of them at the end of the row:

clang [klæŋ] – n. ля́скат, бра́згат -у *m.*...
clatter ['klætər] – n. 1. стук, звон -у *m.*...
waiter ['weɪtər] n. 1. афіцыя́нт, ке́льнэр -а *m.*...

Also, when two or more synonymous nouns are of the same gender, then the gender (*m.*, *f.* or *n.*) is given for all of them at the end of the row:

abetment [ə'betmənt] n. падбіва́ньне; падбухто́рваньне; заахво́чваньне *n.*
accordance [ə'kɔ:rdəns] n. згóднасьць; адпаве́днасьць *f.*...
bulk [bʌlk] – n. 1. а) памéр, аб'ём -у *m.*...

Often the feminine form of the Belarusian equivalent is given:

settler ['setələr] n. 1. пасяле́нец -ца *m.*, пасяле́нка *f.*...
sewer II ['soʊər] n. швец -яцá *m.*, швáчка *f.*

ADJECTIVES

Irregular forms of comparative and superlative adjectives are indicated:

bad [bæd] – adj. **worse, worst** ...
good [gʊd] – adj. **better, best** ...

VERBS

Transitivity or intransitivity of verbs is indicated by letters v.t. or v.i., respectively. If the verb is used both as transitive and intransitive, it is marked by "v." only. In irregular verbs inflected forms are given:

abide [əˈbaɪd] v., **abode** or **abided, abiding** ...
bid [bɪd] – v.t., **bade, bid** or **bad, bidden** or **bid, bidding** ...
– v.i. ...

Doubling of the final consonant in a verb in past tense and participles is given in parentheses:

nab [næb] v. **(-bb-)** Sl. 1. злавíць...
nag [næg] v. **(-gg-)** 1. даймáць *каго́*, дапякáць *каму́* ...

ILLUSTRATING EXAMPLES, SYNONYMS, AND IDIOMS

In verbal illustrating phrases marked by the dot the infinitive indicator *to* is implied. Whereas undotted verbal phrases are preceded by *to*:

break I [breɪk] – v.t., **broke** or Archaic **brake, broken**
1. разьбівáць; ламáць, рвáць (*ні́тку*).
2. разьмéньваць (*гро́шы*). 3. шко́дзіць, ламáць:
to break the machine паламáць машы́ну; ***to break one's arm*** зламáць руку́. 4. парушáць, не датры́мваць:
to break the law пару́шыць зако́н ...
....
• ***break away*** а) адламáцца; адарвáцца...
• ***break down*** а) папсавáцца, зламáцца...
• ***break in*** а) аб'яжджáць (*маладо́га каня́*), навучáць ...

In many entries examples are used to better explain the meaning of an English word or idiom.

make [meɪk] – v.t., **made** 1. рабíць; будавáць, утвараць: ***to make a new dress*** пашы́ць но́вую сукéнку; ***to make a boat*** збудавáць чóвен; ***to make a bed*** паслáць лóжак; ***to make a fire*** раскласьці агóнь ...

In some entries idiomatic expressions are given to illustrate the meaning of the entry-word. Corresponding Belarusian idioms, if found, are used:

boat [boʊt] – n. 1. чóвен, чаўнá *m.*, лóдка *f.* 2. вадаплáўны -ва, карабéль -ля́ *m.*
– v.i. 1. сядáць у чóвен, на вадаплáў, плы́сьці чаўнóм *або́* вадаплáвам
– v.t. весláваць, перавóзіць чаўнóм
• ***burn one's boats*** спалíць за сабóю масты́
• ***in the same boat*** у такíм сáмым станóвішчы *або́* ўмóвах
• ***miss the boat,*** Informal прапусьцíць, празявáць нагóду
• ***rock the boat,*** Informal разгóйдваць чóвен, пару́шаць нармáльны парáдак

ЯК КАРЫСТАЦЦА СЛОЎНІКАМ

СКЛАД СЛОЎНІКА. ВЫМАЎЛЕНЬНЕ. ПРАВАПІС

Рэестар слоўніка складаецца з агульнаўжывальнай лексыкі ды найважнейшых геаграфічных назоваў.

У ангельскай частцы слоўніка ўжыты амэрыканскі правапіс. Для некаторых слоў падаецца таксама брытанскае напісаньне, адзначанае абрэвіятурай Brit. Калі амэрыканскае напісаньне мае два варыянты, падаюцца абодва, на першым месцы – варыянт, часьцей ужываны. Альтэрнатыўнае напісаньне адзначаецца круглымі дужкамі.

Парадак загалоўных словаў альфабэтны. Калі ў якасьці загалоўных словаў выступаюць словазлучэньні, якія складаюцца з двух або больш кампанэнтаў, то іх месца ў рэестры залежыць ад альфабэтнага парадку кожнага кампанэнту. Прыкладам, **want ad** стаіць перад **wanting**.

Пры наяўнасьці артаграфічных, акцэнтных ці словаўтваральных варыянтаў, адзін зь іх рэкамэндуецца як асноўны, унармаваны, а другі — як дапушчальны, варыянтны. Калі згодна з альфабэтным рэестрам яны стаяць побач, то падаюцца ў адным слоўнікавым артыкуле. Першым падаецца слова, якое лічыцца нормай, другім – ягоны варыянт. Калі варыянтныя словы займаюць розныя месцы адносна альфабэту, кожнае слова распрацоўваецца паасобку як загалоўнае.

Усе загалоўныя словы забясьпечаныя фанэтычнай транскрыпцыяй у квадратных дужках непасрэдна пасьля самога слова. Вымаўленьне даецца паводле сыстэмы Міжнароднай фанэтычнай транскрыпцыі. Націск у транскрыпцыі ставіцца перад націскным складам. Асноўны (першасны) націск абазначаецца знакам зьверху [ˈ...], дадатковы (другасны) – знакам зьнізу [ˌ...].

Вымаўленьне не адзначаецца, калі ў ролі загалоўнага слова выступае словазлучэньне, прыкладам, **absentee landlord** або **bill of exchange**. Вымаўленьне кожнага кампанэнта словазлучэньня паказанае ў альфабэтным рэестры слоўніка паасобку.

Усе словы беларускай часткі маюць націск, за выняткам аднаскладовых словаў і словаў зь літарай –ё-, якая заўсёды націскная.

УМОЎНЫЯ АБАЗНАЧЭНЬНІ

У беларускай частцы слоўнікавага артыкулу блізказначныя словы адзначаюцца арабскімі лічбамі (1, 2, 3 і г .д.). Сынонімы ў межах асобнай лічбы – коскай або кропкай з коскай у залежнасьці ад сэмантычнай або стылістычнай блізкасьці. У чарговасьці сынонімаў перавага даецца спрадвечнабеларускім словам. Пры больш дакладнай сэмантычнай і стылістычнай градацыі ў межах лічбаў ужываюцца літары — а), б), в) і г.д.:

> **operation** [ˌɑ:pəˈreɪʃən] n. 1. дзе́яньне *n.*, пра́ца *f.*:
> ***to come into operation*** пача́ць працава́ць, дзе́яць;
> ***in operation*** а) у дзе́яньні, працу́е. б) у выкарыста́ньні, ва ўжы́тку. 2. кірава́ньне, абслугó́ўваньне *n.*:
> ***the operation of a machine*** абслугó́ўваньне машы́ны.
> 3. апэра́цыя *f.* ...

Амонімы абазначаюцца рымскімі лічбамі (I, II і г. д.)

> **mail I** [meɪl] – n. 1. по́шта. 2. карэспандэ́нцыя *f.*
> 3. пашто́вы тра́нспарт...
> **mail II** [meɪl] n. 1. кальчу́га *f.* 2. браня́ *f.*, па́нцыр -у *m.* ...

Кожнае загалоўнае ангельскае слова мае граматычную характарыстыку ў выглядзе абрэвіятуры:

- adj. = adjective – прыметнік
- adv. = adverb – прыслоўе
- interj. = interjection – выклічнік
- n. = noun – назоўнік
- p.p. = past participle – дзеепрыметнік мінулага часу
- prep. = preposition – прыназоўнік
- pref. = prefix – прэфікс, прыстаўка
- pres. p. = present participle – дзеепрыметнік цяперашняга часу
- pron. = pronoun – займеньнік

- p.t. = past tense – мінулы час
- v. = verb – дзеяслоў
- v.i. = verb intransitive – непераходны дзеяслоў
- v.t. = verb transitive – пераходны дзеяслоў

Граматычны род беларускага назоўніка абазначаецца літарамі:

f. = feminine – жаночы
m. = masculine – мужчынскі
n. = neuter – ніякі

Лічэбнікі (numerals) у ангельскай граматыцы залічаюцца да назоўнікаў або прыметнікаў у залежнасьці ад канктэксту.

Калі загалоўнае слова ўжываецца ў значэньні іншай часьціны мовы, яно памячаецца адпаведнай паметай з працяжнікам наперадзе (– n., – adj., – v.t. і г. д.):

master ['mæstər] – n. 1. а) гаспада́р -а́ *m.*, улада́льнік -а *m.*
б) капіта́н гандлёвага су́дна...
– adj. 1. галóўны: ***a master bedroom*** галóўная спа́льня.
2. высóкакваліфікава́ны...
– v.t. 1. адóльваць, асíльваць, апанóўваць, перамага́ць;
падпарадкóўваць сабе...

semiweekly [ˌsemi'wi:kli] – adj. паўтыднёвы
– adv. двойчы на ты́дзень
– n. паўтыднёвік -а *m.* (*ча́сапіс, газэ́та*)

Тэрміны й спэцыяльныя словы забясьпечваюцца, пры неабходнасьці, умоўнымі скаротамі, прыкладам **Bot.** (батаніка), **Mus.** (музыка), **Psych.** (псыхіятрыя), **Sl.** (жаргон), **Figur.** (пераноснае), **Obsol.** (састарэлае).

ГРАМАТЫЧНЫЯ КАТЭГОРЫІ ЧАСЬЦІН МОВЫ

НАЗОЎНІК

Рэгулярная форма множнага ліку ангельскага назоўніка (з канчаткам –s, далучаным да формы адзіночнага ліку) звычайна ў слоўніку не падаецца. Для назоўнікаў зь няправільнай формай множнага ліку падаюцца паказьнікі множнага ліку або цалкам слова ў форме множнага ліку:

buddy ['bʌdi] n., pl. **-dies** Informal 1. бліскі ся́бра,
кале́га -і *m.* 2...
buffalo ['bʌfəlou] – n., pl. **-loes, los** or esp. coll. **-lo**
бу́йла -ы, бу́йвал -а *m.*, бу́йваліца *f.*; амэрыка́нскі бізо́н ...
goose [gu:s] n., pl. **geese** 1. гусь *f.* 2. Informal ду́рань -ня *m.*,
дурні́ца, разява́кла -і *m. & f.*
mouse [maus] – n., pl. **mice** [mais] 1. мыш, мы́шка *f.*
2. Comput. мыш *f.* 3. нясьме́лы, сарамлі́вы чалаве́к...

У беларускіх назоўніках мужчынскага роду адзначаныя канчаткі роднага склону –а або –у. (У асобных выпадках слова ў форме роднага склону падаецца поўнасьцю: акар *акра*, госьць *гасьця*, стол *стала*). Нязьменная частка назоўніка аддзяляецца ад канчатка вэртыкальнай рысачкай:

walker ['wɔ:kər] n. 1. пешахо́д -а *m.*, ход|о́к -ака́ *m.*...
wallet ['wɑ:lət] n. каша|лёк -лька́ *m.*, партман э́т -а *m.*

Калі прыводзяцца адзін за адным некалькі сынанімічных назоўнікаў мужчынскага роду з аднолькавым канчаткам роднага склону, то канчатак паказваецца ў канцы шэрагу:

clang [klæŋ] – n. ля́скат, бра́згат -у *m.*...
clatter ['klætər] – n. 1. стук, звон -у *m.*...
waiter ['weitər] n. 1. афіцыя́нт, ке́льнэр -а *m.*...

У межах слоўнікавага артыкулу аналягічна абазначаецца род назоўнікаў (*m.*, *f.*, *n.*) аднаго сінанімічнага шэрагу:

abetment [əˈbetmənt] n. падбіва́ньне; падбухто́рваньне; заахво́чваньне *n.*
accordance [əˈkɔ:rdəns] n. зго́днасьць; адпаве́днасьць *f.*...
bulk [bʌlk] – n. 1. а) памёр. аб'ём -у *m.*...

У назоўніках, якія абазначаюць прафэсію, занятак, месца жыхарства асобы, падаюцца абедзьве формы – мужчынскага й жаночага роду:

settler [ˈsetələr] n. 1. пасяле́нец -ца *m.*, пасяле́нка *f.*...
sewer II [ˈsouər] n. шве́ц -яца́ *m.*, шва́чка *f.*

ПРЫМЕТНІК

Калі́ ў ангельскім прыметніку параўнальная й найвышэйшая ступені параўнаньня маюць няправільныя фо́рмы, яны пішуцца поўнасьцю:

bad [bæd] – adj. **worse, worst** ...
good [gud] – adj. **better, best** ...

ДЗЕЯСЛОЎ

Пераходнасьць або непераходнасьць дзеясловаў абазначаецца адпаведна абрэвіятурамі v.t. або v.i. Калі́ дзеяслоў ужываецца як пераходны й непераходны, ён пазначаецца літарай v.:

abide [əˈbaɪd] v., **abode** or **abided, abiding** ...
bid [bɪd] – v.t., **bade, bid** or **bad, bidden** or **bid, bidding** ...
– v.i. ...

Няправільныя формы ангельскага дзеяслова падаюцца непасрэдна пасьля граматычнай пометы:

eat [i:t] v.t., **ate, eaten, eating** ...
go [gou] v.i., **went, gone, going** ...

Падваеньне канцавога зычнага ў дзеясловах і дзеепрыметніках мінулага часу падаецца ў дужках:

nab [næb] v. **(-bb-)** Sl. 1. злаві́ць...
nag [næg] v. **(-gg-)** 1. даймáць *каго́*, дапякáць *каму́* ...

ІДЫЁМЫ

Ілюстрацыйныя фразэалягічныя выразы пазначаюцца спэцыяльным знакам (bullet). Па магчымасьці прыводзяцца беларускія адпаведнікі:

boat [bout] – n. 1. чо́вен, чаўна́ *m.*, ло́дка *f.* 2. вадапла́ўны -ва, карабе́ль -ля́ *m.*
– v.i. 1. сядáць у чо́вен, на вадапла́ў, плы́сьці чаўно́м *або́* вадапла́вам
– v.t. веславáць, перавó3іць чаўно́м
• ***burn one's boats*** спаліць за сабо́ю масты́
• ***in the same boat*** у такі́м са́мым стано́вішчы *або́* ўмо́вах
• ***miss the boat,*** Informal прапусьці́ць, празяваць наго́ду
• ***rock the boat,*** Informal разго́йдваць чо́вен, пару́шаць норма́льны пара́дак

ABBREVIATIONS USED IN THIS DICTIONARY
УМОЎНЫЯ СКАРОТЫ

abbr.	abbreviation	скарот
adj.	adjective	прыметнік
adv.	adverb	прыслоўе
Aeron.	Aeronautics	аэранаўтыка
Agric.	Agriculture	сельская гаспадарка
Anat.	Anatomy	анатомія
Arch.	Architecture	архітэктура
Astrol.	Astrology	астралёгія
Astron.	Astronomy	астраномія
Auto.	Automobile	аўтамабіль
Av.	Aviation	авіяцыя
Bibl.	Biblical	біблійнае
Biol.	Biology	біялёгія
Bookkeep.	Bookkeeping	бухгальтэрыя
Bot.	Botany	батаніка
Brit.	British	брытанскае
Can.	Canadian	канадзкае
Chem.	Chemistry	хімія
coll.	collective	зборнае
colloq.	colloquial	размоўнае
Comm.	Commerce	гандаль
compar.	comparative	вышэйшая ступень (прыметніка)
Comput.	Computer	кампутар
conj.	conjunction	злучнік
Constr.	Construction	будаўніцтва
demonstr.	demonstrative	паказальны (займеньнік)
dim.	diminutive	памяншальнае
Diplom.	Diplomacy	дыпляматыя
Eccl.	Ecclesiastical	царкоўнае
Econ.	Economics	эканоміка
Electr.	Electricity	электрычнасьць
emph.	emphatic	узмацняльнае
Engin.	Engineering	інжынэрыя
esp.	especially	асабліва
f.	feminine	жаночы род
Figur.	Figurative	пераноснае
Fr.	French	французская
Geogr.	Geography	геаграфія
Geol.	Geology	геалёгія
Geom.	Geometry	геамэтрыя
Gram.	Grammar	граматыка
Hist.	History	гісторыя
Hum.	Humor	гумар
impers.	impersonal	безасабовы
indecl.	indeclinable	нескланяльнае
interj.	interjection	выклічнік
Lat.	Latin	лацінскае
Ling.	Linguistics	мовaведа
Lit.	Literature	літаратура
m.	masculine	мужчынскі род
Math.	Mathematics	матэматыка
Med.	Medicine	мэдыцына
Meteor.	Meteorology	мэтэаралёгія
Milit.	Military	ваеннае, вайсковае
Min.	Mineralogy	мінэралёгія
Mus.	Music	музыка

Myth.	Mythology	міталёгія
n.	noun	назоўнік
n.	neutral	ніякі род
Naut.	Nautical	марское
obj.	objective	ускосны склон
Obsol.	Obsolete	састарэлае
pf.	perfective	закончаны лад
Pharm.	Pharmacology	фармакалёгія
Philos.	Philosophy	філязофія
Phon.	Phonetics	фанэтыка
Photogr.	Photography	фатаграфія
Phys.	Physics	фізыка
Physiol.	Physiology	фізыялёгія
pl.	plural	множны лік
Poet.	Poetic	паэтычнае
poss.	possessive	прыналежнае
p.p.	past participle	дзеепрыметнік мінулага часу
pref.	prefix	прыстаўка
prep.	preposition	прыназоўнік
pres. p.	present participle	дзеепрыметнік цяперашняга часу
Print.	Printing	друкарства
pron.	pronoun	займеньнік
Psych.	Psychology	псыхалёгія
p.t.	past tense	мінулы час
refl.	reflexive	зваротны стан
Relig.	Religion	рэлігія
Rhetor.	Rhetoric	рыторыка
Scot.	Scottish	шатляндзкае
sing.	singular	адзіночны лік
Sl.	Slang	жаргон, слэнг
superl.	superlative	найвышэйшая ступень (прыметніка)
Surg.	Surgery	хірургія
Tech.	Technical	тэхнічнае
Telev.	Television	тэлевізія
Theatr.	Theatrical	тэатральнае
Trig.	Trigonometry	трыганамэтрыя
U.S.	United States	Злучаныя Штаты
v.	verb	дзеяслоў
v.i.	verb intrasitive	непераходны дзеяслоў
v.t.	verb transitive	пераходны дзеяслоў
Vulg.	Vulgar	вульгарнае
Zool.	Zoology	заалёгія

асабл.	асабліва
гл.	глядзі
лац.	лацінскі выраз
напр.	напрыклад
тс.	таксама
фр.	французскі выраз

LEXICOGRAPHIC SOURCES
ЛЕКСЫКАГРАФІЧНЫЯ КРЫНІЦЫ

• The Amecian Heritage Dictionary. Fourth Edition. Random House: New York, 2001.

• Wielki Slownik Angielsko-Polski PWN-Oxford. Chief Editor: Prof. Jadwiga Linde-Usiekniewicz. Warszawa, 2002.

• English-Russian Dictionary. V. K. Mueller. 24th Revised Edition. Moscow. 1995.

• Oxford Russian Dictionary. English-Russian, edited by Paul Falla; Russian-English, edited by Marcus Wheeler and Boris Unbegaun. Revised and updated by Collin Howlett. Oxford – New York: Oxford University Press, 1997.

• The Oxford Dictionary of Current English. New Revised Edition. Edited by Della Thompson. London, 1998.

• Random House Webster's Unabridged Dictionary (Electronic Version). 1999.

• Longman Advanced American Dictionary of American English. Harlow, 2000.

• J.C.Wells. Longman Pronunciation Dictionary. Second Edition. Harlow, 2000.

• Слоўнік беларускай мовы. Пад рэдакцыяй М.В.Бірылы. Мінск, 1987.

• А.М.Булыка. Слоўнік іншамоўных слоў. У 2-х т. Мінск, 1999.

• Англа-беларускі слоўнік грамадска-палітычнай лексікі. Укладальнікі Л. Т. Карповіч і Л. А. Казыра. Мінск, 1993.

• Англо-український словник. Склали М. Л. Подвезько, М. І. Балла. Київ, 1974.

• Беларуска-расійскі (Вялікалітоўска-расійскі) слоўнік. Published by Lew Sapieha Greatlitvan (Byelorussian) Foundation. Укладальнік др. Я. Станкевіч. New York, [1989].

• Беларуска-рускі слоўнік у двух тамах. Рэдактар К. К. Атраховіч (Кандрат Крапіва). Выданне 2-е. Мінск, 1988, 1989.

• Польска-беларускі слоўнік. Укладальнікі Я. В. Волкава і В. Л. Авілава, пад рэд. Г. А. Цыхуна. Мінск, 2004.

• Расійска-крыўскі (Беларускі) слоўнік. Укладальнік В. Ластоўскі. Коўна, 1924.

• М.Байкоў, С.Некрашэвіч. Беларуска-расійскі слоўнік. Менск, 1926.

• С.Некрашэвіч, М.Байкоў. Расійска-беларускі слоўнік. Менск, 1928.

• Руска-беларускі слоўнік. Рэдактар К. К. Крапіва. Выданне 2-е. Мінск, 1982.

• Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча ў пяці тамах. Рэдакцыйная калегія: Ю. Ф. Мацкевіч і інш. Мінск, 1979-1986.

• Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. Пад рэд. М. Р. Судніка і М. Н. Крыўко. Выданне 2-е. Мінск, 1999.

• Тлумачальны слоўнік беларускай мовы ў пяці тамах. Пад агульнай рэдакцыяй акадэміка АН БССР К. К. Атраховіча (Кандрата Крапівы). Мінск, 1977-1984.

• Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы ў двух тамах. Укладальнік І. Я. Лепешаў. Мінск, 1993.

ENGLISH ALPHABET
АНГЕЛЬСКІ АЛЬФАБЭТ

Aa	**Bb**	**Cc**	**Dd**	**Ee**	**Ff**
Gg	**Hh**	**Ii**	**Jj**	**Kk**	**Ll**
Mm	**Nn**	**Oo**	**Pp**	**Qq**	**Rr**
Ss	**Tt**	**Uu**	**Vv**	**Ww**	**Xx**
		Yy	**Zz**		

A

A [eɪ] n., pl. **As** or **A's** 1. *пе́ршая лі́тара анге́льскага альфабе́ту.* 2. найле́пшы, пе́ршы: ***Grade A eggs*** я́йкі найвышэ́йшага гату́нку; ***Company A in an infantry battalion*** пе́ршая ро́та пяхо́тнага батальёну. 3. выда́тна (*шко́льная адзна́ка*): ***to get an A in Belarusian*** атрыма́ць выда́тна зь белару́скае мо́вы. 4. Mus. ля

a, an [*unstressed* ə; *stressed* eɪ]. adj. or indefinite article 1. *неазнача́льны арты́кль (не перакла́дае́цца). "a" ста́віцца пе́рад зы́чнымі, апрача́ нямо́га "h", пе́рад "eu" ды "u": **a tree, a horse** "an" — пе́рад гало́снымі і нямы́м "h": **an apple, an heir*** 2. (*ча́ста пе́рад со́бскімі імёнамі*) такі́, гэ́ткі як: ***a Napoleon*** такі́ Напалео́н; ***He is a Cicero in eloquence*** Ён як Цыцэро́н у красамо́ўстве; ***She is a saint among women*** Яна́ як сьвята́я сяро́д жанчы́н. 3. адзі́н: ***to have a million dollars*** мець мільён даля́раў; ***not a*** ані́, ніякі. 4. ***a few*** не́калькі; ***a good many*** ве́льмі шмат; ***a little*** кры́шку. 5. *"a" звыча́йна ўжыва́ецца пасьля́:* ***all of, many of, many, such, what: all of a size*** усе́ тако́й са́май велічыні́; ***many a man*** шмат хто; ***such a*** такі́; ***what a bore*** што за нуда́. 6. *у некато́рых зваро́тах:* ***twice a day*** дво́йчы на дзень; ***once a week*** раз на ты́дзень; ***one cent a piece*** па цэ́нце за шту́ку; ***90 cents a dozen*** дзевяно́ста цэ́нтаў за ту́зін. 7. не́хта; ***a Mr. Henry Green*** не́йкі спада́р Гэ́нры Грын

aback [əˈbæk] adv. наза́д, ты́лам, уза́д, зза́ду: ***to stand aback from*** трыма́цца зза́ду, на адле́гласьці; ***to take aback*** зьбянтэ́жыць, засьпе́ць зьняна́цку

abacus [ˈæbəkəs] n. 1. лічы́льныя ко́сткі, лічы́льнікі *pl. only.* 2. Archit. аба́ка *f.* (*ве́рхняя ча́стка калёны*)

abaft [əˈbæft] – prep. зза́ду *чаго́*, за *чым.* – adv. Naut. зза́ду карабля́, на карме́; у бок кармы́

abandon [əˈbændən] – v.t. 1. пакіда́ць; адмаўля́цца: ***to abandon a career*** паки́нуць прафэ́сію; ***to abandon a custom*** адыйсьці́ ад звы́чаю; ***to abandon one's home*** паки́нуць (свой) дом. 2. адрака́цца; адмаўля́цца; адступа́ць: ***to abandon one's position*** адмо́віцца ад сваёй пазы́цыі, перакана́ньня. 3. парыва́ць; вырака́цца; пазбыва́цца: ***to abandon a habit*** пазбыва́цца звы́чкі. 4. аддава́цца; упада́ць: ***to abandon oneself to despair*** аддава́цца ро́спачы, упада́ць у ро́спач – n. 1. бестурбо́тнасьць *f.*: ***to dance with youthful abandon*** танцава́ць з маладо́й бестурбо́тнасьцю. 2. бесцырымо́ннасьць, нястры́манасьць *f.*

abandoned [əˈbændənd] adj. 1. паки́нуты, занядба́ны. 2. нястры́мны: ***abandoned laughter*** нястры́мны сьмех. 3. распу́сны

abandonment [əˈbændənmənt] n. 1. пакіда́ньне *n.* 2. адступле́ньне ад *чаго́*; зрачэ́ньне *n.*

abase [əˈbeɪs] v.t. 1. паніжа́ць (*ра́нгам*). 2. прыніжа́ць: ***to abase oneself*** прыніжа́цца; ***A man who betrays his country abases himself*** Чалаве́к, які́ здра́джвае сваю́ кра́ю, прыніжа́е само́га сябе́

abasement [əˈbeɪsmənt] n. прыніжэ́ньне *n.*; паніжэ́ньне ра́нгам

abash [əˈbæʃ] v. саро́міць; бянтэ́жыць: ***to be abashed*** саро́мецца; бянтэ́жыцца

abashment [əˈbæʃmənt] n. засаро́мленасьць, зьбянтэ́жанасьць *f.*

abate [əˈbeɪt] – v.i. сьціша́цца, усьцішацца; суніма́цца: ***The storm has abated*** Бу́ра сьці́шылася

– v.t. 1. сьцішаць; суніма́ць: ***Aspirin abated his pain*** Асьпірын сьці́шыў яму́ боль. 2. зьмяншаць; зьніжа́ць: ***abate a tax*** зьні́зіць пада́так. 3. Law касава́ць; анулява́ць

abatement [əˈbeɪtmənt] n. 1. спад -у *m.*, зьме́ншаньне *n.*; зьні́жка *f.*, зьніжэ́ньне *n.*: ***abatement of the prices*** зьні́жка цэ́наў. 2. Law скасава́ньне, анулява́ньне *n.*

abb [æb] n., Brit. уто́к *f.* (*у тка́цтве*)

abbacy [ˈæbəsi] n., pl. **-cies** 1. аба́цтва, ігу́менства *n.* 2. раён *або́* грамада́, кірава́ная аба́там

abbess [ˈæbes] n. абатыса, ігу́меньня *f.*

abbey [ˈæbi] v.t. аба́цтва *n.*, манасты́р -а́ *m.*

abbot [ˈæbət] n. аба́т -а, ігу́мен -а *m.*, кіраўні́к манастыра́

abbreviate [əˈbri:vieɪt] v. 1. скарача́ць. 2. скарача́цца

abbreviation [əˌbri:viˈeɪʃən] n. скарачэ́ньне *n.* (*сло́ва*); скаро́т -у *m.*

A.B.C. book лемантáр, буквáр -á *m.*

ABCs [ˌeibi:ˈsi:z] n. pl. 1. абэцэ́да *f.*, альфабэ́т -у *m.* 2. пачатко́выя ве́ды; асно́вы *pl.*: ***to master the ABC's of swimming*** апанава́ць асно́вы пла́ваньня

abdicate [ˈæbdɪkeɪt] v. 1. абдыкава́ць; адмаўля́цца: ***The king abdicated his throne*** Каро́ль адмо́віўся ад тро́ну. 2. адыхо́дзіць: ***Those who abdicate life socially, will soon abdicate from life itself*** Тыя́, што адыхо́дзяць ад грама́дзкага жыцьця́, ху́тка адыйду́ць ад само́га жыцьця́

abdication [ˌæbdɪˈkeɪʃən] n. абдыка́цыя *f.*; адмаўле́ньне ад паса́ды

abdomen [ˈæbdəmən] n. 1. Anat., Zool. чэ́рава, бру́ха *n.*; жывло́т -ата́ *m.* 2. брушна́я по́ласьць *f.* 3. бру́шка (*у чле́ністано́гіх*) *n.*

abdominal [æbˈdɑ:mɪnəl] adj. брушны́: ***the abdominal muscles*** брушны́я му́скулы

abdominous [æbˈdɑ:mɪnəs] adj. бруха́ты, пуза́ты

abduce [æbˈdu:s] v.t. адво́дзіць (*убо́к*)

abducent [æbˈdu:sənt] adj., Anat. адво́дны: ***abducent muscles*** адво́дныя му́скулы

abduct [æbˈdʌkt] v.t. выкрада́ць (*асо́бу*)

abduction [æbˈdʌkʃən] n. выкрада́ньне *n.*

abductor [æbˈdʌktər] n. 1. выкрада́льнік -а *m.* 2. адво́дны му́скул *m.*

abed [əˈbed] adv. у ло́жку

Abel [ˈeɪbəl] n., Bibl. Абэль (*2-гі́ сын Ада́ма й Евы*)

aberrance [æˈberəns] n. адхіле́ньне (*ад кіру́нку, но́рмы, пра́віла*)

aberrancy [æˈberənsi] n. = **aberrance**

aberrant [æˈberənt] – adj. адхі́лены ад но́рмы, ненарма́льны; няпра́вільны: ***a rocket on an aberrant course*** раке́та адхілі́лася ад ку́рсу; ***aberrant behavior*** ненарма́льныя паво́дзіны

– n. ненарма́льны -ага *m.*, ненарма́льная *f.*

aberration [ˌæbəˈreɪʃən] n. 1. адхіле́ньне, ухіле́ньне *n.* (*ад пра́вільнага шля́ху ці ку́рсу*): ***aberration of the mind*** замгле́ньне *n.* ро́зуму. 2. адхіле́ньне *n.* (*ад пра́віла, ты́пу, станда́рту*). 3. Astron. абэра́цыя *f.*, адхіле́ньне *n.*: ***aberration of the needle*** адхіле́ньне магні́тнае стрэ́лкі

abet [əˈbet] v.t. намаўля́ць, падбіва́ць, падбухто́рваць: ***to abet a crime*** падбухто́рыць да злачы́нства

abetment [əˈbetmənt] n. падбіва́ньне; падбухто́рваньне; заахво́чваньне *n.*

abetter or **abettor** [əˈbetər] n. падбухто́рнік -а, падмо́ўнік -а *m.*; падбухто́рніца, падмо́ўніца *f.*

abeyance [əˈbeɪəns] n. часо́вая бязьдзе́йнасьць *f.*, часо́вае неўжыва́ньне *n.*: ***The custom was revived after an abeyance of several centuries*** Звы́чай быў адно́ўлены пасьля́ не́калькіх стаго́дзьдзяў забыцьця́

• ***in abeyance*** а) у ча́се прыпыне́ньня дзе́йнасьці. б) Law у ча́се чака́ньня зако́ннага ўла́сьніка

abhor [æbˈhɔ:r] v.t. 1. гі́дзіцца, бры́дзіцца; ненаві́дзець: ***She abhors snakes*** Яна́ гі́дзіцца зьме́яў; ***to abhor cruelty*** мець агі́ду да лю́тасьці. 2. жаха́цца; уздры́гваць; калаці́цца: ***to abhor the idea of war*** жаха́цца ад аднае́ ду́мкі пра вайну́

abhorrence [æbˈhɔ:rəns] n. 1. агі́да, нянаві́сьць *f.* 2. што́сьці агі́днае

abhorrent [æbˈhɔ:rənt] adj. агі́дны, бры́длы, гі́дкі; жахлі́вы: ***abhorrent conduct*** агі́дныя паво́дзіны

• ***abhorrent to*** супярэ́чны, нязго́дны, несумяшча́льны зь не́чым: ***abhorrent to nature*** супярэ́чны прыро́дзе

abidance [əˈbaɪdəns] n. знахо́джаньне *n.*, ***abidance by*** прытры́маньне, выко́наньне *n.*: ***The coach demanded abidance by the rules of the game*** Трэ́нэр патрабава́ў прытры́маньня пра́вілаў гульні́

abide [əˈbaɪd] v., **abode** or **abided, abiding** 1. цярпе́ць; вытры́маць. 2. прытры́мацца, падпара́дкавацца; заставацца ве́рным: ***Abide by your word*** Трыма́й сваё сло́ва

ability [əˈbɪlətɪ] n., pl. **-ties** 1. здо́льнасьць, зда́тнасьць *f.*: ***the ability to think clearly*** здо́льнасьць я́сна ду́маць. 2. уме́льства *n.*, та́лент -у *m.*: ***ability of a carpenter*** сталя́рскае уме́льства

• ***abilities,*** pl. здо́льнасьці; разумо́выя здо́льнасьці: ***a man of abilities*** таленавіты чалаве́к

abject [ˈæbdʒekt] adj. 1. жа́ласны; мізэ́рны; убо́гі: ***in abject poverty*** у мізэ́рнай бядо́це. 2. нікчэ́мны, нягодны: ***an abject flatterer*** нікчэ́мны ліс ьліве́ц. 3. нявольніцкі: ***abject submission*** нявольніцкае падпара́дкаваньне

abjection [æbˈdʒekʃən] n. прыніжэ́ньне, гнібе́ньне *n.*

abjuration [ˌæbdʒəˈreɪʃən] n. адрачэ́ньне пад прыся́гай

abjure [æbˈdʒʊr] v.t. 1. адрака́цца, зрака́цца, адмаўля́цца: ***to abjure power*** адрачы́ся ад улады́, зрачы́ся ўлады́. 2. афіцыйна адступа́цца: ***to abjure one's religion*** адступі́цца ад ве́ры

ablation [æbˈleɪʃən] n. 1. Surg. выдале́ньне, выраза́ньне, адраза́ньне *n.* 2. Geol. размыва́ньне, выпятрэ́ньне (*ска́лаў*); зно́шваньне *n.* (*ледавіко́ў*). 3. Aeron. знос пярэ́дняй ча́сткі раке́ты пры ўвахо́дзе ў атмасфэ́ру

ablaze [əˈbleɪz] – adv. у по́лымі, у агні́

– adj. 1. бліскучы; я́ркі, зы́ркі. 2. узбу́джаны, распа́лены: ***to be ablaze*** пала́ць агнём, палымне́ць, гарэ́ць

able [ˈeɪbəl] adj. 1. які́ можа, які́ ўме́е ***to be able:*** быць у ста́не; магчы́: ***Most little children are able to walk before they are able to talk*** Бальшыня́ малы́х дзяце́й мо́гуць хадзі́ць ране́й як гаварыць; ***A cat is able to see in the dark*** Кот можа ба́чыць у це́мры. 2. здо́льны, таленавіты; зда́тны: ***She is an able teacher*** Яна́ зда́тная наста́ўніца. 3. кваліфікава́ны, спра́ўны: ***an able seaman*** спра́ўны мара́к

able-bodied [ˌeɪbəlˈbɑ:dɪd] adj. фізы́чна зда́тны; здаро́вы, мо́цны

ablet [ˈæblət] n. Zool. верхаво́дка *f.*

abloom [əˈblu:m] adv., adj. у цьве́це, у кве́цені; квітне́ючы, цьвіту́чы

ablush [əˈblʌʃ] – adv. пачырване́ўшы, засаро́млена

– adj. пачырване́лы

ablution [əˈblu:ʃən] n. 1. умыва́ньне *n.* 2. абмыва́ньне *n.* (*рэлігі́йнае ачышча́ньне*)

ably [ˈeɪblɪ] adv. спры́тна, спра́ўна; уме́ла

abnegate [ˈæbnɪˌgeɪt] v.t. адмаўля́ць сабе́; адмаўля́цца, выракáцца

abnegation [ˌæbnɪˈgeɪʃən] n. самаадрачэ́ньне, адмаўле́ньне; вырачэ́ньне *n.*

abnormal [æbˈnɔ:rməl] adj. ненармáльны; нязвычáйны, ненатурáльны; анамáльны; нетыпóвы, нестандáртны

abnormality [ˌæbnɔ:rˈmæləti] n., pl. **-ties** 1. ненармáльнасьць, анамáльнасьць; нязвы́чнасьць *f.* 2. нязвы́чная рэч *або́* здарэ́ньне

aboard [əˈbɔ:rd] adv. 1. а) на карабе́ль (*на борт*); на самалёт, цягні́к. б) на караблі́ (*на бо́рце*); у самалёце: ***to go aboard a train*** се́сьці ў цягні́к. 2. уздо́ўж (*карабля́ ці бе́рагу*)
• ***All aboard!*** а) Усе́ сядáць! б) Гато́ва! (усе́ се́лі)

abode I [əˈboʊd] n. жытло́ *n.*; сяліба *f.*

abode II [əˈboʊd] v., *p.t, p.p. of* **abide**

abolish [əˈbɑ:lɪʃ] v.t. касавáць, адмяня́ць: ***to abolish slavery*** скасавáць нявóльніцтва

abolishment [əˈbɑ:lɪʃmənt] n. скасавáньне *n.*

abolition [ˌæbəˈlɪʃən] n. 1. касавáньне *n.* 2. Hist. скасавáньне нявóльніцтва нэ́граў

abolitionist [ˌæbəˈlɪʃənɪst] n. прыхíльнік скасавáньня: ***abolitionist theories of capital punishment*** тэóрыі прыхíльнікаў скасавáньня кáры сьмéрці. 2. Hist. абаліцыяні́ст -а *m.*, прыхíльнік скасавáньня нявóльніцтва нэ́граў

A-bomb [ˈeɪbɑ:m] n. áтамная бóмба

abominable [əˈbɑ:mɪnəbəl] adj. агíдны, гíдкі: ***the abominable odor of rotting garbage*** агíдны смурóд гнілы́х адкíдаў

abominate [əˈbɑ:mɪneɪt] v.t. гíдзіцца; адчувáць агíду; ненавíдзець: ***to abominate unfairness*** ненавíдзець несправядлíвасьць. 2. не цярпéць, не вынóсіць: ***She abominates hot weather*** Янá ня цéрпіць гарачыні́

abomination [əˌbɑ:mɪˈneɪʃən] n. агíда, агíднасьць, мярзóта *f.*

aboriginal [ˌæbəˈrɪdʒənəl] adj. пракавéтны; тубы́льчы

aborigine [æbəˈrɪdʒəni] n. 1. аўтахтóн, абарыгéн, пракавéтнік -а *m.*; тубы́лец -льца *m.*, тубы́лька *f.*; тутэ́йшы -ага *m.* 2. абарыгéн -а *m.* (*у Аўстралíі*)
• ***aborigines*** pl. мясцóвая фáўна й флёра

abort [əˈbɔ:rt] – v.i. 1. неданасíць, спараніць; скíнуць (*пра жывёліну*). 2. Biol. спыні́цца ў разьвіцьцí; занíкнуць. 3. сарвáцца, ня ўдáцца
– v.t. 1. зрабíць абóрт, спарóн. 2. ня вы́канаць задáньня; не давéсьці да канцá (*дóсьлед, задáньне*)

abortion [əˈbɔ:rʃən] n. 1. спарóн -у, абóрт -у *m.* 2. пóўная няўдáча, раптóўны правáл. 3. Biol. а) недаразьвíцьцё óрганаў. б) недаразьвíты вóрган -а *m.*

abortionist [əˈbɔ:rʃənɪst] n. асóба, якáя рóбіць абóрты (*нелегальна*)

abortive [əˈbɔ:rtɪv] – adj. 1. заўчáсны. 2. няўдáлы; безвынікóвы, бясплённы: ***abortive effort*** дарэ́мныя намагáньні. 3. заўчáсна нарóджаны. 4. Biol. недаразьвíты, зачáткавы
– n. срóдак, які́ выклікáе спарóн

abound [əˈbaʊnd] v.i.1. быць у вялíкай кóлькасьці: ***Fish abound in the ocean*** У акія́не шмат ры́бы. 2. быць багáтым: ***The ocean abounds with fish*** Акія́н багáты ры́бай; ***abounding in water*** мнагавóдны, паўнавóдны

about [əˈbaʊt] – prep. 1. пра *кагó-што*; аб *кім-чым*: ***a book about Belarus*** кнíга пра Беларýсь; ***We talked about you*** Мы гаварылі пра цябé. 2. каля́, ля *чагó*: ***Come about three o'clock*** Прыйдзí каля́ трэ́цяй гадзíны. 3. навóкал *чагó*: ***a fence about the garden*** плот навóкал гарóду. 4. пры *кім-чым*. 5. па *кім-чым*: ***children's toys scattered about the room*** дзіця́чыя цáцкі параскідáныя па пакóі; ***The dog ran about the yard*** Сабáка бéгаў па двары́
– adv. 1. блізý; больш-менш: ***The bottle is about empty*** Пля́шка блізý

пустáя; ***He is about my size*** Ён больш-менш майгó рóсту. 2. навó-кал, наўкóла: ***to look about*** разглядáцца наўкóла; ***to turn about*** завярнýцца назáд. 3. зь мéсца на мéсца; туды́-сюды́: ***to shuffle papers about on a desk*** перакідáць зь мéсца на мéсца папéры на сталé. 4. у адварóтным кірýнку: ***to face about*** абярнýцца зáдам

• ***about to*** вось-вось, амáль

• ***up and about*** вярнýцца да звычáйных заняткаў (*пасьля́ хваробы*), быць акты́ўным

about-face [əˌbaʊtˈfeɪs] – n. паварóт на 180 грáдусаў: ***About face!*** Кругóм! (*вайскóвая камáнда*)

– v.i. павярнýцца на 180 грáдусаў, завярнýцца назáд

about-turn [əˌbaʊtˈtɜ:rn] n. паварóт назáд: ***The expected about-turn in U.S. policy*** Чакáны паварóт у палíтыцы ЗША

above [əˈbʌv] – adv. навéрх, угарý, угóру: ***stairs leading above*** схóды, што вядýць навéрх. 2. увéрсе, угары́. 3. ранéй; вышэ́й: ***from what was said above*** з тагó, што скáзана ранéй; ***as stated above*** як скáзана ранéй. 4. вышэ́йшы рáнгам, улáдай: ***to make an appeal to the court above*** апэлявáць да вышэ́йшага сýду

– prep. вышэ́й за, вышэ́й як: ***The elevator does not go above the third floor*** Ліфт ня йдзé вышэ́й за трэ́ці павéрх; ***above zero*** вышэ́й нуля́, над нулём. 2. над: ***a sword above his head*** меч над ягóнай галавóю; ***He kept his head above water*** Ён трымáў галаву́ над вадóю; ***A captain is above a sergeant*** Капітáн вышэ́йшы рáнгам за сяржáнта. 3. больш як, больш за што: ***Not above twenty dollars*** Ня больш, як двáццаць даля́раў. 4. панад, над *чым*: ***The president should not be above the law*** Прэзыдэ́нт не павíнен быць па-над закóнам

– adj. вышэ́йназвáны; вышэ́йгадáны; вышэ́й успóмнены: ***the above fact*** вышэ́йгадáны факт

– n. вышэ́й напíсанае, ранéй скáзанае

• ***above all*** перш за ўсё: ***above all things*** перадусíм

• ***from above*** зьвéрху: ***an order from above*** загáд зьвéрху

aboveboard [əˈbʌvbɔ:rd] – adv. адкры́та, сумлéнна

– adj. адкры́ты, сумлéнны

abrade [əˈbreɪd] v. 1. зьдзірáць; зьдзірáцца. 2. зразáць, сьцірáць, шліфавáць

abrasion [əˈbreɪʒən] n. 1. нацёртая рáна; задзíрына, намýліна *f.*: ***Abrasions of the skin sometimes heal slowly*** Задзíрыны чáсам гóяцца павóлі. 2. Geol. абрáзія *f.*; размы́тая вадóю глéба ці скалá

abrasive [əˈbreɪsɪv] – adj. 1. абразíўны; шліфавáльны. 2. рэ́зкі, грýбы: ***an abrasive voice*** рэ́зкі гóлас

– n. абразíў -ву *m.*, шліфавáльны матэрыя́л: ***Sandpaper is an abrasive*** Наждáчная папéра — абразíў

abreast [əˈbrest] adv., adj. пóплеч, пóруч: ***The soldiers marched four abreast*** Жаўнéры маршыравáлі па чацьвёра ў шэ́рагу; ***to keep abreast of/-with science*** ісьцí з пóступам навýкі; ***to keep abreast of the times*** ісьцí з дýхам чáсу, не адставáць ад жыцьця́

abridge [əˈbrɪdʒ] v.t. скарачáць: ***This long story can be abridged*** Гэ́тае даўгóе апавяда́ньне мóжна скараці́ць. 2. абмяжóўваць; зьмяншáць, памяншáць: ***The rights of citizens must not be abridged without proper cause*** Ня мóжна абмяжóўваць правóў грамадзя́наў без адпавéднае прычы́ны. 3. пазбаўля́ць (*пра́ва, прывілéю*)

abridged [əˈbrɪdʒd] adj. скарóчаны: ***This book appears in an abridged form*** Гэ́тая кнíга выхóдзіць у скарачэ́ньні

abridg(e)ment [əˈbrɪdʒmənt] n. 1. скарачэ́ньне *n.* 2. зьмéншаньне, абмежавáньне *n.*: ***an abridgment of liberties*** абмежавáньне свабóдаў

abroad [əˈbrɔ:d] – adv. 1. за мяжо́ю; за мяжу́: ***to go abroad for the summer*** паéхаць на лéта за мяжу́. 2. далёка, шыро́ка, ва ўсé бакí, у ро́зныя бакí: ***The news spread abroad*** вéстка разыйшлáся далёка
– n. замéжжа *n.*
• ***be all abroad*** а) быць далёкім ад спрáўднасьці. б) быць зьбянтэ́жаным
abrogate [ˈæbrəgeɪt] v.t. касавáць; адхіля́ць (*зако́н, звы́чай*)
abrogation [ˌæbrəˈgeɪʃən] n. скасавáньне, адхілéньне *n.* (*прáўным áктам*)
abrupt [əˈbrʌpt] adj. 1. раптóўны, нечакáны: ***He made an abrupt turn to avoid hitting another car*** Ён зрабíў раптóўны паварóт, каб ня ўдáрыць другóе áўта. 2. рэ́зкі: ***He had an abrupt way of speaking*** Ён меў рэ́зкую манéру гавары́ць. 3. урывíсты: ***an abrupt style*** урывíсты стыль. 4. вéльмі стрóмы, стрóмкі: ***The road made an abrupt rise up the hill*** Дарóга стрóмка падняла́ся на ўзгóрак
abruptly [əˈbrʌptli] adv. неспадзявáна, рáптам; рэ́зка; стрóмка
abscess [ˈæbses] – n. скулá *f.*, нары́лў -ва *m.*, абсцэ́с -са *m.*
– v.i. нарывáць
abscessed [ˈæbsest] adj. з нарывам: ***an abscessed tooth*** нары́ўны зýб
abscissa [æbˈsisə] n., Math. абсцы́са *f.*
abscission [æbˈsiʃən] n. 1. Surg. адрэ́заньне *n.*, ампутáцыя *f.* 2. Bot. ападáньне *n.* (*пладоў, лістоў*)
abscond [əbˈskɑ:nd] v.i. уцячы́ ад сьлéдзтва; зьнíкнуць, хавáцца ад закóну: ***The dishonest cashier absconded with the bank's money*** Несумлéнны касíр зьнік з грашы́ма з бáнку
abscondee [ˌæbskɑ:nˈdi:] n. той, хто хавáецца ад прáва; бяглíяк -якá *m.*, бяглячка *f.*
absence [ˈæbsəns] n. 1. адсýтнасьць *f.*: ***absence from work*** адсýтнасьць на прáцы, прагýл -у *m.*; ***leave of absence*** вóдпуск -у *m.* 2. пэры́яд адсýтнасьці: ***an absence of two weeks*** двутыднёвая адсýтнасьць. 3. недахóп -у *m.*, нястáча *f.*: ***Darkness is the absence of light*** Цéмра — гэ́та недахóп сьвятлá
• ***absence of mind*** няўвáга, няўвáжнасьць; расьсéянасьць, расьцярýшанасьць *f.*
absent [ˈæbsənt] – adj. 1. адсýтны: ***He is absent from school*** Ён прагуля́ў шкóлу. 2. няíсны. 3. бяздýмны, няўвáжлівы: ***absent look*** бяздýмны пóгляд
– v.t. [æbˈsent] быць непрысýтным; адсýтнічаць
absentee [ˌæbsənˈti:] n. 1. непрысýтны -ага *m.*, непрысýтная *f.* 2. прагýльнік -а *m.*
absentee landlord улáсьнік, якí жывé ў íншым мéсцы
absentee vote гóлас за непрысýтнага ў дзень вы́бараў
absenteeism [ˌæbsənˈti:ɪzəm] n. 1. абсэнтэíзм -у *m.*, чáстая адсýтнасьць *f.*. 2. прагýльніцтва *n.*
absently [ˈæbsəntli] adv. няўвáжліва, няўвáжна; расьцярýшана
absent-minded [ˌæbsəntˈmaɪndɪd] adj. няўвáжлівы, расьцярýшаны; бяздýмны; няпáмятлівы
absinth [ˈæbsinθ] n. Bot. палы́н -у *m.*
absinthe [ˈæbsinθ] n. палынóўка *f.*, палынóвая настóйка
absolute [ˈæbsəlu:t] – adj. 1. пóўны; безумóўны; абсалю́тны: ***absolute ignorance*** пóўнае нéвуцтва, цямнóта; ***absolute rest*** пóўны спакóй; ***absolute truth*** безумóўная прáўда. 2. неабмежавáны: ***absolute authority*** неабмежавáная ўлáда. 3. пэ́ўны; надзéйны: ***absolute proof*** пэ́ўны дóвад. 4. Chem. чы́сты, без прымéшкі: ***absolute alcohol*** чы́сты сьпірт. 5. абсалю́тны: ***absolute humidity*** абсалю́тная вóгкасьць; ***absolute majority*** абсалю́тная бальшыня́; ***absolute zero*** абсалю́тны нуль
– n. Philos. абсалю́т -у *m.*

absolutely [ˈæbsəlu:tli] adv. зусі́м; ца́лкам; абсалю́тна: ***Are you absolutely certain?*** Ці ты абсалю́тна пэ́ўны? 2. неабмежава́на; абсалю́тна: ***in an age when kings ruled absolutely*** у часо́х, калі́ каралі́ ме́лі неабмежава́ную ўла́ду

absolution [ˌæbsəˈlu:ʃən] n. 1. адпушчэ́нне; разграшэ́нне *n.*; абсалю́цыя *f.*: ***absolution of sins*** адпушчэ́нне грахо́ў. 2. дарава́нне *n.*: ***absolution from guilt*** дарава́нне ві́ны. 3. апраўда́нне *n.* (*ад ві́ны ці абві́нава́чаньня*). 4. звальне́нне *n.* (*ад абавя́зкаў ці абяца́ньня*)

absolutism [ˈæbsəlu:tɪzəm] n. абсалюты́зм -у *m.*

absolutist [ˈæbsəlu:tɪst] – n. абсалюты́ст -а *m.*; прыхі́льнік абсалюты́зму
– adj. дэспаты́чны

absolve [əbˈzɑ:lv] v.t. 1. апра́ўдваць (*ад ві́ны ці за́кіду*); звальня́ць ад ка́ры. 2. адпушча́ць грахі́. 3. вызваля́ць: ***absolve from promise, duty or obligation*** вы́звалiць ад абяца́ньня, абавя́зку або́ абавяза́ньня

absorb [əbˈzɔ:rb] v.t. 1. уця́гваць; убіра́ць; усмо́ктваць: ***A blotter absorbs ink*** Прамака́тка ўця́гвае чарні́ла; ***to absorb water*** убіра́ць ваду́. 2. асыміля́ваць; паглына́ць: ***The United States has absorbed millions of immigrants*** Аме́рыка асыміля́вала мільёны імігра́нтаў. 3. засво́йваць, разуме́ць: ***to absorb the full meaning of a remark*** зразуме́ць по́ўны сэнс заўва́гі. 4. захапля́ць усю́ ўва́гу, мо́цна ціка́віць: ***The circus absorbed the boys*** Цырк по́ўнасьцяй захапі́ў ува́гу хлапцо́ў. 5. паглына́ць: ***Anything black absorbs most of the light rays*** Усё чо́рнае паглына́е бальшыню́ сьветлавы́х про́мняў

absorbency [əbˈzɔ:rbənsi] n. паглына́льнасьць *f.*

absorbent [əbˈzɔ:rbənt] – adj. паглына́льны; прамака́льны, які́ ўсмо́ктвае: ***Absorbent paper is used to dry hands*** Прамака́льная папе́ра ўжыва́ецца да выціра́ньня рук
– n. паглына́льнік -а *m.*

absorber [əbˈzɔ:rbər] n. 1. паглына́льнік -а; абсо́рбэр -а *m.* 2. амартыза́тар -а *m.*: ***shock absorber*** амартыза́тар (*у машы́нах*)

absorption [əbˈzɔ:rpʃən] n. 1. абсо́рбцыя *f.*, паглына́ньне, усмо́ктваньне, уця́гваньне *n.*: ***absorption of light rays by black objects*** паглына́ньне сьветлавы́х про́мняў чо́рнымі прадме́тамі. 2. заглыбле́ньне *n. ў не́чым*; вялі́кае зацікаўле́ньне *n. не́чым*

absorptive [əbˈzɔ:rptɪv] adj. паглына́льны, абсарбцы́йны; прамака́льны

abstain [əbˈstem] v.i. (from) стры́мвацца, устрымва́цца; адмаўля́цца *ад чаго́*: ***to abstain from smoking (alcohol)*** стры́мвацца ад куро́ньня (алькаго́лю): ***When a vote was taken, several members abstained*** Калі галасава́лі, ко́лькі сяброў устрыма́лася

abstainer [əbˈstemər] n. абстыне́нт -а *m.*

abstemious [əbˈsti:miəs] adj. 1. стры́маны; памярко́ўны (*асабліва ў ядзе́ньні, піцьці*). 2. ве́льмі про́сты, абмежава́ны: ***an abstemious diet*** ве́льмі абмежава́ная дые́та

abstemiously [əbˈsti:miəsli] adv. стры́мана, памярко́ўна

abstention [abˈstenʃən] n. 1. устрыма́ньне *n.* (*ад яды́, куро́ньня*). 2. устрыма́ньне пры галасава́ньні: ***There were several abstentions from voting*** Было́ ко́лькі асо́баў, што ўстрыма́ліся пры галасава́ньні

abstinence [ˈæbstɪnəns] n. стры́манасьць *f.*, устрыма́ньне *n.*: ***abstinence from meat, sweets, or tobacco during Lent*** устры́маньне ад мя́са, ласу́нкаў або́ куро́ньня ў ча́се вялі́кага по́сту

abstinent [ˈæbstɪnənt] adj. стры́маны, памярко́ўны; які́ адмаўля́е сабе́

abstract [ˈæbstrækt] – adj. 1. абстра́ктны, адця́гнены: ***Sweetness is abstract; sugar is concrete*** Сало́дкасьць — паня́цьце абстра́ктнае; цу́кар — канкрэ́тнае; ***abstract noun*** Gram. абстра́ктны назо́ўнік; ***abstract number***

абстра́ктны лік. 2. ідэа́льны; тэарэты́чны. 3. Art абстра́ктны
– v.t. [æbˈstrækt] 1. абстрагава́ць. 2. скарача́ць, рабі́ць рэзюмэ́, рабі́ць вы́піскі. 3. выця́гваць, аддзяля́ць, вылуча́ць
– n. 1. вы́цяг -у *m.*, каро́ткі зьмест, рэзюмэ́ *n.* 2. абстра́ктны твор маста́цтва
• ***in the abstract*** у тэо́рыі (*а ня ў пра́ктыцы*)

abstracted [æbˈstræktɪd] adj. заду́маны, паглы́блены ў ду́мкі; расьцяру́шаны, няўва́жлівы

abstraction [æbˈstrækʃən] n. 1. абстра́кцыя *f.*; абстра́ктнае паня́цьце *n.*: ***Redness, courage, hope, sorrow and length are abstractions*** Чы́рвань, адва́га, надзе́я, боль і даўжыня́ — абстра́ктныя паня́цьці. 2. абстрагава́ньне *n.* 3. адня́цьце, аддзяле́ньне *n.*: ***the abstraction of iron from ore*** аддзяле́ньне жале́за ад руды́. 3. заду́манасьць *f.*, расьцяру́шанасьць *f.*: ***In a fit of abstraction, he misplaced his glasses*** Праз расьцяру́шанасьць, ён не́дзе паклі́нуў сваі́ акуля́ры. 4. твор абстра́ктнага маста́цтва

abstractionism [æbˈstrækʃənˌɪzəm] n. абстракцыяні́зм -у *m.*

abstruse [æbˈstru:s] adj. заблы́таны; няя́сны, цьмя́ны, незразуме́лы

absurd [əbˈsɜ:rd] adj. абсу́рдны, бессэнсо́ўны, недарэ́чны, бязглу́зды; неразу́мны, сьмяхо́тны

absurdity [əbˈsɜ:rdəti] n., pl. **-ties** 1. недарэ́чнасьць *f.*; абсу́рд -у *m.*, бязглу́здзіца; лухта́ *f.*: ***Your explanation is an absurdity*** Тваё тлумачэ́ньне зусі́м недарэ́чнае. 2. дурно́та; неразу́мнасьць, бязглу́здасьць, абсу́рднасьць *f.*: ***the absurdity of superstition*** неразу́мнасьць забабо́наў

abundance [əˈbʌndəns] n. 1. дастáт|ак -ку *m.*; багáцьце *n.* 2. вялі́кая ко́лькасьць; празьме́рнасьць *f.*, збы́т|ак -ку *m.*
• ***in abundance*** удо́сыць, мно́ства

abundant [əˈbʌndənt] adj. багáты, шчо́дры, вялі́кі: ***abundant harvest*** багáты ўраджáй

abuse [əˈbju:z] – v.t. 1. злоўжыва́ць: ***Do not abuse power*** Не злоўжывáй улáдай. 2. зьдзе́кавацца, дрэ́нна абыхо́дзіцца. 3. псава́ць: ***Don't abuse your eyes by reading in a bad light*** Ня псуй вачэ́й, чытáючы пры благі́м сьвятле́. 4. зьневажа́ць, абража́ць
– n. [əˈbju:s] 1. злоўжыва́ньне *n.* 2. абра́за; зьнява́га *f.* 3. зьдзе́кваньне *n.*; зьдзек -у *m.*:***abuse of a helpless prisoner*** зьдзек над бездапамо́жным вя́зьнем

abusive [əˈbju:sɪv] adj. 1. абра́зьлівы, зьнява́жлівы; ра́зкі: ***abusive words*** абра́зьлівыя сло́вы; ***abusive language*** ла́янка. 2. які́ дрэ́нна абыхо́дзіцца. 3. няпра́вільна ўжы́ты

abusiveness [əˈbju:sɪvnəs] n. абра́зьлівасьць, зьнява́жлівасьць *f.*

abut [əˈbʌt] v.i. 1. прытыка́цца; прыляга́ць: ***The sidewalk abuts on the street*** Хо́дзішча прытыка́ецца да ву́ліцы. 2. стыка́цца; межава́ць: ***His land abuts upon mine*** Яго́ная зямля́ мяжу́е з маёю

abutment [əˈbʌtmənt] n. 1. пятá *f.* (*апо́ра а́ркі або́ мо́сту*). 2. суты́к -у *m.*

abuttal [əˈbʌtəl] n. прытыка́ньне *n.*
• ***abuttals,*** pl. паграні́чная паласá, узьме́жжа *n.*, мяжá *f.*

abysm [əˈbɪzəm] n. *гл.* **abyss**

abysmal [əˈbɪzməl] adj. 1. бяздо́нны; ве́льмі глыбо́кі. 2. Informal жахлі́вы, права́льны: ***The system of teaching was abysmal*** Сыстэ́ма навуча́ньня была́ на ве́льмі нізкі́м узро́ўні

abyss [əˈbɪs] n. 1. прадо́ньне *n.*; бе́здань *f.*, бяздо́ньне *n.*; про́рва *f.* 2. Bibl. першабы́тны бязла́д

abyssal [əˈbɪsəl] adj. глыбі́нны; глыбакаво́дны: ***an abyssal mollusk*** глыбакаво́дны малю́ск

Abyssinian [ˌæbɪˈsiniən] – n. абісы́н|ец -ца *m.*, абісы́нка *f.*
– adj. абісы́нскі

acacia [əˈkeɪʃə] n., Bot. акáцыя *f.*

academic [ˌækəˈdemɪk] – adj. 1. акадэмíчны; навукóвы: ***academic research*** навукóвыя дасьлéдваньні. 2. тэарэтычны: ***an academic question*** тэарэтычнае пытáньне

– n. студэ́нт *або́* прафэ́сар універсытэ́ту

academician [əˌkædəˈmɪʃən] n. акадэ́мік -а *m.*, ся́бра акадэ́міі

academy [əˈkædəmi] n., pl. **-mies** 1. акадэ́мія *f.* 2. прыва́тная сярэ́дняя шко́ла. 3. спэцыялізава́ная навуча́льная ўстанова: ***military academy*** ваéнная акадэ́мія; ***academy of music*** музы́чная акадэ́мія

• ***the Academy*** сад блізу́ старажы́тных Атэ́наў, дзе вучы́ў Плятóн

accede [ækˈsi:d] v.i. 1. згаджа́цца; саступа́ць: ***Please accede to my request*** Калí ла́ска, згадзéцеся на маю́ прóсьбу. 2. (to) атрыма́ць (*улáду*, *пасáду*): ***When the king died, his oldest son acceded to the throne*** Калí карóль памёр, ягóны старэ́йшы сын заняў трон. 3. далуча́цца: ***Our government acceded to the treaty*** Наш ура́д далучы́ўся да дамóвы

accelerate [ækˈseləreɪt] – v.t. паскара́ць: ***to accelerate recovery*** паскóрыць выздараўлéньне

– v.i. павялíчваць хýткасьць: ***The train accelerated suddenly*** Цягнíк ра́птам павялíчыў хýткасьць

acceleration [ækˌseləˈreɪʃən] n. паскарэ́ньне *n.*

acceleration of gravity паскарэ́ньне зямны́м прыцягнéньнем

accelerative [ækˌseləˈreɪtɪv] adj. паскара́льны, прысьпяша́льны

accelerator [ækˈseləreɪtər] n. 1. паскара́льнік -а, аксэлера́тар -а *m.* (*у áўце*). 2. Chem. каталіза́тар -у *m.*

accent [ˈæksent] – n. 1. на́ціск -у *m.* 2. вымóва *f.*; акцэ́нт -у *m.*: ***He speaks English with a Belarusian accent*** Ён гавóрыць па-англéльску зь беларýскім акцэ́нтам

– v.t. [ækˈsent] 1. вымаўля́ць з на́ціскам. 2. ста́віць на́ціскі (*на пісьмé, у гýтарцы*). 3. падкрэ́сьліваць: ***Throughout his speech the President accented the gravity of the situation*** На працягý сваé прамóвы прэзыдэ́нт падкрэ́сьліваў пава́жнасьць сытуа́цыі

• ***accents***, pl. а) тон гóласу: ***She spoke in tender accents*** Яна́ гавары́ла далíкáтным гóласам. б) мóва *f.*, слóвы *pl.*

accentual [ækˈsentʃuəl] adj. 1. на́ціскавы. 2. танíчны: ***accentual poetry*** танíчная паэ́зія

accentuate [ækˈsentʃueɪt] v.t. 1. падкрэ́сьліваць: ***The girl's national costume accentuated her beauty*** Нарóдны строй дзяўчы́нкі падкрэ́сьліваў яé прыгажóсьць. 2. вымаўля́ць з на́ціскам. 3. ста́віць знáкі на́ціску. 4. ускладня́ць: ***The problem is accentuated by a shortage of teachers*** Праблéма ўскладня́ецца недахóпам настáўнікаў

accept [ækˈsept] – v.t. 1. прыма́ць: ***I accept your gift gratefully*** Прыма́ю ваш падарýнак з удзя́чнасьцяй. 2. згаджа́цца, пагаджа́цца: ***to accept a proposal*** згадзíцца на прапанóву; ***to accept the fact*** пагадзíцца з фáктам. 3. прызнава́ць праўдзívым, вéрыць: ***The teacher won't accept your excuse*** Настáўнік не павéрыць тваёй адгавóрцы; ***to accept a doctrine*** прызна́ць дактры́ну праўдзívай. 4. залічáць: ***The teacher has accepted my paper*** Настáўнік залічы́ў маю́ пра́цу. 5. акцэптава́ць (*падпíса́ць і згадзíцца заплаці́ць*) вэ́ксаль

– v.i. згаджа́цца *на што*: ***I was invited and I accepted*** Мянé запрасíлі, і я згадзíўся

acceptable [ækˈseptəbəl] adj. 1. прыма́льны, якí мóжна прыня́ць; адпавéдны, пажада́ны: ***Flowers are an acceptable gift to a sick person*** Квéткі — адпавéдны падарýнак для хвóрага. 2. нядрэ́нны: ***an acceptable performance*** нядрэ́нны вы́ступ

acceptance [əkˈseptəns] n. 1. прыма́ньне *n.* 2. згó да *f.* 3. прыхі́льнае прыймó. прызна́ньне, ухвале́ньне. 3. Com. а) акцэ́пт -у *m.* (*вэ́ксаля*). б) акцэптава́ны вэ́ксаль

acceptation [ˌæksepˈteɪʃən] n. 1. агу́льнапрыня́тае зна́чаньне, ужыва́ньне: ***It is more important to know the acceptation of a word than its derivation*** Важне́й ве́даць зна́чаньне сло́ва, як яго́нае пахо́джаньне. 2. ухвале́ньне *n.*

accepted [əkˈseptɪd] adj. агу́льнапрыня́ты, традыцы́йны

access [ˈækses] n. 1. до́ступ -у; дае́зд -у, падыхо́д -у *m.*; пра́ва на пад'е́зд, на ўвахо́д, на карыста́ньне: ***access to a mountain town*** до́ступ да го́рнага мястэ́чка. 2. спо́саб ці сро́дак до́ступу: ***A ladder provided the only access to the attic*** Драбі́на была́ адзі́ным сро́дкам до́ступу на гары́шча. 3. надыхо́д -у *m.*: ***the access of winter*** надыхо́д зімы́. 4. ата́ка *f.*, пры́ступ -у *m.*: ***the access of her asthma in the spring*** е́йныя пры́ступы а́стмы ў ве́сну. 5. Figur. вы́бух -у *m.* (*гне́ву, ша́лу, ра́дасьці*). 6. пабо́льшаньне *n.*; дада́так -ку *m.*

accessibility [əkˌsesəˈbɪlətɪ] n. дасту́пнасьць, успрыма́льнасьць *f.*

accessible [əkˈsesəbəl] adj. 1. дасту́пны. 2. лёгкадасту́пны; з до́брым дае́здам: ***Tools readily accessible on an open rack*** Прыла́ды лёгкадасту́пныя на адкры́тай пали́цы; ***a very accessible market*** ры́нак зь ве́льмі до́брым дае́здам. 3. наяўны, ве́дамы: ***Not many facts about the kidnapping were accessible*** Няшмат было́ ве́дамых фа́ктаў пра выкрадзе́ньне
• ***accessible to*** пада́тны на ўплы́ў, успрыйма́льны

accession [əkˈseʃən] n. 1. уступле́ньне *n.* (*на трон*), прыхо́д -у *m.* (*да ўла́ды*); атрыма́ньне *n.* (*стано́вішча, пра́цы*). 2. прыро́ст -у; дада́так -ку, набы́так -ку *m.*: ***new library accessions*** но́выя набы́ткі бібліятэ́кі. 3. до́ступ -у *m.*

accessory [əkˈsesərɪ] – n., pl. **-ries** 1. дада́так -ку *m.*; дапамо́жная рэч або́ дэта́ль, акцэсуа́р -у *m.*, прынале́жнасьць *f.*: ***A heater is a useful accessory to a car*** Абагрева́льнік — карысны дада́так у а́ўце; ***All the accessories to her costume — hat, gloves, shoes, and purse — were perfectly matched*** Усе́ дада́ткі да е́йнага гарні́тура — капялю́ш, пальча́ткі, чарави́кі й то́рбачка — былі́ даскана́ла падабра́ныя. 2. Law памага́ты ў злачы́нстве
– adj. дадатко́вы, дапамо́жны
• ***accessory after the fact*** уско́сны саўдзе́льнік (*які́ хава́е злачы́нца або́ дапамага́е ямý ўцячы́*)
• ***accessory before the fact*** непасро́дны саўдзе́льнік (*падбухто́рнік*)

accident [ˈæksɪdənt] n. 1. нешчасьлі́вы выпа́дак, здарэ́ньне *n.*: ***an automobile accident*** аўтамабі́льная ава́рыя. 2. нечака́ны выпа́дак: ***Their meeting was an accident*** Іхная сустрэ́ча была́ выпа́дкам
• ***by accident*** выпадко́ва, выпа́дкам: ***We met by accident*** Мы сустрэ́ліся выпадко́ва

accidental [ˌæksɪˈdentəl] adj. 1. выпадко́вы. 2. неісто́тны

accidentally [ˌæksɪˈdentəlɪ] adv. 1. выпа́дкам, выпадко́ва. 2. незнаро́к, міжво́льна, ненаўмы́сна

accipiter [ækˈsɪpətər] n. я́страб -а *m.*

acclaim [əˈkleɪm] – v.t. 1. віта́ць во́плескамі; мо́цна хвалі́ць. 2. абвяшча́ць
– v.i. ухваля́ць; бу́рна пля́скаць
– n. ухва́ла *f.*, во́плескі -аў *pl.*

acclamation [ˌæklə̀ˈmeɪʃən] n. аклямацыя *f.*, ухва́льныя во́клічы *pl.*: ***elected by acclamation*** вы́браны праз аклямацыю, без галасава́ньня

acclimate [ˈæklɪmeɪt] v. прыстасо́ўваць, прыстасо́ўвацца (*да но́вага кліма́ту, асяро́дзьдзя або́ ўмо́ваў*); акліматызава́ць, акліматызава́цца

acclimation [ˌæklɪˈmeɪʃən] n. акліматыза́цыя *f.*

acclimatization [əˌklaɪmətəˈzeɪʃən] n. акліматызава́ньне *n.* (*чалаве́кам*)

acclimatize [əˈklaɪmətaɪz] v. акліматызава́ць; акліматызава́цца

acclivity [əkˈlɪvəti] n., pl. **-ties** пад'ём -у *m.* (*даро́гі*)

accolade [ˈækəleɪd] n. 1. пахвала́ *f.* 2. Hist. пасьвячэ́ньне ў ры́цары

accommodate [əˈkɑ:mədeɪt] – v.t. 1. зьмяшча́ць; мець ме́сца: ***This plane is large enough to accommodate 120 passengers*** Гэ́ты самалёт дастаткова́ вялі́кі, каб зьмясьці́ць 120 пасажы́раў. 2. рабі́ць паслу́гу, прыслу́жвацца *каму́*. 3. дава́ць прыту́лак, разьмяшча́ць. 4. дава́ць пазы́ку. 5. дастасо́ўваць: ***We must accommodate ourselves to our changed circumstances*** Мы му́сім дастасава́цца да на́шых зьме́неных абста́вінаў. 6. сьці́ша́ць; суніма́ць: ***He tried to accommodate the dispute between the friends*** Ён стара́ўся суня́ць спрэ́чку паміж сябра́мі

– v.i. 1. дастасо́ўвацца. 2. пагаджа́цца; суніма́цца

accommodating [əˈkɑ:mədeɪtɪŋ] adj. прыслу́жлівы; згавО́рлівы

accommodation [əˌkɑ:məˈdeɪʃən] n. 1. паме́шканьне і (*ча́сам*) сталава́ньне. 2. дапамо́га; паслу́га; выго́да *f.* 3. прыстасава́ньне *n.*: ***The accommodation of our desires to a smaller income took some time*** Прыстасава́ньне на́шых жада́ньняў да ме́ншых прыбы́ткаў заняло́ пэ́ўны час. 4. узгадне́ньне, пагадне́ньне *n.*; кампрамі́с -у *m.*: ***The bankrupt and the men to whom he owed money arranged an accommodation*** Банкру́т і лю́дзі, каму́ ён быў ві́нен гро́шы, дайшлі́ да пагадне́ньня. 5. паслу́га *f.* 6. пазы́ка *f.* 7. Physiol. прыстасава́насьць *f.* (*напр. во́ка*)

accompaniment [əˈkʌmpənɪmənt] n. 1. дада́тlак -ку *m.*; суправаджэ́ньне *n.*, спадаро́жнік -а *m.*: ***Sour cream is a usual accompaniment to pancakes*** Смята́на звыча́йны дада́так да бліно́ў; ***Destruction and suffering are the accompaniments of war*** Разбурэ́ньне й цярпе́ньні — спадаро́жнікі вайны́. 2. Mus. акампанімэ́нт -у *m.*

accompanist [əˈkʌmpənɪst] n. акампаніст -а *m.*, акампані́стка *f.*

accompany [əˈkʌmpəni] v. **-nied, -nying** 1. суправаджа́ць; далуча́цца; правО́дзіць: ***May we accompany you on your walk?*** Ці мо́жам прайсьці́ся з ва́мі? Ці мо́жам далучы́цца да вас на праха́дку?; ***to accompany a friend to the airport*** праве́сьці сяброўку (сяб-ра) на лётнішча; ***Fire is accompanied by heat*** Аго́нь суправаджа́ецца гарачынёю. 2. Mus. акампаніява́ць

accomplice [əˈkɑ:mplәs] n. супо́льнік -а *m.*, саўдзе́льнік у злачы́нстве: ***an accomplice in the murder*** саўдзе́льнік у забо́йстве

accomplish [əˈkɑ:mplɪʃ] v.t. 1. дасяга́ць, выко́нваць (*абяца́ньне, плян*): ***Did you accomplish your purpose?*** Ці вы дасягну́лі сваёй мэ́ты? 2. рабі́ць; канча́ць: ***John can accomplish more in a day than any other boy in his class*** Янка за дзень мо́жа зрабі́ць больш, чым які́ і́ншы хлапе́ц у кля́се

accomplished [əˈkɑ:mplɪʃt] adj. 1. вы́кананы, зро́блены; зако́нчаны. 2. высо́какваліфікава́ны; выда́тны, таленавіты, дасканалы: ***an accomplished surgeon*** выда́тны хіру́рг. 3. до́бра вы́хаваны *або* адукава́ны: ***an accomplished host*** ве́тлівы гаспада́р

accomplishment [əˈkɑ:mplɪʃmənt] n. 1. дасягне́ньне, выкана́ньне, завяршэ́ньне *n.*: ***The teacher was proud of her pupils' accomplishments*** Наста́ўніца ганары́лася дасягне́ньнямі сваіх ву́чняў. 2. дасягне́ньне, зьдзе́йсьненьне *n.*: ***The accomplishment of his purpose took three months*** Дасягне́ньне мэ́ты заняло́ яму́ тры ме́сяцы

accord [əˈkɔ:rd] – v.i. быць у зго́дзе, згаджа́цца, пагаджа́цца: ***His account of the accident accords with yours***

Ягóны раскáз пра вы́падак згаджáецца з твaíм
– v.t. удзяля́ць; выкáзваць: ***to accord praise for good work*** вы́казаць пахвалу́ за дóбрую прáцу
– n. 1. згóда *f.*; сулáдзьдзе *n.*, сулáднасьць; сугу́чнасьць, гармóнія *f.* 2. умóва, дамóва *f.*, пагаднéньне *n.*: ***an accord with France*** умóва з Фрáнцыяй. 3. Law дабраахвóтнае пагаднéньне *m.*. 4. гармóнія *f.*, сулáдзьдзе кóлераў *абó* тóнаў
• ***in accord*** у згóдзе, згóдна: ***to live in accord*** жыць у згóдзе
• ***of one's own accord*** із свaé сóбскай вóлі, ахвóты
• ***with one accord*** аднадýмна, аднамы́сна

accordance [əˈkɔ:rdəns] n. згóднасьць; адпавéднасьць *f.*: ***in accordance with*** адпавéдна да чагó; згóдна з *чым*. 2. надáньне, дараванáньне *n.*: ***accordance of privilege*** надáньне прывілéю

accordant [əˈkɔ:rdənt] adj. згóдны *з чым*, адпавéдны *чамý*

according [əˈkɔ:rdɪŋ] adv. 1. а) павóдле *чагó*; згóдна *з чым*: ***according to the law*** згóдна з закóнам; ***according to this book*** павóдле гэ́тае кнíгі. 2. залéжна, як; накóлькі; адпавéдна да: ***according as we have the courage*** залéжна ад тагó, накóлькі ў нас адвáгі

accordingly [əˈkɔ:rdɪŋli] adv. адпавéдна; такíм чы́нам; дзéля гэ́тага: ***to act accordingly*** захóўвацца адпавéдна

accordion [əˈkɔ:rdiən] n. акардыён -а *m.*

accordionist [əˈkɔ:rdiənɪst] n. акардыяні́ст -а, гарманíст -а *m.*; акардыяні́стка, гарманíстка *f.*

accost [əˈkɔ:st] v.t. затры́мваць *кагó*, загавóрваць *да кагó*, прычапля́цца *да кагó*: ***I was accosted by a stranger*** Мянé зачапíў незнаёмы

accouche [əˈku:ʃ] v.i. прымáць рóды

accouchement [əˈku:ʃmɑ:nt] n. рóдлы -аў *pl. only*. 2. прыняцьцё рóдаў

account [əˈkaʊnt] – n. 1. раскáз -у *m.*, апісáньне *n.*; падрабя́зная справаздáча; тлумачэ́ньне *n.*: ***Please give me an account of everything*** Калí лáска, раскажэ́це мне пра ўсё; ***satisfactory account*** задавальня́ючае, дастаткóвае тлумачэ́ньне. 2. рахýнлак -ку *m.* (*у банку*): ***current account*** бягýчы рахýнак; ***joint account*** супóльны рахýнак. 3. лік -ку, падлíк -у, рахýнлак -ку *m.*, разрахýнлак -ку *m.*: ***to keep a written account of one's spending*** запíсваць свaé выдáткі. 4. вáжнасьць, вáртасьць; кары́сьць *f.*: ***of no account*** бяз знáчаньня (вáртасьці); ***to be of little account*** мець малýю вáртасьць; ***To turn one's time to good account*** Дóбра вы́карыстаць свой час.
– v.i. 1. (for) тлумáчыць: ***This accounts for his behavior*** Гэ́тым тлумáчацца ягóныя павóдзіны. 2. здавáць справаздáчу: ***You will have to account to the auditor*** Табé трэ́ба бýдзе даць справаздáчу аўды́тару
• ***bring to account*** паклíкаць да адкáзнасьці *кагó*
• ***by all accounts*** на агýльную дýмку
• ***call to account*** запатрабавáць тлумачэ́ньня
• ***give a good (bad) account of oneself*** дóбра (блáга) сябé зарэкамэндавáць
• ***keep account of*** вéсьці рахýнак
• ***of no account*** неістóтны
• ***of some account*** вáжны, істóтны, аўтарытэ́тны
• ***on account of*** з прычы́ны, дзéля *кагó-чагó*: ***The game was put off on account of rain*** Гульня́ былá адклáдзеная дзéля дажджý
• ***on my (his) account*** дзéля мянé (ягó): ***Don't stay home on my account*** Не сядзí дóма дзéля мянé
• ***on no account*** ні ў я́кім рáзе
• ***on one's own account*** на свaю́ ры́зыку на свaю́ адкáзнасьць
• ***take account of*** а) брaць пад увáгу *што*, лічы́цца *з чым*. б) заўважáць; улíчваць

• ***take into account*** лічы́цца з *кім-чым*, браць пад ува́гу
• ***turn to account*** павярну́ць на сваю́ кары́сьць

accountability [əˌkaʊntəˈbɪlətɪ] n. адка́знасьць, справаздача́снасьць *f.*

accountable [əˈkaʊntəbəl] adj. 1. адка́зны (*пе́рад кім за што*): ***Each person is accountable for his own work*** Ко́жны чалаве́к адка́зны за сваю́ пра́цу; ***He is accountable to his superior*** Ён адка́зны пе́рад сваі́м нача́льствам. 2. вытлумача́льны: ***His bad temper is easily accountable: he has had a toothache all day*** Ягоны благі́ настро́й лёгка вы́тлумачыць: уве́сь дзень яму́ бале́ў зуб

accountancy [əˈkaʊntənsɪ] n. пра́ца бухга́льтара, рахункаво́да; вядзе́ньне раху́нкаў, рахункаво́дзтва

accountant [əˈkaʊntənt] n. бухга́льтар, рахункаво́д -а *m.*

accounting [əˈkaʊntɪŋ] n. рахункаво́дзтва *n.*, бухга́льтарская спра́ва

accouter [əˈku:tər] v.t. экіпава́ць, надзя-ля́ць рышту́нкам: ***Knights were accoutered in armor*** Ры́цары насі́лі па́нцыр

accouterments [əˈku:tərmənts] n., pl. 1. жаўне́рскі рышту́нlак -ку *m.* (*за вы́няткам збро́і й адзе́ньня*): ***A belt, blanket and knapsack are parts of a soldier's accouterments*** Папру́га, ко́ўдра й напле́чнік — ча́сткі жаўне́рскага рышту́нку. 2. асаблівыя рэ́чы *pl.*

accredit [əˈkredɪt] v.t. 1. (with) прыпі́сваць *каму́ што*; прызнава́ць: ***I accredited him with more sense than he deserves*** Я прызна́ў яму́ больш глу́зду, чым ён заслугоўвае; ***We accredit the invention of the telephone to Alexander Graham Bell*** Вынахо́дзтва тэлефо́ну мы прыпі́сваем Аляксандру Грэ́ему Бэ́лу. 2. упаўнава́жваць, прызнача́ць: ***The president of the club will accredit you as his assistant*** Старшыня́ клю́бу прызна́чыць Вас сваі́м засту́пнікам. 3. акрэдытава́ць, прызнача́ць дыпляматы́чным прадстаўні́ко́м: ***An ambassador is accredited as the representative of his country in a foreign land*** Амбаса́дар прызнача́ецца дыпляматы́чным прадстаўні́ко́м сваé дзяржа́вы ў заме́жным кра́і. 4. прыма́ць за праўдзі́вае; дава́ць ве́ру; давяра́ць. 5. агу́льна *або́* афіцы́йна прыма́ць, рэкамэндава́ць

accreditation [əˌkredɪˈteɪʃən] n. акрэдыта́цыя *f.*

accredited [əˈkredɪtɪd] adj. агу́льна *або́* афіцы́йна прызна́ны: ***an accredited authority in mathematics*** агу́льнапрызна́ны аўтарыте́т у матэма́тыцы: ***accredited school*** шко́ла прызна́ная адпаве́днымі ўла́дамі

accrete [əˈkri:t] – v.i. 1. зраста́цца. 2. нараста́ць. 3. выклі́ка́ць зраста́ньне
– adj. Bot. зро́слы

accretion [əˈkri:ʃən] n. 1. нараста́ньне *n.*; прыро́ст -у *m.*, павелічэ́ньне паме́рам. 2. зраста́ньне *n.* 3. прыро́ст -у; дада́тlак -ку *m.* 4. Geol. нано́с зямлі́

accrual [əˈkru:əl] n. нараста́ньне *n.*; прыро́ст -у *m.*: ***Money left in a savings bank increases by the accrual of interest*** Гро́шы, пакла́дзеныя ў банк, расту́ць у вы́ніку нараста́ньня працэ́нтаў

accrue [əˈkru:] v.i. 1. выраста́ць; бо́льшыцца. 2. нараста́ць (*пра працэ́нты*)
• ***accrued income*** зарóблены, але́ не атрыма́ны прыбы́так
• ***accrued interest*** наро́слыя, але́ ня вы́плачаныя працэ́нты

acculturation [əˌkʌltʃəˈreɪʃən] n. акульту-ра́цыя *f.*, засваéньне і́ншай культу́ры

accumulate [əˈkju:mjəleɪt] – v.t. 1. зьбі-ра́ць; назапа́шваць; набыва́ць; памнажа́ць: ***He accumulated a fortune by hard work*** Цяжко́ю пра́цаю ён сабра́ў бага́цьце
– v.i. набіра́цца; нагрува́шчвацца; зьбіра́цца: ***Dust and cobwebs accu-***

mulated in the empty house Пыл і павуці́ньне назьбіра́ліся ў пусты́м до́ме

accumulation [əˌkju:mjəˈleɪʃən] n. 1. нагрува́шчаньне; назапа́шваньне, зьбіра́ньне, памнажэ́ньне; набіра́ньне *n.* 2. прыро́ст -у *m.* (*капіта́лу*)

accumulative [əˈkju:mjəleɪtɪv] adj. нараста́льны

accumulator [əˈkju:mjəleɪtər] n. акумуля́тар-а *m.*

accuracy [ˈækjərəsi] n. акура́тнасьць, дакла́днасьць *f.*

accurate [ˈækjərət] adj. акура́тны, дакла́дны: ***You must be accurate in arithmetic*** У арытмэ́тыцы трэ́ба быць дакла́дным

accursed [əˈkɜ:rst] adj. 1. пракля́ты. 2. асу́джаны, зганьбава́ны

accusal [əˈkju:zəl] n. абвінава́чаньне *n.*

accusation [ˌækjuˈzeɪʃən] n. 1. абвінава́чаньне *n.* 2. за́кід -у *m.*: ***What is the accusation against me?*** Якó́е супро́ць мяне́ абвінава́чаньне?

accusative [əˈkju:zətɪv] n., Gram. вінава́льны склон

accusatory [əˈkju:zətɔ:ri] adj. вінава́льны, вінава́ўчы, абвінава́ўчы: ***an accusatory glance*** вінава́ўчы по́зірк

accuse [əˈkju:z] v.t. 1. абвінава́чваць, вінава́ціць: ***to accuse a person of theft*** абвінава́ціць чалаве́ка ў зладзе́йстве. 2. зва́льваць віну, вінава́ціць

accused [əˈkju:zd] adj. абвінава́чаны -ага *m.*, абвінава́чаная *f.*

accuser [əˈkju:zər] n. абвінава́ўца *m. & f.*

accustom [əˈkʌstəm] v.t. (to) прызвыча́йваць, прывуча́ць

accustomed [əˈkʌstəmd] adj. прывы́клы, звыча́йны: ***Take your accustomed place*** Займі́ сваё звыча́йнае ме́сца

• ***accustomed to*** прызвыча́ены *да чаго́*: ***He was accustomed to hard work*** Ён быў прызвыча́ены да цяжко́е пра́цы

ace [eɪs] – n. 1. во́чка *n.* (*у гульні́*). 2. туз -за́ *m.* (*ка́рта*). 3. неадбі́ўная пада́ча (*у тэ́ніce*). 4. ас -а *m.*, ма́йстар -ра *m.* (*асабл. лётчык*). 5. Figur. кры́ха *f.*: ***not an ace*** ані́ кры́хі; ***within an ace*** на валасо́к ад, ледзь не

– v.t. зарабі́ць пункт у гульні́

acerbate [ˈæsərˈbeɪt] v.t. 1. рабі́ць кі́слым, да́ўка-кі́слым, го́ркім. 2. Figur. злава́ць; раздражня́ць; выклі́ка́ць го́рыч

acerbic [əˈsɜ:rbɪk] adj. 1. кі́слы, да́ўкі: ***an acerbic substance*** кі́слае рэ́чыва. 2. Figur. рэ́зкі, зье́длівы

acerbity [əˈsɜ:rbəti] n., pl. **-ties** 1. гаркава́тая кісьліня́; да́ўкасьць *f.* 2. Figur. зье́длівасьць, рэ́зкасьць *f.*

acetate [ˈæsəteɪt] n. 1. Chem. ацэта́т -у *m.* 2. ацэта́тнае валакно́ *n.*

acetic [əˈsi:tɪk] adj. Chem. во́цатны: ***acetic acid*** во́цатная кіслата́

acetification [əˌsɪtɪfəˈkeɪʃən] n. ператвара́ньне ў во́цат *або́* во́цатную кіслату́

acetify [əˈsetɪfaɪ] v.t. **-fied, -fying** Chem. ператвара́ць ў во́цат або́ во́цатную кіслату́

acetone [ˈæsətoʊn] n. ацэто́н -у *m.*

acetous [ˈæsətəs] adj. 1. во́цатны. 2. кі́слы

acetylene [əˈsetəli:n] n. ацэтыле́н -у *m.*

Achaean [əˈki:ən] – adj. ахе́йскі

– n. ахе́лец -йца *m.* (*грэк*)

ache [eɪk] – n. бо́ль (*праця́жны, тупы́*): ***I have a stomach ache*** мне бале́ць жывóт

– v.i. 1. боле́ць; тужы́ць, шчыме́ць бо́лем (*сэ́рца, душа́*): ***My back aches*** Мне бале́ць сьпі́на. 2. Informal пра́гнуць; мо́цна хаце́ць: ***During the hot days we ached to go swimming*** Гара́чымі дня́мі нам мо́цна хаце́лася ісьці́ пла́ваць; ***She aches for home*** Яна́ мо́цна сумуе́ па ха́це

• ***aches and pains*** бо́лі й недамага́ньні

achieve [əˈtʃi:v] v.t. 1. рабі́ць; выко́нваць: ***Did you achieve all that you expected to today?*** Ці ты зрабі́ў сёньня ўсё то́е, што спадзява́ўся? 2. дасяга́ць; здабыва́ць: ***He achieved fame as a swimmer*** Ён здабы́ў сла́ву плыўца́

achievement [əˈtʃi:vmənt] n. 1. дасягне́ньне *n.*: ***the achievement of one's***

aim дасягне́ньне сваé мэ́ты. 2. здабы́так -ку; по́сьпех -у *m.*: ***It was a great achievement*** Гэ́та было́ вялі́кім здабы́ткам; ***achievement test*** экза́мен пасьпяхо́васьці

Achillean [ˌækɪˈliːən] adj. Myth. Ахілéсаў

Achilles [əˈkɪliːz] n. Ахілéс -а *m.*; ***Achilles' heel*** ахілéсава пятá

aching [ˈeɪkɪŋ] adj. балю́чы, шчымлі́вы

achromatic [ˌækrəˈmætɪk] adj. 1. ахраматы́чны. 2. бяскó́лерны

achromatism [eɪˈkroʊməˌtɪzəm] n. 1. ахраматы́зм -у *m.* 2. бяскó́лернасьць *f.*

achy [ˈeɪkɪ] adj. балю́чы, по́ўны бо́лю

acid [ˈæsɪd] – n. 1. кі́сьліна *f.*; кі́слае рэ́чыва *n.*. 2. Chem. кіслатá *f.*

– adj. 1. кі́слы; сквáшаны; во́йстры: ***Lemon is an acid fruit*** Лімон — кі́слы фрукт. 2. Figur. зло́сны, во́йстры, зьдзе́кліві: ***an acid tongue*** во́йстры язы́к; ***acid looks*** кі́слая мі́на. 3. Chem. кісло́тны; кі́слы: ***acid radical*** кісло́тны радыка́л

acidness [ˈæsɪdnəs] n. кісло́тнасьць, кісьліня́ *f.*

acid-fast [ˌæsɪdˈfæst] adj. кісло́тнатрыва́лы (*ко́лер*)

acidic [əˈsɪdɪk] adj. 1. кісло́тны: ***acidic ions*** кісло́тныя іёны. 2. кі́слы: ***acidic rock*** кі́слая паро́да

acidify [əˈsɪdɪfaɪ] – v.t. **-fied, -fying** 1. ква́сіць, заква́шваць. 2. ператвара́ць (-ца) ў кі́сьліну

– v.i. кі́снуць

acidity [əˈsɪdɪtɪ] n., pl. **-ties** 1. кісьліня́ *f.* 2. кісло́тнасьць *f.*; кісьлі́ннасьць *f.*: ***the acidity of a soil*** кісьлі́ннасьць гле́бы.

acidophilous milk [æsɪˈdɑːfɪləs] ацыдафілі́н -у *m.*

acid-proof [ˈæsɪdpruːf] adj. кісло́татрывáлы, кісьлі́натрывáлы

acid-tongued [ˈæsɪdtʌŋd] adj. зье́длівы, ірані́чны, саркасты́чны

acknowledge [əkˈnɑːlɪdʒ] v.t. 1. прызнава́ць: ***to acknowledge defeat*** прызна́ць пара́зу. 2. пацьвярджа́ць (*атрыма́ньне*). 3. выка́заць удзя́чнасьць: ***Mary acknowledged the gift with a pleasant letter*** Марыя адгукну́лася на падару́нак прыéмным лісто́м. 4. адказа́ць: ***He acknowledged the greeting with a nod*** На прывіта́ньне ён адказа́ў ківо́м галавы́. 5. Law прызнава́ць праўдзі́вым; засьве́дчваць, пасьве́дчваць; зацьвярджа́ць: ***to acknowledge a deed before the notary public*** зацьве́рдзіць ку́пчую ў ната́рыюса

acknowledg(e)ment [əkˈnɑːlɪdʒmənt] n. 1. пацьве́рджаньне *n.*: ***A receipt is an acknowledgment that a bill has been paid*** Паквітава́ньне ёсьць пацьве́рджаньнем, што раху́нак запла́чаны. 2. падзя́ка *f.*, выказа́ньне падзя́кі: ***acknowledgment of her kindness*** падзя́ка за яé ве́тлівасьць. 3. прызна́ньне *n.*: ***acknowledgment of a mistake*** прызна́ньне памы́лкі

aclinic [əˈklɪnɪk] adj. без магні́тнага нахі́лу: ***aclinic line*** магні́тны эква́тар, аклінічная крыва́я

acme [ˈækmi] n. верх -у *m* .; вяршы́ня *f.*, зэні́т -у *m.*: ***the acme of the development*** вяршы́ня разьвіцьця́; ***the acme of the skill*** верх спра́ўнасьці

acne [ˈækni] n. 1. прышчы́ *pl.*. 2. Med. запале́ньне тлу́шчавых зало́заў

acock [əˈkɑːk] – adj. ссу́нуты набо́к

– adv. набáкір, на́бак, набо́к: ***to put a hat acock*** надзе́ць капялю́ш набáкір

acolyte [ˈækəlaɪt] n. 1. Relig. прыслу́жнік -а, псало́мшчык -а *m.* 2. асыстэ́нт -а; памага́тыы -ага *m.*

aconite [ˈækənaɪt] n. 1. Bot. мардо́ўнік -у *m.* 2. аканíт -у *m.* (*атру́тны лек для зьнячу́льваньня бо́лю*)

acorn [ˈeɪkɔːrn] n. жо́луд -а *m.*, *pl.* жалуды́

acoustic [əˈkuːstɪk] adj. 1. акусты́чны. 2. слыхавы́: ***acoustic nerve*** слыхавы́ нэрв. 3. гукавы́. 4. гуканепранікáльны: ***acoustic plaster*** гуканепранікáльны тынк

acoustic mine акусты́чная мі́на (*яка́я разрыва́ецца ад гу́ку*)

acoustic waves гукавы́я хвáлі

acoustics [əˈku:stɪks] n., pl. 1. акýстыка, акустычнасьць *f.*: ***The acoustics were so good that people in the last row could hear the speaker well*** Акýстыка былá такáя дóбрая, што людзі ў апóшнім рáдзе маглí дóбра чуць прамóўцу. 2. акýстыка *f.* (*навýка пра гýкі*)

acquaint [əˈkweɪnt] v.t. знаёміць; інфармаваць: ***Let me acquaint you with your new duties*** Дазвóльце пазнаёміць вас з вáшымі нóвымі абавязкамі; ***Acquaint him with your scheme*** Паінфармýйце ягó, якí ваш плян

• ***be acquainted with*** 1. быць знаёмым *з кім-чым*. 2. вéдаць пра *што*; быць азнаёмленым: ***I am acquainted with his plans*** Я вéдаю пра ягóныя плянý;

• ***become acquainted with*** пазнаёміцца *з кім-чым*

acquaintance [əˈkweɪntəns] n., pl. **-ances** 1. знаёмы -ага *m.*, знаёмая *f.*: ***He had many acquaintances but few friends*** Ён меў шмат знаёмых, áле мáла прыяцеляў. 2. знаёмства; вéданьне *n.*: ***I have some acquaintance with French, but I do not know it well*** Я крыху́ знаёмы з францýскай мóвай, але ня вéдаю яé дóбра; ***a man of wide acquaintance*** чалавéк з шырóкімі знаёмствамі

• ***cultivate the acquaintance of someone*** старáцца пазнáць кагóсь дóбра

• ***make the acquaintance of*** пазнаёміцца *з кім-чым*; пазнáць *кагó-што*

acquaintanceship [əˈkweɪntənsʃɪp] n. знаёмства, вéданьне *n.*: ***Their acquaintanceship lasted many years*** Іхнае знаёмства трывáла шмат гадóў

acquiesce [ˌækwiˈes] v.i. пагаджáцца; згаджáцца (*моўчкі або неахвотна*): ***We acquiesced in their plan because we could not suggest a better one*** Мы пагадзíліся зь íхным плянам, бо не маглí запрапанавáць лéпшага

acquiescence [ˌækwiˈesəns] n. маўклíвая згóда *f.*

acqiescent [ˌækwiˈesənt] adj. згóдны; устýплівы; згавóрлівы

acquire [əˈkwaɪr] v.t. 1. набывáць; нажывáць, прыдбáць: ***to acquire land*** набы́ць зямлю́. 2. здабывáць: ***He acquired an education*** Ён здабы́ў асьвéту

acquirement [əˈkwaɪrmənt] n. 1. набыццё, здабыццё *n.*: ***the acquirement of wealth*** здабыццё багáцьця. 2. дасягнéньне *n.*: ***Her musical acquirements are remarkable*** Ейныя дасягнéньні ў галінé мýзыкі незвычáйныя

acquisition [ˌækwɪˈzɪʃən] n. 1. набыццё *n.*; кýпля *f.*; прыдбáньне *n.*: ***With the acquisition of ten rare books, the collection is unmatched*** Пасьля́ набыцця́ дзесяцёх рэ́дкіх кнíгаў гэ́тая калéкцыя ня мáе сабé рóўнай. 2. набы́так -ку *m.*: ***The latest acquisition is a painting by Rubens*** Апóшнім набы́ткам ёсьць карцíна Рýбэнса

acquisitive [əˈkwɪzətɪv] adj. прáгны, прагавíты: ***A miser is acquisitive of money*** Скнáра прáгны на грóшы

acquit [əˈkwɪt] v.t. **-quitted, -quitting** 1. апрáўдваць; прызнавáць невінавáтым: ***The jury acquitted the innocent man*** Прысяжны́я апраўдáлі невінавáтага чалавéка. 2. сплóчваць: ***to acquit a debt*** сплаціць доўг. 3. звальня́ць ад абавя́зку, забавя́заньня; ***to acquit oneself*** справíцца; даць рáды

acquittance [əˈkwɪtəns] n. 1. сплáта дóўгу, выканáньне забавязáньня. 2. звальнéньне ад дóўгу *ці* забавязáньня. 3. паквітавáньне на вы́плачаную сýму

acre [ˈeɪkər] n. ákap, ákра *m.*

• ***acres*** , pl. а) абшáры, зямéльная сóбскасьць. б) Informal вялíкая кóлькасьць: ***acres of money*** шмат грóшай

• ***God's acre*** мóгілкі -аў *pl. only.*, цьвінтáр -á *m.*

acreage [ˈeɪkərɪdʒ] n. 1. плóшча ў ákрах: ***The acreage in square miles is 640 acres*** Плóшча квадрáтнай мíлі — 640 ákраў. 2. парцэляцыйны абшáр

acrid [ˈækrɪd] adj. 1. е́дкі; во́йстры; го́ркі. 2. Figur. зье́длівы; ро́зкі: ***an acrid disposition*** зье́длівая нату́ра

acridity [əˈkrɪdəti] n., pl. **-ties** 1. е́дкая го́рыч. 2. зье́длівасьць *f.*; зье́длівая нату́ра

acrimonious [ˌækrɪˈmoʊniəs] adj. во́йстры; ро́зкі, зье́длівы: ***acrimonious words*** во́йстрыя сло́вы

acrimony [ˈækrəmoʊni] n., pl. **-nies** зье́длівасьць, ро́зкасьць *f.* (*у сло́вах, мане́рах*)

acrobat [ˈækrəbæt] n. акраба́т -а *m.*, акраба́тка *f.*

acrobatic [ˌækrəˈbætɪk] adj. акрабаты́чны

acrobatics [ˌækrəˈbætɪks] n., pl. 1. акраба́тыка *f.*, акрабаты́чныя вы́круты; акрабаты́чная гімна́стыка *f.*: ***The children were delighted by the monkey's acrobatics*** Дзе́ці захапля́ліся вы́крутамі ма́лпы

acronym [ˈækrənɪm] n. акро́нім -у *m.*

acrophobia [ˌækrəˈfoːbɪə] n. акрафо́бія *f.* (*страх пе́рад вышынёю*)

acropolis [əˈkrɑːpəlɪs] n. акро́пал|ь -ю *m.*

across [əˈkrɔːs] – prep. праз, це́раз, на другі́ бок: ***A bridge was laid across the river*** Праз раку́ пабудава́лі мост. 2. за; на другі́м баку́: ***lands across the sea*** замо́рскія краі́

– adv. 1. ад аднаго́ бо́ку да другі́га; упо́перак, насу́праць: ***What is the distance across?*** Яка́я адле́гласьць ад аднаго́ кра́ю да другі́га? 2. на́крыж: ***with arms across*** з рука́мі на́крыж; ***across the country*** праз усю́ краіну; ***to go across the country*** падаро́жнічаць па краі́не

• ***come/run across*** а) натра́піць, нечака́на сустрэ́ць: ***I ran across an old friend in the city yesterday*** Я нечака́на сустрэ́ў старо́га ся́бру ў́чо́ра ў го́радзе. б) дахо́дзіць, даво́дзіць: ***His ideas didn't come across to the students*** Яго́ныя ду́мкі не дайшлі́ да студэ́нтаў

acrostic [əˈkrɔːstɪk] n. акраве́рш -у *m.*

acrylic [əˈkrɪlɪk] – n. акры́лік -у *m.*, акры́лавая сынтэты́чная ма́са; акры́лавая ткані́на

– adj. 1. акры́лавы. 2. атрыма́ны з акры́лавае кіслаты́

acrylic acid акры́лавая кіслата́

acrylic fiber акры́лавае валакно́

acrylic resins акры́лавыя смо́лы

act [ækt] – n. 1. учы́нак -ку *m.*: ***an act of kindness*** учы́нак міласэ́рнасьці. 2. працэ́с -у *m.*: ***in the act of*** у працэ́се *чаго́*; ***in the very act of writing these words*** якра́з калі́ пісаліся гэ́тыя сло́вы. 3. а) дзе́я *f.*, акт -у *m.* б) ну́мар у цы́рку, вар'етэ́ *n.* 4. пастано́ва парля́мэнту, акт -у; дакумэ́нт -у *m.*: ***Independence Act*** Акт Незале́жнасьці. 5. удава́ньне *n.*: ***to put on an act*** удава́ць; рабі́ць вы́гляд

– v.i. 1. дзе́яць: ***to act promptly*** дзе́яць неадкла́дна. 2. трыма́цца: ***She acts as if she were tired*** Яна́ захо́ўваецца, ні́быта была́ зму́чаная. 3. удава́ць; прыкі́двацца, прыкіда́цца: ***Her anger is not genuine; she is acting*** Злосьць е́йная не сапра́ўдная, яна́ то́лькі так прыкіда́ецца. 4. гра́ць на сцэ́не: ***He acts very well*** Ён ве́льмі до́бра гра́е

– v.t. гра́ць ро́лю: ***to act Macbeth*** гра́ць ро́лю Макбэ́та

• ***act as*** выко́нваць фу́нкцыю

• ***act for*** заступа́ць *каго́*, дзе́яць ад не́чыйга імя

• ***act on (upon)*** а) дзе́яць *паво́дле чаго*; б) дзе́яць *на што*: ***Yeast acts on dough and makes it rise*** Дро́жджы дзе́юць на це́ста, і це́ста падыхо́дзіць

• ***act up,*** Informal а) дрэ́нна захо́ўвацца. б) свавóліць, капры́сіць

acting [ˈæktɪŋ] adj. выкана́льнік абавя́зкаў: ***acting chief*** выкана́льнік абавя́зкаў кіраўніка́

action [ˈækʃən] n. 1. дзе́яньне *n.*; за́хады *pl.*: ***a machine in action*** машы́на працу́е; дзе́е; ***to take prompt action*** зрабі́ць ху́ткія за́хады. 2. дзе́йнасьць *f.*: ***a man of action*** энэргі́чны чалаве́к.

3. учы́нlак -ку *m.*:***a kind action*** до́бры ўчы́нак. 4. узьдзе́яньне *n.* 5. болй -ю *m.*, бітва́ *f.*; змага́ньне *n.*: ***to be wounded in action*** быць ра́неным у баі. 6. суд о́вая спра́ва, суд -у *m.*; хо́даньне *n.*: ***to bring an action against*** пада́ць каго́ на суд; судзі́цца *з кім.* 7. дзе́яньне п'е́сы, рама́ну

• ***actions*** учы́нкі *pl.*; трыма́ньне *n.*, паво́дзіны *pl.*: ***Actions speak louder than words*** Учы́нкі мацне́йшыя за сло́вы

• ***out of action*** нядзе́йны, сапсава́ны

• ***put out of action*** вы́весьці са стро́ю, зь дзе́йнасьці; пашко́дзіць; сапсава́ць

• ***see action*** браць удзе́л у бі́тве

• ***take action*** а) стаць дзе́йным. б) пача́ць працава́ць. в) пача́ць судзі́цца, пада́ць на суд

actionless [ˈækʃənləs] adj. бязьдзе́йны; нерухо́мы; інэ́ртны

activate [ˈæktɪveɪt] v.t. 1. актывізава́ць. 2. Phys. рабі́ць ра́дыяакты́ўным. 3. Chem. актывізава́ць (*рэа́кцыю*)

activator [ˈæktɪveɪtər], n. стымуля́тар -а, узбуджа́льнік -а *m.*

active [ˈæktɪv] – adj. 1. руха́вы, жва́вы; энэргі́чны; непасе́длівы. 2. акты́ўны, ажы́ўлены: ***an active market*** ажы́ўлены ры́нак. 3. дзе́йны; акты́ўны: ***an active volcano*** дзе́йны вулька́н; ***to take an active part*** браць дзе́йны ўдзе́л; ***on active duty*** на дзе́йнай слу́жбе. 4. Gram. ***active voice*** дзе́йны стан

– n. 1. дзе́йны стан. 2. актыві́ст -а, акты́лў -ву *m.*

activism [ˈæktɪˌvɪzəm] n. актывізм -у *m.*

activist [ˈæktɪvɪst] n. 1. актывіст -а *m.* 2. прыхі́льнік тэо́рыі актывізму

activity [ækˈtɪvəti] n., pl. **-ties** 1. дзе́йнасьць, акты́ўнасьць *f.*; рух -у *m.*: ***no activity in the market*** засто́й на ры́нку. 2. дзе́яньне *n.*, дзе́йнасьць *f.*: ***the activities of enemy spies*** дзе́йнасьць варо́жых шпіёнаў

• ***activities,*** pl. заня́ткі, дзе́йнасьць: ***student's outside activities*** пазашко́льная дзе́йнасьць ву́чня; ***social activities*** грама́дзкая дзе́йнасьць

actor [ˈæktər] n. 1. акто́р -а, арты́ст -а *m.* 2. дзе́йнік -а *m.*

actress [ˈæktrəs], n. акто́рка, арты́стка *f.*

actual [ˈæktʃuəl] adj. 1. сапра́ўдны, рэчаі́сны, фактычны: ***an actual happening*** сапра́ўднае здарэ́ньне. 2. цяпе́рашні, суча́сны: ***the actual state of affairs*** цяпе́рашні стан спра́ваў

actuality [ˌæktʃuˈæləti] n., pl. **-ties** 1. рэчаі́снасьць, рэа́льнасьць *f.* 2. рэа́льная рэч, факт -у *m.*

actualize [ˈæktʃuəlaɪz] v.t. зьдзяйсьня́ць, рэалізава́ць

actually [ˈæktʃuəli] adv. сапраўды́, фактычна; у сапра́ўднасьці: ***Are you actually going to Belarus?*** Ці вы напра́ўду е́дзеце ў Белару́сь?

actuate [ˈæktʃueɪt] v.t. 1. ру́хаць, пушча́ць у ход: ***The pump is actuated by an electric motor*** По́мпу ру́хае электры́чны мато́р. 2. падахво́чваць, схіля́ць; стымулява́ць да дзе́яньня, узбуджа́ць, уплыва́ць

acuity [əˈkju:əti] n. вастрыня́ *f.*: ***acuity of hearing*** вастрыня́ слы́ху.

acumen [ˈækjʊmən] n. ке́млівасьць, ця́млівасьць, прані́клівасьць *f.*

acuminate [əˌkju:mɪnət] – adj. во́йстры, во́йстраканцо́вы, заво́йстраны; сьпічаста́: ***a leaf with an acuminate tip*** ліст з во́йстрым ко́нчыкам

– v. [əˈkju:mɪneɪt] завайстра́ць

acupuncture [ˈækjəˌpʌŋktʃər] n. акупункту́ра *f.*, лячэ́ньне го́лкамі

acute [əˈkju:t] adj. 1. во́йстры; мо́цны, прані́зьлівы: ***acute pain*** прані́зьлівы боль; ***acute sight*** во́йстры зрок; ***an acute sense of smell*** во́йстрае чуцьцё нюху. 2. прані́клівы, назіра́льны; ке́млівы: ***an acute observer*** прані́клівы назіра́льнік. 3. ве́льмі высо́кі; прані́зьлівы: ***acute sounds*** прані́зьліва высо́кія гу́кі. 4. крыты́чны, пагража́льны: ***an acute fuel shortage*** крыты́чны недахо́п па́ліва. 5. Geom. во́йстры: ***acute angle*** во́йстры кут

• ***acute accent*** акýт -у *m.*, прáвы нáціск (´)

ad [æd] n., Informal рэкля́мная абве́стка

A.D. or AD [ˌeɪˈdi:] *гл.* **anno Domini**

adage [ˈædɪdʒ] n. пры́казка *f.*, выслóўе *n.*

Adam [ˈædəm] n. Адáм -а *m.* (*пе́ршы чалаве́к*)

• ***Adam's apple*** Адáмаў я́блык, гарля́к -á, кады́к -а *m.*

• ***the old Adam*** людзкáя схíльнасьць да грахý

adamant [ˈædəmənt] – adj. 1. непахíсны, нязлóмны, мóцны. 2. вéльмі цьвярды́, непарýшны

– n. вéльмі цьвярдóе цéла, рэ́чыва

adamantine [ˌædəˈmænti:n] adj. вéльмі цьвярды́, стóйкі

adapt [əˈdæpt] v. 1. прыстасóўваць; прыла́джваць, падганя́ць: ***to adapt oneself to the new job (environment)*** прыстасава́цца да нóвае прáцы (асярóдзьдзя). 2. адаптава́ць; перарабля́ць: ***to adapt a novel*** перарабíць раман (*у п'éсу абó ў фíльм*)

adaptation [ˌædæpˈteɪʃən] n. 1. прыстасава́ньне *n.*; адапта́цыя *f.*: ***the adaptation of the eye*** адапта́цыя вóка; ***Wings are adaptations of upper limbs for flight*** Кры́лы — гэ́та вéрхнія канéчнасьці, прыстасава́ныя да лёту. 2. перарóбка *f.*: ***A motion picture is often an adaptation of a novel*** Фíльм чáста бывáе адапта́цыяй рама́ну

adapter or **adaptor** [əˈdæptər] n. 1. прыстасава́льная прыла́да. 2. Mech. ада́птэр -а, перахаднíк -á *m.*

adaptive [əˈdæptɪv] adj. прыстасава́льны

add [æd] – v.t. 1. дадава́ць: ***to add taste*** дада́ць сма́ку. 2. дакладáць, падкладáць: ***Add more wood to the fire*** Падкладзí больш дрóваў на агóнь. 3. даліва́ць, падліва́ць; далíць, падлíць: ***Add some milk*** Далí малакá. 4. дасыпáць, падсыпáць: ***to add some sugar*** падсы́паць цýкру. 5. дапíсваць: ***to add a few lines*** дапісáць кóлькі радкóў. 6. Math. складáць, дадава́ць

– v.i. 1. дадава́ць: ***The fine day added to the pleasure of the picnic*** Прыгóжы дзень дадáў прыéмнасьці да пíкніку. 2. складáць: ***to learn to add and subtract*** вучы́цца дадава́ць і адыма́ць

• ***add in*** улучáць (-ца); зьмяшчáць (-ца)

• ***add up*** знайсьцí сýму (*кóлькіх лíкаў*)

• ***add up to***, Informal дава́ць у сýме, раўня́цца

addendum [əˈdendəm] n., pl. **-da** l. дадáтак -ку *m.*

adder I [ˈædər] n. гад -а *m.*, гáдзіна, гадзю́ка *f.*

adder II [ˈædər] n. машы́на да складáньня, лічы́льная машы́на

adder's-mouth [ˈædərzmaʊθ] n. 1. Bot. рóзныя паўнóчна-амэрыкáнскія архідэ́і. 2. ятры́шнік -у *m.*

adder's-tongue [ˈædərstʌŋ] n. Bot. ві́ды папарáці

addict [ˈædɪkt] – n. 1. наркама́н -а; алькагóлік -а *m.*: ***cocaine addict*** какаíніст -а *m.*, какаíністка *f.* 2. Fig. фана́т -а *m.*

– v.i. [əˈdɪkt] уця́гвацца, захапля́цца (*звычáйна нечым благíм*); аддава́цца (*звы́чцы*)

addicted [əˈdɪktɪd] adj. мóцна ўця́гнуты, залéжны: ***to be addicted to the use of tobacco*** уцягнýцца ў курэ́ньне

addiction [əˈdɪkʃən] n. 1. моцны нахíл, звы́чка *f.*, ця́га да нéчага. 2. наркама́нія, залéжнасьць *f.* (*ад наркотыку, кýрыва*)

addition [əˈdɪʃən] n. 1. складáньне *n.* 2. дада́ньне, дадава́ньне *n.*: ***The addition of flour will thicken gravy*** Ад дада́ньня мукí пагусьцéе падлíўка. 3. дадáтак -ку *m.* 4. Chem. прымéшка, дамéшка *f.* 5. прыбудóва *f.*

• ***in addition to*** у дадáтак да, апрачá таго́

additional [əˈdɪʃənəl] adj. дадаткóвы

addle [ˈædəl] – v.t. 1. блы́таць, зьбівáць з панталы́ку, бянтэ́жыць. 2. псавáцца, тýхнуць (*пра яйкá*)

– adj. 1. збаламу́чаны; зблы́таны. 2. сапсава́ны, ту́хлы

addlebrained ['ædəl,breɪnd] adj. 1. бязмо́згі, тупы́. 2. зьбянтэ́жаны

address [ə'dres] – n. 1. а́драс -у *m.* 2. зваро́т -у *m.*, прамо́ва *f.* (*асабл. афіцы́йная*): ***The President made an address to the nation on television*** Прэзыдэ́нт вы́ступіў са зваро́там да наро́ду ў тэлеві́зіі. 3. мане́ра гаварыць, гаво́рка *f.*: ***His address was abrupt*** Яго гаво́рка была́ рэ́зкая. 4. афіцы́йная про́сьба да ўла́даў. 5. Gram. зваро́тлак -ку *m.*

– v.t. 1. адрасава́ць (*ліст, пасы́лку*). 2. скіро́ўваць: ***to address a formal request to a government*** скірава́ць афіцы́йную про́сьбу да ўра́ду. 3. прамаўля́ць; зварача́цца: ***He addressed himself to the chairman*** Ён зьвярну́ўся да старшыні́. 4. тытулава́ць: ***How do you address a mayor?*** Як тытулава́ць мэ́ра?

address book а́драсная кні́жка

addressee [ˌædres'i:] n. адраса́т -а *m.*

adenoids [ˌædənɔɪdz] n., pl. Med. адэно́іды *pl.*, міндаліны, мігдаліны *f.*

adept – n. ['ædept] зна́ўца -ы, зна́лвец -ўца., экспэ́рт -а *m.*

– adj. [ə'dept] спрактыкава́ны, дасьве́дчаны, спры́тны: ***an adept tennis player*** спрактыкава́ны, дасьве́дчаны гуле́ц у тэ́ніс; ***She is adept in getting her own way*** Яна́ спры́тная настаяць на сваім

adequacy ['ædɪkwəsi] n. адпавёднасьць, адэква́тнасьць *f.*

adequate ['ædɪkwət] adj. 1. дастаткóвы: ***His wages are adequate to support his family*** Яго́ны зарабо́так дастаткóвы, каб утры́мваць сям'ю́. 2. адпавёдны, кампэтэ́нтны: ***a person is adequate for the job*** асо́ба адпавёдная для гэ́тае пра́цы

adhere [əd'hɪr] v.i. 1. трыма́цца, прыліпа́ць; прыстава́ць; ліпнуць, прыліпа́ць: ***Paint adheres best to a clean surface*** Фа́рба найле́пш прыстае́ да чы́стае паве́рхні. 2. трыма́цца, става́цца ве́рным: ***to adhere to a plan*** трыма́цца пля́ну; ***to adhere to the church of one's parents*** заставацца ве́рным царкве́ сваіх бацько́ў

adherence [əd'hɪrəns] n. ве́рнасьць, прывя́занасьць, ля́льнасьць *f.* 2. прытры́маньне *n.*; дакла́днае выко́ньне: ***rigid adherence to the rules*** стро́гае прытры́маньне пра́вілаў

adherent [əd'hɪrənt] – n. прыхі́льнік -а *m.*; прыхі́льніца *f.*; пасьлядо́ўнік -а *m.*, пасьлядо́ўніца *f.*

– adj. 1. лі́пкі, які прыстае́. 2. Bot. прыро́слы

adhesion [əd'hi:ʒən] n. 1. прыстава́ньне, прыліпа́ньне *n.* 2. прывя́занасьць, ве́рнасьць, ля́льнасьць *f.* 3. Phys. малекуля́рнае прыцяга́ньне. 4. Med. зрост -у *m.* (*тка́нак*)

adhesive [əd'hi:sɪv] – adj. 1. які́ лёгка прыстае́. 2. лі́пкі, кле́йкі, ліпу́чы: ***adhesive tape*** пля́стыр

– n. клей -ю *m.*

adhesiveness [əd'hi:sɪvnəs] n. кле́йкасьць, ліпу́часьць *f.*

ad hoc ['æd'hɑ:k] Latin спэцыя́льны, адмысло́вы: ***an ad hoc committee*** адмысло́вы камітэ́т

adieu [ə'dju:] – interj. быва́й, быва́йце

– n., pl. **adieus, adieux** разьвіта́ньне *n.* • ***make one's adieux*** разьвіта́цца

adipose ['ædɪpous] – adj. 1. тлу́шчавы, то́ўшчавы. 2. тлу́сты

– n. жывёльны тлу́шч: ***adipose tissue*** а) жывёльны тлу́шч. б) злучальная тка́нка пад ску́рай і навóкал ны́рак

adiposity [ˌædɪ'pɑ:səti] n. 1. атлусьце́нне *n.* 2. схі́льнасьць да паўна́ты

adit ['ædɪt] n. 1. увахо́д -у, праход -у *m.* 2. падыхо́д -у., до́ступ -у *m.* 3. што́льня *f.* (*увахо́д у ша́хту*)

adjacency [ə'dʒeɪsənsi] n., pl. **-cies** 1. прыляга́ньне, прымыка́ньне *n.* 2. суме́жнасьць *f.*, суседзтва *n.*

adjacencies, pl. навако́льная мясцо́васьць

adjacent [əˈdʒeɪsənt] adj. 1. блізкі́; прыле́глы; суседні; суме́жны: ***The farm adjacent to ours has been sold*** Сусе́дняя да нас фа́рма прада́дзеная
adjacent angles, Geom. суме́жныя куты́
adjectival [ˌædʒɪkˈtaɪvəl] adj. прыме́тнікавы: ***an adjectival suffix*** прыме́тнікавы су́фікс
adjective [ˈædʒɪktɪv] – n. Gram. прыме́тнік -а *m.*
– adj. 1. прыме́тнікавы, ужы́ты як прыме́тнік. 2. зале́жны, несамасто́йны. 3. Law працэду́рны, дапамо́жны. 4. нетрыва́лы, без замацава́льніка (*пра фа́рбу*)
adjoin [əˈdʒɔɪn] – v.t. прымыка́ць; прыляга́ць; межава́ць: ***Canada adjoins the United States*** Кана́да мяжу́е са Злу́чанымі Шта́тамі; ***Our garden adjoins the house*** Наш сад каля до́му
– v.i. межава́ць: ***Belarus and Poland adjoin*** Белару́сь і По́льшча мяжу́юць
adjoining [əˈdʒɔɪnɪŋ] adj. суме́жны; суседні: ***adjoining rooms*** суседнія, суме́жныя пако́і
adjourn [əˈdʒɜ:rn] – v.t. 1. адкладаць на пасьля́; адтэрмінова́ць: ***to adjourn a meeting*** адкла́сьці насе́джаньне. 2. спыня́ць: ***to adjourn the court for two hours*** спыні́ць насе́джаньне су́ду на дзьве гадзі́ны. 3. адця́гваць,
– v.i. 1. абвяшча́ць перапы́нак (*у пра́цы*), рабі́ць пярэ́рву: ***The court adjourned from Friday until Monday*** Суд абвясьці́ў перапы́нак ад пя́тніцы да панядзе́лка. 2. перахо́дзіць; перабіра́цца: ***The committee adjourned to a larger hall*** Камітэ́т перанёс насе́джаньне ў бо́льшую за́лю
adjournment [əˈdʒɜ:rnmənt] n. 1. адтэрмінава́ньне *n.*, адкла́д -у *m.* 2. перапы́нак -ку *m.*
adjudge [əˈdʒʌdʒ] v.t. 1. прыгаво́рваць; прызнава́ць: ***He was adjudged guilty*** Ён быў прызна́ны вінава́тым. 2. засуджа́ць: ***The thief was adjudged to prison for two years*** Зло́дзей быў засу́джаны на два гады́ турмы́. 3. разгляда́ць (*у судзе́*). 4. прысуджа́ць: ***The property was adjudged to the rightful owner*** Маёмасьць была́ прызна́ная пра́ўнаму ўла́сьніку
adjudicate [əˈdʒu:dɪkeɪt] – v.t. судзі́ць; ула́джваць спра́ву зго́дна з зако́нам
– v.i. прыйма́ць пастано́ву: ***The court adjudicated on the case*** Суд прыня́ў пастано́ву ў спра́ве
adjudication [əˈdʒu:dɪkeɪʃən] n. 1. прысу́д -у *m.* 2. пастано́ва су́ду
adjunct [ˈædʒʌŋkt] n. 1. дада́так -ку *m.*. 2. памо́чнік -а; асыстэ́нт -а; ад'юта́нт -а *m.* 3. паясьня́льныя сло́вы ў ска́зе (*азначэ́ньні, дапаўне́ньні, акалі́часьці*)
adjuration [ˌædʒuˈreɪʃən] n. 1. нака́з -у, зага́д -у *m.*: ***a strong adjuration to the witness to tell the whole truth*** мо́цны нака́з сьве́дку, каб каза́ў пра́ўду. 2. заклі́наньне *n.*; прыся́га *f.*
adjure [əˈdʒʊr] v.t. 1. дава́ць нака́з; падво́дзіць пад прыся́гу. 2. заклі́наць; мані́ць; упро́шваць, упраша́ць: ***I adjure you to speak the truth*** Я заклі́на́ю вас, гаварэ́це пра́ўду
adjust [əˈdʒʌst] – v.t. 1. дапасо́ўваць, дастасо́ўваць. 2. папраўля́ць; упарадко́ўваць; настаўля́ць; урэгулёўваць: ***to adjust a radio dial*** наста́віць радыё. 3. пагаджа́ць; зала́джваць: ***to adjust a difference of opinion*** пагадзі́ць спрэ́чку. 4. ацэ́ньваць (*шко́ду, страты*)
– v.i. 1. прызвыча́йвацца; дастасо́ўвацца: ***Freshmen soon adjust to school life*** Навічкі́ ху́тка прывыка́юць да шко́льнага жыцьця́
adjustable [əˈdʒʌstəbəl] adj. 1. дапасава́льны. 2. рухо́мы: ***an adjustable bookshelf*** рухо́мая кні́жная палі́ца
adjustment [əˈdʒʌstmənt] n. 1. датарнава́ньне, дастасава́ньне *n.*: ***an adjustment to village life*** дастасава́ньне да жыцьця́ на ве́сцы. 2. рэгуля́цыя *f.*: ***a tone adjustment on the radio*** рэгуля́цыя то́ну ў ра́дыё. 3. ула́джаньне,

пагаднéньне *n.*: ***an out-of-court adjustment of a claim for damages*** палюбóўнае ўлáджаньне прэтэ́нзіі за шкóду. 4. дапасавáньне цаны́, зьні́жка *f.*

adjutancy [ˈædʒʊtənsi] n. ад'ютáнцтва *n.* (*рáнг абó пасáда ад'ютáнта*)

adjutant [ˈædʒʊtənt] n. 1. ад'ютáнт -а *m.*. 2. асыстэ́нт -а, застýпнік -а, памагáты|ы -ага *m.*

adjutant general 1. начáльнік адміністрацы́йнай упрáвы сухазéмных вóйскаў. 2. Brit. генэрáл адміністрацы́йнай слýжбы

admeasure [ædˈmeʒər] v.t. адмéрваць, выдзяля́ць

administer [ədˈmɪnɪstər] – v.t. 1. вéсьці (*спрáвы*), кіраваáць, загáдваць, адміністраваáць: ***to administer one's household*** вéсьці сваю́ хáтнюю гаспадáрку. 2. даваáць, выдаваáць, раздаваáць: ***The doctor administered an anesthetic to the patient*** Дóктар даў пацыéнту абязбóльвальны срóдак. 3. кантраляваáць, стабілізаваáць цэ́ны абó зарабóткі

– v.i. Law выкóнваць абавя́зкі адміністрáтара *або* апякунá

• ***administer an oath*** падвóдзіць пад прыся́гу

administration [ədˌmɪnɪˈstreɪʃən] n. 1. загáдваньне, вядзéньне; кіраваáньне *n.* 2. кіраўні́цтва *n.*, адміністрáцыя *f.* 3. даваáньне, удзяля́ньне *n.*: ***the administration of aid to refugees*** даваáньне дапамóгі ўцекачáм

• ***the Administration*** а) прэзыдэ́нт і ягóны ўрад; б) Brit. прэм'éр і кабінэ́т

administrative [ədˈmɪnɪstreɪtɪv] adj. 1. адміністрацы́йны; выканáўчы: ***administrative abilities*** адміністрацы́йныя здóльнасьці; ***administrative policies*** палі́тыка адміністрáцыі

administrator [ədˈmɪnɪstreɪtər] n. 1. адміністрáтар -а, кіраўні́к -á, арганізáтар -а, урадóвец -ўца *m.* 2. Law адміністрáтар -а, выканáльнік тэстамэ́нту, павéрнік -а *m.*

administratrix [ədˈmɪnɪstreɪtrɪks] n., pl. **-trixes, -trices** Law адміністрáтарка *f.*, выканáльніца тэстамэ́нту, павéрніца *f.*

admirable [ˈædmərəbəl] adj. 1. дзівóсны, захапля́льны; цудóўны, чарóўны. 2. дасканáлы, вéльмі дóбры

admirably [ˈædmərəbli] adv. захапля́льна, чарóўна, цудóўна; дасканáла

admiral [ˈædmərəl] n. 1. адмірáл -а *m.* 2. камáндуючы рыбáцкае абó гандлёвае флятыліі. 3. Zool. адмірáл -а *m.* (*маты́ль*)

admiralty [ˈædmərəlti] n., pl. **-ties** 1. марскáя адміністрáцыя. 2. адмірáльства *n.* (*рáнг і пасáда адмірáла*)

admiration [ˌædməˈreɪʃən] n. 1. захапле́ньне *n.*: ***with admiration*** з захапле́ньнем, захóплена. 2. прадмéт захапле́ньня

admire [ədˈmaɪr] v.t. 1. захапля́цца. 2. дзіваваáцца, дзíву даваáцца: ***I admire your bravery*** Захапля́юся тваёй адвáгай

admirer [ədˈmaɪrər] n. 1. паклóньнік -а *m.*, паклóньніца *f.* 2. закаханы -ага *m.*

admissible [ədˈmɪsəbəl] adj. 1. дапушчáльны; дазвóлены: ***Is it admissible to smoke here?*** Ці дазвóлена тут куры́ць? 2. дарэ́чны: ***an admissible suggestion*** дарэ́чная прапанóва. 3. Law дапушчáльны (*як прáўны дóвад*). 4. прымáльны: ***Only adults are admissible to this club*** Тóлькі дарóслыя мóгуць быць прынятыя ў гэ́ты клюб

admission [ədˈmɪʃən] n. 1. прыняцьцё, дапушчэ́ньне, залічэ́ньне *n.*: ***admission to the university*** залічэ́ньне ва ўнівэрсытэ́т; ***admission into a hospital*** прыняцьцё ў шпіталь. 2. а) дазвóл на ўвахóд: ***admission by ticket*** увахóд павóдле білéтаў; б) цанá ўвахóду: ***The admission was four dollars*** Цанá ўвахóду былá чаты́ры даля́ры. 3. прызнáньне *n.*: ***an admission of guilt*** прызнáньне віны́. 4. прызначэ́ньне *n.*, дазвóл -у *m.*: ***admission to the bar*** дазвóл практыкаваáць прáва

• ***admission fee*** уступнáя плáта

admit [ədˈmɪt] – v.t. 1. прызнаваáць; прызнаваáцца ў *чым*: ***to admit one's mis-***

take or guilt прызна́ць сваю́ памы́лку або́ віну́. 2. дапушча́ць: ***It is necessary to admit the possibility of error*** Неабхо́дна дапушча́ць магчы́масьць памы́лкі. 3. упушча́ць: ***Windows admit light and air to the room*** Во́кны ўпушча́юць у пако́й сьвятло́ й пове́тра. 4. дава́ць пра́ва на ўсту́п: ***This ticket admits one person*** Гэ́ты біле́т на адну́ асо́бу. 5. прыма́ць: ***I was admitted to this club last year*** Мяне́ прынялі́ ў гэ́ты клюб у мину́лым го́дзе. 6. зьмяшча́ць

• ***admit of*** дапушча́ць, дазваля́ць: ***The question admits of no delay*** Пыта́ньне ня це́рпіць адкла́ду

admittance [ədˈmɪtəns] n. 1. до́ступ -у, увахо́д -у; дазво́л -у *m.* (*пра́ва ўвахо́ду ці ўсту́пу*): ***No admittance*** Увахо́д забаро́нены. 2. прыём -у *m.*, прыймо (*ва ўстано́ву*) *n.* 3. Electr. по́ўная прово́днасьць

admittedly [ədˈmɪtədli] adv. дапушча́льна; агульнапрызна́на; бясспрэ́чна; ма́быць, му́сіць

admix [ədˈmɪks] v.t. дамеша́ць, прыме́шваць

admixture [ədˈmɪkstʃər] n. прыме́сь, дамеша́ *f.*

admonish [ədˈmɑ:nɪʃ] v.t. 1. перасьцерага́ць. 2. ушчува́ць, дакара́ць, рабіць заўва́гу *або́* вымо́ву: ***The teacher admonished the student for his careless work*** Настаўні́к зрабіў ву́чню заўва́гу за нядба́йную пра́цу. 3. ра́дзіць, павуча́ць: ***Their guide admonished the mountain climbers to follow him carefully*** Правадні́к павуча́ў альпіні́стаў, каб яны́ асьцяро́жна ішлі́ за ім. 4. нага́дваць: ***She admonished him of his obligation*** Яна́ нагада́ла яму́ пра ягО́нае абавяза́ньне

admonition [ˌædməˈnɪʃən] n. 1. перасьцяро́га, заўва́га *f.*; ушчува́ньне *n.*, вымо́ва *f* .; павуча́ньне *n.*, напамі́нак -ку *m.* 2. пара́да, рэкамэнда́цыя *f.*

admonitory [ədˈmɑ:nətɔ:ri] adj. павуча́льны, перасьцерага́льны, ушчува́льны

ad nauseam [ˌædˈnɔ:ziəm] Latin празь ме́ру, да мо́таштасьці

adobe [əˈdoubi] – n. 1. цэ́гла, су́шаная на со́нцы. 2. сама́н -у *m.* 3. будыні́на з сама́ну

– adj. пабудава́ны зь неапа́ленае цэ́глы, сама́навы

• ***adobe house*** сама́навы дом

adolescence [ˌædəˈlesəns] n. юна́цтва *n.*: ***years of adolescence*** юна́цкія гады́

adolescent [ˌædəˈlesənt] – adj. 1. юна́цкі; дзявО́чы: ***adolescent friendship*** сяброўства зь юна́цкіх часо́ў. 2. недасьпе́лы: ***He behaves like an adolescent*** Ён павО́дзіць сябе́ як хлапчу́к

– n. юна́к -а́ *m.*, юна́чка *f.*; падле́т|ак -ка *m. & f.*

adopt [əˈdɑ:pt] v.t. 1. усынаўля́ць; удачара́ць: ***an adopted child*** прыёмнае дзіця́. 2. прыма́ць: ***The committee adopted the resolution*** Камітэ́т прыня́ў рэзалю́цыю. 3. запазыча́ць

adoption [əˈdɑ:pʃən] n. 1. прыма́ньне, прыня́цьце *n.*: ***the adoption of some new rules*** прыня́цьце некато́рых но́вых пра́вілаў. 2. усынаўле́ньне; удачарэ́ньне *n.*

adoptive [əˈdɑ:ptɪv] adj. 1. прыёмны, прыймО́вы, усынО́ўлены. 2. схі́льны да прыйма́

adorable [əˈdɔ:rəbəl] adj. 1. цудО́ўны, чарО́ўны. 2. абагаўля́ны

adoration [ˌædəˈreɪʃən] n. 1. прыхі́льнасьць, пашА́на *f.*. 2. пакланÉньне *n.*, Relig. адара́цыя *f.*, абагаўле́ньне *n.*

adore [əˈdɔ:r] v.t. 1. го́рача любіць; шанава́ць: ***She adores her mother*** Яна́ го́рача лю́біць і шану́е сваю́ ма́ці. 2. пакланя́цца. 3. Informal захапля́цца: ***I just adore that hat*** Я про́ста захО́пленая гэ́тым капелюшО́м

adorer [əˈdɔ:rər] n. гара́чы прыхі́льнік

adorn [əˈdɔ:rn] v.t. 1. упрыго́жваць; аздабля́ць: ***a table adorned with flowers*** стол упрыго́жаны кве́ткамі. 2. дава́ць бля́ску, го́нару або́ ва́жнасьці

adornment [əˈdɔ:rnmənt] n., pl. **-s** 1. аздо́ба *f.*, арнамэ́нт -у *m.*, дэкара́цыя *f.*;

Christmas tree adornments ца́цкі на яліну. 2. упрыго́жваньне; дэкарава́ньне *n.*: ***the adornment of the room*** дэкарава́ньне пако́ю

adown [əˈdaʊn] prep., adv., Poet. уніз: ***adown the stream*** уніз па рэ́чцы

adrenal [əˈdri:nəl] – adj. прыны́ркавы; надны́ркавы
– n. надны́ркавая зало́за

adrenalin [əˈdrenəlɪn] n. адрэналі́н -у *m.*

adrift [əˈdrɪft] adv., adj. на плыні бяз стырна́; на ла́сцы лёсу: ***Our boat is adrift on the lake*** Наш чо́вен во́льна пла́вае на во́зеры

adroit [əˈdrɔɪt] adj. спра́ўны, уме́лы: ***He is an adroit climber*** Ён спра́ўны лазу́н

adsorb [ædˈsɔ:rb] v.t. адсарбава́ць, прыця́гваць, затры́мваць (*газ, ва́дкасьць*): ***Dyes are adsorbed by the fibers of cloth*** Фарбава́льнікі адсарбу́юцца вало́кнамі тканіны

adsorption [ədˈsɔ:rpʃən] n. адсо́рбцыя *f.*

adulate [ˈædʒəleɪt] v.t. ліслі́віць; падлі́звацца, падла́шчвацца

adulation [ˌædʒəˈleɪʃən] n. ліслі́васьць *f.*; падлі́званьне, падла́шчваньне *n.*

adulatory [ˈædʒələtɔ:ri] adj. ліслі́вы, падлі́зьлівы

adulator [ˈædʒəleɪtər] n. ліслі́вец -ўца *m.*, падлі́за *m. & f.*, падлі́зьнік -а *m.*

adult [əˈdʌlt] – n. 1. дарослы -ага *m.*, даро́слая *f.*; паўнале́тні -яга *m.*, паўнале́тняя *f.* 2. даро́слая жывёліна ці расьлі́на
– adj. 1. даро́слы; ста́лы: ***an adult person*** паўнале́тняя, даро́слая асо́ба; ***adult notions*** ста́лыя ду́мкі. 2. для даро́слых: ***adult education*** адука́цыя для даро́слых

adulterate [əˈdʌltəreɪt] – v.t. падме́шваць; фальшава́ць (*няя́каснымі дaméшкамі*); разво́дзіць: ***adulterate milk with water*** разьве́сьці малако́ вадо́ю
– adj. [əˈdʌltərət] падро́блены, сфальшава́ны

adulteration [əˌdʌltəˈreɪʃən] n. 1. падрабля́ньне, падме́шваньне, фальшава́ньне *n.* 2. падро́бка *f.*

adulterator [əˈdʌltəreɪtər] n. фальсыфіка́тар, падро́бнік -а *m.*

adulterer [əˈdʌltərər] n. блудадзе́й -я *m.*

adulteress [əˈdʌltərəs] n. блудадзе́йка *f.*

adulterous [əˈdʌltərəs] adj. 1. блудадзе́йны. 2. вінава́ты ў блудадзе́йстве

adultery [əˈdʌltəri] n., pl. **-teries** блудадзе́йства *n.*, жані́мская здра́да

adulthood [əˈdʌlthʊd] n. 1. даро́слы век. 2. даро́сласьць *f.*

advance [ədˈvæns] – v.t. ру́хаць напе́рад, дапамага́ць, спрыя́ць: ***to advance the cause of peace*** спрыя́ць спра́ве мі́ру. 2. дава́ць, прыво́дзіць (*аргумэ́нт*). 3. плаці́ць пе́рад тэ́мінам; дава́ць ава́нс; дава́ць за́гадзя: ***to advance a loan*** дава́ць пазы́ку. 4. прысьпяша́ць: ***to advance the date of the wedding*** прысьпе́шыць да́ту вясе́льля. 5. павыша́ць ра́нг; аванса-ва́ць: ***to advance his rank from lieutenant to captain*** павы́сіць яго́ зь лейтэна́нта ў ра́нг капіта́на
– v.i. 1. ісьці́; ру́хацца напе́рад: ***The troops advanced*** Во́йска пайшло́ ў на́ступ. 2. рабі́ць по́ступ, удаскана́львацца: ***to advance in skill*** рабі́ць по́ступы ў сваёй спэцыя́льнасьці. 3. павыша́цца ў цане́: ***The stock advanced three points*** Акцыі падняліся на тры пу́нкты
– n. 1. рух напе́рад, пасо́ўваньне напе́рад: ***The army's advance was very slow*** Пасо́ўваньне во́йска было́ ве́льмі паво́льнае. 2. про́йдзеная адле́гласьць *f.* 3. по́ступ -у *m.*: ***the advance of knowledge*** по́ступ ве́ды. 4. ро́ст ко́лькасьці, ва́ртасьці або́ цаны́; падвы́шка *f.* 5. ава́нс -у, зада́так -ку *m.*; пазы́ка *f.*
– adj. 1. пярэ́дні, перадавы́: ***advance party of the expedition*** перадава́я гру́па экспэды́цыі. 2. заўча́сны, сыгна́льны: ***an advance copy of the book*** сыгна́льны экзэмпля́р кні́гі
• ***advances*** заляца́ньне
• ***go in advance*** а) ісьці́ напе́радзе. б) быць больш разьві́тым

• ***in advance*** а) за́гадзя. б) сьпе́раду, напе́радзе
• ***in advance of*** упе́радзе *ці* ране́й *каго́-чаго́*

advanced [ədˈvænst] adj. 1. пярэ́дні: ***an advanced patrol*** пярэ́дні патру́ль. 2. перадавы́: ***advanced political ideas*** перадавы́я палітычныя ідэ́і. 3. найнавэ́йшы: ***an aircraft of an advanced design*** самалёт найнавэ́йшае мадэ́лі. 4. далёка пасу́нуты (*до́сьлед, хвароба*): ***advanced age*** глыбо́кі век. 5. павы́шаны, пабо́льшаны

advance guard аванга́рд -у *m.*

advancement [ədˈvænsmənt] n. 1. рух напе́рад, прасо́ўваньне *n.* 2. по́ступ -у *m.*, удасканале́ньне *n.* 3. павышэ́ньне *n.*: ***His new position is a great advancement*** Ягóнае но́вае стано́вішча — вялі́кае павышэ́ньне

advantage [ədˈvæntɪdʒ] – n. 1. перава́га *f.*, верх -у *m.*, карысьне́йшае стано́вішча; кары́сьць; вы́гада *f.*, прывіле́й -ю *m.*: ***to gain an advantage over*** здабы́ць перава́гу. 2. спрыя́льныя, абста́віны, уда́ча *f.*, шча́сьце *n.*; дапамо́га *f.*
– v.t. 1. быць на руку́ або́ кары́сным; дава́ць кары́сьць. 2. падтры́мваць, спрычыня́цца да по́ступу
• ***take advantage of a person*** вы́карыстаць, ашука́ць чалаве́ка
• ***take advantage of an opportunity*** скарыста́ць з нагоды

advantageous [ˌædvænˈteɪdʒəs] adj. кары́сны, выго́дны

advection [ədˈvekʃən] n. рух -у *m.* (*цяпла́, паве́тра, вады́*)

advent [ˈædvent], n. пры́йсьце *n.*, прыхо́д -у *m.*

Advent [ˈædvent] n. 1. адвэ́нт -у *m.*, перадкаля́дная пара́; пост -у *m.* (*пе́рад Каля́дамі*), Піліпаўка *f.* 2. пры́йсьце Хрыста́ на зямлю́. 3. надыхо́д -у *m.*

Adventist [ˈædventɪst] – n. адвэнты́ст -а *m.*, адвэнты́стка *f.*
– adj. адвэнты́сцкі

adventure [ədˈventʃər] – n. 1. прыго́да, авантю́ра *f.*: ***the spirit of adventure*** прыго́дніцкі дух. 2. рызыко́ўная спра́ва, ры́зыка *f.*; адва́жнае пачынна́ньне: ***the daring adventure of man rocketing into outer space*** адва́жны палёт чалаве́ка ў ко́смас
– v.i. 1. забіра́цца: ***Now he adventured on a shore unknown*** Цяпе́р забра́ўся ён на бе́раг невядо́мы. 2. адва́жвацца; нава́жвацца, асьме́львацца: ***She could not adventure to do so*** Яна́ не магла́ асьме́ліцца зрабіць гэ́так. 3. рызыкава́ць

adventurer [ədˈventʃərər] n. 1. шука́льнік прыго́даў, рызыка́нт -а *m.* 2. авантю́рнік -а *m.*

adventuresome [ədˈventʃərsʌm] adj. 1. прыго́дніцкі. 2. адва́жны

advanturess [ədˈventʃərəs] n. 1. шука́льніца прыго́даў, рызыка́нтка *f.* 2. авантю́рніца *f.*

adventurous [ədˈventʃərəs] adj. 1. авантю́рны; прыго́дніцкі; ху́ткі да ры́зыкі; адва́жны: ***a bold adventurous explorer*** адва́жны прыго́днік, разьве́днік. 2. рызыко́ўны: ***an adventurous undertaking*** рызыко́ўнае й небясьпе́чнае пачына́ньне

adverb [ˈædvɜːrb] n., Gram. прысло́ўе *n.*

adverbial [ədˈvɜːrbiəl] adj., Gram. прысло́ўны: ***an adverbial suffix*** прысло́ўны су́фікс

adversary [ˈædvərseri] – n., pl. **-saries** 1. супраці́ўнік -а, во́раг -а *m.* 2. спабо́рнік, супе́рнік -а *m.*: ***Who is our adversary in this week's soccer game?*** Хто бу́дзе на́шым спабо́рнікам у футбо́льнай гульні́ на гэ́тым ты́дні?
– adj. 1. варо́жы, непрыя́зны, антаганісты́чны: ***The hearings are not to be adversary in character*** Слу́ханьні не паві́нны мець варо́жы хара́ктар

adverse [ædˈvɜːrs] adj. 1. непрыя́зны, варо́жы, нязго́дны з *чым*: ***His adverse criticisms discouraged me*** Ягóная варо́жая кры́тыка зьнеахво́ціла мяне́. 2. некары́сны, шко́дны: ***adverse circumstances*** некары́сныя абста́віны. 3. супраці́ўны: ***adverse***

winds супраці́ўныя вятры́. 4. супрацьле́жны

adversity [æd'vɜ:rsəti] n., pl. **-ties** нядо́ля *f.*, няшча́сьце *n.*, бяда́, нягода́ *f.*: ***to experience adversity*** пазна́ць бяду́

advert [æd'vɜ:rt] v.i. зварача́ць; пакліка́цца *на што*: ***to advert to other matters*** зьвярну́ць ува́гу на і́ншыя спра́вы

advertent [æd'vɜ:rtənt] adj. ува́жны, спасьцерага́льны

advertise ['ædvərtaɪz] – v.t. 1. рэкламава́ць: ***Manufacturers advertise their products widely*** Вытво́рцы рэкламу́юць сваі́ тава́ры. 2. паведамля́ць, інфармава́ць, падава́ць да ве́дама. 3. абвяшча́ць, дава́ць абве́стку: ***to advertise in the newspaper*** абвяшча́ць у газе́це; ***He advertised for a job*** Ён даў абве́стку пра по́шукі пра́цы

advertisement [ˌædvər'taɪzmənt] n. абве́стка, рэкля́ма *f.*

advertising ['ædvərtaɪzɪŋ] n. рэкламава́ньне, абвяшча́ньне *n.*

advice [əd'vaɪs] n. пара́да, ра́да *f.*: ***doctor's advice*** ле́карская пара́да; ***to ask someone's advice*** пыта́цца ў не́кага пара́ды; ***to take someone's advice*** паслу́хацца не́чае ра́ды

advisability [ədˌvaɪzə'bɪlətɪ] n. мэтазго́днасьць, слу́шнасьць *f.*

advisable [əd'vaɪzəbəl] adj. адпаве́дны, мэтазго́дны, пажада́ны; разу́мны

advise [əd'vaɪz] – v.t. 1. ра́іць, перасьцерага́ць. 2. рэкамэндава́ць; прапі́сваць: ***His doctor advised complete rest*** Ягоны ле́кар прапіса́ў яму́ по́ўны адпачы́нак. 3. пава́дамі́ць, паінфармава́ць, даць інфарма́цыю: ***to advise of the date of delivery*** пава́дамі́ць да́ту даста́ўкі

– v.i. 1. ра́іць: ***I shall do as you advise*** Я зраблю́, як ты ра́іш

advised [əd'vaɪzd] adj. 1. узва́жаны, абду́маны: ***an ill-advised remark*** неабду́маная *або́* неразва́жная заўва́га. 2. паінфармава́ны: ***keep me advised*** інфарму́йце мяне́

advisedly [əd'vaɪzɪdlɪ] adv. наўмы́сна

adviser or **advisor** [əd'vaɪzər] n. 1. дара́днік -а, дара́дца|а -ы; кансульта́нт -а *m.*: ***a political adviser*** палітычны дара́днік. 2. кансульта́нт -а *m.*

advisory [əd'vaɪzərɪ] – adj. дара́дны, кансультацыйны: ***an advisory committee*** дара́дны камітэ́т

– n., pl. **-ries** афіцыйнае паведамле́ньне *n.* (*найчасьце́й перасьцяро́га*)

advocacy ['ædvəkəsɪ] n. 1. засту́пніцтва *n.*; падтры́мка; прапага́нда *f.* 2. адвака́цтва *n.*

advocate ['ædvəkət] – n. 1. адвака́т -а *m.* 2. засту́пнік -а *m.*, засту́пніца *f.* 3. прыхі́льнік -а; абаро́нц|а -ы *m.*, абаро́ньніца *f.*: ***an advocate of independence*** абаро́нца незале́жнасьці

– v.t. ['ædvəkeɪt] 1. абараня́ць, падтры́мваць, адсто́йваць. 2. прапагандава́ць

adz or **adze** [ædz] – n. струг -а *m.*, ско́бля *f.* (*для абчэ́сваньня бярвёнаў*)

– v.t. часа́ць бярвёны, струга́ць

aegis ['i:dʒɪs] n. 1. Greek Myth. эгі́да *f.* (*шчыт Зэ́ўса або́ Атэ́ны*). 2. ахо́ва *f.*: ***the aegis of the law*** пра́ўная ахо́ва. 3. засту́пніцтва, кіраўні́цтва, апяку́нства *n.*; эгі́да *f.*: ***a conference under the aegis of the United Nations*** канфэрэ́нцыя пад эгі́дай Аб'е́днаных На́цыяў

aeon or **eon** ['i:ən] n. 1. ве́чнасьць *f.* 2. Geol. ты́сяча мільёнаў гадо́ў

aerate [er'eɪt] v.t. 1. праве́трываць, вэнтылява́ць. 2. насыча́ць га́зам, газава́ць. 3. насыча́ць кісларо́дам: ***Blood is aerated in the lungs*** Кроў у лёгкіх насыча́ецца кісларо́дам

aeration [er'eɪʃən] n. 1. праве́траньне *n.*; насычэ́ньне праве́трам; аэра́цыя *f.*: ***aeration of the soil or water*** аэра́цыя гле́бы або́ вадаёму. 2. насычэ́ньне га́зам

aerial ['eriəl] – n. антэ́на *f.*

– adj. 1. праве́траны; авіяцы́йны: ***aerial spraying*** авіяцы́йнае распы́рскваньне 2. атмасфэры́чны, праве́траны. 3. надзе́мны, праве́траны. 4. бяс-

плóтны, эфíрны; уя́ўны, незямны́; нябе́сны

• ***aerial photograph*** аэрафотаздымка

aerialist [ˈeriəlɪst] n. акрабáт -а *m.*, акрабáтка *f.* (*на трапэ́цыі*)

aerie or **aërie** [ˈeri] n. 1. вышы́ннае птушы́нае гняздó. 2. птушаня́ты ў такíм гнязьдзе́. 3. дом *або* зáмак у ця́жка-дастýпных гарáх

aerification [ˌerɪfɪˈkeɪʃən] n. насычэ́нне павéтрам

aerify [ˈerəfaɪ] v.t. 1. насычáць павéтрам. 2. ператвáрáць у пáру або́ газ

aerobatics [ˌerəˈbætɪks] n. вышэ́йшы пілятáж, фігýрныя палёты

aerobics [eˈroʊbɪks] n. аэрóбіка *f.*: ***aerobics improves one's physical condition*** аэрóбіка паляпшáе фізы́чны стан чалавéка

aerodrome [ˈerədroʊm] n. esp. Brit. лётнішча *n.*, аэрадрóм -у *m.*

aerodynamics [ˌeroʊdaɪˈnæmɪks] n. аэрадынáмікa *f.*

aerogram [ˈerəgræm] n. 1. радыёграмá *f.* 2. ліст павéтранай пóштай

aeronaut [ˈerənɔːt] n. аэранáўт -а *m.* (*пілёт або́ пасажы́р самалёту, балёну*)

aeronautics [ˌerəˈnɔːtɪks] n. аэранáўтыка *f.*, навýка лётаў

aeroplane [ˈerəpleɪn] n., esp. Brit. самалёт -а *m.*

aerosol [ˈerəsɑːl] n. аэразóль -ю *m.*

aerospace [ˈeroʊspeɪs] n. касьмíчная прастóра, кóсмас -у *m.*

aerostat [ˈeroʊstæt] n. аэрастáт -а *m.*

aerostatics [ˌeroʊˈstætɪks] n. аэрастáтыка *f.*

aeruginous [ɪˈruːdʒɪnəs] adj. сіне-зялёны (*кóлеру медзянóй іржы́*)

aerugo [ɪˈruːgoʊ] n. медзянáя іржá *f.*

aery or **aëry** [ˈeri] – adj., Poet. лёгкі, як павéтра; эфíрны, бесьцялéсны, незямны́

– n., pl. **aeries**, *гл.* **aerie**

Aeschylus [ˈeskələs] n. Эсхíл -а *m.*

Aeschylean [ˌeskəˈliːən] adj. Эсхíлаў

Aesculapius [ˌeskjəˈleɪpɪəs] n. 1. Эскуля́п -а *m.* (*рымскі бог мэдыцы́ны й лячэ́ньня*). 2. мэ́дык -а *m.*

Aesop [ˈiːsɑːp] n. Эзóп -а *m.*

Aesopian [ˌiːˈsoʊpiən] adj. Эзóпаў, эзóпаўскі: ***a fable in the Aesopian style*** бáйка ў эзóпаўскім стылі

aesthete [ˈesθiːt] n., *такс.* **esthete** эстэ́т -а *m.*, амáтар красы́

aesthetic [esˈθetɪk] adj., *такс.* **esthetic(al)** 1. эстэты́чны. 2. (*пра асóбу*) чýлы на красý. 3. (*пра рэ́чы*) у дóбрым гýсьце, артыстычны, прыéмны для вóка

aesthetician [ˌesθeˈtɪʃən] n. эстэ́тык -а *m.*, знáўца *або́* студэ́нт эстэ́тыкі

aestheticism or **estheticism** [esˈθetɪˌsɪzəm] n. эстэты́зм -у *m.*, эстэ́цтва *n.*

aesthetics [esˈθetɪks] n. эстэ́тыка *f.*

aetiology [ˌiːtɪˈɑːlədʒi] n. *гл.* **etiology**

afar [əˈfɑːr] adv. далёка, удалечынí

• ***from afar*** здалёк: ***He saw me from afar*** Ён пабáчыў мянé здалёк

affability [ˌæfəˈbɪlətɪ] n. абыхóдлівасьць, вéтласьць; далікáтнасьць; прыя́знасьць *f.*

affable [ˈæfəbəl] adj. 1. вéтлы; абыхóдлівы: ***a very friendly and affable man*** вéльмі прыя́зны й абыхóдлівы чалавéк. 2. прыéмны, далікáтны: ***an affable smile*** прыéмная ўсьмéшка

affably [ˈæfəblɪ] adv. вéтла, вéтліва, абыхóдліва; прыя́зна

affair [əˈfer] n. 1. спрáва *f.*: ***He has many affairs to look after*** Ён мýсіць займáцца шмат якíмі спрáвамі; ***That's my affair*** Гэ́та мая́ спрáва. 2. падзéя *f.*: ***a social affair*** грамáдзкая падзéя. 3. сýвязь *f.*: ***a love affair*** раман, любóўная сýвязь. 4. Figur. штýка *f.*: ***a complicated affair*** складáная, скамплікавáная штýка

affect I [əˈfekt] v.t. 1. дзéяць; уплывáць; мяня́ць, зьмяня́ць: ***The disease affected his mind*** Хварóба падзéяла на ягóны рóзум. 2. хваляваць; звару-шáць; краналь сэ́рца, закранáць: ***The news affected him*** Навíна ўсхвалявáла ягó; ***Nothing could affect him*** Нішто́ не краналá ягó

affect II [əˈfekt] v.t. 1. удавáць, прыкíдвацца: ***affect ignorance*** удавáць ня-

ве́даньне. 2. дава́ць перава́гу. 3. удава́ць; напуска́ць вы́гляд: ***He affects carelessness in dress*** Ён нядба́йна адзяе́цца

affectation [ˌæfekˈteɪʃən] n. 1. удава́ньне *n.* 2. по́за, ненатура́льнасьць, мане́рнасьць *f.*: ***Her little affectations seem silly*** Ейная мане́рнасьць выглада́е сьме́шна

affected I [əˈfektɪd] adj. 1. кра́нуты, закра́нуты. 2. Med. пашко́джаны (*хваро́бай*). 3. усхваля́ваны, узру́шаны; схі́льны, настро́ены: ***to be well affected towards*** быць прыхі́льна настро́еным *да каго́-чаго́*

affected II [əˈfektɪd] adj. 1. удава́ны, ненатура́льны, шту́чны: ***an affected manner*** крыўля́ньне *n.*, мане́рнасьць *f.*: ***an affected tone of voice*** ненатура́льны тон го́ласу. 2. які́ трыма́ецца ненатура́льна: ***He is too affected*** Ён зана́дта ненатура́льны, шту́чны

affecting [əˈfektɪŋ] adj. звару́шлівы, крана́льны: ***an affecting story of hunger and suffering*** звару́шлівы апо́вед пра го́лад і цярпе́ньні

affection [əˈfekʃən] n. 1. прыхі́льнасьць *f.*, падаба́ньне *n.*, лю́басьць, пяшчо́тнасьць, любо́ў *f.*: ***the affection of a mother for her child*** ма́тчына лю́басьць да дзіця́ці. 2. пачуцьцё *n.*, схі́льнасьць *f.* 3. боль -ю *m.*; хваро́ба *f.*: ***an affection of the ear*** боль ву́ха

affectional [əˈfekʃənəl] adj. пачуцьцёвы

affectionate [əˈfekʃənət] adj. ласка́вы, пяшчо́тны, чу́льлі́вы, чу́лы; прыхі́льны, лю́басны: ***an affectionate child*** ла́скавае, пяшчо́тнае дзіця́; ***an affectionate farewell*** чу́лае разьві́ньне

affectionately [əˈfekʃənətli] adv. ла́скава, лю́басна; зь лю́басьцяй

affective [æˈfektɪv] adj. пачуцьцёвы, эмацыяна́льны

afferent [ˈæfərənt] adj. цэнтраімкло́ўвы: ***afferent nerves*** цэнтраімкло́ўвыя (*пачуцьцёвыя*) но́рвы

affiance [əˈfaɪəns] – v. заручы́ць, заручы́цца – n. зару́чыны *pl.*

affidavit [ˌæfɪˈdeɪvɪt] n. афідэ́віт -у *m.* (*пісьмо́вая заява́ пад прыся́гай*)

affiliate [əˈfɪlieɪt] – v.t. 1. далучы́ць, аб'яднаво́ўваць, зьліва́ць, улучы́ць у сыстэ́му. 2. усынаўля́ць
– v.i. далуча́цца як ся́бра, запі́свацца: ***to affiliate with a political party*** уступі́ць у палітычную па́ртыю
– n. [əˈfɪliət] 1. аддзе́л -у *m.*, фі́лія *f.* 2. арганіза́цыя-кампаньён

affiliation [əˌfɪliˈeɪʃən] n. 1. спалучэ́ньне *n.*, су́вязь *f.* 2. партыі́йная прынале́жнасьць

affined [əˈfaɪnd] adj. 1. сваяцкі, спарадне́ны. 2. зьвя́заны, злу́чаны

affinity [əˈfɪnəti] n., pl. **-ties** 1. сымпа́тыя *f.*, нахі́л -у *m.*:, ця́га *f.*: ***an affinity for dancing*** нахі́л да та́нцаў. 2. сымпа́тыя *f.* (*асо́ба*). 3. сваяцтва *n.*, ро́днасьць *f.* 4. падабе́нства *n.*, бліскасьць *f.*: ***the affinity of culture, language*** бліскасьць культу́ры, мо́вы. 5. Biol. сямейнае падабе́нства. 6. Chem. хімі́чная ро́днасьць

affirm [əˈfɛ:rm] – v.t. 1. сьцьвярджа́ць, запэ́ўніваць, перако́нваць. 2. пацьвярджа́ць: ***to affirm the decision*** пацьве́рдзіць пастано́ву
– v.i. руча́цца, цьве́рдзіць

affirmation [ˌæfərˈmeɪʃən] n. 1. сьцьве́рджаньне, упэ́ўненьне *n.* 2. пацьве́рджаньне *n.*, урачы́стае запэ́ўненьне

affirmative [əˈfɛ:rmətɪv] – adj. сьцьвярджа́льны: ***an affirmative answer*** сьцьвярджа́льны адка́з
– n. сьцьве́рджаньне *n.*: ***to reply in the affirmative*** адказа́ць сьцьвярджа́льна

affix [əˈfɪks] – v.t. 1. прымацо́ўваць, наляпля́ць, накле́йваць: ***to affix a stamp to a letter*** накле́іць ма́рку на ліст. 2. дадава́ць, далуча́ць: ***to affix one's signature (to a letter)*** падпіса́цца (*у канцы́ ліста́*). 3. ста́віць; прыклада́ць: ***to affix a seal*** паста́віць пяча́тку. 4. Figur. прыпі́сваць: ***to affix blame*** прыпіса́ць каму́ віну́

– n. [ˈæfɪks] дада́тлак -ку *m.* 2. Gram. а́фікс -у *m.* (*прыста́ўка або́ су́фікс*)

afflict [əˈflɪkt] v.t. спрычыня́ць боль, му́чыць; засмуча́ць, непако́іць; турбава́ць; гры́зьці: ***The pangs of conscience afflicted him*** Яго́ му́чылі дако́ры сумле́ньня

affliction [əˈflɪkʃən] n. 1. больь -ю *m.*; згрызо́та, паку́та *f.* 2. го́ра *n.*, бядá *f.*; няшча́сьце *n.*: ***the bread of affliction*** го́ркі хлеб

afflictive [əˈflɪktɪv] adj. балю́чы; прыгнята́льны

affluence [ˈæfluəns] n. 1. бага́ццьце *n.*; дастáтлак -ку *m.*, дастáча *f.*: ***a country of great affluence*** ве́льмі бага́ты край. 2. вялíкая ко́лькасьць, мно́ства *n.*: ***winter with its affluence of snows*** зімá зь вялíкімі сьняга́мі

affluent [ˈæfluənt] – adj. 1. замо́жны, бага́ты: ***an affluent person*** бага́ты, замо́жны чалаве́к. 2. Figur. дастáтны, шчо́дры: ***affluent harvest*** шчо́дры ўраджáй

– n. прыто́к -а *m.* (*рэ́чкі*)

afflux [ˈæflʌks] n. прыто́к -у, наплы́ў -ву *m.*

afford [əˈfɔːrd] v.t. 1. магчы́, мець магчы́масьць, дазваля́ць сабе́: ***We can't afford a new car*** У нас нямá гро́шай на но́вае áўта; ***A busy man can't afford a delay*** Заня́ты чалаве́к ня мо́жа чака́ць. 2. дава́ць, забясьпе́чваць, прыно́сіць, радзíць: ***Our garden affords a good supply of fresh vegetables*** Наш гаро́д даé до́брыя збо́ры сьвéжае гаро́дніны; ***Reading affords pleasure*** Чыта́ньне даé прыéмнасьць

afforest [əˈfɔːrəst] v.t. садзíць лес; заса́джваць ле́сам

afforestation [əˌfɔːrəsˈteɪʃən] n. 1. паса́дка ле́су, аблясе́ньне *n.* 2. пло́шча, заса́джаная ле́сам

affray [əˈfreɪ] n. сва́рка, бо́йка *f.*, парушэ́ньне публíчнага пара́дку

affreightment [əˈfreɪtmənt] n. фрахтава́ньне *n.*

affricate [ˈæfrɪkət] – n., Gram. афрыка́та *f.*

– adj. афрыкаты́ўны, шчы́лінны

affront [əˈfrʌnt] – n. абра́за *f.*, зьнява́га *f.*, афро́нт -у *m.*

– v.t. 1. публíчна абража́ць, зьневажа́ць. 2. глядзе́ць у тва́р (*небясьпе́цы, сьме́рці*)

affusion [əˈfjuːʒən] n. абліва́ньне *n.* (*ваго́й*)

Afghan [ˈæfgən] – n. 1. афга́нец -ца *m.*, афга́нка *f.* 2. пушту́ (*адна́ зь дзьвю́х гало́ўных мо́ваў Афганіста́ну*)

– adj. афга́нскі

• ***Afghan hound*** афга́нскі хорт

afghan [ˈæfgən] n. пле́цены ваўня́ны шаль *або́* по́сьцілка

afield [əˈfiːld] adv. 1. далёка ад до́му: ***far afield in foreign lands*** далёка ад ха́ты ў чужы́х краёх. 2. далёка ўбок: ***to go far afield*** зьбíцца з даро́гі. 3. на по́лі бíтвы: ***to put an army afield*** вы́весьці во́йска на по́ле бíтвы

afire [əˈfaɪər] adv., adj. 1. у агні́: ***to be afire*** гарэ́ць, пала́ць агнём. 2. энтузіяста́ычна, з запа́лам

aflame [əˈfleɪm] adv., adj. 1. у по́лымі, у агні́. 2. Figur. палымя́ны: ***to be aflame with eagerness*** гарэ́ць ад нецярплíвасьці

afloat [əˈfloʊt] – adv. 1. на вадзе́, на мо́ры; на мо́рскай слу́жбе. 2. у дзе́яньні. 3. пры грашо́х

– adj. 1. які́ плыве́, трыма́ецца на вадзе́ ці ў паве́тры. 2. залíты, зато́плены: ***After the rain the whole cellar was afloat*** Пасьля́ дажджу́ ўве́сь падва́л быў залíты вадо́ю. 3. Figur. пашы́раны: ***Rumors of a revolt were afloat*** Хадзíлі чу́ткі пра бунт

afoot [əˈfʊt] adv., adj. 1. пехато́ю; пе́ша: ***Did you come all the way afoot?*** Ці вы ўсю́ даро́гу йшлí пехато́ю? 2. на нага́х; у ру́ху, у пра́цы: ***Not a person in the house was yet afoot*** Ніхто́ яшчэ́ ў ха́це ня быў уста́ўшы; ***Preparations for dinner were afoot in the kitchen*** У ку́хні йшла́ падрыхто́ўка да абе́ду

aforementioned [əˌfɔːrˈmentʃənd] adj. *гл.* **aforesaid**

aforesaid [əˈfɔːrsed] adj. вышэ́йска́заны; вышэ́йпада́дзены; вышэ́йназва́ны
aforethought [əˈfɔːrθɔːt] adj. 1. абду́маны, сьвядо́мы. 2. наўмы́сны
aforetime [əˈfɔːrtaɪm] – adv. кали́сьці, кали́сь, не́калі; быва́ла
– adj. ко́лішні; да́ўні
afraid [əˈfreɪd] adj. баязьлі́вы: ***I am afraid*** баю́ся; ***She is afraid of the dark*** Яна́ баі́цца це́мры
• ***be afraid*** бая́цца (*адчува́ць шкада-ва́ньне, неахво́ту не́шта сказа́ць*) ***I'm afraid you are wrong*** Баю́ся, вы памыля́ецеся; ***I'm afraid I'm late*** Баю́ся, я спазьні́ўся
afresh [əˈfreʃ] adv. нано́ва, яшчэ́ раз; ізно́ў
African [ˈæfrɪkən] – adj. афрыка́нскі
– n. афрыка́нец -а *m.*, афрыка́нка *f.*
Afrikaans [ˌæfrɪˈkɑːns] n. афрыка́нс (*мо́ва*)
Afrikander [ˌæfrɪˈkɑːndər] n. 1. *гл.* **Afrikaner.** 2. паўдзённа-афрыка́нская паро́да аве́чак
Afrikaner [ˌæfrɪˈkɑːnər] n. афрыка́нэр -а *m.* (*нашча́дак галя́ндзкіх каляні́за-тараў у Паўдзённай Афрыцы*)
aft [æft] – adv., Naut. на карме́, у бок кармы́: ***fore and aft*** ад но́са да кармы́, на ўсю́ даўжыню́ (*карабля́*)
– adj. кармавы́, за́дні
after [ˈæftər] – prep. 1. па *чым*; праз *што* ***after supper*** па вячэ́ры; ***after his arrival*** па яго́ным прые́зьдзе; ***after an hour*** праз гадзі́ну. 2. за *кім-чым*: ***day after day*** дзень за днём; ***They walked in line one after another*** Яны́ йшлі́ адзі́н за адны́м; ***Run after him*** Бяжы́ за і́м. 3. пра *каго́*: ***to ask after someone*** пыта́цца, дава́ць ве́дваць пра не́кага. 4. пасьля́, дзе́ля: ***After all the lies she told, who could trust her?*** Пасьля́ ўсяе́ маны́, што яна́ нагаварыла, хто мо́жа ёй ве́рыць? 5. нягле́дзячы на *што*: ***After all my trouble he has learned nothing*** Нягле́дзячы на ўсе́ маё стара́ньні, ён нічо́га не навучы́ўся. 6. паво́дле *чаго*, зго́дна з *чым*; у сты́лі, на мане́р, на ўзо́р *чаго́*: ***after the same pattern*** паво́дле таго́ са́мага ўзо́ру; ***after the latest fashion*** зго́дна з найнаве́йшай мо́дай. 7. па, у го́нар: ***He was named after his father*** Яго́ назва́лі па ба́цьку
– adv. 1. зза́ду, уза́дзе: ***to follow after*** ісьці́ зза́ду. 2. пасьля́, пазьне́й: ***three hours after*** тры гадзі́ны пазьне́й
– adj. пазьне́йшы, насту́пны: ***In after years he regretted the mistakes of his boyhood*** У пазьне́йшыя гады́ ён шкадава́ў памы́лкі свайго́ юна́цтва. 2. за́дні; бліжэ́йшы да кармы́: ***the after sails*** за́днія ветразі
– conj. калі́; пасьля́ таго́, як: ***Soon after he arrived he began to work*** Ху́тка пасьля́ таго́, як ён прые́хаў, ён пача́ў працава́ць
• ***after all*** усё ж, урэ́шце
• ***After you*** То́лькі пасьля́ Вас!
• ***look after somebody*** дагляда́ць *каго́*
• ***What is he after?*** Чаго́ ямў трэ́ба?; Што ён хо́ча?
afterbirth [ˈæftərbɜːrθ] n. Anat. пасьле́д -у *m.*, пляцэ́нта *f.*
aftercrop [ˈæftərkrɑːp] n. другі́ ўраджа́й; ата́ва *f.*
afterdark [ˈæftərdɑːrk] adj. вячэ́рні, начны́: ***afterdark runs of the buses*** вячэ́рняе курсава́ньне аўто́бусаў
afterdinner [ˈæftərˌdɪnər] adj. паабе́дні, пасьля́ абе́ду: ***an afterdinner speech*** паабе́дняя прамо́ва; ***afterdinner coffee*** паабе́дняя ка́ва
after-effect [ˈæftərɪˌfekt] n. 1. пазьне́йшы вы́нік. 2. пабо́чнае дзе́яньне (*нарко́тыку, хваро́бы*)
afterglow [ˈæftərgloʊ] n. 1. за́рыва па за́хадзе со́нца. 2. Figur. прые́мны ўспамі́н
after-grass [ˈæftərgræs], n. ата́ва *f.*, трава́ на по́жні
after-image [ˈæftərˌɪmɪdʒ] n. Psych. аста́ткавы во́браз
afterlife [ˈæftərlaɪf] n. 1. замагі́льнае, тагасьве́тнае жыцьцё. 2. пазьне́йшае жыцьцё

aftermath ['æftərmæθ] n. насту́пствы *pl.* (*звычайна непрые́мныя*): ***The aftermath of war is hunger and disease*** Насту́пствы вайны́ — го́лад і хваро́бы

aftermost ['æftərmoust] adj. 1. апо́шні, са́мы за́дні. 2. Naut. найбліжэ́йшы да кармы́

afternoon [ˌæftər'nu:n] – n. 1. час пасьля́ по́ўдня: ***in the afternoon*** папо́ўдні. 2. Figur. старэ́йшы век: ***in the afternoon of one's life*** пад ста́расьць, у гадо́х – adj. пасьляпаўднёвы

afterpains ['æftərpeɪnz] n., pl. пасьляро́давыя бо́лі *pl.*

aftertaste ['æftərteɪst] n. пры́смак -у *m.*

afterthought ['æftərθɔ:t] n. 1. запо́зьненая ду́мка. 2. ро́здум -у *m.*: ***in afterthought*** пасьля́ ро́здуму

aftertime ['æftərtaɪm] n. бу́дучыня *f.*

afterwards ['æftərwərdz] adv. пасьля́, по́тым

again [ə'gen] adv. 1. ізно́ў, яшчэ́ раз: ***Try again*** Спрабу́й яшчэ́. 2. апрача́ таго́, прыты́м; да таго́: ***And then again, what do his fine words amount to?*** А прыты́м, да чаго́ ж зво́дзяцца яго́ныя прыго́жыя сло́вы? 3. з другога́ бо́ку, ізно́ў: ***These again are more expensive*** Гэ́тыя, ізно́ў жа — даражэ́йшыя

• ***again and again (time and again)*** ча́ста, няра́з

• ***as much again*** яшчэ́ раз гэ́тулькі

against [ə'genst] prep. 1. супро́ць, су́праць; насупро́ць: ***against the law*** супро́ць зако́ну; ***against the wind*** супро́ць ве́тру. 2. па: ***Rain beats against the window*** Дождж б'е па вакне́. 3. да, на: ***over against the wall*** зьве́рнуты тва́рам да сьцяны́; ***against a background*** на фо́не; ***to save money against a rainy day*** ашчаджа́ць гро́шы на чо́рны дзень; ***to store up food against the winter*** запаса́цца е́жай на зіму́; ***to run against*** натыкну́цца на не́шта. 4. аб, на, да: ***She leaned against the fence*** Яна́ прыхіну́лася да пло́ту; ***a ladder leaning against the wall*** драбі́на, абапе́ртая на сьцяну́. 5. ад: ***protection against fire*** ахо́ва ад пажа́ру

agamic [ə'gæmɪk] adj. Biol. ага́мны, бяспо́лы

agape [ə'geɪp] – adv. разя́віўшыся (*ад зьдзіўле́ньня ці нечака́насьці*)

– adj. шыро́ка адкры́ты, разя́ўлены: ***with mouth agape*** з разя́ўленым ро́там

agate ['ægət] n. 1. ага́т -у *m.* 2. прыла́да да палірава́ньня. 3. Print. ага́т -у *m.* (*паме́р друка́рскага шры́фту*)

agateware ['ægətwer] n. эмалява́нае судзьдзё

agaze [ə'geɪz] – adv. утаро́піўшы во́чы

– adj. з утаро́пленымі вачы́ма

age [eɪdʒ] – n. 1. век -у *m.* (*жыцьця́*): ***His age was 14*** Ямў было́ 14 гадо́ў; ***The age of a horse is 24 to 30 years*** Ко́ні жыву́ць да 24 да 30 гадо́ў. 2. пэры́яд жыцьця́: ***old age*** стары́ век, ста́расьць. 3. эпо́ха *f.*: ***Galileo was in advance of his age*** Галіле́й вы́перадзіў сваю́ эпо́ху. 4. пакале́ньне *n.* 5. век -у *m.* (*пэры́яд у гісто́рыі*): ***the Middle Ages*** сярэдняве́чча *n.*: ***the atomic age*** а́тамны век. 6. э́ра *f.* (*пэры́яд у гісто́рыі зямлі*): ***the Ice Age*** ледавіко́вы пэры́яд, ледавіко́вая э́ра

– v.t. 1. рабі́ць стары́м, стары́ць: ***Worry ages a man*** Згрызо́ты ста́раць чалаве́ка. 2. высьпяля́ць, вы́сьпеліць, рабі́ць гато́вым для ўжыва́ньня: ***to age cheese for a year*** уле́жваць, высьпяля́ць сыр цэ́лы год

– v.i. 1. старэ́ць: ***He aged rapidly*** Ён ху́тка пастарэ́ў. 2. выстро́йваць: ***The wine is put into oak casks to age*** Віно́ зьлівáюць у дубо́выя бо́чкі для выстро́йваньня

• ***ages,*** pl. вякі́

• ***be (come) of age*** быць (ста́ць) даро́слым

• ***for ages*** ве́льмі даўно́: ***I haven't seen you for ages*** Ве́льмі даўно́ цябе́ ня ба́чыў

aged ['eɪdʒɪd] – adj. 1. стары́: ***the aged woman*** стара́я жанчы́на. 2. старэ́чы.

3. [ˈeɪdʒd] вы́сьпелы, уляжа́лы: ***aged cheese*** вы́сьпелы сыр. 4. [ˈeɪdʒd] у ве́ку: ***aged 50*** у ве́ку пяцьдзяся́т гадо́ў

– n. ***the aged*** [ˈeɪdʒɪd] старэ́йшыя лю́дзі, стары́я *pl.*: ***a home for the aged*** дом для стары́х; ***care for the aged*** дагля́д стары́х

ageless [ˈeɪdʒləs] adj. 1. які́ не старэ́е. 2. ве́чны, пракаве́тны, адве́чны: ***the ageless wisdom*** адве́чная му́драсьць

agelong [ˈeɪdʒlɔ:ŋ] adj. спрадве́чны, пракаве́тны, векавы́: ***agelong legend*** спрадве́чная леге́нда

agency [ˈeɪdʒənsi] n., pl. **-cies** 1. аге́нцтва *n.*: ***employment agencies*** аге́нцтвы пра́цы. 2. стара́ньне, пасярэ́дніцтва *n.*, дапамо́га *f.*: ***by the agency*** or ***through the agency*** пры дапамо́зе, дзя́куючы стара́ньням. 3. бюро́

agenda [əˈdʒendə] n. пара́дак дня

agent [ˈeɪdʒənt] n. 1. аге́нт -а, прадстаўні́к -а́, упаўнава́жан|ы -ага, адміністра́тар -а *m.* 2. та́йны аге́нт. 3. пасярэ́днік -а; фа́ктар -у, узбуджа́льнік -а *m.*: ***some mosquitos are agents of malaria*** некато́рыя камары́ — разно́сьнікі маляры́і. 4. Chem. рэ́чыва *n.*: ***a catalytic agent*** каталіза́тар. 5. сро́д|ак -ку *m.*: ***lubrication agent*** зма́звальны сро́дак

agglomerate [əˈglɑ:mərеɪt] – v.t. 1. зьбіра́ць у ку́чы, ма́су; нагрува́шчваць

– v.i. зьбіра́цца (*у ку́чу, ма́су*)

– adj. [əˈglɑ:mərət] сабра́ны, згрува́шчаны

– n. Geol. аглямэра́т -у *m.*

agglomeration [əˌglɑ:məˈreɪʃən] n. 1. а) нагрува́шчаньне *n.* б) нагрува́шчваньне *n.* 2. ма́са нагрува́шчаных рэ́чаў

agglutinate [əˈglu:tɪneɪt] – v.t. зьле́пліваць, скле́йваць

– v.i. 1. зьле́плівацца, скле́йвацца. 2. ператвара́цца ў клей

– adj. [əˈglu:tɪnət] 1. зьле́плены, скле́ены. 2. зьлі́ты: ***an agglutinate word (e.g. never-to-be-forgotten)*** зьлі́тае сло́ва

agglutination [əˌglu:tɪˈneɪʃən] n. 1. зьле́пліваньне, скле́йваньне *n.* 2. зьле́пленая ма́са. 3. аглютына́цыя *f.* (*тварэ́ньне сло́ва злучэ́ньнем ко́лькіх сло́ваў*)

agglutinative [əˈglu:tənеɪtɪv] adj. 1. кле́йкі: ***Glue is an agglutinative substance*** Клей — рэ́чыва, яко́е зьле́плівае. 2. (*пра мо́ву*) аглютынаты́ўная

aggrandize [əˈgrændaɪz] v.t. 1. павялі́чваць, пабо́льшваць (*у́лада́ду, сі́лу, бага́ццьце*), павыша́ць ра́нг. 2. узвыша́ць

aggrandizement [əˈgrændɪzmənt] n. узьвялічэ́ньне, узвышэ́ньне *n.*

aggravate [ˈægrəveɪt] v.t. 1. паго́ршваць, узмацня́ць: ***His bad temper was aggravated by a headache*** Ягоны благі́ настро́й пагоршыўся ад бо́лю галавы́. 2. Informal злава́ць, раздражня́ць, дражні́ць

aggravation [ˌægrəˈveɪʃən] n. 1. паго́ршаньне, абвастрэ́ньне, узмо́цненьне *n.* 2. Law пагаршальныя абста́віны. 3. злосьць *f.*, раздра́жненьне *n.*

aggregate [ˈægrɪgət] – n. 1. агу́льная ко́лькасьць, су́ма *f.* 2. аб'ядна́ная ма́са́, суку́пнасьць *f.*: ***in the aggregate*** ра́зам; у цэ́лым, суку́пна. 3. Geol. ска́ла-зро́стак, агрэга́т -у *m.*

– adj. 1. супо́льны, агу́льны: ***aggregate income*** супо́льны прыбы́так. 2. агрэга́тны, складны́

– v.t. [ˈægrɪgeɪt] злуча́ць, задзіно́чваць, аб'яднó́ўваць

– v.i. злуча́цца, задзіно́чвацца, аб'яднó́ўвацца

aggregation [ˌægrɪˈgeɪʃən] n. злучэ́ньне, задзіно́чаньне, аб'ядна́ньне *n.*

aggress [əˈgres] v.i. 1. напада́ць. 2. пачына́ць сва́рку

aggression [əˈgreʃən] n. 1. напа́д -у *m.*, агрэ́сія *f.* 2. агрэсі́ўнасьць *f.* 3. замáх -у *m.*: ***aggression upon their liberties*** замáх на íхныя свабо́ды

aggressive [əˈgresɪv] adj. 1. захо́пніцкі, агрэсі́ўны; задзі́рлівы. 2. энэргі́чны, насто́йлівы: ***an aggressive campaign*** энэргі́чная кампа́нія; ***an aggressive person*** насто́йлівы чалаве́к

aggressor [əˈgresər] n. захо́пнік -а, агрэ́сар -а *m.*

aggrieve [əˈgri:v] v.t. засмуча́ць; прыгнята́ць, крыўдзіць

aggrieved [əˈgri:vd] adj. скрыўджаны; засму́чаны

aghast [əˈgæst] adj. спало́ханы; аслупяне́лы

agile [ˈædʒəl] adj. 1. жва́вы, рухавы; спрыт ны: ***An acrobat has to be agile*** Акраба́т павінен быць спрытны. 2. Figur. ке́млівы: ***an agile mind*** спрытны ро́зум

agility [əˈdʒɪlətɪ] n. 1. жва́васьць, рухава́васьць, спрытнасьць, спра́ўнасьць *f.*: ***the agility of a monkey*** спрытны, як ма́лпа. 2. Figur. гну́ткасьць *f.*, спрыт -у *m.*: ***a great mental agility*** вялі́кая гну́ткасьць ро́зуму

aging [ˈeɪdʒɪŋ] n. 1. старэ́ньне *n.*; працэ́с высьпе́льваньня: ***the aging of meat (cheese)*** высьпе́льваньне мя́са (сы́ру)

agitate [ˈædʒɪteɪt] v.t. 1. ру́хаць; узварушы́ць, устраса́ць. 2. хвалява́ць, трыво́жыць; непако́іць: ***to be agitated by the bad news*** усхвалява́цца благо́ю ве́сткаю. 3. публі́чна дыскутава́ць; агітава́ць: ***to agitate for a shorter working day*** агітава́ць за карацэ́йшы працо́ўны дзень

agitation [ˌædʒɪˈteɪʃən] n. 1. хвалява́ньне, узбуджэ́ньне *n.* 2. хвалява́ньне *n.*, узбушава́насьць *f.*: ***the agitation of the sea*** узбушава́насьць мо́ра. 3. агіта́цыя *f.*, публі́чныя дыску́сіі, спрэ́чкі

agitator [ˈædʒɪteɪtər] n. 1. падбухто́рнік -а, агіта́тар -а *m.* 2. Tech. мяша́лка *f.*

agleam [əˈgli:m] – adv. бліскатлі́ва, паблі́скваючы; зіхо́тка
– adj. бліскатлі́вы, зіхатлі́вы, зіхо́ткі: ***Christmas tree agleam with lights*** Яло́нка паблі́сквала агня́мі

aglet [ˈæglət] n. бля́шка на канцы́ матузка́

aglimmer [əˈglɪmər] – adv. мігатлі́ва
– adj. мігатлі́вы

aglitter [əˈglɪtər] – adv. у бля́ску, у зьзя́ньні
– adj. бліску́чы, блішча́сты

aglow [əˈgloʊ] – adv. у палымя́ным бля́ску
– adj. 1. палымя́на-бліску́чы. 2. распа́лены дачы́рвана *або́* дабяла́

agnostic [ægˈnɑ:stɪk] – n. агно́стык -а *m.*
– adj. агнастычны

agnosticism [ægˈnɑ:stɪˌsɪzəm] n. агнастыцы́зм -у *m.*

ago [əˈgoʊ] adj., adv. таму́: ***two years ago*** два гады́ таму́; ***long ago*** даўно́

agog [əˈgɑ:g] – adj. нецярпли́вы, па́лкі; усхвалява́ны, праня́ты: ***They were all agog to see her*** Ім не цярпе́лася паба́чыць яе
– adv. нецярпли́ва; зь вялі́кім жада́ньнем, ціка́васьцяй; узбу́джана

agonize [ˈægənaɪz] – v.i. 1. аганізава́ць, мо́цна паку́таваць, цярпе́ць (*фізы́чна або́ мара́льна*). 2. Figur. ро́спачна імкну́цца, змага́цца, му́чыцца: ***to agonize over a problem*** му́чыцца над праблёмай; бі́цца, як ры́ба аб лёд
– v.t. му́чыць, зьдзе́кавацца

agony [ˈægənɪ] n., pl. **-nies** 1. вялі́кія пакуты, цярпе́ньні *pl.* (*духо́выя або́ фізы́чныя*), ро́спач *f.*: ***the agony of defeat*** ро́спач стра́ты
• ***the agonies*** аго́нія *f.*, перадсьмяро́тныя пакуты

agoraphobia [ˌægərəˈfoʊbiə] n. агарафо́бія *f.*, бо́язь адкры́тай праст о́ры

agrarian [əˈgreriən] – adj.1. агра́рны, зямэ́льны: ***agrarian laws*** зямэ́льныя зако́ны; ***an agrarian movement*** агра́рны рух (*у падтры́мку землярабаў або́ за разьвіцьцё землярабства*). 2. земляро́бскі. 3. (*пра расьлі́ны*) дзікі́, палявы́
– n. прыхі́льнік агра́рнае рэфо́рмы

agree [əˈgri:] v.i. 1. згаджа́цца: ***I agree with you*** Я згаджа́юся з ва́мі (табо́ю). 2. супада́ць, быць адно́лькавым: ***Your story agrees with mine*** Твой ро́спавед супада́е з маі́м. 3. жыць у зго́дзе, ла́дзіць: ***They agree well*** Яны́ до́бра ла́дзяць. 4. дамаўля́цца: ***at the agreed time*** у дамо́ўленым ча́се. 5. згаджа-

цца: ***to agree on the terms*** згадзі́цца на ўмо́вы. 6. Gram. дапасо́ўвацца: ***Verbs agree with nouns*** Дзеясло́вы дапасо́ўваюцца да назо́ўнікаў
– v.t. прызнава́ць, дапушча́ць: ***John agreed that he had been wrong*** Янка прызна́ў, што ён памыля́ўся
• ***agree with*** быць карысным, ісьці́ на здаро́ўе: ***Wine does not agree with me*** Ад віна́ мне быва́е нядо́бра

agreeable [əˈgri:əbəl] adj. 1. прые́мны: ***a charming and agreeable young man*** мі́лы й прые́мны малады́ чалаве́к. 2. згаво́рлівы; памяркко́ўны; зго́дны: ***agreeable to the suggestion*** зго́дны на прапано́ву. 3. адпаве́дны: ***music agreeable to the occasion*** му́зыка, адпаве́дная для наго́ды

agreeably [əˈgri:əbli] adv. 1. прые́мна. 2. адпаве́дна

agreed [əˈgri:d] adj. зго́дны; дамо́ўлены за агу́льнай зго́дай: ***Are you all agreed?*** Ці вы ўсе́ зго́дныя?; ***to pay the agreed price*** заплаці́ць дамо́ўленую цану́

agreement [əˈgri:mənt] n. 1. зго́да, зго́днасьць *f.* 2. умо́ва *f.*, пагадне́ньне *n.*: ***trade agreement*** гандлёвае пагадне́ньне; ***to remove any obstacle to an agreement*** адхілі́ць уся́кую перашко́ду да пагадне́ньня. 3. Gram. дапасава́ньне *n.* 4. сугу́чнасьць, гармо́нія, адпаве́днасьць *f.*

agricultural [ˌægriˈkʌltʃərəl] adj. земляро́бскі; сельскагаспада́рчы: ***an agricultural region*** земляро́бскі раён; ***an agricultural college*** сельскагаспада́рчы кале́дж

agriculture [ˈægrɪˌkʌltʃər] n. 1. земляро́бства *n.* 2. се́льская гаспада́рка

agriculturist [ˌˈægrɪˈkʌltʃərɪst] n. 1. земляро́б -а *m.* 2. агроно́м -а *m.*

agrimony [ˈægrəmouni] n., pl. **-nies,** Bot. дзяды́, дзядкі́ *pl.*

agronomical [ˌægrəˈnɑ:mɪkəl] adj. агранамі́чны

agronomics [ˌægrəˈnɑ:mɪks] n. аграно́мія *f.*

agronomist [əˈgrɑ:nəmɪst] n. агроно́м -а *m.*, студэ́нт агроно́міі

agronomy [əˈgrɑ:nəmi] n. агроно́мія *f.*

aground [əˈgraund] adv., adj. на мелі́ну́; на мелі́не́: ***The ship ran aground*** Карабе́ль сеў на мелі́ну́

ague [ˈeɪgju:] n. 1. малярыя́, бало́тная ліхама́нка *f.* 2. тра́сца *f.*, дрыжыкі *pl.*

aguish [ˈeɪgjuɪʃ] adj. 1. малярыйны. 2. ліхама́нкавы. 3. дрыго́ткі

ah [ɑ:] interj. a! ах !

aha [ɑ:ˈhɑ:] interj. ага́ !

ahead [əˈhed] adv. сьпе́раду, напе́радзе; пе́рад: ***Walk ahead of me*** Ідзі́ сьпе́раду мяне́
• ***get ahead*** Informal вы́сунуцца напе́рад, зрабіць кар'е́ру
• ***get ahead of*** перагна́ць; вы́перадзіць
• ***Go ahead!*** а) Напе́рад. б) Праця́гвайце, рабе́це; Ідзе́це; Гаварэ́це дале́й: ***Go ahead with this work*** Праця́гвайце гэ́тую пра́цу дале́й

aheap [əˈhi:p] – adj. зава́лены: ***a room aheap with books*** пако́й, зава́лены кні́гамі
– adv. у ку́чы, ку́чай

ahem [əˈhem] interj. кхэ-кхэ (*пака́шліваньне, каб прыцягну́ць ува́гу*)

aid [eɪd] – v. 1. дапамага́ць; падтрымо́ўваць: ***to aid flood victims*** дапамага́ць ахвя́рам павóдкі
– n. 1. дапамо́га *f.* 2. памага́тыы -ага; памо́чнік -а *m.*, памо́чніца *f.* 3. а) ад'ютáнт -а *m.* б) Brit. асыстэ́нт -а *m.*; асыстэ́нтка *f.*
• ***in aid of*** у падтры́мку *каго-чаго*

aide-de-camp [ˌeɪddəˈkæmp] n., pl. **aides-** 1. ад'ютáнт -а *m.* 2. Brit., Informal асыстэ́нт (*у ча́се спэцыя́льнай нагóды*)

aide [eɪd] n. 1. ад'ютáнт -а *m.* 2. асыстэ́нт, дара́днік-а *m.*: ***a presidential aide*** дара́днік прэзыдэ́нта

AIDS [eɪdz] n. СНІД -у *m.*

aigrette [ˈeɪgrət] n. плюма́ж -ý, султáн -у *m.* (*аздóба на галаву́*)

aiguille [ˈeɪgwi:l] n. сьпічáстая верхаві́на, гóрскі пік

ail [eɪl] v. 1. балéць, далягáць: ***What ails you ?*** а) Што табé далягáе? б) У чым

спра́ва? 2. цярпе́ць, быць хво́рым, хварэ́ць, недамага́ць: ***She ailed for years*** Яна́ недамага́ла гада́мі

aileron ['eɪlərɑ:n] n. элеро́н -а *m.* (*рухо́мая ча́стка крыла́ самалёта*)

ailing ['eɪlɪŋ] adj. 1. хво́ры. 2. хвараві́ты

ailment ['eɪlmənt] n. недамага́ньне *n.*, хво́расьць, не́мач *f.*

aim [eɪm] – v.t. 1. прыцэ́льваць, накіро́ўваць, скіро́ўваць: ***to aim a gun*** прыцэ́льваць гарма́ту; ***to aim a talk (speech) at*** скірава́ць гу́тарку да *кагó*, гаварыць да *кагó*

– v.i. 1. цэ́ліцца, прыцэ́львацца. 2. імкну́цца да чагó; стара́цца: ***She aims for perfection*** Яна́ імкне́цца да даскана́ласьці; ***We aim to please*** Мы стара́емся дагадзіць. 3. Informal намéрвацца, мець намéр; зьбіра́цца: ***I aim to go*** Зьбіра́юся пайсьці́

– n. 1. прыцэ́льваньне *n.* 2. прыцэ́л -у *m.*: ***to take aim (at)*** браць на прыцэ́л, прыцэ́львацца, нацэ́ліцца *на кагó-што.* 3. мэ́та *f.*; намéр -у *m.*

• ***take aim*** цэ́ліцца, прыцэ́львацца

aimless ['eɪmləs] adj. бязмэ́тны; пусты́: ***aimless talk*** пуста́я гу́тарка

ain't [eɪnt] Nonstandard or dialect. *сьця́гнутая фóрма ад* 1. ***am not, is not***. 2. *ад* ***are not***. 3. ад ***have not, has not***

air [er] – n. 1. павéтра *n.*; атмасфэ́ра *f.*; нéба *n.*: ***Birds fly in the air*** Птýшкі лётаюць у павéтры. 2. рух павéтра, вéтрык -а *m.*: ***a hot day without a breath of air*** гара́чы дзень без найме́ншага павéву вéтрыку. 3. этэ́р -у *m.*: ***to be/go on the air*** быць у этэ́ры. 4. Figur. публі́чнае выка́званьне: ***He gave air to his opinions*** Ён публі́чна вы́казаў сваю́ сваé пагля́ды. 5. вы́гляд -у *m.*; мі́на, по́за; манéра *f.*: ***to assume solemn air*** прыня́ць урачы́сты вы́гляд. 6. мэлёдыя *f.*: ***a traditional air*** стара́я мэлёдыя

– v.t. 1. правéтрываць, прасýшваць: ***to air a room*** правéтрыць пако́й. 2. выка́зваць, абвяшча́ць: ***Do not air your troubles*** Не агало́швай сваíх бéдаў. 3. вéсьці на прагуля́нку. 4. Informal перадава́ць у ра́дыё або́ тэлевíзіі

– v.i. правéтрыцца; прайсьці́ся, праéхацца

– adj. 1. авіяцы́йны; з самалёту: ***air photography*** аэрафотаздымка *f.* 2. павéтраны, у павéтры: ***air dominance*** перава́га ў павéтры; ***air alert*** павéтраная трывóга

• ***airs*** , pl. манéрнасьць *f.*, задава́ньне *n.*: ***to put on/give oneself airs*** задзіра́ць нос, фанабэ́рыцца; ***air and graces*** фанабэ́рыі

• ***by air*** самалётам

• ***clear the air*** вы́сьветліць пыта́ньне, зала́дзіць праблéму

• ***get the air***, Sl. а) быць звóльненым з пра́цы. б) быць адкі́нутым (*пры сва́таньні*)

• ***give the air***, Sl. вы́кінуць з пра́цы

• ***in the air*** а) пашы́раны: ***Wild rumors were in the air*** Шы́рыліся дзíкія чýткі. б) няпэ́ўны; ***Our plans are still up in the air*** На́шыя пля́ны яшчэ́ ў павéтры

• ***off the air*** а) не ў эфíры. б) не працава́ць (*пра радыёста́нцыю*)

• ***on the air*** быць у эфíры, перадава́ць: ***Is that show still on the air?*** Ці гэ́тая праграма яшчэ́ перадаéцца?

• ***take the air*** а) вы́йсьці на сьвéжае павéтра. б) пача́ць перадава́ць па ра́дыё

• ***up in the air*** a) Informal няпэ́ўны, няўла́джаны. б) Informal вéльмі злóсны, ўсхвалява́ны

• ***walk on air*** быць на сёмым нéбе

air bag авары́йная паду́шка (*у аўтамабілі*)

air base авіяба́за *f.*

airborne ['erbɔ:rn] adj. 1. а) узьня́ты ў павéтра. б) перавóжаны самалётам: ***airborne troops*** вóйска, перавóжанае самалётам. в) паветрана-дэса́нтны. 2. перанóшаны павéтрам: ***airborne seeds*** насéньне, перанóшанае вéтрам

air brake пнэўматы́чны тóрмаз

airbrush ['erbrʌʃ] n. распыля́льнік фа́рбы (*для малява́ньня*)

air compressor кампрэ́сар -а *m.*
aircondition ['erkən,dɪʃən] v.t. 1. ста́віць кандыцыянэ́р. 2. кандыцыянава́ць паве́тра
airconditioned [,erkən'dɪʃənd] adj. кандыцыянава́ны, які́ ма́е кандыцыянэ́р
air conditioner кандыцыянэ́р -а *m.*
air conditioning кандыцыянава́ньне паве́тра
air-cool ['erku:l] v.t. ахало́джваць паве́трам
aircraft ['erkræft] n., pl. **aircraft** лята́льны апара́т, самалёт; авія́цыя
aircraft carrier авіяно́сьбіт -а *m.*
aircrew ['erkru:] n. экіпа́ж самалёта
air cushion надзіма́ная паду́шка
air defense супрацьпаве́траная абаро́на
air-driven ['erdrɪvən] adj. пнэ́ўматы́чны: ***an air-driven dental drill*** пнэ́ўматы́чны зубны́ сьве́рдзел
airfare ['erfer] цана́ самалётнага біле́ту
airfield ['erfi:ld] n. лётнішча, лётнае по́ле *n.*
airflow ['erflou] n. пато́к паве́тра
air force вае́нна-паве́траныя сілы, вае́нная авія́цыя
air gun 1. пнэ́ўматы́чная стрэ́льба. 2. пульвэрыза́тар -а *m.*
airhole ['erhoul] n. 1. праду́ха *f.*, душні́к -а́ *m.* 2. пало́нка *f.*, про́луба *f.* 3. паве́траная я́ма
airing ['erɪŋ] n. 1. праве́трыванье *n.*, вэнтыля́цыя *f.*: ***She gave the rug a thorough airing*** Яна́ до́бра праве́трыла дыва́н. 2. прагуля́нка на сьве́жым паве́тры. 3. Figur. пада́ньне да агу́льнага ве́дама, публі́чная дыскуся́: ***The whole matter is due for an airing*** Уся́ спра́ва ма́е быць пада́дзеная да агу́льнага ве́дама
air lane авіятра́са, рэгуля́рны маршру́т самалёта
airless ['erləs] adj. 1. бяз сьве́жага паве́тра; ду́шны. 2. бязьве́траны, спако́йны
airlift ['erlɪft] n. паве́траны мост; пераки́дка паве́трам
airline ['erlam] n., or **air line** 1. сыстэ́ма паве́транага тра́нспарту. 2. авіякампа́нія
airliner ['erlaɪnər] n. пасажы́рскі самалёт
air mail ['ermeɪl] n. паве́траная по́шта, авіяпо́шта
air-mail ['ermeɪl] – v.t. пасыла́ць паве́транай по́штай
– adj. а́віяпо́штавы: ***airmail letter*** ліст паве́транай по́штай
airman ['ermən] n., pl. **-men** 1. авія́тар -а, лётчык -а *m.* 2. радавы́ ў авія́цыі
airplane ['erpleɪn] n. самалёт -а *m.*
air pocket паве́траная я́ма
air pollution забру́джанасьць паве́тра
airport ['erpɔ:rt] n. лётнішча *n.*
air post ['erpoust] n., Brit. авіяпо́шта *f.*
air pressure 1. ціск паве́тра. 2. атмасфэры́чны ціск
airproof ['erpruf] – adj. гэрмэты́чны, паве́транепранікальны
– v.t. гэрмэтызава́ць, выка́чваць паве́тра
air pump паве́траная по́мпа
air raid паве́траны налёт
air-raid alarm паве́траная трывога
air-raid shelter бамбасхо́вішча *n.*
air rifle *гл.* **air gun**
airscrew ['erskru:] n., Brit. прапэ́лер -а *m.* (*самалёта*)
air shaft вэнтыляцыйная ша́хта
airship ['erʃɪp] n. дырыжа́бль -я *m.*, паве́траны карабе́ль
air shuttle чаўно́чныя авіярэ́йсы
airsick ['ersɪk] adj. загайда́ны, які́ це́рпіць паве́траную хваро́бу
airspace паве́траная прасто́ра
air speed ху́ткасьць у паве́тры
airstrip ['erstrɪp] n. узьлётна-паса́дачная паласа́
airtight ['ertaɪt] adj. 1. шчы́льны, гэрмэты́чны. 2. Figur. пэ́ўны, до́бра забясьпе́чаны, без слабы́х пу́нктаў, непрабі́ўны, «жале́зны»: ***an airtight defense*** до́бра забясьпе́чаная абаро́на
airway ['erweɪ] n. паве́траная лі́нія, авіятра́са *f.*

airworthy [ˈerˌwɜ:rðɪ] adj. здáтны для палёту

airy [ˈeri] adj. 1. вéтраны, з правéвам: ***a large airy room*** вялíкі пакóй з правéвам. 2. лёгкі; далікáтны: ***an airy tune*** лёгкая мэлёдыя. 3. уя́ўны, нерэáльны: ***airy phantoms of the mind*** уя́ўныя прывíды фантáзіі. 4. бестурбóтны; вясёлы: ***airy laughter*** бестурбóтны сьмех. 5. Figur. ненатурáльны, прытвóрны: ***an airy tone of voice*** ненатурáльны тон гóласу. 6. ганары́сты, фанабэ́рысты

aisle [aɪl] n. 1. прахóд -у *m.* (*паміж радáмі крэ́слаў*). 2. прыдзéл -а *m.*, бакавы́ нэф (*царквы́*)

ajar I [əˈdʒɑ:r] adj., adv. прачы́нены (*праз дзьвéры*)

ajar II [əˈdʒɑ:r] adv. бязлáдна

a.k.a. or **aka (also known as)** [ˌeɪˌkeɪˈeɪ] таксáма вéдамы як (*пра мянýшку*)

akimbo [əˈkɪmboʊ], adj., adv. узя́ўшыся ўбóкі: ***to stand with arms akimbo*** стая́ць узя́ўшыся ўбóкі

akin [əˈkɪn] adj. 1. свая́цкі; рóдны. 2. падóбны. 3. Gram. аднакарэ́нныя слóвы

alabaster [ˈæləbæstər] – n. алябáстар -у, гíпс -у *m.*

– adj. 1. алябáстравы: ***an alabaster vase*** алябáстравая вáза. 2. Figur. алябáстравы, глáдка-бéлы

alabastrine [ˌæləˈbæstrɪn] adj. алябáстравы

alacrity [əˈlækrətɪ] n. 1. жвáвасьць *f.*: ***to move with alacrity*** жвáва рýхацца. 2. ахвóтнасьць, гатóвасьць *f.*

Aladdin's lamp [əˈlædɪnz læmp] n. чарадзéйная Алядзíнава лáмпа

alarm [əˈlɑ:rm] – n. 1. пярэ́палах -у, перапýд -у *m.*; пáніка *f.*: ***to dart off in alarm*** кíнуцца наўцёкі зь перапýду. 2. трывóга *f.* 3. сыгнáл трывóгі: ***a burglar alarm*** супрацькрадзéжная сыгналізáцыя. 4. зáклік да збрóі

– v.t. 1. палóхаць, непакóіць: ***to be alarmed*** палóхацца, непакóіцца. 2. падымáць трывóгу, перасьцерагáць аб небясьпéцы

• ***alarm clock*** будзíльнік -а, бýднік -а *m.*

alarmist [əˈlɑ:rmɪst] n. панікёр -а *m.*

alary [ˈeɪlərɪ] adj. крылападóбны; у фóрме крылá

alas [əˈlæs] interj. нажáль; авóхці: ***but alas*** ды дзе там; áле нажáль

alb [ælb] n. Relig. áльба *f.*

albacore [ˈælbəkɔ:r] n., pl. **-cores** альбакóр -а *m.* (*вялíкая марскáя рыбá з рóду тунцóў*)

Albanian [ælˈbeɪnɪən] – adj. альбáнскі

– n. 1. альбáнец -ца *m.*, -ка *f.* 2. альбáнская мóва

albatross [ˈælbətrɑ:s] n., pl. **-trosses** or (collectively) **-tross** альбатрóс -а *m.*

albeit [ɔ:lˈbi:ɪt] conj. хоць

albescent [ælˈbesənt] adj. белавáты, выбелены (*на сóнцы*)

albino [ælˈbaɪnoʊ] n., pl. **albinos** альбінóс - а *m.*

Albion [ˈælbɪən] n., Poet. Альбіён, Англéльшчына *f.*

album [ˈælbəm] n. 1. альбóм -у *m.* 2. альбóм, кружэ́лка

albumen [ælbˈju:mən] n. 1. бялóк яйкá. 2. Chem. альбýмін -а *m.*, бялóк -кá *m.*, бялкóвае рэ́чыва

albumin [ælbˈju:mən] n. Chem. альбумíн -у *m.*

albuminize [ælbˈju:mɪnaɪz] v.t. 1. ператвараáць у альбýмін. 2. пакрываáць бялкóвым растворам

albuminous [ælbˈju:mɪnəs] adj. or **albuminose** [-noʊz] бялкóвы, альбýмінавы

alchemic [ælˈkemɪk] adj. алькімíчны

alchemist [ˈælkəmɪst] n. алькíмік -а *m.*

alchemy [ˈælkəmi] n. 1. алькíмія *f.* 2. Figur. магíчная сíла

alcohol [ˈælkəhɔ:l] n. 1. алькагóль -ю; сьпірт -у *m.*: ***wood alcohol*** драўля́ны сьпірт. 2. алькагóльны напóй

alcoholic [ˌælkəˈhɑ:lɪk] – adj. з алькагóлю, алькагóльны: ***alcoholic fumes*** пáра з алькагóлю; ***alcoholic drinks*** алькагóльныя напóі

– n. алькагóлік-а *m.*, алькагалíчка *f.*, п'я́ніца -ы *m. & f.*

alcoholism [ˈælkəhɑːˌlɪzəm] n. алькагалі́зм -у *m.*

Alcoran [ˌælkoˈræn] n. Кара́н -у *m.*

alcove [ˈælkouv] n. мала́я камо́рка; алько́лў -ва *m.*, ні́ша *f.*

alder [ˈɔːldər] – n. во́льха, але́шына *f.*: ***alder grove*** але́шнік -а *m.*
– adj. альхо́вы, але́шнікавы

alderman [ˈɔːldərmən] n., pl. **-men** 1. радзкі́ ра́дны, о́лдэрмэн. 2. Brit. наме́сьнік бурмі́стра

ale [eɪl] n. э́ль -ю (*мо́цнае пі́ва*)

aleak [əˈliːk] adv., adj. дзіра́вы, які́ працяка́е: ***the roof is aleak*** страха́ працяка́е

aleatory [ˈeɪlɪətərɪ] adj. выпадко́вы, рызыко́ўны

alehouse [ˈeɪlhaus] n. піўна́я *f.*, бар -у *m.*

alert [əˈlɜːrt] – adj. 1. пі́льны, чу́йны. 2. жва́вы, шпа́ркі, паваро́тлівы
– n. 1. сыгна́л трывогі. 2. час трывогі. 3. Milit. сыгна́л гато́васьці да бо́ю
– v.t. 1. перасьцерага́ць. 2. прыво́дзіць (*во́йска*) ў стан гато́васьці
• ***be on the alert*** быць напагато́ве
• ***keep on the alert*** трыма́ць напагато́ве

Aleut [əˈluːt] n. 1. алеу́т -а *m.*, жыха́р Алеу́цкіх абто́каў. 2. алеу́цкая мо́ва

Aleutian [əˈluːʃən] adj. алеу́цкі

Aleutian Islands Алеу́ты

alewife [ˈeɪlwaɪf] n., pl. **-wives** карчма́рка *f.*

alexandrine [ˌælɪgˈzændraɪn] n. алекса́ндрыйскі верш (*шасьці́сто́пны я́мб з цэзу́рай пасьля́ трэ́цяй стапы́*)

alfalfa [ælˈfælfə] n., Bot. люцэ́рна *f.*

alga [ˈælgə] n., pl. **algae** [ˈældʒiː] во́дарасьць *f.*

algebra [ˈældʒɪbrə] n. а́льгебра *f.*

algebraic [ˌældʒɪˈbreɪɪk] adj. альгебраі́чны: ***algebraic expression*** альгебраі́чная фо́рмула

Algerian [ælˈdʒɪrɪən] – adj. альжы́рскі
– n. альжы́рлац -ца *m.*, альжы́рка *f.*

algorithm [ˈælgəˌrɪðəm] n. альгары́тм -у *m.*

algorithmic [ˌælgəˈrɪðmɪk] adj. альгарытмі́чны

alias [ˈeɪlɪəs] – n., pl. **-ases** мяну́шка *f.*, псэўдані́м -у *m.*
– adv. іна́кш ка́жучы, або́

alibi [ˈæləbaɪ] n., pl. **-bis** 1. Law а́лібі *indecl.* 2. Informal адгаво́рка *f.*, вы́крут -у *m.*

alien [ˈeɪlɪən] – n. 1. іншазе́мец, чужазе́мец, чужы́нец -ца *m.* 2. прыха́дзень з ко́смасу
– adj. 1. чужы́, заме́жны.: ***an alien language*** чужа́я мо́ва; ***alien domination*** чужа́я ўла́да, чужо́е панава́нне. 2. неўласьці́вы, нязвы́чны: ***Unkindness is alien to her nature*** Нявле́тласьць неўласьцівая ёй. 3. іншасьве́тны, іншаплянэ́тны

alienable [ˈeɪlɪənəbəl] adj., Law адчу́жаны, які́ перада́ецца і́ншаму ўла́сьніку

alienate [ˈeɪlɪəneɪt] v.t. 1. адчужа́ць, адштурха́ць, аддаля́ць ад сябе́; настро́йваць, настаўля́ць супро́ць сябе́: ***to alienate public opinion*** наста́віць публі́чную ду́мку су́праць сябе́. 2. перада́ць пра́ва ўла́снасьці

alienation [ˌeɪlɪəˈneɪʃən] n. 1. адчу́жаньне; ахаладжэ́ньне *n.* (*пачуцьця́*). 2. Law перада́ньне пра́ва на ўла́снасьць. 3. Med. вар'я́цтва; памяша́ньне

alienee [ˌeɪlɪəˈniː] n., Law асо́ба, яко́й перада́ецца майно́

alienist [ˈeɪlɪənɪst] n. судо́вы псыхія́тар

alight I [əˈlaɪt] v.i. 1. зыхо́дзіць; зла́зіць: ***to alight from a horse*** саско́чыць з каня́. 2. спуска́цца, садзі́цца (*пра пту́шку*): ***The bird alighted on our window sill*** Пту́шка се́ла на на́ша падвако́ньне. 3. нечака́на натра́піць: ***I alighted on just the book I needed*** Я нечака́на натра́піў на кні́гу, яка́я якра́з мне была́ патрэ́бная

alight II [əˈlaɪt] adv., adj. 1. запа́лены, у вагні́. 2. Figur. асьве́тлены: ***alight with happiness*** сьвяці́цца ад шча́сьця

align or **aline** [əˈlaɪn] – v.t. 1. ста́віць у лі́нію. 2. выраўно́ўваць, падраўно́ўваць: ***to align the wheels of a car*** падраўно́ўваць ко́лы на аўтамабі́лі
– v.i. 1. раўня́цца; утвара́ць лі́нію.

2. прылуча́цца, далуча́цца. 3. злуча́цца ў адно́

alignment or **alinement** [əˈlaɪnmənt] n. 1. уста́ўленьне ў про́стую лі́нію; выраўна́ньне *n.* 2. Milit. лі́нія стро́ю. 3. злучэ́ньне для супо́льных мэ́таў; супо́льнасьць *f.*: ***a new European alignment*** но́вая эўрапе́йская супо́льнасьць. 4. Engin. гарызанта́льная праце́кцыя

alike [əˈlaɪk] – adv. 1. падо́бна. 2. адно́лькава, таксама́

– adj. адно́лькавы, падо́бны: ***These twins are very much alike*** Гэ́тыя блізьня́ты ве́льмі падо́бныя

aliment [ˈælɪmənt] – n. 1. е́жа, пажы́ва *f.* (*таксама духо́вая*). 2. Figur. матэрыя́льная й мара́льная падтры́мка; утрыма́ньне *n.*

– v.t. карміць; жывіць; падтры́мваць, утры́мваць

alimentary [ælɪˈmentəri] adj. 1. харчо́вы; спажы́ўны. 2. які́ ко́рміць, падтры́мвае *або́* ўтры́мвае

• ***alimentary canal*** страва́льны тракт

alimentation [ˌælɪmənˈteɪʃən] n. 1. харчава́ньне, кармле́ньне *n.* 2. утрыма́ньне *n.*: ***the alimentation of poor children*** утрыма́ньне бе́дных дзяцей

alimony [ˈælɪmoʊni] n. 1. алімэ́нты *pl. only.* 2. забясьпе́чаньне сро́дкамі да жыцьця́, утрыма́ньне *n.*

aline [əˈlaɪn] v. *гл.* **align**

aliphatic [ˌælɪˈfætɪk] adj., Chem. алі-фаты́чны,

aliquot [ˈælɪkwɑːt] adj., n. дзе́льнік натура́льнага лі́ку

alive [əˈlaɪv] adj. 1. жывы́: ***Was the snake alive or dead?*** Ці вужа́ка была́ жыва́я ці мёртвая? 2. по́ўны эне́ргіі, дзе́йны, бадзёры. 3. Electr. злу́чаны з крыні́цай то́ку; улу́чаны, дзе́йны

• ***alive to*** сьвядомы *чаго*

• ***alive with*** по́ўны *чаго́*: ***The streets were alive with people*** На ву́ліцах было́ по́ўна людзе́й

• ***keep alive*** падтрымо́ўваць (*агонь, зацікаўле́ньне*)

• ***Look alive!*** Варушы́ся! Жы́ва!

• ***the happiest man alive*** найшчасьлівэ́йшы чалаве́к на сьве́це

alizarine [əˈlɪzərɪn] n. алізары́н -у *m.* (*чырво́ная фа́рба*)

alkali [ˈælkəlaɪ] – n., pl. **-lis** or **-lies** 1. Chem. шчо́лач *f.* 2. саланчако́вая гле́ба, саланчакі́

– adj. шчо́лачны: ***alkali soils*** саланчакі́

alkalize [ˈælkəlaɪz] v. шчалачы́ць; шчалачы́цца

alkaloid [ˈælkəlɔɪd] n. алькалёйд -у *m.*

all [ɔːl] – adj. 1. уве́сь, уся́, усё *(pl.)* ***all Europe*** уся́ Эўро́па; ***all the nation*** уве́сь наро́д. 2. усяля́кі, ко́жны: ***beyond all doubt*** безь ніякага сумле́ву; ***in all respects*** з ко́жнага гле́дзішча. 3. по́ўны: ***with all speed*** на по́ўнай ху́ткасьці. 4. то́лькі, адны́: ***all words and no thoughts*** адны́ то́лькі сло́вы, а ду́мкі нямá

– pron. 1. уве́сь, усе́: ***All of us are going*** Мы ўсе́ ідзём; ***all of the bread*** уве́сь хлеб; ***all the time*** уве́сь час

– n. цэ́ласьць *f.*, усё; усе́: ***all agree*** усе́ згаджа́юцца

– adv. зусім: ***all alone*** зусім сам, сам адзі́н; самасто́йна; ***all tired out*** зусім змо́раны; ***It is all the same to me*** Мне ўсяро́ўна

• ***above all*** перш за ўсё, у пе́ршую чаргу́

• ***after all*** урэ́шце, нарэ́шце; нягле́дзячы на; аднáк

• ***all along*** уве́сь час, ад само́га пача́тку

• ***all but*** блізу́, амáль: ***She is all but nine years old*** Ёй блізу́ дзе́вяць гадо́ў

• ***all in*** Informal замýчаны, загнáны: ***The horse was all in*** Конь быў зусім загнáны

• ***all in all*** а) улічы́ўшы ўсё. б) цáлкам, по́ўнасьцю, зусім: ***to trust all in all*** по́ўнасьцю дава́ць ве́ры каму́

• ***all of*** уве́сь, усю́, усё, усе́, цэ́лы: ***all of fifteen minutes*** усе́ пятнáццаць

хві́лі́наў; ***all of half a page*** цэ́лую паўбачы́ны
• ***all of a sudden*** ра́птам, ні стуль ні сьсюль
• ***all over*** а) усю́ды: ***He looked all over*** Ён шука́ў усю́ды. б) ско́нчаны: ***The game is all over*** Гульня́ ско́нчаная
• ***all right*** до́бра; усё ў пара́дку
• ***all the better*** тым ле́пей
• ***all the same*** а ўсё ж, тым ня менш
• ***all too soon*** зара́на
• ***at all*** наагу́л, нао́гул; цалко́м, зусі́м: ***not at all*** ані́, зусі́м: ***He was not at all disturbed*** Ён зусі́м не пераймо́ўся
• ***for all (that)*** нягле́дзячы *на што*
• ***in all*** усяго́, ра́зам: ***100 men in all*** усяго́ 100 чалаве́к
• ***that is all*** гэ́та ўсё

Allah [ˈælə] n. Алáг, Алáх -а *m.*

all-American [ˌɔ:ləˈmerɪkən] adj. усеамэры-ка́нскі, агульнаамэры-ка́нскі; ты-по́ва амэры-ка́нскі

all-around [ˌɔ:ləˈraʊnd] adj. 1. усебако́вы; здо́льны, зда́тны. 2. універса́льны

allay [əˈleɪ] v.t. 1. суні-ма́ць, суці-ша́ць, супако́йваць: ***to allay all fears*** суці́шыць усю́ трыво́гу. 2. памяншá́ць; аслабля́ць

all-Belarusian [ˌɔ:lbelə ˈru:s(ɪ)ən] adj. усе-белару́скі

all-Canadian [ˌɔ:lkəˈneɪdiən] adj. усека-нады́йскі

all clear [ɔ:lˈklir] n. адбо́й (*пове́транае трыво́гі ці і́ншае небясьпе́кі*)

allegation [ˌæləˈgeɪʃən] n. 1. недака́занае цьве́рджаньне. 2. за́кід *m.*, абві-нава́-чаньне *n.* (*асабл. пе́рад суд о́м*)

allege [əˈledʒ] v.t. 1. цьве́рдзіць, сьцьвяр-джа́ць. 2. сьцьвярджа́ць бяз до́вадаў. 3. спасыла́цца *на што* (*як прычы́ну, до́вад або́ адгаво́рку*): ***to allege illness*** спасыла́цца на хваро́бу

alleged [əˈledʒd] adj. уя́ўны, вы́думаны, меркава́ны, сьцьвярджа́ны (*бяз до́вадаў*): ***The alleged theft never really happened*** Сьцьвярджа́нага крадзяжу́ ў сапра́ўднасьці нікó́лі не было́

allegedly [əˈledʒɪdli] adv. нібы́, нібы́та; бы́ццам, як бы́ццам

allegiance [əˈli:dʒəns] n. 1. ляя́льнасьць, ве́рнасьць *f.* 2. адда́насьць *f.*

allegorical [ˌælə ˈgɔ:rikəl] adj. алегары́чны, іншаказа́льны

allegorize [ˈæləgəraɪz] – v.t. прадстаў-ля́ць алегары́чна
– v.i. гаварыць алего́рыямі

allegory [ˈæləgɔ:ri] n., pl. **-ries** алего́рыя *f.*

alleluia or **alleluiah** [ˌælə ˈlu:jə] interj. алі-лу́я, алелю́я

allergenic [ˌælərˈdʒenɪk] adj. алерге́нны, алергі́чны

allergic [əˈlɜ:rdʒɪk] adj. 1. алергі́чны: ***an allergic reaction*** алергі́чная рэа́кцыя; ***to be allergic to*** мець але́ргію *да чаго́*. 2. Sl. які́ мо́цна ня лю́біць: ***to be allergic to work*** ня любі́ць працава́ць, быць гультаём

allergy [ˈælərdʒi] n., pl. **-gies** 1. але́ргія *f.*, павы́шаная адчува́льнасьць, ура́жлі-васьць *f.* 2. Sl. антыпа́тыя *f.*

alleviate [əˈli:vieɪt] v.t. 1. зьмяншá́ць. 2. лаго́дзіць, аблягча́ць, сьці-ша́ць, су-німа́ць

alleviation [əˌli:viˈeɪʃən] n. аблягча́ньне, зьмякча́ньне, зьме́ншаньне *n.*

alleviative [əˈli:vieɪtɪv] adj. суніма́льны, злаго́джвальны

alley [ˈæli] n., pl. **-leys** 1. вузка́я за́дняя ву́лка; прахо́д між будынкамі. 2. але́я *f.*, прыса́ды *pl. only.* 3. кегельба́н -у *m.*, ке́глевая даро́жка

All Fools' Day Дзень Ду́рняў, пры́ма апры́ліс (*1 красавіка*)

alliance [əˈlaɪəns] n. 1. згуртава́ньне, за-дзіно́чаньне *n.*; хаўру́с, саю́з -у *m.* 2. саю́зьнікі *pl.* 3. сваяцтва *n.*

allied [ˈælaɪd] adj. 1. блізкі́; суме́жны: ***allied sciences*** суме́жныя галі́ны навýкі. 2. саю́зьніцкі, саю́зны: ***allied nations (armies)*** саю́зьніцкія наро́ды (а́рміі); аліяны. 3. спалу́чаны: ***allied banks*** спалу́чаныя ба́нкі

alligator [ˈælɪgeɪtər] n. 1. Zool. аліга́тар -а *m.* 2. ску́ра з аліга́тара
• ***alligator shoes*** чаравікі з аліга́та-равай скýры

• ***alligator wrench*** ключ з зубáмі (*для трýбаў*)

alliterate [əˈlɪtəreɪt] – v.i. ужывáць алітэрáцыю

– v.t. гаварыць *абó* пісáць з алітэрáцыяй

alliteration [əˌlɪtəˈreɪʃən] n. алітэрáцыя *f.*

allocate [ˈæləkeɪt] v.t. 1. выдзяля́ць, разьмяркóўваць, асыгнóўваць: ***millions of dollars allocated among many colleges and hospitals*** мільёны даля́раў асыгнавáныя на шмат якíя кóледжы й шпіталí. 2. выяўля́ць месцазнахóджаньне

allocation [ˌæləˈkeɪʃən] n. 1. разьмеркавáньне, выдзялéньне, асыгнавáньне *n.* 2. датáцыя *f.*

allot [əˈlɑːt] v.t. 1. разьдзяля́ць, прыдзяля́ць: ***to allot profits equally*** разьдзялíць прыбы́ткі парóўну. 2. давáць: ***to allot a task*** даць задáньне

allotment [əˈlɑːtmənt] n. 1. надзялéньне, разьмеркавáньне *n.* 2. вы́дзеленая налéжная чáстка, пóрцыя, дóля

allover [ˌɔːlˈoʊvər] adj. паўсюдны; які́ пакрывáе ўсю́ павéрхню

allow [əˈlaʊ] v.t. 1. дазваля́ць: ***Dogs are not allowed here*** З сабáкамі тут не дазвóлена. 2. выдавáць, выдзяля́ць: ***His father allows him $2 a week*** Бáцька даé ямý 2 даля́ры на ты́дзень. 3. дапускáць, прымáць: ***The judge allowed the claim of the man*** Судзьдзя́ прыня́ў скáргу чалавéка. 4. улíчваць, браць пад увáгу; дапушчáць: ***to allow a car to be stolen*** дапусьцíць, каб áўта скрáлі

• ***allow for*** узя́ць пад увáгу, напусьцíць: ***to allow for shrinking*** напусьцíць на зьбяганьне

allowable [əˈlaʊəbəl] – adj. дазвóлены, дапушчáльны

– n. дазвóленае, дапушчáльнае

allowance [əˈlaʊəns] n. 1. кішэ́нныя грóшы. 2. дапамóга *f.*, дадáтак -ку *m.*: ***family allowance*** грашóвая дапамóга сéм'ям. 3. адлічэ́ньне *n.*, скíдка *f.*: ***an allowance of $500 on the old car*** скíдка 500 даля́раў за стары́ аўтамабíль. 4. талераванье *n.*: ***allowance of slavery*** талераванье нявóльніцтва

• ***make allowance (for)*** браць пад увáгу, лічы́цца з чым: ***to make allowance for the wishes of others*** лічы́цца з жадáньнем íншых

alloy [ˈælɔɪ] – n. 1. сплаў -ву *m.* 2. дамéшка *f.*

– v.t. [əˈlɔɪ] 1. сплаўля́ць. 2. мяшáць. 3. Figur. паніжáць гатýнак *абó* вáртасьць (*тáннымі дамéшкамі*)

all-powerful [ˌɔːlˈpaʊərfəl] adj. усяўлáдны, усемагýтны

all-purpose [ˌɔːlˈpɜːrpəs] adj. універсáльны, да ўсягó: ***an all-purpose flour*** мукá для рóзнага ўжы́тку

all-right [ɔːlˈraɪt] adj. 1. сумлéнны, добрасумлéнны. 2. вéльмі дóбры. 3. здарóвы: ***I was ill, but I'm all right now*** Я хварэ́ў, але цяпéр ужó здарóвы. 4. задавальня́льны, зусíм дóбры, прымáльны

all right, adv. 1. прáвільна. 2. алé, няхáй; дóбра: ***All right, I'll come*** Дóбра, я прыйдý. 3. без сумнéву, напэ́ўна

all-round [ˌɔːlˈraʊnd] adj. усебакóвы, універсáльны

all-rounder n., esp. Brit. чалавéк з рознабакóвымі здóльнасьцямі

All Saints' Day Дзень Усíх Сьвяты́х

all-spice [ˈɔːlspaɪs] n. 1. пімэ́нт -у *m.* (*прыпрáва*). 2. ямáйскі пéрац; пахýчы пéрац

all-star [ˌɔːlˈstɑːr] adj. зóркавы, вы́браны: ***all-star team*** вы́браная камáнда, камáнда ўсіх зóрак

allude [əˈluːd] v.i. рабíць намíнку, намёк; спасылáцца

allure [əˈlʊr] – v.t. 1. нáдзіць, вáбіць, спакушáць: ***The circus so allured him that he wished to join it*** Цырк так ягó нáдзіў, што ён хацéў далучы́цца да ягó. 2. захапля́ць, прыця́гваць, ачарóўваць

– v.i. быць чарóўным, панáдным

– n. панáднасьць, прынáднасьць, спакýса *f.*

allurement [əˈlʊrmənt] n. 1. чар -у *m.*, захапле́ньне *n.* 2. прына́джваньне, спаку́шваньне *n.* 3. прына́да, спаку́са *f.*

alluring [əˈlʊrɪŋ] adj. 1. прына́дны, пана́дны, спаку́сьлівы: ***alluring terms*** прына́дныя ўмо́вы. 2. чаро́ўны; захапля́льны

allusion [əˈlu:ʒən] n. намі́нка *f.*, намёк -у *m.*

allusive [əˈlu:sɪv] adj. з намі́нкай, по́ўны намі́нак

alluvial [əˈlu:viəl] – adj., Geol. 1. нанесены, намы́ты, алювія́льны. 2. нано́сны: ***alluvial deposit*** намы́тыя вадо́ю нано́сы

– n. нано́сная гле́ба

alluvion [əˈlu:viən] n. 1. нано́с -у, намы́ў -ву. 2. павО́дка *f.*, развО́дзьдзе *n.*

alluvium [əˈlu:viəm] n., pl. **-viums, -via** намы́ты мул, зямля́

ally I [əˈlaɪ] – v.t. **-lied, -lying** 1. злуча́ць: ***to ally oneself*** уступа́ць у хаўру́с, саю́з; заключа́ць умо́ву. 2. Pass. быць зьвя́заным: ***Norwegian is nearly allied to Danish*** Нарвэ́ская мо́ва ве́льмі бл і́зкая да да́цкае

– v.i. заключа́ць хаўру́с, саю́з: ***to ally against the common enemy*** заключы́ць саю́з супро́ць супо́льнага во́рага

ally II [ˈælaɪ] n., pl. **-lies** 1. хаўру́сьнік -а, саю́зьнік -а *m.* 2. памага́тЫы -ага; памо́чнік -а *m.*, памо́чніца *f.*; прыхі́льнік -а *m.*

almanac [ˈɔ:lmənæk] n. 1. альмана́х -у *m.* 2. каляндА́р календара́ *m.* (*з астранамі́чнымі і і́ншымі да́дзенымі*)

almandine [ˈælməndi:n] n., Min. альманды́н -у *m.*, чырво́ны грана́т

almightiness [ɔ:lˈmaɪtinəs] n. усемагу́тнасьць *f.*

almighty [ɔ:lˈmaɪti] – adj. 1. усемагу́тны: ***God Almighty!*** Усемагу́тны Бо́жа! 2. усяўла́дны

– adv. незвыча́йна: ***an almighty fine girl*** незвыча́йна прыго́жая дзяўчы́на

• ***the Almighty*** Бог, Бо́ства

almond [ˈɑ:mənd] n. мігда́лы *pl.*; мінда́ль -ю *m.*

almost [ˈɔ:lmoʊst] adv. амА́ль, бл і́зу́, ма́ла не, бяз ма́ла, бл і́зка што, ле́дзь не: ***I almost got lost in the forest*** Я ма́ла не заблудзіўся ў ле́се; ***almost never*** амА́ль нікО́лі: ***She has almost no hope*** Яна́ амА́ль ня ма́е ніякае надзе́і

alms [ɑ:mz] n., sing. or pl. мі́ласьць, мі́ласьціна *f.*

almshouse [ˈɑ:mzhaʊs] n. багадзе́льня *f.*, прыту́лак для бе́дных

aloe [ˈæloʊ] n., pl. **-oes,** Bot. альЯ́с, альва́с -у *m.*: ***American aloe*** стале́тнік -у *m.*

• ***aloes*** [ˈælouz] n. pl. (*ужыва́ецца ў адз. лі́ку*) прачышча́льны сродак, праймА́льны срО́дак

aloft [əˈlɑ:ft] adv., adj. 1. высО́ка над зямлёю, высО́ка. 2. Naut. высО́ка над па́лубаю, угарЫ

aloha [əˈlouhɑ:] interj. 1. алО́га (*гава́йскае прывіта́ньне*). 2. быва́й, да пабачЭ́ньня

alone [əˈloʊn] – adj. 1. адзі́н, адна́: ***She was alone*** Яна́ была́ адна́. 2. сам, сама́, самО́: ***One boy alone can do it*** Адзі́н хлапе́ц гЭ́та мО́жа зрабіць сам

– adv. а) аднаму́, аднО́й: ***walk (live) alone*** хадзіць (жыць) аднаму́ абО́ аднО́й. б) тО́лькі, вылу́чна: ***He alone can know it*** ТО́лькі ён мО́жа гЭ́та ве́даць

• ***go it alone*** дзе́йнічаць самастО́йна

• ***leave alone*** не турбава́ць, пакі́нуць у спакО́і; не чапА́ць

• ***let alone*** а) пакі́нуць у супакО́і, не чапА́ць. б) ня ка́жучы ўжО́ пра: ***It would have been a hot day for July, let alone early May*** ГЭ́та быў бы гарА́чы дзень для лі́пеня, ня ка́жучы ўжО́ пра пача́так тра́ўня

• ***Let well enough alone*** Няха́й ужО́ бу́дзе так, як ёсьць

along [əˈlɔ:ŋ] – prep. паўз, уздО́ўж: ***walk along a river*** сьце́жка паўз раку́

– adv. 1. з канца́ ў кане́ц, праз усю́ даўжыню́; уздО́ўж: ***Cars parked along by the station*** З канца́ ў кане́ц уздО́ўж ста́нцыі стаялі аўтамабілі. 2. напе́рад, але́й: ***Let us walk along***

хадзе́м дале́й. 3. ра́зам: ***I'll go along with you*** Я пайду́ з ва́мі ра́зам; ***Take some drink along with the food*** Вазьме́це яко́га напо́ю ра́зам зь е́жай
• ***all along*** усю́ по́ру, уве́сь час
• ***be along*** вярну́цца
• ***get along,*** Informal а) дава́ць ра́ды; до́бра ме́цца. б) ла́дзіць з *кім*, жыць у зго́дзе: ***They get along well as partners*** Яны́ до́бра ла́дзяць як супо́льнікі
• ***go along for the ride*** пайсьці́ за кампа́нію
• ***right along*** без затры́мак: ***The traffic moved right along*** Даро́жны рух ішо́ў без затры́мак
• ***take along*** узя́ць з сабо́ю: ***He took his dog along*** Ён узя́ў з сабо́ю сваёй го́ сраба́ку

alongshore [əˈlɔ:ŋʃɔ:r] adv. 1. уздо́ўж бе́рагу. 2. на бе́разе

alongside [əˈlɔ:ŋsaɪd] – adv. збо́ку, ка́ля бо́ку; бок у бок, по́бач, плячо́ ў плячо́: ***alongside of*** по́бач
– prep. ту́т жа, ка́ля *каго́-чаго́*: ***Park alongside of curb*** Пастаў а́ўта ка́ля бардзю́ра

aloof [əˈlu:f] – adv. здалёк, згары́, збо́ку: ***to stand aloof (from)*** трыма́цца здалёк *ад каго́-чаго́*; цура́цца, ухіля́цца
– adj. адчу́жаны, адда́лены; неспага́длівы, замкнёны ў сабе́; нетава́рыскі, стры́маны

aloofness [əˈlu:fnəs] n. стры́манасьць; неспага́длівасьць, хало́днасьць; нетава́рыскасьць *f.*

aloud [əˈlaʊd] adv. уго́лас; го́ласна: ***to read aloud*** чыта́ць уго́лас; ***to speak aloud*** гаварыць го́ласна

alp [ælp] n. 1. высо́кая гара́. 2. высакагóрная па́ша

alpaca [ælˈpækə] n. 1. Zool. альпа́ка *f.* 2. во́ўна з альпа́кі. 3. альпа́ка (*сукно́*) *f.*

alpenglow [ˈælpəngloʊ] n. альпі́йскае зьзя́ньне

alpenstock [ˈælpənstɑ:k] n. альпэншто́к -а *m.*, альпі́йскі кі́й

alpha [ˈælfə] n. 1. а́льфа *f.* (*пе́ршая лі́тара грэ́цкага альфабе́ту*). 2. пача́так -ку *m.*

alphabet [ˈælfəbet] n. альфабе́т -у *m.*

alphabetical [ˌælfəˈbetɪkəl] adj. альфабе́тны: ***out of alphabetical order*** не ў альфабе́тным пара́дку

alpine [ˈælpaɪn] adj. 1. альпі́йскі. 2. высакагóрны

already [ɔ:lˈredi] adv. ужо́

Alsatian [ælˈseɪʃən] – adj. эльза́скі
– n. жыха́р Эльзасу, эльза́лец -ца *m.*

also [ˈɔ:lsoʊ] adv. таксама́

alt [ælt] adj., Mus. альт -у *m.*

Altaic [ælˈteɪɪk] adj. алта́йскі

altar [ˈɔ:ltər] n. алта́р -а́ *m.*
• ***lead to the altar*** ве́сьці пад вянец

altar boy прыслу́жнік -а *m.* (*у царкве́, касьце́ле*)

altarpiece [ˈɔ:ltərpi:s] n., Relig. запрасто́льная ікона *f.* , разьба́ *f.*

alter [ˈɔ:ltər] – v.t. 1. зьмяня́ць, перарабля́ць; папраўля́ць: ***to alter a coat*** дапасава́ць палітó: ***to alter one's mind*** зьмяні́ць ду́мку. 2. (*пра жывёлу*) а) лягча́ць, пакладаць (*самца́*). б) рабі́ць бясплóднай (*са́мку*)
– v.i. зьмяня́цца

alterable [ˈɔ:ltərəbəl] adj. зьмяня́льны, дапасава́льны

alteration [ˌɔ:ltəˈreɪʃən] n. 1. зьме́на *f.* 2. перарóбка, папра́ўка *f.*

alterative [ˈɔ:ltərətɪv] adj. які́ выклікáе зьме́ну, зьменатво́рны (*лек, рэжы́м*)

altercate [ˈɔ:ltərkeɪt] v.i. спрача́цца, сварыцца

altercation [ˌɔ:ltərˈkeɪʃən] n. сва́рка, спрэ́чка *f.*

alternate [ˈɔ:ltərneɪt] – v.i. 1. чаргава́цца, зьмяня́цца (*па чарзе́*). 2. пераплята́цца: ***Red and black alternate often in Belarusian design*** Чырво́ны і чо́рны ко́леры ча́ста пераплята́юцца ў белару́скіх узо́рах
– v.t. чаргава́ць: ***to alternate work and pleasure*** чаргава́ць пра́цу з прые́мнасьцю

– adj. [ɔ:lˈtərnət] 1. перамéнны. 2. кóжны другí, праз адзíн: ***on alternate days*** празь дзень
– n. застýпнік, замяшчáльнік -а *m.*
• ***alternate angles*** процілéглыя куты́

alternately [ˈɔ:ltərnətli] adv. упераме́шку, напераме́нку

alternating current Electr. перамéнны ток

alternation [ˌɔ:ltərˈneɪʃən] n. чаргава́ньне *n.*, зьмéна *f.*

alternative – adj. [ɔ:lˈtɜ:rnətɪv] 1. альтэрнаты́ўны, другí (*з двух магчымых*). 2. альтэрнаты́ўны, нетрадыцы́йны
– n. 1. альтэрнаты́ва *f.* 2. вы́бар -у *m.*

alternator [ˈɔ:ltərˌneɪtər] n. альтэрна́тар -а *m.*, генэра́тар перамéннага тóку

although [ɔ:lˈðoʊ] conj. хоць, хаця́

altimeter [ælˈtɪmətər] n. альтымэ́тар -ра *m.*

altitude [ˈæltɪtu:d] n. 1. вышыня́ *f.*; вышыня́ над узрóўнем мóра. 2. высóкае мéсца *n.*. 3. Astron. вышыня́ зóркі над гарызóнтам

alto [ˈæltoʊ] – n., pl. **-tos,** Mus. 1. альт -а *m.* 2. сьпява́чка з а́льтам. 3. па́ртыя а́льта. 4. інструмэ́нт для а́льта
– adj. а́льтавы

altogether [ˌɔ:ltəˈgeðər] – adv. 1. зусíм, цалкóм. 2. беручы́ ўсё пад ува́гу. 3. усяго́ ра́зам: ***Altogether there were 10 books*** Усяго́ ра́зам было́ 10 кні́г
– n. цэ́ласьць *f.*
• ***in the altogether*** Informal го́лы

altruism [ˈæltruˌɪzəm] n. альтруі́зм -у *m.*

altruist [ˈæltruɪst] n. альтруі́ст -а *m.*

altruistic [ˌæltruˈɪstɪk] adj. альтруі́стычны

alumina [əˈlu:mɪnə] n. гліназём -у *m.*

aluminium [ˌæləˈmɪniəm] n., esp. Br. алюмíній -ю *m.*

aluminous [əˈlu:mɪnəs] adj. 1. алюмíніевы. 2. гліназе́мны

aluminum [əˈlu:mɪnəm] n. алюмíній -ю *m.*

alumna [əˈlʌmnə] n., pl. **-nae** [əˈlʌmni:] была́я гадава́нка, выпускні́ца *f.* (*навуча́льнай устано́вы*)

alumnus [əˈlʌmnəs] n., pl. **-ni** [əˈlʌmnaɪ] былы́ гадуне́ц, выпускні́к -а́ *m.* (*навуча́льнай устано́вы*)

always [ˈɔ:lweɪz] adv. заўсёды, заўжды́

am [æm, *unstressed* əm] v. *пе́ршая асо́ба адз. лíку ад "to be"*: ***I am*** Я ёсьць

a.m. [ˌeɪˈem] *гл.* **ante meridiem**

amain [əˈmeɪn] adv. 1. з усíх сіл, гвалто́ўна. 2. по́ўным хо́дам. 3. пасьпе́шна

amalgam [əˈmælgəm] n. 1. Chem. амальга́м -у *m.* (*сплаў ірту́ці зь іншым мэта́лам*). 2. Figur. мешані́на *f.*: ***an amalgam of good and evil*** мешані́на дабра́ й зла

amalgamate [əˈmælgəmeɪt] – v. 1. злуча́ць, злуча́цца; зьлівáць, зьлівáцца: ***to amalgamate two competing companies*** злучы́ць дзьве канкурэ́нтныя кампа́ніі. 2. злуча́ць ірту́ць зь і́ншым мэта́лам
– adj. спалу́чаны, злу́чаны, зьлі́ты

amalgamation [əˌmælgəˈmeɪʃən] n. 1. амальгама́цыя *f.*, амальгамава́ньне *n.* 2. мяша́ньне *n.*, мешані́на *f.* 3. злуча́ньне, задзіно́чаньне, зьліцьцё *n.*

amaranth [ˈæmərænθ] n. 1. Bot. амара́нт -у, аксамі́тнік -у *m.* 2. амара́нтавы, барвóвы кóлер -у *m.* 3. Poetic неўвяда́льная кве́тка *f.*

amaranthine [ˌæməˈrænθaɪn] adj. 1. пурпурóвы. 2. неўвяда́льны; неўміру́чы, несьмяро́тны

amass [əˈmæs] v.t. зьбіра́ць; назапа́шваць: ***to amass a fortune*** нажы́ць бага́ццьце

amassment [əˈmæsmənt] n. назапа́шваньне, зьбіра́ньне *n.*

amateur [ˈæmətʃʊr] – n. ама́тар -а, ахво́тнік -а *m.*
– adj. ама́тарскі, непрафэсíйны: ***an amateur orchestra*** ама́тарскі аркéстар

amateurish [ˌæməˈtʊrɪʃ] adj. 1. ама́тарскі, непрафэсíйны. 2. няўме́лы: ***an amateurish attempt*** няўме́лая спро́ба

amateurism [ˈæmətʃʊrˌɪzəm] n. ама́тарства *n.*

amatory [ˈæmətɔ:ri] adj. любóўны; любóсны: ***amatory verses*** любóўныя ве-

ршы; ***an amatory look*** любо́сны по́зірк

amaze [əˈmeɪz] v.t. зьдзіўля́ць, дзівіць: ***amazed look*** зьдзі́ўлены по́зірк: ***to be amazed*** зьдзіўля́цца, дзіва́цца

amazement [əˈmeɪzmənt] n. зьдзіўле́нье *n.*

amazing [əˈmeɪzɪŋ] adj. дзіўны́; дзіво́сны; цудо́ўны; зьдзіўля́льны, надзвыча́йны

ambassador [æmˈbæsədər] n. 1. амбаса́дар -а, пас|о́л -ла́ *m.* 2. прадстаўні́к -а́ *m.*

ambassador-at-large, n., pl. **-dors-at-large** пасо́л для асабліўых даручэ́ньняў, адмыслóвы прадстаўні́к

ambassador extraordinary надзвыча́йны пасо́л

ambassadorial [æmˌbæsəˈdɔːriəl] adj. пасо́льскі, амбаса́дарскі

ambassador plenipotentiary паўнамо́цны пасо́л

amber [ˈæmbər] – n. 1. бурштын -у *m.* 2. бурштынавы, жо́ўты ко́лер – adj. бурштынавы, жо́ўты, жо́ўтарудзі́

ambidexterity [ˌæmbɪdeksˈterətɪ] n. 1. двуру́чнасьць *f.* 2. вялі́кая спра́ўнасьць. 3. Fig. двуду́шнасьць *f.*

ambidextrous [ˌæmbɪˈdekstrəs] adj. 1. двуру́чны. 2. ве́льмі спра́ўны. 3. Fig. двуду́шны

ambience [ˈæmbiəns] n. асяро́дзьдзе *n.*; дух -у *m.*, атмасфэ́ра *f.*

ambient [ˈæmbiənt] adj. навако́льны: ***ambient temperature*** навако́льная тэмпэрату́ра

ambiguity [ˌæmbɪˈgjuːətɪ] n., pl. **-ties** 1. двухсэнсо́ўнасьць, двухзна́чнасьць, няя́снасьць *f.* 2. шматзна́чнасьць *f.*

ambiguous [æmˈbɪgjuəs] adj. 1. двухсэнсо́ўны, неадназна́чны, няя́сны. 2. шматзна́чны

ambit [ˈæmbɪt] n. ме́жы *pl.*, дыяпазо́н -у *m.* 2. прасто́р -у *m.*, сфэ́ра *f.*, по́ле *n.* (*дзе́яньня*). 3. акру́жнасьць *f.*

ambition [æmˈbɪʃən] n. 1. амбі́цыя *f.*, сла́валю́бства *n.*; імкне́ньне да пашаны́ (сла́вы, ула́ды). 2. прадме́т жада́ньня: ***His ambition was to become a writer*** Яго́ным імкне́ньнем было́ стаць пісьме́ньнікам

ambitious [æmˈbɪʃəs] adj. 1. славалю́бны, амбі́тны: ***an ambitious man*** амбі́тны чалаве́к. 2. пра́гны: ***ambitious of power*** пра́гны да ўла́ды. 3. прэтэнзі́йны: ***an ambitious style*** прэтэнзі́йны стыль

ambivalence [æmˈbɪvələns] n. супярэ́чнасьць пачу́ццяў

ambivalent [æmˈbɪvələnt] adj. супярэ́члівы, раздво́ены (*пра пачу́цьці*)

amble [ˈæmbəl] – n. 1. і́нахадзь *f.* (*ко́нскі бег*). 2. павóльны крок *m.*
– v.i. 1. бе́гчы і́нахадзьдзю (*пра каня́*). 2. павóльна кро́чыць

ambo [ˈæmboʊ] n., pl. **-bos** амбо́н -а *m.*

ambrosia [æmˈbroʊʒə] n. 1.Myth. амбро́зія *f.*, е́жа й пітво́ багóў. 2. крыні́ца асало́ды

ambrosial [æmˈbroʊʒəl] adj. 1. асабліва прые́мны. 2. Figur. бо́скі, ва́рты багóў

ambulance [ˈæmbjələns] – n. 1. ху́ткая дапамóга, амбуля́нс -у *m.*, 2. палявы́ шпіта́ль -лю
– adj. санітáрны: ***ambulance airplane*** санітáрны самалёт
• ***ambulance chaser,*** Informal назóльны адвака́т

ambulatory [ˈæmbjələtɔːrɪ] adj. хадзя́чы (*пра хворага, старога*)

ambuscade [ˈæmbəskeɪd] n., v. *гл.* **ambush**

ambush [ˈæmbʊʃ] – n. залóга; заса́да *f.* (*лю́дзі або́ ме́сца*): ***to lie in ambush*** засе́сьці ў заса́ду
– v.t. 1. напада́ць з заса́ды. 2. рабіць залóгу
– v.i. ляжа́ць у заса́дзе; прытóйвацца

ameba [əˈmiːbə] n., pl. **-bas, -bae**, *гл.* **amoeba**

ameliorate [əˈmiːljəreɪt] v. паляпша́ць, паляпша́цца, удасканáльваць, удасканáльвацца

amelioration [əˌmiːljəˈreɪʃən] n. палéпшаньне *n.*

ameliorative [əˈmi:ljəreɪtɪv] adj. паляпшáльны

amen [ˌeɪˈmen] – interj. 1. амíн (*у канцы́ малі́твы*). 2. Informal вы́раз ухвалéньня
– adv., Archaic прáвільна, запраўды́: ***to say "amen" to*** а) ухвалíць. б) закóнчыць, скóнчыць

amenability [əˌmi:nəˈbɪləti] n. 1. падáтнасьць *f.* 2. адкáзнасьць *f.* (*перад закóнам*)

amenable [əˈmi:nəbəl] adj. 1. паслухмя́ны; падаўкí: ***He is amenable to persuasion*** Ягó мóжна пераканáць. 2. адкáзны: ***amenable to the law*** адкáзны перад закóнам

amend [əˈmend] v.t. 1. рабíць папрáўкі (*у закóне, прапанóве*). 2. папраўля́ць, паляпшáць. 3. выпраўля́ць (*памы́лкі*), карэгавáць

amendment [əˈmendmənt] n. 1. папрáўка *f.* (*у закóне, устáве*). 2. папрáва *f.*, удасканалéньне *n.* 3. карэ́кта *f.*

amends [əˈmendz] n., sing. or pl. кампэнсáцыя *f.*; задавальнéньне *n.*; пакрыцьцё *n.*, зварóт -у *m.* (*стрáты*): ***to make amends for*** кампэнсавáць (*кры́ўду*), пакры́ць, вярнýць (*стрáту*)

amenity [əˈmi:nəti] n., pl. **-ties,** 1. вéтлівасьць, далікáтнасьць *f.* 2. уцéха, прыéмнасьць *f.*: ***amenities of home life*** уцéхі сямéйнага жыцьця́
• ***amenities*** выгóды *pl.*

amentia [eɪˈmenʃə] n. недаразьвíтасьць *f.*

amerce [əˈmɜ:rs] v.t. 1. штрафавáць. 2. карáць

American [əˈmerɪkən] – n. амэрыкáнец -ца *m.*, амэрыкáнка *f.*
– adj. амэрыкáнскі: ***American eagle*** амэрыкáнскі арóл (*гэрб ЗША*)

Americanism [əˈmerɪkənˌɪzəm] n. амэрыканíзм -у *m.*

Americanize [əˈmerɪkənaɪz] v.t. амэрыканізавáць, амэрыканізавáцца

amethyst [ˈæməθɪst] n. 1. амэты́ст -у *m.* 2. фіялéтавы кóлер

amethystine [ˌæməˈθɪstən] adj. 1. фіялéтавы. 2. амэты́ставы

Amharic [æmˈhærɪk] adj., n. амхáрская мóва *f.* (*у Этыёпіі*)

amiability [ˌeɪmiəˈbɪləti] n. 1. прыя́знасьць, вéтлівасьць *f.* 2. прывáбнасьць *f.* 3. дабрадýшнасьць, лагóднасьць *f.*

amiable [ˈeɪmiəbəl] adj. 1. ласкáвы. 2. мíлы. 3. дабрадýшны, прыя́зны

amicability [ˌæmɪkəˈbɪləti] n. прыя́знасьць, міралю́бнасьць *f.*

amicable [ˈæmɪkəbəl] adj. прыя́зны, міралю́бны; палюбóўны, мíрны: ***to settle a quarrel in an amicable way*** залáдзіць свáрку палюбóўна

amicably [ˈæmɪkəbli] adv. прыя́зна, палюбóўна; мíрна

amid [əˈmɪd] prep. сярóд, памíж, пасярэ́дзіне: ***amid the ruins*** сярóд руíнаў

amidship(s) [əˈmɪdʃɪps] adv. пасярэ́дзіне карабля́

amidst [əˈmɪdst] prep. сярóд: ***amidst enemies*** сярóд вóрагаў

amiss [əˈmɪs] – adv. недалáду; няпрáвільна, ня так, як трэ́ба, ня ў час: ***something is amiss*** нéшта недалáду
– adj. няла́дны; неадпавéдны; не такí, як трэ́ба; няпрáвільны
• ***go/happen amiss*** не ўдавáцца: ***your work is going amiss today*** табé прáца сёньня не ўдаéцца
• ***take/think amiss*** блáга зразумéць; абрáзіцца, чýцца абрáжаным

amity [ˈæməti] n., pl. **-ties** пры́язьнь *f.*, прыя́зныя дачынéньні

ammonia [əˈmouniə] n., Chem. 1. амія́к -у *m.* 2. нашаты́рны сьпірт

ammoniac [əˈmouniək] adj. аміячны

ammonium [əˈmouniəm] n. амóній -ю *m.*

ammonium chloride нашаты́рны сьпірт, нашаты́р -ý *m.*, хлёрысты амóній

ammunition [ˌæmjuˈnɪʃən] n. 1. амуні́цыя *f.* 2. баявы́я прыпáсы

amnesia n. [æmˈni:ʒə] амнэ́зія *f.*, стрáта пáмяці

amnesty [ˈæmnəsti] – n., pl. **-ties** амні́стыя *f.*, памíлаваньне, дарава́ньне *n.*
– v.t. абвясьцíць амні́стыю, памíлаваць

amniocentesis [ˌæmnioosenˈti:sɪs] n., Med. прóба каляплóдных вóдаў

amoeba or **ameba** [əˈmi:bə] n. **-bas, -bae**, Zool. амёба *f.*

amoebic or **amebic** [əˈmi:bɪk] adj. амёбавы, амёбны: ***amoebic dysentery*** амёбная дызэнтэ́рыя

amok [əˈmʌk] – adj., adv. *таксама* **amuck** ашале́лы, вар'я́цкі

– n. шале́нства, гвалто́ўная нэрво́вая хвароба

• ***run amok*** ашале́ць, звар'яце́ць

among [əˈmʌŋ] prep. 1. сяро́д, памі́ж: ***among the trees*** сяро́д дрэ́ваў; ***to divide among the boys*** падзяліць памі́ж хлапцо́ў. 2. з: ***one among many*** адзі́н з мно́гіх. 3. ра́зам, супо́льна: ***Among them they have spoiled the child*** Яны́ ра́зам разбэ́сьцілі дзіця́

• ***among ourselves, yourselves, themselves*** памі́ж сабо́ю

amongst [əˈmʌŋst] prep., esp. Brit., *гл.* **among**

amoral [ˌeɪˈmɔ:rəl] adj. амара́льны.

amorally [ˌeɪˈmɔ:rəli] adv. амара́льна

amorous [ˈæmərəs] adj. 1. улю́бліві. 2. закаха́ны. 3. любо́ўны: ***amorous songs*** пе́сьні каха́ньня

amorousness [ˈæmərəsnəs] n. 1. улю́бліваць *f.* 2. закаха́насьць *f.*

amorphism [əˈmɔ:rfɪzəm] n. 1. бясфо́рмнасьць *f.* 2. Min. амарфі́чнасьць, некрышталі́чнасьць *f.*

amorphous [əˈmɔ:rfəs] adj. 1. бясфо́рмны: ***An amoeba is amorphous*** Амёба бясфо́рмная. 2. няпэ́ўны, невыра́зны. 3. Min. некрышталі́чны, амо́рфны

amortization [ˌæmərtəˈzeɪʃən] n. амартыза́цыя *f.*, пагашэ́ньне *n.* (*до́ўгу*)

amortize [ˈæmərtaɪz] v.t. 1. амартызава́ць, пагаша́ць доўг. 2. Law. перадава́ць ула́снасьць юрыды́чнай асо́бе

amount [əˈmaʊnt] – n. 1. су́ма *f.*: ***What is the amount of the bill?*** Яка́я су́ма раху́нку? 2. ко́лькасьць *f.*: ***a great amount of intelligence*** высо́кі інтэле́кт. 3. ва́ртасьць, ва́жнасьць *f.* 4. агу́льная су́ма пазы́кі й працэ́нтаў

– v.i. 1. склада́ць. 2. дахо́дзіць: ***The loss from the flood amounts to ...*** Стра́ты ад паво́дкі дахо́дзяць да ... 3. быць раўназна́чным: ***This amounts to a refusal*** Гэ́та раўназна́чна адмо́ве

amour [əˈmʊr] n. 1. амо́ры, та́йнае недазво́ленае каха́ньне. 2. непава́жны раман

amperage [ˈæmpərɪdʒ] n. сі́ла то́ку (*у ампэ́рах*)

ampere [ˈæmpɪr] n. ампэ́р -а *m.*

ampere-hour [ˈæmpɪrˌaʊər] n. ампэр-гадзі́на *f.*

amperemeter [ˈæmpɪrˌmi:tər] n. ампэрмэ́тар -ра *m.*

ampere-turn [ˈæmpɪrˌtɜ:rn] n. ампэр-віто́к -тку́ *m.*

ampersand [ˈæmpərsænd] n. знак "&" (*зна́чыць* ***and***)

amphetamine [æmˈfetəmi:n] n. амфэтамі́н -у *m.*

amphibia [æmˈfɪbiə] n., pl., Zool. амфі́біі, земнаво́дныя *pl.*

amphibian [æmˈfɪbiən] n., pl. **-ians, -ia** 1. Zool. земнаво́днае *n.* (*зьвер або́ расьлі́на*), амфі́бія *f.* 2. Tech. самалёт-амфі́бія, танк-амфі́бія

amphibious [æmˈfɪbiəs] adj. 1. земнаво́дны: ***Frogs are amphibious*** Жа́бы — земнаво́дныя ствара́ньні. 2. які́ ру́хаецца па вадзе́ і су́шы

amphibrach [ˈæmfɪbræk] n. амфібра́х -у *m.*

amphitheater [ˈæmfɪˌθɪətər] n., Brit. **amphitheatre** амфітэа́тар -ру *m.*

amphora [ˈæmfərə] n., pl. **-phorae** [ˈæmfəri:] а́мфара *f.*

ample [ˈæmpəl] adj. **-pler, -plest** 1. вялі́кі, прасто́рны, абшы́рны: ***an ample closet*** вялі́кая ша́фа. 2. шчо́дры, неабмежава́ны: ***to give ample praise*** разьліва́цца ў пахва́лах. 3. дастатко́вы, по́ўны: ***an ample supply of food*** дастатко́вы запа́с е́жы; ***ample justice*** по́ўная справядлі́васьць

amplification [ˌæmplɪfɪˈkeɪʃən] n. 1. пабо́льшаньне, пашырэ́ньне, узмо́цненьне *n.* 2. дада́ткі, прыклады ў ро́спаведзе. 3. пашы́раны ро́спавед. 4. узмо́цненьне сі́лы электры́чнага то́ку

amplifier [ˈæmplɪfaɪər] n. 1. узмацня́льнік -а *m.* (*у ра́дыё*). 2. гу́чнагаварыцель -я, рэпрадукта́р -а *m.*

amplify [ˈæmplɪfaɪ] – v.t. пабо́льшваць, узмацня́ць: ***to amplify the demand for a product*** пабо́льшыць по́пыт на прадукт. 2. дапаўня́ць; пашыра́ць: ***to amplify a description*** дапо́ўніць апіса́ньне. 3. перабо́льшваць: ***Don't amplify the difficulties*** Не перабо́льшвай ця́жкасьцяў. 4. узмацня́ць (*гук*) – v.i. піса́ць *ці* гаварыць до́ўга, у дэта́лях

amplitude [ˈæmplɪtu:d] n. 1. вялікасьць, шырыня́ *f.*; разма́х -у *m.*; памер -у *m.* 2. мно́ства, бага́ццце *n.*, даста́тлак -ку *m.*: ***an amplitude of money*** мно́ства гро́шай. 3. шырыня́ кругагля́ду. 4. Phys. амплітуда *f.*

amplitude modulation амплітудная мадуля́цыя (*у ра́дыё*)

amply [ˈæmpli] adv. 1. прасто́рна, шыро́ка, раско́шна. 2. дастатко́ва; бага́та, шчо́дра: ***to be amply supplied*** быць дастатко́ва забясьпе́чаным

amp(o)ule [ˈæmpu:l] n. а́мпула *f.*

amputate [ˈæmpjəteɪt] v.t. 1. ампутава́ць; адраза́ць. 2. абраза́ць

amputation [ˌæmpjəˈteɪʃən] n. ампута́цыя *f.*, адраза́ньне *n.*

amputee [ˌæmpjəˈti:] n. чалаве́к з ампутава́най нагі́й *ці* руко́й, кале́кla -i *m. & f.*

amuck [əˈmʌk] adv., adj., *такс.* **amok** ашале́лы

• ***run/go amuck*** ашале́ць, звар'яце́ць

amulet [ˈæmjələt] n. амуле́т -а. талісма́н -а *m.*

amuse [əˈmju:z] v.t. 1. забаўля́ць, весялі́ць. 2. займа́ць: ***The new toys amused the children*** Но́выя ца́цкі забаўля́лі дзяце́й. 3. сьмяшы́ць: ***You amuse me*** Вы сьме́шыце мяне́

amused [əˈmju:zd] adj. зацікáўлены; забáўлены, разьвясе́лены

amusement [əˈmju:zmənt] n. 1. весялó́сьць, забáўнасьць *f.*: ***The clown's antics caused much amusement*** Кло́ўнавы крыўля́ньні выклікáлі вялі́кую весялóсьць. 2. забáва; уце́ха *f.*, гýлі *pl.*

amusement arcade за́ля гульнёвых аўтама́таў

amusement park парк для забáваў

amusing [əˈmju:zɪŋ] adj. 1. сьме́шны, забáўны, паце́шны: ***amusing jokes*** сьме́шныя жáрты. 2. цікáвы, займáльны: ***an amusing book*** займáльная кні́га

amyl [ˈæməl] n., Chem. амі́л -у *m.*

an (æn; *unstressed* ən), adj. or indef. article, *гл.* **a (an)**

ana [ˈɑ:nə] n. 1. збо́рнік выка́званьняў (*на не́йкую асо́бную тэ́му*). 2. выка́званьне (*з гэ́ткага збо́рніка*)

anabaptism [ˌænəˈbæptɪzəm] n. анабаптызм -у *m.*

anachronism [əˈnækrəˌnɪzəm] n. анахранізм -у *m.*

anachronistic [əˌnækrəˈnɪstɪk] adj. анахранічны

anaconda [ˌænəˈkɑ:ndə] n., Zool. анако́нда *f.*

anaemia [əˈni:miə] n., esp. Brit. гл. **anemia**

anaerobe [ˈænəroʊb] n., Biol. анаэро́б -а *m.* (*бактэ́рыя*)

anaerobic [ˌæneˈroʊbɪk] adj. анаэро́бны

anaesthesia [ˌænəsˈθi:ʒə] n., esp. Brit. *гл.* **anesthesia**

anaglyph [ˈænəglɪf] n. анагліф -у *m.* (*выпу́клая гравю́ра*)

anagram [ˈænəgræm] n. анагра́ма *f.*

anal [ˈeɪnəl] adj. (of **anus**), Anat. за́днепрахо́дны, ана́льны

analecta [ˌænəˈlektə] n., pl. or **analects** [ˈænəlekts] аналéкты (*збо́рнік фрагме́нтаў з тво́раў*)

analeptic [ˌænəˈleptɪk] – adj. умацава́льны, ачуня́льны

– n. аналéптык -а *m.*

analgesia [ˌænəlˈdʒi:zɪə] n. неадчува́льнасьць бо́лю, нячу́ласьць на боль

analgesic [ˌænəlˈdʒi:zɪk] – adj. болесуцяша́льны

– n. болесуцяша́льны сро́дак, аналге́тык -у *m.*

analog [ˈænəˌlɑ:g] – n. ана́ляг -у; эквівале́нт -у *m.*
– adj. ана́лягавы
analogical [ˌænəˈlɑ:dʒɪkəl] adj. аналягі́чны
analogize [əˈnælədʒaɪz] v.t. рабі́ць аналёгію, аналягізава́ць
analogous [əˈnæləgəs] adj. аналягі́чны, падо́бны
analogy [əˈnælədʒi] n., pl. **-gies** 1. падабе́нства *n.* 2. аналёгія *f.* 3. Math. прапо́рцыя *f.*, дачыне́ньне *n.*
analyse [ˈænəlaɪz] v.t., esp. Brit. *гл.* **analyze**
analysis [əˈnæləsɪs] n., pl. **-lyses** [əˈnæləsi:z] 1. ана́ліз -у *m.*; дасьле́даваньне *n.* 2, Gram. разбо́р -у *m.*: ***sentence analysis*** сынтаксы́чны разбо́р ска́зу. 3. Chem. ана́ліз -у *m.*, раскладáньне *n.*
• ***in the last analysis*** у су́тнасьці, у канчатко́вым вы́ніку
analyst [ˈænəlɪst] n. 1. аналі́тык -а *m.* 2. лябара́нт-хі́мік -а *m.* 3. псыхааналі́тык -а *m.*
analytic(al) [ˌænəˈlɪtɪkəl] adj. аналіты́чны
analytics [ˌænəˈlɪtɪks] n. Math. аналі́тыка *f.*
analyze [ˈænəlaɪz] v.t. 1. аналізава́ць; разгляда́ць: ***to analyze the situation*** разгле́дзець сытуа́цыю. 2. Chem. аналізава́ць, раскладáць. 3. разьбіра́ць: ***to analyze a sentence grammatically*** зрабі́ць граматы́чны разбо́р ска́зу
anamnesis [ˌænæmˈni:sɪs] n. 1. прыпамінáньне *n.* (*мінýлага*). 2. Med. анамне́зія *f.*
anamorphosis [ˌænəˈmɔ:rfəsɪs] n., pl. **-ses** [-si:z] анамарфо́з -у *m.* (*зьме́неная канфігура́цыя аб'е́кта*)
anap(a)est [ˈænəpest] n. Lit. ана́пэст -у *m.*
anarch [ˈænɑ:rk] n. анархі́ст -а *m.*, бунтаўні́к -á *m.*
anarchic [əˈnɑ:rkɪk] adj. безула́дны, анархі́чны
anarchism [ˈænərˌkɪzəm] n. 1. анархі́зм -у *m.* 2. бязла́дзьдзе *n.*
anarchist [ˈænərkɪst] n. анархі́ст -а *m.*, анархі́стка *f.*
anarchistic [ˌænərˈkɪstɪk] adj. анархі́чны
anarchy [ˈænərki] n. 1. ана́рхія *f.*, безула́дзьдзе *n.* 2. бязла́дзьдзе *n.*
anathema [əˈnæθəmə] n., pl. **-mas** 1. адлучэ́ньне ад царквы́, ана́тэма *f.* 2. праклён -у *m.* 3. вы́клятая рэч *ці* асо́ба
anathematize [əˈnæθəmətaɪz] – v.t. 1. выкліна́ць, адлуча́ць ад царквы́. 2. праклі́на́ць
– v.i. абвяшча́ць ана́тэму
anatomical [ˌænəˈtɑ:mɪkəl] adj. анатамі́чны
anatomist [əˈnætəmɪst] n. 1. ана́там -а *m.*, спэцыяліст у галіне́ анато́міі. 2. Figur. кры́тык -а *m.*, аналі́тык -а *m.*
anatomize [əˈnætəmaɪz] v.t. 1. дзяліць на ча́сткі (*жывёліну ці расьлі́ну*); рабі́ць дысэ́кцыю (*тру́па*). 2. Figur. аналізава́ць
anatomy [əˈnætəmi] n., pl. **-mies** 1. анато́мія *f.*: ***human, plant anatomy*** анато́мія чалаве́ка, расьлі́ны. 2. анатамі́чны разрэ́з -у *m.* 3. ана́ліз -у, разбо́р -у *m.*
ancestor [ˈænsestər] n. 1. пра́шчур -а, прарóдзіч -а, прóдлак -ка, дзед -а *m.* 2. папярэ́днік -а *m.* 3. Law спадка-да́ўца *m.*
ancestral [ænˈsestrəl] adj. 1. пра́шчураў, ро́давы. 2. спа́дчынны: ***an ancestral trait in the family*** спа́дчынная ры́са ў сям'і́
ancestry [ˈænsestri] n., pl. **-tries** 1. пра́шчуры *pl.*, дзяды́ й пра́дзеды. 2. радавó́д -у *m.*, радавóдная *f.*, генэалёгія ро́ду. 3. сла́ўнае пахóджаньне
anchor [ˈæŋkər] – n. 1. я́кар -а *m.* 2. Tech. скаба́ *f.*; а́нкер -а *m.*, заця́жка *f.*
– v.t. 1. ста́віць на я́кар: ***to anchor a ship*** паста́віць карабе́ль на я́кар. 2. прымацо́ўваць: ***to anchor a tent to the ground*** прымацава́ць намёт да зямлі́. 3. ве́сьці перада́чу (*зь не́калькімі ўдзе́льнікамі*)
– v.i. 1. стая́ць на я́карах. 2. умацо́ўвацца
• ***at anchor*** на я́карах
• ***cast anchor, come to an anchor*** кі́нуць я́кар, стаць на я́кар

• ***ride at anchor*** стаяць на я́кары
• ***weigh anchor*** а) здыма́цца зь я́кара. б) пакіда́ць стаянку, рыхтава́цца вы́ехаць

anchorage ['æŋkərɪdʒ] n. 1. я́карная стаянка. 2. пла́та за пра́ва стаянь на я́кары. 3. стаянье на я́кары. 4. Figur. апо́ра *f.*; апо́шні сро́дак ратунку, апо́шняя надзе́я

anchoretic [ˌæŋkə'retɪk] adj. пусте́льніцкі

anchorite ['æŋkəraɪt] n. 1. пусте́льнік -а *m.* 2. само́тнік -а *m.*

anchorman ['æŋkərmæn] n., pl. **-men** 1. удзе́льнік апо́шняга эта́пу эстафе́ты. 2. Radio, TV. каардына́тар, вядучы перада́чы

anchovy ['æntʃouvi] n., pl. **-vies** камса́ *f.*, анчо́ўс -а *m.*

ancient ['eɪnʃənt] – adj. 1. старове́чны, старажы́тны: ***ancient history*** старажы́тная гісто́рыя: ***ancient times*** старада́ўнасьць *f.* 2. старада́ўны: ***an ancient temple*** старада́ўняя сьвятыня. 3. ве́льмі стары́: ***an ancient city*** ве́льмі старо́е ме́ста. 4. старамо́дны
– n. ве́льмі стары́ чалаве́к, галава́ ро́ду; заснава́льнік ро́ду
• ***the ancients*** старажы́тныя наро́ды (*грэ́кі, ры́мляне*)

ancillary ['ænsəleri] adj. 1. падпара́дкаваны; зале́жны. 2. дапамо́жны; запасны́: ***an ancillary engine in the boat*** запасны́ мато́р у ло́дцы

ancon ['æŋkən] n., pl. **ancones** ['æŋkounz] Arch. кранштэ́йн -у *m.*; кансо́ль *f.*

and [ænd; *unstressed* ənd] conj. 1. і (й), ды: ***girls and boys*** дзяўча́ты й хлапцы́. 2. ды, дада́ць: ***4 and 2 makes 6*** Чаты́ры ды два — шэсьць. 3. Informal каб (*пасьля́ try, come, go*): ***Try and do better*** Паспрабу́й зрабіць ле́пей; ***Come and see us*** Прыйдзі́ адве́даць нас. 4. а, але: ***I shall go and you stay here*** Я пайду́, а ты заста́ньcя тут
• ***and/or*** і/або́ (*або́два або́ адзі́н з двух*): ***income from stocks and/or bonds*** дахо́д ад а́кцыяў і/або абліга́цыяў
• ***and so on*** і да таго́ падо́бнае, і гэ́так дале́й

Andalusian [ˌændə'lu:ʒən] – adj. андалюзі́йскі
– n. 1. андалюзі́ец -йца *m.*. 2. паро́да сво́йскае пту́шкі

Andean [æn'di:ən] adj. андыйскі

andesite ['ændɪzaɪt] n., Min. андэзі́т -у *m.*

andiron ['ænd,aɪrn] n. жале́зныя ко́зьлікі для дро́ваў (*у каміне*)

androgynous [æn'drɑ:dʒənəs] adj. 1. гэрмафрады́тны, адначасна мужчы́нскі й жано́цкі. 2. Bot. двупо́лы

androgyny [æn'drɑ:dʒəni] n. гэрмафрадыты́зм -у *m.*

android ['ændrɔɪd] n. андро́ід -а *m.*, чалаве́кападобны ро́бат

anecdotal [ˌænɪk'doutəl] adj. анэкдаты́чны, як анэкдо́т; по́ўны анэкдо́таў

anecdote ['ænɪkdout] n. 1. здара́ньне з жыцьця́. 2. анэкдо́т -у *m.* (*ціка́вая падрабя́знасьць з прыва́тнага жыцьця́ гістары́чных асо́баў*)
• ***anecdotes*** та́йныя, прыва́тныя або́ ране́й не публіка́ва́ныя эпізо́ды з гісто́рыі ці біягра́фіі

anecdotic(al) [ˌænɪk'doutɪkəl] adj. анэкдаты́чны

anemia [ə'ni:miə] or esp. Brit. **anaemia**, n. малакро́ўе *n.*, ана́мія *f.*

anemic [ə'ni:mik] adj. 1. малакро́ўны, анэмі́чны: ***an anemic child*** малакро́ўнае дзіця́. 2. Figur. слаbý, падупа́лы: ***an anemic economy*** падупа́лая эканоміка

anemometer [ˌænɪ'mɑ:mətər] n. ветрамэ́тар, анемамэ́тар -ра *m.*

anemone [ə'neməni] n. 1. Bot. красьле́п -у *m.*, анэмо́на *f.* 2. Zool. марска́я анэмо́на (*кветкападо́бны палі́п*)

anemophilous [ˌænɪ'mɑ:fɪləs] adj., Bot. ветраапыля́льны

aneroid ['ænərɔɪd] adj. бязва́дкасны (*баромэтар*)

aneroid barometer баро́мэтар-анэро́ід

anesthesia [ˌænəs'θi:ʒə] n. or esp. Brit. **anaesthesia** анэстэ́зія *f.*, нарко́з -у *m.*, абязбо́льваньне *n.*

anesthetic [ˌænəsˈθetɪk] – n. or esp. Brit. **anaesthetic** сро́дак на абязбо́льванне, нарко́тык -у *m.*
– adj. 1. які абязбо́львае, анэстэзі́йны. 2. абязбо́лены, нячу́лы
anesthetist n. [əˈnesθətɪst] анэстэзі́ст -а *m.*
anesthetize [əˈnesθetaɪz] v.t. абязбо́льваць, рабі́ць нячу́лым, дава́ць нарко́з
aneurysm or **-rism** [ˈænjəˌrɪzəm] n., Med. анэўры́зм -у *m.*
anew [əˈnu:] adv. нано́ва, на́нава
angel [ˈemdʒəl] n. 1. анёл -а *m.* 2. Poet. вясту́н -а́ *m.*: ***the angels of spring*** вестуны́ вясны́. 3. дух (*до́бры або́ злы*): ***Every man has a good and a bad angel*** Ко́жны чалаве́к ма́е сваёйго́ до́брага й зло́га ду́ха. 4. Figur. анёлак -ка *m.*: ***She is an angel*** Яна́ —сапра́ўдны анёлак
angel cake сьве́тлы бісквіт
angelic [ænˈdʒelɪk] adj. 1. анёльскі, нябесны: ***angelic messengers*** пасла́нцы зь не́ба. 2. як анёл, чы́сты, няві́нны; бязьві́нны; до́бры й мі́лы: ***an angel woman*** жанчы́на як анёл
angelica [ænˈdʒelɪkə] n., Bot. дзя́гілль -ю *m.*
Angelus [ˈændʒələs] n. 1. малі́тва «Анёл па́нскі». 2. звон на «Анёл па́нскі»
angel visits, Brit., Informal каро́ткія й ро́дкія візы́ты
anger [ˈæŋgər] – n. злосьць *f.*, гнеў -ву *m.*: ***with anger*** са зло́сьцю, сярдзі́та
– v.t. злава́ць, гнява́ць
– v.i. гне́вацца, злава́цца
angina [ænˈdʒaɪnə] n. 1. стэнакардыя, грудна́я жа́ба *f.* 2. анґі́на *f.*
angle I [ˈæŋgəl] – n. 1. кут -а́ *m.*: ***acute (right, obtuse) angle*** во́йстры (про́сты, тупы́) кут; ***at an angle of 45 degrees*** пад кутко́м 45 гра́дусаў. 2. рог -у *m.*: ***angle of the church*** ро́г царквы́. 3. Informal а) гле́дзішча *n.*: ***to treat the problem from a new angle*** падыхо́дзіць да пыта́ньня з но́вага гле́дзішча. б) бок -у *m.*, аспэ́кт -у *m.*: ***There are many angles to this question*** Гэ́тае пыта́ньне ма́е шмат бако́ў
– v.i. 1. перахо́дзіць наўско́с (*даро́гу*). 2. зваро́чваць, паваро́чваць: ***The road here angles to the right*** Даро́га тут зваро́чвае напра́ва
– v.t., Informal прадстаўля́ць спра́ву неаб'ектыўна, перакру́чваць
angle II [ˈæŋgəl] v.i. 1. ву́дзіць. 2. Figur. закіда́ць ву́ду
angler [ˈæŋglər] n. 1. вуда́р -а́, ву́даль -я *m.*, рыба́к, што ло́віць ры́бу ву́дай. 2. хітру́н -а́, інтрыга́н -а *m.* 3. Zool. марскі́ чорт (*драпе́жная ры́ба*)
Anglican [ˈæŋglɪkən] – adj. англіка́нскі
– n. англіка́нін -а *m.*, ся́бра англіка́нскае царквы́
Anglicanism [ˈæŋglɪkəˌnɪzəm] n. англікані́зм -у *m.*
Anglicism [ˈæŋglɪˌsɪzəm] n. 1. анге́льскасьць *f.*, англіцы́зм *m.*, анге́льшчына *f.* (*звы́чаі, звы́чкі*). 2. сло́ва ужыва́нае ў Анге́льшчыне; брытані́зм -у *m.*
arboreal [ɑ:rˈbɔ:riəl] adj. 1. які́ жыве́ на дрэ́вах, сяро́д дрэ́ваў: ***A squirrel is an arboreal animal*** Вавёрка — зьвяро́к, які́ жыве́ на дрэ́вах. 2. дрэвападо́бны; з дрэ́ва, дрэ́вавы
arboreous [ɑ:rˈbɔ:riəs] adj. 1. заса́джаны дрэ́вамі, зале́сены. 2. дрэ́ўны
arborescent [ˌɑ:rbəˈresənt] adj. дрэ́вападо́бны; дрэ́вавы
arboretum [ˌɑ:rbəˈri:təm] n., pl. **-tums, -ta** [-tə] дрэ́вагадава́льнік -у *m.*
arboriculture [ˈɑ:rbəriˌkʌltʃər] n. гадо́ўля дрэ́ваў і куста́ў, лесаво́дзтва *n.*
arbour [ˈɑ:rbər] n., *гл.* **arbor I**
arc [ɑ:rk] – n. дуга́ *f.*
– adj. дугавы́: ***arc lamp*** дугава́я ля́мпа
– v. ру́хацца дуго́ю
arcade [ɑ:rˈkeɪd] n. 1. Arch. арка́да *f.* 2. гандлёвыя рады́. 3. за́ля для ві́дэагу́льняў

Arcadian [ɑ:rˈkeɪdiən] – adj. 1. аркады́йскі. 2. ідылі́чны
– n. 1. жыха́р Арка́дыі. 2. чалаве́к з про́стымі гу́стамі
arcane [ɑ:rˈkeɪn] adj. тае́мны, таямні́чы
arch I [ɑ:rtʃ] – n. 1. а́рка *f.* 2. Anat. пад'ём -у *m.* (*нагі́*)
– v.t. 1. сагну́ць у дугу́: ***A cat arched its back*** Кот вы́гнуў сьпіну дуго́ю. 2. тварыць дугу́: ***A bridge arched the stream*** Мост дугой узно́сіўся над ра́чкай
– v.i. выгіна́цца дугой
arch II [ɑ:rtʃ] adj. гара́зьлівы, гара́зны, гульлі́вы; хітрава́ты: ***an arch look*** гульлі́вы по́зірк
arch- pref. 1. гало́ўны, ста́ршы: ***archenemy*** гало́ўны во́раг. 2. заўзя́ты, страшэ́нны, ве́льмі вялі́кі: ***arch-liar*** страшэ́нны манюка; ***archconservative*** ве́льмі кансэрваты́ўны, рэакцы́йны
archaic [ɑ:rˈkeɪnk] adj. 1. архаі́чны. 2. старасьве́цкі; старамо́дны, перастаре́лы. 3. старажы́тны
archaism [ˈɑ:rkiˌɪzəm] n. архаі́зм -у *m.*
archangel [ˈɑ:rkˌeɪndʒəl] n. 1. архáнгел, арханёл -а *m.* 2. Bot. дзя́гільль -ю *m.*
archbishop [ˌɑ:rtʃˈbɪʃəp] n. арцыбі́скуп -а *m.* (*каталі́цкі*), архіяпі́скап -а *m.* (*праваслáўны*)
archdeacon [ˌɑ:rtʃˈdi:kən] n. архідыя́кан -а *m.*
archdiocese [ˌɑ:rtʃˈdaɪəsəs] n. япáрхія архіяпі́скапа, архідыяцэ́зія *f.*
archducal [ˌɑ:rtʃˈdu:kəl] adj. эрцгэ́рцагскі
archduchess [ˌɑ:rtʃˈdʌtʃɪs] n. эрцгэрцагі́ня *f.*
archduchy [ˌɑ:rtʃˈdʌtʃi] n., pl. **-duchies** эрцгэ́рцагства *n.*
archduke [ˌɑ:rtʃˈdu:k] n. эрцгэ́рцаг -а *m.*
archeological [ˌɑ:rkiəˈlɑ:dʒɪkəl] adj. археалягі́чны
archelogist [ˌɑ:rkiˈɑ:lədʒɪst] n. археóляг -а *m.*
archeology [ˌɑ:rkiˈɑ:lədʒi] n. археалёгія *f.*
archer [ˈɑ:rtʃər] n. лу́чнік -а *m.*, стралóк з лу́ка
Archer [ˈɑ:rtʃər] n. Стралéц -ьцá *m.* (*знак задыя́ку*)
archery [ˈɑ:rtʃəri] n. 1. лу́чніцтва *n.* 2. лу́чнікі *pl.* 3. збро́я лу́чнікаў
archetype [ˈɑ:rkitaɪp] n. прататы́п -у, архетып -у *m.*
archimandrite [ˌɑ:rkəˈmændraɪt] n. архімандры́т -а *m.*
Archimedean [ˌɑ:rkɪˈmi:diən] adj. архімэ́даў: ***Archimedean screw*** архімэ́дава шру́ба
Archimedes [ˌɑ:rkɪˈmi:di:z] n. Архімэ́д -а *m.*
archipelago [ˌɑ:rkəˈpeləgoʊ] n., pl. **-gos** or **-goes** архіпэля́г -у *m.*, гру́па абто́каў
architect [ˈɑ:rkɪtekt] n. 1. архітэ́ктар -а *m.* 2. Figur. твóрца -ы *m. & f.*: ***Everyman is the architect of his own destiny*** Ко́жны чалаве́к — будаўні́к свайго́ лёсу
architectonic [ˌɑ:rkətəkˈtɑ:nɪk] adj. архітэктані́чны, архітэкту́рны
architectonics [ˌɑ:rkətəkˈtɑ:nɪks] n. архітэктóніка *f.*
architectural [ˌɑ:rkɪˈtektʃərəl] adj. архітэкту́рны
architecture [ˈɑ:rkətektʃər] n. 1. архітэктýра *f.* 2. стыль будава́ньня. 3. пабудóва *f.* 4. будынак -ку *m.*, будыніна *f.*; збудава́ньне *n.*
archival [ɑ:rˈkaɪvəl] adj. 1. архíўны. 2. сабра́ны ў архíў, зьме́шчаны ў архíве
archive [ˈɑ:rkaɪv], *usually* **archives** [ˈɑ:rkaɪvz] – n. 1. архíлў -ву *m.*, архíўная калéкцыя. 2. архíлў -ву *m.* (*ме́сца*)
– v.t. 1. зьбіра́ць у архіў. 2. Comput. архівава́ць
archivist [ˈɑ:rkɪvɪst] n. архівíст -а *m.*, супрацóўнік архíву
archway [ˈɑ:rtʃweɪ] n. прахóд пад а́ркай. 2. а́рка *f.*
Arctic [ˈɑ:rktɪk] – adj. 1. арктычны, паля́рны, паўно́чны: ***the Arctic fox*** паля́рны ліс. 2. арктычны, сьцюдзёны
– n. ***the Arctic*** Арктыка *f.*
Arctic Circle Паля́рны круг
ardency [ˈɑ:rdənsi] n. 1. запа́л -у *m.*, па́лкасьць *f.* 2. стара́ннасьць, шчы́расьць *f.* (*у пра́цы*)

ardent [ˈɑ:rdənt] adj. 1. по́ўны запа́лу, энтузія́стычны; па́лкі; стара́нны, шчы́ры: ***an ardent student of history*** стара́нны студэ́нт гісто́рыі; ***ardent speech*** па́лкая прамо́ва. 2. гару́чы, пяку́чы; агні́сты; палымя́ны; гара́чы • ***ardent spirits*** мо́цныя алькаго́льныя напо́і

ardently [ˈɑ:rdəntli] adv. го́рача, з запа́лам, энтузія́стычна

ardor, Brit. **ardour** [ˈɑ:rdər] n. пал, запа́л -у *m.*; ця́га *f.*, вялі́кі энтузія́зм: ***patriotic ardor*** патрыятычны запа́л

arduous [ˈɑ:rdʒuəs] adj. 1. цяжкі́ для выкана́ньня, стамля́льны: ***an arduous lesson*** цяжка́я ле́кцыя. 2. стро́мкі: ***an arduous hill*** стро́мкі ўзго́рак

are I [ɑ:r; unstressed ər] v. *мно́жны лік дзеясло́ва* to be: ***you are*** вы ёсьць; ***we are*** мы ёсьць

are II [er] n. ар -а *m.* 100 м² (*ме́ра зяме́льнай пло́шчы*)

area [ˈeriə] n. 1. пло́шча *f.*: ***area of a triangle*** пло́шча трыку́тніка. 2. по́ле дзе́яньня, прасто́ра *f.*, абся́г -у *m.*, сфэ́ра *f.*; галіна́ *f.*: ***the area of physics, chemistry*** галіна́ фі́зыкі, хі́міі. 3. раён -у *m.*, зо́на, мясцо́васьць, вако́ліца *f.*, краі́й -ю *m.*, абша́р -у *m.*: ***residential area*** жылы́ раён. 4. пляц -у *m.*, пляцо́ўка, дзяля́нка *f.*: ***playground area*** дзіця́чая пляцо́ўка

area code тэлефо́нны код

area rug дыванло́к -ка́ *m.*

arena [əˈri:nə] n. 1. арэ́на (*цыркава́я, спарто́вая*) *f.*: ***boxing arena*** рынг -у *m.* 2. ме́сца дзе́яньня; ***political arena*** палітычная арэ́на

arenaceous [ˌærɪˈneɪʃəs] adj. пяшча́ны

aren't [ɑ:rnt] *скаро́чанае* **are not**

areology [ˌærɪˈɑ:lədʒi] n. марсазна́ўства *n.* (*вывучэ́ньне плянэ́ты Марс*)

arete [əˈreɪt] n. грэ́бень гары́

argentiferous [ˌɑ:rdʒənˈtɪfərəs] adj. срэбрано́сны: ***an argentiferous ore*** срэ́бная руда́

Argentinian [ˌɑ:rdʒənˈtɪniən] – adj. аргенты́нскі – n. аргентыне́ц -ца *m.*, аргентыне́нка *f.*

argentine [ˈɑ:rdʒəntaɪn] – adj. 1. сре́бны. 2. серабры́сты – n. 1. сре́бра *n.* 2. серабры́сты мэта́л *або́* ре́чыва

argil [ˈɑ:rdʒɪl] n. гліна *f.*

argillaceous [ˌɑ:rdʒɪˈleɪʃəs] adj. гліні́сты

argon [ˈɑ:rgɑ:n] n., Chem. аргон -у *m.*

argosy [ˈɑ:rgəsi] n., pl. **-sies**, Poet. 1. гандлёвы карабе́ль. 2. флёт з такі́х караблёў

argot [ˈɑ:rgoʊ] n. 1. жарго́н -у *m.*, арго́ *n., indecl.*: ***prisoners' argot*** турэмны жарго́н

arguable [ˈɑ:rgju:əbəl] – adj. 1. спрэ́чны. 2. магчы́мы, дапушча́льны

arguably [ˈɑ:rgju:əbli] – adv. магчы́ма, дапушча́льна

argue [ˈɑ:rgju:] – v.i. 1. спрача́цца. 2. дава́дзіць: ***He argued for independence*** Ён дава́дзіў патрэ́бу незале́жнасьці – v.t. 1. разгляда́ць: ***to argue a question*** разгляда́ць пыта́ньне. 2. перако́нваць, дава́дзіць; цьве́рдзіць: ***Columbus argued that the world was round*** Калю́мб цьве́рдзіў, што сьвет кру́глы

argument [ˈɑ:rgjəmənt] n. 1. спрэ́чка *f.*: ***to win the argument*** вы́йграць спрэ́чку. 2. дава́ньне до́вадаў, аргумэнта́цыя *f.*, спрэ́чкі *pl.*: ***to waste time in argument*** тра́ціць час на спрэ́чкі. 3. до́вад, аргумэ́нт -у *m.*

argumentation [ˌɑ:rgjəmənˈteɪʃən] n. 1. аргумэнта́цыя *f.*, разважа́ньне *n.* 2. спрэ́чкі *pl.*, дыскусія *f.*

argumentative [ˌɑ:rgjəˈmentətɪv] adj. 1. які́ лю́біць спрача́цца, дыскутава́ць: ***an argumentative disposition*** схі́льны да спрэ́чак. 2. спрэ́чны

aria [ˈɑ:riə] n. а́рыя *f.*

arid [ˈærɪd] adj. 1. сухі́, перасо́хлы; вы́сушаны; засу́шлівы; бязво́дны, я́лавы; неўрадлі́вы: ***arid region*** неўрадлі́вы раён. 2. ну́дны, неціка́вы: ***an arid field of study*** суха́я галі́на навуко́

aright [əˈraɪt] adv. пра́вільна, до́бра

arise [əˈraɪz] v.i. **arose, arisen, arising** 1. устава́ць. 2. падыма́цца, узно́сіцца:

Smoke arises from the chimney З ко́міна падыма́ецца дым. 3. паўстава́ць; узьніка́ць: ***if the need should arise*** калі́ ўзьні́кне патрэ́ба. 4. вынікá́ць *з чаго́*, быць вы́нікам *чаго́*: ***Accidents arise from carelessness*** Вы́падкі ёсьць вы́нікам неасьцяро́жнасьці. 5. уваскраса́ць

arista [əˈrɪstə] n. **-tae**, Bot. асьцю́к -а́ *m.*

aristocracy [ˌærɪˈstɑ:krəsi] n., pl. **-cies** арыстакра́тыя *f.*

aristocrat [əˈrɪstəkræt] n. арыстакра́т -а *m.*, арыстакра́тка *f.*

aristocratic [əˌrɪstəˈkrætɪk] adj. арыстакраты́чны

Aristotelian [ˌærɪstəˈti:liən] – adj. арысто́тэлеўскі

– n. пасьлядо́ўнік Арысто́тэля *або́* яго́нае філязо́фіі

Aristotle [ˈærɪstɑ:təl] n. Арысто́тэл|ь -я *m.*

arithmetic [əˈrɪθmətɪk] – n. арытмэ́тыка *f.*, лічэ́ньне *n.*

– adj. [ˌærɪθˈmetɪk] арытмэты́чны

arithmetical [ˌærɪθˈmetɪkəl] adj. 1. арытмэты́чны. 2. зго́дны з пра́вілами арытмэ́тыкі: ***arithmetical mean*** сярэ́дняе арытмэты́чнае; ***arithmetical progression*** арытмэты́чная прагрэ́сія

arithmetician [əˌrɪθməˈtɪʃən] n. арытмэ́тык -а *m. & f.*

ark [ɑ:rk] n. Bibl. а́рка *f.*, вялі́кі карабе́ль: ***Noah's ark*** Но́ева а́рка

arm I [ɑ:rm] n. 1. рука́ *f.*; (*перадплéчча*): ***infant in her arms*** дзіця́ ў яе́ на рука́х. 2. рукаво́, крыло́ *n.*: ***arm of a coat*** рукаво́ палітá. 3. сі́ла *f.*; ула́да *f.*: ***the long arm of the law*** уседася́жная сі́ла зако́ну. 4. вялі́кая галіна́ (*дрэ́ва*). 5. по́руч|ань -ня *m.*, по́ручні, парэ́нчы *pl.* (*крэ́сла*)

• ***arm in arm (with)*** рука́ ў руку́, пад ру́ку

• ***at arm's length*** здалёк ад сябе́, на адле́гласьці

• ***twist one's arm*** выкру́чваць ру́кі, прымуша́ць

• ***with open arms*** шчы́ра, адкры́та, з распасьце́ртымі рука́мі

arm II [ɑ:rm] – n. 1. зброя *f.* 2. род во́йска (*а́рмія, флёт ці лётніцтва*): ***air arm*** паве́траная зброя

– v.t. 1. узбро́йваць, збро́іць: ***to arm a vessel*** узбро́іць карабе́ль. 2. пакрыва́ць бранёю. 3. настаўля́ць (*запа́л*)

– v.i. 1. узбро́йвацца, збро́іцца. 2. рыхтава́цца; запаса́цца: ***to be armed with patience*** запасьці́ся цярпліва́сьцю

armada [ɑ:rˈmɑ:də] n. 1. флёт вае́нных караблёў. 2. флёт самалётаў

armament [ˈɑ:rməmənt] n. 1. узбрае́ньне *n.* 2. збро́йныя сі́лы (*а́рмія, флёт*). 3. узбрае́ньні *pl.*

armature [ˈɑ:rmətʃʊr] n. 1. Elec. а) я́кар -у *m.* б) браня́ *f.* (*ка́бэля*). 2. Art армату́ра *f.* 3. Zool., Bot. абаро́нны панцы́р

armband [ˈɑ:rmbænd] n. нарука́ўная павя́зка

armchair [ˈɑ:rmtʃer] – n. фатэ́ль -я *m.*

– adj. 1. Figur. тэарэты́чны, кабінэ́тны (*не практы́чны*): ***an armchair strategist*** стратэ́г-тэарэ́тык

armed [ɑ:rmd] adj. узбро́ены, збро́йны: ***armed forces*** збройныя сі́лы (*а́рмія, флёт, лётніцтва*): ***armed robbery*** збройны рабу́нак

Armenian [ɑ:rˈmi:niən] – adj. армя́нскі

– n. 1. армяні́н -а *m.*, армя́нка *f.* 2. армя́нская мо́ва.

armful [ˈɑ:rmful] n. бярэ́мя *n.*

armhole [ˈɑ:rmhoul] n. вы́раз на руку́ *або́* рукаво́

armiger [ˈɑ:rmɪdʒər] n. 1. гэ́рбавы шля́хціц. 2. збраяно́сец -ца *m.*

arming [ˈɑ:rmɪŋ] n. збро́еньне *n.*, баёвая падрыхто́ўка

armistice [ˈɑ:rmɪstɪs] n. замірэ́ньне, перамі́р'е *n.*

armless I [ˈɑ:rmləs] adj. 1. бязру́кі. 2. без галі́наў

armless II бяз зброі; безабаро́нны

armlet [ˈɑ:rmlət] n. 1. нарука́ўная павя́зка. 2. залі́лў -ву *m.*, зато́ка *f.*

armor, Brit. **armour** [ˈɑ:rmər] – n. 1. па́нцыр -а *m.* 2. браня́ *f.* (*карабля́, та́нка*). 3. бранясі́лы, па́нцырныя

сі́лы. 4. браня́ ка́бэлю; скафа́нд|ар -ра *m.* 5. па́нцыр -а *m.* *(чарапа́хі)*
– v. пакрыва́ць бранёю, узбро́йваць

armorer [ˈɑ:rmərər] n. збро́йнік -а, збраяро́б -а *m.*

armored, Brit. **armoured** [ˈɑ:rmərd] adj. 1. пакры́ты бранёю. 2. бранята́нкавы: ***an armored division*** бранята́нкавая дывізія
• ***armored cable*** забясьпе́чаны электры́чны ка́бель
• ***armored car*** бранявік, бронеаўтамабі́ль
• ***armored force*** бранясі́лы

armorial [ɑ:rˈmɔ:riəl] adj. гэральды́чны; гэ́рбавы

armory [ˈɑ:rməri] n., pl. **-ries** 1. арсэна́л -у *m.* 2. збро́евая майстэ́рня, збро́евы заво́д. 3. будынак для муштры́ вайско́ўцаў. 4. гэра́льдыка *f.*

armpit [ˈɑ:rmpɪt] n. па́ха *f.*, па́хавая я́мка

armrest [ˈɑ:rmrest] n. падлако́тнік -а *m.*

arms [ˈɑ:rmz] n. 1. збро́я *f.* 2. змага́ньне *n.* 3. гэрб -у *m.*
• ***arms control*** кантро́ль над узбрае́ньнямі
• ***arms race*** го́нка ўзбрае́ньняў
• ***bear arms*** а) служы́ць у во́йску. б) мець гэрб
• ***lay down arms*** скла́сьці зброю́
• ***take up arms*** узьня́ць зброю́
• ***to arms!*** да зброі!

arm-wrestling [ˈɑ:rmˌrestlɪŋ] n. ду́жаньне на рука́х

army [ˈɑ:rmi] n., pl. **-mies** 1. а́рмія *f.*; во́йска *n.* 2. Figur. мно́ства *n.*, вялі́кая ко́лькасьць: ***an army of ants*** мно́ства мура́шак

arnica [ˈɑ:rnɪkə] n. Bot., Med. 1. а́рніка *f.* (*расьлі́на*). 2. Med. ле́кавая ва́дкасьць з а́рнікі

aroma [əˈroʊmə] n. во́дар, пах -у *m.*; духмя́насьць *f.*, арама́т -у *m.*, спэцыфі́чны пах: ***the aroma of freshly ground coffee*** пах сьве́жазмо́латае ка́вы

aromatic [ˌærəˈmætɪk] adj. 1. во́дарны, паху́чы, духмя́ны. 2. араматы́чны

around [əˈraʊnd] – prep. 1. вако́л; навако́л, наўко́л(а), з усіх бако́ў: ***around the garden*** навако́л гаро́ду; ***a coat around her shoulders*** палітó, накі́нутае на пле́чы. 2. Informal па: ***to walk around the town*** хадзі́ць па го́радзе. 3. Informal бліза, каля́: ***Please stay around the house*** Калі́ ла́ска, бу́дзьце бліза до́му. 4. каля́, прыбліза: ***around five dollars*** каля́ пяцёх даля́раў; ***around three o'clock*** каля́ трэ́йцяе гадзі́ны. 5. за: ***around the corner*** за ро́гам; за рог
– adv. 1. наўко́ла, круго́м, навако́л: ***to spin around*** круці́цца навако́л. 2. у абхва́це: ***The tree measures five meters around*** Дрэ́ва ма́е пяць мэ́траў у абхва́це. 3. усю́ды, навако́л: ***A dense fog lay around*** Усю́ды была́ імгла́. 4. Informal тут, непадалёку: ***Wait around awhile*** Пачака́йце тут не́дзе хві́лі́ну. 5. наза́д: ***Turn around!*** Павярні́ся наза́д; ***I'll see you around*** Паба́чымся

around-the-clock [əˌraʊndðəˈklɑ:k] adj. безупы́нны, празь дзень і ноч

arousal [əˈraʊzəl] n. прабуджэ́ньне *n.*; узбуджэ́ньне *n.*

arouse [əˈraʊz] – v.t. 1. будзі́ць: ***The noise aroused him*** Го́ман разбудзі́ў яго́. 2. узбуджа́ць: ***to arouse suspicion*** узбуджа́ць, выкліка́ць падазрэ́ньне. 3. пабуджа́ць, уздыма́ць: ***to arouse to action*** пабуджа́ць да дзе́яньня
– v.i. прачына́цца; прабуджа́ца, узбуджа́цца (*пра пачуцьцё*)

arrack [ˈærək] n. ара́к -у *m.* (*алькаго́льны напо́й*)

arraign [əˈreɪn] v.t. 1. прыця́гваць да су́дова́й адка́знасьці. 2. абвінава́чваць

arraignment [əˈreɪnmənt] n. 1. прыцягне́ньне да суда́ вай адка́знасьці. 2. абвінава́чваньне, вінава́чаньне *n.*

arrange [əˈreɪndʒ] – v.t. 1. уклада́ць; расстаўля́ць, разьмяшча́ць; ула́джваць: ***to arrange books on a shelf*** укла́сьці кні́гі на палі́цы; ***to arrange in alphabetical order*** разьмясьці́ць у альфа-

бэ́тным пара́дку. 2. плянава́ць, рыхтава́ць: ***We arranged the meeting*** Мы падрыхтава́лі пасе́джаньне. 3. узгадня́ць: ***He arranged it with her*** Ён узгадні́ў гэ́та зь ёю. 4. Music. прыстасо́ўваць; пераклада́ць, аранжава́ць: ***This music for violin is also arranged for piano*** Гэ́тыя но́ты для скры́пкі аранжава́ныя таксама для піяні́на
– v.i. 1. ула́джваць, ула́джвацца: ***Can you arrange to see him tomorrow?*** Ці вы змо́жаце ўла́дзіць, каб паба́чыцца зь ім за́ўтра?; ***to arrange for a taxi*** замо́віць таксі́. 2. пагаджа́цца; умаўля́цца: ***We arranged to meet at six*** Мы ўмо́вілі ся сустрэ́цца а шо́стай

arrangement [ə'reɪndʒmənt] n. 1. укладда́ньне, (у)пара́дкаваньне, разьмяшчэ́ньне, разьмеркава́ньне *n.* 2. плян -у *m.*, камбіна́цыя *f.* 3. ула́джаньне, пагадне́ньне *n.*; дамо́ўленасьць *f.*: ***They came to an arrangement*** яны́ дамо́ві́ліся. 4. перапро́бка, адапта́цыя *f.*; прыстасава́ньне *n.* 5. Music. аранжыро́ўка *f.*
• ***arrangements***, pl. пля́ны, падрыхтава́ньні: ***to make arrangements for a journey*** падрыхтава́цца да падаро́жжа

arrant ['ærənt] adj. відаво́чны, і́сны, жахлі́вы: ***an arrant liar*** відаво́чны маню́ка; ***arrant nonsense*** і́снае глу́пства, і́сная лухта́

array [ə'reɪ] – n. 1. строй -ю *m.*: ***battle array*** баявы́ строй. 2. пака́з -у *m.*, выста́ва, кале́кцыя *f.*; збор -у *m.*: ***an array of wedding gifts*** збор вясе́льных падару́нкаў. 3. убра́ньне *n.*, строй для ўрачы́стае нагоды: ***bridal array*** убра́ньне маладу́хі. 4. Comput. масі́лў -ву *m.*
– v.t. 1. выстро́йваць, ста́віць стро́ем (*жаўне́раў*). 2. прыстро́йваць; апрана́ць, убіра́ць

arrears [ə'rɪərz] n., pl. 1. адстава́ньне, запазьне́ньне *n.*: ***His work is in arrears*** Ён адста́ў у пра́цы. 2. даўгі́ *pl.*, запазы́чанасьць *f.*

arrest [ə'rest] – v.t. 1. арышто́ўваць. 2. затры́мваць; спыня́ць: ***arrested development*** затрыма́нае разьві́цьцё. 3. зьвярта́ць, захапля́ць, прыко́ўваць: ***to arrest someone's attention*** захапі́ць не́чыю ўва́гу
– n. 1. а́рышт -у *m.*; зьняво́леньне *n.* 2. спыне́ньне, затрыма́ньне *n.*

arris ['ærɪs] n. во́йстрая грань, во́йстры ка́нт

arrival [ə'raɪvəl] n. 1. прые́зд, прыхо́д -у *m.*, прыбыцьцё *n.*; надыхо́д -у *m.* 2. прышэ́лец -ьца *m.*, пры́шлы -ага *m.*; новапрыбы́лы -ага *m.*: ***The new arrival is a boy*** Нованаро́джаны — хло́пчык

arrive [ə'raɪv] v.i. 1. прыбыва́ць; прыхо́дзіць; прыяжджа́ць: ***to arrive by air*** прыляце́ць. 2. надыхо́дзіць, прыхо́дзіць, наставаць: ***The time has arrived*** Наста́ў час. 3. рабі́ць кар'е́ру; праслаўля́цца, рабі́цца вядо́мым: ***to arrive as an actor*** здабы́ць сла́ву акто́ра. 4. нарадзі́цца
• ***arrive at a conclusion*** прыйсьці́ да высно́вы
• ***arrive at a decision*** прыня́ць пастано́ву

arrogance ['ærəgəns] n. ганары́стасьць *f.*; напы́шлівасьць, пы́ха *f.*; наха́бства *n.*, фанабэ́рыстасьць *f.*

arrogant ['ærəgənt] adj. 1. празьме́рна ганары́сты, фанабэ́рысты; пыхлі́вы, наха́бны. 2. саманадзе́йны

arrogate ['ærəgeɪt] v.t. 1. беспадста́ўна прысво́йваць, бяспра́ўна забіра́ць, прысабе́чваць: ***to arrogate a privilege*** прысво́йваць прывіле́і. 2. мець беспадста́ўныя прэтэ́нзіі

arrow ['ærou] n. 1. страла́ *f.*: ***bow and arrow*** лук і страла́. 2. стрэ́лка *f.* (*што пака́звае кіру́нак*)

arrowhead ['ærouhed] n. наканцо́ўе *n.*, вастрыё стралы́

arsenal ['ɑ:rsənəl] n. арсэна́л -у *m.*, склад зброі і вае́ннай амуні́цыі

arsenic ['ɑ:rsənɪk] – n. мыш'я́к -ю́ *m.*
– adj. мыш'яко́вы

arson ['ɑ:rsən] n. падпа́л -у *m.* (*умы́сны, злачы́нны*)

art I [ɑ:rt] – n. 1. маста́цтва *n.*: ***fine arts*** прыго́жыя маста́цтвы. 2. ***arts,*** pl. галі́на навуча́ньня: ***the faculty of arts*** факультэ́т гуманіта́рных наву́каў. 3. рамяство́ *n.*: ***the industrial arts*** рамёствы. 4. майстро́ўства *n.*: ***art of printing*** майстро́ўства дру́ку. 5. спры́тнасьць *f.*, спрыт -у *m.*; уме́льства *n.*: ***the art of making friends*** уме́льства здабыва́ньня сяброў
– adj. маста́цкі

art II [ɑ:rt] v., Archaic = **are** (*used only with* **thou**): ***thou art*** ты ёсьць

artefact, *гл.* **artifact**

Artemis [ˈɑ:rtɪmɪs] n., Myth. Артэмі́да *f.*, багі́ня палява́ньня

arterial [ɑ:rˈtɪriəl] adj. артэрыя́льны: ***the arterial walls*** сьце́нкі арта́рыяў. 2. магістра́льны, гало́ўны: ***an arterial highway*** магістра́льная аўтастра́да

arteriosclerosis [ɑ:rˌtɪrioʊsklə'roʊsəs] n. артэрыясклеро́з -у *m.*

artery [ˈɑ:rtəri] n., pl. **-teries** 1. арта́рыя *f.* 2. магістра́ль *f.*, гало́ўны шлях

artesian [ɑ:rˈti:ʒən] adj. артэзія́нскі

artful [ˈɑ:rtfəl] adj. 1. спра́ўны, разу́мны: ***artful handling of a situation*** разу́мнае вядзе́ньне спра́вы. 2. хі́тры; круце́льскі, махля́рскі. 3. шту́чны

arthritic [ɑ:rˈθrɪtɪk] – adj. артрыты́чны
– n. артры́тык -а *m.*, атрыты́чка *f.*

arthritis [ɑ:rˈθraɪtəs] n. артры́т -у *m.*

artichoke [ˈɑ:rtətʃoʊk] n. артышо́к -у *m.*

article [ˈɑ:rtɪkəl] n. 1. прадме́т -у *m.*, рэч *f.*, прадукт, вы́раб, тава́р -у *m.*: ***article of food*** прадукт харчава́ньня; ***article of furniture*** прадме́т мэ́блі, мэ́баль. 2. арты́кул -у *m.* 3. пункт -у *m.* (*ко́дэксу, умо́вы*): ***leading article*** перадавіца. 4. Gram. арты́кль -я *m.*: ***Belarus(i)an nouns have no articles*** Беларускія назо́ўнікі ня ма́юць арты́кляў

articular [ɑ:rˈtɪkjələr] adj. суста́ўны: ***Arthritis is an articular disease*** Артры́т — хваро́ба суста́ваў

articulate [ɑ:rˈtɪkjələt] – adj. 1. вырази́ста вымаўля́ны: ***articulate speech*** вырази́стая вымо́ва. 2. здо́льны я́сна выка́звацца. 3. вырази́сты, я́сна вы́казаны. 4. кале́нчаты; суста́ўчаты; чле́ністы: ***The backbone is an articulate structure*** Съпі́нны хрыбе́т ма́е чле́ністую буда́ву
– v.t. [ɑ:rˈtɪkjəleɪt] вырази́ста вымаўля́ць
– v.i. вырази́ста гаварыць

articulated [ɑ:rˈtɪkjəleɪtəd] кале́нчаты; суста́ўчаты; шарні́рны

articulation [ɑ:rˌtɪkjəˈleɪʃən] n. 1. вымаўле́ньне *n.*, артыкуля́цыя *f.* 2. суста́лў -ва *m.* 3. спалучэ́ньне суста́вамі, сучлянёньне *n.*

artifact [ˈɑ:rtɪfækt] n. артыфа́кт -у *m.*, ручны́ вы́раб

artifice [ˈɑ:rtɪfɪs] n. 1. спры́тная вы́думка, хі́трыкі *pl.* 2. ашука́нства *n.*, падма́н -у *m.*

artificer [ɑ:rˈtɪfəsər] n. 1. ма́йстра -ы *m.*, рамёсьнік -а *m.*; кваліфікава́ны рабо́тнік. 2. вынахо́днік -а *m.*

artificial [ˌɑ:rtɪˈfɪʃəl] adj. 1. шту́чны, ненатура́льны: ***artificial flowers*** шту́чныя кве́ткі. 2. няшчы́ры, фальшы́вы

artificially [ˌɑ:rtɪˈfɪʃəli] adv. 1. шту́чна, ненатура́льна. 2. няшчы́ра, фальшы́ва

artificiality [ˌɑ:rtəˌfɪʃiˈælәti] n., pl. **-ties** 1. шту́чнасьць, ненатура́льнасьць *f.* 2. прытво́рнасьць, фальшы́васьць *f.*

artillery [ɑ:rˈtɪləri] *n.* артыле́рыя *f.*

artilleryman [ɑ:rˈtɪlərimæn] n., pl. **-men** артылерыст -а, кананір -а *m.*

artisan [ˈɑ:rtəzən] n. рамёсьнік -а *m.*, рамёсьніца *f.*, ма́йстрla -ы *m.*

artist [ˈɑ:rtəst] n. 1. маста́к -а́ *m.*, маста́чка *f.* 2. арты́ст -а *m.*, арты́стка *f.*

artiste [ɑ:rˈti:st] n. 1. эстра́дны арты́ст. 2. ма́йстра сваё спра́вы

artistic [ɑ:rˈtɪstɪk] adj. артысты́чны; маста́цкі

artistry [ˈɑ:rtɪstri] n., pl. **-ries** артысты́зм -у *m.*, артысты́чныя здо́льнасьці, майстэ́рства *n.*

artless [ˈɑ:rtləs] adj. 1. неартысты́чны; неабву́чаны, некваліфікава́ны. 2. нявінны, адкры́ты, няхі́тры, про́сты, на-

ію́ны. 3. натура́льны, няшту́чны: ***artless beauty*** натура́льная прыгажо́сьць

artsy ['ɑ:rtsi] adj., Informal з прэтэ́нзіяй на маста́цкасьць

Aryan ['eriən] – adj. арыі́йскі, індаэўрапе́йскі

– n. арыі́лец -йца *m.*, арыі́йка *f.*

as [æz; *unstressed* əz] – conj. 1. каб: ***He came early so as to meet us*** Ён прыйшо́ў рана, каб паба́чыцца з на́мі. 2. хоць, як ні, які́ б ні: ***Cunning as he is, he won't deceive me*** Які́ ён ні хі́тры, мяне́ ён не ашука́е. 3. як; так, як: ***do as you are told*** рабе́це, як вам ска́зана; ***white as snow*** бе́лы, як сьнег. 4. як; у ро́лі; у я́касьці: ***as friends*** як сябры́; ***to appear as Hamlet*** выступа́ць у ро́лі Га́млета; ***to work as a teacher*** працава́ць наста́ўнікам; ***to die as a slave*** памёрці няво́льнікам. 5. калі́, у той час, як: ***He came in as I was speaking*** Ён увайшо́ў, калі́ я прамаўля́ў. 6. бо: ***He could not stay, as it was late*** Ён ня мог заста́цца, бо было́ по́зна. 7. як напры́клад: ***some animals, as the fox and the wolf*** некато́рыя зьвяры́, як напры́клад лісі́ца й воўк

– pron. 1. што, які́, як: ***I had the same trouble as you*** Я меў той са́мы кло́пат, што й ты; ***He is a writer, as is his wife*** Ён пісьме́ньнік, як і яго́ная жо́нка. 2. як, што: ***He lost, as you know*** Ён прайграў, як вы ве́даеце.

• ***as... as*** такса́ма як: ***He is as tall as you are*** Ён тако́га са́мага ро́сту, як і вы

• ***as far as*** да; нако́лькі; яшчэ́: ***as far as I know*** нако́лькі я ве́даю; ***as far as 1920*** яшчэ́ ў 1920 го́дзе; ***as soon as you can*** як то́лькі змо́жаце

• ***as for*** што датычыць

• ***as from*** пачына́ючы ад

• ***as good as*** фактычна; бліз ў́; усё ро́ўна што: ***The work is as good as done*** Рабо́та фактычна зако́нчаная

• ***as if*** як бы́ццам, ні́быта, ні́бы, як

• ***as is*** як ёсьць, у цяпе́рашнім ста́не

• ***as it were*** так сказа́ўшы

• ***as much*** так і; гэ́так і: ***I thought as much*** Я гэ́так і ду́маў

• ***as regards*** што да, што датычыць

• ***as soon as*** як то́лькі

• ***as though = as if*** бы́ццам

• ***as to*** каб: ***as to impress*** каб зрабіць ура́жаньне

• ***as well*** такса́ма: ***I can do it as well*** Я такса́ма магу́ гэ́та зрабіць

• ***as well as*** у дада́так; а такса́ма: ***The room is light as well as airy*** Пако́й сьве́тлы, а такса́ма до́бра праве́траны

• ***as yet*** дагэ́туль, паку́ль што: ***Nothing has been done as yet*** Дагэ́туль нічо́га ня зро́блена

asbestos [æs'bestəs] – n. асбэ́ст-у *m.*

– adj. асбэ́ставы: ***asbestos gloves*** асбэ́ставыя рукаві́цы

ascend [ə'send] – v.i. паднім а́цца, узнім а́цца, уздым а́цца; узыхо́дзіць (*пра со́нца*): ***The airplane ascended higher and higher*** Самалёт узнім а́ўся вышэ́й і вышэ́й; ***The sun ascended slowly*** Со́нца павóлі ўзыхо́дзіла. 2. Mus. павыш а́цца (*пра тон*)

– v.t. 1. узла́зіць, узнім а́цца, уздым а́цца (*на гару́*): ***to ascend Mount Everest*** узьня́цца на гару́ Эвэрэст. 2. узыхо́дзіць (*на пас а́д*). 3. ісьці́ ўверх (*па рацэ́*)

ascendancy [ə'sendənsi] n. перава́га *f.*; дамінýючая пазы́цыя; панава́ньне *n.*

ascendant or **-ent** [ə'sendənt] – adj. 1. які́ дамінýе, панýе: ***ascendant position in world politics*** дамінýючае стано́вішча ў сусьве́тнай пали́тыцы. 2. узыхо́дны, які́ ўзыхо́дзіць *(пра зо́рку, со́нца)*

– n. 1. перава́га *f.*; дамінýючая пазы́цыя: ***to be in the ascendant*** мець перава́гу; узыхо́дзіць. 2. пра́шчур -а *m.*

ascension [ə'senʃən] n. 1. узыхо́джаньне, уздым а́ньне *n.*; узьня́цьце *n.* 2. усхо́д -у *m.* (*нябе́снага це́ла*)

Ascension Day, Relig. Узьнясе́ньне Гаспо́дняе, Ушэ́сьце *n.*

ascensive [ə'sensiv] adj. 1. узыхо́дны (*у гару́*). 2. Gram. павелічáльны; узмацня́льны (*напр. су́фікс*)

ascent [əˈsent] n. 1. узьбіра́ньне (*на гару́*). 2. узыхо́джаньне, узьніма́ньне, падня́цьце *n.*, узьлёт -у *m.*: ***the ascent of the airplane*** узьлёт самалёта. 3. стро́мкасьць *f.*, градые́нт -а *m.*: ***an ascent of ten degrees*** стро́мкасьць на 10 гра́дусаў

ascertain [ˌæsərˈteɪn] v.t. канстатава́ць; выясьня́ць; устанаўля́ць; сьцьвярджа́ць, пацьвярджа́ць; упэ́ўнівацца: ***to ascertain the situation*** вы́ясьніць абста́віны

ascertainment [ˌæsərˈteɪnmənt] n. сьцьве́рджаньне, устанаўле́ньне, выясьне́ньне *n.*

ascetic [əˈsetɪk] – n. аске́т -а *m.*, аске́тка *f.* – adj. аскеты́чны; стры́маны

asceticism [əˈsetɪsɪzəm] n. аскетызм -у *m.*, самаадмаўле́ньне -я *n.*

ascorbic [əˈskɔːrbɪk] adj. аскарбі́навы. ***ascorbic acid*** аскарбі́навая кіслата́, вітамі́н С

ascribe [əˈskraɪb] v.t. прыпі́сваць

asepsis [ˌeɪˈsepsɪs] n. асэ́птыка *f.*

aseptic [ˌeɪˈseptɪk] adj. асэптычны (*абязара́жаны*), дэзынфіка ва́ны

asexual [ˌeɪˈsekʃuəl] adj., Bot. бяспо́лы

ash I [æʃ] – n. 1. по́пел -у *m.*: ***Ash Wednesday*** Папяльцо́вая Серада́. 2. ко́лер по́пелу
– v.i. спапяля́цца
• ***ashes*** 1. по́пел -у *m.*: ***hot ashes*** пры́сак -у *m.* 2. це́ла нябо́жчыка, аста́нкі, парэ́шткі *pl. only*; тло *n.*, прах -у *m.*; пыл -у *m.*: ***to turn to dust and ashes*** рассы́пацца ў пыл, спарахне́ць. 3. ру́іны *pl.*

ash II [æʃ] n. я́сень -я *m.*

ashamed [əˈʃeɪmd] adj. засаро́млены: ***to be ashamed of something*** саро́мецца *чаго́*; ***to be ashamed for someone*** саро́мецца за *каго́*; ***He was ashamed to tell the truth*** Яму́ было́ со́рамна сказа́ць пра́ўду; ***He became ashamed*** Яму́ ста́ла со́рамна

ashcan [ˈæʃkæn] n. вядро́ на сьмяцьцё, по́пел

ashen I [ˈæʃən] adj. 1. папяліс́ты; бляды́, бле́дны як сьме́рць. 2. по́пельны; з по́пелу

ashen II [ˈæʃən] adj. я́сеневы; зь я́сеню

ashlar [ˈæʃlər] n. 1. каме́нныя блёкі для будава́ньня. 2. будыніна з тако́га ка́меню

ashore [əˈʃɔːr] adv. 1. да бе́рагу, на бе́раг. 2. на бе́разе; на су́шы

ashtray [ˈæʃtreɪ] n. по́пельніца, по́пелка *f.*

ashy [ˈæʃi] adj. 1. папяліс́ты, бле́дны як по́пел. 2. з по́пелу; по́пельны. 3. пакры́ты по́пелам

Asian [ˈeɪʒən] – adj. азія́цкі: ***Asian flu*** азія́цкі грып– n. азія́т -а *m.*, азія́тка *f.*

Asiatic [ˌeɪʒiˈætɪk] adj. азія́цкі

aside [əˈsaɪd] – adv. 1. набо́к; убо́к; збо́ку: ***to put aside*** адкла́сьці набо́к; ***Move the table aside*** Адсу́нуць стол набо́к; ***to stand aside*** стая́ць збо́ку
– n. 1. заўва́га, ска́заная напаўго́ласа: ***His low aside was overheard*** Яго́ заўва́га, ска́заная напаўго́ласа, была́ ўсё ж пачу́тая. 2. сло́вы, гаво́раныя акто́рам убо́к
• ***aside from*** асо́бна; апрача́, акрамя́

asinine [ˈæsɪnaɪn] adj. 1. асьлі́ны, як асёл. 2. дурны́, упа́рты

ask [æsk] – v.t. 1. пыта́ць, пыта́цца: ***to ask the way*** пыта́цца даро́гі; ***Ask him how old he is*** Спыта́йцеся ў яго́, ко́лькі яму́ гадо́ў. 2. прасі́ць: ***to ask permission*** прасі́ць дазво́лу. 3. запро́шваць, дамага́цца: ***to ask too high a price*** запро́шваць зана́дта высо́кую цану́. 4. запраша́ць; зваць: ***She asked her friends to come to her house*** Яна́ запрасі́ла сваіх сяброў да сябе. 5. вымага́ць, патрабава́ць: ***This job asks hard work*** Гэ́тая праца́ вымага́е цяжкае пра́цы; ***It asks for attention*** Гэ́та вымага́е ўва́гі
– v.i. 1. прасі́ць: ***to ask for help*** прасі́ць дапамо́гі. 2. пыта́цца, дае́дваца: ***Did anyone ask for me?*** Ці не́хта пыта́ўся пра мяне́?
• ***ask a riddle*** зага́дваць, задава́ць зага́дку

• ***ask for it = to ask for trouble*** шука́ць бяды́; ле́зьці на ражо́н
• ***ask out*** запраша́ць не́кага (*на спатка́ньне*)

askance [əˈskæns] adv. недаве́рліва, незадаво́лена, падазро́на, ско́са: ***to look askance at someone*** глядзе́ць на не́кага ско́са

askew [əˈskju:] – adv. ко́са, кры́ва: ***The picture is hanging askew*** Карці́на вісі́ць кры́ва
– adj. крывы́, ко́сы, касы́

aslant [əˈslænt] – adv. укóсна, ко́са; наўскася́к, наўскасы́, наўко́с
– prep. упо́перак, наўко́с
– adj. укóсны

asleep [əˈsli:p] adj., adv. 1. сьпя́чы: ***to fall asleep*** засына́ць, засну́ць. 2. няўва́жны; вя́лы, нясьве́дамы: ***He is asleep to the danger*** Ён нясьве́дамы небясьпе́кі. 3. тупы́: ***His mind is asleep*** У яго́ тупы́ ро́зум. 4. здранцьве́лы, зьняме́лы: ***My arm is asleep*** У мяне́ здранцьве́ла рука́. 5. мёртвы

aslope [əˈsloʊp] – adv. пахі́ла, пахі́лена; ко́са; на схі́ле, на спа́дзе
– adj. пахі́лы, ко́сы

asocial [əˈsoʊʃəl] adj. 1. неграма́дзкі. 2. нетава́рыскі

asp [æsp] n. ядаві́тая зьмяя́

asparagus [əˈspærəgəs] n. Bot. спа́ржа *f.*

aspect [ˈæspekt] n. 1. гле́дзішча *n.*; бок -у *m.*; аспэ́кт -у *m.*: ***to consider a question in all aspects*** разгляда́ць пыта́ньне з усі́х бако́ў. 2. вы́раз тва́ру, вы́гляд, пагля́д -у *m.* 3. від *m.* (*у пэ́ўным кіру́нку*). 4. бок -у *m.*: ***the western aspect of the house*** захо́дні бок до́му. 5. Gram. трыва́ньне *n.*: ***imperfective aspect*** незако́нчанае трыва́ньне. 6. Astrol. фа́за *f.*

aspen [ˈæspən] – n. аси́на *f.*
– adj. 1. аси́навы: ***to tremble like an aspen leaf*** дрыжэ́ць, як аси́навы ліст. 2. Figur. дрыго́ткі

asperge [əˈspɜ:rdʒ] v.t. пы́рскаць, крапі́ць

aspergilum [ˌæspərˈdʒɪləm] n., pl. **-gilla** or **-lums** крапі́ла *n.*

asperity [æˈsperəti] n., pl. **-ties** 1. няро́ўнасьць, шурпа́тасьць, шо́рсткасьць *f.* 2. рэ́зкасьць, грубія́нскасьць, неачэ́санасьць *f.*: ***the asperity in his voice*** рэ́зкасьць у яго́ным го́ласе. 3. суро́васьць, во́йстрасьць *f.*: ***the asperities of a very cold winter*** суро́васьць сьцюдзёнай зімы́

asperse [əˈspɜ:rs] v.t. 1. крапі́ць; пы́рскаць. 2. рабі́ць паклёпы *на каго́*, га́ньбіць, ганьбава́ць, няслáвіць, зьнеслаўля́ць

aspersion [əˈspɜ:rʒən] n. 1. краплéньне (*вадо́ю*), пы́рсканьне *n.* 2. паклёп -у *m.*: ***You should not cast aspersions upon an innocent man*** Ты не павінен кі́даць паклёпы на невінава́тага чалаве́ка. 3. паклёпнічаньне *n.*

asphalt [ˈæsfɔ:lt] – n. асфа́льт -у *m.*
– v. асфальтава́ць– adj. асфа́льтавы: ***an asphalt highway*** асфа́льтавая аўтастра́да; ***asphalt jungle,*** Informal асфа́льтавыя джу́нглі, ча́стка го́раду, у яко́й учыня́ецца шмат злачы́нстваў

asphodel [ˈæsfədəl] n., Bot. 1. асфадэ́ль -ю *m.*; нарцы́з -у *m.* 2. Myth. неўміру́чая кве́тка з палёў Элізэ́йскіх

asphyxia [æsˈfɪksiə] n. Med. удушэ́ньне ад нястачы кісларо́ду, асфі́ксыя *f.*

asphyxiate [əsˈfɪksieɪt] v. душы́ць|ь (-ца) (*ад недахо́пу кісларо́ду*)

aspirant [ˈæspərənt] – n. кандыда́т -а *m.*; прэтэндэ́нт -а *m.*, прэтэндэ́нтка *f.*: ***aspirants for the office of mayor*** прэтэндэ́нты на паса́ду мэ́ра
– adj. які́ імкне́цца *да чаго́*, прэтэндуе на *што*

aspirate [ˈæspəreɪt] – v.t. 1. вымаўля́ць з прыдыха́ньнем. 2. Med. выдаля́ць ва́дкасьць высо́сваньнем (*з по́ласьці це́ла*)
– n. [ˈæspərət] прыдыха́льны гук
– adj. прыдыха́льны

aspiration [ˌæspəˈreɪʃən] n. 1. імкне́ньне *n.*, мо́цнае жада́ньне; амбі́цыя *f.* 2. удыха́ньне *n.*; удых -у *m.*, дыха́ньне *n.* 3. прыдыха́ньне *n.*, прыдыха́льны гук. 4. Med. асьпіра́цыя *f.*, высо́сваньне ва́д-

касьці ці павéтра з пóласьці цéла. 5. усмóктваньне, прысмóктваньне, ссáньне *n.*

aspire [əˈspaɪər] v.i. 1. імкнýцца *да чагó*; мець мóцнае жадáньне. 2. узнóсіцца

aspirin [ˈæsprɪn] n. асьпіры́н -у *m.*

aspiring [əˈspaɪərɪŋ] adj. 1. прáгны да пашáны (*слáвы, улáды*), амбíтны. 2. які́ ўздымáецца

asquint [əˈskwɪnt] adv. а) кóса, скóса: ***to look asquint*** глядзéць скóса. б) Figur. глядзéць кóса, падазрóна

ass [æs] n. 1. асёл, аслá *m.* 2. дýрлань -ня *m.*, дурны́ *абó* упáрты чалавéк. 3. Sl. зáдніца *f.*

• ***kick smb's ass*** Sl. задáць ды́хту

• ***sit on your ass*** Sl. сядзéць кýчай

assail [əˈseɪəl] v.t. 1. нападáць, атакавáць: ***to assail a fortress*** напáсьці на крэпасьць. 2. апанóўвець, ахапля́ць: ***I was assailed with doubts*** Мяне́ апанавáлі сумнéвы. 3. рэ́зка крытыкавáць; закідáць: ***I was assailed with questions*** Мяне́ закі́далі пытáньнямі

assailable [əˈseɪləbəl] adj. адкры́ты для напáдаў, слабы́, прыстýпны

assailant [əˈseɪlənt] n. напáднік *m.*, хто нападáе абó атакýе

assassin [əˈsæsɪn] n. забóйца -ы *m. & f.*

assassinate [əˈsæsɪneɪt] v.t. 1. забівáць. 2. Figur. зьнеслаўля́ць: ***assassinate someone's name*** зьняслáвіць нéчае імя́ паклёпамі

assassination [əˌsæsɪˈneɪʃən] n. забóйства *n.*

assault [əˈsɔ:lt] – n. 1. напáд -у *m.*; атáка *f.*, штурм -у *m.*; пры́ступ -у *m.*: ***to take by assault*** узя́ць штýрмам. 2. Law слóўная абрáза, пагрóза фізы́чнага гвáлту: ***assault and battery*** напáд са зьбіцьцём. 3. згвалтавáньне *n.* 4. Milit. вы́садка дэсáнту з бóем

– adj. штурмавы́: ***assault troops*** штурмавы́я аддзéлы

– v.t. 1. атакавáць, штурмавáць. 2. нападáць, накідáцца. 3. гвáлціць

assay [əˈseɪ] – v. 1. прабавáць, выпрабóўваць; дасьлéдаваць, спраўджáць, правяráць. 2. аналізавáць сплаў ці рудý: ***This ore assays high in gold*** Гэ́тая рудá багáтая зóлатам

– n. 1. аналíз -у *m.*, прóба *f.* 2. выпрабавáньне *n.*; дóсьлед -у, тэст -у, экзáмэн -у *m.* 3. аналізавáнае рэ́чыва

assemblage [əˈsemblɪdʒ] n. 1. збор -у, зьéзд-у *m.*, збóрышча *n.*: ***an assemblage of all religions and races*** збор усíх рэлíгіяў і рáсаў. 2. награмáджаньне *n.*; калéкцыя, грýпа *f.* 3. схóдка, збóрка *f.*, збор -у *m.* 4. збóрка *f.*, мантáж -ý *m.*: ***the assemblage of parts of a machine*** збóрка чáстак машы́ны

assemble [əˈsembəl] – v.t. 1. зьбіráць. 2. складáць: ***to assemble a watch*** склáсьці гадзíньнік. 3. склікáць

– v.i. зьбіráцца, зьяжджáцца; сыхóдзіцца: ***Parliament assembles in October*** Парля́мэнт зьбіráецца ў кастры́чніку

assembly [əˈsembli] n., pl. **-blies** 1. асамблéя *f.*, лю́дзі, што сабráліся; схóд -у *m.*; пасéджаньне *n.* 2. устанóўчы сход; заканадáўчы óрган, сойм -у *m.* 3. збóрка *f.* (*чáстак мэханíзму*). 4. набóр, камплéкт, агрэгáт -у *m.* 5. Milit. сыгнáл на збор. 6. схóдка *f.*: ***unlawful assembly*** нелегáльная схóдка

assembly line збóрачны канвэ́р

assembly plant збóрачны цэх

assent [əˈsent] – v.i. выкáзваць згóду, згаджáцца, пагаджáцца: ***He assented to our proposal*** Ён згадзíўся на нáшую прапанóву

– n. згóда *f.*; прыняцьцё прапанóвы

assentation [ˌæsenˈteɪʃən] n. 1. выказáньне згóды. 2. угóдніцтва *n.*, лíсьлівае падтáкваньне

assert [əˈsɜ:rt] v.t. 1. сьцьвярджáць, упэ́ўніваць, казáць. 2. настóйваць (*на сваíх правóх*); баранíць: ***Assert your independence*** Баранí сваю́ самастóйнасьць

• ***assert oneself*** настóйваць на сваíм

assertion [əˈsɜ:rʃən] n. 1. сьцьвéрджаньне, упэ́ўніваньне *n.*, упэ́ўненасьць *f.* 2. настóйваньне на сваім прáве; напалягáньне *n.*; дамагáньне *n.*

assertive [əˈsɜ:rtɪv] adj. 1. напо́рысты, саманадзе́йны, самаўпэ́ўнены. 2. Gram. апавяда́льны: ***an assertive sentence*** апавяда́льны сказ

assess [əˈses] v.t. 1. ацэ́ньваць. 2. вызнача́ць су́му *(пада́тку, ка́ры)*; аблічаць, ацэ́ньваць: ***Damages have been assessed at $2000*** Шко́да была́ ацэ́нена на дзьве ты́сячы даля́раў. 3. вызнача́ць ва́ртасьць. 4. абмярко́ўваць: ***to assess a situation*** абмеркава́ць сытуа́цыю

assessment [əˈsesmənt] n. 1. ацэ́нка *f.*, ацэ́ньваньне *n.*, атэста́цыя *f.* 2. вы́значаная су́ма пла́ты

assessor [əˈsesər] n. асэ́сар -а *m.* а) пада́ткавы ўрадо́вец. б) кансульта́нт пры судзьдзі́

asset [ˈæset] n. 1. каштоўнасьць, ва́ртасьць *f.* 2. ко́зыр -а *m.*

assets [ˈæsets] n., pl. маёмасьць: ***personal assets*** рухо́мая маёмасьць. 2. Bookkeep. акты́ў -ву *m.*, акты́вы: ***assets and liabilities*** акты́ў і пасі́ў

asseverate [əˈsevəreɪt] v.t. урачы́ста абвяшча́ць, заяўля́ць

assiduity [ˌæsɪˈdu:əti] n., pl. **-ties** 1. стара́ннасьць, шчы́расьць у пра́цы, пі́льнасьць, ру́плівасьць *f.* 2. ста́лы ру́плівы дагля́д, дагаджа́ньне *n.*

assiduous [əˈsɪdʒuəs] adj. 1. стара́нны, шчы́ры ў пра́цы. 2. ру́плівы; ува́жны

assign [əˈsaɪn] v.t. 1. назнача́ць, прызнача́ць: ***The judge assigned a day for the trial*** Судзьдзя́ прызна́чыў дзень суду́. 2. дава́ць, задава́ць: ***to assign homework*** зада́ць ха́тнюю пра́цу. 3. устанаўля́ць, выяўля́ць: ***No cause could be assigned to the fire*** Не маглі́ вы́явіць прычы́ны пажа́ру. 4. перадава́ць (*маёмасьць, правы́*)

assignation [ˌæsɪgˈneɪʃən] n. 1. прызначэ́ньне *n.* 2. патае́мнае спатка́ньне, дамо́ўленьне на спатка́ньне

assignee [əˌsaɪˈni:] n. зако́нны спадкае́мца, перае́мнік правоў. 2. упаўнава́жаны

assignment [əˈsaɪnmənt] n. 1. вы́значанае зада́ньне; мі́сія *f.*, даручэ́ньне *n.*: ***assignment in arithmetic*** зада́ньне з арытмэ́тыкі. 2. прызначэ́ньне *n.*, намі́нацыя *f.* 3. а) зако́нная перада́ча маёмасьці. б) дакумэ́нт, на падста́ве яко́га ро́біцца перада́ча

assimilate [əˈsɪməleɪt] – v.t. 1. асымілява́ць, упадабня́ць: ***to assimilate immigrants*** асымілява́ць імігра́нтаў. 2. засво́йваць: ***You read so much that you do not assimilate it all*** Ты чыта́еш так шмат, што ўсяго́ не засво́йваеш. 3. Biol. засво́йваць

– v.i. асымілява́цца, упадабня́цца

assimilation [əˌsɪməˈleɪʃən] n. 1. асымілява́ньне *n.*, асыміля́цыя *f.* 2. засвае́ньне *n.*; паглына́ньне *n.* 3. Gram. прыпадабне́ньне *n.*, асыміля́цыя *f.* (*гу́каў*). 4. Biol. засвае́ньне *n.*

assimilative [əˈsɪməleɪtɪv] adj. 1. асымілятыўны. 2. засваяльны; асыміляцыйны

assist [əˈsɪst] – v.t. дапамага́ць, падтрымо́ўваць, супрацо́ўнічаць

– v.i. (in) бра́ць удзе́л *у чым*, (at) прысу́тнічаць: ***He assisted at a meeting*** Ён бра́ў удзе́л у збо́рцы

– n. дапамо́га, падтры́мка *f.*

assistance [əˈsɪstəns] n. дапамо́га, падтры́мка *f.*: ***Can I be of assistance?*** Ці магу́ я дапамагчы́?

assistant [əˈsɪstənt] – n. памо́чнік -а *m.*, памо́чніца *f.*; памага́тыы -ага *m.*, памага́тая *f.*; асыстэ́нт -а *m.*, асыстэ́нтка *f.*

– adj. дапамо́жны; які́ дапамага́е

associate [əˈsouʃieɪt] – v.t. 1. асацыява́ць, спалуча́ць, злуча́ць (*у ду́мках*). 2. далуча́цца да су́палкі ці фі́рмы: ***to be associated with*** быць зьвя́заным з *кім-чым*: ***Her name is associated with the women's rights movement*** Яе́ імя́ зьвя́занае з жано́чым ру́хам. 3. злуча́ць ра́зам; задзіно́чваць, аб'яднаўваць, гурта-ва́ць

– v.i. 1. сябрава́ць, ве́сьці знаёмства з *кім*. 2. гуртава́цца, задзіно́чвацца

– adj. [əˈsouʃiət] аб'ядна́ны; зьвяза́ны

– n. 1. ся́бра -ы *m.*, сяброў́ка *f.*, калéга -і *m.*, супрацоў́нік -а *m.* 2. супóльнік -а *m.*, супóльніца *f.*; партнэ́р -а *m.* • ***an associate member*** ся́бра арганізáцыі зь няпóўнымі правáмі • ***associate editor*** памóчнік рэдáктара

association [əˌsoʊsiˈeɪʃən] n. 1. сýвязь *f.*: дачынéньні *pl. only*; бліжэ́йшае знáёмства. 2. аб'яднáньне, згуртавáньне *n.*; хаўрýс -у *m.*, тавáрыства *n.*, асацыя́цыя *f.*: ***the young people's association*** згуртавáньне мóладзі. 3. сяброўства, партнэ́рства *n.*, сýпалка, сýвязь, асацыя́цыя *f.*: ***association of ideas*** сýвязь дýмак

associative [əˈsoʊʃieɪtɪv] adj. асацыяты́ўны; схíльны да гуртавáньня

assonance [ˈæsənəns] n. асанáнс -у *m.*, недакладная рыфма

assonant [ˈæsənənt] – adj. асанáнсны, сугýчны – n. асанáнс -у *m.*, сугýчча *n.*

assort [əˈsɔːrt] – v.t. сартавáць; разьмяркóўваць; разьбірáць; групавáць, клясыфікавáць: ***to assort books alphabetically*** групавáць кнíгі ў альфабэ́тным парáдку – v.i. падыхóдзіць, пасавáць: ***to assort well*** дóбра пасавáць

assorted [əˈsɔːrtəd] adj. 1. пасартавáны; выбраны; разнаякí, мéшаны, мяшáны: ***assorted candies*** мéшаныя цукéркі. 2. падабрáны; клясыфікавáны

assortment [əˈsɔːrtmənt] n. 1. сартавáньне *n.*, клясыфікáцыя *f.* 2. выбар -у *m.*; падбóр -у *m.*, асартымэ́нт -у *m.*

assuage [əˈsweɪdʒ] v.t. 1. зьмякчáць. палягчáць (*гóра, боль*). 2. наталя́ць, заспакóйваць, задавóльваць, суцішáць: ***to assuage hunger*** суцíшыць гóлад

assuagement [əˈsweɪdʒmənt] n. 1. зьмякчэ́ньне, палягчэ́ньне *n.* 2. наталéньне, заспакаéньне, суцішэ́ньне *n.*

assume [əˈsuːm] – v.t. 1. прымáць, браць: ***He assumed a new name*** Ён узя́ў сабé íншае імя́; ***to assume control*** браць кіраўнíцтва; ***to assume an air of innocence*** прыня́ць бязьвíнны вы́гляд. 2. прысвóйваць; узурпавáць. 3. удавáць; прыкідáцца: ***to assume ignorance*** удавáць нявéданьне – v.i. меркавáць; дапушчáць: ***I assume that...*** я дапушчáю, што...

assumed [əˈsuːmd] adj. 1. удавáны; прыня́ты, незапрáўдны, фíкцыйны, вы́думаны: ***an assumed name*** прыня́тае ймя́. 2. дапушчáльны; меркавáны. 3. узурпавáны, бяспрáўна захóплены

assuming [əˈsuːmɪŋ] adj. 1. занáдта ўпэ́ўнены, нахáбны

assumption [əˈsʌmpʃən] n. 1. прысваéньне, захаплéньне *n.* (*улáды*); прыня́цьце *n.* (*абавя́зку*). 2. дапушчэ́ньне, меркавáньне *n.*: ***You are making a dangerous assumption*** Вы робіце небясьпéчнае дапушчэ́ньне. 3. нахáбства *n.*

Assumption Усьпéньне Бóжае Máці

assurance [əˈʃʊrəns] n. 1. запэ́ўненьне, упэ́ўненьне *n.*: ***to give one's assurance*** запэ́ўніць. 2. страхóўка *f.*, страхавáньне *n.* 3. пэ́ўнасьць, перакананасьць *f.*; цьвёрдая ўпэ́ўненасьць: ***We have the assurance of final victory*** Нас запэ́ўнілі ў канчатковай перамóзе. 4. самапэ́ўнасьць, самаўпэ́ўненасьць *f.*

assure [əˈʃʊr] v.t. 1. упэ́ўніваць, пераконваць. 2. запэ́ўніваць: ***I can assure you*** Я магу́ вас запэ́ўніць. 3. забясьпéчваць, гарантавáць. 4. страхавáць: ***to assure one's life*** застрахавáць жыцьцё. 5. падбадзёрваць, дадавáць сьмéласьці: ***to assure a frightened child*** падбадзёрыць спалóханае дзіця́

assured [əˈʃʊrd] – adj. 1. пэ́ўны, запэ́ўнены: ***Success is assured*** Удáча запэ́ўненая. 2. пэ́ўны сябé; адвáжны. 3. застрахавáны – n. застрахавáны -ага *m.*

assuredly [əˈʃʊrɪdli] adv. 1. напэ́ўна; вядóма; безумóўна. 2. пэ́ўна, адвáжна, я́сна

assuredness [əˈʃʊrɪdnəs] n. 1. пэ́ўнасьць *f.* 2. самапэ́ўнасьць *f.*
astatic [əˈstætɪk] adj. нястáлы; хíсткі
aster [ˈæstər] n. Bot. áстра *f.*
asterisk [ˈæstərɪsk] – n. зóрачка *f.*, знак знóскі (*у дрýку ці пісьмé*)
– v.t. пазначáць зóрачкай
asteroid [ˈæstərɔɪd] – n. 1. Astron. астэрóйд -а *m.* 2. Zool. марскáя зóрка
asteroidal [ˌæstəˈrɔɪdəl] adj. астэрóйдавы
asthenia [æsˈθi:nɪə] n. астэ́нія, квóласьць *f.*, бясьсíльле *n.*
asthenic [æsˈθenɪk] adj. астэнíчны
asthma [ˈæzmə] n. áстма, дыíхавіца *f.*; задыíшка *f.*
asthmatic [æzˈmætɪk], – adj. астматы́чны, дыíхавічны
– n. хвóры на áстму, астмáтык -а *m.*, астматы́чка *f.*
astigmatic [ˌæstɪgˈmætɪk] adj. 1. астыгматы́чны. 2. Figur. вы́крыўлены (*паглядз*)
astigmatism [əˈstɪgməˌtɪzəm] n. астыгматы́зм -у *m.*
astir [əˈstɜ:r] adv., adj. у рýху; узбýджаны
astonish [əˈstɑ:nɪʃ] v.t. зьдзіўля́ць, дзівíць
astonishing [əˈstɑ:nɪʃɪŋ] adj. неспадзявáны, нечакáны; якíдзíвіць
astonished [əˈstɑ:nɪʃt] adj. зьдзíўлены
astonishment [əˈstɑ:nɪʃmənt] n. зьдзіўлéньне *n.*: ***to my astonishment*** на маё зьдзіўлéньне
astound [əˈstaʊnd] v.t. мóцна зьдзіўля́ць, дзівíць. 2. уражáць
astraddle [əˈstrædəl] adv., adj., *гл.* **astride**
astrakhan [ˌæstrəˈkæn] n. 1. вóўна з астраханскіх авéчак. 2. карáкульь -ю *m.*
astral [ˈæstrəl] adj. зóркавы; зóрны, астрáльны
astray [əˈstreɪ] – adv. зьбíцца з дарóгі: ***to go astray*** заблудзíць; зьбíцца з дарóгі. ***to lead astray*** зьбівáць з дарóгі
– adj. якí зьбíўся з дарóгі, якí заблудзíў
astrict [əˈstrɪkt] v.t. 1. зьвя́зваць, стрымваць. 2. марáльна абавя́зваць, зьвя́зваць. 3. абмяжóўваць
astride [əˈstraɪd] – adj. з расстáўленымі нагáмі
– adv., prep. 1. вéрхам; расстáвіўшы нóгі: ***He sits astride on his horse*** Ён сядзíць вéрхам на канí. 2. паабáпал, уздóўж: ***astride of the road*** паабáпал дарóгі
astringent [əˈstrɪndʒənt] – adj. 1. вя́жучы. 2. сурóвы; стрóгі (*стыль*). 3. éдкі
– n. рэ́чыва, якóе звужáе ткáнкі
astrologer [əˈstrɑ:lədʒər] n. астрóляг -а *m. & f.*, зьвяздáр зьвездарá *m. & f.*
astrological [ˌæstrəˈlɑ:dʒɪkəl] adj. астралягíчны
astrology [əˈstrɑ:lədʒi] n. астралёгія *f.*
astronaut [ˈæstrənɔ:t] n. астранáўт -а *m.*, астранáўтка *f.*; касманáўт -а *m.*
astronautics [ˌæstrəˈnɔ:tɪks] n. астранáўтыка *f.*
astronomer [əˈstrɑ:nəmər] n. астранóм -а *m. & f.*
astronomic(al) [ˌæstrəˈnɑ:mɪkəl] adj. 1. астранамíчны. 2. вéльмі вялíкі, велічэ́зны: ***astronomical sums of money*** велічэ́зныя сýмы грóшай
astronomy [əˈstrɑ:nəmi] n. астранóмія *f.*
astrophysics [ˌæstrəˈfɪzɪks] n. астрафíзыка *f.*
astute [əˈstu:t] adj. 1. праніклівы, празóрлівы; спрытны: ***an astute diplomat*** празóрлівы дыплямáт. 2. хíтры, лóўкі; кéмлівы
asunder [əˈsʌndər] adv. 1. па-рóзнаму; асóбна; у рóзныя бакí: ***to rush asunder*** кíнуцца ў рóзныя бакí. 2. надвóе; на кавáлкі, на чáсткі
• ***split asunder*** расшчапíць на чáсткі
• ***tear asunder*** разарвáць на кавáлкі
asylum [əˈsaɪləm] n. 1. прытýлак -ку *m.* 2. прыстáнішча *n.*, дом для псыхíчна хвóрых. 3. прытýлак *m.*, схóвішча *n.*, азы́лль -ю *m.*: ***political asylum*** палітычны прытýлак
asymmetrical [ˌeɪsɪˈmetrɪkəl] adj. асымэтрычны, несымэтрычны
asymmetry [eɪˈsɪmətri] n. асымэтрыя, несымэтрычнасьць *f.*
asymptote [ˈæsɪmtoʊt] n., Math. асымптóта *f.*

at [æt; *unstressed* ət] prep. 1. ля, у; на; блі́зка *чаго́*: ***at the door*** ля дзьвярэ́й, пры дзьвяра́х; ***at home*** до́ма: ***at school*** у шко́ле; ***at a meeting*** на пасе́джаньні. 2. (*у кірýнку*) у, на, за: ***to aim at the mark*** цэ́ліць у мэ́ту; ***Look at me*** Глядзі́ на мяне́; ***sit down at the table*** се́сьці за стол. 3. пад; у ста́не; на: ***at right angles*** пад про́стым ку-то́м; ***at war*** у ста́не вайны́; ***at anchor*** на я́кары; ***at peace*** у супако́і; ***at your discretion*** пад тваю́ разва́гу, на тваё вырашэ́ньне; ***at first sight*** на пе́ршы пагля́д; ***delighted at*** захо́плены *чым*. 4. (*пра час*) а, у, на, пад: ***at midnight*** апо́ўначы; пад по́ўнач; ***at five o'clock*** а пя́тай гадзіне; ***at the end of the lesson*** у канцы́ ле́кцыі; ***at dawn*** на сьві-та́нку; ***at night*** уначы́, уно́чы; ***at present*** цяпе́р. 5. праз: ***Enter at the back door*** Захо́дзь праз за́днія дзьве́ры. 6. да, за: ***at work*** за пра́цай; ***good at languages*** здо́льны да мо́ваў. 7. з прычы́ны, па: ***to be happy at something*** це́шыцца з прычы́ны не́чага

ataractic [ˌætəˈræktɪk] – adj. супако́йвальны: ***ataractic medicines*** супако́йвальныя ле́кі
– n. супако́йвальны лек

ataraxy [ˈætəˌræksi] n. Med. умыслó́вы й духовы супако́й; стаíчная абыяка-васьць

atavism [ˈætəˌvɪzəm] n. атавíзм -у *m.*, падабе́нства да далёкага про́дка

atavistic [ˌætəˈvɪstɪk] adj. атавісты́чны

ate [eɪt] v., *p.t. of* **eat**

atelier [ˌætəlˈjeɪ] n. майстэ́рня, сту́дыя *f.*, атэльé, *indecl., n.*

atheism [ˈeɪθiˌɪzəm] n. бязбо́жніцтва *n.*, атэíзм -у *m.*

atheist [ˈeɪθiɪst] n. 1. бязбо́жнік -а *m.*, бязбо́жніца *f.*; атэíст -а *m.*, атэíстка *f.*

atheistic [ˌeɪθiˈɪstɪk] adj. бязбо́жніцкі; атэістычны

Athena [əˈθi:nə] n., Myth. Атэ́на *f.*, багíня му́драсьці

athenaeum or **atheneum** [ˌæθɪˈni:əm] n. 1. навуко́вы *або́* літаратýрны клюб. 2. чыта́льня, бібліятэ́ка *f.*

Athenian [əˈθi:niən] – adj. атэ́нскі
– n. жыха́р(ка) Атэ́наў

athlete [ˈæθli:t] n. атле́т -а *m.*; спартóл-вец -ўца *m.*, спартóўка *f.*

athlete's foot, Med грыбко́вая хвароба на нага́х

athletic [æθˈletɪk] adj. 1. атлетычны; спартóвы: ***an athletic field*** спартóвы пляц. 2. руха́вы, энэргíчны

athleticism [æθˈletɪˌsɪzəm] n. захапле́нье спóртам, любóў да спóрту; здóльнасьць да спóрту

athletics [æθˈletɪks] n. 1. (usually pl.) спартóвыя гýльні. 2. (usually sing.) атле́тыка *f.*; фізкультýра *f.*, спорт -у *m.*: ***track and field athletics*** лёгкая атле́тыка

at-home [ətˈhoum] – n., *такс.* **at home** неафіцы́йнае прыняцьцё
– adj. ха́тні; неафіцы́йны: ***at-home clothes*** ха́тняя во́пратка
• ***feel at home*** чýцца ўтýльна, па-ха́тняму

athwart [əˈθwɔ:rt] – adv. на́крыж; упóперак, наўскóс
– prep. 1. упóперак; праз: ***to throw a bridge athwart a river*** перакíнуць мост праз ракý. 2. сýпраць, супрóць; насýперак, насупóр: ***athwart his plans*** насýперак ягóным пля́нам

atilt [əˈtɪlt] adj., adv. 1. перахíлены; набáкір (*пра ша́пку, капялю́ш*). 2. Milit. наперавéс

atlantes [ətˈlænti:z] n. pl., sing. **atlas** Arch. атля́нты, падпóрныя калёны

Atlantic [ətˈlæntɪk] – adj. атлянты́чны, трансатлянты́чны
– n. Атля́нтык -а *m.*, Атлянты́чны акія́н

atlas [ˈætləs] n. атля́с -у *m.*

atmosphere [ˈætməsfɪr] n. 1. атмасфэ́ра *f.* 2. Figur. навакóльнае асяродзьдзе, абстáвіны *pl.*, атмасфэ́ра *f.* 3. Phys. атмасфэ́ра *f.* (*адзíнка атмасфэ́рнага ціску*)

atmospheric [ˌætməsˈferɪk] adj. атмасфэ́рны: ***atmospherical pressure*** атмасфэ́рны ціск

atmospherics [ˌætməsˈferɪks] n. атмасфэ́рныя перашко́ды (*ра́дыё*)
atoll [ˈætɔ:l] n. ато́л -а *m.*
atom [ˈætəm] n. 1. а́там -а *m.* 2. малéнькая ча́стачка; кры́ха *f.*: ***there is not an atom of evidence*** нямá анí кры́хі до́ваду
atom bomb or **atomic bomb** а́тамная бо́мба
atomic [əˈtɑ:mɪk] adj. 1. а́тамны: ***atomic research*** а́тамнае дасьлéдаваньне. 2. прывóджаны ў рух а́тамнай энэ́ргіяй
atomic age а́тамны век, сучáсная эпóха
atomic energy а́тамная энэ́ргія
atomic fallout = nuclear fallout ра́дыяакты́ўныя апа́дкі
atomic heat а́тамнае цяплó
atomic number а́тамны пара́дкавы лік
atomic warfare а́тамная вайнá
atomic weight а́тамная вагá
atomization [ˌætəmɪˈzeɪʃən] n. 1. распы́льваньне *n.* 2. разьбівáньне на а́тамы. 3. раздрабнéньне на ча́стачкі
band II [bænd] – n. 1. стýжка *f.*, тáсьма, тасёмка *f.*, паясlóк -кá *m.* 2. павя́зка *f.*; абрýч -а *m.* 3. паласá, зóна *f.* 4. бераžlóк, шлячlóк -кá *m.*: ***a white cup with a gold band*** бéлы кýбак з залаты́м бераžкóм. 5. пярсьцёнlак -ка *m.* (*шлюбны*)
– v.t. перавязáць; бінтавáць

bandage [ˈbændɪdʒ] – n. бінт -á *m.*; бандáж -á *m.*; павя́зка *f.* (*на вóка*)
– v.t. завя́зваць, перавязáць, бінтавáць

banderol [ˈbændəroul] n. вы́мпел -а *m.*; сьцяжóк на мáчце

bandit [ˈbændɪt] n., pl. **-s** or **banditti** разбóйнік -а, рабаўнíк -á, банды́т -а *m.*

banditry [ˈbændɪtri] n. 1. бандыты́зм -у *m.* 2. банды́ты *pl.*

bandleader [ˈbændˌli:dər] n. дырыжóр -а *m.* (*аркéстры*), капэльмáйстlар -ра *m.*

bandmaster [ˈbændˌmæstər] n. капэльмáйстlар -ра *m.*

bandoleer or **bandolier** [ˌbændəˈlɪr], n. патрантáш-а *m.*

band shell кры́тая канцэ́ртная эстрáда

bandsman [ˈbændzmən] n., pl. **-men** аркестрáнт -а, музы́кlа -і *m.*

bandstand [ˈbændstænd] n. пляцóўка для аркéстры

bandwagon [ˈbændˌwægən] n. 1. фургóн з аркéстрай. 2. Informal папуля́рны, мóдны рух, грýпа ці плынь: ***to join the bandwagon*** далучы́цца да перамóжнага бóку

bandy [ˈbændi] adj. крывы́; вы́гнуты навóнкі: ***bandy legs*** крывы́я нóгі

bandylegged [ˌbændiˈlegd] adj. крывано́гі

bane [beɪn] n. 1. пракля́цьце *n.* 2. згу́ба, бядá *f.*, няшчáсьце *n.*: ***He is the bane of my life*** Ён атру́ціў мне жыцьцё

baneful [ˈbeɪnfəl] adj. 1. сьмяро́тны: ***a baneful poison*** сьмяро́тная атру́та. 2. шко́дны, згу́бны

bang I [bæŋ] – n. 1. вы́бух -у *m.*: ***the bang of a gun*** гарма́тны вы́бух. 2. уда́р, гру́кат -у *m.* 3. Informal сі́ла, энэ́ргія *f.*, імпэ́т -у *m.*

– v. 1. гру́каць; сту́каць, гры́мнуць. 2. бра́згаць: ***to bang a door*** бра́знуць дзьвяры́ма

– adv. 1. мо́цна, зь ля́скатам. 2. ра́птам, нечака́на. 3. якра́з, про́ста: ***It hit me bang in the eye*** Уда́рыла мне про́ста ў во́ка

– interj. бум! бразь! бах! баба́х! трах!

• ***bang up*** пашко́дзіць, пакале́чыць (*уда́рам*)

bangle [ˈbæŋgəl] n. бранзале́т -а *m.*

bang(s) II [bæŋz] – n. гры́ўка *f.*

– v.t. 1. падраза́ць пад гры́ўку. 2. падраза́ць ко́нскі хвост

banish [ˈbænɪʃ] v.t. 1. засуджа́ць на выгна́ньне, ссыла́ць. 2. праганя́ць, адганя́ць

banishment [ˈbænɪʃmənt] n. 1. выгна́ньне *n.* 2. выгна́ньніцтва *n.*

banister [ˈbænɪstər] n., also **bannister** баля́са *f.*

• ***banisters*** баля́сы з парэ́нчамі (*у схо́дах*)

banjo [ˈbændʒoʊ] – n., pl. **-jos** or **-joes** ба́нджа *n.*

– v.i. гра́ць на ба́нджа

bank I [bæŋk] – n. 1. на́сып, вал -у *m.* 2. бе́раг -а *m.* (*ракі́, во́зера*). 3. мелі́на́ *f.*; рыф -а *m.* 4. схон, схіл, нахі́л -у *m.* 5. крэн -у *m.* (*нахі́л самалёта пры паваро́це*)

– v.t. 1. рабіць на́сып, насыпа́ць валы́, абво́дзіць на́сыпам. 2. скіда́ць, нава́льваць у ку́чу, нагрува́шчваць. 3. нахіля́ць (*самалёт пры паваро́це*). 4. прысыпа́ць аго́нь по́пелам

bank II [bæŋk] – n. 1. банк -у *m.* 2. банк -у *m.* (*у гульні́ ў ка́рты*)

– v.i. 1. ве́сьці банк, быць банкі́рам; трыма́ць банк у гульні́. 2. трыма́ць гро́шы ў ба́нку, мець ба́нкаўскі раху́нак

– v.t. кла́сьці гро́шы ў банк

• ***bank on***, Informal паляга́ць на *каго́-што*, быць пэ́ўным *чаго́*

bank III [bæŋk] – n. 1. рад, шэ́раг -у *m.*: ***bank of keys*** клявіяту́ра (*арга́наў, друкава́льнай машы́нкі, кампу́тара*). 2. а) ла́ўка на гале́ры. б) весьляры́ на гэ́тай ла́ўцы. в) рад вёслаў

– v.t. уклада́ць, стаўля́ць у рады́

bank account ба́нкаўскі раху́нак

bankbook [ˈbæŋkbʊk] ба́нкавая кні́жка

banker [ˈbæŋkər] n. 1. банкі́р -а *m.* (*і ў гульні́ ў ка́рты*). 2. працаўні́к ба́нку

bank note банкно́т -а *m.*

bankrupt [ˈbæŋkrʌpt] – n. 1. банкру́т -а *m.*, неплатаздо́льны даўжні́к. 2. ідэ́йны банкру́т

– adj. неплатаздо́льны; няздо́льны спла́чваць сваé даўгі́, збанкрутава́ны

– v.t. дово́дзіць да банкру́цтва, да матэрыя́льнае руі́ны

bankruptcy [ˈbæŋkrʌptsi] n., pl. **-cies** 1. банкру́цтва *n.* 2. заняпа́д -у *m.*, стра́та рэпута́цыі

banner [ˈbænər] – n. 1. сьцяг -у *m.* 2. транспара́нт -у *m.* 3. ша́пка (*у газэ́це*)

– adj. 1. перадавы́. 2. ве́льмі ўда́лы, рэко́рдны: ***a banner year for sales and earnings*** ве́льмі ўда́лы год для про́дажу й прыбы́ткаў

banns or **bans** [ˈbænz] n., pl. за́паведзі *pl. only* (*паведамле́ньне аб жані́мстве*): ***to ask the bans*** дава́ць на за́паведзі; ***to call the bans*** абвяшча́ць за́паведзі

banquet [ˈbænkwət] – n. банке́т -у *m.*, афіцы́йны абе́д з прамо́вамі

– v.t. ла́дзіць банке́т: ***to banquet the famous visitors*** ла́дзіць банке́т у го́нар сла́ўных гасьце́й

– v.i. банкетава́ць

banter [ˈbæntər] – n. паджарто́ўваньне

– v. па-сяброўску паджартоўваць, перакідáцца жáртамі, пасьміхáцца, пакéпліваць

baptism [ˈbæptˌɪzəm] n. 1. хрост -у *m.*, хрышчэ́ньне *n.* 2. цяжкóе выпрабава́ньне: ***baptism of/by fire*** баявóе хрышчэ́ньне. 3. пакýтніцтва *n.*

Baptist [ˈbæptɪst] – n. 1. бапты́ст -а *m.*, -ка *f.* 2. хрысьці́цель -я *m.*: ***John the Baptist*** Ян Хрысьці́цель

– adj. бапты́сцкі

baptize [ˈbæptaɪz] v., **-tized, -tizing** 1. хрысьці́ць. 2. ачышчáць (*духóва*). 3. давáць імя́

bar I [bɑ:r] n. 1. брусóк -кá *m.*, зьлі́так -ку *m.*, плі́тка *f.*, кавáлак -ка *m.*: ***a bar of iron*** брусóк жалéза; ***a bar of gold*** зьлі́так зóлата; ***a bar of chocolate*** плі́тка шакаля́ду; ***a bar of soap*** кавáлак мы́ла. 2. жэ́рдка *f.*; кол, калá *m.*; штáба, зáсаўка, завáла, запрýда *f.* 3. а) перашкóда *f.* б) нанóс пяскý, мелінá пры вýсьці ракí. 4. паласá сьвятлá *абó* кóлеру. 5. Mus. тáктавая рыса ; такт -а *m.* 6. бар -у *m.* 7. а) адвакáцкая прафэ́сія. б) адвакáты, праўнікі. в) мéсца ў судзé для адвакáта *абó* абвінавáчанага. 8. суд -у *m.* 9. Law спынéньне судóвага працэ́су

bar II [bɑ:r] **barred, barring**, – v.t. 1. засóўваць; закладáць штáбай, жэ́рдкай. 2. зачыня́ць (-ца). 3. спыня́ць, перашкаджáць, загараджáць. 4. забараня́ць: ***to bar from*** не дапушчáць да *кагó-чагó*. 5. пазначáць каляровымі палóскамі

– prep. за вы́няткам, апрачá: ***bar one*** за вы́няткам аднагó; ***bar none*** бяз вы́нятку

barb [bɑ:rb] n. 1. калю́чка *f.*, зубле́ц -цá *m.* (*на кручкý, стралé*). 2. зьéдлівае слóва, зьéдлівасьць *f.*: ***the stinging barb of sarcasm*** пякýчая зьéдлівасьць саркáзму. 3. Bot. асьцю́к -á *m.* 4. Zool. вýсікі (*у ры́баў*); калю́чкі

barbarian [bɑ:rˈberiən] – n. бáрбар -а *m.*; дзікýн -á *m.*

– adj. 1. бáрбарскі, нецывілізавáны; дзікýнскі

barbaric [bɑ:rˈbærɪk] adj. 1. бáрбарскі, дзікýнскі. 2. прыміты́ўны, першабы́тны

barbarism [ˈbɑ:rbəˌrɪzəm] n. 1. бáрбарства, дзікýнства *n.*, нецывілізавáнасьць *f.* 2. барбары́зм -у *m.* (*мóўны*)

barbarity [bɑ:rˈbærəti] n., pl. **-ties** 1. брутáльная лю́тасьць, нечалавéчнасьць, бесчалавéчнасьць *f.* 2. лю́ты ўчы́нак. 3. прыміты́ўнасьць *f.* (*стылю, гýсту*)

barbarous [ˈbɑ:rbərəs] adj. 1. нецывілізавáны, дзікýнскі. 2. грубія́нскі. 3. брутáльны

barbate [ˈbɑ:rbeɪt] adj., Zool. вусáты, барадáты; Bot. асьцюкавáты

barbecue [ˈbɑ:rbɪkju:] – n. 1. смáжаніна на сьвéжым павéтры; пі́кнік са смáжанінай. 2. жарóўня *f.*

– v.t. 1. смáжыць цэ́лую жывёліну ці кавáлкі мя́са на адкры́тым агні́. 2. смáжыць мя́са ці ры́бу ў вóйстрым сóўсе

barbed [ˈbɑ:rbd] adj. 1. з калю́чкамі, калю́чы: ***barbed wire*** калю́чы дрот. 2. зьéдлівы, саркасты́чны: ***a barbed comment*** саркасты́чная заўвáга

barber [ˈbɑ:rbər] – n. цырýльнік -а *m.*

– v.t. 1. стры́гчы. 2. галі́ць

barberry [ˈbɑ:rˌberi] n., pl. **-ries** барбары́с -у *m.* (*куст абó я́гада*)

barbershop [ˈbɑ:rbərʃɑ:p] n. цырýльня *f.*

bard [ˈbɑ:rd] n. 1. бард -а *m.*, сьпявáк-паэ́т. 2. Poet. паэ́т -а *m.*, пясьня́р, песьняра́ *m.*: ***Bard of Avon*** Ві́льям Шэ́кспір; ***Bards of Belarus*** песьняры́ Беларýсі; Янка Купáла й Якýб Кóлас

bare [ber] – adj. **barer, barest** 1. гóлы; нічы́м не пакры́ты, агóлены. 2. нехавáны, адкры́ты: ***the bare truth*** шчы́рая прáўда. 3. пусты́: ***The room was bare of furniture*** Пакóй быў пусты́, бяз мэ́блі. 4. прóсты, неўпрыгóжаны. 5. знóшаны, вы́церты. 6. як тóлькі; якрáз: ***He earns a bare living*** Ён зарабля́е як тóлькі пражы́ць

– v.t. 1. раскрываáць, выкрываáць (*прáўду*). 2. агаля́ць

• ***lay bare*** раскрыва́ць, выкрыва́ць

bareback ['berbæk] adv., adj. безь сядла́ (*е́хаць*), неасядла́ны (*конь*)

bareboned ['berbound] adj. худы́, схудне́лы

bare-bones ['berbounz] – n. ве́льмі худы́ чалаве́к, ску́ра й ко́сьці
– adj. мізэ́рны; худы́

barefaced [ˌber'feɪst] adj. 1. з адкры́тым тва́рам, бяз ма́скі. 2. наха́бны, бессаро́мны

barefoot ['berfʊt] adv., adj. бо́сы; басано́ж

barefooted ['berfʊtɪd] adj. бо́сы

barehanded [ˌber'hændɪd] adj., adv. 1. з го́лымі рука́мі. 2. сваі́мі ўла́снымі рука́мі. 3. з пусты́мі рука́мі

bareheaded [ˌber'hedɪd] adj., adv. бяз ша́пкі, з адкры́тай галаво́ю

barelegged [ˌber'legd] – adj. з го́лымі нага́мі, без панчо́хаў
– adv. басано́ж

barely ['berli] adv. 1. ледзь, то́лькі як: ***barely enough*** якра́з до́сыць. 2. адкры́та, про́ста. 3. бе́дна, сьці́пла

bareness ['bernəs] n. галізна́, аго́ленасьць *f.*; пу́стасьць *f.*

bargain ['bɑ:gɪn] – n. 1. торг -у *m.*, гандлёвае пагадне́ньне. 2. та́нна прада́дзеная *або́* ку́пленая рэч. 3. ку́пля *f.*: ***a good (bad) bargain*** до́брая (блага́я) ку́пля
– v.i. таргава́цца
– v.t. гандлява́ць
• ***bargain for*** быць прыгатава́ным да *чаго́*, спадзява́цца *чаго́*
• ***in/into the bargain*** да таго́ ж, у да да́так
• ***strike a bargain*** старгава́цца

bargaining ['bɑ:gɪnɪŋ] – n. 1. таргава́ньне *n.* (*за цану́*). 2. перамо́вы *pl. only.*
– adj. які́ вядзе́ перамо́вы, які́ таргу́ецца

barge [bɑ:dʒ] – n. 1. ба́ржа, ба́рка *f.* 2. двухпавярхо́вая ба́ржа для экску́рсіяў *або́* пара́даў. 3. адмірáльскі ка́тэр
– v.t. ве́зьці, перавóзіць ба́ржай
– v.i. урыва́цца, ува́львацца: ***Don't barge where you're not wanted*** Ня пха́йся, куды́ цябе́ ня про́сяць

barish ['bærɪʃ] adj. пуставáты

baritone ['bærətoun] – n. барытóн -у *m.* (*го́лас, аcóба, інстру́мант*)
– adj. барытóнавы, барытóнны (*па́ртыя*)

barium ['beriəm] n., Chem. ба́рыій -ю *m.*

bark I [bɑ:rk] – n. 1. брэх -у *m.*, бражáньне *n.* 2. Informal ка́шлаль -лю *m.*
– v.i. бражáць
– v.t. га́ркаць
• ***bark at the moon*** крычэ́ць, агітава́ць упусту́ю
• ***bark up the wrong tree*** ісьці́ фальшы́вым шляхам, памыля́цца

bark II [bɑ:rk] – n. 1. кара́, карыца *f.*, лы́ка *n.* 2. гарба́рная кара́, дубі́льная кара́. 3. хі́нная кара́, хі́на *f.*
– v.t. 1. абдзіра́ць кару́, ако́рваць. 2. кальцава́ць. 3. дубі́ць ску́ры (*дубо́ваю каро́ю*)

bark III [bɑ:rk] n. барк -а *m.* (*трохма́чтавы карабе́ль*)

barkeeper ['bɑ:rki:pər] n. 1. ула́сьнік ба́ру, шынка́р -а́ *m.* 2. буфэ́тчык -а *m.*, буфэ́тчыца *f.*

barley ['bɑ:rli] n. ячме́нь -ю *m.*

barm [bɑ:rm] n. пі́ўны́я дро́жджы *pl.*

barmaid ['bɑ:rmeɪd] n. буфэ́тчыца *f.*

barman ['bɑ:rmən] n., pl. **-men** буфэ́тчык -а *m.*

barmy ['bɑ:rmi] adj. **-ier, -iest** 1. які́ фэрмэнту́е, пе́ністы. 2. Informal прыду́ркаваты, дурны́

barn ['bɑ:rn] n. 1. гумно́ *n.*, пу́ня *f.*, адры́на *f.* 2. хлеў -явá *m.*, ста́йня *f.* 3. барн -а *m.* (*адзі́нка ме́ры*)

barn owl сіпу́ха (*род савы́*)

barometer [bə'rɑ:mətər] n. бaро́мэтлар -ра *m.*

barometric [ˌbærə'metrɪk] adj. барамэтры́чны

baron ['bærən] n. 1. барóн -а *m.* (*ты́тул*). 2. Informal магна́т -а *m.*, бу́йны прамысло́вец: ***a coal (beef) baron*** ву́гальны (мясны́) магна́т

baronage ['bærənɪdʒ] n. 1. баро́ны *pl.* 2. баро́нства *n.* (*го́днасьць і ты́тул баро́на*)

baroness ['bærənəs] n. баранэ́са *f.*

baroque [bə'rouk] – n. баро́ка, *indecl.* – adj. 1. баро́кавы (*стыль*). 2. негусто́ўны, вы́чварны

barrack ['bærək] – n., pl. or sing. 1. каша́ры *pl.*, каза́рма *f.* 2. бара́кі *pl.* – v.t. разьмяшча́ць у каза́рме – v.i. жыць у каза́рме

barrage [bə'rɑ:ʒ] – n., esp. Brit., Milit. 1. бара́ж -у́ *m.*, сканцэнтрава́ны абстрэ́л, кананада *f.* 2. ['bɑ:rɪdʒ] гаць *f.* (*у рацэ́*) – v.t. баражы́раваць, абстрэ́льваць з артыле́рыі – v.i. быць пад артылерыйскім агнём

barracuda [ˌbærə'ku:də] n. баракуда *f.*, марскі́ шчупа́к

barrel ['bærəl] n. 1. бо́чка *f.* 2. бо́чка (*ме́ра*). 3. ду́ла *n.*, ствол, ствала́ *m.*, ру́ля *f.* (*па́льнае зброі*). 4. Tech. вал -а *m.*, цыліндар -ра *m.*, бараба́н -а *m.* • ***money on the barrel*** гро́шы на бо́чку • ***over a barrel*** прыці́снуць да сьце́нкі • ***scrape the (bottom of the) barrel*** выпаражня́ць кішэ́ні

barrelhead ['bærəlhed] n. ве́ка бо́чкі

barrelhouse ['bærəlhaʊz] n. 1. джа́завы стыль зь ве́льмі ху́ткім тэ́мпам. 2. карчма́ *f.*, шынко́к -ку́ *m.*

barren ['bærən] adj. 1. няпло́дны, неўрадлі́вы, неўраджа́йны. 2. бясплодны, няпло́дны; я́лавы: ***barren flower*** пустацьве́т. 3. Figur. неціка́вы, ну́дны. 4. бескары́сны; дарэ́мны; непрыбытко́вы, нерэнта́бэльны

barrens ['bærənz] n., pl. аблого́а *f.*; пусте́ча *f.*

barricade ['bærəkeɪd] – n. 1. барыка́да *f.* 2. перашко́да – v. забарыкадо́ўваць (-ца)

barrier ['bæriər] – n. 1. бар'е́р -а *m.*; ста́ва, перашко́да, замі́нка *f.* 2. бар'е́р на ста́рце – v.t. адгараджа́ць бар'е́рам

barrier reef кара́лавы рыф

barring ['bɑ:rɪŋ] prep. за вы́няткам; апрача́, акрамя́: ***barring you and me*** за вы́няткам цябе́ й мяне́

barrister ['bæristər] n. ба́рыстэр, адвака́т -а *m.*

barrow I ['bærou] n. 1. та́чка *f.* 2. насі́лкі *pl. only*, но́шы *pl. only.* 3. Brit. та́чка на двух ко́лах

barrow II ['bærou] n. 1. курга́н -а́ *m.*, магі́льны на́сып, капе́ц -ца́ *m.*

bartender ['bɑ:rˌtendər] n. барме́н -а, буфэ́тчык -а *m.*

barter ['bɑ:rtər] – v. мяня́ць, абме́ньваць, выме́ньваць, ве́сьці менавы́ га́ндаль – n. 1. ме́навы га́ндаль, ба́ртэр -у *m.* 2. абме́н тава́рамі, тавараабме́н -у *m.* 3. абме́ньваны тава́р • ***barter away*** прагандлява́ць ці адда́ць са стра́таю: ***to barter away one's soul for wealth*** прада́ць душу́ за бага́цьце (*ці і́ншыя прывіле́і ў жыцьці*)

barytone ['bærɪtoun] n., adj., *гл.* **baritone**

basal ['beɪsəl] adj. асно́ўны, фундамэнта́льны

basalt [bə'sɔ:lt] n. база́льт -у *m.* (*мінэра́л*)

basaltic [bə'sɔ:ltɪk] adj. база́льтавы: ***basaltic lava*** база́льтавая ля́ва

bascule ['bæskju:l] n. пад'ёмнае прыстасава́ньне: ***bascule bridge*** пад'ёмны мост

base I [beɪs] – n. 1. падста́ўка *f.*; ба́за *f.*, падно́жжа *n.* (*гары́*). 2. Tech. станіна *f.* 3. асно́ва *f.*, галоўны прынцып, зыхо́дны пункт: ***to assume as a base*** прыня́ць за асно́ву. 4. Arch. п'едэста́л -у *m.*, цо́каль -ю *m.*; ба́зіс -у *m.* (*калёны*); фунда́мэнт -у *m.*, падму́рак -ку *m.* (*будыні́ны*). 5. Chem. асно́ва *f.* 6. (*у бэйсбо́ле*) ба́за *f.*, «дом». 7. Milit. апэрацыйная ба́за. 8. Geom. асно́ва *f.* (*трохку́тніка*) – adj. галоўны, асно́ўны – v.t. 1. рабіць фунда́мэнт, ствара́ць асно́вы. 2. базава́цца, абапіра́цца: ***to be based on*** абапіра́цца на *што*

• ***get to first base***, Informal удáла пачáць
• ***off base***, adv., Informal няпрáвільны, памылкóвы
• ***touch base with*** паразумéцца, налáдзіць сýвязь

base II [beɪs] – adj. 1. нíзкі; нікчэ́мны. 2. прóстага пахóджаньня. 3. невысакарóдны (*пра жалéза, медзь*). 4. неліратýрны; неклясы́чны, вульгáрны: ***base Latin*** вульгáрная лацíна. 5. непаўнавáртасны: ***base coin*** фальшы́вая, падрóбленая манэ́та. 6. басавíты (*гóлас*)
– n. а) бас -а *m.* (*гóлас*). б) сьпявáк

baseball ['beɪsbɔ:l] n. 1. бэйсбóл -а *m.* 2. бэйсбóльны мя́ч

baseboard ['beɪsbɔ:rd] n. лíштва *f.*

baseborn [ˌbeɪs'bɔ:rn] adj. 1. прóстага пахóджаньня. 2. пазашлю́бны

baseless ['beɪsləs] adj. беспадстáўны, неабгрунтавáны

basely ['beɪsli] adv. нíзка, пóдла, ганéбна; беспрынцыпóва

basement ['beɪsmənt] n. 1. падвáл -у *m.*, паўпадвáл -у *m.*; сутарэ́ньне *n.*, склеп -у *m.* 2. падмýрлак -ка *m.*

base metal 1. невысакарóдны мэтáл. 2. галóўны мэталíчны элемэ́нт у сплáве

baseness ['beɪsnəs] n. нíзкасьць, пóдласьць *f.*; нікчэ́мнасьць *f.*

bashful ['bæʃfəl] n. сарамлíвы, сарамя́жлівы, нясьмéлы

bashfulness ['bæʃfəlnəs] n. сарамлíвасьць, сарамя́жлівасьць, нясьмéласьць *f.*

basic ['beɪsɪk] – adj. 1. галóўны; аснóўны; пачаткóвы. 2. Chem. аснóўны
– n. галóўная чáстка; аснóўны прынцып, аснóўнае прáвіла

basically ['beɪsɪkli] adv. у аснóўным; у агýльных рысах; у галóўным

basicity [beɪ'sɪsəti] n., Chem. шчóлачнасьць *f.*

basil ['beɪzəl] n., базы́лік -а *m.* (*кулінáрная прыпрáва*)

basilica [bə'sɪlɪkə] n., Bot. базы́ліка *f.*

basilisk ['bæzəlɪsk] n. 1. васілíск, базылíшак (*я́шчарка*). 2. Zool. род я́шчаркі

basin ['beɪsən] n. 1. мядніца *f.*, таз -а *m.* (*для мыцьця́*). 2. басэ́йн -у *m.*: ***river basin*** вадазбóр, басэ́йн ракí. 3. бýхта *f.*: ***a yacht basin*** бýхта, дзе стая́ць я́хты. 4. упáдзіна, запáдзіна *f.*, лог -у *m.*, лагчы́на *f.*

basis ['beɪsɪs] n., pl. **bases** 1. галóўная чáстка, аснóва *f.* 2. аснóўны прынцып, падстáва *f.* 3. галóўны элемэ́нт. 4. Rare зыхóдны пункт; ваéнная бáза

bask [bæsk] v.i. 1. грэ́цца, выграваццá (*на сóнцы, ля агню́*). 2. Figur. цéшыцца шчáсьцем, мець асалóду

basket ['bæskət] n. кош, кашá *m.*, кóшык -а *m.*

basketball ['bæskətbɔ:l] n. баскетбóл -у *m.*

basket chair плéценае крэ́сла

basketry ['bæskɪtri] n. 1. плéценыя вырабы, пляцёнкі. 2. прафэ́сія кашарá

Basque [bæsk] – n. 1. баск -а *m.* 2. бáсконская мóва
– adj. бáсконскі

bas-relief [ˌbɑ:rɪ'li:f] n. барэльéф -а *m.*

bass I [bæs] n., pl. **basses** or coll. **bass** 1. акýнь

bass II [bæs] n. 1. амэрыкáнская лíпа. 2. лы́ка *n.*

bass III [beɪs] – n., pl. **basses** 1. бас -а *m.* (*гóлас і сьпявáк*). 2. басэ́тля *f.* (*інструмэ́нт*)
– adj. басóвы; нíзкі (*пра гóлас*)

bass clef басóвы ключ

bass drum басóвы бýбен, барабáн

bass guitar бас-гітáра

basset ['bæsɪt] n. тáкса *f.* (*сабáка*)

bassinet [ˌbæsɪ'net] n. люлька, калы́ска *f.*

bassoon [bə'su:n] n. фагóт -а *m.*

bast [bæst] n. лы́ка *n.*: ***bast-shoe*** лáпаць -ця *m.* (*лы́кавы*)

bastard ['bæstərd] – n. 1. пазашлю́бнае дзіця́; Vulg. байструк -á *m.* 2. нéшта ніжэ́йшае, гóршае; падрóбка *f.*
– adj. 1. пазашлю́бна рóджаны. 2. несапрáўдны; падрóблены, падрóбны

baste [beɪst] v.t. 1. фастрыгава́ць. 2. паліва́ць смажані́ну (*сваі́м со́кам, тлу́шчам*). 3. лупі́ць, лупцава́ць, мала́ці́ць

bastille or **bastile** [ˌbæˈsti:l] n. астро́г -у *m.*; цытадэ́ль *f.*

basting [ˈbeɪstɪŋ] n. паліва́ньне мя́са ў ча́се сма́жаньня

bastings [ˈbeɪstɪŋz] n., pl. 1. фастрыга-ва́ньне *n.* 2. фастры́га *f.*

bastion [ˈbæstʃən] n. бастыён -у *m.*

bat I [bæt] n. кажа́н -а́ *m.*

• ***blind as a bat*** зусі́м сьляпы́, сляпы́ як крот

bat II [bæt] n. бі́та *f.* (*у бэ́йсболе*); раке́тка *f.* (*у тэ́нісе*)

bat III [bæt] n. уюк -а́ *m.* (*сядло́ або́ пакла́дзены ў яго́ груз*)

batch [bætʃ] – n. 1. ко́лькасьць *f.*, па́ртыя *f.* (*вы́рабаў*); упёк -у *m.*: ***This batch of cookies was better than the last one*** Гэ́ты ўпёк пе́чыва быў ле́пшы за папярэ́дні. 2. пач|о́к -ка́ *m.*; жме́ня *f.*, ку́ча *f.*: ***to pay a batch of bills*** заплаці́ць ку́чу раху́нкаў. 3. па́ртыя, гру́па *f.*: ***the first batch of students*** пе́ршая па́ртыя студэ́нтаў. 4. заме́с -у *m.* (*бэто́ну*)

– v.t. зьбіра́ць, групава́ць

bate I [beɪt] v.t. спыня́ць; зьмянша́ць; стры́мваць: ***with bated breath*** затаі́ўшы дух

bate II [beɪt] v.t. маха́ць кры́ламі

bath [bæθ] – n., pl. **baths** 1. купа́ньне *n.*: ***to take/have a bath*** купа́цца. 2. ва́нна *f.* 3. ва́нны пако́й. 4. ла́зьня *f.* ***baths*** куро́рт зь мінэра́льнымі во́дамі

– v. купа́ць; мыць у ва́ньне; купа́цца

bathe [beɪð] – v.t. 1. купа́ць. 2. прамыва́ць: ***to bathe the eyes*** прамыва́ць во́чы. 3. Figur. заліва́ць, напаўня́ць: ***bathed in sunlight*** зали́ты со́нцам

– v.i. 1. купа́цца. 2. пла́ваць, плёхацца, акуна́цца

bather [ˈbeɪðər] n. 1. купа́ньнік -а *m.*, купа́ньніца *f.* 2. плы|ве́ц -ўца́ *m.*, плыві́ца *f.*

bathhouse [ˈbæθhaʊz] n. 1. ла́зьня *f.* 2. разьдзява́льня *f.* (*на пля́жы*)

bathing cap гумо́вая ша́пка для пла́ваньня

bathing costume, Brit. = **bathing suit** купа́льнік -а *m.*

bath mat дыван о́к для ва́нны

bathrobe [ˈbæθroʊb] n. купа́льны хала́т

bathroom [ˈbæθru:m] n. 1. ва́нны пако́й. 2. прыбіра́льня *f.*

bathtub [ˈbæθtʌb] n. ва́нна *f.*

batiste [bæˈti:st] – n. батыі́ст -у *m.* (*тканіна́*)

– adj. батыі́ставы

batman [ˈbætmən] n., pl. **-men**, Brit. ардынар|ац -ца *m.*, пасыльн|ы́ -о́га *m.*, вестав|ы́ -о́га *m.*

baton [bəˈtɑ:n] n. 1. булава́ *f.* 2. дырыжо́рская па́лачка. 3. эстафэ́та *f.*

battalion [bəˈtæljən] n. 1. батальён -у *m.* 2. а́рмія *f.*

• ***battalions*** ваі́ско́выя сі́лы; а́рміі

batten [ˈbætən] v.i. 1. адпа́свацца, тлусьце́ць. 2. разжыва́цца (*ко́штам і́ншых*)

batter I [ˈbætər] – v. 1. бі́ць; лупі́ць; лупцава́ць; калаці́ць. 2. лама́ць; разьбіва́ць ушчэ́нт. 3. зно́шваць, трапа́ць: ***battered old hat*** стары́ зно́шаны капялю́ш

– v.i. лама́цца: ***to batter away at a door*** лама́цца ў дзьве́ры

batter II [ˈbætər] – n. це́ста *n.*

– v.t. мясі́ць це́ста

batter III [ˈbætər] – n., Constr. схіл, на́хіл -у *m.*

– v.t. нахіля́ць, пахіля́ць

– v.i. нахіля́цца, пахіля́цца, каслі́цца (*пра сьцяну́*)

battery [ˈbætəri] n., pl. **-teries** 1. батаре́я *f.*: ***to charge the battery*** зараджа́ць батаре́ю; ***a flash light battery*** батаре́я для ліхта́рыка. 2. камплє́кт, рад -у *m.* 3. Law пабо́і *pl. only*: ***assault and battery*** напа́д з пабо́ямі. 4. уда́рныя музы́чныя інструме́нты

batting [ˈbætɪŋ] n. 1. Sport. пада́ча (*у бэ́йсбо́ле*) *n.* 2. падкла́дка (*ва́тная*)

battle [ˈbætəl] – n. 1. бі́тва́, сутычка *f.*, бо|йня́ -ю *m.* 2. змага́ньне *n.*: ***a battle of words*** спрэ́чка, палеміка *f.*

– v.i. браць удзе́л у суты́чцы, змага́ц-ца за *што*: ***to battle for justice*** змага́цца за справядлі́васьць
– v.t. змага́цца супро́ць *кагó-чагó*: ***to battle a strong current*** змага́цца з мо́цнай плы́няй

battle cruiser крэ́йсэр -а *m.*

battlefield ['bætəlfi:ld] n. по́ле бітвы́

battleground ['bætəlgraund] n., *гл.* **battlefield**

battlement ['bætəlmənt] n. зубча́тая сьцяна́; зубцы́ байні́цы (*для абаро́нных мэ́таў*)

battleplane ['bætəlplem] n. баявы́, штурмавы́ самалёт, зьнішча́льнік -а *m.*

battue [bæ'tu:] n. 1. абла́ва *f.* 2. палява́ньне з абла́вай. 3. бо́йня *f.*; ма́савая разьня́

baulk [bɔ:k] n., v. *гл.* **balk**

bauxite ['bɔ:ksaɪt], n. баксі́т -у *m.*, алюмі́ніевая руда́

Bavarian [bə'veriən] – adj. бава́рскі
– n. 1. бава́рлац -ца *m.*, бава́рка *f.* 2. бава́рскі дыяле́кт

bawd [bɔ:d] n. 1. зво́дніца *f.* 2. гаспады́ня публі́чнага до́му. 3. распу́сьніца *f.*, распу́сьнік -а *m.*

bawdry ['bɔ:dri] n. 1. непрысто́йнасьць, бессаро́мнасьць *f.* 2. распу́ста, разбэ́шчанасьць *f.*

bawl [bɔ:l] – v.i. 1. крыча́ць, гарлапа́ніць, гарла́ніць; раўці́ (*пра жывёлу*). 2. го́ласна пла́каць, раўці́
– v.t. 1. заклі́ка́ць, захваля́ць свой тава́р кры́кам
• ***bawl out*** насвары́цца, накрычэ́ць, зрабі́ць вымо́ву
– n. 1. крык-у *m.* 2. ла́янка *f.*

bay I [beɪ] n. 1. зато́ка, бу́хта *f.* 2. раўні́нная прага́ліна ў го́рах. 3. ча́стка прэ́рыі, яка́я ўрэ́зваецца ў лес

bay II [beɪ] n. 1. ні́ша *f.* 2. вы́ступ у сьцяне́ з вакно́м. 3. камо́ра, бако́ўка *f.* 4. прыстаран|ак -ку *m.* (*у пу́ні*)
• ***horse bay*** сто́йла, за́гарадка для каня́
• ***sick bay*** шпіта́льная пала́та

bay III [beɪ] – n. зая́длы брэх, браха́ньне, га́ўканьне *n.*
– v.i. браха́ць, га́ўкаць, выць
– v.t. 1. браха́ць (*на кагó-што*): ***to bay the moon*** браха́ць, выць на ме́сяц. 2. гна́цца *за кім* з брэ́хам
• ***bring to bay*** загна́ць у безвыхо́днае стано́вішча, заганя́ць у тупі́к; абкружы́ць, асадзі́ць
• ***hold (keep) at bay*** а) трыма́ць на адле́гласьці, здалёк. б) пасьпяхо́ва адбіва́цца, адгрыза́цца. в) стры́мліваць: ***Drugs kept the fever at bay*** Лек стрыма́ў гара́чку
• ***stand at bay*** барані́цца ў тупіку́

bay IV [beɪ] n. 1. ляўро́вы ліст. 2. паўно́чнаамэрыка́нская магно́лія. 3. бако́вае дрэ́ва
• ***bays*** 1. ля́ўры, ляўро́вы вянок. 2. Figur. го́нар, сла́ва

bay V [beɪ] – n. 1. цёмна-ры́жы ко́лер. 2. гняды́ конь
– adj. цёмна-ры́жы, руды́, гняды́, гне́ды

bay VI [beɪ] n. гаці́на *f.*

bay leaf ляўро́вы ліст

bayonet ['beɪənət] – n. штых -á *m.*
– v.t. кало́ць, прабіва́ць штыхо́м

bay window э́ркер -у *m.*, выпу́клае акно́

bazaar or **bazar** [bə'za:r] n. 1. усхо́дні кірма́ш. 2. кірма́ш. 3. база́р -у *m.* (*дабрачы́нны*)

BC or **B.C.** [ˌbi:'si:] (**Before Christ**) да Хрыста́, да нараджэ́ньня Хрысто́вага, да на́шае э́ры

BDR [ˌbi:ˌdi:'a:r] (**Belarusian Democratic Republic**) БНР

be [bi:] v.i. (Pres. sing. **am, are, is**; pl. **are**; past sing. **was, were, was**, pl. **were**; pr. p. **being**, p.p. **been**) 1. быць (pres. ёсьць; past sing. быў, была́, было́; pl. былі́), існава́ць: ***To be or not to be*** Быць ці ня быць; ***that may be*** гэ́та мо́жа быць, гэ́та магчы́ма; ***however that may be*** Як бы там ні было́. 2. жыць; знахо́дзіцца, быва́ць: ***They are no more*** Іх ужо́ нямá; ***Where are my books?*** Дзе маé кні́гі? 3. каштава́ць: ***How much is it?*** Ко́льк-

кі гэ́та каштуе́? 4. чу́цца, ме́цца: ***How is he?*** Як ён ма́ецца? 5. *у скла-да́ным выка́зьніку зьяўля́ецца зьвя́зкай.* ***She is a secretary*** Яна́ — сакрата́рка; ***He is sick*** Ён хво́ры. 6. *ужыва́ецца як дапамо́жны дзеясло́ў для ўтварэ́ньня: а) праця́глае фо́рмы на* **-ing**: ***I am reading*** Я чыта́ю; ***He was reading*** Ён чыта́ў. *б) у залежным ста́не:* ***I am asked*** Мяне́ пыта́юцца; ***You will be asked*** Цябе́ бу́дуць пыта́цца; ***She was asked*** Яе́ пыта́ліся. *в) каб вы́разіць абавя́зак, наме́р, магчы́масьць:* ***He is to be there now*** Ён му́сіць там быць цяпе́р. *г) для ўтварэ́ньня міну́лага зако́нчанага трыва́ньня (perfect tense) ад некато́рых неперахо́дных дзеясло́ваў:* ***The sun is set*** Со́нца ўжо́ зайшло́

• ***be about*** а) зьбіра́цца: ***He is about to go*** Ён зьбіра́ецца ісьці́. б) займа́цца не́чым, рабі́ць: ***What are you about ?*** Што ро́біш?

• ***be away*** вы́ехаць, адсу́тнічаць

• ***be for*** быць за

• ***Be gone!*** Ідзі́ адсю́ль ! Прэч!

• ***Be that as it may*** Хай бу́дзе як бу́дзе

• ***Let it be*** Хай бу́дзе; Паклі́нь у спако́і

• ***to be*** бу́дучы: ***the doctor to be*** бу́дучы ле́кар

beach [bi:tʃ] – n. 1. бе́раг мо́ра. 2. пляж -у *m.*

– v.t. падплыва́ць да бе́рагу

• ***on the beach*** а) Naut. на су́шы. б). Sl. бяз пра́цы

beachcomber ['bi:tʃ,koumər] n. 1. надмо́рскі бадзя́га. 2. акія́нская хва́ля, што набяга́е на бе́раг

beachhead ['bi:tʃhed], n. берагавы́ пляцда́рм (*пры вы́садцы дэса́нту*)

beacon ['bi:kən] – n. 1. сыгна́льны аго́нь. 2. сьве́тач -а *m.*, мая́к -а́ *m.*, бу|й -я *m.*, сыгна́льная ве́жа. 3. радыёмая́к -а́ *m.*

– v.t. 1. асьвятля́ць сыгна́льнымі агня́мі. 2. перасьцерага́ць. 3. ста́віць маякі, дава́ць сьветлавы́я сыгна́лы

– v.i. сьвяці́ць, асьвятля́ць даро́гу; перасьцерага́ць

bead [bi:d] – n. 1. па́церка *f.* 2. кро́пля, кро́пелька *f.* : ***beads of sweat*** кро́плі по́ту. 3. Milit. му́шка *f.*: ***to draw a bead on*** прыцэ́ліцца, узя́ць на му́шку. 4. а) бу́рбалкі ў шыпу́чых ві́нах. б) пе́на на пі́ве

– v.t. 1. адзява́ць па́церкі, прыбіра́ць па́церкамі. 2. нані́зваць як па́церкі

– v.i. бурбо́ліць (*пра ва́дкасьць*)

• ***beads*** а) па́церкі *pl.* б) ружа́н|ец -ца *m.*

beaded ['bi:dɪd] adj. 1. прыбра́ны па́церкамі. 2. падо́бны да па́церкі, кро́пелькі

beagle ['bi:gəl] – n. ганча́к -а́ *m.* (*паляўні́чы саба́ка*)

– v.i. 1. палява́ць з ганчака́мі. 2. Sl. падгляда́ць, ціка́ва́ць, сачы́ць

beak [bi:k] n. дзю́ба *f.*

beaker ['bi:kər] n. 1. ке́ліх -а *m.*, ча́ра *f.* (*для віна́*). 2. лябарато́рная шкля́нка, прабі́рка *f.*

be-all and end-all [,bi:ɔ:lən'endɔ:l] n. уве́сь гало́ўны зьмест, уся і́снасьць; усё *n.*

beam [bi:m] – n. 1. бервяно́ *n., coll.* бярве́ньне; бэ́лька *f.*, брус -а *m., pl.* бру́сы; перакла́дзіна, папяро́чка *f.* 2. ды́ша|ль -ля *m.* (*у плу́зе*). 3 а) каро́мысла ша́ляў. б) ша́лі *pl. only.* 4. праме́нь, про́мня *m.*, праме́нчык -а *m.* 5. Figur. усьме́шка *f.*: ***There was a beam on her face*** Яе́ твар сьвяці́ўся ўсьме́шкай. 6. навó|й -я *m.* (*у кро́снах*). 7. радыёсыгна́л (*для самалёта або вадапла́ва*)

– v.t. 1. прамяні́ць, вылуча́ць праме́ньні, выпраме́ньваць. 2. перада-ва́ць радыёпраграмы

– v.i. зьзяць; бліш|чэ́ць; (*пра асо́бу*) шчасьлі́ва ўсьміха́цца

• ***off the beam*** а) (*пра самалёт*), адхі́лены ад ку́рсу. б) Sl. (*пра чалаве́ка*) на блу́дным шляху́, мыля́цца

• ***on the beam*** на пра́вільным ку́рсе, зусі́м пра́вільны

beaming ['bi:miŋ] adj. 1. зіхо́ткі, сьве́тлы, прамяні́сты. 2. са сьве́тлай усьме́шкай; ра́дасны

bean [bi:n] n. 1. фасо́ля *f.*, боб -у *m.* 2. зе́рне (*ка́вы*). 3. Sl. галава́ *f.* 4. Slang грош -а *m.*: ***not a bean*** ні граша́

• ***full of beans,*** Sl. жывы́, энэргі́чны; у вясёлым настро́і

• ***old bean,*** Brit. стары́

• ***spill the beans*** прагаварыцца, вы́даць сакре́т

beanpole ['bi:npoul] n. 1. ты́чка *f.* (*для гаро́ху, вінагра́ду*). 2. Sl. ты́чка *f.* (*пра высо́кага худо́га чалаве́ка*)

beanstalk ['bi:nstɔ:k] n. сьцябліна фасо́лі

bear I [ber] **bore,** Archaic **bare, borne** or **born**, – v.t. 1. не́сьці; перано́сіць. 2. трыма́ць, вы́трымаць; трыма́ць на сабе́ цяжа́р: ***Will the ice bear your weight?*** Ці вы́трымае лёд ва́шу вагу́? 3. зно́сіць, зьне́сьці; цярпе́ць (*боль, шум*). 4. нараджа́ць, нарадзі́ць: ***to bear a child*** нарадзі́ць дзіця́. 5. трыма́цца: ***He bore himself with dignity*** Ён трыма́ўся з го́днасьцяй, пава́жна. 6. адчува́ць: ***to bear affection*** адчува́ць лю́басьць. 7. наси́ць (*імя́, ты́тул*); мець сла́ву *каго́-чаго́*; мець (*абавя́зак, пра́ва, сі́лу, ула́ду*): ***to bear sway*** трыма́ць ула́ду

– v.i. 1. радзі́ць, дава́ць плод. 2. мець су́вязь, уплы́ў або́ дачыне́ньне. 3. наці́ска́ць, апіра́цца на *што.* 4. ру́хацца, трыма́цца; і́сьці: ***The ship bore north*** Карабе́ль ішо́ў на по́ўнач. 5. знахо́дзіцца, ляжа́ць: ***to bear due north of smth*** ляжа́ць про́ста на по́ўнач ад *чаго́*

• ***bear a hand*** пада́ць руку́ дапамо́гі, дапамагчы́; прычыні́цца да агу́льнае спра́вы

• ***bear in mind*** мець на ўва́зе

• ***bear on*** а) мець дачыне́ньне да *чаго́*, даты́чыць, б) ру́хацца ў да́дзеным кіру́нку

• ***bear out*** падтрыма́ць, пацьвярджа́ць; прызна́ць (*пра́ўду*): ***The facts bore him out*** Фа́кты пацьве́рдзілі яго́ную слу́шнасьць

• ***bear the cost*** пакрыва́ць ко́шты

• ***bear the responsibility*** не́сьці адка́знасьць

• ***bear up*** трыма́цца, ня па́даць ду́хам

• ***bear witness*** быць сьве́дкам, сьве́дчыць

bear II [ber] – n., pl. **bears** or coll. **bear** 1. мядзьве́дзь -я *або́* медзьвядзя́, *pl.* мядзьве́дзі *або́* медзьвядзі́. 2. грубія́нскі, бурклі́вы чалаве́к. 3. бі́ржавы спэкуля́нт

– adj. мядзьве́джы (*сьлед, паход*)

• ***the Great (Little) Bear*** Вялі́кі (Малы́) Воз (*сузо́р'е*)

bearable ['berəbəl] adj. цярпі́мы, дапушча́льны

beard [bɪrd] – n. 1. барада́, боро́дка *f., dim.* 2. асьцюкі́ *pl.*, ву́сы ко́ласа

– v.t. 1. адва́жна выступа́ць су́праць. 2. браць за бараду́

bearded ['bɪrdəd] adj. 1. барада́ты. 2. уса́ты, асьцюкава́ты: ***bearded wheat*** асьцюкава́тая пшані́ца

bearer ['berər] n. 1. но́сьбіт, но́счык -а *m.* 2. прад'яўні́к -а́ *m.*, прад'яўні́ца *f.* 3. пладано́сная расьлі́на: ***This apple tree is a good bearer*** Гэ́тая я́блыня до́бра ро́дзіць. 4. асо́ба з ра́нгам

bearing ['berɪŋ] n. 1. трыма́ньне *n.*, паво́дзіны, мане́ры *pl.*, паста́ва *f.* 2. дачыне́ньне *n.*, су́вязь *f.* 3. апо́ра *f.* 4. Tech. падшы́пнік -а *m.* 5. а) пло́днасьць *f.* б) плод -у *m.*; ураджа́й -ю *m.* 6. цярпе́ньне *n.*: ***beyond bearing*** нясьце́рпна, нязно́сна

• ***bearings*** кіру́нак -ку *m.*: ***to lose one's bearings*** заблудзі́ць, стра́ціць арыента́цыю

bearish ['berɪʃ] adj. 1. мядзьве́джы, як мядзьве́дзь; грубія́нскі, нявы́тлівы, пану́ры, зло́сны. 2. які́ выклі́кае зьні́жэ́ньне ку́рсу а́кцыяў. 3. Figur. пэсымісты́чны, няпэ́ўны: ***to be bearish on something*** быць няпэ́ўным, глядзе́ць пэсымісты́чна на *што*

bearskin ['berskɪn] n. 1. мядзьве́джая шку́ра. 2. ша́пка зь мядзьве́джай шку́ры (*анге́льскіх гвардзе́йцаў*). 3. таўста́я, касма́тая, ваўня́ная тканіна

beast [bi:st] n. 1. зьвер, зьвяра́ *m.*; зьвяру́га *f.* (*і пра чалаве́ка*). 2. грубія́н -а *m.*, наха́бнік -а *m.*

• ***beast of burden*** цяглавая, уючная жывёліна

• ***beast of prey*** драпе́жнік -а *m.*, драпе́жная жывёла

beastliness ['bi:stlɪnəs] n. 1. зьве́рства *n.*, кра́йняя лю́тасьць. 2. сьві́нства, наха́бства *n.* 3. быдля́чыя абста́віны

beastly ['bi:stlɪ] – adj. 1. зьве́рскі, лю́ты; злы, мярзо́тны. 2. Informal ве́льмі дрэ́нны, даку́члівы, непрые́мны, пяке́льны: ***a beastly headache*** пяке́льны боль галавы́

– adv., Informal ве́льмі; непрые́мна, даку́чліва

beat [bi:t] – **beat, beaten**, v.t. 1. біць, удара́ць. 2. зьбіва́ць, узьбіва́ць (*я́йка*). 3. перамага́ць, бі́ць, перавыша́ць: ***This beats me*** Гэ́та мне не пад сі́лу, гэ́таму ня дам ра́ды. 4. Informal ашу́кваць, махлява́ць; скру́чваць (*гро́шы, нале́жную ча́стку*). 5. кава́ць (*зо́лата*); выто́птваць (*сьце́жку*). 6. лапата́ць (*кры́ламі*). 7. адбіва́ць: ***to beat time*** адбіва́ць такт, дырыгава́ць

– v.i. 1. біць у *што* (*як до́ждж*); бі́цца: ***Her heart beats fast with joy*** Ейнае сэ́рца ху́тка б'е́цца ад ра́дасьці. 2. Informal выйграва́ць

• ***beat back*** зму́сіць адступі́цца наза́д, адапхну́ць

• ***beat down*** зьбіць (*цану́*), вы́таргаваць

• ***beat off*** адбі́ць сі́лаю (*ата́ку*)

beat [bi:t] – n. 1. уда́р -у *m.*, біцьцё *n.* 2. такт -у *m.* (*у му́зыцы*), адбіва́ньне та́кту. 3. абыхо́д -у *m.* (*вартаўні́ка́ ці паліцыя́нта*): ***to be on the beat*** рабі́ць абыхо́д. 4. Sl. бі́тнік -а *m. & f.*; стыля́га *m. & f.*

– adj. 1. Informal мо́цна сто́млены, змо́раны, зьнясі́лены, змардава́ны. 2. Informal ашало́млены ад зьдзіўле́ньня. 3. Sl. бі́тніцкі

• ***off one's beat*** не на сваёй звыча́йнай пра́цы

beaten ['bi:tən] adj. 1. пабі́ты; перамо́жаны: ***a beaten dog*** пабі́ты саба́ка; ***a beaten army*** перамо́жаная а́рмія. 2. ко́ваны, кава́ны; кляпа́ны, раскле́паны. 3. а) вы́таптаны (*сьце́жка*), прае́жджаны (*даро́га*). б) звыча́йны, зьбі́ты, шаблённы. 4. зьбі́ты на пе́ну: ***beaten egg whites*** зьбі́тыя бялкі́. 5. зьнясі́лены, вы́біты зь сі́лаў, змардава́ны

beater ['bi:tər] n. 1. трапа́ла *n.*, пра́нік -а *m.*, бі́ч -а́ *m.* 2. заго́ншчык -а *m.* (*на палява́ньні*). 3. калато́ўка, прыла́да для зьбіва́ньня (*я́ек, сьмята́ны*): ***an electric beater*** электры́чная калато́ўка

beatific [ˌbi:ə'tɪfɪk] adj. ве́льмі шчасьлі́вы, шча́сны; блажэ́нны

beatify [bi'ætɪfaɪ] v.t. **-fied, -fying** 1. рабі́ць ве́льмі шчасьлі́вым, ашчасьлі́ўліваць; дабраслаўля́ць. 2. кананізава́ць

beating ['bi:tɪŋ] n. 1. біцьцё *n.*, лупцо́ўка *f.* 2. разгро́м -у *m.* 3. біцьцё *n.* (*сэ́рца*). 4. лапата́ньне (*кры́ламі*)

• ***take a beating*** а) быць мо́цна пабі́тым (*за ка́ру*). б) пане́сьці вялі́кія стра́ты

beatnik ['bi:tnɪk] n. бі́тнік -а *m. & f.*, стыля́га -і *m. & f.*

beau [bou] n., pl. **beaus** or **beaux** [bouz] 1. кавале́р -а *m.*, залётнік -а *m.* 2. фарсу́н -а́ *m.*, франт -а *m.*

beautician [bju:'tɪʃən] n. касмэ́тык -а *m.*, касмэты́чка *f.*

beautification [ˌbju:tɪfɪ'keɪʃən] n. упрыго́жваньне, аздабле́ньне *n.*

beautiful ['bju:təfəl] – adj. прыго́жы, харо́шы, цудо́ўны

– n. прыго́жае *n.*

beautifully ['bju:təflɪ] adv. хо́раша, прыго́жа, го́жа, цудо́ўна

beautify ['bju:tɪfaɪ] – v.t. **-fied, -fying** упрыго́жваць

– v.i. прыгажэ́ць

beauty ['bju:ti] n., pl. **-ties** 1. красá *f.*; прыгаствó, харастwó *n.*; прыгажóсьць, прыгóжасьць *f.* 2. красýнія, прыгажýня, харашýха *f.*

• ***the beauty of it ...*** і сáмае цікáвае ...

beauty contest кóнкурс прыгажóсьці

beauty shop, parlor or **salon** касмэты́чны кабінэ́т

beauty sleep, Informal ráньні сон; сон удзень

beauty spot мýшка *f.* (*на твáры*)

beaver I ['bi:vər] n. 1. бабёр -рá *m.* 2. бабрóвае фýтра *абó* капялюш. 3. Sl. барадá *f.*; барадáч -á *m.*

beaver II ['bi:vər] n. забрáла *n.* (*у шалóме*)

became [bɪ'keɪm] v., *p.t. of* **become**

because [bɪ'kʌz] conj. бо; тамý што

• ***because of*** з прычы́ны *чагó*; праз, дзéля *кагó*: ***Because of you we were late*** Празь цябé мы спазьні́ліся

bechance [bɪ'tʃæns] – v.i. здарáцца

– v.t. трапля́цца *камý*, здарáцца

becharm [bɪ'tʃɑ:rm] v.t. зачарóўваць; ачараваць

beck [bek] – n. кіўý -ву *m.*, кіўóк -ўкá *m.*

– v. ківаць *камý* галавóю ці рукóю

• ***be at one's beck and call*** быць у нéчым пóўным распараджэ́ньні, быць цáлкам залéжным ад *кагó*

beckon ['bekən] – v. ківаць галавóю *ці* рукóю, даваць знак: ***He beckoned me to follow him*** Ён кіўнýў, каб я йшоў за ім: ***He beckoned to her*** Ён даў ёй знак

– n. кіўý -ву *m.*, кіўóк -ўкá *m.*

becloud [bɪ'klaʊd] v.t. 1. захмáрваць; рабіць хмýрным; зацямня́ць, затумáньваць. 2. хавáць, закрывáць, прыкрывáць: ***These big words becloud unpleasant facts*** Гэ́тыя прыгóжыя слóвы прыкрывáюць непрыéмныя фáкты

become [bɪ'kʌm] **-came, -come,** – v.i. рабіцца; ставáцца

– v.t. 1. выпадáць, адпавядáць, падыхóдзіць: ***It does not become me*** Гэ́та мне не выпадáе. 2. пасавáць, быць да твáру: ***This dress becomes her*** Гэ́тая сукéнка ёй да твáру

• ***become of (to)*** стáцца з *кім-чым*: ***What will become of her?*** Што стáнецца зь ёю?

becoming [bɪ'kʌmɪŋ] – adj. 1. адпавéдны, налéжны. 2. да твáру: ***a very becoming dress*** сукéнка вéльмі да твáру

– n., Philos. 1. станаўлéньне *n.* 2. перахóд з аднагó стáну ў íншы

bed [bed] – n. 1. лóжак -ка *m.*; пасьцéль *f.*; лóгава, лóгвішча *n.* (*зьвяры́нае*). 2. Tech. станíна *f.* (*машы́ны*); фундáмэнт -а *m.*, падмýрак -ка *m.*: ***a bed of concrete*** бэтóнны падмýрак. 3. дно (*ракí*, *мóра*), рэ́чышча *n.* 4. грáдка, грáда *f.* 5. Geol. пласт -á *m.*, напластаváньне *n.*, фармáцыя *f.*: ***a bed of coal*** пласт вугалю́. 6. нáсып -у *m.* (*чыгýнкі*), палатнó *n.*

– v.t. 1. клáсьці спаць, слáць: ***bed down horses with straw*** падсьцілáць кóням нáнач салóму. 2. укладáць; устаўля́ць; умурóўваць. 3. саджáць, высáджваць (*на грáдку*). 4. укладáць пластáмі, клáсьці плáзам

– v.i. 1. клáсьціся спаць; начавáць. 2. утвараáць пласт; залягáць

• ***go to bed*** клáсьціся спаць

• ***make the bed*** слáць лóжак: ***As you make your bed, so you must lie in it*** Як пасьцéлесься, так і вы́сьпіся

• ***put to bed*** а) клáсьці спаць б) Sl. рыхтавáць да дрýку (*газэ́ту*, *чáсапіс*)

• ***take to one's bed*** зьлéгчы, захварэ́ць

bedabble [bɪ'dæbəl] v.t. запы́рскваць, запля́мваць (*нéчым брýдным*)

bed and board а) прытýлак -ку (*мéсца спаць і харчы́*). б) дом

bedarken [bɪ'dɑ:rkən] v.t. зацямня́ць цáлкам

bedbug ['bedbʌg] n. клоп клапá *m.*, блашчы́ца *f.*

bedchamber ['bed,tʃeɪmbər] n. спáльня *f.*, спáльны пакóй

bedclothes ['bedklouz] n., pl. пасьцéль *f.*, *гл.* **bedding**

bedding ['bedɪŋ] n. 1. пасьцéль *f.* (*кóўдры, пóсьцілкі*), пасьцéльная бялíзна. 2. пóдсьціл -у *m.*, пóдсьцілка *f.* (*для жывёлы*). 3. фундáмэнт -а *m.*, нíжні пласт. 4. Geol. напластавáньне *n.*, паклáд -у *m.* 5. саджáньне квéтак у грáдкі

bedeck [bɪ'dek] v.t. убірáць, упрыгóжваць

bedevil [bɪ'devəl] v.t. **-il(l)ed, -il(l)ing** 1. замýчваць, мóцна дакучáць, назаляць. 2. зусíм зьбівáць з панталы́ку. 3. зачарóўваць, кíдаць чáры

bedew [bɪ'du:] v.t. зрашáць, арашáць, пакрывáць расóю: ***Tears bedewed her cheeks*** Сьлёзы зрасíлі ёй шчóкі

bedfast ['bedfæst] adj. цяжка хвóры, прыкавáны да лóжка

bedfellow ['bed,felou] n. 1. хто дзéліць лóжак з сябрам, калéга, кумпáн па лóжку. 2. супóльнік -а *m.*, партнэ́р -а *m.*: ***strange bedfellow*** выпадкóвы партнэ́р

bedgown ['bedgaun] n. жанóчая начнáя кашýля

bedim [bɪ'dɪm] v.t. зацямняць, затумáньваць

bed jacket начны́ кафтáнік, жакéцік

bedlam ['bedləm] – n. 1. замяшáньне *n.*, крыкі *pl.*, балагáн -у *m.* 2. Archaic дом вар'я́таў
– adj. як з дóму вар'я́таў, вар'я́цкі (*пра дом*); звар'яцéлы (*пра чалавéка*)

Bedouin ['beduɪn] – n. 1. бэдуíн -а *m.* 2. качэ́ўнік, вандрóўнік -а *m.*
– adj. бэдуíнскі, вандрóўны, качавы́

bedpan ['bedpæn] n. 1. начны́ гаршчóк (*для хвóрага*). 2. грэ́лка *f.* (*для награвáньня пасьцéлі*)

bedrabble [bɪ'dræbəl] **-bled, -bling**, v.t. абпы́рскваць, аблівáць; захлю́пваць

bedraggle [bɪ'drægəl] **-gled, -gling,** v.t. запэ́цкваць, забры́ндваць (*грáзяй, вадóю*)

bedrail ['bedreɪl] n. 1. бакавáя дóшка ў лóжку. 2. пóручня ў шпітáльным лóжку

bedridden ['bed,rɪdən] adj. прыкавáны да лóжка (*хварóбай*)

bedrock ['bedrɑ:k] – n. 1. Geol. карэ́нная парóда, скалá. 2. Figur. мóцныя падстáвы, грунт. 3. Figur. найніжэ́йшы ўзрóвень, дно *n.* 4. галóўны пры́нцып: ***Honesty was the bedrock of his life*** Сумлéннасьць былá галóўным пры́нцыпам у яго́ным жыцьцí
– adj. аснóўны, фундамэнтáльны

bedroom ['bedru:m] n. спáльня *f.*, спáльны пакóй

bedside ['bedsaɪd] n. бок лóжка, пры лóжку: ***at someone's bedside*** пры чы́мсьці лóжку, ля хвóрага; ***to sit at someone's bedside*** даглядáць хвóрага

bed-sitting room [,bed'sɪtɪŋru:m] Brit. аднапакаёвая кватэ́ра

bedsore ['bedsɔ:r] n. пролéжань -ня *m.*

bedspread ['bedspred] n. пакрывáла на лóжак, кáпа *f.*

bedtime ['bedtaɪm] n. парá спаць

bee [bi:] n. 1. пчалá *f.*, *coll.* пчóлы: ***honey-bee*** пчóлка-рабóтніца: ***queen bee*** мáтка. 2. прáца талакóй, супóльнае гуля́ньне
• ***have a bee in one's bonnet*** or ***one's head*** а) забíць сабе цьвік у галаву́. б) мець патаéмную дýмку. в) зьéхаць з глýзду

beebread ['bi:bred] n. éжа для пчóлаў

beech [bi:tʃ] – n., Bot. бук -а *m.* (*дрэ́ва*); бук -у *m.* (*матэрыя́л*)
– adj. бýкавы, з бýку

beechnut ['bi:tʃnʌt] n. бýкавы арэ́шак

beef [bi:f] – n., pl. **beeves** 1. я́лавіца *f.*; малады́ бычóк *ці* вол. 2. я́лавічына *f.* (*мя́са*). 3. Informal сíла *f.*, мýскул -а *m.*; дýжасьць *f.* 4. Informal вагá, цяжкасьць *f.* 5. Sl. жальбá, скáрга *f.*; нараканьне *n.*
– v.i., Sl. гóласна нарака́ць
– v.t. выкóрмваць *абó* забівáць на мя́са ***to beef up*** узмацня́ць, павялíчваць

beefsteak ['bi:fsteɪk] n. біфштэ́кс -а *m.*

beefy ['bi:fi] adj. 1. я́лавічны, мясны́. 2. мóцны, дýжы; мускулíсты; мясíсты

beehive [ˈbi:haɪv] n. 1. вулéй -ьля́ *m.*; калóда *f.* 2. мéсца, пóўнае рýху, мітусьні́, дзéйнасьці

beekeeper [ˈbi:ˌki:pər] n. пчаля́р -á *m.*

beekeeping [ˈbi:ˌki:pɪŋ] n. пчаля́рства *n.*

beeline [ˈbi:laɪn] n. прóстая лі́нія, найпрасьцéйшая дарóга

• ***make a beeline for*** сьпяшáцца напрасткí *куды́-н.*

beemaster [ˈbi:ˌmæstər] n. пчаля́р -а *m.*

been [bɪn] *p.p. of* **be**

beep [bi:p] – n. 1. карóткі сыгнáл у радыёперадавáньні. 2. сыгнáл (*напр. аўтамабíля*)

– v.t. давáць карóткія сыгнáлы

beer [bɪr] n. пíва *n.*

beery [ˈbɪri] adj. 1. піўны́; ад пíва: ***beery good humor*** дóбры настрóй ад пíва. 2. п'яны́

beestings [ˈbi:stɪŋz] n., pl. малóдзіва *n.*

beeswax [ˈbi:zwæks] – n. пчалíны воск

– v.t. васкавáць

beet [bi:t] n. бурáк -á *m.*: ***white beets*** бéлыя цукрóвыя буракí

• ***beet greens*** бацьвíньне

beetle I [ˈbi:təl] – n. жук -á *m.*; хрушч -á *m.*: ***Colorado beetle*** калярáдзкі жук (*у бýльбе*)

– v.i., Informal хýтка рýхацца, бéгаць дрóбным крóкам

beetle II [ˈbi:təl] – n. 1. Tech. бáба *f.* (*для забівáньня пáляў*), каплёр -рá, кáпар -а *m.* (*машы́на*). 2. таўкáч -á *m.*, таўкáчык -а *m.* 3. машы́на для ўбівáньня палатнá й паркáлю

– v.t. трамбавáць, біць (*камéньне*)

beetle-browed [ˈbi:təlbraʊd], adj. 1. з навíслымі брóвамі. 2. панýры, хмýрны; насýплены, надзьмýты

beetlehead [ˈbi:təlhed] n. дýрань -ня *m.*, бóўдзіла -ы *m. & f.*

befall [bɪˈfɔ:l] **-fell, -fallen, -falling** – v.i. здарáцца; трапля́цца: ***it so befalls*** гэ́так здарáецца

– v.t. 1. здарáцца з *кім*; напаткáць *кагó*: ***No harm befalls him*** Нічóга благóга зь ім ня здáрыцца; ***A strange fate befell him*** Дзіўнáя дóля ягó напаткáла

befit [bɪˈfɪt] v.t., **-fitted, -fitting** быць адпавéдным, падыхóдзіць

befitting [bɪˈfɪtɪŋ] adj. адпавéдны; гóдны

befog [bɪˈfɔ:g] v.t. **-fogged, -fogging** 1. затумáньваць, ахýтваць імглóю. 2. замарóчваць; бянтэ́жыць; ашаламля́ць

befool [bɪˈfu:l] v.t. 1. абдýрваць, ашýкваць. 2. а) рабíць з *кагó* дýрня. б) абзывáць *кагó* дýрнем

before [bɪˈfɔ:r] – prep. 1. пéрад: ***before five o'clock*** пéрад пя́тай гадзíнай; ***before long*** неўзабáве, у хýткім чáсе. 2. пéрад(а): ***She walks before me*** Янá йдзе пéрада мнóю. 3. у прысýтнасьці, на вачóх: ***before the king*** у прысýтнасьці караля́

– adv. 1. сьпéраду; папéрадзе; напéрад. 2. ранéй, пéрад гэ́тым; даўнéй; дагэ́туль; зáгадзя: ***I didn't know that before*** Я ня вéдаў гэ́тага ранéй

– conj. пéрад тым, як; хутчэ́й, як: ***Before she goes, I would like to talk to her*** Пéрад тым, як янá пóйдзе, я хацéў бы пагýтарыць зь ёю; ***I will die before I give in*** Я хутчэ́й памрý, як здáмся

beforehand [bɪˈfɔ:rhænd] adv., adj. зáгадзя, напéрад; заўчáсна, зарáна, ранавáта: ***Are you not a little beforehand with this request for payment?*** Ці вы не зарáна дамагáецеся гэ́тае плáты?

befoul [bɪˈfaʊl] v.t. 1. пэ́цкаць; пагáніць. 2. заблы́тваць, ублы́тваць

befriend [bɪˈfrend] v.t. стáвіцца па-сяброўску, дапамагáць; запрыя́зьнівацца

beg [beg] **begged, -gging** – v.t. 1. прасíць (*дапамóгі, мíласьціны*). 2. упрóшваць, малíць: ***He begged his mother*** Ён упрóшваў сваю́ мáці. 3. вéтліва прасíць: ***I beg your pardon*** Выбачáйце; Прашý выбачэ́ньня

– v.i. прасíцца; падавáць прóсьбу: ***to beg for mercy*** прасíць лíтасьці

• ***beg off*** адпрасíцца, атрымáць дараванáньне кáры

began [bɪˈgæn] v., *p.t. of* **begin**

beget [bɪˈget] v.t. **-got, -gotten, -getting** 1. спараджáць, давáць жыцьцё. 2. Figur.

выклікáць, спараджáць: ***Hate begets hate*** Нянáвісьць спараджáе нянáвісьць

begetter [bɪˈgetər] n. 1. бáцькa -і *m.* 2. пачынáльнік -а *m.*

beggar [ˈbegər] – n. 1. жабрáк -á *m.*, жабрáчка *f.* 2. бядняк, беднякá *m.* 3. істóта *f.*, чалавéк -а *m.*: ***insolent beggar*** нахáбa -ы *m. & f.*; ***poor beggar*** бядáк, бедакá *m.*, нябóгa, небарáкa -і *m. & f.*; ***dull beggar*** занýдa -ы *m. & f.*: ***little beggars*** (*пра дзяцéй і звяроýў*) малóцтва, малéча *n.*

– v.t. 1. рабíць жабракóм, пускáць з тóрбай, руйнавáць. 2. зьбядняць: ***It beggars all description*** Гэ́та цяжка апісáць

beggarly [ˈbegərli] adj. жабрáцкі, бéдны

beggar's lice, n., pl. дзяды́, *pl. only* (*калю́чкі асату́*)

beggary [ˈbegəri] n., pl. **-garies** галітá *f.*, жабрáцтва *n.*

begin [bɪˈgɪn] – v.i. **-gan, -gun, -ginning** 1. пачынáць(-ца); наставáць: ***We will begin work soon*** Мы неўзабáве пачнём працавáць; ***to begin at the beginning*** пачáць ад сáмага пачáтку; ***to begin with the hardest problem*** пачынáць ад найцяжэ́йшае праблéмы. 2. пачынáць існаванне, быць арганізавáным: ***The club began two years ago*** Клюб быў арганізавáны два гады́ тамý

– v.t. 1. пачынáць: ***He began reading this book*** Ён пачáў чытáць гэ́тую кнíгу. 2. ствараць; арганізóўваць: ***to begin the club*** арганізавáць клюб

• ***to begin with*** перш-нáперш

beginner [bɪˈgɪnər] n. 1. пачаткóвец -ўца *m.*; навічóк -кá *m.* 2. пачынáльнік -а *m.*, пачынáльніца *f.*; заснавáльнік -а *m.*, заснавáльніца *f.*

beginning [bɪˈgɪnɪŋ] – n. 1. пачáтак -ку *m.*: ***in the beginning*** напачáтку. 2. крыніца *f.*, першапачáтак -ку *m.*

– adj. які́ пачынáе

begird [bɪˈgɜ:rd] v.t. **-girt** or **-girded, girding** 1. апяразваць. 2. абвóдзіць; абкружáць

begone [bɪˈgɔ:n] interj. прэч; пайшóў, вон, вон адсю́ль

begrime [bɪˈgraɪm] v.t. пэ́цкаць, бру́дзіць, чарні́ць

begrudge [bɪˈgrʌdʒ], v.t. 1. шкадавáць, скупíцца (*на éжу, пачасту́нак*). 2. зайздрóсьціць: ***They begrudge us*** Яны́ зайздрóсьцяць нам. 3. наракáць, бурчэ́ць

beguile [bɪˈgaɪl] v.t. 1. ашу́кваць; звóдзіць; падмáнваць: ***to beguile someone into doing something*** ашукáнствам змýсіць нéкага зрабíць штось. 2. вы́маніць хíтрасьцю. 3. забаўля́ць, займáць, весялíць. 4. бáвіць, правóдзіць час: ***to beguile the tedious hours*** бáвіць маркóтныя гадзíны

beguilement [bɪˈgaɪlmənt] n. 1. ашукáнства *n.*, падмáн -у *m.* 2. забáва *f.*

beguiling [bɪˈgaɪlɪŋ] adj. 1. падмáнлівы, звóдны. 2. цікáвы, займáльны

behalf [bɪˈhæf] n. застýпніцтва *n.*; інтарэ́с -у *m.*, кары́сьць *f.*: ***to act in his behalf*** дзéяць за ягó, дзéяць на ягóную кары́сьць

• ***in behalf of*** для *кагó-чагó*, у нéчым інтарэ́се

• ***on behalf of*** а) ад нéчага імя́, як прадстаўнíк. б) на нéчаю кары́сьць

behave [bɪˈheɪv] v.i. 1. трымáцца, павóдзіць сябé. 2. дóбра сябé павóдзіць, налéжна трымáцца: ***Did you behave today?*** Ці ты быў дóбры сёньня?

behavior, Brit. **behaviour** [bɪˈheɪvjər], n. 1. трымáньне *n.* 2. павóдзіны *pl. only*: ***proper behavior*** прыстóйныя павóдзіны. 3. манéры *pl.*

behead [bɪˈhed] v.t. сьцінáць, сьсякáць галаву́ (*як пакараньне*)

beheadal [bɪˈhedəl] n. сьцяцьце галавы́

beheld [bɪˈheld] v., *гл.* **behold**

behemoth [bɪˈhi:mɑ:θ] n. бэгэмóт -а *m.* а) бібліíйная пачвáра. б) вялíкі мóцны зьвер, нéшта вялíкае й мóцнае

behest [bɪˈhest] n. накáз, загáд -у *m.*: ***at the behest*** на загáд

behind [bɪˈhaɪnd] – prep. 1. ззáду; за, пáза: ***behind the door*** за дзьвяры́ма;

behind the hill за, па-за ўзго́ркам; ***behind the house*** за до́мам, ззаду до́му; ***He is behind the others in his class*** Ён го́ршы, слабе́йшы за і́ншых у кля́се; ***behind time, schedule*** спо́зьнены; ***to be behind time*** пазьні́цца 2. па: ***to leave behind oneself*** паки́нуць па сабе́ (*пасьля́ сьме́рці*). 3. за: ***His friends are behind him*** Яго́ныя сябры́ стаяць за яго́

– adv. 1. ззаду; спо́зьнена: ***to be far behind*** быць, заста́цца далёка ззаду. 2. у рэзэ́рве, у запа́се: ***More supplies are behind*** У рэзэ́рве ёсьць больш прыпа́саў. 3. по́зна, ня ў час: а) ***The train is behind today*** Цягні́к сёньня по́зьніцца. б) ***to be behind with/in one's work*** пазьні́цца з рабо́тай, зацягну́ць з рабо́тай. в) ***to be behind with one's rent*** пратэрмінава́ць кватэ́рную пла́ту

• ***behind the times*** адста́лы, састарэ́лы

behindhand [bɪ'haɪndhænd] adj. 1. по́зьні, спо́зьнены. 2. які́ адстае́; адста́лы. 3. задо́ўжаны; вінава́ты, у даўгу́

behold [bɪ'hoʊld] – v., **-held, -holding** агляда́ць; назіра́ць, ба́чыць

– interj. глядзі́! вось!

beholden [bɪ'hoʊldən] adj. абавя́заны, удзя́чны; у даўгу́

behoove, Brit. **behove** [bɪ'hu:v] v. нале́жацца, быць неабхо́дным: ***it behooves you*** табе́ неабхо́дна, ты му́сіш

beige [beɪʒ] – adj. бэ́жавы

– n. 1. бэ́жавы ко́лер. 2. лёгкі баваўня́ны матэрыя́л

being ['bi:ɪŋ] – n. 1. быццё *n.*; існава́ньне, жыццё *n.*: ***A new era came into being*** Пачала́ся но́вая э́ра. 2. нату́ра, істо́та *f.* 3. асо́ба *f.*, жывы́е стварэ́ньне

– adj. цяпе́рашні, суча́сны: ***for the time being*** а) у гэ́ты мо́мант, цяпе́р. б) паку́ль што

– v., pres. p. of **be**: ***The dog is being fed*** Цяпе́р якра́з ко́рмяць саба́ку

bejewel [bɪ'dʒu:əl] v.t. прыбіра́ць каштто́ўнымі каме́ньнямі

black-eyed [,blæk'aɪd] adj. 1. чарнаво́кі. 2. з падбі́тым во́кам

black flag піра́цкі сьцяг

Black Friday кры́зысны дзень на бі́ржы

blackguard ['blægɑ:rd] – n. нягóднік -а *m.*, падлю́г|а -і *m. & f.*
– v.t. ла́яцца непрыстóйнымі сло́вамі
– v.i. трыма́цца як нягóднік

blackguardly ['blægɑ:rdli] – adj. по́длы, нягóдніцкі
– adv. по́дла; па-нягóдніцку

blackhead ['blækhed] n. 1. вугóр -а *m.* (*на ску́ры*). 2. пту́шка з чо́рнаю галаво́ю

black humor чо́рны, магі́льны гу́мар

blackish ['blækɪʃ] adj. чарня́вы; чарнава́ты

blacking ['blækɪŋ] n. чо́рная ва́кса; чо́рная палітУ́ра

blackjack ['blækdʒæk] – n. 1. дубі́нка *f.* 2. піра́цкі чо́рны сьцяг. 3. ачко́ *n.* (*аза́ртная гульня́*)
– v.t. біць дубі́нкай; вымуша́ць: ***to blackjack someone into submission*** вы́мусіць не́кага падпара́дкавацца

black letter 1. го́тык -у *m.* (*друк*). 2. друк таўсты́мі лі́тарамі

black list чо́рны сьпіс

blacklist ['blæklɪst] v.t. зано́сіць у чо́рны сьпіс

black magic чо́рная ма́гія

blackmail ['blækmeɪl] – n. 1. шанта́ж -ý *m.* 2. гро́шы, вы́мушаныя шантажо́м
– v.t. 1. шантажава́ць. 2. вымага́ць гро́шы пагро́замі

blackmailer ['blæmeɪlər] n. шантажы́ст -а *m.*, шантажы́стка *f.*; вымага́льнік -а *m.*, вымага́льніца *f.*

black market чо́рны ры́нак

black marketeer спэкуля́нт -а *m.*, спэкуля́нтка *f.*

blackness ['blæknəs] n. 1. чо́рнасьць *f.* 2. це́мра *f.*

blackout ['blækaʊt] n. 1. зацямне́ньне (*у су́вязі з супрацьпаве́транай абаро́наю*). 2. часо́вае асьляпле́ньне *або́* абамле́ньне. 3. часо́вая стра́та па́мяці. 4. часо́вая адсу́тнасьць электры́чнага то́ку, радыёпрыёму. 5. Theatr. пагашэ́ньне сьвятла́ на сцэ́не. 6. засакрэ́чаньне інфарма́цыі

black pepper чо́рны пе́рац

black pudding крывя́нка *f.*

black sheep 1. вы́радак (*у сям'і́*) -а *m.*. 2. нягóднік -а *m.*

Black Shirt чо́рнакашу́льнік -а, фашы́ст-а *m.*

blacksmith ['blæksmɪθ] n. кава́ль -я́ *m.*

blacksmithing ['blæksmɪθɪŋ] n. кава́льства *n.*, кава́льская спра́ва

black tie 1. чо́рная му́шка. 2. мужчы́нскі вечаро́вы ўбо́р

blacktop ['blæktɑ:p] – n. 1. асфа́льт -у *m.* 2. асфа́льтная даро́га
– v.t. асфальтава́ць
black widow ядавіты чо́рны паву́к
bladder ['blædər] n. 1. Anat. мачавы́ пухі́р. 2. пузы́р -á *m.*
blade [bleɪd] n. 1. лязо́ *n.* (*нажа́, мяча́*), палатно́ пілы́. 2. меч, мяча́ *m.* 3. трава́інкla, былі́нка *f.* 4. ліст (*расьлі́ны*). 5. ло́пасьць вясла́. 6. лапа́тка (*шыро́кая пляска́тая ко́стка*); лапа́тка прапэ́лера
blah [blɑ:] n., Sl. лухта́ , бяссэ́нсіца *f.*
• ***the blahs*** дрэ́нны, непрые́мны настро́й
blain [bleɪn] n. пухі́р -á *m.*, нарыlў -ва *m.*, прышч -á *m.*
blame [bleɪm] – v.t. 1. вінава́ціць: ***he is to blame*** ён вінава́ты. 2. га́ніць
– n. 1. віна́ *f.* 2. нага́на *f.*; вымо́ва *f.*
blameless ['bleɪmləs] adj. бездако́рны, беззага́нны
blameworthy ['bleɪmˌwɜ:rðɪ] adj. ва́рты нага́ны
blanch [blæntʃ] – v.t. 1. бяліць, выбе́льваць (*на со́нцы*). 2. рабіць бле́дным, пазбаўля́ць ко́леру: ***Fear blanched her lips*** Ад стра́ху ў яе́ зьбяле́лі ву́сны. 3. бляншава́ць гаро́дніну
– v.i. бялі́цца; бляднéць; бля́кнуць
• ***blanch over,*** Brit. падава́ць у карыстным сьвятле́; абаля́ць
bland [blænd] adj. 1. далика́тны, лагодны: ***a bland speech*** далика́тная прамо́ва; ***a bland smile*** лагодная ўсьме́шка. 2. мяккі́, далика́тны, прые́мны: ***a bland summer breeze*** далика́тны ле́тні ве́трык. 3. бяз сма́ку (*пра е́жу*), без вастрыні́, на́ціску (*пра прамо́ву, артыкул*)
blandish ['blændɪʃ] v.t. 1. угаво́рваць; задо́брываць, уце́шваць: ***She blandished him*** Яна́ задо́брыла яго. 2. ліся́ліві́ць, падла́шчвацца
blandishment ['blændɪʃmənt] n. 1. падлі́званьне, падла́шчваньне *n.* 2. лёсткі *pl. only*, ухвале́ньні *pl.*
blank [blæŋk] – n. 1. пусто́е месца. 2. блянк -у *m.*: ***application blank*** блянк для заявы. 3. пу́стка *f.* (*духоўная*): ***My mind is a complete blank*** Я нічо́га ня памята́ю. 4. пусты́ лятарэ́йны біле́т. 5. працяжнік (*замі́ж прапу́шчанага сло́ва*)
– adj. 1. пусты́; чы́сты, нясьпі́саны: ***sheets of blank paper*** лісты́ чы́стае папе́ры. 2. незапо́ўнены: ***a blank form*** незапо́ўнены блянк. 3. пусты́: ***a blank stare*** пусты́, утаро́плены по́зірк; ***a blank outlook for the future*** без надзе́і на бу́дучыню. 4. бязду́мны, тупы́: ***There was a blank look on his face*** У яго́ быў тупы́ вы́раз тва́ру. 5. по́ўны, абсалю́тны: ***blank silence*** по́ўная ціша; ***blank stupidity*** абсалю́тная дурно́та. 6. халасты́, сьляпы́: ***a blank cartridge*** халасты́ патро́н. 7. суцэ́льны, глухі́: ***a blank wall*** глуха́я сьця́на́
– v.t. абыгра́ць «усуху́ю»
• ***draw a blank*** пацярпе́ць няўда́чу ў намага́ньні зрабіць *што*
• ***in blank*** надрукава́ны з про́пускамі, як блянк
blank check а) непадпіса́ны адкры́ты чэк. б) по́ўная свабо́да дзе́яньня
blanket ['blæŋkɪt] – n. 1. ко́ўдра *f.*, плед -а *m.*: ***homewoven blanket*** дзяру́жка, по́сьцілка *f.* 2. по́крыва *n.*: ***a blanket of snow*** сьне́жнае по́крыва
– v.t. 1. засьціла́ць. 2. пакрыва́ць. 3. перашкаджа́ць, заглуша́ць, глушы́ць (*радыёперада́чу*)
– adj. агу́льны, по́ўны, усеабдымны: ***a blanket guarantee*** агу́льная, по́ўная гара́нтыя
blank verse бе́лы верш
blare [bler] – v.i. трубіць
– v.t. го́ласна крычэ́ць, раўсьці́, раўці́
– n. 1. гу́кі трубы́, трубе́ньне *n.* 2. асьляпля́льны бляск
blarney ['blɑ:rnɪ] – n. лісьлі́васьць *f.*
– v. лісьлі́ва ўгаво́рваць; перабо́льшваць
blasé [ˌblɑ:'zeɪ] adj. абыя́кавы, перасы́чаны, зьнеахво́чаны (*ад збы́тку*): ***blasé attitude*** абыя́кавае ста́ўленьне

blaspheme [ˌblæsˈfi:m] v. 1. зьневажáць (*Бóга*), блюзьнéрыць. 2. праклінáць, клясьцí; лáяць, зьневажáць

blasphemer [ˌblæsˈfi:mər] n. блюзьнéр -а *m.*, блюзьнéрка *f.*; богазьневажáльнік -а *m.*, богазьневажáльніца *f.*

blasphemous [ˈblæsfəməs] adj. блюзьнéрскі, богазьневажáльны

blasphemy [ˈblæsfəmi] n., pl. **-mies** блюзьнéрства *n.*, богазьневажáньне *n.*

blast [blæst] – n. 1. парыўлў, павéлў -ву *m.*: ***the icy blasts of winter*** марóзныя зімóвыя павéвы. 2. а) трубéньне *n.* (*на гóрне*). б) гук трýбаў. 3. струмéнь павéтра пры плаўлéньні жалéза. 4. а) выбух -у *m.*; падрыўлў -ву *m.* 5. зарáд для падрыву
– v.t. 1. падрываць (*дынамітам*). 2. зьнішчáць; руйнаваць: ***A disease has blasted our grapes*** Хваробa панішчыла наш вінагрáд; ***to blast one's reputation (plans)*** зруйнаваць сваю рэпутáцыю (разбурыць пляны). 3. сыгналіць (*у аўтамабілі*)
– v.i. сóхнуць (*пра расьлíны*); рабіцца бескарысным
• ***blast off*** узьлёт
• ***full blast*** пóўным хóдам

blasted [ˈblæstəd] adj. 1. пашкóджаны, зруйнаваны, зьнішчаны: ***blasted by forest fires*** зьнішчаны лясны́мі пажáрамі. 2. Sl. праклятый

blast furnace дóмна *f.*

blasting [ˈblæstɪŋ] n. падрываньне *n.* (*скáлаў*)

blastoderm [ˈblæstədɜ:rm] n., Biol. зарóдкавая абалóнка

blast shelter схóвішча ад выбухаў

blat [blæt] – v.i. бляяць (*як авéчка*)
– v.t. казáць нéшта недарэчы; прагавóрвацца

blatancy [ˈbleɪtənsi] n., pl. **-cies** крыклівасьць, вульгáрнасьць *f.*: ***the blatancy of modern advertising*** крыклівасьць сучáснае рэкля́мы

blatant [ˈbleɪtənt] adj. 1. крыклівы; гарлапáнскі. 2. паказны́, напакáз, разьлічаны на эфэкт: ***blatant prosperity*** багáцтва напакáз. 3. страшэ́нны, абурáльны: ***a blatant lie*** абурáльная манá

blather [ˈblæðər] – n. лухтá, балбатня́ *f.*
– v. плéсьці лухтý, балбатáць

blatherskite [ˈblæðərskaɪt] n.,Informal пустамéлля -і *m. & f.*

blaze I [bleɪz] – n. 1. пóлымя *n.*, агóнь -ню́ *m.*: ***in a blaze*** у агні́. 2. бляск -у *m.*, рэ́зкае сьвятлó. 3. выбух -у *m.*: ***a blaze of temper*** выбух злóсьці
– v.i. 1. палáць, палымнéць; гарэ́ць. 2. сьвяціцца (*ад агню́, сьвятлá*); зьзяць, блішчэ́ць, зіхацéць. 3. а) успалыхваць, шугáць, загарáцца (*пóлымем*). б) выбухáць (*ад злóсьці, рáдасьці*)
– v.t. асьвятля́ць, кíдаць сьвятлó
• ***blaze away,*** Informal а) бесьперапы́нна страля́ць. б) натхнёна працаваць *абó* гаварыць
• ***Go to blazes!*** Ідзí ў пéкла!
• ***the blazes,*** Sl. пякéльны агóнь, пéкла *n.*

blaze II [bleɪz] n. 1. знак -у *m.*, засéчка *f.* (*на дрэ́ве*). 2. бéлая пля́мка (*на лóбе жывёлы*)

blaze III [bleɪz] v.t. разгалашáць

blazer [ˈbleɪzər] n. спартóвы пінжáк

blazing [ˈbleɪzɪŋ] adj. 1. я́ркі, зы́ркі: ***blazing flame*** зы́ркае пóлымя; ***glance blazing with rage*** пóзірк, што гарэ́ў злосьцю. 2. зы́ркі, я́ркі, асьляпля́льны, сьляпýчы: ***a blazing sun*** зы́ркае сóнца

blazon [ˈbleɪzən] – v.t. 1. апавяшчáць, абвяшчáць. 2. прыбірáць, упрыгóжваць: ***meadows blazoned with flowers*** лугí, упрыгóжаныя крáскамі . 3. апíсваць *абó* маляваць гэрб
– n. герб -у *m.*

bleach [bli:tʃ] – v.t. бялíць; выбéльваць
– v.i. 1. выбéльвацца. 2. бялéць, бляк-нуць, блéкнуць. 3. выгарáць; ліняць. выцьвітáць (*на сóнцы*)
– n. 1. хлёрка *f.* 2. бялéньне *n.*

bleacher [ˈbli:tʃər] n. 1. бялíльшчык -а *m.*, бялíльшчыца *f.* (*тканíнаў*). 2. срóдак для бялéньня

bleachers [ˈbli:tʃərz] n. pl. лáўкі (*на спартóвых пляцóўках*)

bleak I [bli:k] adj. 1. адкры́ты, незахі́нены ад ве́тру; го́лы, незаро́слы расьлі́намі: ***bleak, gray mountains*** го́лыя шэ́рыя го́ры. 2. сьцюдзёны: ***a bleak wind*** сьцюдзёны ве́цер. 3. Figur. хму́рны, змро́чны, безнадзе́йны, чо́рны: ***a bleak future*** змро́чная бу́дучыня

bleak II [bli:k] n., Zool. верхаво́дка *f.* (*ры́ба*)

blear [blɪr] – adj. затума́нены; му́тны, каламу́тны; няя́сны, невыра́зны
– v.t. затума́ньваць; каламу́ціць; рабі́ць невыра́зным

bleary ['blɪri] adj. **blearier, bleariest** 1. затума́нены, цьмя́ны: ***eyes bleary with weeping*** во́чы, затума́неныя ад пла́чу

bleat [bli:t] – n. 1. бляя́ньне *n.* (*ове́чкі, казы́*), мы́каньне *n.* (*цяля́ці*). 2. скуго́леньне, нарака́ньне *n.*
– v.i. 1. бляя́ць, мы́каць, мыча́ць. 2. нарака́ць, скуго́ліць

bleb [bleb] n. 1. пухі́р -а́ *m.* (*на це́ле*). 2. бу́рбалка *f.*

blebby ['blebi] adj. 1. пухі́рысты, пакры́ты пухіра́мі. 2. по́ўны бу́рбалак

bleed [bli:d] **bled, bled** – v.i. 1. крыва́віць, сьцяка́ць крывёю, праліва́ць кроў: ***He bled to death*** Ён сьцёк крывёю й памёр; ***He fought and bled for his country*** Ён змага́ўся й праліва́ў кроў за свой край. 2. сачы́цца, тра́ціць сок (*пра пашко́джанае дрэ́ва*). 3. Figur. крывёю абліва́цца, шкадава́ць, перажыва́ць: ***Our hearts bleed for you*** На́шыя сэ́рцы за цябе́ крывёю абліва́юцца. 4. Print. выхо́дзіць за палі́, не пакіда́ць палёў
– v.t. 1. пуска́ць кроў, браць кроў. 2. пуска́ць сок з дрэ́ваў. 3. Informal вымага́ць (*гро́шы*). 4. Print. друкава́ць да канцо́ў бачы́ны (*не пакіда́ючы палёў*). 5. паво́лі спуска́ць ваду́
– n. 1. тэкст ці ілюстра́цыя ў кні́зе, што дахо́дзіць да краёў бачы́ны. 2. Tech. кла́пан -а *m.*, вэ́нтыль -я *m.*
• ***bleed white*** абяскро́віць (*забра́ць усе́ гро́шы й сі́лы*), спусто́шыць

bleeder ['bli:dər] n. 1. гэмафі́лік -а *m.* 2. Tech. засьцерага́льны кла́пан -а *m.*, вэ́нтыль -я *m.* 3. Sl. паразі́т -а *m.*

bleeding ['bli:dɪŋ] n. 1. крыва́цёк -у *m.* 2. крывапуска́ньне *n.*

bleeding heart – n. Bot. дыцэ́нтра *f.*, разьбі́тае сэ́рца
– adj. мя́ккасардэ́чны: ***bleeding heart liberal*** мяккацэ́лы лібэра́л

blemish ['blemɪʃ] – n. 1. знак, пля́ма (*на це́ле*). 2. недахо́п, недагля́д -у *m.*; хі́ба *f.* 3. пля́ма *f.* (*мара́льная*), га́ньба *f.*
– v.t. 1. пакрыва́ць шна́рамі, пакіда́ць зна́кі. 2. псава́ць, пля́міць, га́ньбіць (*рэпута́цыю*)

blemishment ['blemɪʃmənt] n. пашко́джаньне *n.*; скале́чаньне *n.*; пля́ма, хі́ба *f.*; недагля́д -у *m.*

blench I [blentʃ] – v.i. адступа́ць, адступа́цца
– v.t. уніка́ць

blench II [blentʃ] v.i. бяле́ць; блядне́ць: ***He blenched with terror*** Ён зьбяле́ў ад стра́ху

blend [blend] **blended** or poetic **blent** – v.t. 1. зьме́шваць. 2. спалуча́ць
– v.i. 1. зьме́швацца: ***Oil and water will not blend*** Але́й з вадо́ю ня зьме́шваюцца. 2. спалуча́цца, зьліва́цца, гарманізава́ць
– n. 1. спалучэ́ньне *n.* 2. мешані́на, су́месь *f.*

blende [blend] n. бле́нда *f.* (*цы́нкавая руда́*)

blended whiskey ме́шанае ві́скі

blender [blendər] n. мяша́лка *f.*

bless [bles] **blessed** or **blest,** v.t. 1. благаслаўля́ць, бласлаўля́ць; сьвяці́ць (*ваду́, е́жу*), высьве́чваць. 3. жада́ць дабра́, чу́цца ўдзя́чным: ***God bless him for his kindness*** Дай, Бо́жа, ямў здаро́ўя за яго́ную ве́тласьць. 4. рабі́ць шчасьлі́вым, ашчасьлі́ўліваць. 5. добраслаўля́ць, услаўля́ць, усхваля́ць: ***Bless the Lord, O my soul*** Блаславі́, душа́ мая́, Го́спада
• ***Bless!*** Хай Бог лю́біць!
• ***Bless me!*** (*выкліч нік зьдзіўле́ньня*) О, Бо́жа!

• ***bless oneself*** хрысьці́цца, жагна́цца
• ***Bless you!*** На здаро́ўе! (*пажада́нье таму́, хто чыхну́ў*)

blessed [blest or 'blesɪd] adj. 1. сьвяты́: ***the Blessed Trinity*** сьвята́я Тро́йца. 2. благасла́ўлены. 3. шчасьлі́вы, шча́сны, блажэ́нны: ***Blessed are the pure in heart*** Шчасьлі́выя чы́стыя сэ́рцам. 4. ра́дасны. 5. Informal праклі́яты: ***I can't get this blessed car to start*** Не магу́ заве́сьці гэ́ты праклі́яты аўтамабі́ль

blessing ['blesɪŋ] n. 1. благаславе́нства *n.*; дабрадзе́йства *n.*, дар -у *m.*: ***the blessings of nature*** дары́ прыро́ды. 2. ухвале́ньне *n.*, са́нкцыя *f.*
• ***blessing in disguise*** шча́сьце ў няшча́сьці

blew [blu:] v., *p.t. of* **blow I** and **blow II**

blight [blaɪt] – n. 1. по́шасьць, хваро́ба, шко́днік (*расьлі́наў*). 2. Figur. расчарава́ньне *n.*, уда́р -у *m.* 3. занепада́ньне *n.*, заняпа́д -у *m.*: ***urban blight*** гарадзкі́ заняпа́д
– v.t. 1. выклі́ка́ць хваро́бу расьлі́наў; шко́дзіць. 2. разьбіва́ць, руйнава́ць (*надзе́ю, пля́ны*)

blind [blaɪnd] – adj. 1. сьляпы́. 2. ледзь ба́чны, схава́ны: ***a blind curve on a highway*** ледзь ба́чны вы́гін аўтастра́ды. 3. ледзь зна́чны, непрыкме́тны, сьляпы́: ***blind path*** ледзь заўва́жная сьце́жка. 4. засьле́плены: ***blind fury*** сьляпа́я злосьць. 5. сьляпы́ (*без вако́н*): ***a blind wall*** сьляпа́я сьцяна́
– v.t. 1. сьляпі́ць; асьляпля́ць: ***blinding light*** сьляпу́чае сьвятло́. 2. зацямня́ць, зацьмява́ць; закрыва́ць; маскава́ць. 3. засьляпля́ць, асьляпля́ць: ***affection blinds reason*** пачуцьцё асьляпля́е ро́зум
– n 1. што́ра, акані́ца *f.*; засло́нка *f.*: ***Venetian blind*** жалюзі́ *Indecl., n.* 2. Figur. вы́думаная прычы́на, адгаво́рка *f.* 3. аса́да *f.* (*для паляўні́чага*)
• ***be blind to*** недацэ́ньваць, не заўважа́ць *чаго́*
• ***blind street*** тупі́к -а́ *m.*

blindage ['blaɪndɪdʒ] n. бліндаж -а́ *m.*

blind date 1. нала́джаная сустрэ́ча незнаёмых мужчы́ны й жанчы́ны. 2. адна́ з асо́баў, які́я так сустрака́юцца

blinder [blaɪndər] n. навочнік -а *m.* (*у палахлі́вага каня́*)

blindfold ['blaɪndfould] – v.t. 1. завя́зваць во́чы. 2. Figur. зацямня́ць: ***Prejudice blindfolds the mind*** Прадузя́тасьць зацямня́е ро́зум
– adj. 1. з завя́занымі вачы́ма. 2. Figur. неразва́жны, неразва́жлівы; неасьцяро́жны
– n. павя́зка *f.* (*на во́чы*)

blind gut сьляпа́я кі́шка

blindingly ['blaɪndɪŋli] adv. асьляпля́льна

blindly ['blaɪndli] adv. 1. сьле́па; неразу́мна, неразва́жна; наўздага́д. 2. во́бмацкам (*як сьляпы́*)

blindman's bluff гульня́ ў «сьляпу́ю ба́бу»

blindman's holiday ша́рая гадзі́на, суто́ньне *n.*

blindness ['blaɪndnəs] n. 1. сьлепата́ *f.* 2. асьляпле́ньне *n.*

blind spot 1. сьляпа́я пля́ма на сятча́тцы во́ка. 2. слабо́е ме́сца ў не́чым разуме́ньні *або́* ве́дах. 3. ме́сца слабо́е ба́чнасьці (*пры язьдзе́ ў аўтамабі́лі*)

blindworm ['blaɪndwɜ:rm] n., Zool. вераце́ньніца *f.* (*род я́шчаркі*)

blink [blɪŋk] – v.i. 1. мо́ргаць, мірга́ць: ***We blink every few seconds*** Мы міргае́м ко́жныя не́калькі сэку́ндаў. 2. плю́шчыць во́чы, жму́рыцца: ***to blink at the sudden light*** зажмуры́ца ад нечака́нага сьвятла́. 3. мига́ць, мігце́ць, мігце́цца; мірга́ць (*пра ля́мпу*)
– v.t. 1. ігнарава́ць, заплю́шчваць во́чы на *што*: ***don't blink the fact that...*** не заплю́шчвай во́чы на той факт, што... 2. асьляпля́ць: ***The sun is blinking my eyes*** Со́нца сьле́піць мне во́чы
– n. 1. міргА́ньне, падмі́ргваньне *n.* 2. вокамгне́ньне *n.*, каро́ткі бляск (*сьвятла́*), каро́ткі по́зірк

• ***blink at*** заплю́шчваць во́чы на *што*
• ***blink one's eyes*** мірга́ць вачы́ма
• ***in a blink*** во́бміргам
• ***on the blink*** няспра́ўны, не працу́е

blinker ['blɪŋkər] n. 1. сыгна́л мірга́ннем сьвятла́. 2. ко́нскі навано́чнік. 3. Sl. а) во́ка *n.*, сьлепакі́ *pl. only*. б) падбі́тае во́ка, сіня́к пад во́кам

bliss [blɪs] n. 1. вялі́кае шча́сьце, вялі́кая ра́дасьць. 2. раско́ша, асало́да *f.*; шча́сьце *n.*, шча́снасьць *f.*

blissful ['blɪsfəl] adj. ве́льмі шчасьлі́вы, шча́сны; ра́дасны: ***a blissful reunion*** ра́дасная сустрэ́ча; ***blissful memories*** ра́дасныя ўспамі́ны

blissfully ['blɪsfəli] adv. ра́дасна

blissfulness ['blɪsfəlnəs] n. шча́снасьць, ра́даснасьць *f.*

blister ['blɪstər] – n. 1. пухі́р -а́ *m.* (*на це́ле*). 2. пухіро́к, пухі́р на расьлі́не. 3. Med. выцяжны́ пля́стыр
– v.t. 1. выклі́каць пухіры́ на це́ле. 2. Figur. напада́ць, атакава́ць во́стрымі сло́вамі
– v.i. пакрыва́цца пухіра́мі *або́* прышча́мі

blister gas атру́тны газ, які́ выклі́кае пухіры́

blithe [blaɪð] adj. шчасьлі́вы, вясёлы

blither ['blɪðər] n. лухта́ *f.*; недарэ́чнасьць, дурні́на *f.*

blithering ['blɪðərɪŋ] adj. балбатлі́вы

blitz [blɪts] – n. 1. бліцкры́г -у *m.*, мала́нкавая вайна́. 2. нечака́ны гвалто́ўны напа́д (*самалётамі або́ та́нкамі*)
– v.t. рапто́ўна, гвалто́ўна напада́ць, атакава́ць або́ перамага́ць

blizzard ['blɪzərd] n. сьне́жная заве́я, мяце́ліца, завіру́ха *f.*

bloat [bloʊt] – v.t. 1. надзіма́ць. 2. саліць і вэ́ндзіць селядцы́
– v.i. надзіма́цца, пу́хнуць
– n. 1. уздуцьцё *n.* (*жыват*а́). 2. Informal павелічэ́ньне шта́ту або́ выда́ткаў

bloated ['bloʊtəd] adj. 1. напу́хлы, азы́злы: ***bloated faces*** азы́злыя тва́ры. 2. ду́тыя; ве́льмі вялі́кія: ***bloated armaments*** празьме́рнае ўзбрае́ньне

• ***bloated herring*** вэ́нджаны, маласо́лены селядзе́ц

bloater ['bloʊtər] n. маласо́лены, вэ́нджаны селядзе́ц

blob [blɑ:b] – n. 1. кро́пля *f.*: ***a blob of syrup*** кро́пля сыро́пу. 2. маленькі камя́к (*зямлі́, гліны*). 3. каляро́вая пля́мка або́ пы́рска (*фа́рбы*)
– v.t. пэ́цкаць, пля́міць; запы́рскваць, заплёхваць: ***to blob paint on the wall*** запы́рскаць сьцяну́ фа́рбай

bloc [blɑ:k] n. блёк -у *m.*; аб'е́днаньне *n.* (*дзяржа́ваў, палітычных па́ртыяў*)

block [blɑ:k] – n. 1. а) кало́да *f.* (*дрэ́ва*), цу́рка *f.* (*мэта́лу*), глы́ба *f.* (*камє́нная*), блёк -у *m.* (*бэто́ну*); б) ку́бік -а *m.* (*дзе́цям для гульні́*). 2. перашко́да *f.*, зато́р -у *m.*: ***a traffic block*** зато́р у ру́ху. 3. кварта́л у го́радзе: ***one block east*** адзі́н кварта́л на ўсхо́д. 4. а) жыльлёвы ко́рпус. б) гандлёвыя ряды́. 5. блёк -а *m.* (*бі́лета́ў*). 6. перагро́н -у *m.* (*на чыгу́нцы*). 7. Sl. даўбе́шка *m.* & *f.*, до́ўбня *m.*& *f.* (*галава́*). 8. пла́ха *f.* (*для пакара́ньня сьме́рцю*). 9. Tech. блёк -у *m.*, лябёдка *f.* 10. Figur. перашко́да *f.*, ця́жкасьці: ***to have a mental block about spelling*** мець асаблі́выя ця́жкасьці ў вывуча́ньні пра́вапісу
– v.t. 1. блякава́ць, зачыня́ць; затры́мваць: ***to block the access*** зачыні́ць до́ступ; ***to block the progress*** затрыма́ць по́ступ. 2. перашкаджа́ць. 3. фармава́ць: ***Felt hats are blocked*** Фэтравы́я капялю́шы фарму́юць
• ***block in/out*** наки́нуць плян або́ чарнові́к
• ***block off*** перакры́ць (*даро́гу*)
• ***blocked up*** зава́лены
• ***go to the block*** а) ісьці́ на пла́ху (*эшафо́т*). б) ісьці́ на про́даж (*асаблі́ва празь ліцыта́цыю*)
• ***on the block*** а) на про́даж. б) на ліцыта́цыю

blockade [blɑ:'keɪd] – n. 1. бляка́да *f.* 2. бляка́дны флёт *або́* а́рмія

– v.t. 1. накладáць блякáду. 2. выклікáць затóр (*на дарóзе*); заступáць (*дарóгу*); перашкаджáць
• ***raise the blockade*** зьняць блякáду
• ***run the blockade*** праскóчыць праз блякáду

blockade runner карабéль абó чалавéк, якí прарываецца праз блякáду

blockbuster ['blɑ:kˌbʌstər] n. 1. павéтраная бóмба вялíкага калíбру. 2. фільм, зрóблены вялíкім кóштам. 3. Figur. нéшта вялíкае, грандыёзнае

block faulting or **fault,** Geol. блёкавыя зрушэ́ньні, скід -у *m.*

blockhead ['blɑ:khed] n. дýрань -ня *m.*, дуры́лa -ы *m. & f.*, ёлупень -ня *m.*

blockish ['blɑ:kɪʃ] adj. дурны́; тупы́

block letter друкавáная вялíкая лíтара

blog [blɑ:g] v. вéсьці блог (*дзёньнік у Інтэрнэ́це*)

blogger ['blɑ:gər] n. блóгер -а *m.* (*чалавéк, якí вядзé дзёньнік у Інтэрнэ́це*)

blond [blɑ:nd] – adj. 1. бяля́вы; сьвéтлавалóсы. 2. вéльмі сьвéтлага кóлеру: ***blond oak*** сьвéтлы дуб
– n. блянды́н -а *m.*

blonde [blɑ:nd] – n. блянды́нка *f.*
– v.t. фарбавáць валасы́ на сьвéтлы кóлер

blood [blʌd] n. 1. кроў, крывí *f.* 2. род -у *m.*, радня́ *f.*, сваяцтва, пахóджаньне *n.*: ***my own flesh and blood*** мая́ рóдная кроў і кóстка; ***It runs in his blood*** Гэ́та ў яго́ ў крывí. 3. забóйства, крывапралíцьце *n.* 4. высóкае радаслóўе: ***a prince of the blood*** князь з каралéўскага рóду. 5. парóдзістасьць *f.*, дóбрая парóда; рáса *f.*: ***full blood*** конь чы́стае парóды, парóдзісты конь
• ***Blood is thicker than water*** Крóўная сýвязь мацнéйшая за сяброўства
• ***in cold blood*** а) люта. б) сумы́сьля, знарóк; сьвéдама
• ***make one's blood boil*** раззлавáць нéкага
• ***make one's blood run cold*** мóцна напалóхаць нéкага
• ***make one's blood stir*** узбудзíць у нéкім гарáчае пачуцьцё ці захаплéньне
• ***shed blood*** ліць, праліваць кроў

blood [blʌd] v.t. 1. прывучáць паляўнíчых сабáк да крывí. 2. правóдзіць баявóе хрышчэ́ньне

blood bank банк крывí

blood brother рóдны брат

blood cancer рак крывí

bloodcurdling ['blʌdkɜ:rdlɪŋ] adj. жахлíвы, ад якóга кроў сты́не ў жы́лах

blooded ['blʌdɪd] adj. дóбрай парóды, парóдзісты: ***blooded horses*** парóдзістыя кóні, кóні дóбрае парóды
• ***cold-blooded*** халóднакрóўны
• ***warm-blooded*** цеплакрóўны

blood feud варóжасьць паміж рóдамі (*з праліцьцём крывí*)

blood group грýпа крывí

bloodhound ['blʌdhaund] n. 1. сабáка-вывéднік. 2. Sl. шпік -á *m.*, агéнт вы́шуку, дэтэкты́ў -ва *m.*

bloodless ['blʌdles] adj. 1. бяскрóўны; блядзь: ***a bloodless victory*** перамóга без праліцьця́ крывí. 2. без энэ́ргіі, вя́лы, без жыцьця́. 3. бяздýшны, халóдны; нячýлы

bloodletting ['blʌdˌletɪŋ] n. 1. кровапускáньне *n.* 2. праліцьцё крывí, кровапралíцьцё *n.*, бóйня *f.*

bloodline радаслóўная

blood poisoning заражэ́ньне крывí

blood pressure крывяны́ ціск, ціск крывí

blood pudding or **sausage** крывянáя каўбасá, крывя́нка *f.*

bloodshed ['blʌdʃed] n. праліцьцё крывí; бóйня *f.*

bloodstained ['blʌdsteɪnd] adj. 1. заплямлены крывёю. 2. вінавáты ў забóйстве *абó* праліцьці крывí: ***a bloodstained conscience*** сумлéньне, заплямленае крывёю

bloodshot ['blʌdʃɑ:t] adj. налíты крывёю (*пра вóчы*)

bloodstock ['blʌdstɑ:k] n. жывёла чы́стае парóды (*асаблíва пра кóней*)

bloodsucker ['blʌdˌsʌkər] n. 1. п'яўка *f.*, крывасмо́к -а *m.* 2. Figur. абдзіра́ла -ы *m. & f.*; крывасмо́к -а *m. & f.*, эксплюата́тар -а *m.*

blood test ана́ліз крыві́

bloodthirstiness ['blʌdˌθɜ:rstinəs] n. крыважэ́рнасьць, лю́тасьць, жо́рсткасьць *f.*

bloodthirsty ['blʌdˌθɜ:rsti] adj. крыважэ́рны; схі́льны да забо́йстваў; жо́рсткі, лю́ты

blood transfusion пераліва́ньне крыві́, трансфу́зія *f.*

blood vessel крывяно́сны сасу́д

bloodworm чырво́ны дажджавы́ чарвя́к

bloody ['blʌdi] adj. **-bloodier -iest** 1. крыва́вы, які́ крыва́віць: ***a bloody nose*** крыва́вы нос. 2. скрыва́ўлены, запэцканы крывёю. 3. крыва́вы: ***a bloody battle*** крыва́вая бітва́. 4. крыважэ́рны, лю́ты. 5. чырво́ны, як кроў: ***the bloody sun*** чырво́нае, як кроў, со́нца. 6. Brit., Sl. (*ла́янка*) пракля́ты, хале́рны: ***He's a bloody fool*** Ён набі́ты ду́рань

bloody ['blʌdi] v.t. 1. ра́ніць да крыві́, скрыва́ўліваць. 2. пля́міць, пэ́цкаць крывёю

Bloody Mary «крывавая Мэры» (*гарэ́лка з памідо́равым со́кам*)

bloom [blu:m] – n. 1. кра́ска, кве́тка *f.*; цьвет -у *m.*, кве́цень *f.*: ***in bloom*** у цьве́це, у кве́цені. 2. цьвіце́ньне, красава́ньне *n.* (*пра збажыну́*). 3. ро́сквіт -у *m.*: ***in the bloom of youth*** у ро́сквіце маладо́сьці. 4. румя́нец -ца *m.*: ***the bloom of health and happiness*** румя́нцы здаро́ўя й шча́сьця. 5. пушло́к -ка́ *m.* (*на фру́ктах, лісто́х*)

– v.i. 1. цьвісьці́, квітне́ць; красава́ць (*пра збажыну́, траву́*); расьцьвіта́ць: ***the flowers that bloom in the spring*** кра́скі, што цьвітуць увесну; ***when rye bloomed*** калі́ жы́та красава́ла. 2. квітне́ць, разьвіва́цца, быць у найле́пшых сі́лах і здаро́ўі. 3. прамяне́ць здаро́ўем і красо́ю – v.t. 1. ажыўля́ць, спрычыня́цца да ро́сквіту: ***Only water can make the desert bloom*** То́лькі вада́ можа ажыві́ць пусты́ню. 2. зарумя́ніцца

bloomer ['blu:mər] n., Brit., Sl. вялі́кая памы́лка, про́мах -у *m.*

bloomers ['blu:mərz] n., pl. шыро́кія спо́днія по́ркі

blooming ['blu:mɪŋ] adj. 1. у цьве́це, у кве́цені: ***blooming shrubs*** кусты́ ў цьве́це. 2. квітне́ючы, у ро́сквіце; які́ даé вялі́кія прыбы́ткі: ***blooming market*** ры́нак у ро́сквіце, мо́цна ажы́ўлены ры́нак

bloomy ['blu:mi] adj. пакры́ты пылко́м (*як сьлі́ўка*)

blooper ['blu:pər] n., Sl. дурна́я памы́лка

blossom ['blɑ:səm] – n. цьвет -у *m.*, кве́цень *f.*: ***apple blossom*** я́блынавы цьвет; ***a cherry tree in blossom*** ві́шня ў кве́цені

– v.i. цьвісьці́, зацьвіта́ць, расьцьвіта́ць: ***All the orchards blossom in the spring*** Усе́ сады́ цьвітуць увесну. 2. разьвіва́цца, разьві́цца: ***Her musical talent blossomed early*** Ейны музы́чны тале́нт ра́на разьві́ўся

blossomy ['blɑ:səmi] adj., Poet. увесь у кве́цені

blot [blɑ:t] – v.t. 1. пля́міць, запля́мваць чарні́лам, садзі́ць кля́ксу. 2. прамака́ць, сушы́ць прамака́ткай. 3. Figur. пля́міць, га́ньбіць

– v.i. пля́міцца

– n. кля́кса *f.*; пля́ма *f.*; хі́ба, га́ньба *f.* • ***blot out*** а) хава́ць; зата́іць. б) зацьмі́ць: ***A cloud has blotted out the moon*** Хма́ра зацьмі́ла ме́сяц. в) вы́церці, сьце́рці; зьні́шчыць

blotch [blɑ:tʃ] – n. 1. вялі́кая пля́ма. 2. прышч -а́ *m.*

– v.t. 1. пля́міць. 2. абсыпа́ць прышча́мі

blotchy ['blɑ:tʃi] adj. прышчава́ты, які́ ма́е прышчы́

blotter ['blɑ:tər] n. 1. прамака́тка *f.* 2. запісна́я кні́жка, ната́тнік -а *m.*

blotting paper ['blɑ:tɪŋ] n. прамака́льная папе́ра, прамака́тка *f.*

blouse [blaʊs] n. 1. жано́чая блю́зка. 2. вайско́вая *або́* рабо́чая блю́за

blow I [bloʊ] n. 1. уда́р -у *m.*: ***a blow with a fist (hammer)*** уда́р кулако́м (малатко́м). 2. няшча́сьце *n.*, уда́р -у *m.* (*лёсу*). 3. раптО́ўны напа́д (*на во́рага*)

• ***at one blow*** адра́зу; адны́м ма́хам

• ***come to blows*** пача́ць біцца

• ***strike a blow for*** заступі́цца за *каго́-што*, стаць на абаро́ну *каго́-чаго́*

blow II [bloʊ] v., **blew, blown, blowing** – v.i. 1. дзьмуць, дзьму́хаць; ве́яць (*пра ве́цер*). 2. не́сьціся: ***Dust blew across the road*** Праз даро́гу нёсься пыл. 3. граць на духавы́м інструмэнце; сьвістА́ць, гудзе́ць: ***The whistle blows at noon*** Сьвісто́к сьві́шча апаўдні́. 4. сапці́, ця́жка ды́хаць. 5. Informal хвалі́цца, выхваля́цца. 6. перагара́ць (*пра электры́чны ко́рак, засьцераго́льнік*) – v.t. 1. хіста́ць: ***The wind blew the curtains*** Ве́цер хіста́ў фіра́нкі. 2. разьдзіма́ць: ***to blow the fire into flame*** разьдьму́ць аго́нь. 3. прадзіма́ць. 4. выдзіма́ць: ***to blow glass*** выдзіма́ць шкляны́я вы́рабы. 5. падрыва́ць. 6. пла́віць. 7. Sl. а) раскіда́ць, ма́рна тра́ціць, марнатра́віць (*гро́шы*). б) выдава́ць гро́шы на *каго́*: ***I'll blow you to dinner tonight*** Я сёньня зафунду́ю табе́ абе́д. 8. Sl. партО́ліць; блы́таць: ***The actress blew her lines*** Акто́рка паблы́тала сваі́ сло́вы

– n. 1. по́дых -у *m.*; паве́ў -ву *m.* (*ве́тру*). 2. дзьму́ханьне *n.* 3. віху́ра *f.*: ***Last night's big blow did a lot of damage*** Учо́рашняя вялі́кая віху́ра нарабі́ла шмат шко́ды. 4. хвальба́ *f.*, самахва́льства *n.*

• ***blow hot and cold*** вага́цца, быць то за, то су́праць

• ***blow in,*** Sl. а) нечака́на прые́хаць, зьяві́цца *або́* заско́чыць да *каго́*. б) марнатра́віць гро́шы

• ***blow off*** выпуска́ць па́ру; вы́лецець (*пра па́ру*)

• ***blow on,*** Brit., Informal засьвіста́ць у сьвісто́к

• ***blow one's nose*** вы́смаркаць нос, вы́смаркацца

• ***blow out*** а) задзьму́ць, згаси́ць сьве́чку: ***Please blow out the candle*** Калі́ ла́ска, згасі́ сьве́чку. б) ло́пнуць, трэ́снуць: ***The worn tire blew out*** Зно́шаная шы́на ло́пнула; ***to blow out one's brains*** пусьці́ць сабе́ ку́лю ў лоб

• ***blow over*** суніма́цца, прахо́дзіць, міна́ць: ***The storm has blown over*** Навальні́ца суняла́ся

• ***blow the whistle*** вы́крыць ненарма́льнасьці *або́* парушэ́ньні ў арганіза́цыі, устано́ве

• ***blow up*** а) падарва́цца; вы́бухнуць; падарва́ць. б) надзьму́ць пав е́трам: ***to blow up a tire*** надзьму́ць шы́ну. в) Informal мо́цна ўзлава́цца. г) Informal крыча́ць і сварыцца на *каго́*: ***to blow up at the class*** крыча́ць на кля́су. д) пабо́льшаць, памацне́ць: ***A storm suddenly blew up*** Навальні́ца ра́птам памацне́ла. е) пабо́льшыць, павялі́чыць (*фатагра́фію*)

• ***blown with pride*** по́ўны го́нару, ганарлі́васьці

blow III [bloʊ] – n. 1. цьвіце́ньне, квітне́ньне *n.* 2. цьвет -у *m.*

– v.i. **blew, blown** распуска́цца, зацьві та́ць; цьвісьці́, квітне́ць

blow-by-blow крок за кро́кам, дэталёва

blow dryer сушы́лка гара́чым паве́трам

blower ['bloʊər] n. 1. а) надзіма́льная прыла́да. б) выдзіма́льнік -а *m.*, выдзіма́льніца *f.*: ***a glass blower*** выдзіма́льнік шкляны́х вы́рабаў. 2. вэнтыля́тар -а *m.* 3. Brit., Sl. тэлефо́н -а *m.*

blowfly ['bloʊflaɪ] n., pl. **-flies** мясна́я му́ха

blowhole ['bloʊhoʊl] n. 1. вэнтыля́тар -а *m.* (*у тунэ́лі*). 2. ды́хальца *n.*, ды́хальныя адту́ліны. 3. пало́нкі ў лёдзе. 4. брак у мэта́ле ў фо́рме бу́рбалкі

blown I [bloun] – adj. 1. засо́пшыся, які́ ця́жка ды́хае: ***He was blown after climbing the steep hill*** Ён засо́пся, паку́ль забра́ўся на стро́мкі ўзго́рак: ***a blown horse*** загна́ны конь. 2. запэ́цканы му́хамі; засе́джаны му́хамі (*мя́са*). 3. выдзіма́ны, дзьму́ты: ***blown glass*** дзьму́тае шкло. 4. успу́хлы (*пра жывёліну*), абжэ́рлы
– v., the p.p. of **blow I** and **blow II**

blown II [bloun] – v., *p.p. of* **blow III**
– adj. у цьве́це; ца́лкам расьцьві́лы: ***a full blown rose*** расьцьві́лая ружа

blowoff ['blouɔ:f] n. 1. выпуска́ньне *n.* 2. апара́т для выпуска́ньня па́ры. 3. Informal вы́бух гне́ву, набале́лага пачуцця́. 4. Sl. хвалькло́ -а́ *m.*, самахва́л -а *m.*

blowout ['blouaut] n. 1. ло́паньне ка́мэры (*ў ко́ле*). 2. прары́лў -ву *m.* (*плаці́ны*). 3. перагара́ньне, распла́ўленьне (*электры́чнага засьцерага́льніка, ко́рка*). 4. Sl. вялі́кае ігры́шча, гуля́нка *f.*

blowpipe ['bloupaip] n. пая́льная тру́бка

blowtorch ['bloutɔ:rtʃ] n. 1. пая́льная ля́мпа. 2. Sl. а) рэакты́ўны самалёт. б) рэакты́ўны рухані́к

blowup ['blouʌp] n. 1. а) вы́бух -у *m.* б) сва́рка, спрэ́чка *f.* 2. Informal вы́бух гне́ву. 3. а) пабо́льшаны фатаздымак. б) пашы́раная вэ́рсія фі́льму. 4. банкру́цтва *n.*

blowy ['blouі] adj. **blowier, -iest** ве́траны: ***a blowy day*** ве́траны дзень

blowzed [blouzd] or **blowzy** ['blouzi] adj. 1. неаха́йны; раскудла́чаны: ***blowzy hair*** раскудла́чаныя валасы́. 2. чырванашчо́кі, грубы́

blub [blʌb] v. **blubbed, blubbing**, *гл.* **blubber**, v.t.

blubber ['blʌbər] – n. 1. во́рвань *f.*, тлушч з марскі́х жывёлаў. 2. мо́цны плач, полў -ву *m.*
– v.i. раўсьці́, го́ласна пла́каць, лямантава́ць
– v.t. гаварыць з пла́чам

blubbery ['blʌbəri] adj. 1. таўсты́, адтапы́раны: ***blubbery lips*** адтапы́раныя ву́сны. 2. тлу́сты

bludgeon ['blʌdʒən] – n. дубі́на *f.*
– v.t. 1. біць дубі́наю. 2. пагража́ць, застра́шваць, стра́шыць

blue [blu:] – n. 1. блакі́т -у *m.*; сі́ні ко́лер. 2. а) сі́няя фа́рба. б) сі́нька *f.* 3. Informal «сі́няя панчо́ха». 4. Informal сі́няя сту́жка (*знак высо́кага вызначэ́ньня*)
– adj. 1. сі́ні, сі́ненькі; блакі́тны. 2. пасіне́лы, сьсіне́лы: ***blue with cold*** пасіне́лы ад хо́ладу. 3. су́мны; хму́рны; зьнеахво́чаны: ***to look blue*** мець су́мны вы́гляд; ***to feel blue*** чу́ць прыгне́чаным. 4. бязра́дасны, змро́чны, прыгнята́льны. 5. esp. Brit. непрысто́йны, салёны: ***a blue joke*** салёны жарт. 6. блю́завы
– v.t. сініць (*сі́нькай*)
• ***into the blue*** далёка з вачэ́й; у забыцьцё
• ***out of the blue*** зьняна́цку, зусі́м нечака́на
• ***the blue*** а) не́ба *n.* б) мо́ра *n.*
• ***the Blue and the Gray*** сі́нія й шэ́рыя (*паўно́чная й паўдзённая а́рміі ў амэры́ка́нскую грамадзя́нскую вайну́*)

blue baby дзіця́, наро́джанае зь сі́няй ску́рай (*сінюхай*)

bluebell ['blu:bel] n. сі́нія званочкі (*кве́ткі*)

blueberry ['blu:ˌberi] – n., pl. **-ries** чарні́цы *pl. only* (*я́гада і куст*)
– v.t. зьбіра́ць чарні́цы

blue-black цёмна-сі́ні

blue blood шляхо́тнае пахо́джаньне

bluebonnet ['blu:ˌbɑ:net] n. 1. сі́ні лю́бін. 2. шко́цкі сі́ні капту́р
• ***Blue Bonnet*** шкот -а *m.*

blue book кні́га *або́* сьпі́с ва́жных урадо́ўцаў, дыплама́таў

blue-collar worker чо́рнарабо́чы

bluecoat ['blu:kout] n. паліцыя́нт -а *m.*

blue-eyed сінявокі

blue-grass 1. род травы́. 2. блю-гра́с (*стыль му́зыкі ка́нтры*)

• ***Bluegrass State*** мяну́шка шта́ту Кента́кі

blue-green сі́не-зялёны

bluejacket ['blu:ˌdʒækɪt] n. мара́к вае́ннага флёту

blue jeans or **bluejeans** ['blu:dʒi:nz] n., pl. джы́нсы *pl.*

bluejay ['blu:dʒeɪ] n. чуба́тая со́йка

blue Monday Informal цяжкі́ панядзе́лак; дзень вярта́ньня да пра́цы

blue moon: ***once in a blue moon*** ама́ль нікó́лі, ве́льмі рэ́дка, гады́ ў рады́

bluenose ['blu:nouz] n., Informal 1. сьвята́ша -ы *m. & f.* 2. пурыта́нін -а *m.*, пурыта́нка *f.*

blue-pencil [ˌblu:'pensəl] v.t. 1. рэдагава́ць; выкрэ́сьліваць, папраўля́ць (*памы́лкі*) сі́нім алавіко́м. 2. цэнзурава́ць

blueprint ['blu:prɪnt] – n. 1. сьветлако́пія. 2. плян, прае́кт -у *m.*

– v.t. 1. рабі́ць сьве́тлапіс, сьветлако́пію. 2. рабі́ць дакла́дны плян

bluestocking ['blu:stɑ:kɪŋ] n. «сі́няя панчо́ха», інтэлектуа́лка *f.*

bluestone ['blu:stoun] n. 1. сі́не-шэ́ры пяшча́нік. 2. ме́дны купарва́с, сі́ні ка́мень: ***blue vitriol*** ме́дны купарва́с

bluff I [blʌf] – n. 1. высо́кі абры́вісты бе́раг *або́* скала́; стро́ма *f.* 2. гру́па дрэ́ваў, куста́ў сяро́д прэ́рыі

– adj. стро́мкі, абры́вісты. 2. рэ́зкі, бесцырымо́нны; адкры́ты й дабраду́шны

bluff II [blʌf] – n. блеф -у *m.*, вы́думка *f.*, падма́н -у *m.*, ашука́нства, запало́хваньне *n.*

– v.t. ашу́кваць, застра́шваць, ужыва́ць бле́ф

• ***call the bluff*** не паддава́цца бле́фу, запало́хваньню

bluish ['blu:ɪʃ] adj. сінява́ты

blunder ['blʌndər] – n. дурна́я памы́лка; хі́ба *f.*

– v.i. 1. схі́біць, зрабі́ць дурну́ю памы́лку. 2. брысьці́, блука́ць

– v.t. 1. рабі́ць няпра́вільна; парта́чыць, рабі́ць брак. 2. вы́казаць глу́пства

blunge [blʌndʒ] v.t. мяша́ць з вадо́ю (*напр. гліну*), замяша́ць

blunger ['blʌndʒər] n. 1. мэхані́чная мяша́лка. 2. чалаве́к, які́ працу́е пры мяша́лцы

blunt [blʌnt] – adj. 1. тупы́: ***a blunt knife*** тупы́ нож. 2. адкры́ты, бесцырымо́нны; рэ́зкі: ***a blunt answer to a silly question*** бесцырымо́нны адка́з на дурно́е пыта́ньне. 3. Figur. няке́млівы, тупы́

– v.t. 1. тупі́ць (*нож*). 2. атупля́ць; прытупля́ць (*пачу́ьці, энэ́ргію*)

– v.i. 1. тупе́ць, тупі́цца. 2. Figur. тупе́ць (*пра чалаве́ка*)

bluntly ['blʌntli] adv. адкры́та, бесцырымо́нна; про́ста з мо́ста

blur [blɜ:r] – v.t. **blurred, -rring** 1. рабі́ць няя́сным; затума́ньваць: ***Mist blurred the hills*** Імгла́ затума́ніла ўзго́ркі. 2. зацьмява́ць: ***Tears blurred my eyes*** Сьлёзы зацьмі́лі мне во́чы. 3. пэ́цкаць, ста́віць кля́ксы; пля́міць. 4. Figur. пля́міць: ***to blur one's character*** запля́міць сваю́ рэпута́цыю

– v.i. зацьмява́цца, рабі́цца няя́сным

– n. 1. цьмя́насьць, невыра́знасьць *f.* 2. цьмя́ная пля́ма. 3. пля́ма, кля́кса *f.* 4. пля́ма, зага́на *f.* (*на хара́ктары ці рэпута́цыі*)

blurb [blɜ:rb] Informal, – n. каро́ткая даве́дка (*пра кні́гу, фільм*)

– v.t. апавяшча́ць, дава́ць абве́стку

blurry ['blɜ:ri] adj. **-rier, -riest** 1. цьмя́ны; невыра́зны. 2. папэ́цканы; папля́млены кля́ксамі: ***a blurry copy*** папля́млены асо́бнік

blurt [blɜ:rt] – v.t. прагаво́рвацца, вы́пальваць, ля́паць (*каза́ць не падумаўшы*): ***In his anger he blurted out the secret*** У зло́сьці ён ля́пнуў пра сакрэ́т

– n. імпульсі́ўнае выка́званьне

blush [blʌʃ] – n. 1. пачырване́ньне *n.* (*ад со́раму*), румя́нец -ца *m.*: ***to put to the blush*** засаро́міць, зму́сіць чырване́ць. 2. чы́рвань *f.*; зара́ *f.*, во́дбліск -у *m.*; за́рава *n.* (*пажа́ру*)

– v.i. 1. чырване́ць. 2. саро́мецца
– v.t. чырвані́ць
• ***at first blush*** зь пе́ршага по́зірку; на пе́ршую ду́мку

blushful ['blʌʃfəl] adj. 1. съці́плы; сарамлі́вы. 2. пачырване́лы, румя́ны

blushless ['blʌʃləs] adj. без румя́нцаў; які́ не чырване́е; бессаро́мны

bluster ['blʌstər] – v.i. 1. бушава́ць, раўсьці́ (*пра бу́ру*). 2. го́ласна крыча́ць (*пагража́ючы*)
– v.t. пагража́ць
– n. 1. по́ўў -ву *m.*, завыва́ньне, бушава́ньне *n.* (*ве́тру*). 2. пусты́я пагро́зы: ***boastful bluster*** крыкліва́е самахва́льства

boa ['bouə] n., pl. **boas** Zool. 1. бо́а, *indecl.* уда́ў -ва *m.* 2. бо́а, жано́чы шаль

boa constrictor уда́ў

boar [bɔ:r] n. 1. кныр -а́ *m.* 2. дзік -а́ *m.*

board [bɔ:rd] – n. 1. до́шка *f.*: ***an ironing board*** до́шка для прасава́ньня; ***chess board*** ша́хматная до́шка. 2. стол (*асабліва для е́жы*). 3. пале́ціа *f.* 4. харчава́ньне, сталава́ньне *n.*; стол, стала́ *m.*: ***board and lodging*** кватэ́ра й сталава́ньне. 5. цьвярда́я во́кладка для кні́гі. 6. упра́ва, ра́да *f.*; праўле́ньне *n.*: ***a school board*** шко́льная ра́да; ***a board of directors*** упра́ва дырэ́ктараў. 7. борт -а *m.* (*карабля́*). 8. карні́з -а *m.*
– v.t. 1. кла́сьці падло́гу; забіва́ць до́шкамі, абшалёўваць. 2. сталава́ць, выдава́ць абе́ды. 3. сяда́ць на карабе́ль (*цягні́к, самалёт*)
– v.i. 1. сталава́цца *або́* быць на кватэ́ры са сталава́ньнем. 2. Naut. лявірава́ць (*супро́ць ве́тру*)
• ***board on board*** по́бач, бок пры бо́ку
• ***control board*** пульт кірава́ньня
• ***go by the board*** а) упа́сьці з па́лубы ў ваду́. б) не зварача́ць ўва́гі на *што*, махну́ць руко́ю на *што*: ***Formalities went by the board*** На фарма́льнасьці не зварача́лі ўва́гі
• ***on board*** на бо́рце, у вадапла́ве, цягніку́, самалёце
• ***the boards*** сцэ́на ў тэа́тры
• ***thread the boards*** граць на сцэ́не

boarder ['bɔ:rdər] n. 1. сталаўні́к -а́ *m. & f.*, госьць у пансіяна́це. 2. ву́чань, які́ жыве́ ў інтэрна́це

boarding ['bɔ:rdiŋ] n. 1. до́шкі *coll.* 2. за́гарадка *f.*, парка́н -у *m.*

boarding house пансіён -у *m.*

boarding school шко́ла зь інтэрна́там

board of health аддзе́л публі́чнага здаро́ўя пры мясцо́вай ула́дзе

boardwalk ['bɔ:rdwɔ:k] n. 1. дашча́ны на́сьціл на набярэ́жнай. 2. хо́днік -а *m.* (*з до́шак*)

boast I [boust] – v. 1. хвалі́цца, выхваля́цца. 2. ганары́цца: ***Our town boasts many fine parks*** Наш го́рад ганары́ца прыго́жымі па́ркамі
– n. 1. самахва́льства *n.*, хвальба́ *f.*, выхваля́ньне *n.*: ***I don't believe his boasting*** Я не даю́ ве́ры яго́ным выхваля́ньням. 2. не́шта, чым мо́жна ганары́цца

boast II [boust] v.t. збо́льшага абчаса́ць

boaster I ['boustər] n. хвалькло́ -а́ *m. & f.*

boaster II ['boustər] n. шыро́кае разьбя́рскае до́лата, разле́ц -ца́ *m.*

boastful ['boustfəl] adj. выхва́льны, самахва́льны: ***a boastful story*** самахва́льнае апавяда́ньне; ***a boastful man*** хвальклó -а́ *m.*

boastfully ['boustfəli] adv. з выхваля́ньнем

boat [bout] – n. 1. чо́вен, чаўна́ *m.*, ло́дка *f.* 2. вадапла́ў -ва *m.*, карабе́ль -ля́ *m.*
– v.i. 1. сяда́ць у чо́вен, на вадапла́ў, плы́сьці чаўно́м *або́* вадапла́вам
– v.t. весławáць, перавозіць чаўно́м
• ***burn one's boats*** спаліць за сабо́ю масты́
• ***in the same boat*** у такі́м са́мым ста но́вішчы *або́* ўмо́вах
• ***miss the boat,*** Informal прапусьці́ць, празява́ць нагоду
• ***rock the boat,*** Informal разго́йдваць чо́вен, пару́шаць норма́льны пара́дак

boatable ['bouṭəbəl] adj. суднахо́дны: ***The canal will be boatable*** Кана́л бу́дзе суднахо́дны

boatage ['bouṭɪdʒ] n. 1. перавоз во́дным шля́хам. 2. пла́та за таки́ перавоз

boater ['bouṭər] n. 1. ло́дачнік -а *m.*, вясьля́р весьляра́ *m.* 2. саламя́ны пляска́ты капялю́ш з паля́мі

boat hook бусак -а́ *m.*

boating ['bouṭɪŋ] n. ло́дачны спорт

boat house пры́стань для чаўно́ў

boatman ['bouṭmən] n., pl. **-men** 1. ло́дачнік -а *m.* 2. пла́тны вясьля́р. 3. рабо́тнік на караблі́

boatrace ['bouṭreɪs] n. спабо́рніцтвы ло́дак, рэга́та *f.*

boatswain ['bousən] n. бо́цман -а *m.*

boat train цягні́к, узго́днены з раскла́дам параплава́ў

bob I [bɑ:b] v. **bobbed, -bbing** 1. сту́каць. 2. раптоўна схіля́цца: ***He bobbed suddenly and avoided the blow*** Ён ра́птам схіліўся, каб пазьбе́гнуць уда́ру

• ***bob up*** нечака́на зьяві́цца, вы́плысьці

bob II [bɑ:b] – n. 1. ко́ратка падстры́жаныя валасы́ (*у жанчы́ны ці дзіця́ці*). 2. вузел -ла́, зьвя́зак -ка, пук пука́ *m.*. 3. падрэ́заны хвост. 4. падве́ска *f.*, адве́с -а *m.*. 5. плаўво́к, паплаўво́к -ўка́ *m.* 6. са́ні *pl.* 7. мадуля́цыя *f.*

– v.t. 1. стры́гчы ко́ратка валасы́. 2. падраза́ць хвост (*каню́ ці саба́ку*)

bob III [bɑ:b] – n. лёгкі штуршо́к, уда́р; лёгкае сту́каньне

– v.t. **bobbed, -bbing** 1. лёгка штурха́ць, шлёпаць. 2. сту́каць

bob IV [bɑ:b] n., pl. **bob**, Brit., Sl. шы́лінг -а *m.*

bobbed [bɑ:bd] adj. 1. ко́ратка падстры́жаны. 2. ко́ратка абрэ́заны

bobbin ['bɑ:bən] n. 1. шпу́ля, шпу́лька *f.* 2. верацяно́ *n.* 3. чаўнло́к -ака́ *m.* (*для тка́ньня*), чаўначло́к -ка́ *m.* (*для краве́цкай машы́ны*)

bobby ['bɑ:bi] n., pl. **-bies,** Brit., Sl. паліцыя́нт -а *m.*

bobby pin прыко́лка, зако́лка *f.* (*для валасо́ў*)

bobbysocks or **-sox** ['bɑ:bɪsɑ:ks] n. Informal дзявочыя каро́ткія шкарпэ́ткі

bobbysoxer ['bɑ:bɪsɑ:ksər] n., Informal дзяўчы́на-падле́так, яка́я захапля́ецца навінкамі

bobcat ['bɑ:bkæt] n. амэрыка́нская рысь

bobsled ['bɑ:bsled] or **bobsleigh** ['bɑ:bsleɪ] n. 1. бабслэ́й -ю *m.* 2. са́ні для перавозкі бярвёньня

bobtail ['bɑ:bteɪl] – n. 1. каро́ткі хвост *або́* ко́ратка падрэ́заны хвост. 2. конь *або́* саба́ка з абрэ́заным хвасто́м

– adj. 1. куртаты, з каро́ткім хвасто́м. 2. Figur. няпо́ўны, скаро́чаны

– v.t. 1. ко́ратка абраза́ць хвост. 2. Figur. скарача́ць

bobwhite ['bɑ:bhwaɪt] n. амэрыка́нская перапёлка

Boche or **boche** [bɑ:ʃ] n. 1. нямецкі жаўне́р. 2. не́мец -ца *m.*, не́мка *f.* (*зьневажа́льна*)

bock beer or **bock** [bɑ:k] мо́цнае цёмнае пі́ва

bode I [boud] v. прадвяшча́ць, праро́чыць

• ***bode ill*** быць благі́м зна́кам

• ***bode well*** быць до́брым зна́кам

bode II n., *p.t. of* **bide**

bodeful ['boudfəl] adj. прадвяшча́льны; праро́чы

bodice ['bɑ:dɪs] n. 1. ста́нік -а *m.*, стан -у *m.* (*суке́нкі*). 2. гарсэ́т -у *m.*, шнуро́ўка *f.*

bodiless ['bɑ:dɪləs] adj. бесьцяле́сны, бясьце́лы

bodily ['bɑ:dəli] – adj. 1. цяле́сны, фізы́чны: ***bodily pain*** фізы́чны боль; ***bodily strength*** фізы́чная сі́ла. 2. цяле́сны, матэрыя́льны: ***our bodily life*** існава́ньне, жыцьцё на́шага це́ла, на́шае фізы́чнае існава́ньне

– adv. 1. асабі́ста, ва ўла́снай асо́бе: ***He came bodily*** Ён прыйшо́ў асабі́ста. 2. пагало́ўна; усе́ ра́зам; як адзі́н: ***The audience rose bodily*** Гледачы́ ўсе́ ўста́лі, як адзі́н

boding ['bəʊdɪŋ] – n. перасьцярóга *f.*; прадвяшчáньне *n.*, прыкмéта *f.*, знак -у *m.*, прадвéсьце *n.*: ***a boding of disaster*** прадвéсьце няшчáсьця
– adj. прадвяшчáльны, праро́цкі

bodkin ['bɑ:dkɪn] n. 1. вялíкая тупáя гóлка. 2. шпíлька для валасóў. 3. шы́ла *n.* 4. Print. прылáда да выбірáньня лíтараў

body ['bɑ:di] – n., pl. **bodies** 1. цéла *n.* 2. ту́лава *n.*, ту́ша *f.* (*жывёлы*). 3. галóўная чáстка. 4. ку́заў аўтамашы́ны. 5. фюзэля́ж -у *m.* (*самалёта*). 6. гру́па *f.*; о́рган -у *m.*; збор -у *m.*: ***a body of troops*** атрáд вóйскаў; ***a legislative body*** закóнадáўчы вóрган; ***a body of laws*** збор закóнаў. 7. Informal чалавéк -а *m.*: ***a good sort of body*** дóбры чалавéк. 8. труп -а *m.*, цéла мёртвага чалавéка. 9. мáса *f.*; масíў -ву *m.*, чáстка матэ́рыі: ***body of water*** вóдны масíў; ***The moon, the sun, and the stars are heavenly bodies*** Мéсяц, сóнца й зóркі — нябéсныя цéлы. 10. гушчыня́; кансыстэ́нцыя *f.*: ***wine of good body*** дóбрае вінó (*дóбрай кансыстэ́нцыі*). 11. вéрхняя чáстка адзéжыны, стáнік -а *m.*
– v.t. 1. надавáць фóрму *чаму́*. 2. ажыццяўля́ць
• ***in a body*** усé, як адзíн, пагалóўна
• ***keep body and soul together*** трымáцца жывы́м, падтры́мваць існавáньне

body clock біялагíчны гадзíньнік

body count падлíк забíтых

bodyguard ['bɑ:dgɑ:rd] n. 1. целаахóўнік -а *m.* 2. сьвíта *f.*, эскóрт -у *m.*

body language мóва ру́хаў і жэ́стаў

Boer [bɔ:r] – n. бур -а *m.*
– adj. бу́рскі: ***Boer War*** бу́рская вайнá

bog [bɑ:g] – n. балóта *n.*; дры́гва *f.*: ***peat bog*** імшáра, амшáра *f.*; тарфя́нік -у *m.*, тарфя́нішча *n.*
– v. **bogged, -gging** тапíцца; правáльвацца ў балóце *абó* як у балóце
• ***bog down*** загрáзнуць, як у балóце: ***He bogged down in the middle of his speech*** Ён загрáз у сярэ́дзіне сваéй прамóвы

bogberry ['bɑ:gˌberi] n., pl. **-ries** журавíны *pl. only*

bogeyman ['bəʊgimæn] n. дамавíк -á *m.*

boggish ['bɑ:gɪʃ] adj. амшáрысты; балацяны, балóцісты

boggle ['bɑ:gəl] – v.i. 1. паўстры́мвацца, вагáцца. 2. палóхацца, жахáцца. 3. быць агалóмшаным
– v.t. партáчыць, рабíць брак
– n. памы́лка *f.*; нячы́стая партáцкая рабóта

boggy ['bɑ:gi] adj. **-gier, -giest** тóпкі; балóцісты; дрыгвяны́

bogie I ['bəʊgi] n. 1. дамавíк -á *m.*, нячы́сьцік -а *m.* 2. Sl. неапазнáны самалёт

bogie II ['bəʊgi] n. двухвóсевыя павóзкі (*паравóзу*)

bog oak or **wood** мóраны дуб

bogus ['bəʊgəs] adj., падрóблены, фальшы́вы, фікцы́йны: ***a bogus cheque (check)*** падрóблены чэк

bogy I ['bəʊgi] n., pl. **-gies** 1. дамавíк -á *m.*, нячы́стая сíла. 2. пу́дзіла *n.*; нéхта, каго́ ўсе баяцца, гразá *f.*

bogy II ['bəʊgi] n., pl. **-gies** 1. вазлóк -кá *m.* 2. двухвóсевыя павóзкі

bohemia [bəʊ'hi:miə] n. багэ́ма *f.* а) свабóдны й вóльны спóсаб жыцьця́. б) мéсца, дзе мастакí й пісьмéньнікі вядýць такóе жыцьцё

Bohemian or **bohemian** [bəʊ'hi:miən] – adj. 1. багэ́мскі (*чэ́скі*). 2. чэ́ская мóва. 3. багэ́мны
– n. 1. багэ́мец -ца *m.* 2. прадстаўнíк багэ́мы

boil [bɔɪl] – v.i. 1. кіпéць; гатавáцца: ***The eggs are boiling*** Яйкі гатýюцца. 2. Figur. быць узбýраным, злóсным; злавáцца: ***to boil with anger*** кіпéць ад злóсьці. 3. бушавáць (*пра натóўп*)
– v.t. 1. кіпяцíць, вары́ць; гатавáць, пáрыць (*малакó*). 2. стэрылізавáць
– n. кіпéньне *n.*
• ***boil away*** вы́кіпець

• ***boil down*** а) выкіпа́ць; згушча́ць кіпячэ́ннем. б) скарача́ць, выкіда́ючы нява́жнае
• ***boil over*** а) пабе́гчы (*пры кіпе́ньні*). б) не панава́ць над сабо́ю, вы́бухнуць: ***to come to a boil*** закіпе́ць

boil II [bɔil] n. ску́ла *f.*, нары́лў -ва *m.*

boiled [bɔild] adj. ва́раны; кіпячо́ны, гатава́ны (*пра ваду́*); па́раны (*пра мако́*)

boiled oil пако́ст -у *m.*

boiler ['bɔilər] n. 1. паравы́ кацёл, каза́н -а́ *m.* 2. кіпяці́льнік -а *m.*

boiler plate 1. каце́льнае жале́за (*прызна́чанае для вы́рабу катло́ў або́ каце́льны ліст*). 2. шаблённая мо́ва

boilermaker ['bɔilərmeikər] n. каце́льнік -а *m.*

boiler room каце́льня *f.*

boiling ['bɔiliŋ] – n. 1. кіпе́ньне *n.* 2. кіпячэ́ньне *n.*
– adj. кіпу́чы

boiling point тэмпэрату́ра кіпе́ньня

boiling water вар -у *m.*

boisterous ['bɔistərəs] adj. 1. шу́мна вясёлы: ***boisterous laughter*** гу́чны вясёлы сьмех. 2. гвалто́ўны, бу́рны; неспако́йны: ***a boisterous wind*** гвалто́ўны ве́цер; ***a boisterous child*** неспако́йнае дзіця́, распу́сьнік

bold [bould] – adj. 1. адважны, сьме́лы, дзёрзкі: ***a bold explorer*** адва́жны дасьле́днік; ***a bold plan*** адважны плян. 2. наха́бны, бессаро́мны; бесцырымо́нны. 3. выра́зны (*пра по́чырк*). 4. стро́мкі, стро́мы; рэ́зкі: ***bold cliffs*** стро́мыя ска́лы, стро́мы. 5. то́ўсты, тлу́сты
– n., Print тлу́сты шрыфт
• ***make bold*** дазво́ліць сабе́; адва́жыцца

bold-faced ['bouldfeist] adj. 1. наха́бны; бессаро́мны: ***a bold-faced lie*** бессаро́мная хлусьня́. 2. а) тлу́сты (*пра шрыфт*). б) набра́ны тлу́стым шры́фтам

boldly ['bouldli] adv. 1. адва́жна. 2. наха́бна, бессаро́мна

boldness ['bouldnəs] n. 1. адва́га *f.* 2. наха́бства *n.*, бесцырымо́ннасьць *f.*

bole [boul] n. камле́ль -ля́ *m.* (*дрэ́ва*)

bolero [bə'lerou] n., pl. **-ros** а) балеро́ (*гішпа́нскі та́нец і му́зыка*). б) каро́ткі жаке́цік

boll [boul] n., Bot. насе́нная гало́ўка (*лёну або́ бавоўны*)

bologna [bə'lounjə] n. балёнская каўбаса́

boloney [bə'louni] n., esp. Brit. *гл.* **baloney**

Bolshevik or **bolshevik** ['boulʃəvik] – n. бальшаві́к -а́ *m.*
– adj. бальшаві́цкі

Bolshevism ['boulʃəvizəm] n. 1. бальшаві́зм -у *m.* 2. кра́йні радыкалі́зм -у *m.*

bolt I [boult] – n. 1. шво́ран -а *m.*, болт балта́ *m.*, ніт -а́ *m.* 2. а) за́саўка, зава́ла *f.* (*на дзьвяра́х*). б) замо́к (*у па́льнай зброі*). 3. се́рца *n.*, язы́к -а́ *m.* (*у замку́*). 4. страла́ *f.* 5. мала́нка *f.* 6. уцёкі *pl.*, раптоўны зрыў: ***to make a bolt (for)*** кі́нуцца на ўцёкі, уцячы́. 7. сувой палатна́ *або́* шпале́раў
– v.t. 1. зачыня́ць на за́саўку (*дзьве́ры*); нітава́ць, браць на ніт. 2. вы́паліць, сказа́ць насьпе́х, ля́пнуць. 3. глыта́ць не пражава́ўшы, е́сьці насьпе́х. 4. скру́чваць тканіну (шпале́ры) у сувой
– v.i. 1. кі́дацца на ўцёкі, рва́цца; зрыва́цца: ***The horse bolted*** Конь рвану́ўся. 2. ху́тка йсьці́ ў стаўпа́к (*пра насе́ньне ці расьлі́ну*)
– adv. раптоўна
• ***bolt from the blue*** гром зь я́снага не́ба; нечака́нае здарэ́ньне; неспадзе́ўка
• ***bolt upright*** про́ста, як стралою́, угару́

bolt II [boult] v.t. 1. се́яць (*сі́там*), расе́йваць. 2. Figur. дакла́дна правяра́ць, аддзяля́ць

boltage ['boultidʒ] n. расе́йваньне *n.* (*мукі́*)

bolter I ['boultər] n. 1. зьбе́глы конь. 2. чалаве́к, які́ адыйшо́ў ад сваі́ па́ртыі

bolter II ['boultər] n. сі́та -а *n.*, машы́на для прасе́йваньня

bomb [bɑ:m] – n. 1. бо́мба *f.* 2. Figur. нечака́нае здарэ́ньне, пры́края неспадзе́ўка. 3. Geol. вялі́кая ма́са ля́вы, вы́кінутая з вулка́ну
– v. бамбі́ць, бамбава́ць, кі́даць бо́мбы

bombard [bɑ:m'bɑ:rd] – v.t. 1. мо́цна абстрэ́льваць з гарма́таў, бамбарава́ць. 2. скіда́ць з самалёта бо́мбы, бамбі́ць, бамбава́ць. 3. Figur. мо́цна атакава́ць пыта́ньнямі, за́кідамі
– n. ['bɑ:mbærd] 1. бамба́рда *f.* 2. бамбаві́к -а́ *m.* (*самалёт*)

bombardier [ˌbɑ:mbər'dɪr] n. 1. бамбаві́к -а́ *m.* (*лётнік*). 2. Brit. капра́л у брыта́нскай артыле́рыі, ста́ршы канані́р

bombardment [ˌbɑ:m'bɑ:rdmənt] n. абстрэ́л -у *m.* (*з гарма́таў*); бамбава́ньне *n.*

bombardon [ˌbɑ:m'bɑ:rdən] n. бамбардо́н -у *m.* (*музы́чны духавы́ інструме́нт*)

bombast ['bɑ:mbæst] n. 1. а) напы́шлівая мо́ва, высакамо́ўнасьць *f.* б) перабо́льшаньне *n.* 2. ва́та для падкла́дкі (*да во́праткі*)

bombastic [bɑ:m'bæstɪk] adj. высакамо́ўны, напы́шлівы, рытары́чны

bombazine [ˌbɑ:mbə'zi:n] n. бамбазі́н -у *m.* (*тканіна*)

bomber ['bɑ:mər] n. 1. бамбавоз -у *m.*, бамбаві́к -а́ *m.* 2. бамбаві́к (*лётнік*)

bombproof ['bɑ:mpru:f] – adj. непрабіва́льны бо́мбамі *або́* снара́дамі
– n. бамбасхо́вішча *n.*

bombshell ['bɑ:mʃel] n. 1. бо́мба *f.* 2. Figur. нечака́нае здарэ́ньне, непрые́мная неспадзе́ўка

bombshelter ['bɑ:mʃeltər] n. бамбасхо́вішча *n.*

bona fide [ˌbounə'faɪdi] adj. з до́брай ве́рай, дабраду́шны; праўдзі́вы

bonanza [bə'nænzə] n. 1. бага́тыя за́лежы руды́ ў ша́хце. 2. Informal крыні́ца вялі́кіх прыбы́ткаў

bond I [bɑ:nd] – n. 1. су́вязь *f.*; по́вязі *pl. only*: ***a bond of friendship*** мо́цная сяброўская по́вязь; ***a bond of blood*** кро́ўныя по́вязі. 2. аблі́га́цыя *f.*, бо́ны *pl. only*. 3. піса́нае абавяза́ньне; умо́ва *f.* 4. паручы́цель -я *m.*, паручы́целька *f.* 5. вя́жучае рэ́чыва: ***Cement is the bond in concrete*** Цэме́нт — вя́жучае рэ́чыва ў бэто́не
– v.t. 1. а) выпуска́ць бо́ны. 2. закла́дваць ма́емасьць. 3. зьвя́зваць, спалуча́ць
• ***bonds*** а) пу́ты *pl.*; ланцугі́; кайданы́, ако́вы *pl. only*. б) вастро́г -у *m.*, зьняво́леньне *n.*
• ***in bond*** затрыма́ны да апла́ты мы́та (*пра тавар*)

bond II [bɑ:nd] n., Archaic прыго́нны -ага *m.*; прыго́нная *f.*

bondage ['bɑ:ndɪdʒ] n. 1. няво́ля *f.*, прыго́н -у *m.* 2. зале́жнасьць *f.*: ***The drunkard is in bondage to alcohol*** П'я́ніца — няво́льнік алькаго́лю

bonded ['bɑ:ndɪd] adj. 1. забясьпе́чаны бо́намі (*пра доўг*). 2. затрыма́ны да ўпла́ты мы́та: ***bonded goods*** тавар, затрыма́ны на мы́тні да ўпла́ты мы́та

bonded warehouse мы́тны склад

bondholder ['bɑ:ndhouldər] n. трыма́льнік аблі́га́цыяў, бо́наў

bondmaid ['bɑ:ndmeɪd] n. няво́льніца *f.*; прыго́ньніца *f.*

bond(s)man ['bɑ:ndmən] n., pl. **-men** 1. няво́льнік -а *m.* 2. прыго́нны -ага *m.*

bone [boun] – n. 1. косьць *f.* 2. слано́вая косьць, кіто́вы вус. 3. прадме́т з ко́сьці, слано́вае ко́сьці, кіто́вага ву́са
– v.t. 1. выма́ць ко́сьці (*зь мя́са ці ры́бы*). 2. ужыва́ць ко́сткі (*ў гарсэ́це*)
– v.i., Sl. мо́цна вучы́цца, зубры́ць: ***to bone up on algebra*** зубры́ць а́льгебру; до́бра апанава́ць а́льгебру
• ***feel in one's bones*** мець пэ́ўнае прадчува́ньне, быць пэ́ўным *чаго́*
• ***have a bone to pick*** мець прычы́ну спрача́цца *або́* нарака́ць
• ***near the bone*** а) ве́льмі патрабава́льны. б) ама́ль непрысто́йны
• ***throw a bone*** кі́нуць ко́стку, заспако́іць

• ***to the bone*** а) да ко́сьці. б) да мі́німуму: ***to cut prices to the bone*** зьні́зіць цэ́ны да мі́німуму

bone china парцаля́на *f.*

bone-dry ['bounˌdraɪ] adj. ве́льмі сухі́

bonehead ['bounhed] n., Sl. ду́рань -ня *m.*, тупі́ца -ы *m. & f.*

boneless ['bounləs] adj. 1. без касьце́й. 2. бесхара́ктарны, бесхрыбе́тны; слабы́; баязьлі́вы, трусьлі́вы

bone of contention прычы́на сва́ркі, разла́ду; я́блык разла́ду

bone powder касьцяна́я мука́ (*для ўгнае́ньня*)

boner ['bounər] n., Sl. дурна́я памы́лка

bonfire ['bɑ:nˌfaɪr] n. во́гнішча *n.*; аго́нь, агню́ *m.*; цяпло́, цяпе́льца *n.*

bonnet ['bɑ:nɪt] – n. 1. капту́р -а́ *m.*, капту́рок -ка́ *m.* (*дзіця́чы або́ жано́чы*). 2. мужчы́нская шко́цкая ша́пачка. 3. індыя́нскі галаўны́ ўбо́р зь пёраў. 4. esp. Brit. капо́т -а *m.* (*машы́ны*)
– v.t. надзява́ць ша́пку

bon ton [bɑ:n'tɔ:n] n., French до́бры тон

bonus ['bounəs] n. 1. дада́так -ку *m.* (*асабліва да зарпла́ты*). 2. прэ́мія *f.*

bony ['bouni] adj. **-ier, -iest** 1. касьцяны́; касьці́сты: ***bony fish*** касьці́стая ры́ба. 2. худы́

boo [bu:] – n., interj. во́кліч неўхвале́ньня, асуджэ́ньня, непрыхі́льнасьці
– v.i. кі́даць во́клічы асуджэ́ньня
– v.t. асьві́ставаць

booby trap 1. падкла́дзеная мі́на *або́* бо́мба. 2. па́стка *f.*; падстро́еная шту́чка

boodle ['bu:dəl] – n., Sl., 1. ха́барніцтва *n.*, ха́бар -у *m.*; по́дкуп -у *m.* 2. нато́ўп -у *m.*, збо́рышча *n.*
– v. браць ха́бар; дава́ць ха́бар; падкупля́ць

book [buk] – n. 1. кні́га, кні́жка *f.*; кні́га для вядзе́ньня раху́нкаў. 2. том -у *m.*; ча́стка *f.* (*кні́гі*): ***the books of the Bible*** кні́гі Бі́бліі. 3. а) лібрэ́та, *indecl., n.* (*сло́ўны тэкст о́пэры, апэрэ́ты*). б) тэкст п'е́сы. 4. за́пісы закла́даў (*на ко́нскіх ска́чках*). 5. кні́жачка *f.*: ***a book of tickets*** кні́жачка біле́таў
– v.t. 1. запі́сваць у кні́гу, у сьпіс. 2. замаўля́ць, запі́сваць: ***to book a seat on the plane*** заказа́ць ме́сца (*у самалёце*); ***to book a passenger*** запіса́ць у сьпіс пасажы́раў. 3. ангажава́ць: ***The lecturer is booked for two nights*** Ле́ктар запро́шаны на два вечары́
– adj. кніжны: ***book learning*** кні́жныя ве́ды

• ***book in*** упіса́цца ў кні́гу

• ***bring to book*** а) дамага́цца тлумачэ́ньня. б) дава́ць нага́ну

• ***by the book*** па ўсіх пра́вілах

• ***close the books*** а) закры́ць раху́нак; падве́сьці канчатко́вы баля́нс. б) зако́нчыць, даве́сьці да канца

• ***in one's book,*** Informal павóдле не́чае ду́мкі: ***in one's bad (good) books*** мець у не́кага благу́ю (до́брую) рэпута́цыю, быць у няла́сцы (у ла́сцы)

• ***keep a book*** ве́сьці раху́нкі закла́даў (*асабліва на ко́ней*)

• ***keep books*** ве́сьці кні́гі раху́нкаў

• ***like a book*** дакла́дна; навылёт; наскро́зь: ***I know him like a book*** Я зна́ю яго́ ве́льмі до́бра

• ***on the books*** у сьпі́се

• ***the Book*** Бі́блія *f.*

• ***throw the book at,*** Sl. прысудзі́ць найвышэ́йшую ка́ру

• ***without book*** а) напа́мяць, без чыта́ньня, без папе́ркі

bookbinder ['bukˌbaɪndər] n. 1. пераплётнік -а *m.*, пераплётніца *f.* 2. ско́расшыва́льнік -а *m.* (*па́пка*)

bookbindery ['bukˌbaɪndəri] n., pl. **-eries** пераплётная майстэ́рня

bookbinding ['bukˌbaɪndɪŋ] n. пераплята́ньне *n.*; пераплётніцкая вытво́рчасьць, пераплётніцкая спра́ва

bookcase ['bukkeɪs] n. кні́жная ша́фа, этажэ́рка *f.*

book club кні́жны клюб

booked [bukt] adj. 1. заказа́ны, замо́ўлены. 2. заня́ты

bookends канцавы́я падпо́ркі для кні́г

booking ['bukɪŋ] n. 1. закантрактава́ньне *n.* (*арты́ста*). 2. зака́з на ме́сца на самалёт, у гатэ́лі

booking agent 1. білéтны агéнт. 2. агéнт, адміністрáтар артыстаў
book label кнíжны знак, эксліброс -у *m.*
booklearned ['bʊklɜ:rnəd] adj. кнíжны, вýчаны па кнíгах
book jacket супэрвóкладка *f.*
bookkeeper ['bʊkˌki:pər] n. рахункавóд, бухгáльтар -а *m.*
bookkeeping ['bʊkˌki:pɪŋ] n. рахункавóдзтва *n.*, бухгáльтарскі ýлíк
bookless ['bʊkləs] adj. 1. бяз кнíгі, бяз кнíгаў: ***A bookless house isn't a real home*** Дом бяз кнíгаў ня ёсьць сапрáўдным дóмам. 2. неасьвéчаны, неадукавáны
booklet ['bʊklət] n. брашýра, кнíжачка *f.*
bookman ['bʊkmən] n., pl. **-men** 1. літарáтар -а *m.*; вучóны -ага *m.*; студэ́нт -а *m.* 2. Informal кнігапрадаўвéц -ýцá *m.*; рэдáктар -а, выдаўвéц -ýцá *m.*
bookmark ['bʊkmɑ:rk] n. закладáдка *f.* (*у кнíзе*)
book matches запáлкі ў кардóннай вóкладцы
book review рэцэ́нзія на кнíгу
book reviewer рэцэнзэ́нт -а *m.*
bookseller ['bʊkˌselər] n. кнігáр -á *m.*, кнігапрадаўвéц -ýцá *m.*
bookshelf ['bʊkʃelf] n., pl. **-shelves** кнíжная палíца
bookshop ['bʊkʃɑ:p] n. кнігáрня *f.*
bookstack ['bʊkstæk] n. кніжны стэлáж (*у бібліятэ́цы*)
bookstall ['bʊkstɔ:l] n. кніжны шáпік
bookstore ['bʊkstɔ:r] n. кнігáрня *f.*
bookworm ['bʊkwɜ:rm] n. 1. «кнігаéд», чалавéк, які́ любíць чытáць, кнíжнік -а *m.* 2. кнíжная моль
boom [bu:m] – n. 1. гул -у *m.* (*стрэ́лу, званóў*). 2. эканамíчны ýздым, бум -у *m.*; раптóўны рост, разьвіцьцё. 3. узрóст папуля́рнасьці
– v.i. 1. гудзéць, грымéць. 2. хýтка расьці́, разьвівáцца; перажываць уздым: ***Business is booming*** Гáндаль раптóўна разьвівáецца
• ***boom-and-bust*** [ˌbu:mənˈbʌst] Informal ненармáльна хýткі рост, па якíм прыхóдзіць спад
• ***boom times*** часы́ ўздыму й рóсквіту
boomerang ['bu:məræŋ] n. бумэрáнг -а *m.*
boon I [bu:n] n. дар -у *m.*; выгада, карысьць *f.*
boon II [bu:n] adj. 1. вясёлы. 2. Poet. блíзкі па душы́, вéльмі мíлы, прыéмны, вéтлы: ***a boon companion*** вясёлы кампаньён, ся́бра
boon III [bu:n] n. кастры́ца *f.* (*лёну*)
boor [bʊr] n. грубія́н -а *m.*, грубія́нка *f.*; некультýрны, нявы́хаваны чалавéк
boorish ['bʊrɪʃ] adj. 1. некультýрны; прóсты; грубія́нскі. 2. нехлямя́жы
boost [bu:st] – n. 1. рэклямавáньне *n.*, агітáцыя за *каго́*, падтры́мка *f.* 2. павышэ́ньне *n.*: ***a boost in prices*** павышэ́ньне цэ́наў
– v.t. 1. паднімáць; падпіхáць. 2. падтры́мваць, агітавáць за: ***to boost a candidate*** агітавáць за кандыдáта. 3. збóльшваць, павышáць: ***to boost sales*** павы́сіць прóдаж тавáру
– v.i. давáць падтры́мку
booster [bu:stər] n. 1. Electr. дадаткóвы генэрáтар. 2. Informal энтузіястычны прыхíльнік
• ***booster shot*** паўтóрная ін'ёкцыя
boot [bu:t] – n. 1. бот -а *m.*, чóбат -а *m.*, чаравíк вышэ́й кóсткі. 2. калóдкі *pl.* (*прылáда катавáньня*). 3. Brit. багáжнік -а *m.* (*у áўце*). 4. запóна *f.*
– v.t. 1. абувáць (*бóты*). 2. Sl. давáць высьпя́тка (*нагóю*). 3. а) Baseball прамахнýцца. б) Sl. празявáць нагóду. 4. Informal пазбывáцца; звальня́ць. 5. Comput. запускáць, загружáць
• ***bet your boots*** будзь пэ́ўны
• ***die with one's boots on*** памéрці ў баí, на вáрце
• ***lick the boots of*** лізáць бóты, падлíзвацца
• ***the boot,*** Sl. звальнéньне *n.*
• ***to boot*** на дадáтак; апрачá
bootblack ['bu:tblæk] n. чысьцíльнік бóтаў

bootee [bu:ˈti:] n. 1. дзіця́чы бо́цік (*ча́ста плі́цены*). 2. да́мскі каро́ткі бот

booth [bu:θ] n., pl. **booths** 1. ша́пік -а, кіёск -а, латло́к -ка́ *m.* 2. тэлефо́нная бу́дка. 3. кабі́на для галасава́ньня. 4. асо́бная адгаро́дка (*у рэстара́не*)

bootjack [ˈbu:tdʒæk] n. прыла́да да сьця́гваньня бо́таў

bootlace [ˈbu:tleɪs], n. матузы́ ў чарані́ках

bootleg [ˈbu:tleg] – v. гнаць самаго́нку
– adj. нелега́льна ро́блены, прадава́ны, самаго́нны
– n. самаго́нка *f.*

bootlegger [ˈbu:tlegər] n. чалаве́к, які́ го́ніць самаго́нку

bootless I [ˈbu:tləs] adj. бяз бо́таў, бо́сы

bootless II [ˈbu:tləs] adj. бескары́сны, непрыда́тны; няўда́лы: ***bootless effort*** бескары́сныя нату́гі

bootlick [ˈbu:tlɪk] Sl., v.t. падлі́звацца, падхалі́мнічаць

bootlicker [ˈbu:tlɪkər] n., Sl. падхалі́м -а *m.*, падлі́за *m. & f.*

boots [bu:ts] n., Brit. хлапе́ц на паслу́гах у гатэ́лі

boots and saddles сыгна́л сяда́ць на каня́

bootmaker [ˈbu:tmeɪkər] n. шаве́ц -ўца́ *m.*

booty [ˈbu:ti] n., pl. **-ties** 1. вае́нная здабы́ча, трафэ́й -ю *m.* 2. кра́дзеныя гро́шы *або́* рэ́чы; нарабава́нае *n.*

boozy [ˈbu:zi] adj., Informal 1. п'я́ны. 2. які́ лю́біць ча́ста выпіва́ць

booze [bu:z] – n., Informal 1. алькаго́ль -ю *m.* 2. п'я́нства *n.*; папо́йка *f.*
– v.i. мо́цна піць, напіва́цца

boracic [bəˈræsɪk] adj. *гл.* **boric**

borax [ˈbɔ:ræks] n., Chem. бура́кс -у *m.*

Bordeaux [bɔ:rˈdou] n. бардо́, *indecl., n.*

bordello [bɔ:rˈdelou] n. публі́чны дом

border [ˈbɔ:rdər] – n. 1. мяжа́, грані́ца *f.* 2. краі́й -ю *m., dim.*, краёчлак -ка *m.*, бе́раг, бок -у *m.*: узьбярэ́жжа *n.*: ***on the border of a lake*** на бе́разе во́зера. 3. шляк -а́ *m.*, шлячло́к -ка́ *m., dim.*; беражло́к -ка́ *m.*; аблямо́ўка *f.*
– v.t. 1. абрамля́ць, абкружа́ць; аблямо́ўваць, абшыва́ць; абса́джваць: ***We have bordered our lawn with shrubs*** Мы абсадзі́лі наш двор куста́мі. 2. абво́дзіць мяжо́ю
• ***border on/upon*** а) межава́ць, быць на мяжы́ *чаго́* б) быць бліскім да *чаго́*: ***to border on the ridiculous*** быць на мяжы́ сьме́шнага, дахо́дзіць да сьме́шнага
• ***the border*** паграні́чная паласа́ паміж Злу́чанымі Шта́тамі і Кана́дай *або́* Мэ́ксыкай

borderland [ˈbɔ:rdərlænd] n. 1. паграні́чная паласа́. 2. паласа́ няпэ́ўнасьці, прамэ́жкавая зо́на

borderless [ˈbɔ:rdərləs] adj. бязь ме́жаў; бязьме́жны

borderline [ˈbɔ:rdərlaɪn] – n. мяжа́ *f.*; лі́нія, яка́я разьдзяля́е; лі́нія падзе́лу
– adj. 1. на мяжы́, суме́жны. 2. прамэ́жкавы

bore I [bɔ:r] – v.i. 1. сьвідрава́ць, перакру́чваць. 2. быць пада́тным на сьвідрава́ньне: ***This wood bores well*** Гэ́тае дрэ́ва лёгка сьвідру́ецца. 3. прабіва́ць, прапіха́ць напе́рад
– v.t. 1. сьвідрава́ць дзі́рку. 2. пако́пваць; прабіва́ць (*тунэ́ль*). 3. бурыць, сьвідрава́ць углы́б, прабіва́ць грунт. 4. прапіха́ць, прабіва́ць сабе́ даро́гу
– n. прасьвідрава́ная адту́ліна, дзі́рка

bore II [bɔ:r] – v.t. 1. апры́краць, надаку́чваць: ***He bores me to death*** Ён надаку́чыў мне да сьме́рці; ***I am bored*** Мне ну́дна
– n. ну́дны, надаку́члівы чалаве́к *або́* заня́так

bore III [bɔ:r] v., p.t. of **bear I**

bore IV [bɔ:r] n. мо́цны акія́нскі прылі́ў

boredom [ˈbɔ:rdəm] n. нуда́, нудо́та, туга́ *f.*

borer [ˈbɔ:rər] n. 1. сьве́рдзел -а *m.*, бур -а *m.*, сьвярдзёлак -ка *m.* 2. бор -а *m.*, зубны́ сьве́рдзел. 3. сьвідро́ўнік -а *m.*, бурави́к -а́ *m.* 4. ша́шаль -я

boresome [ˈbɔ:rsʌm] adj. ну́дны, надаку́члівы

boric [ˈbɔ:rɪk] adj. бо́рны

boric acid бо́рная кіслата́

boring I ['bɔ:rɪŋ] n. 1. прабіва́ньне, сьвідрава́ньне, бурэ́ньне *n.* 2. бурава́я шчы́ліна
• ***borings*** стру́жка пры сьвідрава́ньні
boring II ['bɔ:rɪŋ] adj. ну́дны, надаку́члівы, сто́мны
born [bɔ:rn] – adj. 1. наро́джаны. 2. прыро́джаны (*тале́нт, паэ́т*), прыро́дны: ***a born poet*** прыро́джаны паэ́т
– v., p.p. of **bear**
borne [bɔ:rn] v., *p.p. of* **bear I**: ***I have borne it as long as I can*** Я цярпе́ла гэ́та, пакуль магла́; ***She had borne five children*** Яна́ нарадзі́ла пяцяры́х дзяце́й
boron ['bɔ:rɑ:n] n., Chem. бор -у *m.*
borough ['bɜ:roʊ] n. 1. го́рад (*з по́ўным самаўра́дам*). 2. гарадскі́ раён. 3. малы́ го́рад, мястэ́чка
borrow ['bɔ:roʊ] v.t. 1. пазыча́ць: ***to borrow money*** пазыча́ць гро́шы; ***to borrow books from the library*** пазыча́ць зь бібліятэ́кі кні́гі. 2. запазыча́ць, перайма́ць: ***Rome borrowed many ideas from Greece*** Рым запазы́чыў шмат ідэ́яў ад Грэ́цыі. 3. Math. (*пры адні́ма́ньні*) пазыча́ць
• ***borrow trouble*** перайма́цца за́гадзя
borrowable ['bɔ:roʊəbəl] adj. пазыча́льны, пазыко́вы: ***borrowable fund*** пазыко́вы фонд
borrower ['bɔ:roʊər] n. 1. чалаве́к, які́ пазыча́е. 2. плягія́тар -а *m.*
borrowing ['bɔ:roʊɪŋ] n. 1. пазыча́ньне *n.* 2. запазы́чваньне, перайма́ньне *n.* 3. запазы́чаньне *n.*
bort [bɔ:rt] n. другара́дны гату́нак дыяма́нту; абрэ́зкі пры рэ́заньні дыяма́нту
borzoi ['bɔ:rzɔɪ] n. хорт харта́ *m.* (*паляўні́чы саба́ка*)
boscage ['bɑ:skɪdʒ] n., Poet. за́расьнік, гушча́р -у, гаі́й -ю *m.*
bosh [bɑ:ʃ] n., interj., Informal лухта́; глу́пства
bosk [bɑ:sk] n. гаі́й -ю *m.*; малы́ лясо́к; за́расьнік -у *m.*
bosky ['bɑ:ski] adj. 1. заро́слы дрэ́вамі, куста́мі; лясі́сты. 2. Poet. цяні́сты

Bosnian ['bɑ:zniən] – adj. басьні́йскі – n. жыха́р Бо́сьніі, басьні́ец -йца *m.*, басьні́йка *f.*
bosom ['bʊzəm] – n. 1. гру́дзі, *pl. only*; ло́на *n.* 2. грудзі́на *f.* (*кашу́лі, блю́зкі*). 3. па́зуха *f.*: ***in one's bosom*** за па́зухай (*трыма́ць*), за па́зуху (*кла́сьці*). 4. ло́на *n.*: ***in the bosom of one's family*** у ко́ле сваé сям'і́. 5. сэ́рцыа *n.*, ду́мкі, пачу́цьці *pl.* 6. абды́мкі *pl. only.*
– adj. сардэ́чны: ***bosom friend*** сардэ́чны, неразлу́чны ся́бра
– v.t. 1. прытуля́ць да ўло́ньня, прыла́шчваць, прыгалу́бваць; абдыма́ць. 2. пяле́гаваць; пе́сьціць, хава́ць у сэ́рцы (*надзе́ю*)
bosomy ['bʊzəmi] adj. зь вялі́кімі грудзьмі́
boss I [bɔ:s] – n. 1. гаспада́р -а́, нагля́дчык -а *m.*, старэ́йшы працаўні́к; ма́йстрыа -ы *m.* 2. нача́льнік, бос -а *m.*
– v.t. быць гаспадаро́м; кірава́ць, загада́ваць
– adj. 1. галоўны; вядучы; кіру́ючы
boss II [bɔ:s] – n. 1. рэльэ́фны арна́мэнт са сэ́бра, слано́вае ко́сьці. 2. гуз -а *m.*; вы́пукласьць *f.* 3. Geol. ку́пальная структу́ра
– v.t. упрыго́жваць рэльэ́фным арнамэ́нтам
bossy I ['bɔ:si] adj. **bossier, -iest,** Informal уладалю́бны; які́ лю́біць загада́ваць; ула́дны, дэспаты́чны
bossy II ['bɔ:si] adj. 1. удэкарава́ны рэльэ́фнымі аздо́бамі. 2. вы́пуклы, як гуз; гузава́ты
botanic [bə'tænɪk] or **botanical** [bə'tænɪkəl] – adj. батані́чны
– n. зёлкавы лек
botanical garden батані́чны сад
botanist ['bɑ:tənəst] n. бата́нік -а *m.*
botany ['bɑ:təni] n., pl. **-nies** бата́ніка *f.* 2. расьлі́ннасьць *f.*: ***the botany of Palessie*** расьлі́ннасьць Пале́сься
botch [bɑ:tʃ] – v.t. 1. парта́чыць, псава́ць. 2. неакура́тна ла́таць *або́* зашыва́ць
– n. 1. бла́га вы́кананая рабо́та. 2. ла́та *f.*

botfly ['bɑ:tflaɪ] n., pl. **-flies** авадзе́нь -дня́ *m.*

both [bəʊθ] – adj., pron. або́два -ух *m. & n.*; абе́дзьве *f.*, або́е, абаі́х: ***both houses*** або́два дамы́; ***both brothers*** або́два браты́; ***both sisters*** абе́дзьве сястры́; ***they both (brother and sister)*** яны́ або́е; ***Both of them are doctors*** Або́два яны́ — дактары́
– adv. ра́зам, гэ́так жа: ***He fears and hopes both at once*** Ён баі́цца й аднача́сна спадзяе́цца
– conj. як... так і; да таго́ ж, і... і: ***He is both tired and hungry*** Ён і змарыўся і галодны

bother ['bɑ:ðər] – n. 1. турбо́та *f.*; кло́пат -у *m.*, даку́ка *f.* 2. назо́ла *f.* (*пра чалаве́ка*)
– v.t. 1. дакуча́ць; дурыць галаву́; назаля́ць, турбава́ць. 2. непако́іць, хвалява́ць
– v.i. турбава́цца, непако́іцца

bothering ['bɑ:ðərɪŋ] adj. турбо́тны; даку́члівы

bothersome ['bɑ:ðərsʌm] adj. турбо́тны; даку́члівы; назо́льны

bott [bɑ:t] n. ля́рва авадня́

bottle ['bɑ:təl] – n. пля́шка, буты́лька *f.*
– v.t. налива́ць у буты́льку, трыма́ць у буты́льках
• ***bottle up*** паўстрыма́ць, апанава́ць: ***to bottle up one's anger*** апанава́ць сваю́ злосьць
• ***hit the bottle,*** Sl. а) піць гары́лку. б) напіва́цца
• ***the bottle*** буты́лька алкаго́льнага напо́ю

bottlebrush ['bɑ:təlbrʌʃ] n., Bot. хвошч, хвашчу́ *m.*

bottleneck ['bɑ:təlnek] n. 1. ры́льца буты́лькі. 2. ву́зкі прахо́д *або́* ву́ліца. 3. зато́р -у *m.*; перашко́да *f.*

bottom ['bɑ:təm] – n. 1. дно *n.*, спод -у *m.*; дні́шча *n.*: ***at the bottom of the basket*** на спо́дзе ко́шыка; ***the bottom of the sea (river)*** марско́е дно (дно ракі́). 2. ***bottoms*** нізы́, нізі́на *або́* лагчы́на паўз раку́. 3. сядзе́ньне (*крэ́сла*). 4. падста́ва *f.*, фунда́мэнт -у *m.*; крыні́ца *f.*; су́тнасьць *f.*: ***We must get to the bottom of the mystery*** Мы му́сім раскры́ць таямні́цу. 5. Informal аза́дак -ка *m.* 6. кіль -я *m.*
– v.t. 1. устаўля́ць сядзе́ньне (*у крэ́сла*). 2. устаўля́ць дно, задні́ць (*бо́чку*). 3. дайсьці́ да дна; ца́лкам зразуме́ць. 4. будава́ць, ста́віць на падму́рку; апіра́ць на *чым*
– v.i. 1. стая́ць на падму́рку; абапіра́цца. 2. дакрана́цца да дна
– adj. 1. найніжэ́йшы; апо́шні: ***bottom prices*** найніжэ́йшыя цэ́ны; ***He spent his bottom dollar*** Ён вы́даў свой апо́шні даля́р. 2. фундамэнта́льны. 3. до́нны: ***bottom life in the ocean*** жыцьцё на дне акія́ну
• ***at bottom*** у асно́ўным; па су́тнасьці
• ***be at the bottom of*** быць запра́ўднай крыні́цай *або́* прычы́най *чаго́*
• ***bottom up*** дагары́ нага́мі
• ***Bottoms up!*** Informal Да дна! (*вы́піць*)
• ***knock the bottom out of*** зрабі́ць непрыда́тным; зьнішто́жыць
• ***scrape the bottom of the barrel*** дайсьці́ да дна

bottomless ['bɑ:təmləs] adj. 1. а) бяз дна *ці* сядзе́ньня. б) Figur. беспадста́ўны, неабгрунтава́ны. 2. а) непаме́рна глыбо́кі, бязло́нны. б) Figur. недаступны для ро́зуму, невытлумача́льны

botulism ['bɑ:tʃəˌlɪzəm] n. батулі́зм -у *m.*

boudoir ['bu:dwɑ:r] n. будуа́р -а *m.*

bough [baʊ] n. галі́на *f.*, сук -а́ *m.*

bought I [bɔ:t] n. 1. згін -у *m.*, крывізна́ *f.*, зьві́ліна *f.* 2. пятля́ (*зь вяро́ўкі*), скру́так (*вяро́ўкі, сьпіра́лі*)

bought II [bɔ:t] v., *p.t. and p.p. of* **buy**

bouillon ['bʊljɑ:n] n. булён -у *m.*: ***bouillon cubes*** булённыя ку́бікі

boulder ['bəʊldər] n. валу́н -а́ *m.*

boulevard ['bʊləvɑ:rd] n. бульва́р -у *m.*

bounce [baʊns] – v.i. 1. падско́кваць (*як мя́чык*), адбіва́цца, адско́кваць. 2.

ускóкваць: ***bounce into the room*** ускóчыць, уляцéць у пакóй. 3. падскóкваць, скакáць. 4. Sl. (*пра чэк*) быць вéрнутым бáнкам дзéля недахóпу пакрыцьця́
– v.t. 1. падбівáць (*мя́чык, каб скакáў*); гóцаць, падкідáць (*дзіця́*). 2. Sl. выкідáць, звальня́ць з прáцы
– n. 1. падскóк -у *m.*, адбіцьцё *n.*, падскóкваньне *n.* 2. выхваля́ньне *n.*, хвальбá *f.*, самахвáльства *n.* 3. Informal жыцьцяздóльнасьць, энэ́ргія *f.*: ***to be full of bounce*** быць пóўным жыцьця́ й энэ́ргіі. 4. Sl. звальнéньне з прáцы: ***to get the bounce*** быць звóльненым з прáцы. 5. цяжкí ўдáр
• ***bounce back*** пачáць нáнава пасьля́ няўдáчы

bouncer ['baunsər] n. 1. скакýн -á *m.* 2. нéшта вéльмі вялíкае. 3. Informal хвалькló -а *m. & f.*; самахвáл -а *m.*, самахвáлка *f.* 4. плáтны выкідáла -ы *m.* (*у бáры, гатэ́лі*). 5. Brit., Informal бессарóмная хлусьня́

bouncing ['baunsiŋ] adj. 1. які́ падскóквае. 2. дýжы, здарóвы, энэргíчны: ***a bouncing baby*** здарóвае дзіця́тка; ***bouncing economy*** здарóвая эканóміка

bound I [baund] v., *p.t. and p.p. of* **bind.** adj. 1. пераплéцены, сшы́ты: ***a bound book*** пераплéценая кнíга. 2. зьвя́заны, абавя́заны; змýшаны: ***to be bound by one's promise*** быць зьвя́заным абяцáньнем. 3. Informal рашýчы, станаўкí: ***to be bound to go*** навáжыцца ісьцí
• ***bound up in or with*** а) цéсна зьвя́заны з *чым* б) вéльмі аддáны *камý-чамý*

bound II [baund] – v.i. 1. падскóкваць; скакáць, бéгчы пóдскакам. 2. адбівáцца, адскóкваць
– v.t. падбівáць (*напр. мя́чык*)
– n. адскóк -у *m.*, скачóк упéрад; падскóк -у *m.*: ***With one bound the deer went into the woods*** Адны́м скачкóм казýля шмы́гнула ў лес

bound III [baund] – n. мяжá *f.*, мéжы *pl.*: ***bounds*** а) мéжы. б) абшáр, абня́ты мéжамі: ***out of bounds*** за мяжóю *абó* за лíніяй спартóвай пляцóўкі
– v.t. 1. правóдзіць мяжý, абмяжóўваць. 2. Obsol. абыймáць, улучáць
– v.i. межавáцца
• ***hold within bounds*** трымáць у дысцыплíне
• ***within the bounds of possibility*** у мéжах магчы́масьці

bound IV [baund] adj. 1. у дарóзе; у кірýнку: ***I am bound for home*** Я éду дамóў; ***a train bound for Miensk*** цягнíк на Менск

boundary ['baundəri] n., pl. **-ries** дзяржáўная мяжá; мéжы *pl.*

bounden ['baundən] – adj. вымагáны, абавязкóвы; канéчны: ***one's bounden duty*** канéчны абавя́зак
– v. *p.p. of* **bind** абавя́заны

boundless ['baundləs] adj. бязмéжны; неабмежавáны; бяскрáйні, неабся́жны

boundlessness ['baundləsnəs] n. бязмéжнасьць, бяскрáйнасьць, неабся́жнасьць *f.*

bounteous ['bauntiəs] adj. *гл.* **bountiful**

bountiful ['bauntifəl] adj. 1. шчóдры; нескупы́, ахвя́рны. 2. багáты, дастáтны

bounty ['baunti] n., pl. **-ties** 1. шчóдрасьць *f.* 2. шчóдры дар. 3. узнагарóда *f.*

bouquet [bu'kei] n. 1. букéт -а *m.* (*квéтак*). 2. [bou'kei] пах, вóдар -у *m.* (*віна́*)

bourgeois ['burʒwɑ:] – n., pl. **-geois** мешчанíн -а *m.*, прадстаўнíк сярэ́дняе кля́сы: ***the bourgeois*** сярэ́дняя кля́са, мяшчáнства *n.*, буржуазíя *f.*
– adj. 1. мяшчáнскі, буржуáзны. 2. мяшчáнскі, звычáйны; прóсты: ***bourgeois attitude*** мяшчáнскі падыхóд; ***bourgeois taste*** дрóбнамяшчáнскі густ

bourgeoisie [ˌburʒwɑ:'zi:] n. сярэ́дняя кля́са, буржуазíя *f.*

bourse [burs] n. бíржа *f.*

bout [baut] n. 1. суты́чка *f.*, спабóрніцтва *n.*, дýжаньне *n.*: ***boxing bout*** спа-

бо́рніцтва ў бо́ксе. 2. прыступ -у *m.*: ***a bout of illness*** прыступ хваро́бы; ***drinking bout*** запо́й

boutique [bu:ˈti:k] n. мо́дная кра́мка

boutonniere [ˌbu:tənˈɪr] n. кве́тка ў пяцёльцы

bovine [ˈbouvaɪn] – adj. 1. вало́вы; каро́він. 2. Figur. як вол *ці* каро́ва, а) павольны, тупы́: ***a bovine stare*** тупы́ по́зірк. б) абыя́кавы, флегматы́чны: ***a bovine nature*** флегматы́чная нату́ра

– n. вол *або́* каро́ва

bow I [baʊ] – v.i. 1. кла́няцца: ***He smiled and bowed*** Ён усьміхну́ўся й паклані́ўся. 2. схіля́цца; падпарадко́ўвацца: ***The boy bowed to his parents' wishes*** Хлапе́ц падпара́дкаваўся жада́ньню бацько́ў

– v.t. 1. схіля́ць (*галаву́*): ***to bow one's thanks*** падзя́каваць паклано́нам. 3. віта́ць паклано́нам. 4. згіна́ць; го́рбіць: ***The man was bowed by old age*** Ста́расьць згго́рбіла чалаве́ка

– n. паклон -у *m.*, кіў галавы́

• ***bow and scrape*** быць зана́дта ве́тлівым, уго́длівым, гну́цца ў паклано́нах

• ***bow out*** вы́йсьці, разьвіта́цца

• ***take a bow*** прыня́ць паклано́нам пахвалу́, во́плескі

bow II [bou] – n. 1. лук -а *m.* (*зброя́*). 2. смык -а́ *m.* 3. ву́зел (*ба́нтам*): ***a bow of ribbon*** бант са сту́жкі, ба́нцік -а *m.* 4. дуга́ *f.*, вы́гін -у *m.*

– adj. дугавы́, дугападо́бны; сагну́ты (*у дугу́*), згго́рблены

– v.t. 1. выгіна́ць; згіна́ць (*у дугу́*). 2. ігра́ць на смыкавы́м інструме́нце

– v.i. 1. выгіна́цца, згіна́цца. 2. вадзі́ць смыко́м па стру́нах

• ***have two strings to one's bow*** мець вы́бар не́калькіх магчы́масьцяў для дзе́яньня

bow IV [baʊ] n. нос карабля́, чаўна́ ці самалёту

bow compass кронцы́ркуль -я *m.*

bowdlerize [ˈbaʊdləraɪz] v.t. выкіда́ць з напі́санага непрысто́йныя ўры́ўкі, сло́вы

bowel [ˈbaʊəl] – n. кі́шка *f.*; вантро́бы *pl. only.*

– v.t. патрашы́ць, выма́ць вантро́бы

bowel movement спараже́ньне, пра́ца кішэ́чніка

bowels [ˈbaʊəlz] n., pl. 1. кі́шкі *pl.* 2. Informal то́ўстая кі́шка: ***to move one's bowels*** спаражні́цца. 3. не́тры: ***the bowels of the earth*** не́тры зямлі́

bower I [ˈbaʊər] – n. 1. альта́нка *f.* 2. ле́тнік -у *m.*, ле́цішча *n.*, ха́тка *f.*

– v.t. абса́джваць дрэ́вамі, рабі́ць за́сень

bower II [ˈbaʊər] n. чалаве́к, які́ кланя́ецца *або́* го́рбіцца

bowery I [ˈbaʊəri] adj., Poet. пакры́ты лі́сьцем, ліставы́; лі́сьцевы, лісьцёвы; цяні́сты

bowery II [ˈbaʊəri] n., pl. **-eries** ху́тар -а *m.*

bowie knife [ˈboʊi] паляўні́чы нож

bowing [ˈbaʊɪŋ] **acquaintance** ша́пачнае знаёмства

bowl I [boʊl] n. 1. мі́са *f.*; мі́ска *f.*, мі́сачка *f.*: ***a mixing bowl*** мі́са для мяша́ньня (*це́ста*); ***a bowl of soup*** мі́ска су́пу; ***a bowl of flowers*** ва́за з кве́ткамі. 2. заглыбле́ньне *n.*: ***the bowl of a spoon*** заглыбле́ньне лы́жкі. 3. амфітэа́тар -ра *m.*, стадыён -а *m.* 4. Archaic ча́ша *f.*

bowl II [boʊl] – n. 1. ку́ля (*для гульні́*). 2. Tech. ро́лік -а *m.* , блёк -а *m.*

– v.i. 1. гу́ляць у бо́ўлінг. 2. каці́ць ку́лю. 3. Informal ху́тка й гла́дка пасо́ўвацца напе́рад, каці́ць; ху́тка е́хаць

– v.t. 1. каці́ць ку́лю. 2. кача́ць (*абру́чы*)

• ***bowl down*** зьбі́ць, звалі́ць

• ***bowl over*** а) перакулі́ць. б) Informal зьбянтэ́жыць

bowlegged [ˌboʊˈlegɪd] adj. крывано́гі

bowler [ˈboʊlər] n. 1. гуле́ц у бо́ўлінг. 2. капялю́ш-кацялко́к

bowling [ˈboʊlɪŋ] n. 1. гульня́ бо́ўлінг. 2. гуля́ньне ў ку́лі

bowling alley будзі́нак для гульні́ ў бо́ўлінг; кегельба́н -у *m.*

bowman I ['bəʊmən] n., pl. **-men** лу́чнік -а *m.*, стралóк з лу́ку

bowman II ['bəʊmən] n., pl. **-men** пярэ́дні вясьля́р

bowshot ['bəʊʃɑ:t] n. 1. стрэл з лу́ку. 2. далёкасьць лёту стралы́

bowstring ['bəʊstrɪŋ] n. цецівá лу́ку

bow tie му́шка *f.* (*на шы́ю*)

bow-wow [ˌbaʊ'waʊ] – n. 1. брэх сабáкі, гаў-гаў. 2. сабáчка (*у дзіця́чых апавяда́ньнях*)
– adj., Sl. брахлі́вы; задзі́рлівы
– v.i. брахáць

box I [bɑ:ks] – n. 1. скры́нка, скры́ня *f.*, куфэ́рак-ка *m.*; пáчак -ка *m.*; пу́шка *f.*: ***a box of matches*** пáчак запáлак. 2. лёжа *f.* (*у тэáтры*). 3. бу́дка *f.*: ***a sentry box*** а) вартаўні́чая бу́дка. б) малáя хáтка. 4. кóзлы *pl.* (*сядзе́ньне для фу́рмана*)
– v.t. 1. пакавáць у скры́нкі *або́* пáчкі: ***to box cigars*** укладáць цыгáры ў скры́начкі. 2. Print. выдзяля́ць рáмкамі. 3. баксавáць, біць кулакóм
• ***boxes*** гледачы́ ў лёжы
• ***box up*** запакавáць; трымáць замкну́тым, абмежавáць
• ***Christmas box,*** Brit. каля́дны падару́нак
• ***in a box,*** Informal у цяжкі́м станóвішчы
• ***shooting box,*** Brit. малы́ дóмік для паляўні́чых ці рыбакóў
• ***the box,*** Informal тэлевíзар -а *m.*

box II [bɑ:ks] – n. аплявýха *f.* (*удáр*)
– v.t. даць аплявýху
– v.i. баксавáць з *кім*

box calf хрóмавая цяля́чая скýра

boxcar ['bɑ:ksˌkɑ:r] n. тавáрны вагóн

boxer ['bɑ:ksər] n. 1. пакавáльнік (*у скры́ні*). 2. баксёр -а *m.* (*спартóвец*). 3. баксёр -а *m.* (*парóда сабáкі*)

boxing ['bɑ:ksɪŋ] n. 1. бокс (*спорт*). 2. пакавáльны матэрыя́л. 3. пакавáньне ў скры́нкі. 4. шуфля́да *f.* (*вакнá*)

boxing gloves баксёрскія рукавíцы

box office тэатрáльная кáса

box-office ['bɑ:ksˌɑ:fəs] adj. папуля́рны, прыбыткóвы: ***This concert is a box-office success*** Гэ́ты канцэ́рт прыбыткóвы

box pleat or **plait** падвóйная склáдка (*у спадні́цы*)

box spring рáма са спружы́намі (*у лóжку*)

boy [bɔɪ] – n. 1. хлаплéц -цá *m.*, хлóпlец -ца *m.*, хлóпчык -а *m.*; сын -а *m.* 2. рабóтнік *m.* (*слугá*). 3. маладзён -а *m.* (*пагáрдліва*)
– interj., Informal (*вы́крык зьдзіўлéньня, трывóгі*): ***Boy, isn't it hot!*** Ну ж і гарачыня́!
• ***good boy*** малайчы́на
• ***My boy!*** Хлóпча! Чалавéча!
• ***the boys*** а) сыны́ *pl.* б) мужчы́нскае тавáрыства

boyar [bəʊ'jɑ:r] n. бая́рын -а *m.*, *pl.* бая́ры, радавíты дваранíн

boycott ['bɔɪkɑ:t] – v. байкатавáць
– n. байкóт -у *m.*

boyfriend ['bɔɪfrend] n. 1. кавалéр -а *m.* (*дзяўчы́ны*); блíзкі ся́бра (*хлапцá*). 2. Informal сымпáтыя *f.*

boyhood ['bɔɪhʊd] n. 1. хлапéчыя гады́, малéнства. 2. хлапцы́ *coll.*

boyish ['bɔɪɪʃ] adj. 1. хлапéцкі, хлапéчы, падлéткавы: ***boyish ambition*** хлапéцкія амбíцыі. 2. як хлапéц, як у хлапцá: ***The girl was boyish in her choice of games*** Дзяўчы́на былá як хлапéц у сваíм вы́бары гýльняў. 3. блáзенскі, хлапéчы

Boy Scout скаўт -а *m.*

Boy Scouts скáўцкая арганізáцыя (*для хлапцóў*), скáўтынг -у *m.* (*хлапéцкі*)

bra [brɑ:] n. *гл.* **brassiere**

brace [breɪs] – n. 1. змацавáньне *n.*, скрэ́па *f.*; клямlар -ра *m.*; падпóрка *f.* 2. пáра *f.* (*асабліва дзíчы*): ***a brace of ducks*** качы́ная пáра. 3. кóльба *f.* (*ру́чка сьвярдзёлка*). 4. фігýрная дýжка
– v.t. 1. падмацóўваць; падпірáць. 2. упірáць у *што*. 3. нацягваць, зацiскáць. 4. брáць у фігýрныя дýжкі. 5. ***to brace oneself*** напрýжыць усé сваé сíлы; мужáцца, паддáць сабé адвáгі; ***to brace oneself up to fear*** старáцца перамагчы́ страх

• ***braces*** 1. мэталёвая сьця́жка (*для раўня́ньня зубо́ў*). 2. шле́йкі, падця́жкі *pl. only*
• ***brace up,*** Informal браць сябе́ ў рукі: ***Brace up and begin studying*** Вазьмі́ сябе́ ў ру́кі і пачні́ вучы́цца

bracelet ['breɪslət] n. 1. бранзале́тка *f.*, бранзале́т -а *m.* 2. Sl. кайданы́ *pl. only*

bracing ['breɪsɪŋ] adj. ажыўля́льны, асьвяжа́льны: ***The mountain air was bracing*** Го́рнае паве́тра асьвяжа́ла

bracket ['brækɪt] – n. 1. падпо́рка, падста́ўка *f.* 2. ду́жка *f.* 3. гру́па, катэго́рыя *f.*: ***the lowest income bracket*** гру́па з найніжэ́йшымі дахо́дамі. 4. кансо́ль *f.*
– v.t. 1. падпіра́ць кансо́ляй. 2. браць у ду́жкі. 3. спалуча́ць скрэ́пай. 4. падво́дзіць пад адну́ катэго́рыю: ***Don't brace me with him*** Ня ста́ў мяне зь і́м у адну́ катэго́рыю

brackish ['brækɪʃ] adj. 1. саланава́ты (*вада́*). 2. нясма́чны, непрые́мны

bracteal ['brækti:l] adj. прыкве́ткавы

brad [bræd] n. то́нкі цьвічо́к, штыфцік -а *m.*: ***shoe brads*** цьвічкі́ да бо́таў

bradawl ['brædɔ:l] n. шы́ла *n.*

brag [bræg] – v., **bragged -ging** хваліцца, выхваля́цца: ***to brag of a good car*** хваліцца до́брым самахо́дам
– n. 1. хвальба́ *f.*, самахва́льства *n.* 2. хвалькло́ -а́ *m.*

braggart ['brægərt] – n. 1. выхваля́кла -і *m.*, хвалькло́ -а́ *m.*; самахва́л -а *m.*, самахва́лка *f.*
– adj. які́ выхваля́ецца

braid [breɪd] – n. каса́ *f.* (*з валасо́ў*). 2. та́сьма *f.*, тасёмка *f.* 3. касьні́к -а́ *m.*, сту́жка *f.* (*да валасо́ў*)
– v.t. 1. пле́сьці, заплята́ць (*валасы́*): ***to braid rugs*** пле́сьці дываны́. 2. абшыва́ць та́сьмай. 3. зьвя́зваць сту́жкай

braided ['breɪdɪd] adj. 1. пле́цены, спле́цены; запле́цены; перапле́цены. 2. абшы́ты та́сьмай

Braille or braille [breɪl] n. шрыфт Бра́йля (*для сьляпы́х*)

brain [breɪn] n. 1. мозг -у *m.*, *pl.* мазгі́. 2. ро́зум -у *m.*, інтэліге́нцыя *f.*, разуме́выя здо́льнасьці
• ***beat one's brains*** лама́ць сабе́ галаву́, стара́цца прыпо́мніць
• ***have something on the brain,*** Informal мо́цна не́чым захапі́цца
• ***pick the brain of*** выця́гваць ад не́кага кары́сную інфарма́цыю

brain drain уце́чка мазго́ў

brainless ['breɪnləs] adj. дурны́, бязглу́зды

brainpan ['breɪnpæn] n. ча́рап -а *m.*

brainstorm ['breɪnstɔ:rm] n. 1. раптО́ўнае натхне́ньне. 2. «мазгава́я ата́ка»

brain trust мазгавы́ тра́ст

brainwash ['breɪnwɔ:ʃ] v.t., Informal прамыва́ць мазгі́

brainy ['breɪni] adj. **-er, -est,** Informal мазгаві́ты, разу́мны, інтэліге́нтны

braise [breɪz] v.t. тушы́ць (*мя́са*)

brake I [breɪk] – n. 1. то́рмаз -а *m.* 2. Figur. перашко́да *f.*
– v.t. тармазі́ць: ***to brake an automobile*** затармазі́ць аўтамабі́ль

brake II [breɪk] – n. 1. це́рніца *f.* (*для лёну або́ канапе́лі*). 2. цяжка́я бара́на. 3. цестамясі́лка *f.*
– v.t. це́рці *або́* трапа́ць лён (*кано́плі*)

brake III [breɪk] n. гушча́р -у *m.*

brake IV [breɪk] n. or **bracken** па́параць *f.*

brakeage ['breɪkɪdʒ] n. 1. тармажэ́ньне *n.* 2. тармазы́ *pl.*

brake pedal пэда́ль то́рмаза

braky ['breɪki] adj. заро́слы куста́мі, гушча́рам

bramble ['bræmbəl] n. 1. калю́чы куст (*ажы́ны, мали́ны*). 2. ажы́на *f.*

bran [bræn] n. во́труб'е *n.*, вы́сеўкі *pl.*, мякі́на *f.*

brancard ['brænkərd] n. насі́лкі *pl. only*

branch [brænʧ] – n. 1. галі́на *f.*, галі́нка *f.*, сук -а́ *m.* 2. лі́нія (*сямёйная*); пры́тока *f.*, рукаво́ *n.* (*ракі́*). 3. аддзе́л -у *m.*, ча́стка *f.*, галіна́ *f.*: ***a branch of learning*** галіна́ нау́кі; ***a branch of a bank*** аддзе́л ба́нку. 4. пададдзе́л, гру́па (*мо́ўная*)

– v.i. пушча́ць галі́ны, разгалі́но́ўвацца, адгалі́но́ўвацца
– v.t. дзяліць на аддзе́лы (*устано́ву, арганіза́цыю*)
• ***branch off*** аддзяліцца, адгалінава́цца
• ***branch out*** а) разгалінава́цца. б) пашы́рыць (*прадпрые́мства, зацікаўле́ньні*)

branchia [ˈbrænkiə] n. жа́бры, шчэ́лепы *pl.*

branchial [ˈbrænkiəl] adj. жа́бравы, шчэ́лепавы

branchy [ˈbræntʃi] adj. 1. разло́жысты, галіна́сты; разьві́слы, разьве́сісты. 2. які́ разгалі́но́ўваецца

brand [brænd] – n. 1. гату́нак -ку *m.*: ***a good brand of butter*** до́бры гату́нак ма́сла. 2. гандлёвая ма́рка: ***of the best brand*** найле́пшае ма́ркі. 3. кляймо́ *n.* 4. Figur. пля́ма га́ньбы, кляймо́. 5. галаве́шка *f.* 6. са́жа *f.* (*хваро́ба збо́жжавых расьлі́наў*). 7. Poet. меч, мяча́ *m.*
– v.t. 1. кляймі́ць. 2. а) клеймава́ць, кляймі́ць: ***He has been branded as a traitor*** Яго́ закляймі́лі як здра́дніка. 3. вылуча́ць, адро́зьніваць, рабі́ць: ***Her hairstyle brands her as oldfashioned*** Ейная фрызу́ра ро́біць яе́ старамо́днай. 4. Figur. урэ́звацца (*ў па́мяць*), рабі́ць вялі́кае ўра́жаньне: ***events branded on one's memory*** падзе́і ўрэ́заліся ў па́мяць

brandish [ˈbrændɪʃ] – v.t. 1. маха́ць, размаха́ць; замаха́цца. 2. выстаўля́ць напака́з
– n. пагражальнае маха́ньне (*мячо́м, кі́ем*)

brand-new [ˌbrændˈnu:] adj. навю́ткі, навю́сенькі; зусі́м но́вы; з го́лачкі

brandy [ˈbrændi] – n., pl. **-dies** канья́к -ю́ *m.*, брэ́нды *indecl.*
– v.t. мяша́ць з брэ́нды, насто́йваць на брэ́нды

brash I [bræʃ] – adj. 1. наха́бны, непачці́вы, дзёрзкі: ***a very brash young man*** ве́льмі непачці́вы малады́ чалавек. 2. пасьпе́шлівы, неабду́маны; неразва́жлівы, неразва́жны: ***a brash act*** неабду́маны крок
– n. 1. пры́ступ хваро́бы. 2. вы́сыпка *f.* 3. пяко́тка *f.* 4. раптоўны ве́цер з дажджо́м

brash II [bræʃ] n. ку́ча аблóмкаў

brashy [ˈbræʃi] adj. паламаны, аблама́ны, пакры́шаны

brass [bræs] – n. 1. лату́нь *f.*, мо́сяж -у *m.* (*сплаў ме́дзі й цы́нку*). 2. рэч з лату́ні: ***to polish all brasses*** пачы́сьціць усе́ рэ́чы з мо́сяжу. 3. Mus. also **brasses** духавы́я інструме́нты. 4. Brit., Sl. гро́шы *pl.* 5. Informal бессаро́мнасьць *f.*, наха́бства *n.* 6. Informal афіцэ́ры *або́* ўрадо́ўцы высо́кага ра́нгу. 7. а) цьвёрдасьць *f.*; трыва́ласьць, непару́шнасьць *f.* б) нячу́ласьць, бяздушнасьць *f.*
– adj. масяжо́вы, ме́дны: ***brass candlesticks*** ме́дныя падсьве́чнікі
– v.t. пакрыва́ць мо́сяжам

brass band духавы́ аркестар, вайско́вы аркестар

brass hat, Sl. 1. вышэ́йшы афіцэ́р. 2. сано́ўнік -а *m.*, высо́кі ўрадо́вец

brassiere [brəˈzɪr] n. ста́нік, бюстга́льтар -а *m.*

brassy [ˈbræsi] adj. 1. ме́дны, масяжо́вы. 2. Figur. гу́чны й рэ́зкі: ***a brassy voice*** рэ́зкі, гу́чны го́лас. 3. Informal бессаро́мны, наха́бны: ***a brassy manner*** бессаро́мныя, раьвя́зныя мане́ры

brat [bræt] n. капры́знае, разбэ́шчанае дзіця́

brattice [ˈbrætɪs] – n. вэнтыляцы́йны шчыт (*у ша́хце*)
– v.t. ста́віць вэнтыляцы́йныя шчыты́

bravado [brəˈvɑ:dou] n., pl. **-does** or **-dos** брава́да, зухава́тасьць *f.*

brave [breɪv] – adj. **braver, -est** 1. адва́жны, му́жны: ***brave knights*** адва́жныя ры́цары. 2. пы́шны, велікапы́шны. 3. Archaic даскана́лы, перадавы́: ***brave new world*** даскана́лы но́вы сьвет
– n. 1. адва́жны чалаве́к. 2. індыя́нскі ваяка

– v.t. 1. бясстра́шна сустрака́ць (*не-бясьпе́ку*), не бая́цца. 2. супрацьста-я́ць

bravely ['breɪvli] adv. му́жна, адва́жна

bravery ['breɪvəri] n., pl. **-eries** бясстра́шнасьць, адва́га *f.*

bravo I ['brɑ:vou] interj., n. бра́ва!

bravo II ['brɑ:vou] n., pl. **-voes** or **-vos** наня́ты забо́йца, банды́т -а *m.*

brawl [brɔ:l] – n. 1. сва́рка, спрэ́чка *f.* 2. а) цурчэ́ньне, бульката́ньне *n.* (*вады́*). б) го́ман -у *m.*, кры́кі *pl.*

– v. 1. спрача́цца, ва́дзіцца. 2. журчэ́ць, цурчэ́ць. 3. буя́ніць

brawn [brɔ:n] n. 1. му́скул -а *m.*; цьвярды́я му́скулы. 2. му́скульная сі́ла

brawny ['brɔ:nɪ] adj. **-ier, -est** мо́цны; мускулі́сты: ***brawny arms*** мускулі́стыя ру́кі

bray I [breɪ] – n. рык -у *m.* (*асла́, тру́бы*)

– v.i. раўці́: ***The trumpets brayed*** Раўлі́ тру́бы

– v.t. крычэ́ць, зло́сна прыкры́кваць, га́ркаць, гы́ркаць

bray II [breɪ] v.t. расьці́ра́ць на парашо́к

braze [breɪz] v.t. літава́ць, паяць

brazen ['breɪzən] adj. 1. бессаро́мны, наха́бны. 2. го́ласны й рэ́зкі. 3. мо́сяжны, медзяны́. 4. медзяно́га ко́леру

brazenly ['breɪzənli] adv. наха́бна, бессаро́мна

brazier I ['breɪʒər] n. жарні́ца *f.*, жарво́ўня *f.* (*на гара́чае вуго́льле*)

brazier II ['breɪʒər] n. ме́днік -а *m.*

Brazilian [brə'zɪlɪən] – adj. бразы́льскі

– n. бразы́лец -льца *m.*, бразылья́нка *f.*

breach [bri:tʃ] – n. 1. прало́м -у *m.*; дзі́рка *f.*; адту́ліна *f.*: ***the breach in the hedge*** дзі́рка ў жываплёце. 2. парушэ́ньне, зламáньне, занядба́ньне *n.*: ***a breach of law*** парушэ́ньне зако́ну; ***a breach of duty*** занядба́ньне абавя́зку. 3. разры́ў -ву *m.* (*сяброўскіх дачыне́ньняў, дру́жбы*); сва́рка *f.* 4. а) разьбіва́ньне хва́ляў. б) хва́лі *pl.*

– v.t. прарыва́ць; рабі́ць прало́м

– v.i. выны́рваць (*з вады́ — пра кіта́*)

breach of contract недатрыма́ньне кантра́кту

breach of peace парушэ́ньне грама́дзкага пара́дку, забурэ́ньні, хвалява́ньні

breach of promise парушэ́ньне абяца́ньня

bread [bred] – n. 1. хлеб -а *m.* 2. утрыма́ньне *n.*, сро́дкі на пражыцьцё, пражы́так -ку *m.*: ***How will you earn your daily bread?*** Як бу́дзеш зарабля́ць на пражыцьцё? 3. про́сьвіра, прасфо́рка *f.*

– v.t. абка́чваць у цёртым сухары́

• ***bread buttered on both sides*** вялі́кае бага́цьце, шчасьлі́выя абста́віны

• ***break bread*** а) падзяліцца е́жай. б) дава́ць *або́* прыма́ць каму́нію

• ***daily bread*** штодзённы хлеб

bread and butter 1. хлеб з ма́слам. 2. сро́дкі для існава́ньня

breadbasket ['bred,bæskət] n. 1. хле́бніца *f.*, ко́шычак для хле́ба. 2. Figur. хлебаро́дны раён

breadboard ['bredbɔ:rd] n. 1. до́шка для рэ́заньня хле́ба, стальні́ца *f.* 2. Tech. про́бная мадэ́ль прае́кту

breadbox ['bredbɑ:ks], n. скры́нка для хле́ба, хле́бніца *f.*

breadcrumb ['bredkrʌm] – n. 1. кры́шкі хле́ба; цёрты сухáр. 2. мя́кіш -у *m.*

– v.t. пасыпа́ць, абка́чваць у цёртым сухары́

breadless ['bredləs] adj. 1. бяз хле́ба, бясхле́бны: ***a breadless diet*** бясхле́бная дые́та; ***breadless refugees*** уцекачы́, які́я ня ма́юць чаго́ е́сьці

bread line чарга́ па е́жу

bread mold хле́бная цьвіль

breadstuff ['bredstʌf] n. 1. зе́рне, мука́ на хлеб. 2. хлеб -а *m.*

breadth [bredθ] n. 1. шырыня́ *f.*: ***the breadth of the road*** шырыня́ даро́гі. 2. глыбіня́ *f.*: ***breadth of mind*** глыбіня́ ро́зуму, шырыня́ кругагля́ду; ***breadth of understanding*** глыбіня́ зразуме́ньня. 3. абся́г, размáх -у *m.*: ***the breadth of his knowledge*** абся́г яго́ ве́даў

• ***by a hair's breadth*** на валасо́к, ве́льмі бліз́ка

breadthways ['bredθweɪz] or **breathwise** ['bretθwaɪz] adv. ушыркі́, упо́перак

breadwinner ['bred,wɪnər] n. гаспада́р сям'і́; кармі́цель -я *m.*, кармі́целька *f.*

break I [breɪk] **broke** or Archaic **brake, broken** – v.t. 1. разьбіва́ць; лама́ць, рва́ць (*ні́тку*). 2. разьме́ньваць (*гро́шы*). 3. шко́дзіць, лама́ць: ***to break the machine*** паламаць машы́ну; ***to break one's arm*** зламаць руку́. 4. парушаць, не датры́мваць: ***to break the law*** пару́шыць зако́н; ***to break the step*** зьбі́цца з нагі́; ***to break a promise*** не датрыма́ць абяца́ньня. 5. зьмяншаць, аслабля́ць, разьбіва́ць; ***The trees break the wind*** Дрэ́вы аслабля́юць сі́лу ве́тру. 6. спыня́ць, перапыня́ць, перарыва́ць; перабіва́ць: ***to break a journey*** прыпыні́ць падаро́жжа; ***to break the boredom*** перабі́ць нуду́; ***to break silence*** пару́шыць маўча́ньне. 7. уцяка́ць, вырыва́цца, вызваля́цца: ***to break jail*** уцячы́ з вастро́гу. 8. прывуча́ць; аб'яжджа́ць; асво́йваць. 9. бі́ць: ***to break all records*** пабі́ць усе́ рэко́рды. 10. каза́ць, паведамля́ць: ***to break the news*** пове́даміць навіну́. 11. расшыфро́ўваць; разьбіра́ць; разьвя́зваць: ***to break a code*** раскры́ць шыфр. 12. руйнава́ць

– v.i. 1. трэ́скацца, разьбіва́цца, расшчапля́цца. 2. вырыва́цца (*з вастро́гу*); прабіва́цца, прарыва́цца: ***The police broke through the crowd*** Пале́ыя прарва́лася праз нато́ўп. 3. раптоўна зрыва́цца, выбуха́ць. 4. зало́мваццa: ***His voice broke with emotion*** У яго́ го́лас задрыжа́ў ад хвалява́ньня. 5. банкрутава́ць

– n. 1. прары́ў -ву *m.*, расшчэ́піна, шчы́ліна *f.* 2. злама́ньне, пабіцьцё, расшчапле́ньне *n.* 3. уцёкі *pl. only*: ***to make a break for freedom*** уцячы́ на во́лю. 4. а) раптоўная перамена, зьме́на *f.*: ***a break in the weather*** раптоўная зьме́на ў надво́р'і. б) пача́так дня, сьвіта́ньне *n.*, зо́лак -ку *m.*: ***by the break of day*** до́сьвіткам, на зо́лку, на сьвіта́ньні. 5. перапы́нак -ку *m.*, па́ўза *f.*; адпачы́нак -ку *m.*: ***a five-minute break*** адпачы́нак на пяць хвілі́наў. 6. нагода *f.*; ша́нец -цу *m.*: ***a lucky break*** до́брая нагода, шчасьлі́вы ша́нец, вы́падак. 7. раптоўнае зьніжэ́ньне цэ́наў. 8. а) пусты́ радо́к памі́ж пара́графамі. б) шматкро́п'е *n.*

• ***break away*** а) адлама́цца; адарва́цца. б) уцячы́, вы́звалі́цца; аддзяліцца; адпа́сьці. в) Sport стартава́ць пе́рад сыгна́лам

• ***break down*** а) папсава́цца, злама́цца: ***The car's engine broke down*** У а́ўце папсава́ўся мато́р. б) разва́льваць; разбура́ць; лама́ць: ***to break down a wall*** развалі́ць сьцяну́; ***to break down all opposition*** злама́ць усю́ апазы́цыю. в) падупада́ць, занепада́ць: ***His health broke down*** Ён занядужаў. г) падзяліць (*на гру́пы*), разьдзяліць. д) пача́ць пла́каць. е) разьдзяліцца; раскладацца (*такса́ма хімі́чна*)

• ***break in*** а) аб'яжджа́ць (*маладо́га каня́*), навуча́ць: ***to break in an office boy*** навучы́ць пра́цы пасыльно́га. б) разно́шваць (*чаравікі*). в) перапыня́ць; уме́швацца (*у гу́тарку*). г) урыва́цца (*сі́лаю*)

• ***break into*** а) уварва́цца: ***A robber broke into the house*** Зло́дзей уварва́ўся ў ха́ту. б) сарва́цца: ***to break into a run*** кі́нуцца бе́гчы; ***to break into a song*** запяя́ць

• ***break loose*** а) адарва́цца. б) вы́звалі́цца, уцячы́

• ***break off*** а) абло́мваць, аблама́ць; адлама́цца: ***to break off a twig*** аблама́ць галі́нку. б) перапыня́ць, спыня́ць: ***The conferences were broken off*** Канфэрэ́нцыі былі́ спы́неныя. в) парва́ць сяброўства

• ***break out*** а) раптоўна выбуха́ць, пачына́цца (*пра ваі́ну́, пажа́р, эпідэ́мію*). б) мець вы́сыпку, высыпа́ць: ***The child broke out with measles*** У дзіця́ці вы́сыпаў адзёр; ***A rash broke***

out Пайшлá вы́сыпка (*на цéле*). в) падня́цца, вы́бухнуць: ***Cries of horror broke out*** Узьняліся крыкі перапу́ду • ***break up (with)*** а) разыхо́дзіцца (*і пра жані́мства*): ***A fog breaks up*** Разыхо́дзіцца імглá. б) ***to break up business*** зьліквідава́ць прадпрыéмства: ***to break up a meeting*** зако́нчыць пасéджаньне; ***A meeting broke up*** Пасéджаньне ско́нчылася • ***break with*** парыва́ць, разрыва́ць з *кім-чым* (*сяброўства*), пасварыцца • ***break with the past*** парыва́ць зь мінýлым • ***fever broke*** гара́чка апáла • ***frost breaks*** маро́з адпушчáе • ***The day is breaking*** Днéе

break II [breɪk] n. 1. пусты́ воз для аб'яжджáньня маладо́га каня́. 2. брычка *f.*, брэг -у *m.*

breakable ['breɪkəbəl] adj. ло́мкі, кро́хкі

breakables ['breɪkəbəlz] n., pl. прадмéты, якíя лёгка б'ю́цца

breakage ['breɪkɪdʒ] n. 1. пералóм, ло́м -у *m.*; разьбіва́ньне, лама́ньне *n.* 2. шко́да *або́* стрáта ад паламáньня, пабіцьця́; паламáныя, пабíтыя прадмéты: ***a high rate of breakage*** вялíкі працэ́нт пашко́джаньня; ***The breakage was excessive*** Пабíтага было́ празьмéрна шмат. 3. кампэнса́цыя за пашко́джаныя тавáры

breakdown ['breɪkdaʊn] – n. 1. а) сапсуцьцё *n.*, злом -у, пало́м -у *m.*, авáрыя *f.*: ***breakdown of the car engine*** злом мато́ра ў áўце. 2. заняпáд -у *m.*; упáдак -ку *m.*; заняпáд сíлаў; зьнясíленьне *n.*: ***a nervous breakdown*** нэрво́вы зрыў. 3. разьмеркава́ньне *n.*; разьдзялéньне на катэго́рыі; клясыфіка́цыя *f*; схéма арганіза́цыі. 4. хімíчны расклáд, анáліз -у *m.*
– adj. рамóнтны, аварыйны: ***a breakdown crew*** рамóнтная брыгáда

breaker I ['breɪkər] n. 1. буру́н -á *m.*, пéністая хвáля. 2. драбíлка *f.* (*машы́на*). 3 разьбівáльнік -а *m.*: ***a breaker of promises*** той, хто ня стрымвае абяцáньняў; ***a breaker of hearts*** сэрцаéд -а *m.*

breaker II ['breɪkər] n. бóчка для вады́

breakfast ['brekfəst] – n. сьнéданьне *n.*, сьнядáнак -ку *m.*
– v.i. сьнéдаць

breakfront ['breɪkfrʌnt] n. 1. буфэ́т -у *m.* (*для пóсуду*). 2. шáфа (*для кні́жак*)

breaking point пералóмны мóмант

breakneck ['breɪknek] adj. рызыкóўны; небясьпéчны; каркалóмны: ***at breakneck speed*** стрымгалóў, з каркалóмнай хýткасьцю, на злом галавы́

break of day сьвітáнак -ку *m.*, сьвітáньне *n.*, зóлак -ку *m.*

breakthrough ['breɪkθru:] n. 1. Milit. прары́ў -ву *m.* 2. дасягнéньне *n.*; пералóм -у *m.*

breakup ['breɪkʌp] n. 1. развáл -у *m.*; распáд -у *m.* : ***the breakup of a marriage*** жані́мства распáлася. 2. разьбіцьцё *n.*: ***the breakup of all one's hopes*** стрáта ўсíх надзéяў. 3. упáдак -ку, расклáд -у *m.*

breakwater ['breɪkˌwɔ:tər] n. хвалялóм -а *m.*; мол -а *m.*

bream [bri:m] n., pl. **breams** or coll. **bream** лешч, ляшчá *m.* (*ры́ба*)

breast [brest] – n. 1. грýдзі *pl.*, грудна́я клéтка. 2. грудзíна *f.* (*адзéжы*), пéрад -у *m.* 3. пярэ́дняя чáстка; фронт -у *m.* 4. грудна́я (малóчная) залóза. 5. Figur. сэ́рца *n.*, душá *f.*; пачýцьці *pl.* 6. Mining забóй -ю *m.*, штóльня *f.* 7. палíца *f.* (*у плýзе*)
– v.t. супраціўля́цца, змагáцца; супрацьстаяць • ***beat one's breast*** бíцца ў грýдзі • ***make a clean breast of*** шчы́ра прызнáцца ў *чым*

breastbone ['brestboʊn] n., Anat. грудзíна *f.* (*грудна́я косьць*)

breast-fed ['brestfed] adj. кóрмлены грудзьмí (*пра дзіця́*)

breast-feed ['brestfi:d] v. **-fed** кармíць грудзьмí

breast-high ['bresthaɪ] adj., adv. па грýдзі

breaststroke ['breststroʊk] n. брас -у *m.*

breastwork ['brestwɜ:rk] n. бру́ствэр -у *m.*

breath [breθ] n. 1. дых, дух -у *m.*; дыха́ньне *n.*, удыха́ньне й выдыха́ньне пове́тра: ***to lose one's breath*** засапсьці́ся, задыхацца. 2. а) удых -у *m.*: ***Take a breath and hold it*** Удыхні́ глыбо́ка й затрыма́й пове́тра. б) уздых -у *m.*: ***to the last breath*** да апо́шняга ўздыху. 3. перадышка *f.*, час во́льна дыхну́ць: ***Give me some breathing room*** Дай мне крыху перадыхну́ць. 4. жыццё *n.* 5. по́дых -у *m.*, павеўў -ву *m.*: ***soft as the breath of evening*** мя́ккі, як вячэ́рні по́дых. 6. цень -ю *m.*: ***the breath of suspicion*** цень падазрэ́ньня

• ***catch one's breath*** а) перадыхну́ць, перавёсьці дух. б) затаіць дух (*ад хвалява́ньня, стра́ху*)

• ***hold one's breath*** затрыма́ць дыха́ньне: ***in the same breath*** адны́м ду́хам, у той са́мы час

• ***out of breath*** засо́пшыся, задыхаўшыся

• ***save one's breath*** замаўча́ць

• ***take one's breath away*** заня́ць дух, зьдзівіць, шакава́ць

• ***under one's breath*** шэ́птам, ці́ха

• ***waste one's breath*** гаварыць у пове́тра; дарма́ марнава́ць сло́вы

breathe [bri:ð] – v.i. 1. ды́хаць. 2. перадыхну́ць, адсапсьці́ся, адпачы́ць: ***At last there is time to breathe*** Нарэ́шце знайшо́ўся час перадыхну́ць. 3. лёгка дзьмуць, ве́яць (*пра ве́цер*). 4. жыць, быць жывы́м

– v.t. 1. удыха́ць, ды́хаць: ***to breathe poisonous fumes*** удыха́ць атру́тныя выпарэ́ньні. 2. дава́ць адпачы́ць: ***The rider breathed his horse*** Ко́ньнік даў адпачы́ць каню́. 3. шапта́ць; каза́ць: ***not to breathe a word*** не прагаварыцца ні сло́вам, ня пі́скнуць ні сло́ва, трыма́ць у сакрэ́це. 4. перадава́ць; ды́хаць *чым*. 5. Figur. удыха́ць, натхня́ць: ***to breathe new life into an organization*** ажывіць арганіза́цыю

• ***breathe a vein*** пусьці́ць кроў

• ***breathe easy*** уздыхну́ць з палёгкай

breather ['bri:ðər] n. 1. перапы́нак, адпачы́нак -ку *m.*: ***to take a breather*** зрабіць перадых. 2. праду́ха, адду́ха, адду́шына *f.*

breathing ['bri:ðɪŋ] – n. 1. дыха́ньне *n.*: ***labored breathing*** цяжко́е дыха́ньне. 2. дых -у *m.*; ве́льмі каро́ткі час: ***for the breathing of a second*** на ча́стачку сэку́нды. 3. перадышка *f.*; адпачы́нак -ку *m.* 4. лёгкі ве́трык. 5. Gram. прыдыха́ньне *n.*

– adj. жывы́, які́ ды́хае

breathing space ме́сца, час, каб во́льна ўздыхну́ць; нагода адпачыць, перадыхну́ць

breathing spell перапы́нак, перадых, час адпачы́нку

breathless ['breθləs] adj. 1. бяз ду́ху; засо́пшыся. 2. без дыха́ньня, мёртвы, нежывы́. 3. бязьве́траны, спако́йны, бяз ру́ху

breathtaking ['breθˌteɪkɪŋ] adj. які́ займа́е дух

breath test праве́рка на алькаго́ль

breech [bri:tʃ] n. зад -у *m.*, аза́дак -ку *m.*, я́гадзіца *f.*

breeches ['brɪtʃɪz] n. нагавіцы, по́ркі *pl.*

breed [bri:d] v., **bred, breeding** – v.t. 1 а) пладзіць; выво́дзіць, высе́джваць (*птушаня́т*). б) выро́шчваць расьлі́ны, развóдзіць. 2. а) гадава́ць (*паро́дзістую жывёлу, ко́ней*). 3. Figur. развóдзіць, спрычыня́цца, выкліка́ць: ***Dirt breeds germs*** У бру́дзе развóдзяцца бактэ́рыі; ***Careless driving breeds accidents*** Няўва́жная язда́ вядзе́ да ава́рыяў. 4. узгадо́ўваць; вучы́ць, навуча́ць: ***He was bred to be a sailor*** Яго́ вы́вучылі на марака́

– v.i. 1. радзіцца, распло́джвацца. 2. паўстава́ць; разьвіва́цца

– n. 1. паро́да *f.*; завóд -у *m.*, ра́са *f.*: ***breeds of cattle*** паро́ды жывёлы. 2. гату́нак -ку *m.*; тып -у *m.*: ***a fighting breed of men*** ваяўні́чы тып людзе́й.

3. U.S., Sl. ра́савы мяша́нец (*цяпе́р абра́зьлівае*)
• ***breed in*** жаніцца ўнутры сям'і (*з раднёю*)
• ***breed out*** адсе́йваць (*непажада́нае*), рабіць адбо́р

breeder ['bri:dər] n. 1. той. хто гаду́е: ***a cattle breeder*** жывёлагадо́лвец -ўца *m.*; ***a dog breeder*** сабакагадо́лвец -ўца *m.*. 2. самлёц -ца́, вытво́рнік -а *m.* 3. Figur. крыніца, прычы́на *f.*

breeding ['bri:dɪŋ] n. 1. размно́жаньне, размнажэ́ньне, распло́джваньне *n.* 2. развóджаньне но́вых пале́пшаных гату́нкаў. 3. узгадава́ньне, выхава́ньне *n.*; узгадава́насьць *f.*: ***Courtesy is a sign of good breeding*** Ве́тлівасьць — азна́ка до́брага выхава́ньня

breeze [bri:z] – n 1. лёгкі ве́трык, брыз -у *m.*; ве́цер, павéлў -ву, по́дых -у *m.* 2. Brit. Informal замяша́ньне *n.*, непара́длак -ку *m.*; сва́рка *f.* 3. ве́стка, чу́тка *f.* 4. Informal не́шта, што лёгка зрабіць – v.i. 1. ху́тка прахо́дзіць, прано́сіцца. 2. лёгка ве́яць *або́* дзьмуць
• ***breeze in*** уляце́ць, уско́чыць (*у пако́й*)
• ***breeze up*** мацне́ць, бо́льшаць (*пра ве́цер*)
• ***in a breeze,*** Informal лёгка, без нату́гі

breezy [bri:zi] adj. **-zier, -ziest** 1. ве́траны; сьве́жы, халаднава́ты: ***a breezy day*** ве́траны дзень. 2. праве́ўны: ***a breezy porch*** праве́ўны га́нак

brethren ['breðrən] n. 1. бра́цтва (*царко́ўнае*). 2. мана́хі *pl.*, браты́ *pl.*

breve [bri:v] n. 1. значо́к каро́ткасьці гало́сных. 2. музы́чная но́та ро́ўная дзьвюм цэ́лым но́там

breviary ['breviəri] n., pl. **-aries** часасло́лў -ва *m.* (*малітоўнік*)

brevier [bre'vɪr] n., Print. пэты́т -у *m.*

brevity ['brevəti] n., pl. **-ties** каро́ткасьць, сьці́сласьць *f.*

brew [bru:] – v.t. 1. вары́ць (*пі́ва*). 2. ава́рваць, (*гарба́ту, ка́ву*); рабіць нава́р, насто́йку, насто́йваць. 3. заду́мваць, наду́мваць: ***to brew mischief*** заду́маць шко́ду
– v.i. вары́цца (*пра пі́ва*), зава́рвацца (*пра гарба́ту*); зьбіра́цца: ***A storm is brewing*** Зьбіра́ецца на навальні́цу
– n. 1. зава́раны напо́й (*напі́так*), узва́р -у *m.*, насто́йка *f.*, пі́ва, ва́рыва *n.* 2. варэ́ньне, зава́рваньне *n.*

brewage ['bru:ɪdʒ] n. 1. зва́раны напо́й, нава́р -у *m.*, насто́лй -ю *m.*, насто́йка *f.* 2. варэ́ньне, зава́рваньне, насто́йваньне *n.*

brewer ['bru:ər] n. півава́р -а *m.*

brewer's yeast піўны́я дро́жджы

brewery ['bru:əri] n., pl. **-eries** бро́вар -у *m.*, півава́рня *f.*

brewhouse ['bru:haʊs] n. бро́вар -у *m.*, півава́рня *f.*, півава́рны заво́д

briar [braɪr] n., *гл.* **brier**

bribe [braɪb] – n. 1. ха́бар, по́дкуп -у *m.* – v.t. падкупля́ць; дава́ць *або́* прапанава́ць ха́бар

briber ['braɪbər] n. ха́барнік -а *m.*

bribery ['braɪbəri] n., pl. **-eries** по́дкуп -у *m.*; ха́барніцтва *n.*; а) прапанава́ньне *або́* дава́ньне ха́бару. б) бра́ньне ха́бару

brick [brɪk] – n., pl. **bricks** or coll. **brick** 1. цэ́гла *f.*; цагліна *f.* 2. брусло́к -ка́ *m.* 3. Informal маладзе́ц, малайца́ *m.*, малайчы́нla -ы *m.*
– adj. цагля́ны, цаге́льны

brick [brɪk] v.t. мурава́ць з цэ́глы, масьці́ць, брукава́ць цэ́глай
• ***brick in/up*** замурава́ць цэ́глай

brickbat ['brɪkbæt] n. 1. кава́лак цэ́глы. 2. Figur. абра́за *f.*

brick field цаге́льня *f.*

brickkiln ['brɪkkɪln] n. печ для абпа́льваньня цэ́глы

bricklayer ['brɪkˌleɪər] n. муля́р -а́ *m.*

brickmaker ['brɪkmeɪkər] n. цагля́р -а́ *m.*, цаге́льнік -а *m.*, рабо́тнік на цаге́льні

brick-red [ˌbrɪk'red] adj. цагля́ны, жо́ўта- *або́* ру́да-чырво́ны

brickwork ['brɪkwɜ:rk] n. 1. мур -у *m.* 2. мурава́ньне, муля́рства *n.*

brickyard ['brɪkjɑ:rd] n. цаге́льня *f.*

bridal ['braɪdəl] – adj. вясе́льны, шлю́бны: ***a bridal veil*** шлю́бны вэ́люм – n. шлюб -у *m.*, вясе́льле *n.*

bride [braɪd] n. маладá́я, маладу́ха *f.*

bridecake ['braɪdkeɪk] n. карава́й -я *m.*

bridegroom ['braɪdgru:m] n. малады́ -о́га *m.* (*на вясе́льлі*), жані́х -а́ *m.*

bridesmaid ['braɪdzmeɪd] n. дру́жка *f.* (*на вясе́льлі*), бая́рка *f.*

bridesman ['braɪdzmən] n., pl. **-men** дружба́нт, ша́фер -а *m.*

bridewell ['braɪdwel] n. папра́ўчы дом; астро́г -у *m.*

bridge [brɪdʒ] – n. 1. мост -у *m.*, мастло́к -ка́ *m.* 2. капіта́нскі масто́к. 3. перано́сьсе *n.* 4. мастло́к -ка́ *m.* (*зу́бы*)
– v.t. 1. спалуча́ць, злуча́ць: ***to bridge the generations*** злучы́ць пакале́ньні. 2. будава́ць мост. 3. пераакро́чваць, пераступа́ць: ***to bridge over the difficulties*** пераадо́лець ця́жкасьці
• ***burn one's bridges*** спалі́ць за сабо́ю масты́

bridge II [brɪdʒ] n. брыдж -у *m.* (*картачная гульня́*)

bridgehead ['brɪdʒhed] n., Milit. 1. пляцда́рм -у *m.* 2. перадмасто́вае ўмацава́ньне. 3. адзі́н з канцо́ў маста́

bridle ['braɪdəl] – n. 1. вуздэ́чка, абро́ць *f.*
– v.t. 1. надзява́ць абро́ць (*вуздэ́чку*). 2. Figur. утаймо́ўваць, паўстрымо́ўваць

bridle path or **road** сьце́жка, даро́га для ко́ньнікаў

brief [bri:f] – adj. 1. каро́ткі; бе́глы, мімалётны (*пра по́гляд*): ***a brief announcement*** каро́ткае паведамле́ньне. 2. сьці́слы; зьмясто́ўны, каро́ткі й я́сны
– n. 1. каро́ткае асьве́дчаньне, паведамле́ньне, рэзюмэ́. 2. Law каро́ткі вы́клад спра́вы. 3. по́зва ў суд. 4. інстру́кцыя *f.*
– v.t. 1. рабі́ць каро́ткае рэзюмэ́, падсумо́ўваць. 2. дава́ць інстру́кцыю
• ***briefs*** трусы́, тру́сікі *pl.*
• ***hold a brief for*** падтры́мваць, барані́ць *каго́*
• ***in brief*** ко́ратка ка́жучы, у не́калькіх сло́вах

briefcase партфэ́ль -я *m.*

briefing ['bri:fɪŋ] n. 1. інструкта́ж -у *m.* 2. бры́фінг -у *m.*, інструкцы́йная нара́да

briefless ['bri:fləs] adj. 1. без манда́ту, неўпава́жнены. 2. які́ ня ма́е кліе́нтаў (*пра адвака́та*)

brier I [braɪr] n., also **briar** 1. калю́чы куст (*напр. шыпшы́на, ажы́ньнік*). 2. за́расьнік -у *m.* (*з такі́х куста́ў*)

brier II [braɪr] n. 1. э́рыка *f.* (*бе́лае дрэ́ўца*). 2. лю́лька для курэ́ньня (*з ко́раня э́рыкі*)

briery ['braɪrɪ] adj. цярні́сты; зь це́рнем, калю́чы

brig [brɪg] n. 1. брыг -а *m.*, двухма́чтавы карабе́ль. 2. вастро́г на вае́нным караблі́

brigade [brɪ'geɪd] – n. 1. брыга́да *f.* 2. кама́нда, дружы́на *f.*
– v.t. 1. фармава́ць брыга́ду. 2. групава́ць у дружы́ны

brigadier [ˌbrɪgə'dɪr] n. 1. брыга́дны генэра́л. 2. камандзі́р брыга́ды

brigand ['brɪgənd] n. разбо́йнік -а, бандыт -а *m.*

brigandage ['brɪgəndɪdʒ] n. 1. разбо́й -ю, бандыты́зм -у *m.* 2. банды́ты *pl.*

bright [braɪt] adj. 1. сьве́тлы, я́сны; паго́дны: ***a bright moon*** я́сны ме́сяц; ***a bright day*** пагодны дзень. 2. ке́млівы, ця́мкі, ця́млівы; разу́мны; здо́льны: ***a bright answer*** разу́мны адка́з; ***a bright boy*** ке́млівы, здо́льны хло́пец. 3. жывы́, зы́ркі, асьляпля́льны, я́ркі: ***a bright fire*** асьляпля́льны аго́нь; ***bright colors*** жывы́я ко́леры. 4. аптымісты́чны, жыцьцярада́сны, сьве́тлы: ***a bright outlook for the future*** аптымісты́чны пагля́д на бу́дучыню; ***bright hopes*** сьве́тлыя надзе́і

brighten ['braɪtən] – v.i. 1. праясьня́цца, разьясьня́цца; ясьне́ць; распаго́джвацца, выпаго́джвацца (*пра не́ба*). 2. праясьня́цца; ясьне́ць; весяле́ць (*пра твар, по́зірк*)

– v.t. праясьня́ць; ажыўля́ць,

brightish ['braɪtɪʃ] adj. сьветлава́ты, до́сыць сьве́тлы

brightness ['braɪtnəs] n. 1. я́снасьць, я́ркасьць *f.*; жы́васьць (*ко́лераў*), зы́ркасьць *f.* (*по́лымя*). 2. ке́млівасьць, здо́льнасьць *f.*

brill [brɪl] n., pl. **brills** or coll. **brill** ка́мбала *f.* (*ры́ба*)

brilliance ['brɪljəns] n. 1. зы́ркасьць *f.* (*по́лымя*); бляск -у *m.*, прамяні́стасьць *f.* 2. бліскýчасьць *f.* (*ро́зуму, дасягне́ньняў*); выда́тнасьць, генія́льнасьць *f.*

brilliant ['brɪljənt] adj. 1. зы́ркі; бліскýчы. 2. Figur. пы́шны, велікапы́шны; цудо́ўны, надзвыча́йны. 3. ве́льмі здо́льны, выда́тны (*хіру́рг, матэма́тык*), генія́льны (*плян*)

brilliantine ['brɪljənti:n] n. брыльянты́н -у *m.* (*для валасо́ў*)

brim [brɪm] – n. 1. верх -у *m.* (*ку́бка, мі́скі*), краі́й -ю *m.*, бераж|о́к -ку́ *m.*: ***to fill to the brim*** наліць ро́ўна зь бераж|ка́мі, по́ўна да ве́рху. 2. палі́ капелюша́

– v.i. быць ро́ўным зь берага́мі: ***The pond is brimming with water*** У са́жалцы вады́ ро́ўна зь берага́мі; ***brimming with patriotism*** перапо́ўнены патрыятызмам, ве́льмі патрыятычны; ***her eyes brimming with tears*** е́йныя во́чы по́ўныя сьлёз

– v.t. налі́ва́ць да ве́рху, ро́ўна зь бераж|ка́мі

• ***brim over*** пералі́ць, налі́ць праз верх

brimful [ˌbrɪm'fʊl] adj. по́ўны да ве́рху *або́* да бераж|ко́ў, паўню́ткі: ***a glass brimful of wine*** паўню́ткая ча́рка віна́

brimless ['brɪmləs] adj. без палёў (*капялю́ш*)

brimmer ['brɪmər] n. по́ўная ча́ша, по́ўны ку́бак

brimstone ['brɪmstoʊn] n. се́ра, се́рка *f.*

brindled ['brɪndəld] adj. рабы́, паласа́ты (*пра жывёлу*)

brine [braɪn] – n. 1. расо́л -у, ляк -у *m.* (*расо́л ад селядцо́ў*), сало́ная вада́. 2. сало́нае во́зера, мо́ра *або́* акія́н

– v.t. салі́ць, залі́ва́ць расо́лам

bring [brɪŋ] v.t. **brought, bringing** 1. а) прыно́сіць. б) прывóзіць. 2. прывóдзіць. 3. перако́нваць: ***He was brought to agree to our position*** Ён быў вы́мушаны пагадзі́цца з на́шым по́глядам

• ***bring about*** ажыцьцяўля́ць, прычыня́цца, выклі́ка́ць

• ***bring around*** а) прывóдзіць да прыто́мнасьці. б) перако́нваць, угавóрваць

• ***bring back*** а) прыно́сіць (прывóзіць, прывóдзіць) наза́д, вярта́ць. б) аднаўля́ць, успаміна́ць

• ***bring down*** а) спуска́ць; зва́льваць, валі́ць; скіда́ць (*ула́ду*); накла́да́ць ка́ру. б) прыніжа́ць. в) зьбіва́ць, падстрэ́льваць. г). зьніжа́ць, памянша́ць, спуска́ць (*цану́*)

• ***bring forth*** а) радзі́ць, нараджа́ць. б) раскрыва́ць, пака́зваць. в) Obsol. гадава́ць, развóдзіць парóдзістую жывёлу

• ***bring forward*** а) выяўля́ць, пака́зваць. б) прывóдзіць: ***to bring forward proof*** прывéсьці дóвад. в) Account. перано́сіць су́му на другую бачы́ну

• ***bring in*** а) увóдзіць. б) дава́ць прыбы́так. в) афіцы́йна паведамля́ць, абвяшча́ць: ***to bring in a verdict*** абвясьці́ць прысу́д. г) здабыва́ць на́фту. д) арыштóўваць

• ***bring into the world*** нарадзі́ць (*на гэ́ты сьвет*)

• ***bring off*** прычыні́цца да зьдзяйсьне́ньня, дасе́сьці да памы́снага канца́

• ***bring on*** выклі́ка́ць

• ***bring out*** а) выка́зваць (*по́гляд*), выяўляць: ***to bring out into the open*** вывóдзіць на чы́стую ваду́, высьвятля́ць. б) публікава́ць, выдава́ць (*кні́гу*), ста́віць (*п'е́су, о́пэру*). в) выстаўля́ць на выста́ве

• ***bring over*** перако́нваць; перацяга́ць на свой бок

• ***bring through*** лячы́ць, ратава́ць (*хвóрага*)

• ***bring to*** прывóдзіць да прытóмнасьці
• ***bring under*** падпарáдкаваць
• ***bring up*** а) гадавáць (*дзяцéй*); узгадóўваць. б) выхóўваць; адукóўваць; навучáць. в) прапанавáць (*плян*) для дыскýсіі. г) стáвіць на вышэ́йшае станóвішча; падымáць, узвóдзіць угóру

brink [brɪŋk] n. 1. бéраг -у *m.*, крaй -ю *m.*, краёчлак -ка *m.* (*стрóмы, прадóньня*): ***the brink of the cliff*** край скáлы. 2. Figur. мяжá *f.*: ***on the brink of ruin*** на мяжы́ руíны

briny ['braɪnɪ] adj. **-ier, -iest** рассóльны; салёны

briquette or **briquet** [brɪ'ket] n. брыкéт -а, -у *m.*

brisk [brɪsk] – adj. 1. хýткі, шпáркі, бóрзды: ***a brisk walk*** шпáркая хадá. 2. вóстры, рэ́зкі: ***brisk weather*** рэ́зкае надвóр'е; ***a brisk manner*** рэ́зкія манéры. 3. мóцны, шыпýчы напой. 4. вóстры: ***a brisk flavor*** вóстры смак 5. халóдны, сьцюдзёны: ***a brisk breeze*** сьцюдзёны вéцер
– v. ажыўля́ць(-ца), асьвяжáць (-ца); паскарáць: ***to brisk up one's pace*** паскóрыць крок

briskly ['brɪskli] adv. хýтка, шпáрка, бóрзда

brisket ['brɪskɪt] n. грудзíнка *f.*

bristle ['brɪsəl] – n. 1. шчацíньне *n.*, шчэць *f.* 2. штýчнае шчацíньне: ***a brush with nylon bristles*** шчóтка з нэйлёнавай шчацíнаю
– v.i. 1. ашчацíньвацца, натапы́рвацца, станавíцца дýбам: ***Dog's hair bristled*** Шэрсьць у сабáкі стáла дýбам (*натапы́рылася*); ***The dog bristled*** Сабáка ашчацíніўся. 2. выкáзваць злосьць, раздражнéньне
– v.t. 1. пакрывáць шчацíньнем. 2. тапы́рыць

bristled ['brɪsəld] adj. 1. шчацíністы. 2. натапы́раны, ашчацíнены

bristly ['brɪsəlɪ] adj. **-tlier, -tliest** 1. шчацíністы, шóрсткі, калю́чы: ***a bristly chin*** калю́чая барадá. 2. зьéдлівы: ***a bristly temper*** зьéдлівы харáктар; ***a bristly mood*** задзíрлівы настрóй

British ['brɪtɪʃ] – adj. брытáнскі; вялікабрытáнскі
– n. 1. ***the British*** брытáнцы. 2. мóва стары́х брытáнцаў. 3. англéльская мóва

British Empire Брытáнская Імпэ́рыя

Britisher ['brɪtɪʃər] n., esp. англéлец -ьца *m.*, англéлька *f.*; брытáнскі грамадзянíн

British thermal unit (BTU) брытáнская адзíнка цяплá

Briton ['brɪtən] n. 1. старажы́тны брыт. 2. брытáнец -ца *m.*

brittle ['brɪtəl] adj. крóхкі, лóмкі

broach [broʊtʃ] – n. 1. ражóн -нá *m.* (*для смáжаньня мя́са*), пóжаг -а *m.* 2. сьвéрдзел для адкрывáньня бóчак. 3. бróшка *f.* 4. каменячасáльная прылáда
– v.t. 1. сьвідравáць адтýліну. 2. пачынáць гýтарку, адкрывáць дыскýсію. 3. часáць кáмень

broad [brɔ:d] – adj. 1. шырóкі. 2. абшы́рны, прастóрны. 3. шырóкага кругагля́ду, лібэрáльны; талерáнтны: ***broad ideas*** лібэрáльныя ідэ́і; ***a broad mind*** рóзум шырóкага кругагля́ду. 4. агýльны: ***broad literary outline*** агýльны літаратýрны нáрыс. 5. адкры́ты (*пра гук*)
– adv. 1. шырóка; свабóдна; адкры́та: ***to speak broad*** гавары́ць адкры́та. 2. зусíм, цáлкам: ***broad awake*** зусíм прачнýўшыся; ***broad-blown*** цáлкам расьцьвíўшы
– n., U.S., Sl. жанчы́на, дзяўчы́на *f.* (*абрáзьлівы тэ́рмін*)
• ***in broad daylight*** сярóд бéлага дня

broadcast ['brɔ:dkæst] **-cast** or **-casted, -casting,** – v.t. 1. перадавáць па рáдыё *або́* тэлебáчаньні. 2. шырóка распаўсю́джваць, пашырáць: ***to broadcast news, ideas, gossip*** распаўсю́джваць навíны, ідэ́і, плёткі. 3. раскідáць, расьсявáць (*насéньне*)

– v.i. перадава́ць, мець радыёперада́чы: ***to broadcast 24 hours a day*** мець ра́дыёперада́чы 24 гадзі́ны на дзень
– n. перада́ча *f.*, вяшча́ньне *n.* 2. расьсява́ньне *n.* (*насе́ньня*)

broadcaster ['brɔ:dkæstər] n. 1. радыёабо тэлежурналі́ст -а *m.* 2. перада́тчык -а *m.*

broadcasting ['brɔ:dkæstɪŋ] n. радыёперада́ча *f.*, радыёвяшча́ньне *n.*; тран-сьля́цыя *f.*

broadcloth ['brɔ:dklɔ:θ] n. палатно́ *n.*: ***woolen broadcloth*** то́нкае сукно́

broaden ['brɔ:dən] – v.t. пашыра́ць
– v.i. пашыра́цца

broad-gauge ['brɔ:dgeɪdʒ] adj. 1. шыро́какале́йны. 2. Figur. шыро́кіх погля́даў, лібэра́льны

broad jump, Brit. **long jump** скачо́к у даўжыню́

broadloom ['brɔ:dlʊm] adj. тка́ны на шыро́кіх кро́снах: ***a broadloom carpet*** дыва́н, тка́ны на шыро́кіх кро́снах

broad-minded [ˌbrɔ:d'maɪndɪd] adj. шыро́кіх погля́даў, талера́нтны

broadmindedness [ˌbrɔ:d'maɪndɪdnəs] n. талера́нтнасьць, лібэра́льнасьць *f.*

broadsheet ['brɔ:dʃi:t] n. вялі́кая афі́ша *f.*

broadside ['brɔ:dsaɪd] n. 1. борт -у *m.* (*карабля́*). 2. бок -у *m.* 3. афі́ша *f.*

broadsword ['brɔ:dsɔ:rd] n. пала́ш -а́ *m.*

broadway ['brɔ:dweɪ] n. шыро́кая даро́га, аўтастра́да *f.*

broadways ['brɔ:dweɪz] adv. упо́перак, ушы́ркі

broadwise ['brɔ:dwaɪz] adv. *гл.* **broadways**

brocade [broʊ'keɪd] n. парча́ *f.*

brocaded [broʊ'keɪdɪd] adj. парчо́вы

brochure [broʊ'ʃʊr] n. брашу́ра *f.*

brogue I [broʊg] n. гру́бы чарові́к

brogue II ірля́ндзкі акцэ́нт у англе́льскай мо́ве

broil I [brɔɪl] – v.t. 1. сма́жыць, пячы́. 2. пале́ць (*ску́ру*)
– v.i. 1. пале́цца, сма́жыцца, пячы́ся на со́нцы. 2. Figur. кіпе́ць ад зло́сьці, за́йздрасьці; гарэ́ць ад нецярпле́васьці

– n. 1. мя́са, сма́жанае на агні́. 2. Figur. кіпе́ньне *n.*: ***to be in a broil of indignation*** кіпе́ць ад абурэ́ньня

broil II [brɔɪl] – n. сва́рка, бо́йка *f.*; крык, га́лас -у *m.*
– v.i. сварыцца, ва́дзіцца

broiler ['brɔɪlər] n. 1. сма́жальніца *f.*. 2. маладая ку́рка для сма́жаньня. 3. Informal сьпяко́тны дзень

broke I [broʊk] – v., *p.t. of* **break**
– adj., Sl. а) фіна́нсава зруйнава́ны. б) бяз гро́шай, бяз гро́ша

broke II [broʊk] v.i. займа́цца ма́клерствам

broken ['broʊkən] v., *p.p. of* **break,** adj. 1. разьбі́ты, пабі́ты: ***a broken cup*** пабі́ты ку́бак. 2. патрэ́сканы, разьдзе́рты: ***broken skin*** патрэ́сканая ску́ра. 3. зама́ны; аслабле́ны: ***broken health*** падупа́лае здаро́ўе. 4. няро́ўны, надарва́ны; перасе́чаны, узара́ны: ***broken ground*** няро́ўная мясцо́васьць; ***to say in a broken voice*** сказа́ць надарва́ным го́ласам. 5. зама́ны, нястры́маны: ***a broken promise*** нястры́манае абяца́ньне. 6. лама́ны: ***broken English*** лама́ная англе́льская мо́ва. 8. збанкрутава́ны, зруйнава́ны: ***a broken man*** збанкрутава́ны чалаве́к. 9. перапы́нены: ***broken sleep*** перапы́нены сон

broken-down [ˌbroʊkən'daʊn] n. 1. разьбі́ты, сапсава́ны, сапсу́ты, зруйнава́ны: ***broken-down health*** сапсава́нае здаро́ўе. 2. зьні́шчаны, палама́ны, непрыда́тны для ўжы́тку; развалі́ны: ***broken-down furniture*** палама́ная мэ́бля

broken-hearted [ˌbroʊkən'hɑ:rtɪd] adj. прыбі́ты го́рам, з разьбі́тым сэ́рцам

broken wind ды́хавіца *f.* (*у ко́ней*)

broken-winded [ˌbroʊkən'wɪndɪd] adj. 1. ды́хавічны (*пра каня́*). 2. бяз ду́ху

broker ['broʊkər] n. 1. ма́клер, бро́кер -а *m.*; камісіянэ́р -а *m.*, біржавік -а́ *m.* 2. Brit. гандля́р ужыва́нымі рэ́чамі

brokerage ['broʊkərɪdʒ] n. 1. ма́клерства *n.* 2. камісо́выя ко́шты за пасярэ́дніцтва (*камісіянэ́ра*)

bronchi ['brɑ:ŋkaɪ] n., *pl. of* **bronchus** бро́нхі, *pl. of* бро́нха *f.*

bronchia ['brɑ:ŋkiə] n., pl. другара́дныя бро́нхі

bronchial ['brɑ:ŋkiəl] adj. бранхія́льны

bronchitic [brɑ:ŋ'kɪtɪk] adj. бранхі́тавы

bronchitis [brɑ:ŋ'kaɪtəs] n. бранхі́т -у *m.*

bronze [brɑ:nz] – n. 1. бро́нза *f.* 2. вы́рабы з бро́нзы; мэда́ль *f.* 3. жо́ўта-руды́ *або́* чырванава́та-руды́ ко́лер

– adj. 1. бро́нзавы, як бро́нза: ***a bronze bell*** бро́нзавы звон. 2. жо́ўта-руды́ *або́* чырванава́та-руды́

– v.t. бранзава́ць

– v.i. бранзаве́ць (*пра загара́*)

Bronze Age бро́нзавы век

brooch [broʊtʃ] n. бро́шка *f.*

brood [bru:d] – n. 1. вы́вад|ак -ку *m.* (*птушаня́таў*), птушаня́ты *pl.* 2. а) малады́я жывёлы, дзе́ці аднае́ ма́ткі. б) грама́дка, чарада́, чаро́дка *f.*: ***a widow with a brood of daughters*** удава́ з чаро́дкай дачо́к. 3. заво́д -у *m.*; адбо́рная паро́да

– v.t. 1. высе́джваць (*кураня́т*). 2. а) ду́маць, разду́мваць. б) выно́шваць (*но́выя ідэ́і, по́мсту*). 3. ахо́ўваць; трыма́ць пад кры́ламі

– v.i. 1. сядзе́ць на я́йках, квакта́ць. 2. непако́іцца, клапаці́цца; перажыва́ць: ***The boy brooded about his lost dog*** Хло́пчык непако́іўся пра згу́бленага саба́ку

• ***brood on/over*** а) перажыва́ць. б) Figur. павісну́ць над *чым* (*пра хма́ры*)

brooder ['bru:dər] n. 1. інкуба́тар -а *m.* 2. пану́ры чалаве́к. 3. квакту́ха *f.*

brood mare племянна́я кабы́ла

brook I [brʊk] n. руча́й -ю́ *m.*, ручалёк -йка́ *m., dim.*

brook II [brʊk] v.t. цярпе́ць; талерава́ць; перано́сіць: ***I cannot brook such conduct*** Не магу́ перано́сіць такі́х паво́дзінаў

brooklet [brʊklət] n. ручалёк -йка́ *m.*, ручаі́на, ручаі́нка *f.*

broom [bru:m] – n. 1. ве́нік -а *m.*, мятла́ *f., pl.* мётлы; шчо́тка (*для замята́нья*). 2. ракі́та *f.*: ***broom grove*** ракі́тнік -а *m.*, ракі́та *f.*

– v.t. замята́ць ве́нікам, мятло́ю

• ***a new broom*** но́вая мятла́; но́вы, энтузіясты́чны нача́льнік

broomstick ['bru:mstɪk] n. даўга́я ру́чка, кій мятлы́

broomy ['bru:mi] adj. 1. паро́слы ракі́тнікам, лазо́ю. 2. як мятла́

broth [brɔ:θ] n. булён -у *m.*, мясны́ на-ва́р

brothel ['brɑ:θəl] n. публі́чны дом

brother ['brʌðər] – n., pl. **brothers** or Archaic **brethren** 1. брат -а *m.* 2. а) блі́зкі ся́бра. б) суро́дзіч -а, зямля́к земляка́ *m.* 3. брат -а *m.* (*ся́бра таі́ са́мае царквы́, тава́рыства, бра́цтва*). 4. міра́нін -а *m.* (*у рэлігі́йным о́рдэне*)

– v.t. 1. ста́віцца па-бра́цку; заваць бра́там

brotherhood ['brʌðərhʊd] n. 1. братэ́рства *n.* 2. бра́цтва *n.*

brother-in-law ['brʌðərɪnˌlɔ:] n., pl. **brothers-in-law** 1. шва́гlер -ра *m.*, шва́грla -ы *m.* (*жо́нчын брат*). 2. дзе́вер -а *m.* (*му́жаў брат*)

brotherless ['brʌðərləs] adj. бяз бра́та, які́ ня ма́е бра́та

brotherly ['brʌðərli] – adj. 1. бра́тні; братэ́рскі: ***brotherly affection*** бра́тняя любо́ў, бра́тняе пачуццё. 2. бра́цкі; шчы́ры, тава́рыскі, сяброўскі: ***in a brotherly way*** па-бра́цку, шчы́ра, па-сяброўску

– adv. па-бра́цку, шчы́ра

brow [braʊ] n. 1. брыво́ *n., pl.* бро́вы, бро́ваў. 2. лоб, лба *або́* ілба́ *m., pl.* ілбы́: ***a wrinkled brow*** памо́ршчаны лоб

browbeat ['braʊbi:t] v.t. **-beat, -beaten** запу́жваць; запало́хваць; ні́шчыць, забіва́ць по́зіркам

brown [braʊn] – adj. 1. руды́, бу́ры; карычне́вы: ***brown hair*** руды́я валасы́. 2. смугля́вы, загарэ́лы. 3. ка́ры: ***brown eyes*** ка́рыя во́чы. 4. пану́ры: пава́жны

– n. руды́ ко́лер
– v. 1. рабі́ць (рабі́цца) рудым, рудзе́ць. 2. загара́ць (*на со́нцы*)
• ***brown out*** зацьмі́ць, пагасі́ць сьвятло́

brown bread 1. цёмны хлеб. 2. чо́рны хлеб

brown coal бу́ры ву́галь

brown rice нешатрава́ны рыс

Brown Shirt «бу́ракашу́льнік», нацы́ст -а *m.*

brown sugar нерафінава́ны цу́кар

brownie ['brauni] n. 1. дамаві́к -а́ *m.*, кару́зьлік -а *m.* 2. шакаля́дны ко́ржык з арэ́хамі

Brownie мало́дшая ска́ўтка, прале́ска *f.*

brownish ['brauniʃ] adj. рудава́ты, рудава́ценькі: ***brownish-yellow*** бу́ра-жо́ўты

brownout ['braunaut] n. зацямне́ньне, прыцямне́ньне *n.*

browse [brauz] – v.t. па́сьвіць
– v.i. 1. жыві́цца траво́ю, па́сьвіцца. 2. Figur. гарта́ць, пераглада́ць кні́гі
– n. малады́я па́расткі, галі́нкі, зялёная па́ша

bruise [bru:z] – n. 1. пабі́тае ме́сца, ра́нка *f.* 2. сіня́к -а́ *m.* 3. увагну́тае *або́* ўбі́тае ме́сца
– v.t. набіва́ць сіня́к; абабіва́ць, пабі́ць (*фрукт*). 2. Figur. ра́ніць, зьневажа́ць, абража́ць (*пачу́цьці*). 3. таўчы́; расьціра́ць на парашо́к

bruiser ['bru:zər] n. 1. прафэсі́йны баксёр. 2. Informal задзі́рла -ы *m. & f.*, галаварэ́з -а *m.*

brumal ['bru:məl] adj. зімо́вы

brunch [brʌntʃ] n., Informal по́зьняе сьне́даньне, спалу́чанае з по́луднем

brunet [bru'net] – n. брунэ́т -а *m.*
– adj. цёмнавало́сы

brunette [bru'net] – n. брунэ́тка *f.*
– adj. цёмнавало́сая

brunt [brʌnt] n. 1. гало́ўная сі́ла; гало́ўны ўда́р *або́* цяжа́р: ***the brunt of the hurricane*** гало́ўная сі́ла ўрага́ну; ***to bear the brunt of the battle*** прыня́ць на сябе́ гало́ўны цяжа́р бі́твы

brush I [brʌʃ] – n. 1. шчо́тка, шчо́тачка *f., dim.*; пэ́ндзаль -ля *m.* (*для малява́ньня*); памазло́к -ка́ *m.* (*для гале́ньня*). 2. чышчэ́ньне, часа́ньне шчо́ткаю: ***to give a good brush*** до́бра паскрэ́бсьці. 3. сутычка *f.*; сва́рка *f.*: ***a brush with the enemy*** сутычка з во́рагам. 4. пушы́сты хвост
– v. 1. чы́сьціць, зьмята́ць, часа́ць шчо́ткаю; малява́ць пэ́ндзлем. 2. абці́ра́ць, зма́хваць (*сьлёзы*). 3. лёгка дакрана́цца
• ***brush aside/away*** адкі́нуць, ня ўзя́ць пад ува́гу
• ***brush off*** а) счы́сьціць, згарну́ць. б) Informal адхілі́ць, адкі́нуць як нява́жнае; абрэ́заць
• ***brush up/up on*** а) пачы́сьціць, прывёсьці ў пара́дак. б) асьвяжы́ць у па́мяці (*ве́ды*), паўтары́ць

brush II [brʌʃ] n. 1. лама́чча *n.* 2. густы́ за́расьнік, хмызьня́к -у́ *m.* 3. рэ́дка насе́лены абша́р; глуш, глухме́нь *f.*

brushwood ['brʌʃwud] n. 1. сьсе́чанае гальлё *n., coll.*, лама́чча *n.* 2. густы́ за́расьнік, хмызьня́к -у́ *m.*

brushy I ['brʌʃi] adj. **-shier, -shiest** як шчо́тка, шчаці́ністы

brushy II ['brʌʃi] adj. **-shier, -shiest** паро́слы куста́мі, густо́ўем

brusque [brʌsk] adj. гру́бы, рэ́зкі (*у мане́рах, гу́тарцы*), бесцырымо́нны

brut [bru:t] adj. 1. ве́льмі сухо́е (*віно́*). 2. не шліфава́ны (*каштоўны ка́мень*)

brutal ['bru:təl] adj. сібе́рны, бязьлі́тасны, лю́ты; брута́льны, жо́рсткі, гру́бы: ***a brutal remark*** гру́бая заўва́га; ***a brutal attack*** брута́льны напа́д

brutally ['bru:təli] adv. дзі́ка, лю́та; нахабна; брута́льна

brutality [bru'tæləti] n., pl. **-ties** 1. лю́тасьць, сібе́рнасьць, бязьлі́таснасьць, жо́рсткасьць *f.* 2. лю́ты ўчы́нак; гру́басьць *f.*

brutalize ['bru:təlaiz] – v.t. зьдзе́кваць
– v.i. лю́таваць

brute [bru:t] – n. 1. жывёліна *f.* 2. неачэ́саны, лю́ты чалаве́к

– adj. 1. брута́льны; жывёльны. 2. неачэ́саны; лю́ты; юрлі́вы

brutish ['bru:tɪʃ] adj. 1. жывёльны, як у жывёлы; быдля́чы. 2. тупы́, дурны́; неачэ́саны; дзікі́, дзіку́нскі

BSSR [ˌbi:eses'ɑ:r] (**Belarusian Soviet Socialist Republic**) БССР

bubble ['bʌbəl] – n. 1. бу́рбалка, бу́рбалачка *f., dim.*: ***soap bubbles*** мы́льныя бу́рбалкі. 2. пузы́р -á, пузыр|о́к -ка́ *m.* 3. бу́льканьне, бульката́ньне *n.* 4. ду́ты плян; ду́тая спра́ва

– v.i. 1. пуска́ць бу́рбалкі; бурлі́ць (-ца) 2. бульката́ць, бу́лькаць (*пра кіпя́чую ваду́*), цурчэ́ць, журчэ́ць (*пра ваду́, ручаі́*)

• ***bubble bath*** купа́ньне ў мы́льнай пе́не

• ***bubble gum*** жу́йка *f.*

• ***bubble over*** а) пералі́ва́цца. б) мо́цна ра́давацца

bubbly ['bʌbəli] adj. з бу́рбалкамі; шыпу́чы n., Sl. шампа́нскае віно́

buccaneer [ˌbʌkə'nɪr] – n. піра́т -а *m.*

– v.i. займа́цца мо́рскім рабу́нкам, быць піра́там

buck I [bʌk] – n., pl. **bucks** or (coll) **buck** 1. самле́ц -ца́ *m.*; але́нь -я *m.*; казлёл -ла́ *m.*, бара́н -а́ *m.* 2. малады́ франт. 3. Informal мужчы́на -ы *m.*

– adj. мужчы́нскі: ***a buck rabbit*** саме́ц трусá

buck II [bʌk] v. а) Informal упа́рта супраціўля́цца, упа́рціцца. б). (*пра каня́*) става́ць ду́ба, брыка́цца

• ***buck for,*** Informal мо́цна дамага́цца, імкну́цца да *чаго́*

buck III [bʌk] n. 1. ко́злы (*для піла-ва́ньня*), сталю́га *f.* 2. казлёл -ла́ *m.* (*для гімна́стыкі*)

buck IV [bʌk] n., Sl. даля́р -а, бакс -а *m.*

• ***pass the buck*** Informal сапхну́ць адка́знасьць

bucket ['bʌkɪt] – n. 1. вядро́ *n.* 2. а) чарпа́к -а́ *m.* (*землячарпа́лкі ці збо́жжавага элева́тара*). б) чарпа́к на вадзяны́м ко́ле, лапа́тка турбі́ны. 3. по́ршань по́мпы. 4. Sl. карыта *n.*, ма́чына *f.*, драндуле́т -а *m.* (*стары́, павольны карабе́ль, аўтамабі́ль*)

– v.t. 1. чарпа́ць, насі́ць ваду́ вядро́м. 2. гнаць каня́, е́хаць на злом галавы́

• ***kick the bucket,*** Sl. памёрці, вы́цягнуць но́гі

buckhorn ['bʌkhɔ:rn] n. але́ні рог

buckle ['bʌkəl] – n. 1. спра́жка *f.* 2. вы́пукліна *f.*

– v.t. 1. зашпіля́ць спра́жкай. 2. пу́чваць, змо́ршчваць (*пад ці́скам*)

– v.i. 1. выгіна́цца, згіна́цца (пра ко́ла); вытву́чвацца (*пад ці́скам*). 2. Figur. схапля́цца, счапля́цца (*з супраці́ўнікам*)

• ***buckle down to*** ця́жка, шчы́ра працава́ць над *чым*

bucksaw ['bʌksɔ:] n. лучко́вая піла́

buckskin ['bʌkskɪn] n. але́невая ску́ра (*вы́рабленая*)

buckskins, pl. нагаві́цы з але́невай ску́ры

Buckskin ['bʌkskɪn] n. амэрыка́нскі жаўне́р часо́ў рэвалю́цыі

buckthorn ['bʌkθɔ:rn]n., Bot. крушы́на *f.*

bucktooth [ˌbʌk'tu:θ] n., pl. **-teeth** зуб, які́ вытыркáецца

buckwheat ['bʌkhwi:t] – n. грэ́чка *f.*

– adj. грача́ны, грэ́цкі: ***buckwheat cake*** грача́ны блін, грача́нік

bud [bʌd] – n. 1. пупы́шка (*кве́ткі або́ лісткá*), по́каўка *f.* (*лісткá*). 2. кве́тка, яка́я распускáецца. 3. дзіця́ *n.*; маладáя дзяўчы́на

– v.i. 1. пушча́ць пупы́шкі, расткі́. 2. налі́ва́цца (*пра пупы́шкі*). 3. пачына́ць расьці́, разьві́ва́цца

– v.t. прышчапля́ць пупы́шкі

• ***in bud*** у ча́се пушча́ньня пупы́шак: ***The apple tree is in bud*** Яблыня пушчáе пупы́шкі

• ***nip in the bud*** спыні́ць, здушы́ць у зача́тку, зьні́шчыць у ко́рані

Buddha ['budə] n. Бу́дда -ы *m.*

Buddhism ['budɪzəm] n. будды́зм -у *m.*

Buddhist ['budɪst] – adj. будды́сцкі (*храм, рэлі́гія*)

– n. будды́ст -а *m.*, будды́стка *f.*

buddy ['bʌdi] n., pl. **-dies** Informal 1. блі́зкі ся́бра, кале́гa -і *m.* 2. Sl. хло́пча, бра́це, бра́тка, чалаве́ча (*як зваро́т*)

budge [bʌdʒ] – v.i. ру́хацца, крана́цца зь ме́сца, зварухну́цца: ***He did not budge*** Ён і не зварухну́ўся.
– v.t. зру́шваць, скрана́ць зь ме́сца (*не́шта ця́жкае*)

budget ['bʌdʒɪt] – n. 1. бюджэ́т -у *m.* 2. фіна́нсавы каштары́с. 3. запа́с -у *m.*; набо́р -у *m.*: ***a budget of news*** набо́р наві́наў
– v.t. 1. а) зрабі́ць плян выда́ткаў. б) разьмеркава́ць свой час. 2. уне́сьці ў бюджэ́т
– v.i. (for) асыгнава́ць, вы́дзяліць на выда́ткі

budgetary ['bʌdʒəteri] adj. бюджэ́тны

buff [bʌf] n. 1. бізо́нава або́ бу́йвалава ску́ра. 2. цьмя́на-жо́ўты ко́лер. 3. Informal го́лае це́ла: ***to appear in the buff*** паказа́цца, зьяві́цца го́лым

buffalo ['bʌfəlou] – n., pl. **-loes, los** or esp. coll. **-lo** бу́йла -ы, бу́йвал -а *m.*, бу́йваліца *f.*; амэрыка́нскі бізо́н
– v.t., Sl. а) запало́хваць, застра́шваць; б) наўмы́сна ўво́дзіць у зман; зьбіва́ць з тро́пу: ***Don't let them buffalo you*** Не дава́йся, каб яны́ зьвялі́ цябе́

buffer I ['bʌfər] – n. бу́фэр -а *m.*
– adj. бу́фэрны

buffer II ['bʌfər] n. 1. ану́чка для навóджаньня гля́нцу. 2. той, хто глянцу́е

buffer state бу́фэрная дзяржа́ва (*паміж дзьвюма́ варо́жымі*)

buffet I ['bʌfɪt] – n. уда́р -у *m.*
– v.t. 1. уда́рыць, вы́цяць. 2. кі́даць: ***The waves buffeted the boat*** Хва́лі кі́далі ло́дку. 3. змага́цца з *чым*
– v.i. 1. змага́цца, бі́цца. 2. праштурхо́ўвацца, прабіва́цца

buffet II [bə'feɪ] n. 1. буфэ́т -а *m.* (*для по́суду*). 2. буфэ́т -а *m.*, буфэ́тная сто́йка
• ***buffet car*** вагóн-рэстара́н
• ***buffet lunch, supper*** по́лудзень, вячэ́ра ў буфэ́це

buffoon [bə'fu:n] – n. бла́зан -на *m.*, кло́ўн -а *m.*
– v.i. блазнава́ць

buffoonery [bə'fu:nəri] n., pl. **-eries** 1. блазнава́ньне *n.*; кло́ўнавы шту́чкі й жа́рты. 2. непрысто́йныя, гру́быя жа́рты

bug [bʌg] – n. 1. казя́ўка, кузу́рка *f.* 2. блашчы́ца *f.*; клоп, клапа́ *m.* 3. Informal хваробатво́рная бактэ́рыя, бацы́ла *f.* 4. а) вялі́кая заціка́ўленасьць, апанта́насьць *f.* б) вялі́кі ама́тар: ***the travel bug*** вялі́кі ама́тар падаро́жжаў. 5. Sl. жучло́к -ка́ (*прыла́да для падслухо́ўваньня*)
– v.t. 1. Sl. уста́віць мікрафо́н для падслухо́ўваньня. 2. Sl. дакуча́ць, дурыць галаву́, назаля́ць
• ***bug off,*** Sl. уцяка́ць
• ***bug out,*** Informal (of the eyes) вы́тарашчыць во́чы (*ад зьдзіўле́ньня ці ўзбуджэ́ньня*)

bugaboo ['bʌgəbu:] n., pl. **-boos** пу́дзіла *n.*, стра́хі *pl.*

buggy ['bʌgi] n., pl. **-gies** 1. бры́чка *f.*, лёгкі двухме́сны вазо́к. 2. дзіця́чы вазо́к

bugle ['bju:gəl] – n. 1. горн -а *m.*: ***bugle call*** сыгна́л го́рна. 2. паляўні́чы рог, ражло́к -ка́ *m.*
– v. трубі́ць у рог

bugler ['bju:glər] n. трубáч -а́, гарні́ст -а *m.*

build [bɪld] – v., **built,** v.t. 1. будава́ць. 2. разбудо́ўваць, разьвіва́ць. 3. Figur. грунтава́ць, абгрунто́ўваць: ***to build a case on facts*** абгрунтава́ць на фа́ктах
– v.i. 1. будава́цца; віць, рабі́ць гняздо́. 2. грунтава́цца
– n. 1. буда́ва *f.*; фо́рма *f.*; канструкцыя *f.* (*карабля́, аўтамашы́ны*). 2. склад це́ла, структу́ра, буда́ва *f.* (*чалаве́ка, жывёлы*)
• ***build in*** аббудава́ць, абкружы́ць будынкамі
• ***build into*** убудава́ць
• ***build on*** дабудава́ць

• ***build up*** а) забудава́ць. б) пабо́льшыць, узмо́цніць

builder [ˈbɪldər] n. будаўні́к -а́ *m.*, падра́дчык -а *m.*

building [ˈbɪldɪŋ] n. 1. будыні́на *f.* (*вялі́кі будына́к*), будыні́ак -ку *m.*, будо́ва *f.* 2. будава́ньне *n.*, будо́ўля, пабудо́ва *f.*, будаўні́цтва *n.*: ***building material*** будаўні́чы матэрыя́л

build-up [ˈbɪldʌp] n. 1. узро́ст сі́лы, узмацне́ньне *n.* 2. пабо́льшаньне *n.*: ***a build-up of pressure*** павышэ́ньне ці́ску. 3. ціск на грама́дзтва

built [bɪlt] v., *p.t. and p.p. of* **build**

built-in 1. убудава́ны. 2. прыро́джаны: ***a built-in sense of humor*** прыро́днае пачуццё гу́мару

bulb [bʌlb] n. 1. цыбу́ліна *f.*; галó́ўка, цыбу́лька *f.*: ***bulb of onion*** галó́ўка цыбу́лі. 2. электры́чная ля́мпачка

bulbed [bʌlbd] adj. цыбу́льны; цыбу́лісты

bulbiform [ˈbʌlbɪfɔ:rm] adj. у фо́рме цыбу́лі; цыбу́ліcты

bulbous [ˈbʌlbəs] adj. 1. цыбу́льны: ***bulbous plants*** цыбу́льныя расьлі́ны. 2. цыбу́лісты: ***bulbous nose*** нос, як бу́льбіна

Bulgarian [bʌlˈgeriən] – adj. баўга́рскі
– n. 1. баўга́рын -а *m.*, баўга́рка *f.* 2. баўга́рская мо́ва

bulge [bʌldʒ] – v.i. выпу́чвацца, узьдзіма́цца, выпіна́цца
– v.t. выпу́чваць, выпіна́ць
– n. 1. вы́пучына, вы́пукліна *f.* 2. Figur. часо́вае пабо́льшаньне, падняцьцё *n.*: ***a bulge in prices*** рост цэ́наў

bulgy [ˈbʌldʒi] adj. 1. вы́пучаны, вы́пуклы. 2. распу́хлы; напу́хлы

bulk [bʌlk] – n. 1. а) памёр, аб'ём -у *m.*; ко́лькасьць *f.*: ***a vast bulk*** вялі́кая ко́лькасьць. б) велічэ́зны памёр. 2. бо́льшая ча́стка; галó́ўная ма́са. 3. груз -у *m.*, пакла́жа *f.* (*карабля́*)
– v.i. 1. быць важкі́м, мець вялі́кае значэ́ньне. 2. пабо́льшвацца, расьці́ (*пра су́му гро́шай*)
• ***break bulk*** пачына́ць разгру́зку
• ***in bulk*** а) не ў па́чках. б) вялі́кімі ко́лькасьцямі

bulky [ˈbʌlki] adj. , **-ier, -iest** 1. аб'ёмісты, вялі́кі, грува́сткі, масі́ўны. 2. нязру́чны, непаваро́тлівы, нехлямя́жы

bull I [bʊl] – n. 1. бык -а́ *m.* , бага́лій -я́ *m.*, бу́йла -ы *m.* 2. саме́ц вялі́кіх жывёлаў. 3. гру́зны чалаве́к. 4. спэкуля́нт на бі́ржы. 5. бульдо́г -а *m.* (*саба́ка*)
– adj. бычы́ны, мо́цны, як у быка́
– v.t. 1. купля́ць а́кцыі з мэ́тай спэкуля́цыі. 2. Informal сі́лай прабіра́цца, прапі́хвацца: ***to bull one's way through the crowd*** сі́лай прапхну́цца праз нато́ўп
– v.i. спэкулява́ць на бі́ржы
• ***take the bull by the horns*** узя́ць быка́ за ро́гі, пача́ць дзе́йнічаць энэргі́чна, рашу́ча

bull II [bʊl] n. 1. па́пская бу́ла, па́пская пяча́тка. 2. афіцы́йны ліст, эдыкт -у *m.*

bull calf бычло́к -ка́ *m.*

bulldog [ˈbʊldɔ:g] n. 1. бульдо́г -а *m.* (*саба́ка*). 2. караткаство́льны рэвальвэ́р

bulldoze [ˈbʊldoʊz] v.t. 1. бурыць, расчышча́ць бульдо́зэрам. 2. сі́лаю правóдзіць (*сваю́ ду́мку*). 3. мо́цна сьцяба́ць, лупцава́ць, бі́ць

bulldozer [ˈbʊlˌdoʊzər] n. 1. бульдо́зэр -а *m.* 2. Sl. вялі́кі пістале́т

bullet [ˈbʊlɪt] n. ку́ля *f.*
• ***bite the bullet*** сьме́ла гля́нуць у твар ця́жкасьцям; быць адва́жным

bulletin [ˈbʊlətɪn] – n. 1. бюлетэ́нь -ю *m.*, паведамле́ньне *n.* 2. ча́сапіс -у *m.*
– v.t. паведамля́ць бюлетэ́нем

bulletin board до́шка для абве́стак

bulletproof [ˈbʊlɪtpru:f] adj. куленепрабіва́льны

bullfight [ˈbʊlfaɪt] n. 1. бой з быко́м. 2. бой быко́ў на арэ́не

bullfighter [ˈbʊlfaɪtər] n. тарэадо́р -а *m.*

bullion [ˈbʊliən] n. 1. зьлі́так зо́лата *або́* сро́бра. 2. фрэ́ндзлі з залаты́х *або́* сро́бных ні́так

bull's-eye or **bullseye** ['bʊlzaɪ] n. 1. я́блыка мішэ́ні. 2. мэ́та прыцэ́лу

bullish ['bʊlɪʃ] adj. 1. упа́рты, як бык. 2. упэ́ўнены, самапэ́ўны: ***bullish market*** фінансавы рынак з хуткім ростам цэ́наў

bully ['bʊli] – n. 1. задзі́ра -ы *m.*, хулі́ган -а *m.*

– v.t. 1. зьдзе́кавацца, тыра́ніць. 2. застра́шваць, змуша́ць: ***to bully into submission*** сі́лай падпарадко́ўваць

– adj. 1. Informal першара́дны, даскана́лы. 2. жартаўлі́вы; вясёлы; дабрадуши́ны

– interj. Бра́ва! До́бра!

bulwark ['bʊlwərk] – n. 1. абаро́на, ахо́ва *f.*, падтры́мка *f.* 2. абаро́нны вал *або́* мур. 3. мол -у *m.*, хвалялю́м, хвалярэ́з -у *m.*

– v.t. 1. абараня́ць, ахо́ўваць. 2. умацо́ўваць абаро́нным ва́лам, му́рам

• ***bulwarks*** барты́ вадаплáва

bum I [bʌm] – n., Sl. 1. абібо́к -а *m.*, валацу́га, бадзя́га -і *m. & f.*, гульта́й -я́ *m.* 2. п'я́ніца -ы *m. & f.* 3. папо́йка, гуля́нка *f.*

– v.t. жабрава́ць, прасі́ць

– v.i. 1. цяга́цца (*бязмэ́тна*), абіва́цца; гультая́ваць, гульта́іць

– adj. малава́ртасны; дрэ́нны; бязва́ртасны; фальшы́вы: ***bum cheque*** чэк без пакрыцьця́

• ***on the bum*** нядзе́йны, не ў пара́дку

bum II [bʌm] n. аза́дак -ка *m.* (*у чалавéка*)

bumblebee ['bʌmbəlbi:] n. чмель, чмяля́ *m.*

bump [bʌmp] – v.t. удара́ць, штурха́ць: ***That truck bumped our car*** Грузавік удáрыў нáшае áўта

– v.i. удáрыцца, вы́цяцца

– n. 1. глухі́ ўда́р. 2. апу́хласьць, пухлі́на ад удáру. 3. гуз -а *m.*; калдо́бі́на (*на даро́зе*). 4. павéтраная я́ма

• ***bump into,*** Informal натыкну́цца на *каго́*; неспадзява́на сустрэ́ць

• ***bump off,*** Sl. забі́ць

bumper ['bʌmpər] – n. 1. ба́мпэр -а *m.* (*а́ўта*). 2. напо́ўненая шкля́нка *або́* кýбак. 3. нéшта незвычáйна вялíкае.

– adj., Informal багáты, шчóдры: ***a bumper crop*** багáты ўраджáй збóжжа

– v.t. налíць рóўна зь берагáмі

bumptious ['bʌmpʃəs] adj. самапэ́ўны, саманадзéйны; нахáбны; сварлíвы

bumpy ['bʌmpi] adj. калдóбісты

bun [bʌn] n. 1. бýлка, бýлачка *f.*, *dim.* 2. кýкла *f.* (*з валасóў*)

bunch [bʌntʃ] – n. 1. грóнка *f.*: ***bunch of grapes*** грóнка вінагрáду. 2. Informal грýпа *f.*; мнóства *n.*, зьвя́зlак -ку *m.*: ***a bunch of thieves*** шáйка зладзéяў; ***a bunch of brothers*** мнóства братóў; ***a bunch of keys*** зьвя́зак ключóў. 3. гуз -а *m.*; пухлíна *f.*

– v.t. 1. вязáць, зьвя́зваць у пучкí, вя́зкі. 2. фалдавáць, мóршчыць (*сукéнку*)

– v.i. зьбірáцца, зьбівáцца ў кýпу

bunchy ['bʌntʃi] adj. 1. які́ мáе грóнкі, які́ расьцé грóнкамі *або́* пукáмі. 2. вы́пуклы

bundle ['bʌndəl] – n. 1. вя́зка *f.* ; зьвя́зlак -ку *m.*, нóшка *f.*: ***a bundle of firewood*** вя́зка, нóшка дрóваў. 2. пáчlак -ка, клýнlак -ка *m.* 3. пук -á *m.*, пучlóк -кá *m.*: ***a bundle of nerves*** клубóк нэ́рваў (*пра нэрвóвага чалавéка*)

– v.t. 1. вязáць, зьвя́зваць у вя́зкі, клýнкі. 2. адсылáць, адпраўля́ць сьпéхам: ***They bundled me off to the hospital*** Яны́ сьпéхам адпрáвілі мянé ў шпіталь

– v.i. вы́йсьці *або́* вы́ехаць сьпéхам

• ***bundle up*** цёпла апрануцца, ахýтаць, захýтаць (*напр. дзіця́*)

bung [bʌŋ] – n. 1.затычка, зáтычка *f.*, вялíкі кóрак. 2. адтýліна ў бóчцы

– v.t. затыкáць

• ***bung up*** заткнýць бóчку затычкай

bungalow ['bʌŋgəlou] n. бýнгала *n.*, лéтнік -у *m.*

bungle ['bʌŋgəl] – v.t. 1. рабíць няўмéла, недакладна, абыя́к. 2. партáчыць. 3. псавáць рабóту

– v.i. няўмéла працавáць; рабíць памы́лкі

– n. дрэ́нная рабо́та, парта́цтва *n.*

bungler ['bʌŋglər] n. дрэ́нны рабо́тнік; бракаро́б -а, парта́ч -а́ *m.*, парта́чка *f.*

bunk [bʌŋk] – n. вузкі́ ло́жак (*ча́ста двух'я́русны*); палі́ок -ка́ *m.*
– v.i., Informal 1. спаць на вузкі́м ло́жку. 2. спаць абы-дзе́: ***We bunked in a barn*** Мы спа́лі ў пу́ні. 3. Informal жыць у падсусе́дзях: ***You can bunk with me*** Мо́жаць паспа́ць у мяне́

bunk beds двух'я́русны ло́жак, на́ры *pl. only*

bunker ['bʌŋkər] n. 1. абаро́нны бу́нкер, бамбасхо́вішча *n.* 2. склад *або́* скры́ня для вугля́

bunny ['bʌni] n. pl. **-ies**, Informal тру́сік, за́йчык -а *m.*

bunt I [bʌnt] v. удара́ць, штурха́ць (*галаво́ю, рага́мі*); басьці́(ся)

bunt II [bʌnt] n. са́жа *f.* (*хваро́ба збо́жжа*)

bunting I ['bʌntɪŋ] n. 1. матэрыя́л на сьцягі́. 2. сьцяг -а *m.*, сьцягі́. 3. канвэ́рт -у *m.* (*дзіця́чая ко́ўдра*)

bunting II ['bʌntɪŋ] n. аўся́нка *f.* (*пту́шка*)

buoy ['bu:i] – n. 1. буй, бу́я *m.*; вяха́ *f.*, *pl.* ве́хі (*на вадзе́*). 2. выратава́льная ку́ртка, выратава́льны по́яс *або́* круг
– v.t. 1. абазнача́ць буя́мі. 2. трыма́ць на паве́рхні
– v.i. трыма́цца на вадзе́: ***to buoy up*** а) трыма́цца на паве́рхні вады́, не тану́ць. б) падтры́мваць, падыма́ць дух, падбадзёрваць: ***She buoyed up his hopes with promises*** Яна́ падтры́мвала у ім надзе́ю абяца́нкамі

buoyancy ['bɔiənsi] n. 1. плыву́часьць *f.* 2. Figur. жыццяра́даснасьць, бестурбо́тнасьць *f.* 3. стра́та вагі́ це́ла ў ва́дкасьці

buoyant ['bɔiənt] adj. 1. плыву́чы. 2. Figur. жыццяра́дасны, по́ўны надзе́і, бестурбо́тны

bur [bɜ:r] n. 1. церне *n.*, калю́чка *f.*, дзяды́ *pl.* (*лапуху́*). 2. калю́чая расьлі́на. 3. Figur. назо́ла -ы *m. & f.* (*пра чалаве́ка*). 4. бор-машы́на *f.*, зубны́ сьве́рдзел

burden I ['bɜ:rdən] – n. 1. груз -у *m.*; цяжа́р -у *m.* 2. цяжка́я но́ша, ця́жкасьці *pl.* 3. вага́ гру́зу (*карабля́*), грузападыма́льнасьць *f.*
– v.t. грузі́ць, нагружа́ць. 2. абцяжа́рваць

burden II ['bɜ:rdən] n. 1. тэ́ма *f.*, гало́ўная ду́мка. 2. прыпе́лў -ву *m.*, рэфрэ́н -у *m.*

burdensome ['bɜ:rdənsəm] adj. ве́льмі цяжкі́; ва́жкі

burdock ['bɜ:rdɑ:k] n. лапу́х -а́ *m.*

bureau ['bjʊrou] n., pl. **bureaus** or **-reaux** ['bjʊrouz] 1. канцыля́рыя *f.* 2. ура́давы аддзе́л, бюро́ *n.*: ***The Weather Bureau*** мэтэаралягі́чная ста́нцыя. 3. Brit. пісьмо́вы стол. 4. камо́да *f.*

bureaucracy [bjʊ'rɑ:krəsi] n., pl. **-cies** 1. бюракра́тыя *f.*; адміністрацыйныя чыно́ўнікі, урадо́ўцы; бюракраты́зм -у *m.* 2. фармалі́стыка, канцыля́ршчына *f.*

bureaucrat ['bjʊrəkræt] n. 1. бюракра́т -а *m.* 2. фармалі́ст, валаво́днік -а *m.*

bureaucratic [ˌbjʊrə'krætɪk] adj. бюракраты́чны

bureaucratism [bjʊ'rɑ:krətˌɪzəm] n. бюракраты́зм -у *m.*

burgeon ['bɜ:rdʒən] – n. пупы́шка *f.*; па́растлак -ка *m.*
– v.i. пушча́ць пупы́шкі, па́расткі; распуска́цца, разраста́цца

burger ['bɜ:rgər] n., Informal = **hamburger** 1. катле́та *f.* 2. га́мбургер -а *m.*

burgher ['bɜ:rgər] n. 1. гараджа́нін -ніна *m.*,*pl.* -не, гараджа́нка *f.* 2. грамадзяні́н -ні́на *m.*, *pl.* -не, грамадзя́нка *f.*

burglar ['bɜ:rglər] n. узло́мшчык -а *m.*

burglar alarm сыгналіза́цыя *f.*

burglary ['bɜ:rgləri] n., pl. **-glaries** 1. крадзе́ж з узло́мам. 2. рабу́нак -ку *m.*, граблёж -яжу́ *m.*

Burgundy ['bɜ:rgəndi] adj. чырво́нае бургу́ндзкае віно́

burial ['beriəl] n. 1. пахава́ньне *n.*, пахо́віны *pl. only.* 2. магі́ла *f.*, ме́сца пахава́ньняў

burial ground мо́гілкі, мо́гільнік -у *m.*

burial mound курга́н -а́ *m.*

buried ['berɪd] adj. пахава́ны; апу́шчаны пад ваду́, закапа́ны ў зямлю́: ***buried treasure*** закапа́ны *або́* зато́плены скарб

burin ['bjʊrɪn] n. разе́ц гравёра

burke [bɜ:rk] v.t. 1. душы́ць. 2. Figur. замя́ць (*спра́ву*); забараніць, зарэ́заць (*кні́гу*) пе́рад вы́хадам

burlap ['bɜ:rlæp] n. грубая́ тканіна; мешкаві́на *f.*

burlesque [bɜ:r'lesk] – n. 1. бурле́ска *f.* 2. паро́дыя, карыкату́ра *f.*
– v.t, v.i. высьме́йваць, рабіць паро́дыю
– adj. камічны, жарто́ўны

burly ['bɜ:rli] adj. **-lier, -liest** 1.вялі́кі, ду́жы. 2. рэ́зкі, бесцырымо́нны

Burmese [ˌbɜ:r'mi:z] – n. 1. бірма́нец -ца *m.*, бірма́нка *f.* 2. бірма́нская мо́ва
– adj. бірма́нскі

burn I [bɜ:rn] – v., **burned** or **burnt, burning,** v.i. 1. гарэ́ць. 2. апяка́цца. 3. адчува́ць гарачыню́, гарэ́ць: ***to burn with fever*** гарэ́ць у ліхама́нцы. 4. Figur. адчува́ць запа́л: ***to burn with enthusiasm*** гарэ́ць натхне́ньнем. 5. дава́ць сьвятло́: ***lamps were burning*** гарэ́лі ля́мпы. 6. мо́цна загарэ́ць, сьпячы́ся на со́нцы. 7. Chem. гара́ць; акісьля́цца. 8. Phys. выкарыста́ўваць я́дзерную энэ́ргію
– v.t. 1. пале́ць. 2. апяка́ць, апяка́цца апа́рвацца: ***He burned his hand*** Ён апёк руку́. 3. выпа́льваць (*узо́р*). 4. пячы́: ***Mustard and pepper burn the tongue*** Гарчы́ца й пе́рац пяку́ць язы́к. 5. абпа́льваць (*цэ́глу, гаршкі*). 6. пале́ць на вагні́ (*як пакара́ньне*)
– n. 1. апёк -у *m.* 2. а) ме́сца, пашко́джанае апёкам. б) вы́паленая дзі́рка. 3. мо́цны загар -у *m.*
• ***burn away*** а) спа́льваць. б) згара́ць
• ***burn down*** спале́ць *або́* згарэ́ць дашчэ́нту
• ***burn into*** прае́сьці: ***the acid has burned into the metal*** кіслата́ прае́ла мэта́л
• ***burn oneself out*** згарэ́ць, зьнясі́ліцца, вы́нішчыцца; ***he burned himself out by hard work*** ён зьнясі́ліўся ад цяжко́й пра́цы
• ***burn out*** а) спале́ць. б) перагарэ́ць, вы́гарэць; дагарэ́ць: ***The candle has burnt out*** Сьве́чка дагарэ́ла
• ***burn up*** а) згарэ́ць, спале́ць. б) спале́ць: ***the car burned up the gasoline*** машы́на спале́ла ўве́сь бэнзы́н

burn II [bɜ:rn] n. малы́ струме́нь, ручаёк -йка́ *m.*

burner ['bɜ:rnər] n. гарэ́лка *f.* (*у ля́мпе, га́завай пліце́*)

burning ['bɜ:rnɪŋ] adj. 1. пяку́чы; сьпяко́тны, гара́чы: ***burning sun*** сьпяко́тнае, гара́чае со́нца. 2. Figur. пяку́чы, гара́чы, па́лкі, жахлі́вы: ***a burning question*** пі́льнае пыта́ньне. 3. страшэ́нны, вялі́кі: ***a burning disgrace*** жахлі́вая га́ньба
• ***burning glass*** запа́льнае шкло (*увагну́тая лі́нза*)

burnish ['bɜ:rnɪʃ] – v.t. паліраваць (*мэ́блю*); чы́сьціць, глянцава́ць: ***to burnish copper*** чы́сьціць медзь
– v.i. бліскучэ́ць, рабіцца гла́дкім, бліскучым
– n. 1. палірову́ка *f.*, паліраванье *n.* 2. гля́нец -цу, бляск -у *m.*

burnisher ['bɜ:rnɪʃər] n. 1. паліра́льнік -а *m.* (*інструме́нт*). 2. палірова́льнік -а *m.* (*чалаве́к*), палірова́льшчыца *f.*

burnoose or **burnous** [bɜ:r'nu:s] n. бурно́с з башлыко́м, бу́рка *f.*

burnsides ['bɜ:rnsaɪdz] n., pl. бакенба́рды, ба́кі *pl.*

burnt [bɜ:rnt] v. *p.t. and p.p. of* **burn I** спа́лены; абгарэ́лы; абпа́лены: ***burnt trees*** абгарэ́лыя дрэ́вы

burnt-out [ˌbɜ:rnt'aut] adj. змо́раны, зму́чаны, сто́млены, зьнясі́лены, змардава́ны

burp [bɜ:rp] – n., Informal адры́жка *f.*
– v.i. адрыга́цца
– v.t. адрыгну́ць дзіця́

burr [bɜ:r] n. 1. це́рне *n.*; калю́чка *f.* 2. бор-машы́на *f.*, зубны́ сьве́рдзел. 3.

гартáннае вымаўлéньне гýку «р»: ***to speak with a burr*** картáвіць

burrow [ˈbɜːroʊ] – n. нарá *f.*
– v. 1. капáць, рыць нарý. 2. зарывáцца: ***to burrow under the blankets*** зарыцца пад кóўдры. 3. жыць у нары́. 4. хавáцца, закóпвацца, зашывáцца. 5. капáцца, рыцца

bursar [ˈbɜːrsər] n. скáрбнік -а *m.* (*навукóвае ўстанóвы*)

bursary [ˈbɜːrsəri] n, pl. **-ries** 1. канцыля́рыя скáрбніка. 2. Brit. стыпэ́ндыя *f.*

bursitis [bərˈsaɪtɪs] n. запалéньне сустáўнай сýмкі

burst [bɜːrst] – v., **burst, -ing**, v.i. 1. лóпаць; узрывáцца; выбухáць; прарывáцца (*пра нары́ў, гаці́ну*): ***The balloon burst*** Балён лóпнуў; ***The boiler burst*** Кацёл вы́бухнуў. 2. урывáцца, увáльвацца: ***to burst into a room*** уварвáцца ў пакóй. 3. расчыня́цца, разгóртвацца: ***to burst into bloom*** раптóўна расьцьвісьці́: ***The door burst open*** Дзьвéры рáптам расчыні́ліся. 4. Figur. выбухáць, успы́хваць: ***to burst into loud laughter, tears*** вы́бухнуць, залі́цца сьмéхам, сьлязьмі. 5. шугáць: ***to burst into flame*** шуганýць пóлымем
– v.t. 1. рвáць, прарывáць: ***to burst a blood vessel*** вы́клікаць разры́ў крывяно́снае судзі́ны; ***to burst chains*** парвáць ланцугі́. 2. узлóмваць (*замóк, сэ́йф*), вылóмваць (*дзьвéры*)
– n. 1. вы́бух -у *m.* (*сьмéху, пачуцця́*); спáзма *f.* (*кáшлю*); пары́лў -ву *m.* (*рáдасьці, злóсьці*). 2. прары́лў -ву *m.*: ***a burst of sunlight*** раптóўна прарвáлася сóнца. 3. вы́бух (*бóмбы*); залп -у *m.*
• ***burst in*** а) уварвáцца, раптóўна зьявíцца. б) перапыня́ць, умéшвацца
• ***burst out*** вы́крыкнуць, закрычáць

bury [ˈberi] v.t. **-ied, -ying** 1. хавáць (*памéрлага*). 2. прыкрывáць, хавáць; закóпваць, закóпваць: ***to bury one's face in one's hands*** закры́ць твар рукáмі. 3. Figur. закóпвацца, зарывáцца: ***to bury oneself in studies*** закапáцца ў вучóбе

burying ground мóгілкі, магі́лкі, клады́ *pl. only*

bus [bʌs] – n., pl. **-ses** or **-sses** аўтóбус -а *m.*
– v. вазíць *абó* éздзіць аўтóбусам

bus boy памагáты *абó* падрýчны афіцыя́нта

bush [bʊʃ] – n. 1. куст -á *m.* 2. дзíкі зарасьнік, хмызьня́к -ý, гушчáр -у *m.* 3. а) густáя чупры́на. б) лісíны хвост
– v.t. 1. абсáджваць *абó* засáджваць кустáмі. 2. Sl. стамíць, змардавáць, вы́матаць, змары́ць: ***I am bushed*** Я вы́матаная
– v.i. гýста разрастáцца
• ***beat around the bush*** абыхóдзіць вакóл пытáньня, круці́ць

bushed [bʊʃt] adj. 1. Informal змардавáны, вы́бітый зь сі́лаў . 2. які́ заблукáў у гушчары́. 3. ашалóмлены, зьбíты з панталы́ку

bushel I [ˈbʊʃəl] n. 1. бýшаль -ля *m.*, (*мéра ёмістасці*). 2. кош, кашá *m.* 3. Informal вялíкая кóлькасьць, мéрка *f.*

bushel II [ˈbʊʃəl] v. лáтаць, перашывáць вóпратку

bushy [ˈbʊʃi] adj. 1. касмáты, кудлáты, густы́ (*пра валасы, бróвы*). 2. зарóслы кустáмі, хмы́зам

business [ˈbɪznəs] n.1.заня́так -ку *m.*; прáца, рабóта *f.*; рамяствó *n.*; спрáва *f.*: ***Business comes before pleasure*** Прáца пéрад забáвай. 2. гáндаль -лю *m.*, гандлёвы абарóт: ***Big stores must do big business*** Вялíкія крáмы робяць вялíкі абарóт. 3. бíзнэс -у; гандлёвае прадпрыéмства, крáма *f.*, прамысловая фíрма: ***a bakery business*** пякáрня *f.* 4. спрáва, рэч *f.*: ***That's not your business*** Гэ́та ня вáшая спрáва; ***I am sick of the whole business*** Мне ўся́ гэ́тая гістóрыя абры́дла; ***to do business as usual*** прадаўжáць дзéяць, ня глéдзячы на перашкóды
• ***business is business*** спрáва спрáваї
• ***get down to business*** да спрáвы, узя́цца за спрáвы

• ***have no business*** не тваѝ спра́ва: ***You have no business doing this*** Не тваѝ спра́ва займа́цца гэ́тым
• ***Mind your own business*** Не твайго́ ро́зуму спра́ва; Ня сунь нос не ў сваю́ спра́ву
• ***on business*** па спра́вах
• ***We mean business*** Мы падыхо́дзім сур'ёзна да спра́вы

business college гандлёвая шко́ла
business hours гадзі́ны прыйма́; службо́выя гадзі́ны; гадзі́ны га́ндлю
businesslike дзелавы́; практы́чны
businessman ['bɪznɪsmæn] n., pl. **-men** бізнэсо́вец -ўца *m.*, камэрса́нт -а *m.*, прадпрыма́льнік -а *m.*
busman ['bʌsmən] n., pl. **-men** шафёр, кіро́ўца аўто́буса
bust [bʌst] n. 1. бюст -а *m.* (*скульпту́ра*). 2. гру́дзі *pl.* 3. жано́чыя гру́дзі
bustle ['bʌsəl] – v.i. мітусі́цца, сьпяша́цца
– v.t. падганя́ць
– n. мітусьня́, беганіна, сумятня́ *f.*
bustling ['bʌslɪŋ] adj. сумятлі́вы
busy ['bɪzi] – adj. **-sier, -siest** 1. працо́ўны, дзе́йны, заня́ты: ***a busy person*** чалаве́к, заня́ты пра́цай; ***a busy day*** заня́ты дзень; ***a busy street*** заня́тая шу́мная ву́ліца зь вялі́кім ру́хам. 2. (*пра тэлефо́н*) заня́ты. 3. які́ суе́ нос не ў сваё: ***busy body*** мітусьлі́вы. 4. Informal крыкля́вы, страка́ты: ***a busy wallpaper*** крыкля́выя шпале́ры
– v.t. **busied, busying** даць рабо́ту, заня́так
– v.i. займа́цца, быць заня́тым
busyness ['bɪzinəs] n. заня́тасьць *f.*
but [bʌt] – conj. 1. а, а́ле, адна́к: ***It rained but he went anyway*** Быў дождж, а́ле ён усё ро́ўна пайшо́ў. 2. хіба́ то́лькі; як не: ***What can I do but confess*** Што я магу́ зрабі́ць, як не прызна́цца. 3. што: ***I don't doubt but he will come*** Я не сумняю́ся, што ён прыйдзе
– prep. за вы́няткам, апрача́, то́лькі не: ***all but one*** усе́ апрача́ аднаго́
– pron. хто б не: ***There is no one but knows it*** Нама́ ніко́га, хто б ня ве́даў гэ́тага
– adv. то́лькі, усяго́, ня больш як: ***He saw him but today*** Ён ба́чыў яго́ то́лькі сёньня; ***She is but five years old*** Ёй усяго́ пяць гадо́ў
• ***all but*** ама́ль, бліз́у: ***He all but died*** Ён ледзь не памёр
• ***but for*** за вы́няткам, апрача́

butcher ['bʊtʃər] – n. 1. мясні́к -а́ *m.*; разні́к -а́ *m.* 2. брута́льны забо́йца
– v.t. 1. забіва́ць, ра́заць (*на мя́са*): ***a butchered animal*** зара́заная жывёліна. 2. брута́льна забіва́ць. 3. псава́ць, парта́чыць: ***The tailor has butchered his suit*** Краве́ц спарта́чыў яго́ны гарні́тур
butcher knife во́стры нож для мя́са
butcherly ['bʊtʃərli] – adj. разьні́цкі
– adv. па-зьве́рску, лю́та
butcher shop мясна́я кра́ма
butchery ['bʊtʃəri] n., pl. **-eries** 1. разьня́, ма́савыя забо́йствы. 2. а) бо́йня *f.* б) мясна́я кра́ма. 3. ра́заньне, забіва́ньне жывёлы
butler ['bʌtlər] n. лёкаій -я *m.*, прыслу́жнік -а *m.*
butt I [bʌt] n. 1. таўсьце́йшы канец (*прыла́ды*), прыкла́д -а *m.* (*збро́і*), камле́ль -ля́ *m.* (*дра́ва*). 2. канле́ц -ца́ *m.*, аста́тлак -ку *m.*; недаку́рлак -ка *m.* 3. Sl. цыгара́та *f.* 4. Sl. аза́длак -ка *m.* (*у чалаве́ка*); зад -а *m.* (*у жывёлы*)
butt II [bʌt] – n. 1. прадме́т кпі́наў, пасьме́шышча *n.* 2. мішэнь, ма́та *f.* (*для страля́ньня*). 3. стык, прыты́к -у *m.* (*до́шак ці бэ́лек*). 4. заве́са *f.* (*у дзьвяра́х, во́кнах*)
– v. сутыка́ць, прытыка́ць
• ***the butts*** стра́льбішча *n.*
butt III [bʌt] – v.t. 1. басьці́, піха́ць, біць ло́бам, як каза́. 2. абра́зваць няро́ўныя канцы́
– v.i. 1. баро́цца, басьці́ся, бі́цца ло́бам *або́* рага́мі: ***a goat butts*** каза́ бадзе́цца. 2. выступа́ць, высо́ўвацца, вытыркацца

– n. удáр рагáмі
• ***butt in,*** Sl. сóвацца, сýнуцца (*не ў сваё*); замінáць; улáзіць

butt IV [bʌt] n. 1. бóчка (*для віна́ ці пі́ва*) 2. бóчка (*адзі́нка ме́ры*)

butter ['bʌtər] – n. 1. мáсла *n.* 2. густóе павíдла: ***apple butter*** я́блычнае павíдла
– v.t. 1. мáзаць мáслам, мáсьліць. 2. Informal мóцна падлíзвацца
• ***butter up*** падмáзвацца, падлíзвацца да *каго́*

buttercup ['bʌtərkʌp] n. казялéц -ьцá *m.*, куры́ная сьлепатá

butterfly ['bʌtərflaɪ] n., pl. **-flies** маты́ль -я́ *m.*, матылёк -ькá *m.*

buttermilk ['bʌtərmɪlk] n. масьля́нка *f.*

butterscotch ['bʌtərskɑ:tʃ], n. карамэ́лька *f.* (*цукéрка*)

buttery I ['bʌtəri] adj. 1. мáсьлены; памáзаны мáслам. 2. Informal падлíзьніцкі: ***buttery manners*** падлíзьніцкія манéры

buttery II ['bʌtəri] n., pl. **-teries** кладóўка *f.*

buttock ['bʌtək] n., Anat. я́гадзіца *f.*

buttocks ['bʌtəks] n., pl. я́гадзіцы *pl.*, азáдак -ка *m.*

button ['bʌtən] – n. 1. гýзік -а *m.* 2. пупы́шка *f.* (*квéткі*), малады́ грыбóк. 3. значóк -кá *m.*
– v.t. 1. зашпіля́ць на гýзікі. 2. прышываць гýзікі. 3. (*у фэхтава́ньні*) дакранáцца канцóм шпáгі. 4. Informal зачыня́ць, заціскáць шчы́льна: ***I buttoned my mouth and did not reply*** Я сьці́снуў вýсны і не адказáў
• ***button up,*** Informal давéсьці справу да канцá, здавальня́юча ўлáдзіць
• ***on the button,*** Informal дакладна, якрáз

buttonhole ['bʌtənhoʊl] – n. 1. пятля́ *f.*, *pl.* пéтлі, пяцéлька *f.* 2. Brit., Informal квéтка ў пятлíцы, бутаньéрка *f.*
– v.t. рабíць пяцéлькі

buttonless ['bʌtənləs] adj. бяз гýзіка(ў)

buxom ['bʌksəm] adj. здарóвы, дзябёлы

buy [baɪ] – v., **bought, buying** 1. купля́ць. 2. падкупля́ць: ***Two members of the jury had been bought*** Два прысяжны́я былí падкýпленыя. 3. адкупля́ць, купля́ць. 4. Sl. прымáць за праўдзívае, вéрыць: ***I've heard but I don't buy it*** Я чуў пра гэ́та, але я ня вéру
– n., Informal пакýпка *f.*, набы́т|ак -ку *m.* 2. Informal недарагáя кýпля: ***It's a real buy*** Гэ́та сапраўды́ дóбрая пакýпка
• ***buy off*** адкупíць, адкупíцца
• ***buy out*** перакупíць; вы́купіць, вы́купіцца
• ***buy over*** падкупíць
• ***buy up*** скупíць

buyer ['baɪər] n. пакýпнік -á *m.*, пакýпніца *f.*; пакупл|éц -цá *m.*; скýпнік -а *m.*

buyer's market ры́нак, запóўнены тавáрамі зь нíзкімі цэ́намі

buzz [bʌz] – n. 1. бзы́каньне *n.*, бзык -у *m.*, гудзéньне *n.* (*камарóў*). 2. гул, гóман -у *m.* (*людзкíх галасóў*). 3. чýтка *f.*; шэпт -у *m.*, пóгаласкі *pl.* 4. Informal тэлефóнны званóк: ***Give me a buzz*** Патэлефануй мне.
– v.i. 1. бзы́каць, бзычэ́ць (*пра му́ху*); гудзéць (*пра камарóў*); шумéць, гаманíць (*пра людзéй*). 2. завіхáцца; круцíцца, мітусíцца. 3. плятка́рыць
– v.t. 1. перакáзваць плёткі, пушчáць пагалóскі. 2. Informal званíць па тэлефóне; выклікáць званкóм: ***He buzzed his secretary*** Ён вы́клікаў сваю́ сакратáрку
• ***buzz about*** круцíцца, увіхáцца каля *каго́*

buzzard ['bʌzərd] n. кáня *f.* (*птýшка*)

buzz bomb лятýчая бóмба, бóмба-рóбат

buzzer ['bʌzər] n. 1. званóк -кá *m.* 2. сыгнáл -у *m.*

by [baɪ] – prep. 1. а) блíзка; пóбач, ля: ***by a river*** каля рэ́чкі, блíзка рэ́чкі; ***Sit by me*** Сядзь каля́ мянé. б) паўз, мíма; за: ***a path by the river*** сьцéжка паўз рэ́чку; ***We went by the house***

Мы прайшлі мі́ма до́му. 2. па, праз: ***by the way*** а) па даро́зе. б). між і́ншым; ***to go by the bridge*** е́хаць (ісьці́) праз мост. 3. (*тво́рны скло́н без прыназо́ўніка*) а): ***to destroy by fire*** зьні́шчыць агнём. б) ***to travel by train*** падаро́жнічаць цягніко́м. 4. на, а) (*пры мно́жаньні, дзяле́ньні або́ падава́ньні памера́ў*): ***multiply by two*** памно́жыць на два: ***a room five by six metres*** пако́й пяць мэ́траў на шэсьць. б) ***to sell by the pound*** прада́ваць на фу́нты. в) ***taller by a head*** вышэ́йшы на галаву́; ***larger by half*** бо́льшы на пало́ву. 5. зго́дна з *чым*: ***by agreement*** зго́дна з умо́вай; ***by law*** зго́дна з зако́нам. 6. каля, не пазьне́й, як: ***be there by nine o'clock*** будзь там каля́ дзявя́тае гадзі́ны. 7. у, у ча́се: ***by day*** удзе́нь; ***by night*** уно́чы. 8. па: ***step by step*** крок па кро́ку, паступо́ва; ***little by little*** патро́шку, паступо́ва; ***little by little*** пакрысе́

– adv. 1. тут жа, каля́: ***near by*** бліз-ка. 2. мі́ма, паўз: ***days gone by*** мінýлі дні; ***A car dashed by*** Пранёсся а́ўта. 3. набо́к, збо́ку; недалёка: ***to put something by*** пакла́сьці не́шта збо́ку

• ***by all means*** а) усяля́кімі спо́сабамі. б) (*у адка́зе на пыта́ньне*): калі́ ла́ска, безумо́ўна

• ***by and by*** неўзаба́ве, у хýткім ча́се, за́раз

• ***by and large*** наагýл, агýлам, агýльна

• ***by chance*** выпадко́ва

• ***by oneself*** а) адзі́н; сам. б) сам па сабе́, безь нічыёй дапамо́гі (*зрабі́ць што*)

• ***by the by*** 1. дарэ́чы; між і́ншым. 2. выпа́дкам, выпадко́ва

• ***by the way*** а) на краі́ даро́гі; на або́чыне: ***We stopped by the way to eat*** Мы спыні́ліся па даро́зе, каб пад'е́сьці. б) дарэ́чы; між і́ншым

by-bidder ['baɪbɪdər] n. асо́ба, яка́я падбіва́е цэ́ны (*на ліцыта́цыі*)

by-blow ['baɪbloʊ] n. 1. уда́р у бок; выпадко́вы ўда́р. 2. няшлю́бнае дзіця́

bye-bye [baɪ'baɪ] interj., Informal = **good-bye** быва́й

by-election ['baɪˌlekʃən] n. дадатко́выя вы́бары, давы́бары

Byelavezha forest Белаве́ская пу́шча

Byelorussian [bɪˌeloʊ'ru:ʃən] adj., *гл.* **Belarus(i)an**

bygone ['baɪgɔ:n] – adj. мінýлы; да́ўні, даўне́йшы, былы́: ***bygone centuries*** мінýлыя, да́ўнія стаго́дзьдзі

– n. 1. не́шта мінýлае, было́е. 2. мінýўшчына *f.*

• ***let bygones be bygones*** дарава́ць і забы́цца (*старо́е*)

bylaw ['baɪlɔ:] n. 1. статýт арганіза́цыі. 2. пабо́чны, другара́дны зако́н *або́* пра́віла. 3. Brit. зако́н, уве́дзены мясцо́вымі ўла́дамі

by-name ['baɪneɪm] n. мянýшка *f.*

by-pass ['baɪpæs] – n. 1. аб'е́зд -у *m.*, аб'е́зная даро́га. 2. Med. шунт -а *m.*, абыхо́д каранарных сасýдаў. 3. Electr. адгалі́нава́ньне (*электры́чнага ка́бэля, то́ку*), шунт -а *m.*

– v.t. 1. абыхо́дзіць, аб'яжджа́ць. 2. абміна́ць. 3. не зварача́ць ува́гі, ігнарава́ць

by-path ['baɪpæθ] n. бо́чная сьце́жка, даро́жка *f.*

by-product ['baɪˌprɑ:dəkt] n. пабо́чны прадýкт

by-road ['baɪroʊd] n. бо́чная даро́га

bystander ['baɪˌstændər] n. старо́ньні, выпадко́вы назіра́льнік *або́* глядач

by-street ['baɪstri:t] n. бо́чная вýліца

byway or **by-way** ['baɪweɪ] n. бо́чная даро́га *або́* сьце́жка; глуха́я даро́га

by-word ['baɪwɜ:rd] n. 1.прыма́ўка, прыка́зка *f.* 2. увасабле́ньне *n.*, прыклад: ***a by-word of inequity*** увасабле́ньне несправядлі́васьці

Byzantian [bɪ'zæntiən] or **Byzantine** [bɪ'zæntaɪn] – adj. бізанты́йскі

– n. бізанты́ец -йца *m.*, бізанты́йка *f.*

C

C, c [si:] n., pl. **C's, c's** 1. *трэ́цяя лі́тара англе́льскага альфабэ́ту.* 2. трэ́ці гату́нак: ***grade C canned fish*** рыбныя кансэ́рвы 3-га гату́нку. 3. пасрэ́дна (*шко́льная адзна́ка*). 4. Mus. до (*но́та*)

cab [kæb] n. 1. такс**і́** *n., indecl.* 2. дро́жкі *pl. only.* 3. бу́дка машыні́ста *або́* шафёра

cabal [kə'bɑ:l] – n. 1. палітычная кліка. 2. та́йныя пля́ны, змо́ва, інтрыга *f.*
– v.i. тварыць кліку, рабіць змо́ву

caballer [kə'bɑ:lər] n. інтрыга́н -а *m.*

cabana [kə'bænə] n. 1. кабі́нка на пля́жы. 2. бу́дка, ха́тка *f.*

cabaret ['kæbəreɪ] n. кабарэ́ *n., indecl.* а) рэстара́н з эстра́днымі вы́ступамі. б) эстра́дны вы́ступ у кабарэ́

cabbage I ['kæbɪdʒ] – n. капу́ста *f.*
– adj. капу́сны

cabbage II ['kæbɪdʒ] – n., Brit., Sl. падрадко́ўнік -у *m.*, шпарга́лка *f.*
– v.t. Informal сьцягну́ць, сьві́снуць (*укра́сьці*)

cabbagehead ['kæbɪdʒhed] n. 1. качан капу́сты. 2. Informal вялі́кая кру́глая галава́. 3. Informal бязмо́зглая галава́, тупі́ца

cabbages and kings гаро́х з капу́стай

cabby or **cabbie** ['kæbi] n., pl. **-bies** 1. такс**і́**ст -а *m.* 2. рамі́зьнік - а *m.*

cabin ['kæbɪn] – n. 1. хаці́на *f.*; ха́тка, бу́дка *f.*; бара́к -а *m.*: ***a summer cabin*** ле́тнік -у *m.*, да́ча *f.* 2. кабі́на *f.* (*у самалёце*). 3. каю́та *f.* (*на караблі́*)
– v.i. жыць у бара́ку, бу́дцы

cabin boy ю́нга -і *m.* (*на караблі́*)

cabinet ['kæbɪnət] n. ша́фка *f.*: ***a kitchen cabinet*** кухо́нная ша́фка

Cabinet, Brit. кабі́нэ́т міні́страў

cabinetmaker ['kæbɪnətˌmeɪkər] n. мэ́блевы сталя́р

Cabinet meeting пасе́джаньне кабінэ́ту

Cabinet minister ся́бра брыта́нскага кабінэ́ту

cabinetwork ['kæbɪnətwɜ:rk] n. то́нкая сталя́рская рабо́та

cable ['keɪbəl] – n. 1. кана́т -а *m.* 2. я́карны ланцу́г *або́* кана́т. 3. ка́бель -я *m.* (*электры́чны — падво́дны, назе́мны*). 4. тэлегра́ма *f.*
– v.t. 1. зьвя́зваць, прывя́зваць кана́там. 2. тэлеграфава́ць

cablegram ['keɪbəlgræm] n. тэлегра́ма *f.*

cable railway (road) фунікулёр -а *m.*

cabman ['kæbmæn] n., pl. **-men** рамі́зьнік -а *m.*; шафёр такс**і́**, такс**і́**ст -а *m.*

caboose [kə'bu:s] n. 1. службо́вы ваго́н у тава́рным цягні́ку́. 2. ку́хня *f.* (*на па́лубе караблі́*)

cab rank (stand) стая́нка такс**і́** *або́* рамі́зьнікаў

cacao [kə'kaʊ] n., pl. **-caos** какава́, *indecl.*

cache [kæʃ] – n. 1. схо́ванка *f.*, схо́вішча *n.*, схо́вань *f.* 2. схава́ныя запа́сы
– v.t. кла́сьці, склада́ць у схо́вішча, хава́ць
– v.i. сядзе́ць у схо́ванцы; хава́цца

cackle [ˈkækəl] – v.i. 1. куда́хтаць (*пра ку́рыцу*). 2. хіхі́каць. 3. балбата́ць – n. 1. куда́хтаньне *n.* 2. хіхі́каньне *n.* 3. гамана́, балбатня́ *f.*

cacophonous [kæˈkɑ:fənəs] adj. какафані́чны, непрые́мны для слы́ху, немілагу́чны

cacophony [kæˈkɑ:fəni] n., pl. **-nies** какафо́нія *f.*, негармані́чнае спалуча́ньне музы́чных гу́каў

cactaceous [kækˈteɪʃəs] adj. ка́ктусавы

cactus [ˈkæktəs] n., pl. **-tuses, -ti** ка́ктус -а *m.*

cad [kæd] n. грубія́н -а *m.*

cadaver [kəˈdævər] n. труп -а *m.*

cadence [ˈkeɪdəns] n. 1. рытм, такт -у *m.* (*у му́зыцы*). 2. зьніжэ́ньне го́ласу. 3. мадуля́цыя *f.* 4. Mus. кадэ́нцыя *f.* 5. інтана́цыя *f.*

cadet [kəˈdet] n. 1. кадэ́т -а *m.* (*вайско́вы*). 2. студэ́нт вае́ннае акадэ́міі. б) Brit. студэ́нт вае́ннага кале́джу. 3. а) мало́дшы сын *або́* брат. б) наймало́дшы сын

cadge [kædʒ] – v.t. жабрава́ць, выкле́нчваць – v.i. жабрава́ць, папраша́йнічаць, ка́ньканаць

cadger [ˈkædʒər] n. папраша́йка -і *m.*

cadre [ˈkædri] n. 1. ка́дры *pl.* (*вайско́выя або́ рабо́тніцкія*). 2. схе́ма *f.*; касьця́к -а́ *m.*

caducity [kəˈdu:səti] n. 1. старэ́чая кво́ласьць, ляда́шчасьць, састарэ́ласьць. 2. нетрыва́ласьць, тле́ннасьць

Caesar [ˈsi:zər] n. 1. а) Цэ́зар (*імя́*). б) цэ́зар -а *m.* (*ты́тул*). 2. імпэра́тар -а, ке́сар -а *m.* 3. аўтакра́т -а, дыкта́тар -а *m.*

Caesarean or **Caesarian** [sɪˈzeriən] adj. 1. Цэ́зараў. 2. цэ́сарскі: ***the Caesarean succession*** цэ́сарскае насту́пства паса́ду

Caesarean operation or **section** ке́сарава сячэ́ньне

cafe [kæˈfeɪ] n. 1. невялі́кі рэстара́н -у *m.* 2. бар -у *m.* 3. кавя́рня *f.*

cafeteria [ˌkæfəˈtɪriə] n. кафэтэ́рыі -ю *m.*, стало́вая *f.*, стало́ўка з сыстэ́май самаабслуго́ўваньня

caffein(e) [ˈkæfi:n] n. кафэ́ін -у *m.*

cage [keɪdʒ] – n. 1. кле́тка *f.* (*для зьвяро́ў, пту́шак*). 2. вастро́г -у *m.* 3. пад'ёмная кле́тка ў ліфце. 4. бра́мка ў хаке́і – v.t. садзі́ць у кле́тку, трыма́ць у кле́тцы

cajole [kəˈdʒoʊl] – v.t. ла́шчыцца, ліслі́віць. 2. задо́брываць, зьмякча́ць: ***to cajole someone into doing something*** падгаварыць *ка́го* зрабі́ць *што* – v.i. паддо́брывацца, падла́шчвацца, падлі́звацца

cake [keɪk] n. 1. піро́г -ага́, торт -а *m.* 2. бліна́ -ы́ *m.* 3. ала́дка, катле́та *f.*: ***a fish cake*** рыбна́я катле́та

• ***a cake of soap*** кава́лак мы́ла

• ***a piece of cake*** не́шта, што лёгка зрабі́ць ці атрыма́ць

• ***take the cake,*** Sl. а) узя́ць пе́ршую ўзнагаро́ду. б) перавы́сіць усі́х

cake mix парашо́к для піра́га

cake and ale до́брыя рэ́чы, прые́мнасьці жыцьця́

calamitous [kəˈlæmətəs] adj. згу́бны, пагі́бельны, катастрафі́чны

calamity [kəˈlæməti] n., pl. **-ties** 1. вялі́кае няшча́сьце, бяда́ *f.* 2. катастро́фа *f.*

calamity howler ны́цік, пэсымі́ст -а *m.*, пэсымі́стка *f.*

calcareous [kælˈkeriəs] adj. 1. ва́пнавы. 2. ка́льцыевы

calciferous [kælˈsɪfərəs] adj. 1. які́ ма́е ў сабе́ кальцыт. 2. які́ ўтвара́е ка́льцыевыя со́лі

calcify [ˈkælsɪfaɪ] v.t., v.i. ператвара́ць (-ца) ў ва́пну, цьвярдзе́ць

calcite [ˈkælsaɪt] n. кальцы́т -у *m.*

calcium [ˈkælsiəm] n., Chem. ка́льцыі -ю *m.*

calculable [ˈkælkjələbəl] adj. 1. вылічальны, які́ мо́жна падлічы́ць. 2. пэ́ўны, надзе́йны, на які́ мо́жна разьлі́чваць

calculate ['kælkjəleɪt] – v.t. вылічáць, падлічáць, калькуляваць
– v.i. спадзявáцца, разьлíчваць
calculating ['kælkjəleɪtɪŋ] adj. 1. лічы́льны, падлікóвы. 2. асьцярóжны, празóрлівы. 3. схíльны да інтрыгаў; эгаістычны, карысьлівы
calculating machine лічы́льная машы́на
calculation [ˌkælkjə'leʃən] n. 1. лічэ́ньне, вылíчваньне *n.*, калькуля́цыя *f.* 2. вылічэ́ньні *pl.* 3. прадбáчлівае плянаванáньне *n.*
calculator ['kælkjəleɪtər] n. 1. вылічáльнік -а *m.* (*асóба абó апарáт*). 2. калькуля́тар -а *m.*
calculus ['kælkjələs] n., pl. **-li** 1. кáмень (*у ны́рках*). 2. pl. **-luses,** Math. дыфэрэнцыя́льнае і інтэгрáльнае вылічэ́ньне
caldron or **cauldron** ['kɔ:ldrən] n. вялíкі казáн, кацёл
Caledonian [ˌkælɪ'douniən] – adj., Poet. шкóцкі
– n. шкот -а *m.*
calendar ['kæləndər] – n.1. каляндáр -лендарá *m.* 2. пералíк спрáваў для разгля́ду ў судзе́. 3. вучэ́бны плян *абó* праграмá ўнівэрсытэ́цкага гóду
– v.t. упíсваць у каляндáр; каталягаванáць у храналягíчным парáдку (*дакумэ́нты*) ***calendar month (year)*** каляндáрны мéсяц (год)
calf I [kæf] n., pl. **calves** [kævz] 1. цялё *n.* (*карóвы*). 2. малы́ кіт; фóкla -i *m.*; сланянё *n.* 3. цяля́чая скýра. 4. Informal цялё (*пра няўдáлага хлапцá ці дзецюкá*). 5. áйсбэрг -у *m.*, крыга *f.*
• ***in/with calf*** цéльная карóва
calf II [kæf] n., pl. **calves** лы́тка *f.*
calf love, Informal дзіця́чае, падлéткавае каханьне
calfskin ['kæfskm] n. цяля́чая скýра (*і вы́рабленая*)
caliber ['kæləbər] n. or **calibre** 1. калíбар -ру *m.* 2. я́касьці, здóльнасьці *pl.*: ***men of caliber*** здóльныя лю́дзі
calibrate ['kæləbreɪt] v.t. 1. калібраваць. 2. вызначáць калíбар
calico ['kælɪkou] – n., pl. **-coes** or **-coes** набіваны паркáль
– adj. 1. паркалёвы. 2. рабы́, пярэ́сты: ***a calico mare*** пярэ́стая кабы́ла
caliph ['keɪlɪf] n. калíф -а *m.*
caliphate ['kælɪfeɪt] n. калíфат -у *m.*
calk I [kɔ:k] v.t. замáзваць (*расшчэ́піну, злучэ́ньне*)
calk II [kɔ:k] – n. 1. гак, гáка *m.* (*на кóнскай падкóве*). 2. падкóўка *f.* (*на абýтку*)
– v.t. 1. падкаваць (*каня́*). 2. падбíць падкóўкі (*на абцáсе*)
calk III [kɔ:k] v.t. калькаваць, здымáць кóпію
call [kɔ:l] – v.t. 1. клíкаць, заклікáць, загáдваць: ***He called us to help him*** Ён паклíкаў нас, каб дапамаглí ямý; ***He called a cab*** Ён вы́клікаў таксí; ***to call to order*** заклікáць да парáдку. 2. а) склікáць, даваць сыгнáл. б) вабіць, прынáджваць (*зьвярá*). 3. выклікáць: ***to call the roll of the class*** правярáць прысýтнасьць вýчняў. 4. будзíць. 5. заць, называ́ць: ***They called him George*** а) Ягó назвáлі Юркам. б) Ягó звáлі Юркам; ***to be called*** звáцца, называ́цца; ***the so-called*** гэ́так звáны. 6. тэлефанаваць, званíць. 7. лічы́ць, уважáць: ***I call this a good house*** Я лічý, што гэ́та дóбры дом. 8. дамагáцца, жадáць: ***The bank called my loan*** Банк зажадáў пóўнае сплáты маёй пазы́кі. 9. абвяшчáць, прадказваць, прадбáчваць: ***The forecast calls for rain*** Прагнóз надвóр'я прадказвае дождж
– v.i. 1. гóласна гаварыць, крычáць; гукáць: ***He called from outside*** Ён гукнýў звóнку. 2. навéдваць: ***to call on a sick friend*** навéдаць хвóрага сябру
– n. 1. гукáньне *n.*, крык -у *m.* 2. гукавáя прынáда (*на зьвярá, птýшку*). 3. сыгнáл трубы́ (*у вóйску*). 4. заклік, зварóт -у *m.*, клíканьне *n.*; за-

про́сіны *pl. only.* 5. дзелавы́ візы́т; наве́даньне хво́рага ле́карам. 6. каро́ткія адве́дкі. 7. тэлефо́нны званок: ***There is a call for you*** Цябе́ про́сяць да тэлефо́на

• ***be on/at call*** а) быць гато́вым на ко́жны вы́клік (зага́д). б) быць на дыжу́ры

• ***call back*** а) кліка́ць наза́д, адкліка́ць; адтэлефанава́ць *каму́*. б) узя́ць наза́д: ***to call back one's words*** узя́ць сваé сло́вы наза́д

• ***call down*** зга́ніць, нага́ніць

• ***call in*** а) запрасі́ць, паклі́каць. б) патрабава́ць, дамага́цца вярта́ньня (*до́ўгу*). в) здыма́ць з ужы́тку: ***call in a book*** сканфіскава́ць кні́гу, зьняць з про́дажу

• ***call into being, existence*** паклі́каць да жыцьця́, ажыцьцяві́ць

• ***call off*** а) адкліка́ць. б) забра́ць: ***Call off your dog*** Забяры́це свайго́ саба́ку

• ***call on*** зайсьці́ся да *каго́*, адве́даць *каго́*

• ***call out*** а) кры́кнуць, гукну́ць. б) выкліка́ць во́йска (*на дапамо́гу цывільным ула́дам*)

• ***call up*** а) выкліка́ць успамі́ны, прыпо́мніць. б) патэлефанава́ць *каму́*, пазвані́ць *каму́*. в) прызыва́ць у во́йска

• ***within call*** бліза́ка, паблі́зу

caller ['kɔ:lər] n. госьць, гасьця́ *m.*, го́сьця *f.*; наве́днік -а *m.*

calligrapher [kə'lɪgrəfər] n. 1. чалаве́к з прыго́жым по́чыркам, калігра́ф -а *m.* 2. перапі́счык ру́капісаў

calligraphic [ˌkælɪ'græfɪk] adj. каліграфі́чны

calligraphy [kə'lɪgrəfi] n. 1. по́чырк -у *m.*, прыго́жы по́чырк. 2. калігра́фія *f.*

calling ['kɔ:lɪŋ] n. 1. заня́т|ак -ку *m.*, прафэ́сія *f.* 2. заклі́каньне, кліканьне *n.*, запро́сіны *pl.only*: ***the calling of the bells to prayer*** заклі́каньне званоў на малі́тву. 3. паклі́каньне *n.*

callosity [kə'lɑ:səti] n., pl. **-ties** 1. зацьвярдзе́ньне на ску́ры; мазо́ль -аля́ *m.* 2. бяздушнасьць, таўстаску́расьць *f.*

callous ['kæləs] adj. 1. цьвярды́, зацьвярдзе́лы, мазалі́сты. 2. нячу́лы, бяздушны, таўстаску́ры

callow ['kælou] adj. 1. малады́ й недасьве́дчаны, неспрактыкава́ны, зялёны. 2. не зусі́м разьві́ты. 3. бясьпёры (*пра птушак*)

call slip блянк для замо́вы кні́гі ў бібліятэ́цы

calm [kɑ:m] – adj. 1. ці́хі, спако́йны; заці́шны: ***a calm evening*** ці́хі ве́чар; ***a calm sea*** спако́йнае мо́ра. 2. спако́йны, ураўнава́жаны

– n. 1. спако́й -ю *m.*, ці́ша *f.*; заці́шша *n.* 2. супако́й -ю *m.*, ціхамі́рнасьць *f.*

– v.t. 1. суніма́цца, суці́швацца. 2. суці́швацца: ***The sea calmed*** Мо́ра суці́шылася. 3. супако́йвацца, ціша́ць, астыва́ць (*ад гне́ву*)

calmly ['kɑ:mli] adv. спако́йна, стры́мана, вы́трымана

calmness ['kɑ:mnəs] n. ці́ша, ці́шыня́ *f.*, спако́й -ю *m.*

caloric [kə'lɔ:rɪk] – n. цеплыня́ *f.*

– adj. цеплавы́, каляры́йны

calorie ['kæləri] or **calory** n., pl. **-ries** калёрыя *f.*

calorific [ˌkælə'rɪfɪk] adj. цеплатво́рны

calorimeter [ˌkælə'rɪmətər] n. калярыма́т|ар -ра *m.*

calumniate [kə'lʌmnieɪt] v.t. паклёпнічаць, ачарня́ць, чарні́ць; абылга́ць

calumniation [kəˌlʌmni'eɪʃən] n. 1. паклёпнічаньне *n.*, зло́снае зьнеслаўле́ньне. 2. паклёп -у *m.*, зло́сны абгаво́р

calumniator [kə'lʌmnieɪtər] n. паклёпнік -а *m.*, паклёпніца *f.*

calumnious [kə'lʌmniəs] adj. паклёпніцкі

calumny ['kæləmni] n., pl. **-ies** паклёп -у *m.*, паклёпніцкія вы́думкі

Calvary ['kælvəri] n. Гальго́та *f.*

calvary ['kælvəri] n. 1. Гальго́та *f.* (*выя́ва расьпя́цьця*). 2. вялі́кія асабі́стыя цярпе́ньні *або́* ця́жкасьці

calve [kæv] – v.i. цяліцца

– v.t. нарадзі́ць (*цялё*)

calves I [kævz] n. pl. цяля́ты

calves II [kævz] n. pl. лы́ткі

calyx ['keılıks] n., pl. **calyxes** or **-ces** 1. Bot. падвяно́члак -ка *m.* (*кве́ткі*). 2. Anat., Zool. рэ́пка

Cambodian [kæm'boudiən] – adj. камбаджы́йскі
– n. жыха́р Камбо́джы

cambric ['keımbrık] n. батыст -у *m.* (*тканіна*)

camel ['kæməl] n. вярблю́д -а *m.*

camelback ['kæməlbæk] n. горб вярблю́да

cameleer [ˌkæmə'lır] n. 1. паганя́ты вярблю́даў. 2. жаўне́р на вярблю́дзе

camellia n. [kə'mi:liə] камэ́лія *f.* (*дрэ́ва й кве́тка*)

camel's hair вярблю́джая шэрсьць *або́* падме́на яе́ (*напр. з вавёрчынага хваста́*)

camelhair ['kæməlher] adj. зро́блены зь вярблю́джае шэ́рсьці

cameo ['kæmiou] n., pl. **-eos** камэ́я *f.*

camera ['kæmərə] n., pl. **-eras** 1. фатаграфічны апара́т. 2. pl. **-erae** кабінэ́т судзьдзі́
• ***in camera*** а) у судзьдзёўскім прыва́тным кабінэ́це. б) асабі́ста, прыва́тна: ***to tell in camera*** сказа́ць прыва́тна
• ***on camera*** ужыву́ю пе́рад тэлека́мэрай

cameraman ['kæmrəmæn] n., pl. **-men** фотарэпартэ́р, кінаапэра́тар -а *m.*, тэлевізійны апэра́тар

camomile ['kæməmaıl] n. румя́нак -ку *m.*

camouflage ['kæməflɑ:ʒ] – n. 1. камуфля́ж -у *m.*, маскава́ньне *n.*, маскіро́ўка *f.* 2. хі́трасьць *f.*, хі́трыкі для адво́ду вачэ́й
– v.t. маскава́ць
– v.i. маскава́цца

camp [kæmp] – n. 1. ля́гер -у *m.* 2. намёт, бу́дка для часо́вага жыцьця́. 3. жыцьцё ў намёце, шалашы́. 4. ля́гер -у *m.* (*грама́дзка-палі́тычны*)
– v.i стая́ць, разьмяшча́цца ля́герам
– v.t. разьмяшча́ць у ля́геры
– adj. ля́герны
• ***be in the same camp*** быць у зго́дзе, супрацо́ўнічаць
• ***break camp*** разьбіра́ць ля́гер
• ***camp out*** начава́ць пад адкры́тым не́бам

campaign [kæm'pem] – n. 1. пахо́д -у *m.*, а́кцыя *f.* 2. кампа́нія *f.*: ***a campaign to raise money*** кампа́нія збо́ру гро́шай; ***a campaign to elect someone*** агітацы́йная кампа́нія, каб вы́браць *кага́*
– v.i. 1. браць удзе́л у пахо́дзе. 2. агітава́ць, правóдзіць кампа́нію

campaigner [kæm'pemər] n. удзе́льнік кампа́ніі *або́* пахо́ду

camp bed раскладны́ ло́жак

camp chair раскладно́е крэ́сельца

camphor ['kæmfər] n. камфо́ра *f.*

camphorated ['kæmfəreıtıd] adj. прася́кнуты камфо́рай: ***camphorated oil*** камфо́рны але́й

campus ['kæmpəs] n. універсытэ́цкі гарадо́к

can I [kæn] v., p.t. **could** 1. а) магчы́. б) быць у ста́не. в) мець магчы́масьць. г) умець: ***I can speak French*** Я ўме́ю гаварыць па-францу́ску. 2. магчы́; мець пра́ва, дазво́л, ахво́ту: ***You can go*** Вы мо́жаце йсьці́; ***You can take the test again*** Вы мо́жаце йзно́ў здава́ць экза́мэн

can II [kæn] n. 1. кансэ́рвавая бляша́нка *f.*: ***can of peas*** бляша́нка гаро́ху. 2. бітóн -у *m.*, бак: ***a milk can*** бітóн для малака́; ***a garbage can*** вядро́, бак, скры́нка для съмяцьця́
– v.t. 1. уклада́ць у бляша́нкі, кансэрава́ць у бляша́нках *або́* сло́іках: ***to can fruit*** рабіць кансэ́рвы з садаві́ны. 2. Sl. зво́льніць з пра́цы, вы́кінуць, вы́гнаць са шко́лы; пазбы́цца чаго́-н. 3. Sl. спыні́ць: ***can the chatter*** спыні́ць пусту́ю гу́тарку. 4. пасадзі́ць у турму́

Canadian [kə'neıdiən] – adj. канады́йскі, кана́дзкі
– n. канады́ец -йца, кана́дзец -ца *m.*

Canadiana [kəˌneıdı'ænə] n. канадыя́на *f.*

Canadian English англе́льская мо́ва канады́йцаў

Canadian French 1. канады́йцы францу́скага пахо́джаньня. 2. францу́ская мо́ва канады́йцаў

canal [kəˈnæl] – n. 1. кана́л -у *m.*: ***irrigation canal*** арашальны кана́л, трубаправо́д -у *m.* 2. Anat. кана́л (*напр. страваваль́ны, кішэ́чны*)
– v.t. капа́ць кана́л, правоздзіць кана́лы

canalization [ˌkænələˈzeɪʃən] n. 1. каналіза́цыя *f.* 2. сыстэ́ма кана́лаў; каналізацы́йная се́тка

canalize [ˈkænəlaɪz] v.t. правоздзіць кана́лы, каналізава́ць

canary [kəˈneri] n., pl. **-naries** 1. канарэ́йка *f.* 2. я́рка-жо́ўты ко́лер

cancan n. [ˈkænkæn] канка́н -а *m.* (*та́нец*)

cancel [ˈkænsəl] v.t. **-cel(l)ed, -cel(l)ing** 1. адкладаць: ***to cancel a trip*** адкліка́ць падаро́жжа. 2. рабіць нява́жным, касава́ць, анулява́ць. 3. а) вычы́ркваць, выкрэ́сьліваць. б) пагаша́ць: ***to cancel stamps*** пагаша́ць ма́ркі. 4. Math. скарача́ць. 5. Print выкіда́ць набра́нае

cancellation [ˌkænsəlˈeɪʃən] n. 1. адме́на *f.*, скасава́ньне *n.*, ануля́цыя *f.* 2. вычыркне́ньне, выкрасьле́ньне *n.* 3. пагашэ́ньне *n.* (*ма́рак*). 4. Math. скарача́ньне *n.*

cancellous [ˈkænsələs] adj., Anat. рашэ́ціста: ***cancellous bone*** рашэ́цістая косьць

cancer [ˈkænsər] n. 1. Med. рак -у *m.* 2. Figur. по́шасьць *f.*; зло *n.*, бядá *f.*

Cancer [ˈkænsər] n. 1. Тро́пік Ра́ка. 2. сузо́р'е Ра́ка

cancerous [ˈkænsərəs] adj. ра́кавы

cancroid [ˌkæŋˈkroɪd] – adj. 1. ракападо́бны: ***a cancroid tumor*** ракападо́бная пухлі́на. 2. ракападо́бны
– n. род ра́ку ску́ры

candid [ˈkændɪd] adj. 1. а) шчы́ры, адкры́ты: ***a candid reply*** шчы́ры адка́з. 2. справядлі́вы, бесстаро́нньні, аб'ектыўны

candidacy [ˈkændɪdəsi] n. кандыдату́ра *f.*

candidate [ˈkændɪdeɪt] n. кандыда́т -а *m.*, кандыда́тка *f.*: ***candidate for president*** кандыда́т на прэзыдэ́нта

candidature [ˈkændədətʃʊr] n., esp. Brit. кандыдату́ра *f.*

candied [ˈkændid] adj. 1. зацукрава́ны, у цу́кры: ***candied fruit*** садаві́на ў цу́кры. 2. сало́дкі, саладжа́вы: ***candied words of praise*** сало́дкія сло́вы пахвалы́

candle [ˈkændəl] n. 1. сьве́чка *f.* 2. сьве́чка (*адзі́нка вымярэ́ньня сі́лы сьвятла́*)

candle-end [ˈkændəlˌend] n. агáрак -ка *m.*

Candlemas (Day) [ˈkændəlməs] n. грамні́цы *pl. only*

candlestick [ˈkændəlstɪk] n. падсьве́чнік -а *m.*

candlewick [ˈkændəlwɪk] n. кнот -а *m.* (*сьве́чкі*)

candock [ˈkændək] n., Bot. гарла́чык -а *m.*

candor, Brit. **candour** [ˈkændər] n. 1. шчы́расьць, адкры́тасьць, сумле́насьць *f.* 2. справядлі́васьць, бесстаро́ннасьць *f.* 3. бездако́рнасьць, беззага́ннасьць *f.* (*хара́ктару*), чысьціня́ *f.*

candy [ˈkændi] – n., pl. **-ies** цукéрка *f.*
– v.t. цукрава́ць

cane [keɪn] – n. 1. па́лка, па́лачка *f.*, трысьці́нка *f.*, кіл й -я, кілёк -йка́ *m.* 2. прут -а́ *m.* 3. трысьнёг -ягу́ *m.*, трысьцё *n.*: ***sugar cane*** цукро́вы трысьнёг
– v.t. 1. бі́ць кі́ем. 2. пле́сьці з трысьнягу́

canebrake [ˈkeɪnbreɪk] n. трысьнягóвы гушчар

cane chair пле́ценае крэ́сла з трысьнягу́

cane field по́ле цукро́вага трысьнягу́

canine [ˈkeɪnaɪn] – adj. 1. саба́чы. 2. драпе́жны
– n. 1. саба́ка -і *m.*; зьвер зь сям'і́ мясажэ́рных. 2. ікло́л -ла́ *m.* (*зуб*)

canine tooth ікло́л -ла́, клык -а́ *m.*

canister [ˈkænɪstər] n. 1. мала́я бляша́нка. 2. каро́бка праціваго́зу

• ***canister shot*** карце́ча *f.*

canker ['kæŋkər] – n. 1. я́зва *f.* 2. хваро́ба — рак пладо́вых дрэ́ваў. 3. зло *n.*; я́зва *f.* 4. Zool. ву́сень -я *m.*
– v.t., v.i. зараж**а́**ць, зараж**а́**цца, быць зара́жаным; разьяда́ць, псава́цца; гні́ць

cankerworm ['kæŋkərwɜ:rm] n. ву́сень -я *m.*

cannabis ['kænəbɪs] n. 1. індыі́йскія канóплі. 2. гашы́ш -у *m.*, марыхуа́на *f.*

canned [kænd] adj. 1. кансэрва**ва́**ны. 2. Sl. запіса́ны на сту́жку: ***canned music*** му́зыка, запі́саная на сту́жку. 3. Informal п'яны́

cannery ['kænəri] n., pl. **-ies** канс**э́**рвавы завóд

cannibal ['kænɪbəl] – n. 1. людае́д, канібá́л -а *m.* 2. зьвер-канібá́л
– adj. людае́дзкі, канібáльскі

cannibalism ['kænɪbəˌlɪzəm] n. людае́дзтва *n.*, канібалі́зм у зьвярóў

cannonade [ˌkænə'neɪd] – n. 1. кананáда *f.* 2. Informal слóўныя напáдкі, лáянне *n.*
– v. безупы́нна бі́ць з гармáтаў

cannon ['kænən] – n., pl. **-nons** or coll. **-non** 1. гармáта *f.* 2. галёначная косьць (*у каня́*)
– v.i. 1. бі́ць, страляць з гармáты. 2. сту́кацца, удара́цца

cannon ball снара́д -а *m.*

cannon bone галёначная косьць

cannon fodder 1. Figur. гармáтнае мя́са. 2. збóжжа для памóлу (*у млы́не*)

cannot ['kænɑ:t] v. = **can not**

canny ['kæni] adj. **-nier,-niest** 1. хі́тры, абярэ́жлівы. 2. ашча́дны, гаспада́рны: ***a canny housewife*** ашча́дная гаспадыня. 3. развáжны, развáжлівы; ке́млівы: ***a canny lad*** ке́млівы хлапе́ц

canoe [kə'nu:] – n. канóэ *n.*, *Indecl.*, індыя́нскі чóвен
– v.i. веслава́ць, плысьці́ чаўнóм
– v.t. перавóзіць чаўнóм
• ***paddle one's own canoe,*** Informal самóму прабіва́ цца праз жыцьцё

canon I ['kænən] n. 1. царкóўны закóн, канóн -у *m.* 2. прáвіла *n.*, станда́рт-у *m.*: ***the canons of good taste*** прáвілы дóбрага гу́сту. 3. афіцыйны сьпíс кні́гаў Бі́бліі. 4. сьпíс сьвяты́х. 5. Print канóн (*вялі́кі шрыфт — 48 пу́нктаў*)

canon II ['kænən] n. канóнік -а *m.*

canonical [kə'nɑ:nɪkəl] adj. 1. кананíчны. 2. зацьве́рджаны, прыня́ты

canonicals царкóўнае адзе́ньне, ры́зы *pl.*

canonicity [ˌkænə'nɪsəti] n. кананíчнасьць, артадаксáльнасьць *f.*

canonization [ˌkænənə'zeɪʃən] n. кананізáцыя *f.* (*у сьвяты́я*)

canonize ['kænənaɪz] v.t. 1. кананізава́ць. 2. прызнава́ць кананíчным. 3. зацьвярджáць, санкцыянава́ць, рабíць правамóцным

can opener адкрыва́чка *f.* (*кансэ́рвавых бляша́нак*)

canopy ['kænəpi] – n., pl. **-pies** 1. балдахíн -а *m.* (*над тро́нам, ло́жкам*). 2. наве́с, пóлаг -у *m.*: ***under the canopy of the trees*** пад зáсеньню дрэ́ваў. 3. не́ба *n.*, ку́пал не́ба. 4. ку́пал парашу́та
– v.t. прыкрыва́ць балдахíнам, наве́сам

cant I [kænt] – n. 1. няшчы́рая гу́тарка, гіпакры́зія *f.*, крываду́шнасьць *f.* 2. зьбíтыя, шаблённыя фрáзы (*палітычныя, рэлігíйныя*). 3. а) своеасаблíвая прафэсíйная мóва (*напр. юрыстаў, мэ́дыкаў*). б) жаргóн
– adj.1. няшчы́ры, крываду́шны, пабóжны на пакáз. 2. жаргóнны

cant II [kænt] n. 1. нахіле́ньне, перахіле́ньне *n.* 2. раптóўны абó мóцны ўдáр (*які́ зьбіва́е з ног*). 3. кóсая лíнія *абó* плошчасхóн, схíл -у *m.*: ***up the cant of the rock face*** увé́рх па схóне скалы́

can't [kænt] v. *скарóчанае* **can not**

cantaloup(e) ['kæntəlu:p] n. ды́ня *f.*

cantankerous [kæn'tæŋkərəs] adj. сварлíвы

canteen [kæn'ti:n] n. 1. бікла́га, пля́шка *f.* 2. вайско́вая кра́ма. 3. жаўне́рскі клюб. 4. стало́ўка *f.*, буфэ́т -у *m.* (*у шко́ле, на фа́брыцы*). 5. пахо́дная скры́ня з кухо́нным по́судам

canter I ['kæntər] – v.t., v.i. е́хаць на кані́, е́хаць лёгкім галёпам *або́* трушко́м, тру́хаць

– n. трушло́к -ка́ *m.*, лёгкі галёп

canter II ['kæntər] n. жабра́к -а́ *m.*, папраша́йкla -i *m.*

canton ['kæntɑ:n] – n. канто́н -у *m.* (*у Швэйца́рыі*)

– v.t. 1. дзяліць на ча́сткі. 2. раскватаро́ўваць во́йска

cantonment [kæn'tɑ:nmənt] n. 1. вайско́выя кватэ́ры, каза́рмы, стая́нкі. 2. раскватарава́ньне во́йска

cantor ['kæntər] n. 1. ка́нтар -а *m.* 2. ка́нтар, салі́ст у сынаго́зе

Canuck [kə'nʌk] n., Sl. 1. канады́ец -ца *m.* 2. канады́ец францу́скага пахо́джаньня

canvas ['kænvəs] – n. 1. парусі́на *f.*; бры-зэ́нт -у *m.* 2. ве́тразь -я *m.*; па́рус -а *m.* 3. палатно́ *n.* (*для малява́ньня*). 4. ка́нва *f.* (*для вышыва́ньня*)

– v.t. накрыва́ць парусі́наю

– adj. палатня́ны, парусі́навы; бры-зэ́нтавы

canvass ['kænvəs] – v.t. 1. зьбіра́ць падпі́счыкаў, ахвя́ры *або́* галасы́, вэрбава́ць прыхі́льнікаў. 2. дакла́дна пераглядаць. 3. падлі́чваць галасы́ (*пры галасава́ньні*)

– n. 1. вэрбава́ньне прыхі́льнікаў: вы́барчая кампа́нія. 2. хаджэ́ньне ад ха́ты да ха́ты

canvasser ['kænvəsər] n. 1. асо́ба, яка́я вэрбу́е, апы́твальнік -а *m.* 2. падлі-ча́льнік галасо́ў

cany ['kemi] adj. трысьняго́вы, як трысьнёг

canyon ['kænjən] n. цясьні́на *f.*, каньён -а *m.*

caoutchouc ['kautʃuk] n. 1. каўчу́к -у *m.* 2. гу́ма *f.*

cap [kæp] – n. 1. ша́пка *f.*; ша́пачка *f.*; ке́пка *f.*, чапле́ц -ца́, каўпа́к -а́ *m.* (*ху-ха́рскі*). 2. ша́пка *f.* (*гры́ба*). 3. ве́чка *n.*, на́крыўка *f.* (*для сло́іка*), ко́рlак -ка, каўпачло́к -ка *m.* (*ад буты́лькі*)

– v.t. 1. надзява́ць ша́пку. 2. кла́сьці наве́рх; закрыва́ць, закарко́ўваць

• ***cap in hand*** з ша́пкай у рука́х (*прыні́жана*)

capability [ˌkeɪpə'bɪlətɪ] n., pl.**-ties** 1. здо́льнасьць *f.* 2. магчы́масьць *f.*

capable ['keɪpəbəl] adj. здо́льны, зда́тны, спра́ўны, кампэтэ́нтны: ***a capable teacher*** здо́льны наста́ўнік

• ***capable of*** здо́льны, зда́тны да *чаго́*

capacious [kə'peɪʃəs] adj. прасто́рны, вялі́кі, ёмісты, умяшча́льны: ***a capacious hall*** прасто́рная зала; ***a capacious bag*** умяшча́льная то́рбачка

capacitate [kə'pæsɪteɪt] v.t. 1. рабіць здо́льным, адпаве́дным да *чаго́*. 2. рабіць правамо́цным

capacity [kə'pæsətɪ] n., pl. **-ties** 1. а) умяшча́льнасьць, ёмістасьць *f.*: ***a capacity of 4 litres*** ёмістасьць 4 лі́тры. б) здо́льнасьць, магчы́масьць *f.*: ***the capacity to withstand heat*** трыва́ласьць на гарачыню́. 2. магу́тнасьць, прадукцы́йнасьць *f.* 3. здо́льнасьці *pl.*: ***a mind of great capacity*** вялі́кі ро́зум. 4. я́касьць, ро́ля *f.*: ***to act in the capacity of a guardian*** дзе́яць у я́касьці апекуна́

cape I [keɪp] n. наки́дка *f.* (*шыро́кая, без рукаво́ў*), пэлерына *f.*

cape II [keɪp] n. мыс -у *m.*: ***Cape of Good Hope*** Мыс До́брае Надзе́і

caper I ['keɪpər] – v.i. гу́льліва падско́кваць, выдурня́цца

– n. 1. вясёлы падско́к. 2. Figur. шту́ка *f.*; вы́брык -у *m.*

• ***cut a caper (capers)*** а) выраблі́ць шту́кі. б) дурасьлі́ва, гу́льліва скака́ць. в) падстро́іць шту́ку

caper II ['keɪpər] n. 1. ка́пэр -а *m.* (*вадаплаву́*). 2. капіта́н вадапла́ву

capercaillie [ˌkæpər'keɪlɪ] n. глушлэ́ц -ца́ *m.* (*птушка*)

capillarity [ˌkæpɪ'lærətɪ] n. валосна́сьць, капіля́рнасьць *f.*

capillary ['kæpəleri] – adj. 1. як валасо́к, ве́льмі то́нкі. 2. капіля́рны
– n. капіля́р -а *m.*, капіля́рная тру́бка
capital ['kæpətəl] – n. 1. сталі́ца *f.* 2. вялі́кая лі́тара. 3. капіта́л -у *m.* 4. рэсу́рсы *pl.*, рэсу́рс -у *m.* 5. ма́емасьць *f.*, бага́цьце *n.* 6. капіталі́сты *pl.* 7. капіта́ль *f.*
– adj. 1. капіта́льны: ***capital expansion plans*** пля́ны пабо́льшаньня капіта́лу. 2. ва́жны, вядо́мы. 3. гало́ўны, істо́тны, капіта́льны. 4. першара́дны, даскана́лы: ***capital speech*** першара́дная прамо́ва. 5. Law кара́ны сьме́рцю (*пра злачы́нства*): ***capital sentence*** сьмяро́тны прысу́д; ***capital punishment*** ка́ра сьме́рці, сьмяро́тная ка́ра
capitalism ['kæpətəl,ɪzəm] n. капіталі́зм -у *m.*
capitalist ['kæpətələst] – n. 1. капіталі́ст -а *m.* 2. бага́ты чалаве́к. 3. прыхі́льнік капіталі́зму
– adj. капіталісты́чны
capitalistic [,kæpətəl'ɪstɪk] adj. капіталісты́чны: ***the capitalistic system*** капіталісты́чны лад
capitalize ['kæpətəlaɪz] – v.t. 1. піса́ць *або́* друкава́ць вялі́кімі лі́тарамі. 2. ператвары́ць у капіта́л. 3. фінансава́ць
– v.i. карыста́ць, выкарыстоўваць
capital letter вялі́кая лі́тара
capitally ['kæpɪtəli] adv. 1. ве́льмі до́бра, выда́тна. 2. на сьмерць: ***to punish capitally*** пакара́ць сьме́рцю
Capitol ['kæpɪtəl] n. капіто́лі -ю *m.* а) будынак Канґрэ́су ў Вашынгто́не; будынак шта́тнай легісьлятуры. б) сьвятыня Юпі́тэра на Капіталі́йскім узвы́шшы ў старажы́тным Ры́ме
capitulate [kə'pɪtʃəleɪt] v.i. капітулява́ць; здава́цца
capitulation [kə,pɪtʃə'leʃən] n. капітуля́цыя *f.*, умо́вы капітуля́цыі
caprice [kə'pri:s] n. 1. капры́с, капры́з -у *m.*, пры́хамаць *f.* 2. зьме́нлівасьць *f.* 3. капры́чыё, *n, indecl.* (*музы́чны тво́р*)
capricious [kə'prɪʃəs] adj. капры́сьлівы, зьме́нлівы
capsizal ['kæpsaɪzəl] n. парушэ́ньне *n.*, разла́д -у *m.*
capsize ['kæpsaɪz] v.t., v.i. перакуль-ваць, перакуль-вацца; перакіда́ць, перакіда́цца
capsule ['kæpsəl] – n. 1. Med. ка́псула *f.* 2. Bot. насе́нная каро́бачка. 3. Anat. абало́нка (*напр. рагава́я, сьлізі́стая*)
– adj. сьці́слы, скаро́чаны: ***a capsule history of Miensk*** сьці́слая гісто́рыя Ме́нску
– v.t. зьмяшча́ць у ка́псулы
capsular ['kæpsələr] adj. 1. ка́псульны. 2. у фо́рме ка́псулы
captain ['kæptən] – n. 1. капіта́н -а *m.* (*карабля́*). 2. капіта́н -а *m.* (*у во́йску*). 3. правады́р -а́ *m.*; палкаво́дзец -ца *m.* 4. Sport капіта́н -а *m.* (*дружы́ны, кама́нды*)
– v.t. кірава́ць, кама́ндаваць
captaincy ['kæptənsi] n., pl. **-ies** ранг капіта́на
captainship ['kæptənʃɪp] n. 1. ты́тул капіта́на. 2. кіраўні́чыя здо́льнасьці, палкаво́дзкае майстэ́рства
caption ['kæpʃən] n. 1. а) загало́вак -ўку *m.* б) по́дпіс -у *m.* (*пад здымкам*). 2. (*у фі́льме*) на́дпіс -у *m.*, субты́тар -ру *m.*
captious ['kæpʃəs] adj. 1. прычэ́пісты, прыдзі́рлівы. 2. падсту́пны
captivate ['kæptɪveɪt] v.t. паланіць; зачаро́ўваць, чарава́ць; ва́біць, прыва́бліваць; захапля́ць
captivation [,kæptɪ'veɪʃən] n. 1. зачараванне, паланенне, захапленне. 2. чар -у *m.*, прыва́бнасьць *f.*
captive ['kæptɪv] – n. 1. зьняво́лены -ага *m.*, вя́зень -ьня *m.*, пало́ньнік -а *m.*
– adj. 1. зьняво́лены, паланёны: ***a captive soldier*** пало́нны -ага *m.* 2. зачарава́ны (*каха́ньнем*)
captivity [kæp'tɪvəti] n., pl. **-ties** 1. пало́н -у *m.* 2. паланенне, зьняво́ленне *n.*
captor ['kæptər] n. захо́пнік -а *m.*, той, хто пало́ніць *або́* трыма́е ў пало́не

capture ['kæptʃər] – v.t. захо́пліваць (*сі-лаю*), лавіць, бра́ць у палó́н
– n. 1. захо́п -у *m.* 2. захо́пленае, трафэ́й -ю *m.*, здабы́ча *f.*
car [kɑ:r] n. 1. аўтамабі́ль -я *m.*, а́ўта *n.*, машы́на *f.* 2. ваганэ́тка, павóзка *f.* 3. вагóн -а *m.* (*цягні́ка́*), трамва́й -я *m.* 4. кле́тка ліфта
caracul ['kærəkʌl] n. кара́куль -ю *m.*
carafe [kə'ræf] n. графі́н -а *m.*
caramel ['kærəməl] n. карамэ́ль *f.*
carapace ['kærəpeɪs] n. па́нцыр -а *m.* (*чарапа́хі, сьлімака́*)
carat ['kærət] n. кара́т -а *m.*
caravan ['kærəvæn] n. 1. карава́н -у *m.* 2. кры́ты грузаві́к, фургóн -а *m.* 3. Brit. дом-аўтапрычэ́п
caraway ['kærəweɪ] n. кмен, кмін -у *m.*
carbide ['kɑ:rbaɪd] n., Chem. 1. карбі́д -у *m.* 2. карбі́д ка́льцыю
carbine ['kɑ:rbi:n] n. карабі́н -а *m.*
carbohydrate [ˌkɑ:rboʊ'haɪdreɪt] n. вуглявóд -у *m*
carbolic [kɑ:r'bɑ:lɪk] adj. ***carbolic acid*** карбóлавая кіслата́, карбóлка
carbon ['kɑ:rbən] n. 1. Chem. вугляро́д -у *m.* 2. Electr. ву́галь -ю *m.*, ву́гальны электро́д
carbonaceous [ˌkɑ:rbə'neɪʃəs] adj. 1. вугляро́дзісты, вугляро́дны: ***carbonaceous compound*** вугляро́днае злучэ́ньне. 2. ву́гальны
carbonate ['kɑ:rbəneɪt] – n. карбана́т -у *m.*, вуглякі́слая соль
– v.t. а) ператвара́ць у карбана́т. б) карбанізава́ць. в) насыча́ць вуглякі́слымі га́замі (*напі́так*)
carbon black са́жа *f.*
carbon copy 1. ко́пія, зро́бленая праз капі́рку. 2. ка́лька, ко́пія *f.*
carbon dioxide вуглекіслата́, вугляки́слы газ
carboniferous [ˌkɑ:rbə'nɪfərəs] adj. 1. вугляно́сны (*пра скалу́*). 2. вугляро́дны
Carboniferous [ˌkɑ:rbə'nɪfərəs] n. 1. каме́ннавугальны (*пэрыя́д*). 2. каме́ннавугальныя фарма́цыі й пакла́ды
carbonization [ˌkɑ:rbənə'zeɪʃən] n. 1. карбанізáцыя *f.* 2. каксава́ньне *n.*
carbonize ['kɑ:rbənaɪz] v.t. 1. абвугліваць, каксава́ць. 2. пакрыва́ць *або́* спалуча́ць з вугляро́дам, карбанізава́ць
carbon monoxide ча́дны газ, чад -у *m.*
carbon paper капіравáльная папе́ра, капі́рка
carbuncle ['kɑ:rbʌŋkəl] n. а) карбу́нкул -а *m.* б) цёмна-чырвóны каштóўны ка́мень
carburator ['kɑ:rbəretər] n. карбюра́тар -а *m.*
carcass or **carcase** ['kɑ:rkəs] n. 1. ту́ша *f.* 2. каркáс -а *m.*, касьця́к -а́ *m.* (*будóвы, вадаплáва*)
card I [kɑ:rd] – n. 1. ка́ртка *f.*: ***postal card*** паштóвая ка́ртка, паштóўка *f.*; ***Christmas card*** калядная паштóўка; ***birthday card*** віншавáльная паштóўка з днём нарóдзінаў. 2. ка́рта для гульні́
– v.t. раздава́ць ка́рты, картава́ць
• ***card up one's sleeve*** мець у запáсе, мець запасны́ кóзыр
• ***cards*** а) гульня́ ў ка́рты. б) ка́рты
• ***hold all the cards*** мець перава́гу, пóўны кантрóль над *чым*
• ***in the cards*** наканава́на; прадба́чана, магчы́ма
• ***put one's cards on the table*** выкладáць ка́рты на стол, адкры́ць сваé ка́рты: ***to show one's cards*** раскры́ць ка́рты
card II [kɑ:rd] – n. драцяна́я шчóтка для часáньня лёну, вóўны, часáлка *f.*
– v.t. часáць (*лён, вóўну*)
cardboard ['kɑ:rdbɔ:rd] – n. кардóн -у *m.*
– adj. кардóнны: ***a cardboard box*** кардóнка *f.*
card catalogue картатэ́ка, ка́ртачны каталёг
carder ['kɑ:rdər] n. 1. часáльнік -а *m.*, часáльніца *f.* 2. часáльная машы́на, воўначасáлка, ільначасáлка *f.*
cardiac ['kɑ:rdiæk] – adj. 1. сардэ́чны: ***cardiac artheries*** сардэ́чныя артэ́рыі;

cardiac muscle сардэ́чны му́скул. 2. ве́рхнястра́ўнікавы
– n.1. сардэ́чнік -а *m.* (*хво́ры на сэ́рца*). 2. лек на сэ́рца. 3. стра́ўнікавы лек

cardigan ['kɑ:rdɪgən] n. свэ́тар -ра *m.*

cardinal ['kɑ:rdɪnəl] – adj. 1. гало́ўны, са́мы істо́тны, кардына́льны: ***the cardinal merit*** гало́ўная заслу́га. 2. я́рка-чырво́ны. 3. кардына́льскі
– n. 1. кардына́л -а *m.* (*царко́ўны*). 2. кардына́л -а *m.* (*пту́шка*). 3. я́рка-чырво́ны ко́лер. 4. Math. ко́лькасны лічэ́бнік

cardinalate ['kɑ:rdənəleɪt] n. 1. стано́вішча, сан кардына́ла, кардына́льства *n.* 2. кардына́льская кале́гія

cardinally ['kɑ:rdɪnəli] adv. гало́ўным, карэ́нным чы́нам; кардына́льна

card index картатэ́ка

cardiology [ˌkɑ:rdi'ɑ:lədʒi] n. кардыялёгія *f.*

care [ker] – n. 1. турбо́та, руплі́васьць, ува́га *f.* 2. апе́ка *f.*; нагля́д -у *m.*: ***under a doctor's care*** пад ле́карскім нагля́дам; ***in her sister's care*** пад апе́кай сваё сястры́. 3. згрызо́та, турбо́та *f.*, кло́пат -у, неспако́й -ю *m.*: ***Few people are free from care*** Няшма́т людзе́й жыве́ бяз кло́пату. 4. дба́ньне, стара́ньне *n.*: ***care for a common good*** дба́ньне дзе́ля агу́льнага дабрабы́ту
– v.i. 1. турбава́цца, ціка́віцца: ***He cares about music*** Ён ціка́віцца му́зыкай. 2. дбаць: ***I don't care what they say*** Я ня дба́ю, што яны́ ка́жуць. 3. хаце́ць; жада́ць: ***Would you care to see him?*** Ці Вы хацелі-б яго́ ба́чыць?
• ***care for*** а) ру́ніцца, дбаць пра *каго́-што*; забясьпе́чваць *каго́*. б) любі́ць: ***I don't care for it*** Я не люблю́ гэ́тага
• ***have a care*** будзь асьцяро́жны, ува́жлівы
• ***(in) care of (c/o)*** пад гэ́ткім а́драсам
• ***Take care!*** Будзь асьцяро́жны! Бераж ы́ся!
• ***take care of*** дбаць, ру́ніцца пра *каго́*; утры́мваць *каго́*: ***to take care of children*** дагляда́ць дзяце́й, утры́мваць дзяце́й

career [kə'rɪr] – n. 1. а) заня́тлак -ку *m.*, прафэ́сія *f.* б) кар'е́ра *f.* 2. ху́ткасьць *f.*, по́ўны ход: ***They rode in full career*** Яны́ е́халі по́ўным хо́дам
– adj. прафэсі́йны: ***career personnel*** прафэсі́йны пэрсана́л, працаўні́кі: ***career woman*** жанчы́на, яка́я прафэсі́йна працу́е, ро́біць кар'е́ру

carefree ['kerfri:] adj. бестурбо́тны, шчасьлі́вы

careful ['kerfəl] adj. 1. ува́жны, ува́жлівы, асьцяро́жны: ***to be careful of sweets*** асьцераго́цца сало́дкага. 2. стара́нны, дакла́дны: ***careful examination of the question*** дакла́дны і ўва́жны разгля́д пыта́ньня. 3. руплі́вы, клапатлі́вы; ува́жлівы: ***Be careful of the horses!*** Асьцяро́жна абыхо́дзься з ко́ньмі!

carefully ['kerfəli] adv. 1. асьцяро́жна; ува́жна, дакла́дна. 2. руплі́ва

careless ['kerləs] adj. 1. нядба́лы, нядба́йны; нерупліві: ***a careless person*** нядба́йла, нядба́йнік, нядба́йніца. 2. бестурбо́тны, абыя́кавы: ***careless of danger*** які́ ня дба́е, ня ду́мае пра небясьпе́ку

carelessly ['kerləsli] adv. 1. няўва́жна, неасьцяро́жна. 2. нядба́ла, нестара́нна, абы-я́к. 3. абыя́кава, ня ду́маючы

carelessness ['kerləsnəs] n. 1. нядба́льства, нядба́йства *n.* 2. нядба́йнасьць, нядба́ласьць, няўва́жнасьць *f.*

caress [kə'res] – n. ла́ска *f.*, абдымкі *pl. only*, пацалу́нак -ку *m.*
– v.t. гла́дзіць, ла́шчыць, пе́сьціць

caret ['kærɪt] n. знак уста́ўкі (^)

caretaker ['kerˌteɪkər] – n. 1. дагля́дчык -а *m.*, дагля́дчыца *f.* 2. вартаўні́к -а́ *m.*
– adj. тымчасо́вы: ***caretaker government*** тымчасо́вы ўра́д

careworn ['kerwɔ:rn] adj. зьнямо́жаны згрызо́тамі *або́* турбо́тамі

carfare ['kɑ:rfer] n. апла́та за язду́ (*трамва́ем, аўто́бусам*)

cargo [ˈkɑ:rgou] n., pl. **-goes** or **-gos** груз -у *m.*, пакла́жа *f.* (*вадаплáва, самалёта*); цяжа́р -у *m.*

caribou [ˈkærəbu:] n., pl. **-bous** or coll. **-bou** паля́рны але́нь

caricature [ˈkærɪkətʃʊr] – n. карыкату́ра *f.* – v.t. прадстаўля́ць у карыкату́рным вы́глядзе

caricaturist [ˈkærɪkətʃʊrəst] n. карыкатурыст -а *m.*, карыкатурыстка *f.*

caries [ˈkeri:z] n. псава́ньне, гніцьцё *n.* (*зубо́ў*), кастае́да *f.*, ка́рыес -у *m.*

carious [ˈkeriz] adj. ка́рыесны, карыёзны (*пра зуб*), які́ псуе́цца, гніе́

carking [ˈkɑ:rkɪŋ] adj. гнятлі́вы, турбо́тны

carload [ˈkɑ:rloud] n. вагóн гру́зу

Carmelite [ˈkɑ:rməlaɪt] – n. 1. кармэлі́т -а *m.* (*мана́х*). 2. то́нкая ваўня́ная тканіна

– adj. кармэлі́цкі

carmine [ˈkɑ:rmaɪn] – n. карміна -у *m.* (*ко́лер*)

– adj. карміна́вы, сьве́тла-барво́вы

carnage [ˈkɑ:rnɪdʒ] n. ма́савае забіва́ньне людзе́й, разьня́, бо́йня *f.*

carnal [ˈkɑ:rnəl] adj. 1. а) цяле́сны. б) палавы́, пачуцьцёвы, сэксуа́льны: ***carnal desire*** юр -у *m.*, пажа́длівасьць *f.* 2. сьве́цкі, зямны́, не духо́ўны

carnality [kɑ:rˈnæləti] n., pl. **-ties** 1. цяле́снасць *f.* 2. сьве́цкасьць *f.* 3. юрлі́васьць, пачуцьцёвасьць *f.*

carnation [kɑ:rˈneɪʃən] – n. 1. гвазьдзі́к -а́ *m.* 2. ружо́вы ко́лер

– adj. ружо́вы

carnival [ˈkɑ:rnɪvəl] n. 1. ма́сьленіца *f.* 2. карнава́л -у *m.*

carnivore [ˈkɑ:rnəvɔ:r] n. 1. драпе́жны зьвер. 2. насяко́мае́дная расьлі́на

carnivorous [kɑ:rˈnɪvərəs] adj. 1. драпе́жны. 2. насяко́мае́дны

carol [ˈkærəl] – n. 1. ра́дасная пе́сьня. 2. сьвятóчны гімн: ***Christmas carols*** каля́дкі. 3. карагóд зь пе́сьнямі

– v.i. 1. сьпява́ць. 2. калядава́ць

– v.t. сла́віць каля́дкамі

carol(l)er [ˈkærələr] n. каля́днік -а, калядо́ўшчык -а *m.*

carotid [kəˈrɑ:tɪd] n. со́нная арты́рыя

carousal [keˈraʊzəl] n. шу́мная гуля́нка, папóйка *f.*

carousel [ˌkærəˈsel] n. карусэ́ль *f.*

carp I [kɑ:rp] v.i. крытыкава́ць, знахо́дзіць недахо́пы, чапля́цца

carp II [kɑ:rp] n., pl. **carps** or coll. **carp** карп -а *m.*

carpal [ˈkɑ:rpəl] – adj., Anat. кі́сьцевы: ***carpal bones*** кі́сьцевыя ко́сьці; ***carpal joint*** кі́сьцевы суста́ў

– n. кі́сьцевая косьць

• ***carpal tunnel syndrome*** запя́сьцевы тунэ́льны сындро́м (*напру́жаньне запя́сьця ад до́ўгай пра́цы на кампу́тары*)

car park аўтамабі́льная стаянка

carpel [ˈkɑ:rpəl] n., Bot. пладалі́сьцік -а *m.*

carpenter [ˈkɑ:rpəntər] – n. 1. цясьля́р, цесьляра́ *m.*; це́сьлія -і *m.* 2. сталя́р -а́ *m.*

– v.i. займа́цца цясьля́рствам, сталя́рствам, цясьля́рыць, сталя́рыць

carpenter bee ша́шаль

carpentry [ˈkɑ:rpəntri] n., pl. **-tries** цясьля́рства, сталя́рства *n.*; цясьля́рка, сталя́рка *f.*

carpet [ˈkɑ:rpət] – n. 1. дыва́н -а́ *m.*, кілі́м -а *m.* (*на сьцяну́*) 2. пакрыцьцё кве́так

– v.t. пакрыва́ць, засьціла́ць дыванóм

• ***call on the carpet*** выклі́ка́ць «на дыва́н»

• ***sweep under the carpet*** хава́ць, адклада́ць пад сукно́

carpetbagger [ˈkɑ:rpətˌbægər] n. 1. кампаняжо́р -а *m.* 2. палітычны авантю́рнік

carpeting [ˈkɑ:rpɪtɪŋ] n. 1. матэрыя́л на дываны́. 2. по́крыва *n.*: ***a carpeting of fresh snow*** по́крыва сьве́жага сьне́гу

carpet rods мэталёвыя пруткі́ для ўмацава́ньня дывана́ на схо́дах

carping [ˈkɑ:rpɪŋ] adj. празьме́рна крытычны, прычэпісты

car port наве́тка для а́ўтаў

carpus ['kɑ:rpəs] n., pl. **-pi** запя́сьце *n.*; ко́сьці запя́сьця

carriage ['kærɪdʒ] n. 1. воз -а *m.*; бры́чка *f.*: ***carriage and four horses*** бры́чка, запрэ́жаная чатырма́ ко́ньмі. 2. каро́тка *f.* (*друкава́льнай машы́нкі*). 3. а) перавоз -у *m.*, тра́нспарт -у *m.* б) ко́шты перавозу, перасы́лкі

carrier ['kærɪər] n. 1. а) насі́льшчык -а *m.* б) пасланне́ц -ца́, пасыльны́ -о́га, вясту́н вестуна́ *m.*: ***carrier of news*** вясту́н навінаў; ***letter carrier*** пашта́р -а́, лістано́ша -ы *m.* 2. бацыланосьбіт -а *m.* 3. бага́жнік -а *m.* (*на самака́це*). 4. тра́нспартная кампа́нія. 5. адво́дны кана́л, кана́ва *f.* 6. авіяно́сьбіт -а *m.* 7. пашто́вы го́луб

carrion ['kærɪən] – n. 1. па́дла *f., n.*, мярцьвя́чына *f.* 2. гні́ль *f.*; бруд -у *m.*
– adj. 1. мярцьвя́цкі. 2. які́ жы́віцца па́длаю. 3. гнілы́, бру́дны

carrion crow чо́рная варо́на

carrot ['kærət] n. мо́рква *f.*

carrot weed марко́ўнік -у *m.*

carroty ['kærətɪ] adj. 1. марко́ўнага ко́леру. 2. ры́жы

carrousal [ˌkærə'sel] n., *такс.* **carousel** карусэ́ль *f.*, бага́жны круг (*на лётніш-чы*)

carry I ['kærɪ] – v.t. **-ried, -rying** 1. насі́ць; не́сьці: ***He is carrying two books*** Ён нясе́ дзьве кні́жкі. 2. вазі́ць; ве́зьці: ***A ship carries cargo*** Вадапла́ў вязе́ груз. 3. а) захапля́ць: ***to carry the enemy's position*** захапі́ць варо́жую пазы́цыю. б) правёсьці (*пастано́ву*). в) падпіра́ць, трыма́ць на сабе́ цяжа́р. г) мець зна́чаньне, уплы́ў: ***His judgment carries great weight*** Ягона́ ду́мка ма́е вялі́кую вагу́. 4. трыма́цца: ***to carry oneself with dignity*** трыма́цца з го́днасьцю. 5. зьмяшча́ць: ***to carry a review*** зьмясьці́ць агля́д. 6. гандлява́ць, прадава́ць, трыма́ць: ***to carry clothing for men*** гандлява́ць мужчы́нскай во́праткай
– v.i. 1. разыхо́дзіцца (*пра гук*), разно́сіцца, сяга́ць. 2. трыма́цца: ***This horse carries high*** Гэ́ты конь высо́ка трыма́е галаву́
• ***carry away*** а) адно́сіць (*пра хва́лю, ве́цер*). б) захапля́ць, натхня́ць: ***to be carried away*** захапля́цца, перайма́цца не́чым
• ***carry in (into)*** уно́сіць
• ***carry forward*** а) рабі́ць по́ступ, ісьці́ за не́чым напе́рад. б) перано́сіць на другу́ю бачы́ну ці ў другі́ слупо́к
• ***carry off*** вы́йграць, здабы́ць (*узнагаро́ду*)
• ***carry on*** а) не затры́мвацца, праця́гваць (-цца): ***The conversation was carried on*** Гу́таркі йшлі́ дале́й. б) дале́й ве́сьці, кірава́ць (*спра́ву, заня́ткі*)
• ***carry out*** выко́нваць (*зага́ды, інстру́кцыі*), зрабі́ць, зако́нчыць, правёсьці (*плян, до́сьлед*)
• ***carry over*** а) затрыма́ць, атрыма́ць зь міну́лага. б) перано́сіць (*сло́ва*). в) праця́гваць, адкладаць: ***to carry an account over to the next month*** адкла́сьці разраху́нак на насту́пны ме́сяц
• ***carry through*** а) вы́весьці, дапамагчы́ вы́йсьці (*зь ця́жкасьцяў*). б) дове́сьці да канца́, зако́нчыць, дасягну́ць

carry II ['kærɪ] n., pl. **-ries** 1. дальнабо́йнасьць *f.* (*збро́і*). 2. во́лак -у *m.* (*чаўна́*). 3. далёкасьць палёту (*снара́да, мяча́ ў го́льфе*)

carsickness ['kɑ:rsɪknəs] n. мо́таснасьць ад ру́ху (*у аўтамабі́лі, цягніку́*)

cart [kɑ:rt] – n. 1. воз -а *m.*; калёсы *pl. only*, драбі́ны *pl. only.* 2. двуко́лка *f.* 3. ручны́ вазо́к
– v.t., v.i. вазі́ць, або́ е́хаць (*калёсамі*)
• ***put the cart before the horse*** пачына́ць ад канца́, рабі́ць шы́варат-навы́варат

cartage ['kɑ:rtɪdʒ] n. 1. гужава́я перавозка, гужавы́ тра́нспарт. 2. ко́шты гужаво́е перавозкі

coddle ['kɑ:dəl] v.t. 1. пяшчо́тна даглядА́ць, пе́сьціць. 2. вары́ць на малы́м агні́

code [koud] – n. 1. ко́дэкс -у *m.*: ***code of laws*** збор зако́наў; ***civil code*** цыві́льны ко́дэкс; ***criminal code*** крымі́нальны ко́дэкс. 2. код -у *m.*, сыгналізацы́йная сыстэ́ма: ***the Morse code*** код Мо́рзэ. 3. шыфр -у *m.*; умо́ўныя знакі́

– v.t. шыфрава́ць, перадава́ць ко́дам

codeine ['koudi:n] n. кадэі́н -у *m.*

codex ['koudeks] n., pl. **codices** 1. ко́дэкс -у *n.*, ру́капіс Сьвято́га Пісьма́ *або́* старада́ўнягага клясы́чнага тво́ру. 2. збор ру́капісаў

codger ['kɑ:dʒər] n., Informal дзіва́к -а́ *m.*

codify ['kɑ:difai] v.t. клясыфікава́ць

cod-liver oil ['kɑ:dlivər ˌɔɪl] n. рыбны тлушч

coed or **co-ed** ['koued] n., Informal 1. сістэма супольнага навучання. 2. вучні школы супольнага навучання

coeducation [ˌkouˌedʒə'keɪʃən] n. супольнае навучанне

coeducational [ˌkouˌedʒə'keɪʃənəl] adj. коадукацыйны, супольнага навучання

coefficient [ˌkouɪ'fɪʃənt] n., Math., Phys. каэфіцыент -а *m.*: ***coefficient of efficiency*** каэфіцыент карыснага дзеяньня

coelenterate [sɪ'lentəreɪt] n., Zool. кішачна-поласьцевы -ага *m.* (*як гідра, медуза*)

coeliac ['si:liæk] adj., Physiol. брушны

coerce [kou'ɜ:rs] v.t. змушаць, прымушаць: ***to coerce into agreement*** прымусіць пагадзіцца

coercion [kou'ɜ:rʃən] n. 1. прымус -у, уціск -у *m.* 2. улада моцнае рукі

coercive [kou'ɜ:rsɪv] adj. 1. прымусовы. 2. прыгнятальны

coeval [kou'i:vəl] – adj. 1. сучасны. 2. такога самага веку, такое самае даты, такога самага часу трываньня
– n. сучасьнік -а *m.*

coexecutor [ˌkouɪg'zekjətər] n. сувыканальнік -а *m.*

coexist [ˌkouɪg'zɪst] v.i. суіснаваць

coexistence [ˌkouɪg'zɪstəns] n. суіснаваньне *n.*: ***peaceful coexistence*** мірнае суіснаваньне

coexistent [ˌkouɪg'zɪstənt] adj. суіснуючы; суіснавальны

coffee ['kɔ:fi] – n. 1. кава *f.* (*напой, зерне*). 2. таварыская сустрэча з кавай. 3. кававы колер цёмна-рудый
– adj. кававы

coffee break перапынак на каву

coffee grinder кавамлын -а *m.*

coeffee house кавярня *f.*

coffeemaker ['kɔ:fimeɪkər] n. кафунік -а *m.*

coffee pot кафунік -а *m.*

coffin ['kɔ:fən] – n. труна *f.*
– v. класьці ў труну

cog [kɑ:g] n. 1. зуб на зубчастым коле. 2. шасьцярня *f.*; зубчастая перадача

cogency ['koudʒənsi] n. 1. перакананьчасць, бясспрэчнасьць *f.*

cogent ['koudʒənt] adj. перакананьчы, перакананальны

cogitate ['kɑ:dʒɪteɪt] v. раздумоўваць, абдумоўваць, разважаць, думаць

cognac ['kounjæk] n. каньяк -ý *m.*

cognate ['kɑ:gneɪt] – adj. родны, сваяцкі: ***cognate words*** словы аднаго кораня, аднаго паходжаньня
– n. 1. сваяк -á *m.*, сваячка *f.* 2. сваяцкія мовы, аднакарэнныя словы

cognition [kɑ:g'nɪʃən] n. 1. ведa *f.*; пазнаваньне, веданьне, успрыманьне *n.* 2. пазнаньне, запазнанае, усьвядомленае *n.*

cognizable [ˌkɑ:g'naɪzəbəl] adj. пазнавальны, распазнавальны; даступны пазнаньню, успрыманьню

cognizance ['kɑ:gnɪzəns] n. 1. веданьне *n.*; усьведамленьне, разуменьне *n.*: ***to have cognizance of plots*** ведаць пра змовы. 2. юрысдыкцыя, адказнасьць *f.*

cognomen [ˌkɑ:g'noumən] n. 1. прозьвішча *n.* 2. мянушка *f.*

cogwheel ['kɑ:ghwi:l] n., Tech. зубчастае кола; шасьцярня *f.*, зубчастая перадача

cohabit [kou'hæbət] v.i. жыць супольна

cohabitation [kouˌhæbɪ'teɪʃən] n. супольнае жыцьцё (*па-за шлюбам*)

coheir [kou'er] n. суспадчыньнік -а *m.*

cohere [kou'hɪr] v.i. 1. злучацца, зьлівацца, счапляцца. 2. лучыцца лягічна, быць пасьлядоўным

coherence [kou'hɪrəns] n. or **coherency** 1. зьлітнасьць, злучнасьць *f.* 2. лягічная сувязь, пасьлядоўнасьць *f.*

coherent [kou'hɪrənt] adj. 1. лягічны, лягічна павязаны; пасьлядоўна збудаваны, выказаны. 2. зьлеплены, счэплены; які трымаецца разам

cohesion [kou'hi:ʒən] n. 1. счапленьне, счэпліваньне *n.*; злучэньне *n.*, імкненьне трымацца разам. 2. Phys. гезія *f.*, сіла счапленьня

cohesive [kou'hi:sɪv] adj. шчыльны; зьяднаны; счапляльны

coiffeur [kwɑ:ˈfɜ:r] n. цыру́льнік -а *m.*, цыру́льніца *f.*

coiffure [kwɑ:ˈfjʊr] n. 1. фрызу́ра, прычо́ска *f.* 2. галаўны́ ўбо́р

coil [kɔɪl] – n. 1. скру́тлак -ка *m.*, вітло́к -ка́ *m.* 2. драцяна́я сьпіра́ль. 3. Electr. шпу́ля, шпу́лька *f.*

– v.t. скру́чваць віткі́ ́мі, сьпіра́лямі

coin [kɔɪn] – n. манэ́та *f.*

– v.t. 1. чака́ніць (*манэ́ту*). 2. ствара́ць; назапа́шваць: ***to coin a phrase*** стварыць тра́пны вы́раз

• ***coin money*** разбагаце́ць, мець дахо́днае прадпрые́мства

• ***pay back in his own coin*** адплаці́ць той са́май манэ́тай

• ***the other side of the coin*** адваро́тны бок манэ́ты

coinage [ˈkɔɪnɪdʒ] n. 1. чака́нка манэ́таў. 2. манэ́ты *pl.* 3. манэ́тная сыстэ́ма. 4. а) ствара́ньне *n.* б) но́вае сло́ва, наватво́р -у *m.*: ***a word of his own coinage*** ство́ранае ім сло́ва

coincide [ˌkoʊnˈsaɪd] v.i. 1. супада́ць, адбыва́цца ў тым са́мым ча́се. 2. адпавяда́ць дакла́дна; згаджа́цца

coincidence [koʊˈɪnsɪdəns] n. 1. супадзе́ньне *n.*, зьбег абста́вінаў. 2. дакла́дная адпаве́днасьць, зго́днасьць *f.*

coincident [koʊˈɪnsɪdənt] adj. 1. які́ супада́е. 2. які́ адпавяда́е

coincidental [koʊˌɪnsəˈdentəl] adj. 1. выпадко́вы. 2. супада́льны

coiner [ˈkɔɪnər] n. 1. а) чака́ншчык манэ́таў. б) фальшы́ваманэ́тчык. 2. ствара́льнік, вынахо́днік -а *m.*

coinheritance [koʊɪnˈherɪtəns] n. 1. супо́льнае пра́ва на спа́дчыну. 2. супо́льная спа́дчына

coke I [koʊk] n. кокс -у *m.* (*ву́галь*)

coke II [koʊk] n., Sl. какаі́н -у *m.*

colander [ˈkʌləndər] n. друшля́к-а́ *m.*, цадзі́лка *f.*

colchicum [ˈkɑ:ltʃɪkəm] n., Bot. 1. познацьве́т -у *m.* 2. лек з познацьве́ту

cold [koʊld] – adj. 1. хало́дны; сьцюдзёны: ***I am cold*** Мне хало́дна; ***This coffee is cold*** Гэ́тая ка́ва хало́дная; ***to get cold*** астыва́ць; ***to get colder*** халадне́ць. 2. хало́дны, нячу́лы, беспачуцьцёвы: ***a cold greeting*** хало́днае прывіта́ньне. 3. абыя́кавы, без запа́лу: ***a cold nature*** абыя́кавая нату́ра. 4. бесстаро́нны, аб'екты́ўны. 5. слабы́, кво́лы: ***cold comfort*** слаба́я ўце́ха; ***cold scent of the fox*** ледзь чу́тны лісі́ны пах. 6. хало́дны (*пра ко́лер*)

– n. 1. хо́лад -у *m.*, сьцюжа *f.*; стынь *f.* 2. засту́да *f.*; ка́тар -у *m.*

• ***catch cold*** застудзі́цца

• ***in cold blood*** халаднакро́ўна

• ***in the cold*** зусі́м адзі́н, занядба́ны, заки́нуты

• ***pour/throw cold water on*** лі́нуць вядро́ хало́днай вады́, ахаладзі́ць запа́л, ацьверазі́ць, зьнеахво́ціць

cold-blooded [ˌkoʊldˈblʌdɪd] adj. 1. хало́днакро́ўны (*як жа́ба, вужа́кі*). 2. зя́бкі, адчува́льны да хо́ладу. 3. лю́ты, без чуцьця́, сухі́

cold cuts парэ́заныя мясны́я вы́рабы, каўба́сы, хало́дныя заку́скі

cold fact, Informal абсалю́тны, аб'екты́ўны факт

cold-hearted [ˌkoʊldˈhɑ:rtəd] adj. хало́дны, нячу́лы; бяз сэ́рца, няве́тлы

coldly [ˈkoʊldlɪ] adv. сьцюдзёна, хало́дна; су́ха, няве́тла; без энтузія́зму

coldness [ˈkoʊldnəs] n. 1. хо́лад -у *m.* 2. хало́днасьць, сьцюдзёнасьць *f.*; няве́тласьць *f.*; абыя́кавасьць *f.*

cold storage 1. хало́днае ме́сца, халадзі́льнік. 2. перахава́ньне ў хало́дным ме́сцы

cole [koʊl] n. кальра́бі *indecl.*, *f.*; капу́ста *f.*

coleslaw [ˈkoʊlslɔ:] n. капу́сны сала́т

colic [ˈkɑ:lɪk] n. ко́лікі *pl.*, рэ́зкі боль (*у жываце́*)

coliseum [ˌkɑ:ləˈsi:əm] n. стадыён -у *m.*, спарто́вы будынак

collaborate [kəˈlæbəreɪt] v.i. 1. супрацо́ўнічаць. 2. супрацо́ўнічаць з во́рагам

collaboration [kəˌlæbəˈreɪʃən] n. 1. супрацо́ўніцтва *n.* 2. калябара́цыя *f.* (*з во́рагам*)

collaborator [kə'læbəreɪtər] n. 1. супрацо́ўнік -а *m.*, супрацо́ўніца *f.* 2. калябара́нт -а *m.*, калябара́нтка *f.*

collapse [kə'læps] – v. 1. а) права́львацца; зава́львацца. б) ло́паць (*пра балён*). 2. склада́цца, склада́ць (*крэ́сла*). 3. зало́мвацца; занепада́ць (*пра здаро́ўе*), зрыва́цца (*пра перамо́вы*)
– n. 1. развал -у *m.*; зава́льваньне *n.* (*мо́сту, пля́наў*). 2. упа́дак -ку *m.* (*сі́лаў, прадпрые́мства*). 3. заламáньне *n.*, фізы́чнае *або́* нэрво́вае зьнясі́леньне

collapsible [kə'læpsəbəl] adj. 1. склада́ны, раскладны́ (*крэ́сла*): ***collapsible baby stroller*** склада́ны дзіця́чы вазо́к. 2. збо́рны. 3. адкідны́: ***collapsible seat*** адкідно́е сядзе́ньне

collar ['kɑ:lər] – n. 1. каўнíер -ярá *m.* 2. нашы́йнік -а *m.*, абро́жак-ка *m.* (*для саба́кі*). 3. хаму́т -á *m.*
– v.t. 1. надзе́ць каўне́р (*ашы́йнік, хаму́т*). 2. схапíць за каўне́р

collarbone ['kɑ:lərboun] n. ключы́ца *f.*

collateral [kə'lætərəl] – adj. 1. паралéльны, пабо́чны. 2. другара́дны, дадатко́вы. 3. з бакавóе лíніі (*пра пахо́джаньне*). 4. забясьпе́чаны (*для пазы́кі*)
– n. 1. сваяк з бакавóе лíніі (*напр. кузы́н*). 2. забясьпе́чаньне, заклáд за пазы́ку

colleague ['kɑ:li:g] n. калéга -і *m.*, ся́бра (*па слу́жбе, па шко́ле*)

collect [kə'lekt] v. 1. зьбірáць. 2. спаганя́ць, сы́скваць, сьця́гваць (*пада́ткі*). 3. засяро́джвацца, канцэнтрава́цца: ***to collect oneself*** схамяну́цца, апáмятацца, прыйсьці да сябе́. 4. калекцыянава́ць

collected [kə'lektɪd] adj. 1. сабра́ны: ***collected works*** сабра́ныя твóры, збор твóраў. 2. спако́йны, вы́трыманы

collection [kə'lekʃən] n. 1. зьбіра́ньне *n.* 2. сабра́ныя гро́шы. 3. калéкцыя *f.*

collective [kə'lektɪv] – adj. 1. супóльны; агу́льны, збóрны: ***the collective wisdom of Congress*** супóльная му́драсьць Кангрэ́су; ***collective number*** збóрны лічэ́бнік. 2. калекты́ўны: ***collective farming*** калекты́ўная гаспада́рка
– n. 1. збóрны назóўнік. 2. су́ма *f.*, збор -у *m.* 3. калекты́ўнае прадпрыéмства, калга́с -у *m.*

collective bargaining перамóвы рабóтнікаў з працада́ўцам

collectively [kə'lektɪvli] adv. калекты́ўна; як гру́па, усé ра́зам

collectivize [kə'lektɪvaɪz] v. калектывізава́ць

collectivization [kəˌlektɪvə'zeɪʃən] n. калектывіза́цыя *f.*

collector [kə'lektər] n. 1. зьбіра́льнік, калекцыянэ́р -а *m.* 2. збóршчык -а *m.* (*пада́ткаў, даўго́ў*). 3. Tech. калéктар -а *m.*

college ['kɑ:lɪdʒ] n. 1. універсытэ́цкі калéдж: ***college of medicine*** мэды́чны калéдж. 2. невялíкі ўнівэрсытэ́т. 3. калéгія *f.* 4. (*у Фра́нцыі*) сярэ́дняя шко́ла

collegian [kə'li:dʒiən] n. 1. студэ́нт -а *m.*, студэ́нтка *f.* 2. ся́бра калéгіі

collegiate [kə'li:dʒiət] – adj. 1. універсытэ́цкі, акадэмíчны: ***collegiate life*** студэ́нцкае жыцьцё. 2. маладня́цкі, як студэ́нт, юна́к: ***collegiate irresponsibility*** маладня́цкая безадка́знасьць
– n. сярэ́дняя шко́ла

collide [kə'laɪd] v.i. 1. сутыка́цца, сту́кацца: ***The cars collided*** Аўтамабíлі сту́кнуліся. 2. не пагаджа́цца, спрача́цца; супярэ́чыць

collie ['kɑ:li] n. шко́цкая аўча́рка

collier ['kɑ:ljər] n., esp. Brit. 1. вуглякóп -а *m.* 2. вадаплáў для перавóзкі вугóльля

colliery ['kɑ:ljəri] n., pl. **-lieries** каме́нна-ву́гальная капа́льня

collision [kə'lɪʒən] n.1. сутыкне́ньне *n.* (*цягнікóў, áўтаў*). 2. супярэ́чнасьць *f.*: ***to be in collision*** быць у супярэ́чнасьці; ***to come into collision*** тра́піць у супярэ́чнасьць. 3. канфлíкт -у *m.*

colloquial [kəˈloukwiəl] adj. гутарко́вы, размо́ўны: ***colloquial language*** гутарко́вая мо́ва

colloquialism [kəˈloukwiəˌlizəm] n. размо́ўнае, гутарко́вае сло́ва, выра́з

colloquy [ˈkɑ:ləkwi] n., pl. **-quies** 1. гу́тарка *f.*; канфэрэ́нцыя *f.* 2. пі́саны дыялёг -у *m.*

collude [kəˈlu:d] v.i. згаво́рвацца; змаўля́цца (*пата́емна*)

colon I [ˈkoulən] n. двухкро́п'е *n.*, два пу́нкты

colon II [ˈkoulən] n., pl. **-lons, -la** то́ўстая кі́шка

colonel [ˈkɜ:rnəl] n. палко́ўнік -а *m.*

colonial [kəˈlouniəl] – adj. каланія́льны: ***colonial policy*** каланія́льная палі́тыка; ***colonial skirmishes with the Indians*** сутычкі калані́за́тараў зь інды́я́намі; ***colonial furniture*** мэ́бля сты́лю каланія́льнага пэры́яду
– n. жыха́р калёніі

Colonies [ˈkɑ:ləniz] n., pl. **the Colonies** трына́ццаць брыта́нскіх калёніяў, які́я ста́ліся Злу́чанымі Шта́тамі

colonist [ˈkɑ:lənɪst] n. 1. каланіст -а *m.*, перасяле́нец, асяле́нец -ца *m.*, перасяле́нка, высяле́нка, асяле́нка *f.*; аса́днік -а *m.* 2. жыха́р калёніі

colonization [ˌkɑ:lənəˈzeʃən] n. каланіза́цыя *f.*

colonize [ˈkɑ:lənaɪz] v.t. 1. каланізава́ць. 2. утвара́ць калёнію, асяля́цца ў калёніі

colonizer [ˈkɑ:lənaɪzər] n. каланіза́тар -а *m.*

colonnade [ˌkɑ:ləˈneɪd] n. каляна́да *f.*

colony [ˈkɑ:ləni] n., pl. **-nies** 1. калёнія *f.* 2. гру́па асяле́нцаў. 3. гру́па людзе́й аднае́ прафэ́сіі: ***artists' colony*** калёнія мастако́ў. 4. Biol. жывёльнае або́ расьлі́ннае ску́пішча: ***a colony of ants*** мура́шнік -а *m.*

color, Brit. **colour** [ˈkʌlər] – n. 1. ко́лер -у *m.*, адце́ньне *n.* 2. афарбо́ўка, масьць *f.* (*пра жывёліну*). 3. фа́рба *f.*; фарбава́льнік -а *m.* (*для тканіны*). 3. ко́лер тва́ру (*румя́нец, бле́днасьць*): ***to lose color*** пабляднець, паблекнуць, зьбялець. 4. ко́лер ску́ры. 5. каляры́т -у *m.*, жы́васьць *f.*
– v. 1. фарбава́ць, малява́ць. 2. Figur. прадстаўля́ць у фальшы́вым сьвятле́, перакру́чваць; афарбо́ўваць (-ца)
• ***change color*** а) пабляднець. б) пачырванець
• ***colors*** адзна́ка, во́пратка (*арганіза́цыі, па́ртыі*)
• ***give or lend color to*** дада́ць праўдападо́бнасьць *чаму́*
• ***show one's colors*** а) паказа́ць сябе́ такі́м, які́м ёсьць. б) раскры́ць сваі́ пагля́ды ці пля́ны
• ***the colors*** а) сьцяг нацыяна́льны, вайско́вы. б) цырымо́ніі падыма́ньня й апуска́ньня сьця́га
• ***with flying colors*** пасьпяхо́ва, зь перамо́жнымі адзна́камі

color-blind [ˈkʌlərblaɪnd] adj. дальтані́чны

colorfast [ˈkʌlərfæst] adj. колератрыва́лы

color film каляро́вая сту́жка

colorful [ˈkʌlərfəl] adj. 1. каляро́вы, ко́лерны. 2. маляўні́чы: ***a colorful description*** маляўні́чае апіса́ньне

coloring [ˈkʌlərɪŋ] n. 1. афарбо́ўка *f.* 2. фа́рба *f.*, пігмэ́нт -у *m.*

colorless [ˈkʌlərləs] adj 1. бяско́лерны. 2. блядзі́, бле́дны: ***a colorless complexion*** бле́дны ко́лер тва́ру. 3. неціка́вы: ***a colorless person*** неціка́вы чалаве́к

colt [koult] n. 1. жарабя́, асьляня́ *n.* 2. малады́ недасьве́дчаны чалаве́к, навічо́к -ка́ *m.*

column [ˈkɑ:ləm] n. 1. калёна *f.*, абэлі́ск -а *m.* слупо́к -ка́ *m.*, калёнка *f.* (*газэ́тная*): ***a column of smoke*** слуп ды́му; ***the spinal column*** хрыбе́т -та́, пазвано́чнік -а *m.* 3. а) аддзе́л -у *m.* (*у газэ́це*): ***a financial column*** фіна́нсавы аддзе́л. б) арты́кул у гэ́тым аддзе́ле. 4. калёна *f.* (*жаўне́раў*), аўтакалёна

columnist [ˈkɑ:ləmnɪst] n. камэнта́тар -а *m.* (*газэ́тны*); фэльетані́ст -а *m.*, фэльетані́стка *f.*

coma I [ˈkoumə] n. ко́ма *f.*, бяспа́мяцтва *n.*

coma II [ˈkoumə] n., pl. **comae** абало́нка камэ́ты

comb [koum] – n. 1. грэ́бень -я *m.* (*і ў пе́ўня*). 2. скрэ́бла *n.*; шчо́тка для часа́ньня, часа́лка *f.* 3. со́ты *pl.*, вашчы́на *f.* 4. грэ́бні хва́ляў

– v.t. 1.часа́ць: ***to comb one's hair*** прычэ́сваца. 2. чы́сьціць скрэ́блам (*каня́*). 3. абшу́кваць (усю́ды), ператраса́ць, прачэ́сваць: ***We had to comb the whole city to find our dog*** Мы абшука́лі ўвесь го́рад, пакуль знайшлі́ свайго́ саба́ку

combat [ˈkɑ:mbæt] – n. 1. бой -ю *m.*, бі́тва *f.*: ***a single combat*** двубо́й -ю *m.*

– adj. баявы́, пахо́дны, страявы́: ***combat company*** а) ро́та ў баявы́м пара́дку. б) сапёрная ро́та; ***combat boots*** пахо́дныя бо́ты

– v. [kəmˈbæt] бі́цца; ваява́ць; змага́ць-ца

combatant [kəmˈbætənt] n. змага́р -а́ *m.*, балє́ц -йца́ *m.*, камбата́нт -а *m.*

combative [kəmˈbætɪv] adj.1. баявы́, ваяўні́чы. 2. задзі́рысты, лёгкі да бо́йкі ці сва́ркі

combed [koumd] adj. прычэ́саны; чэ́саны: ***combed yarn*** чэ́саная пра́жа

combination [ˌkɑ:mbɪˈneɪʃən] n. 1. злучэ́ньне, адзіно́чаньне *n.* 2. задзіно́чаньне, спалучэ́ньне *n.*, сындыка́т -у *m.* 3. камбіна́цыя *f.*: ***a combination lock*** сакрэ́тны замо́к; ***the combination of a safe*** камбіна́цыя сэ́йфу. 4. камбінэзо́н -а *m.* (*ве́рхні або́ спо́дні*). 5. Chem. спалучэ́ньне *n.*

combine [kəmˈbaɪn] – v. 1. лучы́цца, злуча́цца, задзіно́чваць(ь (-ца). 2. Chem. спалуча́ць у хімі́чныя элемэ́нты. 3. жаць і малаці́ць камба́йнам

– n. 1. камбіна́т -у *m.*: ***publishing combine*** выдаве́цкі камбіна́т. 2. камба́йн -а *m.*

combined [kəmˈbaɪnd] adj. 1. спалу́чаны, злу́чаны. 2. супо́льны

combustible [kəmˈbʌstəbəl] – adj. 1. запа́льны, гару́чы; лёгкі на загара́ньне. 2. па́лкі, гара́чы; запа́льчывы

– n. гару́чае, па́ліва *n.*, узгара́льнае рэ́чыва

combustibility [kəmˌbʌstəˈbɪlətɪ] n. запа́льнасьць, гару́часьць *f.*

combustion [kəmˈbʌstʃən] n. 1. гарэ́ньне, згара́ньне, спа́льваньне *n.* 2. Chem. акісьле́ньне *n.* 3. Figur. хвалява́ньні *pl. only*, замяша́ньне *n.*

come [kʌm] v.i. **came, come** 1. а) прыхо́дзіць: ***Come here!*** Хадзі́ сюды́; ***to come flying!*** прылята́ць; ***to come running*** прыбяга́ць. б) прыяжджа́ць; прылята́ць: ***to come by car*** прые́хаць машы́наю. в) прыбыва́ць: ***They will come home tomorrow*** Яны́ прые́дуць за́ўтра. 2. наставáць, прыхо́дзіць: ***Summer came*** Наста́ла ле́та. 3. дара́цца: ***How did it come that...*** Як так ста́лася, што... 4. браць пача́так, пахо́дзіць: ***These words came from Latin*** Гэ́тыя сло́вы прыйшлі́ з лаці́ны; ***to come of a poor family*** пахо́дзіць зь бе́днае сям'і́; ***No good will come of it*** Нічо́га до́брага з гэ́тага ня вы́йдзе

• ***come about*** а) зда́рыцца, адбы́цца. б) завярну́цца, зьмяні́ць кіру́нак

• ***come across*** а) напатка́ць, сустрэ́ца; спатыка́цца. б). Sl. дава́ць, плаці́ць

• ***come at*** а) дайсьці́ да *чаго́*, дабра́цца. б) кі́нуцца на *каго́*, заатакава́ць

• ***come back*** а) варо́чацца, вярта́цца. б) по́мсьціць

• ***come between*** разьдзяля́ць; разлуча́ць, уме́швацца

• ***come by*** атрыма́ць; набы́ць; нажы́ць: ***to come by the money*** нажы́ць гро́шы, дайсьці́ да гро́шай

• ***come down*** а) зыхо́дзіць; зьяжджа́ць, зла́зіць. б) перадава́цца, перахо́дзіць з пакале́ньня ў пакале́ньне (*па традыцыі*). в) стра́ціць ра́нг, стано́вішча, гро́шы

• ***come forward*** а) вы́йсьці, вы́ступіць (*напе́рад*). б) прапанава́ць дапамо́гу, ісьці́ насу́страч

• ***come in*** а) увахо́дзіць: ***Come in!*** Увахо́дзьце! б) прыхо́дзіць, прыбыва́ць (*пра цягні́к, вадапла́ў*)
• ***come in to*** атры́мваць; набыва́ць
• ***come in handy*** прыда́цца
• ***come in sight*** паказа́цца
• ***come in time*** падасьпе́ць, пасьпе́ць
• ***come in to*** атрыма́ць (*гро́шы*): ***to come into one's own*** атрыма́ць належнае; ***to come into being*** паўстава́ць; узьніка́ць (*нараджа́цца*)
• ***come off*** а) адбы́цца, ста́цца. б) вы́явіцца. в) вы́йсьці (*з спабо́рніцтва, спрэ́чкі*). г) адарва́цца (*пра гу́зік*), адкле́йвацца, адстава́ць
• ***Come off it!*** До́сыць ужо́!
• ***come on*** а) сустрэ́ць выпадко́ва. б) рабі́ць по́ступ (*у нову́цы*), разьвіва́ца (*пра хваро́бу*), набліжа́цца (*пра бу́ру*). в) выхо́дзіць на сцэ́ну
• ***Come on!*** За мно́ю! Хадзе́м хутчэ́й! Калі́ ла́ска (*про́сячы*); А ну! Ды ну!
• ***come out*** а) выхо́дзіць (*з пако́ю, з дру́ку — пра кні́гу*). б) зако́нчыцца, вы́йсьці. в) раскры́цца, вы́явіцца: ***The truth will come out*** Пра́ўда вы́явіцца; ***The secret came out*** Сакрэ́т раскры́ўся. г) дэбютава́ць. д) распуска́цца (*пра лісты́, кра́скі*). е) выво́дзіцца (*пра пля́мы*)
• ***come over*** а) апанава́ць, агарну́ць: ***A fear came over me*** Мяне́ агарну́ў страх. б) ста́цца: ***What's come over him?*** Што зь ім ста́лася?
• ***come to*** а) прыйсьці́ да прыто́мнасьці: ***to come to oneself*** а) ачуня́ць. б) каштава́ць, дахо́дзіць: ***The bill came to $10*** Раху́нак дайшо́ў да 10 даля́раў
• ***come to blows*** пабі́цца, дайсьці да кулако́ў
• ***come to one's senses*** апа́мятацца
• ***come to terms*** прыйсьці да пагадне́ньня
• ***come together*** зыхо́дзіцца, зьяжджа́цца
• ***come true*** збы́цца, спра́ўдзіцца, зьдзе́йсьніцца
• ***come up*** узыхо́дзіць
• ***come up with a solution*** знайсьці разьвя́зку
• ***come what may...*** што бу́дзе, тое бу́дзе; а ўжо́ ж што бу́дзе
• ***How come?*** Чаму́ так?
• ***if worst comes to worst*** у найго́ршым выпа́дку

comedian [kə'mi:diən] n. 1. ко́мік -а *m.* (*акто́р*). 2. камэдыя́нт -а *m.* 3. сьме́шны, заба́ўны, дасьці́пны чалаве́к

comedienne [kəˌmi:di'en] n. камэдыя́нтка *f.*

comedown ['kʌmdaʊn] n. 1. Informal заняпа́д -у *m.*, зьбяднє́ньне *n.* 2. стра́та стано́вішча або́ ра́нгу, дэграда́цыя *f.*

comedy ['kɑ:mədi] n., pl. **-dies** 1. камэ́дыя *f.* 2. заба́ўнае здарэ́ньне *або́* вы́падак

comely ['kʌmli] adj. **-lier, -liest** 1. прыва́бны, прые́мны з вы́гляду; мі́лы, ста́тны: ***rather comely than beautiful*** хутчэ́й прыва́бная, чым прыго́жая. 2. адпаве́дны, прыго́дны

comet ['kɑ:mɪt] n. камэ́та *f.*

comfort ['kʌmfərt] – v. 1. суцяша́ць; разва́жваць. 2. падбадзёрваць. 3. рабі́ць выго́дным. 4. Archaic дапамага́ць, падтры́мваць
– n. 1. суцяшэ́ньне *n.* 2. уцє́ха, ра́дасьць, асало́да *f.*; падтры́мка *f.*: ***Social security is a comfort to retired persons*** Сацыя́льнае забесьпячэ́ньне — падтры́мка для пэнсіянэ́раў. 3. а) выго́да *f.*; зру́чнасьць *f.* б) выго́ды жыцьця́, камфо́рт -у *m.*

comfortable ['kʌmpftəbəl] adj. 1. выго́дны, зру́чны: ***This chair is comfortable*** Гэ́тае крэ́сла выго́днае. 2. ёмкі, уту́льны. 3. супако́йны, спако́йны, бестурбо́тны: ***a comfortable sleep*** спако́йны сон; ***to feel comfortable*** чу́цца спако́йным, задаво́леным. 4. Informal дастатко́вы, ла́дны (*заро́бак*); зна́чны, перава́жны (*бальшыня́ галасо́ў*)

comfortably ['kʌmpftəbli] adv. выго́дна, уту́льна; зру́чна, ёмка

comforter ['kʌmfərtər] n. 1. суцяша́льнік -а *m.* 2. сьцёганая ко́ўдра. 3. даўгі́ ваўня́ны шаль. 4. со́ска-пусты́шка

comfortless ['kʌmfərtləs] adj. 1. су́мны (*пра сло́вы*), няўце́шны (*боль*). 2. няўту́льны; невыго́дны, без выго́даў

comic ['kɑ:mɪk] – adj. 1. кам|і́чны, гумарысты́чны, сьме́шны, заба́ўны. 2. камэды́йны: ***comic opera*** апэра́тка

– n. ко́мік -а *m.* (*акто́р*). 2. кінакамэ́дыя *f.*, мультыплікацы́йны фі́льм. 3. кам|і́зм -у *m.* 4. Informal ко́мікс -а *m.*

comics ко́міксы, сэры́йныя малю́нкі

comical ['kɑ:mɪkəl] adj. 1. заба́ўны, паце́шны, сьме́шны, кам|і́чны. 2. Informal дзіўны́, дзіва́чны, дзівакава́ты

coming ['kʌmɪŋ] – n. 1. надыхо́д -у *m.* 2. прыхо́д -у *m.* (*цягні́ка*), прые́зд -у *m.*

– adj. насту́пны, надыхо́дзячы

comity ['kɑ:mətɪ] n., pl. **-ties** ве́тлівасьць, цывілізава́насьць *f.*

comity of nations узае́мнае прызна́нье зако́наў і звы́чаяў і́ншых на́родаў

comma ['kɑ:mə] n. ко́ска *f.*

command [kə'mænd] – v.t. 1. зага́дваць: ***to command the men to fire*** загада́ць жаўне́рам страля́ць. 2. кама́ндаваць; кірава́ць: ***The captain commands his ship*** Капіта́н кіру́е караблём. 3. панава́ць, мець кантро́ль: ***to command the seas*** панава́ць на мо́рах. 4. вы́сіцца, мець угля́д

– n. 1. зага́дваньне, кама́ндаваньне *n.* 2. зага́д, нака́з- у *m.*; інстру́кцыя *f.*; указа́ньне *n.* 3. Milit. кама́нда *f.*, кама́ндаваньне *n.*: ***to be in command of a regiment*** кама́ндаваць палко́м; ***under command*** пад кама́ндаваньнем; ***at command*** у распараджэ́ньні. 4. аўтарытэ́т -у *m.*, ула́да *f.* 5. вало́даньне *n.*, бе́гласьць *f.* (*мо́вы*)

commandant ['kɑ:məndænt] n. 1. нача́льнік -а *m.* (*вае́ннай акадэ́міі або́ шко́лы*), камандзі́р -а *m.* 2. камэнда́нт (*крэ́пасьці*)

commandeer [ˌkɑ:mən'dɪr] v.t. 1. рэквізава́ць (*прыва́тнае майно́*). 2. прымусо́ва набіра́ць у во́йска

commander [kə'mændər] n. 1. зага́дчык, нача́льнік -а, правады́р -а́ *m.* 2. кама́ндуюч|ы -ага *m.* 3. капіта́н -а *m.*

commander-in-chief, pl. **commanders-in-chief** галó́ўнакама́ндуючы

commanding [kə'mændɪŋ] adj. 1. кама́ндуючы (*афіцэ́р*). 2. кіру́ючы; ула́дны, мо́цны: ***commanding influences*** мо́цныя ўплы́вы. 3. аўтарытэ́тны; які́ імпану́е, ро́біць ура́жаньне: ***a commanding voice*** аўтарытэ́тны го́лас. 4. які́ дамінуе або́ ўзвыша́ецца (*напр. узго́рак*)

commandment [kə'mændmənt] n. 1. запаве́т -у *m.* (*адзі́н зь дзесяцёх*). 2. зага́д -у *m.*, дырэктыва *f.*, зако́н -у *m.*

commando [kə'mændou] n. спэцыя́льны аддзе́л (*во́йска, мілі́цыі*)

command post галó́ўная кватэ́ра

commemorate [kə'meməreɪt] v.t. 1. ушано́ўваць, адзнача́ць па́мяць *або́* ўго́дкі. 2. захо́ўваць па́мяць, увекаве́чваць

commemoration [kəˌmemə'reɪʃən] n. 1. адзначэ́ньне, сьвяткава́ньне *n.* 2. слу́жба, урачы́стасьць (*у па́мяць*): ***in commemoration of*** каб ушанава́ць па́мяць *каго́-чаго́*

commemorative [kə'memərətɪv] adj. мэмарыя́льны

commence [kə'mens] v. 1. пачына́цца. 2. пачына́ць

commencement [kə'mensmənt] n. 1. пача́т|ак -ку *m.* 2. выпускны́ дзень у школе ці ўнівэрсытэ́це. 3. урачы́стасьць у гэ́ты дзень

commend [kə'mend] v. 1. хвалі́ць. 2. рэкамэндава́ць; сулі́ць. 3. аддава́ць пад не́чую апе́ку

commendable [kə'mendəbəl] adj. пахва́льны, ва́рты пахвалы́

commendation [ˌkɑ:men'deɪʃən] n. 1. ухвале́ньне *n.*; пахвала́ *f.* 2. рэкамэнда́ваньне *n.*, рэкамэнда́цыя *f.* 3. даве́раньне, даручэ́ньне *n.*; перада́ча пад апе́ку *або́* на захава́ньне

commendatory [kə'mendətɔ:rɪ] adj. рэкамэндацы́йны (*ліст*)

commensurable [kəˈmensərəbəl] adj. 1. сувымéрны. 2. адпавéдны (*памéрам, кóлькасьцю*), прапарцыйны

commensurate [kəˈmensərət] adj. 1. у адпавéднай прапóрцыі, прапарцыйна аднóлькавы. 2. рóўны (*памéрамі, вышынёю*). 3. сувымéрны

comment [ˈkɑ:ment] – n. 1. тлумачэ́ньне *n.*, заўвáга *f.*, камэнтáр -á *m.* 2. зáцемка *f.*, выкáзваньне *n.* 3. гýтарка *f.*, абгавóр -у *m.*

– v.i. 1. пісáць паясьняльныя *абó* крытычныя зáцемкі. 2. выкáзвацца, рабіць заўвáгі. 3. абгавóрваць

commentary [ˈkɑ:menteri] n., pl. **-ries** 1. тлумачáльныя зáцемкі, паясьнéньні. 2. тлумачáльны нáрыс. 3. камэнтáр (*у рáдыё, тэлевíзіі*)

commerce [ˈkɑ:mɜ:rs] n. гáндаль -лю *m.*, камэ́рцыя *f.*

commercial [kəˈmɜ:rʃəl] – adj. гандлёвы, камэрцыйны

– n. гандлёвая рэкля́ма, абвéстка (*у рáдыё, тэлевíзіі*)

commercial bank камэрцыйны банк

commingle [kəˈmɪŋgəl] v.t. зьмéшваць(ь) (-ца), мяшáць(ь) (-ца); зьліваць(ь) (-ца) (*пра галасы́*)

comminute [ˈkɑ:mənu:t] v.t. 1. таўчы́, расьціpáць (*на парашóк*). 2. крышы́ць, драбíць

comminution [ˌkɑ:məˈnu:ʃən] n.1. ператварэ́ньне ў парашóк, раздрабнéньне. 2. Surg. злом кóсьці на нéкалькі кавáлкаў

commiserate [kəˈmɪzəreɪt] v.t. 1. спачуваць. 2. лíтавацца над *кім*, шкадаваць

commissar [ˈkɑ:məsɑ:r] n. камісáр -а *m.*

commissariat [ˌkɑ:məˈseriət] n. 1. а) інтэндáнцтва *n.* б) інтэндáнт -а *m.* 2. дастáўка харчóў. 3. камісарыя́т -у *m.*

commissary [ˈkɑ:məseri] n., pl. **-saries** 1. крáма ў вайскóвым ля́геры. 2. інтэндáнт -а *m.* 3. дэпутáт -а, прадстаўнíк -á *m.* 4. камісáр -а *m.*

commission [kəˈmɪʃən] – n. 1. даручэ́ньне *n.*; паўнамóцтва *n.*, мандáт -у *m.* 2. а) загáд пра надáньне вайскóвага рáнгу. б) надáдзены ранг: ***to get a commission*** атрымáць афіцэ́рскі ранг; ***to resign one's commission*** звóльніцца з вайскóвае слýжбы. 3. камíсія *f.*, камітэ́т-у *m.* 4. камісíйная плáта

– v.t. 1. прызначáць на станóвішча; дэлегавáць; давáць паўнамóцтвы. 2. даручáць, давáць замóву (*мастаку́ на карці́ну*). 3. рыхтавáць да дзéяньня

• ***in commission*** а) на слýжбе; у карыстáньні. б) гатóвы да слýжбы *абó* ўжывáньня; у спрáўнасьці

• ***out of commission*** а) у адстáўцы. б) не гатóвы для ўжывáньня; няспрáўны

commissioner [kəˈmɪʃənər] n. 1. ся́бра камісíі (*асабл. урáдавае*). 2. камісáр -а *m.*: ***the commissioner of public health*** камісáр ахóвы здарóўя

commit [kəˈmɪt] v.t. 1. рабíць, учыня́ць: ***to commit adultery*** учыніць жанíмскую здрáду; ***to commit an error*** зрабíць памы́лку. 2. аддавáць: ***to commit to an asylum*** аддáць у шпітáль для псыхíчна хвóрых; ***to commit the body to earth (the grave)*** хавáць цéла, аддавáць зямлі; ***to commit to fire*** спалíць. 3. зьнявóліць. 4. абавязáць(ь) (-ца): ***It does not commit me to anything*** Гэ́та мянé да нічóга не абавя́звае; ***He would not commit himself in any way*** Ён нічы́м не забавязáўся

• ***commit to memory*** навучы́цца напáмяць

• ***commit to paper or writing*** запісáць, давéрыць паперы

commitment [kəˈmɪtmənt] n. 1. абяцáньне, забавязáньне *n.* 2. прысýд, загáд пасадзíць у астрóг *абó* паслáць у дом для псыхíчна хвóрых. 3. даручэ́ньне *n.*, перадáча *f.*

committee [kəˈmɪti] n. камітэ́т -у *m.*, камíсія *f.*: ***standing committee*** стáлая камíсія (*парлямэ́нту ці арганізáцыі*)

committeeman [kəˈmɪtimən] n., pl. **-men** ся́бра камíсіі *m. & f.*

commode [kəˈmoud] n. 1. камóда *f.* 2. стульчáк (*у прыбіpáльні*)

commodious [kəˈmoudiəs] adj. 1. абшы́рны. 2. зру́чны, выго́дны: ***a commodious location*** зру́чнае разьмяшчэ́ньне

commodity [kəˈmɑ:dəti] n., pl. **-ties** 1. тава́р, вы́раб -у *m.* 2. прадме́т ужы́тку

common [ˈkɑ:mən] – adj. 1. супо́льны: ***common interest*** супо́льныя зацікаўле́ньні. 2. агу́льны, агу́льнапрыня́ты: ***by common consent*** за агу́льнай зго́дай; ***common knowledge*** агу́льнае ве́дама. 3. грама́дзкі, публі́чны: ***common land*** грама́дзкая насе́ка. 4. звыча́йны, про́сты, паспалі́ты: ***common man*** звыча́йны, про́сты чалаве́к. 5. про́сты, грубы́: ***common speech*** про́стая, груба́я мо́ва. 6. Gram. а) агу́льны: ***common gender*** агу́льны род; ***common noun*** агу́льны назо́ўнік

– n. 1. супо́льнае *n.* 2. звы́чайнае *n.*: ***to have nothing in common*** ня мець нічо́га супо́льнага

• ***commons*** 1. агу́льнаграма́дзкая зямля́. 2. про́стыя лю́дзі. 3. агу́льная стало́ўка (*для студэ́нтаў*)

• ***the Commons = the House of Commons*** ні́жняя пала́та брыта́нскага й канады́йскага парлямэ́нту

common denominator агу́льны назо́ўнік (*дро́баў*)

common divisor (or **factor**) агу́льны дзе́льнік (*мно́жнік*)

common fraction про́сты дроб

common law 1. звычаёвае пра́ва. 2. няпі́саны зако́н

• ***common law marriage*** фактычнае жані́мства (*бяз шлю́бу*), жыцьцё на веру

common logarithm, Math. дзесятко́вы лягары́тм

common measure (time), Mus. па́рны такт (*на два або́ чаты́ры*)

commonly [ˈkɑ:mənli] adv. звыча́йна; агу́льна

common market агу́льны ры́нак

Common Market Агу́льны Ры́нак

commonplace [ˈkɑ:mənpleɪs] – n. а) звыча́йная, штодзённая рэч. б) бана́льнасьць *f.*

– adj. стары́, неціка́вы; зьбі́ты (*жарт*); бана́льны, штодзённы, звыча́йны

common sense здаро́вы ро́зум

commonweal [ˈkɑ:mənwi:l] n. агу́льнае дабро́

commonwealth [ˈkɑ:mənwelθ] n. 1. наро́д -у *m.*, грамадзя́не аднае́ дзяржа́вы. 2. дэмакраты́чная дзяржа́ва; супо́льнасьць, садру́жнасьць *f.*

• ***Commonwealth of Independent States (CIS)*** Супо́льнасьць Незале́жных Дзяржа́ваў (СНД)

• ***the Commonwealth of Nations = the British Commonwealth of Nations*** Брыта́нская супо́льнасьць наро́даў

commotion [kəˈmouʃən] n. 1. мітусьня́, бегатня́, сумятня́ *f.*; хвалява́ньне *n.* 2. публі́чныя хвалява́ньні, забурэ́ньні. 3. гвалто́ўны рух; бу́рныя ўда́ры (*ве́тру, бу́ры*), бурле́ньне: ***commotion of the waves*** бу́рныя ўда́ры хва́ляў

communal [kəˈmju:nəl] adj. 1. абшчы́нны: ***communal ownership of land*** абшчы́ннае земляўлада́ньне. 2. калекты́ўны, камуна́льны; грама́дзкі

communicate [kəˈmju:nɪkeɪt] v. 1. перада ва́ць. 2. паведамля́ць, каза́ць: ***to communicate news*** пове́даміць навіну. 3. паразумява́цца, дамаўля́цца. 4. спалуча́цца, быць спалу́чаным (*пако́і*). 5. прычашча́цца

communication [kəˌmju:nɪˈkeɪʃən] n. 1. перадава́ньне інфарма́цыі. 2. зно́сіны *pl.*, камуніка́цыя *f.* 3. ліст -а́ *m.*, ве́стка *f.*; паведамле́ньне *n.* 4. а) шляхі́ зно́сінаў. б) палучэ́ньне *n.*, прахо́д -у *m.* (*з пако́ю ў пако́й*)

• ***communications*** лі́ніі, сыстэ́ма су́вязі

communicative [kəˈmju:nɪkətɪv] adj. 1. тава́рыскі, гаваркі́. 2. камунікаты́ўны

communion [kəˈmju:niən] n. 1. супо́льнасьць (*зацікаўле́ньняў*). 2. бліская духо́вая су́вязь, сяброўства *n.* 3.

гру́па людзе́й адно́лькавага веравызна́ньня
• ***(Holy) Communion*** прыча́сьце *n.*

communiqué [kəˈmju:nɪkeɪ] n. ура́давы камуніка́т, камюніке́ *n., indecl.*

communism [ˈkɑ:mjəˌnɪzəm] n. камуні́зм -у *m.*

communist [ˈkɑ:mjənəst] – n. камуні́ст -а *m.*, камуні́стка *f.*
– adj. камуністы́чны: ***Communist party*** камуністы́чная па́ртыя

community [kəˈmju:nəti] – n., pl. **-ties** 1. грамада́ *f.* 2. грама́дзкасьць *f.* 3. супо́льнасьць *f.*, супо́льнасьць навуко́ўцаў: ***community of ideas*** супо́льнасьць пагля́даў. 4. супо́льнае ўлада́ньне: ***community property*** супо́льная ўла́снасьць, маёмасьць *f.* 5. падабе́нства *n.*, падо́бнасьць, то́еснасьць *f.* (*зацікаўле́ньняў*)
– adj. 1. грама́дзкі: ***a community playground*** грама́дзкая пляцо́ўка для гу́льняў; ***community center*** грама́дзкі цэ́нтар
• ***community college*** двухгадо́вы кале́дж, утрымо́ўваны мясцо́вай шко́льнай сыстэ́май

commutate [ˈkɑ:mjəteɪt] v. 1. Electr. пералуча́ць (*ток*). 2. замяня́ць ток (*перамо́нны на ста́лы*)

commutation [ˌkɑ:mjəˈteɪʃən] n. 1. заме́на *f.* 2. зьме́ншаньне ка́ры. 3. е́жджаньне на пра́цу (*цягніко́м, аўто́бусам*). 4. Electr. пералуча́ньне то́ку камута́тарам, камута́цыя *f.*
• ***commutation ticket*** сэзо́нны біле́т (*для прае́зду*)

commutator [ˈkɑ:mjəteɪtər] n., Electr. пераключа́льнік (*то́ку*), камута́тар -а *m.*

commute [kəˈmju:t] v. 1. замяня́ць (*забавяза́ньне*). 2. зьмянша́ць ка́ру. 3. пералуча́ць (*кіру́нак то́ку*). 4. е́зьдзіць на пра́цу (*цягніко́м, аўто́бусам*)

commuter [kəˈmju:tər] n. асо́ба, што рэгуля́рна курсу́е, дае́зьнік -а *m.*

compact I [kəmˈpækt] – adj. 1. тугі́, шчы́льны, шчы́тны. 2. кампа́ктны. 3. сьці́слы (*стыль*), каро́ткі
– v. ту́га пакава́ць; шчы́льна зьвя́зваць, сьціска́ць
– n. [ˈkɑ:mpækt] 1. малы́ аўтамабі́ль. 2. пу́драніца *f.*

compact II [ˈkɑ:mpækt] n. умо́ва, зго́да *f.*; кантра́кт -у *m.* (*між бака́мі*)

companion [kəmˈpænjən] – n. 1. ся́бра -ы *m.*, сяброў́ка *f.*, тава́рыш -а *m.* 2. кампаньён -а *m.*
– v.t. суправаджа́ць, спадаро́жнічаць

companionship [kəmˈpænjənʃɪp] n. сяброў́ства *n.*

company [ˈkʌmpəni] n., pl. **-nies** 1. кампа́нія *f.* (*гандлёвая*); тава́рыства *n.* 2. кампа́нія *f.* (*тава́рыская*): ***to behave well in company*** до́бра трыма́цца ў кампа́ніі. 3. Informal госьць -я *m.*, го́сьця *f.* 4. тава́рыства, сяброў́ства *n.* 5. Milit. ро́та *f.*
• ***bear company*** трыма́цца, быць у кампа́ніі
• ***keep company*** ве́сьці знаёмства, быць у кампа́ніі
• ***part company*** а) разыйсьці́ся. б) парва́ць знаёмства

comparable [ˈkɑ:mpərəbəl] adj. параўна́льны, падо́бны

comparative [kəmˈpærətɪv] – adj. 1. параўна́льны. 2. адно́сны, параўна́льны (*карысьць, лёгкасьць*). 3. Gram. параўна́льны (*злу́чнік*)
– n. вышэ́йшая ступе́нь (*прыме́тніка, прысло́ўя*)

comparatively [kəmˈpærətɪvli] adv. параўна́льна

compare [kəmˈper] – v. 1. (with) а) раўнава́ць, параўно́ўваць. б) зраўно́ўвацца: ***not to be compared with*** а) непараўна́ны, ве́льмі ро́зны. б) далёка не такі́ до́бры. 2. лічы́ць падо́бным. 3. Gram. утвара́ць ступе́ні параўна́ньня (*прыме́тнікаў, прысло́ўяў*)
– n. параўна́ньне *n.*: ***beyond compare*** без параўна́ньня, непараўна́льны

comparison [kəmˈpærɪsən] n. 1. параўна́ньне *n.*: ***There is no comparison between them*** Між і́мі ня мо́жа быць ніякага параўна́ньня. 2. пада-

бе́нства *n.* 3. Gram. зьме́на па ступе́нях параўна́ньня (*прыме́тнікаў*)

compartment [kəmˈpɑ:rtmənt] n. асо́бнае аддзяле́ньне *n.*, купэ́ *n., indecl.*

compass [ˈkʌmpəs] – n. 1. ко́мпас -а *m.* 2. ме́жы *pl.*, абся́г -у *m.* 3. дыяпазо́н -у *m.* 4. Figur. стрыма́насьць *f.*: ***to keep one's desire within compass*** стры́мваць, абмяжо́ўваць сваé жада́ньні. 5. *такс.* **compasses** цы́ркуль -я *m.*

– v.i. 1. і́сьці навóкал, абыхо́дзіць. 2. абкружа́ць; абступа́ць. 3. дасяга́ць: ***to compass one's purpose*** дасягну́ць сваé мэ́ты. 4. рабі́ць змо́ву, заду́мваць (*інтры́гу*). 5. спасьціга́ць, цалкам разуме́ць

– adj. акру́жны, кругападо́бны

compassion [kəmˈpæʃən] – n. спага́да *f.*, спачува́ньне *n.*

– v. спагада́ць, спачува́ць, шкадава́ць

compass plane банда́рскі струг, гэ́блік з паўкру́глым лязо́м

compassionate [kəmˈpæʃənət] adj. спачува́льны, спага́длівы; жа́ласьлівы

compatibility [kəmˌpætəˈbɪləti] n. 1. сумяшча́льнасьць *f.* 2. зго́днасьць, сула́днасьць *f.*, зго́днае сужыцьцё

compatible [kəmˈpætəbəl] adj. сумяшча́льны, сула́дны

compatriot [kəmˈpætriət] n. суайчы́ннік -а *m.*, зямля́к, земляка́ *m.*, зямля́чка *f.*

compel [kəmˈpel] v.t.(**-ll-**) 1. змуша́ць, прымуша́ць, вымуша́ць. 2. дабіва́цца; дамага́цца. 3. зганя́ць (*у грамаду́, да ку́чы*)

compendious [kəmˈpendiəs] adj. каро́ткі, сьці́слы

compendium [kəmˈpendiəm] n., pl. **-diums, -dia** каро́ткі перака́з; рэзюмэ́ *n., indecl.*; скарачэ́ньне *n.* (*кні́гі*)

compensate [ˈkɑ:mpənseɪt] v. 1. пакрыва́ць; варо́чаць, вяртáць (*стра́ты*). 2. кампэнсава́ць, наганя́ць (*стра́чаны час*). 3. апла́чваць, плаці́ць: ***to compensate for extra work*** заплаці́ць за дадатко́вую пра́цу. 4. Tech. балянсава́ць, ураўно́ўваць

compensation [ˌkɑ:mpənˈseɪʃən] n. 1. узнагаро́джаньне, кампэнсава́ньне *n.* 2. узнагаро́да *f.*; адшкадава́ньне *n.*, кампэнса́цыя *f.* (*за стра́ты, скале́чаньне*). 3. пэ́нсія *f.*, пла́та за пра́цу: ***equal compensation for men and women for equal work*** адно́лькавая пла́та для мужчы́наў і жанчы́наў за адно́лькавую пра́цу. 4. Tech. балянсава́ньне, ураўно́ўваньне *n.*

compete [kəmˈpi:t] v.i. 1. спабо́рнічаць, спаду́жнічаць; змага́цца. 2. прыма́ць удзе́л у спабо́рніцтве. 3. канкурава́ць

competence [ˈkɑ:mpətəns] n. or **-cy** 1. здо́льнасьць, зда́тнасьць., кампэтэ́нтнасьць, кваліфіка́цыя *f.* 2. Law правамо́цтва *n.*, кампэтэ́нцыя *f.* (*су́ду*). 3. даста́тлак -ку *m.*, замо́жнасьць *f.*

competent [ˈkɑ:mpətənt] adj. 1. кваліфікава́ны, здо́льны, падрыхтава́ны; адпаве́дны, кампэтэ́нтны. 2. Law правамо́цны, раўнапра́ўны

competition [ˌkɑ:mpəˈtɪʃən] n. 1. спаду́жніцтва *n.*, канкурэ́нцыя *f.* (*гандлёвая*). 2. спабо́рніцтва *n.*, вы́перадкі *pl.* (*у бе́гу*); ко́нкурс -у *m.*: ***chess competition*** ша́хматны турні́р

competitive [kəmˈpetətɪv] adj. 1. ко́нкурсны: ***competitive examination*** ко́нкурсны экза́мэн, ко́нкурс -у *m.* 2. канкурэнцы́йны (*цана́*), спабо́рны (*пра дружы́ны*)

competitor [kəmˈpetətər] n. спаду́жнік, спабо́рнік -а *m.*; канкурэ́нт -а *m.*

compilation [ˌkɑ:mpɪˈleɪʃən] n. 1. зьбіра́ньне *n.* (*матэрыя́лу, фа́ктаў*). 2. кампіля́цыя *f.*

compile [kəmˈpaɪl] v.t. 1. склада́ць: ***to compile a dictionary*** склада́ць сло́ўнік. 2. зьбіра́ць; кампілява́ць

compiler [kəmˈpaɪlər] n. склада́льнік -а *m.*, склада́льніца *f.*; кампіля́тар -а *m.*

complacency [kəmˈpleɪsənsi] n., pl. **-cies** 1. самазадавóленасьць *f.*, самазадаво́леньне *n.* 2. здаво́ленасьць, задаво́ленасьць *f.*

complacent [kəmˈpleɪsənt] adj. самаздаво́лены, задаво́лены

complain [kəmˈplem] v. 1. жа́ліцца, нарака́ць: ***to complain of a headache*** нарака́ць на боль галавы́. 2. ска́рдзіцца

complaint [kəmˈplemt] n. 1. жа́льба *f.*, нарака́ньне *n.*: ***I have no complaint to make*** Мне нямá на што нарака́ць. 2. незадавальне́ньне *n.* 3. фізы́чнае недамага́ньне, хвароба *f.*: ***A cold is a very common complaint*** Засту́да ве́льмі распаўсю́джанае недамага́ньне. 4. абвінава́чваньне *f.*, судо́вая ска́рга: ***to lodge/make a complaint*** пада́ць ска́ргу

complaisance [kəmˈpleɪsəns] n.1. лагóднасьць, паслу́жлівасьць *f.*; ве́тлівасьць *f.* 2. усту́пчывасьць *f.*

complaisant [kəmˈpleɪsənt] adj. 1. прывéтлівы, ласка́вы, паслу́жлівы; рахма́ны. 2. усту́пчывы, пада́тлівы

complement [ˈkɑ:mpləmənt] – n. 1. дапаўне́ньне *n.* 2. Gram. выказа́льнае сло́ва (*у выка́зьніку*). 3. Geom. дапаўне́ньне (*да про́стага кута́*). 4. камплéкт -у *m.*: ***The factory has a complement of workers*** Фа́брыка ма́е по́ўны штат працаўнікóў

– v.t. дапаўня́ць, укамплекто́ўваць

complete [kəmˈpli:t] – adj. 1. по́ўны, цэ́лы: ***complete set of works*** по́ўны збор тво́раў. 2. уве́сь, уся́, усё; цэ́лы: ***to devote a complete day to studies*** прысьвяці́ць цэ́лы дзень нову́цы. 3. ско́нчаны, зро́блены. 4. по́ўны, абсалю́тны: ***a complete surprise (happiness)*** по́ўная неспадзе́ўка

– v.t. 1. зако́нчыць, ско́нчыць, завяршы́ць. 2. допо́ўніць, укамплекта́ваць

completely [kəmˈpli:tli] adv. 1. зусі́м. 2. цалко́м, ца́лкам, по́ўнасьцю; да-шчэ́нту

complex – adj. [ˌkɑ:mˈpleks] 1. скамплікава́ны. 2. склада́ны

– n. [ˈkɑ:mpleks] 1. ко́мплекс, гру́па будынкаў. 2. Psych. ко́мплекс -у *m.*: ***inferiority complex*** камплéкс непаўнава́ртасьці

complexion [kəmˈplekʃən] n. 1. ко́лер тва́ру. 2. агу́льны вы́гляд; хара́ктар -у *m.*

complexity [kəmˈpleksəti] n., pl. **-ties** 1. склада́насьць, заблы́танасьць *f.* 2. склада́ны прадме́т

compliance [kəmˈplaɪəns] n. 1. усту́пчывасьць, пада́тлівасьць, пако́рлівасьць *f.* 2. выкана́ньне *n.* (*жада́ньня, зага́ду*); падпара́дкаваньне *n.*: ***in compliance with his orders*** згóдна, адпавéдна зь яго́ным зага́дам

compliant [kəmˈplaɪənt] adj. усту́пчывы, пада́тлівы, згавóрлівы

complicate [ˈkɑ:mpləkeɪt] v.t. 1. ускладня́ць; блы́таць. 2. пагóршваць, пагаршáць

complicated [ˈkɑ:mpləkeɪtəd] adj. складáны; цяжкí; заблы́таны: ***a complicated design*** складáны ўзóр; ***complicated negotiations*** складáныя перамóвы

complication [ˌkɑ:mpləˈkeɪʃən] n. 1. складáнасьць *f.* 2. ускладнéньне *n.*

complicity [kəmˈplɪsəti] – n., pl. **-ties** саўдзéл -у *m.*

compliment [ˈkɑ:mpləmənt] n. камплімэ́нт -у *m.*, пахвалá *f.*: ***to pay a compliment*** зрабíць камплімэ́нт, пахвалíць; ***to fish for compliments*** напрóшвацца на камплімэ́нты

– v. 1. хвалíць; вітáць, віншавáць. 2. дараваць (*з прызнáньнем*)

complimentary [ˌkɑ:mpləˈmentəri] adj. 1. пахвáльны; прывітáльны. 2. дáдзены бясплáтна (*кнíга, білéт*)

comply [kəmˈplaɪ] v.i. 1. згаджáцца; падпарадкóўвацца. 2. трымáцца фóрмаў вéтлівасьці

component [kəmˈpoʊnənt] – n. кампанэ́нт -а *m.*, складóвая чáстка; элемэ́нт -а *m.*

– adj. складóвы

compose [kəmˈpoʊz] v. 1. складáць. 2. складáць (*верш, плян*), кампанавáць (*мýзыку*). 3. Print., Brit. набірáць (*тэкст*). 4. супакóйвацца: ***Compose yourself!*** Супакóйся! Трымáй сябé ў рукáх!

composed [kəmˈpoʊzd] adj. супакóйны; цíхі; стрыманы

composer [kəmˈpouzər] n. 1. складáльнік -а *m.* 2. кампазы́тар -а *m.* 3. áўтар -а *m.*

composing machine, Brit. набóрная машы́на

composing room, Brit. набóрны цэх

composite [kəmˈpɑ:zət] – adj. 1. склáдзены з рóзных чáстак; складáны. 2. Bot. складáнацьвéтны
– n. сýмесь *f.*
• ***composite number*** складáны лік

composition [ˌkɑ:mpəˈzɪʃən] n. 1. укладáньне *n.*; твóрапіс, твор -у *m.* 2. кампазы́цыя *f.* 3. пабудóва *f.*, складáньне *n.* 4. склад -у *m.*

compositor [kəmˈpɑ:zətər] n., Brit. набóршчык -а *m.*

compost [ˈkɑ:mpoʊst] – n. кампóст -у *m.*
– v.t. 1. рабíць кампóст. 2. угнóйваць кампóстам

composure [kəmˈpouʒər] n. 1. стры́манасьць *f.*, самавалóданьне *n.* 2. спакóйнасьць *f.*

compote [ˈkɑ:mpoʊt] n. 1. кампóт -у *m.* 2. вáзачка на садавíну, цукéркі

compound I [ˈkɑ:mpaʊnd] – adj. 1. складáны. 2. Gram. а) складáнае слóва. б) складáна-злýчаны сказ
– n. 1. сýмесь *f.* 2. Chem. злучэ́ньне *n.* 3. складáнае слóва
– v. 1. злучáць. 2. ускладня́ць: ***to compound the problem*** ускладнíць праблéму

compound II [ˈkɑ:mpaʊnd] n. грýпа буды́нкаў, кóмплекс -у *m.*

comprehend [ˌkɑ:mprɪˈhend] v. 1. разумéць; ця́міць, кéміць. 2. абымáць (*абшáр*); зьмяшчáць

comprehensibility [ˌkɑ:mprɪˌhensəˈbɪləti] n. зразумéласьць, я́снасьць *f.*

comprehensible [ˌkɑ:mprɪˈhensəbəl] adj. зразумéлы

comprehension [ˌkɑ:mprɪˈhenʃən] n. 1. разумéньне *n.*; кéмлівасьць, кéмкасьць, ця́млівасьць *f.* 2. ахóпліваньне, улучэ́ньне, уключэ́ньне *n.*

comprehensive [ˌkɑ:mprɪˈhensɪv] adj. 1. шырóкі, вялíкі, вялíкага аб'ёму; вычарпáльны, усебакóвы, пóўны: ***a comprehensive review*** вычарпáльны агля́д. 2. ця́млівы, кéмлівы, кéмны (*чалавéк*); праніклівы (*рóзум*)

compress [kəmˈpres] v. 1. сьціскáць. 2. згушчáць пад ціскам, кандэнсавáць

compressed [kəmˈprest] adj. сьціснуты; зьмéншаны пад ціскам, згýшчаны

compressed air згýшчанае павéтра

compressibility [kəmˌpresəˈbɪləti] n. сьціскáльнасьць *f.*

compressible [kəmˈpresəbəl] adj. які́ мóжна сьціснуць

compression [kəmˈpreʃən] n. сьціскáньне *n.*, сьціск -у *m.*

comprise [kəmˈpraɪz] v. зьмяшчáць у сабé, уключáць, складáцца з; абдымáць

compromise [ˈkɑ:mprəmaɪz] – n. 1. кампрамíс -у *m.*, састýпка *f.* 2. кампрамітáцыя *f.*
– v. 1. ісьцí на кампрамíс. 2. кампрамітавáць, стáвіць пад падóзраньне; рызыкавáць
– adj. кампрамíсны; згóдніцкі, прымірэ́нчы

comptroller [kənˈtroʊlər] n. урáдавы фінáнсавы кантралёр

compulsion [kəmˈpʌlʃən] n. 1. пóцяг -у *m.* 2. прынýка *f.*: ***under compulsion*** пад прынýкай, вы́мушаны

compulsory [kəmˈpʌlsəri] adj. 1. прымусóвы, абавя́зкавы: ***compulsory education*** абавя́зкавае навучáньне. 2. накíнуты, навя́заны сíлаю

compunction [kəmˈpʌŋkʃən] n. 1. дакóры сумлéньня. 2. шкадавáньне *n.*, жалíь -ю *m.*; спагáда *f.*: ***without compunction*** бяз жáлю, без спагáды

computation [kɑ:mpjəˈteɪʃən] n. 1. вылічáнь не, падлічáньне, лічэ́ньне *n.*: ***Addition and subtraction are forms of computation*** Складáньне й адымáньне — ві́ды вылічэ́ньня. 2. падлíк, лік -у *m.*

compute [kəmˈpju:t] v. 1. падлíчваць; вылічáць. 2. лічы́ць

computer [kəmˈpju:tər] n. электрóнная вылічáльная машы́на; кампýтар, камп'ю́тар -а *m.*

comrade [ˈkɑ:mræd] n. 1. тава́рыш -а *m.*; ся́бра -ы *m.* 2. напа́рнік -а *m.*, ся́бра, кале́га па пра́цы

comradeship [ˈkɑ:mrædʃɪp] n. сяброў-ства *n.*, прыя́зьнь *f.*, тава́рыскія да-чыне́ньні

con I [kɑ:n] adv. супро́ць: ***pro and con*** за й супро́ць

con II [kɑ:n] v. стара́нна вывуча́ць, зуб-ры́ць

con III [kɑ:n] v., Sl. ашу́кваць, махля-ва́ць

concave [kɑ:nˈkeɪv] – adj. увагну́ты, угну́ты: ***a concave lens*** увагну́тая лі́нза

– v.t. угіна́ць

concavity [kɑ:nˈkævəti] n., pl. **-ties** 1. увагну́тасьць, угну́тасьць *f.* 2. увагну́тая паве́рхня, упа́дзіна *f.*

concavo-concave [kɑ:nˌkeɪvoʊkɑ:nˈkeɪv] adj. увагну́ты з або́двух бако́ў (*лі́нза*)

concavo-convex [kɑ:nˌkeɪvoʊkɑ:nˈveks] adj. увагну́та-выпу́клы (*лі́нза*)

conceal [kənˈsi:l] v. хава́ць, прыхо́ўваць. 2. уто́йваць (-ца); таі́ць (-ца)

concealed [kənˈsi:ld] adj. 1. схава́ны, прыхава́ны. 2. уто́ены, зато́ены. 3. та́йны

concealment [kənˈsi:lmənt] n. 1. хава́ньне, уто́йваньне, зато́йваньне *n.* 2. пата-е́мнае ме́сца, та́йнік -а *m.*; схо́ванка *f.*

concede [kənˈsi:d] v. 1. саступа́ць, прызнава́ць: ***I conceded that I have made a mistake*** Я прызна́ў, што зрабі́ў памы́лку. 2. саступа́ць, дазваля́ць, здава́ць; прызнава́ць: ***to concede the game*** здаць гульню́, прызна́ць пара́зу; ***The candidate conceded the election*** Кандыда́т прызна́ў пара́зу ў вы-барах

concededly [kənˈsi:dɪdli] adv. папра́ўдзе, пра́ўду ка́жучы; сапраўды́

conceit [kənˈsi:t] n. 1. зазна́йства *n.*, саманадзе́йнасьць, самаздаво́ленасьць, пы́ха *f.*: ***He is full of conceit*** Ён зало́шне самаздаво́лены. 2. капры́з -у *m.*

conceited [kənˈsi:tɪd] adj. саманадзе́йны, самапэ́ўны, самаўпэ́ўнены, самаздаво́лены

conceivable [kənˈsi:vəbəl] adj. дасту́пны ро́зуму, зразуме́лы, магчы́мы: ***every conceivable precaution against fire*** уся́кая магчы́мая засьцяро́га ад пажа́ру

conceive [kənˈsi:v] v. 1. прыду́мваць, заду́мваць: ***a well conceived scheme*** до́бра заду́маны плян. 2. уяўля́ць, ду́маць. 3. выка́зваць, перада-ва́ць сло́вамі. 4. зацяжа́рваць, зачына́ць

concentrate [ˈkɑ:nsəntreɪt] – v. 1. зьбі-ра́ць, засяро́джваць, канцэнтрава́ць. 2. згушча́ць, насыча́ць раство́ры, випа́рваць. 3. ачышча́ць руду́ ад пяску́, каме́ньня, абагача́ць (*руду́*). 4. (on, upon) засяро́джвацца, скан-цэнтро́ўвацца (*ду́мкай*)

– n. канцэнтра́т -у *m.*

concentration [ˌkɑ:nsənˈtreɪʃən] n. 1. засяро́джаньне *n.* (*сі́лаў, намага́ньняў*), канцэнтра́цыя *f.*; абагача́ньне (*руды́*). 2. засяро́джаная ўва́га. 3. моц *f.*, мацу́нак -ку *m.* (*раство́ру*). 4. Milit. групо́ўка *f.*, канцэнтрава́ньне збройных сі́лаў

• ***concentration camp*** канцэнтрацы́йны ля́гер

concentric or **concentrical** [kənˈsentrɪk] adj. канцэнтры́чны: ***concentric circles*** ко́лы, акру́жнасьці, які́я ма́юць супо́льны цэ́нтар

concept [ˈkɑ:nsept] n. агу́льнае паня́ць-це, паймо́ *n.*; ідэ́я *f.*; уяўле́ньне *n.*: ***the concept of equality*** паня́цьце ро́ўнасьці

conception [kənˈsepʃən] n. 1. разуме́нь-не *n.*: ***It is beyond my conception*** Гэ́та вышэ́й за маё разуме́ньне. 2. ду́мка, канцэ́пцыя *f.* 3. Philos. агу́льнае паня́цьце, ідэ́я *f.* 4. плян, прае́кт -у *m.*, за́дума *f.* 5. зача́цьце, апладне́нь-не *n.*

conceptional [kənˈsepʃənəl] adj. канцэп-туа́льны, паня́цьцевы

concern [kənˈsɜ:rn] – v. 1. даты́чыць, мець дачыне́ньне: ***It concerns nobody but me*** Гэ́та апрача́ мяне́ ніко́га не даты́чыць. 2. ру́піцца; турбава́цца, не-

пакóіцца: ***to be concerned about the future*** дбаць пра бýдучыню; ***as far as I am concerned*** што да мянé

– n. 1. спрáва, якáя нéкага датычыцца: ***It is none of my concern*** Гэ́та не маё спрáва. 2. дачынéньне *n.*: ***have little concern with something*** мець мáла дачынéньня да *чагó*. 3. непакóй -ю *m.*, турбóта, трывóга *f.*, хваляванне *n.* 4. канцэ́рн -у *m.*, гандлёвая фірма, кампáнія, прадпрыёмства *n.*

• ***concern oneself in*** цікáвіцца *чым*; займáцца *чым*

• ***concern oneself about*** турбавáцца аб *кім-чым*, непакóіцца, хваляванне

• ***of concern*** вялікай вáжнасьці: ***matter of great concern*** вéльмі вáжная спрáва

concerned [kənˈsɜ:rnd] adj. 1. зьвязáны, занятý; зацікáўлены: ***concerned parties*** зацікáўленыя бакí. 2. заклапóчаны

concerning [kənˈsɜ:rnɪŋ] prep. пра *кагó-што*, што да *кагó-чагó*, у дачынéньні да *кагó-чагó*: ***concerning me*** што тычыцца мянé

concert [ˈkɑ:nsərt] – n. 1. канцэ́рт -у *m.* 2. згóда *f.*; пагадненьне *n.*; дамóўленасьць *f.*: ***in concert with the associates*** у дамóўленасьці з супóльнікамі; ***in concert*** усé рáзам, супóльна, згóдна з дамóўленасьцю. 3. злáджанасьць *f.*, сулáднасьць музычных гýкаў

– adj. 1. канцэ́ртны (*зáля*): ***a concert pianist*** піяні́ст, які́ даé канцэ́рты

– v. [kənˈsɜ:rt] 1. дамаўля́цца, пагаджáцца. 2. супóльна плянавáць *абó* выкóнваць нéшта

concerted [kənˈsɜ:rtɪd] adj. 1. узаéмна ўзгóднены, дапасавáны. 2. супóльна плянавáны *абó* зрóблены; спалýчаны: ***a concerted attack*** атáка спалýчанымі сíламі. 3. Mus. падзéлены на кóлькі галасóў *абó* інструмэ́нтаў

concession [kənˈseʃən] n. 1. састýпка *f.*: ***make concessions*** íсьці на састýпкі. 2. канцэ́сія *f.*

concessive [kənˈsesɪv] adj. 1. канцэсíйны. 2. устýплівы, падáтлівы; прымірэ́нчы (*тон*). 3. Gram. уступáльны: ***"though" is a concessive word*** «хоць» — уступáльнае слóва

conch [kɑ:ŋk] n., pl. **conchs** or **conches** 1. Zool. сьлізьня́к -á *m.*; малю́ск -а *m.* 2. рáкавіна *f.* 3. Arch. а) скляпéньне кýпала. б) абсы́да *f.*

concha [ˈkɑ:ŋkə] n., pl. **-chae** Anat. вушнáя рáкавіна

conciliar [kənˈsɪliər] adj. сабóрны

conciliate [kənˈsɪlieɪt] v. 1. прымірáць, улагóджваць. 2. дабівáцца прабачэ́ньня, здабывáць, заваёўваць прыхíльнасьць, пашáну. 3. пагаджáць (*рóзныя пагля́ды*)

conciliation [kənˌsɪliˈeɪʃən] n. пагадненьне, прымірэ́ньне *n.*

conciliatory [kənˈsɪliətɔ:ri] adj. прымірэ́нчы (*тон, настрóй*)

concise [kənˈsaɪs] adj. 1. сьцíслы, карóткі. 2. выразны, дакладны

conciseness [kənˈsaɪsnəs] n. сьцíсласьць *f.*; дакладнасьць *f.*

conclave [ˈkɑ:nkleɪv] n. 1. закрытае *абó* таéмнае пасéджаньне. 2. канклявý -ву *m.*

conclude [kənˈklu:d] v. 1. канчáць, закóнчваць (*пасéджаньне, прамóву*). 2. заключáць (*умóву, мір*), рабíць высновý. 3. пастанаўля́ць, вырашáць ***I concluded not to go*** Я пастанáвіў ня йсьці. 4. канчáцца, закóнчвацца: ***The book concluded happily*** Кнíга закóнчылася шчасьлíва: ***to conclude*** такíм чы́нам (*у канцы́ прамóвы*)

concluding [kənˈklu:dɪŋ] adj. апóшні, заключны (*канцэ́рт, слóва*)

conclusion [kənˈklu:ʒən] n. 1. канéц -цá *m.*, заканчэ́ньне *n.*; апóшняя чáстка. 2. заключная чáстка (*твóру, прамóвы*). 3. вы́нік -у *m.* 4. заключэ́ньне *n.* (*умóвы, мíру*). 5. высновá, пастановá *f.*: ***to jump to a conclusion*** рабíць пасьпéшную высновý, забягáць напéрад

• ***in conclusion*** у заключэ́ньні, на-

рэ́шце

conclusive [kən'klu:sɪv] adj. заклю́чны; вырашáльны; пераканáўчы (*до́каз*)

concomitant [kən'kɑ:mətənt] – adj. суправаджа́льны, спадаро́жны: ***a concomitant result*** суправаджа́льны вы́нік

– n. суправаджа́льныя акалі́чнасьці

concord ['kɑ:nkɔ:rd] n. 1. згóда *f.*; лад -у *m.*, сулáдзьдзе *n.* 2. палітычная ўмо́ва, тракта́т -у *m.* 3. Mus. сулáднасьць *f.*, кансана́нс -у *m.*, гармо́нія *f.* 4. Gram. дапасава́ньне *n.*

concordance [kən'kɔ:rdəns] n. 1. згóднасьць, згóда *f.* 2. канкарда́нс -у *m.*, слóўнік (*а́ўтара, твóру*)

concordant [kən'kɔ:rdənt] adj. згóдны, супада́льны; сулáдны, гарманічны

concourse ['kɑ:nkɔ:rs] n. натóўп, гурт -ý *m.*, гýрба *f.* 2. зьліцьцё *n.*, злучэ́ньне ў адно́ цэ́лае: ***at the concourse of two rivers*** пры зьлі́цьці дзьвюх рэ́чак. 3. пляц -у *m.*, плóшча *f.* 4. галóўны вэстыбю́ль вакза́лу. 5. пад'е́зд -у *m.*, дарóга (*пад ха́ту*), бульва́р -у *m.*

concrescence [ˌkɑ:n'kresəns] n. зрастáньне *n.*, зрост -у *m.*

concrete ['kɑ:nkri:t] – adj. 1. канкрэ́тны, рэчаі́сны; рэа́льны. 2. цьвярды́, зацьвярдзе́лы (*рэ́чыва*) 3. [kɑ:n'kri:t] бэтóнны: ***a concrete sidewalk*** бэтóнны хóднік.

– n. 1. бэтóн -у *m.* 2. канкрэ́тнае паня́цьце, ідэ́я *абó* тэ́рмін

– v.t. залівáць бэтóнам, пакрывáць бэтóнам

– v.i. 1. цьвярдзе́ць. 2. застывáць. 3. бэтанава́ць

concrete mixer бэтонамяшáлка *f.*

concretion [kən'kri:ʃən] n. 1. зацьвярдзе́ньне, застыва́ньне, згуса́ньне *n.* 2. Med. камянí (*у ны́рках, жóўцевыя*)

concubine ['kɑ:ŋkjubaɪn] n. налóжніца, палюбóўніца *f.*

concupiscence [kɑ:n'kju:pɪsəns] n. юрлі́васьць, пажáдлівасьць, жадóба *f.*, юр -у *m.*

concupiscent [kɑ:n'kju:pɪsənt] adj. юрлі́вы, пажáдлівы

concur [kən'kɜ:r] v. 1. супадáць, прыхóдзіць ра́зам. 2. згаджáцца, быць таé сáмае ду́мкі. 3. спрыя́ць (*пра абста́віны*)

concurrence [kən'kɜ:rəns] n. 1. згóднасьць *f.* 2. супадзе́ньне *n.* (*у ча́се, пагля́дах*). 3. спрыя́ньне *n.*

concurrent [kən'kɜ:rənt] – adj. 1. супада́льны, адначáсны. 2. спрыя́льны. 3. Geom. якíя сыхóдзяцца ў адны́м пу́нкце. 4. згóдны (*у пагля́дзе*)

– n. 1. адначáсная падзе́я. 2. канкурэ́нт -а *m.*

concuss [kən'kʌs] v. 1. трэ́сьці, страcáць. 2. выклікáць зрушэ́ньне мазго́ў

concussion [kən'kʌʃən] n. 1. раптóўнае страсе́ньне. 2. зрушэ́ньне мазго́ў, кантýзія *f.*

condemn [kən'dem] v.t. 1. асуджáць; ганьбава́ць, га́ніць. 2. прызнава́ць вінава́тым. 3. прысуджáць, выно́сіць прысýд, засуджáць: ***to condemn to death*** засуджáць на сьмерць. 4. бракава́ць; прызнава́ць непрыда́тным (*будынак, мост*)

condemnation [ˌkɑ:ndəm'neɪʃən] n. 1. прысýд -у *m.*; асуджэ́ньне *n.* 2. прызна́ньне непрыда́тным, зага́нным

condemnatory [kən'demnətɔ:rɪ] adj. абвінава́ўчы (*прысýд, прамóва*); асуджáльны (*по́зірк*)

condemned [kən'demd] adj. прызна́ны вінава́тым; засýджаны, асýджаны

condensability n. згушча́льнасьць *f.*

condensation [ˌkɑ:nden'seɪʃən] n. 1. згушча́ньне, ушчыльня́ньне *n.*, кандэнcáцыя *f.* 2. згушчэ́ньне, ушчыльне́ньне *n.* 3. згýшчаная ма́са

condense [kən'dens] v.t. 1. згушча́ць(ца), ушыльня́ць(ца); кандэнсава́ць. 2. сьці́сла выка́заць ду́мку, скарача́ць: ***He condensed the paragraph into one sentence*** Ён пераказа́ў пара́граф адны́м ска́зам. 3. ператвара́ць газ *абó* па́ру ў ва́дкасьць; ператвара́цца ў ва́дкасьць, кандэнсава́цца

condensed [kənˈdenst] adj. 1. сьці́сла вы́казаны, скаро́чаны: ***condensed story*** скаро́чанае апавяда́ньне. 2. згу́шчаны: ***condensed milk*** згу́шчанае малако́. 3. ператво́раны ў ва́дкасьць

condenser [kənˈdensər] n. кандэнса́тар -а *m.*

condescend [ˌkɑ:ndɪˈsend] v.i. 1. ста́віцца пабла́жліва, рабі́ць ла́ску. 2. удасто́іць (*ласка́вым сло́вам*), ласка́ва дазво́ліць. 3. прыніжа́цца (*да благо́га ўчы́нку*)

condescendence [ˌkɑ:ndɪˈsendəns] n. пабла́жка *f.*; ла́ска *f.*

condescending [ˌkɑ:ndɪˈsendɪŋ] adj. 1. пабла́жлівы. 2. апяку́нскі (*тон*)

condescension [ˌkɑ:ndɪˈsenʃən] n. 1. пабла́жлівасьць (*да ніжэ́йшых*), пабла́жка *f.* 2. апяку́нскае ста́ўленьне

condign [kənˈdaɪn] adj. заслу́жаны, адпаве́дны: ***condign punishment*** заслу́жаная ка́ра

condition [kənˈdɪʃən] – n. 1. стан -у *m.*: ***in poor condition*** у благі́м ста́не. 2. Sport фо́рма *f.*: ***in (out of) condition*** у до́брай (благо́й) фо́рме. 3. прыда́тнасьць (*да пра́цы, про́дажу*). 4. сацыя́льнае стано́вішча; ранг -у *m.*: ***a man of humble condition*** чалаве́к сьці́плага паха́джаньня. 5. абста́віны *pl.* 6. умо́ва *f.*; акалі́чнасьць *f.*
– v.1. прыво́дзіць у до́бры стан, у до́брую фо́рму. 2. быць умо́вай. 3. абумо́ўліваць
• ***on condition that*** пад умо́вай, што; калі́
• ***under a condition*** умо́ўна

conditional [kənˈdɪʃənəl] – adj. умо́ўны; зале́жны (*ад не́чага*)
– n., Gram. умо́ўны сказ, лад або́ злу́чнік

conditioned [kənˈdɪʃənd] adj. 1. умо́ўны, абумо́ўлены, зале́жны ад *чаго́*: ***conditioned reflex*** умо́ўны рэфле́кс. 2. адпаве́дны но́рмам

conditionally [kənˈdɪʃənəli] adv. умо́ўна, з умо́вай

conditioner [kənˈdɪʃənər] n. 1. сро́дак для пале́пшаньня, аздараўле́ньня: ***a hair conditioner*** сро́дак для аздараўле́ньня валасо́ў. 2. Informal кандыцыянэ́р пове́тра

condole [kənˈdoʊl] v.i. спачува́ць; выка́зваць спачува́ньні

condolence [kənˈdoʊləns] n. спачува́ньні *pl.*

condominium [ˌkɑ:ndəˈmɪniəm] n. 1. кандамі́ніюм -у *m.* 2. ула́сная кватэ́ра ў агу́льнай будыні́не

condonation [ˌkɑ:ndəˈneɪʃən] n. прабачэ́ньне, дарава́ньне *n.*

condone [kənˈdoʊn] v.t. 1. прабача́ць, забыва́ць (правіну, абра́зу), дарава́ць (*правіну*). 3. Law прабача́ць (*парушэ́ньне жані́мскае прыся́гі*)

conduce [kənˈdu:s] v.i. садзе́йнічаць; спрыя́ць

conducive [kənˈdu:sɪv] adj. 1. карысны, спрыя́льны: ***to be conducive to good health*** быць карысным для здаро́ўя. 2. які́ вядзе́ да не́чага

conduct [ˈkɑ:ndʌkt] – n. 1. трыма́ньне *n.*, паво́дзіны *pl. only.* 2. кірава́ньне, вядзе́ньне *n.* (*спра́ваў*). 3. настаўле́ньне, указа́ньне *n.*, нака́з -у *m.*
– v.t. [kənˈdʌkt] 1. трыма́цца. 2. кірава́ць (*устано́вай*); дырыгава́ць (*аркестрам*). 3. паво́дзіць, суправаджа́ць. 4. быць праваднікóм (*для экску́рсіі*). 5. Phys. служы́ць праваднікóм, паво́дзіць (*цеплыню́, эле́ктрыку*)

conduction [kənˈdʌkʃən] n. 1. Phys. а) паво́джаньне (*цеплыні́, то́ку*). б) паво́днасьць *f.* 2. прапушча́ньне (*напр. вады́ праз трубу́*), рух (*вады́ па трубе́*)

conductor [kənˈdʌktər] n. 1. праваднік -á *m.* (*на чыгу́нцы*); канду́ктар -а *m.* (*на аўто́бусе, трамва́і*); кіраўні́к -á, праваднік -á *m.*: ***the conductor of a tour*** кіраўні́к падаро́жжа, экскурсаво́д. 2. дырыге́нт -а *m.*, дырыжо́р -а *m.* (*аркестру*), капэльма́йстар -ра *m.* 3. Phys. праваднік -á *m.* (*цяпла́, электры́чнага то́ку*)

conduit ['kɑ:nduət] n. 1. канáл -у *m.*; трубаправóд; вадаправóд -у *m.*, аквэдýк -у *m.* 2. ізаляцыйная трýбка

cone [koun] – n. 1. кóнус -а *m.* 2. Bot. шышка *f.*
– v. надавáць фóрму кóнуса

coney ['kouni] n., pl. **-neys** *гл.* **cony**

confection [kən'fekʃən] n. 1. салóдкія (кандытарскія) выробы (*цукéркі, канфітýры*). 2. канфэкцыя *f.*, гатóвае жанóчае адзéньне

confectioner [kən'fekʃənər] n. цукéрнік -а, кандытар -а *m.*: ***confectioner's sugar*** цукрóвы парашóк

confectionery [kən'fekʃəneri] n., pl. **-eries** 1. кандытарскія вырáбы. 2. кандытэрыя, цукéрня *f.*

confederacy [kən'fedərəsi] n., pl. **-cies** 1. канфэдэрáцыя *f.* (*дзяржáваў абó асóбаў*). 2. кансьпірáцыя, змóва *f.* 3. згуртавáньне *n.*, саюз -у *m.*, лíга *f.*
• ***the Confederacy*** грýпа адзінаццацёх паўдзённых штáтаў, якія ў 1860-61 гг. адлучыліся ад ЗША

confederate [kən'fedərət] – adj. саюзьніцкі, фэдэрáльны
– n. 1. саюзьнік -а *m.* 2. саўдзéльнік (*у злачынстве*)
– v. [kən'fedəreɪt] злучáцца ў канфэдэрáцыю

confederation [kənˌfedə'reɪʃən] n. 1. а) задзінóчваньне, лучэ́ньне ў лíгу. б) фэдэрáцыя *f.* 2. лíга *f.*, саюз -у *m.*, канфэдэрáцыя *f.*
• ***Confederation*** Канадыйская Канфэдэрáцыя (*задзінóчаньне Антáрыё, Квэбэ́ку, Нóвай Шкóцыі й Нью Брáнсýіку, якóе далó пачáтак Канáдзе*)
• ***the Confederation*** задзінóчаньне трынаццацёх амэрыкáнскіх штатáў павóдле Палажэ́ньняў 1781-89 гг.

confer [kən'fɜ:r] – v.i. **-ferred, -ferring** рáіцца, рáдзіцца, мець нарáду, вéсьці кансультáцыі
– v.t. давáць (*мэдáль*); надавáць, прысуджáць (*ступéнь, узнагарóду*)

conferee [ˌkɑ:nfə'ri:] n. 1. удзéльнік канфэрэ́нцыі. 2. асóба, якóй даéцца ўзнагарóда, ступéнь

conference ['kɑ:nfərəns] n. нарáда, канфэрэ́нцыя *f.*

confess [kən'fes] v. 1. прызнавáць (*віну́, слáбасьць*); выдавáць (*сакрэ́т*). 2. спавядáцца (*сьвятару́*). 3. спавядáць (*пра сьвятарá*)

confession [kən'feʃən] n. 1. прызнáньне *n.* (*віны́*). 2. спóведзь *f.* 3. веравызнáньне *n.*

confessor [kən'fesər] n. 1. спавядáльнік -а *m.* (*сьвятáр*). 2. спавéднік -а *m.*, асóба, якáя прызнаéцца. 3 пасьлядóўнік якóе-н. вéры

confetti [kən'feti] n. канфэці́, *n., indecl.*

confidant ['kɑ:nfɪdænt] n. 1. давéраная асóба. 2. сардэ́чны ся́бра

confidante ['kɑ:nfɪdænt] n. сардэ́чная сяброўка

confide [kən'faɪd] v. 1. давяráць, адкрывáцца, дзялíцца (*сакрэ́там, клóпатамі*). 2. даручáць, аддавáць пад апéку

confidence ['kɑ:nfɪdəns] n. 1. вéра, упэ́ўненасьць *f.*; давéр -у *m.*: ***with full confidence in victory*** з пóўнай вéрай у перамóгу. 2. самапэ́ўнасьць *f.* 3. адвáга *f.*; зухвáльства *n.*
• ***take into one's confidence*** увéсьці нéкага ў давéр

confident ['kɑ:nfɪdənt] – adj. 1. пэ́ўны, перакананы. 2. саманадзéйны. 3. занáдта пэ́ўны, зухвáлы
– n. блíзкі, давéраны ся́бра; блíзкая сяброўка

confidential [ˌkɑ:nfɪ'denʃəl] adj. 1. сакрэ́тны, канфідэнцыйны: ***a confidential report*** сакрэ́тная справаздáча. 2. пэ́ўны. 3. давéраны, які́ карыстáецца давéрам: ***a confidential secretary*** давéраны сакратáр

confidentiality [ˌkɑ:nfəˌdenʃi'æləti] n. сакрэ́тнасьць, канфідэнцыйнасьць *f.*

confidentially [ˌkɑ:nfɪ'dentʃəli] adv. пад сакрэ́там, канфідэнцыйна

confiding [kən'faɪdɪŋ] adj. давéрлівы

configuration [kənˌfɪgjə'reɪʃən] n. 1. канфігурáцыя, структýра *f.*; фóрма *f.*, абрыс -у *m.* 2. сыстэ́ма (*нябéсных цéлаў*)

confine [kənˈfaɪn] – v.t. 1. абмяжо́ўваць, абмяжо́ўвацца. 2. трыма́ць унутры́: ***A cold confined him to the house*** Прасту́да трыма́е яго́ ў ха́це; ***to be confined to bed*** быць прыкава́ным да ло́жка. 3. саджа́ць у турму́, зьняво́льваць
– n. often ***confines*** ме́жы; дзяржа́ўная мяжа́

confined [kənˈfaɪnd] adj. 1. зьняво́лены, пало́нены. 2. абмежава́ны

confinement [kənˈfaɪnmənt] n. 1. абмежава́ньне *n.* 2. зьняво́леньне *n.*; а́рышт -у *m.* 3. ро́ды *pl. only*

confirm [kənˈfɜ:rm] v.t. 1. пацьвярджа́ць, сьцьвярджа́ць. 2. ратыфіка́ваць (*умо́ву*). 3. падмацо́ўваць, падтры́мваць. 4. Relig. канфірмава́ць

confirmation [ˌkɑ:nfərˈmeɪʃən] n. 1. пацьве́рджаньне *n.* 2. умацава́ньне, замацава́ньне *n.* 3. ратыфіка́цыя *f.* (*умо́вы*). 4. Relig. канфірма́цыя *f.*

confirmative [kənˈfɜ:rmətɪv] adj. пацьвярджа́льны

confirmed [kənˈfɜ:rmd] adj. 1. пацьве́рджаны, дове́дзены, абгрунтава́ны. 2. закаране́лы (*манью́ка*), заўзя́ты (*п'я́ніца*). 3. храні́чны: ***a confirmed invalid*** храні́чны кале́ка

confiscate [ˈkɑ:nfɪskeɪt] v.t. канфіскава́ць, рэквізава́ць

confiscation [ˌkɑ:nfɪsˈkeɪʃən] n. канфіска́цыя, рэквізы́цыя *f.*

conflagrate [ˈkɑ:nfləgreɪt] – v.i. загара́цца, выбуха́ць агнём, гара́ць
– v.t. падпа́льваць, спа́льваць

conflagration [ˌkɑ:nfləgˈreɪʃən] n. вялі́кі пажа́р, пажа́рышча *n.*

conflict [ˈkɑ:nflɪkt] – n. 1. змага́ньне *n.*, канфлі́кт -у *m.* 2. разыхо́джаньне *n.*, супярэ́чнасьць *f.*, калі́зія *f.*: ***conflict of opinions*** супярэ́чнасьць пагля́даў
– v.i. [kənˈflɪkt] 1. быць у супярэ́чнасьці, пярэ́чыць; разыхо́дзіцца (*у ду́мках*). 2. змага́цца

conflicting [kənˈflɪktɪŋ] adj. нязго́дны, супярэ́члівы: ***conflicting evidence*** супярэ́члівыя сьве́дчаньні

confluence [ˈkɑ:nfluəns] n. 1. зьліцьцё *n.* (*рэ́чак*). 2. суто́к -у *m.* (*ме́сца зьліцьця́*). 3. зьбег -у *m.* (*акалі́чнасьцяў*). 4. збор -у, сьціск -у, наплы́ў -ву *m.* (*людзе́й*), нато́ўп -у *m.*

confluent [ˈkɑ:nfluənt] – adj. які́я зьліва́юцца ў адно́
– n. прыто́к -у *m.*

conform [kənˈfɔ:rm] – v.i. 1. прыстасо́ўвацца. 2. адпавяда́ць зако́ну. 3. прыпадабня́цца фо́рмай, хара́ктарам
– v.t. 1. прыпадабня́ць фо́рмай, хара́ктарам. 2. прыстасо́ўваць

conformability [kənˌfɔ:rməˈbɪlətɪ] n. 1. падабе́нства *n.* 2. прыстасава́ньне *n.* (*да но́рмаў*). 3. пада́тлівасьць, пако́рлівасьць *f.*

conformable [kənˈfɔ:rməbəl] adj. 1. адпаве́дны, падо́бны. 2. дастасава́ны. 3. пада́тлівы

conformation [ˌkɑ:nfɔ:rˈmeɪʃən] n. 1. фо́рма, структу́ра *f.* 2. сымэтры́чны ўкла́д ча́стак. 3. а) датарнава́ньне, прыпадабне́ньне *n.* б) прыстасава́ньне да агу́льных но́рмаў

conformist [kənˈfɔ:rmɪst] n. 1. канфарми́ст -а, прыстасава́нец -ца *m.* 2. Hist. пасьлядо́ўнік Англіка́нскае царквы́

conformity [kənˈfɔ:rmətɪ] n., pl. **-ties** 1. падабе́нства *n.*; зго́днасьць; адпаве́днасьць *f.*: ***in conformity with*** зго́дна з *чым*. 2. а) падпара́дкаваньне фо́рмам. б) прыстасава́нства *n.* 3. паслухмя́насьць, пада́тлівасьць, пако́рнасьць *f.*

confound [kənˈfaʊnd] v.t. 1. бянтэ́жыць. 2. блы́таць, зблы́тваць. 3. зьдзіўля́ць; зьбіва́ць з тро́пу; разла́джваць, псава́ць
• ***Confound it (him)*** Хай яго́ лі́ха; Лі́ха на яго́

confounded [kənˈfaʊndɪd] adj. 1. зьбянтэ́жаны; разгу́блены. 2. агі́дны: ***He is a confounded liar*** Ён агі́дны хлус

confraternity [ˌkɑ:nfrəˈtɜ:rnətɪ] n., pl. **-ties** 1. братэ́рства *n.* 2. бра́цтва *n.*

confront [kənˈfrʌnt] v.t. 1. стаяць твар у твар, стаяць насупро́ць. 2. супраціў-

ля́цца, супрацьстая́ць. 3. рабі́ць во́чную ста́ўку

confrontation [ˌkɑ:nfrʌnˈteɪʃən] n.1. канфрантáцыя *f.*, во́чная ста́ўка. 2. супастаўле́нье *n.* 3. супраціўле́нье *n.*

confuse [kənˈfju:z] v. 1. мяша́ць, заблы́тваць, рабі́ць замяша́ньне. 2. не адро́зьніваць (*адзі́н ад аднаго́*), пераблы́тваць. 3. саро́міць, бянтэ́жыць. 4. ашаламля́ць; уво́дзіць у разгу́бленасьць

confused [kənˈfju:zd] adj. 1. зьбянтэ́жаны, разгу́блены, засаро́мленыя: ***to be confused*** засаро́міцца, зьбянтэ́жыцца, суме́цца. 2. заблы́таны, бязла́дны: ***confused answer*** блы́таны адка́з

confusedly [kənˈfju:zɪdli] adv. 1. зьбянтэ́жана, засаро́млена, разгу́блена. 2. бязла́дна, хааты́чна

confusion [kənˈfju:ʒən] n. 1. блытані́на *f.*, блы́таньне *n.* 2. замяша́ньне *n.*, непара́д|ак -ку *m.* 3. разгу́бленасьць, ашало́мленасьць *f.* 4. зьбянтэ́жанасьць, засаро́мленасьць *f.*

confutation [ˈkɑ:nfjuˈteɪʃən] n. запярэ́чаньне *n.*

confute [kənˈfju:t] v.t. запярэ́чваць, абвяргáць

congeal [kənˈdʒi:l] v. 1. замаро́жваць (*ва́дкасьць*). 2. цьвярдзе́ць; застыва́ць (*ква́шаніна*); згушча́ц|ь (-ца); тужэ́ць

congenial [kənˈdʒi:niəl] adj. кангеніяльны, адпаве́дны паводле ду́ху

congenital [kənˈdʒenɪtəl] adj. прыро́джаны, прыро́дны

congest [kənˈdʒest] v. 1. перапаўня́ць (*людзьмі́, аўтамаба́ілямі*). 2. закупо́рваццa

congestion [kənˈdʒestʃən] n. 1. перапо́ўненасьць, перанасе́ленасьць *f.* 2. перагру́жанасьць *f.*, зато́р -у *m.* (*ву́ліч-нага ру́ху*). 3. Med. закупо́рка *f.*, засто́й -ю *m.*: ***venous congestion*** згушчэ́ньне крыві́ ў ве́нах

conglobate [ˈkɑ:ngləbeɪt] – adj. кулі́сты, шарападо́бны, сфэры́чны

– v. надава́ць кулі́стую фо́рму; прыма́ць кулі́стую фо́рму

conglomerate [kənˈglɑ:mərət] – adj. 1. сабра́ны ў ма́су. 2. зьле́плены, спалу́чаны з чаго́-н. разнаро́днага. 3. Geol. канглямэра́тны

– n. 1. зьле́пішча *n.* 2. канглямэра́т -у *m.* 3. Geol. аса́дкавая го́рная поро́да

– v. [kənˈglɑ:mereɪt] 1. зьбіра́ц|ь (-ца), сканцэнтро́ўваць (-ца). 2. ператвара́ц|ь (-ца) у зьлі́тную ма́су

conglomeration [kənˌglɑ:məˈreɪʃən] n. 1. злучэ́ньне *n.*, зьліцьцё ў ма́су. 2. канглямэра́цыя *f.* ; мешані́на *f.*

conglutinate [kənˈglu:tɪneɪt] – v. зьле́пліваць (-ца); зьліпа́цца

– adj. зьле́плены, зьлі́плы, скле́ены

conglutination [kənˌglu:tɪˈneɪʃən] n. 1. зьле́пваньне, зьліпа́ньне *n.* 2. зрост -у *m.*

congratulant [kənˈgrætʃələnt] – adj. прывіта́льны, віншава́льны

– n. той, хто віта́е; віншава́льнік -а *m.*, віншава́льніца *f.*

congratulate [kənˈgrædʒəleɪt] v. 1. віта́ць; віншава́ць: ***I congratulate you on your success*** Віншу́ю вас з по́сьпехам; ***to congratulate someone on his birthday*** віншава́ць *каго́* з днём наро́дзінаў

congratulation [kənˌgrætʃəˈleɪʃən] n. віта́ньне, зычэ́ньне *n.*

• ***congratulations*** прывіта́ньні, віншава́ньні

congregate [ˈkɑ:ŋgrɪgeɪt] – v.i. зьбіра́цца (*у ку́чу, грамаду́*): ***All the children congregated around the Christmas tree*** Усе́ дзе́ці сабра́ліся каля ялі́нкі

– v.t. зьбіра́ць

– adj. [ˈkɑ:ŋgrɪgət] 1. сабра́ны, сканцэнтрава́ны. 2. збо́рны

congregation [ˌkɑ:ŋgrɪˈgeɪʃən] n. 1. зьбіра́ньне *n.*, зыхо́джаньне ў грамаду́. 2. збо́рышча *n.* (*людзе́й*), сход -у *m.*; зьезд -у *m.* 3. Relig. пара́фія *f.*, прыхо́д -у *m.*; парафія́не, прыхаджа́не *pl. only.* 4. рэлігі́йнае тава́рыства, супо́лка, кангрэга́цыя *f.*

congress ['kɑ:ŋgres] n. 1. кангрэ́с -у *m.* (*заканада́ўчы во́рган у дзяржа́ве*). 2. зьезд -у *m.*, сустрэ́ча *f.*, кангрэ́с -у *m.*: ***a writers' congress*** зьезд пісьме́ньнікаў
• ***Congress*** Кангрэ́с ЗША (*які́ складае́цца з Сэна́ту й Пала́ты Прадстаўні́ко́ў*)
congressional [kəŋ'greʃənəl] adj. кангрэ́савы: ***Congressional election*** вы́бары Кангрэ́су
congressman ['kɑ:ŋgresmən] n., pl.-**men** кангрэсмэ́н -а *m.* (*ся́бра Кангрэ́су ЗША, асабліва пала́ты прадстаўні́ко́ў*)
conic ['kɑ:nɪk] adj. *гл.* **conical**
conical ['kɑ:nɪkəl] adj. кані́чны; ко́нусападо́бны
conic section Math. кані́чнае сячэ́ньне
conifer ['kɑ:nəfər] n. хваёвае дрэ́ва, хваёвы куст
coniferous [kou'nɪfərəs] adj. 1. які́ ма́е шы́шкі. 2. хваёвы: ***a coniferous forest*** хваёвы лес
conjectural [kən'dʒektʃərəl] adj. прыпушча́льны, абапе́рты на меркава́ньні
conjecture [kən'dʒektʃər] – n. 1. меркава́ньне, дапушча́ньне *n.* 2. здага́дка *f.*, здо́гад -у *m.*, дапушчэ́ньне *n.*
– v. здага́двацца, дапушча́ць
conjoin [kən'dʒɔɪn] v. лучы́ць(ь) (-ца); спалуча́ць(ь) (-ца)
conjoint [kən'dʒɔɪnt] adj. злу́чаны, спалу́чаны; супо́льны
conjugal ['kɑ:ndʒəgəl] adj. жані́мскі, шлю́бны
conjugate ['kɑ:ndʒəgeɪt] – v.t. 1. Gram. спрага́ць. 2. спалуча́ць (*па́рамі*)
– v.i. 1. Gram. спрага́цца. 2. Biol. спалуча́цца (*па́рамі*), прахо́дзіць капуля́цыю
– adj. ['kɑ:ndʒəgət] 1. па́рны, спалу́чаны па́рамі. 2. Gram. аднакарэ́нны. 3. Math. спалу́чаны: ***conjugate angles*** спалу́чаныя куты́
conjugation [kɑ:ndʒə'geɪʃən] n. 1. Gram. а) спрага́ньне *n.* б) спражэ́ньне *n.* 2. спалучэ́ньне *n.* 3. Biol. капуля́цыя *f.*

conjunct ['kɑ:ndʒʌŋkt] adj. спалу́чаны; супо́льны; зьвяза́ны
conjunction [kən'dʒʌŋkʃən] n. 1. су́вязь *f.*, спалучэ́ньне *n.*, камбіна́цыя *f.*: ***in conjunction*** у спалучэ́ньні, ра́зам, супо́льна. 2. зьбег -у *m.* (*падзе́яў, акалі́чнасьцяў*), супадзе́ньне *n.* 3. Gram. злу́чнік -а *m.*
conjunctiva [ˌkɑ:ndʒʌŋk'taɪvə] n., pl. **-vas, -vae,** Anat. каньюнкты́ва (*сьлі́зістая абало́нка во́ка*)
conjunctive [kən'dʒʌŋktɪv] – adj. 1. злуча́льны. 2. злу́чаны, спалу́чаны. 3. Gram. злу́чнікавы
– n. злуча́льнае сло́ва, злу́чнік -а *m.*
conjure ['kɑ:ndʒər] – v. 1. закліна́ць (*чарадзе́йнымі сло́вамі*). 2. вядзьма́рыць, чарава́ць. 3. [kən'dʒʊr] прасі́ць; упро́шваць; закліна́ць
– v.i. 1. выклі́ка́ць ду́хаў. 2. пака́зваць фо́кусы, займа́цца штука́рствам
conjurer or **conjuror** ['kɑ:ndʒərər] n. 1. штука́р -а́, фо́кусьнік -а *m.* 2. чараўні́к -а́, чарадзе́й -я *m.*; чараўні́ца, чарадзе́йка *f.*
conk [kɑ:ŋk] – n. 1. Brit., Sl. нос -а *m.* 2. Sl. галава́ *f.* 3. уда́р у галаву́
– v.t. уда́рыць, саўгану́ць (*асабл. у галаву́*)
• ***conk out*** перастава́ць працава́ць, лама́цца, псава́цца (*асабл. пра мато́р*)
connate ['kɑ:neɪt] adj. 1. прыро́джаны, прыро́дны. 2. аднача́сна наро́джаны, паўста́лы. 3. сваяцкі, падо́бны (*нату́раю*). 4. Biol. зро́слы
connect [kə'nekt] – v.t. 1. прылуча́ць; спалуча́ць; зьвя́зваць. 2. злуча́ць (*тэлефані́чна*). 3. лучы́ць (*у ду́мках*), асацыява́ць. 4. далуча́цца. 5. Electr. далуча́ць, злуча́ць
– v.i. 1. лучы́цца, быць палу́чаным. 2. мець спалучэ́ньне (*пра цягнікі́*)
connection, Brit. **connexion** [kə'nekʃən] n. 1. су́вязь *f.*; прынале́жнасьць *f.*: ***to have connection with*** мець су́вязь з чым; ***connection with the church*** прынале́жнасьць да царквы́. 2.

дачыне́ньне *n.* 3. а) сваяк -а́ *m.*, свая́чка *f.* б) сваяцтва *n.* 4. спалуча́ньне цягнікóм

• ***connections*** су́вязі з уплывóвымі людзьмі́

• ***in connection with*** а) ра́зам, у су́вязі з *чым.* б) што датычыць *чаго́*

connective [kə'nektɪv] – adj. злуча́льны: ***connective tissue*** злуча́льная тка́нка; ***connective word*** злуча́льнае сло́ва

– n. Gram. злуча́льнае сло́ва

connivance [kə'naɪvəns] n. маўкліва́я згóда

connive [kə'naɪv] v.i. 1. патура́ць, гляджзе́ць праз па́льцы. 2. та́йна супрацо́ўнічаць (*напр. з во́рагам*)

connoisseur [ˌkɑ:nə'sɜ:r] n. знаўцé- ўца́ *m.* (*асабл. у маста́цтве*)

connotation [ˌkɑ:nə'teɪʃən] n. падразуме́ньне *n.*, канота́цыя *f.*

connote [kə'noʊt] v. падразумява́ць

conquer ['kɑ:ŋkər] – v.t. 1. заваёўваць (*край*). 2. перамага́ць, пераадо́льваць (*во́рага, сон, страх*). 3. перасíльваць, перадо́льваць: ***to conquer a bad habit*** перадо́лець благу́ю звы́чку. 4. перамóжна ўзьбіра́цца на го́рныя вяршы́ні, здабыва́ць го́рныя вяршы́ні

– v.i. быць перамóжцам, рабíць заваява́ньні, перамага́ць: ***to conquer or die*** перамагчы́ або́ памéрці

conqueress ['kɑ:ŋkərəs] n. перамóжніца *f.*

conqueringly ['kɑ:ŋkərɪŋli] adv. перамóжна

conqueror ['kɑ:ŋkərər] n. перамóжлац -ца *m.*

conquest ['kɑ:nkwest] n. 1. заваява́ньне *n.*, перамóга *f.* 2. здабы́ты край (*лю́дзі*). 3. заваёва *f.* (*таксáма ў каха́ньні*). 4. здабы́тлак -ку *m.*, дасягне́ньні -яў *pl.*: ***conquests of science*** здабы́ткі навýкі. 5. Figur. сэ́рца, здабы́тае прыхíльнасьцю

consanguine [kən'sæŋgwɪn] adj. крóўны, крэ́ўны, ро́дны па крывí

consanguinity [ˌkɑ:nsæŋ'gwɪnəti] n. сваяцтва *n.*; ро́днасьць, адзінакро́ўнасьць *f.*

conscience ['kɑ:nʃəns] n. 1. сумле́ньне *n.*: ***clear conscience*** чы́стае сумле́ньне. 2. сьве́дамасьць *f.*

• ***in all conscience*** па пра́ўдзе, пра́ўду ка́жучы; вядóма, зразуме́ла; бясспрэ́чна

conscienceless ['kɑ:nʃənsləs] adj. несумле́нны, беспрынцы́пны, без усяля́кага со́раму

conscience-stricken ['kɑ:nʃənsˌstrɪkən] adj. му́чаны дако́рамі сумле́ньня

conscientious [ˌkɑ:nʃi'enʃəs] adj. добрасумле́нны, акура́тны: ***conscientious work*** сумле́нная пра́ца

conscientious objector адмаўле́нлец -ца *m.* (*які́ зь перакана́ньня не жада́е служы́ць у во́йску*)

conscious ['kɑ:nʃəs] adj. 1. сьве́дамы, сьвядо́мы *чаго́*, які́ разуме́е, усьведамля́е. 2. сьве́дамы, прыто́мны: ***to become conscious*** прыйсьці́ да прыто́мнасьці, апрыто́мнець. 3. адчу́ты, адчува́ны: ***conscious guilt*** адчува́нае пачуцьцё ві́ны. 4. наўмы́сны, абду́маны, сьве́дамы: ***a conscious lie*** сьвядо́мая мана́. 5. няёмкі; сарамлíвы: ***She was a little conscious in her manner because of her oldfashioned dress*** Яна́ чу́лася крыху́ няёмка дзе́ля сваé старамóднае сукéнкі

• ***the conscious,*** Psychol. сьве́дамасьць *f.*

consciously ['kɑ:nʃəsli] adv. 1. сьве́дама, сьвядо́ма. 2. наўмы́сна, абду́мана

consciousness ['kɑ:nʃəsnəs] n. 1. сьве́дамасьць, сьвядо́масьць *f.* 2. прыто́мнасьць *f.*: ***to lose consciousness*** стра́ціць прыто́мнасьць

conscribe [kən'skraɪb] v.t. набіра́ць, прызыва́ць у во́йска

conscript [kən'skrɪpt] – v.t. 1. набіра́ць (*у во́йска*). 2. канфіскава́ць (*для дзяржа́ўнага ўжы́тку*)

– adj. прызва́ны (*у во́йска*)

– n. ['kɑ:nskrɪpt] прызыўні́к -á *m.*, прызыўны́ -о́га *m.*; навабра́нлец -ца, рэ́крут -а *m.*

conscript fathers 1. сэна́тары, а) у старажы́тным Ры́ме. б) у сярэдняве́чнай Вэнэ́цыі. 2. сэна́тары, паслы́

conscription [kənˈskrɪpʃən] n. 1. прызы́ў, набо́р у во́йска. 2. вайско́вая паві́ннасьць (*грашы́ма, пра́цай*)

consecrate [ˈkɑ:nsəkreɪt] – v.t. 1. высьвяча́ць (*царкву́, на сьвятара́*). 2. асьвяча́ць, рабі́ць сьвя́тасьцю. 3. прысьвяча́ць сябе́

– adj., Archaic пасьве́чаны, вы́сьвечаны

consecration [ˌkɑ:nsəˈkreɪʃən] n. 1. асьвячэ́ньне, сьвячэ́ньне *n.* 2. высьве́чваньне *n.* 3. рукапалажэ́ньне *n.* (*у духо́ўны сан*), кансэкра́цыя *f.*

consecution [ˌkɑ:nsɪˈkju:ʃən] n. 1. пасьлядо́ўнасьць, чарго́васьць *f.* 2. лагі́чная пасьлядо́ўнасьць. 3. Gram. пасьлядо́ўнасьць (часо́ў)

consecutive [kənˈsekjətɪv] adj. пасьлядо́ўны, чарго́вы

consensus [kənˈsensəs] n. агу́льная зго́днасьць (*ду́мкі, пагля́даў*), кансэ́нсус -у *m.*

consent [kənˈsent] – v.i. 1. згаджа́цца

– n. зго́да *f.*, дазво́л -у *m.*: ***common consent*** агу́льная зго́да

consentaneous [ˌkɑ:nsənˈteɪniəs] adj. 1. узго́днены, адпаве́дны. 2. адзінаду́шны

consequence [ˈkɑ:nsəkwəns] n. 1. вы́нік -у *m.*, насту́пства *n.* 2. вы́вад -у *m.*, лагі́чная высно́ва. 3. зна́чаньне, значэ́ньне *n.*; вага́ *f.*: ***of no consequence*** нява́жны; ***of great consequence*** вялі́кае вагі́. 4. уплыво́васьць, ва́жнасьць *f.*: ***person of consequence*** чалаве́к з уплы́вамі, ва́жны чалаве́к

• ***in consequence*** як вы́нік

• ***in consequence of*** у вы́ніку

• ***take the consequences*** узя́ць на сябе́ адка́знасьць за насту́пствы

consequent [ˈkɑ:nsəkwənt] – adj. 1. вы́нікліы (*зь не́чага*). 2. лагі́чна пасьлядо́ўны

– n. 1. вы́нік -у *m.*, пасьлядо́ўнае здарэ́ньне. 2. Gram. другі́ член умо́ўнага ска́зу. 3. Math. другі́ член прапо́рцыі (*дачыне́ньня*)

consequential [ˌkɑ:nsɪˈkwenʃəl] adj. 1. які́ лагі́чна, пасьлядо́ўна выніка́е. 2. які́ лі́чыць сябе́ ва́жным. 3. ва́жны

consequently [ˈkɑ:nsɪkwəntli] adv. затым; такі́м пара́дкам; таму́, у вы́ніку

conservation [ˌkɑ:nsərˈveɪʃən] n.1. захава́ньне *n.*: ***conservation of energy*** захава́ньне энэ́ргіі. 2. ахо́ва (*лясо́ў, рэчак*). 3. запаве́днік -у *m.*

conservationist [ˌkɑ:nsərˈveɪʃənɪst] – n. ахо́ўнік *або́* прыхі́льнік ахо́вы прыро́ды

– adj. ахо́ўны, які́ датычыць ахо́вы прыро́ды

conservatism [kənˈsɜ:rvəˌtɪzəm] n. кансэрваты́зм -у *m.*

conservatist [kənˈsɜ:rvətɪst] n. *гл.* **conservative,** n.

conservative [kənˈsɜ:rvətɪv] – adj. 1. кансэрваты́ўны, супраці́ўны зьме́нам. 2. асьцяро́жны, памярко́ўны, умерка ва́ны; скро́мны, сьці́плы: ***a conservative estimate*** скро́мная ацэ́нка. 3. які́ захо́ўвае ад псава́ньня, які́ кансэрву́е; засьцераго́льны

– n. 1. кансэрва́тар -а *m.* 2. рэакцыянэ́р -а *m.*, рэакцыянэ́рка *f.*

conservator [kənˈsɜ:rvətər] n. 1. ахо́ўнік -а *m.*, апяку́н апекуна́ *m.*, кансэрва́тар -а *m.* 2. Brit. ахо́ўнік фо́ндаў музэ́ю

conservatory [kənˈsɜ:rvətɔ:ri] – n., pl. **-ries** 1. музы́чная кансэрвато́рыя. 2. цяпліца, аранжарэ́я *f.* 3. Obsol. склад -у *m.*; схо́лы -ву *m.*

– adj. які́ захо́ўвае *або́* кансэрву́е

conserve [kənˈsɜ:rv] – v.t. 1. захо́ўваць (*ад псава́ньня, разбурэ́ньня*), захава́ць . 2. ашчаджа́ць, зьберага́ць. 3. кансэрвава́ць: ***to conserve meat*** рабі́ць мясны́я кансэ́рвы

– n. [ˈkɑ:nsɜ:rv] often ***conserves*** фрукто́выя кансэ́рвы, варэ́ньне

consider [kənˈsɪdər] v.t. 1. абду́мваць, разглядаць, абмяркоўваць, заду́мвацца над *чым*. 2. прызнава́ць, лі-

чы́ць: ***He considers them (to be) innocent*** Ён лі́чыць іх невінава́тымі; ***to consider it necessary*** прызнава́ць патрэ́бным. 3. ду́маць, уважа́ць. 4. лічы́цца з *кім*, шанава́ць (*пагля́ды, пачу́цьці*). 5. браць пад ува́гу, улі́чваць: ***all things considered*** узя́ўшы ўсё пад ува́гу. 6. цані́ць; мо́цна паважа́ць. 7. разважа́ць, меркава́ць

considerable [kənˈsɪdərəbəl] – adj. 1. зна́чны, істо́тны, ва́жны; ва́рты ўва́гі: ***a considerable responsibility*** ва́жная адка́знасьць. 2. ла́дны, до́сыць вялі́кі: ***a considerable sum of money*** ла́дная су́ма гро́шаў

– adv. ла́дна, до́сыць

considerably [kənˈsɪdərəbli] adv. ла́дна; шмат

considerate [kənˈsɪdərət] adj. 1. ува́жны, ува́жлівы. 2. стара́нны, ува́жны

consideration [kənˌsɪdəˈreɪʃən] n. 1. разгля́д -у *m.*, абмеркава́ньне *n.*: ***to give careful consideration to this question*** дакла́дна абмеркава́ць гэ́тае пыта́ньне; ***to submit for consideration*** адда́ць на разгля́д. 2. меркава́ньне *n.*, ду́мка *f.*, пагля́д -у *m.*: ***That is a consideration*** Мо́жна гэ́так меркава́ць; Гэ́та до́бры пагля́д. 3. ува́га, ува́жлівасьць; пашана́, пава́га *f.*: ***an author worthy of consideration*** а́ўтар ва́рты ўва́гі. 4. адпла́та *f.*; узае́мная паслу́га; кампэнса́цыя *f.*, узнагаро́джаньне *n.*; пла́та *f.*

• ***be under consideration*** разглядáцца, абмярко́ўвацца

• ***in consideration of*** а) дзе́ля таго́. б) у адпла́ту за *што*

• ***take into consideration*** браць пад ува́гу

• ***under consideration*** на разгля́дзе, разглядáны

considered [kənˈsɪdərd] adj. 1. ува́жліва прадзу́маны, абду́маны: ***This is my considered opinion*** Гэ́та мой ува́жна прадзу́маны пагля́д. 2. паважа́ны; шанава́ны

considering [kənˈsɪdərɪŋ] – prep. беручы́ пад ува́гу, ма́ючы на ўва́зе

– adv. беручы́ пад ува́гу абста́віны; адно́сна

consign [kənˈsaɪn] v.t. 1. аддава́ць пад апе́ку; даруча́ць. 2. прызнача́ць. 3. дастача́ць, перасыла́ць, пасыла́ць (*тава́р*)

consignment [kənˈsaɪnmənt] n. 1. прызначэ́ньне, перадава́ньне *n.*, перасы́лка *f.*: ***the consignment of surplus food to the stricken areas*** прызначэ́ньне лі́шку харчо́ў у пацярпе́лы раён. 2. прызна́чаная па́ртыя тава́ру, груз -у *m.*

• ***on consignment*** (*тава́р*) у кансыгна́цыі (*пла́тны пасьля́ про́дажу*)

consist [kənˈsɪst] v.i. 1. склада́цца, заключа́цца, зьмяшча́цца: ***A week consists of seven days*** Ты́дзень склада́ецца зь сямі́ дзён. 2. згаджа́цца, супада́ць: ***It consists with my thoughts*** Гэ́та супада́е з маімі ду́мкамі. 3 Archaic суіснава́ць, сумяшча́ць

• ***consist in*** заключа́цца ў

consistence = consistency [kənˈsɪstənsi] n.,pl. **-cies** 1. гушчыня́ *f.*; цьвёрдасьць, ту́гасьць *f.* 2. пасьлядо́ўнасьць *f.* 3. адпаве́днасьць, зго́днасьць, нязьме́ннасьць, вы́трыманасьць *f.*: ***consistency in writing style*** вы́трыманасьць у сты́лі пісáньня. 4. Obsol. густо́е рэ́чыва

consistent [kənˈsɪstənt] adj. 1. пасьлядо́ўны. 2. сумяшча́льны, сула́дны. 3. цьвярды́, салі́дны

consolation [kɑːnsəˈleɪʃən] – n. 1. суце́шваньне, суцяшэ́ньне *n.*, уце́ха *f.*, рэч, што прыно́сіць суцяшэ́ньне

– adj. суцяша́льны

consolation prize суцяша́льная ўзнагаро́да

console I [kənˈsoʊl] v.t. 1. суцяша́ць; супако́йваць. 2. разважа́ць (*го́ра, сму́так*)

console II [ˈkɑːnsoʊl] n. 1. ша́фа, кансо́ль *f.* 2. Archit. вы́ступ у сьцяне́, падпо́рка *f.* (*пад карні́з, балько́н*). 3. прыбо́рная до́шка, кантро́льная панэ́ль

consolidate [kənˈsɑ:lɪdeɪt] v. 1. кансалі-дава́ць, злуча́ць(ь) (-ца) ў адно́, задзіно́чваць(ь) (-ца). 2. цьвярдзе́ць, узмацня́цца. 3. умацо́ўваць(ь) (-ца)

consolidated [kənˈsɑ:lɪdeɪtɪd] adj. задзіно́чаны; спалу́чаны, супо́льны: ***consolidated efforts*** спалу́чаныя нама-га́ньні

consoling [kənˈsoʊlɪŋ] adj. суцяша́льны, пацяша́льны: ***consoling thought*** пацяша́льная ду́мка

consommé [ˌkɑ:nsəˈmeɪ] n. мо́цны расо́л, булён -у *m.*

consonance [ˈkɑ:nsənəns] n. 1. зго́днасьць *f.*; гармо́нія *f.* (*пагля́даў*). 2. сугу́чнасьць, сула́днасьць *f.*, гармо́нія гу́каў. 3. Mus. кансана́нс -у *m.* 4. Phys. рэзана́нс -у *m.*

consonancy n., *гл.* **consonance**

consonant [ˈkɑ:nsənənt] – n. Phon. а) зы́чны гук. б) лі́тара, яка́я абазнача́е зы́чны гук

– adj. 1. зго́дны з *чым*. 2. сугу́чны (*то́нам ці гу́кам*). 3. Phys. рэзана́нсны

consort [ˈkɑ:nsɔ:rt] – n. 1. муж -а *m.*; жо́нка *f.*: ***queen consort*** жо́нка карала́; ***king consort*** муж карале́вы. 2. вадапла́ў, які́ суправаджа́е другі́. 3. супо́льнік -а *m.*; кампаньён -а *m.*; тава́рыш -а *m.*

– v.i. [kənˈsɔ:rt] 1. вадзі́цца, ве́сьці знаёмства, мець зно́сіны. 2. згаджа́цца, супада́ць, гарманізава́ць

– v.t. лучы́цца, вяза́цца; нала́джваць су́вязь

consort II [ˈkɑ:nsɔ:rt] n. 1. пагаднёньне *n.*, зго́да *f.* 2. сугу́чнасьць, гармо́нія *f.*

conspicuous [kənˈspɪkjuəs] adj. 1. зна́чны (*до́бра ба́чны*), які́ кі́даецца ў во́чы; выра́зны. 2. асабліві, незвыча́йны, які́ прыця́гвае ўва́гу: ***an actress of conspicuous charm*** акто́рка з надзвыча́йнай прыва́бнасьцю. 3. го́дны ўва́гі; ве́льмі до́бры, выда́тны. 4. паказны́, прэтэнзі́йны

conspiracy [kənˈspɪrəsi] n.,pl. **-cies** 1. змо́ва *f.*; кансьпіра́цыя *f.* 2. гру́па змо́ўнікаў, кансьпіра́тараў

conspirator [kənˈspɪrətər] n. змо́ўнік, кансьпіра́тар -а *m.*

conspiratorial [kənˌspɪrəˈtɔ:rɪəl] adj. змо́ўніцкі, кансьпірацы́йны

conspire [kənˈspaɪr] – v.i. 1. быць у змо́ве. 2. ра́зам дзе́яць; садзе́йнічаць, спрыя́ць

– v.t. ла́дзіць змо́ву, кансьпірава́ць

constable [ˈkɑ:nstəbəl] n. паліцыя́нт -а *m.*, камэндант крэпасьці *або́* пала́цу

constancy [ˈkɑ:nstənsi] n., pl. **-cies** 1. непахіснасьць *f.*; насто́йлівасьць *f.* 2. ве́рнасьць, ляя́льнасьць *f.* 3. нязьме́ннасьць *f.*; ста́ласьць *f.*

constant [ˈkɑ:nstənt] – adj. 1. ста́лы, заўсёдны, нязьме́нны. 2. ця́глы, безупы́нны; насты́рны: ***constant rain*** безупы́нны дождж. 3. ве́рны, нязьме́нны, ляя́льны; вы́трыманы, непахі́сны. 4. Math, Phys. ста́лы: ***a constant force*** ста́лая сі́ла

– n. 1. ста́лае, заўсёднае *n.* 2. Math., Phys. пастая́нная вялічыня́, канста́нта *f.*

constantly [ˈkɑ:nstəntli] adv. 1. заўсёды; нязьме́нна: ***constantly complaining*** заўсёды незадаво́лены. 2. безупы́нна. 3. ча́ста, няра́з; усё, уве́сь час

constellation [ˌkɑ:nstəˈleɪʃən] n. 1. Astr. сузо́р'е *n.* 2. плея́да *f.*: ***a constellation of scholars*** плея́да вуче́ных

constipate [ˈkɑ:nstɪpeɪt] v.t. скрапля́ць, выклі́ка́ць запо́р

constipated [ˈkɑ:nstɪpeɪtɪd] adj. хво́ры на запо́р

constipation [ˌkɑ:nstɪˈpeɪʃən] n. запо́р -у *m.*

consternate [ˈkɑ:nstərneɪt] v.t. зьдзіўля́ць, пало́хаць; непако́іць, трыво́жыць

consternation [ˌkɑ:nstərˈneɪʃən] n. перапало́х, жах -у *m.*

constituency [kənˈstɪtʃuənsi] n., pl. **-cies** 1. вы́барнікі, вы́барцы *pl.* 2. вы́барчая акру́га. 3. пакупнікі́, падпі́счыкі *pl.*; кліенту́ра *f.*

constituent [kənˈstɪtʃuənt] – adj. 1. які́ зьяўля́ецца ча́сткай цэ́лага; скла-

до́вы. 2. вы́барчы; які́ прызнача́е. 3. устано́ўчы; правамо́цны: ***a constituent assembly*** устано́ўчы сход
– n. 1. кампане́нт -а *m.* 2. вы́барц|а -ы, вы́барнік -а *m.*, вы́барніца *f.*; дае́рнік -а *m.*

constitute ['kɑ:nstətu:t] v.t. 1. утвара́ць; склада́ць. 2. пастанаўля́ць, уво́дзіць (*зако́н*). 3. арганізава́ць; засно́ўваць. 4. пра́ўна афармля́ць. 5. прызнача́ць; выбіра́ць

constitution [ˌkɑ:nstə'tu:ʃən] n. 1. канстыту́цыя *f.*, гало́ўны зако́н. 2. склад це́ла (*ро́зуму*), целаскла́д -у *m.*: ***the constitution of one's mind*** склад ро́зуму. 3. ула́джаньне *n.*, структу́ра *f.*; су́тнасьць, і́снасьць *f.*: ***the constitution of life*** су́тнасьць жыцця́. 4. прызначэ́ньне *n.*, стварэ́ньне, фармава́ньне, залажэ́ньне *n.* (*не́чага*). 5. зако́н, дэкрэ́т -у *m.*; прыня́ты звы́чай

constitutional [ˌkɑ:nstə'tu:ʃənəl] – adj. 1. канстытуцы́йны. 2. кары́сны для здаро́ўя: ***constitutional exercises*** практыкава́ньні, кары́сныя для здаро́ўя. 3. істо́тны, гало́ўны
– n. практыкава́ньні, прахо́дка для здаро́ўя, мацыён -у *m.*

constrain [kən'streɪn] v.t. 1. змуша́ць, вымуша́ць, прымуша́ць. 2. абмяжо́ўваць свабо́ду, зьняво́льваць, садзі́ць у турму́. 3. стры́мва|ць (-ца)

constrained [kən'streɪnd] adj. 1. зму́шаны, прыму́шаны. 2. вы́мушаны; стрыма́ны; напру́жаны: ***a constrained smile*** шту́чная, вы́мушаная ўсьме́шка. 3. абмежава́ны

constraint [kən'streɪnt] n. 1. абмежава́ньне свабо́ды. 2. зьняво́леньне астро́гам. 3. вы́мушанасьць, напру́жанасьць, нясьме́ласьць *f.*: ***We felt a little constraint with the new teacher*** Мы чу́ліся крыху́ нясьме́лымі пры но́вым наста́ўніку. 4. прыму́с -у *m.*, прыну́ка *f.*

constrict [kən'strɪkt] v.t. сьціска́ць, сьця́гваць; змыка́ць, звужа́ць (*напр. крывяно́сныя сасу́ды*)

constriction [kən'strɪkʃən] n. сьця́гваньне, звужа́ньне, сьціска́ньне *n.*: ***a constriction in one's chest*** сьціска́е ў грудзёх

constrictor [kən'strɪktər] n. 1. душы́цель -я *m.* (*напр. зьмяя́*); сьціска́ч -а́ *m.* 2. му́скул, які́ сьціска́е: ***constrictors of the eyelids*** му́скул, які́ заплю́шчвае во́чы

construct [kən'strʌkt] – v.t. 1. канструява́ць, будава́ць. 2. склада́ць, ствара́ць (*фа́булу для фі́льму, рама́ну*)
– n. ['kɑ:nstrʌkt] абстра́кт -у *m.*, адця́гненае паня́ціце

construction [kən'strʌkʃən] n.1. будава́ньне *n.*, будо́ўля *f.*; будаўні́цтва *n.* 2. будын|ак -ка *m.*, будо́ўля *f.*, збудава́ньне *n.*

constructive [kən'strʌktɪv] adj. 1. тво́рчы, ствара́льны. 2. канструкты́ўны (*крытыцы́зм, прапано́ва*). 3. будаўні́чы

construe, esp. Brit. [kən'stru:] – v.t. 1. тлума́чыць сэнс, інтэрпрэтава́ць; растлума́чваць: ***His statement can be construed in many ways*** Яго́ную зая́ву мо́жна інтэрпрэтава́ць па-ро́знаму. 2. перадава́ць, пераклада́ць
– n. 1. будо́ва *f.* (*ска́заў*). 2. інтэрпрэта́цыя *f.*, перакладан́ьне *n.*, перакла́д -у *m.*

consul ['kɑ:nsəl] n. ко́нсул -а *m.*: ***consul general*** генэра́льны ко́нсул

consular ['kɑ:nsələr] adj. ко́нсульскі

consulate ['kɑ:nsələt] n. 1. кансуля́т -у *m.* 2. ко́нсульства *n.*

consulship ['kɑ:nsəlʃɪp] n. 1. ко́нсульства *n.* 2. кадэ́нцыя ко́нсула

consult [kən'sʌlt] – v.t. 1. ра́іцца, шука́ць інфарма́цыі: ***to consult a dictionary*** зазірну́ць у сло́ўнік; ***to consult a doctor*** пара́іцца з до́ктарам. 2. лі-чы́цца з *чым*
– v.i. ра́іцца з *кім*, кансультава́цца, абгаво́рваць спра́ву: ***He is consulting with his lawyer*** Ён ра́іцца са сваі́м адвака́там

consultant [kən'sʌltənt] n. 1. асо́ба, яка́я ра́іцца. 2. дара́днік -а, кансульта́нт -а *m.*

consultation [ˌkɑ:nsəlˈteɪʃən] n. кансульта́цыя *f.*; нара́да *f.*, абмеркава́ньне *n.*; кансы́ліюм -у *m.*

consultative [kənˈsʌltətɪv] adj. кансультацыі́йны, дара́дчы

consulting [kənˈsʌltɪŋ] adj.1. які́ ра́іць, кансульту́е: ***a consulting physician*** ле́кар-кансульта́нт. 2. для кансульта́цыі: ***consulting hours*** гадзі́ны прыйма́; ***consulting room*** кабіне́т для кансульта́цыі

consume [kənˈsu:m] v.t. 1. спажыва́ць; е́сьці; зьяда́ць. 2. расхо́даваць, выдатко́ўваць; тра́ціць, марнава́ць: ***He consumed his time talking, not studying*** Ён змарнава́ў час на размо́вы заме́ст вучы́цца. 3. зьнішча́ць, пали́ць: ***consumed by fire*** зьні́шчаны агнём
• ***consumed with*** ахо́плены, напо́ўнены не́чым: ***consumed with love*** ахо́плены па́лкім каха́ньнем; ***consumed with anger*** напо́ўнены зло́сьцю

consumer [kənˈsu:mər] – n. спажы|ве́ц -ўца́ *m.*
– adj. спажыве́цкі: ***consumer (or consumer's) goods*** спажыве́цкія тава́ры

consummate [ˈkɑ:nsəmeɪt] – v.t. 1. дако́нчыць, ско́нчыць. 2. дакана́ць, зьдзе́йсьніць; ажыцьцяві́ць: ***consummate the marriage*** дакана́ць жані́мства (*палавы́м а́ктам*). 3. Obsol. удакана́льваць
– v.i. зьдзяйсьня́цца, удакана́львацца
– adj. [ˈkɑ:nsəmət] зако́нчаны, дакана́лы: ***consummate skill*** дакана́лае майстэ́рства; ***a consummate artist*** дакана́лы маста́к

consummation [ˌkɑ:nsəˈmeɪʃən] n. 1. заканчэ́ньне *n.*, кан|е́ц -ца́ *m.* 2. зьдзяйсьне́ньне *n.*; дасягне́ньне *n.* (*мэ́ты*). 3. дакана́ласьць *f.*

consumption [kənˈsʌmpʃən] n. 1. спажыва́ньне, спажыцьцё, харчава́ньне *n.*: ***consumption of fuel*** спажыва́ньне па́ліва. 2. сухо́ты *pl. only*

consumptive [kənˈsʌmptɪv] adj. 1. зьнішча́льны, разбура́льны. 2. тубэркулёзны, сухо́тны
– n. сухо́тнік -а *m.*; сухо́тн|ы -ага *m.*, сухо́тная *f.*

contact [ˈkɑ:ntækt] – n. 1. сутыка́ньне *n.*, канта́кт -у *m.*: ***to be in contact*** сутыка́цца, быць у канта́кце; ***to come into contact*** а) сутыкну́цца. б) увайсьці́ ў канта́кт. 2. а) су́вязь *f.*, знаёмства *n.* б) кары́сныя знаёмствы. в) сувязн|ы́ -о́га *m.* (*аса́ба*). 3. Electr. а) спалуча́ньне: ***to make (to break) contact*** улучы́ць (вы́лучыць) ток. б) лу́чнік, уключа́льнік -а *m.* (*электры́чны*)
– adj. канта́ктны, датыка́льны, сувязны́
– v.t. спалуча́ць, сутыка́ць
– v.i. 1. сутыка́цца. 2. нала́джваць су́вязь

contact lens канта́ктная ли́нза

contagion [kənˈteɪdʒən] n. 1. заразьлівасьць *f.* 2. зара́за *f.*, зара́зная *або́* інфэкцы́йная хвароба. 3. Figur. благі́ ўплы́ў; узьдзе́яньне; перада́ваньне *n.*: ***Parents fear the contagion of television*** Бацькі́ бая́цца благо́га ўплы́ву тэлеві́зіі

contagious [kənˈteɪdʒəs] adj. 1. зара́зны: ***colds are contagious*** засту́да — зара́зная хвароба. 2. зара́зны (*хво́ры*). 3. заразьлівы: ***yawning is often contagious*** пазяха́ньне ча́ста быва́е заразьлі́вае

contagiousness [kənˈteɪdʒəsnəs] n. зара́знасьць, заразьлі́васьць *f.*

contain [kənˈteɪn] – v.t. 1. зьмяшча́ць, а) ***Books contain information*** Кні́гі зьмяшча́юць інфарма́цыю. б) ***This pitcher will contain a quart of milk*** Гэ́ты збано́к зьме́сьціць лі́тар малака́. 2. мець у сабе́: ***One meter contains 100 centimeters*** Адзі́н мэ́тар ма́е 100 цэнтымэ́траў. 3. стры́мваць: ***to contain oneself*** стры́мвацца, вало́даць сабо́ю. 4. Milit. стры́мваць, затры́мваць, акружа́ць (*во́рага*). 5. Math. дзяліцца: ***10 contains 2 and 5*** Дзе́сяць дзе́ліцца на два й пяць
– v.i. стры́мвацца

container [kənˈteɪnər] n. 1. скры́ня, скры́нка *f.*; пасу́дзіна *f.* 2. ёмішча *n.*, кантэ́йнэр -а *m.*

contaminate [kənˈtæmɪneɪt] – v. забру́джваць (*ваду́, павéтра*); зага́джваць – adj. забру́джаны, зага́джаны

contamination [kənˌtæmɪˈneɪʃən] n. 1. забру́джаньне *n.*; забру́джанасьць *f.* (*павéтра*); зара́жанасьць *f.* 2. бруд -у *m.*, зара́за *f.*

contemn [kənˈtem] v.t. 1. пагарджа́ць, ста́віцца з пага́рдай; грэ́баваць. 2. не паважа́ць, не надава́ць вагі; не звача́ць ува́гі; ста́віцца абыя́кава

contemplate [ˈkɑ:ntəmpleit] v.1. разважа́ць, раздýмваць; аддава́цца ўспамі́нам. 2. узіра́цца, глядзéць, сузіра́ць: ***to contemplate waves at seashore*** сузіра́ць хва́лі на ўзьбярэ́жжы мо́ра. 3. мець намéр, намéрвацца; маніцца

contemplation [ˌkɑ:ntəmˈpleiʃən] n. 1. сузіра́ньне, разважа́ньне *n.*, разва́га *f.* 2. задýманьне *n.*; ро́здум -у *m.*, паглы́бленьне ў дýмкі. 3. прадба́чаньне, спадзява́ньне *n.*: ***The squirrels store food in contemplation of a long cold winter*** Вавёркі запаса́юцца éжай у прадба́чаньні даўго́й хало́днай зімы́

contemplative [kənˈtemplətɪv] adj. 1. задýманы, задумéнны; сузіра́льны; схі́льны да ро́здуму, ро́здумны. 2. паглы́блены: ***a contemplative life*** жыцьцё паглы́бленае ў ро́здум аб рэлі́гіі, малітóўнае жыцьцё

contemplativeness [kənˈtemplətɪvnəs] n. ро́здумнасьць *f.*

contemporary [kənˈtəmpərəri] – n., pl. **-raries** суча́сьнік -а *m.*
– adj. суча́сны

contempt [kənˈtempt] n. 1. пага́рда *f.*, пагарджа́ньне *n.* 2. га́ньба *f.*: ***to be held in contempt*** быць ганьбава́ным. 3. Law зьнява́га, непадпара́дкаваньне: ***contempt of court*** зьнява́га су́ду, непаша́на да пастано́вы су́ду, непадпара́дкаваньне пастано́ве су́ду

contemptible [kənˈtemptəbəl] adj. ва́рты пага́рды, пагарджа́ны; по́длы, нікчэ́мны, пага́рдлівы: ***Liars and thieves are contemptible*** Манюкі й зладзéі — нікчэ́мныя, пага́рдлівыя лю́дзі

contemptuous [kənˈtemptʃuəs] adj. пага́рдлівы: ***a contemptuous look*** пага́рдлівы по́зірк

contemptuousness [kənˈtemptʃuəsnəs] n. пага́рдлівасьць *f.*

contemptuously [kənˈtemptʃuəsli] adv. пага́рдліва, грэ́бліва

contend [kənˈtend] v. 1. змага́цца, перамага́ць: ***the refugees had to contend with sickness and lack of food*** уцекачы́ му́сілі змага́цца з хваро́бамі і нястача́й харчо́ў. 2. спаду́жнічаць, спабо́рнічаць. 3. спрача́цца. 4. аспрэ́чваць, сьцьвярджа́ць; заяўля́ць

contender [kənˈtendər] n. 1. удзе́льнік спабо́рніцтва, супе́рнік -а *m.* 2. кандыда́т на стано́вішча ці паса́ду, спабо́рнік -а *m.* 3. дыспута́нт -а *m.*

content I [ˈkɑ:ntent] n., often **contents** 1. зьмест -у *m.*; зьме́сьціва *n.*: ***the contents of a room*** зьме́сьціва пако́ю; ***content of a book*** зьмест кні́гі; ***table of contents*** зьмест (*кні́гі, ча́сапісу*). 2. ёмістасьць *f.* (*пасу́дзіны*), умяшча́льнасьць *f.*; аб'ём -у *m.* 3. ко́лькасьць, наяўнасьць *f.*: ***Cottage cheese has a high protein content*** Твaро́г ма́е вялі́кую ко́лькасьць бялко́ў. 4. сэнс, зьмест -у *m.*: ***the content of a speech*** зьмест прамо́вы

content II [kənˈtent] – v.t. 1. задавальня́ць: ***Nothing contents him*** Ніштó яго́ не задавальня́е; ***to content oneself*** задаво́ліцца
– adj.1. задаво́лены. 2. зго́дны; гато́вы: ***Will you be content to wait until tomorrow?*** Ці вы зго́дны пачака́ць да за́ўтра?
– n. 1. задавальне́ньне *n.*, задаво́ленасьць *f.* 2. Brit. го́лас «за» ў пала́це ло́рдаў
• ***one's heart's content*** уво́лю; усма́к

contented [kənˈtentəd] adj. задавóлены: ***a contented smile*** задавóленая ўсьмéшка

contention [kənˈtenʃən] n. 1. спрэ́чка *f.*, дыспут -у *m.*; свáрка *f.*, разлáд -у *m.*; спрачáньне *n.* 2. асьвéдчаньне *n.*, спрэ́чнае пытáньне. 3. змагáньне, спадýжніцтва *n.*

contentious [kənˈtenʃəs] adj. 1. сварлíвы, звáдлівы. 2. пóўны спрэ́чак, заўзя́тасьці; задзíрлівы: ***a contentious campaign*** заўзя́тая кампáнія

contentment [kənˈtentmənt] n. задавóленасьць *f.*, задавальнéньне *n.*

conterminous [kənˈtɜ:rmɪnəs] adj., *тс.* **coterminous** 1. які́ мáе супóльную мяжý; сумéжны. 2. супадáльны, сутрывáльны: ***The terms of office of the president and his chief advisor are conterminous*** Час улáды прэзыдэ́нта і яго́ галóўнага дарáдніка супадáюць

contest [ˈkɑ:ntest] – n. 1. спабóрніцтва, спадýжніцтва *n.*, кóнкурс -у *m.*: ***a swimming contest*** плывéцкае спабóрніцтва; ***a beauty contest*** кóнкурс прыгажóсьці. 2. болй -ю *m.*, змагáньне *n.* 3. спрэ́чка, дыскýсія *f.*
– v. [kənˈtest] 1. спабóрнічаць, змагáцца. 2. зьбівáць (*аргумэ́нты, дóвады*); выступáць супрóць, аспрэ́чваць. 3. стáвіць пад сумнéў

contestable [kənˈtestəbəl] adj. спрэ́чны; сумнéўны

contestant [kənˈtestənt] n. спабóрнік -а *m.*; канкурэ́нт -а *m.*

context [ˈkɑ:ntekst] n. кантэ́кст -у *m.*

contiguity [ˌkɑ:ntəˈgju:əti] n., pl. **-ties** 1. сумéжнасьць, блíзкасьць *f.* 2. кантáкт -у *m.* 3. суцэ́льная мáса: ***a contiguity of water*** суцэ́льная вадзянáя прастóра

contiguous [kənˈtɪgjuəs] adj. 1. сумéжны, прылéглы: ***to be contiguous*** межавáцца. 2. Geom. прылéглы: ***contiguous angles*** прылéглыя куты́. 3. блíзкі, сусéдні

continence [ˈkɑ:ntənens] n. 1. стрымáнасьць *f.*, устрымáньне *n.*; умеркавáнасьць, памяркóўнасьць *f.* 2. нявíннасьць, цнатлíвасьць *f.*

continent I [ˈkɑ:ntənent] n. 1. кантынэ́нт -у *m.* 2. вялíкі вóстраў сярóд грýпы мéншых
• ***the Continent*** Эўрóпа (*без Брытáнскіх астравóў*)

continent II [ˈkɑ:ntənent] adj. 1. стрымáны. 2. нявíнны, цнатлíвы

continental [ˌkɑ:ntənˈentəl] – adj. кантынэнтáльны
– n. жыхáр кантынэ́нту

Continental [ˌkɑ:ntənˈentəl] adj. 1. эўрапейскі. 2. калянія́льны: ***the Continental Army*** калянія́льнае вóйска

contingency [kənˈtɪndʒənsi] n., pl. **-cies** непрадбáчаная акалíчнасьць: ***for every contingency*** на ўсяля́кі вы́падак

contingent [kənˈtɪndʒənt] – adj. непрадбáчаны: ***contingent expenses*** непрадбáчаныя, магчы́мыя выдáткі; ***contingent meeting*** непрадбáчанае пасéджаньне
– n. 1. кантынгéнт -у *m.* (*вóйска, рабóчае сíлы*). 2. пададдзéл -у *m.* 3. чáстка спáдчыны. 4. нечакáнасьць *f.*

continual [kənˈtɪnjuəl] adj. 1. бесьперапы́нны, стáлы: ***the continual wash of the tides*** заўсёдныя прылíвы й адлíвы. 2. раз-пóраз, паўтóрны

continually [kənˈtɪnjuəli] adv. 1. заўсёды; стáла; увéсь час; бесьперапы́нна. 2. раз-пóраз; вéльмі чáста

continuation [kənˌtɪnjuˈeɪʃən] n. 1. працяг -у *m.*, узнаўлéньне *n.* 2. праця́г -у *m.* (*апавядáньня*)

continuation school дадатковая шкóла, вячэ́рняя шкóла

continuator [kənˌtɪnjuˈeɪtər] n. прадаўжáльнік -а *m.*, прадаўжáльніца *f.*

continue [kənˈtɪnju:] – v.i. 1. цягнýцца. 2. праця́гваць; прадаўжáць; узнаўля́ць пасьля́ перапы́нку. 3. трывáць. 4. заставáцца; прабывáць
– v.t. 1. праця́гваць, прадаўжáць. 2. падаўжáць. 3. падтры́мваць, захóўваць (*трады́цыі*). 4. затры́мваць, пакідáць (*на станóвішчы*). 5. адкла-

да́ць, перано́сіць на пазьне́йшы час, адтэмі́но́ваць: ***to be continued*** праця́г бу́дзе

continuity [ˌkɑ:ntənˈu:əti] n., pl. **-ties** 1. праця́гласьць *f.*; суцэ́льнасьць, неразры́ўнасьць *f.* 2. пасьлядо́ўнасьць *f.*

continuous [kənˈtɪnjuəs] adj. 1. ця́глы, праця́глы; безупы́нны, бесьперапы́нны, несьціха́ны: ***continuous work*** безупы́нная пра́ца. 2. заўсёдны (*вятры́, зьме́ны*)

continuously [kənˈtɪnjuəsli] adv. бесьпераста́нку, ця́гла, безупы́нна, бесьперапы́нна

contort [kənˈtɔ:rt] v.t. 1. выгіна́ць, скру́чваць; крыўля́ць, перакрыўля́ць; перако́шваць: ***The clown contorted his face*** Клоўн крыўля́ў твар. 2. скажа́ць; перакру́чваць (*тэкст*)

contortion [kənˈtɔ:rʃən] n. 1. крыўля́ньне, перако́шваньне *n.* 2. перакру́чваньне, скажа́ньне *n.* (*фа́ктаў*)

contour [ˈkɑ:ntʊr] – n. 1. абры́с -у *m.*; ко́нтур -у *m.*

– adj. 1. ко́нтурны: ***contour map*** ко́нтурная ка́рта

– v.t. 1. будава́ць зго́дна з ко́нтурам. 2. рабі́ць абры́с

contra [ˈkɑ:ntrə] n. не́шта супрацьле́глае

contraband [ˈkɑ:ntrəbænd] – n. 1. кантраба́нда *f.*, нелега́льны га́ндаль. 2. кантраба́ндны тава́р. 3. вае́нная кантраба́нда

– adj. кантраба́ндны, нелега́льны

contrabandist [ˌkɑ:ntrəˈbændɪst] n. кантрабандыі́ст -а *m.*, кантрабандыі́стка *f.*

contraception [ˌkɑ:ntrəˈsepʃən] n. прадухіле́ньне зача́цьця, кантрацэ́пцыя *f.*

contraceptive [ˌkɑ:ntrəˈseptɪv] – adj. су́працьзача́ткавы, про́ціза-ча́ткавы

– n. су́працьзача́ткавы сро́дак

contract [ˈkɑ:ntrækt] – n. умо́ва *f.*, кантра́кт -у *m.*

– v.t. [kənˈtrækt] 1. сьця́гваць, звужа́ць; сьціска́ць; абмяжо́ўваць, зьмянша́ць: ***to contract efforts*** зьмянша́ць намага́ньні. 2. заключа́ць умо́ву, кантра́кт. 3. схапі́ць (*хваро́бу*). 4. Gram. скарача́ць, сьця́гваць сло́вы: ***do not = don't***

– v.i. 1. сьця́гвацца, звужа́цца, зьмянша́цца; сьціска́цца. 2. падпі́сваць кантра́кт, абавяза́цца

extraordinary [ɪkˈstrɔ:rdənerɪ] adj. 1. ва́рты ўва́гі, выда́тны; незвыча́йны. 2. надзвыча́йны: ***an envoy extraordinary*** надзвыча́йны і паўнамо́цны пасо́л, пасла́ньнік -а *m.*

extravagant [ɪkˈstrævəgənt] adj. 1. марнатра́ўны, экстравага́нтны. 2. фантасты́чна абсу́рдны; недарэ́чны; перабо́льшаны; празьме́рна, зана́дта вялі́кі (*пра цану́*)

extreme [ɪkˈstri:m] – adj. 1. скра́йні, экстрэма́льны; надзвыча́йны; радыка́льны: ***extreme measures*** радыка́льныя за́хады. 2. найдале́йшы, найбо́льш адда́лены (*ад це́нтру*). 3. апо́шні (*надзе́я*)

– n. 1. скра́йнасьць *f.*; скра́йняя супярэ́чнасьць: ***Love and hate are two extremes of feeling*** Каха́ньне і няна́вісьць — дзьве скра́йнія пачуцьцёвыя супярэ́чнасьці. 2. найвышэ́йшая ступе́нь: ***in/to the extreme*** у (да) найвышэ́йшай ступе́ні. 3. Math. кра́йнія чле́ны (*прапо́рцыі*)

• ***go to the extremes*** упада́ць у скра́йнасьць

extremely [ɪkˈstri:mlɪ] adv. ве́льмі, надзвыча́йна, скра́йне

extremity [ɪkˈstremətɪ] n., pl. **-ties** 1. канец -ца́ *m.*, край -ю *m.* (канец). 2. скра́йняя патрэ́ба, бяда́ *f.* 3. скра́йнасьць (*у пагля́дах*); скра́йняя неабхо́днасьць

• ***extremities*** канцаві́ны, кане́чнасьці

extrinsic [ekˈstrɪnsɪk] adj. 1. неўласьці́вы. 2. во́нкавы, пастаро́ньні

extrude [ɪkˈstru:d] – v.t. выштурхваць, выпіха́ць, выціска́ць

– v.i. выдзяля́ць

exuberance [ɪgˈzu:bərəns] n. 1. бага́ццё *n.*, пы́шнасьць: ***an exuberance of tropic vegetation*** пы́шнасьць трапі́чнае расьлі́ннасьці. 2. збы́так -ку *m.*, празьме́рнасьць *f.*; даста́так -ку *m.*, паўната́ *f.* (*пачуцьця́*). 3. бу́рны, празьме́рны вы́бух (*ра́дасьці*)

exuberant [ɪgˈzu:bərənt] adj. 1. бага́ты; шчо́дры; квітне́ючы (*пра здаро́ўе*): ***an exuberant welcome*** шчо́драе прыймо́, віта́ньне. 2. густы́, пы́шны, бу́йны (*пра расьлі́ннасьць*)

exude [ɪgˈzu:d] v. 1. выступа́ць, паце́ць (*пра пот*); сачы́цца (*пра ваду́*). 2. выдзяля́цца (*пра ва́дкасьць*), выдзяля́ць

exult [ɪgˈzʌlt] v.i. мо́цна ра́давацца, трыюмфава́ць

exultance [ɪgˈzʌltəns] or **exultancy** [ɪgˈzʌltənsɪ] n. вялі́кая ра́дасьць, трыю́мф -у *m.*

exultant [ɪgˈzʌltənt] adj. ра́дасны, вясёлы; трыюмфа́льны

eye [aɪ] – n. 1. во́ка *n.*, *pl.* во́чы: ***He has blue eyes*** У яго́ сі́нія во́чы; ***a black eye*** падбі́тае во́ка, сіня́к пад во́кам; ***to close one's eyes*** заплю́шчыць во́чы; ***to squint one's eyes*** прыплю́снуць во́чы. 2. а) назіра́льнасьць *f.* б) здо́льнасьць ба́чыць; зрок -у *m.*: ***to have an eye for color*** до́бра разьбіра́ць ко́леры. 3. по́зірк, по́гляд -у *m.* 4. гле́дзішча *n.*; погля́д -у *m.*: ***in the eyes of the law*** з гле́дзішча пра́ва. 5. во́чка *n.* (*на клу́бнях бу́льбы*). 6. ву́шка *n.* (*го́лкі*). 7. во́ка (*урага́ну*) – v.t. 1. глядзе́ць; паглада́ць, пазіра́ць. 2. пі́льна прыглада́цца
• ***eye and hook*** га́фтачка й га́плік
• ***eye for an eye*** во́ка за во́ка
• ***keep an eye on*** а) наглада́ць, даглада́ць; сачы́ць за ...
• ***make eyes at*** стро́іць во́чкі, каке́тліва паглада́ць
• ***shut one's eyes to*** заплю́шчваць во́чы на што-н., не зварача́ць ува́гі
• ***with one's eyes open*** з адкры́тымі вачы́ма, сьве́дамы ры́зыкі і вы́ніку

eyeball [ˈaɪbɔ:l] n. во́чны я́блык

eyebrow [ˈaɪbraʊ] n. бры́во́ *n.*

eyeglass [ˈaɪglæs] n. 1. лі́нза *f.*, мано́кль -я *m.* 2. акуля́р -а *m.* (*мікраско́па, тэлеско́па*)

eyeglasses акуля́ры *pl.*

eyehole [ˈaɪhoʊl] n. 1. Anat. вачні́ца *f.* 2. во́чка *n.* (*і ў вяза́ньні*). 3. назіра́льная шчы́ліна

eyelash [ˈaɪlæʃ] n. ве́я, ве́йка *f.*

eyelet [ˈaɪlət] n.1. ву́шка *n.*; пятля́, пяце́лька *f.* (*для гу́зікаў*); дзі́рка *f.* (*для шнуро́вак*). 2. во́чка *n.*

eyelid [ˈaɪlɪd] n. паве́ка *f.*

eye shadow це́ні для паве́каў

eyeshot [ˈaɪʃɑ:t] n. по́ле зро́ку: ***out of eyeshot*** па-за по́лем зро́ку; ***in eyeshot*** у по́лі зро́ку, як во́кам кі́нуць

eyesight [ˈaɪsaɪt] n. 1. зрок -у *m.* 2. по́ле зро́ку

eye socket вачні́ца *f.*

eyesore [ˈaɪsɔ:r] n. не́шта, што рэ́жа во́ка, на што непры́емна глядзе́ць (*напр., ку́ча сьмяцьця́*)

eyetooth [ˈaɪtu:θ] n., pl. **-teeth** во́чны зуб

eyewitness [ˈaɪˌwɪtnəs] n. навао́чны сьве́дка

F

F, f [ef] n., pl. **F's , f's** 1. *шо́стая лі́тара анге́льскага альфабе́ту*. 2. найніжэ́йшая шко́льная адзна́ка (*ве́льмі дрэ́нна*). 3. Mus. фа (*но́та*)

fable ['feɪbəl] – n. 1. ба́йка *f.* 2. вы́думка *f.*; вы́мыслел -лу *m.* 3. міт -у *m.*, леге́нда *f.*

– v. 1. пісáць *або́* раскáзваць бáйкі. 2. казáць няпрáўду, маніць

fabric ['fæbrɪk] n. 1. тканíна *f.*, матэрыя́л -у *m.* 2. структу́ра *f.*: ***financial fabric*** фінáнсавая структу́ра

• ***fabrics*** мануфактýра *f.*

fabricate ['fæbrɪkeɪt] v.t. 1. будавáць; вырабля́ць, фабрыкавáць. 2. зьбірáць машы́ну (*складáць з гато́вых ча́стак*). 3. выдумля́ць, хлусíць. 4. падрабля́ць (*дакумэ́нты*)

fabrication [ˌfæbrɪ'keɪʃən] n. 1. збо́рка (*аўтамабі́ляў*); вы́раб -у *m.*, выраблянь не *n.*; ствараньне *n.* 2. вы́думка *f.*, прыу́маная гісто́рыя, мана́, адгаво́рка *f.*

face [feɪs] – n. 1. твар -у *m.*, аблíчча *n.* 2. вы́раз твáру. 3. грымáса *f.*: ***to make faces at*** перадражнíваць, крывíць твар. 4. во́нкавы вы́гляд. 5. пярэ́дняя чáстка; до́бры, прáвы бок (*тканíны*); павéрхня *f.*: ***the face of a clock*** цыфэрбля́т гадзíньніка. 6. фасáд -а *m.*

– v. 1. стаяць твáрам, стаяць пéрад *кім-чым*: ***the problem that faces us*** праблéма, якáя стаíць пéрад намí. 2. зварачáцца, быць зьвéрнутым у якí-н. бок; выхóдзіць: ***My windows face the sea*** Маé вóкны выхóдзяць на мóра; ***our house faces north*** наш дом зьвéрнуты на пóўнач. 3. адвáжна сустракáць, супрацьстаяць (*вóрагу, цяжкасьцям*): ***to face the facts*** браць пад увáгу фáкты. 4. абліцóўваць (*дом цэглай*). 5. паліраваць, абтóчваць (*камень*)

• ***face down*** запалóхаць, асадзíць

• ***face to face*** твар у твар

• ***face up to*** адвáжна пастáвіцца (*да цяжкасьцяў, прыкрасьцяў*)

• ***in the face of*** а) пéрад *кім-чым*, у прысýтнасьці *кагó*. б) насýперак, насупóр *чамý*

• ***lose face*** згубíць твар, страціць аўтарытэт

• ***pull a long face*** выглядáць нешчасьлíвым або́ незадавóленым

• ***to one's face*** а) у чыёй-н. прысýтнасьці, б) прóста ў вóчы, шчы́ра, адвáжна

face card карóль, дáма *або́* валéт (*у кáрах*); фігýрная кáрта, карцíнка *f.*

face lift 1. касмэтычнае амаладжэ́ньне твáру. 2. абнаўлéньне фасáду

facet ['fæsɪt] n. 1. грань *f.*; пэры́яд -у *m.* 2. аспэ́кт -у *m.*: ***a facet of his character*** рыса ягóнага харáктару

facial ['feɪʃəl] – adj. 1. твáрны; твáру: ***a facial nerve*** нэрв твáру. 2. для твáру: ***a facial ointment*** мазь для твáру

– n., Informal масáж твáру

facial tissue папяро́вая ху́стачка (*для тва́ру*)

facile ['fæsəl] adj. 1. лёгкі, про́сты. 2. спры́тны, ху́ткі. 3. лаго́дны, рахма́ны; дабраду́шны, згаво́рлівы

facility [fə'sɪlətɪ] n., pl. **-ties** 1. лёгкасьць *f.* 2. спрыт -у *m.* 3. абсталява́ньне, прыстасава́ньне *n.* 4. пада́тнасьць, рахма́насьць, згаво́рлівасьць *f.* 5. магчы́масьць, умо́ва *f.*: ***work facilities*** ме́сца для пра́цы

facing ['feɪsɪŋ] n. 1. абліцо́ўка *f.*, абліцо́вачны матэрыя́л. 2. адваро́т -у *m.* (*у суке́нцы, гарні́ту́ры*); матэрыя́л на адваро́ты. 3. Milit. паваро́т -у *m.* (*упра́ва, уле́ва*)

facsimile [fæk'sɪməlɪ] n. факсы́міле, *indecl.* (*дакла́дная ко́пія або́ рэпраду́кцыя*)

fact [fækt] n. 1. факт -у *m.*; акалі́чнасьць *f.*; падзе́я *f.*; зья́ва *f.*: ***scientific facts*** навуко́выя фа́кты. 2. пра́ўда, сапра́ўднасьць *f.*; рэчаі́снасьць, су́тнасьць *f.*: ***the fact is that*** рэч у тым, што
• ***after the fact*** Law пасьля́ ўчыне́ньня злачы́нства
• ***in fact*** or ***as a matter of fact*** у сапра́ўднасьці, фактычна
• ***in point of fact*** сапраўды́; фактычна

faction ['fækʃən] n. 1. фра́кцыя *f.* 2. кліка *f.* 3. сва́рка *f.*; разла́д -у *m.*, нелады́ *pl.*

factor ['fæktər] n. 1. элемэ́нт -у *m.*, істо́тныя абста́віны, фа́ктар -у *m.* 2. Math. мно́жнік -а *m.* 3. аге́нт -а *m.*, камісіянэ́р -а *m.*; пасярэ́днік -а *m.* (*у гандлёвых зьдзе́лках*)

factory ['fæktrɪ] n., pl. **-ries** 1. фа́брыка *f.*, завод -у *m.*: ***chemical factory*** хімі́чны завод. 2. фактóрыя *f.*

faculty ['fækəltɪ] n., pl. **-ties** 1. здо́льнасьць *f.*: ***the faculty of hearing*** здо́льнасьць чуць. 2. наста́ўніцкі, прафэсарскі склад шко́лы. 3. факульта́т, аддзе́л -у *m.* (*ва ўнівэрсыта́це*)

fad [fæd] n. 1. мо́да *f.*; часо́вае захапле́ньне. 2. хо́бі *indecl.*

fade [feɪd] – v.i. 1. бля́кнуць; рабі́цца цьмя́ным (*і пра ўспамі́ны*); выцьвіта́ць; выгара́ць; ліня́ць (*на со́нцы, у мыцьці*). 2. вя́нуць. 3. слабе́ць; зьніка́ць: ***to fade away*** паступо́ва зьніка́ць, замі́ра́ць
– v.t. выпа́льваць (*пра со́нца*), пазбаўля́ць ко́леру: ***sunlight faded the curtains*** со́нца вы́паліла фіра́нкі

fade in v. (*у ра́дыё, кіно́, тэлеба́чаньні*) паступо́ва павялі́чваць сі́лу гу́ку *або́* выра́знасьць выя́вы

fade out v. паступо́ва зьмянша́ць сі́лу гу́ку *або́* выра́знасьць выя́вы

fag [fæg] – v.t. зьнясі́льваць, стамля́ць (*пра́цай*)
– v.i. зьнясі́львацца, стамля́цца
– n. 1. цяжка́я, ну́дная пра́ца. 2. Informal недапа́лак -лка, бычо́к -ка (*цыгары́ты*)

fag II [fæg] n., Sl. гомасэксуалі́ст -а *m.*; го́мік -а *m.*

fail [feɪl] – v.i. 1. цярпе́ць няўда́чу; не ўдава́цца; ***he failed*** ямý не ўдало́ся, ён завалі́ў спра́ву. 2. не става́ць, не хапа́ць; адсу́тнічаць. 3. тра́ціць сі́лы; занепада́ць, слабе́ць; паступо́ва замі́ра́ць. 4. банкрутава́ць. 5. ня здаць экза́мену
– v.t. 1. ня слу́хацца (*ра́ды*). 2. падво́дзіць, расчаро́ўваць. 3. ста́віць ву́чню дрэ́нную адзна́ку; зрэ́зваць на экза́мэне
• ***without fail*** напэ́ўна, беспамылко́ва

failing ['feɪlɪŋ] – n. 1. няўда́ча *f.* 2. сла́басьць *f.*; віна́ *f.*; зага́на *f.*
– prep. 1. без, за недахо́пам: ***failing good weather*** калі́ ня бу́дзе паго́ды. 2. пры адсу́тнасьці: ***failing election*** у выпа́дку няўда́чы ў вы́барах.
– adj. 1. слабы́, кво́лы (*пра здаро́ўе*). 2. яко́га не стае́, не хапа́е; нездавальня́ючы: ***a failing grade*** нездавальня́ючая адзна́ка

failure ['feɪljər] n. 1. няўда́ча *f.*, правá́л -у *m.*, непасьпяхо́васьць *f.*: ***The trip was a failure*** Пае́здка не ўдала́ся; ***a failure of crops*** неўраджа́й -ю *m.* 2. упа́дак

сі́лаў, стра́та *f.*: ***a failure of eyesight*** стра́та зро́ку. 3. банкру́цтва *n.* 4. няўда́чнік -а *m.*, няўда́чніца *f.*

faint [feɪnt] – adj. 1. няя́сны (*ду́мка*), бля́клы, невыра́зны (*ко́лер*). 2. кво́лы, слабы́: ***a faint voice*** кво́лы го́лас. 3. неахво́тны, без запа́лу. 4. бліз кі да непрыто́мнасьці, гато́вы амле́ць. 5. нясьме́лы, баязьлі́вы
– v.i. амле́ць, тра́ціць прыто́мнасьць
– n. непрыто́мнасьць *f.*, самле́ньне *n.*

fainthearted [ˌfeɪnt'hɑ:rtəd] adj. баязьлі́вы, нясьме́лы, нерашу́чы

fair I [fer] – adj. 1. справядлі́вы; сумле́нны, добрасумле́нны; зго́дны з пра́вiламі (*гульня́*): ***a fair judge*** справядлі́вы судзьдзя́. 2. неблагі́. 3. ла́дны: ***a fair sum of money*** ла́дная су́ма гро́шай. 4. сьве́тлы, бляя́вы (*валасы́, ску́ра*). 5. лаго́дны, со́нечны; чы́сты (*пра не́ба*); незапля́млены. 6. прыго́жы; ве́тлівы. 7. разбо́рлівы, выра́зны, чытэ́льны (*по́чырк*)
– adv. 1. справядлі́ва, сумле́нна. 2. про́ста
• ***fair and square*** справядлі́ва й сумле́нна
• ***fair lady*** прыгажу́ня

fair II [fer] n. кірма́ш -у́ *m.*

fairly ['ferli] adv. 1. сумле́нна; справядлі́ва. 2. до́сыць, дава́лі. 3. фактычна; зусі́м, ца́лкам. 4. я́сна, выра́зна (*піса́ць*)

fair-minded [ˌfer'maɪndɪd] adj. справядлі́вы, бесстаро́нны, непрадузя́ты, аб'ектыўны

fairness ['fernəs] n. сумле́ннасьць, добрасумле́ннасьць, справядлі́васьць *f.*

fairy ['feri] n., pl. **fairies** фэ́я *f.*

fairy tale 1.ка́зка *f.* 2. вы́думка, небылі́ца *f.*

faith [feɪθ] n. 1. ве́ра *f.*; дове́р -у *m.* 2. рэлі́гія *f.* 3. ве́рнасьць, адда́насьць, ляя́льнасьць *f.*
• ***in bad faith*** несумле́нна, з дрэ́ннай ду́мкай
• ***in good faith*** сумле́нна, шчы́ра
• ***keep faith*** стрыма́ць абяца́ньне; ве́рыць

faithful ['feɪθfəl] – adj. 1. ве́рны, адда́ны. 2. праўдзі́вы; дакла́дны, акура́тны
– n. ве́рны -ага *m.*, ве́рная *f.*

faithfulness ['feɪθfəlnəs] n. ве́рнасьць, адда́насьць *f.*

fake [feɪk] – v. 1. падрабля́ць, фальшава́ць. 2. ашу́кваць; удава́ць, прыкі́двацца (*хво́рым*)
– n. 1. фальшы́ўка *f.*; падро́бка *f.*; прыкі́дваньне *n.* 2. прытво́рa -ы *m.* & *f.*
– adj. фальшы́вы, падро́блены

falcon ['fælkən] n. со́кал -а *m.*

falconer ['fælkənər] n. сако́льнік -а *m.*

fall [fɔ:l] – v.i., **fell, fallen, -ing** 1. па́даць; сы́пацца, асыпа́цца; апада́ць (*пра лі́сты*). 2. па́даць (*пра валасы́*), апушча́цца, апуска́цца, па́даць (*мара́льна*). 3. гі́нуць, быць забі́тым (*у бі́тве*). 4. па́даць, здава́цца: ***The fort fell to the enemy*** Форт зда́ўся во́рагу. 5. упада́ць у стан: ***to fall asleep*** засну́ць; ***to fall in love*** закаха́цца. 6. наставáць, надыхо́дзіць, пачына́цца: ***when night fell*** калі наста́ла ноч. 7. прыпада́ць, выпада́ць: ***Christmas fell on Sunday this year*** Сёлета Каля́ды прыпада́юць на нядзе́лю. 8. зьніжа́цца: ***prices fall*** цэ́ны па́даюць. 9. дзялі́цца: ***The story fell into five parts*** апавяда́ньне дзе́ліцца на пяць ча́стак. 10. упада́ць (*пра раку́*)
– n. 1. упа́дак -ку *m.* (*і мара́льны*). 2. падзе́ньне *n.* 3. зьніжэ́ньне *n.* (*цэ́наў, ці́ску*). 4. пака́тасьць *f.*, спад -у *m.* 5. вадаспа́д -у *m.* 6. во́сень *f.*
– adj. во́сенскі
• ***fall across*** or ***among*** выпадко́ва сустрэ́цца, натыкну́цца, наско́чыць на *каго́*
• ***fall apart*** распада́цца, разва́львацца
• ***fall behind*** адстава́ць, заставáцца ззаду
• ***fall due*** падляга́ць вы́плаце (*пра доўг*)
• ***fall heir to*** атрыма́ць у спа́дчыне
• ***fall in*** а) выпадко́ва спатка́цца. б) згаджа́цца, саступа́ць. в) ува́львацца; зава́львацца

• ***fall off*** а) зьлятáць, звáльвацца. б) адпадáць, адыхóдзіць. в) зьмяншáцца, паслабля́цца
• ***fall on*** нападáць
• ***fall out*** выпадáць
• ***fall short (of)*** быць мéншым (*за што-н.*), не ставáць
• ***fall through*** праваáльвацца
• ***fall under*** а) падпадáць (*пад уплы́ў*). б) налéжаць да грýпы
• ***fall upon*** кíнуцца, напáсьці на *кагó-што*

fallacy [ˈfæləsi] n., pl. **-cies** памы́лка *f.*; памылкóвая дýмка, памылкóвы пагля́д

fallout [ˈfɔ:laʊt] n. радыёакты́ўныя апáдкі *абó* пыл

fallow [ˈfælou] – adj. 1. папáрны (*пра пóле*): ***fallow field*** папáр. 2. Informal неразьвíты, бязьдзéйны (*рóзум*)
– n. папáр -у *m.*
– v.t. арáць пад папáр, кідáць пóле пад папáр

falls [fɔ:lz] n., pl. вадаспáд -у *m.*

false [fɔ:ls] – adj. 1. фальшы́вы; няпráвільны; памылкóвы. 2. ілжы́вы, хлусьлíвы (*сьвéдчаньне*). 3. фальшы́вы (*нóта*); нявéрны, няшчы́ры (*ся́бра*). 4. ашукáнскі (*сыгнáл*), махля́рскі (*вагá*). 5. падрóблены, штýчны (*дыямэ́нт*)
– adv. фальшы́ва; ілжы́ва; няшчы́ра; штýчна
– v. фальшы́віць (*у ігры́*), падрабля́ць

falsehood [ˈfɔ:lshʊd] n. 1. фальшы́васьць *f.* 2. хлушэ́ньне, ілгáньне *n.* 3. хлусьня́, манá, ілжá *f.*; фальш -у *m.*

fame [feɪm] n. 1. слáва *f.*; папуля́рнасьць *f.* 2. рэпутáцыя *f.*

familiar [fəˈmɪljər] adj. 1. знаёмы, добра вядóмы: усíм вядóмы; прывы́чны; блíзкі, інты́мны (*ся́бра*). 2. дасьвéдчаны: ***to be familiar with ...*** быць дóбра дасьвéдчаным у *чым*, азнаёмленым з *чым*. 3. неафіцы́йны, сябрóўскі (*дачынéньні*); фамілья́рны. 4. прыры́чаны (*пра жывёліну*)

familiarity [fəˌmɪliˈærəti] n., pl. **-ties** 1. блíзкае знаёмства, вéданьне *n.* 2. фамілья́рнасьць *f.*

family [ˈfæmli] – n., pl. **-lies** 1. сям'я́ *f.* 2. дзéці, нашчáдкі. 3. род -у *m.* 4. знáтнае пахóджаньне. 5. Bot., Zool. сям'я́
– adj. сямéйны; хáтні
• ***family line*** радавóд
• ***family name*** прóзьвішча
• ***family tree*** радавóднае дрэ́ва
• ***in the (a) family way*** у цяжкý, цяжáрная

famine [ˈfæmɪn] n. 1. галадáньне *n.*; галадóўля *f.*; гóлад -у *m.* 2. вялíкі недахóп: ***a coal famine*** вялíкі недахóп вýгалю

famish [ˈfæmɪʃ] – v.t. марыць гóладам
– v.i. 1. быць мóцна галóдным; галадаváць. 2. памірáць з гóладу

famous [ˈfeɪməs] adj. 1. дóбра вядóмы, слáўны, знакамíты. 2. выдáтны; дасканáлы

fan I [fæn] – n. 1. вéер -а *m.* 2. вэнтыля́тар -а *m.* (*у пакóі*). 3. вéялка *f.* (*для збóжжа*)
– v.t. 1. абмáхваць вéерам. 2. разьдзьмýхваць (*агóнь*). 3. вéяць (*збóжжа*)

fan II [fæn] n. Informal 1. энтузія́ст -а *m.*, энтузія́стка *f.*; фанáт -а *m.* 2. Sport заўзя́тар -а *m.*, заўзя́тарка *f.*

fanatic [fəˈnætɪk] – n. фанáтык -а *m.*, фанаты́чка *f.*
– adj. заця́ты; апантáны

fanciful [ˈfænsɪfəl] adj. 1. капры́зны, капры́сьлівы, перабóрлівы. 2. дзівóсны, фантазíйны, пóўны фантáзіі; нязвы́клы, незвычáйны. 3. які́ мáе багáтае ўяўлéньне, з багáтай фантáзіяй: ***a fanciful writer*** пісьмéньнік з багáтай фантáзіяй. 4. уя́ўны, нерэáльны, фантасты́чны: ***a fanciful story*** фантастычнае апавядáньне

fancy [ˈfænsi] – n., pl. **-cies** 1. фантáзія *f.*, уяўлéньне *n.* 2. галюцынáцыя *f.* 3. нахíл -у *m.*; схíльнасьць *f.*; сымпáтыя *f.*; упадабáньне *n.*: ***They took a great fancy to each other*** Яны́ мóцна спа-

дабáліся аднó аднамý. 4. капрыс́ьлівасьць *f.*, капрыз -у *m.*
– v.t. 1. уяўля́ць. 2. меркава́ць, ду́маць. 3. любíць; падаба́цца
– adj. 1. аздóбны, аздóблены, прыбра́ны; мóдны. 2. няпрóсты; фігу́рны: ***fancy skating*** адвóльнае ката́нне на канька́х. 3. спэцыя́льна гадава́ны (*фрукт, жывёліна*). 4. уя́ўны; вы́думаны; фантасты́чны

fancy ball маскара́дны баль

fancy dress шыкóўная адзéжына; маскара́дны ўбор

fancy goods галянтэрэ́я

fancywork ['fænsɪwɜ:rk] n. вы́шыўка *f.*; вязáньне *n.*

fang [fæŋ] n. 1. ікл|óл -лá *m.* 2. ядавíты зуб (*у зьмéяў*). 3. завóстраная чáстка (*зуб відэ́льца*)

fantastic [fæn'tæstɪk] adj. 1. дзівóсны; дзíўны, незвычáйны. 2. эксцэнтры́чны. 3. фантасты́чны; нерэáльны. 4. Informal неверагóдна дóбры (хýткі, высóкі)

fantasy ['fæntəsi] n., pl. **-sies** 1. уяўлéньне *n.*, фантáзія *f.* 2. капры́з -у *m.* 3. Mus. фантáзія *f.*

far [fɑ:r] – adj. **farther, farthest** 1. далёкі. 2. даўгí: ***a far journey*** далёкае падарóжжа. 3. другí, супрацьлéжны, супрацьлéглы: ***a far bank*** супрацьлéглы бéраг
– adv. 1. далёка: ***far away*** далёка, удáлеч; ***far from*** вóддаль; ***far into the night*** пóзна ўнóчы; ***far into the ground*** глыбóка ў зямлю́. 2. (*вéльмі*) шмат; куды́: ***far better*** куды́ лéпшы
• ***as far as*** а) аж да. б) накóлькі: ***as far as I know*** накóлькі я вéдаю
• ***by far*** шмат, знáчна
• ***far and near*** усю́ды
• ***far be it from me*** не хачу́; нізавóшта
• ***far from it*** зусíм не; анí, ні ў я́кім рáзе
• ***from far*** здалёку
• ***how far*** дакýль; як далёка
• ***so far*** дагэ́туль; датýль
• ***so far as*** накóлькі; да тагó, што
• ***so far so good*** пакýль што ўсё дóбра

farce [fɑ:rs] n. 1. фарс -у *m.* (*тэáтр*). 2. пасьмéшышча *n.*, камэ́дыя *f.*

fare [fer] – n. 1. плáта за праéзд (*аўтóбусам, цягнікóм*). 2. пасажы́р (*аўтóбуса, цягнікá*). 3. éжа *f.*, харч: ***a daily fare*** штодзённая éжа; ***bill of fare*** мэню́, *indecl.*
– v.i. 1. éсьці, харчавáцца: ***He fares well*** ён дóбра харчýецца. 2. вéсьціся: ***he is faring well in school*** ямý дóбра йдзé навýка. 3. давóдзіцца ***It will fare hard with the thief, if ...*** Злóдзею ця́жка давядзéцца, калí ...

Far East Далёкі Ўсхóд

farewell [ˌfer'wel] – interj. 1. бывáй здарóў, бывáйце здарóвы! 2. бывáй, бывáйце! Шчасьлíва! Усягó дóбрага!
– n. разьвітáньне *n.*
– adj. разьвітáльны; апóшні

farfetched [ˌfɑ:r'fetʃt] adj. наця́гнуты; ненатурáльны, штýчны: ***a farfetched comparison*** наця́гнутае параўнáньне

farm [fɑ:rm] – n. 1. гаспадáрка *f.*, фáрма, фэ́рма *f.*; хýтар -у *m.*: ***a dairy farm*** малóчная фэ́рма. 2. гадавáльнік -у *m.*: ***an oyster farm*** гадавáльнік вýстрыцаў
– v.t. 1. абрабля́ць, апрацóўваць зямлю́, здавáць у арэ́нду (*зямлю́*), давáць у нáймы (*рабóтнікаў*)
– v.i. займáцца земляробствам, быць земляробам

farmer ['fɑ:rmər] n. земляро́б, фáрмэр -а *m.*

farm hand наня́ты рабóтнік на сéльскай гаспадáрцы, пáрабак -ка *m.*

farm house ['fɑ:rmhaʊs] n. жылы́ дом на хýтары

farmland ['fɑ:rmlænd] n. вóрная зямля́ й пáша *абó* паплавы́

farmstead ['fɑ:rmsted] n. фальвáрак -ка *m.*; фáрма з гаспадáрчымі будынкамі

far-off [ˌfɑ:r'ɔ:f] adj. далёкі

far-reaching [ˌfɑ:r'ri:tʃɪŋ] adj. далекася́жны

far-seeing [ˌfɑ:rˈsi:ɪŋ] adj. 1. дальнабáчны, празóрлівы, прадбáчлівы. 2. дальназóркі

farsighted [ˌfɑ:rˈsaɪtəd] adj. 1. дальназóркі. 2. дальнабáчны, празóрлівы, прадбáчлівы

farther [ˈfɑ:rðər] adj. *вышэ́йшая ступе́нь ад* **far** 1. далéйшы. 2. больш, дадаткóвы: ***Do you need farther help?*** Ці патрэ́бна вам далéйшая дапамóга?

farthest [ˈfɑ:rðɪst] – adj. *найвышэ́йшая ступе́нь ад* **far** 1. найдалéйшы. 2. найдаўжэ́йшы: ***the farthest distance*** найдалéйшая адлéгласьць
– adv. 1. найдалéй. 2. вéльмі далёка

farthing [ˈfɑ:rðɪŋ] n. 1. Brit. фáртынг -а *m.* (*1/4 пэ́нса*). 2. дрóбязь *f.*: ***it's not worth a farthing*** грóша ня вáрта

fascinate [ˈfæsɪneɪt] v.t. 1. захапля́ць. 2. зачарóўваць

fascinating [ˈfæsɪneɪtɪŋ] adj. захапля́льны; чарóўны, панáдны

fascination [ˌfæsɪˈneɪʃən] n. 1. захаплéньне, ачараванáньне *n.* 2. чарóўнасьць; панáднасьць, прывáбнасьць *f.*

fascism [ˈfæʃˌɪzəm] n. фашы́зм -у *m.*

fascist [ˈfæʃɪst] – n. фашы́ст -а *m.*
– adj. фашы́сцкі, фашыстóўскі

fashion [ˈfæʃən] – n. 1. спóсаб -у *m.*; манéра *f.*; узóр -у *m.*: ***after my fashion*** па-мóйму; ***after the fashion of*** на ўзóр *чаго́* 2. мóда *f.*: ***in (the) fashion*** мóдны; ***out of fashion*** нямóдны, састарэ́лы. 3. фасóн -у, кроі́й -ю *m.*, фóрма *f.*; узóр -у *m.*
– v.t. 1. рабíць; мадэляваáць, фармаваáць. 2. прыстасóўваць
• ***after*** or ***in a fashion*** да пэ́ўнай ступéні; сяк-так
• ***set the fashion*** увóдзіць мóду
• ***something of that fashion*** нéшта накштáлт тагó

fashionable [ˈfæʃənəbəl] – adj. 1. мóдны: у мóдзе. 2. сьвéцкі, які́ трымáецца мóды
– n. мóднік -а *m.*

fast I [fæst] – adj. 1. шпáркі, бóрзды, хýткі: ***my watch is fast*** мой гадзíннік сьпяшáецца. 2. мóцны: ***to take a fast hold of something*** мóцна ўхапíцца за што-н. 3. які́ мóцна трымáецца, ня бля́кне (*пра кóлер*). 4. легкадýмны, фрывóльны; шалапýтны: ***He led a fast life*** Ён вёў шалапýтнае жыцьцё. 5. вéрны: ***fast friend*** вéрны прыя́цель
– adv. 1. шпáрка, бóрзда, хýтка. 2. мóцна; шчы́льна; пэ́ўна: ***The baby is fast asleep*** Дзіця́тка мóцна сьпіць. 3. пасьпéшна, безраздýмна: ***to live fast*** марнатрáвіць жыцьцё
• ***play fast and loose*** казáць аднó, а рабíць другóе; быць няшчы́рым *абó* ненадзéйным

fast II [fæst] – v.i. пасьціцьь, пóсьнікаваць
– n. пост -у *m.*

fasting [ˈfæstɪŋ] n. пост -у *m.*

fasten [ˈfæsən] v.t. 1. прымацóўваць, прывя́зваць, зьвя́зваць; сашчэ́пліваць (*папéры*); сашрубóўваць. 2. сьціскáць (*рýкі, зýбы*). 3. зачыня́ць; замыкáць; зашпіля́ць : ***to fasten a door*** зашчапíць дзьвéры; ***to fasten a blouse*** зашпілíць блю́зку

fastener [ˈfæsənər] n. 1. зáсаўка *f.* (*у дзьвярáх*), завáла *f.* 2. (*вінтавáя*) защіскáчка *f.*; замацавáльнік -а, кля́мlар -ра *m.* 3. сашчэ́пка *f.* (*для папéраў*)

fastidious [fæˈstɪdiəs] adj. 1. патрабавáльны; перабóрлівы. 2. вы́танчаны: ***a fastidious mind*** or ***taste*** вы́танчаны рóзум абó густ

fastidiousness [fæˈstɪdiəsnəs] n. 1. патрабавáльнасьць *f.* 2. вы́танчанасьць *f.*

fat [fæt] – n. 1. тлушч -у *m.*; тук -у *m.*; сáла *n.* 2. сы́тасьць, тлýстасьць *f.*
– adj. 1. тлýсты (*мя́са*). 2. урадлíвы (*зямля́*). 3. выгóдны, дахóдны (*прáца*). 4. таўсты́, сы́ты, пóўны, глáдкі. 5. багáты. 6. тупы́, дурны́
– v.t. 1. адкóрмваць, выкóрмваць, адпáсвасць
– v.i. сыцéць, рабíцца глáдкім (*пра жывёлу*)

fatal [ˈfeɪtəl] adj. 1. сьмяротны: ***fatal accident*** сьмяротны вы́падак. 2. згýб-

ны. 3. ва́жны; вырашáльны; накана-ва́ны, су́джаны, фата́льны

fatality [feɪˈtæləti] n., pl. **-ties** 1. сьмяро́тны вы́падак, сьмерць *f.* 2. згу́бнасьць, сьмяро́тнасьць *f.* 3. наканава́насьць, фата́льнасьць *f.*

fate [feɪt] – n. 1. кон -у *m.* 2. наканава́ньне *n.* 3. до́ля *f.*, лёс -у *m.* 4. сьмерць *f.*, згу́ба *f.*, гі́бель *f.*
– v.t. наканóўваць

father [ˈfɑːðər] – n. 1. ба́цькa -і *m.*; про́дак -ка *m.* 2. айц|е́ц -ца́ *m.* (*фо́рма зваро́ту да сьвятара́*). 3. ствара́льнік -а, тво́рцa -ы *m.*; правады́р -а́ *m.*
– v. 1. спараджа́ць, быць ба́цькам. 2. ствара́ць

fatherhood [ˈfɑːðərhʊd] n. бацько́ўства *n.*

father-in-law [ˈfɑːðərənˌlɔː] n., pl. **fathers-in-law** сьвёкlар -ра *m.* (*му́жаў ба́цька*); це́сьць -я *m.* (*жо́нчын ба́цька*)

fatherland [ˈfɑːðərlænd] n. ба́цькаўшчына, айчы́на *f.*

fatherly [ˈfɑːðərli] – adj. бацько́ўскі
– adv. па-бацько́ўску

fatigue [fəˈtiːg] – n. змо́ра *f.*; сто́ма, сто́мленасьць, змо́ўчанасьць *f.*
– v.t. стамля́ць; му́чыць, мары́ць
– v.i. стамля́цца, му́чыцца; мары́цца

fatling [ˈfætlɪŋ] n. ко́рмнік -а *m.*; мала-да́я жывёліна, адко́рмленая на мя́са

fatness [ˈfætnəs] n. 1. сы́тасьць, тлу́стасьць *f.* 2. урадлі́васьць (*гле́бы*)

fatten [ˈfætən] – v.t. 1. адко́рмваць, выко́рмваць (*жывёлу*), ту́чыць. 2. угно́йваць (*раллю́*)
– v.i. сыце́ць

fattened [ˈfætənd] adj. адко́рмлены

fatty [ˈfæti] – adj. 1. тлу́сты. 2. тлу́шчавы
– n. таўсту́н -а́ *m.*, таўсту́ха *f.*; гла́дкая жывёліна

faucet [ˈfɔːsɪt] n. (*вадаправо́дны*) кран -у *m.*

fault [fɔːlt] – n. 1. недахо́п -у *m.*, зага́на *f.*; брак -у *m.*: ***to find fault with*** знахо́дзіць зага́ну, пярэ́чыць чаму́-н., крытыкава́ць. 2. памы́лка, хі́ба *f.* 3. віна́ *f.*; правíна *f.*; злачы́нства *n.* 4. Geol. зрушэ́ньне *n.*, зрух -у *m.*
– v.i. 1. Geol. зру́хвацца, зьмяшча́цца (*пра го́рныя паро́ды*). 2. памыля́цца
– v.t. 1. Geol. 1. выклі́ка́ць зрушэ́ньне. 2. пярэ́чыць; крытыкава́ць
• ***at*** or ***in fault*** вінава́ты; няпра́вільны, які ня ма́е ра́цыі
• ***to a fault*** зашма́т, зана́дта, празьме́рна, залі́шне: ***generous to a fault*** залі́шне шчо́дры

faultfinder [ˈfɔːltˌfaɪndər] n. прычэ́пa, прыдзі́ра *m. & f.*; крытыка́н -а *m.*

faultfinding [ˈfɔːltˌfaɪndɪŋ] – n. нарака́ньне, крытыкава́ньне *n.*, кры́тыка *f.*
– adj. прыдзі́рлівы, прычэ́плівы, які́ крытыку́е

faulting [ˈfɔːltɪŋ] n., Geol. зрушэ́ньне *n.*, скіды *pl. only*

faultless [ˈfɔːltləs] adj. 1. беззага́нны, бездако́рны. 2. беспамылко́вы; бясхі́бны

faulty [ˈfɔːlti] adj. зага́нны, які́ ма́е недахо́пы; памылко́вы, няпра́вільны; няспра́ўны

favor, Brit. **favour** [ˈfeɪvər] – n. 1. ла́скa, паслу́га *f.*: ***Will you do me a favor?*** Зрабе́це мне ла́ску; ***to be out of favor*** быць у няла́сцы. 2. ухвале́ньне, прыхі́льнасьць, зго́да: ***to look with favor on*** ухваля́ць, быць зго́дным на *што*. 3. падару́нак *m.*, па́мятка *f.*
– v.t. 1. мець ла́ску, быць ласка́вым: ***Favor us with a song*** Бу́дзь ласка́вы, засьпява́й нам. 2. спрыя́ць, ста́віцца з прыхі́льнасьцю. 3. ухваля́ць, пагаджа́ць: ***We favor your plan*** Нам падаба́ецца ваш плян. 4. падтрымо́ўваць, стая́ць на чыі́м-н. баку, стая́ць за; дапамага́ць *каму́-чаму́*
• ***in favor of*** а) быць прыхі́льным, стая́ць за *каго́-што*. б) на карысьць, у карысьць: ***to write a cheque in favor of*** вы́пісаць чэк на чыё-н. імя́

favorable, Brit. **favourable** [ˈfeɪvərəbəl] adj. 1. прыхі́льны. 2. спрыя́льны, зру́чны, карысны: ***a favorable wind*** спадаро́жны ве́цер. 3. які́ абяца́е *або́* прадвяшча́е до́брае

favorite, Brit. **favourite** [ˈfeɪvrət] – adj. улюбёны, аблюбава́ны

– n. 1. улюбёнlец -ца *m.*, улюбёнка *f.*; пястýн пестунá *m.*, пястýха *f.* 2. фаварыт -а *m.*

favoritism, Brit. favouritism ['feɪvrəˌtɪzəm] n. фаварытызм -у *m.*

fawn I [fɔ:n] – n. 1. казýля, маладáя кózачка. 2. жóўта-бýры кóлер
– adj. сьвéтла жóўта-бýры
– v.t. нарадзíць, прывéсьці казьлянё

fawn II [fɔ:n] v.i. 1. падмáзвацца, падлíзвацца, падхалíмнічаць. 2. лáшчыцца (*пра сабáку*)

fear [fɪr] – n. 1. страх -у *m.* 2. небясьпéка *f.*; бóязь *f.*: ***in fear of one's life*** бóязь за сваё жыцьцё. 3. страх з глыбóкай пашáнай
– v.t. баяцца, непакóіцца: ***to fear for one's safety*** непакóіцца за сваю бясьпéку
• ***without fear or favor*** бесстаróнна, справядлíва

fearful ['fɪrfəl] adj. 1. страшны, страшны́. 2. пóўны стрáху, у стрáху

fearless ['fɪrləs] adj. бясстрáшны; адвáжны, сьмéлы

fearlessness ['fɪrləsnəs] n. бясстрáшнасьць, адвáга, сьмéласьць *f.*

feasible ['fi:zəbəl] adj. 1. зьдзяйсьня́льны, рэáльны. 2. магчы́мы, праўдападóбны. 3. адпавéдны

feast [fi:st] n. 1. бясéда *f.*, банкéт -у *m.* 2. багáты абéд. 3. фэст -у *m.* (*рэлігíйнае сьвя́та ці ўрачы́стасьць*)

feat [fi:t] – n. 1. высóкі ўчы́нак. 2. дасягнéньне *n.*; спрыт -у *m.*
– adj. 1. прыдáтны, адпавéдны. 2. спры́тны

feather ['feðər] – n. 1. пярó *n.* (*птушы́нае*), *pl.* пёры, *coll.* пéр'е *n.*; пяры́на, пяры́нка *f.* (*аднó пярó*). 2. esp. pl. апярэ́ньне *n.*
– v.t. пакрывáць *абó* ўпрыгóжваць пёрамі

feather-brain adj. пустагалóвы

feather weight – adj. лёгкі, як пяры́нка
– n. лёгкая вагá (*у бóксе*)

feature ['fi:tʃər] – n. 1. асаблíвасьць, характэ́рная ры́са, дэтáль *f.* 2. галóўная чáстка праграмы, асаблíва фільм. 3. галóўны арты́кул у газэ́це *абó* чáсапісе
– v.t. 1. пакáзваць (*на экрáне*); прадстаўля́ць; апíсваць. 2. адвóдзіць асóбнае мéсца ў газэ́це
– v.i. быць характэ́рнай ры́сай чагó-н.
• ***features***, pl. ры́сы твáру (*вóчы, нос, вýшы*), твар

febrifuge ['febrɪfju:dʒ] – n. 1. гарáчкапаніжáльнае *n.* (*лек*). 2. асьвяжáльны напóй
– adj. гарáчкапаніжáльны

February ['febjueri] – n., pl. **-aries** лю́тыага *m.*
– adj. лю́таўскі

feces ['fi:si:z] n., pl. 1. кал -у *m.* 2. адкíды *pl. only*; асáдак -ку *m.*

fed [fed] v. *pt. and pp. of* **feed**

federal ['fedərəl] adj. фэдэрáльны

federate ['fedəreɪt] – v.t. 1. утвары́ць фэдэрáцыю. 2. арганізавáць на фэдэрáльных аснóвах
– v.i. спалучáцца ў фэдэрáцыю
– adj. ['fedərət] спалýчаны ў фэдэрáцыю
– n. удзéльнік фэдэрáцыі

federation [ˌfedə'reɪʃən] n. фэдэрáцыя *f.*, саюз -у *m.*

federative ['fedərətɪv] adj. фэдэрацы́йны

fee [fi:] – n. 1. плáта *f.*; ганарáр -у *m.*: ***an admission fee*** уступнáя плáта. 2. аплáта *f.*
– v.t. 1. плаціць за паслýгу

feeble ['fi:bəl] adj. 1. слабы́, квóлы, хваравíты, нямóцны: ***a feeble old man*** квóлы стары́ чалавéк; ***a feeble resistance*** слабы́ супрацíў. 2. слабы́; няя́сны, невырáзны: ***a feeble cry*** квóлы крык; ***a feeble light*** слабóе сьвятлó

feebleness ['fi:bəlnəs] n. квóласьць, бясьсíльнасьць, нядýжасьць *f.*

feebly ['fi:bli] adv. слáба, квóла

feed [fi:d] – v.t. **feed, feeding** 1. кармíць, харчавáць: ***to feed a baby*** кармíць дзіця́тка. 2. жывíць; распáльваць (*злосьць*). 3. падтрымваць, забясьпéчваць пáлівам, вадóю *ці* сыра-

ві́най: ***to feed kerosene to a lamp*** налі́ць га́зы ў ля́мпу. 4. па́сьвіць (*жывёлу*). 5. уво́дзіць: ***to feed information into a computer*** уво́дзіць інфарма́цыю ў кампу́тар
– v.i. па́сьвіцца (*пра жывёлу*); е́сьці: ***Cows feed on hay*** Каро́вы ко́рмяцца се́нам
• ***I am fed up*** Sl. Мне абры́дла
– n. 1. корм -у *m.*; кармы́ *pl.* 2. Informal е́жа. 3. харчава́ньне *n.*, корме́ньне *n.*

feedback зваро́тная су́вязь

feeder ['fi:dər] n. 1. а) карміцель -я *m.*, карміцелька *f.* б) кармушка (*прыстасава́ньне для кармле́ньня жывёлы, пту́шак*). 2. Electr. фі́дэр -а *m.* (*дрот*). 3. прыто́к (*ракі́*); кана́л -у *m.*

feel [fi:l] **felt, feeling** – v.t. 1. ма́цаць, дакрана́цца: ***Feel how cold my hands are*** Паглядзі́, якія ў мяне́ хало́дныя ру́кі. 2. шука́ць во́бмацкам. 3. адчува́ць. 4. ду́маць, ве́рыць
– v.i. 1. нама́цваць, прама́цваць. 2. чу́цца, адчува́ць сябе́. 3. шкадава́ць, спачува́ць
– n. 1. до́тык -у *m.* 2. адчува́ньне, чуцьцё *n.* 3. пачуцьцё до́тыку
• ***feel like*** хаце́ць, мець ахво́ту *або́* жада́ньне

feeler ['fi:lər] n. шчупле́нь -ня́ *m. або́* шчу́пальца *n.*, ву́сік -а *m.*

feeling ['fi:liŋ] – n. 1. адчува́ньне *n.*: ***a feeling of cold (pain)*** адчува́ньне хо́ладу (бо́лю). 2. пачуцьцё до́тыку. 3. чуцьцё *n.*; ду́мка *f.* 4. пачуцьцё *n.*, эмо́цыя *f.*: ***noble feelings*** высакаро́дныя пачу́цьці. 5. шкадава́ньне, спачува́ньне *n.*
– adj. 1. чульлі́вы, чу́лы; пачуцьцёвы: ***a feeling heart*** чу́лае се́рца. 2. глыбо́ка адчува́ны
• ***hurt someone's feelings*** абра́зіць чыё-н. пачу́цьці

feet [fi:t] n. *pl. of* **foot**
• ***carry*** or ***sweep off one's feet*** а) захапі́ць каго́-н., узбудзі́ць энтузія́зм. б) зрабі́ць вялі́кае ўра́жаньне
• ***stand on one's own feet*** быць незале́жным, стая́ць на сваі́х нага́х

feign [fem] v. 1. прыкі́двацца; сымулява́ць, удава́ць. 2. выдумля́ць; прыду́мваць (*апраўда́ньне*). 3. уяўля́ць (*нерэа́льнае*)

feigned [femd] adj. 1. удава́ны; няшчы́ры. 2. прыду́маны, несапра́ўдны

felicity [fə'lisəti] n., pl. **-ties** 1. шча́сьце *n.*, уда́ча *f.* 2. асало́да *f.*

fell I [fel] v. *p.t. of* **fall**

fell II [fel] – v.t. 1. зьбіва́ць з ног, вали́ць. 2. ре́заць (*дрэ́ва*), сячы́ (*лес*). 3. шыць бяло́знавым швом
– n. 1. спу́шчаныя дрэ́вы ў сэзо́н. 2. бяло́знавае шво

fellage ['felidʒ] n. высяка́ньне *n.* (*дрэваў*), вы́сечка *f.*

felloe ['felou] n. во́бад -а *m., pl.* абады́ (*ко́ла*)

fellow ['felou] – n. 1. чалаве́к -а, хло́пец хлапца́ *m.*: ***old fellow*** дру́жа, стары́ (*у зваро́це*); ***poor fellow*** бядна́к; нябо́га, небара́ка. 2. ся́бра -ы *m.*, тава́рыш -а *m.*, супо́льнік -а *m.*: ***a fellow in misery*** тава́рыш у няшча́сьці. 3. ся́бра навуко́вага тава́рыства *або́* кале́джу
– adj. супо́льны, падо́бны: ***fellow citizens*** суграмадзя́не; ***fellow workers*** супрацо́ўнікі

fellow countryman зямля́к земляка́ *m.*, суайчы́ньнік -а *m.*

fellow feeling 1. спачуцьцё *n.* 2. пачуцьцё супо́льнасьці зацікаўле́ньняў

fellowship ['felouʃip] n. 1. сяброўскасьць, прыя́зьнь *f.* 2. сяброўства *n.*, 3. згуртава́ньне, тава́рыства *n.*, супо́лка *f.*; бра́цтва *n.*, карпара́цыя *f.* 4. стыпэ́ндыя *f.*

felon ['felən] n. злачы́нец -ца, крымінальнік -а *m.*: ***Murderers and thieves are felons*** Забо́йцы і зладзе́і — крымінальнікі

felony ['feləni] n., pl. **-nies**, Law крымінальнае злачы́нства

felt I [felt] v. *p.t. and p.p. of* **feel**

felt II [felt] – n. 1. фэ́тар -ру *m.*; *sing. only.* 2. ля́мец -цу *m.*

– adj. 1. фэ́травы: ***a felt hat*** фэ́травы капялю́ш. 2. ля́мцавы: ***a felt boot*** валёнак -ка *m., pl.* валёнкі

female [ˈfi:meɪl] – n. 1. жанчы́на, дзяўчы́на *f.* 2. са́мка *f.* 3. Bot. жано́чая кве́тка (*яка́я ма́е то́лькі пе́сьцікі*)
– adj. жано́чы: ***a female choir*** жано́чы хор

feminine [ˈfemənɪn] – adj. 1. жано́чы, жано́цкі, даліка́тны: ***feminine intuition*** жано́чая інтуі́цыя. 2. жанчынападо́бны, немужчы́нскі, расьпе́шчаны, кво́лы (*пра мужчы́ну*). 3. Gram. жано́чы род
– n. жано́чы род

femininity [ˌfemə̇ˈnɪnəti] n. 1. жано́цкасьць, жано́часьць. 2. жанчы́ны, жано́чы род

fen [fen] n., Brit. ба́гна, дрыгва́ *f.*, бало́та -а *n.*

fence [fens] – n. 1. плот -у *m.*, за́гарадзь *f.* 2. a) Informal скупшчык *або́* прадаве́ц кра́дзеных рэ́чаў. б) ме́сца, дзе прадаю́цца кра́дзеныя рэ́чы. 3. фэхтава́ньне *n.*
– v.t. 1. абгаро́джваць. 2. адгаро́джваць. 3. абараня́ць; ахо́ўваць; сьцерагчы́
– v.i. 1. фэхтава́ць. 2. Informal ухіля́цца ад адка́заў у дыску́сіі, парыра́ваць

fencing [ˈfensɪŋ] – n. фэхтава́ньне *n.*
– adj. фэхтава́льны: ***fencing foil*** фэхтава́льная шпа́га; ***fencing master*** фэхтма́йстар -ра *m.* (*інстру́ктар фэхтава́ньня*)

fender [ˈfendər] n. 1. крыло́ *n.* (*аўтамабі́ля*) 2. се́тка або́ кра́ты ў каміне

ferment [fərˈment] – v.i. 1. брадзіць; фэрмэнтава́ць. 2. хвалява́цца; узбуджа́цца, распаля́цца
– v.t. 1. выклі́ка́ць браджэ́ньне. 2. выклі́ка́ць хвалява́ньні. 3. распа́льваць, абвастра́ць
– n. [ˈfɜ:rment] 1. фэрмэ́нт -у. 2. браджэ́ньне *n.*, фэрмэнта́цыя *f.* 3. хвалява́ньне, забурэ́ньне *n.*

fermentation [ˌfɜ:rmenˈteɪʃən] n. 1. браджэ́ньне *n.*, фэрмэнта́цыя *f.* 2. хвалява́ньне *n.*; узбу́джанасьць *f.*; хвалява́ньні *pl. only*

fern [fɜ:rn] n. па́параць *f.*

ferny [ˈfɜ:rni] adj. па́паратны, як па́параць; заро́слы па́парацьцю

ferocious [fəˈroʊʃəs] adj. 1. лю́ты; злы. 2. Informal ве́льмі мо́цны, страшны́: ***a ferocious headache*** страшны́ боль галавы́

ferocity [fəˈrɑ:səti] n., pl. **-ties** 1. лю́тасьць *f.*, гне́лў -ву *m.*, разьюшанасьць *f.* 2. зьве́рскі ўчы́нак, зьве́рства *n.*

ferriferous [fəˈrɪfərəs] adj. жале́зісты; які́ ма́е ў сабе́ жале́за, бага́ты на жале́за

ferroconcrete [ˌferoʊˈkɑ:nkri:t] – n. жале́забэто́н -у *m.*
– adj. жале́забэто́нны

ferry [ˈferi] – n., pl. **-ries** 1. перапра́ва *f.*, ме́сца перапра́вы праз раку. 2. паро́м -а *m.* 3. рэгуля́рная авіятра́нспартная слу́жба
– v.t. 1. перавозіць ло́дкай, паро́мам або́ парапла́вам. 2. перавозіць самалётам. 3. рабіць даста́ўкі самалётам
– v.i. пераплыва́ць праз раку́ паро́мам *або́* ло́дкай

ferryboat [ˈferɪboʊt] n. паро́м -у *m.*, ло́дка *або́* вадапла́ў для перавозу праз раку́

fertile [ˈfɜ:rtəl] adj. 1. урадлі́вы (*гле́ба, год*); пло́дны. 2. Biol. апло́днены; апы́лены: ***fertile eggs*** апло́дненыя я́йкі 3. бага́ты; пладаві́ты (*на ідэ́і*); тво́рчы; жыватво́рчы

fertility [fərˈtɪləti] n. 1. урадлі́васьць *f.* 2. пло́днасьць, пладавітасьць *f.* 3. плённасьць, пладаві́тасьць *f.* (*тво́рчая*) 3. пло́днасьць *f.* (*фізы́чная*)

fertilization [ˌfɜ:rtələˈzeɪʃən] n. 1. угно́йваньне, угнае́ньне *n.* 2. апладне́ньне *n.*

fertilize [ˈfɜ:rtəlaɪz] v.t. 1. угно́йваць (*зямлю́*). 2. Biol. апладня́ць

fertilizer [ˈfɜ:rtəlaɪzər] n. угнае́ньне *n.*, гно́й -ю *m.*

fervent [ˈfɜ:rvənt] adj. 1. па́лкі (*пачуцьцё*), палымя́ны, шчы́ры. 2. гара́чы. распа́лены

fervor, Brit. **fervour** [ˈfɜ:rvər] n. 1. гара́чнасьць, палымя́насьць *f.* 2. вялі́кая гарачыня́

fester [ˈfestər] – v.i. 1. гнаі́цца (*пра ра́ну*), гнаі́цца (*пра во́чы*). 2. гнісьці́, гніць. 3. разьвярэ́джвацца (*пра крыўду, боль*) – v.t. 1. выклі́каць гнаёньне *або́* запале́ньне. 2. му́чыць, грызьці́, разьвярэ́джваць (*ра́ну, крыўду*)

festival [ˈfestɪvəl] n. сьвя́та, сьвяткава́ньне *n.*; урачы́стасьць *f.*, фэсты-ва́ль -ю *m.*

festive [ˈfestɪv] adj. сьвятó́чны, урачы́сты; вясёлы, ра́дасны

festively [ˈfestɪvli] adv. па-сьвятó́чнаму, урачы́ста; ра́дасна

festivity [fesˈtɪvəti] n., pl. **-ties** 1. урачы́стасьці. 2. гуля́ньне, заба́ва; весялó́сьць. 3. фэстыва́ль -ю *m.*

fetch [fetʃ] – v.t. 1. прыно́сіць, прывó-зіць (*во́зам, а́ўтам*), прывó́дзіць (*пехато́й*). 2. атры́маць, выручы́ць: ***to fetch a good price*** прада́ць за до́брую цану́. 3. Informal узя́ць; адхапі́ць – v. адшу́кваць і прыно́сіць забі́тую дзічыну́ (*пра саба́ку*)
• ***fetch a breath*** аддыхацца
• ***fetch a groan*** застагна́ць
• ***fetch example*** браць прыклад

fetish [ˈfetɪʃ] n. 1. фэты́ш -у *m.*, стó́дзіва *n.*, і́дал -а *m.* 2. амуле́т, талісма́н -а *m.*

fetter [ˈfetər] – n. 1. кайданы́, кайда́ны *pl. only*; пу́ты *pl. only* (*на но́гі*). 2. усё, што абмяжо́ўвае свабо́ду – v.t. 1. зако́ўваць (*но́гі ў кайданы́*). 2. зьвя́зваць, зьнявó́льваць

fetus [ˈfi:təs] n. зарóд|ак -ку *m.*

feud I [fju:d] – n. 1. варóжасьць (*до́ўгая сьмяро́тная*). 2. сва́рка *f.*; няспы́нныя нелады́, змага́ньне – v.i. сьмяро́тна варагава́ць

feud II [fju:d] n. лен -у *m.*, фэўда́льнае ўлада́ньне, фэўда́льны маёнтак

feudal [ˈfju:dəl] adj. 1. фэўда́льны. 2. які́ варагу́е, варóжы

feudalism [ˈfju:dəlɪzəm] n. фэўда́льны лад, фэўдалі́зм -у *m.*

feudalist [ˈfju:dəlɪst] n. фэўда́л -а *m.*, прыхі́льнік фэўдалізму

fever [ˈfi:vər] – n. 1. гара́чка *f.* 2. ліхама́нка *f.* 3. хварóба: ***scarlet fever*** шкарлятына *f.*; ***typhoid fever*** тыфус, тыф; ***yellow fever*** жóўтая ліхама́нка. 4. захапле́ньне *n.*, аза́рт -у *m.*; мóцнае ўзру́шаньне – v.t. кіда́ць у жар, паліць гара́чкай – v.i. мець гара́чку

fevered [ˈfi:vərd] adj. 1. які́ ма́е гара́чку, з гара́чкай. 2. гара́чкавы, ліхама́нкавы; усхвалява́ны; няўры́мсьлівы

feverish [ˈfi:vərɪʃ] adj. 1. а) які́ ма́е невялі́кую гара́чку. б) у гара́чцы. 2. вы́кліканы гара́чкай, гара́чкавы: ***feverish thirst*** гара́чкавая сма́га. 3. ліхама́нкавы, гара́чкавы; неспако́йны: ***feverish haste*** ліхама́нкавы сьпе́х

few [fju:] – adj. нешматлі́кі, няшма́т, ма́ла: ***His friends are few*** У яго́ няшма́т сяброў; ***in a few words*** ко́ратка, у ко́лькіх сло́вах – n. мала́я ко́лькасьць, ня шмат хто
• ***quite a few***, Informal дово́лі шмат
• ***the few*** ме́ншасьць *f.*

fiancé [fi:ɑ:nˈseɪ] n. нарачо́н|ы -ага *m.*

fiancée [fi:ɑ:nˈseɪ] n. нарачо́ная *f.*

fiasco [fiˈæskou] n., pl. **-cos** or **-coes** по́ўная няўда́ча, права́л -у *m.*

fib [fɪb] – n. хлусьня́ *f.*; мана́, няпра́ўда *f.* (*малава́жная*) – v.i. (**-bb**) хлусіць, маніць, каза́ць няпра́ўду

fiber [ˈfaɪbər] n. 1. валакно́ *n.*; фі́бра *f.*: ***hemp fiber*** канапля́нае валакно́. 2. ні́тка *f.* 3. хара́ктар -у *m.*, нату́ра *f.* (*чалаве́ка*). 4. Bot. то́нкія карэ́нчыкі расьлі́наў

fibered or **fibred** [ˈfaɪbərd] adj. валакні́сты

fiberglass [ˈfaɪbərglæs] n. шкловалакно́ *n.*

fibroid [ˈfaɪbrɔɪd] – adj. валакні́сты, валакні́стае будо́вы – n. род пухлі́ны

fickle [ˈfɪkəl] adj. зьме́нлівы, няўсто́йлівы; наста́лы, капры́зны: ***fickle fortune*** зьме́нлівае шча́сьце; ***a fickle friend*** наста́лы ся́бра

fickleness ['fɪkəlnəs] n. нястáласьць, зьмéнлівасьць *f.*

fiction ['fɪkʃən] n. 1. прóза *f.*, мастáцкая літаратýра, бэлетрыстыка *f.*: ***works of fiction*** рамáны, апóвесьці. 2. выдумка, фантáзія *f.* 3. прыдýманая гістóрыя

fictitious [fɪk'tɪʃəs] adj. 1. несапрáўдны, прыдýманы, уяўлены, фіктыўны. 2. ашукáнскі, хлусьлівы, фальшывы, зьмéнены (*імя́*): ***The criminal used a fictitious name*** Злачы́нец меў выдуманае імя́

fiddle ['fɪdəl] – n. 1. Informal скрыпка *f.*: ***to play second fiddle*** граць другýю скрыпку, адыгрываць другарáдную рóлю. 2. Sl. ашукáнства *n.*, хітрасьць *f.*

– v.i. 1. Informal іграць на скрыпцы. 2. круціць у рукáх: ***The embarrassed boy fiddled with his hat*** Засарóмлены хлапéц мяў у рукáх шáпку

• ***fiddle away*** змарнавáць, прагультáіць

fiddler ['fɪdlər] n. скрыпáч -á *m.*

fiddlestick ['fɪdəlstɪk] n. 1. смык -á *m.* 2. лýхта, драбніца *f.*

fidelity [fɪ'delətɪ] n., pl. **-ties** 1. вéрнасьць, аддáнасьць, ляя́льнасьць *f.* 2. дакладнасьць, старáннасьць *f.* (*у выкóнваньні абавя́зкаў*). 3. дакладная згóднасьць (*як у кóпіі*). 4. дакладнасьць (*інструмэ́нту, рáдыё*)

fidget ['fɪdʒət] – v.i. тýрзацца, неспакóйна круціцца.

– v.t. тýрзаць, нэрвавáць

– n. 1. нэрвóвы неспакóй. 2. мітусьлівы, неспакóйны чалавéк, непасéдла -ы *m. & f.*

fidgety ['fɪdʒətɪ] adj. неспакóйны; непасéдлівы, мітусьлівы

fief [fi:f] n. фэўдáльнае ўладáньне, зямля́, лен -у *m.*

field [fi:ld] – n. 1. пóле *n.*, луг -у *m.* 2. а) пляцóўка *f.* (*спартóвая абó íншая*). б) пóле *n.*, пляц -у *m.*, мéсца *n.*: ***a flying field*** лётнішча; ***the gold fields*** капáльні зóлата; ***the coal fields*** вýгальны басэ́йн. 3. а) пóле бітвы́. б) бíтва *f.* 4. галінá *f.*, пóле дзéйнасьці: ***the field of politics*** галінá палíтыкі

– adj. 1. палявы́: ***field hospital*** палявы́ шпіталь. 2. баявы́: ***a field operation*** баявáя апэрáцыя

• ***take the field*** распачáць бíтву, гульнюó, агітáцыю

field events спабóрніцтва (*у лёгкай атлéтыцы: скóкі, кíданьне*)

field glass or **glasses** палявы́ бінóкль

field marshal фэльдмáршал -а *m.*

field officer штаб-афіцэ́р (*ад маёра да палкóўніка*)

field work, Geol. палявы́я рабóты, разьвéдка; зьбіráньне вéстак (*статы́стыка, вывучэ́ньне грамáдзкай дýмкі*)

fiend [fi:nd] n. 1. нячы́ст|ы -ага *m.*, нячы́сьцік -а *m.*; чорт, чартá *m.*, д'я-бл|ал -ла *m.* 2. Informal чалавéк, які́ ўцягнýўся ў нéшта благóе: ***dope fiend*** наркамáн абó наркóтык -а *m.*, вы́люд|ак -ка *m.* (*лю́ты чалавéк*)

fiendish ['fi:ndɪʃ] adj. чартóўскі; д'я-бальскі, сатанíнскі, вéльмі лю́ты *абó* злы; ліхадзéйны

fierce [fɪrs] adj. 1. дзíкі (*пра зьвярá*). 2. гвалтóўны; шалёны (*вéцер*); бязьлітасны: ***a fierce attack*** гвалтóўны напáд. 3. старáнны, настóйлівы: ***fierce efforts to get ahead*** старáнныя, настóйлівыя намагáньні зрабíць кар'éру. 4. Sl. вéльмі благí, непрыéмны

fieriness ['faɪərɪnəs] n. 1. пáлкасьць *f.* 2. запальчы́васьць, гарáчнасьць *f.*

fiery ['faɪərɪ] adj. 1. распáлены, мóцна нагрэ́ты, гарáчы (*пра печ*). 2. напáлены; агнíсты, бліскýчы (*пра вóчы*): ***a fiery red*** агнíстая чы́рвань. 3. пáлкі, гарáчы: ***a fiery speech*** пáлкая прамóва. 4. гарáчы, запáльчывы: ***a fiery temper*** запáльчывы харáктар. 5. лёгкі на загарáньне (*пра газ*). 6. Med. запáлены струп, бóлька *f.*: ***a fiery sore*** запáленая рáнка

fiesta [fɪ'estə] n. 1. фэст -у, фэстывáл|ь -ю *m.* 2. сьвя́та *n.*; урачы́стасьць *f.*

fifteen [ˌfɪfˈti:n] n. пятна́ццаць
fifteenth [ˌfɪfˈti:nθ] – adj. 1. пятна́ццаты – n. пятна́ццатая ча́стка
fifth [fɪfθ] – adj. 1. пя́ты. 2. які́ ёсьць пя́тай ча́сткай – n. 1. пя́т|ы -ага *m.*, пя́тая *f.* 2. пя́тая ча́стка: ***two fifths*** дзьве пя́тыя
fiftieth [ˈfɪftiəθ] – adj. 1. пяцьдзяся́ты – n. пяцьдзяся́тая ча́стка
fifty [ˈfɪfti] n., pl. **-ties** пяцьдзяся́т: ***fifty-five*** пяцьдзяся́т пяць
fifties, the [ˈfɪftiz] 1. пяцьдзяся́тыя гады́ (*стаго́дзьдзя*). 2. шо́сты дзяся́так (*чалаве́чага ве́ку*)
fig I [fɪg] n. 1. фі́га *f.* (*плод і дрэ́ва*). 2. ***I don't care a fig for your opinion*** начха́ць мне на тваю́ ду́мку
fig II [fɪg] – n., Informal 1. убо́р -у *m.*, стро́і *pl.*, убра́ньне *n.* 2. стан -у *m.*; фо́рма -*f.*: ***in full fig*** у по́ўным убо́ры *або́* рышту́нку – v.t. (**-gg-**) убіра́ць, выстро́йваць
fight [faɪt] – n. 1. змага́ньне *n.*; бо|й -ю *m.*, бі́тва *f.*, бо́йка *f.* 2. зва́да *f.*; сва́рка *f.*, спрэ́чкі *pl.* – v., **fought, fighting** змага́цца; бі́цца • ***fight back*** супраціўля́цца, адбіва́цца
fighter [ˈfaɪtər] n. 1. змага́р -а́ *m.*, барацьбі́т -а́ *m.* 2. баксёр -а *m.* 3. самалёт-зьнішча́льнік
figuration [ˌfɪgjəˈreɪʃən] n. 1. фо́рма *f.*; абры́с, ко́нтур -у *m.* 2. фармава́ньне *n.*, надава́ньне фо́рмы, афармле́ньне *n.* 3. арнамэнта́цыя *f.*
figurative [ˈfɪgjərətɪv] adj. 1. фігура́льны (*сло́ва, паэ́зія*), перано́сны (*значэ́ньне сло́ва*). 2. сымбалі́чны
figuratively [ˈfɪgjərətɪvli] adv. у перано́сным сэ́нсе
figure [ˈfɪgjər] – n. 1. лі́чба: ***Arabic figures and Roman figures*** ара́бскія й ры́мскія лі́чбы. 2. ко́лькасьць, ва́ртасьць *f.*, кошт -у *m.* 3. Geom. фігу́ра *f.*, це́ла *n.* 4. фігу́ра *f.*, стан -у *m.*, по́стаць, буда́ва *f.*, вы́гляд -у *m.* (*чалаве́ка*). 5. фо́рма *f.*, абры́с -у *m.* 6. вы́да́тная асо́ба, фігу́ра *f.* (*у гісто́рыі*), хара́ктар -а *m.* (*у рама́не*). 7. во́браз -у *m.*: ***figure of perfection*** во́браз даскана́ласьці. 8. малю́н|ак -ку *m.*, дыягра́ма, ілюстра́цыя *f.* 9. узо́р -у *m.* (*на тканіне*). 10. сы́мбал|ь -ю *m.*, эмбле́ма *f.*
– v.t. 1. падлі́чваць; вылі́чваць. 2. абазнача́ць лі́камі. 3. перадава́ць, пака́зваць, адлюстро́ўваць, ілюстрава́ць. 4. аздабля́ць, упрыго́жваць, убіра́ць (*фігу́рамі, узо́рам або́ арнаме́нтам*). 5. сымбалізава́ць. 6. Informal ду́маць, меркава́ць. 7. уяўля́ць сабе́
– v.i. 1. лічы́ць, рахава́ць. 2. займа́ць ме́сца (*у гісто́рыі*), фігурава́ць
• ***a figure of speech*** рытары́чная фігу́ра мо́вы (*мэта́фара, параўна́ньне, гіпэ́рбала*)
• ***figures*** лічэ́ньне *n.*, арытмэ́тыка *f.*
figure on Informal лічы́ць, разьлі́чваць на *каго́-што*, здава́цца; спадзява́цца на *каго́-што*
figure out 1. падлі́чваць, вылі́чваць. 2. разуме́ць, дахо́дзіць; даду́мвацца
figure skating фігу́рнае ката́ньне на канька́х
filament [ˈfɪləmənt] n. ні́тка, ні́тачка *f.*, дро́цік -а *m.*
filbert [ˈfɪlbərt] n. ляшчы́навы арэ́х
filch [fɪltʃ] v.t. скра́сьці (*не́шта мало́е*), сьцягну́ць
file I [faɪl] – n. 1. картатэ́ка *f.* (*збор ка́ртак або́ скры́нка, у яко́й яны́ трыма́юцца*). 2. падшы́тыя а́кты, папе́ры; па́пка *f.* 3. рад -у *m.*, *pl.* ралы́; шарэ́нга, лінэ́йка *f.*
– v.t. 1. адкладза́ць *або́* падшыва́ць (*папе́ры, дакумэ́нты*), рэгістрава́ць. 2. перадава́ць у архі́ў
– v.i. 1. маршырава́ць *або́* ісьці́ цу́гам (*адзі́н за адны́м*). 2. падава́ць (*зая́ву, дакумэ́нт*): ***to file charges*** пада́ць абвінава́чаньне на *каго́*
• ***in file*** у рад (*адзі́н за адны́м*), цу́гам, ланцуго́м, ланцужко́м
• ***keep on file*** мець на ўлі́ку, у картатэ́цы
file II [faɪl] – n. напі́льнік -а *m.*

– v.t. падпілóўваць

filibuster ['fɪlɪbʌstər] n. 1. флібуст'ép -а *m.* 2. абстрýкцыя *f.* (*у парля́мэнце*). 3. абструкцыяні́ст -а *m.*

filing cabinet ша́фа, ша́фка з шуфля́дамі для картатэ́кі, дакумэ́нтаў; шуфля́днік -а *m.*

filings ['faɪlɪŋz] n., pl. пілавíньне (*асабл. мэталёвае*)

fill [fɪl] – v.t. 1. напаўня́ць; запаўня́ць (*за́лю, час*): ***The crowd filled the hall*** Натóўп запóўніў за́лю. 2. задавóльваць (*сма́гу, патрэ́бы*); кармíць. 3. выкóнваць замóвы (*прадпіса́ньне ле́кара*). 4. плямбава́ць (*зуб*). 5. займа́ць (*паса́ду, станóвішча*): ***to fill a diplomatic post*** займа́ць дыпляматы́чную паса́ду. 6. рыхтава́ць лек (*павóдле рэцэ́пту*). 7. (*пра ве́цер*) надзіма́ць (*ве́тразі*). 8. засыпа́ць; закіда́ць (*я́му, роў пяскóм*). 9. фальшава́ць, падрабля́ць

– v.i. напаўня́цца, запаўня́цца

– n. дастаткóвая кóлькасьць: ***one's fill*** удóсыць, увóлю; ***to eat (to drink, weep) one's fill*** наéсьціся (напíцца, напла́кацца) удóсыць, увóлю. 3. жвір -у *m.*, каме́ньне (*для засыпа́ньня*)

• ***fill in*** а) зама́заць (*расшчэ́піну*). б) напóўніць *чым*; уста́віць (*да́ту ў зая́ве*)

• ***fill in the time*** займа́цца чым-н. у вóльны час, ба́віць час

• ***fill out*** а) напаўня́ць, надзіма́ць (*шы́ны павéтрам*). б) патаўсьцéць, пакруглéць, папра́віцца: ***Her cheeks have filled out*** Ейныя шчóкі пакруглéлі. в) запаўня́ць (*анкéту*)

• ***fill up*** ца́лкам запóўніць, напóўніць, засы́паць, закíдаць (*пяскóм я́му, бак бэнзы́нам*)

filled [fɪld] adj. 1. пóўны, напóўнены; ахóплены, апа́наваны (*ра́дасьцю*). 2. з начы́нкай, з дамéшкай

fillet ['fɪlɪt] – n. 1. стýжка *f.*, вýзкая павя́зка на галавý. 2. вýзкая палóска з мэта́лу ці íншага матэрыя́лу. 3. філé, *indecl.*, *n.* (*ры́бнае, мяснóе*)

– v.t. 1. завя́зваць на галавý павя́зку. 2. рабíць філé з ры́бы, мя́са

filling ['fɪlɪŋ] n. 1. начы́нка *f.* 2. плёмба *f.* (*у зýбе*). 3. Textile утóк -у *m.*

filling station бэнзы́навая калёнка

fillip ['fɪlɪp] – v.t. 1. пстры́каць. 2. кíдаць. 3. узбуджа́ць, пабуджа́ць; ажыўля́ць

– v.i. дава́ць пстры́чку

– n. 1. пстры́чка *f.* 2. узбуджа́льнік -а *m.* (*апэты́ту*)

film [fɪlm] – n. 1. абалóнка *f.*, тóненькае пóкрыва, пласт -у *m.*; эмýльсія *f.* 2. стýжка *f.*; фатаграфíчная стýжка. 3. кінастýжка *f.*; фільм -у *m.* 4. перапóнка *f.* 5. далікáтная тканíна. 6. цьмя́насьць уваччý (*ад сьлёзаў*)

– v. 1. пакрыва́ць (-ца), зацьмява́ць (-ца) (*пра вóчы ад сьлёзаў*). 2. фільмава́ць, здыма́ць на стýжку, накрýчваць на стýжку

filmy ['fɪlmi] adj. 1. цянюткі. 2. невыра́зны, затума́нены

filter ['fɪltər] – n. фíльтар -ра *m.*

– v.t. фільтрава́ць; цадзíць, працэджваць

– v.i. прасóчвацца

filth [fɪlθ] n. 1. бруд -у *m.*, адкíды *pl.*, сьмéцьце *n.* 2. непрыстóйныя слóвы *або́* дýмкі; нікчэ́мнасьць *f.*, мара́льны бруд, мара́льная сапсава́насьць, разбэ́шчанасьць *f.*

filthy ['fɪlθi] adj. 1. а) бры́дны; агíдны. б) нячы́сты, запэ́цканы: ***filthy hands*** запэ́цканыя рýкі. 2. мара́льна гнілы́; нікчэ́мны; непрыстóйны, бры́дкі (*слóвы*); бры́дны: ***a filthy story*** бры́дная гістóрыя

filtrate ['fɪlreɪt] – n. ва́дкасьць, прапýшчаная празь фíльтар, фільтра́т -у *m.*

– v. фільтрава́ць

fin [fɪn] n. 1. пла́ўнік -а *m.* (*у ры́бы*). 2. кíль -я *m.* (*у самалёце*)

final ['faɪnəl] – adj. 1. апóшні. 2. канчаткóвы (*мэ́та*); беспаваротны, канча́льны (*пастанóва*): ***final result*** канчаткóвы вы́нік

– n. 1. апóшні, канцавы́ (*экза́мен*). 2. фіна́л -у *m.* (*у спóрце*)

finally ['faɪnəli] adv. 1. нарэ́шце, урэ́шце: ***they came finally*** яны́ нарэ́шце пры-

йшлі́. 2. канча́льна, канчатко́ва: ***to conquer finally*** канча́льна перамагчы́

finance [ˈfaɪnæns] – n. грашо́выя спра́вы, фіна́нсы *pl.only*: ***public finance*** дзяржа́ўная фіна́нсавая гаспада́рка
– v.t. [fəˈnæns] 1. фінансава́ць. 2. кірава́ць фіна́нсамі
– v.i. ве́сьці фіна́нсавыя апэра́цыі

financial [fəˈnænʃəl] adj. грашо́вы; фіна́нсавы

financier [ˌfɪnənˈsɪr] – n. фінансі́ст -а *m.*
– v.t. 1. фінансава́ць. 2. кірава́ць фіна́нсамі
– v.i. займа́цца фіна́нсавымі апэра́цыямі

finch [fɪntʃ] n. берасьця́нка *f.* (*пту́шка*)

find [faɪnd] – v., **found, finding** 1. знахо́дзіць; адшу́кваць. 2. выяўля́ць; ба́чыць; лічы́ць; адчува́ць; заўважа́ць: ***We found that he could not swim*** Мы пабачылі, што ён ня ўме́е пла́ваць; ***We find the prices high*** Мы ўважа́ем, што цэ́ны высо́кія; ***He found that he was growing sleepy*** Ён адчу́ў, што засына́е. 3. дахо́дзіць; трапля́ць: ***Water finds its level*** Вада́ дайшла́ да свайго́ ўзро́ўню. 4. Law прызнава́ць; устанаўля́ць (*віну́*)
– n. 1. адкрыцьцё *n.* 2. вялі́кая ва́ртасная зна́хадка
• ***find oneself*** а) знайсьці сябе́ (*сваё здо́льнасьці, схі́льнасьці*). б) апыну́цца; знайсьці́ся; тра́піць: ***He found himself in a dilemma*** Ён апыну́ўся пе́рад дыле́май
• ***find out*** дове́дацца; пазнава́ць; адкрыва́ць

finding [ˈfaɪndɪŋ] n. 1. знахо́джаньне *n.* (*працэ́с*), адкрыцьцё *n.* 2. знахо́дка *f.* (*вы́нік*). 3. Law пастано́ва, вы́несеная пасьля́ дасьле́даваньня спра́вы

fine I [faɪn] – adj. 1. высакая́касны, ве́льмі до́бры, даскана́лы, выда́тны, фа́йны. 2. ачы́шчаны, высакапро́бны (*пра зо́лата*). 3. ве́льмі дро́бны *або́* то́нкі; даліка́тны: ***fine lace*** то́нкія кару́нкі; ***fine skin*** даліка́тная ску́ра. 4. во́стры: ***a fine edge*** во́страе лязо́. 5. то́нкі: ***fine distinction*** то́нкае адро́зьненьне. 6. прыго́жы; згра́бны (*чалаве́к*); вы́танчаны (*пра стыль мо́вы*). 7. харо́шы, паго́дны (*пра надво́р'е*). 8. кваліфіка́ваны (*наста́ўнік*)
– adv., Informal фа́йна, выда́тна

fine arts выяўле́нчае маста́цтва, прыго́жыя маста́цтвы.

fine II [faɪn] – n. штраф -у *m.*
– v.t. штрафава́ць; накла́даць штраф на *каго́*

finely [ˈfaɪnli] adv. 1. ува́жна, дакла́дна; руплі́ва. 2. элега́нтна: ***a finely dressed woman*** элега́нтна апра́нутая жанчы́на

fineness [ˈfaɪnnəs] n. 1. то́нкасьць *f.* (*лі́ніі, ні́ткі, дро́ту, іго́лкі*). 2. вастрыня́, *f.* 3. лагі́днасьць, я́снасьць *f.* (*надво́р'я*). 4. дабрая́каснасьць, даскана́ласьць *f.* (*матэрыя́лаў*). 5. прапо́рцыя чы́стага зо́лата *або́* сро́бра (*у спла́ве*)

finger [ˈfɪŋgər] – n. 1. па́л|ец -ьца *m.* (*рукі́ і пальча́ткі*): ***little finger*** ме́зен|ец -ца *m.* 2. стрэ́лка (*гадзі́ньніка, прыла́ду*)
– v. 1. дакрана́цца па́льцамі. 2. гра́ць па́льцамі на інструме́нце. 3. кра́сьці (*што-н. мало́е*), сьцягну́ць. 4. Sl. пака́зваць на *каго́*; выдава́ць *каго́*; здра́джваць *каму́*
• ***burn one's fingers*** патра́піць у бяду́, ле́зучы не ў сваё
• ***have a finger in the pie*** а) мача́ць па́льцы, удзе́льнічаць у чым-н. б) мяша́цца; перашкаджа́ць
• ***twist around one's (little) finger*** абве́сьці вако́л па́льчыка

finger alphabet альфабэ́т глуханямы́х

finger board 1. грыф -а *m.* (*скры́пкі, гіта́ры*). 2. клявіяту́ра *f.* (*піяні́на, арга́наў*)

fingerprint [ˈfɪŋgərprɪnt] n. адбі́так па́льца

fingertip [ˈfɪŋgərtɪp] n. ко́нчык па́льца: ***at one's fingertips*** а) до́бра ве́дамы. асьвядо́млены. б) пад рукі́й

finish [ˈfɪnɪʃ] – v.t. 1. канча́ць. 2. зака́нчваць (*вучо́бу, будо́ўлю*). 3. спажы-

ва́ць да канца́; даяда́ць; дапіва́ць (*да канца́*). 4. Informal а) змардо́ўваць, змо́рваць. б) дабіва́ць; дако́нваць; дака́нчваць. 5. апрацо́ўваць (*ру́капіс*); выгла́джваць (*паве́рхню*), выраўно́ўваць. 6. дапаўня́ць адука́цыю
– v.i. 1. канча́цца. 2. Obsol. паміра́ць
– n. 1. заканчэ́ньне *n.*, канле́ц -ца́ *m.* 2. даскана́ласьць, зако́нчанасьць *f.* 3. апрацо́ўваньне *n.* (*тканіны*), апрацо́ўка *f.* (*тэ́ксту*); адстро́йваньне *n.* (*до́му, кватэ́ры*) і матэрыя́л ужыва́ны для гэ́тага

• ***finish off*** а) зако́нчыць. б) змардава́ць; зьні́шчыць; дабі́ць; дако́нчыць; дасканаа́ць

• ***finish up*** а) зако́нчыць (*пра́цу*). б) ужы́ць да канца́

• ***finish with*** а) спыні́ць, не праця́гваць. б) парва́ць сяброўства з *кім*

finished ['fɪnɪʃt] adj. 1. ско́нчаны, ко́нчаны. 2. зако́нчаны, гато́вы. 3. даскана́лы, беззага́нны. 4. адпалі́раваны, гла́дкі

Finn [fɪn] n. фін -а *m.*, фі́нка *f.*, жыха́р Фінля́ндыі

Finnish ['fɪnɪʃ] – adj. фі́нскі
– n. фі́нская мо́ва

Finno-Ugrian [ˌfɪnoʊ'ju:griən] or **Finno-Ugric** [ˌfɪnoʊ'ju:grɪk] – adj. фі́на-вуго́рскі
– n. фі́на-вуго́рская сям'я́ мо́ваў

fir [fɜ:r] n. пі́хта *f.*; яло́ва, е́лка *f.*, е́лачка *f., dim.*

fir apple or **fir cone** ялло́вая шы́шка

fire ['faɪr] – n. 1. агло́нь -ню́ *m.*, по́лымя *n.*: ***to light the fire*** запалі́ць у пе́чы. 2. пажа́р -у *m.* 3. запа́л, уздыі́м -у *m.*; натхне́ньне *n.*; па́лкасьць, палымя́насьць, жва́васьць *f.*: ***full of patriotic fire*** по́ўны патрыятычнага запа́лу. 4. пяку́чы боль, ліхама́нка *f.*; запале́ньне *n.* 5. Milit. агло́нь -ню́ *m.*, стральба́ *f.*; абстрэ́л -у *m.* 6. закі́дваньне (*пыта́ньнямі, крыі́тыкай*)
– v.t. 1. запа́льваць (*дро́вы*), падпа́льваць (*дом*). 2. палі́ць у пе́чы. 3. абпа́льваць (*керамі́чныя вы́рабы, цэ́гла*). 4. сушы́ць (*гарба́ту, тыту́нь*). 5. узбуджа́ць, распа́льваць (*фанта́зію*). 6. страля́ць, палі́ць (*за́лпам*). 7. Informal кіда́ць (*ка́менем*). 8. Informal звальня́ць (*з пра́цы*)
– v.i. 1. загара́цца (*агнём, зло́сьцю, энтузія́змам*). 2. страля́ць (*са стрэ́льбы, гарма́ты*). 3. абпа́львацца (*як цэ́гла*)

• ***be under fire*** а) быць пад варо́жым абстрэ́лам. б) быць прадме́там напа́дак *або́* абвінава́чаньняў

• ***between two fires*** памі́ж двух агнёў

• ***catch fire*** а) загарэ́цца, заня́цца агнём. б) запалі́цца (*энтузія́змам*)

• ***fire off*** вы́пусьціць (*раке́ту або́ касьмі́чны карабе́ль*)

• ***fire up*** а) распалі́ць кіпяці́льнік, печ. б) узлава́цца, ускіпе́ць. в) пусьці́ць машы́ну, прыве́сьці ў рух машы́ну

• ***go through fire and water*** прайсьці агóнь, ваду́ й ме́дныя тру́бы

• ***lay a fire*** раскла́сьці агóнь або́ во́гнішча

• ***on fire*** а) у агні́; б) по́ўны запа́лу

• ***play with fire*** гуля́ць з агнём

• ***set fire to*** падпа́льваць

• ***set on fire*** а) падпалі́ць. б) захапі́ць

fire alarm 1. пажа́рная трывóга. 2. аўтаматы́чны пажа́рны сыгна́л

firearms ['faɪrɑ:rmz] n., pl. па́льная зброя

firebrand ['faɪrbrænd] n. 1. ахо́пленая полымем галаве́шка. 2. бунта́р -а́ *m.*, баламу́т, інтрыга́н -а *m.*

firebrick ['faɪrbrɪk] n., pl. **-s** or coll. **-brick** во́гнетрыва́лая цэ́гла

fire department аддзе́л пажа́рнай ахо́вы

fire engine пажа́рная машы́на

fire fighter 1. пажа́рнік -а *m.* 2. асо́ба, яка́я змага́ецца з лясны́мі пажа́рамі

firehouse ['faɪrhaʊs] n. пажа́рнае дэпо́, пажа́рная *f.*

fireman ['faɪrmən] n., pl. **-men** 1. пажа́рнік -а *m.* 2. качага́р -а *m.*

fireplace ['faɪrpleɪs] n. камі́н -а *m.*

fireproof ['faɪrpru:f] adj. 1. во́гнетрыва́лы. 2. незага́льны (*сэйф*)

fire screen камі́нны экра́н, засло́нка
firewood ['faɪrwʊd] n. дро́вы *pl. only*
fireworks ['faɪrwɜ:rks] n., pl. 1. фэервэ́рк -у *m.* 2. Informal фэервэ́рк сло́ваў, бу́рная крыкліва́я спрэ́чка
firing ['faɪrɪŋ] n. 1. стральба́, страляні́на *f.*; стрэл -у *m.* 2. абпа́льваньне *n.* (*керамі́чных вы́рабаў, цэ́глы*). 3. Med. прыпяка́ньне *n.* (*ра́ны*). 4. апа́л -у *m.*
firm I [fɜ:rm] – adj. 1. тугі́, цьвёрды, цьвярды́; мо́цны: ***firm ground*** цьвёрды грунт; ***firm land*** су́ша *f.*; сухазе́м'е *n.*; ***firm muscle*** тугі́ му́скул. 2. мо́цны, непахі́сны (*ве́ра, надзе́я*): ***firm decision*** непахі́сная пастано́ва; ***a firm step*** цьвёрды крок, цьвёрдая хада́. 3. нава́жаны; рашу́чы (*ме́ры*); станаўкі́, стано́ўкі; насто́йлівы (*хара́ктар*). 4. ста́лы (*пра цэ́ны*)
– v.t. 1. умацо́ўваць, мо́цна трыма́ць. 2. убіва́ць, уто́птваць; утрамбо́ўваць (*ускапа́ную зямлю́*)
– v.i. умацо́ўвацца
firm II [fɜ:rm] n. фі́рма *f.* (*прамысло́вае або́ гандлёвае прадпрыёмства*)
firmness ['fɜ:rmnəs] n. 1. моц *f.* (*жале́за*), трыва́ласьць *f.*, мацу́нлак -ку *m.* (*напо́ю*). 2. вы́трыманасьць *f.* (*хара́ктару*), сі́ла *f.*: ***firmness of spirit*** сі́ла ду́ху; непахі́снасьць, цьвёрдасьць *f.* (*пагля́даў*)
first [fɜ:rst] – adj. 1. пе́ршы. 2. найвышэ́йшы (*го́лас у му́зыцы*): ***in the first place*** перш, найпе́рш; перш-на́перш, спача́тку, у пе́ршую чаргу́; ***(the) first thing*** як мага́ ране́й: ***first thing in the morning*** як мага́ ране́й
– adv. 1. перш; ране́й, найпе́рш: ***First bring (me) the coffee*** Пе́рш прынясі́ мне ка́ву. 2. упершыню́, пе́ршы раз. 3. хутчэ́й, барджэ́й
– n. 1. пе́ршы -ага *m.*, пе́ршая *f.*, *pl.* пе́ршыя. 2. пе́ршае ме́сца ў спабо́рніцтве *або́* ко́нкурсе. 3. пача́так -ку *m.*: ***the first of storm*** пача́так навальні́цы. 4. найвышэ́йшы го́лас *або́* інструмэ́нт, які́ бярэ́ гэ́ты го́лас
• ***at first*** or ***at the first*** спача́тку
• ***from first to last*** ад пе́ршага да апо́шняга
• ***from the first*** ад са́мага пача́тку
first aid пе́ршая дапамо́га
first-aid [ˌfɜ:rst'eɪd] adj. для пе́ршае дапамо́гі: ***first-aid kit*** саніта́рны паке́т
first-born ['fɜ:rstbɔ:rn] – adj. першаро́дны – n. першынле́ц -ца́ *m.* & *f.*, першаро́дная *f.*, пе́ршае дзіця́
first class пе́ршая кля́са (*у цягні́ку́, самалёце*)
first-class [ˌfɜ:rst'klæs] adj. першакля́сны, выда́тнай я́касьці; узо́рны
first cousin стрые́чны брат, стрые́чная сястра́
first finger указа́льны па́лец
first floor ні́жні паве́рх; Brit. другі́ паве́рх
first-hand [ˌfɜ:rst'hænd] adj., adv. зь пе́ршых рук, непасрэ́дна: ***first-hand information*** інфарма́цыя зь пе́ршых рук
firstly ['fɜ:rstli] adv. 1. перш, найпе́рш; перш-на́перш. 2. пе́ршае, па-пе́ршае
first name імя́
first-name ['fɜ:rstneɪm] v.t. называ́ць *ка́го* па і́мі
first-rate [ˌfɜ:rst'reɪt] – adj. 1. першакля́сны, першара́дны: ***of first-rate importance*** першара́днае ва́жнасьці. 2. Informal даскана́лы, ве́льмі до́бры
– adv. ве́льмі до́бра выда́тна
fiscal ['fɪskəl] adj. фіска́льны, фіна́нсавы: ***fiscal year*** бюджэ́тны год
fish [fɪʃ] – n., pl. **fishes**, coll. **fish** 1. ры́ба, ры́біна *f.*: ***fish are biting*** ры́ба то́ргае. 2. Informal чалаве́к -а *m.*, тып -а *m.*: ***an odd fish*** дзіва́к
– v.t. 1. лавіць; ву́дзіць ры́бу; рыба́чыць. 2. знахо́дзіць; выця́гваць
– v.i. 1. лавіць ры́бу. 2. (for) шука́ць (*пад вадо́ю*): ***to fish for pearls*** шука́ць пэ́рлаў (*пад вадо́ю*). 3. (for) напро́швацца (*на камплімэ́нт*)
– adj. 1. ры́бны, ры́бін: ***fish scale*** ры́біна лу́ска; ***fish trade*** ры́бны га́ндаль. 2. рыбало́ўны
• ***fish-and-chips*** Brit. сма́жаная ры́ба са сма́жанай бу́льбай

• ***fish in troubled waters*** лавіць ры́бу ў каламу́тнай вадзе́
• ***fish out*** а) вы́лавіць усю́ ры́бу. б) вы́пыта|ць (*сакрэ́т*), вы́цягнуць (*інфарма́цыю*)
• ***fish soup*** ю́шка *f.*

fish ball or **cake** ры́бная галу́шка *або́* катле́та

fisher ['fɪʃər] n. рыба́к -а́ *m.*

fisherman ['fɪʃərmən] n., pl. **-men** 1. рыба́к -а́ *m.* 2. рыба́цкі чо́вен

fishery ['fɪʃəri] n., pl. **-eries** 1. рыба́цтва *n.* (*як заня́так: ло́ўля або́ гадо́ўля ры́бы*), рыбны́ про́мысел. 2. ры́бнае ме́сца; ме́сца, дзе гаду́юць ры́бу. 3. дазво́л на ры́бную ло́ўлю

fishhook ['fɪʃhʊk] n. кручо́к -ка́ *m.* (*да лёскі*)

fishing ['fɪʃɪŋ] n. 1. ву́джаньне ры́бы; рыбна́я ло́ўля: ***to go fishing*** пайсьці́ на рыба́лку. 2. ме́сца для ло́ўлі ры́бы; ры́бнае ме́сца

fishing ground ры́бнае ме́сца, бага́тае на ры́бу

fishing hole пало́нка ў лёдзе для ло́ўлі ры́бы

fishing line лёска (*да ву́ды*)

fishing rod ву́да *f.*, вудзі́льна *n.*

fishing tackle рыба́цкая снасьць (*ву́ды, се́тка*)

fishless ['fɪʃləs] adj. бязры́бны

fish line лёска (*ву́ды*)

fishmonger ['fɪʃˌmʌŋgər] n. гандля́р ры́бай

fish oil ры́бны тлушч

fishy ['fɪʃi] adj. 1. ры́бны (*пах, смак*); ры́бін; з ры́бы. 2. по́ўны ры́бы, бага́ты ры́бай. 3. Informal няпэ́ўны, непраўдападо́бны; падазро́ны, цёмны: ***a fishy story*** непраўдападо́бная гісто́рыя. 4. цьмя́ны, бяз вы́разу: ***fishy eyes*** цьмя́ныя, невыра́зныя во́чы

fissile ['fɪsəl] adj. 1. распа́длівы, які́ лёгка расшчапля́ецца. 2. здо́льны да я́дзернага распа́ду

fission ['fɪʃən] n. 1. расшчапле́ньне *n.*, падзе́л, распа́д на ча́сткі. 2. Biol. размнажэ́ньне шля́хам дзяле́ньня кле́так. 3. Phys., Chem. расшчапле́ньне а́тамнага ядра́ пры я́дзернай рэа́кцыі

fissionable ['fɪʃənəbəl] adj. распа́длівы, здо́льны да я́дзернага распа́ду

fissure ['fɪʃər] – n. 1. расшчэ́піна, трэ́шчына, раско́ліна *f.*: ***a fissure in a rock*** раско́ліна ў скале́. 2. расшчэ́пліваньне *n.*, дзяле́ньне на ча́сткі. 3. Anat. зьві́ліна *f.* (*у мазга́х*)
– v.t. расшчапля́ць, дзяліць на ча́сткі
– v.i. расшчапля́цца

fist [fɪst] – n. кула́к -а́ *m.*
– v.t. біць кулака́мі, кулако́м

fit I [fɪt] – adj. 1. адпаве́дны; які́ ма́е кваліфіка́цыі; прыго́дны, го́дны, зда́тны, прыда́тны: ***a man fit to be a chairman*** чалаве́к, які́ ма́е зда́тнасьць быць старшынёю; ***Grass is a fit food for cows*** Трава́ прыда́тная для ко́рму каро́вам. 2. пра́вільны, нале́жны, адпаве́дны: ***fit time and place*** адпаве́дны час і ме́сца. 3. гато́вы, падрыхтава́ны, здо́льны: ***I am fit for another mile*** Я магу́ прайсьці́ яшчэ́ мі́лю; ***fit for dispatch*** гато́вы да вы́сылкі. 4. у до́брай фо́рме (*спарто́вец*); у до́брым здаро́ўі; здаро́вы, мо́цны: ***to keep fit*** быць мо́цным, здаро́вым
– v.t. 1. адпавяда́ць *чаму́*, згаджа́цца з *чым*: ***his actions fit his words*** яго́ныя ўчы́нкі згаджа́юцца зь яго́нымі сло́вамі; ***a punishment to fit the crime*** ка́ра, адпаве́дная злачы́нству. 2. пасава́ць: ***The dress fitted Mary*** суке́нка пасава́ла Марыі. 3. дапасо́ўваць; дабіра́ць, падбіра́ць: ***to fit a key in a lock*** падабра́ць ключ да замка́; ***to fit the words to the music*** падабра́ць сло́вы да мэлёдыі. 4. падрыхто́ўваць. 5. забясьпе́чваць, абсталёўваць: ***to fit a store with counters*** пабудава́ць у кра́ме прылаўкі
– v.i. пасава́ць, ляжа́ць: ***The dress fits perfectly*** суке́нка пасу́е дасканала́
– n. 1. дапасо́ўваньне, дабіра́ньне *n.* 2. Mech. прыго́нка *f.*, дапасава́ньне *n.*

fit II [fɪt] n. 1. пры́ступ -у *m.*, прыпа́д|ак -ку *m.*: ***a fainting fit*** абамле́ньне *n.*,

непрыто́мнасьць *f.*; ***a fit of epilepsy (of anger)*** прыступ эпілепсіі (гневу); ***a fit of energy*** (*раптоўны і часовы*) прыплыў энэргіі

fitch [fɪtʃ] n. тхлор -ара́ *m.*, шашло́к -ка́ *m.*

fichet [ˈfɪtʃɪt] or **fitchew** [ˈfɪtʃu:] *гл.* **fitch**

fitful [ˈfɪtfəl] adj. 1. парывісты (*ве́цер*); су́таргавы, нерэгуля́рны, зь перабо́ямі (*гу́тарка, пульс*). 2. мігатлівы: ***fitful gleams*** мігатлівае сьвятло́

fittings [ˈfɪtɪŋz] n., pl. рэ́чы, мэ́бля; асьвятля́льныя прыла́ды

five [faɪv] n. пяць; пяцёра, пяцёх; пяцёрка *f.* (*ка́рта, банкно́т*): ***five children*** пяцёра дзяце́й; ***five sons*** пяцёх сыно́ў

fivefold [ˈfaɪvfould] – adj. 1. пяціразо́вы. 2. які́ ма́е пяць ча́стак
– adv. у пяць разо́ў больш

five thousand пяць ты́сячаў

five-thousandth пяціты́сячны

five times пяцьма́, пяць разо́ў

fix [fɪks] **fixed** or **fixt**, – v.t. 1.замацо́ўваць (*і ў па́мяці*), мо́цна ўмацо́ўваць, убіва́ць (*у зямлю́ кол*). 2. пастанаўля́ць, прызнача́ць (*цану́, да́ту*). 3. прыця́гваць (*ува́гу, по́зірк*), затры́мваць, спыня́ць (*ува́гу, по́зірк*), утаро́пваць, утаро́пвацца. 4. фіксава́ць; замацо́ўваць (*апрацо́ўваць замацава́льнікамі фа́рбу, здыма́к*). 5. ла́дзіць (*чаравікі*); ла́таць, ла́піць (*во́пратку*); цырава́ць (*панчо́хі*); рамантава́ць (*машы́ну, ха́ту*); напраўля́ць папсава́нае. 6. Informal пара́дкаваць, прычэсваць (*валасы́*), папраўля́ць фрызу́ру. 7. Informal рабіць несумле́нную камбіна́цыю: ***to fix a jury*** падкупі́ць прысяжных. 8. Informal по́мсьціць; кара́ць. 9. Chem. згушча́ць; зьвя́зваць. 10. рыхтава́ць; гатава́ць, гатава́ць, вары́ць (*е́жу, по́лудзень*)
– n. 1. цяжко́е, безвыхо́днае *або́* дзіўнае стано́вішча. 2. вызначэ́ньне месцазнахо́джаньня (*самалёта, вадапла́ва*). 3. Sl. а) ха́бар, по́дкуп -у *m.* б) до́за нарко́тыкаў
• ***fix on, upon*** пастанавіць, вы́браць (*да́ту*)
• ***fix up*** Informal а) падпра́віць, зашы́ць (*дзі́рку*), зала́таць; зацыраваць; пала́дзіць паламанае. б) упара́дкаваць (*дом*); ула́дзіць. в) убра́цца

fixation [fɪkˈseɪʃən] n. 1. фіксацыя *f.*, замацо́ўваньне (*фа́рбаў, здымкаў*). 2. Chem. згушчэ́ньне *n.* 3. ма́нія *f.*

fixed [fɪkst] adj. 1. нерухо́мы, нераcóўны, ста́лы, замацава́ны; цьвёрды (*пра цэ́ны*). 2. вы́значаны, акрэ́сьлены; усталява́ны, ста́лы (*пла́та за таксі́*). 3. пі́льны, ува́жлівы; утаро́плены: ***a fixed gaze*** пі́льны, утаро́плены по́зірк. 5. Informal за́гадзя дамо́ўлены (*вы́нік ма́тчу*); змахлява́ны. 6. Chem. зьвя́заны, нелятучы

fixed capital асно́ўны капіта́л (*зямля́, будыні, машыны*)

fixed idea неадчэ́пная ду́мка, ідэ́я фікс

fixity [ˈfɪksəti] n., pl. **-ties** 1. нерухо́масьць; нязьме́ннасьць, трыва́ласьць *f.*; усто́йлівасьць *f.*, моц *f.* 2. ува́жнасьць, пі́льнасьць *f.* (*по́зірку*)

fixture [ˈfɪkstʃər] n. 1. прыла́да, наглу́ха прыро́бленая рэч, прыстасава́ньне, ста́лая ча́стка чаго́-н.: ***bathroom fixtures*** прыла́ды ва́ннага пако́ю; ***lighting fixtures*** асьвятля́льныя прыла́ды. 2. асо́ба *або́* рэч, яка́я застае́цца до́ўгі час на адны́м ме́сцы

fizz [fɪz] – v.i. шыпе́ць
– n. шыпе́ньне *n.*, шыпу́чы напо́й (*як шампа́нскае*)

fizzle [ˈfɪzəl] – v. сла́ба шыпе́ць *або́* пы́рскаць
– n. 1. шыпе́ньне, пы́рсканьне *n.* 2. Informal няўда́ча *f.*; права́л -у *m.*, фіяска, *indecl.*
• ***fizzle out*** зако́нчыцца няўда́чай

fizzy [ˈfɪzi] adj. шыпу́чы (*пра напо́й*)

fjord [fiˈɔ:rd] n. фіёрд -у *m.*

flabbiness [ˈflæbinəs] n. вя́ласьць, абві́сласьць, адві́сласьць *f.*; слабавО́льнасьць, слабахара́ктарнасьць *f.*

flabby [ˈflæbi] adj. 1. адві́слы, абві́слы, мя́ккі; вя́лы (*пра це́ла*): ***flabby cheeks***

адві́слыя шчо́кі. 2. слабы́: ***a flabby nature*** слабы́ хара́ктар

flaccid ['flæksɪd] adj. слабы́, вя́лы; адві́слы (*пра галі́ны*): ***flaccid muscles*** слабы́я, мя́ккія му́скулы; ***a flaccid will*** слаба́я во́ля

flag I [flæg] – n. 1. сьцяг -у *m.* 2 Mus. сьцяжо́к на но́це. 3. ша́пка *f.*, назо́ў газэ́ты (*на тыту́льнай бачы́не*)
– v.t. 1. выве́шваць сьцяг, прыбіра́ць сьцяга́мі. 2. сыгналіза ва́ць *або́* затры́мваць сьцяжко́м (*цягні́к*)
• ***flags*** до́ўгія пёры на нага́х некато́рых пту́шак (*каршуна́, савы́*)

flag II [flæg] n. Bot. каса́ч -а́ *m., pl.* касачы́

flag III [flæg] **(-gg-)** v.i. падупа́сьці, зьвя́нуць; аслабе́ць (*пра запа́л, зацікаў ле́ньне*), рабі́цца неціка́вым

flag IV [flæg] – n. каме́нная плі та́ *f.* (*для бруказа ва́ньня*).
– v.t. **(-gg-)** бруказа ва́ць, выкладза́ць каме́ннымі пліта́мі

flagman ['flægmən] n., pl. **-men** 1. сьцяганóclец -ца *m.* 2. сыгна́льшчык -а *m.* (*на чыгу́нцы, даро́зе*)

flagrant ['fleɪgrənt] adj. 1. абура́льны, скандальны; відаво́чны: ***a flagrant crime*** жахлі́вае злачы́нства; ***a flagrant error*** скандальная памы́лка. 2. ганебны: ***You are an old flagrant liar*** Ты стары́ ганебны манюка

flagstone ['flægstoun] n. 1. каменная плі та́ (*для выкладза́ньня хо́днікаў*). 2. плітня́к -у́ *m.*

flail [fleɪl] – n. цэп -а *m., pl.* цапы́
– v.t. 1. малаці́ць (*збо́жжа*). 2. лупі́ць, бі ць; малаці́ць (*кулака́мі*)

flair [fler] n. 1. то́нкае адчува́ньне, чуцьцё *n.*; нюх -у *m.* (*і ў жывёлы*). 2. здатнасьць, здо́льнасьць *f.*, нахі л -у *m.*: ***artistic flair*** маста́цкае чуцьцё; прыро́джаны та́лент, здатнасьць

flake [fleɪk] – n. 1. луска́, лускавінка; шматло́к, драбло́к -ка́ *m.*: ***a flake of snow*** сьняжы́нка *f.* 2. то́ненькі пласт
– v.t. 1. дзяліць, драбі ць на то́нкія пласты́. 2. адшчапля́ць (*то́нкімі пласта́мі*), адко́лваць (*ад ка́меня*)

– v.i. 1. лу́шчыцца, лупі́цца (*пра фа́рбу*). 2. па́даць камяка́мі (*пра сьнег*)

flam [flæm] n. 1. вы́думка, мана́; і лжа́ *f.* 2. ашука́нства *n.*; махля́рства *n.*

flame [fleɪm] – n. 1. по́лымя *n.*: ***a bright flame*** зы́ркае по́лымя. 2. аго́нь, языкі́ агню́. 3. запа́л -у *m.* (*гне́ву, каха́ньня*); палымя́нае пачуцьцё. 4. Informal прадме́т каха́ньня: ***my old flame*** маё старо́е каха́ньне
– v.i. 1. пала́ць, зы́рка пали́цца; гарэ́ць (*пра шчо́кі*); выбуха́ць агнём, палымне́ць, зіхацэ́ць; разгара́цца: ***Her face flamed with excitement*** Твар у яе́ разгарэ́ўся ад хвалява́ньня. 2. сьвяці́ць, сьвяці́цца; успалы́хваць, шуга́ць (*агнём, зло́сьцю*) ***to flame out*** раптоўна перста́ць дзе́яць (*пра рэакты́ўны рухаві́к*)
• ***flame out, up*** or ***forth*** а) вы́бухнуць, шугану́ць по́лымем. б) вы́бухнуць гне́вам, ускіпе́ць

flaming ['fleɪmɪŋ] adj. 1. які́ пала́е агнём, у агні́: ***a flaming house*** дом у агні́. 2. агні́сты, я́ркі, зы́ркі, палымя́ны: ***flaming eyes*** палымя́ныя во́чы. 3. бурлі́вы, гвалто́ўны, неапанава́ны, гара́чы: ***flaming youth*** бурлі́вая маладо́сьць

flammable ['flæməbəl] adj. гару́чы, запа́льны

flan [flæn] n. 1. адкры́ты піро́г з садавіно́й або́ крэ́мам. 2. кружо́к манэ́ты (*яшчэ́ не адчака́ненай*)

flank [flæŋk] – n. 1. бок -у *m.* (*це́ла жывёліны або́ чалаве́ка*). 2. бакава́я ча́стка мясно́е ту́шы. 3. бок, крыло́ *n.* (*будынка*). 4. схон -у, схіл -у *m.* (*гары́*). 5. Milit. крыло́ *n.* , флянг -у *m.*
– v.t. 1. знахо́дзіцца збо́ку, расьці збо́ку. 2. ісьці́, маршыраваць аба́пал *чаго́*. 3. Milit. а) атакава́ць крыло́ *або́* з крыла́. б) абараня́ць крыло́. 4. (*пра карабе́ль*) паварочвацца бо́кам да хва́ляў

flannel ['flænəl] – n. 1. флянэ́ль *f.* (*мя́ккае сукно́*). 2. флянэ́лька *f.* (*баваўня́ная*)

– adj. флянэ́левы.
– v.t. загó́ртваць, закру́чваць у флянэ́ль; праці́ра́ць (*сро́бра*) флянэ́ляй
flannels а) флянэ́левы гарні́ту́р (*асабл. нагави́цы*). б) баваўня́ная нацэ́льная бялі́зна
flap [flæp] – v.i. **(-pp-)** 1. хіста́ацца; трапята́ць, лапата́ць (*пра сьцягі́ на ве́тры, птушы́ныя кры́лы*). 2. пля́скаць (*і крыло́м*). 3. шлёпаць (*бо́тамі, галёшамі*). 4. пля́скацца ні́цма (*на зямлю́*). 5. маха́ць кры́ламі: ***The large bird flapped away*** Вялі́кая пту́шка адляце́ла, лапо́чучы кры́ламі
– n. 1. лапата́ньне *n.* 2. пля́ск -у *m.*, пляска́ч плескача́ *m.* (*уда́р*). 3. Sl. бу́ча, ля́мант, вэ́рхал -у *m.*
• ***flaps on the pockets*** кла́паны на кішэ́нях
flare [fler] – v.i. 1. успы́хваць; шуга́ць, загара́цца. 2. сьвяці́цца. 3. пашыра́цца клёшам (*пра спадні́цу*)
– v.t. дава́ць сьветлавы́я сыгна́лы
– n. 1. успы́шка *f.* (*сьвятла́*), бліск -у *m.* (*запа́лкі, мала́нкі*) 2. сьветлавы́ сыгна́л. 3. клёш -а *m.* (*спадні́цы*)
• ***flare out*** or ***up*** а) успы́хваць, загара́цца. б) выбуха́ць гнево́м
flash [flæʃ] – n. 1. бліск -у *m.* (*мала́нкі*). 2. про́бліск -у *m.* (*надзе́і, до́сьціпу*). 3. імгне́ньне *n.*, міг -у *m.*; часі́нка *f.* 4. паказна́я бліску́часьць. 5. каро́ткае паведамле́ньне (*у ра́дыё*). 6. мо́цная плынь, на́ціск вады́. 7. Informal жарго́н зло́дзеяў *або́* бадзя́гаў
– v.i. 1. а) бліскаць, успы́хваць: ***to flash into a blaze*** успы́хнуць агнём. б) бліскаць; сьвяці́цца, зіхацэ́ць, іскры́цца (*шча́сьцем, ра́дасьцю*). 2. ве́льмі ху́тка прабяга́ць, праяжджа́ць, прано́сіцца (*пра ду́мку, цягні́к*); сіга́ць. 3. ху́тка, незаўва́жна мінаць
– v.t. дава́ць сьветлавы́я сыгна́лы
– adj. паказны́; крыкліві (*вы́гляд*)
flash fire раптоўны, жахлі́вы пажа́р
flash flood раптоўная бу́рная павóдка
flashlight [ˈflæʃlaɪt] 1. кішэ́нны ліхта́рык *f.* 2. сыгна́льныя агні́ маяка́
flashy [ˈflæʃi] adj. 1. бліскучы, зіхатлі́вы, асьляпля́льны. 2. мімалётны, нетрыва́лы. 3. крыкліві, які́ кі́даецца ў во́чы; прэтэнзі́йны (*пра на́зву, архітэкту́ру*)
flask [flæsk] n. 1. бікла́га, бікла́жка, пля́шка, пля́шачка *f.* 2. Chem. ко́лба *f.* 3. ліцэ́йная фо́рма, апо́ка *f.*
flat I [flæt] – adj. **flatter, flattest** 1. пло́скі, ро́ўны, гла́дкі; пляска́ты; прыплю́снуты: ***flat land*** раўні́на *f.*: ***flat nose*** пляска́ты, прыплю́снуты нос: ***flat tire*** зьдзьму́тая шы́на; ***flat hand*** далóнь. 2. плы́ткі (*тале́рка*). 3. катэгары́чны, неаспрэ́чны: ***a flat refusal*** катэгары́чная адмóва. 4. ста́лы, нязьме́нны, заўсёды аднóлькавы: ***flat rate*** ста́лая (*заўсёды аднóлькавая*) ра́та (*апла́ты, пада́тку*). 5. ну́дны, неціка́вы; манато́нны, мля́вы; без жыцьця́, неэнэргі́чны; бяз сма́ку (*пра е́жу*). 6. ма́тавы, бяз бля́ску; без адце́ньняў, аднакаляро́вы: ***flat color*** аднато́нны ко́лер. 7. Mus. бэмóльны, мінóрны
– n. 1. ро́ўнядзь, раўні́на *f.* ; нізі́на *f.*, во́дмель *f.*; балóта *n.* 2. вялі́кая пласкадо́нная ло́дка. 3. за́днік -а *m.* (*сцэ́ны*). 4. Mus. бэмóль -я *m.* 5. ду́рань -ня *m.*, дурні́ца -ы *m. & f.*
– adv. 1. Mus. на паўто́на ніжэ́й. 2. ро́ўна; пляска́та; пака́та, неглыбо́ка. 3. пла́зам (*упа́сьці*): ***He laid me flat on the ground*** Ён паваліў мяне́ пла́зам на зямлю́. 4. Informal дашчэ́нту; зусі́м: ***flat broke*** без граша́. 5. Finance без працэ́нту. 6. катэгары́чна (*пярэ́чыць*)
– v.t. 1. сплю́шчваць (*рабі́ць пляска́тым*), плю́шчыць. 2. Mus. паніжа́ць но́ту на паўто́на
– v.i. 1. сплю́шчвацца. 2. апада́ць. 3. не ўдава́цца; зава́львацца, права́львацца
flat II [flæt] Brit. памéшканьне *n.*, гаспóда *f.*; кватэ́ра (*на адны́м паве́рсе*)
flatcar [ˈflætkɑ:r] n. вагóн-плятфóрма
flatfoot [ˈflætfʊt] n., pl. **-feet** 1. пляска́тая ступня́. 2. Sl. паліцыя́нт -а *m.*

flat-footed [ˌflætˈfʊtəd] adj. 1. з пляскáтай ступнёй. 2. Informal катэгарычны; бескампрамíсны

flat-headed [ˈflæthedɪd] adj. пляскáтагалóвы

flat-nosed [ˈflætnoʊzd] adj. пляскáтанóсы

flatten [ˈflætən] v. 1. сплюшчваць (-ца), рабíцца пляскáтым, плюшчыць. 2. спыняцца, сунімáцца (*пра вéцер*). 3. распрасóўваць, распрóствацъ. 4. развóдзіць (*фáрбу, éжу, вінó*)

flatter [ˈflætər] – v.t. 1. хвалíць, расхвáльваць (*няшчы́ра*). 2. паддóбрывацца. 3. цéшыць, лáшчыць; быць прыéмным, лéсьціць

– v.i. лісьлíвіць; дагаджáць; падлíзвацца; прыхарóшваць: ***This picture flatters her*** Гэ́ты здымак прыхарóшвае яé

• ***flatter oneself*** 1. а) угавóрваць сябé. б) зашмáт пра сябé дýмаць; перацэ́ньваць сябé. в) выхваля́ць сябé

flatterer [ˈflætərər] n. лісьлíвец -ўца *m.*, лісьлíўка *f.*; падлíзьнік -а *m.*, падлíзьніца *f.*

flattering [ˈflætərɪŋ] adj. 1. лісьлíвы, падлíзьлівы. 2. пахвáльны

flatteringly [ˈflætərɪŋli] adv. 1. лісьлíва. 2. пахвáльна, дóбра, прыéмна (*вы́казацца*)

flattery [ˈflætəri] n. 1. лісьлíвасьць, падлíзваньне; лісьлíвыя слóвы. 2. пахвалá

flatware [ˈflætwer] n. 1. сталóвы прыбóр (*нож, відэ́лец, лы́жка*). 2. плы́ткі пóсуд (*талéркі, спóдкі, блю́ды*)

flatways [ˈflætweɪz] adv. плóска; плáзам, ніц, нíцма (*упáсьці, лéгчы*)

flatwise [ˈflætwaɪz] adv. *гл.* **flatways**

flaunt [flɔ:nt] – v. 1. выхваля́цца *чым*; выстаўля́ць напакáз (*багáцьце*). 2. казыры́цца. 3. вéлічна разьвявáцца, лунáць (*пра сьцяг*)

– n. выхваля́ньне, казыráньне *n.*

flavor, Brit. **flavour** [ˈfleɪvər] – n. 1. смак -у *m.* 2. прыпрáва *f.*, пры́смак -у *m.* 3. пры́смак -у *m.*, адцéньне: ***a flavor of romance*** прысмáк рамáну 4. пах -у *m.*, спэцыфíчны пах

– v.t. 1. прыпраўля́ць (*стрáву*). 2. надавáць пры́смак *абó* цікáвасьць да *чагó*

flavorful, Brit. **flavourful** [ˈfleɪvərful] adj. з прыéмным смáкам *абó* пáхам; смакавíты, пáхкі, пахýчы

flavoring, Brit. **flavouring** [ˈfleɪvərɪŋ] n. прыпрáва *f.*, прысмáкі

flavorless, Brit. **flavourless** [ˈfleɪvərləs] adj. бяз смáку *абó* пáху

flaw I [flɔ:] – n. 1. шчарбíна *f.*, брак -у *m.* (*у тавáры*). 2. загáна *f.*, недахóп -у *m.* (*у характáры*). 3. недагля́д -у *m.*, хíба *f.* (*у дакумэ́нце*)

– v.t. шкóдзіць, псавáць, раскóлваць, вышчарбля́ць

– v.i. трэ́скацца, раскóлвацца

flaw II [flɔ:] n. раптóўны пóшуг вéтру, раптóўная навальнíца зь лíўнем, шквал -у *m.*

flax [flæks] n. 1. лён, ільнý *абó* лёну *m.* 2. валакнó лёну

flax comb шчóтка для часáньня лёну, ільночасáлка *f.*

flaxen [ˈflæksən] adj. 1. ільняны́, льняны́, зь лёну. 2. які́ кóлерам і мя́ккасьцю нагáдвае валакнó лёну; бяля́вы, блянды́ністы: ***flaxen hair*** льняны́я, бяля́выя валасы́

flaxseed [ˈflækssi:d] n. льняно́е сéмя

flaxy [ˈflæksi] adj. *гл.* **flaxen**

flay [fleɪ] v.t. 1. абдзірáць, калéчыць скýру: ***with a back flayed*** з абдзéртымі плячы́ма (*ад пабóяў*). 2. сурóва, мóцна гáніць; бязьлíтасна, няшчáдна крытыкавáць. 3. абабірáць; грáбіць, зьдзірáць; ашýкваць

flea [fli:] n. блыхá *f.*, *pl.* блóхі

fleck [flek] – n. 1. пля́ма, пля́мка *f.* (*фáрбы, сьвятлá*). 2. лáпік -а *m.*, крáпінка, драбíнка, часьцíнка *f.* (*пы́лу, пяскý*): ***a fleck of dust*** пылíнка; ***flecks of sunlight*** вóдбліскі сóнца, сóнечныя блíскі

– v.t. усéйваць крáпкамі (*фáрбы, сьвятлá*); пярэ́сьціць, сьпярэ́шчваць

flecked [flekt] adj. усе́яны пля́мкамі (*фа́рбы, сьвятла́*), сьпярэ́шчаны

flection ['flekʃən] n. 1. згіна́ньне *n.*, згіб, згін -у *m.* 2. Gram. зьме́на фо́рмаў сло́ваў (*па скло́нах, лі́ках, асо́бах*)

flectional ['flekʃənəl] adj. флекты́ўны (*мо́ва*)

fled [fled] v., *p.t. and p.p. of* **flee**

flee [fli:] – v., **fled**, **fleeing**, v.i. 1. уцяка́ць. 2. шука́ць ратўнку. 3. ху́тка ляце́ць, не́сьціся. 4. прахо́дзіць, пралята́ць: ***life had fled*** жыцьцё праляце́ла; ху́тка міна́ць; спыня́цца; зьніка́ць

– v.t. пазьбяга́ць, ухіля́цца

fleece [fli:s] – n. 1. шэ́рсьць, поўсьць *f.*, руно́ аве́чкі, аве́чая во́ўна: ***golden fleece*** залато́е руно́. 2. ко́лькасьць во́ўны, настры́г з аднае́ аве́чкі. 3. мя́ккі (*шаўкави́сты*) ворс, начо́с -у *m.*, тканіна з таки́м во́рсам

– v.t. 1. стры́гчы (*аве́чку*). 2. Informal абдзіра́ць, рабава́ць, ашу́кваць. 3. абраста́ць во́ўнай

fleecy ['fli:si] adj. 1. як во́ўна, пушы́сты, кучара́вы: ***fleecy clouds*** кучара́выя аблО́кі. 2. ваўні́сты, варсі́сты (*пра сукно́*). 3. ваўня́ны: ***fleecy underwear*** ваўня́ная наце́льная бялі́зна

fleet I [fli:t] n. 1. флёт -у *m.* 2. флятылія *f.* (*караблёў, самалётаў або́ а́ўтаў*)

fleet II [fli:t] – adj. 1. ху́ткі, бо́рзды, шпа́ркі (*конь*). 2. Poet. міну́чы, недаўгаве́чны, хуткаплы́нны (*час*), мімалётны

– v.i. ху́тка міна́ць, ху́тка ру́хацца

fleeting ['fli:tɪŋ] adj. 1. мімалётны, міну́чы, недаўгаве́чны, нетрыва́лы: ***the fleeting beauty of youth*** міну́чая краса́ маладо́сьці; ***a fleeting smile*** мімалётная ўсьме́шка

flesh [fleʃ] n. 1. плоць *f.*, це́ла *n.* 2. (*сыро́е*) мя́са *n.*: ***Wolves live on flesh*** Ваўкі жы́вяцца мя́сам; ***Neither fish, flesh, nor fowl*** Ні ры́ба, ні мя́са. 3. сы́тасьць, таўшчыня́ *f.*: ***He has lost flesh*** Ён схудне́ў; ***in flesh*** у це́ле, сы́ты, то́ўсты. 4. фізы́чная нату́ра чалаве́ка (*не духо́ўная*). 5. жывы́я істо́ты: ***all flesh*** усё жыво́е, усе́ жывы́я істо́ты. 6. род чалаве́чы, чалаве́цтва *n.* 7. сям'я́, радня́ *f.*, ро́дныя *pl.* 8. цялі́сны ко́лер. 9. мя́каць пладо́ў, клу́бняў (*я́блыка, я́гады, бу́льбіны*)

• ***in the flesh*** а) жывы́. б) у цялі́снай фо́рме, у асо́бе, асабі́ста: ***He has never been seen in the flesh*** НікО́лі яго́ ў во́чы ніхто́ ня ба́чыў

flesh and blood 1. плоць і кроў чалаве́ка. 2. чалаве́чая нату́ра. 3. Informal чалаве́к -а *m.*, лю́дзі *pl.*; чалаве́цтва *n.*

• ***one's own flesh and blood*** сям'я́, радня́, дзе́ці

flesh-colored ['fleʃˌkʌlərd] adj. цялі́снага ко́леру

flesh-eating ['fleʃˌi:tɪŋ] adj. драпе́жны, мясае́дны

fleshiness ['fleʃməs] n. 1. сы́тасьць, таўшчыня, паўната́ *f.* 2. мясі́стасьць *f.* (*пло́да, чалаве́ка, но́са*)

fleshliness ['fleʃlməs] n. 1. цялі́снасьць *f.* 2. ю́рлівасьць *f.*; па́лкасьць *f.*

fleshly ['fleʃli] adj. 1. цялі́сны. 2. фізы́чны; юрлі́вы. 3. дача́сны; сьмяро́тны; чалаве́чы. 4. сьве́цкі. 5. Obsol. сы́ты, таўсты́, то́ўсты

flesh wound дра́піна *f.*, лёгкая неглыбо́кая ра́на

fleshy ['fleʃi] adj. 1. сы́ты; то́ўсты. 2. мясі́сты (*плод, чалаве́к, нос*), сакаўны́: ***a fleshy peach*** мясі́сты, сакаўны́ пэ́рсік

flew [flu:] v., *p.t. of* **fly**

flex [fleks] – v.t. 1. згіна́ць, гнуць. 2. сьціска́ць: ***to flex one's muscle*** напру́жваць і расслабля́ць му́скулы

– v.i. гну́цца, згіна́цца

– n. гну́ткасьць *f.*

flexibility [ˌfleksəˈbɪlətɪ] n. гну́ткасьць, пада́тлівасьць *f.*

flexible ['fleksəbəl] adj. 1. гну́ткі (*ску́ра, дрот*), гі́бкі (*го́лас*). 2. падаўкі́, пада́тлівы; паваро́тлівы (*дзяло́к, палі́тык*)

flexion ['flekʃən] n. 1. згіна́ньне *n.* (*рукі́, нагі́*) 2. згін -у *m.* (*ме́сца згі́ну*), лакцявы́ згін

flexor ['fleksər] n. му́скул, які́ згіна́е ча́стку це́ла

flick [flɪk] – n. 1. лёгкі раптоўны ўда́р. 2. пстрык -у *m.* (*гук*)
– v.t. 1. лёгка ўдара́ць; сьцяба́ць, хваста́ць. 2. зма́хваць (*пыл*)
– v.i. ху́тка ру́хацца, насі́цца

flicker ['flɪkər] – v.i. 1. мігце́ць; мига́ць, мігацэ́ць (*пра зо́ркі, слабо́е по́лымя*). 2. лапата́ць, біць кры́ламі (*пра ту́шку*)
– n. 1. мігатлі́вае, трапяткоe сьвятло́ *або́* по́лымя. 2. про́бліск -у *m.*, і́скра *f.* (*надзе́і, ра́дасьці*). 3. мірга́ньне *n.* (*ве́йкамі, вачы́ма*)

flickers, Sl. кінафі́льм -у *m.*; кіно́ *n.*

flier ['flaɪr] n. 1. лятўн -а́ *m.*: ***That eagle is a high flier*** Той аро́л высо́ка лётае. 2. пілёт -а *m.* 3. ху́ткі цягні́к, аўто́бус; экспрэ́с -а *m.* 4. Informal рызыко́ўнае прадпрые́мства, авантю́ра *f.* 5. Tech. махані́к -а́ *m.*

flight [flaɪt] – n. 1. лёт, палёт -у *m.* 2. адле́гласьць палёту. 3. чарада́ ту́шак; град (*стрэ́лаў, ку́ляў*). 4. рэйс самалёта. 5. ху́ткі рух (*ча́су, хма́раў*). 6. чарада́ схо́даў; пралёт, марш -а *m.* 7. луна́ньне *n.*, узьлёт -у *m.*: ***a flight of fancy*** узьлёт фанта́зіі. 8. чарада́ шлю́заў (*на кана́ле*)
– v.i. 1. лётаць чарадо́ю: ***The wild geese are flighting*** Дзі́кія гу́сі лётаюць чаро́дамі. 2. Obsol. пералята́ць (*на зіму́*)
– v.t. страля́ць у ту́шку ў лёце

flight II [flaɪt] n. 1. уцёкі *pl. only.* 2. хава́ньне ад правасу́дзьдзя, та́йныя ўцёкі: ***to put to flight*** змусіць уцяка́ць

flighty ['flaɪti] adj. 1. няста́лы; ве́траны; капры́зны; лёгкаду́мны, пусты́, несур'ёзны. 2. прыдуркава́ты. 3. пудлі́вы (*пра каня́*). 4. мімалётны, недаўгаве́чны

flimflam ['flɪmflæm] n. 1. глу́пства *n.*, лухта́ *f.* 2. махля́рства *n.*

flimsy ['flɪmzi] – adj. 1. то́нкі, рэ́дкі, нямо́цны. 2. непава́жны, малава́жны, трывія́льны: ***a flimsy excuse*** адгаво́рка; несур'ёзнае апраўда́ньне
– n. 1. папяро́сная *або́* то́нкая папе́ра (*для ко́піяў*). 2. Sl. грашо́вы банкно́т

flinch [flɪntʃ] – v.i. 1. ску́рчвацца; уздры́гваць; мо́ршчыцца (*ад бо́лю*). 2. ухіля́цца, адмаўля́цца (*ад ця́жкасьцяў, абавя́зку*)
– v.t. адступа́цца ад *чаго́*

fling [flɪŋ] – v.t. **flung** 1. кі́даць; шпурля́ць: ***to fling someone into jail*** кі́нуць каго́ ў турму́; ***to fling fresh troops into a battle*** кі́нуць сьве́жыя аддзе́лы ў бой; ***to fling a stone*** шпурну́ць ка́мень. 2. пазіра́ць з пага́рдай, кіда́ць пага́рдлівы по́зірк. 3. а) кі́даць аб зямлю́, валі́ць; скіда́ць: ***the horse flung his rider*** конь скі́нуў ездака́. б) (out) брыка́ць. 4. кіда́ць (*цень*), напаўняць, по́ўніць (*па́хам, гу́камі*): ***The flowers fling their fragrance around*** Кве́ткі напаўня́юць паве́тра па́хам. 5. уклада́ць, аддава́ць: ***To fling all energies*** аддава́ць усе́ сілы, акуну́цца з галаво́ю (*у пра́цу*)
– v.i. 1. кі́дацца, выбяга́ць, выскака́ць: ***She flung out of the room*** Яна́ вы́бегла з пако́ю. 2. пачына́ць сварыцца, ла́яцца
– n. 1. кідо́к -ка́ *m.*, по́швырак -ка *m.* 2. гуля́ньне *n.*, прые́мнае ба́ўленьне ча́су: ***to have one's fling*** нагуля́цца, прые́мна пабава́іцца; ***to have a fling with someone*** мець рама́н з *кім*. 3. зьнява́жлівая заўва́га; крыты́чныя напа́дкі; ***to have a fling at*** а) паспрабава́ць рабіць. б) пага́рдліва або́ зьнява́жліва выка́звацца

flint [flɪnt] n. 1. крэ́мень -ю *m.*, крамя́нчык -а *m.*, *dim.* 2. крэ́сіва *n.* 3. не́шта цьвёрдае, як ка́мень: ***a heart of flint*** каме́ннае се́рца

flint glass крышта́льнае шкло

flint-hearted ['flɪnt,hɑ:rtəd] adj. бяздушны; лю́ты; з каме́нным се́рцам

flinty ['flɪnti] adj. 1. крамянёвы. 2. цьвёрды, як крэ́мень; непадаўкі́, зацяты

flip [flɪp] v. (**-pp-**) 1. пстрыкаць. 2. падкідáць: ***He flipped a coin*** Ён падкíнуў манэ́ту. 3. лёгка сьцебануць, хвастанýць, змахнýць

flippancy ['flɪpənsi] n., pl. **-cies** 1. легкадýмнасьць *f.*; непачцíвасьць *f.* 2. дзёрзкасьць *f.*

flippant ['flɪpənt] adj. 1. адвáжны, нахáбны (*у гýтарцы, у трымáньні*). 2. непачцíвы, грубіянскі

flipper ['flɪpər] n. 1. плаўнік -á, ласт -а *m.* (*як у фóкаў*). 2. ласт -а *m.* (*у вадалáзаў*)

flirt [flɜ:rt] – v.i. 1. фліртавáць, заляцáцца. 2. забаўляцца; непавáжна стáвіцца да *чагó*

– v.t. махáць (*вéерам*), круцíць у рукáх

– n. какéтка *f.*, залётнік -а *m.*, ахвótнік пафліртавáць

flirtation [flɜ:r'teɪʃən] n. 1. заляцáньне *f.*, флірт -у *m.* 2. фліртавáньне *n.*, забаўлянье (*нéйкай дýмкай*)

float [flout] – v.i. 1. трымáцца на павéрхні вады́ *абó ў* павéтры; плáваць, плы́сьці; усплывáць: ***Ice floats on water*** Лёд плáвае на вадзé. 2. плы́сьці з вадóю, быць нéсеным плы́ньню. 3. пранóсіцца (*перад вачы́ма абó ў дýмках*). 4. пашырáцца, распаўсю́джвацца, разнóсіцца: ***The rumor floated through the town*** Чýтка разнóсілася па гóрадзе

– v.t. 1. спускáць на ваду́ (*вадаплáў*), здымáць зь мéлі, мялíзны. 2. затаплянь, заліваць. 3. сплаўляць (*лес*). 4. пускáць у ход гандлёвае прадпрыéмства. 5. пускáць на рынак, прадаваць (*акцыі*). 6. распаўсю́джваць (*чýтку*)

– n. 1. плыт -á *m.*, парóм -а *m.*, выратавáльная кýртка, выратавáльны пóяс *абó* кóла. 2. плавýн -á *m.*, плaвóк -ўкá *m.* (*на лёсцы ў вýдзе*). 3. плáвальны пузы́р (*у ры́бы і іншых вадзяны́х жывёлінаў*). 4. нізкі фургóн, ужываны ў парáдах

• ***floats*** рáмпа *f.* (*у тэáтры*).

floatable ['floutəbəl] adj. 1. плывýчы (*здóльны трымáцца на павéрхні вады́*). 2. сплаўны́ (*пра ракý*)

floating ['floutɪŋ] adj. плáваючы; плывýчы, плы́ўкі

floating bridge плывýчы мост, пантон -а *m.*

floating capital абарóтны капітáл

floating kidney блукáючая ны́рка

flock I [flɑ:k] – n. 1. чарадá (*птýшак, авéчак, кózаў*): ***a flock of geese*** чарадá гусéй: ***flocks and herds*** авéчкі й рагáтая жывёла. 2. грýпа, гурт, натóўп: ***to come in flocks*** прыхóдзіць гýртам, натóўпам, грýпамі. 3. парафія́не аднаé царквы́, пáства *f.*

– v.i. зьбірáцца; зьбівáцца (*у кýчу*), тóўпіцца: ***The children flocked around the Christmas tree*** Дзéці тóўпіліся вакóл ялíнкі

flock II [flɑ:k] – n. 1. касмы́к -á *m.*, касмычóк -кá *m., dim.* (*вóўны, бавóўны*); пучóк -кá *m.*; пáсма *f.* (*валасóў*). 2. пáчаскі *pl. only*, пáчасьце (*лёну, вóўны, бавóўны*)

– v.t. набівáць, напíхваць пáчаскамі (*матрáс, падýшку*)

floe [flou] n. крыга *f.*

flog [flɑ:g] v.t. (**-gg-**) 1. мóцна лупцаваць (*кíем*), сьцябáць (*пýгаю, кíем*), падсьцёбваць (*каня́ пýгаю*). 2. Brit., Sl. несумлéнна прадаваць (*асабл. крáдзенае*)

flogging [flɑ:gɪŋ] n. цялéсная кáра; лупцóўка *f.*

flood [flʌd] – n. 1. павóдка *f.*, развóдзьдзе *n.* 2. Poet. акія́н -у *m.*, мóра, вóзера *n.*, ракá *f.* 3. патóк -у *m.* (*сьвятлá, слóваў, людзéй*), мóра *n.*: ***flood of tears*** мóра сьлёз. 4. прыплы́ў -ву *m.*

– v.t. 1. заліваць; затапляць. 2. закідáць *кагó* (*пытáньнямі, прóсьбамі*)

– v.i. улівáцца

• ***the Flood*** Сусьвéтны патоп

floodgate ['flʌdgeɪt] n. шлюз -а *m.*

flood lands or **flood plains** паплавы́ *pl.*

floodlight ['flʌdlaɪt] n. пражэ́ктар -а *m.*, пражэ́ктарнае асьвятлéньне

floor [flɔ:r] – n. 1. падло́га *f.* 2. паве́рх -у *m.*: ***ground floor*** ні́жні, пе́ршы паве́рх, партэ́р -у *m.* 3. дно *n.* (*мо́ра, пячо́ры*). 4. за́ля пасе́джаньняў: ***to have, to take the floor*** выступа́ць (*на пасе́джаньні*), бра́ць сло́ва
– v.i. 1. кла́сьці падло́гу 2. вали́ць на падло́гу, зьбіва́ць з ног. 3. Informal а) перамага́ць. б) зьбіва́ць з панталы́ку, ста́віць у тупі́к

flooring ['flɔ:rɪŋ] n. 1. падло́га *f.* 2. матэрыя́л на падло́гі (*парке́т, ліно́леўм*)

flora ['flɔ:rə] n., pl. **-ras, -rae** флёра *f.* (*расьлі́нны сьвет*)

floral ['flɔ:rəl] adj. 1. з кве́так, кве́тачны (*адэкалён*): ***floral decorations*** дэкара́цыі з кве́так. 2. квяці́сты, у кве́ткі: ***floral patterns*** квяці́стыя ўзо́ры, з узо́рам у кве́ткі

florescence [flɔ:'resəns] n. 1. флюарэсцэ́нцыя *f.* 2. квітне́ньне, цьвіце́ньне, красава́ньне (*збо́жжа*) *n.* 3. час квітне́ньня, красава́ньня; ро́сквіт -у *m.* 4. кве́ткі *pl. of* кве́тка *f.*, кве́цень *f.*

florescent [flɔ:'resənt] adj. квітне́ючы, які́ цьвіце́, квітне́е, красу́е

florid ['flɔ:rɪd] adj. 1. румя́ны, чырво́ны; шматко́лерны: ***a florid complexion*** расчырване́лы твар. 2. квяцісты, напы́шлівы (*стыль*)

florist ['flɔ:rɪst] n. 1. кветкавод. 2. гандля́р кве́ткамі

floss [flɔ:s] n. 1. шаўко́вае валакно́. 2. шаўко́выя ні́ткі (*каб вышыва́ць або́ чы́сьціць між зуба́мі*). 3. шаўкавісты́я валасы́ на катаху́ кукуру́зы

flounder I ['flaʊndər] – v.i. 1. валту́зіцца, бо́рсацца (*у сьне́зе, балоце*); брысьці́: ***to flounder in the deep snow drifts*** брысьці́ праз высо́кія гу́рбы сьне́гу. 2. блы́тацца, рабіць памы́лкі (*у сьпе́ве, прамо́ве*)
– n. валтузьня́ *f.*, валту́жаньне, бо́рсаньне *n.*

flounder II ['flaʊndər] n., pl. **-ders** or coll. **flounder** ка́мбала *f.*

flour ['flaʊr] – n. 1. мука́ *f.* 2. парашло́к -ку́ *m.*
– v.t. 1. пасыпа́ць мукло́ю, кача́ць у муцэ́ (*ры́бу, мя́са*). 2. мало́ць на муку́

flour bolt расе́йвальная машы́на *або́* падсі́так, сі́та для расе́йваньня мукі́

flourish ['flɜ:rɪʃ] – v.i. 1. квітне́ць, пы́шна расьці́ (*пра расьлі́ну*); до́бра разраста́цца, мо́цна разьвіва́цца; до́бра ме́цца. 2. быць у ро́сквіце (*жыцьця́ або́ дзе́йнасьці*)
– v.t. 1. маха́ць, разма́хваць *чым.* 2. выстаўля́ць напака́з, выхваля́цца.
– n. 1. ро́сквіт -у *m.*: ***in full flourish*** у по́ўным ро́сквіце (*жыцьця́*). 2. разма́хваньне *n.*, ро́счырк -у *m.* (*пяра́*), завітло́к -ка́ *m.*, завіту́шка *f.* (*з вала-со́ў*). 3. квяці́сты стыль *або́* вы́раз

flourishing ['flɜ:rɪʃɪŋ] adj. здаро́вы; квітне́ючы, пы́шны, бліскучы: ***a flourishing garden*** пы́шна разро́слы гаро́д; ***a flourishing career*** бліскучая кар'е́ра

flout [flaʊt] – v.t. 1. пагарджа́ць; не прыма́ць пад ува́гу: ***The foolish boy flouted his mother's advice*** Неразу́мны хлапе́ц ня прыняў пад ува́гу пара́ду сваі́ ма́ці. 2. высьме́йваць, абсьме́йваць
– v.i. кпіць, насьміха́цца
– n. зьнява́га *f.*; кпі́ны *pl.*, насьме́шкі *pl.*, насьміха́ньні *pl.*

flow [floʊ] – v.i. 1. цячы́, струме́ніцца; ліцца; плы́сьці (*пра раку́*): ***to flow through*** праплыва́ць; ***to flow into*** уплыва́ць, уцяка́ць, улива́цца (*пра раку́*). 2. лёгка спада́ць, сплыва́ць (*пра валасы́, во́пратку*). 3. быць бага́тым *або́* по́ўным празь верх. 4. прыбыва́ць; падыма́цца (*пра прыплы́ў*)
– v.t. ліць; залива́ць, затапля́ць
– n. 1. плынь *f.* (*ракі́*), цячэ́ньне *n.*: ***flow of blood*** крывацёк -у *m.* 2. пато́к -у *m.* (*і сьлёзаў, сло́ваў*); струме́нь -я *m.*, руча́й -я́ *m.* 3. прыплы́ў, прылі́ў -ву *m.* (*мо́ра*). 4. павóдка *f.*, разьлі́ў -ву *m.*: ***the flows of the Nile*** разьлі́вы Ні́лу

flower ['flaʊr] – n. 1. кра́ска, кра́сачка *f.*, *dim.*; кве́тка, кве́тачка *f.*, *dim.*; квет-

кавая расьлі́на. 2. краса́ *f.*, цьвет -у *m.* (*найле́пшая ча́стка*). 3. ро́сквіт -у *m.*: ***in the flower of life*** у ро́сквіце жыцьця́

– v.i. цьвісьці́, красава́ць; квітне́ць. 2. быць у ро́сквіце (*у найле́пшым ста́не*)

– v.t. прыбіра́ць, аздабля́ць кве́ткамі

– adj. кве́ткавы: ***flower seeds*** кве́ткавае насе́ньне

• ***flower bed*** клю́мба

• ***in flower*** квітне́ючы, цьвіту́чы, які́ цьвіце́

flower girl 1. мала́я дзяўчы́нка ў вясе́льным карта́жы. 2. кве́тачніца, гандля́рка кве́ткамі

flowering ['flaʊərɪŋ] – adj. квітне́ючы, квіту́чы, які́ цьвіце́

– n. 1. цьвіце́ньне, красава́ньне *n.* (*збо́жжа*), дасьпява́ньне *n.*

flowerpot ['flaʊrpɑ:t] n. вазо́н -а *m.*

flower show выста́ва кве́так

flowery ['flaʊri] adj. 1. усы́паны кве́ткамі. 2. квяці́сты (*стыль, мо́ва*). 3. квяці́сты, у кве́ткі (*ткані́на*)

flowing ['floʊɪŋ] adj. 1. цяку́чы. 2. пла́ўны (*рух*). 3. лёгкаспа́дны (*пра во́пратку*)

flu [flu:] n., Informal грып -у *m.*, інфлюэ́нца *f.*

fluctuate ['flʌktʃueɪt] – v.i. 1. падыма́цца й апада́ць, быць няста́лым, мяня́цца, вага́цца (*пра цэ́ны, тэмпэрату́ру*). 2. хвалява́цца (*пра ваду́*)

– v.t. выклі́ка́ць хва́лі

flue I [flu:] n. 1. ю́шка *f.*, дымахо́д -у *m.* 2. цеплаправо́д -у *m.* 3. трубá ў арга́не

flue II [flu:] n. пух -у *m.*, пушло́к -ка́ *m.*; камякі́, кло́кі пы́лу пад мэ́бляй

fluency ['flu:ənsi] n. бе́гласьць *f.* (*у мо́ве*); пла́ўнасьць *f.* (*у та́нцы*)

fluent ['flu:ənt] adj. 1. бе́глы (*чыта́ньне, мо́ва*), дастатко́ва свабо́дны. 2. які́ ху́тка, лёгка гаво́рыць або́ пі́ша. 3. няста́лы; ва́дкі, цяку́чы

fluff [flʌf] n. 1. пух -у *m.*, пушло́к -ка́ *m.*, пушы́сты ворс (*на ткані́не*): ***bit of fluff*** пушы́нка *f.* 2. Sl. памы́лка ў чыта́ньні ў ра́дыё *або́* на сцэ́не

fluffy ['flʌfi] adj. пушы́сты; пу́хкі (*це́ста*); мя́ккі, мя́кенькі, як пух

fluid ['flu:ɪd] – adj. 1. цяку́чы, ва́дкі. 2. няста́лы, зьме́нны

– n. ва́дкасьць *f. або́* газ -у *m.*

fluke I [flu:k] – n. шчасьлівы вы́падак, ша́нец -цу *m.*

– v.t. атры́мваць выпадко́ва

fluke II [flu:k] n. 1. ка́мбала *f.* (*ры́ба*). 2. трэмато́да (*паразы́т жывёлы*)

flung [flʌŋ] v., *p.t. and p.p. of* **fling**

flunk [flʌŋk] – v.t., Informal 1. праваліць, ня здаць экза́мэн. 2. праваліць, паста́віць незадавальня́ючую адзна́ку

– v.i. 1. праваліцца на экза́мэне, ня здаць экза́мэн. 2. зда́цца, адступі́ць; адмо́віцца

– n. права́л -у *m.*, няўда́ча *f.*

• ***flunk out,*** Informal паки́нуць шко́лу; быць вы́ключаным са шко́лы

fluorescence [flɔ:'resəns] n. сьве́цень, флюарэсцэ́нцыя *f.*

fluorescent [flɔ:'resənt] adj. флюарэсцэ́нтны: ***fluorescent lamp*** флюарэсцэ́нтная ля́мпа

flurry ['flɜ:ri] – n., pl. **-ries** 1. пары́лў -ву, по́шуг -у *m.* (*ве́тру*), віхо́р, ві́хлар -ру *m.*: ***A flurry of wind upset the small sailboat*** Віхо́р абярну́ў малы́ ве́тразьнік. 2. заве́я *f.*; парывісты дождж: ***flurries of snow*** завіру́ха *f.* 3. нэрво́вы сьпех; хвалява́ньне *n.*; мітусьня́, сумятня́ *f.*

– v.t. хвалява́ць, узбура́ць: ***Noise in the audience flurried the actor so that he forgot his lines*** Шум у за́лі так усхвалява́ў акто́ра, што ён забы́ўся сваé сло́вы

flush I [flʌʃ] – v.i. 1. чырване́ць: ***The girl flushed when they laughed at her*** Дзяўчы́на пачырване́ла, калі зь яé сьмяя́ліся; ***Blood flushed to her cheeks*** Чы́рвань уда́рыла ёй у шчо́кі. 2. пуска́ць па́расткі (*пра расьлі́ну*)

– v.t. 1. а) змыва́ць струме́нем вады́ (*ву́ліцы*). б) спушча́ць ваду́: ***to flush the toilet*** спусьці́ць ваду́ ў прыбі-

ра́льні. в) ачышча́ць стра́ўнік (*пасьля́ атру́чаньня*). 2. напаўня́ць, перапаўня́ць (*ра́дасьцю, го́нарам*); захапля́ць: ***flushed with joy*** перапо́ўнены ра́дасьцю
– n. 1. румя́нlец -ца *m.*, чы́рвань *f.* (*на тва́ры*). 2. струме́нь -я *m.* 3. прылі́ў (*пачуцьця́*), захапле́ньне *n.*, узбу́джанасьць -і *f.*: ***in the flush of victory*** у ра́дасным уздыме перамо́гі. 4. бу́йны рост (*травы́ вясно́ю*). 5. ду́жасьць, бадзёрасьць *f.*: ***the first flush of youth*** пе́ршы ро́сквіт маладо́сьці. 6. прыступ гарачыні́, гара́чкі; прылі́ў (*крыві́*)

flush II [flʌʃ] – adj. 1. ро́ўны, на тым са́мым узро́ўні. 2. до́бра забясьпе́чаны, замо́жны. 3. шмат, у вялі́кай ко́лькасьці. 4. шчо́дры; лібэра́льны. 5. румя́ны; по́ўны сі́лаў, здаро́ўя. 6. по́ўны да ве́рху
– adv. 1. ро́ўна. 2. про́ста: ***He hit him flush on the nose*** Ён уда́рыў яго́ про́ста ў нос

flush III [flʌʃ] – v.i. узьлята́ць; успы́рхваць (*пра пту́шку*)
– v.t. 1. спу́джваць: ***The hunter's dog flushed a partridge*** Саба́ка паляўні́чага ўспу́дзіў курапа́тку. 2. Informal прымуша́ць вы́йсьці са схо́ванкі; лаві́ць уцекачо́ў
– n. 1. успу́джваньне *n.* 2. спу́джаная пту́шка *або́* чарада́ пту́шак

flush IV [flʌʃ] n. ка́рты аднае́ ма́сьці, ко́лер -у *m.*

fluster ['flʌstər] – v.t. хвалява́ць; бянтэ́жыць, нэрвава́ць
– v.i. хвалява́цца, бянтэ́жыцца, нэрвава́цца
– n. узбу́джанасьць, усхвалява́насьць *f.*

flute [flu:t] – n. 1. фле́йта *f.* 2. Arch. жалаб|о́к -ка́, ра|во́к -ўка́ *m.*, паз -у *m.*, вы́емка *f.* 3. малы́я, ву́зкія скла́дачкі
– v.i. 1. гра́ць на фле́йце. 2. выраза́ць жалабкі́ (*на калёне*). 3. запрасо́ўваць скла́дкі

flutter ['flʌtər] – v.i. 1. лапата́ць (*крыла́мі*); трапята́ць: ***the flag fluttered in the breeze*** сьцяг лапата́ў на ве́тры. 2. дрыжа́ць, трэ́сьціся: ***Her hands fluttered*** У яе́ трэ́сьліся ру́кі. 3. бі́ца ня́ро́ўна, нерэгуля́рна: ***Her pulse fluttered*** Пульс у яе́ быў ня́ро́ўны
– n. 1. лапата́ньне *n.* 2. неспако́й -ю *m.* хвалява́ньне *n.*

flux [flʌks] – n. 1. цячэ́ньне *n.* 2. прыплы́|ў -ву *m.* (*мо́ра*). 3. безупы́нныя зьме́ны: ***in a state of flux*** у ста́не безупы́нных зьме́наў. 4. Med. паталягі́чнае сплыва́ньне (*крыві́*). 5. Metallurgy пла́|вень -ўня *m.*, флюс -у *m.*
– v.t. выкліка́ць сплыва́ньне (*крыві́*); ачышча́ць, прачышча́ць
– v.i. 1. сплаўля́цца. 2. выплыва́ць, выцяка́ць, плы́сьці; зьмяня́цца

fluxion ['flʌkʃən] n. 1. цячэ́ньне *n.*; пато́к -у *m.* 2. выдзяле́ньне *n.* (*гно́ю з ра́ны*)

fly I [flaɪ] n., pl. **flies** му́ха, му́шка *f.*, *dim.*: ***a fly in the ointment*** лы́жка дзёгцю ў бо́чцы мёду

fly II [flaɪ] – v.i. **flew, flown, flying; flied, flying** 1. лётаць, ляце́ць: ***birds fly*** пту́шкі лётаюць. 2. разьвява́цца ў пове́тры, луна́ць (*пра сьцяг, валасы́*). 3. лётаць, ляце́ць самалётам. 4. ляце́ць; імча́цца, імкну́ць: ***time flies*** час ляці́ць. 5. уцяка́ць
– v.t. 1. пушча́ць у пове́тра: ***to fly a kite*** запуска́ць зьме́я. 2. пералята́ць. 3. кірава́ць самалётам. 4. перавозіць самалётам. 5. уцяка́ць ад *каго́-чаго́*, уніка́ць *каго́-чаго́*
– n. 1. кла́пан на гу́зікі; прарэ́х -а *m.*, шырынка *f.* 2. адкідно́е пало́тнішча (*дзьве́ры ў намёце*). 3. даўжыня́ сьця́га. 4. палёт -у *m.*
• ***fly at*** кі́нуцца адзін на аднаго́ (*у бо́йцы*)
• ***fly away*** адлята́ць, зьлята́ць
• ***fly by (past, through)*** пралята́ць
• ***fly down*** зьлята́ць
• ***fly in the face of*** я́ўна не паслу́хацца *каго́*, не падпара́дкавацца *каму́*; не лічы́цца з *кім-чым*

• ***fly off*** раптóўна вы́йсьці; уцячы́
• ***fly out*** вы́бухнуць гнéвам, ускіпéць
• ***fly over*** пераляцéць, пераскóчыць

fly agaric мухамóр -а *m.* (*грыб*)

flyblow ['flaɪblou] – n. мушы́нае я́йка *абó* ля́рва (*на мя́се*)
frock [frɑ:k] n. 1. суке́нка, су́кня *f.* 2. халя́т -а *m.* 3. сута́на, ря́са *f.* (*сьвятаро́*). 4. сурду́т -а *m.*

frock coat сурду́т -а *m.*

frog ['frɑ:g] n. жа́ба *f.*, жа́бка *f. dim.*
• ***frog in the throat*** хрыпо́та

frolic ['frɑ:lɪk] – n. 1. вясёлыя шту́чкі, жа́рты; вясёлае свавóльства. 2. вясёлыя гу́льні
– v.i. гуля́ць, дурэ́ць, свавóліць
– adj. вясёлы, свавóльны; гульлі́вы, гарэ́зьлівы, шу́стры

frolicker ['frɑ:lɪkər] n. гарэ́зьла -ы *m. & f.*, свавóльнік -а *m.*

frolicsome ['frɑ:lɪksəm] adj. вясёлы; гульлі́вы, дурасьлі́вы

from [frʌm; *unstressed* frəm] prep. 1. з, са (*на пытаньне: адку́ль? з чаго́?*): ***a train from Miensk*** цягні́к зь Ме́нску; ***made from iron*** зро́блены з жале́за. 2. ад (*на пытаньне ад каго́-чаго́? ад яко́га ча́су?*): ***Take the book from her*** Вазьмі́ кні́гу ад яе́; ***from that time*** ад таго́ ча́су; ***to escape from fire*** уцячы́ ад агню́, пажа́ру; ***From morning till night*** Ад ра́ньня да но́чы, ад ра́нку да ве́чара. 3. ад (*пасьля́ дзеяслóваў: hide, conceal, differ, distinguish, tell*): ***She concealed it from me*** Яна́ зата́ила гэ́та ад мяне́; ***Anyone can tell apples from oranges*** Ко́жны мо́жа адро́зьніць я́блыкі ад апэльсы́наў. 4. з, дзе́ля (*для абазна́чаньня прычы́ны, маты́ву*): ***from a sense of duty*** з пачуцьця́ абавя́зку; ***from my own experience*** з мае́ ўла́снае пра́ктыкі

front [frʌnt] – n. 1. пе́рад *чаго́*: ***the front of the garden*** пе́рад са́ду: ***a shirt front*** пе́рад кашу́лі. 2. пярэ́дні бок, фаса́д -а *m.* 3. Milit. фронт -у *m.*; перадавы́я пазы́цыі: ***service at the front*** слу́жба на фро́нце. 4. згуртава́насьць ро́зных гру́паў у змага́ньні (*палітычным, эканамі́чным*), фронт -у *m.*: ***the labour front*** рабо́чы фронт. 5. набярэ́жная *f.*; прымо́рскі бульва́р. 6. Informal прыкрыцьцё *n.*; фаса́д -у *m.*; шы́льда *f.*: ***The club was just a front for gangster activities*** Клюб быў то́лькі прыкрыцьцём для гангстэ́рскае дзе́йнасьці

– adj. 1. пярэ́дні: ***the front line*** пярэ́дняя лі́нія. 2. Phon. пярэ́днеязы́чны (*пра галосныя*)

– v.t. 1. быць паве́рнутым пе́радам: ***Our house fronts the park*** Наш дом паве́рнуты пе́радам да па́рку. 2. супрацьстая́ць; супраці́віцца

– v.i. 1. выхо́дзіць на *што* (*быць накіра́ваным у які́-н. бок*): ***The house fronts on the sea*** Дом выхо́дзіць на мо́ра. 2. Informal (for) служы́ць фаса́дам, прыкрыва́ць *што*

• ***change front*** завярну́ць (-ца) у і́ншы бок

• ***in front of*** пе́рад *кім-чым*

frontage ['frʌntɪdʒ] n. 1. а) фаса́д будынка, пярэ́дняя ча́стка пля́цу. б) даўжыня́ гэ́тага фаса́ду. 2. до́ступ -у *m.* (*да мо́ра, ракі, ву́ліцы*) 3. ча́стка пля́цу памі́ж будынкам і ву́ліцай (*рако́й*)

frontal ['frʌntəl] – adj. 1. ло́бны: ***frontal bones*** ло́бныя ко́сьці. 2. лабавы́: ***a frontal attack*** лабавы́ напа́д, лабава́я ата́ка. 3. Phon. пярэ́днеязы́чны

– n. 1. ло́бная косьць. 2. фаса́д -а *m.* (*до́му*)

front bench, Brit. пярэ́дня ла́ва ў парля́мэнце.

frontier [frʌn'tɪr] – n. 1. дзяржа́ўная мяжа́. 2. мяжа́ прасо́ўваньня пасяле́нцаў у ЗША. 3. перадава́я галі́на (*наву́кі*). 4. Obsol. цьвярды́ня *f.*; форт -у *m.*; паме́жны го́рад

– adj. паме́жны

front page ты́тульная старо́нка

front-page [ˌfrʌnt'peɪdʒ] – adj. зьме́шчаны на пе́ршай паласе́ газэ́ты; ва́жны

– v.t. зьмяшча́ць на пе́ршай паласе́, падкрасьля́ць ва́жнасьць *чаго́*

frost [frɔ:st] – n. 1. маро́з -у *m.*: ***sharp frost*** сьцюжа *f.*, мо́цны маро́з. 2. шэ́рань *f.*, іне́й -ю *m.* 3. хало́днасьць, сьцюдзёнасьць *f.*; су́хасьць *f.* (*пачу́ццяў або́ мане́раў*). 4. Sl. няўда́ча *f*, права́л -у *m.* 5. Informal ахаладжэ́ньне (*у сяброўстве*), адчужэ́ньне *n.*

– v.t. 1. пакрыва́ць шэ́раньню, замаро́жваць (*во́кны*). 2. паліва́ць, пакрыва́ць глязу́рай (*пірог*); пасыпа́ць цукро́вай пу́драй. 3. рабіць шкло ма́тавым. 4. маро́зіць (*кве́ткі*); замаро́жваць (*рэ́кі, ваду*)

– v.i. замярза́ць, ме́рзнуць

frostbite ['frɔ:stbaɪt] – n. адмаро́жанае або́ пашко́джанае маро́зам ме́сца, падмаро́жаньне *n.*

– v.t. **-bit, -bitten, -bitting** адмаро́жваць (*ча́стку це́ла*), падмаро́жваць

frostbitten ['frɔ:stˌbɪtən] adj. адмаро́жаны, падмаро́жаны, пашко́джаны маро́зам

frostbound ['frɔ:stbound] adj. заме́рзлы (*зямля́*), скава́ны маро́зам (*рэ́чка*)

frosting ['frɔ:stɪŋ] n. 1. глязу́ра (*для пірага́*). 2. ма́тавасьць *f.* (*шкла, мэта́лу*)

frostless ['frɔ:stləs] adj. безмаро́зны (*год, дзень*)

frosty ['frɔ:sti] adj. 1. маро́зны. 2. заме́рзлы, пакры́ты лёдам (*пра во́кны*). 3. хало́дны (*у пачу́ццях, абыхо́джаньні*), непрыя́зны: ***a frosty greeting*** хало́днае прывіта́ньне. 4. сівы́, пасіве́лы

froth [frɔ:θ] – n. 1. пе́на *f.* (*на вадзе́, і пе́на з ро́та жывёліны*). 2. пусты́я, бана́льныя гу́таркі; балбатня́ *f.*

– v.i. 1. пе́ніцца. 2. запе́ньвацца (*пакрыва́цца пе́най*)

– v.t. усьпе́ньваць, запе́ньваць; пе́ніць (*пакрыва́ць пе́най*)

frothy [ˈfrɔ:θi] adj. 1. пе́ністы: ***frothy soap suds*** пе́ністая мы́льная вада́. 2. лёгкі (*му́зыка*); плы́ткі, нява́жны (*гу́тарка*)

frown [fraʊn] – n. 1. нахму́ранасьць *f.* (*на тва́ры чалаве́ка*); пану́ры по́зірк. 2. насу́пленасьць *f.*
– v.i. хму́рыцца, быць незадаво́леным *або́* зло́сным, насу́плівацца. 2. глядзе́ць пану́ра

frowsy or **frowzy** [ˈfraʊzi] adj. 1. за́тхлы, пры́тхлы; пракі́слы, ски́слы (*пах*). 2. неаха́йны; бру́дны (*пако́й*)

frozen [ˈfroʊzən] adj. 1. заме́рзлы (*вада́, рака́*). 2. памаро́жаны (*трава́, бу́льба*). 3. замаро́жаны (*мя́са*). 4. ве́льмі сьцюдзёны. 5. Figur. хало́дны; бяз сэ́рца: ***a frozen stare*** хало́дны по́зірк

frugal [ˈfru:gəl] adj. 1. ашча́дны. 2. недарагі; сьці́плы (*невялі́кі, нязна́чны*), мізэ́рны: ***a frugal supper*** сьці́плая вячэ́ра

frugality [fru:ˈgæləti] n., pl. **-ties** ашча́днасьць *f.*

fruit [fru:t] – n. плод, фрукт -а *m.*
– v. 1. радзі́ць (*пра расьлі́ны*), дава́ць ураджа́й. 2. выро́шчваць садавіну́

fruits, pl. 1. садавіна́ *f.*, фру́кты *pl.* 2. Figur. плён, вы́нік -у *m.* (*і ў пра́цы*); прыбы́так -ку *m.*
• ***the fruits of the earth*** дары́ прыро́ды

fruiter [ˈfru:tər] n. 1. садо́вае дрэ́ва. 2. садо́ўнік -а *m.* 3. карабе́ль для перавозжаньня садавіны́

fruitful [ˈfru:tfəl] adj. 1. урадлі́вы, ураджа́йны (*дрэ́ва і гле́ба*). 2. пло́дны; пладаві́ты (*ро́зум*). 3. жыватво́рчы: ***fruitful showers*** жыватво́рчыя дажджы́. 4. плённы (*пра́ца*); карысны; выго́дны; прыбытко́вы

fruitfulness [ˈfru:tfəlnəs] n. 1. урадлі́васьць, пладаві́тасьць *f.* 2. плённасьць (*пра́цы*), прадукцы́йнасьць *f.*

fruitless [ˈfru:tləs] adj. 1. бескары́сны; дарэ́мны, ма́рны. 2. неўрадлівы; пусты́ (*цьвет, зямля́*)

frump [frʌmp] n. старамо́дна і неаха́йна апра́нутая жанчы́на, неаха́йніца *f.*

frumpish [ˈfrʌmpɪʃ] adj. 1. апра́нуты ў пашарпанае, старамо́днае адзе́ньне. 2. зласьлі́вы; ро́зкі; гру́бы

frustrate [ˈfrʌstreɪt] v.t. 1. раскіда́ць, зрыва́ць (*пля́ны*); рабіць дарэ́мнымі спадзява́ньні. 2. расчаро́ўваць

frustrated [ˈfrʌstreɪtəd] adj. расчарава́ны, зьнеахво́чаны

frustration [frʌsˈtreɪʃən] n. расчарава́насьць, фрустра́цыя *f.*, крах надзе́яў

fry I [fraɪ] **fried, frying,** – v.t. 1. сма́жыць, сква́рыць: ***to fry potatoes*** сма́жыць бу́льбу
– v.i. сма́жыцца, сква́рыцца
– n. сма́жанае мя́са, сма́жаная ры́ба, сма́жанка, смажані́на *f.*

fry II [fraɪ] n., pl. **fry** 1. дро́бная ры́ба. 2. малады́я істо́ты, драбната́, драбяза́, жамяра́ *f.*, мале́чча -ы *f.* (*і пра дзяце́й*): Informal ***small fry*** а) мале́ча (*дзе́ці*). б) ня ва́ртыя ўва́гі рэ́чы або́ лю́дзі

fryer [ˈfraɪr] n. 1. ку́рыца *або́* мя́са, прыда́тнае для сма́жаньня. 2. патэ́льня для сма́жаньня

frying pan патэ́льня *f.*
• ***out of the frying pan into the fire*** з агню́ ды ў по́лымя

fuddle [ˈfʌdəl] – v.t. Informal 1. паі́ць да п'яна́. 2. адурма́ньваць, п'яні́ць
– v.i. напіва́цца
– n. 1. ап'яне́ньне *n.* 2. адурма́неньне *n.*

fudge I [fʌdʒ] n. ірыска, карамелька; мя́ккая цукерка

fudge II [fʌdʒ] – v.i. 1. ашу́кваць. 2. выкру́чвацца ад абавяза́ньня
– n. вы́думка, мана́ *f.*

fuel [ˈfju:əl] n. 1. па́ліва *n.*, апа́л -у *m.* 2. па́ліва *n.* (*для рухавіко́ў*)

fuel oil мазу́тнае па́ліва, мазу́т -у *m.*

fugacious [fjuˈgeɪʃəs] adj. 1. нетрыва́лы. 2. мімалётны; праміну́чы, недаўгаве́чны. 3. лятучы, які́ ху́тка выпара́ецца

fugacity [fjuˈgæsəti] n. 1. мімалётнасьць, нетрыва́ласьць, праміну́часьць *f.* 2. лятучасьць *f.*

fugitive ['fju:dʒətɪv] – n. 1. зьбе́глы -ага *m.*; бягу́н -а́ *m.* 2. уцяка́ч уцекача́ *m.*, уцяка́чка *f.* 3. Obsol. дэзэртэ́р -а *m.* – adj. 1. зьбе́глы. 2. мімалётны, мінýчы. 3. вандро́ўны; бадзя́жны

fulcrum ['fʌlkrəm] n., pl. **-rums, -cra** 1. пункт апо́ры. 2. апо́ра *f.*

fulfil or **fulfill** [fʊl'fɪl] v.t. 1. выко́нваць (*абяца́ньне, абавя́зак, кантра́кт*). 2. ажыцьцяўля́ць; здавальня́ць (*вымо́гі*); адпавяда́ць (*умо́вам, мэ́це*)

fulfilment or **fulfillment** [fʊl'fɪlmənt] n. выкана́ньне, ажыцьцяўле́ньне *n.*, зьдзяйсьне́ньне, задавальне́ньне *n.*

full I [fʊl] – adj. 1. по́ўны; цэ́лы: ***a full cup*** по́ўны ку́бак; ***He ran a full mile*** Ён бег цэ́лую мі́лю. 2. сы́ты, пад'е́ўшы. 3. (*пра бра́та, сястру́*) ро́дны. 4. кру́глы: ***a full face*** по́ўны, кру́глы твар. 5. шыро́кі: ***a full skirt*** шыро́кая спадні́ца. 6. по́ўны; мо́цны: ***a full voice*** мо́цны, гу́чны го́лас

– adv. 1. цалко́м; зусі́м по́ўна. 2. якра́з, про́ста: ***The ball hit him full on the nose*** Мяч уда́рыў яго́ про́ста ў нос. 3. ве́льмі, на́дта: ***full well*** ве́льмі до́бра

• ***full of*** а) напо́ўнены, по́ўны. б) заня́ты: ***He is full of his own affairs*** У яго́ по́ўна сваі́х спра́ваў

full II [fʊl] v.t. валя́ць (*сукно́*)

fullback ['fʊlbæk] n. абаро́нца -ы *m.* (*у футбо́ле, хаке́і*)

full blood чы́стая ра́са

full-blood [ˌfʊl'blʌd] adj. ро́дны (*пра бра́та, сястру́*)

full-blooded [ˌfʊl'blʌdɪd] adj. 1. чыстакро́ўны, чы́стае ра́сы; ра́савы, паро́дзісты (*пра жывёліну*). 2. паўнакро́ўны; мо́цны

full-blown [ˌfʊl'bloʊn] adj. зусі́м распусьці́ўшыся (*пра кве́тку*); у по́ўным кве́це

full dress вечаро́вы *або́* пара́дны ўбо́р

full-length [ˌfʊl'leŋθ] adj., adv. 1. на ўве́сь рост (*пра партрэ́т, лю́стра*). 2. да зямлі́ (*пра суке́нку*), даўгі́ (*пра фу́тра, палітó*)

full moon по́ўня *f.*, по́ўны ме́сяц

ful(l)ness ['fʊlnəs] n. паўната́ *f.*, напо́ўненасьць *f.*

• ***in the fullness of time*** у свой час, у адпаве́дны час

full stop, esp. Brit. кро́пка *f.*, пункт -у *m.*; прыпы́нак -ку *m.*

full time по́ўны працо́ўны дзень

full-time [ˌfʊl'taɪm] adj. по́ўначасо́вы: ***a full-time job*** пра́ца на по́ўны працо́ўны час.; ***full-time worker*** шта́тны працаўні́к

fully ['fʊli] adv. 1. ца́лкам, цалко́м; зусі́м; по́ўнасьцю: ***a fully automatic*** по́ўнасьцю аўтаматы́чны. 2. дастатко́ва, бага́та. 3. дакла́дна

fulminant ['fʊlmɪnənt] adj. 1. мала́нкавы, бліскаві́чны, грамавы́. 2. (*пра хваро́бу*) раптóўны, хуткацёчны

fulminate ['fʊlmɪneɪt] – v.t 1. граміць (*і ў дру́ку*). 2. суро́ва га́ніць, крытыкава́ць

– v.i. 1. раптóўна разьвіва́цца (*пра хваро́бу*). 2. выбуха́ць. 3. грыме́ць і бліскаць

fulmination [ˌfʊlmɪ'neɪʃən] n. 1. суро́вае асуджэ́ньне, зга́неньне. 2. гвалтóўны вы́бух

fulsome ['fʊlsəm] adj. 1. шчо́дры. 2. перабо́льшаны, няшчы́ры (*пра пахвалу́*). 3. Archaic агі́дны; пры́кры

fume [fju:m] – n. 1. *often* **fumes** па́ра *f.*, газ -у *m. або́* дым -у *m.* (*асабліва шко́дны*); выпарэ́ньні *pl.* 2. мо́цны пах (*кве́так, парфу́мы*). 3. паху́чы дым (*як з лада́ну або́ папяро́саў*). 4. вы́бух зло́сьці: ***in a fume*** у зло́сьці, са зло́сьці

– v.i. 1. випа́рвацца; дыміцца; па́хнуць, тхнуць, патыха́ць: ***He fumed with beer*** Ад яго́ патыха́ла пі́вам. 2. злава́цца

– v.t. абку́рваць (*ды́мам*)

fumigate ['fju:mɪgeɪt] v.t. 1. дэзынфікава́ць (*ды́мам або́ выпарэ́ньнямі*); абку́рваць

fumigation [ˌfju:mɪ'geɪʃən] n. 1. абку́рваньне *n.* 2. дым *або́* выпарэ́ньні, ужыва́ныя пры абку́рваньні

fumy ['fju:mi] adj. 1. ды́мны; по́ўны ды́му *або́* выпарэ́ньняў. 2. які́ ды́міць *або́* выдзяля́е выпарэ́ньні, пах

fun [fʌn] n. 1. паце́ха, заба́ва *f.* 2. жарт -у *m.*
• ***for*** or ***in fun*** дзеля жа́рту, жа́ртам
• ***make fun of*** or ***poke fun at*** высьме́йваць *каго́-што*

function ['fʌŋkʃən] – n. 1. а) дзе́яньне *n.*; прызначэ́ньне *n.* б) абавя́зак -ку *m.*, абавя́зкі *pl.*; прафэ́сія *f.* 2. грама́дзкая ўрачы́стасьць *або́* збо́рка. 3. Math. фу́нкцыя *f.*
– v.i. дзе́яць, працава́ць

functional ['fʌŋkʃənəl] adj. дзе́йны; функцыяна́льны

functionary ['fʌŋkʃəneri] – n., pl. **-aries** урадо́вец -ўца *m.*; функцыянэ́р -а, службо́вец -ўца, чыно́ўнік -а *m.*, чыно́ўніца *f.*: ***party functionary*** партыйны функцыянэ́р
– adj. афіцыйны

fund [fʌnd] – n. 1. фонд -у *m.* 2. запа́с -у *m.*
– v.t. 1. фінансава́ць. 2. кансалідава́ць (*капіта́л*). 3. уклада́ць (*капіта́л*). 4. адклада́ць су́му гро́шай
• ***funds*** а) гро́шы *pl.*, сро́дкі *pl.*; капіта́л -у *m.*

fundament ['fʌndəmənt] n. 1. фунда́мэнт -а *m.*, падму́рак -ка *m.*; асно́ва *f.* 2. а) аза́дак -ка *m.*, я́гадзіцы *pl.* б) за́дні прахо́д (*у чалаве́ка*)

fundamental [ˌfʌndə'mentəl] – adj. 1. асно́ўны. 2. грунто́ўны; істо́тны, гало́ўны, фундамэнта́льны: ***fundamental changes*** грунто́ўныя зьме́ны
– n. **fundamentals** асно́вы *pl.*

fundamentally [ˌfʌndə'mentəli] adv. у асно́ўным

funeral ['fju:nərəl] – n. 1. пахо́віны *pl. only*, пахава́ньне *n.* 2. пахава́льная працэ́сія
– adj. пахава́льны: ***funeral home*** or ***parlor*** пахава́льнае бюро́

fungous ['fʌŋgəs] adj. губча́ты, губкава́ты; по́рысты.

fungus ['fʌŋgəs] n., pl. **-gi, -guses** 1. грыб, плёсьня *f.*, губа́-грыб (*на дрэ́вах*). 2. не́шта, што ху́тка зьяўля́ецца або́ расьце́, як грыб. 3. Med. грыбо́к -ка́ *m.*

funicular [fju'nɪkjələr] adj. кана́тны: ***funicular railway*** кана́тная даро́га, фунікулёр -а *m.*

funk [fʌŋk] – n., Informal 1. пярэ́палах -у *m.*, па́ніка *f.* 2. баязьлі́вец -ўца *m.*, язьлі́ўка *f.*
– v.t. 1. бая́цца. 2. пало́хаць. 3. уніка́ць; ухіля́цца
– v.i. стара́цца адыхо́дзіць ад *чаго́*, выхо́дзіць, выступа́ць

funnel ['fʌnəl] n. 1. ле́йка *f.* 2. кру́глы мэталёвы ко́мін (*у караблі́*). 3. вэнтыляцы́йная ша́хта

funny ['fʌni] adj. 1. сьме́шны, сьмяхо́тны; заба́ўны, кам'і́чны: ***in a funny way*** сьмяхо́тна, сьме́шна, заба́ўна. 2. Informal дзі́ўны, дзіво́сны; дзіва́цкі (*хара́ктар*), дзівакава́ты (*чалаве́к*)

funnyman ['fʌnimən] n., pl. **-men**, Informal гумары́ст -а *m.* (*пісьме́ньнік*), ко́мік -а *m.* (*акто́р*)

fur [fɜ:r] – n. 1. поўсьць, шэрсьць *f.* 2. **furs** ску́ры пу́шных жывёлаў: ***fur coat*** фу́тра *n.* 3. на́кіп -у *m.* (*у катле́*); аса́дак -ку *m.* (*у бо́чцы*); налёт -у *m.* (*на языку́ ў хво́рага*)
– v. 1. падбіва́ць фу́трам. 2. пакрыва́цца налётам

fur trader ску́пнік ску́раў, фу́тра

furbearer ['fɜ:rberər] пушны́ зьвер

furbelow ['fɜ:rbəlou] n. фальбо́на (*у суке́нцы*)

furbish ['fɜ:rbɪʃ] v.t. 1. паліраваць, наво́дзіць гля́нец. 2. рамантава́ць; паднаўля́ць; адсьвяжа́ць (*фа́рбы, ве́ды*)

furious ['fjʊriəs] adj. 1. разьлютава́ны; разбушава́ны, разья́траны (*ве́цер*). 2. разью́шаны (*зьвер*), зло́сны (*по́зірк*), мо́цна ўзлава́ны: ***He was furious*** Ён мо́цна ўзлава́ўся. 3. шалёны (*бег*): ***a furious gallop*** шалёны галёп

furiously ['fjʊriəsli] adv. лю́та; разью́шана; шалёна

furl [fɜ:rl] v.t. зго́ртваць (*кры́лы*), скру́чваць (*ве́тразі*), закрыва́ць (*парасо́н*)

furnace [ˈfɜːrnɪs] n. 1. го́рлан -на *m.*, плаві́льная печ. 2. печ для аграва́ньня, то́пка *f.*

furnish [ˈfɜːrnɪʃ] v.t. 1. забясьпе́чваць; дастаўля́ць, дастача́ць (*інфарма́цыю*). 2. мэблява́ць, абсталёўваць мэ́бляю: ***furnished apartment*** мэблява́ная кватэ́ра

furnishings [ˈfɜːrnɪʃɪŋz] n. а) абсталява́ньне *n.*, мэ́бля *f.* б) прынале́жнасьці адзе́ньня

furniture [ˈfɜːrnɪtʃər] n. 1. мэ́бля *f.* 2. абсталява́ньне *n.* 3. уве́сь інвэнта́р -а́ *m.* 4. зьме́сьціва *n.*

furrow [ˈfɜːroʊ] – n. 1. баразна́, баразёнка *f.* 2. каляі́на *f.* (*ад ко́лаў*), жо́лаб -у *m.* (*размы́ты вадо́ю*), разо́ра *f.* 3. скла́дка, змо́ршчына *f.* 4. Poet. а) ралля́ *f.* б) ні́ва *f.*; по́ле *n.*

– v.t. 1. ара́ць. 2. баразьні́ць. 3. мо́ршчыць, утвара́ць мо́ршчыны. 4. расьсяка́ць (*хва́лі, паве́тра*)

– v.i. 1. мо́ршчыцца (*пра твар*), зьбіра́цца ў маршчы́ны. 2. рабаці́цца (*пра паве́рхню вады́*)

furrowy [ˈfɜːroʊi] adj. маршчы́ністы (*пра твар і пра нярО́ўную паве́рхню*)

further [ˈfɜːrðər] *compar.* – adv. and adj., *superl.* **furthest** 1. дале́й: ***further down*** дале́й унізе *або́* ўні́з. 2. шырэ́й; падрабя́зьней, больш: ***Inquire further into the matter*** Разьве́дай падрабя́зьней пра спра́ву. 3. у дада́так да, зато́ым, таксама́; апрача́ таго́: ***Let me further tell you*** Дазво́льце мне дада́ць

– adj. 1. дале́йшы. 2. дадатко́вы

– v.t. падтры́мваць; дапамага́ць правёсьці *што*; спрыя́ць

furtherance [ˈfɜːrðərəns] n. 1. прасо́ўваньне, падтры́мваньне *n.* 2. падтры́мка, дапамо́га *f.*; павышэ́ньне *n.*

furthermore [ˈfɜːrðərmɔːr] adv. да таго́ ж; апрача́ таго́, акрамя́ таго́; звыш таго́, таксама́

furthermost [ˈfɜːrðərmoʊst] adj. найдале́йшы, найбо́льш адле́глы

furthest [ˈfɜːrðɪst] superl. – adv. найдале́й

– adj. найдале́йшы, найбо́льш адда́лены, адле́глы

furtive [ˈfɜːrtɪv] adj. 1. зро́блены крадко́м, упо́тайкі *або́* цішко́м, патайны́, скры́тны: ***a furtive glance*** по́зірк крадко́м. 2. хі́тры; схава́ны

furtively [ˈfɜːrtɪvli] adv. крадко́м, упо́тай; упо́тайкі, цішко́м; скры́та

furuncle [ˈfjʊrʌŋkəl] n., Med. ску́ла *f.*, фуру́нкул -а *m.*

fury [fjʊri] n., pl **-ries** 1. шал -у *m.*, разью́шанасьць *f.* 2. гвалто́ўнасьць (*урага́ну*), заўзя́тасьць *f.* (*бо́ю*). 3. ашале́лы ад зло́сьці; зьлю́ка (*асабл. пра жанчы́ну*). 4. нясто́мная энэ́ргія, заўзя́тасьць *f.*: ***to work with fury*** працава́ць заўзя́та

Fury [fjʊri] n., pl. **-ries,** Myth. фу́рыя *f.*

fuse I [fjuːz] n. 1. ко́рлак -ка *m.* (*электры́чны засьцерага́льнік*). 2. кнот -а *m.* (*у бо́мбе, снара́дзе*)

fuse II [fjuːz] – v.t. 1. пла́віць. 2. сплаўля́ць (*злуча́ць шля́хам пла́ўкі*)

– v.i. пла́віцца, сплаўля́цца (*пра мэта́л*); тапі́цца (*пра сьве́чку*)

fuselage [ˈfjuːsəlɑːʒ] n. ко́рпус (*самалёта, верталёта*), фюзэля́ж - а *m.*

fusibility [ˌfjuːzəˈbɪlətɪ] n. пла́ўкасьць *f.*

fusible [ˈfjuːzəbəl] adj. пла́ўкі

fusillade [ˈfjuːsəleɪd] – n. 1. страляні́на, за́лпавы аго́нь. 2. Figur. залп: ***a fusillade of questions*** град пыта́ньняў

– v.t. атакава́ць за́лпавым агнём

fusion [ˈfjuːʒən] n. 1. плаўле́ньне, тапле́ньне *n.*; спла́ўліва́ньне *n.*, спла́ўка *f.* 2. распла́ўленая *або́* расто́пленая ма́са; сплаў -ву *m.* 3. зьліцьцё *n.*, спалучэ́ньне, аб'ядна́ньне *n.*

• ***fusion bomb*** вадаро́дная бо́мба

fuss [fʌs] – n. 1. празьме́рная мітусьня́. 2. пусты́я гу́таркі *або́* турбо́ты. 3. мітусьлі́вец -ўца *m.*, неспако́йны чалаве́к

– v.i. мітусі́цца

– v.t. выклі́каць неспако́й, турбава́ць

fussy [ˈfʌsi] adj. 1. мітусьлі́вы, сумятлі́вы, неспако́йны. 2. перабо́рлівы, патрабава́льны. 3. по́ўны аздо́баў: ***a fussy dress*** суке́нка з замыслава́тым фасо́нам

fusty ['fʌsti] adj. 1. за́тхлы; цьві́лы́, заплясьне́лы; цяжкі (*пра паве́тра*). 2. старамо́дны; застарэ́лы, адста́лы

futile ['fju:təl] adj. 1. дарэ́мны, ма́рны; няўда́лы; бескары́сны. 2. нява́жны, малава́жны. 3. пусты́; бязмэ́тны: ***a futile life*** пусто́е, бязмэ́тнае жыццё

futility [fju'tıləti] n., pl. **-ties** 1. дарэ́мнасьць, ма́рнасьць, бескары́снасьць *f.* 2. малава́жнасьць, нява́жнасьць *f.*; легкаду́мнасьць *f.* 3. малава́жныя дзе́яньні, за́хады, падзе́і

future ['fju:tʃər] – n. 1. бу́дучыня, пры́шласьць *f.*: ***for the future*** на бу́дучыню; ***in the future*** у бу́дучыні; ***A young man with a future*** Малады́ чалаве́к з бу́дучыняй. 2. Gram. бу́дучы час дзеясло́ва

– adj. бу́дучы. а) ***future events*** бу́дучыя падзе́і. б) Gram. ***future tense*** бу́дучы час

• ***futures*** ф'ю́чэрсы (*бі́ржава́я ку́пля або́ про́даж тава́раў напе́рад*)

futurism ['fju:tʃərızəm] n. футары́зм -у *m.*

futurist ['fju:tʃərıst] n. футары́ст -а *m.*, футары́стка *f.*

futuristic [ˌfju:tʃə'rıstık] adj. 1. футары́стычны. 2. бу́дучы; прадба́чаны ў бу́дучыні

fuze ['fju:z] n. 1. дыстанцы́йная тру́бка (*для падры́ву снара́да, бо́мбы*), кнот -а *m.* 2. Electr. ко́plак -ка *m.*; *гл.* **fuse I**

fuzz [fʌz] – n. 1. пушы́нка *f.*; варсі́нкі, валаскі́ *pl.*; пух -у *m.*, пушло́к -ку́ *m.*: ***Peaches covered with fuzz*** Пэ́рсікі пакры́тыя пушко́м. 2. Sl. паліцыя́нт -а, мент мянта́, дэтэкты́лу́ -ва *m.*

– v.t. рабі́ць пушы́стым; пакрыва́ць пушко́м *або́* пушы́нкамі

– v.i. 1. пакрыва́цца пласто́м дро́бных пушы́нак. 2. разьлята́цца, як пух

fuzzy ['fʌzi] adj. 1. пушы́сты, як пух. 2. пакры́ты пушко́м. 3. зама́заны, няя́сны (*пра здымак*)

fyke [faık] n. рыба́цкая се́тка ў фо́рме ме́ха

G

G, g [dʒi:] n., pl. **G's, g's** 1. *сёмая лі́тара анге́льскага альфабэ́ту.* 2. Mus. соль (*но́та*)

gab [gæb] – n. 1. балбатня́ *f.*, шчэ́бет -у *m.*, шчабята́ньне *n.* (*пту́шкі, дзіця́ці*) – v.i. безупы́нна гаварыць; шчабята́ць; мало́ць языко́м

gabardine ['gæbədi:n] n. габардын -у *m.*

gabber ['gæbər] n., Informal гавару́н -а́ *m.*, гавару́ха *f.*; балбату́н -а́ *m.*, балату́ха *f.*

gabbiness ['gæbinəs] n., Informal балбатлі́васьць, гаварлі́васьць *f.*

gabble ['gæbəl] – v.i. 1. мало́ць языко́м. 2. балбата́ць; саката́ць. 3. гагата́ць (*пра гусь*)
– n. 1. балбатня́ *f.* 2. го́гат -у *m.* (*гусе́й*).

gabby ['gæbi] adj. **-bier, -biest,** Informal гаваркі́, гаварлі́вы; балбатлі́вы

gad I [gæd] **gadded, gadding,** – v.i. бадзя́цца, швэ́ндацца, сно́ўдацца; вандрава́ць
– n. 1. бадзя́ньне, туля́ньне *n.* 2. бадзя́гла, валацу́гла, туля́гла -і *m. & f.*

gad II [gæd] – n. 1. ражло́н -на́ *m.* 2. зубі́ла *n.*, клін -а *m.* (*для адбіва́ньня вугля́, руды́, ска́лаў*)
– v.t. паро́ць; кало́ць; по́ркаць (*чым-н. во́стрым*). 2. адко́лваць; адшчапля́ць

gadabout ['gædəˌbaut] Informal бадзя́гла, валацу́гла *m. & f.*, туля́гла -і *m.*

gadbee ['gædbi:] n. авадзе́нь -ня́ *m.*

gadfly ['gædflaɪ] n. 1. авадзе́нь, сляпле́нь -ня́ *m.* 2. назо́ла -ы *m. & f.*

gadget ['gædʒɪt] n. 1. прыла́да *f.* 2. мэха́нічная нави́нка. 3. ца́цка, заба́ўка *f.*

Gael [geɪl] n. 1. шатля́ндзкі го́рац. 2. шатля́ндзкі (*радзе́й ірля́ндзкі*) кельт

Gaelic ['geɪlɪk] – adj. 1. ке́льцкі. 2. ірля́ндзкі
– n. 1. шатля́ндзкая мо́ва. 2. ірля́ндзкая мо́ва

gag [gæg] – n. 1. за́ткала *n.*, за́тычка *f.* (*затыка́ць рот*). 2. зага́д, пастано́ва спыні́ць дыскусію. 3. прыстасава́ньне трыма́ць рот адкры́тым падча́с апэра́цыі. 4. жарт -у *m.*, штука́рства *n.*
– v.t. 1. затыка́ць рот. 2. прымуша́ць маўча́ць, не дава́ць гаварыць
– v.i. душы́цца ад вані́таў

gage I [geɪdʒ] n. 1. вы́клік -у *m.* 2. закла́д -у *m.*

gage II [geɪdʒ] n., v.t. *гл.* **gauge**

gaiety ['geɪəti] n., pl. **-ties** 1. весяло́сьць, ра́дасьць *f.*, вясёлы настро́й. 2. уцехі *pl.*, вясёлыя заба́вы, гуля́нкі. 3. я́ркасьць, страка́тасьць (*суке́нкі*)

gaily ['geɪli] *таксама* **gayly**, adv. 1. вясёла; ра́дасна. 2. я́рка: ***She was gaily dressed*** Яна́ была́ адзе́тая на́дта страка́та

gain I [geɪn] – v.t. 1. выйграва́ць: ***to gain time*** вы́йграць час. 2. атры́мваць, забясьпе́чваць (*сабе́*). 3. дамага́цца, дасяга́ць. 4. сьпяша́цца (*пра гадзі́ньнік*). 5. выга́дваць: ***How much do I***

gain by that? Ко́лькі я вы́гадаю гэ́тым? 6. прыбыва́ць; дабіра́цца; дасяга́ць: ***The swimmer gained the shore*** Плыве́ц дасягну́ў бе́рагу. 7. дадава́ць: ***to gain weight*** прыбы́ць на ва́зе: ***to gain strength*** набіра́цца сі́лаў
– v.i. 1. прыно́сіць карысьць, быць карысным; мець карысьць, карыста́ць. 2. рабіць по́ступ
– n. 1. прыбы́так -ку *m.*; прыро́ст -у *m.* (*ху́ткасьці*); вы́йгрыш -у *m.*; карысьць *f.* 2. прыбыва́ньне, павелічэ́ньне *n.* 3. нажы́ва *f.*: ***Greed is love of gain*** Пра́гнасьць — гэ́та імкне́ньне да нажывы
• ***gain on*** or ***upon*** даганя́ць
• ***gain over*** пераканаць, перацягну́ць на свой бок
• ***gains*** прыбы́ткі, зароб́кі *pl.*; дахо́д -у *m.*

gain II [gem] adj. 1. выго́дны; карысны; адпаве́дны. 2. зру́чны; спра́ўны, уме́лы

gainful ['gemfəl] adj. 1. дахо́дны; прыбыткоўвы; выго́дны, карысны: ***a gainful occupation*** дахо́дная прафэ́сія

gainsay [ˌgem'sei] – v., **-said** or **sayed, saying** 1. пярэ́чыць, супярэ́чыць; дыспутава́ць, спрача́цца. 2. супрацьдзе́яць, супрацьста́віцца
– n. пярэ́чаньне, адмаўле́ньне, супярэ́чаньне *n.*

gait [geit] n. хада́, паходка *f.*

gala ['geilə] – n. урачы́стасьць *f.*; сьвя́та *n.*, фэстыва́ль -ю *m.*
– adj. урачы́сты, з урачы́стасьцямі; сьвято́чны; пара́дны: ***gala dress*** пара́дны ўбо́р; ***gala night*** га́ля-спэкта́кль

galaxy ['gæləksi] n., pl. **-axies** 1. галя́ктыка *f.* 2. плея́да *f.*, імпаза́нтная, ве́лічная гру́па

Galaxy ['gæləksi] n. Мле́чны Шлях, Птушы́ная Даро́га

gale I [geil] n. 1. ве́льмі мо́цны ве́цер, шторм -у *m.*, бу́ра *f.* 2. раска́т, вы́бух -у *m.*: ***gale of laughter*** вы́бух сьме́ху. 3. Poet. ве́трык -а *m.*, зэфі́р -у *m.* 4. Informal весяло́сьць *f.*; падня́ты настро́й, ра́дасная ўсхвалява́насьць

gale II [geil] n. Brit. пэрыяды́чная пла́та рэ́нты, працэ́нтаў

gale III [geil] n. Bot. васко́ўнік -а *m.* (*куст, расьце́ на балоце*)

gall I [gɔ:l] n. 1. жоўць *f.* 2. жо́ўцевы пухі́р. 3. раздражне́ньне *n.*, злосьць, го́рыч *f.*; няна́вісьць *f.*
• ***dip one's pen in gall*** піса́ць зь няна́вісьцю й зло́сьцю

gall II [gɔ:l] – v.t. 1. наму́льваць, націра́ць (*ра́ну*). 2. злава́ць, раздражня́ць. 3. дакуча́ць, назаля́ць (*во́рагу напа́дамі*); турбава́ць
– v.i. 1. наму́львацца, націра́цца (*да крыві*). 2. рабіць зло́сныя заўва́гі; абража́ць (*го́нар*)
– n. 1. ра́на *f.* 2. нацёртае ме́сца

gallant ['gælənt] – adj. 1. высакаро́дны, му́жны; адва́жны. 2. ве́лічны; урачы́сты. 3. прыго́жы, пы́шны. 4. [gə'lænt] галя́нтны, далика́тны; любо́ўны: ***gallant adventures*** любо́ўныя прыго́ды
– n. 1. адва́жны, му́жны чалаве́к. 2. фарсу́н -а́ *m.*, франт -а *m.* 3. кавале́р -а *m.* 4. залётнік -а *m.*: ***to play the gallant*** фліртава́ць; заляца́цца
– v.t. 1. заляца́цца. 2. суправаджа́ць

gallantry ['gæləntri] n., pl. **-ries** 1. высакаро́днасьць, му́жнасьць, адва́га *f.* 2. галя́нтнасьць, далика́тнасьць *f.* 3. ласка́васьць, ве́тлівасьць *f.*; камплімэ́нт -у *m.*; прые́мныя сло́вы

gall bladder жо́ўцевы пухі́р

gallery ['gæləri] n., pl. **-leries** 1. галерэ́я *f.* 2. галерэ́я (*у тэа́тры, цы́рку*), галёрка *f.* 3. а) галерэ́я, маста́цкі музэ́й. 4. карці́нная галерэ́я

galley ['gæli] n., pl. **-leys** 1. гале́ра *f.* 2. ка́мбуз -а *m.* (*ку́хня на вадапла́ве*): ***galley slave*** сасла́ны на гале́ры; ка́таржнік -а *m.*

galley proof Print. гра́нка *f.*

Gallic ['gælik] adj. 1. га́льскі (*пра культу́ру, мо́ву га́лаў*). 2. га́льскі, францу́скі: ***Gallic wit*** францу́ская дасьці́пнасьць

gallium ['gæliəm] n. Chem. га́лій -ю *m.*

gall-less ['gɔ:ləs] adj. 1. бяз жо́ўці. 2. бяз го́рычы *або́* няна́вісьці

gallon ['gælən] n. галён -а *m.* (*ме́ра ва́дкасьці — 3,78 л*)

galloon [gə'lu:n] n. 1. галу́н -у́ *m.* 2. нашы́ўка з пало́скі галуну́

gallop ['gæləp] – n. галёп -у *m.*: ***at a gallop*** галёпам

– v.i. 1. бе́гчы галёпам (*пра каня*). 2. ве́льмі ху́тка гаварыць *або́* чыта́ць

– v.t. гнаць каня́ галёпам

• ***speak at a gallop*** гаварыць ве́льмі ху́тка

gallows ['gælouz] – n., pl. **-lowses** or **-lows** 1. ві́сельня, шыбеніца *f.* 2. пакара́ньне пове́шаньнем

– adj. 1. Archaic or Sl. ва́рты пове́шаньня; злачы́нны, ліхадзе́йны. 2. свабо́льны, гарэ́зьлівы, непаслухмя́ны, шко́дны: ***gallows children*** гарэ́зы, няпо́слухі; шкадляры́, праку́ды

gallows humor гу́мар з-пад шыбеніцы

gallstone ['gɔ:lstoun] n. жо́ўцевы ка́мень

galore [gə'lɔ:r] – adv. удо́сыць, у даста́тку, у вялі́кай ко́лькасьці, шмат: ***There is fruit galore*** Вялі́кі ўраджа́й садавіны́

– adj. шматлі́кі: ***problems galore*** шматлікія праблéмы, шмат праблéмаў

– n. даста́тлак -ку *m.*, бага́цьце *n.*; вялі́кая ко́лькасьць

galosh [gə'lɑ:ʃ] n., usually **galoshes** 1. галёш -а *m.* 2. Obsol. чарави́к на драўля́най падэ́шве

galvanic [gəl'vænik] adv. 1. гальвані́чны. 2. узбуджа́льны. 3. нечака́ны; нената́ральны, удава́ны (*пра ўсьме́шку*)

galvanise ['gælvənaiz] v.t. esp. Brit., *гл.* **galvanize**

galvanization [ˌgælvənə'zeiʃən] n. 1. гальваніза́ваньне *n.* 2. гальваніза́цыя *f.*

galvanize ['gælvənaiz] v.t. 1. гальванізава́ць. 2. пакрыва́ць (*жале́за або́ сталь*) то́нкім пласто́м цы́нку. 3. узбудзі́ць ра́птам (*не́йкае пачуцьцё*); пабуджа́ць, уздыма́ць (*да дзе́яньня*)

gamble ['gæmbəl] – n. 1. аза́ртная гульня́. 2. рызыко́ўнае прадпрыéмства *або́* спра́ва

– v.i. 1. гуля́ць у аза́ртныя гу́льні. 2. рызыкава́ць, спэкулява́ць: ***to gamble in stocks*** спэкулява́ць на бі́ржы

– v.t. рызыкава́ць (*грашы́ма, жыцьцём*), закладáцца на *што*

• ***gamble away*** прайгра́ць (*праз ры́зыку, нядба́льства*); растра́ціць (*гро́шы*)

gambler ['gæmblər] n. 1. аза́ртны гуле́ц. 2. афэры́ст -а *m.*, афэры́стка *f.*

gambol ['gæmbəl] – n. вясёлыя падско́кі (*у ско́ках ці гуля́ньні*), свабо́льнасьць *f.*

– v.i. гайса́ць, го́йсаць, вясёла падско́кваць: ***Lambs were gamboling in the meadows*** Аве́чкі гайса́лі на лу́зе

game I [geim] – n. 1. гульня́ *f.*; прыла́ды для гульні́. 2. Sport. гульня́, па́ртыя *f.*: ***to lose a game*** прайгра́ць гульню́. 3. дзі́кая зьверына́, дзічы́на *f.*

– adj. 1. адва́жны, энэргі́чны; заўзя́ты, з запа́лам. 2. ахво́ча гато́вы зрабі́ць што-н.: ***to be game for anything*** быць гато́вым на ўсё, нічо́га не бая́цца

– v.i. гуля́ць у аза́ртныя гу́льні на гро́шы: ***to game deep*** гуля́ць на высо́кую ста́ўку

– v.t. раскіда́ць, прамента́чваць гро́шы; ба́віць час за аза́ртнымі гу́льнямі: ***to game away one's inheritance*** прамента́чыць сваю́ спа́дчыну

• ***be on or off one's game*** быць до́брым або́ благі́м гульцо́м

• ***die game*** заме́рці ў баі́, му́жна заме́рці

• ***game laws*** пра́вілы палява́ньня, рыбало́ўлі; зако́ны ахо́вы дзічыны́

• ***games*** атлетычныя спабо́рніцтвы: ***the Olympic games*** Алімпі́йскія гу́льні

• ***make game of*** сьмяя́цца, насьміха́ць з *каго́-чаго́*; кпіць з *каго́-чаго́*

• ***play the game,*** Informal а) гуля́ць паво́дле пра́вілаў. б) дзе́йнічаць сумле́нна

• ***The game is up*** Спра́ва прайгра́ная; Плян ня ўда́ўся

game II [gem] adj., Informal скале́чаны. зьнявéчаны (*пра нагу́, руку́*); кульга́вы

gamekeeper ['geɪmˌki:pər] n. лясьні́к -а *m.* (*які́ ахо́ўвае дзі́кую зьверыну́*)

gamete ['gæmi:t] Biol. рухо́мая палава́я кле́тка расьлінных і жывёльных арга́нізмаў, гамэ́та *f.*

gamin ['gæmɪn] n. ву́лічны хлапчу́к, беспрыту́льны -ага *m.*

gamma ['gæmə] n., pl. **-mas** га́ма, трэ́цяя лі́тара грэ́цкага альфабэ́ту

gamma rays, pl., Phys. га́ма-прамяні́

gammon I ['gæmən] – n. вэ́нджаны кумпя́к

– v.t. салі́ць, вэ́ндзіць (*мя́са, ры́бу*)

gammon II ['gæmən] – v.i. 1. загаво́рваць зу́бы (*з мэ́тай ашука́ньня*). 2. прыкі́двацца, удава́ць

– v.t. ашу́кваць *каго́*

– n. Brit., Informal лухта́ *f.*

gamut ['gæmət] 1. Mus. га́ма *f.* 2. паўната́ ў шэ́рагу, ра́дзе: ***He ran a gamut from praise to contempt*** Ён прайшо́ў шлях ад пахвалы́ да пага́рды

gamy ['geɪmi] adj. 1. з па́хам *або́* сма́кам дзічы́ны, з душко́м. 2. бага́ты на дзічы́ну. 3. му́жны; по́ўны запа́лу; гарачы. 4. Sl. непрысто́йны, бры́дкі; салёны, саланава́ты (*пра анэкдо́т*)

gander ['gændər] – n. 1. гуса́к -а́ *m.* 2. ёлуп -а *m.*, ёлупень -ня *m.* 3. Sl. праця́глы по́зірк: ***take a gander*** прыгле́дзецца

– v.i., Sl. агляда́ць, разгляда́ць, прыгляда́ць

gang [gæŋ] – n. 1. ша́йка, ба́нда *f.*; хэ́ўра *f.*; кліка *f.*: ***a gang of thieves*** ба́нда зладзе́яў; ***a political gang*** палітычная хэ́ўра. 2. а) брыга́да рабо́тнікаў. б) гру́па вя́зьняў. 3. камплє́кт прадметаў, прыла́даў: ***a gang of oars*** камплє́кт ве́слаў. 4. табу́н але́няў *або́* бізо́наў

– v.i. 1. (together) сябрава́ць, утвара́ць гру́пу. 2. напада́ць гру́пай, ба́ндай

• ***gang up on*** спалучы́цца ў апазы́цыю *або́* да супо́льнага супраці́ву

gangboard ['gæŋbɔ:rd] n. схо́дня *f.*, памо́ст, трап -у *m.*, кла́дка *f.* (*для вы́хаду з карабля́*),

ganger ['gæŋər] n. нагля́дчык, дзяся́тнік -а *m.*

gangling ['gæŋlɪŋ] adj. цыба́ты, няўклю́дны

ganglion ['gæŋgliən] n., pl. **-glia** or **-glions** 1. Anat. га́нгліі́ -я *m.* (*ско́пішча нэрво́вых кле́так, нэрво́вых вузло́ў*). 2. цэ́нтар сі́лы, дзе́йнасьці, зацікаўле́ньня́ў. 3. Med. пухлі́на *f.*, кіста́ *f.*

gangplank ['gæŋplæŋk] n. *гл.* **gangboard**

gang plow двухлямешны *або́* шматлямешны плуг

gangrene ['gæŋgri:n] – n. гангрэ́на *f.*

– v.t. выклі́ка́ць гангрэ́ну

– v.i. падпада́ць гангрэ́не; гні́сьці́, гні́ць

gangrenous ['gæŋgrɪnəs] adj. гангрэно́зны, пашко́джаны гангрэ́най

gangster ['gæŋstər] – n. га́нгстэр, банды́т -а *m.*

– adj. га́нгстэрскі

gangsterism ['gæŋstərˌɪzəm] n. 1. гангстэры́зм (*арганізава́ная злачы́насьць*), бандыты́зм -у *m.* 2. га́нгстэры *pl.*

gangway ['gæŋweɪ] n. 1. прахо́д -у *m.* (*паміж рада́мі*). 2. а) увахо́д з тра́па. б) схо́дня *f.* в) прахо́д на караблі́. 3. Brit. папярэ́чны прахо́д, які́ падзяля́е пала́ту абшчы́наў на дзьве ча́сткі. 4. штрэк -у *m.* (*у капа́льні*)

gaol [dʒeɪl] – n., Brit. астро́г -у *m.*, турма́ *f.*

– v.t. саджа́ць у астро́г

gaoler ['dʒeɪlər] n., Brit. астро́жны нагля́дчык

gap [gæp] n. 1. прало́м -у *m.*, дзі́рка *f.* (*у пло́це, сьцяне́*). 2. а) прамя́жлак -ку *m.*; прага́л, прабе́л, про́пуск -у *m.* (*на бля́нках*). б) хі́ба *f.*, недахо́п -у *m.* 3. вялі́кае разыхо́джаньне, ро́зьніца ў пагля́дах. 4. го́рны прахо́д, ву́зкая цясьні́на ў гара́х

• ***fill a gap*** запо́ўніць прага́л; ліквіда́ваць недахо́пы

gape [geɪp] – v.i. 1. шыро́ка раскрыва́ць рот; пазяха́ць. 2. глядзе́ць, разя́віўшы рот ад зьдзіўле́ньня. 3. (for) шука́ць, мо́цна хаце́ць *чаго́*

– n. 1. дзі́рка, адту́ліна, зе́ўра *f.* 2. разяўля́ньне *n.*, пазяха́ньне *n.*, по́зех -у *m.* 3. зьдзі́ўлены по́зірк. 4. пра́га *f.* (*ве́даў*), хаце́ньне *n.*

• ***gapes*** пры́ступ пазяха́ньня

garage [gə'rɑ:ʒ] – n. гара́ж -а́ *m.*, аўтагара́ж -а́ *m.*

– v.t. ста́віць *або́* трыма́ць у гаражы́

garb [gɑ:rb] – n. адзе́ньне *n.*, во́пратка *f.*; убо́р -у *m.*: ***military or priestly garb*** вае́ннае або́ сьвята́рскае адзе́ньне; ***peasant garb*** сялянская во́пратка

– v.t. адзява́ць, апрана́ць

garbage ['gɑ:rbɪdʒ] n. 1. сьме́цьце *n.*; кухо́нныя адкі́ды, адпа́ды. 2. Informal бязвартасная літарату́ра, маста́цтва; макулату́ра *f.*

garbage can сьме́тніца *f.*

garbage truck сьмецьцявоз -а *m.*; грузаві́к, які́ вывозіць сьме́цьце

garble ['gɑ:rbəl] – v.t., **-bled, -bling** 1. падтасо́ўваць (*фа́кты*), наўмы́сна скажа́ць, падабра́ўшы то́лькі выго́днае. 2. пераблы́тваць (*фа́кты*) між во́льна. 3. сартава́ць, выбіра́ць найле́пшае

– n. 1. падтасо́ўваньне, наўмы́снае скажэ́ньне *n.* 2. падтасава́ны, скажо́ны *або́* пераблы́таны тэкст; лама́ная мо́ва, сло́ва

garden ['gɑ:rdən] – n. 1. а) гаро́д -у *m.*; гаро́дчык -а *m.* (*для кве́так*). б) сад -у *m.*: ***botanical garden*** батані́чны сад. 2. парк -у *m.*

– v.i. працава́ць у гаро́дзе

– v.t. апрацо́ўваць, абрабля́ць гаро́д; развадзіць сад

– adj. гаро́дны, садо́вы

• ***garden bed*** града́, гра́дка, гра́дачка, клю́мба *f.*

garden center гаро́дніцкая кра́ма

gardener ['gɑ:rdnər] n. гаро́днік, садо́ўнік -а *m.*

gardening ['gɑ:rdnɪŋ] n. гаро́дніцтва, садо́ўніцтва *n.*

garden stuff 1. гаро́дніна, зеляні́на *f.* 2. кве́ткі *pl.* 3. зе́лень *f.* (*ліс́ьце дрэ́ваў, куста́ў; трава́*)

gargle ['gɑ:rgəl] – v.t. паласка́ць (*го́рла, рот*)

– n. паласка́ньне *n.*; ва́дкасьць для паласка́ньня го́рла

garish ['gerɪʃ] adj. 1. непрые́мна я́ркі, зы́ркі: ***the garish sun*** зы́ркае со́нца. 2. я́ркі, крыкліві, безгусто́ўны (*гарніту́р*)

garland ['gɑ:rlənd] n. 1. вянло́к -ка́ *m.*, гірля́нда *f.* 2. збо́рнік ве́ршаў, баля́даў, анталёгія *f.*

garlic ['gɑ:rlɪk] n. 1. часнло́к -аку́ *m.* 2. гало́ўка часнаку́; зубо́к часнаку́

garlicky ['gɑ:rlɪki] adj. часно́чны, з запа́хам часнаку́

garment ['gɑ:rmənt] – n. 1. адзе́жына *f.* 2. по́крыва *n.*

– v.t. адзява́ць, апрана́ць

garment bag адзе́жны мяшо́к

garner ['gɑ:rnər] – v.t. 1. зво́зіць і ссыпа́ць у клець (*збо́жжа*). 2. зьбіра́ць, склада́ць (*кні́гі ў бібліятэ́ку*)

– v.i. зьбіра́цца, набіра́цца (*пра няві́сьць*)

– n. 1. сьві́рлан -на *m.*, клець *f.* 2. склад -у *m.* (*для захо́ўваньня чаго́-н.*)

garnet ['gɑ:rnɪt] – n. 1. грана́т -у *m.* (*каштто́ўны ка́мень*). 2. цёмная чы́рвань

– adj. цёмна-чырво́ны.

garnish ['gɑ:rnɪʃ] – n. 1. гарні́р -у *m.* 2. аздо́ба *f.*; убо́р -а *m.*

– v.t. 1. аздабля́ць гарні́рам (*стра́вы*). 2. аздабля́ць, убіра́ць, упрыго́жваць

garret ['gærət] n. 1. падда́шша, гары́шча *n.*, гара́ *f.* (*у до́ме*). 2. падда́шлак -ка *m.*, мансарда *f.* (*пако́й або́ жыло́е памеш́каньне*)

garrison ['gærɪsən] – n. гарнізо́н -у *m.*

– v.t. 1. ста́віць во́йска ў го́рад для абаро́ны. 2. увадзіць во́йска ў го́рад, займа́ць го́рад пад гарнізо́н. 3. разьмяшча́ць, раскватаро́ўваць (*жаўне́раў*)

garrulity [gə'ru:ləti] n. гаварлі́васьць, балбатлі́васьць *f.*

garrulous ['gærələs] adj. 1. гаваркі́, гаварлі́вы, балбатлі́вы. 2. расьця́гнуты, залі́шне праця́глы, до́ўгі; шматсло́ўны (*раска́з*)

garter ['gɑ:rtər] – n. падвя́зка *f.* (*для панчо́хаў*)
– v.t. адзява́ць на падвя́зку
Garter ['gɑ:rtər] n. ***Order of the Garter*** О́рдэн Падвя́зкі (*найстарэ́йшы ры́царскі о́рдэн у Вялікабрыта́нii*)
garter snake мала́я бясшко́дная вужа́ка (*бранзо́ва-зеленава́тага ко́леру*)
garter stitch про́стая вя́зка пруткамі (*яко́й вя́жуцца панчо́хі, рукави́цы*)
gas I [gæs] – n., pl. **gases** 1. газ -у *m.* 2. сьвяці́льны газ. б) газ-па́ліва. в) газ-сро́дак для абязбо́льваньня, анэстэ́зii. 3. Mining грыму́чы *або́* руднико́вы газ (*выбухо́вы*). 4. Milit. газ (*атру́тнае рэ́чыва*). 5. га́зы ў стра́ўніку *або́* кі́шках. 6. Sl. пуста́я балбатня́, выхва́льства, самахва́льства *n.*
– v.t. 1. напаўня́ць га́зам. 2. атру́чваць га́зам. 3. пуска́ць заду́шлівыя га́зы. 4. забіва́ць га́зам (*у га́завай ка́мэры*). 5. Informal, Sl. ашу́кваць, загаво́рваючы зу́бы
– v.i. 1. выдзяля́ць, выпуска́ць газ. 2. Sl. балбата́ць пусто́е; выхваля́цца
gas II [gæs] – n., Informal бэнзы́н -у *m.*, га́за, газаліна *f.*: ***to step on the gas,*** Sl. ці́снуць на газ, хутчэ́й е́хаць (*аўтамабі́лем*), збо́льшыць ху́ткасьць
– v. напаўня́ць (*бэнзы́нам*)
gas attack га́завая ата́ка
gas bottle 1. рэто́рта *f.* 2. сталёвы цыліндар для захо́ўваньня згу́шчанага га́зу
gas burner га́завая гарэ́лка (*у га́завай пліце́, прыму́се*)
gas chamber га́завая ка́мэра
gas engine га́завы рухавік
gas furnace 1. га́завая печ. 2. печ для газыфіка́цыі
gaseous ['gæsiəs] adj. га́завы (*стан*), га́западо́бны
gas fitter газавік -а́, газаправо́дчык -а *m.* (*які́ правóдзіць або́ рамантуе́ газаправо́дныя тру́бы*)
gas helmet or **gas mask** супрацьга́з, адга́зьнік -у *m.*, супрацьга́завая ма́ска
gash [gæʃ] – n. 1. а) даўгі́ глыбо́кі парэ́з, разрэ́з. б) даўга́я глыбо́кая ра́на – v.t. рабі́ць даўгі́, глыбо́кі парэ́з *або́* ра́ну
gasification [ˌgæsɪfɪ'keɪʃən] n. газыфіка́цыя *f.* (*ператварэ́ньне цьвёрдага ці ва́дкага па́ліва ў гару́чы газ*)
gasiform ['gæsɪfɔ:rm] adj. газападо́бны
gasify ['gæsɪfaɪ] **-fied, -fying,** v.t. газыфікава́ць (*ву́галь, торф*), ператвара́ць у гару́чы газ
gas jet 1. га́завая гарэ́лка. 2. га́завае по́лымя
gasman ['gæsmæn] n., pl. **-men** 1. газавік -а́ *m.* 2. а) рабо́тнік, які́ чыта́е га́завыя лічы́льнікі. б) збо́ршчык гро́шаў, нале́жных кампа́нii за даста́ўлены газ. 3. газаправо́дчык -а *m.*
gas mask, *гл.* **gas helmet**
gas meter га́завы лічы́льнік, газаме́р -а *m.*
gasoline or **gasolene** ['gæsəli:n] n. 1. газалі́н -у *m.*, газаліна, га́за *f.* 2. Amer. бэнзы́н -у *m.*
gasp [gæsp] – n. 1. задышка *f.*, ця́жкае ды́ханьне. 2. сло́вы, ска́заныя задыха́ючыся
– v.i. 1. задыха́цца, ця́жка ды́хаць. 2. мо́цна хаце́ць, го́рача жада́ць *чаго́*
– v.t. ледзь вымавіць, задыха́ючыся
• ***at the last gasp*** на апо́шнім уздыху, пе́рад сьме́рцю
• ***gasp one's last*** памёрці
• ***gasp out*** or ***forth*** насі́лу (з ця́жкасьцю) сказа́ць
gasping ['gæspɪŋ] – n. хапа́ньне паве́тра, ве́льмі ця́жко́е *або́* су́таргавае ды́ханьне
– adj. су́таргавы, канвульсі́йны, спазматы́чны
gas pipe га́завая труба́
gas plant га́завы завóд
gas range га́завая пліта́
gassed [gæst] adj. атру́чаны га́зам
gas station запра́вачная ста́нцыя
gas stove га́завая печ для ацяпле́ньня або́ гатава́ньня
gas tank 1. цыстэ́рна для га́зу. 2. бэнзаба́к -а *m.* (*у аўтамабі́лі*)
gastight ['gæstaɪt] adj. газанепранікальны

gastric [ˈgæstrɪk] adj. страўнікавы.
• ***gastric glands*** страўнікавыя залозы
• ***gastric juice*** страўнікавы сок
• ***gastric ulcer*** язва страўніка
gastritis [gæˈstraɪtəs] n. Med. гастрыт -у *m.*
gastronome [ˈgæstrənoʊm] n. гастранóм -а *m.*, знáўца і амáтар смáчнае éжы, гурмáн -а *m.*
gastronomic [ˌgæstrəˈnɑ:mɪk] adj. гастранамічны (*выраб, крáма*)
gastronomics [ˌgæstrəˈnɑ:mɪks] n. *гл.* **gastronomy**
gastronomy [gæˈstrɑ:nəmi] n. гастранóмія *f.*, тóнкае разуменьне і вéданьне кулінáрнага майстэрства
gas warfare хімічная вайнá
gasworks [ˈgæswɜ:rks] n., pl. (sing. in use) гáзавы завóд
gate [geɪt] n. 1. варóты *pl. only*, брáма *f.*, вéсьніцы *pl. only*.: ***small gate*** вéсьнічкі, варóтцы: брáмка, фóртка *f.* 2. увахóд -у *m.* (*у плóце, муры*). 3. застáва *f.*, шлягбáўм -а *m.* 4. гóрны прахóд. 5. шлюз -а *m.* (*у гáці, трубé*)
• ***get the gate,*** Sl. быць звóльненым
gate crasher, Sl. няпрóшаны госьць
gatekeeper [ˈgeɪtˌki:pər] n. брáмнік -а *m.*, брáмніца *f.*; вартаўнік -á *m.*, вартаўніца *f.* пры брáме
gateway [ˈgeɪtweɪ] n. 1. брáма *f.*, увахóд -у *m.* 2. перахóд -у *m.*
gather [ˈgæðər] – v.t. 1. зьбірáць. 2. зрываць; зьбірáць ураджáй. 3. набываць, набірáць (*хýткасьці*), назапáшваць, памнажáць (*сíлы*). 4. дýмаць; рабіць высновy. 5. зьбірáць, мóршчыць (*лоб*); зьбірáць у склáдкі абó збóркі (*спаднíцу*)
– v.i. 1. зьбірáцца (*пра натóўп, хмáры*). 2. нарываць (*пра рáну*). 3. мóршчыцца
• ***gather breath*** перадыхнýць, зрабіць карóткі перапы́нак для адпачы́нку
• ***gather up*** а) падымáць, падбірáць. б) падгарнýць (*нóгі пад сябé*)
• ***gathers*** збóркі *pl.* (*у сукéнцы*)
gathering [ˈgæðərɪŋ] n. 1. зьбірáньне *n.* 2. збор -у *m.* 3. збóрка *f.*, сход -у *m.*; зьезд, зьлёт -у *m.*; натóўп -у *m.* 4. нагнаéньне *n.*, нарыўлў -ву *m.*
gaudy I [ˈgɔ:di] adj. 1. я́ркі, тандэтны, крыклівы, безгустóўны. 2. стракáты; квяцíсты (*і пра стыль ці мóву*)
gaudy II [ˈgɔ:di] n., pl. **-ies,** Brit. сьвяткавáньне *n.*, урачы́стасьць (*асабліва гадавы́ банкéт у кóледжы*)
gauge [geɪdʒ] – n. 1. мéра *f.*; маштáб -у *m.* (*для мéраньня*); эталён -а *m.* (*узóр адзíнкі вымярэ́ньня*). 2. вымяральная прылáда. 3. крытэрый -ю *m.* 4. памéр -у *m.*; ёмістасьць, ёмкасьць *f.* 5. калíбр -у *m.* 6. шырынá чыгýначнае каляí: ***broad (narrow) gauge*** шырóкая (вýзкая) каляíна
– v.t. 1. дакладна мéраць, вымяráць, спраўджáць памéр. 2. ацэ́ньваць (*чалавéка, характáр*). 3. калібраваць (*правяráць калíбар абó шкáлу*). 4. вызначáць ёмістасьць
• ***gauge glass*** вадамéрнае шкло
Gaul [gɔ:l] n. 1. Гáлія *f.* 2. гал -а *m.*, жыхар старажы́тнае Гáліі. 3. францýз -а *m.* 4. Фráнцыя *f.*
Gaulish [ˈgɔ:lɪʃ] – adj. гáльскі (*культýра*)
– n. гáльская мóва
gaunt [gɔ:nt] adj. 1. схуднéлы, змарнéлы; худы́. 2. пусты́, гóлы й панýры
gauntlet [ˈgɔ:ntlət] n. 1. пáнцырная пальчáтка (*чáстка рыцарскае зброі*). 2. пальчáткі для фэхтавáньня. кóннай яздý: ***to take up the gauntlet*** а) прыняць вы́клік. б) выступіць у абарóну; ***to throw down the gauntlet*** кінуць пальчáтку, кінуць вы́клік
gauze [gɔ:z] n. 1. мáрля *f.*, газ -у *m.* (*тканíна*). 2. драцянáя сéтка. 3. смугá, дымка *f.*; лёгкі тумáн
gauzy [ˈgɔ:zɪ] adj. гáзавы, тóнкі й лёгкі як газ; празрысты
gave [geɪv] v. *p.t. of* **give**
gawk [gɔ:k] – n. недарэ́кла -і *m. & f.*, разя́ва *f.*, разявя́кла, зявáкла -і *m. & f.*
– v.i., Informal бяздýмна ўзіráцца, вытараўшчваць
gawky [ˈgɔ:ki] – adj. нехлямя́жы; дзіўны
– n. дзівáк -á *m.*, недарэ́кла -і *m. & f.*

gay [geɪ] adj. 1. вясёлы; жыццяра́дасны. 2. я́ркі, каляро́вы. 3. шыко́ўна апра́нуты. 4. распу́сны; шалапу́тны; змарнава́ны (*пра жыццё*). 5. Informal гелй -я, гомосэксуа́л -а *m.*

gaze [geɪz] – v. узіра́цца, прыглада́цца
– n. пі́льны, ува́жлівы по́зірк

gazelle [gə'zel] n. газэ́ль *f.*

gazette [gə'zet] – n. 1. газэ́та. 2. esp. Brit., Can. афіцы́йны ўра́давы бюлетэ́нь
– v.t. esp. Brit. публікава́ць у дзяржа́ўным бюлетэ́ні

gazetteer [ˌgæzə'tɪr] n. 1. сло́ўнік геаграфічных назо́ваў. 2. esp. Brit. выдаве́ц афіцы́йнага дзяржа́ўнага бюлетэ́ню

G.C.F., g.c.f., or **gcf, greatest common factor** найбо́льшы агу́льны мно́жнік

G.C.M., g.c.m., or **gcm, greatest common measure** найбо́льшы агу́льны дзе́льнік

gear [gɪr] – n. 1. Tech. шасьцярня́ *f.*; зубча́(с)тае ко́ла. 2. зубча́(с)тая перада́ча, прыво́д -у *m.*, перада́тачны мэхані́зм. 3. апара́т -а *m.* ; прыла́да *f.*, інструме́нт -а *m.*; прыла́дак -ка *m.*, прыла́дзьдзе *n.* 4. рухо́мая маёмасьць. 5. во́пратка *f.*, адзе́ньне *n.*, убо́р -у *m.* 6. збру́я, ву́праж *f.* (*для каня́*). 7. Naut. асна́стка *f.*, сна́сьці вадапла́ва, такела́ж -у *m.*
– v.t. 1. забясьпе́чваць прыво́дам. 2. пуска́ць у рух. 3. падпара́дкаваць
– v.i. 1. спра́ўна працава́ць (*пра ча́сткі машы́ны*). 2. рыхтава́цца, плянава́ць
• ***in gear*** а) злу́чаны з мато́рам, улу́чаны. б) спра́ўны, прыго́дны для карыста́ньня, у до́брым ста́не
• ***in high gear*** по́ўным хо́дам, у разма́ху, у разга́ры, у по́ўні
• ***out of gear*** а) няўлу́чаны. б) у няспра́ўным ста́не, сапсу́ты
• ***shift gears*** а) мяня́ць ху́ткасьць. б) мяня́ць сваё ста́ўленьне, падыхо́д

gearbox ['gɪrbɑ:ks] n. esp. Brit. **transmission** каро́бка перада́чаў, каро́бка ху́ткасьцяў, трансмі́сія *f.*

gear wheel ['gɪrhwi:l] n. зубча́(с)тае ко́ла

gee I [dʒi:] – interj. но! напра́ва! (*на каня́, асла́*)
– v. паваро́чваць напра́ва

gee II [dʒi:] interj., Informal ну, далібо́г!

geese [gi:s] n., *pl. of* **goose**

geezer ['gi:zər] n., Sl. дзіва́к -а́ *m.*, стары́ча -ы *m.* (*перава́жна пра мужчы́ну*)

gelatin ['dʒelətɪn] n. жэлятын -у *m.*

gelatinous [dʒə'lætənəs] adj. 1. як жэле́. 2. жэлятынавы

geld [geld] v.t. лягча́ць, пакрада́ць (*жывёліну*), кастрава́ць са́мца

gem [dʒem] – n. 1. каштоўны ка́мень (*асабліва рэ́заны, шліфава́ны*); каштоўнасьць, пэ́рла *f.* 2. ліс'цевая пупы́шка *f.*
– v.t. 1. упрыго́жваць, прыбіра́ць каштоўнымі камяня́мі. 2. распуска́цца (*пра дрэ́ва*)

geminate ['dʒemmeɪt] – v. 1. падво́йваць (-ца), здво́йваць (-ца). 2. разьмяшча́ць па́рамі
– adj. ['dʒemɪnət] падво́йны; які́я расту́ць па́рамі або́ разьме́шчаныя па́рамі (*пра лісты́*)

gemination [ˌdʒemɪ'neɪʃən] n. 1. падво́йваньне, здво́йваньне *n.*; паўтарэ́ньне *n.* 2. Phon. падвае́ньне зы́чнага. 3. Rhetor. паўтарэ́ньне *n.*

gemma ['dʒemə] n., pl. **gemmae** 1. Bot. пупы́шка, по́каўка *f.* 2. Zool. ны́рка *f.*

gender ['dʒendər] – n. 1. Gram. род -у *m.*
– adj. ро́давы: ***gender endings*** ро́давыя канча́ткі. 2. Informal пол -у *m.*: ***the female gender*** жано́чы пол
– v.t., Archaic спараджа́ць, нараджа́ць

gene [dʒi:n] n., Biol. ген, ге́на *m.*

genealogical [ˌdʒi:niə'lɑ:dʒɪkəl] adj. 1. генэалягі́чны, радаво́дны: ***genealogical tree*** радаво́днае дрэ́ва. 2. генэалягі́чная табліца (*пра пахо́джаньне жывёлаў або́ расьлі́наў*)

genealogy [ˌdʒi:ni'ælədʒi] n., pl. **-gies** 1. радаво́дная *f.* 2. радаво́д -у *m.*, генэало́гія *f.* 3. выяўле́ньне *або́* дасьле́даваньне радаво́ду

genera [ˈdʒenərə] n. *pl. of* **genus**

general [ˈdʒenərəl] – adj. 1. агу́льны: ***the general welfare*** агу́льнае дабро́; ***a general rule*** агу́льнае пра́віла. 2. ***a general reader*** сярэ́дні, звыча́йны чыта́ч. 3. павярхо́ўны: ***in a general way*** павярхо́ўна, агу́льна. 4. усеагу́льны (*вы́бары, страйк*). 5. гало́ўны, найвышэ́йшага ра́нгу.
– n. 1. генэра́л -а *m.* (*вайско́вы*). 2. агу́льны факт, пры́нцып, агу́льная ду́мка або́ цьве́рджаньне. 3. генэра́л рэлігі́йнага о́рдэну
• ***in general*** 1. наагу́л, нао́гул. 2. звыча́йна

general assembly агу́льны зьезд

General Assembly 1. Генэра́льная Асамбле́я (*Арганіза́цыі Аб'е́днаных На́цыяў*). 2. заканада́ўчы о́рган дзяржа́вы. 3. заканада́ўчая ўстано́ва некато́рых шта́таў у Злу́чаных Шта́тах Ам∂рыкі

general election усеагу́льныя вы́бары

general headquarters штаб гало́ўнакама́ндуючага, ста́ўка *f.*

general hospital 1. шпіта́ль агу́льнага ты́пу. 2. вайско́вы шпіта́ль, у які́ перавозяць хво́рых або́ ра́неных з палява́ння шпіталю́

generalissimo [ˌdʒenərəˈlɪsɪmoʊ] n., pl. **-mos** генэралі́сімус -а *m.*

generality [ˌdʒenəˈræləti] n., pl. **-ties** 1. агу́льная фра́за, павярхо́ўнае, неканкрэ́тнае цьве́рджаньне. 2. агу́льны пры́нцып *або́* пра́віла. 3. бальшыня́ *f.*, бо́льшая ча́стка. 4. агу́льная я́касьць, агу́льныя ўмо́вы

generalize [ˈdʒenərəlaɪz] – v.t. 1. абагульня́ць, падво́дзіць пад агу́льны зако́н, гру́пу. 2. выво́дзіць агу́льнае пра́віла з паасо́бных фа́ктаў. 3. папулярызава́ць, ува́дзіць у агу́льны ўжы́так
– v.i. 1. рабі́ць агу́льныя высно́вы. 2. гаварыць агу́льна

generally [ˈdʒenərəli] adv. 1. у бальшыні́ выпа́дкаў, звыча́йна: ***He is generally on time*** Ён звыча́йна прыхо́дзіць у ча́с. 2. агу́лам, шыро́ка. 3. агу́льна, у агу́льных ры́сах, без падрабя́зна-сьцяў і дэта́ляў; ***generally speaking*** агу́лам ка́жучы

generate [ˈdʒenəreɪt] v.t. 1. тварыць; утвара́ць; нараджа́ць, выкліка́ць. 2. спараджа́ць, нараджа́ць. 3. Math. тварыць, утвара́ць, ствара́ць (*кут, лі́нію*)

generating plant or **station** [ˈdʒenəreɪtɪŋ] электраста́нцыя *f.*

generation [ˌdʒenəˈreɪʃən] n. 1. пакале́ньне *n.*, род -у *m.*: ***from generation to generation*** з ро́ду ў род. 2. нараджэ́ньне *n.* 3. утварэ́ньне *n.*; выкліка́ньне, спрычыне́ньне *n.*

generator [ˈdʒenəreɪtər] n. 1. дына́ма *n.*, электры́чны генэра́тар. 2. газагенэра́тар -а *m.*

generic [dʒəˈnerɪk] adj. 1. ро́давы, характэ́рны для азна́чанага ві́ду. 2. агу́льны: ***a generic term*** агу́льны назо́ў, тэ́рмін

generosity [ˌdʒenəˈrɑːsəti] n., pl. **-ties** 1. шчо́драсьць *f.* 2. велікаду́шнасьць *f.* 3. высакаро́дны ўчы́нак

generous [ˈdʒenərəs] adj. 1. шчо́дры, бескары́сьлівы. 2. высакаро́дны. 3. вялі́кі, важкі́: ***a generous piece*** вялі́кі кава́лак. 4. спо́рны, ураджа́йны: ***generous fields*** ураджа́йныя палі́

genesis [ˈdʒenəsɪs] n., pl. **-ses** [-siːz] 1. пача́так -ку *m.*; пахо́джаньне *n.*; ствары́ньне, зараджэ́ньне, узьнікне́ньне *n.*, ге́нэзыс -у *m.* 2. **Genesis** Кні́га Быцьця́ (*пе́ршая кніга Старо́га Запаве́ту*)

genetic [dʒəˈnetɪk] adj. 1. генэты́чны (*су́вязь, інфарма́цыя*). 2. спа́дчынны праз ге́ны

genetics [dʒəˈnetɪks] n. генэ́тыка *f.*

genial I [ˈdʒiːnjəl] adj. 1. вясёлы; мі́лы; сардэ́чны, прыя́зны, ве́тлы: ***a genial welcome*** сардэ́чнае віта́ньне. 2. які́ разьвесяля́е, ажыўля́е. 3. мя́кі; лагі́дны (*і пра кліма́т*); ласка́вы. 4. Obsol. натура́льны, прыро́джаны, прыро́дны: ***genial bent*** прыро́джаная схі́льнасьць

genial II [dʒə'ni:əl] adj., Anat. падбаро́дачны

geniality [ˌdʒi:ni'æləti] n. 1. весялó́сьць, тава́рыскасьць, сардэ́чнасьць, прыя́знасьць, ве́тласьць *f.* 2. лагóднасьць *f.* (*кліма́ту*)

genie ['dʒi:ni] n. дух, джын -а *m.* (*до́бры або́ злы́ дух у ара́бскай і пэрсы́дзкай міталёгіі*)

genii ['dʒi:niaɪ] n., *pl. of* **genius** джы́ны, до́брыя або́ злыя ду́хі

genital ['dʒenɪtəl] adj. дзе́тарóдны, палавы́

genitals ['dʒenɪtəlz] n., pl. палавы́я о́рганы, генітáліі

genitive ['dʒenətɪv] n. ро́дны склон

genius ['dʒi:niəs] n., pl. **geniuses** 1. ге́ні|й -я *m.*, генія́льнасьць *f.*: ***a man of genius*** генія́льны чалаве́к. 2. генія́льны чалаве́к, ге́ні|й -я *m.* 3. вялі́кая здо́льнасьць, таленавíтасьць, генія́льнасьць *f.*: ***to have a genius for acting*** мець здо́лънасьць да акто́рства. 4. асаблі́вы хара́ктар *або́* дух (*асо́бы, на́цыі, ча́су, мо́вы*). 5. до́бры (злы). 6. (pl. **genii**) дух -а *m.*, до́бры дух або́ злы́, які́я ўплыва́юць на жыцьцё чалаве́ка

genocide ['dʒenəsaɪd] n. генацы́д -у *m.*, нарадагу́бства *n.*

genteel [dʒen'ti:l] adj. 1. які́ але́жыць да вышэ́йшага грама́дзтва; сьве́цкі, шляхо́цкі, Informal па́нскі. 2. ве́тлівы, до́бра вы́хаваны; мо́дны; элега́нтны

gentility [dʒen'tɪləti] n., pl. **-ties** 1. радавíтасьць *f.*; прынале́жнасьць да арыстакра́ты *або́* вышэ́йшае кля́сы. 2. до́брыя мане́ры. 3. элега́нтнасьць, далíка́тнасьць *f.*

gentle ['dʒentəl] – adj. **-tler, -tlest** 1. лагóдны; далíка́тны: ***a gentle tap*** далíка́тны стук. 2. мя́ккі, ці́хі: ***a gentle sound*** ці́хі гук. 3. памяркóўны, ме́рны, лагóдны: ***gentle heat*** памяркóўная цеплыня́; ***a gentle slope*** лагóдны схіл. 4. ласка́вы; ве́тлы, прыя́зны, лагóдны: ***a gentle disposition*** лагóдны, ве́тлы хара́ктар. 5. шляхе́цкі, шляхе́цкага ро́ду. 6. зна́тны; до́бры; пале́пшаны: ***gentle birth*** зна́тнае пахо́джаньне; ***gentle blood*** до́брая паро́да – n., Archaic асо́ба зна́тнага пахо́джаньня або́ высо́кага ра́нгу – v.t. 1. аб'яжджа́ць (*маладо́га каня́*). 2. рабíць больш памяркóўным (*пагля́ды*), зьмякча́ць

gentlefolk ['dʒentəlfouk] n., pl. 1. шля́хта *f.*, двара́нства, магна́цтва *n.*

gentleman ['dʒentəlmən] n., pl. **-men** 1. джэнтэльме́н -а *m.*; спада́р -а́ *m.* 2. до́бра вы́хаваны чалаве́к. 3. *ве́тлівая фо́рма называ́ньня ко́жнага мужчы́ны.* 4. (*ране́й*) шля́хціц, дваранíн, магна́т -а *m.*
gentlemen спадары́ (*ве́тлівы звано́т да мужчы́нскага тава́рыства*)

gentlemanliness ['dʒentəlmənlinəs] n. джэнтэльме́нства *n.*, карэ́ктнасьць *f.*

gentlemanly ['dʒentəlmənli] – adj. ве́тлівы; до́бра ўзгадава́ны, джэнтэльме́нскі (*мане́ры*)
– adv. па-джэнтэльме́нску, шляхо́тна; карэ́ктна; элега́нтна (*апра́нуты*)

gentleman's or **gentlemen's agreement** 1. джэнтэльме́нскае пагадне́ньне, ву́сная ўмо́ва без фарма́льнасьцяў. 2. няпíсаная дамо́ўленасьць гру́пы асо́баў не пуска́ць íншых у сваё ко́ла

gentleness ['dʒentəlnəs] n. далíка́тнасьць, лагóднасьць, мя́ккасьць *f.*; дабрыня́ *f.*

gentle or **gentler sex** жанчы́ны; жано́чы род, coll.

gently ['dʒentli] adv. 1. далíка́тна, лагóдна; чу́ла, пяшчо́тна; мя́кка. 2. паступова

genuine ['dʒenjum] adj. 1. сапраўдны́, аўтэнты́чны (*тэкст*); праўдзíвы (*крыні́ца*), непадро́блены. 2. шчы́ры, нефальшы́вы

genus ['dʒi:nəs] n., pl. **genera** or **genuses** 1. Bot., zool. род -у *m.* 2. гату́нак -ку, сорт -у *m.*

geodesic [ˌdʒi:ə'desik] adj. 1. геадэзíчны (*вымярэ́ньні, прыла́ды*). 2. які́ ма́е фо́рму вы́пукласьці зямно́е ку́лі

geodesy [dʒiˈɑ:dəsi] n. геадэ́зія *f.*
geographer [dʒiˈɑ:grəfər] n. геó граф -а *m.*
geographic [ˌdʒi:əˈgræfɪk] or **geographical** [ˌdʒi:əˈgræfɪkəl] adj. геаграфі́чны
• ***geographic axis*** зямна́я вось
• ***geographical coordinate*** геаграфі́чная каардына́та
geography [dʒiˈɑ:grəfi] n., pl. **-phies** геагра́фія *f.*
geologic [ˌdʒi:əˈlɑ:dʒɪk] or **geological** [ˌdʒi:əˈlɑ:dʒɪkəl] adj. геалагі́чны (*пэрыя́д, працэ́с*)
geologist [dʒiˈɑ:lədʒɪst] n. геó ляг -а *m.*
geology [dʒiˈɑ:lədʒi] n. геалёгія *f.*
geomagnetic axis магні́тная вось (*зямлі́*): ***geomagnetic equator, pole*** магні́тны эква́тар, по́люс
geometer [dʒiˈɑ:mətər] n. геó мэтар -а *m.*
geometric [ˌdʒi:əˈmətrɪk] or **geometrical** [ˌdʒi:əˈmətrɪkəl] adj. геамэтры́чны
geometrical progression геамэтры́чная прагрэ́сія
geometry [dʒiˈɑ:mətri] n., pl. **-tries** 1. геамэ́трыя *f.* 2. фо́рма *f.* (*будыні́ны*), мадэ́ль *f.*, канструкцыя *f.*
Georgian [ˈdʒɔ:rdʒən] – adj. 1. грузі́нскі. 2. з эпо́хі англе́льскіх каралёў Джо́рджаў
– n. 1. ураджэ́нец *або́* жыха́р шта́ту Джо́рджыя ў ЗША. 2. грузі́н -а *m.* 3. грузі́нская мо́ва. 3. чалаве́к, асабліва пісьме́ньнік з часо́ў пе́ршых чатыро́х англе́льскіх каралёў Джо́рджаў
geranium [dʒəˈreɪnɪəm] n. гера́нь *f.*
germ [dʒɜ:rm] n. 1. мікро́б -а *m.*, бакце́рыя *f.* 2. Biol. заро́дак -ка *m.*; эмбры ён -а *m.*; насе́ньне *n.*; за́вязь *f.* 3. пала ва́я кле́тка (*расьлі́наў, жывёлы*), гамэ́та *f.* 4. пача́так чаго́-н. наагу́л
German [ˈdʒɜ:rmən] – adj. нямецкі, герма́нскі
– n. 1. не́мец -ца *m.*, не́мка *f.*, жыха́р Нямеччыны. 2. нямецкая мо́ва
German measles адзёр адру́ *m.*, краснуха *f.*
Germanic [dʒərˈmænɪk] adj. 1. нямецкі. 2. герма́нскі: ***Germanic languages*** герма́нскія мо́вы
Germanism [ˈdʒɜ:rmənˌɪzəm] n. 1. германі́зм -у *m.* (*у мо́ве*). 2. характэ́рная ры́са не́мцаў. 3. германафі́льства
Germanize [ˈdʒɜ:rmənaɪz] – v.t. германізава́ць. 2. перакла да́ць на нямецкую мо́ву
– v.i. германізава́цца
germinate [ˈdʒɜ:rmɪneɪt] – v.i. прарастá ць, праро́стваць, пуска́ць па́расткі
– v.t. праро́шчваць (*насе́ньне*)
gerund [ˈdʒerənd] n., Gram. геру́ндый
gerundive [dʒeˈrʌndɪv] n. герундыі́ў -ва *m.*
gesticulate [dʒeˈstɪkjəleɪt] v.i. жэстыкулява́ць
gesticulatingly [dʒeˌstɪkjəˈleɪtɪŋli] adv. жэстыкулюючы, з жэ́стамі
gesticulation [dʒeˌstɪkjəˈleɪʃən] n. 1. жэстыкуля́цыя *f.* 2. жэст -у *m.*
gesture [ˈdʒestʃər] – n. 1. жэст -у *m.*; ру́хі рук, галавы́ *або́* це́ла: ***friendly gesture*** прыя́зны рух, жэст
– v.i. рабіць жэ́сты, ру́хі, жэстыкуля ва́ць
get [get] – v.t., **got, got** or **gotten, getting** 1. атры́мваць; набыва́ць, раздабыва́ць; расстара́ цца; нажыва́ць; даставáць (*і хваро́бу*): ***I got a new coat*** Я купі́ла (мне купі́лі) но́вае палі́то́; ***We can get it for you*** Мы мо́жам даста́ць гэ́та для вас; ***to get bad cold*** захварэ́ць; мо́цна застудзі́цца. 2. зарабля́ць: ***She gets $5 per hour*** Яна́ зарабля́е 5 даля́раў за гадзі́ну. 3. зрабі́ць не́шта: ***He got his hair cut yesterday*** Учо́ра ён падстры́гся; ***She got her work done*** Яна́ зрабі́ла сваю́ пра́цу; ***I must get the curtains washed*** Я му́шу адда́ць памы́ць фіра́нкі. 4. рыхтава́ць, гатава́ць: ***to get dinner*** гатава́ць абе́д. 5. угаво́рваць, перако́нваць: ***We got John to come too*** Мы ўгаварылі Янку, каб і ён прыйшо́ў. 6. Informal а) мець: ***I have got very little money*** У мяне́ ве́льмі ма́ла гро́шай. б) му́сіць, быць забавя́заным: ***We have got to win*** Мы му́сім вы́йграць. 7. дастаўля́ць, прыно́сіць: ***Get me a***

chair прынясі́ мне крэ́сла; ***I got him to bed*** Я паклала́ яго́ ў ло́жак. 8. Informal а) трапля́ць (*пра ку́лю, снара́д*). б) забіва́ць, застрэ́ліць: ***to get a deer with a rifle*** застрэ́ліць казу́лю са стрэ́льбы. 9. перако́нваць, зага́дваць, уплыва́ць: ***He got it done*** Ён загада́ў гэ́та зрабі́ць. 10. Sl. разуме́ць: ***I don't get you*** Я вас не разуме́ю. 11. (*пра жывёлу*) нараджа́ць; прыво́дзіць. 12. Informal мець магчы́масьць, спраўля́цца: ***I didn't get to do it*** Я ня ме́ла магчы́масьці зрабі́ць гэ́та

– v.i. 1. прыхо́дзіць, прыяжджа́ць: ***We got home early last night*** Учо́ра мы ра́на прыйшлі́ дадо́му; ***Your letter got here yesterday*** Ваш ліст прыйшо́ў сюды́ ўчо́ра. 2. быць, рабі́цца: ***It is getting colder*** халадне́е; ***Don't get nervous*** не нэрву́йся; ***to get old*** ста́рыцца, рабі́цца стары́м; ***to get angry*** злава́цца; ***to get better*** а) ачу́ньваць (*ад хваро́бы*). б) рабі́цца ле́пшым; ***to get married*** а) жані́цца (*пра мужчы́ну*), выхо́дзіць за́муж (*пра жанчы́ну*)

• ***get about*** а) шмат хадзі́ць *або́* е́здзіць. б) станові́цца шыро́ка вядо́мым; пашыра́цца, разыхо́дзіцца (*пра ве́стку*)

• ***get across,*** Informal а) растлума́чыць, пераканаць

• ***get along*** а) пасо́ўвацца напе́рад. б) даць ра́ды, адо́лець, спра́віцца: ***to get along without food*** абыхо́дзіцца бязь е́жы. в) до́бра ме́цца, мець уда́чу; спраўля́цца з пра́цай, зада́ньнем. г). жыць у зго́дзе, ла́дзіць: ***They get along*** яны́ жыву́ць у зго́дзе

• ***get around*** а). *гл.* ***get about***. б) ашука́ць, абдурыць; зла́дзіць шту́ку *каму́*

• ***get around to*** знайсьці́ час на *што*

• ***get at*** а) прыбы́ць *куды́*, дабра́цца. б) дове́дацца, зразуме́ць: ***I cannot get at the meaning*** Я не магу́ зразуме́ць значэ́ньня. в) гаварыць, кірава́ць гу́тарку на *што*: ***What are you trying to get at?*** Што вы хо́чаце гэ́тым сказа́ць?

• ***get away*** а) адыйсьці́ся. б) уцячы́

• ***get away with,*** Informal а) уцячы́ са здабы́чай. б) вы́йсьці сухі́м з вады́ *або́* чы́стым, непакара́ным

• ***get back*** а) вярну́цца. б) памсьці́цца

• ***get behind*** падтры́мваць *кага́ чым*

• ***get by,*** Informal а) міна́ць. б) перажыва́ць, перакіда́цца: ***to just get by in hard times*** то́лькі перакі́дацца ў цяжкі́ час

• ***get in*** а) захо́дзіць, сяда́ць (*у а́ўта*); прыбы́ць *куды́*. б) укрыда́ць у *што*. в) зво́зіць (*се́на, збо́жжа*). г) увайсьці́ (*у сябро́ўства, у ву́зкія ко́лы*)

• ***get off*** а) зла́зіць; сыхо́дзіць; высяда́ць: ***to get off the train*** высяда́ць зь цягніка́. б) здыма́ць (*палі́то*). в) уцячы́, уратава́цца; дапамагчы́ уцячы́. г) (*пра самалёт*) падыма́цца

• ***get on*** а) узье́хаць, узыйсьці́; узьле́зьці (*на гару́*). б) апрана́ць, адзява́ць; абува́ць (*чаравікі*). в) мець по́сьпех, до́бра ме́цца: ***How is he getting on?*** Як ён ма́ецца? Як у яго́ спра́вы? г) ла́дзіць з *кім*. д) увайсьці́ (*у гады́*): ***to get on in years*** старэ́ць

• ***get out*** а) выхо́дзіць. б) выма́ць. в) уцячы́; памагчы́ уцячы́, вы́ратаваць. г) вы́даць, апублікава́ць (*кні́гу*). д) вы́ведаць, вы́знаць, вы́цягнуць: ***they tried to get out his secret*** яны́ стара́ліся вы́ведаць ад яго́ сакрэ́т. е) ста́цца вядо́мым: ***The news got out*** Навіну́ дове́даліся

• ***get over*** а) ачуня́ць (*ад хваро́бы*). б) перасі́ліць, перамагчы́ ў сабе́ (*страх, непако́й*). в) ско́нчыць, расквіта́цца: ***Let's get this over once and for all*** Ско́нчым з гэ́тым раз назаўсе́ды

• ***get round*** а) ашука́ць, перахітры́ць. б) схілі́ць на свой бок

• ***get set*** рыхтава́цца; рыхтава́ць

• ***get there*** дасягну́ць, дамагчы́ся паста́ўленае мэ́ты, дайсьці́ свайго́

• ***get together,*** Informal а) зьбіра́ць; зьбіра́цца, сустрака́цца: ***Let's get together next week*** Дава́йце зьбярэ́мся на насту́пным ты́дні. б) прыйсьці́ да зго́ды

• ***get up*** устава́ць а) з ло́жка. б) стаць на но́гі. в) узыхо́дзіць, узьбіра́цца на гару́; сяда́ць (*у аўто́бус*)

getaway ['getəˌweɪ] n., Informal 1. уцёкі *pl. only.* 2. пача́так, старт спабо́рніцтваў

gewgaw ['gju:gɔ:] – n. бліску́чыя дро́бязі, заба́ўкі; мішура́
– adj. прэтэнцыёзны

geyser ['gaɪzər] n. 1. ге́йзэр -а *m.* 2. esp. Brit. награва́льнік вады́ (*для ва́нны*)

ghastly ['gæstli] – adj. 1. стра́шны; жахлі́вы, жу́дасны. 2. бле́дны, як сьмерць. 3. Informal страшэ́нны, ве́льмі благі́: ***a ghastly failure*** страшэ́нная няўда́ча
– adv. 1. страшэ́нна, жахлі́ва. 2. Informal ве́льмі бла́га

gherkin ['gɜ:rkɪn] n. карнішо́н -а *m.* (*гату́нак малы́х гурко́ў*)

ghetto ['getou] n., pl. **-os** ге́та, *indecl.*

ghost [goust] n. 1. здань *f.*, дух -а *m.* 2. цень -ю *m.*; лёгкі сьлед, намі́нак: ***the ghost of a smile*** ледзь ба́чная ўсьме́шка
• ***give up the ghost*** скана́ць

ghostly ['goustli] adj. 1. як здань; бляды́, бле́дны; цьмя́ны, няя́сны. 2. пра ду́хаў: ***ghostly legends*** леге́нды пра ду́хаў

ghost writer фактычны а́ўтар (*які́ пі́ша для другі́ога намі́на́льнага а́ўтара*)

ghoul [gu:l] n. 1. крывасмо́к -а *m.*, вампі́р -а *m.*, ваўкала́к -а *m.* 2. чалаве́к, які́ раскрада́е магі́лы

giant ['dʒaɪənt] – n. 1. во́лат -а *m.*; асі́лак -ка *m.*; гіга́нт -а *m.* 2. чалаве́к, які́ перасяга́е і́ншых інтэле́ктам, здо́льнасьцямі, ге́ній; тыта́н: ***giants in the field of science*** во́латы ў галіне́ нау́кі. 3. чалаве́к вялі́кага ро́сту й сі́лы, гіга́нт -а *m.*
– adj. 1. велічэ́зны, веліза́рны, вялі́зны; асі́лкаў (*сі́ла, рост*). 2. які́ перасяга́е і́ншых, выда́тны, надзвыча́йны; гіга́нцкі

giantess ['dʒaɪəntəs] n. во́латка *f.*; жанчы́на-во́лат

gibber ['dʒɪbər] – v.i. 1. гаварыць абы́ што, мало́ць; балабо́ніць. 2. гаварыць ху́тка і невыра́зна, балбата́ць, саката́ць
– n. балбатня́ *f.*, трапа́ньне языко́м

gibbet ['dʒɪbɪt] – n. шыбеніца *f.*
– v.t. ве́шаць на шыбеніцы. 2. выстаўля́ць на публі́чны по́сьмех (*у прэ́се*)

gibe [dʒaɪb] **gibed, gibing,** – v. 1. насьміха́цца; кпіць; зьдзе́кавацца
– n. насьме́шка *f.*, кпі́ны *pl. only.* зье́длівая заўва́га

gibing ['dʒaɪbɪŋ] adj. насьме́шлівы. зьдзе́клівы, по́ўны кпі́наў

giblet ['dʒɪblət] n., pl. **giblets** курыны́я гусі́ныя вантро́бы

giddiness ['gɪdinəs] n. мло́снасьць млосьць *f.*; за́марак -у *m.*, замарачэ́ньне *n.*, то́е, што выклі́ка́е за́марак

giddy ['gɪdi] adj. 1. мло́сны: ***I feel giddy*** у мяне́ замаро́чваецца ў галаве́; мне мло́сна. 2. легкаду́мны, непава́жны. 3. недарэ́чны, бессэнсо́ўны, бязглу́зды; абсу́рдны

gift [gɪft] – n. 1. падару́нак -ка *m.*, дар -у *m.* 2. здо́льнасьць *f.*, та́лент -у *m.*, дар -у *m.*: ***a gift of painting*** здо́льнасьць малява́ць
– v.t. 1. дарыць; дарава́ць. 2. дарыць, абдо́рваць (*напр. малады́х*)

gifted ['gɪftɪd] adj. таленавіты, здо́льны

gigantic [ˌdʒaɪ'gæntɪk] adj. 1. асі́лкаў: ***a man of gigantic build*** мужчы́на з асі́лкавым скла́дам. 2. веліза́рны, велічэ́зны, гіга́нцкі

giggle ['gɪgəl] – v.i. хіхі́каць
– n. хіхі́каньне *n.*, сьме́шкі *pl. only*

gild I [gɪld] v.t. 1. залаці́ць, а) пакрыва́ць пазало́тай. б) фарбава́ць у залаці́сты ко́лер. в) Informal прыхаро́шваць, прыкра́шваць: ***gild the pill*** падсаладзі́ць го́ркую пілю́лю

gild II [gɪld] n. *гл.* **guild**

gilded ['gɪldɪd] adj. 1. залачо́ны, пазалочаны. 2. залаты́ (*бага́ты*): ***the gilded youth*** залата́я мо́ладзь

gills [gɪlz] n. 1. шчэ́лепы *pl.* 2. другі́ падбаро́дак. 3. баро́дка ў пе́ўня

gilt [gɪlt] v., *pt. and pp. of* **gild,** n. пазало́та *f.*

gimlet ['gɪmlət] – n. сьве́рдзел -а *m.*, сьвярдзёлак -ка *m.*
– v.t. 1. сьвідрава́ць. 2. пі́льна ўгляда́цца ў *каго́-што*, сьвідрава́ць по́зіркам

gin I [dʒɪn] n. джын -у *m.*

gin II [dʒɪn] – n. 1. бавоўнаачышча́льная машы́на. 2. калаўро́т -а *m.*, лябёдка *f.* (*машы́на*). 3. сіло́ *n.*, сілло́к -ка́ *m.*, па́стка *f.*
– v.t. 1. ачышча́ць бавоўну. 2. лавіць сіло́м (*пту́шак, жывёлін*)

ginger ['dʒɪndʒər] – n. 1. імбі́р -у *m.* 2. прыпра́ва зь імбі́ру. 3. Informal жы́васьць, жва́васьць, вёрткасьць; руха́васьць, энэргі́чнасьць *f.*
– adj. чырванава́та- або́ бурава́та-жо́ўты (*ко́лер*)
– v.t. 1. запраўля́ць імбі́рам. 2. Informal ажыўля́ць

ginger beer імбі́рнае пі́ва (*безалькагго́льны напо́й*)

gingerbread ['dʒɪndʒərbred] n. 1. імбі́рны пе́рнік. 2. безгусто́ўныя, тандэ́тныя аздо́бы (*у архітэкту́ры*)

gingerly ['dʒɪndʒərli] adv. 1. ве́льмі асьцяро́жна, асьцерага́ючыся. 2. Obsol. далікатна, мане́рна: ***to dance gingerly*** танцава́ць мане́рна

Gipsy or **gipsy** ['dʒɪpsi] – n., pl. **-sies,** esp. Brit. **Gypsy** цыга́н -а *m.*, цыга́нка *f.*
– adj. цыга́нскі

giraffe [dʒə'ræf] n. жыра́фа *f.*

gird I [gɜ:rd] v.t. **girt** or **girded** 1. падпяра́зваць (-ца); апяра́зваць (-ца). 2. абкружа́ць, абгаро́джваць, апяра́зваць (*лес, по́ле*). 3. адзява́ць; надзяля́ць (*уладай*)

gird II [gɜ:rd] v. насьміха́цца; кпіць

girder ['gɜ:rdər] n. апо́рная бэ́лька (*у будынках, для сто́лі*), тра́ма *f.*; (*для да́ху*) кла́дзіна *f.*; (*для мо́сту*) падва́ліна *f.*

girdle ['gɜ:rdəl] – n. 1. по́яс, паяс -а *m.* 2. жано́чы гарсэ́т
– v.t. 1. акружа́ць, апяра́зваць. 2. кальцава́ць (*пту́шак, ры́бы, дрэ́вы*)

girdling ['gɜ:rdlɪŋ] n. кальцава́ньне *n.* (*дрэ́ваў*)

girl [gɜ:rl] n. 1. дзяўчы́на *f. dim.* дзяўчы́нка *f.*, дзяўчо́ *n.* 2. служа́нка *f.*, ха́тняя рабо́тніца. 3. Informal сымпа́тыя, лю́бая *f.* 4. Informal жанчы́на *f.* (*усяля́кага ве́ку*). 5. Informal маладая са́мка
• ***girl friend*** сымпа́тыя *f.*; сяброўка, прыяцелька *f.*

girl guide, Brit. ска́ўтка *f.*

girlhood ['gɜ:rlhʊd] n. дзявочыя гады́, дзявоцтва *n.*

girlie ['gɜ:rli] n., Informal дзяўчы́нка, дзяўчы́начка *f.*, дзяўчо́ *n.*

girlish ['gɜ:rlɪʃ] adj. 1. дзявочы, дзявоцкі. 2. хто трыма́ецца, як дзяўчы́на

girl scout ска́ўтка *f.*

girth [gɜ:rθ] n. 1. абхо́п, паме́р -у *m.* (*дрэ́ва*). 2. папру́га *f.*

gist [dʒɪst] n. су́тнасьць спра́вы

give [gɪv] **gave, given,** – v.t. 1. дава́ць, аддава́ць: ***He gave me his watch*** Ён даў мне свой гадзі́ньнік; ***to give one's word*** даць сло́ва. 2. дарыць, ахвяро́ўваць: ***He gave freely to the hospital*** Ён шмат ахвяро́ўваў на шпіта́ль. 3. уручы́ць; перадава́ць: ***give regards*** перадава́ць прывіта́ньні. 4. ***to give a lecture*** прачыта́ць ле́кцыю; ***to give trouble*** рабіць кло́пат
– v.i. 1. дава́ць. 2. паддава́цца (*на́ціску, напо́ру*) 3. датарно́ўвацца да *чаго́*, прызвыча́йвацца
• ***give away,*** Informal а) адда́ць (*і за́муж*). б) вы́даць сакрэ́т, прагавары́цца
• ***give back*** аддава́ць (*узя́тае*) варо́чаць, вярта́ць
• ***give in*** а) саступа́ць, паддава́цца. б) уручы́ць
• ***give or take*** прыбліз́на.
• ***give off*** вылуча́ць, выдзяля́ць (*пах, газ*)
• ***give out*** а) раздава́ць, разьдзяля́ць. б) распаўсю́джваць, падава́ць да ве́дама
• ***give up*** а) перада́ць. б) зда́цца, адступа́ць, адмо́віцца ад *чаго́* в) пакі́-

нуць (*пра́цу*), кі́нуць (*прывы́чку*). г) стра́ціць надзе́ю

give-and-take [ˌgɪvənˈteɪk] n. 1. ро́ўны, справядлі́вы абме́н. 2. кампрамі́с -у *m.*

given [ˈgɪvən] adj. 1. да́дзены, пада́дзены: ***example given above*** пада́дзены вышэ́й пры́клад. 2. схі́льны, які́ ма́е звы́чай

given name імя́

giver [ˈgɪvər] n. той, хто дае́; ахвярада́вец -ўца *m.*

glacé [glæˈseɪ] adj.1. зацукрава́ны (*фрукт*), глязурава́ны (*піро́г*). 2. замаро́жаны. 3. паліва́ны (*по́суд*), глянцава́ны (*папе́ра*)

glacial [ˈgleɪʃəl] adj. 1. ледавіко́вы. 2. ледзяны́, абледзяне́лы; лядо́вы (*пла́ваньне*). 3. ве́льмі хало́дны, хало́дны як лёд, ледзяны́. 4. ве́льмі паво́льны. 5. Chem. крышталізава́ны

glacial period ледавіко́вы пэры́яд

glacier [ˈgleɪʃər] 1. ледаві́к -á *m.* 2. лядні́к ледніка́ *m.*, гле́тчар -а *m.* (*паўзу́чы лёд у гара́х*)

glad [glæd] – adj. **gladder, gladdest** 1. рады, задаво́лены: ***to be glad*** це́шыцца; ра́давацца; ***I am glad to see you*** Я ра́ды вас ба́чыць. 2. ра́дасны, прые́мны: ***The glad news*** прые́мная ве́стка
– v.t., Archaic це́шыць, ра́даваць
– v.i. це́шыцца, быць задаво́леным

gladden [ˈglædən] v. 1. це́шыць (-ца), ра́даваць (-ца). 2. весяліць

glade [gleɪd] n. 1. паля́на, прага́ліна *f.* (*у ле́се*). 2. балаці́стая нізі́на

glad eye, Sl. залётны по́зірк

gladly [ˈglædli] adv. задаво́лена; ве́села; ахво́ча, ахво́тна; з прые́мнасьцю, з ра́дасьцю, з ахво́тай

gladness [ˈglædnəs] n. ра́дасьць, задаво́ленасьць *f.*

glamor, Brit. **glamour** [ˈglæmər] – n. 1. прыва́бны, спаку́сьлівы чар; тае́мная захапля́льнасьць. 2. ча́ры *pl. only*
– v.t. 1. зачаро́ўваць, заваро́жваць; ачаро́ўваць; паланіць; прыва́бліваць. 2. кі́даць ча́ры, зачаро́ўваць

glamorous, Brit. **glamourous** [ˈglæmərəs] adj. чаро́ўны, захапля́льны; прыва́бны, прыва́блівы, прына́дны; спаку́сьлівы

glance [glæns] – n. 1. бе́глы по́зірк; по́гляд -у *m.* 2. бліск -у *m.*, бліскань не зіхаце́ньне *n.*
– v.i. 1. пазіра́ць; загляда́ць. 2. бліскаць, зіхаце́ць. 3. адбіва́цца (*пра гук, про́мень*)
– v.t. 1. кі́даць бе́глы по́зірк. 2. уба́чыць мімахо́дзь

gland [glænd] n. залоза *f.*

glanders [ˈglændərz] n. сап -у *m.* (*ко́нская хвароба*)

glare I [gler] – n. 1. адсьве́т, во́дбліск -у *m.*; зы́ркае асьляпля́льнае сьвятло́. 2. лю́ты і зло́сны по́зірк. 3. празьме́рная бліску́часьць напака́з
– v.i. 1. асляпля́льна блішчэ́ць. 2. глядзе́ць лю́та і са зло́сьцю. 3. кі дацца ў во́чы (*пра я́ркі ко́лер*)

glare II [gler] n. 1. сьве́тлая, гла́дкая паве́рхня: ***glare ice*** гла́дкі, бліску́чы лёд

glaring [ˈglerɪŋ] adj. 1. зы́ркі, я́ркі. 2. які́ глядзіць лю́та і са зло́сьцю. 3. зана́дта страка́ты. 4. Informal які́ кі даецца ў во́чы; відаво́чны: ***a glaring fault*** відаво́чная, гру́бая памы́лка

glass [glæs] – n. 1. шкло *n.* 2. шкля́нка, ча́рка *f.* 3. лю́стра *n.* 4. шкляны́я рэ чы *або́* по́суд. 5. шы́ба, шы́біна *f.*
– v.t. 1. шкліць (*во́кны*); трыма́ць *што* пад шклом або́ ў цяпліцы. 2. адбіва́ць (*як у лю́стры*). 3. наво́дзіць люстра́ны гля́нец, глянцава́ць
– adj. 1. шкляны́ (*по́суд*). 2. зашкле́ны: ***a glass door*** зашклёныя дзьве́ры
• ***glasses*** акуля́ры *pl. only.*

glass blower гу́тнік -а *m.*

glass blowing гу́тніцтва *n.* (выдзіма́нье шкла)

glass case вітры́на *f.*

glass eye шту́чнае шкляно́е во́ка

glasshouse [ˈglæshaʊs] n. 1. парні́к -á *m.*, цяпліца, аранжэрэ́я *f.* 2. гу́та *f.*, шкляны́ заво́д

glasslike ['glæslaɪk] adj. шкляні́сты; я́сны, празры́сты (*як шкло*)
glass paper шкляна́я папе́ра, наждА́к -ý *m.*
glassware ['glæswer] n. шкляны́я вы́рабы
glass wool шкляна́я ва́та
glasswork ['glæswɜ:rk] n. 1. вы́раб шкла *або́* шкляны́х прадме́таў. 2. шкляны́я вы́рабы. 3. шкле́ньне во́кнаў; глянцава́ньне, паліва́ньне, глязурава́ньне *n.*
glassworks ['glæswɜ:rks] n. гу́та *f.*, шкляны́ заво́д
glassy ['glæsi] adj. 1. люстраны́, гла́дкі; празры́сты. 2. цьмя́ны; вя́лы; нежывы́: ***glassy eyes*** а) во́чы зь вя́лым, тупы́м по́зіркам. б) засты́лыя, шкляны́я во́чы (*паме́рлага*)
glaze [gleɪz] – v. 1. шкліць, ашкліць, зашкліць (*акно́, карці́ну*), устаўля́ць шкло (*у акно́*). 2. паліва́ць (*ганча́рныя вы́рабы*), глязурава́ць (*парцаля́ну, цукёркі*), глянцава́ць папе́ру
– n. 1. а) палі́ва *f.* б) лёд (*на хо́дніку*). 2. ***cooking glaze*** глязу́ра *f.* 3. галалёд -у *m.*, галалёдзіца *f.*
glazier ['gleɪʒər] n. шкляр -á *m.*
glazing ['gleɪzɪŋ] n. 1. шкле́ньне *n.* (*во́кнаў*), шкло, шы́бы для шкле́ньня. 2. палі́ва, глязу́ра *f.* 3. паліва́ньне, глязурава́ньне, глянцава́ньне *n.*; палі́ўка, глязуро́ўка, глянцо́ўка *f.*
gleam [gli:m] – n. 1. бліск -у *m.*, праме́нь сьвятла́; слабо́е сьвятло́. 2. про́бліск -у *m.* (*надзе́і, со́нца*)
– v.i. 1. сьвяці́цца, ясьне́ць. 2. мига́ць, мігаце́ць, мігце́ць (*пра зо́ркі*). 3. праблі́скваць, бліскаць імгне́нна
glean [gli:n] v. 1. зьбіра́ць каласы́ на по́лі (*пасьля́ жніва́*). 2. зьбіра́ць адно́ па адны́м (*фа́кты, ве́сткі*)
glee [gli:] n. 1. ра́дасьць, весяло́сьць *f.*; асало́да *f.* 2. пе́сьня для трох ці бо́льш галасо́ў
glen [glen] n. мала́я, ву́зкая лагчы́на, лагчы́нка *f.*
glib [glɪb] adj. гаварлі́вы, гаваркі, гла́дкі на язы́к: ***glib excuses*** гла́дкія адгаво́ры
glide [glaɪd] – v.i. 1. ру́хацца лёгка й пла́ўна; сьлі́згаць, ко́ўзацца; сьлі́згаць, плыць (*па вадзе́*). 2. міна́ць паво́лі *або́* няўзна́к: ***The years glided past*** гады́ міна́лі няўзна́к. 3. пляніраваць, пла́ўна зьніжа́цца
– n. 1. пла́ўны, лёгкі рух. 2. плянірава́ньне *n.*, пла́ўнае зьніжэ́ньне самалёта
• ***glide into*** пла́ўна, паступо́ва перахо́дзіць з аднаго́ ста́ну ў і́ншы
glider ['glaɪdər] n. плянёр -а *m.*
glimmer ['glɪmər] – n. 1. мігце́ньне *n.*, слабо́е мігатлівае сьвятло́. 2. няя́снае ўяўле́ньне, ду́мка. 3. слабы́ про́бліск (*надзе́і*)
– v.i. 1. мігце́цца; мига́ць. 2. мільгану́ць (*пра ду́мку, надзе́ю*)
• ***go glimmering*** гі́нуць, прападаць; разбура́цца
glimpse [glɪmps] – n. 1. мімалётнае ба́чаньне: ***to catch a glimpse of*** пабачыць мімахо́дзь; ***at a glimpse*** на пе́ршы по́гляд. 2. про́бліск -у *m.* (*ра́дасьці*)
– v.t. пабачыць бе́гла, пабачыць мімахо́дзь
– v.i. 1. бе́гла зірну́ць, зазірну́ць (*у кні́гу*). 2. сла́ба сьвяці́ць, мігце́цца
glint [glɪnt] – v.i. 1. сьвяці́цца (*пра со́нца*); бліскнуць; зіхацёць; ясьне́ць. 2. ху́тка прано́сіцца, ху́тка ру́хацца
– n. 1. блеск, бляск -у *m.*; бліск -у *m.* (*у вача́х*). 2. я́снасьць *f.*
glisten ['glɪsən] – v.i. блішчэ́ць; зьзяць; прамяне́ць; іскры́цца
– n. зы́ркі, я́ркі блеск, зьзя́ньне *n.*
glitter ['glɪtər] – v.i. 1. пералівацца, ясьне́ць, зьзяць; іскры́цца. 2. блішчэ́ць
– n. 1. зы́ркае, асьляпля́льнае сьвятло́, зьзя́ньне *n.* 2. бляск, шык -у *m.*, раско́ша *f.*
glittering ['glɪtərɪŋ] – adj. бліскучы, блішча́сты; зіхатлі́вы, зіхо́ткі, асьляпля́льны
– n. зьзя́ньне *n.*
gloat [gloʊt] v.t. 1. (over) е́сьці, паглынаць вачы́ма; зларадні́чаць; це́шыц-

ца самóму сабé: ***The miser gloated over his gold*** Скнáра паглынáў вачы́ма сваё зóлата

global [ˈgloubəl] adj. 1. сусьвéтны: ***global unrest*** сусьвéтны неспакóй. 2. усеагýльны, глябáльны. 3. які́ мáе фóрму шáру, шарападóбны

globe [gloub] – n. 1. кýля *f.*, шар -а *m.*, сфэ́ра *f.*, зямнáя кýля. 2. зямля́ *f.*, сьвет -у *m.* 3. плянэ́та *f.*, нябéснае цéла. 4. глёбус -а *m.*

– v. прымáць фóрму шáра, надавáць фóрму шáра

globetrotter [ˈgloubˌtrɑ:tər] n. кругасьвéтны падарóжнік; чалавéк, які́ падарóжнічае па сьвéце

globular [ˈglɑ:bjələr] adj. 1. шарападóбны; крýглы, сфэрычны. 2. які́ складáецца з шарападóбных часьці́нак

globule [ˈglɑ:bju:l] n. шáрык -а *m.*, крóпелька *f.*: ***globules of sweat*** крóпелькі пóту.

gloom [glu:m] – n. 1. а) змрóчнасьць, панýрасьць *f.* б) маркóта *f.*, сум -у, смýтак -ку *m.*, жýрба *f.*, змрóчны настрóй. 2. цéмра, цéмрадзь, цéмрань, цéмень, цьма *f.* 3. змрóчнае мéсца, мóрак, змрок -у *m.* 4. прыгнéчаны вы́гляд

– v.i. 1. цямнéць; засмучáцца. 2. чýцца прыгнéчаным *абó* няшчáсным. 3. мець смýтны, маркóтны *абó* змрóчны вы́гляд

– v.t. 1. засмучáць, прыгнятáць, рабі́ць змрóчным. 2. прадстаўля́ць *што* ў цёмных фáрбах

gloomy [ˈglu:mi] adj. 1. сýмны, маркóтны, невясёлы; панýры, хмýрны (*пра вóсень*); у змрóчным настрóі. 2. цёмны, змрóчны (*зімóвы дзень*). 3. прыгнятáльны; які́ абезнадзéйвае *абó* адбівáе ахвóту

glorification [ˌglɔ:rɪfɪˈkeɪʃən] n. 1. услаўлéньне, праслаўлéньне, усхвалéньне *n.* 2. урачы́стае адзначэ́ньне, ушанава́ньне *n.*

glorified [ˈglɔ:rɪfaɪd] adj. 1. услáўлены, праслáўлены; усхвáлены. 2. апéты (*у пéсьнях, вéршах*)

glorify [ˈglɔ:rɪfaɪ] v.t. **-fied, -fying** 1. услаўля́ць, праслаўля́ць, усхваля́ць: апява́ць (*у пéсьнях, вéршах*). 2. славіць, пакланя́цца (*Бóгу*); хвалíць. 3. упрыгóжваць; праясьня́ць, рабíць я́сным (*нéба*)

glorious [ˈglɔ:riəs] adj. 1. слáўны, славýты; праслáўлены; выдáтны (*пра падзéю*). 2. які́ даé слáву; пачэ́сны. 3 пы́шны, вéлічны; дзівóсны, цудóўны; вéльмі прыéмны

glory [ˈglɔ:ri] – n., pl. **-ries** 1. слáва *f.*; вялíкая пахвалá й гóнар. 2. пы́шнасьць *f.*, харáство *n.*, крáса *f.* 3. німб -а *m.*, арэóл -у *m.*, зьзя́ньне *n.*

– v.i. ганары́цца, рáдавацца

• ***go to glory*** памéрці.

gloss I [glɑ:s] – n. 1. гля́нец -цу *m.* а) бляск -у *m.* (*начы́шчанай адпаліраванай павéрхні*). б) беззагáнны вы́гляд, вóнкавы бляск

– v.t. 1. навóдзіць бляск, глянцаваць. 2. загладжваць (*нéшта няпрáвільнае*)

gloss II [glɑ:s] n. 1. глёса *f.* (*тлумачэ́ньне незразумéлага слóва ці вы́разу на палях*): ***glosses in Skaryna's texts*** глёсы ў Скары́навых тэ́кстах. 2. падрадкóвы пераклáд, глясáрый -я *m.* 3. наўмы́сна перакрýчаная *абó* фальшы́вая інтэрпрэтáцыя

glossary [ˈglɑ:səri] n., pl. **-ries** 1. глясáрый -я *m.*, тлумачáльны слóўнік малавядóмых слóваў, звычáйна старажы́тнага тэ́ксту; глёсы

glossy [ˈglɑ:si] – adj. гладкі і бліскýчы; паліраваны (*стол*), глянцаваны

– n., Informal здымак на глянцаванай папéры

glove [glʌv] n. 1. рукавíца, пальчáтка *f.* 2. баксёрская рукавíца ***to fit like a glove*** дасканáла пасаваць

• ***handle with kid gloves*** далікáтна, абярэ́жна абыхóдзіцца

glow [glou] – n. 1. вóдбліск, блеск -у *m.*, зáрава *n.* (*ад пажáру, зáходу сóнца*). 2. напáл жáру (*у пéчы*). 3. румя́нец -цу *m.*: ***the glow of health on his cheeks*** здарóвы румя́нец на ягóных

шчо́ках. 4. запа́л -у *m.*, гара́чае пачуццё: ***a glow of interest or excitement*** запа́л зацікаўленасьці *або́* ўзбу́джанасьці
• ***the glow of sunset*** вячэ́рняя зара́
– v.i. 1. сьвяці́цца (*пра распа́ленае*). 2. гарэ́ць, пала́ць, палымне́ць (*зы́ркім агнём або́ пачуццём*): ***to glow with resentment*** пала́ць абурэ́ньнем, гне́вам. 3. чырване́ць, пунсове́ць (*пра шчо́кі*)

glower ['glauər] v.i. глядзе́ць зло́сна, спадылба́

glowing ['glouɪŋ] adj. 1. я́сны, сьве́тлы (*ко́лер*); зы́ркі, асьляпля́льны (*со́нца, по́лымя*). 2. распа́лены дачы́рвана *або́* дабяла́; румя́ны (*пра шчо́кі*): ***a glowing tan*** залаці́ста-румя́ны загар. 3. ахво́чы, па́лкі; жывы́, яскра́вы: ***a glowing description*** яскра́вае апіса́ньне

glow-worm ['glouwɜ:rm] n. сьвятля́к сьветляка́ *m.*, сьветлячло́к -ка́ *m.*

glucose ['glu:kous] n. глюко́за *f.*

glue [glu:] – n. клей -ю *m.*
– v.t. 1. кле́іць, закле́йваць (*канвэ́рт*), скле́йваць. 2. Informal ліпнуць: ***He glued his eyes to the windows*** Ён не адрыва́ў по́зірку ад во́кнаў

glum [glʌm] adj. пану́ры, змро́чны

glut I [glʌt] – v.t. 1. перако́рмліваць. 2. насыча́ць, заспако́йваць (*сма́гу, ціка́васьць*)
– v.i. 1. наяда́цца дасы́та. 2. аб'яда́цца. 3. затава́рваць ры́нак
– n. 1. аб'яда́ньне. 2. вялі́кая ко́лькасьць, пе́расыць *f.* 3. затава́рваньне ры́нку

glut II [glʌt] v.t. пра́гна глыта́ць

glutton ['glʌtən] n. 1. абжо́рла -ы *m. & f.* 2. прагві́ты, ненажэ́рны *або́* насы́тны чалаве́к

gluttonous ['glʌtənəs] adj. абжо́рысты, абжо́рлівы; ненажэ́рны, насы́тны

gluttony ['glʌtəni] n., pl. **-nies** абжо́рства *n.*, абжо́рлівасьць, пражо́рлівасьць *f.*

glycerin ['glɪsərɪn] – n. гліцэры́н -у *m.*
– adj. гліцэры́навы

gnarl [nɑ:rl] n. сук -а́ *m.*, сучло́к -ка́ *m.*; на́раст -у *m.* (*на дрэ́ве*)

gnarled [nɑ:rld] or **gnarly** ['nɑ:rli] adj. сукава́ты, гузава́ты, скры́ўлены (*пра дрэ́ва*)

gnash [næʃ] v.t. скрыгата́ць (*зуба́мі*)

gnat [næt] n. 1. мо́шка *f., coll.* машкара́ *f.*, гнюс -у *m.* 2. Brit. камар -а́ *m.*

gnaw [nɔ:] v.t. 1. гры́зьці, прагрыза́ць. 2. разьяда́ць, паступо́ва падто́чваць. 3. гры́зьці, непако́іць, му́чыць (*пра страх*)

gnawer ['nɔ:ər] n. грызу́н -а́ *m.*

gnawing ['nɔ:ɪŋ] – n. 1. грызе́ньне, разьяда́ньне, падто́чваньне *n.* 2. боль *f.* (*у жываце́*); загры́зла -ы *f.*, паку́ты сумле́ньня
– adj. 1. які́ грызе́, разьяда́е, падто́чвае. 2. даку́члівы (*пра боль*)

gnome [noum] n. гном -а *m.*

go [gou] **went, gone, going,** – v.i. 1. і́сьці; хадзі́ць: ***Do you go to school?*** Ці ты хо́дзіш у шко́лу?; ***I must go*** Я му́шу і́сьці; ***Does your watch go well?*** Ці ваш гадзі́ньнік до́бра йдзе? 2. е́хаць; е́зьдзіць: ***to go to Belarus*** пае́хаць у Белару́сь; ***to go by car*** е́хаць а́ўтам; ***to go by plane*** ляце́ць самалётам. 3. сяга́ць: ***His memory does not go back that far*** Яго́ная па́мяць не сяга́е так далёка. 4. міна́ць, прахо́дзіць (*пра час*): ***The pain has gone*** Боль суня́ўся; ***All hope is gone*** Прапа́ла ўся надзе́я. 5. губі́ць, тра́ціць: ***His eyesight is going*** У яго́ псуе́цца зрок. 6. памі́раць: ***His wife went first*** Яго́ная жо́нка паме́рла ране́й. 7. лама́цца, псава́цца: ***The engine on the old car finally went*** Мато́р у стары́м а́ўце канчатко́ва папсава́ўся. 8. станові́цца, рабі́цца: ***to go bad*** псава́цца; ***to go blind*** сьле́пнуць; ***to go broke*** банкрутава́ць; ***to go mad*** вар'яце́ць, тра́ціць ро́зум; ***to go to bed*** і́сьці спаць
– n. 1. хаджэ́ньне *n.*, рух -у *m.*: ***the come and go of the waves (seasons)*** рух хва́ляў (зьме́на по́раў го́ду). 2. In-

formal мо́да *f.*: ***all the go*** зусі́м па мо́дзе. 3. стан спра́ваў, стано́вішча: ***This is a pretty go!*** Ну й спра́вы! 4. Informal спро́ба *f.*: ***have a go at (doing)*** спрабава́ць (што-н. рабі́ць). 5. Informal уда́ча *f.*: ***I made a go of it*** Удало́ся мне

• ***go about*** а) займа́цца *чым* б) ходзі́ць, пашыра́цца (*пра ве́сткі*)

• ***go along*** супрацо́ўнічаць; згаджа́цца

• ***go along with*** згадзі́цца на *што* з *кім*

• ***go around*** а) ходзі́ць зь ме́сца на ме́сца, разьязджа́ць. б) хапа́ць на ўсі́х

• ***go at*** а) кі́нуцца на каго́-н. б) энэргі́чна ўзя́цца за *што*

• ***go back on*** а) здра́дзіць. б) не стрыма́ць сло́ва; адыйсьці́ся, адмо́віцца ад *чаго́*

• ***go behind*** дашу́кваццa запра́ўднае прычы́ны

• ***go by*** а) міна́ць (*пра час*); прахо́дзіць паўз *што*. б) кірава́цца *чым*, трыма́цца *чаго́*. в) ісьці́ пад *чым*: ***go by the name*** быць вядо́мым пад і́мем. г) абыхо́дзіцца без *чаго́*: ***He cannot go by without food*** Ён ня мо́жа абыхо́дзіцца бязь е́жы

• ***go down*** а) зыхо́дзіць, зьяжджа́ць, спада́ць (*пра схі́л*); зьні́жа́цца (*пра тэмпэрату́ру, цану́*). б) прайграва́ць; быць перамо́жаным. в) тра́ціць гвалто́ўнасьць, прыціха́ць (*пра ве́цер*). г) быць прыня́тым (*пра прапано́ву*)

• ***go for*** а) імкну́цца да не́чага. б) быць за *што*, падтрымо́ўваць

• ***go into*** а) увайсьці́, зьмясьці́цца. б) уніка́ць, заглыбля́цца, увахо́дзіць (*глыбе́й у спра́ву*)

• ***go it alone*** дзе́яць самастоя́йна, без дапамо́гі

• ***go off*** а) пайсьці́; вы́ехаць, ад'е́хаць. б) вы́страліць, стрэ́ліць (*пра пістале́т*). в) зыйсьці́, перастаць. г) памёрці. д) адбы́цца: ***The picnic went off as planned*** Пі́кнік адбы́ўся, як плянава́лася

• ***go on*** а) ісьці́ *або́* рабі́ць далёй, праця́гваць што-н. рабі́ць. б) цягну́цца, расьця́гвацца. б) трыма́цца, павядзі́ць сябе́. в) дзе́іцца: ***What goes on here?*** Што тут дзе́ецца? г) *выка́зваючы недаве́р*: ***Go on! Are you serious?*** Ідзі́ ты! Ты гэ́та сур'ёзна?

• ***go out*** а) выхо́дзіць (*з до́му, з мо́ды*); быва́ць у тава́рыстве, на вечаро́х. б) пага́снуць. в) зако́нчыцца, ско́нчыцца. г) пайсьці́ на страйк. д) завалі́цца, абвалі́цца

• ***go over*** ува́жліва праглядаць, перачы́тваць, паўтара́ць

• ***go through*** а) давядзі́ць да канца́. б) перажы́ць: прайсьці́, перане́сьці (*цяжку́ю апэра́цыю*). в) шна́рыць; шука́ць. г) прайсьці́, быць прыня́тым (*пра прае́кт*)

• ***go together*** хадзі́ць, сымпатызава́ць адно́ аднаму́, любі́цца (*пра хлапца́ й дзяўчы́ну*)

• ***go to pieces*** распада́цца на кава́лкі; не вало́даць сабо́ю

• ***go under*** а) зруйнава́цца, прапа́сьці, гі́нуць. б) тану́ць (*пра карабе́ль*)

• ***go up*** а) узыхо́дзіць; узьяжджа́ць; падыма́цца (*пра баро́мэтар*): ***The curtain goes up at 7 p.m.*** П'е́са пачына́ецца а 7-ай ве́чара. б) будава́цца. в) павыша́цца, расьці́ (*пра цэ́ны*)

• ***go with*** а) хадзі́ць з *кім* (*заляца́цца*). б) пасава́ць да *чаго́*; падыхо́дзіць: ***The hat goes well with the dress*** Капялю́ш до́бра пасу́е да суке́нкі

• ***go without*** абыхо́дзіцца без *чаго́*

• ***It's a go*** Зго́да (*пры таргава́ньні*)

• ***It's no go,*** Informal а) Не згаджа́юся, Гэ́так ня по́йдзе. б) безнадзе́йна, немагчы́ма

• ***let go*** а) вы́пусьціць. б) паки́нуць (*рабі́ць*); адмо́віцца ад *каго́-чаго́*

• ***on the go*** , Informal мо́цна заня́ты; дзе́йны; заўсёды ў ру́ху; непасе́длівы, мітусьлі́вы

goad [goud] – n. 1. кій кія *m.* (*для паганя́ньня жывёлы*). 2. узбуджа́льнік -а *m.*, сты́мул -у *m.*; шпо́ра *f.*

– v.t. паро́ць; паганя́ць (*кі́ем, шпо́рай*). 2. пабуджа́ць, прымуша́ць: ***Hunger goaded him to steal*** Го́лад прымусіў яго́ кра́сьці

goal [goʊl] n. 1. мэ́та *f.*, намéр -у *m.*, пастáўленая задáча: ***goal of his life*** мэ́та ягóнага жыцця́. 2. мяжá, цэль *f.* (*стральбы́*). 3. фíніш -у *m.* (*у спóрце*). 4. гол -а *m.* (*у гульні́*). 5. брáмнік -а, варатáр -á *m.* (*у спóрце*). 6. брáма, брáмка *f.*, варóты *pl.*

goaler ['goʊlər] n., Can. брáмнік -а *m.*

goalie ['goʊli] n. брáмнік -а *m.*

goalkeeper ['goʊlˌki:pər] n. брáмнік -а *m.*

goat [goʊt] pl. **goats** or coll. **goat** 1. казá *f.*; казýля *f.* (*дзíкая*). 2. гóрны барáн. 3. Sl. ахвя́рны казёл

• ***get one's goat,*** Sl. дражнíць, злавáць *кагó* знарóк

goatherd ['goʊthɜ:rd] n. казíны пастýх

gobble ['gɑ:bəl] v. éсьці хýтка й прáгна, глытáць вялíкімі кавáлкамі

• ***gobble up,*** Informal а) захапíць, схапíць. б) жэ́рці; пажырáць

goblet ['gɑ:blət] n. 1. чáра, чáрка *f.*, бакáл (*да віна́*). 2. Archaic кýбlак -ка *m.*

goblin ['gɑ:blɪn] n. дамавíк -á *m.*

God [gɑ:d] n. Бог -а *m.*: ***Thank God*** Дзя́куй Бóгу; ***God knows where*** Бог вéдае куды́

godchild ['gɑ:dtʃaɪld] n., pl. **-children** хрэ́сьнік, хрóсьнік -а *m.*, хрэ́сьніца, хрóсьніца *f.*

goddess ['gɑ:des] n. 1. багíня *f.* 2. жанчы́на, якýю абагаўля́юць

goddaughter ['gɑ:dˌdɔ:tər] n. хрóсьніца *f.*

godfather ['gɑ:dˌfɑ:ðər] n. хрóсны бáцька

god-fearing ['gɑ:dˌfɪrɪŋ] adj. багабóйны, рэлігíйны

godforsaken ['gɑ:dfərˌseɪkən] adj. усíмі пакíнуты; закíнуты; няшчáсны

godless ['gɑ:dləs] adj. бязбóжны, нерэлігíйны

godlessness ['gɑ:dləsnəs] n. бязбóжнасьць *f.*

godlike ['gɑ:dlaɪk] adj. бóскі, богападóбны

godmother ['gɑ:dˌmʌðər] n. хрóсная máці

godparent ['gɑ:dˌperənt] n. хрóсны бáцька (*для дзіця́ці*), кум -а *m.* (*для бацькóў*), хрóсная máці (*для дзіця́ці*). кумá *f.* (*для бацькóў*)

godsend ['gɑ:dsend] n. Бóгам дáнае, Бóгам паслáнае

godson ['gɑ:dsʌn] n. хрэ́сьнік, хрóсьнік -а *m.*

goggle ['gɑ:gəl] v.i. 1. уталóпвацца, вытарэ́шчвацца, вылýпліваццa. 2. касавýрыцца, скóса паглядзéць; варóчаць вачы́ма

• ***goggles*** n., pl. only ахóўныя акуля́ры

going ['goʊɪŋ] adj. 1. бягýчы, цяпéрашні: ***the going interest rate*** цяпéрашні, бягýчы працэ́нт. 2. прывóдзіць у рух: ***to set the clock (the engine) going*** завéсьці гадзíньнік (матóр)

• ***get going,*** Informal пачынáць рабíць нéшта, брáцца за спрáву

• ***goings*** учы́нкі абó павóдзіны *pl. only*

goiter or **goitre** ['gɔɪtər] n. вальля́к -á *m.* (*хварóба*)

gold [goʊld] – n. 1. зóлата *n.* 2. залаты́я манэ́ты

– adj. 1. залаты́, з зóлата, як зóлата. 2. сьветла-жóўты, залацíсты (*пра кóлер*)

gold-bearing ['goʊldˌberɪŋ] adj. залатанóсны (*пясóк, жы́ла*)

gold diggings залаты́я капáльні, пры́іскі

golden ['goʊldən] adj. 1. залаты́, з зóлата: ***golden cross*** залаты́ кры́ж. 2. залатанóсны. 3. залацíсты, залаты́ (*кóлер*). 4. выдáтны, вéльмі вáжны, каштóўны: ***golden deeds*** высакарóдныя ўчы́нкі. 5. шчасьлíвы; багáты; квітнéючы, залаты́: ***golden age*** залаты́ век, залатáя парá

• ***golden anniversary*** залаты́я ўгóдкі

gold field залатанóснае радóвішча

goldfinch ['goʊldfɪntʃ] n. шчыглóл -лá *m.*

gold mine капáльня зóлата

goldsmith ['goʊldsmɪθ] n. залатáр -á *m.*, ювэлíр -а *m.*

golf [gɑ:lf] – n. гольф -а *m.*

– v.i. гуля́ць у гольф

Golgotha ['gɑ:lgəθə] n. 1. Галгóфа *f.* 2. мéсца пакýтаў

gondola [ˈgɑ:ndələ] n. 1. гандо́ла *f.* 2. кабі́на ў дырыжа́блі, аэраста́це
• ***gondola car*** тава́рны вагóн-платфо́рма для вугля́
gone [gɔ:n] – adj. 1. мінýлы. 2. які́ вы́браўся (*з кватэ́ры*): ***He's gone*** Ён вы́йшаў. 3. стра́чаны; прапа́шчы, безнадзе́йны; непапра́ўны: ***a gone case*** безнадзе́йная спра́ва. 4. мёртвы. 5. вы́даткаваны, патра́чаны (*пра гро́шы*). 6. зруйнава́ны; збанкрутава́ны. 7. слабы́, кво́лы: ***a gone feeling*** кво́лае пачуццё
• ***far gone*** запýшчаны, застарэ́лы (*пра хваро́бу*); зашма́т ублы́таны, уця́гнуты ў *што*
• ***gone on,*** Informal закаха́ны
– v. *p.p. of* **go**
gong [gɔ:ŋ] n. 1. гонг -а *m.* (*музы́чны інструме́нт*). 2. гонг (*гукавы́ сыгна́л*)
good [gʊd] – adj. **better, best** 1. до́бры, до́бранькі: ***good boy (girl)*** малайчы́на -ы *m. & f.* 2. пра́вільны. 3. до́бры, ве́тлы, добразы́члівы; прыхі́льны, спага́длівы: ***a good word*** до́брае сло́ва. 4. до́бры, лю́дзкі (*чалаве́к*). 5. пэ́ўны, надзе́йны; крэдытазда́льны. 6. запра́ўдны, непадро́блены (*гро́шы*). 7. карысны, памо́цны
• ***a good deal*** шмат; шмат які́я, мно́гія
• ***as good as*** амáль таксáма, амáль
• ***for good*** назаўсёды; канчáльна, канчатко́ва
• ***good while*** до́сыць до́ўга
• ***make good*** а) варо́чаць, вярну́ць; аплáчваць, кампэнсава́ць; замяні́ць. б) вы́канаць, спо́ўніць
– n. 1. карысьць *f.*, пажы́так -ку *m.* 2. добро́ *n.*
good afternoon до́бры дзень (*фо́рма прывіта́ньня або́ разьвіта́ньня папаўдні́*)
good-by(e) [ˌgʊdˈbaɪ] – interj., бывáй *sing.*; бывáйце, *pl. and polite.*
– n., pl. **good-byes** разьвіта́ньне *n.*
good day до́бры дзень (*фо́рма прывіта́ньня або́ разьвіта́ньня ўдзень*)
good evening до́бры ве́чар (*фо́рма прывіта́ньня або́ разьвіта́ньня ўве́чары*)
good faith сумле́ннасьць, шчы́расьць
good-for-nothing [ˌgʊdfərˈnʌθɪŋ] – adj нічо́га ня вáрты, нікýды ня вáрты нікчэ́мны
– n. гультáй -я́ *m.*, нягóднік -а *m.*
Good Friday Вялíкая Пя́тніца.
good-hearted [ˌgʊdˈhɑ:rtəd] adj. шчóдры; сардэ́чны, увáжлівы
good-humored, Brit. **good-humoured** [ˌgʊdˈhju:mərd] adj вясёлы, прые́мны; у до́брым настро́і
good-looking [ˌgʊdˈlʊkɪŋ] adj. прыго́жы, ла́дны
good luck 1. шчáсьце, по́сьпех у жыццí; багáцьце *n.* 2. Шчасьлíва! Памажы́ Бо́жа! (*пажада́ньне ўда́чы, шча́сьця*)
good morning до́брай ра́ніцы (*фо́рма прывіта́ньня або́ разьвіта́ньня ўра́ні*)
good-natured [ˌgʊdˈneɪtʃərd] adj. до́брага характáру; прые́мны; лагóдны; нязло́сны
goodness [ˈgʊdnəs] – n. 1. дабрыня́ *f.* 2. дасканáласьць, дабрадзе́йнасьць *f.*
– interj. (*во́кліч зьдзіўленьня*) О, Бо́жа!: ***goodness knows*** Бог ве́дае, хто яго́ ве́дае
• ***for goodness sake*** на прамíлы Бог, на мíласьць Бóга
good night дабрáнач, до́брай но́чы
goods [gʊdz] n., pl. 1. а) асабíстыя рэ́чы, маёмасьць. б. Law рухóмая маёмасьць. 2. тавáры *pl.* 3. мануфакту́ра *f.*, тканíны *pl.*
• ***catch with the goods*** злавíць на гарáчым учы́нку *або́* на ме́сцы злачы́нства
good-tempered [ˌgʊdˈtempərd] 1. спако́йны, з ужы́ўчым характáрам; прые́мны. 2. ураўнава́жаны
good turn паслýга *f.*, до́бры ўчы́нак
good will, n. 1. добразы́члівасьць, прыхíльнасьць, спрыя́льнасьць *f.*: ***a good-will visit*** прыя́цельскі візы́т. 2. гатóўнасьць *f.*, до́брая во́ля. 3. до́брая рэпутáцыя
goody [ˈgʊdi] – n., pl. **goodies** ласýнкі, прысмáкі *pl.*

– interj. ***Oh, goody!*** О, до́бранька!; Цудо́ўна!
– adj. до́бранькі, дабрадзе́йны (*напака́з*)

goof [gu:f] – n., Sl. 1. прасьця́к -а́ *m.*; ду́рлань -ня *m.*, дурні́ца *m. & f.* 2. дурна́я памы́лка *f.*
– v.i. рабі́ць памы́лку, памыля́цца
– v.t. парта́чыць, псава́ць спра́ву

goof off, Sl. 1. марнава́ць час, бязьдзе́йні́чаць; гульта́іць. 2. бадзя́цца бязмэ́тна

goof-off ['gu:fɹɑ:f] n. абібо́к -а *m.*

goofy ['gu:fi] adj. дурнава́ты, бесталко́вы

goose [gu:s] n., pl. **geese** 1. гусь *f.* 2. Informal ду́рлань -ня *m.*, дурні́ца, разява́кla -i *m. & f.*

gooseberry ['gu:sˌberi] n., pl. **-ries** 1. агрэ́ст -у *m.* 2. Informal трэ́цяя асо́ба, яка́я суправаджа́е па́ру закаха́ных

goosebumps ['gu:sbʌmps] n., pl., Informal or **goose flesh** гусі́ная ску́ра, мура́шкі на це́ле

gopher ['goufər] n., Zool. су́сьлік -а *m.*

gore I [gɔ:r] n. 1. запе́чаная кроў; густа́я кроў

gore II [gɔ:r] v.t. 1. прабада́ць, праколо́ць рага́мі *або́* ікла́мі. 2. Obsol. глыбо́ка прабі́ць (*нажо́м*)

gore III [gɔ:r] n. 1. клін, уста́ўлены ў спадні́цу. 2. Dial. клінава́ты ўча́стак зямлі́

gorge [gɔ:rdʒ] – n. 1, глыбо́кая цясьні́на ў гара́х. 2. апэты́тная ядзе́ньне, пражэ́рлівасьць *f.* 3. зьмест стра́ўніка. 4. пачуцьцё агі́ды, абурэ́ньня, кры́ўды
– v.i. пра́гна е́сьці, напі́хвацца; насыча́цца

gorgeous ['gɔ:rdʒəs] adj. пы́шны, вялікапы́шны, раско́шны

gorilla [gə'rɪlə] n. 1. гары́ла *f.* 2. Sl. а) мо́цны й бязьлі́тасны чалаве́к. б) га́нгстэр -а *m.*

gorse [gɔ:rs] n. esp. Brit., Bot. жаўтазе́лʲь -ю *m.*

gory ['gɔ:ri] adj. 1. акрыва́ўлены, запэ́цканы крывёю. 2. крыва́вы (*бой, забо́йства*)

gosling ['gɑ:zlɪŋ] n. 1. гусянё, гусяня́ *n.* 2. дурны́ недасьве́дчаны чалаве́к

gospel ['gɑ:spəl] – n. 1. эва́нгельле *n.* 2. сьвята́я пра́ўда
– adj. эванге́льскі

gossip ['gɑ:səp] – n. 1. плётка *f.*, пляткі́рства *n.* 2. плятка́р -а́ *m.*, плятка́рка *f.*
– v. плятка́рыць

got [gɑ:t] v., *p.t. and a p.p. of* **get** 1. атрыма́ць: ***We got the letter yesterday*** Мы атрыма́лі ліст учо́ра. 2. мець: ***Have you got the pencil?*** Ці ты ма́еш алавік? 3. му́сіць: ***I've got to study now*** Я му́шу цяпе́р вучы́цца

Goth [gɑ:θ] n. 1. гот -а *m.* 2. нецывіліза ва́ны чалаве́к

Gothic ['gɑ:θɪk] – n. 1. го́тыка *f.*, гаты́чны стыль. 2. го́цкая мо́ва. 3. ***gothic*** гаты́чны шрыфт
– adj. 1. гаты́чны (*стыль, архітэкту́ра*). 2. го́цкі (*мо́ва, культу́ра*). 3. нецывілізава́ны, прымітыўны, ба́рбарскі. 4. Obsol. герма́нскі, тэўто́нскі

gouge [gaʊdʒ] – n. 1. паўкру́глае до́лата *або́* стаме́ска. 2. паз, дзі́рка ў дрэ́ве (*вы́браны до́латам*). 3. Informal а) шту́чка *f.*, ашука́нства, круце́льства *n.* б) круцʲе́ль -яля́ *m.*, махля́р -а́ *m.*
– v.i. 1. рабі́ць, выбіра́ць паз паўкру́глым до́латам. 2. выко́пваць; вырыва́ць; выбіва́ць; выко́лваць: ***to gouge an eye*** вы́калаць во́ка. 3. Informal падстро́іць шту́ку, ашука́ць

gourmand ['gʊrmɑ:nd] n. 1. гурма́н -а *m.*, гурма́нка *f.* 2. абжо́рla -ы *m. & f.*

gout [gaʊt] n. 1. пада́гра *f.* 2. кро́пля *f.*; пы́рска *f.*; згу́стlак -ку *m.*: ***gouts of blood*** згу́сткі крыві́. 3. захво́рваньне на сьцёблах пшані́цы й ячме́ню

gouty ['gaʊti] adj. 1. які́ це́рпіць на пада́гру. 2. падагры́чны. 3. які́ выклі ка́е пада́гру. 4. напу́хлы, нібы ад пада́гры

govern ['gʌvərn] v.t. 1. кірава́ць (*дзяржа́вай*); улада́рыць; рэгулява́ць. 2. вало́даць сабо́й. 3. мець уплы́ў; вызнача́ць, абумо́ўліваць. 4. Gram. кірава́ць

governess ['gʌvərnəs] n. 1. гувэрна́нтка, выхава́целька, выхава́льніца *f.* 2. жанчы́на, яка́я кіру́е

government ['gʌvərnmənt] n. 1. ура́д -у *m.* 2. кірава́ньне *n.* (*кра́ем, шта́там*). 2. ура́д -у *m.* 3. лад кірава́ньня. 4. кіраўні́цтва *n.*, упра́ва *f.* 5. Gram. кірава́ньне *n.*

• ***self-government*** самаўра́д -у *m.*

governmental [ˌgʌvərn'məntəl] adj. ура́давы; кіру́ючы, кіраўні́чы

governor ['gʌvənər] n. 1. губэрна́тар -а *m.* 2. кіраўні́к -а́ *m.*, дырэ́ктар -а *m.*: ***a board of governors*** ра́да кіраўні́коў. 4. Tech. рэгуля́тар -а *m.* 5. Obsol. рэпэты́тар -а *m.* 6. esp. Brit., Sl. ба́цька -і *m.*, гаспада́р -а́ *m.* (*на пра́цы*); астро́жны дазо́рца

Governor General, pl. **Governors general,** Can., Aus. генэра́л-губэрна́тар

gown [gaun] n. 1. суке́нка *f.*: ***evening gown*** вечаро́вая суке́нка. 2. а) манты́я *f.* (*судьдзі*). б) прафэсу́ра *f.* 3. начна́я кашу́ля, халя́т -а *m.*, шляфро́к -а *m.* 4. ры́мская то́га

grab [græb] **-bbed, -bbing,** – v.t. 1. хапа́ць. 2. захапля́ць; прысво́йваць. 3. хапа́ць; арышто́ўваць

– n. 1. хапа́ньне *n.* 2. захо́п -у *m.*, прысвае́ньне *n.* 3. Mech. захва́т -а *m.*, аўтаматы́чны чарпа́к, экскава́тар -а *m.* 4. захо́пнік -а *m.*

grace [greis] – n. 1. гра́цыя, згра́бнасьць *f.* 2. прыхі́льнасьць, добразычлі́васьць *f.*; паслу́га, ла́ска *f.* 3. мі́ласьць, лі́тасьць *f.*; дарава́ньне, прабачэ́ньне *n.*: ***by the grace of God*** (*пры каралёўскім ты́туле*) з Бо́жае ла́скі. 4. каро́ткая малі́тва (*пе́рад ядо́й або́ пасьля́ ядо́й*). 5. адтэрмінО́ўка (*упла́ты до́ўгу*). 6. ***Grace*** мі́ласьць, сьве́тласьць *f.* (*фо́рма звароту да ге́рцага, герцагі́ні або́ архібіскупа*): ***Your, His Grace*** Ва́ша, ягО́ная сьве́тласьць

– v.t. 1. дадава́ць прыгажо́сьці *або́* я́касьці. 2. удасто́йваць, ушано́ўваць

• ***fall from grace*** стра́ціць ла́ску

• ***in the good graces of*** у ла́сцы ў *ка-го́*

• ***with bad grace*** неахво́тна; у непры-е́мнай фо́рме, неласка́ва

• ***with good grace*** ахво́ча; ласка́ва

graceful ['greisfəl] adj. 1. по́ўны гра́цыі; згра́бны, прыго́жы, стро́йны. 2. прые́мны

gracious ['greiʃəs] – adj. 1. прые́мны, ве́тлы, ве́тлівы. 2. мі́ласьцівы, ласка́вы; пабла́жлівы. 3. міласэ́рны, спага́длівы . 4. грацыёзны

– inter. (*во́кліч зьдзіўле́ньня*): ***Good gracious!*** А Бо́жухна! А Бо́жачка!

graciousness ['greiʃəsnəs] n. дабрыня́ *f.*: мі́ласьцівасьць, ласка́васьць *f.*

gradation [grə'deiʃən] n. 1. града́цыя *f.* паступо́васьць *f.*; паступо́вы перахо́д. 2. pl. перахо́дныя ступе́ні, адце́ньні. 3. перахо́д ад аднае́ ступе́ні да друго́е *або́* ад аднаго́ ко́леру да друго́га, ценява́ньне. 4. Gram. чаргава́ньне гало́сных, абля́ўт -у *m.*

grade [greid] – n. 1. кля́са *f.* (*у шко́ле*). 2. ступе́нь *f.*, эта́п -у *m.* (*у працэ́се*). 3. гату́нак -ку *m.*, сорт -у *m.*, ранг -у *m.*: ***grade A milk*** малако́ пе́ршага гату́нку. 4. адзна́ка, ацэ́нка *f.* 5. схіл, пака́т -у *m.*

– v.t. 1. разьдзяля́ць на гату́нкі *або́* ступе́ні, сартава́ць, клясыфіка-ва́ць. 2. а) выстаўля́ць адзна́кі. б) разьмяшча́ць (*ву́чняў па кля́сах*). 3. зраза́ць стро́мкі пака́т даро́гі, раўня́ць даро́гу. 4. ценява́ць. 5. паляпша́ць паро́ду крыжава́ньнем зь ле́пшай паро́дай

– v.i. 1. паступо́ва мяня́цца, перахо́дзіць у і́ншую ступе́нь. 2. Ling. чаргава́цца

• ***at grade*** на тым са́мым узро́ўні

• ***the grades*** пачатко́вая шко́ла

grade crossing скрыжава́ньне шляхо́ў (*чыгу́начных, даро́жных, ву́лічных*) на адны́м узро́ўні

gradient ['greidiənt] – n. 1. нахі́л, схіл, пака́т -у *m.* (*даро́гі, чыгу́нкі, кана́лу*). 2. Phys. градые́нт -а *m.*

– adj. 1. паступо́вы. 2. пака́ты, узыхо́дны

gradual ['grædʒʊəl] adj. 1. паступо́вы. 2. спа́дзісты, пахі́лы (*схон*)

gradually ['grædʒʊəli] adv. паступо́ва; ма́ла-пама́лу; патро́ху, патро́хі; пакрысе́, пакры́ху

graduate ['grædʒueɪt] – v. 1. зака́нчваць універсыте́т *або́* шко́лу. 2. паступо́ва зьмяня́цца

– v.t. 1. нано́сіць дзяле́ньні (*на тэрмо́мэтар, лінёйку*). 2. калібрава́ць (*правяра́ць шка́лу*). 3. разьмяшча́ць *або́* разьмяркро́ўваць павóдле мо́цы, велічыні́, ко́леру

– n. ['grædʒuət] 1. выпускні́к -а *m.*, выпускні́ца *f.* (*асабл. універсыте́ту*). 2. Chem. мэнзу́рка *f.*

– adj. які́ зако́нчыў універсыте́т, ма́е ступе́нь бакаля́ўра

• ***graduate course*** or ***study*** курс, які́ падрыхто́ўвае да атрыма́ньня ўнівэрсыте́цкае ступе́ні пасьля́ бакаляўрэа́ту, магістрату́ра *f.*

graduated ['grædʒueɪtəd] adj. 1. з нане́сенай шкало́й. 2. укла́дзены *або́* разьмеркава́ны павóдле ступе́няў, велічыні́, або́ ў пасьлядо́ўным радку

graduate nurse дыплямава́ная мэды́чная сястра́

graduating class выпускна́я кля́са, вы́пуск -у *m.*

graduation [ˌgrædʒu'eɪʃən] n. 1. вы́пуск -у *m.*, заканчэ́ньне шко́лы, універсыте́ту. 2. атрыма́ньне *або́* нада́ньне навуко́вае ступе́ні. 3. цырыманія́л нада́ньня навуко́вае ступе́ні. 4. нано́шаньне шкалы́; шкала́ *f.* 5. града́цыя *f.*

graft I [græft] – v.t. 1. прышчапля́ць (*дрэ́ва*). 2. удаскана́льваць гату́нкі дрэ́ваў, кве́так (*шля́хам прышчэ́пваньня*). 3. перасаджваць жыву́ю тка́нку. 4. прыма́ць, прышчапля́ць, прышчэ́пваць (*но́выя звы́чаі*)

– n. 1. Bot. прышчэ́плак -ка *m.* 2. прышчэ́п -а *m.* 3. прышчэ́пка *f.* (*дзе́ньне*). 4. перасаджаная жыва́я тка́нка

graft II [græft] – n. 1. ха́барніцтва *n.*, бра́ньне ха́бару; по́дкуп -у *m.* 2. ха́бар -у *m.*; нелега́льныя прыбы́ткі

– v.i. браць ха́бар (*асабліва на палітычнай паса́дзе*)

grafter ['græftər] n. 1. той, хто прышчэ́пліваe. 2. ха́барнік -а *m.*, ха́барніца *f.*; махля́р -а́ *m.*, махля́рка *f.*

grain [grem] – n. 1. зе́рне *n.*; зе́рнетка, зярня́тка *n., dim.* (*збо́жжавае*). 2. збо́жжа *n.*: ***a field of grain*** ні́ва *f.* 3. крупі́нка, пясчы́нка *f.*, драбі́нка *f.* (*пяску́*); драбло́к -ка́ *m.* (*со́лі*): ***not a grain of truth*** ні драбі́нкі пра́ўды. 4. гран -а *m.* (*стара́я адзі́нка аптэка́рскай вагі́*). 5. валакно́ *n.*; жы́лка, ні́тка *f.* 6. хара́ктар ад прыро́ды. 7. крышталі́чны стан

– v.t. 1. гранулява́ць (*цу́кар*). 2. малява́ць пад дрэ́ва *або́* ма́рмур. 3. нада ва́ць зярні́стую паве́рхню *чаму́*. 4. ачышча́ць ску́ру ад шэ́рсьці. 5. фарбава́ць у пра́жы, мо́цна насыча́ць фа́рбай. 6. кармі́ць каня́ аўсо́м

– v.i. гранулява́цца; крышталізава́цца

grain elevator элева́тар -а *m.*

grainy ['gremi] adj. 1. зярні́сты; гранулява́ны. 2. які́ ма́е структу́ру падо́бную да дрэ́ва, ма́рмуру

gram [græm] n. грам -а *m.*

grammar ['græmər] n. 1. грама́тыка *f.* 2. асно́вы: ***the grammar of painting*** асно́вы жы́вапісу

grammarian [grə'meriən] n. грама́тык -а *m.*, мовазна́вец -ўца *m.*

grammar school 1. пача́ткавая шко́ла. 2. esp. Brit. сярэ́дняя шко́ла клясы́чнага ты́пу

grammatical [grə'mætɪkəl] adj. граматы́чны: ***grammatical mistake*** граматы́чная памы́лка

gramme [græm] n. Brit., Can. грам -а *m.*

gramophone ['græməfoun] n. Brit. грамафо́н -а *m.*

grampus ['græmpəs] n. 1. вялі́кі марскі́ дэ́льфін. 2. Informal чалаве́к, які́ го́ласна сапе́

granary ['grænəri] n., pl. **-ries** 1. сьві́рлан -на *m.*, клець *f.*, жы́тніца *f.* 2. хлебаро́бная во́бласьць кра́ю

grand I [grænd] adj. 1. грандыёзны; імпазáнтны; высакарóдны, вéлічны; заслýжаны, паважáны: ***a grand man*** заслýжаны чалавéк. 2. найвышэйшы павóдле рáнгу *абó* станóвішча; галóўны, кірýючы. 3. вялíкі; вáжны, галóўны: ***the grand staircase*** парáдныя схóды. 4. Informal вéльмі прыéмны: ***to have a grand time*** вéльмі прыéмна правéсьці час

grand II [grænd] n. раяль -я *m.*

grandaunt ['grændænt] n. цётка бáцькі *абó* мáці

grandchild ['græntʃaɪld] n., pl. **-children** унýк -а *m.*, унýчка *f.*

granddad ['grændæd] or **granddaddy** ['grænˌdædi] n, pl. **-dies,** Informal дзед, дзядýля -і *m.*

granddaughter ['grænˌdɔ:tər] n. унýчка *f.*

grand duchess вялíкая княгíня (*таксáма жóнка кня́зя*), герцагíня *f.* (*жóнка абó дачкá гéрцага*)

grand duchy вялíкае кня́ства; гéрцагства *n.*

Grand Duchy of Lithuania Вялíкае Кня́ства Літóўскае

grand duke вялíкі князь, гéрцаг -а *m.*

grandeur ['grændʒər] n. 1. вéліч *f.*, грандыёзнасьць *f.*; дастóйнасьць, высакарóднасьць; пы́шнасьць *f.* 2. знáтнасьць *f.*

grandfather ['grændˌfɑ:ðər] n. дзед -а *m.*, дзядýля -і *m.*

grandiloquence [græn'dɪləkwəns] n. высакамóўнасьць, напы́шлівасьць *f.* (*стылю*)

grand jury, Law. прыся́жныя (*якíя вырашáюць справу аддáньня пад суд*)

grandma ['grænmɑ:] n. or **grandmamma** ['grændməˌmɑ:] n., Informal бабýля *f.*

grandmother ['grænˌmʌðər] – n. 1. бáбка, бабýля, бабýлька *f.* 2. прарóдзічка *f.*

– v.t. пéсьціць, даглядáць (*дзіця́*)

grandnephew ['grændˌnefju:] n. сын плямéньніка *абó* плямéньніцы

grandniece ['grændni:s] n. дачкá плямéньніка *абó* плямéньніцы

grandparents ['grændˌperənts] n., pl дзед і бáбка, дзядýля й бабýля

grand piano раяль -я *m.*

grandson ['grænsʌn] n. унýк -а *m.*

grandstand ['grændstænd] – n. трыбýна *f.*, мéсца для пýблікі (*на стадыёнах, на пля́цах*)

– v.i. намагáцца зрабíць урáжаньне (*на слухачóў*)

– adj. паказны́, разьлíчаны на вóнкавы эфэ́кт

granduncle ['grændˌʌŋkəl] n. дзя́дзька бáцькі *абó* мáці

grange [greɪndʒ] n. 1. фэ́рма з гаспадáрчымі пабудóвамі. 2. фэўдáльны *абó* манасты́рскі двор. 3. Archaic сьвíран -а *m.*; пýня *f.*, гумнó *n.*

• ***Grange*** арганізáцыя фэ́рмэраў; мясцóвы аддзéл гэ́тае арганізáцыі

granite ['grænɪt] n. 1. гранíт -у *m.* 2. цьвёрдасьць *f.* (*задýмы, сэ́рца*), каменнасьць *f.*: ***granite-faced*** з камéнным твáрам; ***a heart of granite*** сэ́рца з гранíту, камéннае сэ́рца

granitic [grə'nɪtɪk] adj. 1. гранíтны, з гранíту. 2. цьвёрды; нерухóмы, засты́лы, камéнны (*твар*)

grannie or **granny** ['græni] n., pl. **-nies,** Informal бабýля, старáя, бáбка, бабýлька *f.*

grant [grænt] – v.t. 1. давáць (*тóе, пра што прóсяць*); дазваля́ць: ***to grant scholarship (permission)*** даць стыпэ́ндыю (дазвóл). 2. прызнавáць праўдзívым; згаджáцца, прызнавáць слýшнасьць. 3. узнагарóджваць, надавáць (*правы́, прывілéі*); афіцы́йна перадáць *камý* маёмасьць

– v.i. згаджáцца на *што*

– n. 1. атрымáнае прáва (*прывілéй, зямля́*), грашóвая дапамóга; стыпэ́ндыя, датáцыя, субсы́дыя *f.* 2. прызнáньне, надáньне (*прáва*); перадáча *f.* (*маёмасьці*)

• ***take for granted*** прымáць за нармáльную рэч, лічы́ць натурáльным

grant-in-aid ['græntɪneɪd] n., pl. **grants-in-aid** датáцыя, субсы́дыя *f.*

granular ['grænjələr] adj. зярні́сты
granularity [ˌgrænjə'lærəti] n. зярні́стасьць *f.*
granulate ['grænjəleɪt] – v.t. 1. драбі́ць, гранулява́ць, ператвара́ць у зярні́сты стан (*цу́кар*). 2. рабі́ць шурпа́тай ве́рхню
– v.t. 1. драбі́цца. 2. прыма́ць зярні́сты вы́гляд, рабі́цца шурпа́тай (*пра ве́рхню*): ***Wounds granulate in healing*** Ра́на пры заго́йваньні пакрыва́ецца тка́нкай зь зярні́стым вы́глядам
granulated ['grænjəleɪtəd] adj. 1. дро́блены, гранулява́ны (*цу́кар*). 2. ***granulated sugar*** цу́кар-пясо́к, пескавы́ цу́кар. 3. з шурпа́тай паве́рхняй (*шкло, ску́ра*)
granulation [ˌgrænjə'leɪʃən] n. грануля́цыя *f.* а) драбле́ньне рэ́чыва. б) нада́ньне паве́рхні шурпа́тасьці
granule ['grænju:l] n. 1. зярня́тка *n.* 2. драбі́нка, часьці́нка *f.*, драбло́к -ка́ *m.*; мале́нькая пля́мка
grape [greɪp] n. 1. вінагра́д -у *m.* (*лаза́, я́гады*). 2. цёмны фіяле́тава-чырво́ны ко́лер. 3. вінагра́дны сок; віно́ *n.*
grapefruit ['greɪpfru:t] n. грэ́йпфрут -а *m.*
grapery ['greɪpəri] n., pl. **-eries** 1. вінагра́дная цяпліца. 2. вінагра́днік -а *m.*
grapes of wrath прычы́на хвалява́ньняў, ма́савага гне́ву
grapevine ['greɪpvaɪn] n. 1. вінагра́дная лаза́. 2. Informal беспадста́ўныя чу́ткі
graph [græf] n. гра́фік -у *m.*, дыяграма *f.*
graphic ['græfɪk] – adj. 1. во́бразны, жывы́ (*раска́з*). 2. графі́чны; выяўле́нчы – n. гравю́ра *f.*, малю́нак -ка *m.*; літагра́фія *f.*
graphic arts выяўле́нчае маста́цтва
graphically ['græfɪkəli] adv. графі́чна, навóчна, нагля́дна; пры дапамо́зе дыяграмы
graphite ['græfaɪt] n. графі́т -у *m.*
grapnel ['græpnəl] n. 1. абарда́жны крук. 2. малы́ я́кар з трыма́ ці больш кручка́мі (*для ло́дак*); ко́шка *f.*
grapple ['græpəl] – v.t. схапі́ць і мо́цна трыма́ць; мо́цна ўхапі́цца, учапі́цца – v.i. 1. змага́цца; счапля́цца, схапля́цца (*пры ду́жаньні*). 2. шука́ць пры дапамо́зе ко́шкі пад вадо́ю
– n. сутычка, барацьба́ *f.*
grasp [græsp] – v.t. 1. хапа́ць, схо́пліваць. 2. хапа́ць, лавіць (*нагóду*). 3. разуме́ць: ***She grasped my meaning at once*** Яна́ адра́зу зразуме́ла маю́ ду́мку; ***to grasp at*** а) стара́цца схапі́ць. б) ахво́тна прыня́ць *што*, схапі́ць (-ца) за *што*: ***to grasp at the proposal*** схапі́цца за прапано́ву, ахво́тна згадзі́цца з прапано́вай; ***to grasp at straws*** хапа́цца за сало́мінку
– n. 1. хапа́ньне *n.*; захо́п -у *m.*; по́ціск рукі́. 2. дасяга́льнасьць: ***within one's grasp*** бліз́ка, як доста́ць руко́ю; дасяга́льны; ***beyond one's grasp*** недасяга́льны, недася́жны. 3. разуме́ньне, здо́льнасьць ху́тка ўспрыма́ць
grasping ['græspɪŋ] adj. 1. які́ хапа́е, схо́плівае. 2. пра́гны, прагавіты, хці́вы
grass [græs] – n. 1. трава́ *f.* 2. луг -у *m.*, сенажа́ць, па́ша *f.*
– v.t. 1. засява́ць трано́ю. 2. карміць трано́ю. 3. слаць лён на траву́
– v.i. 1. зараста́ць трано́ю. 2. па́сьвіцца на па́шы
• ***at grass*** а) на па́шы. б) бяз пра́цы, на адпачы́нку
• ***go to grass*** а) па́сьвіцца, ісьці́ на па́шу. б) ісьці́ на пэ́нсію
grasshopper ['græsˌhɑ:pər] n. 1. ко́нік -а *m.* (*палявы́*). 2. лёгкі самалёт для вывéдкі, су́вязі ды і́ншых мэ́таў
grass widow саламя́ная ўдава́, развóдка *f.*
grass widower саламя́ны ўдаве́ц
grassy ['græsi] adj. 1. паро́слы трано́ю. 2. травяны́. 3. травяні́сты, зялёны, як тра́ва
grate I [greɪt] n. 1. кра́ты *pl.*, кра́тка *f.*, каласьні́к -а́ *m.* (*у то́пцы*). 2. камі́н -а *m.*
grate II [greɪt] – v.t. 1. дзе́рці (*на та́рцы*). 2. скрыгата́ць (*зуба́мі*). 3. скрэ́бці; шкра́баць. 4. раздражня́ць, злава́ць

– v.i. 1. (on, upon) раздражня́ць ***it grates on my ear*** гэ́та ра́жа слых. 2. скрыгата́ць
– n. скры́гат -у *m.*: ***the grate of old, rusty hinges*** скры́гат стары́х заір-жаве́лых заве́саў

grater ['greɪtər] n. та́рка *f.*

grateful ['greɪtfəl] adj. 1. удзя́чны. 2. даспадо́бы, пажада́ны

gratefully ['greɪtfəli] adv. з падзя́кай, з удзя́чнасьцю

gratify ['grætɪfaɪ] v.t. 1. рабі́ць *каму́* прые́мнасьць; це́шыць, ра́даваць. 2. задавальня́ць; заспако́йваць; наталя́ць (*патро́бу, жада́ньне, сма́гу*). 3. Archaic дава́ць на гасьці́нец *або́* грашо́вы падару́нак

grating I ['greɪtɪŋ] n. 1. кра́ты, *pl. only, gen.* кра́таў (*на во́кнах*). 2. жале́зная агаро́джа

grating II ['greɪtɪŋ] adj. 1. ра́зкі, дзярлі́вы, які́ дзяро́. 2. непрые́мны, раздражня́льны, які́ ро́жа слых

gratis ['grætəs] – adv. дарма́, да́рма; бяспла́тна, за нішто́
– adj. дармавы́, дармо́вы, бяспла́тны

gratitude ['grætətu:d] n. удзя́чнасьць *f.*

gratuitous [grə'tu:ətəs] adj. 1. дармавы́, бяспла́тны. 2. беспадста́ўны; непатро́бны, недаро́чны. 3. Law дармо́вы, бязвы́платны (*адчуже́ньне*)

gratuity [grə'tu:əti] n., pl. **-ties** 1. грашо́вая ўзнагаро́да, пра́мія *f.* 2. гасьці́нец -ца *m.*, чаявы́я, *pl. only.* 3. падару́нак -ка *m.* 4. esp. Brit. узнагаро́дныя *pl. only* (*у во́йску*)

grave I [greɪv] n. 1. магі́ла *f.*, дол -у *m.* 2. курга́н -а́ *m.*, по́мнік -а *m.*, грабні́ца *f.* 3. сьмерць *f.*
• ***one foot in the grave*** адно́й нага́ў магі́ле, бліскі да сьме́рці

grave II [greɪv] adj. 1. ва́жны, ва́жкі: ***a grave decision*** ва́жная пастано́ва. 2. пава́жны, пагража́льны, небясьпе́чны: ***a grave situation*** небясьпе́чнае стано́вішча; ***grave news*** су́мная ве́стка. 3. пава́жны, урачы́сты: ***a grave face*** пава́жны твар. 4. пану́ры, мро́чны, цёмны (*ко́леры*)

grave III [greɪv] v.t., **graved, graved** or **graven** 1. рабі́ць незабы́ўнае ўра́жаньне. 2. ро́заць, выро́зваць (*на дро́ве*); высяка́ць

gravel ['grævəl] – n. 1. жвір -у *m.*, жарства́ *f.* 2. Med. мачавы́я камяні́. 3. Obsol. пяскло́к -ку́ *m.*
– v.t. 1. высыпа́ць жарство́й. 2. ста́віць у тупі́к; бянто́жыць, зьдзіўля́ць. 3. садзі́ць карабе́ль на мелі́ну́
– adj. 1. ро́зкі, ахры́плы, непрые́мны (*пра го́лас*). 2. шо́рсткі, жарсьцьвяны́, жві́рысты

gravely [greɪvli] adv. ця́жка, пава́жна: ***gravely ill*** ця́жка хво́ры

gravestone ['greɪvstoun] n. по́мнік -а *m.*; намагі́льны ка́мень

graveyard ['greɪvjɑ:rd] n. мо́гілкі *pl. only.*; мо́гільнік -у *m.*

gravitate ['grævɪteɪt] – v.i., Phys. 1. прыця́гвацца (*сі́лай зямлі́*). 2. асяда́ць: ***to gravitate to the bottom*** па́даць, асяда́ць на дно або́ до́лу. 3. мець ця́гу, імкну́цца; цягну́цца
– v.t. прыця́гваць (*сі́лай цяжа́ру*)

gravitation [ˌgrævɪ'teɪʃən] n., Phys. 1. прыцягне́ньне *n.*: ***the law of gravitation*** зако́н прыцягне́ньня. 2. ця́га *f.* (*да чаго́-н.*). 3. па́даньне *n.*, апуска́ньне на дно

gravity ['grævəti] n., pl. **-ties,** Phys. 1. а) сі́ла зямно́га прыцягне́ньня. б) прыцягне́ньне, прыцяжэ́ньне *f.* 2. цяжа́р -у *m.*, сі́ла цяжа́ру: ***center of gravity*** цэ́нтар прыцягне́ньня. 3. пава́жнасьць, урачы́стасьць *f.* 4. ва́жнасьць *f.*; ця́жкасьць (*стано́вішча*)

gravy ['greɪvi] n., pl. **-vies** 1. падлі́ва *f.* (*мясна́я*), соўс -у *m.* 2. Sl. лёгкі вы́йгрыш *або́* прыбы́так

gravy boat со́ўсьнік -а *m.*; со́ўсьніца *f.*

gray [greɪ] – n. 1. шэ́ры ко́лер. 2. сіво́е сукно́. 3. сівы́ -о́га *m.* (*пра каня́*)
– adj. 1. сівы́ (*валасы́, конь, сьві́тка*), сіве́нькі: ***to turn gray*** сіве́ць; шэ́ры (*дзень, во́чы*), шэ́ранькі. 2. Informal стары́, старасве́чны. 3. цёмны, пану́ры, шэ́ры; цяжкі́

graze I [greɪz] – v.i. па́сьвіцца (*на па́шы*)
– v.t. па́сьвіць
– n. пасьба́ *f.*

graze II [greɪz] – v.t. 1. лёгка закрана́ць, зачапля́ць *што*. 2. зьбіва́ць; абдзіра́ць (*ску́ру з рукі́*)
– v.i. зачапі́цца, шаргану́цца аб *што*
– n. мала́я ра́нка, дра́піна *f.*

grazing [ˈgreɪzɪŋ] n. па́ша *f.*
• ***grazing land*** па́сьбішча *n.*, папа́с, вы́ган -у *m.*

grease [gri:s] – n. 1. тлушч -у *m.* 2. зма́зка, мазь *f.*
– v.t. 1. ма́заць, нама́зваць (*тлу́шчам*); падма́зваць (*ко́лы ма́зьзю*). 2. Informal падкупля́ць, падма́зваць *каго́*

greasy [ˈgri:sɪ] adj. 1. тлу́сты (*пра е́жу*). 2. тлу́сты, тлу́шчавы (*пля́ма*); затлу́шчаны, зашмальцава́ны

great [greɪt] – adj. 1. вялі́кі (*нато́ўп*). 2. ва́жны, выда́тны, сла́ўны (*здарэ́нье, маста́к*), геніяльны
– adv., Informal ве́льмі до́бра
• ***a great many*** шмат

great-aunt [ˌgreɪtˈænt] n. *гл.* **grandaunt**

great-grandchild [ˌgreɪtˈgræntʃaɪld] n. пра́ўнук -а *m.*, пра́ўнучка *f.*

great-granddaughter [ˌgreɪtˈgrændˌdɔ:tər] пра́ўнучка *f.*

great-grandfather[ˌgreɪtˈgrændˌfɑ:ðər] n. пра́дзед -а *m.*

great-grandmother[ˌgreɪtˈgrændˌmʌðər] n. праба́бка *f.*

great-grandson [ˌgreɪtˈgrændsʌn] n. пра́ўнук -а *m.*

greatly [ˈgreɪtlɪ] adv. 1. мо́цна, ве́льмі. 2. ве́лічна, высакаро́дна

great-uncle [ˌgreɪtˈʌŋkəl] n. *гл.* **granduncle**

Grecian [ˈgri:ʃən] – adj. старагрэ́цкі: ***Grecian temple*** старагрэ́цкая сьвятыня
– n. 1. грэк -а *m.*, грача́нка *f.* 2. эліні́ст -а *m.*, эліні́стка *f.*

greed [gri:d] n. сква́пнасьць, прагаві́тасьць, хці́васьць *f.*

greedily [ˈgri:dɪlɪ] adv. прагаві́та, хці́ва

greediness [ˈgri:dɪnəs] n. прагаві́тасьць, хці́васьць *f.*

greedy [ˈgri:dɪ] adj. 1. прагаві́ты, хці́вы; сква́пны, ненае́дны. 2. пражэ́рлівы

Greek [gri:k] – adj. грэ́цкі
– n. 1. грэк -а *m.*, грача́нка *f.* 2. грэ́цкая мо́ва

Greek Catholic – n. грэ́какаталі́к -а́ *m.*, вунія́т -а *m.*
– adj. грэкакаталі́цкі, вуніяцкі

green [gri:n] – n. 1. зялёны ко́лер. 2. зялёная фа́рба, зялёнка *f.* 3. луг -у *m.* (*для гу́льняў*)
– adj. 1. зялёны. 2. пакры́ты зе́ленью. 3. сьве́жы. 4. нясьпе́лы (*я́блык*) 5. няста́лы, нясьпе́лы (*век*); недаву́чаны, недасьве́дчаны (*працаўні́к*). 6. даве́рлівы. 7. сыры́, неапрацава́ны (*лясны́ матэрыя́л*)
– v.i. , v.t. зелянёць, зеляні́ць
• ***greens*** а) зялёнае лісьцё або́ галі́нкі (*для дэкара́цыі*). б) зеляні́на *f.*, зялёная гаро́дніна, зяле́ніва *n.* в) зялёныя, экалягі́сты
• ***turn green with envy*** пазелянёць ад за́йздрасьці

greenery [ˈgri:nərɪ] n. 1. зе́лень *f.* 2. аранжарэ́я *f.*

green-eyed [ˌgri:nˈaɪd] adj. 1. зеленавóкі. 2. зайздро́сны
• ***green-eyed monster*** за́йздрасьць, рэ́ўнасьць *f.*

greenhouse [ˈgri:nhaʊs] n. цяпліца, аранжарэ́я *f.*, парні́к -а́ *m.*

greenish [ˈgri:nɪʃ] adj. зеленава́ты: ***greenish-yellow*** зеленава́та-жо́ўты

greet [gri:t] v.t. 1. віта́ць. 2. зьвярта́цца да *каго́* (*са сло́вам*). 3. успрыма́ць: ***His speech was greeted with cheers*** Яго́ная прамо́ва была́ ўспрыня́тая ра́даснымі во́клічамі

greeting [ˈgri:tɪŋ] n. віта́ньне, прывіта́ньне *n.*: ***Christmas greetings*** каля́дныя віншава́ньні

greeting card віншава́льная ка́ртка

gregarious [grɪˈgeriəs] adj. 1. які́ жыве́ гу́ртам, грамадо́ю. 2. тава́рыскі, грама́дзкі. 3. ста́дны

grenade [grɪˈneɪd] n. грана́та *f.*

grenadier [ˌgrenəˈdɪr] n. 1. гранатамёт-чык -а *m.* 2. грэнадзёр -а *m.*

grew [gru:] v., *p.t. of* **grow**

grey [greɪ] adj., esp. Brit. *гл.* **gray**

grey-eyed шэравóкі

grey hair сівы́я валасы́, сіві́нка ў валасóх, сівізна́ *f.*

greyhound ['greɪhaʊnd] 1. хорт харта́ *m.* (*паляўні́чы саба́ка*). 2. быстрахо́дны акія́нскі парапла́ў. 3. аўто́бус да́льніх рэ́йсаў

greyish ['greɪɪʃ] adj., esp. Brit. сіява́ты, сіява́ценькі; шарава́ты, шарава́ценькі

grid [grɪd] n. 1. кра́ты *pl.* (*на во́кнах*) 2. агаро́джа з пруткóў, пля́нак. 3. каласьні́к -á *m.* 3. се́тка электраліні́яў

grief [gri:f] n. 1. бо́ль -ю *m.*, сму́так -ку *m.*; сум -у *m.*, скру́ха, туга́ *f.*, жа́льба *f.* 2. го́ра *n.*, бядá *f.*, цярпе́ньні *pl.*: ***to come to grief*** папáсьці ў бяду́; пацярпе́ць няўда́чу

grievance ['gri:vəns] n. 1. кры́ўда, ска́рга *f.* 2. го́ра *n.*, бядá *f.*; небясьпе́ка *f.*, вялі́кі кло́пат

grieve [gri:v] – v.i. мо́цна смуткава́ць, бедава́ць, паку́таваць

– v.t. мо́цна засмуча́ць; прычыня́ць вялі́кі боль

grievous ['gri:vəs] adj. 1. во́стры, нясьце́рпны (*пра боль, лю́тасьць*). 2. страшэ́нны; я́ўны, цяжкі́ (*правіна, памы́лка*). 3. су́мны, гаро́тны, го́ркі (*пра до́лю*): ***a grievous cry*** паку́тлівы, балю́чы крык

grill [grɪl] – n. 1. грыль -ю *m.*, каласьні́ко́выя кра́ты; жале́зная кра́та для сма́жаньня мя́са на агні́. 2. грыль -ю *m.*, мя́са *або́* ры́ба сма́жаная на агні́. 3. рэстара́н, у які́м мя́са, ры́ба сма́жыцца навідаво́ку

– v.t. 1. сма́жыць на агні́. 2. суро́ва дапы́тваць

– v.i. 1. сма́жыцца на агні́. 2. цярпе́ць агнём

grille [grɪl] – n. кра́ты *pl. only.*

– v.t. 1. ста́віць кра́ты. 2. пагаша́ць пашто́выя ма́ркі

grillroom ['grɪlru:m] n. рэстара́н, у які́м мя́са, ры́ба сма́жыцца пры пу́бліцы

grim [grɪm] adj. 1. пану́ры, злаве́сны (*по́зірк, вы́гляд*), пагро́зьлівы. 2. суро́вы, няўмо́льны. 3. непахі́сны, язло́мны; заўзя́ты. 4. страшны́, жахлі́вы

grime [graɪm] – n. бруд, які́ глыбо́ка ўе́ўся (*асабл. у ску́ру*)

– v.t. мо́цна пэ́цкаць: ***Walls were grimed with smoke*** Сьце́ны пачарне́лі ад ды́му

grimace [grɪ'meɪs] – n. грыма́са, мі́на *f.*

– v.i. грыма́сьнічаць, крыўля́цца, стро́іць мі́ны

grimy ['graɪmɪ] adj. карэ́лы, кара́вы; ве́льмі бру́дны, чо́рны

grin [grɪn] – v.i. **(-nn-)** шыро́ка ўсьміха́цца

– n. 1. усьме́шка *f.* 2. выскаля́ньне, вышчэ́рваньне, ашчэ́рваньне *n.*

grind [graɪnd] – v.t. 1. мало́ць; расьці́ра́ць на парашо́к. 2. му́чыць, зьдзе́кавацца; прыгнята́ць, уціска́ць. 3. тачы́ць (*нож*); шліфава́ць. 4. круці́ць ру́чку (*катры́нкі*). 5. скрыгата́ць зуба́мі (*ад зло́сьці*). 6. Informal удзёўбваць, убіва́ць (*у галаву́*)

– v.i. 1. мало́цца. 2. Informal зубры́ць (*пе́рад экза́мэнам*)

– n. 1. расьціра́ньне, таўчэ́ньне *n.* 2. скры́гат -у *m.* 3. цяжка́я ну́дная рабо́та. 4. Informal зубры́ла -ы *m. & f.*

grinder ['graɪndər] n. 1. тачы́льшчык -а *m.* 2. тачы́ла *n.* 3. карэ́нны зуб

• ***grinders***, Informal зу́бы *pl.*

grip [grɪp] – n. 1. хва́тка *f.*; сьціска́ньне *n.*, за́ціск -у *m.* 2. ру́чка *f.* 3. даро́жная то́рба, ка́йстра *f.* 4. улада *f.*, ціскі *pl.*: ***to be in the grip of poverty*** быць у бе́днасьці, цярпе́ць гале́чу. 5. разуме́ньне *n.*, здо́льнасьць разуме́ць: ***to have a grip of subject*** мець здо́льнасьць да прадме́ту, разуме́ць прадме́т. 6. грып -у *m.* 7. Tech. заціска́чка *f.*, кля́мар -а *m.*

– v.t. 1. схапі́ць і трыма́ць; ухапі́цца за *што*. 2. трыма́ць у зацікаўле́ньні; авало́дваць ува́гай (*слухачо́ў*)

• ***come to grips*** а) схапі́цца бі́цца. б) пава́жна ўзя́цца за што-н.

• ***lose one's grip*** тра́ціць кантро́ль

gripe [graɪp] v.t. 1. хапа́ць, схапля́ць; прышчамля́ць, прыціска́ць. 2. прыгнята́ць; прычыня́ць боль. 3. злава́ць. 4. спрычыня́ць су́таргі стра́ўніка. 5. Informal мець жаль

grisly ['grɪzli] adj. страшны́, жахлі́вы, страшэ́нны

grist [grɪst] n. 1. збо́жжа на памо́л. 2. змо́латае збо́жжа. 2. мука́ *f.*, памо́л -у *m.*, мліва *n.* 3. Informal памо́л, прыбы́так -ку *m.*: ***grist to*** or ***for one's mill*** крыніца не́чых прыбы́ткаў

gristle ['grɪsəl] n. храстя́к -ка́ *m.*

gristly ['grɪsli] adj. храсткава́ты, храстка-падо́бны

grit [grɪt] – n. 1. пяскі́к -ку́ *m.*, дро́бны жвір. 2. буйназярні́сты пясча́нік -у *m.* 3. адва́га *f.*, гарт -у *m.*, вы́трымка, рашу́часьць, му́жнасьць *f.*

– v.t. **(-tt-)** рыпе́ць, скрыгата́ць (*зуба́мі*)

grits [grɪts] n., pl. 1. аўся́ныя, кукуру́зныя кру́пы. 2. мамалы́га, кукуру́зная ка́ша

gritty ['grɪti] adj. 1. пясча́ны, жвіравы́. 2. Informal адва́жны, рашу́чы

grizzle ['grɪzəl] – n. 1. сівава́тыя валасы́. 2. сівы́ ко́лер. 3. сівы́ конь *або́* і́ншая жывёліна

– adj. сівы́, сівава́ты, зь сівы́мі валаса́мі, сівагало́вы

– v.t. рабі́ць сівы́м

– v.i. сіве́ць

grizzly ['grɪzli] adj. 1. сівава́ты, сівы́. 2. зь сівы́мі валаса́мі, сівагало́вы

grizzly bear, Grizzly вялі́кі дзікі́ сівы́ або́ бу́ра-сівы́ мядзьве́дзь (*паўно́чна-амэрыка́нскі*)

groan [groun] – n. цяжкі́ ўздыхі́, стогн -у *m.* (*ад бо́лю, незадавальне́ньня*)

– v.i. 1.ця́жка ўздыха́ць, стагна́ць. 2. угіна́цца пад цяжа́рам, быць перагру́жаным. 3. гаварыць са сто́гнам

groats [grouts] n., pl. кру́пы (*гру́ца, аўся́нка*)

grocer ['grousər] n. бакале́йнік -а *m.*

grocery ['grousəri] n. 1. бакале́йная кра́ма

• ***groceries*** прадукты *pl.*, бакале́йныя тава́ры

grog [grɑ:g] n. грог -у *m.*

groggy ['grɑ:gi] adj. 1. хісткі́, няпэ́ўны на нага́х. 2. п'яны́

groin [grɔɪn] n. 1. Anat. пахві́на *f.* 2. Archit. крыжо́вае скляпе́ньне.

groom [gru:m] – n. 1. малады́ -о́га *m.*, жані́х -а́ *m.* 2. ко́нюх -а *m.*

– v.t. 1. карміць, даглядаць ко́ней. 2. дбаць пра свой вы́гляд, акура́тна прыбіра́ць, убіра́ць: ***well groomed person*** акура́тна прыбра́ны чалаве́к

groove [gru:v] – n. 1. жалаб|о́к -ка́ *m.*, паз, нарэ́з -а *m.* 2. каляі́на *f.* (*ад ко́лаў*). 3. Informal рутына, звычка, каляі́на *f.*: ***to get into a groove*** увайсьці́ ў звыча́йную каляі́ну

– v.t. рабіць вы́емкі, нарэ́зваць жалабы́, раўчукі́; рабіць пазы́

grope [group] – v.i. 1. ма́цаць, нама́цваць. 2. шука́ць во́бмацкам, усьляпу́ю, наўздага́д; ісьці́ во́бмацкам

– v.t. нама́цваць *што*, знахо́дзіць даро́гу во́бмацкам

– n. ма́цаньне *n.*

gross [grous] – adj. 1. уве́сь, по́ўны; бру́та, валавы́: ***gross receipts*** валавы́ прыбы́так; ***gross weight*** вага́ бру́та. 2. ве́льмі благі́, вялі́кі (*памы́лка*). 3. грубія́нскі, вульга́рны. 4. ве́льмі сы́ты, таўсты́ (*чалаве́к*). 5. густы́, зьбі́ты (*за́расьнік*)

– n. 1. а) цэ́лая су́ма; уся́ ко́лькасьць. б) Obsol. бо́льшая ча́стка, бальшыня́. 2. 12 ту́зінаў, 144 шту́кі

• ***in the gross*** а) наагу́л, набо́гул; звыча́йна; у цэ́лым. б) агу́лам; гу́ртам (*купля́ць тава́р*)

grotesque [grou'tesk] adj. 1. дзі́ўны, дзівво́сны; гратэ́скавы. 2. сьмяхо́тны; недарэ́чны, абсу́рдны

grotto ['grɑ:tou] n., pl. **-toes** or **tos** пячо́ра *f.*, грот -у *m.*

grouch [grautʃ] Informal – v.i. бурчэ́ць; быць не ў гумо́ры; наракаць

– n. 1. дрэ́нны настро́й, незадаво́ленасьць. 2. буркун -а́ *m.*, буркуха *f.* 3. нарака́ньне, бурча́ньне *n.*

ground I [graund] – n. 1. зямля́, гле́ба *f.*, грунт -у *m.* 2. ме́сца: ***fishing grounds*** ме́сцы, раён для ры́бнай ло́ўлі; ***hunting grounds*** раён палява́ньня. 3. прычы́на, падста́ва *f.*: ***on what ground?*** на яко́й падста́ве? 4. фон -у *m.* 5. дно мо́ра. 6. Electr. зазямле́ньне *n.*
• ***above ground*** жывы́
• ***break ground*** капа́ць; ара́ць (*зямлю́*); выко́пваць я́му (*пад будыні́к*), пачына́ць будава́ць
• ***cover ground*** а) прайсьці не́йкую адле́гласьць. б) падаро́жнічаць
• ***from the ground up*** ца́лкам, зусі́м
• ***get off the ground*** распача́ць, рабі́ць по́ступ
• ***give ground*** адступа́ць, саступа́ць
• ***grounds*** а) зямля́, сад, гаро́д; пляц каля до́му. б) аса́дак, гу́шча (*на дне гарба́ты, ка́вы*)
• ***hold*** or ***stand one's ground*** мо́цна трыма́цца, не саступа́ць, не адступа́ць
– v.t. 1. кла́сьці на зямлю́, дакрану́ць да зямлі́. 2. навуча́ць асно́вам. 3. дава́ць фон для *чаго́*. 4. Electr. зазямля́ць. 5. садзі́ць на мель (*караблі́, чо́вен*). 6. прымуша́ць да паса́дкі (*самалёт*)
– v.i. садзі́цца на мель

ground II [graund] – *p.t. and p.p. of* **grind.**
– adj. мо́латы, змо́латы (*пе́рац*).

groundedly ['graundidli] adv. абгрунтава́на

ground floor ні́жні паве́рх

ground forces назе́мныя во́йскі

ground glass ма́тавае шкло

groundhog, Zool. суплок -ка́ *m.*

Groundhog Day Дзень Сурка́ (*2 лю́тага, калі́ суро́к прачына́ецца ад сваі́ сьпя́чкі*)

groundless ['graundləs] adj. беспадста́ўны, неабгрунтава́ны; беспрычы́нны

ground water грунтавы́я во́ды

groundwork ['graundwɜ:rk] n. 1. фунда́мэнт -а, падму́рак -ка *m.* 2. падста́ва, асно́ва *f.*

group [gru:p] – n. 1. гру́па *f.* 2. авія|по́лк -палка́ *m.* 3. Chem. радыка́л -а *m.*
– v.t. 1. групава́ць, уклада́ць гру́памі
– v.i. групава́цца

grouse I [graus] n. шатля́ндзкая курапа́тка *f.*, ра́бчык -а *m.*
• ***black grouse*** or ***game*** цецяру́к -а́ *m.*
• ***white grouse*** бе́лая курапа́тка
• ***wood grouse*** глушэ́ц -ца́ *m.*

grouse II [graus] Informal, v.i. бурча́ць наракаць

grove [grouv] n. гаі́ -ю *m.*; сад -у *m.*

grovel ['grʌvəl] v.i. ляжа́ць ні́цма, по́ўзаць; прыніжа́цца пе́рад *кім*

groveler ['grʌvələr] n. нізкапаклО́ньнік -а *m.*, халу́й -я́ *m.*, падхалі́м -а *m.*

grow [grou] **grew, grown** – v.i. 1. расьці, вырастаць. 2. павялі́чвацца, пабо́льшвацца; узрастаць. 3. рабі́цца; станаві́цца: ***It grew cold*** Зрабілася сьцюдзёна; ***to grow rich (grey)*** багаце́ць (сіве́ць)
– v.t. гадава́ць, выро́шчваць: ***to grow a beard (moustache)*** адгадава́ць, загадава́ць, адпусьці́ць бараду́ (*ву́сы*)
• ***grow on*** or ***upon*** а) авало́дваць *кім.* б) падаба́цца ўсё больш *каму́*
• ***grow up*** а) падраста́ць, рабі́цца даро́слым. б) ствара́цца; разьві́ваць; паўстава́ць

growing ['grouiŋ] adj. які́ расьце́: ***a growing season*** сэзо́н ро́сту

growl [graul] – v.i. 1. гы́ркаць (*асаб.л. пра саба́ку*). 2. зло́сна наракаць, бурчэ́ць. 3. грыме́ць, грукаце́ць, грукота́ць (*пра гром*)
– n. 1. гы́рканьне *n.* 2. зло́снае нараканьне, бурчэ́ньне *n.* 3. гру́кат і трэск, гул гро́му, грымо́ты *pl.*

grown [groun] – adj. 1. даро́слы, ста́лы (*чалаве́к*). 2. паро́слы за́расьнікам, хмызьняко́м
– v. *p.p. of* **grow**

grown-up, adj. даро́слы (*чалаве́к*): ***grown-up manners*** мане́ры даро́слага чалаве́ка

growth [grouθ] n. 1. рост -у *m.* 2. павялічэ́ньне *n.*, наро́ст, прыро́ст -у *m.* 3.

пахо́джаньне *n.*: ***a plant of foreign growth*** расьлі́на заме́жнага пахо́джаньня. 4. за́расьнік -у *m.* 5. пухлі́на *f.*

grub [grʌb] – n. 1. ву́сень -я *m.*, ля́рва *f.* 2. чалаве́к, які́ займа́ецца цяжко́й, нудно́й пра́цай; ішак ішака́ *m.* 3. Sl. е́жа *f.*
– v.i. 1. ры́цца (*у зямлі́*). 2. ця́жка працава́ць, цягну́ць ля́мку. 3. Sl. е́сьці
– v.t. 1. выкарчо́ўваць, выко́пваць з карэ́ньнем. 2. выбіра́ць карэ́ньне зь зямлі́. 3. Sl. кармі́ць (*забясьпе́чваць е́жай*)

grubby ['grʌbi] adj. бру́дны; карэ́лы, кара́вы; неаха́йны

grudge [grʌdʒ] – n. 1. кры́ўда *f.* 2. незычлі́васьць, непрыя́знасьць *f.*; антыпа́тыя *f.*; за́йздрасьць *f.*: ***to have a grudge against a person*** мець зуб на *кагó*
– v.t. 1. злава́цца, крыўдава́ць на *кагó* за *што*; зайздро́сьціць *каму́ чагó*. 2. шкадава́ць *каму́ чагó*, скупі́цца

grudger ['grʌdʒər] n. скна́ра *m. & f.*, скупяндзю́ра -ы́ *m. & f.*; зайздро́сьнік -а *m.*, зайздро́сьніца *f.*

grudgingly ['grʌdʒiŋli] adv. неахво́тна, не́хаця, шкаду́ючы

gruel ['gru:əl] – n. 1. ро́дзенькая ка́шка, адва́р ры́су, аўся́нкі. 2. Informal ка́ра *f.*, пакара́ньне *n.*: ***to get one's gruel*** атрыма́ць па заслу́гах
– v.t. выму́чваць *кагó*, цалко́м зьнясі́льваць, мардава́ць

grueling ['gru:liŋ] – adj., Informal цяжкі́, сто́мны, зьнясі́льны
– n. му́ка *f.*

gruelling ['gru:liŋ] adj., esp. Brit. *гл.* **grueling**, adv. **gruellingly**

gruesome ['gru:səm] adj. стра́шны; жахлі́вы; агі́дны

gruff [grʌf] adj. 1. гру́бы, ро́зкі; хры́плы (*пра го́лас*). 2. грубія́нскі, нявы́чны (*мане́ры*); непрыя́зны, ху́ткі на злосьць, зло́сны

grumble ['grʌmbəl] – v.i. 1. (at, about) нарака́ць, жа́ліцца на *што*. 2. бурчэ́ць, мармыта́ць. 3. тарахце́ць
– n. 1. нарака́ньне *n.* 2. бурчэ́ньне *n.* 3. тарахце́ньне *n.*

grumbler ['grʌmblər] n. бурку́н -а́ *m.*, буркуха *f.*

grumpy ['grʌmpi] adj. 1. буркліві, пану́ры, зло́сны; грубія́нскі. 2. у дрэ́нным настро́і, надзьму́ты

grunt [grʌnt] – n. 1. ро́хканьне *n.* (*сьві́ньні*). 2. бурчэ́ньне, мы́каньне *n.*
– v.i. 1. ро́хкаць. 2. мармыта́ць, мы́каць

guarantee [ˌgærən'ti:] – n. 1. пару́ка, гара́нтыя *f.* 2. паручы́цель -я *m.*, гара́нт -а *m.* 3. асо́ба, яко́й даецца гара́нтыя. 4. зару́ка *f.*, закла́д -у *m.*: ***Wealth is no guarantee of happiness*** Бага́цьце ня ёсьць зару́кай шча́сьця
– v.t. 1. паручы́цца за *кагó*. 2. гарантава́ць, забясьпе́чваць, руча́цца. 3. (against or from) засьцераго́ць, забясьпе́чваць, страхава́ць ад *чагó*

guaranteed [ˌgærən'ti:d] adj. гарантава́ны

guaranty ['gærənti:] n., pl. **-ties** 1. зару́ка *f.*; закла́д -у *m.* 2. пі́санае абавяза́ньне *абó* пару́ка; забясьпе́чаньне (*пазы́кі*)

guard [gɑ:rd] – v.t. 1. ахо́ўваць, сьцерагчы́, вартава́ць. 2. пільнава́ць. 3. Archaic суправаджа́ць
– v.i. 1. сьцерагчы́ся, асьцераго́цца: ***to guard against errors*** сьцерагчы́ся, асьцераго́цца памы́лак
– n. 1. ва́рта, ахо́ва, абаро́на *f.* 2. вартавы́ -о́га *m.* 3. асьцяро́га, пі́льнасьць *f.* 4. Brit. канду́ктар -а *m.* (*у цягніку́, трамва́і*)
• ***guards***, pl. гва́рдыя ў брыта́нскім во́йску
• ***off one's guard*** непадрыхтава́ны да нечака́нага напа́ду
• ***on guard*** напагато́ве (*барані́цца ці бараніць*); асьцяро́жны, пі́льны

guarded ['gɑ:rdəd] adj. 1. трыма́ны пад ва́ртай *абó* ахо́вай; сьцераже́ны. 2. асьцяро́жны; развя́жны, насьцяро́жаны: ***guarded look*** насьцяро́жаны по́зірк

guardedly ['gɑ:rdədli] adv. асьцераго́чыся, асьцяро́жна; аба́чліва

guardian [ˈgɑ:rdiən] – n. 1. ахо́ўнік -а *m.*; абаро́нц|а -ы *m.*, абаро́ньніца *f.* 2. апяку́н -а́ *m.*, апяку́нка *f.*
– adj. ахо́ўны
guardian angel анёл-ахо́ўнік
guardianship [ˈgɑ:rdiənʃɪp] n. 1. апе́ка *f.* 2. апяку́нства *n.*
guardrail [ˈgɑ:rdreɪl] n. парэ́нчы, по́ручні *pl.* (*схо́даў*); за́гарадзь *f.*, бар'е́р -а *m.*
guardroom [ˈgɑ:rdru:m] n. 1. варто́ўня *f.* 2. гаўптва́хта *f.*
gudgeon [ˈgʌdʒən] – n. 1. пячку́р -а́ *m.* (*ры́ба*). 2. ду́р|ань -ня *m.*, разя́в|а -ы, разява́к|а -і *m. & f.* 3. прына́да *f.* (*на ры́бу*)
– v.t. ашу́кваць; абду́рваць
guerilla or **guerrilla** [gəˈrɪlə] – n. 1. партыза́н -а *m.* 2. партыза́нка *f.*; партыза́нская вайна́
– adj. партыза́нскі
guess [ges] – v.t. 1. уга́дваць. 2. адга́дваць (*зага́дку*)
– v.i. 1. меркава́ць; лічы́ць, ду́маць: ***I guess so*** Я гэ́так ду́маю. 2. здага́двацца, прыбліз́на ацэ́ньваць, вызнача́ць (*ва́ртасьць*)
– n. 1. меркава́ньне, дапушчэ́ньне *n.* 2. здага́дка *f.*
guesswork [ˈgeswɜ:rk] n. здага́дкі, дапушчэ́ньні *pl.*
guest [gest] – n. 1. госьць го́сьця *m.*, го́сьця *f.* 2. пастая́л|ец -ьца *m.*, пастая́лка *f.* (*у гатэ́лі*); сталаўні́к -а́ *m.* 3. спэцыя́льна запро́шаны дакла́дчык, прамо́ўца *або́* арты́ст. 4. Zool. парази́т -а *m.* (*асабл. насяко́мае*)
– adj. 1. гасьці́нны, для гасьце́й: ***a guest room*** пако́й для гасьце́й. 2. запро́шаны: ***a guest lecturer*** запро́шаны ле́ктар
guidance [ˈgaɪdəns] n. 1. кіраўні́цтва *n.* 2. настаўле́ньне *n.*; нака́з, зага́д -у *m.*
guide [gaɪd] – v.t. 1. кірава́ць; ве́сьці, быць правадні́ко́м. 2. накіро́ўваць, кірава́ць (*канём*). 3. кантралява́ць, рэгулява́ць; зага́дваць *кім-чым*
– n. 1. важа́к, павады́р -а́ *m.*, павады́рка *f.*, правадні́к -а́ *m.*, экскурсавод -а *m.& f.* 2. дасве́днік -а *m.* (*асабл. для падаро́жжаў, турызму*). 3. паказа́льнік даро́гаў
guidebook [ˈgaɪdbʊk] n. інфармацыйны дасве́днік; дапамо́жнік -а *m.*, інстру́кцыя *f.*
guidepost [ˈgaɪdpoʊst] n. вяха́ *f.*, паказа́льнік -а *m.* (*даро́гаў*)
guild [gɪld] n. 1. Hist. цэх -у *m.*, гі́льдыя *f.* 2. таварыства самадапамо́гі
guile [gaɪl] n. ашука́нства *n.*; хі́трасьць *f.*, хі́трыкі *pl.*; падсту́пства *n.*; верало́мства *n.*
guileful [ˈgaɪlfəl] adj. хі́тры, падсту́пны, ашука́нскі
guilefully [ˈgaɪlfəli] adv. ашука́нствам, по́дступам
guileless [ˈgaɪlləs] adj. сумле́нны; шчы́ры, адкры́ты
guilt [gɪlt] n. 1. вінава́тасьць *f.* (*наяўнасьць віны́*). 2. віна́, правіннасьць *f.*; злачы́нства *n.*
guiltily [ˈgɪltɪli] adv. вінава́та, зь вінава́тым вы́глядам
guiltless [ˈgɪltləs] adj. 1. без віны́, невінава́ты; нявінны, бязгрэ́шны, бяскры́ўдны. 2. які́ ня ве́дае чаго́-н. *або́* ня ўме́е
guilty [ˈgɪlti] adj. (of) вінава́ты: ***guilty look*** вінава́ты вы́гляд
guinea [ˈgɪni] n. гінэ́я *f.* (*анге́льская ма́нэта на 21 шы́лінг*)
guinea fowl, Zool. цацарка *f.* (*пту́шка*)
guinea pig 1. марска́я сьві́нка (*ужыва́ная і для лябарато́рных экспэрыме́нтаў*). 2. Informal паддо́сьледная жывёліна *або́* чалаве́к
guise [gaɪz] n. 1. стыль во́праткі; убо́р -у *m.*, адзе́ньне *n.* 2. во́нкавы выгляд; падабе́нства *n.* 3. ма́ска *f.*, выгляд -у *m.*: ***under the guise of friendship*** пад вы́глядам прыя́зьні. 4. Obsol. звы́чай -ю *m.*
guitar [gɪˈtɑ:r] n. гіта́ра *f.*
guitarist [gɪˈtɑ:rɪst] n. гітары́ст -а *m.*
gulch [gʌltʃ] n. глыбо́кі роў са стро́мкімі берага́мі
gulf [gʌlf] – n. 1. зато́ка *f.*, зали́ў -ву *m.*: ***the Gulf of Mexico*** Мэксыка́нская за-

то́ка. 2. прадо́ньне *n.*, бе́здань *f.*, бяздо́ньне *n.* 3. про́рва *f.*, прынцыпо́вае разыхо́джаньне; разры́ў -ву *m.* (*сяброўства*). 4. вір -у *m.*
– v.t. 1. глыта́ць, паглына́ць. 2. залі-ва́ць, затапля́ць

gull I [gʌl] n. ча́йка *f.*; ка́гарка *f.*

gull II [gʌl] – v.t. ашу́кваць; абду́рваць
– n. прасьця́к -а́ *m.*, ду́рань -ня *m.*, чалаве́к, яко́га лёгка абдурыць

gullet ['gʌlɪt] n. 1. стрававод -у *m.* 2. го́рла *n.*, гло́тка *f.* 3. вузкі́ яр; цясьні́на *f.* (*у гара́х*)

gullibility or **gullability** [ˌgʌlə'bɪlətɪ] n. легкаве́рнасьць, прастаду́шнасьць, наі́ўнасьць *f.*

gullible ['gʌləbəl] adj. лёгкаве́рны, наі́ўны, прастаду́шны

gully [gʌlɪ] – n., pl. **-lies** 1. вузкі́ яр, цясьні́на (*у гара́х*). 2. роў вы́мыты вадо́ю
– v.t. утвара́ць, вымыва́ць равы́, я́ры

gulp [gʌlp] – v.t. 1. ху́тка *або́* пра́гна глыта́ць. 2. глыта́ць, душы́ць (*сьлёзы, сьмех*); стры́мваць (*хвалява́ньне*)
– v.i. задыха́цца; душы́цца
– n. 1. глыта́ньне *n.* 2. глыто́к -ка́ *m.*

gum I [gʌm] – n. 1. каме́дзь *f.* (*густы́ кле́йкі сок некато́рых дрэ́ваў*). 2. смалі́стае выдзяле́ньне (*смала́, жывіца*). 3. жу́йка *f.*, жава́льная гу́мка. 4. клей на канвэ́рце, ма́рцы. 5. каўчу́к -у́ *m.*, гу́ма *f.* 6. каме́днае дрэ́ва
– v.t. 1. скле́йваць, кле́іць; гумава́ць, насыча́ць гу́май тканіну. 2. пэ́цкаць кле́йкім рэ́чывам (*цуке́ркай*)
– v.i. выдзяля́ць смалу́, кле́іцца, рабі́цца кле́йкім

gum II [gʌm] – n. often **gums** дзясна́ *f.*, *pl.* дзя́сны
– adj. дзя́сенны

gum arabic гуміара́бік -у *m.*

gumboil ['gʌmbɔɪl] n. флюс -у *m.*

gummed stamp (envelope, etc.) пашто́вая ма́рка (канвэ́рт) з кле́ем

gummy ['gʌmɪ] adj. 1. лі́пкі, кле́йкі, ягу́чы, як смала́. 2. гумава́ны. 3. які́ выдзяля́е смалу́, жывіцу; смо́льны, смалі́сты. 4. апу́хлы, напу́хлы; ацёкшы

gun [gʌn] – n. 1. па́льная збро́я; гарма́та *f.*; вінто́ўка, стрэ́льба *f.* 2. Colloq. пістале́т -а *m.*, рэвальвэ́р -а *m.* 3. ***spray gun*** распыля́льнік -а *m.* (*супро́ць машкары́*). 4. стрэл (*як сыгна́л або́ салю́т*). 5. Brit. удзе́льнік палява́ньня. 6. Sl. зло́дзей -я *m.*, кішэ́ньнік -а *m.*
– v.i. **(-nn-)** страля́ць, палява́ць са стрэ́льбай
– v.t., Informal страля́ць, забіва́ць *або́* ра́ніць стрэ́льбай
• ***gun down*** а) зьбіць (*самалёт, птушку*) б) разьбіва́ць, забіва́ць (*не́чую ініцыяты́ву або́ намага́ньні*)
• ***gun for*** а) пача́ць агіта́цыю за ці супро́ць чаго́. б) шука́ць, стара́цца атрыма́ць: ***to gun for support*** шука́ць падтры́мкі. б) страля́ць, палява́ць: ***He is out gunning for ducks*** Ён пайшо́ў палява́ць на ка́чак
• ***stick to one's guns*** трыма́цца свайго́, не здава́ць пазы́цыяў

gunboat ['gʌnbout] n. кананёрка *f.*

gunfire ['gʌnfaɪr] n. гарма́тная страляні́на, гарма́тны агонь

gunman ['gʌnmən] n., pl. **-men** 1. а) чалаве́к, узбро́ены стрэ́льбай. б) знаве́ц зброі. 2. напа́днік, банды́т -а *m.*, забо́йца -ы *m.* & *f.*

gunner ['gʌnər] n. 1. кананір -а *m.*, кулямётчык -а *m.*; артылерыст -а *m.* 2. паляўні́чы -ага *m.*

gunnery ['gʌnərɪ] n. 1. артылерыйская спра́ва. 2. страля́ньне з гарма́таў. 3. па́льная збро́я *coll.*

gunpowder ['gʌnˌpaudər] n. по́рах -у *m.*

gunshot ['gʌnʃɑ:t] – n. 1. гарма́тны стрэл. 2. далёкасьць стрэ́лу: ***within gunshot*** на адле́гласьці стрэ́лу
– adj. агнястрэ́льны: ***a gunshot wound*** ра́на ад стрэ́лу

gurgle ['gɜ:rgəl] – v.i. 1. бу́лькаць; цурча́ць, журча́ць (*пра ваду́*). 2. буркота́ць: ***The baby gurgled happily*** Немаўля́тка ве́села буркота́ла. 3. пала-ска́ць рот
– n. бу́льканьне, цурчэ́ньне вады́

gush [gʌʃ] – v.i. 1. хлы́нуць; ры́нуцца; пали́цца (*раптоўна*), пацячы́ пато́кам. 2. Informal выліва́ць сваё пачу́ццяў, выліва́цца
– n. 1. мо́цны пато́к (*вады́, на́фты, крыві́, сьлёзаў*). 2. вы́бух -у *m.* (*гне́ву*). 3. Informal шчы́рае прызна́ньне, шчы́рыя гу́таркі

gusher ['gʌʃər] n. 1. на́фтавы фанта́н. 2. чалаве́к, які́ бу́рна выяўля́е сваё пачу́ццяў

gushy ['gʌʃi] adj. які́ выяўля́е сваё пачу́ццяў; сэнтымэнта́льны

gust [gʌst] n. 1. парыў ве́тру. 2. раптоўны ліве́нь. 3. вы́бух гне́ву, сьме́ху, энтузія́зму

gusto ['gʌstou] n., pl. **-tos** 1. гара́чае захапле́ньне, ахво́та (*пра́цы*) 2. лю́басьць *f.*; ціка́васьць, схі́льнасьць *f.*; густ -у *m.* 3. маста́цкі стыль

gusty ['gʌsti] adj. бу́рны, бурлі́вы (*мо́ра*), парыві́сты (*ве́цер*); ве́траны (*дзень*)

gut [gʌt] – n. 1. кі́шка *f.*; вантро́бы, трыбухі́ *pl.* 2. кетгут -у *m.* (*мо́цныя ні́ткі з кі́шак аве́чак, ужыва́ныя для вы́рабу стру́наў, тэ́нісных раке́так і ў хірургіі*)
– v.t., Informal 1. трыбушы́ць, патрашы́ць. 2. спусташа́ць, выпусто́шваць

guts а) Sl. сі́ла во́лі, адва́жнасьць, вытрыва́ласьць *f.* б) вантро́бы *pl. only*, кі́шкі

gutter ['gʌtər] – n. 1. кана́ва *f.* 2. ры́на *f.*, вадасьцёк -у *m.* (*на да́ху*). 3. рaўво́к -ўка́, раўчу́к -а́ *m.*; жо́лаб размы́ты вадо́ю. 4. Informal бе́дны, бру́дны раён; падо́нкі грама́дзтва
– v.t. рабі́ць раўчукі́, раўкі́; закла да́ць ры́ны
– v.i. аплыва́ць (*пра сьве́чку*)

guttersnipe ['gʌtərsnaip] n., Informal ву́лічнае дзіця́, беспрыту́льнік -а *m.*; чалаве́к найні́жэ́йшых сацыя́льных пласто́ў

guttural ['gʌtərəl] – adj. 1. гарлавы́; гарта́нны: ***deep guttural voice*** ні́зкі гартанны го́лас. 2. Phon. за́днепадня́бе́нны; вэля́рны
– n., Phon. вэля́рны зы́чны гук

guy [gai] n. 1. Sl. хлапе́ц -ца́ *m.*, хлапчы́на -ы *m.*, дзяцю́к дзецюка́ *m.* 2. дзівакава́ты чалаве́к. 3. пу́дзіла, чучэ́ла *n.*

guzzle ['gʌzəl] – v. пра́гна піць, шмат піць (*гарэ́лкі*)
– n. 1. пітво́ *n.*, напо́й -ю *m.*; сьпіртны́ напо́й. 2. папо́йка, п'я́нка *f.*, абжо́рства і распу́ста

guzzler ['gʌzlər] n. п'я́ніца, абжо́рца -ы *m. & f.*; гуля́ка -і *m.*, распу́сьнік -а *m.*

gym [dʒim] n., Informal *скаро́т ад* **gymnasium**

gymnasium [dʒim'neiziəm] n., pl. **-siums, -sia** 1. гімнасты́чная за́ля. 2. гімнасты́чная шко́ла. 3. [gim'na:ziəm] гімна́зія *f.*, сярэ́дняя шко́ла

gymnast ['dʒimnæst] n. гімна́ст -а *m.*, гімна́стка *f.*

gymnastic [dʒim'næstik] or **gymnastical** [dʒim'næstikəl] adj. гімнасты́чны

gymnastics [dʒim'næstiks] n., pl. гімна́стыка *f.*, фізы́чныя практыкава́ньні

gynecological [ˌgainikə'lɑ:dʒikəl] adj. гінэкалягі́чны

gynecologist [ˌgainə'kɑ:lədʒist] n. гінэко́ляг -а *m.*

gynecology [ˌdʒaini'kɑ:lədʒi] n. гінэкалёгія *f.*

gypseous ['dʒipsiəs] adj. гі́псавы

gypsum ['dʒipsəm] – n. гіпс -у *m.*
– v.t. гіпсава́ць (*гле́бу*)

Gypsy or **gypsy** ['dʒipsi] – n., pl. **-sies** 1. цыга́н -а́ *m.*, цыга́нка *f.* 2. цыга́нская мо́ва
– adj. цыга́нскі, як цыга́н
– v.i. 1. жыць па-цыга́нску. 2. прыма́ць удзе́л у пі́кніку, маёўцы; ла́дзіць маёўку

gyrate ['dʒaireit] – v. круці́цца (*па ко́ле*), ру́хацца (*па сьпіра́лі*)
– adj., Bot. згорнуты сьпіра́льлю

gyroscope ['dʒairəskoup] n. гіраско́п -а *m.*

H

H, h [eɪtʃ] n.,pl. **H 's, h's** *во́сьмая лі́тара анге́льскага альфабэ́ту*

habit I ['hæbɪt] – n. 1. звы́чка, прывы́чка *f.*, звы́чаl̆й -ю *m.*: ***the habit of smoking*** звы́чка куры́ць. 2. Biol. спо́саб ро́сту й разьвіцьця́ жывёліны ці расьлі́ны: ***a plant of trailing habit*** сьце́лістая расьлі́на

habit II ['hæbɪt] – n. а) мана́ская ра́са: ***to take the habit*** пастры́гчыся ў мана́хі, мана́шкі. б) амазо́нка (*да́мскі гарні-ту́р для язды́ на ко́нях*). в) Archaic адзе́ньне *n.*, убо́р -у *m.*
– v.t. апрана́ць, адзява́ць

habitable ['hæbətəbəl] adj. засе́лены, насе́лены; прыда́тны для жыльля́

habitation [ˌhæbɪ'teɪʃən] n. 1. жыльлё, жытло́ *n.*, кватэ́ра *f.* 2. жыльлё, жытло́, пражыва́ньне *n.*: ***Is this house fit for habitation?*** Ці гэ́ты дом прыго́дны для жыльля́?

habitual [hə'bɪtʃuəl] adj. 1. прывы́чны, звы́чны, звы́клы. 2. звыча́йны, заўсёдны: ***a habitual smile*** заўсёдная ўсьме́шка

habituate [hə'bɪtʃueɪt] v.t. 1. прывуча́ць; прызвыча́йваць. 2. ча́ста наве́дваць *што*, ча́ста быва́ць *дзе*

habitude ['hæbɪtu:d] n. 1. уласьці́васьць, асабліва́сьць *f.* 2. звы́чка, прывы́чка *f.*, на́вык -у *m.*

hack I [hæk] – v.t. 1. сячы́, рэ́заць ня-ро́ўна, абы-я́к. 2. а) матыкава́ць. б) зраза́ць каля́ ко́раня
– v.i. 1. спрычыня́ць рэ́заную ра́ну. 2. ка́шляць сухі́м ка́шлем
– n. 1. а) рэ́заная ра́на. б) засе́чка на дрэ́ве. 2. прыла́да, сяке́ра *f.*; кі́рка, маты́ка *f.* 3. сухі́ ка́шаль

hack II [hæk] – n. 1. а) наёмны конь *ці* фурма́нка. б) Informal такі́ *n., indecl.* 2. верхавы́ ці запражны́ конь. 3. кля́ча *f.* 4. літаратў́рны падзёншчык, кампіля́тар -а *m.*
– v.i. 1. е́хаць ступо́ю. 2. Informal быць такі́стам
– v.t. 1. рабі́ць бана́льным, зьбі́тым, шаблённым. 2. Informal піса́ць на кале́не

hackle I ['hækəl] – n. 1. *такс.* **hatchel, heckle** шчо́тка (*для часа́ньня лёну́, кано́пляў*). 2. пе́р'е на шы́і пе́ўня і інш. птў́шак. 3. штў́чная прына́да (*для ры́бы*)
– v.t. часа́ць (*лён*)
• ***raise the hackles*** Informal насьця-ро́жваць *каго́*, выклі́ка́ць падазрэ́ньне *або́* злосьць у *каго́*

hackle II ['hækəl] v. няро́ўна рэ́заць, сячы́ абы-я́к

hackneyed ['hæknɪd] adj. 1. зьбі́ты, шаблённы, бана́льны. 2. дасьве́дчаны; быва́лы

haddock ['hædək] n., pl. **-docks** or coll. **-dock** пі́кша *f.* (*ры́ба сяме́йства траско́вых*)

haemorrhage ['heməɪdʒ] n. *гл.* **hemorrhage**

haft [hæft] n. 1. ру́чка *f.*, тро́нlак -ка *m.* (*нажа́, відэ́льца*); дзяржа́ньне *n.* 2. эфэ́с -а *m.* (*ша́блі, мяча́*)

hag [hæg] n. 1. карга́, карго́та *f.* 2. ве́дзьма *f.*

haggard ['hægərd] – adj. 1. змардава́ны; зьнясі́лены, змарне́лы. 2. дзі́кі, непрыру́чаны (*пра ко́ршака*)
– n. ко́ршак

haggle ['hægəl] – v.i. таргава́цца
– v.t. 1. знахо́дзіць хі́бы ў тава́ры; чапля́цца. 2. няўме́ла ра́заць

hail I [heɪl] – v.t. 1. віта́ць, віта́ць во́клічамі. 2. віта́ць, называ́ць, зваць: ***They hailed him leader*** Яны́ віта́лі яго́ як правадыра́. 3. аклі́ка́ць
– n. 1. во́кліч прывіта́ньня, прывіта́ньне *n.* 2. во́клік- у *m.* (*на адле́гласьці чу́тнасьці го́ласу*)
– Interj., Poetic Віта́ньне! Прывіта́ньне!

hail II [heɪl] – n. град гра́ду *m.*
– v.i. 1. ***It hails*** Ідзе́ град. 2. сы́пацца гра́дам
– v.t. сы́паць, закіда́ць (*як гра́дам*)

hailstone ['heɪlstoʊn] n. гра́дзіна *f.*, кру́пі́нка гра́ду

hailstorm ['heɪlstɔ:rm] n. навальні́ца з гра́дам, вялі́кі град

haily ['heɪli] adj. гра́давы

hair [her] – n. 1. во́лас -а і -у *m.*; валасо́к -ка́ *m.* 2. валасы́ *pl.*: ***to have one's hair done*** зрабі́ць фрызу́ру; ***to cut one's hair*** падстры́гчы валасы́. 3. поўсьць, шэрсьць *f.* (*жывёліны*); ворс -у *m.* 4. валаскі́, варсі́нкі (*на расьлі́нах*)
– adj. валася́ны; зро́блены з валасо́ў
• ***make one's hair stand on end*** мо́цна спало́хаць каго́-н.
• ***not to turn a hair*** і во́кам не міргну́ць
• ***split hairs*** удава́цца ў падрабя́знасьці
• ***tear one's hair*** рва́ць на сабе́ валасы́ (*з ро́спачы і г.д.*).
• ***to a hair*** во́лас у во́лас, зусі́м падо́бны; якра́з
• ***within a hair's breadth*** на валасо́к, ве́льмі бліз́ка

hairbrush ['herbrʌʃ] n. шчо́тка для валасо́ў

haircut ['herkʌt] n. стры́жка

hairdo ['herdu:] n., pl. **-dos** фрызу́ра, прыча́ска *f.*

hairdresser ['her,dresər] n. цыру́льнік -а *m.*, цыру́льніца *f.*

haired [herd] adj. валаса́ты, з валаса́м

hairless ['herles] adj. безвало́сы

hairline ['herlaɪn] – n. 1. лі́нія валасо́ў на галаве́: ***receding hairline*** пача́так лы́сіны. 2. цянюсенькая лі́нія. 3. тканіна ў дро́бную пало́ску
– adj. ве́льмі ву́зенькі; ве́льмі бліз́кі

hair net се́тка для валасо́ў

hair pin шпі́лька *f.*

hairy ['heri] adj. валаса́ты, касма́ты, калма́ты

hale I [heɪl] adj. мо́цны, здаро́вы

hale II [heɪl] v.t. 1. цягну́ць сі́лай, валачы́; ту́заць. 2. змуша́ць (*ісьці*), заця́гваць *куды́*

half [hæf] – n., pl. **halves** 1. пало́ва, палавіна *f.*: ***three and a half years*** тры з пало́вай гады́; ***half a dollar*** паўдаля́ра; ***half a meter*** паўме́тра; ***by half*** нашма́т, зана́дта: ***He is the better player by half*** Ён нашма́т ле́пшы гуле́ц
– adj. 1. палавінны; які́ склада́е пало́ву: ***a half barrel*** паўбо́чкі. 2. няпо́ўны, часткі́вы
– adv. 1. да пало́вы. 2. часткі́ва, напало́ву: ***to speak half aloud*** гаварыць напаўго́ласа. 3. ама́ль, бліз́у, по́ўн- (паў-); ***half dead from hunger*** паўмёртвы ад го́ладу

half-and-half [,hæfən'hæf] – adj. 1. пало́ва на пало́ву. 2. ні ры́ба, ні мя́са; ні то́е, ні сёе
– adv. у ро́ўнай прапо́рцыі
– n. 1. малако́ зьмяша́нае са сьмята́най. 2. Brit. мяша́ны алькаго́льны напо́й

half-baked [,hæf'beɪkt] adj. 1. недапе́чаны, паўсыры́. 2. Informal няпо́ўны, канчатко́ва не распрацава́ны (*плян*). 3. недасьве́дчаны. 4. Informal недапе́чаны, прыду́ркаваты

half-blood ['hæfblʌd] n. 1. зьмяша́ная кроў. 2. зво́дны брат *або́* зво́дная стра́
half-bred ['hæfbred] adj. нечыстакро́ўны (*конь*)
half-breed ['hæfbri:d] n. 1. мяша́н|ец -ца, мэты́с -а *m.* 2. мяша́нец індзе́йскай і бе́лай ра́сы
half-brother зво́дны брат
half-caste ['hæfkæst] n. чалаве́к мяша́най ра́сы (*асабл. нашча́дак эўрапе́йца й азія́ткі*)
half-hearted [ˌhæf'hɑ:rtəd] adj. нясьме́лы, неадва́жны, абыя́кавы *або́* без запа́лу: ***a half-hearted consent*** неахво́тная зго́да
half-heartedly adv. нерашу́ча, абыя́кава, без запа́лу
half-hour [ˌhæf'aʊr] – n. паўгадзі́ны
– adj. паўгадзі́нны, які́ трыва́е паўгадзі́ны
half-hourly [ˌhæf'aʊrli] – adj. паўгадзі́нны
– adv. ко́жнае паўгадзі́ны
half-mast [ˌhæf'mæst] – adv. на паўма́чты: ***flag at half-mast*** сьцяг, спу́шчаны да пало́вы ма́чты
– v.t. спуска́ць сьцяг да пало́вы (*на знак жало́бы*)
half moon паўме́сяц -а *m.* , серп ме́сяца
half-sister зво́дная сястра́
half-time ['hæftaɪm] n. 1. Sport пало́ва гульні́, тайм -у *m.* 2. пало́ва звыча́йнага працо́ўнага ча́су
halfway [ˌhæf'weɪ] – adv. 1. да пало́вы. 2. ***a rope reaching only halfway*** вяро́ўка дастае́ то́лькі да пало́вы. 3. напало́ву: ***The morning is halfway over*** міну́ла ўжо́ пало́ва ра́ніцы; ***to go or meet halfway*** сыйсьціся на поўдаро́зе, пагадзі́цца на *што*, ісьці́ на сту́пкі
– adj. 1. на поўдаро́зе. 2. недастатко́вы, няпо́ўны
half-wit ['hæfwɪt] n. 1. прыду́ркават|ы -ага *m.*, прыду́ркаватая *f.* 2. ду́р|ань -ня *m.*
half-witted [ˌhæf'wɪtəd] adj. 1. прыду́ркаваты. 2. дурны́
half-year [ˌhæf'jɪr] n. паўго́дзьдзе *n.*
half-yearly [ˌhæf'jɪrli] – adj. паўгадо́вы – adv. штопаўго́да, два разы́ на год
halibut ['hælɪbət] n., pl. **-buts** or coll **-but** па́лтус -а *m.*
hall [hɔ:l] n. 1. калідо́р -а *m.* 2. пярэ́дні пако́й; вэстыбю́л|ь -я *m.* 3. за́ля *f.*: ***concert hall*** канцэ́ртная за́ля. 4. дом для грама́дзкіх патрэ́баў. 5. Brit. універсытэ́цкая стало́вая
hallmark ['hɔ:lmɑ:rk] n. 1. прабі́рнае кляймо́, про́ба *f.* (*зо́лата, сро́бра*). 2. характэ́рны знак; адзна́ка *f.*
hallo [hə'loʊ] – interj. алё, здаро́ў!
– n. во́клік прывіта́ньня *або́* зьдзіўле́ньня
hallucination [hə|lu:sɪ'neɪʃən] n. галюцына́цыя *f.*
hallway ['hɔ:lweɪ] n. 1. калідо́р, калідо́рчык -а *m., dim.* 2. пярэ́дні пако́й
halo ['heɪloʊ] n., pl. **-los, -loes** 1. гало́ *n., indecl.* (*бліскучы круг вако́л со́нца, ме́сяца*). 2. арэо́л -у *m.* (*сла́вы, прыгажо́сьці*). 3. арэо́л -а *m.*, німб -а *m.* (*на абразо́х сьвяты́х*)
halt I [hɔ:lt] – v.i. спыня́цца, затры́мвацца
– v.t. спыня́ць, затры́мваць
– n. прыпы́н|ак -ку *m.*
halt II [hɔ:lt] v.i. 1. сумнява́цца, вага́цца. 2. Archaic кульга́ць
halter ['hɔ:ltər] – n. 1. вяро́ўка *f.* (*для навя́званьня жывёлы*), по́вад -у *m.* (*пры абро́ці каня́*). 2. вяро́ўка зь пятлёю (*на шы́беніцы*). 3. сьмерць на шы́беніцы: ***to stretch a halter*** быць паве́шаным
– v.t. 1. прывя́зваць вяро́ўкай, по́вадам. 2. лавіць на арка́н *ці* ласо́. 3. ве́шаць (*чалаве́ка*)
halve [hæv] v.t. 1. дзяліць напала́м, дзяліцца *чым* з *кім*. 2. скарача́ць напало́ву (*ко́шты, час*)
halves [hævz] n., pl. of **half** пало́вы *pl.*: ***to go halves*** дзяліць ро́ўна напала́м (*прыбы́ткі*)
ham [hæm] – n. 1. кумпя́к -а́ *m.*, шы́нка *f.* 2. сьві́ны зад 3. ля́жка *f.*; сьцягно́ *n.*

(*ча́стка нагі́*). 4. Sl. слабы́ акто́р, слаба́я йгра́. 5. радыёама́тар -а *m.*
– v.t., v.i., Sl. ке́пска йгра́ць ро́лю

hamburger ['hæmˌbɜ:rgər] n. катле́та *f.* (*найчасьце́йі я́лавічная*), гамбургер -а *m.*

hamlet ['hæmlət] n. 1. пасёлак -ку *m.*, пасе́лішча *n.*, мале́нькая вёсачка. 2. Brit. вёска без царквы́

hammer ['hæmər] – n. 1. мо́лат -а, малато́к -ка́ *m.* 2. малато́чак -ка *m.* (*у ро́зных мэхані́змах*). 3. уда́рнік -а *m.* (*у па́льнай зброі́*). 4. Anat. малато́чак -ка *m.* (*вушна́я ко́стачка*): ***to come or go under the hammer*** быць прада́дзеным з малатка́ (*на аўкцыёне*); ***hammer and tongs*** усі́мі сі́ламі
– v.t. 1. біць, заганя́ць, прыбіва́ць малатко́м. 2. кава́ць; зьбіва́ць (*як малатко́м*). 3. дзяўбці́, убіва́ць: ***to hammer into one's head*** убіва́ць каму́ ў галаву́. 4. дабіва́цца *чаго́* вялі́кімі намага́ньнямі: ***to hammer at*** упа́рта працава́ць над *чым*
• ***hammer and sickle*** серп і мо́лат
• ***hammer away*** дале́й рабі́ць не́шта, працава́ць над чым
• ***hammer out*** а) выко́ўваць. б) расплю́шчваць. в) выбіва́ць мо́латам. г) выясьня́ць

hammered ['hæmərd] adj. кава́ны (*сро́бра*)

hammock ['hæmək] n. гама́к -а́ *m.*

hamper I ['hæmpər] v.t. заміна́ць, перашкаджа́ць; тармазі́ць

hamper II ['hæmpər] n. вялі́кая кашо́лка зь ве́чкам: ***a hamper for dirty clothes*** кашо́лка для бру́днае бялі́зны

hamster ['hæmstər] n., Zool. хамя́к -а́ *m.*

hamstring ['hæmstrɪŋ] – n., Anat. кале́нныя сухажы́льлі, паджы́лкі
– v.t. 1. кале́чыць, падрэ́заўшы паджы́лкі. 2. нявечыць *каго́*, псава́ць. 3. паралізава́ць, пазбаўля́ць здо́льнасьці дзе́йнічаць

hamstrung ['hæmstrʌŋ] v., *p.t.* and *p.p.* of **hamstring**

hand [hænd] – n. 1. рука́ *f.* (*кі́сьць*) 2. пярэ́дняя ла́па 3. а) наня́ты рабо́тнік: ***a factory hand*** фабры́чны рабо́тнік ***a farm hand*** рабо́тнік се́льскае гаспада́ркі. б) мара́к -а́ *m.*, экіпа́ж, кама́нда вадапла́ва. 4. бок -у *m.*: ***At her left hand stood two men*** Зь ле́вага бо́ку ад яе́ стая́лі два мужчы́ны. 5. гадзі́ньнікавая стрэ́лка 6. по́чырк -у *m.*; по́дпіс -у *m.* 7. во́плескі *pl. only.* 8. здо́льнасьці *pl.*, уме́льства *n.*: ***at first hand*** зь пе́ршых рук, беспасрэ́дна ад *каго́* (*дабе́дацца, атрыма́ць*)
– v.t. перадава́ць, уруча́ць
– adj. ручны́
• ***at hand*** а) пад руко́ю, бліз́ка. б) гато́вы
• ***at second (third) hand*** з другі́х (трэ́ціх) рук, праз пасярэ́днікаў
• ***bind hand and foot*** а) зьвяза́ць ру́кі й но́гі. б) зьвяза́ць па рука́х і нага́х
• ***by hand*** ад рукі́, ручны́м спо́сабам
hypocrisy [hɪˈpɑ:krəsi] n., pl. **-sies** 1. крываду́шнасьць, гіпакры́зія *f.* 2. прыкі́дваньне *n.*

hypocrite [ˈhɪpəkrɪt] n. 1. крываду́шнік -а *m.*, крываду́шніца *f.* 2. той, хто прыкі́дваецца

hypocritical [ˌhɪpəˈkrɪtɪkəl] adj. крываду́шны, няшчы́ры: ***hypocritical smile*** крываду́шная ўсьме́шка

hypodermic [ˌhaɪpəˈdɜ:rmɪk] – adj. падску́рны (*кле́ткі*): ***a hypodermic injection*** падску́рны ўко́л

– n. 1. до́за ле́ку, упы́рснутага пад ску́ру 2. шпрыц шпры́ца *m.*

hypotenuse [haɪˈpɑ:tənu:s] n. гіпатэну́за *f.*

hypothesis [haɪˈpɑ:θəsɪs] n., pl. **-ses** 1. дапушча́ньне *n.*, гіпо́тэза *f.* 2. меркава́ньне *n.*, здага́дка *f.*

hypothetical [ˌhaɪpəˈθetɪkəl] adj. гіпатэты́чны, заснава́ны на меркава́ньні, на гіпо́тэзе

hysteria [hɪˈstɪriə] n. гістэ́рыя *f.*

hysterical [hɪˈsterɪkəl] adj. гістэры́чны, схі́льны да гістэ́рыі: ***a hysterical fit*** гістэры́чны прыпа́дак

hysterics [hɪˈsterɪks] n., pl. гістэ́рыка *f.*, прыпа́дак гістэры́чнага сьме́ху й пла́чу



I, i [aɪ] n., pl. **I's, i's** *дзявя́тая лі́тара анге́льскага альфабэ́ту*

I [aɪ] pron. nom. я; obj. **me** мяне́, мне

ice [aɪs] – n. 1. лёд -у *m.* 2. Sl. дыямэ́нты. 3. Brit. лёды *pl.*, маро́зіва, маро́жанае *n.* 4. Sl. ха́бар -у *m.*
– adj. ледзяны́; лёдавы, лёдзісты (*пакры́ты лёдам*), абледзяне́лы.
– v.t. 1. халадзі́ць, ахало́джваць (*лёдам*). 2. замаро́жваць. 3. пакрыва́ць цукро́вай глязу́рай
– v.i. ме́рзнуць, замярза́ць
• ***break the ice*** зрабі́ць пача́так, пе́ршы крок (*да знаёмства, гу́таркі*)

ice age, Geol. ледавіко́вы пэры́яд

iceberg ['aɪsbɜ:rg] n. айсбэ́рг -а *m.*

iceboat ['aɪsbout] n. 1. бу́ер -а *m.* (*са́ні зь ве́тразем*). 2. ледако́л -а *m.*

icebound ['aɪsbaund] adj. 1. скава́ны лёдам (*пра раку́*). 2. зацёрты лёдам (*пра карабе́ль*)

icebox ['aɪsbɑ:ks] n. 1. лядо́ўня *f.* 2. халадзі́льнік -а *m.*

ice breaker ['aɪsbreɪkər] n. 1. ледако́л -а *m.* (*карабе́ль*). 2. ледарэ́з -а *m.*

ice cream лёды *pl.*, маро́зіва, маро́жанае *n.*

ice cube ку́бік лёду

iced [aɪst] adj. 1. ахало́джаны лёдам 2. пакры́ты лёдам, заледзяне́лы. 3. глязурава́ны, пакры́ты глязу́рай

ice drift 1. ледахо́д -у *m.* 2. таро́с -у *m.*

ice floe кры́га *f.*

ice-free ['aɪsfri:] adj. бязь лёду; які́ нікó-лі не замярза́е: ***an ice-free port*** порт, які́ нікóлі не замярза́е

ice hole палóнка *f.*

Icelander ['aɪsləndər] n. 1. ісьля́нд|зец -ца *m.*, ісьля́ндка *f.*

Icelandic [aɪs'lændɪk] – adj. ісьля́ндзкі
– n. ісьля́ндзкая мóва

ice-skate ['aɪsskeɪt] – n. канёк канькá *m.*, *pl.* канькí
– v.t. кóўзацца на канькáх

ice water 1. вадá, ахало́джаная лёдам. 2. ледзяна́я вадá (*з расто́пленага лёду*)

ichthyology [ɪkθɪ'ɑ:lədʒi] n. іхтыялёгія *f.*

icicle ['aɪsɪkəl] n. лядзя́ш ледзяшá, лядзя́к ледзякá *m.*

icing ['aɪsɪŋ] – n. цукрóвая глязу́ра, вярхýшка тóрта. Informal: ***icing on the cake*** дадаткóвая прынáда
– adj. ***icing sugar*** цукрóвая пу́дра

icon ['aɪkɑ:n] n. 1. ікóна *f.*, сьвяты́ абраз. 2. кумі́р -а, сы́мбаль -ю *m.*

icteric [ɪk'terɪk] – n. 1. сródак ад жаўту́хі. 2. чалаве́к хвóры на жаўту́ху
– adj. 1. жаўту́шны. 2. ужыва́ны для лячэ́ньня жаўту́хі

icy ['aɪsi] adj. 1. ледзяны́; сьцюдзёны. 2. пакры́ты лёдам. 3. халóдны й нявé́тлы

idea [aɪ'di:ə] n. 1. ду́мка, ідэ́я *f.*, разуме́ньне, уяўле́ньне *n.*: ***to have an idea*** мець уяўле́ньне. 2. пагля́д -у *m.*, пе-

раканáньне *n.*, вéра *f.*: ***old-fashioned ideas*** старамóдныя пагляды. 3. уяўлéньне *n.*, фантáзія *f.*: ***What's the big idea?*** Што за глýпства вы задýмалі? 4. плян дзéяньня, намéр -у *m.*, задýма *f.*

ideal [aɪˈdi:əl] – n. ідэáл -у *m.*
– adj. 1. ідэáльны, дасканáлы. 2. уяўны

idealism [aɪˈdi:əˌlɪzəm] n. ідэалíзм -у *m.*

idealist [aɪˈdi:ələst] – n. ідэалíст -а *m.*, ідэалíстка *f.*
– adj. ідэалістычны (*сьветапóгляд*)

idealize [aɪˈdi:əlaɪz] v.t. ідэалізавáць

identical [aɪˈdentɪkəl] adj. 1. ідэнтычны, тóесны; такí сáмы 2. дакладна аднóлькавы

identically [aɪˈdentɪkəli] adv. таксáма, аднóлькава

identification [aɪˌdentɪfɪˈkeɪʃən] n. атаясьнéньне, атаясáмліваньне, атаясáмленьне *n.*: ***identification card*** пасьвéдчаньне асóбы

identify [aɪˈdentəfaɪ] v.t. 1. атаясáмліваць, атаясьняць; распазнавáць, прызнавáць тóесным з *кім-чым*. 2. выяўляць тóеснасьць, ідэнтыфікавáць

identity [aɪˈdentəti] n. 1. таясáмасьць, тóеснасьць, ідэнтычнасьць *f.* 2. сапрáўднасьць, аўтэнтычнасьць *f.*: ***identity card*** пасьвéдчаньне асóбы

ideological [ˌaɪdiəˈlɑ:dʒɪkəl] adj. ідэалягíчны, ідэйны

ideologue [ˈaɪdiəlɔ:g] n. ідэóляг -а *m.*

ideology [ˌaɪdiˈɑ:lədʒi] n., pl. **-gies** ідэалёгія *f.*

idiocy [ˈɪdiəsi] n., pl. **-cies** 1. ідыятызм -у *m.* 2. неразýмнасьць, бязглýздасьць *f.*

idiom [ˈɪdiəm] n. 1. ідыёма *f.* (*выраз уласьцівы аднóй мóве*). 2. дыялéкт -у *m.*

idiomatic [ˌɪdiəˈmætɪk] adj. 1. ідыяматычны (*выраз*). 2. багáты на ідыёмы, які ўжывáе ідыёмы 3. дыялéктны

idiot [ˈɪdiət] – n. 1. ідыёт -а *m.*, ідыётка *f.* 2. дýрань -ня *m.*, тупíца -ы *m & f.*
– adj. 1. ідыёцкі (*выраз твáру*) 2. неразýмны, дурны, бязглýзды

idiotic [ˌɪdiˈɑ:tɪk] adj. *гл.* **idiot,** adj.

idle [ˈaɪdəl] – adj. 1. незаняты; вóльны; бязьдзéйны; беспрацóўны: ***to stand idle*** прастóйваць (*пра фáбрыку*). 2. гультаяваты, лянівы. 3. бескарысны, мáрны, дарэмны. 4. пусты, беспадстáўны (*страх, вéсткі*)
– v.i. 1. нічóга не рабіць, гультаяваць, бязьдзéйнічаць. 2. прахóджвацца, туляцца. 3. быць на халастым ходзе (*пра матóр*)
– v.t. марнавáць, бязьдзéйна бáвіць (*час*)

idleness [ˈaɪdəlnəs] n. 1. бязьдзéйнасьць, незанятасьць *f.* 2. гультаяванне, гультáйства *n.*; лянóта *f.*, абібóцтва *n.* 3. бескарыснасьць, мáрнасьць *f.*

idler [ˈaɪdlər] n. 1. гультáй -я́ *m.*, гультáйка *f.*; абібóк -а *m.*

idol [ˈaɪdəl] n. 1. ідал -а *m.* 2. кумір -а *m.*, стод -а *m.*

idolatry [aɪˈdɑ:lətri] n., pl. **-tries** 1. ідалапаклóнства *n.* 2. пакланéньне *n.*; багóмленьне *n.*

idolize [ˈaɪdəlaɪz] – v.t. 1. пакланяцца *кáму* як ідалу, рабіць з *кагó* ідала 2. мóцна любіць *кагó*, захапляцца *кім*
– v.i. пакланяцца ідалам

idyl(l) [ˈaɪdəl] n. ідылія *f.*

idylic [aɪˈdɪlɪk] adj. 1. ціхі, спакóйны, нічым не засмýчаны. 2. ідылíчны (*жанр, апісáньне*)

i.e. [ˌaɪˈi:] (id est, *лац.*) г.зн., гэта знáчыць

if [ɪf] conj. 1. калí, на выпадак: ***Come if you can*** Прыдзéце, калí мóжаце. 2. калí б; каб: ***If only I'd known*** Калí б я тóлькі вéдаў. 3. ці: ***She doesn't know if he is here*** Янá ня вéдае, ці ён тут
• ***as if*** як быццам, нібыта
• ***As if you didn't know!*** Нібыта ты ня вéдаў?

igloo [ˈɪglu:] n., pl. **-loos** íглу, *indecl.* (*эскімóскае жытлó*)

igneous [ˈɪgniəs] adj. 1. агнявы. 2. Geol. вулканíчны: ***Granite is an igneous rock*** Граніт — агнявáя парóда

ignite [ɪgˈnaɪt] – v.t. 1. запáльваць. 2. распáльваць, награваць да чырвані
– v.i. запáльвацца, загарáцца, успалыхваць (*пра пóлымя*)

ignition [ɪgˈnɪʃən] n. запа́льваньне *n.* (*у аўтамабі́лі*); загара́ньне *n.*; успы́шка *f.* (*по́раху*): ***ignition key*** ключ запа́льваньня (*у аўтамабі́лі*)

ignoble [ɪgˈnoʊbəl] adj. 1. бяз го́нару; по́длы, гане́бны; ні́зкі, агі́дны. 2. ні́зкага пахо́джаньня *або́* ста́ну. 3. ні́зкага гату́нку *або́* я́касьці

ignominious [ˌɪgnəˈmɪnɪəs] adj. 1. гане́бны бяссла́ўны (*учы́нак*); зьнява́жлівы. 2. нікчэ́мны; з дрэ́ннай рэпута́цыяй

ignominy [ˈɪgnəmɪni] n., pl. **-minies** 1. публі́чны со́рам і га́ньба; няслава *f.* 2. гане́бнае трыма́ньне

ignoramus [ˌɪgnəˈreɪməs] n., pl. **-muses** не́вук -а *m. & f.*, праста́к -а́ *m.*, праста́чка *f.*

ignorance [ˈɪgnərəns] n. 1. не́вуцтва *n.*, няве́да *f.*, няве́даньне *n.* 2. неадукава́насьць, цямно́та *f.*

ignorant [ˈɪgnərənt] adj. 1. неадукава́ны; цёмны, бязь ве́даў (*пра чалаве́ка*). 2. не́вуцкі, неасьве́чаны: ***an ignorant remark*** не́вуцкая заўва́га. 3. непаінфармава́ны, які́ ня ве́дае пра штось: ***He was ignorant of the fact that ...*** Ён ня ве́даў таго́, што ...

ignore [ɪgˈnɔːr] v.t. 1. знарок не заўважа́ць, ігнараваць. 2. ня браць пад ува́гу, не зважа́ць; не рэагава́ць

il-, pref. 1. *фо́рма адмо́ўнае прыста́ўкі* ***in-*** *перад "l", як у*: ***illegal*** нелега́льны, ***illegible*** нечытэ́льны. 2. *фо́рма прыста́ўкі* ***in-*** *перад "l", як у*: ***illuminate*** асьвятля́ць

Iliad [ˈɪlɪəd] n. Ілія́да *f.*

ill [ɪl] – adj. **worse, worst** 1. хво́ры, нездаро́вы: ***To be ill with smallpox*** хварэ́ць на адзёр; ***to fall ill*** захварэ́ць 2. а) злы; благі́, дрэ́нны; ліхі́, лю́ты: ***ill fame*** нядо́брая сла́ва. б) шко́дны: ***ill effect*** шко́дны ўплы́ў. 3. неспрыя́льны; нешчасьлі́вы; няўда́чны: ***an ill wind*** неспрыя́льны ве́цер. 4. нядо́бры, зага́нны, дрэ́нны: ***ill manners*** дрэ́нныя мане́ры; ***ill luck*** няўда́ча *f.*, няшча́сьце *n .*: ***he had ill luck*** ямý не пашанцава́ла. 5. няўме́лы; няспра́ўны – n. 1. хвароба, не́мач *f.* 2. шко́да *f.*; бяда́ *f.*, няшча́сьце, зло *n.*: ***Poverty is an ill*** Бе́днасьць — гэ́та няшча́сьце – adv. 1. бла́га, нядо́бра, дрэ́нна; шко́дна 2. неспрыя́льна, непрыхі́льна; нешчасьлі́ва. 3. няве́тла, нядо́бра; немілас э́рна: ***He speaks ill of his friend*** Ён нядо́бра гаво́рыць пра свайго ся́бра; ***to take ill*** захварэ́ць

• ***ill at ease*** неспако́йны, устурбава́ны; сарамлі́вы

• ***take something ill*** абра́зіцца за не́што

ill-advised [ˌɪlədˈvaɪzd] adj. неразу́мны; неразва́жны; неабду́маны

ill-boding [ˌɪlˈboʊdɪŋ] adj. злаве́сны, які́ выклі́кае страх, трывогу; неспрыя́льны

ill-bred [ɪlˈbred] adj. нявы́хаваны; няве́тлівы, грубава́ты, грубія́нскі: ***ill-bred man*** грубія́н -а *m.*

ill-conditioned [ˌɪlkənˈdɪʃənd] adj. 1. з дрэ́нней нату́рай, дрэ́нным хара́ктарам, сварлі́вы 2. у дрэ́нным ста́не, няспра́ўны

ill-disposed [ˌɪldɪsˈpoʊzd] adj. непрыя́зны, няве́тлы; неспрыя́льны, незычлі́вы, непрыхі́льна настро́ены

illegal [ɪˈliːgəl] adj. незако́нны, нелега́льны; забаро́нены зако́нам, падпо́льны

illegality [ˌɪliːˈgælətɪ] n., pl. **-ties** 1. незако́ннасьць, нелега́льнасьць *f.* 2. нелега́льшчына *f.*

illegibility [ɪˌledʒəˈbɪlətɪ] n., pl. **-ties** неразбо́рлівасьць, нечытэ́льнасьць *f.*

illegible [ɪˈledʒəbəl] adj. неразбо́рлівы, нечытэ́льны; невыра́зны, цяжкачытэ́льны: ***illegible handwriting*** неразбо́рлівы по́чырк

illegibly [ɪˈledʒəblɪ] adv. неразбо́рліва, нечытэ́льна, невыра́зна

illegitimacy [ˌɪləˈdʒɪtəməsɪ] n., pl. **-cies** 1. наро́джанасьць па-за шлю́бам. 2. незако́ннасьць *f.*

illegitimate [ˌɪlɪˈdʒɪtəmət] – adj. 1. пазашлю́бны; наро́джаны па-за шлю́бам. 2. незако́нны; нязго́дны з пра́-

ві́ламі; афіцы́йна не дазво́лены. 3. нелягі́чны; няпра́ві́льны
– v.t. абвяшча́ць незако́нным, нязго́дным з пра́ві́ламі

ill-famed [ˌɪl'femd] adj. зьняслá́ўлены, абняслá́ўлены; з дрэ́ннай рэпута́цыяй

ill-fated [ˌɪl'feɪtəd] adj. 1. бяздо́льны, няшча́сны (*чалаве́к*). 2. які́ стаў прычы́най няшча́сьця, непрые́мнасьці

ill-founded [ˌɪl'faʊndɪd] adj. неабгрунтава́ны

ill-gotten [ˌɪl'gɑ:tən] adj. несумле́нна здабы́ты (*гро́шы*)

illicit [ɪ'lɪsɪt] adj. 1. не дазво́лены зако́нам; забаро́нены. 2. няпра́ві́льны

illiteracy [ɪ'lɪtərəsi] n, pl. **-cies** 1. непісьме́ннасьць *f.* 2. неадукава́насьць *f.*, адсу́тнасьць адпаве́дных ве́даў, не́вуцтва *n.*

illiterate [ɪ'lɪtərət] – adj. 1. непісьме́нны. 2. неадукава́ны; недасьве́дчаны ў *чым*. 3. які́ пі́ша й гаво́рыць з грамату́чнымі памы́лкамі: ***He writes in a very illiterate way*** Ён пі́ша ве́льмі непісьме́нна (*з памы́лкамі*)
– n. 1. непісьме́нны -ага *m.*, непісьме́нная *f.* 2. не́вук -а *m. & f.*

ill nature зласьлі́васьць, сварлі́васьць *f.*

ill-natured [ˌɪl'neɪtʃərd] adj. з дрэ́нным хара́ктарам; зло́сны, зласьлі́вы, сварлі́вы: ***ill-natured gossip*** зло́сная плётка

illness ['ɪlnəs] n. хвароба, не́мач *f.*, нездаро́ўе *n.*, нядýжасьць *f.*, слабо́е здаро́ўе

illogical [ɪ'lɑ:dʒɪkəl] adj. 1. нелягі́чны, памылко́вы. 2. беспадста́ўны, неабгрунтава́ны (*страх*)

ill-omened [ˌɪl'oʊmend] adj. 1. злаве́сны. 2. нешчасьлі́вы, згýбны

ill-starred [ˌɪl'stɑ:rd] adj. нешчасьлі́вы, згýбны; з-пад дрэ́ннай зо́ркі

ill-tempered [ˌɪl'tempərd] adj. зласьлі́вы, які́ не вало́дае сабо́ю; раздражня́льны

ill-timed [ˌɪl'taɪmd] adj. няўча́сны, не ў пару́; неадпаве́дны

ill-treat [ˌɪl'tri:t] v.t. дрэ́нна абыхо́дзіцца, зьдзе́кавацца

illuminant [ɪ'lu:mɪnənt] – n. асьвятля́льнае рэ́чыва
– adj. асьвятля́льны

illuminate [ɪ'lu:mɪneɪt] v.t. 1. асьвятля́ць. 2. высьвятля́ць, выясьня́ць. 3. ілюмінава́ць. 4. аздабля́ць кні́гі (*залаче́нымі лі́тарамі, малю́нкамі*). 5. прасьвятля́ць, навуча́ць, дава́ць асьве́ту

illumination [ɪˌlu:mɪ'neɪʃən] n. 1. асьвятле́ньне *n.*: ***the illumination of a bonfire*** сьвятло́ во́гнішча. 2. Phys. я́ркасьць *f.* (*сьветлава́я велічыня́*). 3. вытлумачэ́ньне, выясьне́ньне *n.* 4. ілюміна́цыя *f.* 5. упрыго́жваньне кні́г, лі́тараў

illuminator [ɪ'lu:mɪneɪtər] n. 1. асьвятля́льнік -а *m.* (*асо́ба*); рэфле́ктар -а *m.*, сьвяці́льня *f.* 2. маста́к-ілюстра́тар

illumine [ɪ'lu:mən] – v.t. 1. асьвятля́ць. 2. прасьвятля́ць, дава́ць асьве́ту; натхня́ць
– v.i. ясьне́ць; разгара́цца

illusion [ɪ'lu:ʒən] n. 1. ілю́зія *f.* 2. памылко́вае ўяўле́ньне. 3. міра́ж -ý *m.*; ма́ра *f.* 4. цюль (*на вэ́люмы*)

illusive [ɪ'lu:sɪv] or **illusory** [ɪ'lu:səri] adj. несапра́ўдны, падма́нлівы; уя́ўны, ілюзо́рны

illustrate ['ɪləstreɪt] v.t. 1. ілюстрава́ць, тлума́чыць *што* навó́чным пры́кладам. 2. ілюстрава́ць (*малю́нкамі*)

illustrated ['ɪləstreɪtəd] adj. ілюстрава́ны

illustration [ˌɪlə'streɪʃən] n. ілюстра́цыя *f*

illustrative [ɪ'lʌstrətɪv] adj. ілюстрацы́йны, тлумача́льны (*матэры́ял, малю́нкі*)

illustrator ['ɪləstreɪtər] n. ілюстра́тар -а *m.*

illustrious [ɪ'lʌstriəs] adj. 1. вялі́кі, вы-да́тны, ве́дамы. 2. сла́ўны, славу́ты (*учы́нак*)

im- , pref. 1. *фо́рма адмо́ўнае прыста́ўкі* ***in-*** *пе́рад* ***b, m, p*** *як у*: ***imbalance, immoral, impatient***. 2. *фо́рма прыста́ўкі* ***in-*** *пе́рад* ***b, m, p*** *як у*: ***imbibe, immure, impart.***

I'm [aɪm] *скаро́т* ***I am*** я ёсьць

image ['ɪmɪdʒ] – n. 1. дакла́днае падабе́нства, відары́с, во́браз -у *m.*, ко́пія

f., адбі́тлак -ку *m.* (*у лю́стры*): ***to be the living (spitting) image of someone*** быць двайнікóм каго́-н. 2. ста́туя *f.*; партрэ́т -а *m.* 3. уя́ва *f.* 4. во́браз -у *m.*: ***to speak in images*** гаварыць во́бразна (*яскра́ва, жы́ва*)
– v.t. 1. малява́ць, перадава́ць. 2. адбіва́ць, адлюстро́ўваць. 3. уяўля́ць (*сабе́*). 4. во́бразна апі́сваць. 5. сымбалізава́ць

imagery [ˈɪmɪdʒəri] n., pl. **-ries** 1. уя́ўленыя во́бразы, уяўле́ньні. 2. жывы́я апіса́ньні; параўна́ньні. 3. малява́ныя абразы́, ста́туі, відарысы. 4. во́бразнасьць *f.*

imaginable [ɪˈmædʒɪnəbəl] adj. уя́ўны, які́ то́лькі мо́жна ўявіць; магчы́мы

imaginary [ɪˈmædʒəneri] adj. 1. уя́ўны, несапра́ўдны 2. Obsol. з бага́тым уяўле́ньнем, з бага́тай фанта́зіяй

imagination [ɪˌmædʒɪˈneɪʃən] n. 1. уяўле́ньне *n.* 2. фанта́зія *f.* 3. твóрчая фанта́зія

imaginative [ɪˈmædʒənətɪv] adj. з бага́тым уяўле́ньнем, бага́ты фанта́зіяй: ***Fairy tales are imaginative*** Ка́зкі бага́тыя фанта́зіяй

imagine [ɪˈmædʒɪn] v. 1. уяўля́ць. 2. ду́маць; меркава́ць, лічы́ць; здага́двацца: ***She imagined someone was watching her*** Ёй здава́лася, што не́хта сачы́ў за ёю

imbalance [ˌɪmˈbæləns] n. неўраўнава́жанасьць *f.*, адсу́тнасьць раўнава́гі

imbecile [ˈɪmbəsəl] – n. 1. недаразьві́ты чалаве́к 2. ду́рань -ня *m.*
– adj. 1. недаразьві́ты, бесталко́вы. 2. дурны́ 3. кво́лы, слабы́

imbecility [ˌɪmbəˈsɪləti] n., pl. **-ties** 1. недаразьві́тасьць, ту́пасьць *f.* 2. вялі́кая дурно́та. 3. глу́пства *n.*

imbibe [ɪmˈbaɪb] – v.t. 1. піць, выпіва́ць; паглына́ць (*таксама́ вачы́ма або́ вушы́ма*). 2. уця́гваць, убіра́ць (*ваду́, во́гкасьць*). 3. успрыма́ць
– v.i. 1. піць. 2. убіра́ць во́гкасьць

imbue [ɪmˈbju:] v.t. 1. усяля́ць, наве́йваць, абуджа́ць (*ду́мку, жада́ньне*), заахво́чваць. 2. насыча́ць (*во́гкасьцю, фа́рбай*); прамо́чваць, прасяка́ць (*крывёю*)

imitate [ˈɪmɪteɪt] v.t. 1. перайма́ць у *каго́*, браць прыклад з *каго́*. 2. падрабля́ць, імітава́ць (*брэх саба́кі*). 3. рабі́ць іміта́цыі (*ма́рмуру, ску́ры*)

imitation [ˌɪmɪˈteɪʃən] – n. 1. перайма́ньне *n.*, імітава́ньне *n.* 2. іміта́цыя, падро́бка *f.*
– adj. несапра́ўдны, шту́чны, ненатура́льны: ***imitation pearls*** шту́чныя пэ́рлы

imitative [ˈɪməteɪtɪv] adj. 1. перайма́льны, імітацыйны. 2. несапра́ўдны, падро́блены

immaculate [ɪˈmækjələt] adj. 1. незапля́млены, чысьцю́сенькі, чысьцю́ткі. 2. бязгрэ́шны, чы́сты. 3. Biol. няпля́місты. 4. беззага́нны, бездако́рны

immanent [ˈɪmənənt] adj. нутраны́, імане́нтны

immaterial [ˌɪməˈtɪriəl] adj. 1. нява́жны, неістóтны; нязна́чны (*памы́лка*). 2. нематэрыя́льны, нярэ́чыўны, духо́ўны

immature [ˌɪməˈtʊr] adj. нястáлы; нясьпе́лы (*ро́зум*)

immaturity [ˌɪməˈtʊrəti] n. нястáласьць, нясьпе́ласьць *f.*

immeasurable [ɪˌmeʒərəbəl] adj. нязьме́рны, невыме́рны, непаме́рны, бязьме́жны: ***immeasurable faith*** нязьме́рная ве́ра

immeasurably [ɪˌmeʒərəbli] adv. нязьме́рна, непаме́рна, бязьме́жна

immediacy [ɪˈmi:diəsi] n., pl **-ies** 1. безадкла́днасьць *f.* 2. беспасярэ́днасьць *f.*

immediate [ɪˈmi:diət] adj. 1. неадкла́дны (*адка́з*). 2. непасрэ́дны, беспасярэ́дні (*канта́кт, сутыкне́ньне*); про́сты: ***the immediate result*** беспасярэ́дні вы́нік. 3. бліскі, найбліжэ́йшы (*сусе́д*). 4. цяпе́рашні

immediately [ɪˌmi:diətli] – adv. 1. неадкла́дна, за́раз жа. 2. непасрэ́дна, беспасрэ́дна; про́ста; по́бач
– conj. як то́лькі

immemorial [ˌɪməˈmɔːrɪəl] adj. незапа́мятны, незапо́мны; спрадве́чны, да́ўны, да́ўні: ***from time immemorial*** спако́н вяко́ў

immense [ɪˈmens] adj. 1. вялі́зны, велічэ́зны, бяскра́йні, неабсяжны. 2. Informal ве́льмі до́бры, даскана́лы

immensely [ɪˈmensli] adv. надзвыча́йна, надзвы́чай; бязьме́рна, непаме́рна, на́дта

immensity [ɪˈmensəti] n., pl. **-ties** 1. ве́ліч *f.*, неабсяжны абша́р. 2. вялі́кая ко́лькасьць. 3. бяско́нцасьць, бязме́жнасьць *f.*

immerse [ɪˈmɜːrs] v.t. 1. акуна́ць (*у ва́дкасьць*). 2. акуна́ць у ваду́ (*пры хрышчэ́ньні*). 3. захапля́ць; паглына́ць: ***immersed in thought*** паглы́блены ў ду́мкі: ***immersed in debt(s)*** загра́злы ў даўга́х

immigrant [ˈɪmɪgrənt] – n. імігра́нт -а *m.* – adj. які́ імігру́е, перасяля́ецца

immigrate [ˈɪmɪgreɪt] v.i. іміграва́ць, перасяля́цца

immigration [ˌɪmɪˈgreɪʃən] n. 1. імігра́цыя *f.*, перасяле́ньне *n.* 2. імігра́нты, перасяле́нцы *pl.*

imminence [ˈɪmɪnəns] n. 1. блі́зкасьць *f.*, набліжэ́ньне *n.* 2. наві́слае зло, небясьпе́ка

imminent [ˈɪmɪnənt] adj. 1. бліскі, надыхо́дзячы; які́ набліжа́ецца; няўхі́льны 2. навіслы (*пра небясьпе́ку*)

immobile [ɪˈmoʊbəl] adj. 1. нерухо́мы, мо́цна прымацава́ны. 2. нерухавы (*чалаве́к*). 3. нязьме́нны

immobility [ˌɪmoʊˈbɪləti] n. 1. нерухо́масьць *f.* 2. нерухава́сьць *f.*

immobilize [ɪˈmoʊbəlaɪz] v.t. 1. рабі́ць нерухо́мым. 2. Med. бра́ць у шы́ны (*зламану́ю нагу́*)

immoderate [ɪˈmɑːdərət] adj. 1. неўмеркава́ны (*пра чалаве́ка*); празьме́рны, кра́йні. 2. нястры́маны, нестрыма́ны (*сьмех, сі́ла*)

immodest [ɪˈmɑːdɪst] adj. 1. нясьці́плы, няскро́мны; бесцырымо́нны, наха́бны. 2. непрысто́йны, недаліка́тны

immodesty [ɪˈmɑːdəsti] n. 1. няскро́мнасьць, нясьці́пласьць, нетакто́ўнасьць *f.* 2. непрысто́йнасьць, недаліка́тнасьць *f.*

immoral [ɪˈmɔːrəl] adj. 1. амара́льны. 2. разбэ́шчаны, распу́сны

immorality [ˌɪməˈræləti] n., pl. **-ties** 1. амара́льнасьць *f.* 2. распу́снасьць, разбэ́шчанасьць *f.* 3. амара́льны ўчы́нак, амара́льнае жыцьцё

immortal [ɪˈmɔːrtəl] – adj. несьмяро́тны, неўміру́чы

– n. несьмяро́тны -ага *m.*, несьмяро́тная *f.*

immortality [ˌɪmɔːˈrtæləti] n. 1. несьмяро́тнасьць, неўміру́часьць *f.* 2. ве́чная сла́ва

immovable [ɪˈmuːvəbəl] adj. 1. умацава́ны нерухо́мы, неперасо́ўны. 2. нерухо́мы. 3. непахісны, сто́йкі. 4. нячу́лы, бязьлі́тасны. 5. спако́йны, ціхі́; абыя́кавы

• ***immovables*** нерухо́мая маёмасьць

immovably [ɪˈmuːvəbli] adv. нерухо́ма

immune [ɪˈmjuːn] adj. 1. неўспрыма́льны, адпо́рны, іму́нны. 2. вы́звалены, во́льны

immunity [ɪˈmjuːnəti] n., pl. **-ties** імуні-тэ́т -у *m.* а) неўспрыма́льнасьць, адпо́рнасьць *f.* (*да зараже́ньня хваро́бамі*) б) недатыка́льнасьць *f.*: ***diplomatic immunity*** дыпляматы́чны імунітэ́т

immure [ɪˈmjʊr] v.t. 1. замуро́ўваць умуро́ўваць. 2. садзі́ць (*у вастро́г*) зьняво́льваць. 3. зачыня́ць, трыма́ць у *чым*

immutability [ˌɪmjuːtəˈbɪləti] n. нязьме́ннасьць *f.*

immutable [ɪˈmjuːtəbəl] adj. нязьме́нны

imp [ɪmp] n. 1. нячы́сьцік -а *m.*, чарцяня́ *n.* 2. свавольнік, жэ́ўжык -а *m.*, гарэ́зла -ы *m.* (*пра дзіця́*)

impact [ˈɪmpækt] – n. 1. уда́р -у *m.*, сутыкне́ньне *n.*, калі́зія *f.* 2. уплы́ў -ву *m.*; узьдзе́яньне *n.*

– v. [ɪmˈpækt] 1. мо́цна ўціска́ць. 2. удара́ць. 3. сутыка́цца

impair [ɪmˈper] v.t. 1. шко́дзіць, пагаршáць (*здарóўе*); псавáць. 2. паслабля́ць

impairment [ɪmˈpermənt] n. 1. пагóршаньне, пашко́джаньне *n.* 2. перашко́да *f.*

impalpability [ɪmˌpælpəˈbɪlətɪ] n. неадчувáльнасьць, няўлóўнасьць *f.*

impalpable [ɪmˈpælpəbəl] adj. 1. неадчувáльны (*дóтыкам*). 2. няўлóўны, ледзь прыкмéтны (*рóзьніца*)

imparity [ɪmˈpærətɪ] n. нярóўнасьць *f.*

impart [ɪmˈpɑːrt] v.t. 1. дадавáць, надавáць: ***to impart an air of elegance to*** надáць *чамý* элегáнтны вы́гляд. 2. паведамля́ць, казáць. 3. перадавáць, надавáць

impartial [ɪmˈpɑːrʃəl] adj. бесстарóньні, аб'екты́ўны, справядлі́вы

impartiality [ɪmˌpɑːrʃɪˈælətɪ] n. бесстарóннасьць, аб'екты́ўнасьць *f.*

impartially [ɪmˈpɑːrʃəlɪ] adv. бесстарóнна, аб'екты́ўна

impassable [ɪmˈpæsəbəl] adj. непрахóдны

impasse [ˈɪmpæs] n. 1. тупі́к -á *m.*; безвыхóднае станóвішча. 2. тупі́к -á *m.* (*вýліцы, дарóгі*)

impassibility [ɪmˌpæsəˈbɪlətɪ] n. 1. неадчувáльнасьць *f.* 2. няўрáзьлівасьць *f.*

impassible [ɪmˈpæsəbəl] adj. 1. неадчувáльны 2. няўрáзьлівы 3. абыя́кавы

impassioned [ɪmˈpæʃənd] adj. пáлкі (*пра прамóву*), пóўны запáлу

impassive [ɪmˈpæsɪv] adj. 1. абыя́кавы, апаты́чны. 2. неадчувáльны, непрытóмны: ***The wounded soldier lay as impassive as if he were dead*** Парáнены жаўнéр ляжáў непрытóмны, бы́ццам мёртвы. 3. няўрáзьлівы. 4. безувáжны

impatience [ɪmˈpeɪʃəns] n. нецярплі́васьць *f.*, нецярпéньне *n.* 2. няўсéдлівасьць, няўрымсьлівасьць, неўтаймавáнасьць *f.*

impatient [ɪmˈpeɪʃənt] adj. 1. нецярплі́вы. 2. неспакóйны, імкліві (*пра каня́*), неўтаймавáны

impeach [ɪmˈpiːtʃ] v.t. 1. стáвіць пад сумнéў. 2. абвінавáчваць. 3. абвяшчáць імпі́чмэнт, вінавáціць у злачы́нстве на дзяржáўнай пасáдзе

impeachment [ɪmˈpiːtʃmənt] n. 1. нагáна, ганьбавáньне, абвінавáчаньне *n.* 2. імпі́чмэнт -у *m.*

impeccable [ɪmˈpekəbəl] adj. 1. беззагáнны, бездакóрны. 2. беспамылкóвы, бясхі́бны; бязгрэ́шны

impede [ɪmˈpiːd] v.t. 1. перашкаджáць, замінáць *чамý*. 2. тармазі́ць, запавóльваць (*рух*)

impediment [ɪmˈpedɪmənt] n. 1. перашко́да *f.*, затры́мка *f.* 2. фізы́чны недахóп

impedimenta [ɪmˌpedɪˈmentə] n., pl. перашко́ды

impel [ɪmˈpel] v.t. **(-ll-)** 1. прымушáць, падганя́ць, паганя́ць. 2. рýхаць, пхаць; гнáць, прыганя́ць: ***The wind impelled the boat to shore*** Вéцер прыгнáў чóвен да бéрагу

impellent [ɪmˈpelənt] – adj. пабуджáльны, які́ прымушáе, падахвóчвае; рýхальны

– n. рýхальная, пабуджáльная сі́ла

impend [ɪmˈpend] v.i. 1. набліжáцца, надыхóдзіць. 2. навісáць, пагражáць. 3. зьвісáць, навісáць

impending [ɪmˈpendɪŋ] adj. 1. які́ набліжáецца, надыхóдзіць. 2. пагражáльны. 3. навíслы

impenetrability [ɪmˌpenɪtrəˈbɪlətɪ] n. 1. непрахóднасьць *f.* 2. Phys. непранікáльнасьць *f.*

impenetrable [ɪmˈpenɪtrəbəl] adj. 1. непрахóдны (*лес*); непранікáльны. 2. неўспрымáльны да нóвага (*чалавéк*, *рóзум*). 3. недастýпны (*рóзуму*)

imperative [ɪmˈperətɪv] – adj. неабхóдны; імпэраты́ўны, загáдны

– n. 1. загáд, накáз -у *m.* 2. Gram. загáдны лад

imperceptibility [ˌɪmpərˌseptəˈbɪlətɪ] n. 1. непрыкмéтнасьць *f.* 2. нязнáчнасьць *f.*

imperceptible [ˌɪmpərˈseptəbəl] adj. непрыкмéтны; нязнáчны

imperceptibly [ˌɪmpərˈseptəbli] adv. няўзна́к, непрыкме́тна

imperceptive [ˌɪmpərˈseptɪv] adj. неназіра́льны; неўспрыма́льны (*чыта́ч, пу́бліка*)

imperfect [ɪmˈpɜ:rfɪkt] – adj. 1. недаскана́лы; зь недахо́памі, дэфэкты́ўны. 2. няпо́ўны.
– n. Gram. імпэрфэ́кт -а *m.*

imperfection [ˌɪmpərˈfekʃən] n. 1. недасканáласьць *f.* 2. хíба, загáна *f.*; недахóп -у *m.*; дэфэ́кт -у *m.*

imperfective [ˌɪmpərˈfektɪv] n. Gram. ***imperfective aspect*** незако́нчанае трыва́ньне

imperial [ɪmˈpɪrɪəl] – adj. 1. імпэра́тарскі. 2. імпэ́рскі 3. вялíкасны, ве́лічны; пы́шны, раско́шны
– n. эспаньёлка *f.* (*клінападо́бная баро́дка*)

imperial bushel брытáнскі бу́шаль (*ме́ра ёмістасьці — 36,3 лі́тра*)

imperial gallon брытáнскі галён (*ме́ра ёмістасьці — 4,5 лі́тра*)

imperialism [ɪmˈpɪrɪəˌlɪzəm] n. імпэрыялі́зм -у *m.*

imperialist [ɪmˈpɪrɪəlɪst] – n. імпэрыялíст -а *m.*
– adj. імпэрыялістычны

imperil [ɪmˈperəl] v.t. ста́віць пад небясьпе́ку, ствара́ць небясьпе́ку

imperious [ɪmˈpɪrɪəs] adj. 1. ула́дны, улада́рны, катэгары́чны; пы́хлівы, ганары́сты. 2. неабхо́дны, пі́льны, імпэраты́ўны

imperishability [ɪmˌperɪʃəˈbɪləti] n. 1. непару́шнасьць, ве́чнасьць *f.* 2. трыва́ласьць *f.*

imperishable [ɪmˈperɪʃəbəl] adj. 1. ве́чны, непару́шны; незруйнава́льны. 2. які́ ня псуе́цца

impersonal [ɪmˈpɜ:rsənəl] adj. Gram. безасабо́вы; аб'ектны́ўны, безінтэрэсо́ўны: ***an impersonal verb, sentence*** безасабо́вы дзеяслó́ў, сказ

impersonally [ɪmˈpɜ:rsənəli] adv. безасабо́ва

impersonate [ɪmˈpɜ:rsəneɪt] v.t. 1. увасабля́ць. 2. адыгрываць ро́лю. 3. выдава́ць сябе́ за кагó íншага; імітава́ць

impersonation [ɪmˌpɜ:rsənˈeɪʃən] n. 1. імітáцыя *f.*, падрабля́ньне пад кагó-н. 2. увасабле́ньне *n.*, пэрсаніфіка́цыя *f.*; тып -у *m.*

impertinence [ɪmˈpɜ:rtənəns] n. 1. наха́бнасьць *f.*; наха́бства *n.*, бесцырымо́нна-сьць *f.* 2. наха́бны ўчы́нак, наха́бныя сло́вы. 3. недарэ́чнасьць, непашáна *f.*

impertinent [ɪmˈpɜ:rtənənt] adj. 1. грубія́нскі, непачцíвы, наха́бна-задзíрлівы; наха́бны. 2. недарэ́чны, няслу́шны

imperturbability [ˌɪmpərˌtɜ:rbəˈbɪləti] n. спако́йнасьць, абыя́кавасьць, непару́шнасьць *f.*

imperturbable [ˌɪmpərˈtɜ:rbəbəl] adj. 1. непару́шны (*пра спако́й*). 2. спако́йны

impervious [ɪmˈpɜ:rvɪəs] adj. 1. непранікáльны, непрапушча́льны (*пра матэрыя́л*). 2. абыя́кавы, глухí (*да до́вадаў ці пара́ды*)

impetuous [ɪmˈpetʃuəs] adj. 1. імпэ́тны, няўпы́нны, нестрыма́ны. 2. па́лкі, гара́чы, безразва́жны, парывісты

impetuously [ɪmˈpetʃuəsli] adv. 1. імпэ́тна, няўпы́нна. 2. парывíста, безразва́жна

impetus [ˈɪmpətəs] n., pl. **-tuses** 1. імпэ́т, разго́н -у *m.*; парывíстасьць *f.* 2. ру́хаючая сíла; пабуджэ́ньне *n.*. штурш|о́к -ка́ *m.*, сты́мул -у *m.*

impious [ˈɪmpɪəs] adj. 1. бязбо́жны, бязбо́жніцкі. 2. пага́нскі. 3. нядо́бры, грэ́шны

impish [ˈɪmpɪʃ] adj. як чарцяня́, гульлíвы, непасе́длівы, гарэ́зьлівы

implacable [ɪmˈplækəbəl] adj. непрымірымы, няўмóльны (*во́раг, нянáвісьць*)

implant [ɪmˈplænt] – v.t. 1. усяля́ць, увóдзіць, укараня́ць (*ідэ́і*). 2. устаўля́ць (*зу́бы*). 3. садзíць . 4. перасáджваць жыву́ю тка́нку
– n. [ˈɪmplænt] перасáджаная жывáя тка́нка

implement [ˈɪmplɪmənt] – n. 1. прыла́да *f.*; *coll.* прыла́дзьдзе *n.*; інструме́нт -а *m.* 2. сро́дак для дасягне́ньня чаго́-н. – v.t. 1. выко́нваць, ажыццяўля́ць, укараня́ць, уво́дзіць у жыццё. 2. забясьпе́чваць прыла́дамі *або́* і́ншымі сро́дкамі

implementation [ˌɪmplɪmənˈteɪʃən] n. 1. ажыццяўле́ньне, выкана́ньне, увядзе́ньне *n.*

implicate [ˈɪmplɪkeɪt] v.t. ублы́тваць, уме́шваць, уця́гваць

implication [ˌɪmplɪˈkeɪʃən] n. 1. ублы́таньне, умяша́ньне *n.* 2. заме́шанасьць, ублы́танасьць *f.*, саўдзе́л -у *m.* 3. схава́ны сэнс, намёк -у *m.*

implicit [ɪmˈplɪsɪt] adj. 1. безумо́ўны, абсалю́тны. 2. схава́ны, падразумява́ны, недасказа́ны

implicitly [ˈɪmplɪsɪtli] adv. 1. безумо́ўна. 2. прыхава́на

implore [ɪmˈplɔːr] v.t. умо́льваць, малі́ць; прасі́ць, упро́шваць

imploring [ɪmˈplɔːrɪŋ] adj. умо́льны, упраша́льны

implioringly [ɪmˈplɔːrɪŋli] adv. умо́льна

imply [ɪmˈplaɪ] v.t. намяка́ць, нага́дваць; пака́зваць, азнача́ць, дава́ць зразуме́ць

impolite [ˌɪmpəˈlaɪt] adj. няве́тлівы, грубія́нскі

impolitely [ˌɪmpəˈlaɪtli] adv. няве́тліва

imponderable [ɪmˈpɑːndərəbəl] – adj. 1. бязва́жкі. 2. няўло́ўны
– n. (*ча́ста* pl.) не́шта няўло́ўнае; невыме́рнае, неспасьці́жнае *n.*

import – v.t. [ɪmˈpɔːrt] 1. уво́зіць, прывозіць (*тава́ры*), імпартава́ць. 2. азнача́ць, зна́чыць: ***Her words imported a change of attitude*** Я́е сло́вы азнача́лі зьме́ну ста́ўленьня. 3. быць ва́жным, мець значэ́ньне
– n. [ˈɪmpɔːrt] 1. уво́з, і́мпарт -у *m.* 2. значэ́ньне *n.*, сэнс -у *m.* 3. ва́жнасьць *f.*

importance [ɪmˈpɔːrtəns] n. ва́жнасьць, зна́чнасьць, вага́ *f.*

important [ɪmˈpɔːrtənt] adj. ва́жны (*спра́ва, асо́ба*): уплыво́вы, аўтарытэ́тны

importation [ˌɪmpɔːrˈteɪʃən] n.1. уво́з (*тава́раў*), імпартава́ньне *n.* 2. імпартава́ная рэч, і́мпарт -у *m.*

importunate [ɪmˈpɔːrtʃənət] adj. 1. даку́члівы, неадчэ́пны, назо́льны. 2. насто́йлівы

importune [ˌɪmpərˈtuːn] v.t. дакуча́ць про́сьбамі, дамага́ньнямі; назаля́ць, неадчэ́пна прасі́ць

importunity [ˌɪmpərˈtuːnəti] n., pl. **-ties** 1. насто́йлівасьць (*у дамага́ньнях*). 2. дакучлівасьць (*про́сьбамі*); неадчэпнасьць *f.*

impose [ɪmˈpouz] v. 1. навя́зваць, набіва́ць (*на знаёмства*). 2. абкладаць (*пада́ткамі, штра́фамі*). 3. падсо́ўваць па-ашука́нску
• ***impose on*** or ***upon*** а) выкарыстоўваць *каго́-што.* б) ашу́кваць; махлява́ць

imposing [ɪmˈpouzɪŋ] adj. ве́лічны, ва́жны з вы́гляду, імпаза́нтны

impossibility [ɪmˌpɑːsəˈbɪləti] n., pl. **-ties** 1. немагчы́масьць *f.* 2. немагчы́мае *n.*

impossible [ɪmˈpɑːsəbəl] – adj. 1. немагчы́мы, невыкана́льны. 2. непраўдападо́бны. 3. нясьце́рпны, немагчы́мы (*боль, гарачыня́*)
– n. немагчы́мае *n.*

impostor or **imposter** [ɪmˈpɑːstər] n. 1. самазва́нец -ца *m.*, самазва́нка *f.* 2. ашука́нец -ца *m.*

imposture [ɪmˈpɑːstʃər] n. ашука́нства, круце́льства *n.*

impotence [ˈɪmpətəns] or **impotency** [-si] n. бясьсі́льле *n.*, імпатэ́нцыя *f.*; бездапамо́жнасьць *f.*

impotent [ˈɪmpətənt] adj. 1. бясьсі́льны; беспара́дны, бездапамо́жны. 2. імпатэ́нтны

impound [ɪmˈpaʊnd] v.t. 1. заганя́ць (*жывёлу ў за́гарадзь*), замыка́ць 2. забіра́ць, канфіскава́ць. 3. запру́джваць, зага́чваць (*ваду́*)

impoverish [ɪmˈpɑːvərɪʃ] v.t. 1. давóдзіць да бе́днасьці. 2. спусташа́ць (*гле́бу*) 3. абядня́ць, зьбядня́ць; рабіць неці-ка́вым

impower [ɪmˈpaʊr] v.t. *гл.* **empower**

impracticable [ɪmˈpræktɪkəbəl] adj. 1. невыканáльны, незьдзяйсьняльны. 2. непадáтлівы, упáрты. 3. непрыдáтны для ўжывáньня

impractical [ɪmˈpræktɪkəl] adj. непрактычны; мáлапрыдáтны

imprecate [ˈɪmprəkeɪt] v.t. 1. наклікáць (*бядý, няшчáсьце*). 2. праклінáць

imprecation [ˌɪmprɪˈkeɪʃən] n. 1. наклікáньне (*бяды́, няшчáсьця*). 2. праклён -у *m.*

impregnable [ɪmˈpregnəbəl] adj. 1. непрыступны, дóбра ўмацавáны (*пра цьвярдыню*). 2. непахíсны (*пра вéру*)

impregnate [ɪmˈpregneɪt] – v.t. 1. апладняць. 2. насычáць; прасякáць. 3. абуджáць, выклікáць (*дýмкі*); натхняць

impress I [ɪmˈpres] – v.t. 1. рабíць урáжаньне, урáжваць. 2. замацóўваць (*у пáмяці*). 3. адбівáць, адціскáць, штэмплявáць. 4. націскáць на *што*

– n. [ˈɪmpres] 1. адбíтак -ка *m.*; знак -у *m.* 2. штэмпель -я *m.* (*адбíтак*) 3. урáжаньне *n.*

impress II [ɪmˈpres] – v.t. 1. рэквізавáць. 2. сíлай, прымýсам вэрбавáць (*у вóйска*)

– n. 1. рэквізы́цыя *f.* 2. прымусóвая вэрбóўка

impression [ɪmˈpreʃən] n. 1. а) урáжаньне *n.* б) уплы́ў -ву, эфэ́кт -у *m.*: ***to be under the impression that ...*** мець урáжаньне, што ... 2. адбíтак -ка *m.*; сьлед -у *m.* 3. друк -у *m.*, друкавáньне *n.*; цісьнéньне *n.* (*рэльéфны адбíтак*)

impressionable [ɪmˈpreʃənəbəl] adj. успрымáльны, урáзьлівы

impressive [ɪmˈpresɪv] adj. уражáльны, імпазáнтны

imprint [ˈɪmprɪnt] – n. 1. адбíтак -ка *m.* (*пáльцаў*), сьлед -у *m.*: ***the imprint of sufferings*** сьлед цярпéньняў. 3. выхадны́я зьвéсткі (*у кнíзе*)

– v.t. [ɪmˈprɪnt]1. штэмплявáць (*лíсты́, пасы́лкі*). 2. пакідáць адбíтак (*у пáмяці, душы́*), урэ́звацца, западáць (*у пáмяць*)

imprison [ɪmˈprɪzən] v.t. 1. садзíць у астрóг (*турмý*), трымáць у астрóзе, зьнявóльваць. 2. трымáць, не дазвaляць выхóдзіць

imprisonment [ɪmˈprɪzənmənt] n. зьнявóленьне *n.*

improbability [ɪmˌprɑːbəˈbɪləti] n., pl. **-ties** 1. непраўдападóбнасьць *f.* 2. непраўдападóбнае *n.*

improbable [ɪmˈprɑːbəbəl] adj. непраўдападóбны; невераго́дны

impromptu [ɪmˈprɑːmptuː] – adv. 1. адрáзу, без падрыхтóўкі, экспрóмтам

– adj. імправізавáны

– n. экспрóмт -у *m.*, імправізáцыя *f.*

improper [ɪmˈprɑːpər] adj. 1. няправíльны, памылкóвы. 2. неадпавéдны. 3. непрыстóйны, неналéжны

• ***improper fraction*** няправíльны дроб

impropriety [ˌɪmprəˈpraɪəti] n., pl. **-ties** 1. неадпавéднасьць *f.* 2. непрыстóйнасьць, непрыстóйныя павóдзіны. 3. няправíльны ўчы́нак; няправíльны вы́раз; памы́лка *f.*

improve [ɪmˈpruːv] v. 1. паляпшáць, -ца; рабíць, унóсіць палéпшаньні: ***to improve in one's health*** папраўля́цца. 2. павышáць вáртасьць (*маёмасьці*)

improvement [ɪmˈpruːvmənt] n. 1. палéпшаньне, паляпшэ́ньне *n.* 2. павышэ́ньне вáртасьці. 3. лéпшыя абставíны; пóступ -у *m.*

improvidence [ɪmˈprɑːvɪdəns] n. непрадбáчлівасьць, неабáчлівасьць *f.*; марнатрáўства *n.*

improvident [ɪmˈprɑːvɪdənt] adj. непрадбáчлівы, неабáчлівы; негаспадáрны; марнатрáўны

improving [ɪmˈpruːvɪŋ] adj. які́ паляпшáе, паляпшáльны

improvisation [ɪmˌprɑːvəˈzeɪʃən] n. імправізáцыя *f.*

improvise [ˈɪmprəvaɪz] v.t. імправізавáць

imprudence [ɪmˈpruːdəns] n. неразýмнасьць, неразважнасьць *f.*; неразýмны ўчы́нак, неразýмныя павóдзіны

imprudent [ɪmˈpruːdənt] adj. неразýмны, неразважны, неразважлівы; неасьцярóжны

impudence [ˈɪmpjədəns] or **impudency** [-si] n. бессаро́мнасьць, нясьці́пласьць *f.*; разьвя́знасьць *f.*, наха́бства *n.*

impudent [ˈɪmpjədənt] adj. бессаро́мны, нясьці́плы; наха́бны: ***impudent lie*** бессаро́мная мана́

impugn [ɪmˈpju:n] v.t. аспро́чваць; ста́віць пад сумне́ў

impugnable [ɪmˈpju:nəbəl] adj. спро́чны, няпэ́ўны

impulse [ˈɪmpʌls] n. 1. штурш|о́к -ка́ *m.*; пабуджа́льная прычы́на, сты́мул -у *m.* 2. пары́лў -ву, і́мпульс -у *m.*: ***to act on impulse*** дзе́яць імпульсі́ўна 3. Informal падгаво́рваньне, падбухто́рваньне *n.*

impulsive [ɪmˈpʌlsɪv] adj. імпульсі́ўны, узбуджа́льны

impunity [ɪmˈpju:nəti] n. бяскара́насьць, беспакара́насьць *f.*: ***with impunity*** бяскара́на, беспакара́на

impure [ɪmˈpjʊr] adj. 1. нячы́сты; бру́дны. 2. неаднаро́дны

impurity [ɪmˈpjʊrəti] n., pl. **-ties** нячы́стасьць *f.*

• ***impurities*** нечысто́ты *pl.*, забру́дненьне *n.*

imputation [ˌɪmpjəˈteɪʃən] n. 1. ста́ўленьне ў віну́. 2. за́кід -у *m.*; абвінава́чаньне ў чым-н.

impute [ɪmˈpju:t] v.t. ста́віць у віну́, абвінава́чваць, вінава́ціць

in [ɪn] – prep. 1. у, на (*пры азначэ́ньні ме́сца*), а) *на пыта́ньне «дзе?»*: ***in Belarus*** у Белару́сі; ***in the street*** на ву́ліцы. б) *на пыта́ньне «куды́?»*: ***Go in the house*** Ідзі́ ў ха́ту. в) *на пыта́ньне «у чым?»*: ***in hot water*** у пераплёце, у цяжкі́м стано́вішчы. 2. у, за (*пры азначэ́ньні ча́су*), а) ***in March*** у сакавіку́; ***in a week*** праз ты́дзень; ***in two hours*** празь дзьве гадзі́ны; ***in the morning (evening)*** ура́ньні, зра́нку (уве́чары, уве́чар) 3. з: ***a dress in silk*** суке́нка з шо́ўку; ***one in a hundred*** адзі́н з со́тні. 4. у ча́се, падча́с, калі́: ***in crossing the street*** падча́с перахо́ду ву́ліцы – n. ***ins*** лю́дзі на ва́жных паса́дах, пры ўла́дзе

• ***come in*** увахо́дзіць, увайсьці́

• ***Count me in*** Залічы́ й мяне́

• ***in memory*** у па́мяць

• ***ins and outs*** (*ве́даць*) хады́ й выхады

• ***stay in*** быць до́ма

• ***We are in for a storm*** Напэ́ўна бу́дзе навальні́ца.

inability [ˌɪnəˈbɪləti] n. няздо́льнасьць, няздо́лтнасьць; немагчы́масьць *f.*

inaccessibility [ˌɪnəkˌsesəˈbɪləti] n. 1. недасту́пнасьць, непрысту́пнасьць *f.* 2. недасяга́льнасьць, недася́жнасьць *f.*

inaccessible [ˌɪnəkˈsesəbəl] adj. 1. недасту́пны, непрысту́пны. 2. недася́жны, недасяга́льны

inaccuracy [ɪnˈækjərəsi] n., pl. **-cies** 1. недакла́днасць *f.* 2. памы́лка *f.*

inaccurate [ɪˈnækjərət] adj. недакла́дны, з памы́лкамі; неакура́тны

inaction [ɪnˈækʃən] n. бязьдзе́йнасьць, незаня́тасьць *f.*

inactivate [ɪnˈæktɪveɪt] v.t. абязьдзе́йваць

inactive [ɪnˈæktɪv] adj. 1. бязьдзе́йны, пасі́ўны. 2. без заня́тку; мля́вы, які́ ма́ла ру́хаецца (*пра чалаве́ка*)

inactivity [ˌɪnækˈtɪvəti] n. 1. бязьдзе́йнасьць *f.* 2. мля́васьць *f.*

inadaptability [ˌɪnəˌdæptəˈbɪləti] n. непрыстасава́насьць *f.*

inadaptable [ˌɪnəˈdæptəbəl] adj. непрыстасава́льны; няздо́льны прыстасава́цца

inadequate [ɪnˈædɪkwət] adj. недастатко́вы, неадпаве́дны, неадэква́тны

inadmissible [ˌɪnədˈmɪsəbəl] adj. недапушча́льны; яко́га не́льга прыня́ць

inadvertence [ˌɪnədˈvɜ:rtəns] n. 1. няўва́га *f.* 2. недагля́д -у *m.*, памы́лка *f.*

inadvertent [ˌɪnədˈvɜ:rtənt] adj. 1. ненаўмы́сны; выпадко́вы. 2. няўва́жны, нядба́йны; неасьцяро́жны

inalienable [ɪˈneɪliənəbəl] adj. неад'е́мны, неадчужа́льны

inalienably [ɪˈneɪliənəbli] adv. неад'е́мна, неадчужа́льна

inalterability [ˌɪnˌɔ:ltərəˈbɪləti] n. нязьме́ннасьць *f.*

inalterable [ˌɪnˈɔ:ltərəbəl] adj. нязьме́нны, незьмяня́льны

inane [ɪˈneɪn] adj. 1. неразу́мны. бессэнсо́ўны, недарэ́чны. 2. пусты́; паро́жні

inanimate [ɪnˈænɪmət] adj. 1. неажы́ўлены; нежывы́. 2. непрыто́мны. 3. ну́дны, неціка́вы, пазба́ўлены жыцьця́

inanity [ɪˈnænəti] n., pl. **-ties** 1. дурно́та, ду́расьць, неразу́мнасьць *f.*, духо́ўная пусто́та *f.* 2. глу́пства *n.* 3. пу́стасьць *f.*

inapplicable [ɪnˈæplɪkəbəl] adj. непрыда́тны, неадпаве́дны

inappreciable [ˌɪnəˈpriʃiəbəl] adj. 1. непрыкме́тны, нязна́чны; няўло́ўны; ве́льмі малы́. 2. Obsol. неацэ́нны; бясцэ́нны

inappreciation [ˌɪnəˌpriʃiˈeɪʃən] n. недаацэ́нка *f.*

inappreciative [ˌɪnəˈpriʃiətɪv] adj. няўдзя́чны

inapprehensible [ˌɪnəprɪˈhensəbəl] adj. недасту́пны для ро́зуму; незразуме́лы

inapproachable [ˌɪnəˈproʊtʃəbəl] adj. недасту́пны, непрыступны; недася́жны

inappropriate [ˌɪnəˈproʊpriət] adj. неадпаве́дны; недарэ́чны, не да ме́сца

inapt [ɪnˈæpt] adj. 1. неадпаве́дны; непрыго́дны, непрыда́тны. 2. няўме́лы, нязда́тны; нездо́льны

inaptitude [ɪnˈæptətu:d] n. 1. нязда́тнасьць *f.*, няўме́ньне *n.* 2. неадпаве́днасьць, непрыда́тнасьць *f.*

inarticulate [ˌɪnɑ:rˈtɪkjələt] adj. 1. невыра́зны, няўця́мны. 2. нездо́льны выка́звацца. 3. Zool. нясучле́нены

inasmuch as [ˌɪnəzˈmʌtʃ] 1. таму́ што. 2. пако́лькі

inattention [ˌɪnəˈtenʃən] n. няўва́га, няўва́жлівасьць *f.*; нядба́льства, нядба́йства *n.*

inattentive [ˌɪnəˈtentɪv] adj. няўва́жлівы (*ву́чань*), нядба́лы

inaudible [ɪˈnɔ:dəbəl] adj. нячу́тны, ве́льмі ціхі́

inaudibly [ɪˈnɔ:dəbli] adv. нячу́тна

inaugural [ɪˈnɔ:gjərəl] adj. уступны́, інаўгурацы́йны: ***inaugural address*** прамо́ва пры ўступле́ньні на паса́ду

inaugurate [ɪˈnɔ:gjəreɪt] v.t. 1. урачы́ста ўво́дзіць на паса́ду (*прэзыдэ́нта*). 2. урачы́ста адкрыва́ць, пачына́ць

inauguration [ɪˌnɔ:gjəˈreɪʃən] n. 1. а) урачы́стае ўступле́ньне на паса́ду. б) урачы́стае адкрыцьцё, адчыне́ньне *n.*, інаўгура́цыя *f.* 2. пача́так -ку *m.*

inauspicious [ˌɪnɔ:ˈspɪʃəs] adj. неспрыя́льны, злаве́сны; нешчасьлі́вы

inborn [ˌɪnˈbɔ:rn] adj. прыро́джаны, прыро́дны; натура́льны

inbred [ˌɪnˈbred] – adj. 1. прыро́джаны, глы́бака ўкарэ́нены. 2. вы́ведзены ад бліз́ка параднёных

– v.t. выво́дзіць ад бліз́ка параднёнай жывёлы *або́* расьліны

incalculable [ɪnˈkælkjələbəl] adj. 1. незьлічо́ны, шматлі́кі. 2. непрадба́чаны, неспадзява́ны. 3. няпэ́ўны, ненадзе́йны

incandescent [ˌɪnkænˈdesənt] adj. 1. распа́лены, гара́чы; напа́лены дачы́рвана. 2. ве́льмі сьве́тлы, зы́ркі, я́ркі

incapable [ɪnˈkeɪpəbəl] adj. 1. нездо́льны; нязда́тны: ***incapable of lying*** нездо́льны да маны́. 2. неправаздо́льны

incapacitate [ˌɪnkəˈpæsɪteɪt] v.t. 1. пазбаўля́ць здо́льнасьці, сі́лы *або́* прыда́тнасьці; рабі́ць нездо́льным. 2. пазбаўля́ць пра́ва

incapacity [ˌɪnkəˈpæsəti] n, pl. **-ties** 1. нездо́льнасьць *f.*, бясьсі́льле *n.*, бездапамо́жнасьць *f.* 2. неправаздо́льнасьць *f.*

incarnate [ɪnˈkɑ:rnət] – adj. 1. увасо́блены, ажыцьцёўлены

– v.t. 1. [ɪnˈkɑ:rneɪt] увасабля́ць. 2. ажыцьцяўля́ць. 3. быць увасабле́ннем

incarnation [ˌɪnkɑ:rˈneɪʃən] n. увасабле́ньне *n.*

incautious [ɪnˈkɔ:ʃəs] adj. неасьцяро́жны; неразва́жлівы; неабду́маны

incendiary [ɪnˈsendieri] – adj. 1. які́ падпа́львае. 2. запа́льны (*снара́д*). 3. які́

падбухто́рвае або́ се́е варо́жасьць, падбухто́рніцкі
– n., pl. **-aries** 1. падпа́льнік -а *m.*, падпа́льніца *f.* 2. падбухто́рнік -а *m.*, падбухто́рніца *f.* 3. запа́льная бо́мба *або́* снара́д

incense I [ˈɪnsens] – n. 1. ла́дан -у *m.*, фімія́м -у *m.* 2. узьнёслая пахвала́
– v.i. кадзі́ць; куры́ць фімія́м, ліслі́ва ўсхваля́ць

incense II [ɪnˈsens] v.t. злава́ць, абура́ць

incentive [ɪnˈsentɪv] – n. 1. сты́мул -у *m.*, пабуджа́льная прычы́на, штуршо́к -ка́ *m.*, пабуджэ́ньне *n.*
– adj. пабуджа́льны, які́ пабуджа́е, заахво́чвае

inception [ɪnˈsepʃən] n. пача́так -ку *m.*, пачына́ньне *n.*

inceptive [ɪnˈseptɪv] adj. пачатко́вы, першапачатко́вы, спача́тны

incertitude [ɪnˈsɜ:rtətu:d] n. 1. няпэ́ўнасьць *f.*; сумне́ньне *n.*, сумне́лъ -ву *m.*; вага́ньне, хіста́ньне *n.* 2. няпэ́ўнае *або́* небясьпе́чнае стано́вішча, ненадзе́йнасьць *f.*

incessant [ɪnˈsesənt] adj. безупы́нны, ця́глы; несьціха́ны (*пра дождж*)

incessantly [ɪnˈsesəntli] adv. несьціха́на, безупы́нна

inch [ɪntʃ] n. 1. ца́ля *f.* (*2,54 см*). 2. ве́льмі мала́я ча́стка, велічыня́
• ***by inches*** пама́лу, пакрысе́, паступо́ва, ма́ла-пама́лу
• ***inch by inch*** паво́лі, ма́ла-пама́лу

incidence [ˈɪnsɪdəns] n. 1. ахо́п -у *m.* 2. абся́г дзе́яньня, пашырэ́ньня. 3. па́даньне *n.* 3. Phys. ***angle of incidence*** кут падзе́ньня (*про́мняў сьвятла́*)

incident [ˈɪnsɪdənt] – n. 1. здарэ́ньне *n.*, інцыдэ́нт -у *m.*, вы́падлак -ку *m.* 2. эпізо́д -у *m.*; сцэ́на *f.*, фрагмэ́нт -а *m.*
– adj. 1. уласьці́вы; выпадко́вы. 2. які́ па́дае: ***rays of light incident upon a mirror*** про́мні сьвятла́, якія па́даюць на люстэ́рка

incidental [ˌɪnsɪˈdentəl] – adj. 1. малава́жны: ***incidental details*** малава́жныя падрабя́знасьці. 2. выпадко́вы: ***an incidental encounter with an old friend*** выпадко́вая сустрэ́ча з стары́м ся́брам. 3. пабо́чны (*пра ко́шты, выда́ткі*)
– n. не́шта пабо́чнае, другара́днага значэ́ньня
• ***incidental to*** а) уласьці́вы *чаму́*. б) зьвя́заны з *чым*

incidentals пабо́чныя выда́ткі

incidentally [ˌɪnsɪˈdentəli] adv. 1. між і́ншым, дарэ́чы. 2. выпа́дкам, выпадко́ва

incinerate [ɪnˈsɪnəreɪt] v.t. спа́льваць (*на по́пел*), спапаля́ць

incineration [ɪnˌsɪnəˈreɪʃən] n. спа́льваньне, спапале́ньне *n.*; крэма́цыя *f.*

incinerator [ɪnˈsɪnəreɪtər] n. 1. печ для спа́льваньня сьме́цьця. 2. печ для крэма́цыі

incipience [ɪnˈsɪpiəns] or **incipiency** [ɪnˈsɪpiənsi] n., pl. **-cies** зача́так -ку *m.*; пачатко́вая ста́дыя

incipient [ɪnˈsɪpiənt] adj. які́ пачына́ецца, у пачатко́вай ста́дыі

incise [ɪnˈsaɪz] v.t. 1. выраза́ць, выкрэ́сьліваць. 2. рабі́ць разьбу́, выраза́ць гравю́ру

incision [ɪnˈsɪʒən] n. 1. разрэ́з, нарэ́з -у *m.* 2. нарэ́званьне *n.*, нарэ́зка *f.*

incisive [ɪnˈsaɪsɪv] adj. прані́клівы; во́стры (*кры́тыка, стыль*), рэ́зкі

incisor [ɪnˈsaɪzər] n. разле́ц -ца́ (*зуб*) *m.*

incite [ɪnˈsaɪt] v.t. пабуджа́ць, падахво́чваць; схіля́ць, стымулява́ць; падвуча́ць; падбухто́рваць, намаўля́ць: ***He incited her to do this*** Ён падбухто́рыў яе́ зрабі́ць гэ́та

incitement [ɪnˈsaɪtmənt] n. 1. сты́мул -у *m.*, пабуджа́льная прычы́на. 2. падбухто́рваньне, заахво́чваньне, стымулява́ньне *n.*

incivility [ˌɪnsəˈvɪləti] n., pl. **-ties** 1. непачці́васьць, недаліка́тнасьць, няве́тлівасьць *f.* 2. грубія́нства *n.*, непава́га *f.*

inclement [ɪnˈklemənt] adj. 1. суро́вы, бу́рны (*пра надво́р'е, кліма́т*). 2. неміасэ́рны; стро́гі, суро́вы, лю́ты (*улада́р*)

inclination [ˌɪnklɪˈneɪʃən] n. 1. схі́льнасьць *f.*, нахі́л -у *m.* 2. ахво́та, ця́га *f.*: ***inclination for music*** схі́льнасьць да му́зыкі. 3. схіле́ньне *n.* (*галавы́*), 4. схіл, спад -у *m.* (*да́ху*), схон -у *m.*

incline [ɪnˈklaɪn] – v.i. 1. быць схі́льным, гато́вым да *чаго́*: ***I am inclined to think ...*** Я схі́льны ду́маць ... 2. схіля́цца, нахіля́цца, нахіна́цца. 3. спада́ць, быць спа́дзістым
– v.t. 1. прыхіля́ць, перако́нваць. 2. схіля́ць, нагіна́ць (*галаву́*). 3. нахіля́ць, рабі́ць нахі́леным
– n. [ˈɪnklaɪn] схон, схіл -у *m.* (*гары́*), спад -у *m.* (*да́ху*); спа́дзістая паве́рхня

inclined [ɪnˈklaɪnd] adj. 1. схі́льны, гато́вы: ***to feel inclined*** быць схі́льным, мець ахво́ту. 2. спа́дзісты, нахі́лены; ко́сы, касы́; пад кутом: ***inclined plane*** нахі́льная ро́ўніца

include [ɪnˈklu:d] v.t. 1. зьмяшча́ць у сабе́, займа́ць. 2. улуча́ць, улі́ча́ць: ***The price includes both house and furniture*** У цану́ ўлу́чаны дом і мэ́бля

including [ɪnˈklu:dɪŋ] prep. улу́чна, у тым лі́ку

inclusion [ɪnˈklu:ʒən] n. 1. улучэ́ньне *n.* 2. далучэ́ньне *n.*

inclusive [ɪnˈklu:sɪv] adj. 1. які́ ўлуча́е, зьмяшча́е ў сабе́. 2. які́ ахапля́е ўсё, усеагу́льны

incognito [ˌɪnkɑ:gˈni:toʊ] – adj., adv. інко́гніта, скры́та, та́йна
– n. інко́гніта

incognizable [ɪnˈkɑ:gnɪzəbəl] adj. непазнава́льны, недасту́пны пазна́ньню, які́ ця́жка пазна́ць

incoherence [ˌɪnkoʊˈhɪrəns] or **incoherency** [ˌɪnkoʊˈhɪrənsi] n. 1. няскла́днасьць, нязьвя́знасьць; бязла́днасьць *f.* 2. непасьлядо́ўнасьць *f.* 3. нястача злу́чнасьці, адзі́нства

incoherent [ˌɪnkoʊˈhɪrənt] adj. 1. разьдна́ны, пазба́ўлены адзі́нства. 2. нязьвя́зны, няскла́дны, бязла́дны

incombustible [ˌɪnkəmˈbʌstəbəl] – adj. незгара́льны; во́гнетрыва́лы
– n. неўзгара́льнае, во́гнетрыва́лае рэ́чыва

income [ˈɪnkʌm] n. прыбы́так -ку, дахо́д -у *m.*

income tax падахо́дны пада́так

incoming [ˈɪnˌkʌmɪŋ] – adj. 1. які́ прыйдзе 2. які́ надыхо́дзіць, настае́ (*пра час*)
– n. прыхо́д, надыхо́д -у *m.*

incomings прыбы́так -ку, дахо́д -у *m.*

incommensurable [ˌɪnkəˈmenʃərəbəl] adj. 1. непараўна́льны; несувыме́рны. 2. Math. ірацыяна́льны (*пра лі́кі*)

incommensurate [ˌɪnkəˈmenʃərət] adj. 1. непрапарцыі́йны, неадпаве́дны. 2. несувыме́рны

incommode [ˌɪnkəˈmoʊd] v.t. перашкаджа́ць ; прычыня́ць невыго́ду; турбава́ць, непако́іць: ***Will it incommode you if we open the window?*** Ці ня бу́дзе вам перашкаджа́ць, калі́ мы адчы́нім вакно́?

incommodious [ˌɪnkəˈmoʊdiəs] adj. 1. непрасто́рны, це́сны. 2. невыго́дны, нязру́чны

incommunicable [ˌɪnkəˈmju:nɪkəbəl] adj. неперадава́льны, невыка́зны, невымо́ўны

incommunicative [ˌɪnkəˈmju:nəkeɪtɪv] adj. нетава́рыскі; негаваркі́; замкнёны, маўкліві, скры́тны

incompact [ɪnˈkɑ:mpækt] adj. няшчы́льны, ня сьці́снуты шчы́льна, некампа́ктны

incomparable [ɪnˈkɑ:mpərəbəl] adj. непараўна́льны; надзвыча́йны

incompatible [ˌɪnkəmˈpætəbəl] adj. 1. несумяшча́льны; несупада́льны. 2. нязго́дны з *чым*

incompetence [ɪnˈkɑ:mpətəns] n. 1. некваліфікава́насьць, няздо́лнасьць, некампэтэ́нтнасьць *f.* 2. неправаздо́льнасьць *f.*

incompetent [ɪnˈkɑ:mpətənt] – adj. 1. няўме́лы, няздо́льны; недасьве́дчаны ў чым-н.; незнаёмы з чым-н.; некваліфікава́ны; некампэтэ́нтны. 2. неправаздо́льны.
– n. няўме́кла -і *m. & f.*; некампэтэ́нтны -ага *m.*, некампэтэ́нтная *f.*

incomplete [ˌɪnkəmˈpliːt] adj. няпо́ўны, незако́нчаны

incomprehensible [ɪnˌkɑːmprɪˈhensəbəl] adj. незразуме́лы; зага́дкавы, дзі́ўны

incomprehension [ɪnˌkɑːmprɪˈhenʃən] n. неразуме́ньне, незразуме́ньне *n.*

incomprehensive [ɪnˌkɑːmprɪˈhensɪv] adj. 1. які́ ня ўсё ўлуча́е, абмежава́ны, няпо́ўны. 2. някемлівы, няця́млівы (*пра чалаве́ка*)

incompressibility [ˌɪnkəmˌpresəˈbɪlətɪ] n. несьціска́льнасьць *f.*

incompressible [ˌɪnkəmˈpresəbəl] adj. несьціска́льны (*ва́дкасьць*)

incomputable [ˌɪnkəmˈpjuːtəbəl] adj. незьлічальны

inconceivable [ˌɪnkənˈsiːvəbəl] adj. няўя́ўны; неверагодны

inconclusive [ˌɪnkənˈkluːsɪv] adj. 1. непераканальны, незако́нчаны, непераканаўчы (*пра абвінава́чаньне*). 2. які́ не вырашае чаго́-н. сумне́ўнага

incondensable or **incondensible** [ˌɪnkənˈdensəbəl] adj. незгушчальны

incongruity [ˌɪnkənˈgruːətɪ] n., pl. **-ties** 1. недарэ́чнасьць, неадпаве́днасьць *f.* 2. нязго́днасьць, непасьлядо́ўнасьць *f.*

incongruous [ɪnˈkɑːŋgruəs] adj. 1. неадпаве́дны; несумяшча́льны, не да ме́сца, недарэ́чны. 2. непасьлядо́ўны, нязго́дны, несула́дны; нязла́джаны

inconsequent [ɪnˈkɑːnsɪkwənt] adj. 1. а) непасьлядо́ўны, нелягі́чны б) нязго́дны з агу́льным хара́ктарам *ці* ўзо́рам. 2. не да ме́сца, не на тэ́му, які́ не датычыць спра́вы

inconsiderable [ˌɪnkənˈsɪdərəbəl] adj. нязна́чны, нява́жны

inconsiderate [ˌɪnkənˈsɪdərət] adj. 1. няўва́жны, няўва́жлівы 2. бязду́мны, неасьцяро́жны

inconsistency [ˌɪnkənˈsɪstənsɪ] n., pl. **-cies** 1. нязго́днасьць, несула́днасьць *f.*, разыхо́джаньне *n.* 2. непасьлядо́ўнасьць, зьме́нлівасьць *f.* 3. непасьлядо́ўны ўчы́нак

inconsistent [ˌɪnkənˈsɪstənt] adj. 1. нязго́дны, супярэ́члівы. 2. несула́дны, нязла́джаны; неаднаро́дны, несуцэ́льны 3. непасьлядо́ўны, зьме́нлівы

inconsolable [ˌɪnkənˈsoʊləbəl] adj. несуце́шны

inconspicuous [ˌɪnkənˈspɪkjuəs] adj. непрыкме́тны, які́ не прыця́гвае ўва́гі

inconspicuously [ˌɪnkənˈspɪkjuəslɪ] adv. няўзна́к, непрыкме́тна

inconstant [ɪnˈkɑːnstənt] adj. нястáлы; зьме́нны, зьме́нлівы

incontestable [ˌɪnkənˈtestəbəl] adj. бясспрэ́чны, несумне́ўны, безумо́ўны

incontinence [ɪnˈkɑːntənəns] n. 1. нястры́манасьць, няўстры́манасьць *f.* (*асабліва палава́я*). 2. распу́шчанасьць, амара́льнасьць, разбэ́шчанасьць *f.* 3. Med. неўстрыма́ньне натура́льнага выдзяле́ньня (*асабл. мачы́*)

incontinent I [ɪnˈkɑːntənənt] adj. 1. нястры́маны, нестрыма́ны. 2. распу́шчаны, немара́льны, разбэ́шчаны. 3. Med. які́ це́рпіць на нетрыма́ньне (*мачы́*)

incontinent II [ɪnˈkɑːntənənt] adv. адра́зу; за́раз жа, неадкла́дна

incontrovertible [ˌɪnˌkɑːntrəˈvɛːrtəbəl] adj. бясспрэ́чны, безумо́ўны, неаспрэ́чны

inconvenience [ˌɪnkənˈviːnɪəns] – n. 1. невыго́да, нязру́чнасьць *f.* 2. кло́пат -у *m.*, турбо́та *f.*
– v.t. спрычыня́ць *каму́* невыго́ду; турбава́ць, перашкаджа́ць

inconvenient [ˌɪnkənˈviːnɪənt] adj. невыго́дны, нязру́чны; турбо́тны, клапатлі́вы, цяжкі́

inconvincible [ˌɪnkənˈvɪnsəbəl] adj. 1. непераканальны. 2. яко́га немагчы́ма перакана́ць

incorporate [ɪnˈkɔːrpəreɪt] – v. 1. улуча́ць, далуча́ць|ь (-ца), спалуча́ць|ь (ца). 2. утвара́ць карпара́цыю. 3. прыма́ць у арганіза́цыю. 4. злуча́ць
– adj. [ɪnˈkɔːrpərət] злу́чаны; спалу́чаны; зарэгістрава́ны (*карпара́цыя, тава́рыства*)

incorporated [ɪnˈkɔːrpəreɪtəd] adj. 1. зарэгістрава́ны карапара́цыяй, задзіно́ча-

ны (*аб'е́днаны*) у карпара́цыю. 2. зьмяша́ны, спалу́чаны ў адну́ ма́су *або́* рэ́чыва

incorporation [ɪnˌkɔ:rpə'reɪʃən] n. 1. аб'ядна́ньне, задзіно́чаньне, зьліцьцё *n.* 2. карпара́цыя *f.*

incorrect [ˌɪnkə'rekt] adj. 1. няпра́вільны. 2. неадпаве́дны

incorrigible [ɪn'kɔ:rɪdʒəbəl] – adj. непапра́ўны
– n. непапра́ўнае *n.*

incorruptibility [ˌɪnkəˌrʌptə'bɪlətɪ] n. непадку́пнасьць *f.*

knickerbockers ['nɪkərbɑ:kərz] or **knickers** ['nɪkərz] n., pl. бры́джы *pl. only*

knickknack ['nɪknæk] n. ца́цка, заба́ўка *f.*; аздо́бныя дро́бязі

knife [naɪf] – n., pl. **knives** нож, нажá *m.*

– v. ро́заць, прабіва́ць, забіва́ць нажо́м

knife edge вастрыё *n.*, лязо́ нажá

knife grinder тачы́льнік нажо́ў

knight [naɪt] n. 1. ры́цар -а *m.* 2. ша́хматны конь

knight-errant вандро́ўны ры́цар

knighthood ['naɪthʊd] n. 1. ры́царства *n.* (*ранг або́ заня́так*). 2. хара́ктар ры́цара. 3. ры́цары

knit [nɪt] – v.t. 1. вяза́ць, пле́сьці (*прутка́мі*). 2. злуча́ць, змацо́ўваць

– v.i. злуча́цца, змацо́ўвацца, раста́цца

• ***knit the brows*** насу́піцца

knitting ['nɪtɪŋ] n. 1. вяза́ньне, пляце́ньне *n.* 2. вя́заная рэч

knitting needle вяза́льны пруто́к

knives [naɪvz] n., *pl. of* **knife**

knob [nɑ:b] n. 1. гуз -а *m.*; вы́пукласьць *f.* 2. кру́глая ру́чка (*дзьвярэ́й, шуфля́ды*). 3. узго́рак -ка *m.* 4. Sl. галава́ *f.*, мазгаўня́ *f.*

knock [nɑ:k] – v.t. 1. сту́каць; уда́рыць; біць. 2. валíць, зьбіва́ць

– v.i. сту́кацца: ***to knock at a door*** сту́каць у дзьве́ры

– n. 1. стук -у *m.* 2. Sl. во́страя кры́тыка
• ***knock about (around)*** гайса́ць; сно́ўдацца
• ***knock down*** а) зьбіва́ць (*з ног*), вали́ць. б) разьбіра́ць рэч (*для перавó́зкі*)
• ***knock out*** а) вы́біць. б) перамагчы́. в) накаўтава́ць
• ***knock together*** зьбіва́ць, рабíць сьпе́хам

knoll [noʊl] n. малы́ ўзго́рак, узго́рачак -ка *m.*, пагóрак -ка *m.*

knot [nɑ:t] – n. 1. ву́зел -ла́ *m.* 2. бант -а *m.*, ба́нцік -а *m., dim.* 3. су́вязь *f.*: ***nuptual knot*** сужэ́нства. 4. на́расьць *f.* (*на дрэ́ве*) 5. ву́зел -ла́ *m.* (*адзíнка ху́ткасьці вадаплáваў*). 6. ця́жкасьць, перашко́да *f.*; замíнка, за́гваздка *f.*
– v. 1. завя́заваць вузло́м. 2. зблы́тваць(ь (-ца), заблы́таць(ь (-ца) у вузлы́. 3. завя́зваць, рабíць фрэ́ндзлі

knotty ['nɑ:ti] adj. 1. вузлава́ты. 2. заблы́таны, склада́ны

knout [naʊt] n. бізу́н -á *m.*

know [noʊ] v., **knew, known,** v.t. 1. ве́даць, знаць. 2. ме́ць ве́ды, уме́ць. 3. быць знаёмым з *кім*: ***I know her very well*** Я зь ёю ве́льмі до́бра знаёмы; ***Do you know this road?*** Ці ты ве́даеш гэ́тую даро́гу? 4. уме́ць: ***Mary knows how to cook*** Марыя ўме́е гатава́ць

knowable ['noʊəbəl] – adj. пазнава́льны, дасту́пны пазна́ньню
– n. пазнава́льнае *n.*

knowingly ['noʊŋli] adv. 1. уме́ла, з уме́ньнем, па-майстэ́рску. 2. сьве́дама; наўмы́сна, знаро́к

knowledge ['nɑ:lɪdʒ] n. 1. ве́да *f.*; наву́ка *f.*: ***a branch of knowledge*** галіна́ ве́ды. 2. ве́даньне *n.*, паінфармава́насьць *f.*: ***It came to my knowledge*** Мне ста́ла ве́дама; ***to (the best of) my knowledge*** нако́лькі мне ве́дама. 3. знаёмства, ве́даньне *n.*, ве́стка *f.*

knowledgeable ['nɑ:lɪdʒəbəl] adj. які́ ве́дае, паінфармава́ны

known [noʊn] v., *p.p. of* **know** вядо́мы, ве́дамы: ***it is known*** вядо́ма

known quantity Math. вядо́мае *n.*

know-nothing ['noʊˌnʌθɪŋ] n. не́вук -а *m. & f.*; праста́к -á *m.*, праста́чка *f.*

knuckle ['nʌkəl] – n. 1. суста́ў -ва *m.* (*па́льца*). 2. кале́на *або́* лы́тка (*жывёліны, ужыва́ныя, як мя́са*)
– v.i. сту́каць па́льцам, сту́кацца: ***to knuckle down (under),*** Informal падда́цца, саступíць *каму́*

kohlrabi [ˌkoʊl'rɑ:bi] n., pl. **-bies,** Bot. кальра́бі *f., indecl.*

Korean [kə'ri:ən] – adj. карэ́йскі
– n. 1. карэ́ец -йца *m.*, карэ́йка *f.* 2. карэ́йская мо́ва

Kremlin ['kremlɪn] n. Крэмль Крамля́ *m.*

Ku-Klux-Klan [ˌku:klʌks'klæn] n. Ку-Клукс-Кла́н

kumquat ['kʌmkwɑ:t] n. камкво́т -а *m.* (*малы́ як сьлíўка плод, падо́бны да апэльсíна*)

Kyrgyz [kɪr'gi:z] n., pl. **-ghiz** or **-ghizes** 1. кіргíз -а *m.* 2. кіргíская мо́ва

L

L, l [el] n.,pl. **L's** or **Ls, l's** or **ls** *дванáцатая лíтара англéльскага альфабэ́ту*

label ['leɪbəl] – n. налéпка, наклéйка, этыкéтка *f.*; ярлы́к -á *m.*
– v.t. наклéйваць налéпкі, рабíць нáдпісы. 2. Figur. навéшваць ярлыкí

labial ['leɪbiəl] – adj. губны́
– n., Gram. губны́ зы́чны

labor, Brit. **labour** ['leɪbər] – n. 1. прáца *f.*: ***hard labor*** кáтарга *f.* 2. coll. працóўныя. 3. рóдавыя бóлі
– v.i. ця́жка працавáць, сíліцца

laboratory ['læbərətɔ:ri] – n., pl. **-ries** лябаратóрыя *f.*
– adj. лябаратóрны

Labor Day Дзень прáцы (*сьвя́та*)

laborer, Brit. **labourer** ['leɪbərər] n. 1. рабóчы -ага *m.*, рабóчая *f.* 2. чорнарабóчы -ага *m.*

laborious [lə'bɔ:riəs] adj. 1. цяжкí. 2. працавíты, карпатлíвы

labor market ры́нак прáцы; пóпыт прáцы

labor union прафсаю́з

labyrinth ['læbərɪnθ] n. 1. лябíры́нт -а *m.* 2. заблы́танае станóвішча

lace [leɪs] – n. 1. кару́нкі *pl. only.* 2. шнурóк, матузóк -кá *m.*: ***shoelaces*** матузкí для чаравíкаў. 3. галу́н -á *m.*: ***Some uniforms have laces on them*** Некатóрыя ўніфóрмы мáюць галуны́
– v.t. 1. абшыва́ць кару́нкамі. 2. шнурава́ць. 3. прыбіра́ць галуна́мі, нашыва́ць галуны́

lacerate ['læsəreɪt] v.t. парэ́заць, пара́ніць

lachrymal, *тс.* **lacrimal** ['lækrɪməl] adj. 1. сьлёзны: ***lachrimal glands*** сьлёзныя залóзы. 2. для сьлёзаў

lack [læk] – v. адчува́ць нястáчу; ня мець; не става́ць; мець патрэ́бу: ***He lacks courage*** Ямý не стаé адвáгі; ***A desert lacks water*** У пусты́ні нямá вады́
– n. нястáча *f.*, недахóп -у *m.*, адсýтнасьць *f.*
• ***for lack of*** а) дзéля недахóпу *чагó* б) дзеля адсýтнасьці *чагó*

lacking ['lækɪŋ] adj. якóму не стаé: ***A weak person is lacking in strength*** У слабóга чалавéка не стаé сíлаў

lackluster ['læk,lʌstər] adj. мáтавы, бяз гля́нцу, бяз бля́ску

laconic [lə'kɑ:nɪk] adj. сьцíслы, маласлóўны, ляканíчны

lacquer or **lacker** ['lækər] – n. ляк -у *m.*
– v.t. 1. пакрыва́ць ля́кам. 2. Sl. прыхарóшваць, прыгла́джваць

lactose ['læktous] n. малóчны цýкар, ляктóза *f.*

lacuna [lə'kju:nə] n. 1. лякýна *f.*, прага́л -у *m.* 2. пустóе мéсца

lad [læd] n. хлаплéц -цá *m.*, юнáк -á *m.*, дзяцю́к дзецюкá *m.*

ladder ['lædər] n. драбíна, лéсьвіца *f.*

lade [leɪd] v., **laded, laden** 1. грузíць; нагружа́ць. 2. вычэ́рпваць апалóнікам

laden ['leɪdən] adj. 1. нагру́жаны. 2. абцяжа́раны

ladle ['leɪdəl] – n. апало́нік -а *m.*, чарпа́к -а́ *m.*
– v.t. 1. вычэ́рпваць апало́нікам. 2. разьліва́ць апало́нікам

lady ['leɪdi] – n., pl. **-dies** 1. да́ма *f.*: ***a great lady*** зна́тная да́ма. 2. спада́рыня *f.*: ***ladies and gentlemen*** спада́рыні й спадары́. 3. гаспады́ня *f.* (*до́му*). 4. каха́ная *f.*; жо́нка *f.*
– adj. жано́чы, жано́чага ро́ду: ***a lady doctor*** жанчы́на-до́ктар

ladybug ['leɪdibʌg] or **lady beetle**, n. бо́жая каро́ўка

lady-killer ['leɪdiˌkɪlər] n., Sl. сэрцае́д -а *m.*

ladylike ['leɪdilaɪk] adj. 1. як да́ма, до́бра вы́хаваная. 2. до́брая, даліка́тная. 3. жанчынападо́бны (*пра мужчы́ну*)

lag [læg] – v.i. 1. адстава́ць; паво́льна цягну́цца. 2. паслабля́цца: ***our attention lagged*** на́шая ўва́га паслабля́лася
– n. апазьне́ньне, адстава́ньне *n.*: ***jet lag*** парушэ́ньне су́тачнага ры́тму; сто́ма ад до́ўгага падаро́жжа самалётам; недапасава́насьць арганізму да мясцо́вага ча́су

lagoon or **lagune** [ləˈguːn] n. лягу́на *f.*

laid [leɪd] v., *past & p.p. of* **lay I**

lain [leɪn] v., *p.p. of* **lie II**

lair [ler] – n. 1. бярло́г-у *m.*, ло́гава, ло́гвішча *n.* (*зьве́ра*). 2. ло́гава, прыту́лішча *n.* (*чалаве́ка*). 3. Brit. шала́ш -а́ *m.*, за́гарадзь *f.* (*для жывёлы*)
– v.i. спаць, ляжа́ць у ло́гаве

lake [leɪk] – n. во́зера *n.*
– adj. азёрны

lakelet ['leɪklɪt] n. мало́е во́зера, азе́рца *n.*

lamb [læm] – n. 1. ягня́ *n.*, *pl.* -я́ты; ягня́тка *n.* 2. бара́ніна *f.* (*мя́са*)
– v.i. акаці́цца (*пра аве́чку*)

lame [leɪm] – adj. 1. кульга́вы. 2. зьняве́чаны. 3. Figur. слабы́, нездавальня́ючы, недастатко́вы: ***a lame excuse*** няўда́лая адгаво́рка
– v.t. рабі́ць кульга́вым, няве́чыць
– v.i. закульга́ць; зрабі́цца кульга́вым

lament [ləˈment] – v.t. апла́кваць; шкадава́ць
– v.i. 1. галасі́ць, мо́цна пла́каць. 2. жальбава́ць, лямантава́ць
– n. 1. галашэ́ньне *n.*, ля́мант -у *m.* 2. эле́гія *f.*, жало́бная пе́сьня

lamentable [ləˈmentəbəl] adj. ва́рты жа́лю; няшча́сны, жалюго́дны

lamentation [ˌlæmənˈteɪʃən] n. плач -у *m.*, гаро́тная жа́льба; нараканьні
• Bibl. ***Lamentations*** плач Ераміі

lamp [læmp] n. 1. ля́мпа *f.*; ліхта́р -а́ *m.* 2. Figur. сьвяці́ла *n.*

lamp-post ['læmppoʊst] n. ліхта́рны слуп

lamplight ['læmplaɪt] n. 1. ля́мпавае сьвятло́. 2. вечаро́вая пара́

lampoon [læmˈpuːn] – n. зло́сная саты́ра, па́сквіль -я *m.*; памфле́т -а *m.*
– v.t. напада́ць, высьме́йваць

lamp shade абажу́р -а *m.*

lance [læns] – n. 1. дзі́да *f.*, кап'ё *n.* 2. лянцэ́т -а *m.* (*хірургі́чны*)
– v.t. 1. прабіва́ць дзі́дай. 2. разраза́ць лянцэ́там

lancer ['lænsər] n. улан -а *m.*

lancet ['lænsət] n. лянцэ́т -а *m.*

land [lænd] – n. 1. сухазе́м'е *n.*, су́ша *f.* 2. гле́ба, зямля́ *f.*: ***good land for a garden*** до́брая зямля́ для гаро́ду. 3. зяме́льная ўла́снасьць, маёнтак -ка *m.* 4. край -ю *m.*, краі́на *f.*; раён -у *m.*: ***the land of Belarus*** белару́скі край; ***mountainous land*** го́рны раён
– v.t. 1. выса́джваць (*на бе́раг*). 2. прызямля́ць
– v.i. 1. прыстава́ць, прыча́льваць. 2. выса́джвацца. 3. апына́цца, прыбыва́ць: ***He landed in jail*** Ён апыну́ўся ў астро́зе
• ***lands*** тэрытарыя́льныя ўлада́ньні.

landed ['lændɪd] adj. 1. зяме́льны. 2. які́ ма́е зямлю́, вало́дае зямлёю

landfill ['lændfɪl] n. зва́лка *f.*

landing ['lændɪŋ] n. 1. а) вы́садка *f.* б) паса́дка *f.* 2. ме́сца вы́садкі *або́* паса́дкі. 3. пляцо́ўка на схо́дах

landlady ['lændleɪdi] n., pl. **-dies** улада́льніца, ула́сьніца до́му *або́* зямлі́; гаспады́ня кватэ́ры

landlord ['lændlɔ:rd] n. уладáсьнік, уладáльнік дóму *абó* зямлí; гаспадáр кватэ́ры

landmark ['lændmɑ:rk] n. 1. мéжавы кáмень, вяхá *f.* 2. арыенцíр -а *m.* 3. Figur. вéхі *pl.*, вáжны этáп. 4. пóмнік архітэктýры

land mass or **landmass** мацяры́к -á *m.*

landowner ['lænd,oʊnər] n. земляўлáсьнік, земляўладáльнік -а *m.*; земляўлáсьніца, земляўладáльніца *f.*

landscape ['lændskeɪp] n. 1. краявíд, пэйзáж -у *m.* 2. малю́нак краявíду. 3. ляндшáфт -у *m.*

landslide ['lændslaɪd] n. 1. апóўзень -зьня *m.* 2. Figur. вялíкая перамóга (*у вы́барах*). 3. падзéя вялíзных памéраў: ***landslide inflation*** абвáльная інфля́цыя

lane [leɪn] n. 1. завýлак -ка *m.* 2. вýзкая дарóга, сьцéжка. 3. паласá рýху (*на аўтастрáдзе*): ***Left lane for left turn only*** Лéвая паласá тóлькі для паварóту налéва

language ['læŋgwɪdʒ] n. 1. мóва *f.* 2. стыль -ю *m.*

languid ['læŋgwɪd] adj. 1. квóлы, вя́лы, мля́вы: ***languid attempts*** слабы́я спрóбы. 2. абыя́кавы, апаты́чны

languish ['læŋgwɪʃ] – v.i. 1. слабéць, млець; вя́нуць. 2. сóхнуць, чэ́знуць; марнéць. 3. тужы́ць: ***She languished for home*** Яна́ тужы́ла па дóме

languor ['læŋgər] n. 1. слáбасьць, зьнямóга *f.* 2. мля́вы вы́гляд *абó* пóзірк

lank [læŋk] adj. 1. высóкі і тóнкі; шчýплы; хударля́вы. 2. прóсты, не кучарáвы (*пра валасы́*)

lanky ['læŋki] adj. цыбáты

lantern ['læntərn] n. 1. ліхтáр -á *m.* 2. вéрхняя чáстка маякá

lap I [læp] n. 1. прыпóл -у *m.*, палá *f.* 2. калéні *pl.*, улóньне *n.*: ***The boy sat on his mother's lap*** Хлóпчык сядзéў у мáці на калéнях. 3. лóна, улóньне *n.*: ***in nature's lap*** на ўлóньні прыроды
• ***in the lap of fortune*** мець пóўную ўдáчу
• ***in the lap of luxury*** у раскóшы

lap II [læp] v.t. 1. перакрывáць, пакрывáць нáнава. 2. ахýтваць, ахінáць. 3. загóртваць, закрýчваць

lap III [læp] v. 1. хлябтáць: ***cat laps up milk*** кот хлéбча малакó. 2. пы́рскаць, хлю́паць. 3. плёскацца, пля́скацца

lap IV [læp] – n., Sport 1. кóла *m.* (*вакóл стадыёну*). 2. забéг -у *m.* 3. адці́нак -ка *m.*: ***the last lap of the hike was the toughest*** апóшні адцінак пахóду быў найцяжэ́йшы

lapel [ləˈpel] n. ля́цкан, адварóт -а *m.* (*пінжакá*)

lapidify [ləˈpɪdɪfaɪ] **-fied, -fying** – v.t. ператвараць у кáмень
– v.i. камянéць

lapis lazuli [ˌlæpɪs ˈlæzəli:] лязурыт -у *m.* (*мінэрáл*)

lapse [læps] – n. 1. малáя памы́лка, недагля́д -у *m.*; апíска *f.*; абмóўка, агавóрка *f.*; ля́псус -у: ***Lapse of memory*** прагáл у пáмяці. 2. заняпáд -у *m.* (*марáльны*). 3. мінáньне, праміна́ньне *n.* (*чáсу*)
– v.i. 1. рабíць малýю памы́лку. 2. занепадáць, упадáць: ***to lapse into silence*** змóўкнуць; ***The boy's interest soon lapsed*** Зацікаўлéньне хлапцá хýтка згáсла

laptop ['læptɑ:p] n. партаты́ўны кампýтар, лэптóп -а *m.*

larch [lɑ:rtʃ] n. лістóўніца, мадры́на *f.* (*хваёвае дрэ́ва*)

lard [lɑ:rd] – n. сáла *n.*, шмáлец -льцу *m.*
– v.t. 1. а) шпігавáць кавáлкамі сáла. б) мáзаць тлýшчам. 2. Figur. аздабля́ць, перасыпáць (*мóву*): ***The speaker larded his speech with jokes*** Прамóўца перасыпáў сваю́ прамóву жáртамі

large [lɑ:rdʒ] adj. **larger, largest** 1. вялíкі. 2. буйны́: ***a large enterprise*** буйнóе прадпрыéмства. 3. шматлíкі, знáчны
• ***at large*** а) на вóлі, вóльны (*пра злачы́нца*). б) шырóка, падрабя́зна. в) увóгуле; у цэ́лым

largely ['lɑ:rdʒli] adv. 1. шмат. 2. галóўна, перава́жна, у зна́чнай ступе́ні

large-scale [ˌlɑ:rdʒ'skeɪl] adj. вялі́кі, буйны́, з разма́хам, буйнамашта́бны: ***large-scale agriculture industry*** буйна́я се́льская гаспада́рка́

largesse [lɑ:r'dʒes] n. шчо́драсьць *f.*; велікаду́шнасьць *f.*

lark [lɑ:rk] n. жаўру́к -á, жа́варанак, жа́ўранак -ка *m.*

larva ['lɑ:rvə] n., pl. **-vae** лічы́нка *f.*: ***A tadpole is the larva of a frog*** Апало́нік — лічы́нка жа́бы

laryngal [lə'rɪŋgəl] – adj., Phon. гарта́нны – n. гарта́нны гук

laryngeal [lə'rɪŋdʒəl] adj. гарта́нны, у гарта́ні (*пра му́скул, нэ́рв*)

larynx ['lærɪŋks] n., pl. **larynxes** or **larynges** [læ'rɪŋdʒi:z] гарта́нь *f.*

lascivious [lə'sɪviəs] adj. 1. пачуцьцёвы, юрлі́вы. 2. разбэ́шчаны, распу́сны. 3. які́ ўзбуджа́е, распа́львае юрлі́васьць

laser ['leɪzər] n. ла́зэр -а *m.*: ***laser beam*** ла́зэрны праме́нь

lash I [læʃ] – n. 1. пу́га *f.*, бізу́н -á *m.* 2. уда́р пу́гай, бізуно́м. 3. ве́я, ве́йка *f.* – v. 1. сьцяба́ць, хваста́ць (*пу́гаю*). 2. маха́ць, біць (*хвасто́м*). 3. Figur. напада́ць, высьме́йваць
• ***lash out*** кі́дацца, атакава́ць

lash II [læʃ] v.t. зьвя́зваць вяро́ўкай, шнурко́м

last I [læst] – adj. 1. а) апо́шні. б) найніжэ́йшы: ***next to the last*** перадапо́шні; ***last in importance*** найніжэ́йшы паво́дле ва́жнасьці. 2. мінýлы: ***last Monday*** мінýлы панядзе́лак; ***last year*** ле́тась. 3. найме́нш праўдападо́бны – adv. на канцы́
• ***at last*** нарэ́шце

last II [læst] – v.i. 1. цягну́цца, заця́гвацца; трыва́ць: ***The storm lasted three days*** Навальні́ца цягну́лася тры дні. 2. трыма́цца, трыва́ць. 3. быць дастатко́вым, хапа́ць: ***Our money must last two weeks*** На́шых гро́шай паві́нна хапі́ць на два ты́дні – n. вы́трымка, трыва́ласьць *f.*
• ***last out*** вы́жыць, вы́трываць

last III [læst] n. капы́л -á *m.* (*шаве́цкі*)

lasting ['læstɪŋ] – adj. 1. праця́глы, до́ўгі. 2. заўсёдны. 3. трыва́лы – n. трыва́ньне *n.*

lastly ['læstli] adv. нарэ́шце, урэ́шце

latch [lætʃ] – n. за́саўка, зава́ла, шта́ба *f.* – v. зачыня́ць на за́саўку
• ***on the latch*** на за́саўцы

late [leɪt] – adj. 1. по́зны, по́зьні, прыпо́зьнены, запо́зьнены: ***a late dinner*** по́зны абе́д; ***He was late*** Ён спазьні́ўся. 2. мінýлы, нядáўны. 3. паме́рлы, нябо́жчык: ***The late Mr. Brown was a good man*** Нябо́жчык Браўн быў до́брым чалаве́кам – adv. 1. по́зна. 2. нядáўна, кагадзе́
• ***late in life*** у старэ́йшым ве́ку
• ***of late*** апо́шнім ча́сам; нядáўна

lately ['leɪtli] adv. 1. нядáўна, надо́ечы, кагадзе́. 2. апо́шнім ча́сам

latent ['leɪtənt] adj. прыхава́ны, скры́ты, уто́ены; Med. лятэ́нтны, схава́ны, неразьві́ты (*пэры́яд хваро́бы*)

later ['leɪtər] – adj. *the compar. of* **late** пазьне́йшы – adv. пасьля́, пазьне́й
• ***later on*** по́тым, затым

lateral ['lætərəl] – adj. 1. бакавы́, пабо́чны: ***the river and its lateral streams*** рака́ і е́йныя бакавы́я прыто́кі – n. бакава́я ча́стка, галі́на

laterally ['lætərəli] adv. 1. у бок, збо́ку, бо́кам. 2. пабо́чна

latest ['leɪtɪst] adj. *the superl. of* **late** найпазьне́йшы
• ***at the latest*** найпазьне́й; не пазьне́й, як
• ***the latest***, Informal найбо́льш сучáснае, найнаве́йшы стыль, фасо́н, мадэ́ль

latex ['leɪteks] n. каўчу́к, ля́тэкс -у *m.*: ***latex rubber*** каўчу́кавая гу́ма

lath [læθ] – n., pl. **laths** 1. дра́нка, драні́ца *f.* 2. се́тка *f.* (*для тынкава́ньня*) – v.t. кла́сьці, прыбіва́ць дра́нку

lathe ['leɪð] n. така́рны варшта́т

lather ['læðər] – n. пе́на *f.*
– v.t. мы́ліць, намы́льваць
– v.i. пакрыва́цца пе́най

Latin ['lætən] – n. лаці́нская мо́ва, лаці́на *f.*
– adj. 1. лаці́нскі: ***Latin peoples*** рама́нскія наро́ды. 2. ры́ма-катали́цкі. 3. лаці́наамэрыка́нскі

Latin-American adj. лаці́наамэрыка́нскі

Latin American n. лаці́наамэрыка́нец -ца *m.*

latitude ['lætətu:d] n. 1. Geogr., Astron. шыра́та *f.* 2. Figur. свабо́да дзе́яньня, паўнамо́цтва *n.*

lattice ['lætəs] – n. 1. се́тка *f.*, кра́ты, кра́ткі *pl.*, пераплёт -у *m.* 2. Chem. крышталі́чная рашо́тка
– v.t. паста́віць се́тку, закры́ць се́ткай

Latvian ['lætviən] – adj. латы́скі, латві́йскі
– n. 1. латы́ш -а́ *m.*, латы́шка *f.* 2. латы́ская мо́ва

laud [lɔ:d] – v.t. усхваля́ць, расхва́льваць; праслаўля́ць
– n. 1. хвала́, пахвала́ *f.* 2. пахва́льны гімн

laudable ['lɔ:dəbəl] adj. пахва́льны

laugh [læf] v.i. сьмяя́цца
• ***have the last laugh*** быць тым, хто сьмяе́цца апо́шнім
• ***laugh at*** сьмяя́цца, насьміха́цца з *каго́*
• ***laugh off (away)*** аджартава́цца, збыць сьме́хам

laughable ['læfəbəl] adj. сьме́шны, сьмяхо́тны; заба́ўны, кам'і́чны

laughingstock ['læfiŋstɑ:k] n. пасьме́шышча *n.*

laughter ['læftər] n. сьмех, ро́гат -у *m.*

launch I [lɔ:ntʃ] – v.t. 1. спушча́ць, спуска́ць, спуска́ць (*чо́вен*) на ваду́. 2. пуска́ць, запуска́ць: ***to launch a torpedo*** вы́пусьціць тарпэ́ду; ***to launch a rocket*** запусьці́ць раке́ту. 3. пачына́ць: разго́ртваць, пуска́ць у рух: ***to launch a new enterprise*** распача́ць но́вае прадпрые́мства. 4. кіда́ць; пуска́ць, выпуска́ць: ***to launch threats against someone*** кіда́ць не́каму пагро́зы
– v.i. выпраўля́цца, накіро́ўвацца куды́-н.
– n. за́пуск, пуск -у *m.*
• ***launch out*** пача́ць, распача́ць; ру́шыць (*у даро́гу*)

launch II [lɔ:ntʃ] n. барка́с -а *m.*

launching site пускава́я пляцо́ўка, плятфо́рма

launder ['lɔ:ndər] – v.t. мыць і прасава́ць (*бялі́зну, во́пратку*)
– v.i. мы́цца: ***it launders well*** гэ́та до́бра мы́ецца

laundress ['lɔ:ndrɪs] n. пра́чка *f.*

laundromat ['lɔ:ndrəmæt] n. публі́чная пра́льня

laundry ['lɔ:ndri] n., pl. **-dries** 1. пра́льня *f.* 2. бялі́зна для мыцьця́. 3. мыцьцё й прасава́ньне

laundryman ['lɔ:ndrimən] n., pl. **-men** рабо́тнік у пра́льні

laureate ['lɔ:riət] – n. ляўрэа́т -а *m.*
– adj. 1. адзна́чаны. 2. ляўро́вы (*пра вяно́к*)

laurel ['lɔ:rəl] – n. ляўр -а і -у *m.*
– v.t. 1. аздо́біць ляўро́вымі лістамі *ці* вянко́м. 2. віць вяно́к з ля́ўру
• ***laurels*** ля́ўры, а) го́нар; сла́ва. б) перамо́га
• ***rest on one's laurels*** спачы́ць на ля́ўрах

laureled or **laurelled** ['lɔ:rəld] adj. укаранава́ны ляўро́вым вянко́м, узнагаро́джаны

lava ['lɑ:və] n. ля́ва *f.*

lavatory ['lævətɔ:ri] n., pl. **-ries** 1. туале́т -у *m.* 2. прыбіра́льня *f.*

lavender ['lævəndər] – n. лява́нда *f.*
– adj. сьве́тла-фіяле́тавы

lavish ['lævɪʃ] – adj. 1. шчо́дры: ***lavish of money*** той, хто шчо́дра раздае́ гро́шы. 2. раско́шны; бага́ты, які́ шмат каштуе́, дарагі́: ***lavish gifts*** дарагія падару́нкі
– v.t. шчо́дра раздава́ць; раскіда́цца

lavishly ['lævɪʃli] adv. 1. раско́шна, шчо́дра. 2. марнатра́ўна, неашча́дна

law [lɔ:] n. 1. зако́н -у *m.*, пра́ва *n.*: ***civil law*** цыві́льнае пра́ва. 2. пра́вілa: ***traffic laws*** пра́вілы ру́ху. 3. юрыспрудэ́нцыя *f.*, правазна́ўства *n.*: ***to study law*** вывуча́ць правазна́ўства, пра́ва
• ***commercial law*** гандлёвае пра́ва
• ***criminal law*** крымінальнае пра́ва
• ***go to law*** падава́ць у суд
• ***law and order*** законапара́дак, правапара́дак
• ***lay down the law*** Figur. а) даць зага́д. б) даць нага́ну
• ***read law*** вывуча́ць пра́ва, каб ста́ць юры́стам
• ***take the law in one's own hands*** распра́віцца самаво́льна; узя́ць зако́н у сваé ру́кі
• ***the law of gravitation*** зако́н грави-та́цыі

law-abiding ['lɔ:əˌbaɪdɪŋ] adj. зако́напаслухмя́ны

law-breaker ['lɔ:ˌbreɪkər] n. правапарушáльнік -а, злачы́нец -ца *m.*

law court суд -ý *m.*

lawful ['lɔ:fəl] adj. 1. зако́нны. 2. справядлі́вы, абгрунтава́ны: ***lawful demands*** справядлі́выя дамага́ньні

lawfully ['lɔ:fəli] adv. 1. зако́нна. 2. справядлі́ва, павóдле зако́ну, згóдна з зако́нам

lawless ['lɔ:ləs] adj. 1. беззако́нны; незако́нны. 2. нястры́мны, неўтаймава́ны; непаслухмя́ны

lawlessness ['lɔ:ləsnəs] n. 1. бяспра́ўе *n.* 2. беззако́ннасьць *f.*

lawmaker ['lɔ:meɪkər] n. заканада́вец -ўца, заканада́ўца -ы *m.*

lawmaking ['lɔ:meɪkɪŋ] – adj. заканада́ўчы
– n. заканада́ўства *n.*

lawman [lɔ:mən] n., pl. **-men** ахо́ўнік зако́ну

lawn I [lɔ:n] n. тра́ўнік, газо́н -у *m.*

lawn II [lɔ:n] n. батыст -у *m.*

lawn mower ['lɔ:nˌmoʊər] n. газо́накасі́лка *f.*

law of averages зако́н сярэ́дняга

law of the land зако́н краі́ны; канстыту́цыя

lawsuit ['lɔ:su:t] n. судо́вы працэ́с, судо́вая спра́ва, суд -ý *m.*

lawyer ['lɔ:jər] n. пра́ўнік, адвака́т -а *m.*; юры́ст -а *m.*, юры́стка *f.*

laxative ['læksətɪv] – n. слабі́цельнае *n.*
– adj. слабі́цельны

lay I [leɪ] – **laid, laying** – v.t. 1. кла́сьці: ***Lay the baby down gently*** Пакладзі́ дзіця́ асьцяро́жна. 2. вали́ць, кла́сьці, прымінáць: ***A storm laid crops low*** Навальні́ца прымя́ла пасе́вы. 3. накрыва́ць: ***to lay a table for dinner*** накрыва́ць стол да абе́ду. 4. склада́ць: ***We have laid our plans*** Мы скла́лі на́шыя пля́ны. 5. не́сьці (*яйкі*). 6. віць, зьвіва́ць вярбо́ўку
– v.i. 1. не́сьціся. 2. ляжа́ць
• ***lay aside, away*** or ***by*** адкладáць на пасьля́; ашчаджа́ць, прыхо́ўваць
• ***lay down*** а) пакла́сьці. б) адкла́сьці, прыхава́ць на пасьля́
• ***lay hold of, on*** or ***upon*** а) захапі́ць што-н. б) скарыста́ць з чаго́-н.
• ***lay off*** а) зво́льніць з пра́цы. б) абазна́чыць (*ме́жы*). в) адчапі́цца
• ***lay on*** а) накладáць (*фа́рбу, пада́так*). б) правóдзіць (*ваду́, газ, эле́ктрыку*). в) лісьлі́віць
• ***lay oneself open*** вы́ставіць сябе́ (*на сьмех, небясьпе́ку*)
• ***lay oneself out,*** Informal сілі́цца, намага́цца з усі́х сіл; вылу́звацца са ску́ры
• ***lay out*** а) раскладáць, выкладáць: ***The refreshments were laid out*** Падмацу́нкі былі́ раскла́дзеныя. б) Informal вы́класьці, вы́даткаваць (*гро́шы*). в) падрыхтава́ць, прыбра́ць (*нябо́жчыка*)

lay II [leɪ] v., *p.t. of* **lie**

lay III [leɪ] adj. 1. сьве́цкі. 2. непрафэсі́йны

layer ['leɪər] n. 1. a) кла́дчык -а *m.*: ***bricklayer*** му́ляр -а *m.* б) но́сная курыца. нясу́шка *f.* 2. пласт -á *m.*; слой -ю *m.*

layer cake слаі́сты пірóг

layette [leɪ'et] n. камплéкт во́праткі для немаўля́ці

layman ['leɪmən] n., pl. **-men** 1. неспэцыяліст, непрафэсіянал -а *m.* 2. сьвецкі -ага *m.* (*не духоўны*)
layoff ['leɪɔ:f] n. 1. часовае звальненьне з працы. 2. час (працягласьць) звальненьня
layout ['leɪaʊt] n. 1. разьмяшчэньне *n.*, плян -у *m.* 2. макет -а *m.* (*кнігі, афішы*)
lazily ['leɪzɪlɪ] adv. гультаявата, лянівa
laziness ['leɪzɪnəs] n. гультайства *n.*
lazy ['leɪzɪ] adj. гультаяваты, лянівы
lazybones ['leɪzɪbəʊnz] n., Informal вялікі гультай -я *m.*, лайдак -а *m.*
lb., pl. **lb.** or **lbs** (**libra**, *лац.*) фунт -а *m.*
lead I [li:d] – v.t. 1. весьці, прывадзіць: ***to lead a child by the hand*** весьці дзіця за ручу; ***to lead a horse to water*** павесьці каня да вады; ***to lead astray*** зводзіць з добрай дарогі. 2. давадзіць: ***It led the country to the civil war*** Гэта давяло край да грамадзянскай вайны. 3. правадзіць (*час, жыцьцё*). 4. быць наперадзе, быць на першым месцы: ***to lead the parade*** ісьці першымі на парадзе; ***She leads the class in spelling*** Яна на першым месцы ў клясе ў пісаньні. 5. кіраваць, камандаваць *кім-чым*; стаяць на чале *чаго*: ***to lead an army*** камандаваць арміяй; ***to lead the movement*** стаяць на чале руху, кіраваць рухам; ***to lead an orchestra*** дырыгаваць аркестрам. 6. накіроўваць, схіляць: ***Curiosity led me to look again*** цікаўнасьць змусіла мяне паглядзець ізноў. 7. хадзіць (*у гульні ў карты*): ***to lead hearts*** хадзіць з чырваў
– v.i. 1. весьці, давадзіць: ***Lead, I will follow*** Вядзі, я пайду за табою; ***All roads lead to Rome*** Усе дарогі вядуць у Рым. 2. быць на першым месцы
– n. 1. кіраўніцтва *n.*, прыклад -у *m.*: ***to follow the lead (leader)*** ісьці следам. 2. першынство *n.*, перавага *f.*: ***to have a lead of five seconds*** выперадзіць на пяць сэкундаў. 3. галоўная роля, галоўны выканаўца (*у п'есе*). 4. а) уступны параграф. б) перадавы артыкул
– adj. вядучы; галоўны, кіруючы
• ***lead off*** пачынаць
lead II [led] – n. сьвінец -ца *n.*
– adj. сьвінцовы
leaden ['ledən] adj. 1. сьвінцовы. 2. цяжкі, як сьвінец. 3. нудны, панурый. 4. сіне-шэры. 5. павольны; абцяжараны
leader ['li:dər] n. 1. правадыр, кіраўнік -á *m.*, лідэр -а *m.* 2. рэгент -а *m.*, рэгентка *f.*; кіраўнік (*аркестру, хору*)
leadership ['li:dərʃɪp] n. 1. правадырства, лідэрства, кіраўніцтва *n.* 2. кіраўнічыя здольнасьці
leading ['li:dɪŋ] – adj. 1. кіруючы, вядучы. 2. найважнейшы; галоўны; перадавы
– n. настаўленьне *n.*, інструкцыя *f.*
• ***leading-edge*** перадавы
leading article перадавы артыкул (*у газэце*)
leading question навадное пытаньне
leaf [li:f] – n., pl. **leaves** 1. ліст -á і (*зборнае*) -у *m.*, *pl.* лісты, лісьцё *n.*: ***the fall of the leaves*** ападаньне лістоў. 2. ліст -á *m.*, аркуш -а *m.* (*паперы, мэталу, фанеры*). 3. устаўная дошка, адкідная дошка (*у сталé*)
– v.i. пакрывацца лісьцём, распускацца
– v.t. гартаць, перагортваць (*старонкі кнігі*)
leaf bud почка, пупышка *f.*
leaflet ['li:flət] n. 1. малы *або* маладый лісток. 2. улётка, лістоўка *f.*
leafstalk ['li:fstɔ:k] n. чаранок, хвастók -ка *m.* (*лістá*)
leafy ['li:fi] adj. 1. лісьцевы, лісьцьвяны, ліставы: ***the leafy woods*** лісьцевыя лясы. 2. лістападобны
league [li:g] – n. ліга *f.*; аб'яднаньне асобаў, арганізацыяў
– v.i., v.t. аб'яднoўвацца ў лігу; утвараць лігу
League of Nations Ліга Нацыяў
leak [li:k] – n. 1. працёк -у *m.*, дзірка, шчыліна *f.* (*у страсе, гаршку*). 2. выцяканьне *n.* 3. уцечка *f.* (*вады, газу*)

– v.i. 1. цячы́, прасо́чвацца. 2. працяка́ць (*пра чарави́кі, чо́вен*). 3. прасо́чвацца, выдава́цца: ***The secret leaked out*** Сакрэ́т ста́ўся ве́дамым

leakage ['li:kɪdʒ] n. 1. выцяка́ньне, працяка́ньне, прасо́чваньне *n.* 2. вы́дадзены сакрэ́т. 3. уце́чка *f.* (*вады́, га́зу*)

leaky ['li:ki] adj. дзіра́вы, які́ працяка́е,

lean I [li:n] – v., **leaned** (esp. Brit.) **leant** [lent] v.i. 1. пахіля́цца, нахіля́цца, схіля́цца. 2. абапіра́цца: ***Lean against me*** Абапры́ся на мяне́

– v.t. 1. нахіля́ць. 2. прыстаўля́ць, абапіра́ць. 3. спадзява́цца, разьлі́чваць, здава́цца: ***to lean on a friend's advice*** разьлі́чваць на ся́браву пара́ду. 4. схіля́цца (*у паглядах і пачу́цьцях*)

– n. нахі́л -у *m.*, пахі́ласьць *f.*

• ***lean on***, Sl. націска́ць (*на каго́-не́будзь*)

• ***lean over backward***, Informal перастара́цца

• ***on the lean*** пахі́лы, пахі́лены, нахі́лены, пад нахі́лам

lean II [li:n] – adj. 1. худы́: ***a lean face*** худы́ твар; ***lean cattle*** худа́я жывёла. 2. любо́вы, ня тлу́сты (*пра мя́са*). 3. бе́дны, мізэ́рны: ***a lean harvest*** бе́дны ўраджа́й; ***lean years*** неўраджа́йныя гады́

– n. любо́вае мя́са, любавіна *f.*

leaning ['li:nɪŋ] n. 1. схі́льнасьць, тэндэ́нцыя *f.*; нахі́л -у *m.*: ***political leanings*** палітычныя прыхі́льнасьці. 2. схіля́ньне *n.*

leant [lent] v., *past & p.p. of* **lean I** пахі́лены, схі́лены, абапёрты

leap [li:p] – n. 1. скок, падско́к -у *m.* 2. далёкасьць ско́ку

– v.i. **leaped** or **leapt** [li:pt, lept] 1. скака́ць, падско́кваць. 2. мо́цна бі́цца (*пра се́рца*)

– v.t. пераско́кваць

• ***a leap in the dark*** скок у няве́дамае; рызыко́ўнае прадпрые́мства

• ***by leaps and bounds*** ве́льмі ху́тка, бо́рзда

leapt v., *past & p.p. of* **leap** пераско́кнуты

leap year высако́сны *або́* перасту́пны год

learn [lɜ:rn] v., **learned** [lɜ:rnd] or **learnt** [lɜ:rnt] 1. вучы́цца, вывуча́ць: ***to learn French*** вывуча́ць францу́скую мо́ву. 2. дове́дваца; дазнава́цца: ***He learned the details of the accident*** Ён дове́даўся пра падрабя́знасьці няшча́снага вы́падку

learned ['lɜ:rnəd] adj. вучо́ны, адукава́ны

learning ['lɜ:rnɪŋ] n. 1. вучэ́ньне *n.* 2. вучо́насьць, адукава́насьць *f.* 3. ве́да *f.*

learnt [lɜ:rnt] **learned**, *past & p.p. of* **learn**

leasable ['li:səbəl] adj. які́ мо́жа арэндава́цца

lease [li:s] – n. 1. арэ́нда *f.*, на́ймы *pl.* 2. арэндава́ная маёмасьць

– v.t. арэндава́ць, найма́ць

leash [li:ʃ] n. павад|о́к -ка́ *m.*, абро́жка *f.*

• ***hold (have) in leash*** трыма́ць у зале́жнасьці

• ***on a long leash*** дава́ць шмат свабо́ды

• ***on a short (tight) leash*** абмяжо́ўваць, стры́мваць

least [li:st] – adj. найме́ншы

– n. найме́ншае -га *n.*: ***at (the) least*** прына́мся, прына́мсі, са́ма ме́ней; ***not in the least*** ані́

– adv. найме́нш: ***last but not least*** апо́шні, але ня ме́нш ва́жны

least common denominator агу́льны найме́ншы назо́ўнік

least common multiple агу́льнае найме́ншае дзе́ліва

leather ['leðər] – n. 1. ску́ра *f.* 2. выраб са ску́ры

– adj. 1. скураны́: ***leather gloves*** скураны́я пальча́ткі. 2. як ску́ра; раме́нны

– v.t. 1. пакрыва́ць ску́раю. 2. Informal лупцава́ць, біць рэ́мнем

leathern ['leðərn] adj. 1. скураны́. 2. як ску́ра; цьвярды́, як ску́ра

leathery ['leðəri] adj. падо́бны да ску́ры; скураны́; цьвярды́, як ску́ра: ***leathe-***

ry steak біфштэ́кс цьвярды́, як падэ́шва

leave I [li:v] v., **left, leaving** 1. выхо́дзіць: ***He left the house*** Ён вы́йшаў з до́му; ***He left the room suddenly*** Ён ра́птам вы́йшаў з пако́ю. 2. а) выяжджа́ць: ***to leave the country*** вы́ехаць з кра́ю. б) пакіда́ць, кіда́ць: ***to leave a job*** паки́нуць пра́цу. 3. пакіда́ць, ня бра́ць з сабо́ю: ***He left a book on the table*** Ён паклнуў кнігу на сталé; ***to leave a window open*** паки́нуць акно́ адчы́неным

• ***leave alone*** а) не чапа́ць. б) паки́нуць у спакоі, не перашкаджа́ць

• ***leave behind*** а) забы́ць што-н. б) пакіда́ць зза́ду, выпераджа́ць

• ***leave of absence*** бяспла́тны адпачы́нак

• ***leave off*** спыні́ць, затрыма́ць, перапыні́ць: ***Continue where you left off*** Праця́гвай адту́ль, дзе ты спыні́ўся

• ***leave out*** прапушча́ць, прапуска́ць (*сло́ва ў ска́зе*); выкіда́ць

leave II [li:v] n. 1. дазво́л -у *m.*, зго́да *f.* 2. во́дпуск -у *m.*, адпачы́нак -ку *m.*: ***on leave*** у адпачы́нку; ***on sick leave*** у адпачы́нку па хваро́бе. 3. ад'е́зд, адыхо́д -у *m.*; разьвіта́ньне *n.*

• ***maternity leave*** дэкрэ́тны адпачы́нак

• ***take leave of*** разьвіта́цца

leaven ['levən] – n. 1. дро́жджы *pl.* 2. ро́шчына, заква́ска *f.* 3. Figur. узьдзе́яньне *n.*, уплы́ў -ву *m.*

– v.t. 1. заква́шваць, рашчыня́ць (*це́ста*). 2. узьдзе́йнічаць

leaves [li:vz] n., *pl. of* **leaf** лісты́; ліcьце *n.*

leave-taking ['li:v,teikiŋ] n. разьвіта́ньне *n.*

leavings ['li:viŋz] n., pl. рэ́шткі *pl.*, ста́ткі *pl.* (*е́жы*)

Lebanese [,lebə'ni:z] – adj. лібанскі

– n. лібане́ц -ца *m.*, лібанка *f.*

lectern ['lektərn] n. 1. аналóй -ю *m.* 2. ка́тэдра *f.*

lector ['lektər] n. ле́ктар -а *m.*

lectorate ['lektərit] n. ле́ктарства *n.*

lectress ['lektris] n. ле́ктарка *f.*

lecture ['lektʃər] – n. 1. ле́кцыя *f.*, дакла́д -у *m.* 2. настаўле́ньне, павуча́ньне *n.*, ната́цыя *f.*

– v.i. чыта́ць ле́кцыю

– v.t. рабіць вымо́ву, прабіра́ць

led [led] v., *past & p.p. of* **lead**

ledge [ledʒ] n. 1. падвако́ньне *n.* 2. вы́ступ -у *m.* (*скалы́*). 3. ру́дная жы́ла

ledger ['ledʒər] n. 1. а) рэгістрацы́йны журна́л. б) бухга́льтарская кні́га. 2. надмагі́льная плі́та́

lee [li:] n. схо́вішча, ахо́ва (*ад ве́тру*)

leech [li:tʃ] – n. 1. п'я́ўка *f.*: ***to stick like a leech*** прычапі́цца, як п'я́ўка. 2. вымага́льнік -а *m.*; крывапі́вец -ўца *m.* 3. Archaic ле́кар -а *m.*

– v.i. 1. ста́віць п'я́ўкі. 2. Archaic ляча́ць

leek [li:k] n., Bot. парэ́й -ю *m.*

leer [lɪr] n. юрлі́вы по́зірк

lees [li:z] n., pl. 1. фуз -у, аса́дак -ку *m.*: ***to drink to the lees*** вы́піць да апо́шняй кро́плі. 2. падо́ньне *n.*, адо́нкі *pl.*

leeward ['li:wərd] – adj., adv. 1. падве́траны, закры́ты ад ве́тру. 2. зь ве́трам

– n. падве́траны бок (*закры́ты ад ве́тру*)

leeway ['li:wei] n. 1. дрэйф -у *m.* 2. свабо́да дзе́яньня

left I [left] – adj. ле́вы: ***left turn*** паваро́т нале́ва; ***left bank*** *(of a river)* ле́вы бе́раг, левабярэ́жжа *n.*

– adv. нале́ва

– n. ле́вы бок: ***on the left*** зьле́ва, на ле́вым баку́

left II [left] v., *past & p.p. of* **leave I**

left-handed [,left'hændid] adj. 1. левару́кі: ***left-handed person*** ляўша́, ляўшу́н. 2. для ле́вай рукі. 3. Figur. нехлямя́жы, дзіўны́, няўда́лы (*камплімэ́нт, пахвала́*)

left-hander [,left'hændər] n. ляўша́ *m. & f.*, ляўшу́н леўшуна́ *m.*

leftist or **Leftist** ['leftist] n. ле́вы -ага, лява́к левака́ *m.*, член ле́вай па́ртыі

leftover ['left,ouvər] n. рэ́шткa *f.*, ста́ткі *pl.* (*е́жы*)

leg [leg] n. 1. нага́ *f.* 2. кало́ша, калашына́, штані́на *f.* (*нагавіцаў*). 3. но́жка *f.* (*стала́, крэ́сла*). 4. ча́стка *f.*, эта́п -у *m.*: ***last leg of the trip*** апо́шні эта́п падаро́жжа. 5. бок трохку́тніка
• ***a leg up*** падсадзі́ць (*на каня́, на плот*)
• ***get up on one's hind legs*** стаць на ды́бкі, узью́шыцца, узлава́цца
• ***have not a leg to stand on*** ня мець аніяка́й падста́вы (*абараня́цца*)
• ***on one's last legs*** а) вали́цца з ног, заставацца бяз ног. б) дайсьці́ да ру́чкі
• ***pull one's leg,*** Informal абдуры́ць *каго́*, пажартава́ць, пасьмяя́цца з *каго́*
• ***shake a leg***, Sl. а) узварушы́цца. б) патанцава́ць, паскака́ць
• ***stretch one's legs*** пайсьці́ на прахо́дку, прайсьці́ся

legacy ['legəsi] n., pl. **-cies** спа́дчына *f.*

legal ['li:gəl] adj. 1. юрыды́чны. 2. зако́нны, узако́нены, лега́льны

legally ['li:gəli] adv. лега́льна

legation [lɪ'geɪʃən] n. дыпляматы́чнае прадстаўні́цтва, пасо́льства *n.*

legend ['ledʒənd] n. 1. леге́нда *f.*, наро́днае пада́ньне. 2. на́дпіс; умо́ўныя знакі́ або́ тлумачэ́ньні (*да ка́рты, пля́на*)

legendary ['ledʒənderi] adj. легенда́рны

leggings ['legɪŋz] n. 1. ле́гінзы *pl.* 2. ге́тры *pl.*

leggy ['legi] adj. даўгано́гі; цыба́ты

legible ['ledʒəbəl] adj. чытэ́льны, разбо́рлівы, выра́зны: ***legible handwriting*** разбо́рлівы по́чырк

legibly ['ledʒəbli] adv. разбо́рліва, выра́зна

legion ['li:dʒən] n. 1. легіён -а *m.* (*жаўне́раў*). 2. легіён -а *m.*, мно́ства *n.*

legionnaire [ˌli:dʒə'ner] – n. легіянэ́р -а *m.*
– adj. легіянэ́рскі

legislate ['ledʒɪsleɪt] – v.i. выдава́ць зако́ны
– v.t. пастанаўля́ць, прыма́ць пастано́ву: ***The council legislated a new law*** Ра́да прыняла́ но́вы зако́н

legislation [ˌledʒɪ'sleɪʃən] n. 1. заканада́ўства *n.* 2. вы́дадзены зако́н

legislative ['ledʒəsleɪtɪv] adj. заканада́ўчы: ***a legislative body*** заканада́ўчы о́рган

legislator ['ledʒəsleɪtər] n. заканада́вец -ўца *m.*

legislature ['ledʒəslətʃər] n. заканада́ўчая ўла́да, заканада́ўчая ўстано́ва, заканада́ўчы о́рган

legitimacy [lɪ'dʒɪtəməsi] n. зако́ннасьць, пра́ўнасьць *f.*

legitimate [lɪ'dʒɪtəmət] – adj. 1. зако́нны, легі́тымны; дазво́лены. 2. норма́льны, звыча́йны, прывы́чны. 3. зако́нна наро́джаны (*пра дзіця́*). 4. лягі́чны: ***a legitimate conclusion*** лягі́чная вы́сно́ва
– v.t. [lɪ'dʒɪtəmeɪt] узако́ньваць

legman ['legmən] n., pl. **-men** 1. пасы́льны рэпарцёр. 2. паслане́ц -ца́ *m.*, асо́ба на пабягу́шках

leguminous [lɪg'ju:mɪnəs] adj., Bot. бабо́вы; струко́вы

leisure ['li:ʒər] – n. во́льны час, во́льныя часі́ны
– adj. 1. во́льны, незаня́ты. 2. бязьдзе́йны, нічы́м не заня́ты; гуля́шчы
• ***at leisure*** во́льны, незаня́ты. б) не сьпяша́ючыся, павóлі
• ***at one's leisure*** пры нагóдзе; калі́ ёсьць час, калі́ зру́чна: ***Do it at your leisure*** Зрабе́це гэ́та, калі́ вам зручне́й

leisured ['li:ʒərd] adj. 1. бязьдзе́йны, нічы́м не заня́ты: ***the leisured class of society*** бязьдзе́йная кля́са грама́дства. 2. павóльны, мару́дны; нясьпе́шны (*крок*)

leisurely ['li:ʒərli] – adj. павóльны, мару́длівы, нясьпе́шны
– adv. павóльна, мару́дліва, не сьпяша́ючыся

leitmotif or **leitmotiv** ['laɪtmoʊˌti:f] n. ля́йтматы́лў -ву *m.*

lemon ['lemən] – n. 1. лімо́н -а *m.*, цытры́на *f.* 2. сьветла-жо́ўты, лімо́нны ко́лер

– adj. лімо́нны (*ко́лер і смак*)
lemonade [ˌlemə'neɪd] n. лімана́д -у *m.*
lemon-colored [ˌlemən'kʌlərd] adj. лімо́ннага ко́леру
lemon drop лімо́нны ледзяне́ц
lend [lend] v., **lent, lending,** v.t. 1. пазыча́ць. 2. надава́ць: ***to lend probability to a story*** надава́ць верагодна́сьці апавяда́нью
• ***lend a hand*** дапамагчы́
• ***lend itself*** or ***oneself to*** паддава́цца
• ***lend one's ear*** вы́слухаць
length [leŋθ] n. 1. даўжыня́ *f.* (*пра адле́гласьць*). 2. праця́гласьць (*ча́су*), праця́жнасьць *f.* (*гу́ку*)
• ***at full length*** на ўсю́ даўжыню́
• ***at length*** а) нарэ́шце. б) падрабя́зна, абшы́рна
• ***keep at arm's length*** трыма́цца на пава́жнай адле́гласьці
lengthen ['leŋθən] – v.t. падаўжа́ць
– v.i. падаўжа́цца
lengthwise ['leŋθwaɪz] – adv. уздо́ўж
– adj. падо́ўжны
lengthy ['leŋθi] adj. 1. задо́ўжаны, незвыча́йна даўгі́. 2. расьця́гнуты: ***lengthy description*** расьця́гнутае апіса́ньне
leniency ['li:niənsi] n. лагодна́сьць, далікатна́сьць, пабла́жлівасьць, талера́нтнасьць *f.*
lenient ['li:niənt] adj. паблажлі́вы; памяркоўны; спага́длівы
lens [lenz] n. 1. лі́нза *f.* 2. Anat. крышта́лік -а *m.*: ***contact lenses*** канта́ктныя лі́нзы
lent [lent] v., *past & p.p. of* **lend**
Lent [lent] n. вялі́кі пост (*пе́рад Вялі́каднем*)
Lenten or **lenten** ['lentən] adj. 1. велікапо́сны. 2. по́сны; змро́чны, несьвяточны
lentil ['lentəl] n. сачы́ўка, сачаві́ца *f.*
leonine ['li:ənaɪn] adj. ільві́ны; як леў
leopard ['lepərd] n. леапа́рд -а *m.*
leper ['lepər] n. пракажо́н|ы -ага *m.*, пракажо́ная *f.*
leprosy ['leprəsi] n. прака́за *f.*
lesbian ['lezbiən] n. лесьбія́нка *f.*

less [les] – adj., adv. 1. ме́ншы; менш, ме́ней: ***less known*** ме́ней ве́дамы; ***less important*** менш ва́жны. 2. ніжэ́йшы ра́нгам, ве́кам
– n. ме́ншая ко́лькасьць, ме́ней: ***He refused to take less than $5*** Ён адмо́віўся ўзя́ць менш, як 5 даля́раў
– prep. без, мі́нус: ***a year less two days*** год бяз двух дзён
• ***less and less*** усё ме́ней і ме́ней
• ***none the less*** тым ня менш
lessen ['lesən] – v.i. ме́ншаць, зьмянша́цца; спада́ць, убыва́ць
– v.t. зьмянша́ць; прымянша́ць, перамянша́ць: ***to lessen the achievements of others*** прымянша́ць по́сьпехі і́ншых
lesson ['lesən] – n. 1. ле́кцыя *f.*, уро́к -у *m.*: ***to give a music lesson*** дава́ць ле́кцыю му́зыкі; ***to prepare a Belarusian lesson*** падрыхто́ўваць ле́кцыю белару́скае мо́вы. 2. нау́ка, нау́чка *f.*: ***Let this be a lesson to you*** Хай гэ́та бу́дзе для вас нау́кай. 3. Figur. ната́цыя *f.*, настаўле́ньне *n.*
– v.t. 1. дава́ць ле́кцыі, вучы́ць. 2. Figur. рабі́ць вымо́ву, настаўля́ць, навуча́ць
let [let] v., **let, letting** v.t. 1. дазваля́ць; дава́ць: ***Let him tell it*** Да́йце ямў сказа́ць. 2. а) пуска́ць, прапуска́ць: ***to let a person on board a ship*** прапусьці́ць чалаве́ка на карабе́ль. 3. выпуска́ць: ***to let blood*** пуска́ць кроў. 4. здава́ць у на́ймы, здава́ць у арэ́нду. 5. дапуска́ць: ***Let the two lines be parallel*** Дапу́сьцім, што гэ́тыя дзьве лі́ніі паралє́льныя
• ***let down*** а) спуска́ць ніжэ́й. б) расчаро́ўваць, падво́дзіць. в) прыніжа́ць, зьневажа́ць
• ***let go*** пусьці́ць, вы́пусьціць (*на во́лю ці з рук*)
• ***let in*** упушча́ць, дазво́ліць зайсьці́
• ***let know*** паведамі́ць
• ***let loose*** вы́звалiць, вы́пусьціць
• ***let me alone (be)*** не перашкаджа́й мне, адчапі́ся ад мяне́, паки́нь мяне ў спако́і

• **let off** а) адпусьці́ць (*са слу́жбы*); адпусьці́ць (*бяз ка́ры*). б) вы́пусьціць: **to let off passengers** выпушча́ць, высаджваць пасажы́раў
• **let out** а) выпушча́ць, дазво́ліць вы́йсьці, уцячы́. б) падо́ўжыць *або́* пашы́рыць (*адзе́ньне*). в) здава́ць (*у на́ймы*). г) прагаварыцца, вы́даць таямні́цу
• **Let's go home** Хадзе́м дамо́ў
• **Let's play** Дава́й гуля́ць

letdown ['letdaʊn] n. 1. заняпа́д -у *m.* 2. расчарава́ньне *n.* 3. прыніжэ́ньне *n.*

lethal ['li:θəl] adj. сьмяро́тны (*пра ра́ну, зброю*), сьмяртэ́льны

lethargic [lə'θɑ:rdʒɪk] or **lethargical** [lə'θɑ:rdʒikəl] adj. 1. со́нны, вя́лы, апаты́чны. 2. летаргі́чны

lethargy ['leθərdʒi] n., pl. **-gies** 1. со́ннасьць, вя́ласьць, апаты́чнасьць *f.* 2. Med. летаргі́я *f.*

letter ['letər] – n. 1. лі́тара *f.* 2. ліст -а́ *m.* 3. літара́льны сэнс. 4. афіцы́йны дакумэ́нт, гра́мата *f.*
– v.t. 1. пазнача́ць лі́тарамі. 2. падпі́сваць
• **letters** пісьме́нства *n.*, літарату́ра *f.*: **a man of letters** пісьме́ньнік -а *m.*
• **to the letter** ве́льмі дакла́дна

letter box пашто́вая скры́нка

letter carrier пашта́р -а́ *m.*, пашта́рка *f.*; лістано́ша *m. & f.*

lettered ['letərd] adj. 1. пазна́чаны лі́тарамі. 2. пісьме́нны; начы́таны; адукава́ны, вучо́ны

letterhead ['letərhed] n. афіцы́йны бля́нк

lettuce ['letəs] n. сала́та *f.*

leukemia or **leukaemia** [lu'ki:miə] n. леўкемі́я *f.*, рак крыві́

levee I ['levi] n. 1. да́мба, грэ́бля *f.*; насып -у *m.* 2. берагавы́ вал раки́. 3. пры́стань *f.*

levee II or **levée** ['levi] n. афіцы́йнае ра́нішняе прыня́цьце

level ['levəl] – adj. 1. ро́ўны: **a level floor** ро́ўная падло́га. 2. гарызанта́льны. 3. на тым са́мым узро́ўні. 4. адно́лькавы, ро́ўны, адно́лькава ва́жны: **to be level in ability** быць адно́лькава здо́льным, мець такі́я са́мыя здо́льнасьці. 5. ро́ўны, спако́йны: **a level tone** спако́йны тон. 6. ураўнава́жаны, разва́жны: **a level head** развáжная галава́
– n. 1. а) пло́ская, гарызанта́льная паве́рхня, ро́ўнядзь *f.* б) узро́вень -ю *m.*: **above sea level** над узро́ўнем мо́ра. 2. вышыня́ *f.* (*паво́дкі і пад.*). 3. нарматы́ўная ко́лькасьць: **cholesterol level** ко́лькасьць халестэры́ну. 4. грунтва́га *f.*, ватэрпа́с -а *m.*
– v. 1. разраўно́ўваць; раўня́ць. 2. раўня́ць зь зямлёй, разбура́ць дашчэ́нту. 3. цэ́ліцца; накіро́ўваць, скіро́ўваць (*стрэл, сло́вы*). 4. ураўнава́жваць
• **find one's level** увайсьці́ ў рэ́чышча
• **level off** зраўня́цца, згла́дзіцца, ураўнава́жыцца
• **level with** Sl. сказа́ць пра́ўду, прызна́цца, адкры́цца
• **one's level best** не́чы найбо́льшы, найле́пшы вы́сілак; усё, што ад не́кага зале́жыць
• **on the level** Informal на ўзро́ўні; справядлі́ва, праўдзі́ва

level crossing перае́зд, перахо́д -у *m.* (*чыгу́начны*)

lever ['levər] – n. 1. падва́жнік -а *m.*; ва́га *f.*, вага́р -а́, рыча́г -а́ *m.*: **control lever** вага́р кірава́ньня
– v. падыма́ць падва́жнікам, ва́гай, рычаго́м

leverage ['levərɪdʒ] n. 1. падва́жваньне *n.* 2. Figur. уплы́ў -ву *m.*: **to use leverage** выкарыстоўваць уплы́ў

levitate ['levɪteɪt] v.i. падыма́цца й вісе́ць у пове́тры, быць у ста́не левіта́цыі

levity ['levəti] n., pl. **-ties** 1. легкаду́мнасьць, несур'ёзнасьць *f.* 2. няста́ласьць, зьме́нлівасць *f.* 3. лёгкасьць *f.* (*вагі́*)

levy ['levi] – v.t. 1. накладáць, зьбіра́ць (*пада́ткі*). 2. набіра́ць, мабілізава́ць у во́йска. 3. забра́ць (*за даўгі́*)
– n. 1. збор -у *m.* (*гро́шай, пада́ткаў*). 2. набо́р у во́йска

• ***levy war on (against)*** пачына́ць вайну́ супро́ць *каго́*

levy en masse паспалі́тае рушэ́ньне, наро́днае апалчэ́ньне

lewd [lu:d] adj. 1. распу́сны, агі́дны; непрыстóйны. 2. Obsol. а) неадукава́ны. б) ні́зкі; бязва́ртасны; беспрынцыпóвы

lexical ['leksɪkəl] adj. лексы́чны; слóўні-кавы

lexicon ['leksəkɑ:n] n. лексыкóн -а і -у *m.* а) слóўнік -а *m.* б) слóўны запáс

liability [ˌlaɪə'bɪlətɪ] n., pl. **-ties** 1. схі́льнасьць *f.*: ***liability to disease*** схі́льнасьць да хварóбаў. 2. абавя́занасьць, адка́знасьць *f.*: ***liability for a debt*** адка́знасьць за доўг. 3. перашкóда, замі́нка *f.*

• ***liabilities*** даўгі́, запазы́чанасьць

liability insurance страхóўка на вы́падак адка́знасьці

liable ['laɪəbəl] adj. 1. падле́глы *чаму́*, схі́льны да *чаго́*: ***Glass is liable to break*** Шкло лёгка б'е́цца. 2. адка́зны за *што*. 3. абавя́заны да *чаго́*

liaison ['li:əzɑ:n] n. 1. су́вязь *f.*, узаемадачыне́ньне *n.* 2. нелега́льная любóўная су́вязь. 3. Phon. зьліцьцё гу́каў

liaison officer сувязны́ афіцэ́р

liar ['laɪr] n. хлус -á *m.*, манюкa -і *m. & f.*; ілгу́н -á *m.*, ілгу́ньня *f.*

libel ['laɪbəl] – n. 1. зьнеслаўле́ньне, ганьбава́ньне *n.* 2. паклёп -у *m.*

– v.t. паклёпнічаць

liberal ['lɪbərəl] – adj. 1. шчóдры; бага́ты: ***a liberal donation*** шчóдрае ахвярава́ньне. 2. а) талера́нтны; лібэра́льны: ***a liberal thinker*** мысьля́р з шырóкімі пóглядамі. б) адвóльны: ***a liberal interpretation of a rule*** вóльная інтэрпрэта́цыя пра́віла. 3. лібэра́льны

– n. лібэра́л -а *m.*

Liberal ся́бра па́ртыі лібэра́лаў

liberalism ['lɪbərəlˌɪzəm] n. лібэралі́зм -у *m.*

liberality [ˌlɪbə'rælətɪ] n., pl. **-ties** 1. шчóдрасьць *f.* 2. шчóдры дар. 3. талера́нтнасьць; лібэра́льнасьць *f.*

liberal arts вы́звaленыя, гуманіта́рныя навýкі

liberate ['lɪbəreɪt] v.t. 1. вызваля́ць. 2. Chem. выдзяля́ць

liberated ['lɪbəreɪtəd] adj. вы́звалены

liberation [ˌlɪbə'reɪʃən] n. вызвале́ньне *n.*

liberator ['lɪbəreɪtər] n. вызвóльнік -а, вызвалі́цель -я *m.*

libertine ['lɪbərti:n] – n. 1. распу́сьнік -а *m.* 2. вальнадýмец -ца *m.*

– adj. 1. распýсны, разбэ́шчаны. 2. вальнадýмны

liberty ['lɪbərtɪ] n., pl. **-ties** 1. вóля *f.*; незале́жнасьць *f.* 2. пра́ва *n.*, свабóда *f.*: ***liberty of speech (action)*** свабóда слóва (дзе́яньня). 2. дазвóл -у *m.*, згóда *f.* 3. прывілéі, правы́ *pl.* 4. вóльнасьць *f.*, лішняя фамілья́рнасьць

• ***at liberty*** а) вóльны, на вóлі: ***to set prisoners at liberty*** вы́пусьціць вя́зьняў на вóлю. б) дазвóлены: ***You are at liberty to make any choice*** Вы мóжаце вы́браць, што хóчаце. в) незаня́ты

• ***take liberties*** дазваля́ць сабé вóльнасьці, празьмéрную фамілья́рнасьць

libidinous [lɪ'bɪdənəs] adj. юрлі́вы

librarian [laɪ'brerɪən] n. бібліятэ́кар -а *m.*, бібліятэ́каркa *f.*

library ['laɪbrerɪ] n., pl. **-ries** бібліятэ́ка *f.*

library stacks кні́жныя фóнды

Libyan ['lɪbɪən] – adj. лібі́йскі

– n. лібі́ец -йца *m.*

lice [laɪs] n., *pl. of* **louse**

license ['laɪsəns] – n. 1. дазвóл -у *m.* 2. пасьвéдчаньне *n.* 3. ліцэ́нзія *f.* 4. злоўжыва́ньне свабóдай

– v.t. 1. дава́ць дазвóл. 2. дазваля́ць закóнам

licentious [laɪ'senʃəs] adj. 1. распýшчаны, разбэ́шчаны, немара́льны. 2. які́ ня лі́чыцца з пра́вiламі

lichen ['laɪkən] – n. 1. Bot. лішáлiй -я́ *m.*, лішáйнік -у *m.* 2. лішáлiй -я́ *m.* (*хвароóба скýры*)

– v.t. пакрыва́ць мóхам

lick [lɪk] – v.t. 1. лізáць, аблі́зваць. 2. вылі́зваць: ***The cat licked the plate clean*** Кот чы́ста вы́лізаў талéрку. 3.

Informal біць, калаці́ць, лупцава́ць. 4. Informal перамага́ць (*у бо́йцы, спабо́рніцтве*)
– n. 1. аблі́званьне *n.* 2. Informal уда́р -у *m.* 3. мала́я ко́лькасьць, крыха́ *f.*

licker ['lɪkər] n. лізу́н -а́ *m.*, лізу́ха *f.*

lickerish ['lɪkərɪʃ] adj. 1. ла́сы; хці́вы, прагаві́ты. 2. разбэ́шчаны; юрлі́вы

licking ['lɪkɪŋ] n. 1. Informal лупцо́ўка *f.*: ***to give a licking*** даць лупцо́ўку, набі́ць. 2. няўда́ча *f.*, пашко́джаньне *n.*: ***His business took a bad licking*** Ягó-нае прадпрыéмства пацярпе́ла вялі́кую няўда́чу

lickspittle ['lɪkˌspɪtəl] n. лісьлі́вец -ўца *m.*, падлі́зьнік, падхалі́м -а *m.*

lid [lɪd] n. 1. ве́ка *n.*, *dim.* ве́чка *n.* 2. на́крыўка *f.* (*на гаршо́к*). 3. паве́ка *n.* (*во́ка*)

lie I [laɪ] – n. 1. мана́, ілжа́, хлусьня́ *f.* 2. няпра́ўда *f.*
– v.i., **lied, lying** маніць, хлусі́ць, ілга́ць; каза́ць няпра́ўду, ашу́кваць
• ***give the lie to*** а) абвінава́чваць *каго́* ў мане́. б) выка́зваць нязго́ду з *чым*

lie II [laɪ] – v., **lay, lain, lying,** v.i. 1. ляжа́ць. 2. лажы́цца: ***to lie down*** ляга́ць; кла́сьціся. 3. ***to lie idle (unused)*** ляжа́ць без ужы́тку. 4. ляжа́ць, знахо́дзіцца: ***Land that lay along a river*** Зямля́, яка́я ляжа́ла ўздо́ўж рэ́чкі; ***What a future lies before him!*** Што за бу́дучыня пе́рад ім!
– n. 1. месцазнахо́джаньне *n.*, кіру́нак чаго́-н. 2. стано́вішча *n.*, стан -у *m.* (*спра́ваў*). 3. лагво́ *n.*, бярло́г -а *f.* (*зьвяра́*)
• ***lie back*** адвалі́цца, адкі́нуцца, ле́гчы на сьпіну́
• ***lie by*** бязьдзе́йнічаць, адпачыва́ць
• ***lie over*** адкла́сьці на пасьля́
• ***take an insult lying down*** прыня́ць абра́зу мо́ўчкі

lieutenant [lu:'tenənt] n. 1. наме́сьнік -а *m.*, наме́сьніца *f.* 2. лейтэна́нт -а *m.*

lieutenant colonel падпалко́ўнік -а *m.*

lieutenant general генэра́л-лейтэна́нт

lieutenant governor наме́сьнік губэрна́тара

life [laɪf] n., pl. **lives** [laɪvz] 1. жыцьцё *n.*; існава́ньне *n.* 2. час існава́ньня *або́* дзе́яньня, трыва́ньня: ***a lease's life*** тэ́рмін арэ́нды. 3. асо́ба *f.*, жыва́я істо́та: ***Five lives were lost*** Стра́чана было́ 5 асо́баў. 4. жыцьцяпі́с -у *m.*, біяграфія *f.* 5. запа́л -у *m.*, энэ́ргія *f.*, жыцьцё: ***to put life into one's work*** працава́ць з душо́й, запа́лам
• ***as big (large) as life*** а) у натура́льную велічыню́. б) ула́снай асо́бай: ***Here he is as large as life*** Вось і ён ула́снай асо́бай
• ***bring to life*** а) ажывіць, ажы́ць. б) прывéсьці да прыто́мнасьці
• ***come to life*** апрыто́мнець.
• ***for life*** на ўсё жыцьцё, пажыцьцёва
• ***for dear life*** з усяé сі́лы, нібы́ ратуючы жыцьцё
• ***for the life of me*** нізашто́ ў жыцьці́
• ***not on your life*** у ніякім вы́падку
• ***take a life*** забі́ць *каго́*
• ***take one's life in one's hands*** а) ско́нчыць жыцьцё самагу́бствам. б) пайсьці́ на вялі́кую ры́зыку

life belt выратава́льны по́яс, ко́ла

lifeboat ['laɪfbout] n. выратава́льная ло́дка, шлю́пка *f.*

life-giving ['laɪfˌgɪvɪŋ] adj. жыватво́рны, які́ падтрымо́ўвае жыцьцё

lifeguard ['laɪfgɑ:rd] n. ратаўні́к -а́ *m.* (*на пля́жы, у басэ́йне*)

life imprisonment пажыцьцёвае зьняво́леньне

life insurance страхава́ньне жыцьця́

life jacket выратава́льная камізэ́лька

lifeless ['laɪfləs] adj. 1. пазба́ўлены жыцьця́: ***lifeless planet*** безжыцьцёвая плянэ́та. 2. мёртвы, нежывы́

lifelike ['laɪflaɪk] adj. як жывы́; як спра́ўдны

lifelong ['laɪflɔ:ŋ] adj. на ўсё жыцьцё, праз жыцьцё, пажыцьцёвы: ***a lifelong commitment*** абавя́заньне на ўсё жыцьцё

lifesize ['laɪfsaɪz] or **life-sized** ['laɪfsaɪzd] adj. у натура́льную велічыню́: ***a life-size portrait*** партрэ́т у натура́льную велічыню́

lifetime ['laɪftaɪm] – n. 1. праця́г жыцця́, век -у *m.*: ***in my lifetime*** на маі́м вяку́. 2. час трыва́ньня: ***lifetime of the contract*** час кантра́кту
– adj. на ўсё жыццё, пажыццёвы: ***a lifetime friend*** ся́бра на ўсё жыццё

lift [lɪft] – v.t. 1. падыма́ць, паднімаць; узьнімаць. 2. узвыша́ць; узно́сіць. 3. Informal а) кра́сьці. б) займа́цца пля-гія́там
– v.i. 1. падыма́цца. 2. расьсе́йвацца, разыхо́дзіцца
– n. 1. уздыім -у *m.* 2. падня́цьце *n.* 3. павышэ́ньне, пале́пшаньне *n.* 4. Brit. ліфт -у *m.*
• ***give a lift*** а) падтрыма́ць. б) падве́зьці

ligament ['lɪgəmənt] n. 1. Anat. зьвя́зка *f.* 2. Figur. по́вязь *f.*

light I [laɪt] – n. 1. сьвятло́ *n.*, аг|о́нь -ня́ *m.* 2. асьвятле́ньне. 3. дзённае сьвятло́; сьвіта́н|ак, зо́л|ак -ку *m.* 4. расьве́т -у *m.* 5. сьветлафо́р -у *m.* 6. Figur. ве́да *f.*; інфарма́цыя *f.*; выясьне́ньне *n.*
– adj. сьве́тлы; я́сны: ***light blue*** сьве́тла-сі́ні
– v.t. (**lighted** or **lit**) 1. запа́льваць. 2. асьвятля́ць
– v.i. 1. загара́цца, запа́львацца. 2. разьясьня́цца. 3. сьвяці́ць. 4. ажыўля́цца; сьвяці́цца (*пра во́чы*)
• ***bring to light*** вы́явіць, вы́весьці на чы́стую ваду́
• ***come to light*** вы́явіцца
• ***in the light*** а) у сьвятле́: ***in the light of these facts*** у сьвятле́ гэ́тых фа́ктаў. б) з гле́дзішча *чаго́*
• ***see the light*** уба́чыць сьвятло́, а) нарадзі́цца. б) зразуме́ць, пазна́ць, усьведамі́цца
• ***shed*** or ***throw light on*** праліць сьвятло на *што*; растлума́чыць

light II [laɪt] adj. 1. лёгкі, лёгенькі: ***a light rain*** лёгкі дождж: ***a light sleep*** нямо́цны сон. 2. нецяжкі́, лёгкі (*пра пра́цу*); лаго́дны, лёгкі (*пра ка́ру*). 3. лёгкі, вясёлы: ***light reading*** чыта́ньне для прые́мнасьці, лёгкае чыта́ньне. 5. нязна́чны: ***light losses*** нязна́чныя стра́ты. 6. ры́хлы, пяшча́ны, лёгкі (*пра гле́бу*). 7. нямо́цны (*пра віно́*); нятлу́сты, малакалярыі́йны (*пра е́жу*). 8. Milit. лёгкі (*ко́ньніца*); мало́га кало́ібру

lighten I ['laɪtən] – v.i. 1. сьвятле́ць. 2. сьвяці́цца, ясьне́ць. 3. бліскаць маланкай: ***It thundered and lightened*** Грыме́ла і бліскалі маланкі
– v.t. асьвятля́ць

lighten II ['laɪtən] – v.t. зьмяншаць цяжа́р; зьмякча́ць, паслабля́ць (*боль*); палягча́ць
– v.i. 1. лягчэ́ць. 2. Figur. адчува́ць палёгку; весяле́ць; узьнімаццa: ***Their spirits lightened*** У іх узьня́ўся настро́й

lighter ['laɪtər] n. запальні́чка, запальні́ца *f.*

lighthead ['laɪthed] n. легкаду́мны чалаве́к

light-headed [ˌlaɪt'hedɪd] adj. 1. які́ адчувае галавакружэ́ньне: ***Wine made him light-headed*** Ад віна́ ў яго́ закруці́лася галава́. 2. пусты́, легкаду́мны, несур'ёзны

light-hearted [ˌlaɪt'hɑ:rtəd] adj. вясёлы, бестурбо́тны

light-heartedness [ˌlaɪt'hɑ:rtədnəs] n. бестурбо́тнасьць, жыццярада́снасьць *f.*

lighthouse ['laɪthaʊs] n. маяк -а́ *m.*

lighting ['laɪtɪŋ] n. асьвятле́ньне *n.*

lightless ['laɪtləs] adj. без сьвятла́, цьмя́ны

lightly ['laɪtli] adv. 1. лёгка; зьлёгку; ледзь, ле́дзьве. 2. зь лёгкім сэ́рцам, вясёла. 3. непава́жна: ***to speak lightly of a person*** гаварыць пра каго́-н. непава́жна. 4. неабду́мана; легкаду́мна, нядба́ла

lightness I ['laɪtnəs] n. я́снасьць, сьве́тласьць *f.*

lightness II ['laɪtnəs] n. 1. лёгкасьць *f.* (*но́шы, хады́*). 2. лаго́днасьць *f.* 3. далікатнасьць, гра́цыя *f.* 4. несур'ёзнасьць, легкаду́мнасьць *f.*

lightning ['laɪtnɪŋ] – n. малáнка, бліскавíца *f.* 2. бліск -у *m.* (*сьвятлá*)
– adj. бліскавíчны; вокамгнéнны
lightning conductor or **rod** малáнкаадвóд, громаадвóд -а *m.*
lightsome I ['laɪtsəm] adj. 1. жывы́, жвáвы; шу́стры, лёгкі. 2. вясёлы, рáдасны. 3. нястáлы, вéтраны, пусты́
lightsome II ['laɪtsəm] adj. 1. які́ сьвéціцца, зьзя́е, даé сьвятлó. 2. дóбра асьвéтлены; ілюмінавáны
lightweight ['laɪtweɪt] n. 1. асóба вагí нiжэ́йшай за сярэ́днюю. 2. баксёр лёгкай вагí. 3. Informal неўплывóвая асóба, невялíкая шы́шка
likable ['laɪkəbəl] adj. прыéмны; прывáбны, мíлы
like I [laɪk] – adj. 1. падóбны: ***in a like manner*** падóбным спóсабам. 2. аднóлькавы: ***like sum*** аднóлькавая сýма
– prep. як; падóбны да: ***She is like her sister*** Янá падóбная да сваé сястры́; ***She can sing like a bird*** Янá пяé, як птýшка; ***It looks like rain*** Падóбна на тóе, што бýдзе дóждж; ***I feel like working*** Я мáю ахвóту працавáць
– adv. падóбна, так: ***Do not talk like that*** Не гавары́ так
– n. 1. рóўны -га *m.*, раўня́ *m. & f.* 2. нéшта падóбнае
– conj. як бы́ццам, як бы, нíбы: ***He acted like he was afraid*** Ён паступáў, нíбы баючы́ся
• ***and the like*** і гэ́так далéй, і да тагó падóбнае
• ***like crazy***, Sl. як ашалéлы, як апантáны
• ***nothing like*** нічóга падóбнага, зусім не
• ***something like*** каля́; амáль
like II [laɪk] – v.t. 1. любíць, упадабáць: ***I like dancing*** Я люблю́ танцавáць; ***She likes him but does not love him*** Ён ёй падабáецца, але янá ягó не кахáе. 2. жадáць: ***I should like more time*** Я хацéў бы мець больш чáсу
– v.i. любíць; хацéць: ***Boys like to play*** Хлапцы́ лю́бяць гуля́ць; ***Come whenever you like*** Прыдзí калі хóчаш
• ***likes*** тóе, што падабáецца: ***our likes and dislikes*** тóе, што мы лю́бім і чагó ня лю́бім
likelihood ['laɪklihʊd] n. праўдападóбнасьць, верагóднасьць, магчы́масьць *f.*
likely ['laɪkli] – adj. 1. праўдападóбны, магчы́мы. 2. адпавéдны, дóбры: ***Is this a likely place to fish?*** Ці гэ́та дóбрае мéсца для лóўлі ры́бы?
– adv. праўдападóбна; магчы́ма: ***very likely*** бадáй што
likeness ['laɪknəs] n. 1. падабéнства *n.* 2. партрэ́т -а *m.*; кóпія *f.* 3. вы́гляд -у *m.*; фóрма *f.*
likewise ['laɪkwaɪz] adv. 1. гэ́так сáма; гэ́так жа; падóбным чы́нам, у падóбны спóсаб. 2. таксáма
liking ['laɪkɪŋ] n. 1. прыхíльнасьць, сымпáтыя *f.* 2. смак -у *m.*; схíльнасьць, прыéмнасьць *f.*
lilac ['laɪlək] – n. 1. бэз -у *m.* 2. блéдна-лíлёвы кóлер
– adj. 1. бэ́завы. 2. блéдна-лíлёвы
lilt [lɪlt] – v. жвáва йграць *абó* пяя́ць
– n. 1. жывáя пéсьня *абó* мэлёдыя. 2. рытм -у *m.* (*пéсьні, вéрша*). 3. сьпéўная інтанáцыя
lily ['lɪli] – n., pl. **lilies** лілéя, лíлія *f.*
lily of the valley, pl. **lilies of the valley** лáндыш -а *m.*, канвáлія *f.*
limb [lɪm] – n. 1. член цéла, канéчнасьць *f.* 2. сук -á *m.*, галíна *f.* (*дрэ́ва*)
– v.t. разьдзяля́ць, расчляня́ць
• ***go out on a limb*** рызыкавáць, ставíць сябé ў небясьпéчнае станóвішча
limber ['lɪmbər] – adj. гнýткі; падаўкí; спры́тны, паварóтны
– v. рабíць (-ца) гнýткім
lime I [laɪm] – n. вáпна *f.*
– v.t. 1. вапнавáць. 2. цэмэнтавáць
lime II [laɪm] n. лайм -а *m.* (*род лімóна*)
lime III [laɪm] n. лíпа *f.*
limestone ['laɪmstoʊn] n. вапня́к -ý *m.*
limit ['lɪmɪt] – n. 1. мяжá, граніца *f.* 2. канéц -цá *m.*, край -я, лімíт -у *m.*: ***at the limit of patience*** на крáі цярпéньня 3. Math. граніца *f.*

– v.t. абмяжо́ўваць

limitary ['lɪmɪtəri] adj. 1. абмежава́ны. 2. абмежава́льны. 3. паме́жны

limitation [ˌlɪmɪ'teɪʃən] n. 1. абмежава́нне *n.* 2. недахо́п -у *m.*, зага́на, ва́да *f.*: ***to have one's limitations*** мець сваі́ слабы́я бакі́. 3. апо́шні тэ́рмін

limited ['lɪmətəd] adj. абмежава́ны

• ***limited company*** акцы́йная супо́лка (*з абмежава́най адка́знасьцю*)

• ***limited monarchy*** канстытуцы́йная манархія

limitless ['lɪmɪtləs] adj. бяскра́йны, бязме́жны

limp I [lɪmp] – n. кульга́васьць *f.*, паку́льгваньне *n.*

– v.i. 1. кульга́ць, паку́льгваць. 2. ісьці́ зь ця́жкасьцю, ледзь ру́хацца

limp II [lɪmp] adj. 1. мяккі́, мя́ккі; вя́лы: ***limp flowers*** вя́лыя кве́ткі. 2. слабы́, мля́вы; бязво́льны

limping ['lɪmpɪŋ] – adj. кульга́вы

– adv. кульга́ючы

linage ['laɪnɪdʒ] n. ко́лькасьць радко́ў на бачы́не (*у дру́ку*). б) парадко́вая апла́та

linden ['lɪndən] – n. лі́па *f.*

– adj. лі́павы: ***linden blossom*** лі́павы цьвет

line I [laɪn] – n. 1. лі́нія, ры́са *f.*; вяро́ўка *f.*, шнурло́к -ка́ *m.*: ***a clothes line*** шнур для бялі́зны; ***a fish line*** лёска *f.*, валасьні́к -а́ *m.* 2. мяжа́, грані́ца *f.*, паграні́чная лі́нія. 3. рад -а *m.*; шарэ́нга, чарга́ *f.*: ***a line of persons*** чарга́; ***to march in a line*** маршыраваць шарэ́нгай; ***a line of trucks*** аўтакалёна. 4. радло́к -ка́ *m.* (*ве́рша, ліста́*), каро́ткі ліст, запі́ска: ***Drop me a line*** Напішы́ мне па́ру слоў. 5. тэлефо́нная *або́* чыгу́начная лі́нія. 6. абры́сы *pl.*, ко́нтур -а *m.*

– v.t. 1. правóдзіць лі́нію, разьлінэ́йваць. 2. ста́віць у рад *каго́-што.* 3. ме́раць лінэ́йкай

– v.i. стро́іцца ў рад, у лінэ́йку; шыхава́цца

• ***all along the line*** праз увесь час, на ўсі́м працягу́

• ***come into line*** згаджа́цца; падпара́дкавацца

• ***down the line*** да са́мага канца́

• ***draw a (the) line*** вы́значыць лімі́т; усталява́ць мяжу́

• ***in line with*** у адпаве́днасьці, у зго́дзе з *чым*

• ***line a street with trees*** абсадзі́ць ву́ліцу дрэ́вамі

• ***line up*** а) става́ць у чаргу́. б) зрабіць даступ́ным, прыдба́ць

• ***out of line*** а) у нязго́дзе. б) які́ дрэ́нна захо́ўваецца

• ***read between the lines*** чыта́ць паміж радко́ў

• ***the line*** эква́тар -а *m.*

line II [laɪn] v.t. 1. падшыва́ць падкла́дку (*у палітó*); абабіва́ць зь сярэ́дзіны. 2. напаўня́ць, набіва́ць: ***to line one's pockets with money*** набіць кішэ́ні грашы́ма, разбагаце́ць

lineage ['lɪnɪɪdʒ] n. 1. радаво́д -у *m.* 2. род -у *m.*

linear ['lɪnɪər] adj. 1. лінэ́йны; зь лі́ніяў. 2. па лі́ніі: ***a linear succession from father to son*** спа́дчыннасьць па лі́ніі ад ба́цькі да сы́на. 3. як лі́нія, даўгі́ й ву́зкі. 4. прапарцы́йны, сувыме́рны: ***a linear relationship*** прапарцы́йная су́вязь, зале́жнасьць; ***linear equation*** Math. раўна́ньне пе́ршае ступе́ні

• ***linear measure*** ме́ра даўжыні́

linen ['lɪnɪn] – n. 1. лён (*палатно́ або́ ні́ткі*). 2. бялі́зна *f.*; хусьцё *n.*

– adj. ільняны́

• ***wash one's dirty linen in public*** выно́сіць сьме́цьце з ха́ты

liner ['laɪnər] n. ла́йнэр -а *m.*

linger ['lɪŋgər] – v.i. 1. цягну́цца; заця́гвацца (*пра хваро́бу*); затры́мвацца. 2. мару́дзіць; адця́гваць

– v.t. расьця́гваць, праця́гваць

• ***linger away*** тра́ціць час

• ***linger on*** марне́ць, ледзь жыць

lingerie [ˌlɑ:ndʒə'reɪ] n. жано́чая бялі́зна

lingual ['lɪŋgwəl] – adj. 1. язы́чны. а) ***a lingual nerve (muscle)*** язы́чны нэ́рв (му́скул). б) Phon. ***lingual sounds*** язы́чныя гу́кі. 2. мо́ўны

– n. Phon. язы́чны гук

linguist ['lɪŋgwɪst] n. 1. мовавéд, лінгвíст -а, мовазна́лвец -ўца *m.* 2. палігло́т -а *m.*

linguistic [lɪŋ'gwɪstɪk] or **linguistical** [-stɪkəl] adj. мо́ўны; мовазна́ўчы, мовавéдны, лінгвісты́чны

linguistics [lɪŋ'gwɪstɪks] n. мовазна́ўства *n.*, мовавéда, лінгвíстыка *f.*

lining ['laɪnɪŋ] n. 1. падкла́дка, падбíўка, падшы́ўка *f.* 2. Figur. зьмéсьціва *n.* (*кішэ́ні, то́рбы, ку́фра*). 3. прышыва́ньне падкла́дкі

link [lɪŋk] – n. 1. зьвяно́, лучво́ *n.* 2. су́вязь *f.*, дачыне́ньне *n.*: ***to establish links (with)*** нала́дзіць це́сную су́вязь з *кім-чым*

– v.t. спалуча́ць (*як ко́лцам*)

– v.i. спалуча́цца; быць зьвя́заным

• ***link arms*** узя́цца за ру́кі, спалучы́цца

linoleum [lɪ'nouliəm] n. лінó́леум -у *m.*

linseed ['lɪnsi:d] n. ільняно́е се́мя: ***linseed oil*** ільняны́ але́й

lion ['laɪən] n. 1. леў, ільва́ *m.* 2. сьве́цкі леў; славу́тасьць *f.*

• ***lion's share*** ільві́ная до́ля (*бо́льшая ці найле́пшая ча́стка*)

Lion ['laɪən] n. Леў (*сузо́р'е і знак задыя́ка*)

lioness ['laɪənəs] n. (і)льві́ца *f.*

lionet ['laɪənət] n. (і)львянля́, (і)львянлё *n.*

lion's ['laɪənz] adj. (і)льві́ны

lip [lɪp] – n. 1. губа́ *f.* 2. краль -ю *m.* (*збанка́, зво́на, ра́ны*). 3. мушту́к -á, амбушу́р -а *m.* (*ча́стка духаво́га інструме́нта*)

– adj. губны́

• ***hang on the lips of*** слу́хаць разьве́сіўшы ву́шы, лавíць ко́жнае сло́ва

• ***lips*** ву́сны *pl.*

• ***read my lips,*** Informal намата́й на вус; до́бра запа́мятай

lip service няшчы́рыя, пусты́я сло́вы

lipstick ['lɪpstɪk] n. губна́я пама́да

liquefy ['lɪkwɪfaɪ] v., **-fied, -fying** разро́джваць, расплаўля́ць; зьмяня́ць *або́* зьмяня́цца ў ва́дкасьць; надава́ць *або́* набыва́ць ва́дкі стан

liquescent [lɪ'kwesənt] adj. які́ перахо́дзіць у ва́дкі стан, які́ растае́

liqueur [lɪ'kɜ:r] – n. лікёр -у *m.*

– adj. лікёрны

liquid ['lɪkwɪd] – n. 1. ва́дкасьць *f.* 2. Phon. пла́ўны зы́чны

– adj. 1. ва́дкі; распла́ўлены. 2. празры́сты, сьве́тлы́. 3. Fin. ліквíдны. 4. Phon. пла́ўны

liquidate ['lɪkwɪdeɪt] v. 1. спла́чваць (*доўг*). 2. ліквідава́ць (*прадпрые́мства, спра́вы*). 3. банкрутава́ць. 4. пазбыва́цца *каго́-чаго́*; выбіва́ць, вынішча́ць. 5. ператвара́ць у ная́ўныя гро́шы

liquidation [ˌlɪkwɪ'deɪʃən] n. ліквіда́цыя *f.*: ***liquidation sale*** канчатко́вы распро́даж

liquor ['lɪkər] – n. 1. алькаго́льны напой: ***hard liquor*** мо́цны алькаго́льны напо́й (*гарэ́лка, ві́скі*). 2. расо́л -у *m.*

– v.t. 1. апуска́ць *або́* мачы́ць у расо́ле. 2. ма́заць тлу́шчам (*ску́ру ці абу́так*)

• ***in liquor*** п'яны́, вы́піўшы

• ***liquor store*** кра́ма з алькаго́льнымі напо́ямі

lisp [lɪsp] – v.i., v.t. 1. шапеля́віць. 2. сюсю́каць

– n. шапеля́васьць *f.*, шапеля́веньне *n.*: ***to speak with a lisp*** гаварыць шапеля́ва

list I [lɪst] – n. сьпіс, пералíк -у *m.*

– v.t. 1. рабíць сьпіс; запíсаць, зано́сіць у сьпіс, сьпíсваць, склада́ць пералíк. 2. залічáць, прызыва́ць на слу́жбу ў во́йска

– v.i. запíсвацца; прызыва́цца ў во́йска. *Гл. таксáма* **enlist**

list II [lɪst] n. 1. краль -ю *m.*, бераглóк -ка́ *m.* (*тканíны*), паласа́ *f.* 2. баразна́ зро́бленая плужко́м (*пры абво́рваньні бурако́ў, бу́льбы*)

list III [lɪst] – n. крэн, нахíл -у *m.*

– v.i. нахіля́цца, хілíцца

listen ['lɪsən] v.i. 1. слу́хаць, прыслухо́ўвацца: ***He likes to listen to music*** Ён лю́біць слу́хаць му́зыку. 2. слу́хацца

• ***listen in*** а) падслухо́ўваць. б) слу́хаць ра́дыё

listenable ['lɪsənəbəl] adj. прые́мны для слу́ханьня, ва́рты слу́ханьня

listener ['lɪsənər] n. слуха́ч -а́ *m.*, слуха́чка *f.*

lister ['lɪstər] n. плужо́к для абво́рваньня (*абсыпа́ньня*)

listless ['lɪstləs] adj. абыя́кавы, апаты́чны

listlessly ['lɪstləsli] adv. абыя́кава; без зацікаўленасьці

lists [lɪsts] n., pl. only абгаро́джанае ме́сца, ара́на *f.*

lit [lɪt] – v., *p.t. and p.p. of* **light**
– adj. 1. запа́лены. 2. асьве́тлены

liter, Brit. **litre** ['li:tər] – n. лі́тар -ра *m.*
– adj. літро́вы

literacy ['lɪtərəsi] n. пісьме́ннасьць *f.*

literal ['lɪtərəl] adj. літара́льны, дасло́ўны; про́сты: ***the literal meaning of a word*** літара́льнае значэ́ньне сло́ва; ***literal and figurative sense*** про́сты і перано́сны сэнс

literally ['lɪtərəli] adv. дасло́ўна, літара́льна; у дасло́ўным сэнсе

literary ['lɪtəreri] adj. літарату́рны, літаратуразна́ўчы

literate ['lɪtərət] – adj. 1. пісьме́нны. 2. адукава́ны; літарату́рна адукава́ны
– n. пісьме́нны, адукава́ны чалаве́к

literati [ˌlɪtə'rɑ:ti] n., pl. of **literatus** літара́тары, інтэліге́нты

literature ['lɪtərətʃər] n. літарату́ра *f.*; пісьме́нства *n.*

lithe [laɪð] adj. гі́бкі, гну́ткі: ***a lithe willow*** гну́ткая вярба́

lithograph ['lɪθəgræf] – n. літагра́фія *f.*; літаграфі́чны адбі́так
– v. літаграфава́ць

lithographer [lɪ'θɑ:grəfər] n. літо́граф -а *m.*

Lithuanian [ˌlɪθu'eɪniən] – adj. літо́ўскі
– n. 1. літо́вец -ўца *m.*, летува́с -а *m.* 2. літо́ўская мо́ва

litigate ['lɪtəgeɪt] v.i. судзі́цца

litmus ['lɪtməs] n. ля́кмус -у *m.*: ***litmus paper*** ля́кмусавая папе́ра

litter ['lɪtər] – n. 1. хлам'ё, сьмяцьцё *n.*, раскі́даныя рэ́чы. 2. непара́дак -ку *m.*, неаха́йнасьць *f.* 3. прыпло́д -у *m.* (*шчаня́т, кацяня́т*). 4. по́дсьціл для жывёлы. 5. насі́лкі *pl. only*
– v.t. 1. раскіда́ць рэ́чы, папе́ры без пара́дку. 2. рабіць непара́дак. 3. дава́ць прыпло́д (*пра жывёлу*). 4. падсьціла́ць, насьціла́ць сало́май
– v.i. парасі́цца; шчані́цца (*пра саба́ку, ваўчы́цу*)

littery ['lɪtəri] adj. засьме́чаны; неаха́йны

little ['lɪtəl] – adj., **less** or **lesser, least** 1. малы́, мале́нькі, невялі́кі, невялі́чкі; нязна́чны, малава́жны: ***He has but little ability*** Ён ма́е невялі́кія здо́льнасьці. 2. абмежава́ны, недалёкі; малава́жны: ***little thoughts*** малава́жныя, дро́бныя ду́мкі
– adv. ма́ла; няшма́т; крыху́, кры́шку: ***We see little of him*** Мы рэ́дка яго́ ба́чым; ***a little-known author*** малавядо́мы а́ўтар. 2. зусі́м не: ***a coward is little liked*** баязьлі́ўца ня лю́бяць
– n. 1. крыха́ *f.*; нязна́чная ко́лькасьць; ма́ла: ***add a little*** дада́й крыху́, кры́шку: ***He knows very little*** Ён ве́льмі ма́ла ве́дае; ***a little at a time*** пакрысе́. 2. каро́ткі час: ***After a little you will feel better*** Ху́тка вам пале́пшае. 3. абы-што; дро́бязь *f.*; глу́пства *n.*

• ***in little*** у малы́м, невялі́кім машта́бе; у мініяту́ры

• ***little by little*** памале́ньку; патро́ху; паступо́ва

• ***make little of*** лічы́ць малава́жным; не надава́ць вагі́ *чаму́*

• ***not a little*** ве́льмі, шмат

• ***think little of*** а) лічы́ць нява́жным або́ бязва́ртасным. б) не вага́цца, не хіста́цца

little finger ме́зенец -ца *m.* (*на руцэ́ і назе́*), ме́зены па́лец

liturgy ['lɪtərdʒi] n., pl. **-gies** літургі́я *f.*, царко́ўная багаслу́жба, абе́дня *f.*

livable ['lɪvəbəl] adj. 1. жылы́, адпаве́дны, прыда́тны для жытла́. 2. ужы́ў-

чывы. 3. прыма́льны; ніштава́ты (*жыцьцё, умо́вы*)

live I [lɪv] – v.i. 1. жыць, існава́ць. 2. жыві́цца; харчава́цца: ***to live on bread and water*** жыць на вадзе́ й хле́бе; ***to live by one's wits*** сяк-так, не́як выкру́чвацца, перабіва́цца; ***to live in the country*** жыць на вёсцы

– v.t. пражы́ць (*жыцьцё*)

• ***live down*** а) апраўда́ць цнатлі́вым жыцьцём (*віну́, грахі́*). б) перажы́ць

• ***live it up,*** Sl. карыста́ць з жыцьця́, жыць напо́ўніцу

• ***live out*** а) вы́жыць. б) жыць наво́даль. в) перажыва́ць

• ***live up to*** жыць, дзе́йнічаць зго́дна з *чым* (*пры́нцыпамі, пра́вілами*): ***to live up to the treaty*** трыма́цца пастано́ваў тракта́ту

live II [laɪv] adj. 1. жывы́. 2. жывы́, гара́чы, гару́чы: ***live coals*** не пага́слае вуго́льле, жар -у *m.*: ***a live quarrel*** гара́чая сва́рка. 3. бадзёры, по́ўны жыцця́: ***a live person*** дзе́йны, по́ўны эне́ргіі чалаве́к. 4. жывы́, яскравы: ***a live color*** жывы́ ко́лер. 5. з жывы́м то́кам: ***live wire*** а) электры́чны дрот з жывы́м то́кам. б) Informal энэргі́чны і пране́клівы чалаве́к. 6. у жыву́ю: ***live show*** пака́з у жыву́ю; ***live broadcast*** жывы́ этэ́р. 7. жывы́, вясёлы: ***a live party*** вясёлая, жыва́я кампа́нія

livelihood ['laɪvlɪhʊd] n. сро́дкі на пражыцьцё; утрыма́ньне *n.*

liveliness ['laɪvlɪnəs] n. жы́васьць, жва́васьць *f.*; бадзёрасьць, весяло́сьць *f.*

lively ['laɪvlɪ] adj. 1. по́ўны жыцця́, дзе́йны, бадзёры. 2. я́сны, жывы́ (*пра ко́лер*). 3. ажы́ўлены (*пра гу́тарку*). 4. сьве́жы (*пра пове́тра*)

liver ['lɪvər] n. пе́чань, пячо́нка *f.*

liverwort ['lɪvərwɜ:rt] n., Bot. пячо́начнік -а *m.*

livery ['lɪvərɪ] n., pl. **-eries** 1. ліўрэ́я *f.* 2. пако́рм -у *m.* (*ко́ней*), ста́йня *f.* 3. пака́т -у *m.* (*ко́ней, аўтамабі́ляў*)

livestock ['laɪvstɑ:k] n. сво́йская жывёла, жывы́ інвэнта́р; пагало́ўе *n.*: ***livestock breeding*** жывёлагадо́ўля

livid ['lɪvɪd] adj. 1. а) шэрава́та-сі́ні: ***a livid sea*** шэ́ра-сі́няе мо́ра. б) зьбяле́лы, пасіне́лы: ***livid with rage*** пасіне́лы ад зло́сьці. 2. у сіняко́х; чо́рна-сі́ні

living ['lɪvɪŋ] – adj. 1. жывы́, які́ жыве́. 2. дзе́йны; мо́цны. 3. ве́льмі падо́бны; вы́літы: ***He is a living image of his father*** Ён — вы́літая ко́пія ба́цькі. 4. жыцьцёвы: ***living conditions*** умо́вы жыцьця́; ***living expenses*** выда́ткі на пражы́так

– n. 1. жыцьцё *n.*: ***living in the country*** жыцьцё на вёсцы. 2. сро́дкі на пражы́так: ***What does he do for a living?*** З чаго́ ён жыве́?

• ***within living memory*** за людзко́й па́мяці

living room гасьцёўня *f.*

lizard ['lɪzərd] n. я́шчарка *f.*, я́шчар -а *m.*

load [loʊd] – n. 1. груз -у *m.* 2. цяжа́р -у *m.*; нагру́зка *f.*: ***a load of debt*** цяжа́р даўго́ў

– v.t. 1. грузі́ць, нагружа́ць: ***to load grain*** грузі́ць збо́жжа; ***to load a car*** нагружа́ць а́ўта. 2. Figur. абцяжа́рваць; наладо́ўваць. 3. абсыпа́ць, надзяля́ць: ***to load with compliments*** абсы́паць камплімэ́нтамі. 4. зараджа́ць (*гарма́ту, стрэ́льбу*)

• ***get a load of*** заўва́жыць

• ***loads,*** Informal вялі́кая ко́лькасьць, мно́ства *n.*: ***loads of money*** ку́па гро́шай; ***loads of people*** мно́ства людзе́й

loaf I [loʊf] n., pl. **loaves** бо́хан -а *m.*, буха́нка *f.* (*хле́ба*); бу́лка *f.*: ***end of the loaf (of bread)*** акра́лец -йца *m.*

loaf II [loʊf] v.i. 1. гультаява́ць, нічо́га не рабіць. 2. марнава́ць час: ***to loaf one's life away*** праве́сьці жыцьцё бязьдзе́йна

• ***loaf around*** бадзя́цца, абіва́цца

loafer ['loʊfər] n. 1. а) гульта́й -я́ *m.*, гульта́йка *f.* б) бадзя́гла -і *m. & f.* 2. лёгкія ту́флі

loam [loʊm] n. 1. гліня́ная абма́зка, сама́н -у *m.* 2. ураджа́йная зямля́; гліна й пясо́к зь перагно́ем

• ***clay loam*** сугліна́к
• ***sandy loam*** су́песак

loamy ['ləʊmi] adj. сугліністы

loan [ləʊn] – n. пазы́ка *f.*; запазы́чаньне *n.*: ***a loan word*** запазы́чанае сло́ва
– v. дава́ць пазы́ку, пазыча́ць

loan shark ліхвя́р -а́ *m.*, ліхвя́рка *f.*

loath [ləʊθ] adj. неахво́тны: ***to be loath to depart*** ад'яжджа́ць зь неахво́тай
• ***nothing loath*** ахво́тны; ахво́тна

loathe [ləʊð] v.t. гі́дзіцца, мо́цна не любі́ць; ненавідзець

loathful ['ləʊðfəl] adj. ненавісны, ненавідны; агі́дны

loathsome ['ləʊðsəm] adj. агі́дны; абры́длы; мо́ташны

lobby ['lɑ:bi] – n., pl. **-bies** 1. пярэ́дні пако́й, вэстыбю́ль -я *m.* 2. ло́бі *n., indecl.*
– v.t. лабіява́ць, лабі́раваць

lobbyist ['lɑ:biist] n. лабі́ст -а *m.*

lobe [ləʊb] n. мо́чка *f.* (*ву́ха*)

lobster ['lɑ:bstər] n. амар, рак -а *m.*

local ['ləʊkəl] – adj. 1. мясцо́вы. 2. тутэ́йшы. 3. мясцо́вы (*боль, хваро́ба*). 4. прыга́радны: ***local traffic*** прыга́радны рух
– n. 1. прыга́радны цягні́к, аўто́бус. 2. мясцо́вы жы́хар, тутэ́йшы -ага *m.*

local anesthesia мясцо́вае абязбо́ль-ваньне, мясцо́вая анэстэзі́я

locality [ləʊ'kæləti] n., pl. **-ties** мясцо́васьць, акру́га *f.*

localize ['ləʊkəlaɪz] v.t. спыні́ць пашыра́ньне, лякалізава́ць (*пажа́р, эпідэ́мію*)

locate ['ləʊkeɪt] – v.t. 1. памяшча́ць, зьмяшча́ць: ***He located his office in the center of town*** Ён разьмясьці́ў сваё бюро́ ў цэ́нтры го́раду 2. выяўля́ць месцазнахо́джаньне: ***to locate Miensk on the map*** знайсьці́ Менск на ка́рце. 4. вызнача́ць: ***to locate a highway*** вы́значыць тра́су для аўтастра́ды
– v.i. сяліцца; разьмяшча́цца; знахо́дзіцца; ляжа́ць: ***Viciebsk is located on the Dzvina*** Віцебск стаі́ць на Дзьвіне́

location [ləʊ'keɪʃən] n. 1. разьмяшча́ньне *n.* 2. вызнача́ньне ме́сца. 3. ме́сца *n.*

locative ['lɑ:kətɪv] n., Gram. ме́сны склон

lock I [lɑ:k] – n. 1. замо́к -ка́ *m.* 2. шлюз -а *m.*
– v.t. 1. замыка́ць на ключ. 2. съціска́ць а) у абды́мках. б) у змага́ньні, ду́жаньні. 3. запру́джваць, гаці́ць (*раку́*)
– v.i. замыка́цца
• ***lock arms*** мо́цна ўзя́цца за ру́кі, трыма́цца ра́зам
• ***lock away*** замкну́ць
• ***lock in*** замкну́ць і не выпушча́ць
• ***lock out*** замкну́ць дзьве́ры і не ўпушча́ць
• ***lock, stock, and barrel*** Informal усё дашча́нту, ца́лкам
• ***lock together*** зашчапля́цца (*пра зу́бы ко́лаў*); сашчапі́ць
• ***under lock and key*** замкну́ты, пад надзе́йным замко́м, на замку́

lock II [lɑ:k] n. 1. ку́дзер, ло́кан -а *m.* 2. па́сма (*валасо́ў, лёну*)

locked [lɑ:kt] adj. замкну́ты, замкнёны

locker ['lɑ:kər] n. ша́фка *f.*

locker room разьдзява́льня *f.* (*на прадпрые́мстве, стадыёне*)

locket ['lɑ:kɪt] n. мэдальён -а *m.*

lockout ['lɑ:kaʊt] n. лака́ўт -у *m.*

locksmith ['lɑ:ksmɪθ] n. сьле́сар -а *m.*

locomotion [ˌləʊkə'məʊʃən] n. рух -у *m.*, перамяшча́ньне *n.*

locomotive [ˌləʊkə'məʊtɪv] – n. лякаматы́ў -ва *m.*
– adj. 1. які́ ру́хае, ру́хаецца: ***locomotive power*** ру́хаючая сі́ла. 2. рухо́мы. 3. лякаматы́ўны

locust ['ləʊkəst] n. 1. саранча́ *f.* 2. цыка́да *f.* 3. Bot. род ака́цыі

lode [ləʊd] n. ру́дная жы́ла

lodestar ['ləʊdstɑ:r] n. 1. правадна́я зо́рка. 2. Паля́рная зо́рка. 3. Figur. вядучы, галоўны прынцып; цэ́нтар ува́гі, зацікаўле́ньня

lodge [lɑ:dʒ] – n. 1. ха́тка, да́ча *f.*; зае́зны дом, часо́вае жытло́. 2. лёжа (*масо́нская*). 3. варто́ўня *f.*

– v.t. 1. даць прыту́лак *або́* начле́г. 2. даць кватэ́ру. 3. заяўля́ць, падава́ць: ***to lodge a complaint*** пада́ць ска́ргу
– v.i. 1. засяля́цца (*у зае́зным дварэ́, гатэ́лі*). 2. найма́ць пако́й

lodger ['lɑ:dʒər] n. кватара́нт -а *m.*, кватара́нтка *f.*, найма́льнік -а *m.*, найма́льніца *f.* (*кватэ́ры*)

lodging ['lɑ:dʒɪŋ] n. часо́вы прыту́лак, начле́г -у *m.*

lodgings наня́ты пако́й

lodging house гатэ́ль -я, пансіён -а *f.*

loft [lɔ:ft] – n. 1. падстрэ́шша *n.*; гара́ *f.*, гарышча *n.* (*у до́ме*); манса́рда *f.* 2. вы́шкі *pl.* (*у гумне́, хлеве́*). 3. ве́рхні паве́рх (*скла́ду фа́брыкі*). 4. хо́ры (*у царкве́*). 5. галубя́тнік -а *m.*; чарада́ галубо́ў
– v.t. падбі́ць угару́ (*мяч*)

loftily ['lɔ:ftɪli] adv. 1. узвы́шана, узня́та. 2. фанабэ́рыста, ганары́ста, пыхлі́ва

loftiness ['lɔ:ftinəs] n. 1. узвы́шанасьць, узнёсласьць *f.* (*ідэа́лаў*). 2. ганары́стасьць; напы́шлівасьць, пы́ха *f.*

lofty ['lɔ:fti] adj. 1. ве́льмі высо́кі, які́ ўзвыша́ецца. 2. ве́лічны; узвы́шаны, узнёслы. 3. ганары́сты, пыхлі́вы

log [lɔ:g] – n. 1. пале́на, бервяно́ *n.*; кало́да *f.* 2. за́піс у рэ́стры, у ва́хтавым журна́ле
– v.i. працава́ць на лесанарыхто́ўцы
– v.t. валі́ць дрэ́вы. 2. запі́сваць у ва́хтавы журна́л
– adj. зь бярве́ньня: ***a log house*** ха́та зь бярве́ньня
• ***log on (in)*** Comput. увайсьці́ ў кампу́тар, залагава́цца
• ***log off*** Comput. вы́йсьці з кампу́тара, адлагава́цца

logarithm ['lɔ:gərɪðəm] n. лагары́тм -у *m.*

logbook ['lɔ:gbʊk] n. 1. ва́хтавы журна́л (*вадапла́ва*). 2. бартавы́ журна́л (*самалёта*)

logger ['lɔ:gər] n. 1. лесару́б -а *m.* 2. машы́на для ладава́ньня і вы́вазу бярве́ньня

loggerhead ['lɔ:gərhed] n. тупі́ца -ы *m.* & *f.*, ёлупень -ня *m.*
• ***be at loggerheads*** быць у нязго́дзе

logic ['lɑ:dʒɪk] n. лёгіка *f.*

logical ['lɑ:dʒɪkəl] adj. 1. лягі́чны. 2. пасьлядо́ўны. 3. разва́жны: ***a logical man*** разва́жны чалаве́к

logistics [loʊ'dʒɪstɪks] n. матэрыя́льна-тэхні́чнае забесьпячэ́ньне

loin [lɔɪn] n. паляндві́ца *f.*
• ***loins*** а) крыж -а *m.* (*ча́стка це́ла*). б) паясьні́ца, сярэ́дзіна *f.*

loiter ['lɔɪtər] v. 1. сно́ўдацца, швэ́ндацца. 2. ба́віць, прабаўля́ць час

loll [lɑ:l] – v.i. 1. расьсяда́цца, разва́львацца: ***to loll on a sofa*** развалі́цца на кана́пе. 2. зьвіса́ць; матля́цца, целяпа́цца. 3. высало́пвацца (*пра язы́к*)
– v.t. высало́пваць (*язы́к*)

lollipop or **lollypop** ['lɑ:lipɑ:p] n. ляпдзя́ш ледзяша́, ледзянцо́ -ца́ *m.*, цукёрка-смакта́лка

lone [loʊn] adj. 1. само́тны; адзіно́кі; адзі́ны: ***the lone traveler*** само́тны падаро́жнік; ***the lone survivor*** адзі́ны ацале́лы. 2. адзіно́тны. 3. адасо́блены, само́тны (*дом, дрэ́ва*)

loneliness ['loʊnlinəs] n. само́та, адзіно́та *f.*

lonely ['loʊnli] adj. 1. адзіно́тны, марко́тны. 2. бязьлю́дны, пусты́нны (*пра даро́гу, ме́сца*). 3. само́тны, адасо́блены (*пра дрэ́ва, дом*)

lonesome ['loʊnsəm] adj. 1. марко́тны. 2. ну́длівы: ***a lonesome journey*** ну́дная падаро́жжа. 3. бязьлю́дны, пусты́нны (*шлях, даро́га*)

long I [lɔ:ŋ] – adj. 1. а) даўгі́, до́ўгі. б) празьме́рна даўгі́, праця́глы. 2. даўгі́ (*у даўжыню́, паме́рам*): ***two meters long*** даўжынёю два мэ́тры; ***a speech five pages long*** прамо́ва на пяць бачы́наў. 3. даўгі́ час: ***I have not seen him for a long time*** Я даўно́ яго́ ня ба́чыў. 4. Phon., Gram. даўгі́ (*гук*)
– adv. 1. до́ўга: ***I can't stay long*** Я не магу́ до́ўга заста́вацца; ***not long*** ня́до́ўга. 2. ***all night long*** усю́ ноч. 3. ***long ago*** даўно́. 4. даўгі́ час пе́рад ці пасьля́: ***long since*** даўгі́ час пасьля́;

long before даўгі́ час пе́рад, за́даўна пе́рад; ***not long before*** незадо́ўга да – n. даўгі́ час: ***for long*** на даўгі́ час, надо́ўга; ***not for long*** ненадо́ўга
• ***before long*** ху́тка, неўзаба́ве
• ***So long!*** Тымча́сам! Быва́йце!
• ***the long and the short of it*** ко́ратка ка́жучы

long II [lɔ:ŋ] v.i. 1. мо́цна хаце́ць, пра́гнуць: ***He longs to go home*** Яго́ ця́гне дамо́ў. 2. тужы́ць, сумава́ць

longanimity [ˌlɔ:ŋgəˈnɪməti] n. доўгацярпе́ньне *n.*

longanimous [ˌlɔ:ŋgˈænɪməs] adj. доўгацярплі́вы, цярплі́вы

longevity [lɑ:nˈdʒevəti] n. 1. даўгале́цьце *n.*, даўгаве́чнасьць *f.* 2. даўжыня́, праця́гласьць жыцьця́

long-eared [ˌlɔ:ŋˈɪrd] adj. даўгаву́хі

long-haired [ˌlɔ:ŋˈherd] adj. доўгавало́сы

long-headed [ˌlɔ:ŋˈhedɪd] adj. 1. до́ўгагало́вы; даліхацэфа́л. 2. Figur. хі́тры; пране́клівы; прадба́члівы; здага́длівы

longing [ˈlɔ:ŋɪŋ] n. (мо́цнае) жада́ньне, туга́ *f.*

longitude [ˈlɑ:ndʒətu:d] n., Geogr. даўгата́ *f.*

longitudinal [ˌlɑ:ndʒəˈtu:dənəl] adj. 1. падо́ўжны: ***longitudinal section*** падо́ўжнае сячэ́ньне. 2. геаграфі́чнай даўгаты́

long-legged [ˌlɔ:ŋˈlegɪd] adj. даўгано́гі, цыба́ты

long-lived [ˌlɔ:ŋˈlaɪvd] adj. даўгаве́чны

long-nosed [ˌlɔ:ŋˈnoʊzd] adj. даўгано́сы

long-player [ˌlɔ:ŋˈpleɪər] n. 1. а) до́ўгайгра́льная кружэ́лка. б). прайграва́льнік на кружэ́лкі

longshoreman [ˈlɔ:ŋʃɔ:rmən] n., pl. **-men** до́кер -а *m.*, парто́вы гру́зчык

long-sighted [ˌlɔ:ŋˈsaɪtəd] adj. 1. дальназо́ркі. 2. Figur. дальнаба́чны, празо́рлівы

long-standing [ˌlɔ:ŋˈstændɪŋ] adj. да́ўны, да́ўні: ***a long-standing feud*** да́ўная варо́жасьць

long-suffering [ˌlɔ:ŋˈsʌfərɪŋ] – adj. до́ўгацярплі́вы, шматпаку́тны – n. до́ўгацярпе́ньне *n.*

long-term [ˌlɔ:ŋˈtɜ:rm] adj. до́ўгатэрмі́но́вы (*адпачы́нак, пазы́ка*)

long-tongued [ˌlɔ:ŋˈtʌŋd] adj. до́ўгаязы́кі; языка́ты, балбатлі́вы

longways [ˈlɔ:ŋweɪz] or **longwise** [ˈlɔ:ŋwaɪz] adv. уздо́ўж

long-winded [ˌlɔ:ŋˈwɪndɪd] adj. 1. шматсло́ўны, расьця́гнуты (*раска́з, вы́ступ*). 2. з мо́цнымі лёгкімі (*для бе́гу*)

look [lʊk] – v.i. 1. глядзе́ць (-ца); пазіра́ць: ***Look!*** Глянь!; ***to look at*** разглада́ць; прыглада́цца. 2. шука́ць. 3. быць ува́жным; браць пад ува́гу. 4. выглада́ць: ***It looks as if it might rain*** Выглада́е, што мо́жа быць дождж – n. 1. пагля́д, по́гляд -у *m.* ; по́зірк -у *m.* 2. агля́д -у *m.*: ***Take a quick look around the house*** Ху́тка агле́дзьце ха́ту. 3. вы́гляд -у *m.*
• ***look after*** даглада́ць, наглада́ць
• ***looked after*** дагле́джаны
• ***look at*** глядзе́ць на *каго́-што*
• ***look back*** ду́маць пра міну́лае, прыпаміна́ць; аглада́цца
• ***look down on*** грэ́баваць
• ***look in*** зазірну́ць, заско́чыць на хві́лі́нку
• ***look into*** разабра́цца з *чым*
• ***look forward to*** чака́ць, спадзява́цца
• ***look out*** быць асьцяро́жным, ува́жлівым
• ***look over*** праглада́ць, аглада́ць
• ***look up (a word in a dictionary)*** паглядзе́ць, пашука́ць (*сло́ва ў сло́ўніку*)
• ***looks*** во́нкавы вы́гляд: ***good looks*** прыгажо́сьць; мілы, прые́мны вы́гляд
• ***look up to*** шанава́ць *каго́*, захапля́цца *кім-чым*

looker-on [ˌlʊkərˈɑ:n] n., pl. **lookers-on** глада́ч гледача́ *m.*; наглада́льнік, назіра́льнік -а *m.*

looking glass [ˈlʊkɪŋglæs] n. лю́стра, люстэ́рка *n.*

lookout [ˈlʊkaʊt] n. 1. пі́льнасьць *f.*, назіра́ньне *n.*: ***be on the lookout*** будзь

пі́льным. сьцеражы́ся. 2. назіра́льнік -а *m.*, ва́хта *f.*; дазо́рны -ага *m.* 3. назіра́льны пункт. 4. пля́ны на бу́дучыню

loom I [lu:m] – n. 1. кро́сны *pl. only*. 2. тка́цтва *n.*
– v.t. тка́ць на кро́снах

loom II [lu:m] – v.i. 1. няя́сна вымалёўвацца, маячыць. 2. вісе́ць у паве́тры, навіса́ць (*пра пагро́зу*)
– n. няя́сны абры́с

loon [lu:n] n. гага́ра *f.* (*пту́шка*)

loop [lu:p] – n. пятля́ *f.*
– v.t. 1. рабіць пятлю́. 2. завя́зваць на пятлю́

loophole ['lu:phoul] n. 1. шчы́ліна *f.* 2. байні́ца *f.* (*у сьцяне́*). 3. Figur. вы́крут -у *m.*, дзі́рка, шчы́ліна *f.*, праза́з -у *m.* (*у зако́не, законапрае́кце*)

loose [lu:s] – adj. 1. шыро́кі, во́льны, прасто́рны (*пра во́пратку*). 2. незамацава́ны: ***a loose thread*** во́льны канец ні́ткі; ***a loose tooth*** зуб, які хіста́ецца. 3. во́льны, непрывя́заны: ***a loose dog*** непрывя́заны саба́ка. 4. нячы́льны, ра́дкі (*тканіна*); ры́хлы, рассы́пісты (*пра гле́бу*). 5. недакла́дны, расплы́вісты; во́льны: ***loose translation*** во́льны пераклад. 6. разьвя́зны: ***a loose character*** разьвя́зны хара́ктар. 7. нясшы́ты, незамацава́ны: ***a loose leaf*** укладны́ ліст. 8. балбатлі́вы: ***a loose tongue*** балбату́н -а́ *m.* 9. здо́льны нашко́дзіць: ***a loose cannon*** непрадказа́льны чалаве́к, які́ мо́жа нарабіць бяды́
– v.t. 1. вызваля́ць; адвя́зваць. 2. разьвя́зваць. 3. паслабля́ць, адпуска́ць
– v.i. вызваля́цца; адвя́звацца, разьвя́зацца
– adv. свабо́дна; ненаця́гнута; нячы́льна; во́льна (*пераклада́ць*)
• ***break*** or ***cut loose*** аддзяліцца, парва́ць дачыне́ньні
• ***let loose, set*** or ***turn loose*** вы́звалiць; вы́пусьціць; адпусьці́ць
• ***on the loose,*** Informal на во́лі; нестрыма́на, расьпераза́на

loosen ['lu:sən] v.t. паслабля́ць, адпуска́ць; адвя́зваць, разьвя́зваць

loot [lu:t] – n. здабы́ча *f.* (*вае́нная*); нарабава́нае *n.*
– v.t. рабава́ць

lop I [lɑ:p] – n. дро́бныя галі́нкі, сукі́
– v.t. абсяка́ць; абраза́ць (*галі́ны, сукі́*)
• ***lop away*** ачышча́ць, церабіць дрэвы ад сукоў
• ***lop off*** падраза́ць, скарача́ць

lop II [lɑ:p] – v. **(-pp-)** 1. зьвіса́ць; спуска́цца ўні́з; вісе́ць. 2. зьве́шваць
– adj. зьві́слы, абві́слы

lopsided [ˌlɑ:p'saɪdɪd] adj. нахі́лены на бок; аднабо́кі

loquacious [lou'kweɪʃəs] adj. гаваркі́, гаварлі́вы

lord [lɔ:rd] n. 1. пан, ула́сьнік -а *m.*; валадар, улада́р -а́ *m.* 2. лорд -а *m.*

Lord [lɔ:rd] n. Бог, Го́спад -а

lordly ['lɔ:rdli] adj. 1. як лорд; ве́лічны, арыстакраты́чны; пы́шны; па́нскі. 2. ганары́сты, напы́шлівы (*паво́дзіны*); наха́бны; зьняважлівы

lose [lu:z] – v., **lost, losing**, v.t. 1. губля́ць: ***He lost his book*** Ён згубі́ў сваю́ кні́гу. 2. тра́ціць, стра́чваць: ***to lose patience*** стра́ціць цярплі́васьць: ***to lose one's head*** здурэ́ць. 3. прайгрыва́ць (*гро́шы, закла́д*). 4. марнава́ць (*час, нагоду*)
– v.i. губля́цца, стра́чвацца: ***to get lost*** згубі́цца; ***The ship and its crew were lost*** Карабе́ль і яго́ная кама́нда згубі́ліся *або́* былі́ стра́чаныя
• ***lose oneself*** а) разгубля́цца; губля́цца (*у лі́ках і пад.*) б) паглыбля́цца ў ро́здум

loss [lɔ:s] n. стра́та *f.*
• ***at a loss*** няпэ́ўны; разгу́блены: ***to be at a loss to*** не магчы́, ня здо́лець; ***at a loss to explain*** ня здо́лець растлума́чыць

losses стра́ты *pl.*

lost [lɔ:st] – v., *p.t., p.p. of* **lose**
– adj. 1. стра́чаны. 2. згу́блены. 3. прайгра́ны. 4. змарнава́ны, стра́чаны (*час*)

lot [lɑ:t] – n. 1. жэ́рабя *n.*: ***to cast (draw) lots*** кідáць (цягнýць) жэ́рабя; ***to settle by lot*** вы́рашыць жэ́рабем. 2. лёс -у *m.*, дóля *f.*, кон -у *m.* 3. пляц -у *m.* 4. тэрытóрыя кінастýдыі. 5. грýпа, кампáнія *f.*: ***a fine lot of boys*** грýпа дóбрых хлапцóў; ***these items are from the same lot*** гэ́тыя рэ́чы з таго́ сáмага камплéкту, з той сáмай пáртыі (*тавáру*). 6. Informal тып -у ***m.***: ***He is a bad lot*** Ён — ты́пчык
– v.t. 1. дзяліць на чáсткі. 2. разьдзяля́ць, раздавáць шля́хам жэ́рабя. 3. кідáць жэ́рабя
– adv. шмат, цімáла, прóцьма: ***I feel a lot better*** Я чýюся шмат лéпей
• ***lots,*** pl., Informal шмат: ***lots of people*** мáса людзéй; ***lots of money*** шмат грóшай; ***you have lots of time*** у вас шмат чáсу

lotion ['louʃən] n. лясьён -у *m.*

lottery ['lɑ:təri] n., pl. **-teries** лятарэ́я *f.*

loud [laud] – adj. 1. гóласны, гýчны: ***loud laughter*** рóгат -у *m.* 2. шýмны, крыклівы. 3. Informal крыклівы, яскрáвы: ***loud colors*** рэ́зкія кóлеры
– adv. гóласна, гýчна, мóцна

loudness ['laudnəs] n. гóласнасьць, гýчнасьць, шýмнасьць *f.*

loudly ['laudli] adv. шýмна, гóласна

loudspeaker [ˌlaud'spi:kər] n. галасьнік -á, рэпрадýктар -а *m.*

lounge [laundʒ] – v.i. 1. выгóдна адпачывáць. 2. бязьдзéйна бáвіць час
– n. 1. канáпа, сафá *f.* 2. пакóй для адпачы́нку

louse [laus] – n., pl. **lice** вош *f.*
– v.t. лавíць вóшы
• ***louse up*** Sl. сапсавáць, спартáчыць

lousy ['lauzi] adj. 1. вашы́вы. 2. Sl. благí, дрэ́нны, нядóбры; пóдлы, нíзкі, агíдны

lout [laut] n. 1. нехлямя́жы чалавéк; цялпýк -á *m.* 2. прасьця́к -á *m.*, абмежавáны чалавéк

lovable ['lʌvəbəl] adj. мíлы, прывáбны

love [lʌv] – n. 1. каханьне *n.* 2. каханая *f.*, каханы -ага *m.* 3. любасьць, любóў *f.*
– v.t. 1. каханáць. 2. любíць (*мáці, бáць-каўшчыну*)
– v.i. 1. быць закаханым. 2. любíць
• ***fall in love (with)*** закаханáцца
• ***for love*** бясплáтна; для прыéмнасьці, не за грóшы
• ***for love or money*** за любýю цанý
• ***for the love of*** дзéля чагó-н.
• ***in love*** закаханы
• ***make love*** а) заляцáцца. б) каханáцца
• ***not for love or money*** нізавóшта, ні за я́кія грóшы

lovely ['lʌvli] adj. чарóўны, цудóўны; прывáбны, прыгóжы, прыéмны

lover ['lʌvər] n. 1. каханак -ка *m.*, каханы -ага *m.*, любы -ага *m.* 2. палюбóўнік -а *m.* 3. амáтар -а *m.*, амáтарка *f.* (*кніг, тэáтру*)

love seat малáя сафá на дзьве асóбы

loving ['lʌviŋ] adj. 1. які́ каханé, любíць. 2. любáсны: ***loving glances*** любáсныя пóзіркі

low I [lou] – adj. 1. нíзкі, нізкí, невысóкі. 2. а) плы́ткі, малавóдны (*пра стýдню, рэ́чку*). б) зь вялікім дэкальтэ́ (*пра сукéнку*). в) недастаткóвы: ***low supplies*** недастаткóвыя прыпáсы. 3. нíзкі, цíхі: ***a low whisper*** цíхі шэпт. 4. Biol. ніжэ́йшы, сáмы прóсты: ***Bacteria are low organisms*** Бактэ́рыі зьяўля́юцца ніжэ́йшымі арганíзмамі. 5. а) нíзкі, пóдлы. б) прóсты, вульгáрны. 6. слабы́, квóлы: ***a low state of health*** слабы́ стан здарóўя
– adv. 1. нíзка: ***to bow low*** нíзка клáняцца. 2. цíха, пацíху: ***to speak low*** гаварыць цíха
• ***lay low*** а) зьбíць з ног, здýжаць. б) забíць, паклáсьці
• ***lie low*** а) хавáцца. б) вычэ́кваць
• ***run low*** вычэ́рпвацца; растрáчвацца

lower I ['louər] – v.t. 1. апушчáць, апускáць; спускáць. 2. зьніжáць (*тэмпэратýру*). 3. прыніжáць; паніжáць на пасáдзе, станóвішчы
– v.i. зьніжáцца; сядáць (*пра сóнца*)
– adj. ніжэ́йшы

lower II ['lauər] – v.i. 1. пагражáць. 2. злавáцца, глядзéць панýра

– n. 1. пагро́зьлівы вы́гляд; змро́чнасьць, пану́расьць *f.* 2. насу́пленасьць *f.*

lowering ['laʊərɪŋ] adj. 1. цёмны; змро́чны; пахму́рны: ***lowering clouds*** цёмныя навальні́чныя хма́ры. 2. зло́сны; хму́рны, пану́ры (*пра чалаве́ка*)

lowland ['loʊlænd] – n. нізі́на, далі́на *f.*
– adj. 1. нізі́нны, далі́навы, лагавы́. 2. у нізі́не

lowly ['loʊli] adj. 1. ні́зкі (*ра́нгам, стано́вішчам*). 2. сьці́плы

low-minded [ˌloʊ'maɪndɪd] adj. по́длы, ні́зкі; вульга́рны

low-spirited [ˌloʊ'spɪrətəd] adj. су́мны, марко́тны; прыгне́чаны; прыбі́ты го́рам

low spirits прыгне́чаны стан; прыгне́чаньне *n.*, марко́та *f.* ; вя́ласьць *f.*

loyal ['lɔɪəl] adj. 1. ве́рны, адда́ны. 2. ляя́льны

loyally ['lɔɪəli] adv. 1. ве́рна, адда́на. 2. ляя́льна

loyalism ['lɔɪəˌlɪzəm] n. ляялі́зм -у *m.*

loyalist ['lɔɪəlɪst] n. ляялі́ст -а *m.*

loyalty ['lɔɪəlti] n. ве́рнасьць, ляя́льнасьць *f.*

lozenge ['lɑ:zɪndʒ] n. 1. ромб -а *m.* 2. табле́тка *f.* (*ад ка́шлю*)

lubricant ['lu:brɪkənt] n. зма́зка *f.*, зма́зачны матэры́ял

lubricate ['lu:brɪkeɪt] v.t. зма́зваць

lucid ['lu:sɪd] adj. 1. зразуме́лы, я́сны; лёгкі для зразуме́ньня: ***a lucid explanation*** зразуме́лае тлумачэ́ньне. 2. сьве́тлы, я́сны, бліску́чы. 3. норма́льны, разу́мны. 4. празры́сты: ***a lucid stream*** празры́сты струме́нь

lucidness ['lu:sɪdnəs] n. 1. зразуме́ласьць *f.* 2. сьве́тласьць, я́снасьць *f.* 3. празры́стасьць *f.*

luck [lʌk] n. шча́сьце *n.*: ***good luck*** уда́ча, памы́снасьць *f.*; ***bad luck*** няўда́ча *f.*; ***I had luck*** Мне пашча́сьціла
• ***good luck!*** шчасьлі́ва!
• ***in luck*** шчасьлі́вы
• ***out of luck*** нешчасьлі́вы

luckily ['lʌkɪli] adv. на шча́сьце, шчасьлі́ва

lucky ['lʌki] adj. шчасьлі́вы, уда́чны

lucrative ['lu:krətɪv] adj. дахо́дны, прыбытко́вы

ludicrous ['lu:dɪkrəs] adj. сьмяхо́тны; недарэ́чны, бязглу́зды

lug [lʌg] – v.t. **(-gg-)** 1. цягну́ць, валачы́. 2. Figur. прыплята́ць ні ў пяць ні ў дзе́сяць
– n. заціска́чка *f.*

luggage ['lʌgɪdʒ] n. бага́ж -у́ *m.*

lukewarm [ˌlu:k'wɔ:rm] adj. 1. ле́тні, цеплава́ты. 2. Figur. нерашу́чы; абыя́кавы; без запа́лу

lull [lʌl] – v.t. 1. супако́йваць; закалы́хваць (*дзіця́*). 2. супако́йваць, разьве́йваць (*страх, трывогу*)
– v.i. суніма́цца: ***The wind lulled*** Ве́цер суняўся
– n. 1. часо́вае заці́шша. 2. супако́йвальны гук

lullaby ['lʌləbaɪ] n., pl. **-bies** калыха́нка *f.*
– v.t. закалы́хваць сьпе́вам

lumbago [lʌm'beɪgoʊ] n., pl. **-gos** пастрэ́л -у *m.*, люмба́га *n.*

lumber ['lʌmbər] – n. 1. будаўні́чы лесаматэрыя́л, пі́ламатэрыя́л -у *m.* 2. лама́ччa *n.*
– v. 1. валі́ць лес і нарыхто́ўваць будаўні́чы матэрыя́л. 2. зава́льваць лама́ччам

lumberjack ['lʌmbərdʒæk] n. лесару́б, дрывасе́к -а *m.*

lumberman ['lʌmbərmən] n., pl. **-men** 1. лесару́б -а *m.* 2. лесапрамысло́вец -ўца *m.*, гандля́р ле́сам

lumber mill лесапі́льня *f.*, лесапі́льны заво́д

lumberyard ['lʌmbərjɑ:rd] n. склад будаўні́чага матэрыя́лу

luminary ['lu:məneri] – n., pl. **-naries** 1. сьвяці́ла *n.* (*як со́нца*). 2. выда́тны чалаве́к. 3. шту́чнае сьвятло́ (*асьвятле́ньне*)
– adj. сьветлавы́

luminescence [ˌlu:mɪ'nesəns] n. люмінэсцэ́нцыя *f.*, сьвячэ́ньне *n.*

luminescent [ˌlu:mɪ'nesənt] adj. люмінэсцэ́нтны, які́ сьве́ціцца

luminous ['lu:mɪnəs] adj. 1. які́ сьве́ціц-ца, які́ выпраме́ньвае сьвятло́. 2. я́р-кі, зы́ркі. 3. Figur. я́сны, зразуме́лы. 4. сьве́тлы, до́бра асьве́тлены

lump [lʌmp] – n. 1. камя́к -а́ *m.*, камя-чло́к -ка́ *m., dim.* 2. гуз -а *m.* 3. глы́ба, камлы́га *f.*; ма́са, ку́ча *f.* 4. Informal дуры́л|а -ы *m. & f.*, ёлуп|ень -ня *m.*
– v.t. утвара́ць камякі́, зьме́шваць, склада́ць у цэ́ласьць
– v.i. зьбіва́цца ў камякі́. 2. ця́жка ступа́ць
– adj. 1. камякава́ты, у кава́лках: ***lump sugar*** цу́кар у кава́лках. 2. сабра́ны ў адно́, агу́льны: ***lump sum*** агу́льная су́ма
• ***in the lump*** гу́ртам, о́птам

lumpy ['lʌmpi] adj. 1. камякава́ты, з камяка́мі. 2. выбо́исты, няро́ўны, бугры́сты. 3. цяжкі́ й няўклю́дны

lunacy ['lu:nəsi] n., pl. **-cies** 1. вар'я́цтва, шале́нства *n.* 2. безразва́жнасьць *f.*, вялі́кае глу́пства.

lunar ['lu:nər] adj. 1. ме́сячны: ***lunar eclipse*** зацьме́ньне ме́сяца. 2. як ме́сяц

lunar caustic ля́піс -у *m.*

lunatic ['lu:nətɪk] – n. 1. люна́тык, вар'я́т -а *m.* 2. неразьві́ты, дурны́ чалаве́к
– adj. 1. вар'я́цкі, ненарма́льны: ***a lunatic asylum*** вар'я́цкі дом. 3. дурны́, ідыятры́чны: ***a lunatic policy*** ідыятры́чная пали́тыка

lunch [lʌntʃ] – n. по́луд|зень -ня, абе́д -у *m.*
– v.i. палу́днаваць

luncheon ['lʌntʃən] n. 1. абе́д (*афіцы́йны*). 2. пераку́ска *f.*

luncheonette [ˌlʌntʃə'net] n. заку́сачная *f.*

lung [lʌŋ] n. лёгкае *n., pl.* лёгкія

lunge [lʌndʒ] – n. 1. скок упе́рад, вы́пад -у *m.* (*пры фэхтава́ньні*). 2. уда́р -у *m.* (*мячо́м, ша́бляй*)
– v.i., v.t. нане́сьці ўда́р, зрабі́ць вы́пад

lurch I [lɜ:rtʃ] n. 1. крэн -у *m.* 2. хіста́ньне *n.* 3. нахі́л -у *m.*

lurch II [lɜ:rtʃ] – v.t. пабі́ць (*у ка́ртах*)
– n. пара́за *f.* (*у гульні́*)
• ***leave in the lurch*** паки́нуць у бядзе́

lure [lʊr] – n. 1. спаку́са, спаку́сьлівасьць, прыва́бнасьць *f.* 2. прына́да *f.*
– v.t. 1. спакуша́ць; ва́біць. 2. на́дзіць, прына́джваць

lurid ['lʊrəd] adj. 1. агнявы́; агні́сты. 2. страшны́, дзікі́ (*пра злачы́нства*); сэнсацы́йны. 3. бле́дны, пану́ры (*ко́лер*). 4. зьнясі́лены, змо́раны

lurk [lɜ:rk] v.i. 1. хава́цца; таі́цца, прыто́йвацца. 2. быць схава́ным, не выяўля́цца (*пра хваро́бу*)

Lusatian [lu'seɪʃən] adj. лу́жыцкі, сэрбалу́жыцкі

luscious ['lʌʃəs] adj. 1. сало́дкі й сакаві́ты; апэты́тны. 2. прые́мны, захапля́льны. 3. пры́тарны

lush I [lʌʃ] adj. 1. мяккі́ й сакаўны́. 2. буйны́ (*пра расьлі́ннасьць, траву́*). 3. раско́шны, бага́ты; сакаві́ты (*стыль, апавяда́ньне*)

lush II [lʌʃ] – n. Sl. 1. гарэ́лка *f.* 2. п'я́ніц|а -ы *m. & f.*
– v. 1. піць (*гарэ́лку*). 2. паі́ць,

lust [lʌst] n. 1. пра́га *f.* (*по́мсты, гро́шай*); ця́га, схі́льнасьць *f.* 2. прагаві́тасьць, пра́гнасьць, сква́пнасьць *f.* 3. юр -у *m.*
– v. пра́гнуць: ***A miser lusts after gold*** Скна́ра пра́гне зо́лата

luster, Brit. **lustre** ['lʌstər] – n. 1. бляск -у, гля́нец -цу *m.* 2. я́снасьць *f.* 3. Figur. сла́ва *f.* 4. жырандо́ль *f.*, лю́стра *n.*
– v.t. глянцава́ць
– v.i. бліскаць

lustful ['lʌstfəl] adj. юрлі́вы, пажа́длівы

lustfulness ['lʌstfəlnəs] n. юрлі́васьць, пажа́длівасьць *f.*

lustily ['lʌstɪli] adv. мо́цна; энэргі́чна; бадзёра

lustrous ['lʌstrəs] adj. 1. бліскуча́сты, бліску́чы. 2. глянцаві́ты. 3. Figur. сьве́тлы; выда́тны; надзвыча́йны, бліску́чы (*пра дасягне́ньні, кар'е́ру*)

lusty ['lʌsti] adj. мо́цны і здаро́вы; бадзёры

lute I [lu:t] – n. лю́тня *f.*
– v.i. іграць на лю́тні

lute II [lu:t] n. замáзка *f.*
Lutheran [ˈlu:θərən] adj. лютэрáнскі
luxuriant [lʌgˈʒʊriənt] adj. 1. буйны́, пы́шны. 2. ураджáйны (*пра глéбу*). 3. багáты; аздóблены
luxurious [lʌgˈʒʊriəs] adj. 1. раскóшны; які́ лю́біць раскóшу. 2. раскóшны
luxury [ˈlʌgʒəri] – n., pl. **-ries** 1. раскóша, пы́шнасьць *f.* 2. вялі́кая прыéмнасьць, асалóда *ці* уцéха *f.*: ***the luxury of a good book*** асалóда ад дóбрае кні́гі
– adj. раскóшны: ***a luxury hotel*** раскóшны гатэ́ль
lyceum [laɪˈsi:əm] n. 1. ліцэ́йскі -я *m.* 2. за́ля для лéкцыяў, канцэ́ртаў
lye [laɪ] – n. луг -у *m.* (*для мыцьця́*); ка́ўстык -у *m.*; каўсты́чная со́да
– v.t. запа́рваць лу́гам
lying I [ˈlaɪŋ] – n. ілга́ньне *n.*; ілжа́, маня́, хлусьня́ *f.*
– adj. фальшы́вы; ілжы́вы, хлусьлі́вы
– v., *present p. of* **lie I**: ***I was not lying*** Я не мані́ў
lying II [ˈlaɪŋ] *present p. of* **lie II**: ***He was lying on the ground*** Ён ляжáў на зямлі́
lying-in [ˈlaɪŋ] – n. ро́ды *pl. only.*
– adj. радзі́льны: ***a lying-in hospital*** радзі́льны дом
lymph [lɪmf] n. лімфа *f.*
lymphatic [lɪmˈfætɪk] – adj. 1. лімфаты́чны: ***lymphatic vessels*** лімфаты́чныя сасу́ды. 2. флегматы́чны
– n. лімфаты́чны сасу́д
lynch [lɪntʃ] v.t. лінчава́ць, забіва́ць масу́дам
lynch law самасу́д -у *m.*, суд Лі́нча
lynx [lɪŋks] n., pl. **lynxes** or coll. **lynx** рысь *f.*
lynx-eye во́страе во́ка
lynx-eyed з во́стрым зро́кам
Lyra [ˈlaɪrə] n. Лі́ра *f.* (*сузо́р'е*)
lyre [ˈlaɪr] n. 1. лі́ра *f.* (*інструмэ́нт*). 2. Figur. лі́ра, паэ́зія *f.*
lyric [ˈlɪrɪk] – n. 1. каро́ткі ліры́чны ве́рш: ***lyrics*** сло́вы да пе́сьні. 2. лі́рыка *f.* 3. лі́рык -а *m.*, ліры́чны паэ́т
– adj. ліры́чны
lyrical [ˈlɪrɪkəl] adj. 1. паэты́чны. 2. эмацыйны. 3. ліры́чны
lyricism [ˈlɪrɪˌsɪzəm] n. 1. лірызм -у *m.* 2. чу́льлівасьць *f.*

M

M, m [em] n.,pl. **M's** or **Ms, m's** or **ms** *трына́ццатая лі́тара анге́льскага альфабэ́ту*

M.A. or **MA** [ˌemˈeɪ] *гл.* **Master of Arts**

Ma [mɑ:] n., Informal ма́ма *f.*

ma'am [mæm] n., Informal спада́рыня *f.*

macadam [məˈkædəm] n. 1. макада́м -у *m.* (*жарсьцьвя́нае даро́жнае пакрыцьцё*). 2. шаша́ *f.*

macaroni [ˌmækəˈrouni] n., pl. **-nis** or **-nies** макаро́ны *pl.*

macaronic [ˌmækəˈrɑ:nɪk] – adj. 1. макарані́чны. 2. на ме́шанай мо́ве
– n. макарані́чны твор (*на лама́най лаці́не або́ з прыме́шкай іншамо́ўных сло́ваў*)

Macedonian [ˌmæsɪˈdouniən] – adj. македо́нскі
– n. македо́нец -ца *m.*, македо́нка *f.*

machinate [ˈmækɪneɪt] v. махлява́ць, рабі́ць змо́ву; ве́сьці падко́пы *або́* інтры́гі; інтрыгава́ць, камбінава́ць

machination [ˌmækɪˈneɪʃən] n. махля́рства *n.*, махіна́цыя *f.*; інтры́гі, камбіна́цыі *pl.*

machine [məˈʃi:n] – n. 1. машы́на *f.*: ***sewing machine*** шве́йная машы́на; ***washing machine*** пра́льная машы́на. 2. мэхані́зм -у *m.* 3. аўтамабі́ль -я *m.*, машы́на *f.* 4. чалаве́к, які́ працу́е, як машы́на. 5. апара́т -у *m.*: ***state machine*** дзяржа́ўны апара́т
– adj. машы́нны: ***the machine age*** век машы́наў
– v.t. апрацо́ўваць на варшта́це

machine gun кулямёт -а *m.*

machinegun [məˈʃi:ngʌn] – v.t. абстрэ́льваць, страля́ць з кулямёта; забіва́ць *або́* ра́ніць агнём з кулямёта
– adj. кулямётны: ***machine-gun fire*** кулямётны аго́нь

machine gunner кулямётчык -а *m.*, кулямётчыца *f.*

machine-made [məʃi:nˈmeɪd] adj. зро́блены машы́най, не рука́мі: ***a machine-made sweater*** све́тар машы́ннае рабо́ты

machinery [məˈʃi:nəri] n., pl. **-eries** 1. машы́ны. 2. дэта́лі або́ ча́сткі машы́ны. 3. мэхані́зм -у *m.* 4. апара́т -у *m.* (*дзяржа́ўны, юрыды́чны і пад.*)

machine shop мэхані́чная майстэ́рня, мэхані́чны цэх

machine tool 1. мэхані́чны варшта́т. 2. прыла́да для апрацо́ўваньня мэта́лу

machinist [məˈʃi:nɪst] n. 1. мэха́нік -а, сьле́сар -а *m.* 2. машыні́ст -а *m.* 3. машынабудаўні́к -а́ *m.*

mackerel [ˈmækrəl] n., pl. **-el, -els** макрэ́ль, ску́мбрыя *f.*: ***mackerel sky*** во́блачнае не́ба

maculate [ˈmækjəleɪt] – v.t. запля́міць, папля́міць
– adj.[ˈmækjələt] запля́млены, запэ́цканы

mad [mæd] adj. 1. ненарма́льны, звар'яце́лы; шалёны. 2. дурны́, неразу́мны.

3. а) які́ страшэ́нна лю́біць што-н.: ***mad (after, about)*** шалёна захо́плены (чым-н.), б) дзі́ка ра́дасны *або́* вясёлы. 4. Informal ве́льмі злы: ***to get mad*** узлава́цца, мо́цна раззлава́цца: ***Don't get mad at me*** Ня гнёвайся на мяне́; ***like mad*** шалёна, мо́цна *або́* ху́тка

madam(e) [ˈmædəm] n., pl. **madams** or **mesdames** 1. спада́рыня *f.*, спада́рыча *f.* (*фо́рма зваро́ту*). 2. Informal гаспады́ня публі́чнага до́му

madden [ˈmædən] – v.t. 1. дава́дзіць да вар'я́цтва. 2. мо́цна злава́ць *або́* раздражня́ць
– v.i. вар'яце́ць

maddish [ˈmædɪʃ] adj. дурнава́ты

made [meɪd] – v., *p.t., p.p. of* **make** зраблі́ў -ла; зро́блены
– adj. збудава́ны, зро́блены: ***strongly made*** мо́цна збудава́ны

made-up [ˌmeɪdˈʌp] adj. 1. зро́блены. 2. вы́думаны, непраўдзі́вы. 3. размалява́ны: ***made-up lips*** размалява́ныя ву́сны. 4. нава́жны, станаўкі́

madhouse [ˈmædhaʊs] n. вар'я́тня *f.*, Informal балага́н -у *m.*

madly [ˈmædli] adv. 1. шалёна, апанта́на. 2. па-дурно́му, неразу́мна, бязглу́зда

madman [ˈmædmən] n., pl. **-men** 1. вар'я́т -а *m.* 2. шалёны -ага *m.*

madness [ˈmædnəs] n. 1. вар'я́цтва *n.* 2. шал -у *m.*, разыю́шанасьць *f.* 3. шале́нства *n.*

maelstrom [ˈmeɪlstrəm] n. вір -у *m.*

magazine [ˈmægəzi:n] – n. 1. ча́сапіс -у *m.* 2. склад боепрыпа́саў, ра́чавы склад. 3. магазы́н -а *m.* а) для патро́наў у аўтама́це. б) для фі́льму ў апара́це
– v.t. перахо́ўваць у скла́дзе

magic [ˈmædʒɪk] – n. 1. ма́гія *f.*, чараде́йства, чараўні́цтва *n.*, ча́ры *pl.* 2. чаро́ўнасьць *f.*: ***the magic of her voice*** чаро́ўнасьць е́йнага го́ласу
– adj. 1. чарадзе́йны, чаро́ўны. 2. магі́чны

magical [ˈmædʒɪkəl] adj. 1. чарадзе́йны, магі́чны. 2. тае́мны, невытлумача́льны, незразуме́лы

magician [məˈdʒɪʃən] n. 1. чарадзе́й -я *m.*, чарадзе́йка *f.*; чараўні́к -а́ *m.*, чараўні́ца *f.* 2. штука́р, фо́кусьнік -а *m.*, фо́кусьніца *f.*

magisterial [ˌmædʒɪˈstɪriəl] adj. 1. судо́вы, судзе́йскі. 2. аўтарытэ́тны. 3. ула́дны, улада́рны, насто́йлівы

magistrate [ˈmædʒɪstreɪt] n. магістра́т -у *m.* 2. судзьдзя́ -і́ *m.* (*ніжэ́йшае інста́нцыі*)

magnanimity [ˌmægnəˈnɪməti] n., pl. **-ties** 1. велікаду́шнасьць *f.* 2. велікаду́шны ўчы́нак

magnanimous [mægˈnænɪməs] adj. велікаду́шны

magnate [ˈmægneɪt] n. магна́т, аліга́рх -а *m.*; уплыво́вая асо́ба; ***an oil magnate*** на́фтавы магна́т

magnesium [mægˈni:ziəm] n. ма́гні|й -ю *m.*

magnesium oxide магне́зія *f.*

magnet [ˈmægnɪt] n. 1. Phys. магні́т -у *m.* 2. то́е, што прыця́гвае, ва́біць да сябе́, магні́т

magnetic [mægˈnetɪk] adj. 1. магні́тны: ***the magnetic needle of a compass*** магні́тная стрэ́лка ко́мпаса. 2. магнэты́чны; прыцяга́льны, які́ ва́біць да сябе́

magnetic equator магні́тны эква́тар

magnetic field магні́тнае по́ле

magnetic meridian магні́тны мэрыдыя́н

magnetic pole магні́тны по́люс

magnetic storm магні́тная бу́ра

magnetism [ˈmægnəˌtɪzəm] n. магнэты́зм -у *m.*. 2. асабліва́я прыва́бнасьць. 3. гіпнаты́чная сі́ла

magnetize [ˈmægnətaɪz] – v.t. 1. намагні́чваць. 2. прыця́гваць *каго́*; мець уплы́ў на *каго́*. 3. гіпнатызава́ць
– v.i. намагні́чвацца

magnetized [ˈmægnətaɪzd] adj. намагні́чаны

magnification [ˌmægnɪfɪˈkeɪʃən] n. павялічэ́ньне, пабо́льшаньне, узмацне́ньне *n.*

magnificence [mægˈnɪfɪsəns] n. 1 пы́шнасьць, велікапы́шнасьць *f.* 2. ве́ліч-насьць, узвы́шанасьць *f.*

magnificent [mæg'nɪfɪsənt] adj. 1. пы́шны, велікапы́шны; ве́лічны. 2. імпаза́нтны; высакаро́дны (*пра сло́вы і пад.*). 3. узвы́шаны (*пра ідэ́і і пад.*). 4. надзвыча́йны, дзіво́сны, цудо́ўны

magnify ['mægnɪfaɪ] v., **-fied, -fying** 1. павялі́чваць, пабо́льшваць. 2. перабо́льшваць. 3. ухваля́ць; сла́віць, пакланя́цца

magnifying ['mægnɪfaɪɪŋ] – n. 1. павялі́чваньне, пабо́льшваньне *n.*
– adj. павелічáльны

magnifying glass павелічáльнае шкло, лю́па *f.*

magnitude ['mægnɪtu:d] n. 1. велічыня́, вага́ *f.*, паме́ры *pl.*, сі́ла *f.* 2. вялі́кае зна́чаньне, уплы́ў *або́* вы́нік. 3. Astronomy я́ркасьць *f.* (*зо́ркі*); ***of the first magnitude*** ве́льмі вялі́кі, пе́ршай велічыні́; дасканáлы, ве́льмі паважа́ны

magpie ['mægpaɪ] n. 1. саро́ка *f.* 2. балбату́ха, лапату́ха, сакату́ха *f.*

Magus ['meɪgəs] n., pl. **Magi** ['meɪdʒaɪ] адзі́н з Трох Мудрацо́ў

magus ['meɪgəs] n., pl. **magi** ['meɪdʒaɪ] астро́ляг -а, чарадзе́й -я *m.*

Magyar ['mægjɑ:r] – n. 1. мадзя́р, вугро́рац -ца *m.*, мадзя́рка *f.* 2. вугро́рская мо́ва
– adj. мадзя́рскі, вугро́рскі

mahogany [mə'hɑ:gəni] n., pl. **-nies** 1. чырво́нае дрэ́ва (*матэрыя́л і дрэ́ва*). 2. мэ́бля з чырво́нага дрэ́ва. 3. ко́лер чырво́нага дрэ́ва

maid [meɪd] n. 1. дзе́ўка, дзяўчы́на *f.* 2. служáнка *f.* 3. пакаёўка *f.*

maiden ['meɪdən] – n. дзяўчы́на, дзяўчы́нка *f.*
– adj. 1. дзявóчы, дзявóцкі. 2. незáмужняя. 3. но́вы, сьве́жы, неўжыва́ны; пе́ршы, некра́нуты: ***maiden voyage*** пе́ршы рэйс (*но́вага карабля́*); ***maiden ground*** некра́нутая гле́ба

maidenhood ['meɪdənhʊd] n. дзявóцтва *n.*

maidenliness ['meɪdənlɪnəs] n. дзявóцкасьць *f.*

maiden name дзявóчае про́зьвішча

maid of honor пе́ршая дру́жка

mail I [meɪl] – n. 1. по́шта. 2. карэспандэ́нцыя *f.* 3. пашто́вы тра́нспарт
– v.t. пасыла́ць по́штаю, укіда́ць у пашто́вую скры́нку
– adj. 1. пашто́вы. 2. наня́ты разно́сіць по́шту

mail II [meɪl] n. 1. кальчу́га *f.* 2. браня́ *f.*, па́нцыр -у *m.* 3. па́нцыр чарапа́хі, ра́ка, ахо́ўная луска́

mailbag ['meɪlbæg] n. 1. мех з по́штай. 2. по́шта, карэспандэ́нцыя *f.*

mailbox ['meɪlbɑ:ks] n. пашто́вая скры́нка

mail car пашто́вы вагóн

mail carrier паштáр -á *m.*, паштáрка *f.*

mailed [meɪld] adj. 1. бранірóваны, пакры́ты па́нцырам. 2. (*пра жывёліну*) пакры́ты па́нцырам, ра́кавінай або́ ахо́ўнай луско́й

mailer ['meɪlər] n. 1. адпра́ўнік по́шты, адраса́нт -а *m.* 2. канвэ́рт *або́* кантэ́йнэр для перасы́лкі по́шты

mailman ['meɪlmæn] n., pl. **-men** паштáр -á, паштальён -а *m.*, паштáрка *f.*; ліста́ноша -ы *m.*

mail-order [ˌmeɪl'ɔ:rdər] v. замаўля́ць тавáр праз по́шту

maim [meɪm] – v.t. 1. кале́чыць, нявé-чыць. 2. абясьсі́льваць
– n. скале́чаньне, зьнявé́чаньне *n.*; ра́на *f.*

main [meɪn] – adj. гало́ўны, найважне́йшы, найбо́льшы: ***the main street*** гало́ўная ву́ліца; ***the main line of the railway*** гало́ўная чыгу́начная лі́нія; ***by main force*** усі́мі сі́ламі
– n. 1. гало́ўная вадаправо́дная трубá, гало́ўная электралі́нія *або́* газаправо́д. 2. Poet. адкры́тае мо́ра, акія́н
• ***in the main*** бо́льшай ча́сткай, гало́ўна, у асно́ўным
• ***main clause*** гало́ўны сказ (*у складáназале́жным ска́зе*)

mainland ['meɪnlənd] n. мацяры́к мацерыкá *m.*

mainly ['meɪnli] adv. перава́жна, гало́ўна, асабліва; у бо́льшасьці

mainspring [ˈmeɪnsprɪŋ] n. 1. галóўная спружы́на (*у гадзі́ньніку і г.д.*). 2. галóўны стымýл, пабуджáльная прычы́на

maintain [meɪnˈteɪn] v.t. 1. вéсьці, трымáць (*прадпрыéмства*). 2. падтрымóўваць, падтры́мваць (*сýвязь, здарóўе і г.д.*). 3. трымáць (*парáдак*), сачы́ць за парáдкам. 4. утрымóўваць, забясьпéчваць срóдкамі для існавáньня; кóрмліваць. 5. давáць падтры́мку, абараня́ць (*якóю-н. дýмку*): ***to maintain one's reputation*** абараня́ць сваю́ рэпутáцыю. 6. сьцьвярджáць, цьвéрдзіць; упэ́ўнена *або́* настóйліва казáць. 7. даглядáць, трымáць у парáдку: ***This apartment house is maintained very well*** Гэ́ты шматкватэ́рны дом вéльмі дóбра дагляджаны

maintenance [ˈmeɪntənəns] n. 1. захóўваньне *n.*: ***Maintenance of quiet is essential in a hospital*** У шпіталі́ неабхóдна захóўваць цішыню. 2. утрымáньне *n.*, срóдкі для існавáньня, жыцьця́; выдáткі *pl.* (*дзяржáвы*). 3. дóгляд -у *m.*; тэхні́чнае абслугóўваньне, рамóнт

maize [meɪz] n. кукурýза *f.*

majestic [məˈdʒestɪk] adj. вéлічны; грандыёзны

majesty [ˈmædʒəsti] n., pl. **-ties** вéлічнасьць, вялікасьць *f.*

Majesty [ˈmædʒəsti] n., pl. **-ties** вялíкасьць (*каралéўскі тытýл*): ***Your Majesty*** Вáша вялíкасьць; ***His (Her) Majesty*** Ягó (Яé) вялíкасьць

major [ˈmeɪdʒər] – adj. 1. бóльшы, важнéйшы, знáчны; грунтóўны: ***major part*** бóльшая чáстка; ***major poet*** знáчны паэ́т. 2. старэ́йшы, стáршы. 3. Mus. мажóрны.
– n. 1. маёр -а *m.* 2. дарóслы -ага *m.*, дарóслая *f.*; паўналéтні -яга *m.*, паўналéтняя *f.* 3. галóўная дысцыплі́на, спэцыялізáцыя *f.*

majordomo [ˌmeɪdʒərˈdoʊmoʊ] n., pl. **-mos** 1. дварэ́цкі -ага *m.* (*старэ́йшы слугá ў каралéўскім, пáнскім ці багáтым дóме*). 2. стáршы лёкай, аканóм -а *m.*

major-general генэрáл-маёр

majority [məˈdʒɔːrəti] n., pl. **-ties** 1. бальшыня́, бóльшасьць *f.*: ***vast majority*** перавáжная бальшыня́; ***to gain a majority*** атрымáць бóльшасьць галасóў. 2. дарóсласьць *f.*, паўналéцьце *n.* 3. маёрства *n.*, ступéнь маёра

make [meɪk] – v.t., **made** 1. рабíць; будавáць, утвараць: ***to make a new dress*** пашы́ць нóвую сукéнку; ***to make a boat*** збудавáць чóвен; ***to make a bed*** паслáць лóжак; ***to make a fire*** раскласьці агóнь; ***to make a poem*** склáсьці верш; ***to make a will*** зрабíць тэстамэ́нт. 2. выклікáць, рабіць; станавíцца: ***to make trouble*** выклікáць прыкрасьці; ***to make peace*** пагадзíцца; ***to make a fool of oneself*** зрабíць зь сябé дýрня, пастáвіць сябé ў дурнóе станóвішча; ***She will make a good teacher*** Зь яé бýдзе дóбрая настáўніца. 3. прымушáць: ***He made me go*** Ён прымýсіў мянé пайсьцí. 4. складáць, быць рóўным: ***Two and two make four*** Два і два рóўна чатырóм. 5. éхаць ***To make more than 100 km an hour*** éхаць звыш ста кілямэ́траў на гадзíну. 6. а) упраўля́цца, пасьпявáць; трапля́ць у час: ***to make a traffic signal*** пасьпéць праéхаць на зялёным сьвятлé. б) прыбывáць: ***The ship made port*** Карабéль прыбы́ў у порт
– n. 1. фасóн -у *m.*; мáрка *f.*; тып -у *m.*, мадэ́ль *f.* (*машы́ны*). 2. харáктар -у *m.*

• ***make as if*** or ***as though*** удавáць, што

• ***make away with*** а) пазбы́цца *кагó*; забíць *кагó*. б) скрáсьці

• ***make off*** уцячы́

• ***make out*** а) выпíсваць; давóдзіць, дакáзваць. б) разумéць, разабрáць, ледзь бáчыць

• ***make over*** а) перарабíць, б) перадáць у чыё-н. уладáньне

• ***make up*** а) складáць (*сказ*), б) выдумля́ць. в) загладжваць (*кры́ўду*).

в) пакрыва́ць (*выда́ткі, стра́ты*), кампэнсава́ць. г) меркава́цца; ла́дзіцца, мірыцца з *кім*. д) падмалёўвацца, напу́дрывацца; грыміра́вацца. е) выраша́ць

• ***make up for*** наганя́ць (*стра́чаны час*), адрабля́ць (*што-н. благо́е*)

makeup or **make-up** ['meɪkʌp] n. 1. склад, хара́ктар -у *m.* 2. грым і убра́ньне акто́ра. 3. касмэ́тыка *f.* 4. Print. макетава́ньне *n.*, вёрстка *f.* (*кні́гі, газэ́ты*)

mal- *як складо́вая ча́стка сло́ва* 1. бла́га, дрэ́нна; благі́, дрэ́нны. 2. не-, без-

maladjusted [ˌmælə'dʒʌstɪd] adj. непрытарнава́ны, непрыстасава́ны, недапасава́ны

maladministration [ˌmælədˌmɪnɪ'streɪʃən] n. блага́я адміністра́цыя, няспра́ўнае *або́* нясумле́ннае кіраўні́цтва

maladroit [ˌmælə'drɔɪt] adj. няўме́лы; няскла́дны; няўда́лы; няўклю́дны, непаваро́тлівы, нязгра́бны

malady ['mælədi] n., pl. **-dies** не́мач, хваро́ба *f.*

malaria [mə'leriə] n. малярыя *f.*, бало́тная ліхама́нка, тра́сца *f.*

malarial [mə'leriəl] adj. 1. малярыйны. 2. хво́ры на малярыю

malconduct [ˌmæl'kɑ:ndʌkt] n. дрэ́нныя *або́* неадпаве́дныя паво́дзіны

malcontent [ˌmælkən'tent] – adj. незадаво́лены; неспако́йны; бунта́рскі, бунта́рны

– n. незадаво́лены чалаве́к; бунта́р -а́ *m.*, бунта́рка *f.*

male [meɪl] – n. 1. мужчы́на -ы *m. або́* хлапе́ц -ца́ *m.* 2. саме́ц -ца́ *m.* 3. тычы́нкавая расьліна

– adj. мужчы́нскі: ***male beast*** саме́ц; ***male bee*** тру́цень; ***male fern*** мужчы́нская *або́* тычы́нкавая па́параць

maledіction [ˌmælɪ'dɪkʃən] n. злаязы́касьць *f.*; праклён -у *m.*; паклёп -у *m.*

malefactor ['mælɪfæktər] n. злачы́нец -ца *m.*, ліхадзе́й -я *m.*

malevolence [mə'levələns] n. зларадна́сьць, незычлі́васьць, злосьць *f.*

malevolent [mə'levələnt] adj. зларадны, незычлівы; зло́сны, зласьлі́вы

malformation [ˌmælfɔ:r'meɪʃən] n. 1. дэфарма́цыя, ненарма́льнасьць *f.* 2. дэфэ́кт разьвіцьця́

malformed [ˌmæl'fɔ:rmd] adj. здэфармава́ны; ненарма́льны; дэфэктны́ўны

malice ['mælɪs] n. 1. зла́я во́ля, зласьлі́васьць *f.* : ***to bear malice (to)*** таіць злосьць (*на каго́*). 2. Law наўмы́снасьць *f.*, злачы́нны намер

malicious [mə'lɪʃəs] adj. зло́сны; злы; зласьлі́вы (*по́ўны варо́жасьці*)

maliciously [mə'lɪʃəsli] adv. зло́сна, зласьлі́ва

malign [mə'laɪn] – v.t. дрэ́нна выка́звацца пра *каго́*; паклёпнічаць

– adj. 1. злы; шко́дны. 2. ненавісны, варо́жы. 3. ве́льмі шко́дны; злаякасны

malignancy [mə'lɪgnənsi] n., pl. **-cies** 1. зласьлі́васьць, варо́жасьць *f.* 2. Med. злаякаснасьць *f.*; не́шта злаякаснае (*напр. пухлі́на*)

malignant [mə'lɪgnənt] adj. 1. ве́льмі злы, зло́сны; по́ўны няна́вісьці *або́* зло́сьці. 2. злаякасны, небясьпе́чны для жыцьця́: ***malignant tumor*** злаякасная пухлі́на

malignity [mə'lɪgnəti] n., pl. **-ties** 1. вялі́кае зло; мо́цная няна́вісьць. 2. небясьпе́чнасьць, сьмяртэ́льнасьць *f.* (*ра́ку, ра́ны*)

malleable ['mæliəbəl] n. 1. ко́ўкі (*пра мэта́л*). 2. пада́тны, пада́тлівы; зга́ворлівы, памяркко́ўны, састу́плівы (*пра чалаве́ка*)

mallet ['mælɪt] n. драўля́ны *або́* гумо́вы малато́к, мо́лат -а *m.*

malleus ['mæliəs] n., pl. **mallei** ['mæliaɪ] малато́чак -ка *m.* (*вушна́я ко́стачка*)

malnourished [ˌmæl'nɜ:rɪʃt] adj. згалада́лы; недастатко́ва ко́рмлены

malnutrition [ˌmælnu'trɪʃən] n. недаяда́ньне *n.*; няпра́вільнае харчава́ньне; благі харч

malpractice [ˌmæl'præktɪs] n. 1. злачы́нна нядба́йнае *або́* няўме́лае

выканáньне прафэсíйнага абавя́зку. 2. благóе прафэсíйнае захавáньне, службóвае злоўжывáньне

malt [mɔ:lt] – n. 1. сóлад -у *m.* (*жы́тні, ячме́нны*). 2. Informal пíва *n.*
– v.i. рабíць сóлад

maltreat [ˌmælˈtri:t] v.t. сурóва абыхóдзіцца з *кім*; зьдзе́кавацца, глумíцца з *каго́*, глумíць *што*

maltreatment [ˌmælˈtri:tmənt] n. зьдзе́кліва, лю́тае абыхóджаньне

mammal [ˈmæməl] n. сысу́н -á *m.*

mammary gland малóчная залóза

mammoth [ˈmæməθ] – n. мáмант -а *m.*
– adj. велізáрны; гігáнцкі

man [mæn] – n., pl. **men** 1. мужчы́нa -ы *m.* 2. чалаве́к -а *m.*; асóба *f.* 3. прыслу́жнік -а, слугá -í, рабóтнік -а *m.* 4. а) муж -а *m.*: ***Man and wife*** Муж і жóнка. б) паклóньнік, залётнік -а *m.* 5. му́жны чалаве́к. 6. Informal: чалаве́ча!: ***Read it, man!*** Прачытáй гэ́та, чалаве́ча!
– v.t. 1. укамплектóўваць асабóвым склáдам; займáць людзьмí, садзíць людзе́й. 2. ***to man the guns*** абслугóўваць гармáты. 3. мужáцца; браць сябе́ ў ру́кі. 4. прыручáць
• ***act the man*** быць адвáжным
• ***as one man*** у пóўнай згóдзе; аднадýшна, аднагалóсна
• ***be one's own man*** а) быць сам сабе́ гаспадáр, быць незалéжным ні ад кóга. б) трымáць сябе́ ў рукáх
• ***men*** радавы́я салдáты *абó* маракí
• ***to a man*** бяз вы́нятку, усé

manage [ˈmænɪdʒ] – v.t. 1. кіраваáць (*прадпрыéмствам і пад.*); загáдваць *чым*; давáць рáды з *кім-чым*; адóльваць *каго́-што*: ***Only his mother could manage him*** Тóлькі ягóная мáці маглá даць рáды зь ім; ***easily managed*** рахмáны, пакóрны, лагóдны. 2. здóлець, змагчы́ (*чáста іранíчнае*): ***He has managed to remain poor all his life*** Ён здóлеў заставáцца бéдным усё сваё жыцьцё; ***He manages tools well*** Ён дóбра ўмéе карыстáцца прылáдамі – v.t. 1. вéсьці спрáвы, гаспадáрку. 2. абыхóдзіцца: ***to manage on one's income*** абыхóдзіцца сваíм прыбы́ткам

manageable [ˈmænɪdʒəbəl] adj. 1. зь якíм мóжна спрáвіцца. 2. ***a meek and manageable child*** цíхае й паслухмя́нае дзіця́

management [ˈmænɪdʒmənt] n. 1. кантрóль -ю *m.*; нагля́д -у *m.*; кіраванне *n.* 2. кіраўнíцтва *n.*, дырэ́кцыя, адмíністрáцыя *f.*, мэ́нэджмэнт -у *m.*

manager [ˈmænɪdʒər] n. 1. загáдчык -а *m.* (*устанóвы, крáмы*); дырэ́ктар -а *m.*; адмíністрáтар -а, мэ́нэджэр -а *m.* 2. гаспадáр -á *m.*; распарáднік -а *m.*, распарáдніца *f.* 3. Brit. тэатрáльны рэжысэ́р

Manchu [ˌmænˈtʃu:] – n. 1. манчжу́рлац -ца *m.* 2. манчжу́рская мóва
– adj. манчжу́рскі

mandarin [ˈmændərɪn] n. мандары́н -а *m.*

Mandarin [ˈmændərɪn] n. мандары́н -у, пэкíнскі дыялéкт кітáйскай мóвы

mandate [ˈmændeɪt] n. 1. загáд, накáз -у *m.* 2. мандáт -а *m.*

mandated [ˈmændeɪtəd] adj. падзагáдны; падмандáтны (*край, тэрытóрыя*)

mandatory [ˈmændətɔ:ri] – adj. 1. мандáтны (*камíсія*). 2. абавязкóвы (*пастанóва*), прымусóвы: ***a mandatory sentence*** канчаткóвы прысу́д. 3. які́ атрымáў мандáт кіраваáць залéжнай краíнай
– n. мандатáр -а *m.*

mane [meɪn] n. гры́ва *f.*

maned [meɪnd] adj. з гры́вай; грывáсты

maneuver [məˈnu:vər] n. манэ́ўр -у *m.*

manful [ˈmænfəl] adj. му́жны; станóўкі; цьвярды́; непахíсны

manganese [ˈmæŋgəni:z] n. мáрганец -цу *m.*

manger [ˈmeɪndʒər] n. жóлаб -а *m.*; кармýшка для жывёлы

mango [ˈmæŋgoʊ] n., pl. **-goes, -gos** мáнга *n., indecl.*

manhole [ˈmænhoʊl] n. лаз, люк -а *m.* (*напр. каналізацы́йны*)

manhood [ˈmænhʊd] n. 1. стáласьць *f.*, стáлы век мужчы́ны. 2. мужчы́н-

скасьць, му́жнасьць, адва́га *f.* 3. мужчы́ны *pl.* (*як гру́па*)

manhunt [ˈmænhʌnt] n. паліцэ́йская аблава́, по́шукі злачы́нца або́ зьбе́гла-га вя́зьня

mania [ˈmeɪnɪə] n. 1. ма́нія *f.* 2. празме́рнае захапле́ньне, сла́басьць да чаго́-н.

maniac [ˈmeɪnɪæk] n. манья́к -а *m.*, манья́чка *f.*

maniacal [məˈnaɪəkəl] adj. 1. манья́цкі, маніяка́льны. 2. ненарма́льны, вар'я́цкі

manifest [ˈmænɪfest] – adj. відаво́чны, я́ўны, я́сны: ***a manifest error*** відаво́чная памы́лка

– v.t. 1. я́ўна пака́зваць, выяўля́ць. 2. дава́ць до́вады, дава́дзіць; быць до́вадам. 3. упі́сваць, запі́сваць у дэкляра́цыю суднаво́га гру́зу

– n. 1. падрабя́зны сьпіс суднаво́га *або́* самалётнага гру́зу. 2. маніфэ́ст -у *m.*

manifestation [ˌmænɪfeˈsteɪʃən] n. 1. прая́ва *f.*, выяўле́ньне *n.*: ***manifestation of one's courage*** праява адва́гі. 2. маніфэста́цыя *f.*

manifesto [ˌmænɪˈfestoʊ] – n., pl. **-toes** маніфэ́ст -у *m.*

– v.i. выдава́ць маніфэ́ст

manifold [ˈmænɪfoʊld] – adj. 1. разнаста́йны; разнаро́дны, ро́зны. 2. шматлі́кі

– n. трубá з разгалінава́ньнямі

manipulate [məˈnɪpjəleɪt] v.t. 1. уме́ла абыхо́дзіцца, кірава́ць (*прыла́дай*), маніпулява́ць. 2. хі́тра падыхо́дзіць да *каго́-чаго́*, хі́тра заваёўваць чый-н. дове́р. 3. падтасо́ўваць, наўмы́сна зьмяня́ць

manipulation [məˌnɪpjəˈleɪʃən] n. 1. уме́лае абыхо́джаньне, маніпуля́цыя *f.* 2. спры́тнае махля́рства, махіна́цыя *f.*

mankind [mænˈkaɪnd] n. 1. чалаве́цтва *n.*, чалаве́чы род. 2. [ˌmæŋˈkaɪnd] мужчы́ны, мужчы́нскі род

manlike [ˈmænlaɪk] adj. 1. мужчы́нскі. 2. але́жны, адпаве́дны мужчы́ну

manliness [ˈmænlinəs] n. мужчы́нскасьць, му́жнасьць *f.*

manly [ˈmænli] adj. 1. як мужчы́на, мо́цны, му́жны, высакаро́дны. 2. адпаве́дны мужчы́нам

man-made [ˌmænˈmeɪd] adj. шту́чны; ненатура́льны, шту́чна *або́* сынтэты́чна зро́блены, фабры́чны

manner [ˈmænər] n. 1. спо́саб -у *m.*: ***in this manner*** гэ́так, такі́м пара́дкам. 2. мане́ра *f.*, спо́саб дзе́яньня; ***He speaks in a strange manner*** Ён дзі́ўна гаво́рыць. 3. гату́нак -ку *m.*: ***all manner of birds*** усе́ гату́нкі пту́шак. 4. звы́чаі *pl.*, мо́да *f.*: ***in the Belarusian manner*** паво́дле белару́скіх звы́чаяў. 5. стыль -ю *m.*, маста́цкая мане́ра, лад -у *m.*: ***in the old manner*** на стары́ лад; ***by no manner of means*** зусі́м не, ніяки́м чы́нам, ні ў я́кім вы́падку

• ***in a manner of speaking*** так сказа́ўшы, іна́кш ка́жучы

• ***manners*** мане́ры, зьне́шнія фо́рмы паво́дзінаў, спо́саб трыма́цца; ***good (bad) manners*** до́брыя (дрэ́нныя) мане́ры

mannish [ˈmænɪʃ] adj. як мужчы́на; мужчы́напада́бны

man of letters літара́тар -а *m.*, ма́йстар пяра́

man of the world быва́лы чалаве́к

manor [ˈmænər] n. 1. маёнтак -ка *m.*; двор, двара́ *m.* 2. па́нскі двор

manpower [ˈmænˌpaʊr] n. 1. рабо́чая сі́ла. 2. людзкі́я рэсу́рсы

mansion [ˈmænʃən] n. пала́ц -у *m.*; рэзыдэ́нцыя *f.*; ***mansions*** Brit. шматкватэ́рны дом

mantel [ˈmæntəl] n. палі́ца *f.*, карні́з над ками́нам

mantelpiece карні́з над ками́нам

mantle [ˈmæntəl] – n. 1. наки́дка без рукаво́ў, ма́нтыя *f.* 2. пакрыцьцё *n.*, по́крыва *n.*: ***a mantle of snow*** сьне́жнае по́крыва. 3. Tech. а) кажу́х -á *m.* (*футара́л з жале́за*), б) се́тка (*наво́кал га́завага ліхтара́*)

– v.t. пакрыва́ць; ахо́ўтваць

manual [ˈmænjuəl] – adj. ручны́, фізы́чны: ***manual labor*** фізы́чная пра́ца.
– n. падру́чнік, дапамо́жнік -а *m.*, інстру́кцыя *f.*

manufactory [ˌmænjəˈfæktɔ:ri] n. фа́брыка, мануфакту́ра *f.*

manufacture [ˌmænjəˈfæktʃər] – v.t. 1. вырабля́ць. 2. перапрацо́ўваць: ***to manufacture aluminum into kitchenware*** перапрацо́ўваць алюмі́ній у кухо́нны по́суд. 3. выдумля́ць, фабрыкава́ць (*ману́, плёткі*)
– n. 1. вы́раб -у *m.*, апрацо́ўка *f.*, фабрыка́цыя *f.*, вытво́рчасьць *f.* 2. прадукт, фабрыка́т -у *m.*

manufacturer [ˌmænjuˈfæktʃərər] n. 1. фабрыка́нт -а *m.*; ула́сьнік заво́ду; прамысло́вец -ўца *m.* 2. вытво́рца -ы *m.* (*прамысло́вых тава́раў*)

manufacturing industry вытво́рчая прамысло́васьць

manure [məˈnʊr] n. гно́й -ю *m.*, угна́ньне *n.*

manuscript [ˈmænjəskrɪpt] n. ру́капіс, машы́напіс -у *m* .

many [ˈmeni] – adj. **more, most** шмат які́я, мно́гія; шматлі́кі; шмат: ***many people*** шмат які́я лю́дзі; ***many years ago*** шмат гадо́ў таму́
– n. 1. шмат хто: ***many of us*** шмат хто з нас. 2. вялі́кая ко́лькасьць, мно́ства: ***There were many at the dance*** На та́нцах было́ шмат людзе́й; ***good many*** до́сыць вялі́кая ко́лькасьць; ***a great many*** ве́льмі шмат, мно́ства *n.*; ***how many?*** ко́лькі?

manifold [ˈmænɪfoʊld] adv. шмат разо́ў: ***The number of students has increased manyfold*** Ко́лькасьць ву́чняў пабо́льшала ў шмат разо́ў

many-sided [ˌmeniˈsaɪdɪd] adj. 1. шматбако́вы (*напр. дамо́ва*). 2. рознабако́вы, разнаста́йны: ***a many-sided person*** чалаве́к з рознабако́вымі здо́льнасьцямі

map [mæp] – n. 1. ка́рта, ма́па *f.* 2. плян -у *m.*: ***sky map*** ка́рта зо́рнага не́ба; ***highway map*** даро́жная ма́па; ***weather map*** мэтэаралягі́чная ка́рта
– v.t. 1. малява́ць ка́рту; пака́зваць на ка́рце. 2. склада́ць плян

maple [ˈmeɪpəl] – n. 1. клён -а *m.* (*дрэ́ва*). 2. клён -у *m.* (*матэрыя́л*)
– adj. клянО́вы: ***maple leaf*** клянО́вы ліст; ***maple syrup*** клянО́вы сыро́п

mar [mɑ:r] – v.t. 1. псава́ць (*вы́гляд*); шко́дзіць; збры́джваць, зга́джваць. 2. абязьве́чваць, зьняве́чваць. 3. псава́ць, разбура́ць, разла́джваць
– n. 1. пля́ма на це́ле (*рубе́ц пасьля́ ра́ны, радзімая пля́ма і пад.*) 2. зага́на *f.*

maraud [məˈrɔ:d] – v.i. марадзёрствава́ць, займа́цца марадзёрствам, рабу́нкамі (*у час вайны́*)
– v.t. рабава́ць
– n. марадзёрскі напа́д, марадзёрства *n.*

marauder [məˈrɔ:dər] n. марадзёр -а *m.*

marble [ˈmɑ:rbəl] – n. 1. ма́рмур -у *m.* 2. шкляны́, каме́нны ша́рык (*для гульні́*). 3. узо́р *або́* ко́лер, падо́бны да ма́рмуру; ***marbles*** а) гульня́ ў каме́нчыкі, ша́рыкі, б) кале́кцыя скульпту́раў
– adj. 1. мармуро́вы. 2. як ма́рмур (*бе́лы, цьвёрды, хало́дны або́ нячу́лы*): ***marble heart*** нячу́лае сэ́рца. 3. у кро́пкі, сьпярэ́шчаны, як ма́рмур
– v.t. размалёўваць пад ма́рмур

march [mɑ:rtʃ] – v.i. 1. маршыраваць. 2. ісьці́ пава́жнай хадо́ю. 3. ісьці́ напе́рад
– v.t. 1. (off) адво́дзіць *кагО́*. 2. мінА́ць, прахо́дзіць ма́ршам
– n. 1. марш -у *m.* (*перахо́д во́йска пахо́дным пара́дкам*). 2. марш -у *m.* (*музы́чны твор*). 3. разьвіцьцё *n.*, хада́ *f.* (*падзе́яў*)

March [mɑ:rtʃ] n. сакавік -а́ *m.*
– adj. сакавікО́вы

mare [mer] n. кабы́ла *f.*; асьліца *f.*

margarin or **margarine** [ˈmɑ:rdʒərən] n. маргары́н -у *m.*

margin [ˈmɑ:rdʒɪn] – n. 1. палі́ *pl. only* (*сшыткА́, кні́гі і г.д.*). 2. краj́ -ю *m.*; бе́раг -у *m.*; мяжа́ *f.*: ***the margin of a***

forest узьлéсlак -ку *m.*, узьлéсьсе *n.* 3. запáс -у *m.*; рэзэ́рва *f.*
– v.t. 1. абвóдзіць. 2. рабíць зацéмкі на палях. 3. пакідáць запáс (*грóшай*)

marginal ['mɑ:rdʒɪnəl] adj. 1. напíсаны *абó* надрукавáны на палях. 2. крáйні; бóчны; памéжны

marigold ['mærəgould] n., Bot. аксамíтка *f.*

marijuana or **marihuana** [ˌmærɪ'wɑ:nə] n. 1. індыíйскія канóплі. 2. марыхуáна *f.*

marina [mə'ri:nə] n. прыстань для я́хтаў

marine [mə'ri:n] – adj. 1. марскí: ***marine animals*** марскíя жывёліны; ***marine power*** марскáя сíла, сíла на мóры. 2. сýднавы: ***marine supplies*** сýднавыя прыпáсы. 3. падвóдны
– n. 1. флёт -у *m.*; караблí: ***merchant marine*** гандлёвы флёт. 2. а) салдáт марскóе пяхóты, б) марáк ваéнна-марскóга флёту. 3. карцíна з марскíм краявідам, марынá *f.*

Marine Corps n. марскáя пяхóта

mariner ['mærənər] n. марáк -á, матрóс -а *m.*

marital ['mærətəl] adj. шлюбны; сямéйны; сужэ́нскі: ***a marital obligation*** сужэ́нскае абавязáньне

maritime ['mærɪtaɪm] adj. 1. прымóрскі (*гóрад*). 2. якí жывé над мóрам. 3. ***maritime law*** марскí закóн. 4. марáцкі; мараплáўны: ***a maritime appearance*** марáцкі вы́гляд. 5. ***Maritime Canada*** канáдыйскія правінцыі ўздóўж Атлянты́чнага акія́ну

marjoram ['mɑ:rdʒərəm] – n. маярáн -у *m.*
– adj. маярáнавы

mark I [mɑ:rk] – n. 1. знак -у *m.*, мéтка *f.* 2. ***a question mark*** пытáльнік -а *m.* (*знак прыпы́нку*). 3. адзнáка, ацэ́нка *f.* (*шкóльная*). 4. цэль -і *f.*; мішэ́нь *f.*: ***to hit the mark*** трáпіць у цэ́ль, папáсьці; дасягнýць мэ́ты; ***to miss the mark*** прамахнýцца, не асягнýць пастáўленае мэ́ты. 5. мяжá, нóрма *f.*; узрóвень -ню *m.*: ***above the mark*** вышэ́й за нóрму; ***below the mark*** нiжэ́й за нóрму, не на вышынí; ***up to the mark*** а) на налéжнай вышынí. б) у дóбрым стáне, у дóбрым здарóўі
• ***beside the mark*** недарэ́чы; не на тэ́му
• ***of mark*** вáжны, выдáтны; слáўны (*пра чалавéка*)
– v.t. 1. стáвіць адзнáкі (*у шкóле*). 2. рабíць знáкі; пакідáць сьлед, плямý, рубéц. 3. абазначáць. 4. адзначáць (-ца). 5. пакáзваць на *што*. 6. заўважáць; ***mark my words*** запóмні маé слóвы. 7. запíсваць. 8. стáвіць цэ́ны (*на тавáрах*); ***to mark down*** а) запісáць. б) зьнíзіць цанý на тавáры; ***to mark time*** а) Milit. адбівáць крок на мéсцы. б) часóва адтэрмінóўваць спрáву

mark II [mɑ:rk] n. мáрка *f.* (*кóлішняя грашóвая адзíнка ў Нямéччыне, Фінля́ндыі*)

marked [mɑ:rkt] adj. 1. пазнáчаны, паплямлены. 2. вéльмі выразны, вéльмі знáчны: ***a marked difference*** выразная рóзьніца. 3. абраны, прызнáчаны: ***marked for success*** прызнáчаны для ўдáчы (*у жыцьці́*)

market ['mɑ:rkət] – n. 1. кірмáш -ý *m.*; торг -у *m.*: ***to market*** на кірмáш. 2. ры́нак -ку *m.*, базáр -у *m.*; ры́нкавы пляц; гандлёвыя рады́. 3. крáма *f.*: ***a meat market*** мясна́я крáма, я́тка *f.* 4. гáндаль -лю *m.*; ры́нак -ку *m.* (*сыстэ́ма эканамíчных сýвязяў*); ***to lose one's market*** стрáціць ры́нак. 5. пóпыт -у *m.*, ры́нкавыя цэ́ны: ***a good market*** дóбры пóпыт на *што*
– v.i. купля́ць *абó* прадавáць на кірмашы
– v.t. прадавáць; збывáць
• ***play the market*** спэкуляваáць на бíржы

marketable ['mɑ:rkətəbəl] adj. якí мáе вялікі пóпыт, хóдкі, збы́тны, пакупны́ (*пра тавáры*)

marl [mɑ:rl] n. 1. мэ́ргель -лю *m.* (*сыравíна вапняку́*). 2. Poet. зямля́ *f.*

marmalade ['mɑ:rməleɪd] n. сóчыва з цы́трусавых пладóў (*апэльсíнаў, цытры́ны*), мармэля́да *f.*

maroon [məˈru:n] – adj. цёмна-бардо́вы ко́лер
– adj. цёмна-бардо́вы
marque [mɑ:rk] n., Brit. ма́рка *f.*; гату́нак -ку *m.*, тып вы́рабу (*тава́ру*); мадэ́ль *f.* (*машы́ны*)
marriage [ˈmerɪdʒ] n. 1. шлюб -у *m.*, жані́мства *n.*; жані́цьба *f.* (*для мужчы́ны*), за́мужжа *n.* (*для жанчы́ны*); шлю́бнае жыццё: ***to contract, make a marriage*** заключы́ць жані́мства; ***to give in marriage*** выдава́ць за́муж. 2. шлюб -у *m.* (*цырыманія́л*). 3. бл і́зкае ядна́ньне, це́сная су́вязь. 4. зьлі́цьцё дзьвюх фі́рмаў, або́ ку́пля аднае́ фі́рмы другі́ю
marriage of convenience шлюб з разьлі́кам
married [ˈmerid] adj. 1. жана́ты (*пра мужчы́ну*), за́мужняя (*пра жанчы́ну*): ***a married son*** жана́ты сын; ***a married daughter*** за́мужняя дачка́. 2. жані́мскі, шлю́бны: ***married life*** сужэ́нскае, шлю́бнае жыццё; ***a married couple*** сужэ́нская па́ра. 3. це́сна спалу́чаны; ***to get married*** ажані́цца (*для мужчы́ны*), вы́йсьці за́муж (*для жанчы́ны*)
marrow [ˈmæroʊ] n. 1. шпік -у *m.*, касьцяны́ мозг. 2. ***to the marrow*** да шпіку́ касьце́й (*праме́рзнуць і пад.*), да глыбіні́ душы́, ве́льмі мо́цна (*крану́ць*). 3. энэ́ргія *f.*; сі́ла *f.*
marrow squash кабачо́к -ка́ *m.* (*род гарбуза́*)
marry [ˈmeri] v., **-ried, -rying** 1. вянча́ць. 2. а) жані́цца з *кім* (*пра мужчы́ну*). б) выхо́дзіць за́муж за *каго́* (*пра жанчы́ну*). 3. а) выдава́ць за́муж (*дзяўчы́ну*). б) жані́ць (*мужчы́ну*); ***She has married off all her daughters*** Яна́ вы́дала за́муж усі́х сваі́х дачо́к. 4. це́сна спалуча́ць
marsh [mɑ:rʃ] – n. балóта *n.*, ба́гна, дрыгва́ *f.*; твань *f.*
– adj. 1. балаця́ны (*гле́ба, по́ле*). 2. балóтны (*трава́, пту́шка*): ***a marsh plant*** балóтная расьліна
marshal [ˈmɑ:rʃəl] – n. 1. а) нача́льнік палі́цыі *або́* пажа́рнае кама́нды. б) судо́вы экзэку́тар (*напр. шэ́рыф*). 2. ма́ршал -а *m.* (*у во́йску*). 3. вяду́чы праграмы (*на банке́це, урачы́стасьці*), кама́ндуючы пара́дам
– v.t. 1. выстро́йваць. 2. урачы́ста ве́сьці, уво́дзіць; разьмяшча́ць гасьце́й (*на банке́це і пад.*)
– v.i. выстро́йвацца (*у баявы́м пара́ду*)
marsh gas балóтны газ
marshland [ˈmɑ:rʃlænd] n. балаця́ная мясцо́васьць, багні́стае ме́сца
marsh mallow алтэ́йка -ю *m.* (*алтэ́чны*)
marshmallow [ˈmɑ:rʃˌmeloʊ] n. 1. пу́хкая бе́лая цукерка; кандыта́рскія вы́рабы з алтэ́йнага ко́раня. 2. алтэ́йка -я *f.* (*куст*)
marsh marigold ло́таць *f.*
marshy [ˈmɑ:rʃi] adj. 1. балóісты (*по́ле*). 2. забало́чаны, багні́сты (*мясцо́васьць*). 3. балаця́ны: ***a marshy odor*** балаця́ны пах
mart [mɑ:rt] n. гандлёвы цэ́нтар; ры́нак -ку *m.*
marten [ˈmɑ:rtən] n. куні́ца *f.*
martial [ˈmɑ:rʃəl] adj. 1. вае́нны: ***martial music*** вае́нная му́зыка. 2. ваяўні́чы, адва́жны: ***a martial spirit (nation)*** ваяўні́чы дух (наро́д); ***martial law*** вае́ннае стано́вішча; ***to declare martial law*** абвясьці́ць вае́ннае стано́вішча
martin [ˈmɑ:rtən] n. ла́стаўка
martyr [ˈmɑ:rtər] – n. 1. му́чанік -а *m.*, му́чаніца *f.*: ***Many of the early Christians were martyrs*** Мно́гія з ра́ньніх хрысьція́наў былі́ му́чанікамі. 2. пакўтнік -а *m.*, пакўтніца *f.*
– v.t. 1. му́чыць (*на сьмерць*). 2. зьдзе́кавацца з *каго́*, катава́ць
martyrdom [ˈmɑ:rtərdəm] n. 1. пакўтніцкая сьмерць, пакўтніцтва *n.* 2. вялі́кія цярпе́ньні, пакўта *f.*
marvel [ˈmɑ:rvəl] – n. 1. дзі́ва *n.*, цудо́ўная, дзіўна́я, дзівóсная рэч; цўд -у *m.*
– v.i. 1. зьдзіўля́цца, дзіві́цца. 2. ціка́віцца: ***I marvel who he may be*** Мяне́ ціка́віць, хто ён

marvelous, Brit. **marvellous** ['mɑ:rvləs] adj. 1. цудо́ўны, надзвыча́йны. 2. непраўдападо́бны, невераго́дны. 3. Informal ве́льмі до́бры, раско́шны, выда́тны

Marxism ['mɑ:rksˌɪzəm] n. маркси́зм -у *m.*

Marxist ['mɑ:rksɪst] n. маркси́ст -а *m.*, маркси́стка *f.*

mascot ['mæskɑ:t] n. талісма́н -у *m.*

masculine ['mæskjələn] – adj. 1. мужчы́нскі. 2. мужчынападо́бны: ***a masculine woman*** мужчынападо́бная жанчы́на. 3. Gram. мужчы́нскага ро́ду

– n. 1. мужчы́нскі род; сло́ва ў мужчы́нскім ро́дзе; ***masculine rhyme*** мужчы́нская ры́фма

masculinity [ˌmæskjə'lɪnəti] n. мужчы́нскасьць *f.*

mash [mæʃ] – n. 1. мяккая ма́са, мязга́ *f.* 2. по́йла з во́труб'я (*для жывёлы*). 3. зато́р -у *m.* (*су́месь для браджэ́ння пры вы́рабе гарэ́лкі, пі́ва і інш.*)

– v.t. 1. таўчы́; расьціра́ць, разьміна́ць на мяккую ма́су: ***I'll mash the potatoes*** Я стаўку́ бу́льбу. 2. зава́рваць (*со́лад*); ***mashed potatoes*** то́ўчаная бу́льба, бульбяна́я ка́ша, пюрэ́

masher ['mæʃər] n. таўка́ч -а́ *m.*, таўка́чык -а *m.*: ***a potato masher*** таўка́чык да бу́льбы

mask [mæsk] – n. 1. ма́ска *f.* 2. ма́ска *f.*, удзе́льнік *або́* ўдзе́льніца маскара́ду. 3. прытво́рства, яко́е хава́е су́тнасьць *каго́-чаго́*. 4. Milit. маскіро́ўка *f.*

– v.t. 1. надзява́ць ма́ску. б) удава́ць, прыкіда́цца. 2. хава́ць, прыкрыва́ць: ***A smile masked his disappointment*** Пад усьме́шкай ён хава́ў сваё расчараванье. 3. Milit. маскава́ць

mason ['meɪsən] – n. му́ляр -а *m.*

– v.t. мурава́ць

Mason ['meɪsən] масо́н -а *m.*

masonic or **Masonic** [mə'sɑ:nɪk] adj. масо́нскі

masonry ['meɪsənri] n., pl. **-ries** 1. мур -у *m.*; падмуро́ўка *f.*, падму́рлак -ка *m.* 2. муля́рства *n.* 3. масо́нства

mass [mæs] – n. 1. вялі́кая ко́лькасьць, мно́ства *n.*; камя́к -а́ *m.*, ма́са *f.*: ***a mass of books*** ма́са кні́гаў. 2. бо́льшая ча́стка, бальшыня́ *f.*: ***the great mass of men*** бальшыня́ людзе́й. 3. Phys. вага́ *f.*, ма́са *f.* (*яко́га-н. це́ла*)

– v. зьбіра́ць (-ца) ў ку́чу

– adj. ма́савы: ***a mass protest*** ма́савы пратэ́ст; ***mass culture*** ма́савая культу́ра; ***mass media*** сро́дкі ма́савай інфарма́цыі, СМІ

• ***in the mass*** у цэ́лым, цалко́м, ца́лкам; уво́гуле, без падрабя́знасьцяў

• ***the masses*** ма́сы *pl.*, про́стыя працо́ўныя лю́дзі, наро́дныя ма́сы

Mass or **mass** [mæs] n. імша́, літурги́я *f.*

massacre ['mæsəkər] – n. разьня́ *f.*, ма́савае забо́йства (*людзе́й ці жывёлы*)

– v.t. лю́та забіва́ць

massage [mə'sɑ:ʒ] – n. маса́ж -у *m.*: ***to give a massage to*** рабі́ць маса́ж каму́-н.

– v.t. масажава́ць, рабі́ць маса́ж

masseur [mæ'sur] n. масажы́ст -а *m.*

masseuse [mæ'su:z] n. масажы́стка *f.*

massif [mæ'si:f] n. масі́лў -ву *m.*

massive ['mæsɪv] adj. 1. вялі́кі, цяжкі́, масі́ўны. 2. ве́лічны, імпаза́нтны. 3. ма́савы (*пра ўда́р, напа́д*)

massivity [ˌmæ'sɪvəti] n. масі́ўнасьць *f.*

mast [mæst] – n. 1. ма́чта, шчо́гла *f.* 2. высо́кі слуп -а́ *m.*

– adj. ма́чтавы, шчо́главы: ***mast timber*** ма́чтавы лес

– v.t. ста́віць ма́чту

master ['mæstər] – n. 1. а) гаспада́р -а́ *m.*, улада́льнік -а *m.* б) капіта́н гандлёвага су́дна: ***the master of the house*** гаспада́р дому, галава́ сям'і́. в) гаспада́р рабо́тнікаў, улада́льнік каня́, саба́кі. 2. той, хто вало́дае *чым*, экспэ́рт -а, зна́ўца -ы *m.*: ***He was a perfect master of both languages*** Ён даскана́ла вало́даў абе́дзьвюма мо́вамі; ***to be master of situation*** быць гаспадаро́м стано́вішча; ***to be one's own master*** быць незале́жным, самасто́йным. 3. esp. Brit. наста́ўнік -а *m.* 4. вялікі маста́к (*пісьме́ньнік, кампазытар і пад.*). 5. ***an old master*** карці́на,

скульпту́ра вялікага мастака́. 6. ма́йстр|а -ы, ма́йст|ар -ра *m.* 7. магі́с|тар -тра *m.* (*акадэмі́чная ступе́нь у Кана́дзе, Англіі, ЗША*). 8. спада́рыч (*ве́тлівае тытулава́ньне хлапца́, юнака́*)
– adj. 1. гало́ўны: ***a master bedroom*** гало́ўная спа́льня. 2. высо́каквалі-фікава́ны: ***a master printer*** высо́каквалі́фікава́ны друка́р
– v.t. 1. адо́льваць, аслі́льваць, апано́ўваць, перамага́ць; падпарадко́ўваць сабе́; спраўля́ць: ***to master one's anger*** апанава́ць сваю́ злосьць. 2. авало́дваць, трыва́ла засво́йваць: ***to master the English language*** авало́даць англе́льскай мо́вай. 3. кірава́ць *кім*

mastermind [ˈmæstərmaɪnd] – n. мозг -у *m.* (*неафіцыйны кіраўні́к або́ душа́ чаго́-н.*)
– v.t. распрацо́ўваць плян, ідэ́ю

masterly [ˈmæstərli] adj. 1. майстэ́рскі. 2. высо́каквалі́фікава́ны

master of ceremonies 1. вядо́ўчы праграмы; цырымо́ніймайст|ар -ра *m.* 2. канфэрансье́ *m.& f., indecl.*

Master of Arts магі́стар гуманіта́рных навуко́ў *або́* маста́цтваў

masterpiece [ˈmæstərpi:s] n. 1. шэдэ́ўр -у *m.*, майстэ́рства *n.* 2. найбо́льшы твор *або́* дасягне́ньне

mastery [ˈmæstəri] n., pl. **-teries** 1. ула́да, сі́ла *f.*; кірава́ньне *n.* 2. перава́га, перамо́га *f.* 3. майстэ́рства *n.* 4. ***mastery of*** майстэ́рскае вало́даньне *чым*

masticate [ˈmæstɪkeɪt] v. жава́ць, жваць

mat I [mæt] – n. 1. дыван|о́к -ка́ *m.*, рагó́жка, рагó́жа *f.*; цыно́ўка *f.* 2. падста́ўка, падкла́дка, падсьці́лка (*пад мі́сы, тале́ркі і г.д.*). 3. матра́с -а *m.*; мат -а *m.* 4. карда́нная ра́мка для малю́нкаў, здымкаў, паспарту́ *n.*, *indecl.*
– v.t. **(-tt-)** 1. сла́ць, засьці́ла́ць, падклада́ць падсьці́лку, кла́сьці цыно́ўку. 2. кудла́ціцца, блы́тацца (*пра валасы́*)

mat II [mæt] – adj. 1. ма́тавы, небліскучы. 2. нягла́дкі
– n. ма́тавая апрацо́ўка, паве́рхня *або́* фа́рба
– v.t. рабі́ць ма́тавым

match [mætʃ] – n. 1. раўня́ *f.*; па́ра *f.* : ***He has not met his match*** Ямý нямá ро́ўнага. 2. ***Those two horses make a good match*** Гэ́ныя ко́ні — до́брая па́ра. 3. спабо́рніцтва *n.*, матч -у *m.* (*футбо́льны, ша́хматны*). 4. жані́мства *n.* 5. вы́гадны кандыда́т *або́* кандыда́тка (*для жані́мства*), па́ртыя *f.*
– v. 1. раўня́цца з *кім*, да *каго́*. 2. быць адно́лькавымі, або́ падыхо́дзіць адно́ да аднаго́: ***These colors don't match*** Гэ́тыя ко́леры дрэ́нна спалуча́юцца. 3. супрацьстаўля́ць. 4. жані́ць, выдава́ць за́муж за *каго́*

matchbox [ˈmætʃbɑ:ks] n. па́чак запа́лак

matchless [ˈmætʃləs] adj. непараўна́льны, недася́жны, надзвыча́йны: ***matchless courage*** надзвыча́йная адва́га

matchmaker [ˈmætʃˌmeɪkər] n. 1. сват -а *m.*, сва́цьця *f.* 2. арганіза́тар спабо́рніцтваў, ко́нкурсаў

matchmaking [ˈmætʃˌmeɪkɪŋ] n. сва́танье, сватаўство́ *n.*

mate I [meɪt] – n. 1. напа́рнік -а *m.* 2. муж *або́* жо́нка. 3. памо́чнік капіта́на *або́* і́ншага спэцыяліста (*у фле́це*): ***a cook's mate*** памо́чнік ку́хара. 4. сам|е́ц -ца́ *m. або́* са́мка *f.* 4. адно́ з па́ры (*напр. рукави́ца*)
– v. 1. спалуча́цца шлю́бам. 2. (*пра жывёлаў*) спаро́ўва|ць (-цца), злуча́цца

mate II [meɪt] – n. мат -у *m.* (*у ша́хматах*)
– v.t. дава́ць, ста́віць ма́т

material [məˈtɪriəl] n. 1. матэрыя́л -у *m.*: ***building materials*** будаўні́чы матэрыя́л. 2. матэ́рыя, тканіна *f.*, матэрыя́л: ***dress material*** матэрыя́л на суке́нку. 3. ***raw materials*** а) сырави́на *f.* б) матэрыя́лы, на́кіды (*для арты́кулу, кні́гі*)
– adj. 1. матэрыя́льны, рэ́чыўны; фізы́чны, рэа́льны. 2. матэрыялісты́ч-

ны: ***a material point of view*** матэрыялі́стычны пункт гле́джаньня. 3. істо́тны, ва́жны

materialism [məˈtɪrɪəˌlɪzəm] n. матэрыялі́зм -у *m.*

materialist [məˈtɪrɪəlɪst] n. матэрыялі́ст -а *m.*, матэрыялі́стка *f.*

materialistic [məˌtɪrɪəˈlɪstɪk] adj. 1. матэрыялі́стычны. 2. матэрыялі́сцкі, ву́зка практы́чны

materiality [məˌtɪrɪˈæləti] n. матэрыя́льнасьць *f.*

maternal [məˈtɜ:rnəl] adj. 1. ма́тчынны, мацяры́нскі: ***maternal kindness*** ма́тчынная ла́ска, ласка́васьць *f.* 2. з ма́тчынага бо́ку (*радня́*)

maternity [məˈtɜ:rnəti] – n. 1. мацяры́нства *n.* 2. мацяры́нскасьць *f.*

– adj. 1. ***maternity clothes*** во́пратка для цяжа́рнае жанчы́ны. 2. радзі́льны: ***a maternity ward*** радзі́льнае аддзяле́ньне; ***maternity hospital*** радзі́льны дом; ***maternity leave*** дэкрэ́тны адпачы́нак

mathematical [ˌmæθəˈmætɪkəl] adj. 1. матэматы́чны. 2. дакла́дны: ***mathematical measurements*** дакла́дныя памéры

mathematician [ˌmæθəməˈtɪʃən] n. матэма́тык -а *m.*

mathematics [ˌmæθəˈmætɪks] n. матэма́тыка *f.*

matinée or **matinee** [ˌmætənˈeɪ] n. дзённы спэкта́кль *або́* канцэ́рт; ра́нішнік -у *m.*

mating [ˈmeɪtɪŋ] n. 1. падбіра́ньне да па́ры. 2. спалуча́ньне шлю́бам. 3. спаро́ўваньне *n.*

matrass [ˈmætrəs] n., *тс.* **mattrass** ко́льба *f.* (*для хімі́чных рабо́таў*)

matriarchy [ˈmeɪtrɪɑ:rki] n. матрыярха́т -у *m.*

matriculate [məˈtrɪkjəleɪt] – v. прыма́ць ва ўнівэрсытэ́т; быць прыня́тым ва ўнівэрсытэ́т, матрыкулява́цца

– n. [məˈtrɪkjələt] прыня́ты ва ўнівэрсытэ́т, матрыкулява́н|ы -ага *m.*

matriculation [məˌtrɪkjəˈleɪʃən] n. матрыкуля́цыя *f.*

matrimonial [ˌmætrɪˈmoʊniəl] adj. жані́мскі, шлю́бны

matrimony [ˈmætrəmoʊni] n.. pl. **-nies** 1. шлю́бнае жыцьцё. 2. шлюб -у *m.* 3. мар'я́ж -а *m.* (*у ка́ртах*)

matter [ˈmætər] – n. 1. рэ́чыва *n.*, матэ́рыя *f.* 2. спра́ва *f.*, пыта́ньне *n.*: ***money matters*** грашо́выя спра́вы; ***a matter of life and death*** пыта́ньне жыцьця́ і сьме́рці. 3. зьмест, прадме́т -у *m.*: ***the matter of his speech*** прадме́т яго́нае прамо́вы. 4. прычы́на, падста́ва *f.*: ***no matter for complaint*** нямá падста́вы нарака́ць. 5. спра́ва: ***a matter of two days*** спра́ва *або́* пыта́ньне двух дзён. 6. ва́жнасьць *f.*, значэ́ньне *n.*: ***it is of no matter*** гэ́та ня ма́е значэ́ньня

– v.i. быць ва́жным: ***It doesn't matter*** гэ́та ня ма́е значэ́ньня; усёро́ўна; ніча́го́га

• ***as a matter of fact*** фактычна; сапраўды́; насамрэ́ч

• ***first class matter*** по́шта пе́ршае кля́сы

• ***for that matter*** што датычыцца гэ́тага, калі́ на то́е пайшло́

• ***matter of course*** натура́льная рэч, само́ сабо́й зразуме́лае

• ***matter of opinion*** спрэ́чнае цьве́рджаньне, спрэ́чны по́гляд

• ***no laughing matter*** гэ́та ня жа́рты, гэ́та сур'ёзная спра́ва

• ***no matter*** а) нява́жна. б) не зважа́ючы на

• ***no matter what*** што б ні было́

• ***printed matter*** бандэро́ль *f.*

• ***What is the matter?*** Што ста́лася? У чым спра́ва?

• ***What's the matter with you?*** Што з ва́мі?

matter-of-course [ˌmætərəvˈkɔ:rs] adj. пасьлядо́ўны; натура́льны; норма́льны; зразуме́лы

matter-of-fact [ˌmætərəvˈfækt] adj. 1. сухі́, які́ датычыцца фа́ктаў, празаі́чны. 2. практы́чны, жыцьцёвы, без фанта́зіі

mattery [ˈmætəri] adj., Med. гно́йны; по́ўны гно́ю

matting [ˈmætɪŋ] n. 1. матэрыя́л на падсьцілкі, цыно́ўкі на падло́гу, для заго́ртваньня рэ́чаў. 2. цыно́ўкі *pl.* 3. вы́раб цыно́вак

mattress [ˈmætrəs] n. матра́ц -а, сяньні́ка сеньні́ка́ *m.*

maturate [ˈmætʃəreɪt] v.i. 1. сьпець, высьпява́ць. 2. Med. высьпява́ць (*пра ры́ў*); нагно́йвацца, станові́цца гно́йным

mature [məˈtʊr] – adj. 1. а) сьпе́лы, дасьпе́лы (*плод*). б) ***mature age*** ста́лы век; ***a mature person*** даро́слы чалаве́к. в) ***mature wine*** дасьпе́лае, старо́е віно́; ***mature cheese*** уле́жаны сыр. г) ***mature plans*** до́бра абду́маныя, распрацава́ныя пля́ны. 2. з тэ́мінам плацяжу́, пла́тны; ***mature savings bonds***: ашча́дныя бо́ны, які́я дасягну́лі тэ́рміну плацяжу́

– v.i. 1. а) сьпець, высьпява́ць, дасьпява́ць (*і пра плян*), б) станові́цца даро́слым, ста́лым; стале́ць. 2. падлега́ць выпла́це; наставя́ць, прыхо́дзіць (*пра тэ́рмін плацяжу́*)

– v.t. 1. рабі́ць ста́лым, даво́дзіць да сьпе́ласьці. 2. до́бра распрацо́ўваць (*плян*)

maturity [məˈtʊrəti] n., pl. **-ties** 1. по́ўнае разьві́цьцё, сьпе́ласьць, дасьпе́ласьць *f.* 2. ста́ласьць (*ве́ку, ду́мкі*)

maul [mɔ:l] – n. цяжкі́ мо́лат

– v.t. 1. кале́чыць, бі́ць і цяга́ць; набіва́ць сіняка́. 2. кало́ць кало́ду (*кліна́м і мо́латам*)

mausoleum [ˌmɔ:səˈli:əm] n., pl. **-leums, -lea** маўзале́й -я *m.*

mauve [moʊv] – n. ружава́та-лілёвы ко́лер

– adj. сьветлалілёвы

mawkish [ˈmɔ:kɪʃ] adj. 1. агі́дны, пры́кры на смак, мо́таш ны. 2. мо́таш на сэнтымэнта́льны; сьлязьлі́ва ўра́жлівы

maxim [ˈmæksɪm] n. 1. сэнтэ́нцыя, ма́ксіма *f.*, афары́зм -у *m.*; пры́казка *f.* 2. пры́нцып -у *m.*; пра́вілa павóдзінаў

maximal [ˈmæksɪməl] adj. найбо́льшы, найвышэ́йшы; максыма́льны

may [meɪ] v., p.t. **might** *выка́звае магчы́масьць*. 1. магчы́, магчы́ма: ***It may be so*** Магчы́ма, гэ́та так; ***He may arrive tomorrow*** Ён, магчы́ма, за́ўтра прые́дзе; Ён мо́жа за́ўтра прые́хаць. 2. (*пыта́ньне або́ дазво́л*): ***May I come in?*** Ці мо́жна ўвайсьці́? ***May I come and see you?*** Ці магу́ зайсьці́ адве́даць вас? ***You may go now*** Мо́жаце ісьці́ цяпе́р; ***You may if you can*** Мо́жаце, калі́ здо́лееце. 3. (*пажада́ньне або́ малі́тва*): ***May you be very happy*** Жада́ю вам, каб вы былі́ ве́льмі шчасьлі́выя. 4. ***Whoever he may be*** Хто б ён ні быў. 5. Law му́сіць, паві́нен

May [meɪ] – n. тра́вень -ўня, май -я *m.* – adj. тра́веньскі, ма́йскі

maybe [ˈmeɪbi] adv. магчы́ма, мо́жа: ***Maybe you'll have better luck next time*** Мо́жа насту́пным ра́зам будзеш мець больш уда́чы

May beetle or **May bug** хрушч хрушча́ *m.*

Mayday [ˈmeɪdeɪ] n. or **May Day** ра́дыёсыгна́л небясьпе́кі (*з вадапла́ва або́ самалёта*)

May Day [ˈmeɪdeɪ] n. першама́йскае сьвя́та

mayor [meɪr] n. мэр -а, бурмі́стар -ра *m.*

mayoral [ˈmeɪərəl] adj. мэ́раў, бурмі́страў

mayoralty [ˈmeɪərəlti] n. 1. паса́да мэ́ра, бурмі́стра. 2. час трыва́ньня на паса́дзе мэ́ра

maze [meɪz] n. 1. лябіры́нт -у *m.*; блытані́на *f.* 2. разгу́бленасьць *f.*, замяша́ньне *n.*

me [mi:, *unstressed* mi] pron. *the objective case of* ***I*** мяне́; ***to me*** мне; ***with me*** са мно́ю, пры мне

meadow [ˈmedoʊ] n. 1. луг -у *m.*, *dim.* лужло́к -ка́ *m.*; сенажа́ць *f.* 2. по́плаўў -ву *m.*, *pl.* паплавы́

meager, Brit. **meagre** [ˈmi:gər] adj. 1. бе́дны, по́сны, мізэ́рны: ***a meager meal***

по́сная е́жа. 2. худы́: ***a meager face*** худы́ твар. 3. няпо́ўны, недастатко́вы, скупы́: ***a meager report*** няпо́ўная справазда́ча

meal I [mi:l] n. е́жа, стра́ва *f.*; час е́жы

meal II [mi:l] n. 1. мука́ про́стага памо́лу: ***oat meal*** аўся́нка *f.* 2. дро́бная кукуру́зная крупа́

mean I [mi:n] – v.t., **meant, meaning** 1. зна́чыць; мець значэ́ньне, азнача́ць (*пра сло́вы, зна́кі*): ***What does this word mean?*** Што гэ́тае сло́ва зна́чыць? 2. мець на ду́мцы: ***Say what you mean*** Скажы́, што ты ма́еш на ду́мцы. 3. мець намо́р; зьбіра́цца; хаце́ць; мець на ўва́зе: ***I did not mean to go*** Я не зьбіра́ўся ісьці́; ***I didn't mean to offend you*** Я не хаце́ў вас абра́зіць. 4. прызнача́ць (-цца); судзі́ць лёсам: ***Fate meant us for each other*** Лёс судзі́ў нас адно́ аднаму́

– v.i. мець намо́ры: ***She means well*** Яна́ ма́е до́брыя намо́ры; ***to mean well by*** быць добразы́чліва настро́еным да *каго́*

mean II [mi:n] adj. 1. благі́, нядо́бры, благо́е я́касьці; бе́дны: ***the meanest of gifts*** найго́ршы з падару́нкаў. 2. ні́зкага *або́* про́стага ста́ну, пахо́джаньня. 3. малава́жны, малава́ртасны, сьці́плы. 4. убо́гі, бе́дны; ва́рты жа́лю. 5. няго́дны, нікчэ́мны; по́длы; ні́зкі; дро́бязны: ***a mean trick*** ні́зкая вы́хадка, ні́зкі вы́брык. 6. скупы́. 7. Informal а) ***to feel mean*** чу́цца пані́жаным, засаро́мленым. б) ***a mean horse*** нату́рысты, нарави́сты конь. б) нездаро́вы: ***I feel mean today*** Я сёньня бла́га чу́юся; ***no mean surgeon*** ве́льмі до́бры хіру́рг

mean III [mi:n] – adj. 1. сярэ́дні: ***the mean annual air temperature*** сярэ́днегадава́я тэмпэрату́ра; ***the mean number*** сярэ́дняе арытмэты́чнае. 2. пасрэ́дны, сярэ́дні

– n. 1. сярэ́дзіна *f.*; ***a happy mean*** залата́я сярэ́дзіна. 2. Math. сярэ́дняе *n.* (*напр. арытмэты́чнае*)

meander [mi'ændər] – v.i. 1. ві́цца (*пра раку́, даро́гу*). 2. хадзі́ць бязмэ́тна, блука́ць

– n. 1. заві́ліна, зьві́ліна *f.*; вы́гін, за́гін -у *m.* 2. бязмэ́тнае хаджэ́ньне, блука́ньне *n.*

meandrous [mi'ændrəs] adj. or **meandering** [mi'ændərɪŋ] adj. заві́лісты, зьві́лісты

meaning ['mi:nɪŋ] – n. сэнс -у *m.*; значэ́ньне *n.*; ва́жнасьць *f.*

– adj. 1. які́ не́шта зна́чыць, шматзна́чны (*пра по́зірк*). 2. ***well meaning*** з до́брым наме́рам

meaningful ['mi:nɪŋfəl] adj. по́ўны значэ́ньня, ва́жны

meaningless ['mi:nɪŋləs] adj. бяз сэ́нсу; без значэ́ньня; пусты́; нява́жны

means [mi:nz] n., pl. 1. спо́саб, мэ́тад -у *m.*, сро́дак -ку *n.*; ***means of communication*** сро́дак камуніка́цыі. 2. бага́цьце *n.*; сро́дкі *pl. only*; ***a man of means*** бага́ты, замо́жны чалаве́к, багаце́й -я *m.*

• ***by all means*** напэ́ўна, што б там ні было́

• ***by any means*** у які́-ко́лечы спо́саб. за ўся́кую цану́

• ***by means of*** праз; пры дапамо́зе чаго́-н.

• ***by no means*** не, ані́; ні ў я́кім вы́падку

meant [ment] v., *past and p.p. of* **mean**

meantime ['mi:ntaɪm] adv. тым ча́сам, між тым

meanwhile ['mi:nwaɪl] adv. тым ча́сам; пакуль што

measles ['mi:zəlz] n. адзёр адру́ *m.*, во́дра *f.* ***German measles*** краснуха *f.*: ***Measles is a children's disease*** Адзёр — дзіця́чая хваро́ба

measure ['meʒər] – v.t. 1. ме́раць, вымяра́ць. 2. мець даўжыню́, шырыню́: ***The tree measures 10 meters*** Дрэ́ва ма́е 10 м вышыні́. 3. адме́рваць: ***to measure off 2 meters of cloth*** адме́раць 2 мэ́тры матэрыя́лу. 4. (with), ацэ́ньваць, супастаўля́ючы з *чым*;

(by) датарно́ўваць да *чаго́*. 5. Poet. хадзі́ць, ру́хацца ўза́д і ўпе́рад. 6. ***to measure out*** адмяра́ць. 7. ***to measure up*** а) мець неабхо́дныя кваліфіка́цыі; адпавяда́ць вымо́гам, патрабава́ньням; апра́ўдваць чые́-н. надзе́і
– n. 1. ме́ра *f.*; ме́раньне *n.*: ***liquid (dry, square) measure*** ме́ра ва́дкасьці (сы́пкіх рэ́чываў, паве́рхні). 2. ме́рка *f.*; ***to take (one's) measure*** а) здыма́ць чыю́-н. ме́рку. б) ацэ́ньваць чый-н. хара́ктар. 3. крытэ́рый -ю *m.*, ме́рка *f.*; ***measure of value*** крытэ́рый ва́ртасьці. 4. ***beyond measure*** празме́рна, мо́цна; зана́дта; ***in great measure*** у зна́чнай ме́ры. 5. Mus. такт -у *m.* 6. мерапрые́мства *n.*; за́хады *pl. only*; ***to take measures*** зрабі́ць за́хады; ***preventive measures*** ме́ры засьцяро́гі. 7. Math. дзе́льнік, мно́жнік -а *m.*: ***the greatest common measure (GCM)*** агу́льны найбо́льшы дзе́льнік

measured [ˈmeʒərd] adj. 1. рэгуля́рны; адно́лькавы; аднаста́йны, аднаро́дны. 2. рытмі́чны. 3. пі́саны ве́ршам, ня про́заю. 4. паво́льны і стры́маны

measurement [ˈmeʒərmənt] n. 1. ме́раньне *n.* 2. ***measurements*** паме́ры *pl.* 3. сыстэ́ма ме́раў

meat [mi:t] n. 1. мя́са *n.*; ***meat balls*** мясны́я га́лкі, галу́шкі; ***meat pie*** піро́г зь мя́сам. 2. мя́са *n.*, су́тнасьць *f.*

meat grinder мясару́бка *f.*

meatless [ˈmi:tləs] adj. 1. бязь мя́са, по́сны; бязь е́жы. 2. ***meatless Tuesday*** по́сны аўто́рак

meaty [ˈmi:ti] adj. 1. мясны́. 2. мясі́сты: ***meaty roast*** мясі́стая смажані́на. 2. зьмясто́ўны (*пра кні́гу, прамо́ву*)

mechanic [mɪˈkænɪk] n. мэха́нік -а *m.*: ***an automobile mechanic*** аўтамабі́льны мэха́нік, аўтамэха́нік -а *m.*

mechanical [mɪˈkænɪkəl] adj. 1. мэхані́чны. 2. аўтаматы́чны, машына́льны, без пачуцьця́ (*пра чыта́ньне*). 3. ***a mechanical law*** зако́н мэха́нікі

mechanics [mɪˈkænɪks] n. 1. мэха́ніка *f.* 2. тэ́хніка *f.* чаго́-н.; ***the mechanics of playing the piano*** тэ́хніка ігры́ на піяні́на

mechanize [ˈmekənaɪz] v.t. мэханізава́ць

medal [ˈmedəl] n. мэда́ль -я́ *m.*; о́рдэн -а *m.*

meddle [ˈmedəl] v.i. уме́швацца, мяша́ца (*у чужы́я спра́вы і пад.*)

meddlesome [ˈmedəlsəm] adj. які́ мяша́ецца не ў сваё, даку́чны, назо́йлівы

media I [ˈmi:diə] n., *pl. of* **medium** сро́дкі ма́савай інфарма́цыі, СМІ
• ***advertising media*** сро́дкі рэкляма-ва́ньня (*як газэ́ты, ра́дыё*)

media II [ˈmi:diə] n., pl. **-diae** 1. нутрана́я абало́нка сьце́нкі крывяно́снае або́ лімфаты́чнае су́дзіны. 2. Phon. зво́нкія зы́чныя

medial [ˈmi:diəl] adj. 1. сярэ́дні (*у сярэ́дзіне*). 2. праме́жкавы; пасрэ́дны; звыча́йны.

median [ˈmi:diən] n.. Math. мэдыя́на *f.*

mediate [ˈmi:dieɪt] – v.i. 1. быць пасярэ́днікам, пасярэ́днічаць. 2. займа́ць пасярэ́дняе ме́сца *або́* стано́вішча
– v.t. 1. дово́дзіць да пагадне́ньня пасярэ́дніцтвам. 2. быць су́вязьзю
– adj. праме́жны, праме́жкавы

mediator [ˈmi:dieɪtər] n. пасярэ́днік -а *m.*, пасярэ́дніца *f.*; мэдыя́тар -а *m.*

mediatory [ˈmi:dieɪtɔ:ri] adj. пасярэ́дніцкі

medical [ˈmedɪkəl] – adj. 1. мэды́чны, мэдыцы́нскі (*дапамо́га, устано́ва, факульта́т*). 2. лячэ́бны, мэдыцы́нскі (*прэпара́т*)
– n., Informal мэдыцы́нскі экза́мэн

medicament [məˈdɪkəmənt] n. лек -у *m.*; лека́рства *n.*

medicate [ˈmedɪkeɪt] v.t. 1. лячы́ць ле́камі. 2. насыча́ць ле́кам

medicated [ˈmedɪkeɪtəd] adj. насы́чаны ле́кам, зь ле́кам

medicinal [məˈdɪsənəl] adj. зь ле́кавымі сво́масьцямі, я́касьцямі; лячэ́бны

medicine [ˈmedsən] n. 1. лек -у *m.*, лека́рства *n.*, тэрапі́я *f.* 2. мэдыцы́на *f.*

medicine man шама́н -а *m.*; знаха́р -а́ *m.*, знаха́рка *f.*

medicine box or **chest** ха́тняя апте́чка

medieval [ˌmi:diˈi:vəl] adj. сярэ́дневякó-вы, сярэ́днявéчны

mediocre [ˌmi:diˈoukər] adj. пасрэ́дны, сярэ́дні

mediocrity [ˌmi:diˈɑ:krəti] n., pl. **-ties** пасрэ́днасьць *f.*

meditate [ˈmediteit] v. 1. дýмаць, разважáць; меркавáць; раздýмваць. 2. задýмваць, надýмваць; плянавáць. 3. манíцца, зьбірáцца (*рабíць што-н.*). 4. увáжна прыглядáцца да чагó-н.

meditation [ˌmediˈteiʃən] n. 1. дýманьне, разважáньне *n.*; рóздум -у *m.* 2. сузіráньне *n.*, мэдытáцыя *f.*

mediterranean [ˌmeditəˈreiniən] adj. міжзéмны: ***Mediterranean Sea*** Міжзéмнае мóра

medium [ˈmi:diəm] – adj. сярэ́дні; меркавáны

– n., pl. **-diums** or **-dia** 1. сярэ́дзіна: ***a happy medium*** залатáя сярэ́дзіна. 2. срóд|ак -ку, спóсаб -у *m.*; ***medium of communication*** срóдак камунікáцыі; ***through the medium of*** пры дапамóзе *кагó-чагó*. 3. асярóдзьдзе *n.* 4. распушчáльнік -а *m.* (*для фáрбаў*). 5. (pl. always, **-diums**) мэ́дыюм, сьпірытуалíст -а *m.*

medley [ˈmedli] – n., pl. **-leys** 1. мешанí-на, сýмесь *f.* 2. Mus. папуры́, *n., indecl.*

– adj. зьмéшаны, мяшáны; разнарóдны, разнастáйны

– v.t. зьмéшваць, перамéшваць

medulla [meˈdʌlə] n., pl. **-dullae** 1. прадаўгавáты мозг. 2. шпік -у *m.* (*кóсьці*). 3. нутранáя чáстка óргана (*напр. ныркі*). 4. Bot. асярóд|ак -ка *m.* (*сьцябла́ ці камля́ расьлíны*), стрыж|ань -ня *m.*

medulla oblongata прадаўгавáты мозг (*найніжэ́йшая чáстка мазгóў*)

meek [mi:k] adj. лагóдны, ціхі, рахмáны; пакóрлівы

meekness [ˈmi:knəs] n. лагóднасьць; рахмáнасьць, мя́ккасьць *f.*

meet [mi:t] – v.t. **met, meeting** 1. сустракáць. 2. знаёміцца з *кім*: ***Have you met my sister?*** Ці вы знаёмыя з маёй сястрóю? 3. задавальняць (*жадáньне, вымóгі*); абвяргáць (*пярэ́чаньне*). 4. аплáчваць: ***to meet bills or debts*** аплáчваць рахýнкі абó даўгі; ***to meet a payroll*** быць у стáне плаціць зарплáту

– v.i. 1. сустракáцца. 2. зьбірáцца (*пра сход*). 3. сыхóдзіцца; злучáцца (*пра дарóгі*); упадáць, улівáцца (*пра ракý*); ***to meet (up) with*** а) сустрэ́цца, пазнаёміцца з *кім*. б) натыкнýцца, натрáпіць на *кагó-што*

meeting [ˈmi:tiŋ] n. 1. сустрэ́ча *f.* 2. пасéджаньне *n.*; сход; мітынг -у *m.* 3. рэлігíйны збор для малíтвы. 4. мéсца злучэ́ньня (*дарóг, дзьвюх акрýгаў і г.д.*). 5. дуэ́ль *f.*

megalomania [ˌmegələˈmeiniə] n. манія вялíкасьці, мэгалямáнія *f.*

megaphone [ˈmegəfoun] – n. рýпар, мэгафóн -а *m.*

– v. 1. узмацня́ць *або́* накірóўваць гóлас мэгафóнам. 2. гаварыць у рýпар

melancholia [ˌmelənˈkouliə] n. мэлянхóлія *f.*

melancholic [ˌmelənˈkɑ:lik] – n. мэлянхóлік -а *m.*, мэлянхалíчка *f.*

– adj. мэлянхалíчны, схíльны да мэлянхóліі

melancholy [ˈmelənkɑ:li] – n., pl. **-cholies** 1. журбá, маркóта, нудá, тугá *f.*; сум -у *m.*; мэлянхóлія *f.* 2. задумéннасьць, задýмлівасьць *f.*

– adj. 1. маркóтны, тужлíвы, сýмны; нýдны: ***a melancholy smile*** сýмная ўсьмéшка. 2. задумéнны, задýмлівы

meliorate [ˈmi:liəreit] v. паляпшáц|ь (-ца), удасканáльвац|ь (-ца)

melioration [ˌmi:liəˈreiʃən] n. палéпшаньне, удасканáленьне *n.*, мэліярáцыя *f.*

mellow [ˈmelou] – adj. 1. сьпéлы; сакавíты, сóчны (*пра плады́*). 2. лагóдны, прыéмны (*віно́, гук, сьвятло́*). 3. мяккáя, рассы́пістая (*пра глéбу*). 4. нападпíтку

– v. 1. зьмякчáц|ь (-ца). 2. пасьпяваць, высьпяваць

melodious [məˈloudiəs] adj. 1. прыéмны для слы́ху, мілагýчны. 2. мэляды́чны (*склад вéрша і пад.*)

melodrama [ˈmeləˌdrɑ:mə] n. мэлядра́ма *f.*

melodramatic [ˌmelədrəˈmætɪk] adj. мэлядраматы́чны

melody [ˈmelədi] n., pl. **-dies** мэлёдыя *f.*, музыка́льнасьць *f.* (*ве́рша і пад.*)

melon [ˈmelən] n. ды́ня *f.*

melt [melt] – v.t. **melted** or **molten** 1. тапі́ць, растапля́ць (*сьнег, воск*): ***The sun will melt away the fog*** Со́нца расто́піць тума́н. 2. расплаўля́ць (*во́лава, лёд*). 3. распушча́ць: ***to melt sugar in water*** распусьці́ць цу́кар у вадзе́. 3. зьмякча́ць, рабі́ць ласка́вым

– v.i. 1. тапіцца, растапля́цца (*пра воск, ма́сла, смалу́*); раставаць (*пра сьнег, лёд*). 2. распушча́цца, распуска́цца (*пра соль у вадзе́*). 3. мякчэ́ць, расчу́львацца, раставаць (*пра се́рца*); ***to melt away*** а) раставаць. б) зьніка́ць: ***Money melts away*** Гро́шы зьніка́юць уваччу́; ***His wealth melted away*** Яго́нае бага́цьце расплыло́ся

– n. 1. распла́ўлены мэта́л. 2. пла́ўленьне *n.*

meltability [ˌmeltəˈbɪlətɪ] n. пла́ўкасьць *f.* (*мэта́лу*), то́пкасьць (*во́ску, са́ла*)

meltable [ˈmeltəbəl] adj. пла́ўкі, то́пкі

melting [ˈmeltɪŋ] – n. 1. плаўле́ньне *n.*, пла́ўка *f.* 2. раставаньне, распуска́ньне *n.*

– adj. 1. пла́ўкі. 2. плаві́льны (*цэх, печ*). 3. далика́тны, мя́ккі. 4. чульлі́вы, чу́лы: ***melting point*** пункт плаўле́ньня

melting pot 1. ты́гель -я *m.* 2. плаві́льны кацёл

member [ˈmembər] n. 1. ся́бра -ы, ся́бар -ра *m.*, чалле́ц -льца́ (*сям'і́, арганіза́цыі*), член -а *m.* (*це́ла, ска́зу*): ***member of a sentence*** член ска́зу; ***member of an equation*** член раўна́ньня. 3. ***Member of Parliament*** (Brit.), ***Member of Congress*** (U.S.) дэпута́т парля́мэнту, кангрэ́су, кангрэсме́н -а *m.*

membership [ˈmembərʃɪp] – n. 1. сяброўства, чле́нства *n.* 2. сябры́, чле́ны (*як гру́па*). 3. ко́лькасьць сяброў – adj. сяброўскі, чле́нскі: ***membership card*** сяброўскі біле́т, сяброўскае пасьве́дчаньне

membrane [ˈmembreɪn] n. 1. мэмбра́на, перапо́нка, плява́ *f.* 2. абало́нка *f.*

membranous [ˈmembrənəs] adj. 1. перапо́нчаты (*ла́па*). 2. плеўкавы

memento [məˈmentoʊ] n., pl. **-tos, -toes** 1. па́мятка (*аб яко́й-н. падзе́і*). 2. напамі́н (*пра што-н. мінулае*)

memoir [ˈmemwɑ:r] n. 1. біяграфі́чны за́піс, аўтабіягра́фія. 2. справаздача навуко́вых дасьле́даваньняў; ***memoirs*** а) мэмуа́ры, успамі́ны *pl. only.* б) аўтабіягра́фія

memorable [ˈmemərəbəl] – adj. 1. па́мятны, незабы́ўны. 2. запамінальны – n., *often* **memorables** па́мятныя спра́вы

memorandum [ˌmeməˈrændəm] n.,pl. **dums** or **-da** 1. ната́тка *f.*, па́мятная запі́ска. 2. мэмара́ндум -у *m.*; дыпляматы́чная но́та

memorial [məˈmɔ:riəl] n. 1. по́мнік -а *m.* 2. мэмарыя́л -у *m.* (*падрабя́знае па́ньне фа́ктаў у пэты́цыі*)

Memorial Day Дзень па́мяці пале́глых жаўне́раў

memorize [ˈmeməraɪz] v.t. завучваць напа́мяць; запамінаць

memory [ˈmeməri] n., pl. **-ries** 1. па́мяць *f.*: ***He has a better memory than I have*** Ён ма́е ле́пшую па́мяць, як я. 2. успамі́н -у *m.*, прыпаміна́ньне *n.*; ***the memory of things past*** прыпаміна́ньне мінулых спраў; ***in memory of*** на ўспамі́н *чаго́-каго́*

men [men] n., *pl. of* **man** 1. мужчы́ны *pl.* 2. чалаве́чыя істо́ты, лю́дзі наагу́л

menace [ˈmenəs] – n. пагро́за, небясьпе́ка *f.*; гро́зьба *f.*

– v.t. пагражаць

menacingly [ˈmenəsɪŋli] adv. пагро́зьліва, з пагро́зай

menagerie [məˈnædʒərɪ] n. зьвяры́нец -цу *m.* (*зьвяры́ і будыні́на*)

mend [mend] – v.t. 1. ла́піць, ла́таць (*во́пратку і г.д.*), цыраваць (*панчо́хі*); пра́віць, ла́дзіць, рамантаваць:

to mend clothes ла́таць во́пратку; ***to mend a road*** рамантава́ць даро́гу. 2. папраўля́ць, паляпша́ць, выпраўля́ць: ***to mend one's manners*** папра́віць сваé манéры; ***to mend an error*** вы́правіць памы́лку. 3. ***to mend a fire by adding fuel*** папра́віць аго́нь падкі́нуўшы па́ліва. 4. ***to mend matters*** нала́дзіць спра́вы
– v.i. 1. паляпша́цца. 2. ачу́ньваць, папраўля́цца
– n. 1. зала́таная, зацырава́ная дзі́рка; зама́заная раско́ліна. 2. палéпшаньне *n.* (*здаро́ўя, спра́ваў*); ***to be on the mend*** папраўля́цца, устава́ць на но́гі, вярта́цца да здаро́ўя

mendacious [men'deɪʃəs] adj. 1. хлусьлі́вы, непраўдзі́вы. 2. фальшы́вы, няпра́вільны: ***a mendacious report*** фальшы́вая справазда́ча; ***mendacious rumors*** непраўдзівыя чу́ткі

mendacity [men'dæsəti] n., pl. **-ties** 1. хлусьлі́васьць, ілжы́васьць *f.* 2. мана́ *f.*; хлусьня́ *f.*; фальш -у *m.*

mendicancy ['mendɪkənsi] n. 1. жабрава́ньне *n.* 2. жабра́цтва *n.*

mendicant ['mendɪkənt] – adj. 1. які́ жабру́е: ***mendicant friar*** мана́х, які́ жабру́е. 2. жабра́цкі
– n. жабра́к -á *m.*

mendicity [men'dɪsəti] n. жабра́цтва *n.*

menial ['mi:niəl] – adj. 1. лёкайскі: ***to do menial tasks*** выко́нваць чо́рную пра́цу, працава́ць паслуга́чом. 2. ні́зкі, про́сты (*пра пахо́джаньне*)
– n. 1. слугá -і́, лёкай -я, паслуга́ч -а́ *m.*, той, хто выслу́жваецца ў каго́-н.; чэ́лядзь *f.*

menopause ['menəpɔ:z] n. клімактэ́рый -ю, кліма́кс -у *m.*

menses ['mensi:z] n., pl. ме́сячныя *pl. only*, мэнструа́цыя *f.*

men's room мужчы́нская прыбіра́льня

menstruation [ˌmenstru'eɪʃən] n. мэнструа́цыя *f.*

menstruous ['menstruəs] adj. 1. мэнструа́льны. 2. яка́я ма́е мэнструа́цыю

menswear ['menzwer] n. мужчы́нская во́пратка

mental I ['mentəl] adj. 1. разумо́вы. 2. псыхі́чны: ***a mental disease*** псыхі́чная хвароба. 3. псыхі́чна хво́ры, а) ***a mental patient*** псыхі́чна хво́ры пацыéнт. б) ***a mental institution*** псыхіятры́чная кліні́ка. в) ***a mental specialist*** псыхія́тар -ра *m.* 4. у галаве́, у ду́мках: ***mental arithmetic*** лічэ́ньне ў галаве́

mental II ['mentəl] adj. падбаро́дачны

mentality [men'tæləti] n., pl. **-ties** 1. здо́льнасьць мы́сьліць, разважа́ць; мысьлéньне *n.* 2. спо́саб або́ склад мысьлéньня; мэнта́льнасьць *f.*

mention ['menʃən] – v.t. 1. гаварыць пра *каго́-што.* 2. зга́дваць, прыга́дваць: ***Don't mention it!*** Нямá за што! (*адка́з на падзя́ку*); ***not to mention*** ня ка́жучы ўжо пра
– n. упамі́н -у *m.*; зга́дка, спасы́лка *f.*; ***to make mention of*** гаварыць пра *каго́-што*, спасыла́цца на *каго́-што*

mercantile ['mɜ:rkənti:l] adj. 1. купéцкі, гандлёвы, камэрцыйны: ***a mercantile firm*** гандлёвая фірма. 2. мэркантыльны

mercenary ['mɜ:rsəneri] – adj. 1. карыслівы. 2. наёмны.
– n. наёмнік -а *m.*

merchandise ['mɜ:rtʃəndaɪz] – n. тавáры *pl.* of тавáр -у *m.*
– v. ['mɜ:rtʃəndaɪz] гандлява́ць

merchant ['mɜ:rtʃənt] – n. 1. купéц -ца́ *m.*; гандля́р -á *m.*, гандля́рка *f.* 2. кра́мнік -а *m.*, кра́мніца *f.*; ро́зьнічны гандля́р
– adj. гандлёвы, купéцкі. а) ***a merchant seaman*** мара́к гандлёвага флёту. б) ***a merchant town*** гандлёвы го́рад

merchantable ['mɜ:rtʃəntəbəl] adj. хо́дкі, які́ ма́е вялі́кі по́пыт (*пра тавáр*)

merciful ['mɜ:rsɪfəl] adj. лі́тасьцівы, міласэ́рны

mercifully ['mɜ:rsɪfəli] adv. лі́тасьціва, міласэ́рна

merciless ['mɜ:rsɪləs] adj. бязьлі́тасны, лю́ты

mercury [ˈmɜ:rkjəri] – n., pl. **-ries** 1. рту́ць -і *f.*, жывóе срэ́бра. 2. рту́тны слупóк у тэрмóмэтры абó барóмэтры – adj. рту́тны

mercy [ˈmɜ:rsi] n., pl. **-cies** 1. лі́тасьць, мілас э́рнасьць *f.*; ла́ска *f.* 2. бласла-вéньне *n.*; шча́сьце *n.*; ***That is a mercy*** Гэ́та прóста шча́сьце; ***at the mercy of*** а) у чыёй-н. мóцы. б) на чыёй-н. ла́сцы. 3. памілава́ньне *n.*; ***to obtain mercy*** быць памі́лаваным

mere [mɪr] adj, *superl.* **merest** нічóга ін-шага, як; звыча́йны, прóсты; тóлькі: ***The cut was the merest scratch*** Парэ́з быў звыча́йнай дра́пінай

merely [ˈmɪrli] adv. і нічóга больш; усяго́ тóлькі; прóста; тóлькі

merge [mɜ:rdʒ] – v.t. паглына́ць, убіра́ць (*у сябе́*); злуча́ць у адно́ і ўбіра́ць у сябе́; улівáцца, зьлівáцца: ***The steel trust merged various small businesses*** Стальны́ трэст паглынýў рóзныя малы́я фі́рмы – v.i. быць паглы́нутым *абó* ўвабра́ным

merger [ˈmɜ:rdʒər] n. 1. зьліцьцё, злучэ́ньне *n.* (*дзьвюх кампа́ніяў у адну́*). 2. той, хто злуча́е, зьлівáе ў адно́

meridian [məˈrɪdiən] – n. 1. Geogr. мэрыдыя́н -а *m.* 2. зэні́т -у *m.* 3. вяршы́ня разьвіцьця́; рóсквіт (*жыцьця́*) – adj. найвышэ́йшы, найбóльшы: ***the meridian glory*** найбóльшая слáва. 2. паўдзённы, паўднёвы. 3. які́ стаіць у зэні́це (*пра со́нца, ме́сяц*): ***the sun's meridian beams*** праме́ньні со́нца ў зэні́це

merino [məˈri:nou] n., pl. **-nos** 1. мэрынóс (*парóда гішпáнскіх авéчак*). 2. мэрынóсавая вóўна

merit [ˈmerɪt] – n. 1. заслýга *f.*: ***a mark according to the merit of the student's work*** адзнáка, якóю вýчань заслужы́ў сваёй прáцай; 2. дóбрая я́касьць, плюс -у *m.*, вáртасьць, перавáга *f.*; ***The merits of your plan outweigh the defects*** Дóбрыя бакí твайгó пля́ну пераважáюць недахóпы; ***make a merit of something*** стáвіць што-н. сабé ў заслýгу; тлумáчыць што-н. як сваю́ заслýгу – v. быць вáртым *чагó*; заслугóўваць *чагó*

merited [ˈmerətəd] adj. заслýжаны (*пра ўзнагарóду, пахвалý*)

meritless [ˈmerɪtləs] adj. без заслýгаў *абó* вáртасьці; нявáрты

meritorious [ˌmerɪˈtɔ:riəs] adj. пахвáльны (*учы́нак*); вáрты ўзнагарóды

mermaid [ˈmɜ:rmeɪd] n. русáлка, сырэ́на *f.*; ная́да, нímфа *f.*

merman [ˈmɜ:rmæn] n., pl. **-men** 1. Myth. вадзянíк -á *m.* 2. трытóн -а *m.*

merrily [ˈmerɪli] adv. вясёла, вéсела

merriment [ˈmerimənt] n. сьмéх і весялóсьць; вясёлая забáва

merriness [ˈmerinəs] n. вясёлы настрóй

merry [ˈmeri] adj. 1. вясёлы: ***merry talk*** вясёлая гýтарка; ***merry laughter*** вясёлы сьмех; ***Merry Christmas!*** Вясёлых Калядаў! 2. рáдасны, уцéшны

merry-go-round [ˈmerigouˌraund] n. карусэ́ль *f.*

merrymaking [ˈmeriˌmeɪkɪŋ] n. 1. весялóсьць, пацéха *f.* 2. вясёлая забáва, гуля́нка, вясёлае сьвя́та

mesh [meʃ] – n. 1. пятля́ *f.* (*у сéтцы*), вóчка *n.* (*у рэ́шаце*). 2. сéтка *f.*; пáстка *f.*; сілó *n.*; пляцёнка *f.* (*для прадýктаў*). 3. Tech. счаплéньне *n.* (*зубчáтых кóлаў*); ***in mesh*** уключáны; ***meshes*** а) сéткі (*рыбáцкія*). б) пáстка *f.*; сілó *n.* – v. 1. лавíць сéткамі *абó* пáсткай. 2. (*пра зýбы шасьцярні́*) зачэ́пліваццa. 3. злучáць, задзінóчваць

mesmerize [ˈmezmərɑɪz] v. гіпнатызавáць

mesmerizer [ˈmezmərɑɪzər] n. гіпнатызёр -а *m.*

mess [mes] – n. 1. непарáдак -ку, бруд -у *m.*; сумятня́ *f.*; блытанíна *f.*: ***to make a mess of one's dress*** пабрýдзіць сукéнку; ***to make a mess of things*** праваліць усю́ спрáву; ***in a mess*** а) у непарáдку. б) у грязí, брýдзе

дны. 2. цяжко́е, непрые́мнае *або́* няўда́лае стано́вішча: ***His affairs are in a mess*** Ягóныя спрáвы ў бядóтным стáне; ***to get in mess*** патрáпіць у бядý; ***to clear up the mess*** вы́сьвятліць непаразуме́ньне. 3. супóльны стол, супóльнае харчава́ньне (*у во́йску й флёце*). 4. стрáва, пóрцыя *f.*; ***a mess of oatmeal*** пóрцыя аўся́нкі

– v.t. 1. бру́дзіць, рабіць непара́дак. 2. ***to mess up*** наблы́таць, сапсава́ць спрáву; нарабіць бесталкóвіцы. 3. выдава́ць абе́ды, харчава́ць (*жаўне́раў, маракóў*)

– v.i. ра́зам е́сьці за супóльным сталóм, ра́зам сталава́цца: ***to mess about*** or ***around*** працава́ць дарма́ (*безвынікóва*); хадзіць, блука́ць бязмэ́тна; дурэ́ць, выдурня́цца

message [ˈmesɪdʒ] – n. 1. паведамле́ньне (*ву́снае або́ пісьмóвае*) *n.*; перада́ча *f.*, перадава́ньне *n.*: ***Send me a message*** Паведамі́ мяне́; ***a message of congratulation*** віншава́ньне. 2. пасла́ньне *n.*: ***the President's message to Congress*** пасла́ньне прэзыдэ́нта канграсу. 3. мара́ль, ідэ́йны зьмест (*п'е́сы, фі́льму*). 4. даручэ́ньне *n.*, мі́сія *f.*

– v. 1. паведамля́ць, інфармава́ць. 2. пасыла́ць паведамле́ньне, даручэ́ньне

messenger [ˈmesəndʒər] n. 1. ганле́ц -ца́ *m.*; пасланле́ц -ца́ *m.*; пасы́льны -ага *m.* 2. вястýн вестуна́ *m.*, прадве́сьнік -а *m.* 3. ура́давы кур'е́р

messy [ˈmesi] adj. 1. у непара́дку, непрыбра́ны (*напр. стол*). 2. запэ́цканы, бру́дны: ***messy hands*** бру́дныя ру́кі

met [met] v., *p.t.*, *p.p. of* **meet**

metacarpus [ˌmetəˈkɑ:rpəs] n., pl. **-pi** Anat. пясьць *f.* (*ко́сьці рукі́ паміж запя́сьцем і па́льцамі*)

metal [ˈmetəl] – n. 1. мэта́л -у *m.*; ***noble metals*** высакаро́дныя мэта́лы. 2. друз -у *m.*

– adj. мэталёвы, мэталі́чны (*пыл, канструкцыя*)

– v.t. пакрыва́ць, абшыва́ць мэта́лам

metallic [məˈtælɪk] adj. мэталі́чны

metalliferous [ˌmetəlˈɪfərəs] adj. 1. ***metalliferous rocks*** мэталано́сныя пароды. 2. ***metalliferous mines*** руданосныя капа́льні

metallurgy [ˈmetəlɜ:rdʒi] n. мэталюргі́я *f.*

metalwork [ˈmetəlwɜ:rk] n. 1. вы́рабы з мэта́лу (*асабліва мастáцкія*). 2. вы́раб прадме́таў з мэта́лу

metamorphism [ˌmetəˈmɔ:rfˌɪzəm] n. мэтамарфі́зм

metamorphosis [ˌmetəˈmɔ:rfəsɪs] n., pl. **-ses** мэтамарфо́за *f.*; ператварэ́ньне *n.*; зьме́на фо́рмы, вы́гляду або́ структу́ры: ***Tadpoles become frogs by metamorphosis*** Апало́нік ператвара́ецца ў жа́бу

metaphor [ˈmetəfɔ:r] n. мэта́фара *f.*

metaphorical [ˌmetəˈfɔ:rɪkəl] adj. мэтафары́чны (*вы́раз, мо́ва*), перано́сны (*пра значэ́ньне*)

metaphysical [ˌmetəˈfɪzɪkəl] adj. 1. мэтафізы́чны. 2. ве́льмі абстра́ктны, цяжкі́ для зразуме́ньня; малазразуме́лы. 3. філязо́фскі, тэарэты́чны

metaphysics [ˌmetəˈfɪzɪks] n. мэтафі́зыка *f.*

meteor [ˈmi:tiər] n. мэтэо́р -а *m.*

meteoric [ˌmi:tiˈɔ:rɪk] adj. 1. мэтэо́рны, мэтэары́тны: ***meteoric shower*** дождж мэтэо́раў. 2. бліскýчы *або́* хýткі, як мэтэо́р. 3. зьвя́заны з атмасфэ́рай *або́* атмасфэ́рнымі зья́вамі, атмасфэры́чны: ***meteoric phenomena*** атмасфэ́рныя зья́вы

meteorite [ˈmi:tiəraɪt] n. мэтэары́т -а *m.*

meteoritic [ˌmi:tiəˈrɪtɪk] adj. мэтэары́тны

meteorology [ˌmi:tiəˈrɑ:lədʒi] n. мэтэаралёгія *f.*

meter, Brit. **metre I** [ˈmi:tər] n. 1. мэ́тар -ра *m.*: ***five meters long*** пяцімэтро́вы. 2. памéр -у *m.*, ры́тм -у *m.* (*у мýзыцы*). 3. памéр вéрша, стапá *f.* (*у вершаскладáньні*)

meter, Brit. **metre II** [ˈmi:tər] n. лічы́льнік -а *m.* (*электры́чны, га́завы, у таксі́*)

method [ˈmeθəd] n. 1. мэ́тад -у *m.*, спóсаб, прыём -у *m.* 2. сыстэ́ма *f.*, пара́дак -ку *m.*

methodical [məˈθɑ:dɪkəl] adj. 1. мэтады́чны, плянамéрны, сыстэматы́чны, стрóга пасьлядóўны. 2. мэтады́чны, які́ мáе дачынéньне з мэтóдыкай

meticulous [məˈtɪkjələs] adj. дрóбязны, празьмéрна дакла́дны, скрупулёзны, занадта патрабава́льны

metis [meɪˈti:] n. мэты́с -а *m.*

metric [ˈmetrɪk] adj. мэтры́чны (*пра мéры*): ***metric system*** мэтры́чная сыстэ́ма мéраў

metrical [ˈmetrɪkəl] adj. 1. вымяра́льны, вымéрны. 2. мэтры́чны (*пі́саны вéршам*): ***a metrical translation of Homer*** вершава́ны перакла́д Гамэ́ра

metropolis [məˈtrɑ:pəlɪs] n. 1. сталі́ца *f.*; вялі́кі гóрад; ва́жны цэ́нтар: ***a financial metropolis*** фінáнсавы цэ́нтар. 3. Eccl. мітрапóлія *f.* 4. мэтрапóлія *f.* (*краі́на ў дачынéньні да калёніяў, які́мі яна́ валóдае*)

metropolitan [ˌmətrəˈpɑ:lətən] – adj. 1. сталі́чны; які́ налéжыць да вялі́кага гóраду *або́* цэ́нтру. 2. Eccl. мітрапалі́цкі

– n. 1. жыха́р вялі́кага гóраду. 2. арцыбі́скуп -а *m.* (*у захóдняй царкве́*), мітрапалі́т -а *m.* (*у праваслáўнай царкве́*)

mettlesome [ˈmetəlsəm] adj. пóўны запа́лу, па́лкі; адва́жны, рашу́чы, энэргі́чны; гара́чы (*пра каня́*)

mew I [mju:] – v. мя́ўкаць

– n., interj. [mju:] мя́ўканьне *n.*; мяў

mew II [mju:] n. ча́йка *f.*, марска́я ча́йка

mew III [mju:] – n. кле́тка (*для со́кала*)

– v.t. 1. садзі́ць у кле́тку. 2. ***to mew up*** садзі́ць у астрóг

mews [mju:z] n., pl. (often sing. in use) ста́йні *pl.* (*перабудава́ныя на жытлó*)

Mexican [ˈmeksɪkən] – adj. мэксыка́нскі

– n. мэксыка́н|ец -ца *m.*, мэксыка́нка *f.*

mica [ˈmaɪkə] n. сьлюда́ *f.*

micaceous [ˌmaɪˈkeɪʃəs] adj. 1. сьлю́дзісты (*які́ нага́двае сабóй сьлюду́, бага́ты на сьлюду́*). 2. сьлюдзяны́ (*зрóблены з сьлюды́*)

mice [maɪs] n., *pl. of* **mouse**

microbe [ˈmaɪkroʊb] n. мікрóб -а *m.*, бактэ́рыя *f.*

microbial [maɪˈkroʊbiəl] adj. мікрóбны (*напр. кле́тка, інфэ́кцыя*)

microcopy [ˈmaɪkroʊˌkɑ:pi] – n., pl. **-copies** кóпія, зрóбленая на мікрафі́льме

– v.t. рабі́ць кóпію *чаго́* на мікрафі́льме

microfilm [ˈmaɪkrəfɪlm] – n. мікрафі́льм -а *m.*

– v. здыма́ць на мікрафі́льм

microphone [ˈmaɪkrəfoʊn] n. мікрафóн -а *m.*

microscope [ˈmaɪkrəskoʊp] n. мікраскóп -а *m.*

microscopic [ˌmaɪkrəˈskɑ:pɪk] adj. 1. мікраскапі́чны. 2. ве́льмі малéнькі, малéнечкі. 3. мікраскóпны, пры дапамóзе мікраскóпа (*напр. дасьлéдаваньне*)

mid [mɪd] adj. сярэ́дні, у сярэ́дзіне чагó-н; ***the mid days of autumn*** вóсеньскія дні

midcontinent [ˌmɪdˈkɑ:ntənənt] n. сярэ́дняя ча́стка кантынэ́нту

midday [ˌmɪdˈdeɪ] – n. пóў|дзень -дня *m.*

– adj. паўдзённы: ***the midday heat*** паўдзённая сьпякóта; ***a midday meal*** пóлу|дзень -дня *m.*

middle [ˈmɪdəl] – adj. сярэ́дні, пасярэ́дзіне чагó-н.: ***a middle house in the row*** сярэ́дні дом у рáдзе; ***a man of middle size*** мужчы́на сярэ́дняга рóсту

– n. 1. сярэ́дзін|а -ы *f.*: ***the middle of the road*** сярэ́дзіна дарóгі; ***in the middle*** у сярэ́дзіне, пасярóд. 2. сярэ́дзіна *f.* (*чалавéчага це́ла*), паясьні́ца *f.*

– v.i. 1. ста́віць у сярэ́дзіне. 2. склада́ць, згіна́ць пасярэ́дзіне

middle age сярэ́дні век чалавéка

middle-aged сярэ́дніх гадóў

Middle Ages сярэднявéчча *n.*, сярэ́дняя вякí, сярэдневякóўе *n.*: ***of the Middle Ages*** сярэднявéчны, сярэдневякóвы

middle class сярэ́дняя кля́са, сярэ́дняя буржуазі́я

midge [mɪdʒ] n. 1. мóшка *f.*, *coll.* машкара́ *f.* 2. ка́рлік -а *m.*

midget [ˈmɪdʒɪt] – n. ка́рлік -а *m.*
– adj. ка́рлікавы, ве́льмі малы́; мініяцю́рны

midland [ˈmɪdlənd] – n. сярэ́дняя ча́стка краі́ны
– adj. 1. у сярэ́дняй ча́стцы краі́ны. 2. абкру́жаны су́шай, міжзе́мны

midnight [ˈmɪdnaɪt] n. по́ўнач *f.*: ***at midnight*** апо́ўначы, у по́ўнач; ***to burn the midnight oil*** працава́ць *або́* вучы́цца дапазна́

midnightly [ˈmɪdnaɪtli] – adj. штопаўно́чны
– adv. штопо́ўначы

midst [mɪdst] n. сярэ́дні пункт *або́* ча́стка; цэ́нтар -ру *m.*, сярэ́дзіна *f.*: ***in our (their, your) midst*** сяро́д нас (іх, вас), у на́шай (і́хнай, ва́шай) грамадзе́, асяро́дзьдзі; ***in the midst of*** у сярэ́дзіне чаго́-н., пасяро́д чаго́-н.

mid-term report дове́дка за паўго́дзьдзе (*шко́льная*)

midwife [ˈmɪdwaɪf] n., pl. **-wives** акушэ́рка *f.*

midwifery [mɪdˈwaɪfəri] n. акушэ́рства *n.*

mien [mi:n] n. 1. вы́раз тва́ру. 2. (*во́нкавы*) вы́гляд. 3. мане́ра трыма́ць сябе́

might I [maɪt] v., *p.t.* of **may I**

might II [maɪt] n. 1. магу́тнасьць, моц *f.* 2. энэ́ргія, сі́ла *f.*: ***with might and main*** з усяе́ сі́лы

mighty [ˈmaɪti] – adj. магу́тны; мо́цны: ***a mighty ruler*** магу́тны ўлада́р; ***mighty force*** вялі́кая сі́ла. 2. ве́льмі вялі́кі, велічэ́зны, вялі́зны: ***a mighty famine*** вялі́зны го́лад
– adv. ве́льмі
– n. магу́тнасьць *f.*, магу́тная асо́ба

migraine [ˈmaɪgreɪn] – n. мігрэ́нь *f.*
– adj. мігрэ́невы

migrant [ˈmaɪgrənt] – n. перасяле́нец -ца, мігра́нт -а *m.*, перасяле́нка, мігра́нтка *f.*; пералётная пту́шка
– adj. 1. вандро́ўны. 2. пералётны

migrate [ˈmaɪgreɪt] v.i. 1. перасяля́цца, міграва́ць. 2. пералята́ць (*на зіму́* — *пра пту́шак*)

migration [maɪˈgreɪʃən] n. 1. перасяле́нье *n.*, мігра́цыя *f.* (*людзе́й, жывёлы*). 2. пералёт -у *m.* (*пту́шак*). 3. перамяшчэ́ньне (*а́тамаў унутры́ малеку́лы, іёнаў памі́ж электро́дамі*)

migratory [ˈmaɪgrətɔ:ri] adj. 1. вандро́ўны: ***migratory laborers, workers*** вандро́ўныя рабо́тнікі. 2. мігрыйны. 3. Med. блука́ючы: ***a migratory pain*** блука́ючы боль

milch [mɪltʃ] adj. мало́чны, удо́йны (*пра каро́ву*)

mild [maɪld] adj. 1. далікатны, дабрадушны; ласка́вы, лагодны (*пра чалаве́ка*). 2. цёплы, памяркоўны, лагодны (*пра кліма́т, зіму́*). 3. мя́ккі, нямо́цны: ***a mild cheese*** нявостры сыр; ***a mild cigar*** нямо́цная цыга́ра

mildly [ˈmaɪldli] adv. лагодна, мя́кка: ***to put it mildly*** мя́кка ка́жучы

milden [ˈmaɪldən] – v.t. рабіць лагадне́йшым, слабе́йшым, цяпле́йшым
– v.i. лагадне́ць, рабі́цца цяпле́йшым, не такі́м мо́цным

mildew [ˈmɪldu:] – n. цьві́ль, пле́сьня *f.*; бро́сьня *f.* (*на ва́дкасьці*)
– v. пакрыва́ць (-ца) пле́сьняю, пле́сьнець

mildewy [ˈmɪldu:i] adj. цьвілы́, заплесне́лы, заплясьне́лы

mile [maɪl] n. мі́ля *f.*

mileage or **milage** [ˈmaɪlɪdʒ] n. 1. адле́гласьць у мі́лях; ко́лькасьць мі́ляў (*про́йдзеных а́ўтам*). 2. праязны́я гро́шы. 3. карысьць, прыда́тнасьць *f.*

milepost [ˈmaɪlpoʊst] n. мі́левы слуп

milestone [ˈmaɪlstoʊn] – n. 1. мі́левы ка́мень. 2. вяха́ *f.*
– v.t. адзнача́ць мі́левымі камяня́мі

militant [ˈmɪlɪtənt] – adj. 1. агрэсі́ўны, ваяўні́чы; баявы́
– n. ваяўні́чы чалаве́к

militarism [ˈmɪlɪtəˌrɪzəm] n. мілітары́зм -у *m.*

militarist [ˈmɪlɪtərɪst] n. 1. мілітары́ст -а *m.* 2. спэцыялі́ст у вае́нных спра́вах

military [ˈmɪləteri] – adj. 1. вайско́вы: ***a military uniform*** вайско́вая фо́рма;

military service вайско́вая слу́жба; ***military maneuvers*** вайско́выя манэ́ўры; ***a military bearing*** вайско́вая вы́праўка. 2. жаўне́рскі, салда́цкі. 3. вае́нны: ***military school*** вае́нная вучэ́льня

– n. ***the military*** во́йска *n.*, вайско́ўцы

militia [məˈlɪʃə] n. мілі́цыя (*наро́днае апалчэ́ньне*)

milk [mɪlk] – n. малако́ *n.*

– v.t. 1. даі́ць. 2. а) выця́гваць сок з *чаго́*. б) выця́гваць інфарма́цыю, сі́лы, гро́шы з *каго́*

– v.i. дава́ць малако́ (*пра жывёліну*)

milker [ˈmɪlkər] n. 1. дая́рка *f.* 2. даі́льны апара́т. 3. до́йная жывёліна (*асабліва́ кароо́ва*)

milking [ˈmɪlkɪŋ] n. удо́й -ю *m.*

milking machine даі́льны апара́т

milkmaid [ˈmɪlkmeɪd] n. 1. дая́рка *f.* 2. рабо́тніца ў малача́рні

milkman [ˈmɪlkmən] n., pl. **-men** мало́чнік -а *m.*

milk tooth, pl. **milk teeth** мало́чны зуб

milky [ˈmɪlki] adj. 1. бе́лы, як малако́, мле́чны; белава́ты. 2. мало́чны, до́йны. 3. лаго́дны; слабы́, кво́лы; баязьлі́вы, палахлі́вы

Milky Way, the Мле́чны шлях; Птушы́ная даро́га

mill [mɪl] – n. 1. млын -а́ *m.* (*будыні́на*). 2. млынавы́я жо́рны. 3. ***a coffee mill*** млыно́к на ка́ву, кавамлы́н -а *m.*; ***a pepper mill*** млыно́к на пе́рац. 4. фа́брыка *f.*; завóд -у *m.*; ***a cotton mill*** баваўня́ная фа́брыка

– v.t. 1. мало́ць. 2. вырабля́ць; валі́ць (*сукно́*)

millenary [mɪˈlenəri] – adj. тысячагадо́вы, тысячаго́дні

– n. тысячаго́дзьдзе *n.*

millennium [mɪˈleniəm] n., pl. **-lenniums, -lennia** тысячаго́дзьдзе *n.*

miller [ˈmɪlər] n. млына́р -а́ *m.*

millet [ˈmɪlɪt] n. про́са *n.*

milliard [ˈmɪliɑ:rd] n., Brit. мілья́рд -а *m.*

milligram [ˈmɪligræm] n. мілігра́м -а *m.*

millimeter, Brit. **millimetre** [ˈmɪliˌmi:tər] n. мілімэ́тар -ра *m.*

milliner [ˈmɪlɪnər] n. мады́стка, капялю́шніца *f.*, капялю́шнік -а *m.*

million [ˈmɪljən] – n. мільён -а *m.*

– adj. 1. мільённы. 2. ве́льмі шмат: ***a million thanks*** вялі́кі дзя́куй

millionth [ˈmɪljənθ] adj. мільённы

million(n)aire [ˌmɪljəˈner] n. мільянэ́р -а *m.*

million(n)airess [ˌmɪljəˈnerəs] n. мільянэ́рка *f.*

millstone [ˈmɪlstoun] n. 1. жарно́н -на́ *m.*, *pl.* жо́рны. 2. вялі́кі цяжа́р

mill wheel млынаво́е ко́ла

mimic [ˈmɪmɪk] – v.t. 1. перадра́жніваць, падрабля́ць. 2. насьле́даваць *каму́*, імітава́ць, пераймáць. 3. быць іміта́цыяй *чаго́*

– n. іміта́тар, пераймáльнік -а *m.*

– adj. 1. несапра́ўдны, удава́ны. 2. пераймáльны, імітацы́йны

mimicry [ˈmɪmɪkri] n., pl. **-ries** 1. імітава́ньне, пераймáньне *n.* 2. Biol. мімікры́я *f.*

mimosa [mɪˈmoʊsə] n. мімо́за *f.*

minatory [ˈmɪnətɔ:ri] adj. пагражáльны, пагро́зьлівы

mince [mɪns] – v.t. 1. рэ́заць (*машы́нкай*), сячы́ (*мя́са*); крышы́ць. 2. рэ́заць, дакла́дна дзяля́ць. 3. гаварыць *або́* трыма́цца празьме́рна ве́тліва *або́* мане́рна. 4. зьмякча́ць, лаго́дзіць (*сло́вы*)

– v.i. дро́бненька ступа́ць; ***not to mince matters*** гаварыць про́ста й шчы́ра

– n. 1. дро́бна насе́чанае *або́* парэ́занае мя́са. 2. *гл.* **mincemeat**

minced [mɪnst] adj. 1. парэ́заны, насе́чаны (*пра мя́са і пад.*) 2. зьмя́кчаны

mincemeat [ˈmɪnsmi:t] n. сечані́на *f.*, начы́нка для піра́га

• ***make mincemeat of*** разьбі́ць *каго́* ўшчэнт, сьце́рці на парашо́к; зьні́шчыць

mincing [ˈmɪnsɪŋ] adj. 1. празьме́рна ве́тлівы, мане́рны. 2. які́ дро́бненька ступа́е, перабіра́е нага́мі

mincingly [ˈmɪnsɪŋli] adv. мане́рна, крыўля́ючыся

mind [maind] – n. 1. ро́зум -у *m.*, галава *f.*, разумо́выя здо́льнасьці; разуме́ньне: ***to have a good mind*** мець до́брую галаву́. 2. здо́льнасьць разважа́ць, норма́льная псы́хіка: ***to be out of one's mind*** звар'яце́ць; ***to lose one's mind*** стра́ціць ро́зум. 3. спо́саб ду́маньня, по́гляд, погля́д -у *m.*; ду́мка *f.* 4. дух -у *m.*; настро́й -ю *m.*; ***the hostile mind*** варо́жы дух; ***peace of mind*** душэ́ўны супако́й. 5. жада́ньне *n.*, ахво́та *f.*; наме́р -у *m.*; ***I have a great mind to do it*** Я ма́ю вялі́кую ахво́ту гэ́та зрабі́ць; ***to have no mind to do ...*** зусі́м ня мець ахво́ты. 6. ува́га, ду́мка *f.*: ***Keep your mind on your work*** Засяро́дзься на пра́цы; ***to bear in mind*** мець на ўва́зе, па́мятаць

– v.t. 1. па́мятаць; дбаць пра *што*, глядзе́ць за *чым*: ***Mind my words!*** Па́мятай маё сло́вы! 2. слу́хацца *каго́*: ***Mind your father and mother*** Слу́хайцеся свайго́ ба́цькі й ма́ці. 3. ***Mind that you come on time*** Глядзі́, каб прыйшо́ў на час. 4. уважа́ць на *што*, глядзе́ць *чаго́*, займа́цца *чым*: ***Mind your own business*** Займа́йся сваёй спра́вай, не мяша́йся ў чужы́я. 5. даглада́ць *каго́-што*, глядзе́ць за *чым*; турбава́цца *кім-чым*; сачы́ць, пільнава́ць: ***to mind the baby*** даглада́ць дзіця́, глядзе́ць за дзі́цем; ***Don't mind me*** Не турбу́йцеся за мяне́; не зварача́йце на мяне́ ўва́гі; ***Please mind the fire*** Калі́ ла́ска, пасачы́це за камі́нам. 6. ***Mind the step*** Асьцяро́жна, прыступка! 7. ***Do you mind my smoking?*** Ці вы ня су́праць, калі́ я закуру́? ***I don't mind it a bit*** Не, ані́. ***Yes, I mind it very much*** Так, я ве́льмі су́праць гэ́тага. 8. ***Never mind*** Informal нічо́га, не турбу́йцеся

• ***be of one mind*** згаджа́цца; быць адно́й ду́мкі

• ***bring*** or ***call to mind*** напаміна́ць, нага́дваць

• ***change one's mind*** раздума́цца, зьмяні́ць ране́йшую ду́мку

• ***have in mind*** а) мець на ду́мцы, наўве́це. б) наме́рыцца, плянава́ць. в) па́мятаць

• ***make up one's mind*** наду́мацца, вы́рашыць, пастанові́ць

• ***on one's mind*** на душы́; у ду́мках

• ***pass out of mind*** вы́скачыць з па́мяці, з ду́мкі

• ***piece of one's mind*** Informal нага́ня́й -ю *m.*, ла́янка *f.*

• ***set one's mind on*** мо́цна хаце́ць

mindful ['maindfəl] adj. 1. па́мятаючы: ***Mindful of your advice ...*** Па́мятаючы ва́шую пара́ду... 2. ува́жны, стара́нны; рупліві: ***to be mindful*** уважа́ць

mine I [main] pron. 1. мой: ***This book is mine*** Гэ́тая кніга мая́. 2. маё ро́дныя, маё: ***me and mine*** я і маё

mine II [main] – n. 1. капа́льня *f.* (*ву́галю, зо́лата, со́лі*); руднік -а́ *m.*, ша́хта *f.* 2. пакла́ды *pl.*, радо́вішча *n*, (*руды́, со́лі і пад.*). 3. ***a mine of information*** бага́тая крыні́ца інфарма́цыі. 4. мі́на *f.*

– v.i. 1. капа́ць капа́льню. 2. здабыва́ць (*руду́, ву́галь і да т.п. у капа́льні*). 3. працава́ць у капа́льні. 4. а) падко́пваць, рабі́ць падзе́мны ход *або́* падко́п. б) ста́віць мі́ны

mine field, Milit. мі́ннае по́ле

miner ['mainər] n. 1. шахцёр -а *m.*, гарня́к -а́ *m.* 2. Milit. мінёр -а *m.*

mineral ['minərəl] – n. 1. мінэра́л -у *m.*, кары́сны вы́капень. 2. руда́ *f.* 3. Brit. мінэра́льная вада́; ***minerals,*** Brit. мінэра́льныя во́ды; безалькаго́льныя напо́і

– adj. 1. мінэра́льны. 2. неаргані́чны

mineralogist [ˌminə'rælədʒist] n. мінэралёг -а *m.*

mineralogy [ˌminə'rælədʒi] n. мінэралёгія *f.*

minesweeper ['mainˌswi:pər] n. мінны тра́льшчык

mine thrower мінамёт -а *m.*

mingle ['miŋgəl] v. 1. мяша́ць(ь) (-ца). 2. злуча́ць(ь) (-ца). 3. ве́сьці знаёмства,

таварыства; быва́ць; абарача́цца; сябрава́ць: ***to mingle with important people*** ве́сьці знаёмства з ва́жнымі людзьмі́

miniature [ˈmɪnɪətʃər] – n. мініяцю́ра *f.* – adj. мініяцю́рны

minimal [ˈmɪnɪməl] adj. ве́льмі малы́, як мага́ ме́ншы; мініма́льны: ***minimal damage*** мініма́льнае пашко́джаньне

minimize [ˈmɪnɪmaɪz] v.t. 1. зьні́зіць да мі́німуму, рабі́ць мініма́льным. 2. прымянша́ць, перамянша́ць

minimum [ˈmɪnɪməm] n., pl. **-mums** or **-ma** найме́ншая ко́лькасьць, мі́німум -у *m.*

mining [ˈmaɪnɪŋ] – n. 1. здабы́ча руды́, ву́галю; го́рная прамысло́васьць. 2. ста́ўленьне, падклада́ньне мі́наў – adj. го́рны

minion [ˈmɪnjən] n. 1. прыслу́жнік -а *m.* 2. улюбёнlец -ца *m.*, улюбёнка *f.*; фаварыт -а *m.*, фаварыткa *f.* 3. Print. міньён -а *m.* (*шрыфт на 7 пу́нктаў*)

minister [ˈmɪnɪstər] – n. 1. міні́стlар -ра *m.*. 2. пратэста́нцкі духаўні́к, па́стар -а *m.* 3. выкана́ўцla -ы *m.*; слугlа́ -і́ *m.* – v.t. даглядаць (*хво́рых і пад.*); служы́ць

ministerial [ˌmɪnɪˈstɪrɪəl] adj. 1. міністэ́рскі. 2. па́стырскі. 3. выкана́ўчы, адміністрацы́йны

ministry [ˈmɪnɪstri] n., pl. **-tries** 1. міністэ́рства *n.* 2. кабінэ́т міністраў. 3. духаве́нства, па́стырства *n.* 4. служэ́ньне *n.*

mink [mɪŋk] n., pl. **minks** 1. но́рка *f.* 2. но́ркавае фу́тра

minnow [ˈmɪnoʊ] n., pl. **-nows** *or coll.* **-now** жыве́ц, пячку́р, ве́льмі мала́я ры́бка

minor [ˈmaɪnər] – adj. 1. ме́ншы; менш ва́жны; нязна́чны, малава́жны, другара́дны: ***a minor gain*** нязна́чны вы́йгрыш; ***a minor error*** дро́бная памы́лка; ***a minor poet*** другара́дны паэ́т. 2. непаўнале́тні. 3. Mus. мінО́рны – n. 1. непаўнале́тнlі -яга *m.*, непаўнале́тняя *f.* 2. Mus. мінО́р -у (*тана́льнасьць*), мінО́рная га́ма

minority [məˈnɔːrəti] n., pl. **-ties** 1. ме́ншасьць, меншыня́ *f.* 2. непаўнале́цьце *n.*

minster [ˈmɪnstər] n., esp. Brit. 1. касьцёл у манастыры́. 2. сабО́р -а *m.*, вялі́кая царква́

minstrel [ˈmɪnstrəl] n. мэнэстрэ́ль (*вандро́ўны сьпява́к*), музы́кlа -і, паэ́т -а *m.*

mint I [mɪnt] n. 1. мя́та *f.* 2. мя́тная цукéрка

mint II [mɪnt] – n. 1. манэ́тны двор. 2. мнО́ства *n.*: ***mint of money*** ку́ча грО́шай; ***mint of trouble*** ку́ча непрые́мнасьцяў – v.t. 1. чака́ніць (*манэ́ты*). 2. рабі́ць; тварыць; фабрыкава́ць – adj. беззага́нны, як но́вы: ***in mint condition*** у беззага́нным ста́не

minuend [ˈmɪnjuend] n., Math. зьмянша́льнае *n.*

minus [ˈmaɪnəs] – prep. адня́ць; мі́нус: ***5 minus 2 leaves 3*** пяць мі́нус два рО́ўна тром – adj. 1. адмО́ўны (*пра лік*): ***the minus sign*** знак мі́нус – n. мі́нус -а *m.*

minute I [ˈmɪnət] – n. 1. хвілі́на *f.*; часі́на *f.*; часі́нка *f.*; ***for one minute*** на часі́нку; ***in a minute*** за хвілі́ну; ***on the minute*** пунктуа́льна, хвілі́на ў хвілі́ну. 2. Astron., Math. мінУта, 1/60 гра́дуса – v.t. 1. засяка́ць час. 2. наки́дваць, запі́сваць. 3. пісаць пратакО́л (*схО́ду*) • ***minutes*** а) пратакО́л -а *m.* (*пасе́джаньня*). б) рэзюмэ́; карО́ткі на́кід; па́мятная запі́ска • ***up to the minute*** сучасны, найнавéйшы, павО́дле апО́шняе мО́ды

minute II [maɪˈnuːt] adj. 1. малéнечкі, малéнькі. 2. дакла́дны, дэта́льны, падрабя́зны (*пра інфарма́цыю*). 3. малава́жны, нязна́чны

minute hand хвілі́нная стрэ́лка

minutely I [ˈmɪnətli] – adj. штохвілі́нны; несупы́нны, бесьперапы́нны, несьціха́ны – adv. штохвілі́ны, ка́жную хвілі́ну

minutely II [maɪˈnu:tli] adv. падрабя́зна; дакла́дна; прэцызі́йна

miracle [ˈmɪrəkəl] n. 1. цуд -у *m.*, цу́да *n.* 2. дзі́ва *n.* 3. сярэднявя́чная містэ́рыя

miraculous [məˈrækjələs] adj. 1. звышнатура́льны, незвыча́йны. 2. цудо́ўны; дзі́ўны, дзівО́сны; чаро́ўны. 3. цудатво́рны

mirage [məˈrɑ:ʒ] n. 1. міра́ж -у́ *m.* 2. ілю́зія *f.*

mire [maɪr] – n. 1. бало́та *n.*; гразь, хлюпо́та *f.* 2. дрыгва́ *f.*
– v. 1. загрази́ць у бало́це (*або́ ў ця́жкасьцях, даўго́х*). 2. абкі́дваць (*гра́зьзю, або́ як гра́зьзю*); пэ́цкаць; чарні́ць

mirror [ˈmɪrər] – n. 1. лю́стра, люстэ́рка, лю́страчка *n.* 2. люстра́ная паве́рхня. 3. адлюстрава́ньне *n.*; прыклад, узо́р -у *m.*
– v.t. адбіва́ць (*як у лю́стры*), адлюстро́ўваць

mirror image адваро́тны адбітак; адлюстрава́ньне *n.*

misaddress [ˌmɪsəˈdres] v.t. няпра́вільна *або́* неадпаве́дна адрасава́ць, памыля́цца адрасам

misadventure [ˌmɪsədˈventʃər] n. няшча́сны вы́падак; няшча́сьце *n.*, няўда́ча *f.*

misanthrope [ˈmɪsənθroʊp] n. мізантро́п, чалаве́каненаві́сьнік -а *m.*

misanthropic [ˌmɪsənˈθrɑ:pɪk] adj. мізантрапі́чны, чалаве́каненавісны

misanthropy [mɪˈsænθrəpi] n. мізантро́пія, чалаве́каненавісьніцтва *n.*

misapprehension [ˌmɪsˌæprɪˈhenʃən] n. памылко́вае ўяўле́ньне; неразуме́ньне, непаразуме́ньне *n.*

misbecome [ˌmɪsbɪˈkʌm] v.i. **-came, come** не падыхо́дзіць, не пасава́ць; быць не да тва́ру

misbehave [ˌmɪsbɪˈheɪv] v.i. свавО́ліць; неадпаве́дна трыма́цца

miscalculate [mɪsˈkælkjəleɪt] v. аблі́чвацца; памылко́ва меркава́ць *або́* разьлі́чваць; пралі́чвацца

miscarriage [mɪsˈkærɪdʒ] n. 1. няўда́ча *f.*; памы́лка *f.*: ***a miscarriage of justice*** несправядлі́вы прысу́д, судо́вая памы́лка. 2. прапа́жа *f.*, недаста́ўка на а́драс: ***the miscarriage of a letter*** недаста́ўка ліста́. 3. спарО́н, вы́кідыш -у *m.*

miscarry [mɪsˈkæri] v.i. **-ries, -rying** 1. цярпе́ць няўда́чу. 2. не дайсьці́, прапа́сьці (*пра ліст, пасы́лку*). 3. скі́нуць (*дача́сна нарадзі́ць*); не данасі́ць (*дзіця́*)

miscellaneous [ˌmɪsəˈleɪniəs] adj. 1. зьмяша́ны, мяша́ны (*напр. лес*), разнаста́йны. 2. ро́знабако́вы

miscellany [ˈmɪsəleɪni] n., pl. **-nies** разнаста́йная кале́кцыя, ро́знае; мешані́на *f.*: ***miscellanies*** збО́рнік ра́знаста́йных арты́кулаў, альмана́х -у *m.*

mischief [ˈmɪstʃɪf] n. 1. шко́да, шко́днасьць *f.*; бяда́ *f.*, зло *n.* 2. свавО́льства *n.*, дурасьлі́васьць, гульлі́васьць *f.*; гарэ́зьлівасьць *f.* 3. свавО́льнік -а *m.*, свавО́льніца *f.*, гарэ́зьла, праку́дла -ы *m. & f.*, дурО́нік -а *m.*

mischievous [ˈmɪstʃɪvəs] adj. 1. шко́дны. 2. гарэ́зьлівы, гульлі́вы, свавО́льны, праку́длівы. 3. непаслухмя́ны, шкадлі́вы: ***a mischievous child*** жэ́ўжык -а *m.*, гарэ́зьла -ы *m. & f.*

mischievously [ˈmɪstʃɪvəsli] adv. гарэ́зьліва, гульлі́ва

misconception [ˌmɪskənˈsepʃən] n. памылко́вае ўяўле́ньне

misconduct [ˌmɪsˈkɑ:ndʌkt] – n. 1. благО́е трыма́ньне, неадпаве́дныя павО́дзіны. 2. дрэ́ннае, благО́е кіраўні́цтва. 3. Law жані́мская здра́да
– v.i. [ˌmɪskənˈdʌkt] дрэ́нна трыма́цца
– v.t. дрэ́нна кірава́ць *чым*

misconstrue [ˌmɪskənˈstru:] v.t. памылко́ва тлумачыць *або́* разуме́ць

miscount [ˌmɪsˈkaʊnt] – v. памылко́ва падлі́чваць *або́* разьлі́чваць, меркава́ць, спадзява́цца; пралі́чваць, пралі́чвацца
– n. [ˈmɪskaʊnt] памылко́вы падлі́к, пралі́к -у *m.*

misdeed [ˌmɪsˈdi:d] n. ліхадзе́йства *n.*; дрэ́нны ўчы́нак; грэх граху́ *m.*

misdemeanor [ˌmɪsdɪˈmi:nər] n. 1. Law судо́м кара́ная правіннасьць, дро́бнае злачы́нства *n.* 2. про́мах -у *m.*, хі́ба *f.* 3. дрэ́ннае трыма́ньне, дрэ́нныя паво́дзіны

misdirect [ˌmɪsdəˈrekt] v.t. 1. няпра́вільна, фальшы́ва накіро́ўваць; зво́дзіць. 2. дава́ць зма́нныя інстру́кцыі (*прысяжны́м*)

misemploy [ˌmɪsəmpˈlɔɪ] v.t. памылко́ва *або́* неадпаве́дна ўжыва́ць, злоўжыва́ць *чым*

miser [ˈmaɪzər] n. 1. скна́рла, жмі́ндла -ы *m. & f.* 2. прагаві́ты, хці́вы чалаве́к; хці́лвец -ўца *m.*

miserable [ˈmɪzərəbəl] – adj. 1. няшча́сны, бяздо́льны, гаро́тны (*пра чалаве́ка*). 2. дрэ́нны, пага́ны (*пра надво́р'е*). 3. а) бе́дны, мізэ́рны, убо́гі. б) ва́рты жа́лю або́ спага́ды, няшча́сны: ***a miserable failure*** няшча́сная няўда́ча, няшча́сны бяда́к
– n. бяда́к бедака́ *m.*; гаро́тнік -а *m.*; бяздо́льнlы -ага *m.*, бяздо́льная *f.*

miserly [ˈmaɪzərli] adj. скна́рлівы, скна́рысты; хці́вы, скупы́

misery [ˈmɪzəri] n., pl. **-eries** 1. паку́та *f.*, цярпе́ньне *n.*, нягода́ *f.*; няшча́сьце *n.*; нядо́ля *f.*: ***the misery of poverty*** паку́ты гале́чы; ***companions in misery*** сябры́ ў няшча́сьці. 2. бяда́ *f.*, цяжкі́я абста́віны; гале́ча *f.*

misfortune [mɪsˈfɔ:rtʃən] n. 1. няшча́сьце *n.*; го́ра, лі́ха -а *n.*; бяда́, няўда́ча *f.* 2. нешчасьлі́вы вы́падак

misgive [mɪsˈgɪv] – v.t. **-gave, -given, -giving** 1. выклі́каць, абуджа́ць *або́* навява́ць сумне́ў, падазрэ́ньне *або́* непако́й
– v.i. сумнява́цца, непако́іцца, падазрава́ць

misgiving [mɪsˈgɪvɪŋ] n. пачуцьцё сумне́ву, падазрэ́ньня *або́* непако́ю

misguide [ˌmɪsˈgaɪd] v.t. уво́дзіць у зман, ублы́тваць у злачы́нства

mishap [ˈmɪshæp] n. 1. нешчасьлі́вы вы́падак, няўда́ча *f.* 2. няшча́сьце *n.*

misinform [ˌmɪsɪnˈfɔ:rm] – v. памылко́ва *або́* фальшы́ва інфармава́ць
– v.i. уво́дзіць у зман памылко́вай інфарма́цыяй

misinformation [ˌmɪsɪnfərˈmeɪʃən] n. памылко́вая, недакла́дная *або́* фальшы́вая інфарма́цыя, дэзінфарма́цыя *f.*

misinterpretation [ˌmɪsɪnˌtɜ:rpɾəˈteɪʃən] n. памылко́вае тлумачэ́ньне; непаразуме́ньне *n.*

misjudgement [mɪsˈdʒʌdʒmənt] n. памылко́вая *або́* несправядлі́вая ду́мка пра *каго́-што*; несправядлі́вы прысу́д

mislay [ˌmɪsˈleɪ] v.t. **-laid, -laying** кла́сьці не на ме́сца, заки́дваць, губля́ць, запрапа́шчваць

mislead [ˌmɪsˈli:d] v.t. **-led, -leading** 1. уво́дзіць у зман. 2. наво́дзіць на благо́е. 3. ашу́кваць

misleading [ˌmɪsˈli:dɪŋ] adj. падма́нлівы, падма́нны; які́ наво́дзіць на благо́е

misled [ˌmɪsˈled] v., *p.t. and p.p. of* **mislead**

mismanage [ˌmɪsˈmænɪdʒ] v. бла́га *або́* неадпаве́дна кірава́ць чым-н.; безгаспада́рыць

mismanagement [ˌmɪsˈmænɪdʒmənt] n. благо́е кірава́ньне, безгаспада́рнасьць *f.*

misplace [ˌmɪsˈpleɪs] v.t. кла́сьці не на ме́сца; гаварыць *або́* рабі́ць што-н. не да ме́сца *або́* не ў пару́: ***misplaced confidence*** незаслу́жаны дове́р

misprint [ˈmɪsprɪnt] – n. памы́лка дру́ку
– v.t. [ˌmɪsˈprɪnt] памылко́ва надрукава́ць

misprize [ˌmɪsˈpraɪz] v.t. 1. недаацэ́ньваць. 2. пагарджа́ць *кім-чым*, не зважа́ць ува́гі на *што*

misquote [ˌmɪsˈkwoʊt] v. перакру́чваць цыта́ту, памылко́ва цытава́ць

misrepresent [ˌmɪsˌrepɾɪˈzent] v.t. падава́ць *што* у фальшы́вым сьвятле́, каза́ць няпра́ўду аб *чым*

misrule [ˌmɪsˈru:l] – n. 1. благо́е *або́* неразу́мнае кірава́ньне. 2. стан бязла́дзьдзя, бязла́дзіца *f.*; замяша́ньне *n.*: ***the misrule of mobs*** бязла́дзьдзе нато́ўпу
– v.t. дрэ́нна, няўда́ла кірава́ць *чым*

miss I [mɪs] – v.t. 1. не пацэ́ліць, ня тра́піць у цэль: ***to miss a nail*** ня тра́піць у цьвік. 2. ***to miss a train*** спазьні́цца на цягні́к. 3. а) ***He missed his music lesson today*** Ён сёньня прапусьці́ў ле́кцыю му́зыкі. б) ***to miss an opportunity*** прапусьці́ць наго́ду. в) ***to miss a mistake*** прапусьці́ць памы́лку. 4. ***to miss the point of a remark*** не зразуме́ць сэ́нсу заўва́гі. 5. ухіля́цца, уника́ць. 6. сумава́ць, тужы́ць па *кім-чым*: ***I miss my mother*** Я сумую́ па ма́ці
– v.i. не пацэ́ліць, ня тра́піць
– n. 1. про́мах -у *m.* 2. стра́та *f.*, недахо́п -у *m.*

miss II [mɪs] n., pl. **misses** дзяўчы́на *f.*, неза́мужняя жанчы́на

Miss [mɪs] n., pl. **Misses** спада́рычна *f.*: ***Miss Brown*** спада́рычна Браўн

misshape [mɪs'ʃeɪp] v.t. **-shaped** or **-shapen** надава́ць няпра́вільную фо́рму; дэфармава́ць

misshapen [mɪs'ʃeɪpən] – adj. няпра́вільнай фо́рмы, дэфармава́ны

missile ['mɪsəl] – n. рэактыўны снара́д, раке́та *f.*
– adj. 1. кіда́льны. 2. раке́тны

missing ['mɪsɪŋ] adj. 1. згу́блены, адсу́тны, яко́га не стае́: ***one book is missing*** аднае́ кні́гі не стае́; ***missing link*** прапу́шчанае зьвяно́

mission ['mɪʃən] – n. 1. а) мі́сія *f.* 2. даручэ́ньне, зада́ньне *n.* (*для мі́сіі*). 3. мэ́та жыцьця́, прызначэ́ньне *n.*
– v.t. 1. ве́сьці рэлігі́йную мі́сію. 2. пасыла́ць на мі́сію
– adj. місійны
• ***missions*** місіянэ́рская дзе́йнасьць

missionary ['mɪʃəneri] – n., pl. **-aries** а) місіянэ́р -а *m.*, місіянэ́рка *f.* б) пашыра́льнік -а *m.* (*яки́х-н. ідэ́яў*)
– adj. 1. місіянэ́рскі. 2. пашыра́льніцкі

misspell [ˌmɪs'spel] v., **-spelled** or **-spelt** памылко́ва піса́ць, рабі́ць памы́лкі пра́вапісу

misstate [ˌmɪs'steɪt] v.t. памылко́ва *або́* фальшы́ва заяўля́ць, рабі́ць памылко́вую *або́* фальшы́вую зая́ву

mist [mɪst] – n. 1. імгла́ *f.*, тума́н -у *m.* 2. імжа́ *f.* 3. смуга́ *f.*, за́сьціл -у *m.*, тума́н перад вачы́ма (*ад сьлёз і пад.*), затума́ньваньне *n.*: ***Things viewed through the mist of fear*** Рэ́чы, ба́чаныя праз смугу́ стра́ху
– v.i. 1. 1. імжэ́ць: ***It is misting*** імжы́ць. 2. затума́ньвацца
– v.t. затума́ньваць, засьціла́ць тума́ном; засму́жваць: ***Tears misted her eyes*** сьлёзы затума́нілі ёй во́чы; ***misted window*** запаце́лае акно́

mistake [mɪ'steɪk] – n. памы́лка *f.*; непаразуме́ньне *n.*: ***by mistake*** праз памы́лку
– v., **-took, -taken** 1. не разуме́ць, бла́га разуме́ць. 2. памылко́ва прыма́ць за каго́ і́ншага *або́* за што і́ншае

mistaken [mɪ'steɪkən] adj. 1. які́ памыля́ецца, памыля́ецца. 2. няпра́вільны; памылко́вы; не да ме́сца; не ў пару́: ***a mistaken opinion*** памылко́вая ду́мка, памылко́вы по́гляд

mistakenly [mɪ'steɪkənli] adv. памылко́ва; праз памы́лку

mister ['mɪstər] n. спада́р -а́ *m.*, мі́стэр -а *m.*

Mister ['mɪstər] n., *у скаро́чанай фо́рме* ***Mr.*** ты́тул пе́рад про́зьвішчам: ***Mr. Brown*** спада́р Браўн; ***Mr. President*** спада́р прэзыдэ́нт

mistletoe ['mɪsəltoʊ] n., Bot. амяла́ *f.* (*галі́нкамі яко́е на Каля́ды ўбіра́юцца ха́ты*)

mistress ['mɪstrəs] n. 1. а) гаспады́ня *f.* б) улада́рка *f.* 2. спэцыялі́стка, майстры́ха *f.* 3. Br. наста́ўніца *f.*: ***the dancing mistress*** наста́ўніца та́нцаў. 4. каха́нка *f.*; Poet. каха́ная *f.*

mistrust [ˌmɪs'trʌst] – v. не давяра́ць; сумнява́цца; падазрава́ць
– n. недаве́рлівасьць *f.*; падазрэ́ньне *n.*; недаве́р -у *m.*

mistrustful [ˌmɪs'trʌstfəl] adj. недаве́рлівы; няпэ́ўны; бяз пэ́ўнасьці, по́ўны падазрэ́ньня

misty ['mɪsti] adj. 1. імгліс́ты; затума́нены, засму́жаны: ***misty hills*** засму́-

жаныя ўзго́ркі; ***misty morning*** імглістая ра́ніца. 2. няя́сны, цьмя́ны; невыра́зны: ***a misty notion*** цьмя́нае паня́цьце

misunderstand [ˌmɪsˌʌndərˈstænd] v.t. не разуме́ць, памылко́ва разуме́ць

misunderstanding [ˌmɪsˌʌndərˈstændɪŋ] n. 1. благо́е *або́* памылко́вае разуме́ньне, непаразуме́ньне. 2. сва́рка, нязго́да *f.*

misunderstood [ˌmɪsˌʌndərˈstʊd] – v., *past t. and p.p. of* **misunderstand**
– adj. 1. памылко́ва *або́* дрэ́нна зразуме́ты. 2. недастатко́ва ацэ́нены, недаацэ́нены

misuse [ˌmɪsˈju:z] – v.t. 1. памылко́ва ўжыва́ць. 2. дрэ́нна абыхо́дзіцца з *кім-чым*, злоўжыва́ць
– n. [ˌmɪsˈju:s] 1. памылко́вае ўжыва́ньне. 2. дрэ́ннае абыхо́джаньне

mite I [maɪt] – n. 1. не́шта мало́е; кры́шачка, кро́пелька *f.*; ле́пта (*на дабрачы́ннасьць*): ***He couldn't eat even a mite*** Ён ня мог ані кры́хі зье́сьці. 2. мала́я асо́ба, мале́нькае дзіця́тка. 3. малава́ртасная манэ́та.
– adv. тро́шкі, кры́шку, кры́шачку: ***It is a mite easier*** кры́шку лягчэ́й

mite II [maɪt] n. моль *f.*

mitigate [ˈmɪtəgeɪt] v.t. зьмякча́ць, зьмянша́ць (*боль, гарачыню́, ка́ру*)

mitigation [ˌmɪtəˈgeɪʃən] n. зьмякчэ́ньне, зьме́ншаньне *n.* (*ка́ры*)

mitten [ˈmɪtən] n. 1. рукаві́ца *f.* 2. мітэ́нка *f.* (*да́мская до́ўгая пальча́тка бяз па́льцаў*); ***to give the mitten to*** даць адмо́ву, адмо́віць (*пры сва́таньні*); Informal даць гарбуза́

mix [mɪks] – v., **mixed** or **mixt** 1. зьме́шваць, мясі́ць (*це́ста*). 2. злуча́ць, спалуча́ць: ***to mix business and pleasure*** спалуча́ць спра́вы з прые́мнасьцю
– v.i. 1. злуча́цца, зьме́швацца: ***Oil and water will not mix*** Але́й з вадо́ю ня зьме́шваецца. 2. сыхо́дзіцца; ла́дзіць з *кім*; сябрава́ць: ***We do not mix well*** Мы ня на́дта ла́дзім

mix up v.t. 1. блы́таць, пераблы́тваць: ***to mix up instructions*** пераблы́таць інстру́кцыі. 2. мяша́цца (*у не́чыя спра́вы*)

mix-up [ˈmɪksʌp] n. мешані́на, блытані́на *f.*; су́месь *f.*

mixed [mɪkst] adj. 1. зьме́шаны, наме́шаны. 2. мяша́ны, ме́шаны (*пра тава́рыства, хор*). 3. Informal адурэ́лы, вы́піўшы
• ***be mixed up (in)*** быць заме́шаным у чым-н.
• ***get mixed*** пераме́швацца
• ***mixed number*** зьме́шаны лік (*які́ склада́ецца з цэ́лага лі́ку і дро́бу*)
• ***mixed train*** тава́рна-пасажы́рскі цягні́к

mixer [ˈmɪksər] n. 1. мяша́лка *f.*, мі́ксэр -а *m.* 2. ***a good mixer*** тава́рыскі чалаве́к. 3. мінэра́льная вада́, сок да алькаго́льнага напо́ю
• ***cement mixer*** бэто́намяша́лка

mixture [ˈmɪkstʃər] n. 1. мяша́ньне *n.* 2. су́месь, мешані́на, ме́шань *f.*

moan [moʊn] – n. 1. стогн -у *m.* 2. нарака́ньне, крактаньне, крахта́ньне *n.*
– v.i. 1. стагна́ць. 2. нарака́ць; крактаць. 3. гарава́ць, мо́цна смуткава́ць, жальбава́ць, лямантава́ць

moat [moʊt] – n. глыбо́кі роў, кана́ва *f.* (*навако́л замчы́шча*)
– v.t. абко́пваць ро́вам, кана́вай

mob [mɑ:b] – n. 1. гурба́ *f.*, натоўп -у *m.*; збо́рышча *n.* (*людзе́й*). 2. чэрнь *f.* 3. Sl. злачы́нная ба́нда, ша́йка. 4. ма́фія *f.*: ***the mob*** а) ма́сы *pl. only.* б) збунтава́ны натоўп
– v.i. 1. то́ўпіцца. 2. напада́ць натоўпам, гу́ртам

mobile [ˈmoʊbəl] adj. рухо́мы, перасо́ўны, перавозны, перано́сны: ***mobile home*** перасо́ўная ха́та; ***a mobile mind*** гну́ткі ро́зум

mobility [moʊˈbɪlətɪ] n. рухо́масьць, руха́васьць *f.*; гну́ткасьць *f.*

mobilization [ˌmoʊbələˈzeɪʃən] n. мабілізацыя *f.*

mobilize [ˈmoʊbəlaɪz] v. мабілізава́ць(ца)

mobilized [ˈmoʊbəlaɪzd] adj. змабілізава́ны

moccasin [ˈmɑ:kəsɪn] n. макасі́н -а *m.*

mock [mɑ:k] – v.t. 1. насьміха́цца, рабі́ць жа́рты з *кагó*. 2. перадра́жніваць. 3. падрабля́цца пад *кагó*, імітава́ць. 4. кпіць, зьдзе́квацца з *кагó*. 5. не зварача́ць ува́гі на *кагó-што*. 6. ашу́кваць; падво́дзіць
– adj. несапра́ўдны, удава́ны, імітава́ны: ***a mock battle*** удава́ная бі́тва
– n. 1. насьміха́ньне *n.*, кпі́ны *pl.* 2. паглу́мішча *n.*, по́сьмех -у *m.*, прадме́т насьме́шак: ***to make mock of*** рабі́ць кпі́ны

mocker [ˈmɑ:kər] n. 1. насьме́шнік -а *m.*, насьме́шніца *f.* 2. по́сьмех -у *m.* 3. перасьме́шнік -а *m.* (*птýшка*)

mockery [ˈmɑ:kəri] n., pl. **-eries** 1. высьме́йваньне *n.*, насьме́шка, кпі́на *f.* 2. пасьме́шышча *n.* 3. паро́дыя *f.*: ***to make mockery of*** высьме́йваць, абсьмія́ць

mocking [ˈmɑ:kɪŋ] adj. насьме́шлівы

mockingbird [ˈmɑ:kɪŋbɜ:rd] n., Zool. перасьме́шнік -а *m.* (*птýшка*)

modal [ˈmoʊdəl] adj., Gram. мада́льны

mode I [moʊd] n. 1. спо́саб -у *m.* 2. Gram. лад -у *m.*: ***the indicative (imperative) mode*** абве́сны (зага́дны) лад. 3. Mus. лад -у *m.*, тана́льнасьць *f.*

mode II [moʊd] n. 1. мо́да *f.* 2. звы́чай -ю *m.*

model [ˈmɑ:dəl] – n. 1. мадэ́ль *f.* а) маке́т -а *m.*: ***a model of a ship*** мадэ́ль карабля́. б) узо́р -у *m.*, мадэ́ль для ста́туі. 2. схэ́ма *f.* 3. нату́ршчык -а *m.*, нату́ршчыца *f.* 4. жыва́я мадэ́ль (*у кра́ме во́праткі*)
– v. 1. ляпі́ць (*з гліны*). 2. рабі́ць мадэ́лі, маке́ты. 3. (after, on) а) ствара́ць павóдле ўзо́ру (*прыкладу*). б) браць за прыклад кагó-н.: ***to model oneself on somebody*** браць кагó-н. за прыклад. 4. быць нату́ршчыцай *абó* нату́ршчыкам. 5. быць жывóй мадэ́льлю (*у кра́ме*)
– adj. узо́рны; прыкладны

moderate [ˈmɑ:dərət] – adj. 1. памяркóўны (*пра по́гляд*), умеркава́ны (*выда́ткі*). 2. сярэ́дні; умеркава́ны (*напр. хóлад*)
– n. чалаве́к з памяркóўнымі по́глядамі
– v.t. [ˈmɑ:dəreɪt] 1. стры́мваць. 2. зьмяншáць: ***to moderate one's demands*** зьме́ншыць сваé патрабава́ньні
– v.i. 1. выступа́ць у ро́лі арбі́тра. 2. старшыня́ва́ць

moderately [ˈmɑ:dərətli] adv. 1. памяркóўна (*кара́ць*), умеркава́на. 2. сярэ́дне, ме́рна

moderation [ˌmɑ:dəˈreɪʃən] n. 1. умеркава́насьць, памяркóўнасьць, стры́манасьць *f.* 2. зьмякчэ́ньне, памякчэ́ньне *n.* 3. вы́трымка, ро́ўнасьць (*харáктару*): ***in moderation*** памяркóўна; умеркава́на; стры́мана

moderator [ˈmɑ:dəreɪtər] n. 1. старшыня́ пасе́джаньня. 2. арбі́тар -ра *m.*, пасярэ́днік -а *m.* 3. мадэра́тар -ра *m.*, вядýчы праграмы

modern [ˈmɑ:dərn] – adj. сучáсны; но́вы; найнавéйшы; мадэ́рны
– n. сучáсьнік -а *m.*, сучáсьніца *f.*

modernism [ˈmɑ:dərˌnɪzəm] n. мадэрні́зм -у *m.*

modernize [ˈmɑ:dərnaɪz] v. мадэрнізава́ць

modest [ˈmɑ:dəst] adj. сьці́плы, скро́мны; стры́маны (*у павóдзінах абó вымóгах*); прысто́йны: ***a modest little house*** скро́мная мала́я ха́тка

modesty [ˈmɑ:dəsti] n. сьці́пласьць, скро́мнасьць *f.*

modify [ˈmɑ:dɪfaɪ] v., **-fied, -fying** 1. часткóва зьмяня́ць, мадыфікава́ць. 2. зьмяншáць, зьмякчáць. 3. Gram. азначáць: ***Adverbs modify verbs*** Прыслóўі азначáюць дзеяслóвы

modulate [ˈmɑ:dʒəleɪt] v. 1. рэгулява́ць; дапасóўваць, зьмякчáць, аслабля́ць. 2. зьмяня́ць (*гóлас для інтана́цыі*). 3. а) Mus. мадуляваць гóласам. б) мадуляваць электры́чны ток

mohair [ˈmouher] n. магэ́р -у *m.* (*во́ўна з анго́рскае казы́, ні́ткі з гэ́тае во́ўны, адзе́жына з такі́х ні́так*)

moist [mɔist] adj. 1. во́гкі; сыры́; вільго́тны: ***a moist cellar*** сыры́ падва́л. 2. ***moist eyes*** мо́крыя, павільгатне́лыя во́чы. 3. дажджлі́вы, мо́кры (*дзень, надво́р'е*). 4. мо́кры (*пра хваро́бу, калі́ адыхо́дзіць фле́гма*)

moisten [ˈmɔisən] v. 1. намо́чваць; рабі́ць мо́крым, вільго́тным. 2. нама́каць; рабі́цца мо́крым; вільгатне́ць

moisture [ˈmɔistʃər] n. во́гкасьць, сы́расьць, ві́льгаць, вільго́тнасьць *f.*

molar [ˈmoulər] – n. карэ́нны *або́* ку́тні зуб
– adj. прыстасава́ны для расьціра́ньня; карэ́нны (*пра зуб*)

molasses [məˈlæsiz] n. па́така *f.*

mold I, Brit. **mould** [mould] – n. 1. ліцэ́йная фо́рма, фо́рма для пе́чыва. 2. хара́ктар -у *m.*, склад -у *m.* 3. прави́дла *n.* (*для капелюша́, бо́та*)
– v.t. адліва́ць у фо́рму, фармава́ць

mold II, Brit. **mould** [mould] – n. цьві́ль, пле́сьня, бро́сьня *f.* (*на ва́дкасьці*)
– v.i. цьвісьці́, пакрыва́цца цьві́льлю; пле́сьнець; брасьне́ць

mold III, Brit. **mould** [mould] n. ры́хлая гле́ба

Moldavian [mɑ:lˈdeiviən] – adj. малда́ўскі
– n. малдава́нін -а *m.*, малдава́нка *f.*

molder I, Brit. **moulder** [ˈmouldər] v. гні́сьці, гніць; рассыпа́цца, спусташа́цца

molder II, Brit. **moulder** [ˈmouldər] n. ліцэ́йшчык -а *m.*, фармо́ўшчык -а *m.*

moldy, Brit. **mouldy** [ˈmouldi] adj. цьві́лы́; спле́сьнелы; збрасьне́лы

mole I [moul] n. радзі́мы знак (*на ску́ры*), радзі́мка *f.*

mole II [moul] n., Zool. 1. крот крата́ *m.* 2. цярпліві, шчы́ры працаўні́к

mole III [moul] n. 1. хвалялО́м -а *m.*, мол -а *m.* 2. дамба́ *f.*

mole IV [moul] n. грам-малэ́кула, моль -я *m.*

molecular [məˈlekjələr] adj. малекуля́рны

molecule [ˈmɑ:likju:l] n. малэ́кула *f.*

molehill [ˈmoulhil] n. 1. кратаві́на *f.* (*земляны́ капе́ц над наро́ю крата́*). 2. не́шта малава́жнае: ***to make a mountain (out) of a molehill*** рабі́ць з му́хі слана́

molest [məˈlest] v. 1. дакуча́ць, назаля́ць; перашкаджа́ць. 2. чапля́цца, прыстава́ць да *кагО́*: ***to molest (sexually)*** дакуча́ць сэксуа́льнымі дамага́ньнямі

molestation [ˌmoulesˈteiʃən] n. 1. надаку́чваньне, назаля́ньне *n.* 2. чапля́ньне, прыстава́ньне з сэксуа́льнымі дамага́ньнямі

mollify [ˈmɑ:lifai] v., **-fied, -fying** зьмякча́ць; супако́йваць

mollusk or **mollusc** [ˈmɑ:ləsk] n. малю́ск -а *m.*

mollycoddle [ˈmɑ:liˌkɑ:dəl] n. пястУ́н пестуна́ *m.* (*пра мужчы́ну*)

molt, Brit. **moult** [moult] – v. ліня́ць (*пра пту́шак*), скіда́ць ску́ру (*пра вужа́каў*)
– n. 1. ліня́ньне *n.* 2. час ліня́ньня

molten [ˈmoultən] – adj. 1. распла́ўлены. 2. лі́ты, адлі́ты.
– v., *p.p. of* **melt**

moment [ˈmoumənt] n. 1. мО́мант -у *m.*; хвілі́на, хвілі́нка *f.*: ***in a moment*** за хвілі́нку; ***One moment, please*** Адну́ хвілі́нку, калі́ ла́ска. 2. ***a man of the moment*** чалаве́к на ча́се; ***ally of the moment*** выпадко́вы саю́зьнік. 3. ва́жнасьць *f.*, значэ́ньне *n.*: ***a matter of moment*** ва́жная спра́ва

momentarily [ˌmoumənˈterəli] adv. 1. хвілі́нку, мамэ́нт: ***hesitate momentarily*** вага́цца хвілі́ну. 2. ко́жную хвілі́ну, з хвілі́ны на хвілі́ну: ***We expect him to arrive momentarily*** Мы спадзяемся, што ён прыйдзе з хвілі́ны на хвілі́ну; ***The danger was momentarily increasing*** Небясьпе́ка з ко́жнай хвілі́най расла́

momentary [ˈmoumənteri] adj. імгне́нны, мамэнта́льны

momentous [mouˈmentəs] adj. ве́льмі ва́жны, шматзна́чны

momentum [moʊˈmentəm] n., pl. **-tum** or **-ta** 1. ру́хаючая сі́ла, інэ́рцыя *f.* 2. разма́х, разго́н, імпэ́т -у *m.*

monarch [ˈmɑ:nərk] n. мана́рх -а *m.*

monarchal [məˈnɑ:rkəl] or **monarchial** [məˈnɑ:rkiəl] adj. мана́ршы

monarchic [məˈnɑ:rkɪk] adj. 1. манархі́чны (*ула́да і пад.*). 2. манархі́сцкі (*по́гляд*)

monarchism [ˈmɑ:nərˌkɪzəm] n. манархі́зм -у *m.*

monarchist [ˈmɑ:nərkɪst] n. манархі́ст -а *m.*, манархі́стка *f.*

monarchy [ˈmɑ:nərki] n., pl. **-chies** мана́рхія *f.*

monasterial [ˌmɑ:nəˈstɪriəl] adj. манасты́рскі

monastery [ˈmɑ:nəsteri] n., pl. **-teries** манасты́р -á, кля́штар -а *m.*

monastic [məˈnæstɪk] – adj. 1. мана́скі (*о́рдэн, во́пратка*): ***monastic vows*** мана́скі заро́к. 2. манасты́рскі
– n. мана́х -а *m.*

Monday [ˈmʌndeɪ] n. панядзе́лак -ка *m.*

monetary [ˈmɑ:nəteri] adj. грашо́вы: ***the monetary unit*** грашо́вая адзі́нка; ***monetary gain*** фіна́нсавы прыбы́так

money [ˈmʌni] n., pl. **-eys** or **-ies** 1. гро́шы *pl. only.* 2. бага́цьце *n.*: ***a man of money*** бага́ты чалаве́к; ***moneys*** or ***monies*** а) грашо́выя су́мы. б) ро́зныя манэ́тныя сыстэ́мы, валю́ты; ***make money*** а) зарабля́ць гро́шы. б) зрабі́цца бага́тым

moneybag [ˈmʌnibæg] n. 1. мяшо́к на гро́шы. 2. ***moneybags,*** pl., Informal а) бага́цьце *n.* б) багатыр, бага́ч -а́ *m.*, скна́рпа -ы *m.*

moneyed [ˈmʌnid] adj. з грашы́ма; грашаві́ты, бага́ты

moneylender [ˈmʌniˌlendər] n. ліхвя́р -а́ *m.*

money order грашо́вы перасы́л

Mongol [ˈmɑ:ŋgəl] – n. 1. мангО́л -а *m.*, мангО́лка *f.* 2. мангО́льская мО́ва
– adj. мангО́льскі

mongrel [ˈmʌŋgrəl] – n. мяша́нец -ца *m.*, по́месь *f.* (*пра расьлі́ну або́ жывёліну, асабл. саба́ку*)
– adj. нечыстакро́ўны

monition [məˈnɪʃən] n. заўва́га *f.*; перасьцяро́га *f.*, наста́ўленьне *n.*, афіцы́йнае навуча́ньне, павуча́ньне, нага́на *f.*

monitor [ˈmɑ:nətər] – n. 1. ста́раста кля́сы. 2. дара́днік -а *m.* або́ той, хто перасьцерага́е. 3. манітО́р -а *m.*, апара́т для кантро́лю
– v. правяра́ць; праслухО́ўваць (*ра́дыё*)

monk [mʌŋk] n. мана́х -а *m.*

monkey [ˈmʌŋki] – n. 1. ма́лпа *f.*; ма́лпачка *f.* 2. ма́лпа (*пра дурасьлі́вага чалаве́ка*), ма́лпачка (*пра дзіця́ — дурО́ніка, гарэ́зу*)
– v.i., Informal забаўля́цца, дурэ́ць ; круці́ць што-н. у рука́х: ***Don't monkey with the TV set*** Не гуля́й з тэлеві́зарам

monocle [ˈmɑ:nɪkəl] n. манО́кль -я *m.*

monocled [ˈmɑ:nɪkəld] adj. які́ но́сіць манО́кль

monogamy [məˈnɑ:gəmi] n. аднашлю́бнасьць, манага́мія *f.*

monogram[ˈmɑ:nəgræm] n. манагра́ма *f.*

monolog [ˈmɑ:nəlɔ:g] or **monologue** n. маналёг -у *m.*

monopolist [məˈnɑ:pəlɪst] n. манапалі́ст -а *m.*

monopolistic[məˌnɑ:pəˈlɪstɪk] adj. 1. манапалісты́чны. 2. манапалі́сцкі

monopoly [məˈnɑ:pəli] n., pl. **-lies** манапО́лія *f.*

monosyllabic [ˌmɑ:nəsəˈlæbɪk] adj. аднаскладО́вы

monosyllable [ˈmɑ:nəˌsɪləbəl] n. аднаскладО́вае слО́ва

monotone [ˈmɑ:nətoʊn] n. аднаста́йны тон, стыль піса́ньня, кО́лер

monotonous [məˈnɑ:tənəs] adj. 1. манатО́нны, аднатО́нны: ***to speak in a monotonous voice*** гаварыць манатО́нным гО́ласам. 2. аднаста́йны, бязьзьме́наў. 3. манатО́нны, ну́дны: ***monotonous work*** ну́дная пра́ца

monotonously [məˈnɑ:tənəsli] adv. 1. аднатО́нна, манатО́нна. 2. аднаста́йна; ну́дна

monotony [məˈnɑ:təni] n. 1. аднатóннасьць, манатóннасьць *f.* 2. аднастáйнасьць *f.* 3. нýдная аднóлькавасьць, аднастайнасьць

monoxide [məˈnɑ:ksaɪd] n. вóкіс -у *m.*

monsoon [ˌmɑ:nˈsu:n] – n. мусóн -у *m.*
– adj. мусóнны

monster [ˈmɑ:nstər] n.1. вы́радлак -ка *m.*, пачвáрла -ы *m. & f.* 2. страшы́ла, страхóцьце *n.* 3. лю́ты чалавéк, гвалтаўнік -á *m.*; садыст -а *m.*

monstrance [ˈmɑ:nstrəns] n., Church. даранóсіца *f.*, манстрáнцыя *f.* (Cath.)

monstrosity [mɑ:nˈstrɑ:səti] n., pl. **-ties** 1. вы́радлак -ка *m.* , пачвáрла -ы *m. & f.* 2. пачвáрнасьць, выродлівасьць *f.*

monstrous [ˈmɑ:nstrəs] adj. 1. велічэ́зны, велізáрны. 2. выродлівы, пачвáрны. 3. страшэ́нны, жахлівы

month [mʌnθ] n. мéсяц -а *m.* (*1/12 гóду*)

monthly [ˈmʌnθli] – adj. мéсячны: ***a monthly pay*** мéсячная плáта
– adv. мéсячна, штомéсячна, на мéсяц
– n., pl. **-lies** штомéсячны чáсапіс

monument [ˈmɑ:njəmənt] n. 1. пóмнік -а *m.* 2. манумэ́нт -а *m.*

monumental [ˌmɑ:njəˈmentəl] adj. 1. манумэнтáльны. 2. які́ ўвекавéчвае. 3. нязвы́клы, надзвычáйны; вéльмі вялі́кі: ***monumental ignorance*** надзвычáйнае нéвуцтва

moo [mu:] – n., **moos** рыканьне, мыканьне *n.*; рык -у *m.*
– v.i. рыкáць, мы́каць

mood I [mu:d] n. настрóй -ю *m.*, гумóр -у *m.*; жадáньне *n.*; ахвóта *f.*: ***to be in the mood for something*** мець настрóй (жадáньне, ахвóту) да чагó-н.; ***to be in no mood to laugh*** ня мець настрóю сьмяя́цца

mood II [mu:d] n., Gram. лад -у *m.*: ***the indicative (imperative) mood*** абвéсны (загáдны) лад

moody [ˈmu:di] adj. 1. які́ лёгка мяня́е настрóі. 2. маркóтны, сýмны, панýры; мэлянхалі́чны

moon [mu:n] – n. 1. мéсяц -а *m.* (*спадарóжнік Зямлі́*). 2. мéсячнае сьвятлó. 3. спадарóжнік плянэ́ты: ***the moons of Jupiter*** спадарóжнікі Юпі́тэра
– v. блукáць бязьдзéйна, як у сьне; пазіráць абыя́кава
• ***once in a blue moon*** вéльмі рэ́дка

moonbeam [ˈmu:nbi:m] n. мéсячны прамéнь, паласá мéсячнага сьвятлá

moonlight [ˈmu:nlaɪt] – n. мéсячнае сьвятлó
– adj. пры мéсячным сьвятлé, уначы́
– v.i., Sl. працаváць па-за рэгуля́рнай працóўнай парóй (*уначы́, сьвя́тамі*)

moonlit [ˈmu:nlɪt] adj. залíты мéсячным сьвятлóм, мéсячны (*пра ноч*)

moonstruck [ˈmu:nstrʌk] adj. звар'яцéлы, ненармáльны; зьбянтэ́жаны

moony [ˈmu:ni] adj. 1. падóбны да мéсяца. 2. расьсéяны, няўвáжлівы; абыя́кавы, апаты́чны

moor I [mʊr] v. прычáльваць(ь (-ца); прышвартóўваць(ь (-ца) (*чóвен, карабéль*)

moor II [mʊr] n. пýстка, пустóча *f.* (*асабліва парóслая вéрасам*)

Moor [mʊr] n. Маўр -а *m.*

Moorish [ˈmʊrɪʃ] adj. маўрытáнскі

moose [mu:s] n. лось лася́ *m.*

moot [mu:t] – adj. спрэ́чны, сумнéўны
– v.t. падавáць тэ́му для дыскýсіі, выстаўля́ць на дыскýсію
– v.i. спрачáцца

mop [mɑ:p] – n. 1. швáбра *f.* (*для мыцьця́ падлóгі*). 2. чупры́на *f.*
– v.t. выціráць *абó* мыць швáбрай: ***to mop up***, Sl. скóнчыць

mope [moʊp] v. маркóціцца; сумавáць, тужы́ць

moral [ˈmɔ:rəl] – adj. марáльны: ***a moral act (man)*** марáльны ўчы́нак (чалавéк)
– n. марáль *f.* 2. ***morals*** а) нóравы *pl.* б) натýра *f.* в) э́тыка *f.*

morale [məˈræl] n. марáльны стан

moralist [ˈmɔ:rəlɪst] n. 1. чалавéк з марáльлю. 2. маралíст -а *m.*

morality [məˈrælәti] n. **-ties** 1. марáльнасьць *f.* 2. прáвілы, нóрмы павóдзінаў

morally [ˈmɔ:rәli] adv. марáльна

morass [məˈræs] n. 1. дрыгвá *f.* 2. цяжкóе станóвішча

morbid [ˈmɔ:rbɪd] adj. 1. хваравíты; нездарóвы. 2. хварóбны; выкліканы хварóбай: ***a morbid growth*** злаякасны нарóст. 3. страшны́, жахлíвы, агíдны

morbidity [ˌmɔ:rˈbɪdәti] n. 1. хваравíтасьць *f.* 2. кóлькасьць захвóрванняў

morbifical [ˌmɔ:rˈbɪfɪkәl] adj. хваробатвóрны

mordacity [ˌmɔ:rˈdæsәti] n. зьéдлівасьць *f.*

mordant [ˈmɔ:rdәnt] – adj. 1. Chem. éдкі. 2. зьéдлівы, саркастычны. 3. замацавáльны, які́ замацóўвае (*фáрбы на тканíне*)

– n. 1. замацавáльнік -а *m.* 2. пратрáва *f.* (*éдкае рэ́чыва, ужывáнае пры гравіраванні*)

more [mɔ:r] – adj. 1. больш, бóлей. ***more men*** больш мужчы́наў: ***more help*** больш дапамóгі. 2. дадаткóва, яшчэ́: ***Two more boats*** яшчэ́ два чаўны́

– n. 1. больш: ***The more they have, the more they want*** Чым больш яны́ мáюць, тым больш хóчуць. 2. больш: ***Tell me more*** Скажы́це мне больш; ***We saw no more of him*** Мы яго больш ня бáчылі

– adv. 1. больш: ***You should walk more*** Вы павíнны больш хадзíць; ***More powerful*** мацнéйшы. 2. яшчэ́: ***Sing once more*** Засьпявáйце яшчэ́ раз

• ***and more than that*** і нáват больш

• ***be no more*** ня жыць, памéрці

• ***more or less*** больш-менш

• ***more than once*** цірáз, ня раз

moreover [ˌmɔ:rˈouvәr] adv. таксáма; апрачá тагó, звыш тагó; пры тым, да тагó

morgue [mɔ:rg] n. трупя́рня *f.*, морг -у *m.*

morning [ˈmɔ:rnɪŋ] – n. рáньне *n.*, рáніца *f.*; рáнlак -ку *m.*: ***in the morning*** урáньні, рáнкам, раніцóй; ***since morning*** зрáньня, зрáнку

– adj. рáнішні, рáнічны

morning-after [ˌmɔ:rnɪŋˈæftәr] n., pl. **mornings-after** Informal пахмéльле *n.*

morning-after pill супрацьзачáткавая таблéтка

morning-glory [ˌmɔ:rnɪŋˈglɔ:ri] n., **-ries** павóлй -ю *m.*, павóйка *f.*

morning star 1. зараніца, зарáнка *f.* 2. рáньняя зóрка, Вэнэ́ра

morocco [məˈrɑ:kou] n. **-cos** саф'я́н -у *m.*

morose [məˈrous] adj. панýры; невясёлы; не ў гумóры

morphine [ˈmɔ:rfi:n] n. марфíн -у *m.*

morphinism [ˈmɔ:rfɪˌnɪzәm] n. марфінíзм -у *m.*

morphology [mɔ:rˈfɑ:lәdʒi] n. марфалёгія *f.*

morsel [ˈmɔ:rsәl] n. 1. малéнькі кавáлак, як на раз укусíць. 2. кавáлак, фрагмэ́нт -а *m.*

mortal [ˈmɔ:rtәl] – adj. сьмяротны, сьмяртэ́льны (*пра чалавéка, хварóбу, рáну*)

– n. чалавéк -а *m.*; сьмяротнlы -ага *m.*, сьмяротная *f.*

mortality [mɔ:rˈtæləti] n. сьмяротнасьць *f.*; сьмяртэ́льнасьць (*рáны*)

mortally [ˈmɔ:rtәli] adv. сьмяротна, сьмяртэ́льна

mortal sin сьмяротны грэх

mortar I [ˈmɔ:rtәr] n. вáпна-цэмэ́нтавы растворóр

mortar II [ˈmɔ:rtәr] n. 1. стýпа, стýпка *f.* (*аптэкáрская*). 2. Milit. марты́ра *f.*, мінамёт -а *m.*

mortgage [ˈmɔ:rgɪdʒ] – n. 1. закláд -у *m.*, іпатэ́ка *f.* (*закláд пад нерухóмасьць*). 2. закладны́ ліст

– adj. іпатэ́чны

– v.t. закладáць (*дом абó зямлю́ пад іпатэ́ку*). 2. ахвяравáць; аддавáць: ***Faust mortgaged his soul to the devil*** Фаўст ахвяравáў сваю́ душý д'я́блу

mortgagee [ˌmɔ:rgɪˈdʒi:] n. іпатэ́чны крэдытóр
mortgager or **mortgagor** [ˈmɔ:rgɪdʒər] n. іпатэ́чны даўжнíк
mortification [ˌmɔ:rtəfɪˈkeɪʃən] n. 1. скрáйняя зьбянтэ́жанасьць, засарóмленасьць; прыніжэ́ньне *n.*, крыўда *f.* 2. зьмярцьвя́ньне, утаймóўваньне (*цéла, жадáньняў*). 3. Med. зьмярцьвéньне *n.*, гангрэ́на *f.*
mortify [ˈmɔ:rtəfaɪ] v., **-fied, -fying** 1. прынíзіць, пакрыўдзіць; засарóміць; зьняваáжыць. 2. зьмярцьвя́ць, утаймóўваць (*цéла, жадáньні*). 3. зьмярцьвéць (*пра клéтку, чáстку цéла*)
mortuary [ˈmɔ:rtʃueri] – n. пахавáльня *f.*; трупя́рня *f.*, морг -у *m.*
– adj. пахавáльны
Moslem [ˈmɑ:zləm] – n. **-lems** or **-lem** мусульмáнін-а *m.*, мусульмáнка *f.*
– adj. мусульмáнскі
mosque [mɑ:sk] n. мячэ́ць *f.*
mosquito [məˈski:toʊ] – n., **-toes** or **-tos** камáр -á *m.*
– adj. камарóў
moss [mɔ:s] n. мох мóху *i* імхý *m.*
mossy [ˈmɔ:si] adj. 1. імшы́сты (*пакры́ты мóхам, як балóта, кáмень*). 2. мóхавы, імхóвы, імшáны, як мох
most [moʊst] – adj. *найвышэ́йшая ступéнь ад* **much** і **many**). 1. найбóльшы (*пра чáстку, кóлькасьць*): ***most people*** бальшыня́ людзéй. 2. амáль усé: ***Most children like candies*** Амáль усé дзéці любяць цукéркі. 3. ***for the most part*** перавáжна; бóльшай чáсткай; звычáйна
– n. бальшыня́, бóльшасьць *f.*: ***most of them*** бальшыня́ зь іх
– adv. 1. найбóльш, найбóлей: ***What most annoys me*** Што найбóльш злуé мяне́. 2. вéльмі: ***His speech was most convincing*** Ягóная прамóва былá вéльмі пераканáўчая. 3. ***most beautiful*** сáмы прыгóжы, найпрыгажэ́йшы. 4. ***most likely*** найбóльш праўдападóбна, мáбыць
• ***at most*** or ***at the most*** ня больш як
• ***get the most out of*** дастáць, выцягнуць як найбóльш з *чагóсьці*
• ***make the most of*** як найлéпш выкарыстаць *што*
• ***This is the most we can say*** Гэ́та ўсё, што мы мóжам сказáць
mostly [ˈmoʊstli] adv. амáль усé; бóльшай чáсткай; перавáжна; у бальшынí
mote [moʊt] n. пылíнка *f.*
motel [ˌmoʊˈtel] n. матэ́ль -ю *m.*
moth [mɔ:θ] n., **moths** [mɔ:ðz] 1. моль *f.* 2. начны́ маты́ль
• ***moth ball*** шáрык нафталíну
• ***moth balls*** нафталíн
moth-eaten [ˈmɔ:θˌi:tən] adj. паéдзены мóллю; вы́нашаны, знóшаны; (*пра вóпратку*) стары́; нямóдны
mother [ˈmʌðər] – n. мáці *f., indecl.*, мáтка *f.*
– adj. 1. мáтчын. 2. рóдны: ***mother tongue*** рóдная мóва; ***mother country*** бáцькаўшчына, радзíма *f.*, рóдны край
motherhood [ˈmʌðərhʊd] n. 1. мацяры́нства *n.* 2. мáткі
mother-in-law [ˈmʌðərənˌlɔ:] n., pl. **mothers-in-law** цéшча *f.*; сьвякрýха *f.*
motherland [ˈmʌðərlænd] n. бáцькаўшчына, радзíма *f.*
motherly [ˈmʌðərli] adj. мáтчынны, мацяры́нскі
mother's [ˈmʌðərz] adj. мáтчын
mother-of-pearl – n. мáціца *f.*, пэрламýтар -ру *m.*
– adj. маціцóвы, пэрламýтравы (*бляск, гýзік*)
Mother's Day Дзень Мáці
mother wit здарóвы рóзум
motif [moʊˈti:f] n. маты́ў; лейтматы́ў -ву *m.*
motion [ˈmoʊʃən] – n. 1. рух -у *m.*: ***in motion*** у рýху, на хадý; ***to set (put) in motion*** пусьцíць у ход (*машы́ну, спрáву*). 2. рух цéла, рукі; жэст -у *m.* 3. прапанóва *f.* (*на пасéджаньні*)
– v. паказáць жэ́стам *абó* кíвам галавы́
motionless [ˈmoʊʃənləs] adj. нерухóмы

motion picture фільм -у *m.*

motivate [ˈmoʊtəveɪt] v. 1. матываваць, абгрунтоўваць. 2. быць прычынай, схіляць, заахвочваць да *чаго*

motive [ˈmoʊtɪv] – n. 1. матыў -ву *m.*, прычына, падстава *f.* 2. *гл.* **motif**
– adj. рухаючы: ***motive power*** рухаючая сіла

motley [ˈmɑ:tli] – n., pl. **-leys** 1. стракатае, пярэстае бразнава ўбранне. 2. папуры, *indecl.*; усякая ўсячына
– adj. стракаты, пярэсты, рабы; рознакаляровы

motor [ˈmoʊtər] – n. 1. рухавік -á *m.*, матор -а *m.* 2. аўтамабіль -я *m.*
– adj. матарны (*пра лодку*); рухальны (*пра нэрв, мускул*)
– v. ехаць аўтамабілем

motorboat [ˈmoʊtərboʊt] n. моторная лодка

motorcade [ˈmoʊtərkeɪd] n. аўтакалёна, кавалькада *f.*, картэж -у *m.*

motorcycle [ˈmoʊtərˌsaɪkəl] n. матацыкл -а *m.*, матацыклет -а *m.*

motorcyclist [ˈmoʊtərˌsaɪklɪst] n. матацыклíст -а *m.*, матацыклíстка *f.*

motor hotel or **inn** n. гатэль для аўтамабілістаў

motorist [ˈmoʊtərɪst] n. аўтамабілíст -а *m.*

motorize [ˈmoʊtəraɪz] v.t. матарызаваць

motorization [ˌmoʊtərɪˈzeɪʃən] n. матарызацыя, аснашчэнне матóрам *або* мэханічным транспартам

motorman [ˈmoʊtərmən] n., **-men** кіроўца трамвая *або* электрычкі

mottle [ˈmɑ:təl] – v. знáчыць, пярэсьціць крáпінамі рóзнага кóлеру
– n. 1. маляваньне крáпінкамі, узóр у розначкаляровыя крáпкі. 2. пляма, крáпінка, крáпка *f.* (*на пярэстым узóры*)

mottled [ˈmɑ:təld] adj. у крáпінкі, рабы

motto [ˈmɑ:toʊ] n., **-toes** or **-tos** дэвíз -у *m.*; эпíграф -у *m.*

mound [maʊnd] – n. 1. нáсып -у *m.*; кýча, крýшня *f.* (*камéньня*). 2. малы ўзгóрак. 3. курган -á *m.*
– v.t. 1. абвóдзіць нáсыпам. 2. ссыпáць у кýчу; насыпáць (*курган і пад.*)

mount [maʊnt] – v. 1. узыхóдзіць: ***to mount the stairs*** ісьцí па схóдах угарý: ***to mount a platform*** узыйсьцí на плятфóрму. 2. ***to mount a horse*** сéсьці на каня. 3. павышáцца, паднімáцца (*пра цэны, кошт*). 4. ***to mount specimens on slides*** паклáсьці прэпарáт на шкло. 5. ***to mount a picture*** абрамаváць малюнак
– n. 1. асядлáны конь. 2. падклéйка пад карцíну, малюнак. 3. апрáва (*каменя*)

mountain [ˈmaʊntən] – n. 1. гарá *f.* 2. кýча *f.*, мнóства *n.*: ***a mountain of difficulties*** мнóства цяжкасьцяў
– adj. гóрны: ***a mountain pass*** гóрны прахóд

mountain ash рабíна, арабíна *f.*

mountain chain гóрны ланцýг

mountaineer [ˌmaʊntənˈɪr] n. 1. гóрлац -ца *m.* 2. альпінíст -а *m.*, альпінíстка *f.*

mountainous [ˈmaʊntənəs] adj. 1. гарысты. 2. велічэзны: ***a mountainous wave*** велічэзная хвáля

mounted [ˈmaʊntəd] adj. 1. кóнны: ***mounted police*** кóнная палíцыя. 2. падрыхтаваны: ***a mounted telescope*** тэлескóп, гатóвы для карыстáньня. 3. наклéены на кардóн *або* палатнó (*пра карцíну*). 4. асáджаны, апрáўлены: ***a mounted jewel*** апрáўлены каштóўны кáмень

mourn [mɔ:rn] v. 1. смуткаváць, гаравáць (*з прычыны стráты або сьмéрці*), аплáкваць *каго-што*. 2. быць у жалóбе, насíць жалóбу (*па кім-н.*)

mourner [ˈmɔ:rnər] n. удзéльнік пахаваньня, асóба ў жалóбе

mournful [ˈmɔ:rnfəl] adj. 1. сýмны, жалóбны. 2. панýры, хмýры, змрóчны (*выгляд, мэлёдыя*)

mourning [ˈmɔ:rnɪŋ] – n. 1. аплáкваньне, смуткаváньне *n.* 2. жалóба *f.*, пэрыяд жалóбы; азнáкі жалóбы (*чóрная вóпратка*)
– adj. жалóбны

mouse [maʊs] – n., pl. **mice** [maɪs] 1. мыш, мы́шка *f.* 2. Comput. мыш *f.* 3. нясьме́лы, сарамлі́вы чалаве́к
– v.t. [maʊz] лавіць мышэ́й.

mousetrap [ˈmaʊstræp] n. мышы́ная па́стка, мышалóўка *f.*

moustache, *тс.* **mustache** [ˈmʌstæʃ] n. ву́сы *pl.*, from вус -а *m.*

mouth [maʊθ] – n., **mouths** 1. рот -а *m.*, ву́сны *pl. only.* 2. адту́ліна *f.* (*пячóры*): ***mouth of a river*** утóка *f.*, ву́сьце *n.* 4. грыма́са *f.*
– v. 1. [maʊð] лавіць ро́там; чвя́каць ро́там. 2. гаварыць напы́шліва, ара́тарстваваць. 3. грыма́сьнічаць. 4. прывуча́ць каня́ да ўзды́чкі й цу́гляў

mouthful [ˈmaʊθfəl] n., pl. **-fuls** глытóк -ка́ *m.*; малы́ кава́лак; по́ўны рот

mouth organ 1. губны́ гармóнік. 2. жале́йка *f.*

mouthpiece [ˈmaʊθpi:s] n. 1. мушту́к -а́ *m.* (*музы́чнага інструмэ́нта*). 2. цу́глі *pl. only* (*для каня́*). 3. выка́зьнік -а *m.*, выка́зьніца *f.* (*чыíх-н. інтарэ́саў, ду́мкі*), ру́пар -у *m.*

movable [ˈmu:vəbəl] – adj. 1. рухóмы. 2. перасóўны, перастаўны́, перанóсны (*ля́мпа, ра́дыёста́нцыя*)
– n. ***movables,*** pl. рухóмая маёмасьць

movability [ˌmu:vəˈbɪlətɪ] n. рухóмасьць *f.*

move [mu:v] – v.t. v.i. 1. ру́хаць(ь) (-ца). 2. варушы́ць(ь) (-ца). 3. перабіра́цца, перасяля́цца (*у іншую кватэ́ру, го́рад*). 4. рабіць ход (*у гульні́*). 5. дзе́яць. 6. змуша́ць; схіля́ць, заахвочваць да *чаго́*. 7. узру́шваць; крана́ць; расчу́льваць: ***to move to anger (laughter)*** узлава́ць (расьсьмяшы́ць). 8. рабіць прапано́ву, прапанава́ць. 9. трыма́цца: ***to move with dignity*** трыма́цца з го́днасьцю. 10. Informal ісьці́, ад'яжджа́ць: ***It's time to be moving*** Час ісьці́. 11. Informal спаражня́цца
– n. 1. (*у гульні́*) ход -у *m.* 2. рух -у *m.* 3. мерапрые́мства *n.*: ***to be on the move*** а) быць на нага́х, у ру́ху. б) падаро́жнічаць
• ***move about*** хадзіць, пераяжджа́ць зь ме́сца на ме́сца
• ***move aside*** адсу́нуць(ь) (-ца) на бок
• ***move away*** вы́ехаць; адсу́нуцца
• ***move back*** адступа́ць, адыхо́дзіць (*наза́д, за́дам*); падава́ць наза́д (*а́ў-та*), адсо́ўваць наза́д
• ***move forward*** падава́цца напе́рад
• ***move in*** а) увабра́цца, усяліцца куды́-н. б) усу́нуць што-н.
• ***move on (please)*** прахо́дзьце дале́й (калі́ ла́ска)
• ***move out*** выбіра́ цца

moved [mu:vd] adj. кра́нуты; расчу́лены

movement [ˈmu:vmənt] n. 1. рух -у *m.* (*таксáма грамáдзкі*): ***the movement for peace*** рух прыхíльнікаў мíру. 2. перамяшчэ́ньне, перакіда́ньне (*во́йска*). 3. ход, мэханíзм -у *m.* 4. Mus. а) тэмп -у *m.* б) рытм -у *m.* в) ча́стка до́ўгага музы́чнага тво́ру. 5. пра́ца кішэ́чніка, спаражне́ньне *n.*

movie [ˈmu:vi] n., Informal фільм -у *m.*; кіно́ *n., indecl.*

moving [ˈmu:vɪŋ] adj. 1. рухóмы. 2. які́ выклíка́е рух. 3. крана́льны

mow I [moʊ] v., **mowed** or **mown, mowing** касíць; жа́ць

mow II [maʊ] n. 1. пры́старанак, застаро́нак -ка *m.* (*у гумне́*). 2. тарпа́ снапо́ў *або́* се́на ў пры́старанку

mow III [maʊ] n. грыма́са *f.*

mowing [ˈmoʊɪŋ] n. 1. касьба́ *f.*, кашэ́ньне, касавíца *f.* 2. сенажа́ць *f.* 3. укóс -у *m.* (*ско́шанае се́на*)

Mr., Brit **Mr** [ˈmɪstər] pl. **Messrs** (*скаро́чаная фо́рма ад* ***Mister*** *і ста́віцца заўсёды перад про́зьвішчам*), спада́р -а́ *m.*, мíстэр: ***Mr. Brown*** спада́р Браўн

Mrs., Brit **Mrs** [ˈmɪsɪz] pl. **Mmes** (*скаро́чаная фо́рма ад* ***Mistress***, *ста́віцца пе́рад про́зьвішчам за́мужняй жанчы́ны*) спада́рыня, мíсыс: ***Mrs.Brown*** спада́рыня Браўн; Informal: ***"Where's the missis?"*** А дзе спада́рыня?

Ms., Brit **Ms** [ˈmɪz] (*ста́віцца пе́рад про́зьвішчам жанчы́ны незале́жна ад шлю́бнага ста́ну*) спада́рыня

much [mʌtʃ] – **more, most** – adj. шмат: ***much money*** шмат гро́шай; ***much time*** шмат ча́су
– adv. 1. ве́льмі: ***much pleased*** ве́льмі задаво́лены: ***I am much obliged to you*** Я вам ве́льмі ўдзя́чны. 2. куды́: ***much better*** куды́ ле́пшы. 3. ама́ль; бліз у́: ***much of a size (a height)*** ама́ль тако́га са́мага паме́ру (ама́ль тако́е са́мае вышыні́); ***This is much the same as the others*** Ама́ль такі́ са́мы, як і і́ншыя
– n. 1. шмат што, шмат чаго́: ***Much of this is not true*** Шмат што з гэ́тага няпра́ўда. 2. ***to make much of*** высо́ка цані́ць, шанава́ць; быць высо́кае ду́мкі аб *кім-чым*. 3. ***not much of a*** ня ве́льмі до́бры, слабы́: ***He is not much of an artist*** Невялі́кі зь яго́ маста́к. 4. ***too much for*** не пад сі́лу: ***The work is too much for him*** Пра́ца яму́ не пад сі́лу

mucilage [ˈmjʊsɪlɪdʒ] n. 1. клей -ю *m.* (*таксама́ расьлі́нны*). 2. сьлізь *f.*

muck [mʌk] – n. 1. бруд -у *m.* 2. аскуднасьць *f.* 3. а) гной -ю *m.* б) чарназём, ужыва́ны як угнае́ньне. 4. (*у ша́хце*) друз -у *m.* 5. Informal непара́дак -ку *m.*, бязла́дзьдзе *n.*, бруд -у *m.*
– v.t. 1. бру́дзіць. 2. угно́йваць. 3. (*у ша́хце*) ачышча́ць, вывозіць друз

mucous [ˈmju:kəs] adj. сьлі́зісты

mucous membrane сьлі́зістая абало́нка (*во́ка, но́са, го́рла*)

mucus [ˈmju:kəs] n. сьлізь *f.*

mud [mʌd] n. гразь *f.*: ***clear as mud*** незразуме́лы, цёмны

muddle [ˈmʌdəl] – v. 1. блы́таць; заблы́тваць, пазбаўля́ць я́снасьці; зьбіва́ць з панталы́ку. 2. ап'яня́ць, адурма́ньваць. 3. каламу́ціць (*ваду́*). 4. тра́ціць дарма́ (*гро́шы, час*); растра́чваць, марнава́ць (*гро́шы*). 5. дзе́яць бяз пля́ну, рабі́ць абы-я́к. 6. ***to muddle through*** не́як даць ра́ды, не́як дасе́сьці спра́ву да канца́
– n. непара́дак -ку, балага́н -у *m.*; замяша́ньне *n.*, блы́таніна *f.*: ***to make a muddle of*** зблы́таць, пераблы́таць усё

muddy [ˈmʌdi] – adj. 1. гра́зкі: ***muddy road*** гра́зкая даро́га. 2. бру́дны, нячы́сты; каламу́тны: ***a muddy color*** бру́дны ко́лер; ***muddy water*** каламу́тная вада́. 3. памутне́лы, няя́сны (*пра ро́зум, ду́мкі*)
– v. 1. апы́рскаць(ся) (-ца) гразёю. 2. каламу́ціць

muff [mʌf] – n. 1. му́фта *f.* 2. няспры́тны недарэ́ка, пэ́цкаль -я *m.*
– v.i. 1. схі́біць, даць ма́ху; праваро́ніць. 2. спарта́чыць

muffin [ˈmʌfɪn] n. мале́нькая бу́лачка

muffle [ˈmʌfəl] – v.t. 1. ху́таць, заху́тваць; захіна́ць. 2. ***to muffle oneself*** ху́тацца, заху́твацца, захіна́цца. 3. глушы́ць, заглуша́ць (*гук*)
– n. заглу́шаны гук

muffler [ˈmʌflər] n. 1. шаль -я, ша́лік -а *m.* 2. глушы́льнік -а *m.* (*таксама́ ў аўтамабі́лі*)

mug [mʌg] – n. 1. гліня́ны ку́бак. 2. Sl. (*абразьл.*) ры́ла *n.*, мо́рда *f.* 3. Sl. хулі́га́н, галаварэ́з -а *m.*
– v.t., Sl. фатаграфава́ць для паліцэ́йскага ўжы́тку

muggy [ˈmʌgi] adj. цёплы й во́гкі; па́рны, ду́шны

mulberry [ˈmʌlˌberi] n., pl. **-ries** шаўко́ўніца *f.* (*дрэ́ва і фрукт*)

mule [mju:l] n. 1. мул -а *m.* 2. Informal дурны́ *або́* упа́рты чалаве́к. 3. мюльмашы́на *f.* (*для прадзе́ньня*)

mulish [ˈmju:lɪʃ] adj. як мул; упа́рты, упо́рысты

multicellular [ˌmʌltɪˈseljələr] adj. шматкле́тачны (*пра во́дарасьці, жывёлы*)

multicolored, Brit. **multicoloured** [ˈmʌltɪˌkʌlərd] adj. шматкаляро́вы, рознакаляро́вы

multicultural [ˌmʌltɪˈkʌltʃərəl] adj. шматкульту́рны

multiculturalism [ˌmʌltɪˈkʌltʃərəˌlɪzəm] n. шматкульту́рнасьць *f.*; шматкульту́р'е *n.*

multifold [ˈmʌltɪfoʊld] adj. шматразо́вы

multiform [ˈmʌltɪfɔ:rm] adj. разнастáйны, разнарóдны

multilateral [ˌmʌltɪˈlætərəl] adj. шматбакóвы (*пра умóву, дапамóгу, адукáцыю*)

multilingual [ˌmʌltɪˈlɪŋgwəl] adj. шматмóўны

multimillionaire [ˌmʌltɪˌmɪljəˈner] n. мультымiліянэ́р -а *m.*

multiple [ˈmʌltɪpəl] – adj. шматразóвы, шматлíкі: ***multiple interests*** шматлíкія зацікаўлéньні
– n., Math. крáтны лік.: ***the lowest common multiple*** агýльны наймéншы крáтны лік

multiplicand [ˌmʌltɪplɪˈkænd] n., Math. мнóжыва *n.*

multiplication [ˌmʌltɪplɪˈkeɪʃən] n. 1. Math. мнóжаньне: ***multiplication table*** таблíца мнóжаньня. 2. размнажэ́ньне

multiplier [ˈmʌltɪplaɪər] n., Math. мнóжнік -а *m.*

multiply [ˈmʌltɪplaɪ] v., **-plied, -plying** 1. мнóжыцца (*кóлькасна павялíчвацца*). 2. мнóжыць: ***to multiply 10 by 2*** памнóжыць дзéсяць на два. 3. размнажáцьць (-ца)

multitude [ˈmʌltɪtu:d] n. мнóства *n.*; плóйма *f.* (*камарóў, жаўнéраў*); бéздань, бéзьліч, прóцьма *f.* 2. ***the multitude*** прóстыя людзі, натóўп -у *m.*

mum I [mʌm] – adj. маўклíвы
– Interj. Цíха! Маўчы́!

mum II [mʌm] Informal мáма

mum III [mʌm] n., Informal хрызантэ́ма *f.*

mummy I [ˈmʌmi] n.,pl. **-mies** мýмія *f.*

mummy II [ˈmʌmi] n.,pl. **-mies**, Informal мáма *f.*

mumble [ˈmʌmbəl] – v. 1. мармытáць. 2. мя́мліць. 3. жавáць, як бяз зубóў
– n. мармытáньне, мя́мленьне *n.*

mumps [mʌmps] n., pl. сьвíнка, завушнíца *f.* (*хварóба*)

munch [mʌntʃ] v.t. 1. жавáць; чмя́каць, чвя́каць. 2. хрумстáць

municipal [mjuˈnɪsɪpəl] adj. 1. муніцыпáльны, гарадзкí. 2. самаўрáдавы: ***municipal government*** мясцóвы самаўрáд

municipality [mjuˌnɪsɪˈpæləti] n., pl. **-ties** гóрад, акрýга зь мясцóвым самаўрадам; муніцыпалітэ́т -у *m.*

munificence [mjuˈnɪfɪsəns] n. шчóдрасьць *f.*

munificent [mjuˈnɪfɪsənt] adj. шчóдры

munition [mjuˈnɪʃən] – n., ***munitions,*** pl. вайскóвыя прыпáсы (*напр. стрэ́льбы, пóрах абó бóмбы*)
– adj. ***munition plant*** збрóевы завóд
– v.t. забясьпéчваць (*вóйска ваéннымі прыпáсамі*)

mural [ˈmjʊrəl] – adj. сьцéнны, насьцéнны: ***mural painting*** фрэ́скавы жывапíс
– n. фрэ́ска *f.*

murder [ˈmɜ:rdər] – n. 1. забóйства *n.* 2. Informal нéшта цяжкóе, непрыéмнае: ***That job was murder*** Тáя прáца былá прóста забóйствам; ***Murder will out*** Шылá ў мяхý не схавáеш
– v.t. забівáць

murderer [ˈmɜ:rdərər] and **murderess** [ˈmɜ:rdərəs] n. забóйца -ы *m. & f.*

murderous [ˈmɜ:rdərəs] adj. 1. сьмярóтны, забóйчы (*удáр*). 2. крыважэ́рны: ***a murderous villain*** крыважэ́рны злачы́нец. 3. крывáвы: ***a murderous riot*** крывáвы бунт

murmur [ˈmɜ:rmər] – n. 1. цурчэ́ньне, журчэ́ньне *n.* (*ручаю́*). 2. шамацéньне *n.*, шóлах -у *m.* (*лістóў*); шóргань-не: ***murmur of the forest*** гóман лéсу. 3. прыглýшаныя галасы́, шэпт -у *m.* 4. Med. шумы́ (*напр. у сэ́рцы*). 5. бурчэ́ньне, нараканьне *n.*
– v.i. 1. цурчэ́ць, журчэ́ць. 2. шамацéць. 3. паціху нарака́ць, жáліцца

murmuring [ˈmɜ:rmərɪŋ] adj. гаманкí (*пра лес*)

muscle [ˈmʌsəl] – n. 1. мýскул -а *m.*; мы́шца *f.* 2. сíла, моц *f.* 3. ***to not move a muscle*** анí зварухнýцца
– v., Sl. ***to muscle in*** сíлай уціснуцца куды́-н.

Muscovite [ˈmʌskəvaɪt] n. 1. жыхáр Масквóўшчыны, маскáль -я́ *m.*, расéец -йца *m.*; маскáлька, расéйка *f.* 2. масквíч -á *m.*, масквíчка *f.*

Muscovy [ˈmʌskəvi] n. Маскóўшчына *f.*
muscular [ˈmʌskjələr] adj. 1. мýскульны: ***a muscular tissue*** мýскульная тканка; ***a muscular strain*** расцягнéньне мýскула. 2. мускулíсты, мóцны, дýжы: ***a muscular arm*** мускулíстая рукá
muscularity [ˌmʌskjəˈlærəti] n. мускулíстасьць *f.*
musculature [ˈmʌskjələtʃur] n. мускулятýра *f.*
muse [mju:z] n. мýза *f.*
muse [mju:z] v.i. 1. дýмаць, раздýмваць, разважáць; задýмвацца. 2. задумéнна глядзéць
museum [mjuˈzi:əm] n. музэ́й -ю *m.*
mushroom [ˈmʌʃru:m] – n. грыб -а *m.*, ***pl.*** грыбы́
– adj. 1. як грыб, грыбны́: ***mushroom soup*** грыбны́ суп. 2. ***mushroom growth*** хýткі рост, хýткае разьвіцьцё
– v.i. 1. вéльмі хýтка расьці́. 2. сплю́шчвацца (*з аднагó бóку*)
mushy [ˈmʌʃi] adj. 1. мя́ккі, вя́зкі. 2. Informal млóсна сэнтымэнтáльны
music [ˈmju:zɪk] n. 1. мýзыка *f.* 2. нóты *pl.*: ***He plays without music*** Ён грáе бяз нóтаў. б) музы́чны твор; ***to set to music*** пакла́сьці на мýзыку
musical [ˈmju:zɪkəl] – adj. 1. музы́чны: ***musical instruments*** музы́чныя інструмэ́нты. 2. мэляды́чны, мілагýчны (*гóлас, верш*). 3. музыкáльны, здóльны да мýзыкі
– n. мю́зікл -у *m.*, музы́чная камэ́дыя
music hall канцэ́ртная зáля
musician [mjuˈzɪʃən] n. музы́кла -і *m.*, музыкáнт -а *m.*
musing [ˈmju:zɪŋ] adj. задýманы, летуцéнны, паглы́блены ў дýмкі *абó* мáры
musk [mʌsk] n. 1. мýскус -у *m.* (*пахýчае рэ́чыва*). 2. мýскусны пах
musket [ˈmʌskɪt] n. мушкéт -а *m.*
musketeer [ˌmʌskəˈtɪr] n. мушкецёр -а *m.*
muskmelon ды́ня *f.*
muskrat [ˈmʌskræt] – n., pl. **-rats** or coll. **-rat** 1. хахýля *f.* 2. хахýлевае фýтра
– adj. хахýлевы
musky [ˈmʌski] adj. мýскусны: ***a musky odor*** мýскусны пах
Muslim [ˈmʊzlɪm] – n. мусульмáнін-а *m.*, мусульмáнка *f.*
– adj. мусульмáнскі
mussel [ˈmʌsəl] n., марскі малю́ск, мі́дыя *f.*
must I [mʌst] – v.i. мýсіць: ***Man must eat to live*** Чалавéк мýсіць éсьці, каб жыць; ***You must have that book*** Ты мýсіш мець гэ́тую кні́гу; ***You must have heard about it*** Вы напэ́ўна чýлі пра гэ́та
– n. абавя́зак -ку *m.*, неабхóднасьць *f.*: ***This rule is a must*** Гэ́тае прáвіла абавязкóвае
– adj. патрэ́бны, неабхóдны: ***a must item*** неабхóдная рэч
must II [mʌst] – n. зáтхласьць *f.* (*падвáльнага павéтра*); зáтхлы, гнілы́ пах
– v. рабі́ць (-ца) зáтхлым
mustache, *тс.* **moustache** [ˈmʌstæʃ] n. вýсы *pl. of* вус -а *m.*
mustard [ˈmʌstərd] n. 1. гарчы́ца *f.* 2. цёмна-жóўты кóлер
mustn't [ˈmʌsənt] = **must not**
musty [ˈmʌsti] adj. 1. зáтхлы; тýхлы: ***a musty room*** зáтхлы пакóй; ***musty crackers (grains)*** тýхлыя сухары́ (збóжжа). 2. чэ́рствы (*хлеб*); састарэ́лы (*закóн*). 3. тупы́, апаты́чны: ***a musty old fellow*** апаты́чны стары́
mutable [ˈmju:təbəl] adj. 1. зьмéнлівы. 2. няўстóйлівы, нястáлы (*пра чалавéка*)
mutate [ˈmju:teɪt] v.t. 1. зьмяня́ць; перамяня́ць. 2. Biol. выклікáць мутáцыю (*у жывёліны ці расьлíны*). 3. Phon. зьмяня́цца умля́ўтам
mute [mju:t] – adj. 1. маўклі́вы, ці́хі. 2. нямы́. 3. (*пра лíтару*) якáя не вымаўля́ецца
– n. 1. нямы́ -óга *m.*, нямáя *f.* 2. невымаўля́ная лíтара
mutilate [ˈmju:təleɪt] v.t. 1. нявéчыць; калéчыць, абязьвéчваць. 2. псавáць

mutilated [ˈmju:təleɪtəd] adj. зьнявéчаны, пакалéчаны

mutilation [ˌmju:təlˈeɪʃən] n. 1. зьнявéчваньне *n.* 2. зьнявéчаньне, калéцтва *n.*

mutineer [ˌmju:tənˈɪr] n. бунтáр -á *m.*

mutinous [ˈmju:tənəs] adj. бунтáрны, бунтáрскі, бунтаўнíчы

mutiny [ˈmju:təni] n., pl. **-nies** бунт -у *m.*; паўстáньне, непадпарáдкаваньне *n.*
– v.i. бунтавáцца

mutter [ˈmʌtər] – v.i. 1. мармытáць. 2. бурчэ́ць (*незадавóлена*)
– n. мармытáньне, бурчэ́ньне *n.*

mutton [ˈmʌtən] n. 1. барáніна *f.* 2. барáн -á *m.*

mutual [ˈmju:tʃuəl] adj. 1. узаéмны: ***mutual promises*** узаéмныя абяцáньні; ***mutual help*** узаéмная дапамóга; ***mutual enemies*** узаéмныя вóрагі. 2. Informal супóльны: ***our mutual friend*** наш супóльны ся́бра. 3. саўдзéльны: ***a mutual company*** саўдзéльная фінáнсавая кампáнія

mutuality [ˌmju:tʃuˈæləti] n. узаéмнасьць *f.*

mutually [ˈmju:tʃuəli] adv. узаéмна

muzzle [ˈmʌzəl] – n. 1. мóрда *f.* (*жывёліны*). 2. намóрднік -а *m.* 3. дýла *n.* (*у стрэ́льбе*) рýля *f.*
– v.t. 1. надзéць намóрднік. 2. прымýсіць маўчáць, забараніць вóльна выкáзвацца
• ***put a muzzle on*** забараніць свабóдна выкáзвацца

my [maɪ] adj. мой, мая́, маё; маé *pl.*; свой, свая́, сваё; сваé *pl.*: ***my house*** мой дом; ***my book*** мая́ кнíга; ***my pen*** маё пярó; ***my children*** маé дзéці

myriad [ˈmɪriəd] – n. 1. мірыя́ды *pl. only*; незьлічóная кóлькасьць: ***myriads of stars*** мірыя́ды зóрак. 2. дзéсяць тысячаў
– adj. 1. незьлічóны. 2. дзесяцітысячны

myrrh [mɜ:r] – n. мíра *n.*
– adj. мíравы

myrtle [ˈmɜ:rtəl] – n., Bot. мірт -у *m.*
– adj. мíртавы

myself [maɪˈself] pron., pl. **ourselves** 1. сябé, -ся: ***I washed myself*** Я памыўся. 2. сам: ***I myself will go*** Я сам пайдý; ***I am not myself today*** Я сам ня свой сёньня

mysterious [mɪˈstɪriəs] adj. 1. таéмны, таямнíчы; загáдкавы. 2. незразумéлы, недастýпны (*рóзуму*)

mystery [ˈmɪstri] n., pl. **-teries** 1. таямнíца *f.*: ***to make a mystery of*** рабíць таямніцу з чагó-н. 2. сакрэ́тнасьць *f.* 3. дэтэктыўны раман. 4. таéмства *n.*, рэлігíйны абрáд

mystery play містэ́рыя *f.* (*рэлігíйная драма на бібліíйныя сюжэ́ты*)

mystification [ˌmɪstɪfɪˈkeɪʃən] n. наўмы́снае ўвядзéньне ў зман, містыфікáцыя *f.*; ашалóмленасьць, зьбянтэ́жанасьць, загáдкавасьць *f.*

mystify [ˈmɪstɪfaɪ] v., **-fied, -fying** 1. ашаламляць, наўмы́сна ўвóдзіць у зман, містыфікавáць. 2. рабíць таямнíчым, загáдкавым

myth [mɪθ] n. 1. міт -у *m.* 2. нéшта няíснае, вы́думаная асóба *абó* рэч; вымыслел -лу *m.*

mythic [ˈmɪθɪk] or **mythical** [ˈmɪθɪkəl] adj. 1. мітычны. 2. несапрáўдны, вы́думаны; уя́ўны, уя́ўлены

mythological [ˌmɪθəˈlɑ:dʒɪkəl] adj. міталягíчны

mythology [mɪˈθɑ:lədʒi] n., **-gies** міталéгія *f.*

N

N or **n** [en] n.,pl. **N's** or **n's** 1. *чатырна́цатая лі́тара ў анге́льскім альфабе́це.* 2. Math. неазнача́льная велічыня́

nab [næb] v. **(-bb-)** Sl. 1. злавіць. 2. ца́пнуць, хапану́ць; арыштава́ць

nag [næg] v. **(-gg-)** 1. дайма́ць *каго́*, дапяка́ць *каму́* папро́камі *або́* прыдзі́ркамі, пілава́ць *каго́* за *што.* 2. бесперапы́нна чапля́цца да *каго́*

nagger [ˈnægər] n. 1. прыча́па, прыдзі́ра *m. & f.* 2. буркуно́н -а́ *m.*, буркуно́ха *f.*

nagging [ˈnægɪŋ] – n. чапля́ньне, бурча́ньне, ныцьцё *n.*
– adj. 1. прыча́плівы, прыдзі́рлівы. 2. дакуно́члівы: ***nagging pain*** ста́лы дакуно́члівы боль

nail [neɪl] – n. 1. цьвік -а́ *m.* 2. пазно́гаць -ця, но́гаць -ця *m.*, кі́пець -ця *m.*: ***hard as nails*** а) мо́цны; загартава́ны; у до́брай фізычнай фо́рме (*пра спарто́ўца*). б) бязьлі́тасны, лю́ты
• ***hit the nail on the head*** зразуме́ць слу́шна, тра́піць у са́мую кро́пку
– v.t. прыбіва́ць цьвіко́м

naive [naɪˈiːv] adj. 1. наі́ўны, непасро́дны. прастаду́шны. 2. прасьцякава́ты, праста́ваты

naivete [naɪˈiːvəteɪ] n. 1. наі́ўнасьць, непасро́днасьць *f.* 2. наі́ўны ўчы́нак *або́* пыта́ньне

naked [ˈneɪkɪd] adj. 1. го́лы, аго́лены: а) ***naked fields*** аго́леныя палі́. б) ***a naked sword*** аго́лены (*вы́няты з но́жнаў*) меч. в) ***naked eye*** го́лае (*без акуля́раў, мікраско́пу*) во́ка. 2. чы́сты: ***the naked truth*** чы́стая пра́ўда

name [neɪm] – n. 1. імя́ *n.*, назо́ў -ву *m.*, на́звa *f.*: ***His name is Johnny*** Яго́нае імя́ — Янка; ***in the name of ...*** а) у імя́ *каго́-чаго́* б) ад імя́ *каго́*; на чыё-н. імя́: ***He bought the car in the name of his wife*** Ён купіў машы́ну на імя́ сваёй жо́нкі; ***name of the river*** назо́ў ракі́. 2. про́зьвішча *n.*: ***to know only by name*** ве́даць то́лькі па чу́тках. 3. рэпута́цыя, сла́ва *f.*: ***He is proud of his good name*** Ён ганары́цца сваёй до́брай рэпута́цыяй; ***to call names*** ла́яць абзыва́ць (*благі́мі сло́вамі*)
– v.t. 1. зваць; называ́ць *каго́-што*; дава́ць імя́ *каму́-чаму́*: ***to name a newborn baby*** даць імя́ нованаро́джанаму дзіця́ці; ***Three persons were named in the report*** Тры асо́бы былі назва́ныя ў справазда́чы; ***to name after*** называ́ць у го́нар *каго́-чаго́*; ***Can you name these flowers (birds)?*** Ці ты ве́даеш назо́вы гэ́тых кве́так (птуша́к)? 2. а) прызнача́ць (*да́ту чаго́-н.*); ***to name the day*** прызна́чыць дзень. б) ***name a price*** скажы́ цану́. 3. прызнача́ць на стано́вішча

named [neɪmd] adj. назва́ны

nameless [ˈneɪmləs] adj. 1. а) безыме́нны. б) анані́мны. 2. невыка́зны, невымо́ўны (*пра жада́ньне*). 3. агі́дны

(*пра злачы́нства*). 4. невядо́мы; малавядо́мы (*напр. маста́к*)

namely [ˈneɪmli] adv. менаві́та

namesake [ˈneɪmseɪk] n. цёзка -і *m. & f.*

nanny [ˈnæni] n., **-nies,** Informal гувэрна́нтка, ня́нька *f.*

nap I [næp] – v.(**-pp-**) 1. прыкархну́ць, задрама́ць. 2. ***to catch napping*** захапі́ць *ка́го́* зьняна́цку, нечака́на *аба́* непадрыхтава́ным
– n. дрымо́та *f.*, перасо́нак -ку *m.*

nap II [næp] n. ворс-у *m.* (*на тканіне*)

nape [neɪp] n. ка́пак -ка *m.*

naphthalene or **naphthaline** [ˈnæfθəli:n] n. нафтали́н -у *m.*

napkin [ˈnæpkɪn] n. 1. сурвэ́тка *f.* 2. Brit. дзіця́чая пялю́шка

nappy [ˈnæpi] n. Brit. дзіця́чая пялю́шка

narcissus [nɑ:rˈsɪsəs] n., pl. **-cissuses, -cissi** нарцы́с -а *m.*

narcosis [nɑ:rˈkousəs] n. 1. зьняме́ньне, здранцьве́ньне *n.*; нячу́ласьць *f.* 2. нарко́з -у *m.*

narcotic [nɑ:rˈkɑ:tɪk] – n. нарко́тык -у *m.*, болепато́льны *аба́* снатво́рны сро́дак
– adj. наркаты́чны

narrate [ˈnæreɪt] v. апавяда́ць, раска́зваць (*ка́зкі*)

narration [nærˈeɪʃən] n. 1. раска́з, апо́вед, ро́спавед -у *m.*, раска́званьне *n.* 2. перака́з -у *m.* 3. апавяда́ньне *n.* (*каро́ткі твор*); справаздача *f.*; пералі́к падзе́яў

narrative [ˈnærətɪv] – n. 1. апавяда́ньне *n.* 2. раска́званьне *n.*
– adj. апавяда́льны

narrow [ˈnærou] – adj. 1. вузкі́, вузе́ньскі; нешыро́кі; це́сны (*прахо́д і пад.*). 2. ледзь магчы́мы ***a narrow victory*** ледзь здабы́тая перамо́га. 3. нязна́чны ***a narrow majority*** нязна́чная бальшыня́. 4. вузкі, абмежава́ны; неталера́нтны (*напр. ро́зум*). 5. ве́льмі дакла́дны, пі́льны, ува́жлівы: ***a narrow scrutiny*** ве́льмі дакла́днае й ува́жнае дасьле́даваньне. 6. цяжкі ***to live in narrow circumstances*** жыць у цяжкі́х абста́вінах
– n. ***narrows*** ву́зкая ча́стка ракі́, прато́кі; цясьні́на *f.*
– v. звужа́ць (-ца)

narrow gauge вузкакале́йка *f.*

narrow-minded [ˌnærouˈmaɪndɪd] adj. абмежава́ны, недалёкі; прадузя́ты

narrowness [ˈnæroʊnəs] n. ву́зкасьць *f.*; абмежава́насьць *f.*

nasal [ˈneɪzəl] – adj. 1. насавы́: ***nasal catarrh*** насавы́ ка́тар. 2. гугня́вы. 3. Phon. насавы́ (*пра гук*).
– n. насавы́ гук

nasturtium [næˈstɜ:rʃəm] n. насту́рцыя, насту́рка *f.*

nasty [ˈnæsti] adj. 1. агі́дны, бру́дны (*пра пако́й, рабо́ту*). 2. мара́льна бру́дны, ні́зкі; непрысто́йны, паску́дны (*пра сло́вы*). 3. ве́льмі непрые́мны, благі́, ліхі; паску́дны (*пра надво́р'е, хваро́бу*): ***nasty weather*** благо́е надво́р'е. 4. з дрэ́ннай, паску́днай нату́рай; зласьлі́вы; капры́зны; невыно́сны для і́ншых; ***Don't be nasty*** Не капры́зь, Ня будзь зло́сны. 5. небясьпе́чны ***a nasty accident*** небясьпе́чны вы́падак

natality [neɪˈtæləti] n. нараджа́льнасьць *f.*

nation [ˈneɪʃən] n. 1. наро́д -у *m.*, на́цыя, наро́днасьць *f.* 2. на́цыя, дзяржа́ва *f.*: ***the nation*** краі́й -ю *m.*, краі́на *f.*

national [ˈnæʃənəl] adj. 1. нацыяна́льны; наро́дны: ***national assembly*** нацыяна́льная асамбле́я; ***national economy*** наро́дная гаспада́рка; ***national minority*** нацыяна́льная ме́ншасьць. 2. дзяржа́ўны: ***national laws*** дзяржа́ўныя зако́ны; ***national bank*** дзяржа́ўны банк. 3. усенаро́дны: ***a national disaster*** усенаро́днае бе́дзтва

nationalism [ˈnæʃənəlˌɪzəm] n. нацыяналі́зм -у *m.*

nationalist [ˈnæʃənəlɪst] n. нацыяналі́ст -а *m.*, нацыяналі́стка *f.*

nationalistic [ˌnæʃənəˈlɪstɪk] adj. нацыяналісты́чны

nationality [ˌnæʃəˈnæləti] n. нацыяна́льнасьць *f.*

nationalize [ˌnæʃənəˈlaɪz] v.t. 1. дава́ць грамадзя́нства, натуралізава́ць. 2.

нацыяналізава́ць (*банк*). 3. ператва-ра́ць у на́цыю

national park нацыяна́льны парк, запаве́днік -у *m.*

nation-wide [ˌneɪʃənˈwaɪd] adj. 1. агу́льнанацыяна́льны, агу́льнадзяржа́ўны, усеагу́льны: ***nation-wide election*** усеагу́льныя вы́бары. 2. усенаро́дны, агу́льнанаро́дны (*інтарэ́сы*)

native [ˈneɪtɪv] – n. 1. ураджэ́нец -ца *m.*, ураджэ́нка *f.*, ро́дам зь яко́й-н. мясцо́васьці: ***He is a native of Miensk*** Ён ро́дам зь Ме́нску. 2. мясцо́вы -ага *m.*, мясцо́вая *f.*, тубы́лец -ьца *m.*, тубы́лка *f.*; абарыге́н -а *m.*; аўтахто́н -а *m.*, (*пра чалаве́ка, жывёліну ці расьлі́ну*)

– adj. 1. ро́дны: ***one's native land*** свой ро́дны край; ***one's native language*** свая́ ро́дная мо́ва. 2. прыро́джаны (*пра здо́льнасьці, та́лент*); ***native courtesy*** прыро́джаная ве́тлівасьць. 3. аўтахто́нны (*пра культу́ру, звы́чаі*). 4. чы́сты, самаро́дны; ***native ore*** самаро́дак

native-born [ˌneɪtɪvˈbɔ:rn] adj. прыро́дны, ро́дам зь яко́е-н. мясцо́васьці, кра́ю, карэ́нны: ***a native-born Canadian*** карэ́нны кана́дзец

nativity [nəˈtɪvəti] n., pl. **-ties** нараджэ́нне; ме́сца нараджэ́ньня; ***the Nativity*** Каля́ды, Нараджэ́ньне ХрыстО́ва

natural [ˈnætʃərəl] adj. 1. прыро́дны, натура́льны: ***natural beauty*** прыро́днае харастВО́; ***Coal and oil are natural products*** Ву́галь і на́фта — прыро́дныя прадУ́кты; ***natural resources*** прыро́дныя бага́цьці; ***natural ability*** прыро́дныя здо́льнасьці; ***natural death*** натура́льная сьмерць; ***natural phenomena*** прыро́дныя зья́вы. 2. сапра́ўдны, натура́льны: ***natural flowers*** жывы́я кве́ткі; ***a natural manner*** свабо́дныя паво́дзіны; ***in a natural manner*** натура́льна, про́ста, свабо́дна. 3. ***the natural science*** прыро́дазна́ўства *f.* 4. ***a natural child*** бясшлю́бна ро́джанае дзіця́; ***a natural son*** пабо́чны сын. 5. натуралісты́чны: ***The picture looked natural*** Карці́на выглядала натуралісты́чна

natural calamity нава́ла *f.*

natural gas прыро́дны газ

naturalist [ˈnætʃərəlɪst] n. 1. прыро́дазна́ўца -ы *m. & f.* 2. натура́ліст -а *m.*, натура́лістка *f.* (*маста́к, пісьме́ньнік*)

naturalistic [ˌnætʃərəˈlɪstɪk] adj. натуралісты́чны

naturalize [ˈnætʃərəlaɪz] v.t. 1. натуралізава́ць (-ца), дава́ць (атры́мваць) пра́ва грамадзя́нства. 2. запазыча́ць (*чужы́я сло́вы, звы́чаі*)

naturally [ˈnætʃərəli] adv. 1. натура́льна. 2. па хара́ктару, па нату́ры, па прыро́дзе. 3. вядо́ма, зразуме́ла, безумо́ўна

natural number цэ́лы лік

natural philosophy прырадаве́дныя нау́кі

natural selection натура́льны адбо́р

nature [ˈneɪtʃər] n. 1. прыро́да *f.* 2. нату́ра *f.*, інсты́нкт -у *m.*: ***against nature*** ненатура́льна, ненарма́льна. 3. рэчаі́снасьць, сапра́ўднасьць, рэа́льнасьць *f.*: ***true to nature*** зго́дна з рэчаі́снасьцю. 4. хара́ктар -у *m.*, нату́ра *f.*; уласьці́васьць *f.*: ***She is a gentle nature*** Яна́ ма́е лаго́дны хара́ктар; ***good nature*** дабрадУ́шнасьць, сардэ́чнасьць, лаго́днасьць *f.* 5. гату́нак -ку *m.*; ***by nature*** па прыро́дзе (нату́ры, хара́ктары)

naught [nɔ:t] n. ніштО́, нічО́га; нуль -я́ *m.*

naughtiness [ˈnɔ:tməs] n. свавО́льнасьць, непаслухмя́насьць, капры́знасьць *f.*

naughty [ˈnɔ:ti] adj. 1. благі́; непаслухмя́ны, свавО́льны. 2. непрыстО́йны

nausea [ˈnɔ:ziə] n. 1. мО́ташнасьць, млО́снасьць, млосьць *f.* 2. марска́я хваро́ба. 3. агі́да *f.*

nauseate [ˈnɔ:zieɪt] v. 1. а) выклікА́ць млО́сьць, нУ́дзіць. б) выклікА́ць марскУ́ю хваро́бу. 2. чУ́цца мО́ташна, млО́сна. 3. выклікА́ць агі́ду

nauseous [ˈnɔ:ʃəs] adj. 1. мО́ташны. 2. агі́дны

nautical [ˈnɔ:tɪkəl] adj. марскі́; марахО́дны: ***nautical mile*** марска́я мі́ля

naval [ˈneɪvəl] adj. 1. марскі, флёцкі: ***a naval officer*** марскі афіцэ́р. 2. ***naval forces*** ваéнна-марскія сíлы (*дзяржáвы*)

nave I [neɪv] n. нэф -а *m.*, нáва *f.* (*царквы́*)

nave II [neɪv] n. калóдка кóла

navel [ˈneɪvəl] n. 1. пуп пу́па *m.* 2. сярэ́дзіна *f.*, цэнтлар -ра *m.*

navigability [ˌnævɪgəˈbɪləti] n. марахóднасьць (*карабля́*); су́днахóднасьць *f.* (*ракí*)

navigable [ˈnævɪgəbəl] adj. 1. суднахóдны, прыдáтны для навігáцыі (*пра раку́*). 2. прыдáтны для марапла́ваньня (*пра карабе́ль*)

navigate [ˈnævɪgeɪt] v. 1. плáваць (*вадаплáвам*); лётаць (*самалётам*). 2. кіравáць (*вадаплáвам або́ самалётам*). 3. перавóзіць тавáры вóдным трáнспартам

navigation [ˌnævɪˈgeɪʃən] n. 1. марапла́ваньне *n.*, навігáцыя *f.* 2. караблевадж э́ньне *n.* (*навýка*)

navigator [ˈnævɪgeɪtər] n. 1. навігáтар, марахóд -а *m.* 2. штýрман -а *m.*

navy [ˈneɪvi] n., **-vies** ваéнна-марскí флёт: ***the Royal Navy*** брытáнскі флёт

navy blue цёмна-сíні

Nazi [ˈnɑ:tsi] n. нацы́ст -а *m.*, нацы́стка *f.*

near [nɪr] – adv. 1. блíзка; недалёка: ***Christmas is near*** Калядý ўжо недалёка; ***near-allied tribes*** блíзка параднёныя плямёны. 2. каля́, блізý: ***near a year*** блізý год, каля́ гóду

– adj. 1. блíзкі, блізкí: ***a near friend*** блíзкі ся́бра; ***a near relative*** блíзкі сваяк. 2. карóткі, прóсты: ***Go by the nearest route*** Ідзí найкарацéйшай дарóгай. 3. блíзкі, падóбны: ***near translation*** перакла́д блíзкі да арыгіна́лу

– prep. 1. блíзка, каля́, паблíзу: ***near the river*** каля́ рэ́чкі

– v. набліжа́цца: ***to near the land*** набліжа́цца да бе́рагу

• ***near at hand*** а) пад рукóю. б) не за гарáмі

nearby [ˌnɪrˈbaɪ] – adj. блíзкі, сусéдзкі

– adv. паблíзу, непадалёку

nearly [ˈnɪrli] adv. 1. амáль, блізý: ***I nearly missed the train*** Я амáль спазьнíўся на цягнík. 2. блíзка: ***nearly related*** блíзка парóдненыя; ***not nearly*** зусім не, і ня блíзка

nearness [ˈnɪrnəs] n. блíзкасьць, блізíня *f.*

near-sighted [ˈnɪrsaɪtɪd] adj. блізарýкі

neat [ni:t] adj. 1. старáнна прыбráны, чы́сты (*пакóй*). 2. аха́йны, акурáтны (*чалавéк, вóпратка*): ***neat handwriting*** акурáтны пóчырк; ***neat dress*** сьціплая, але прыгóжая сукéнка. 3. спры́тны: ***neat trick*** спры́тны фóкус. 4. Informal прыéмны, вясёлы: ***neat party*** прыéмная вечары́на. 5. чы́сты, неразьвéдзены: ***neat drink*** неразьвéдзенае пітвó

necessarily [ˌnesəˈserəli] adv. 1. канéчна, кóнча; абавязкóва, неабхóдна. 2. як няўхíльны вы́нік: ***it is not necessarily*** не канéчна, не абавязкóва

necessary [ˈnesəseri] – adj. неабхóдны; абавязкóвы, канéчна патрэ́бны; няўхíльны: ***Death is a necessary end*** Сьмерць — няўхíльны канéц

– n., **-saries** 1. неабхóднае *n.*, прадмéты пéршай неабхóднасьці: ***Food, clothing, and shelter are necessaries of life*** Ежа, вóпратка й жытлó — прадмéты пéршай жыцьцёвай неабхóднасьці. 2. ***the necessary*** а) грóшы. б) прыбірáльня *f.*, туалéт -а *m.*

necessitate [nəˈsəsɪteɪt] v. рабíць неабхóдным, патрабава́ць, вымага́ць *чаго́*: ***His broken leg necessitated an operation*** Ягóная зламáная нагá вымагáла апэрáцыі

necessitous [nəˈsəsɪtəs] adj. вéльмі бéдны, у вялíкай бядзé *або́* нястáчы, галéчы

necessity [nəˈsəsəti] n., pl. **-ties** 1. патрэ́ба, канéчнасьць, неабхóднасць *f.*, неабхóдная рэч: ***Water is a necessity*** Вадá — неабхóдная рэч. 2. нястáча, галéча *f.*; бéднасьць *f.*: ***This poor family is in great necessity*** Гэ́тая бéдная сям'я́ цéрпіць вялíкія нястáчы

neck [nek] – n. 1. шы́я *f.*, ка́рлак -ку *m.*: ***to get it in the neck*** атрыма́ць па ка́рку, атрыма́ць наганя́й; пацярпе́ць. 2. каўнлёр -ярá *m.* (*кашу́лі*). 3. шы́йка *f.* (*бутэ́лькі, збанка́; пазванка́*). 4. Geogr. перашы́лек -йка *m.*, каса́ *f.*
• ***neck and neck*** галава́ ў галаву́, на адно́й лі́ніі (*бе́гчы і пад.*)
• ***neck or nothing*** або́ пан, або́ прапа́ў
• ***stick (one's) neck out,*** Informal рызыкава́ць, ста́віць сябе́ ў небяспе́ку неразу́мным дзе́яннем
– v.t., Sl. пе́сьціць, абдыма́цца, цалава́ць

necklace ['neklәs] n. кара́лі; залаты́ *або́* сро́бны ланцужо́к на шы́ю

necktie ['nektaɪ] n. га́льштук -а *m.*

necrology [nәk'rɑ:lәdʒi] n., **-gies** 1. некралёг -у *m.* 2. сьпіс памёрлых

nectar ['nektәr] n. нэ́ктар -у *m.*

need [ni:d] – n. 1. патрэ́ба *f.*: ***There is no need to hurry*** Нямá патрэ́бы сьпяшáцца. 2. а) бядá *f.* б) галéча, нястáча *f.*; бéднасьць *f.*; ***a friend in need*** ся́бра ў бядзе́
– v. 1. быць патрэ́бным, патрабава́ць: ***I need money*** Мне патрэ́бныя гро́шы. 2. му́сіць; павíнен: ***He need not go. Need she go?*** Ямý ня трэ́ба йсьці́. Ці трэ́ба ёй ісьці́? ***The book needs correction*** Кні́га патрабу́е карэ́кты; ***It needs to be done with care*** Гэ́та трэ́ба зрабíць асьцярóжна; ***You need not trouble yourself*** Вам нямá чагó турбава́цца. 3. цярпе́ць нястáчу: ***Give to those that need*** Дава́й тым, хто ў нястáчы

needle ['ni:dәl] n. 1. го́лка, іго́лка *f.* 2. а) вяза́льны прутóк. б) вяза́льны кручóк. 3. шпíль -я *m.*: ***needle of a compass*** стрэ́лка ко́мпаса. 4. іго́лка (*патэфо́нная, хво́йная, во́жыкава*)

needless ['ni:dlәs] adj. беспатрэ́бны, лíшні

needlessly ['ni:dlәsli] adv. лíшне

needlework ['ni:dәlwɜ:rk] n. шыцьцё, вышыва́ньне *n.*

needy ['ni:di] adj. бéдны, які́ жывé ў нястáчы; які́ патрабу́е

negate [nɪ'geɪt] v. пярэ́чыць; прызнава́ць нява́жным; касава́ць, анулява́ць

negation [nɪ'geɪʃәn] n. адмаўле́ньне *n.*, адмо́ва *f.*

negative ['negәtɪv] – adj. 1. адмо́ўны: ***negative particle*** адмо́ўе; ***negative electrode*** адмо́ўна зара́джаны электро́д. 2. Photogr. нэгаты́лў -ва *m.* 3. Med. нэгаты́ўны
– n. 1. адмаўле́ньне *n.*; адмо́ва *f.* 2. (*у дыску́сіі*) запярэ́чаньне *n.*, нязго́днасьць (*у ду́мках*). 3. адмо́ўны лік: ***the negative sign*** знак мíнус, адмо́ўны знак. 4. адмо́ўная я́касьць *або́* ры́са хара́ктару: ***He is a bundle of negatives*** У яго́ адны́ адмо́ўныя ры́сы. 5. Electr. адмо́ўны зара́д. 6. Photogr. нэгаты́лў -ва *m.* 7. вэ́та, *n. indecl.* зако́н вэ́та
– v. 1. адмаўля́ць, пярэ́чыць; галасава́ць супро́ць. 2. аспрэ́чваць, давóдзіць памылко́васьць *каго́-чаго́*. 3. рабíць бескары́сным, нэўтралізава́ць
• ***in the negative*** адмо́ўна; адмо́ўны

negativeness ['negәtɪvnәs] n. адмо́ўнасьць *f.*

negativism ['negәtɪvˌɪzәm] n. схíльнасьць да адмаўля́ньня, пярэ́чаньня; нэгатывíзм -у *m.*

neglect [nɪ'glekt] – v. 1. занядбо́ўваць; перастава́ць дбаць пра *каго́-што*; пакіда́ць бяз до́гляду: ***to neglect one's health*** занядба́ць сваё здаро́ўе. 2. закíдваць (*пра́цу, вучо́бу*); запуска́ць, пакіда́ць без ува́гі, апуска́ць. 3. прапушча́ць, прапуска́ць; забыва́ць: ***Don't neglect to water the plants*** Не забыва́й паліва́ць вазо́ны
– n. 1. занядба́ньне, занядбо́ўваньне *n.* (*абавя́зкаў, дзяцéй*), недагля́д -у *m.* 2. закíнутасьць, запу́шчанасьць, занядба́насьць *f.*: ***in a state of neglect*** у занядба́ным ста́не

neglected [nɪ'glektɪd] adj. занядба́ны, недагле́джаны: ***a neglected child*** недагле́джанае дзіця́; ***neglected studies*** закíнутая вучо́ба; ***a neglected***

house недагле́джаны дом; ***a neglected garden*** запу́шчаны гаро́д

neglectful [nɪ'glektfəl] adj. няўва́жны да *каго́-чаго́*; нядба́йны, неруплі́вы

negligence ['neglɪdʒəns] n. 1. нядба́льства, нядба́йства *n.*; няўва́га *f.* 2. нядба́йнасьць, абыя́кавасьць, няўва́жлівасьць *f.*

negligent ['neglɪdʒənt] adj. 1. няўва́жны (*да сваі́х абавя́зкаў*), нядба́йны: ***negligent in his dress*** неаха́йны ў во́пратцы. 2. занядба́ны; недагле́джаны; запу́шчаны

negligible ['neglɪdʒəbəl] adj. нязна́чны, яко́га мо́жна ня браць пад ува́гу

negotiable [nɪ'gouʃiəbəl] adj. які́ мо́жа быць прада́дзены, ку́плены, або́ перасасту́плены; прае́зны, прахо́джы, дасту́пны

negotiate [nɪ'gouʃieɪt] v.i. 1. ве́сьці перамо́вы, дамаўля́цца, дагаво́рвацца. 2. дамаўля́цца, пагаджа́цца на *што*. 3. прадава́ць. 4. Informal прае́хаць, прайсьці́

negotiation [nɪˌgouʃi'eɪʃən] n. вядзе́ньне перамо́ваў; перамо́вы *pl. only*: ***negotiations are under way*** вяду́цца перамо́вы

negotiator [nɪ'gouʃieɪtər] n. перамо́ўнік -а *m.*

Negro ['ni:grou] – n., **-groes** не́гар -а *m.*, нэгрыця́нка *f.*
– adj. нэгрыця́нскі

neigh [neɪ] – n. іржа́ньне *n.*
– v.i. іржа́ць

neighbor, Brit. **neighbour** ['neɪbər] – n. 1. суседзе́ -а *m.*; суседзе́дка *f.*, ***neighbors,*** coll. суседзі́. 2. бліжні -яга *m.*, бліжняя *f.*
– v.i. 1. жыць *або́* быць недалёка, па суседзтву. 2. прымыка́ць, прыляга́ць да *чаго́*; межава́цца з *чым*

neighborhood, Brit. **neighbourhood** ['neɪbərhud] – n. 1. суседзтва *n.* (*ме́сца*), бліскасьць *f.*: ***in the neighborhood of*** а) па-суседзку; паблі́зу, бліскa ад чаго́-н. б) каля́, прыбліз́на: ***in the neighborhood of 20 km.*** каля́ дваццацёх кілямэ́траў. 2. раён -у *m.*, вако́ліца *f.*: ***an attractive neighborhood*** прыго́жы, до́бры раён, прыго́жае ме́сца. 3. суседзі *coll.*: ***The whole neighborhood came to the party*** Усе́ суседзі прыйшлі́ на вечары́ну. 4. суседзкія дачыне́ньні: ***good neighborhood*** добрасуседзкія дачыне́ньні – adj. суседзкі; мясцо́вы

neighboring, Brit. **neighbouring** ['neɪbərɪŋ] adj. суседні; суме́жны

neighborly, Brit. **neighbourly** ['neɪbərli] adj. до́брасуседзкі; прыя́зны; тава́рыскі

neither ['ni:ðər] – conj. 1. ***neither ... nor*** ані́ ... ані́, ні ... ні: а) ***Neither you nor I will go*** Ані́ вы, ані́ я ня по́йдзем. б) ***I can neither eat nor sleep*** Не магу́ ні е́сьці, ні спаць. 2. таксама́ не: ***If you don't dance, neither will I*** Калі́ ты не танцу́еш, я таксама́ ня бу́ду
– adj. ніякі́, нівóдзін; ні той, ні другі́: ***Neither accusation is true*** Ні адно́, ні друго́е абвінава́чаньне ня ёсьць праўдзі́вае
– pron. нівóдзін: ***Neither of the accusations is true*** Нівóднае з абвінава́чаньняў ня ёсьць праўдзі́вае

neon ['ni:ɑ:n] n.. Chem. нэо́н -у *m.* (*газ*): ***neon sign*** нэо́навая рэкля́ма

nephew ['nefju:] n. пляме́ньнік -а *m.*

nerve [nɜ:rv] – n. 1. нэрв -а *m.*: ***to get on one's nerves*** нэрвава́ць каго́-н.; злава́ць, раздражня́ць. 2. сі́ла, энэ́ргія *f.*: ***to strain every nerve*** напру́жваць усе́ сі́лы. 3. адва́га *f.*, спако́йнасьць, упэ́ўненасьць у сабе́: ***to lose one's nerve*** спало́хацца; зьбянтэ́жыцца; стра́ціць упэ́ўненасьць у сабе́; ***a man of nerve*** чалаве́к з адва́гай. 4. Informal наха́бнасьць *f.*, наха́бства *n.*; грубія́нства *n.* 5. жы́лка (*у ліcьцях расьлі́наў і кры́лах насяко́мых*)
– v.t. дадава́ць сі́лы, бадзёрасьці *або́* адва́гі: ***to nerve oneself*** а) сабра́цца зь сі́ламі, сабра́ць усе́ сі́лы. б) набра́цца сьме́ласьці
• ***an attack of nerves*** нэрво́вы прыпа́дак

• ***nerves*** нэрво́васьць *f.*

nerveless [ˈnɜ:rvləs] adj. 1. кво́лы, ня-ду́жы; бясьсі́льны; без энэ́ргіі, мля́вы. 2. без адва́гі і вы́трыманасьці. 3. які́ ня ма́е нэрво́вае сыстэ́мы

nervous [ˈnɜ:rvəs] adj. 1. нэрво́вы: ***nervous system*** нэрво́вая сыстэ́ма; ***a nervous disease*** нэрво́вая хваро́ба. 2. нэрво́зны, нэрво́вы (*чалаве́к, сьмех*); неспако́йны, трывожны; нясьме́лы, палахлі́вы: ***Don't be nervous*** Не хвалю́йся

nervousness [ˈnɜ:rvəsnəs] n. нэрво́васьць *f.*; хвараві́тая ўра́жлівасьць

nervous breakdown нэрво́вае расстро́йства

nest [nest] – n. 1. гняздо́ *n.*: ***a nest of thieves*** зладзе́йскае гняздо́. 2. пту́шкі, зьвяры́ ці насяко́мыя, што жывуць у гнязьдзе́. 3. гру́па, набо́р аднаро́дных прадме́таў: ***a nest of drinking cups*** набо́р ку́бкаў да піцьця́ (*які́я ўвахо́дзяць адзі́н у адзі́н*)
– v. 1. віць гняздо́. 2. устаўля́ць (*у гняздо́, або́ як у гняздо́*)

nestle [ˈnesəl] v. 1. утуль на, выго́дна ўла́дзіцца або́ се́сьці. 2. туліцца, мясьці́цца. 3. прытулі́ць (-ца): ***to nestle up to one's mother*** прытулі́цца да ма́ці. 4. а) гнязьдзі́цца, мець гняздо́. б) будава́ць, віць гняздо́

nestling [ˈneslɪŋ] n. 1. маладо́е птушанё. 2. мало́е дзіця́тка

net I [net] – n. 1. се́тка *f.* 2. чыгу́начная се́тка, се́тка даро́г, кана́лаў. 3. па́стка *f.*
– v. 1. ***to net a fish*** злавіць ры́біну ў се́тку. 2. накрыва́ць се́ткай. 3. папа́сьці, уки́нуць мяч у се́тку

net II [net] – adj. чы́сты, не́та (*пра вагу́, прыбы́так*): ***net cash*** наяўныя гро́шы, наяўны разьлі́к; ***net cost*** сабе́кошт -у *m.*
– n. сабе́кошт -у *m.*, не́та вага́, чы́сты прыбы́так, дахо́д -у *m.*
– v. зарабля́ць; дава́ць чы́сты дахо́д

nettle [ˈnetəl] – n. крапіва́ *f.*
– v. раздражня́ць, злава́ць

network [ˈnetwɜ:rk] n. 1. се́тка *f.* 2. се́тка даро́гаў, кана́лаў. 3. Radio се́тка радыёпрысьляцы́йных устано́вак

neuter [ˈnu:tər] – adj. 1. Gram. ніякага ро́ду: ***"It" is a neuter pronoun*** "It" — займе́ньнік ніякага ро́ду. 2. Biol. бясполы. 3. нэўтра́льны
– n. 1. Gram. а) сло́ва *або́* фо́рма ніякага ро́ду. б) ніякі род. 2. Biol. бясполая жывёліна, расьлі́на *або́* насякомае; кастрава́ная жывёліна

neutral [ˈnu:trəl] – adj. 1. нэўтра́льны (*пра краі́ну*): ***a neutral port*** порт у нэўтра́льнай зо́не *або́* краі́не. 2. неазна́чаны: ***neutral color*** нэўтра́льны, шэрава́ты ко́лер. 3. бясполы
– n. нэўтра́льны чалаве́к, нэўтра́льная дзяржа́ва

neutrality [nuˈtræləti] n. 1. нэўтралітэ́т -у *m.*, нэўтра́льнасьць *f.*, неўмяша́ньне ў чыё-н. спра́вы, спрэ́чкі

neutralize [ˈnu:trəlaɪz] v.t. 1. нэўтралізава́ць: ***Alkalis neutralize acids*** Шчо́лачы нэўтралізу́юць кісло́ты. 2. рабі́ць нэўтра́льным. 3. аслабля́ць чый-н. уплы́ў, узьдзе́яньне

neutralization [ˌnu:trələˈzeɪʃən] n. нэўтралізацыя *f.*

never [ˈnevər] adv. 1. ніко́лі. 2. ні ў які́м вы́падку; ні ў які́м ра́зе; зусі́м не. 3. ***never mind*** не зьвярта́й ува́гі; нічо́га; нява́жна, пакі́нь
• ***never so*** зусі́м ня так

nevermore [ˌnevərˈmɔ:r] adv. ніко́лі больш

nevertheless [ˌnevərðəˈles] adv. тым ня менш; усё ж; нягле́дзячы на гэ́та

new [nu:] – adj. 1. но́вы. 2. малады́; сьве́жы: ***new potatoes*** маладая бу́льба. 3. і́ншы, ня той што ране́й: ***He is a new man now*** Ен цяпе́р і́ншы чалаве́к. 4. незнаёмы; нязвы́чны, нязвы́клы: ***a new country to me*** незнаёмая мне краі́на; ***new to the work*** яшчэ́ не прызвыча́ены да пра́цы. 5. но́вы, сучасны, апо́шні: ***new dances*** но́выя та́нцы. 6. дале́йшы, дадатко́вы: ***new information*** дале́йшая інфарма́цыя

– adv. но́ва; нядаўна, то́лькі што: ***new-mown hay*** то́лькі што ско́шанае се́на

newborn [ˈnu:bɔ:rn] adj. 1. нованаро́джаны: ***a new-born baby*** нованаро́джанае дзіця́тка. 2. адро́джаны, гато́вы пача́ць но́вае жыццё

New American асо́ба, яка́я нядаўна прыняла́ амэрыка́нскае грамадзя́нства

newcomer [ˈnu:ˌkʌmər] n. прыхад|зень -ня *m.*; новапрыбы́л|ы -а *m.*; прые́ж|джы -а *m.*

new-fashioned [nu:ˈfæʃənd] adj. нава-мо́дны, мо́дны

newly [ˈnu:li] adv. 1. нядаўна, но́ва: ***newly arrived*** новапрыбы́лы. 2. на́нава; зноў; ***a newly revived scandal*** на́нава ажы́лы скандал

newlywed [ˈnu:liwed] n. маладажо́н -а *m.*; малады́ -о́га *m.*, маладая́ *f.*, *pl.* малады́я

new moon маладзі́к -а́ *m.*

news [nu:z] n. 1. ве́стка, навіна́ *f.*: ***What is the news?*** Што но́вага? 2. паведамле́ньні аб бягу́чых падзе́ях у газе́це, ра́дыё *або́* тэлеві́зіі

• ***break the news*** паве́даміць навіну́

newscast [ˈnu:zkæst] – n. вы́пуск навін (*у ра́дыё або́ тэлеві́зіі*)

– v. перадава́ць навіны́ ў ра́дыё *або́* тэлеві́зіі

newscaster [ˈnu:zkæstər] – n. ды́ктар -а *m.*; ра́дыёкамэнта́тар -а *m.*

– adj. ды́ктарскі, ра́дыёкамэнта́тарскі

newsman [ˈnu:zmæn] n. 1. прадаве́ц газэ́таў, газэ́тчык. 2. а) супрацо́ўнік газэ́ты, журналі́ст -а *m.* б) радыёрэпарцёр -а *m.*

newspaper [ˈnu:zˌpeɪpər] n. газэ́та *f.*

newspaperman [ˈnu:zˌpeɪpərmæn] n., **-men** газэ́тны рэпарцёр; выда|ве́ц -ўца́ *m.*

newspaper office рэда́кцыя газэ́ты

newsreel [ˈnu:zri:l] n. кінахро́ніка *f.*

newsstand [ˈnu:zstænd] n. газэ́тны кіёск, ша́пік -а *m.*

New Testament Но́вы Запаве́т

New World Но́вы Сьвет (Амэ́рыка)

New Year or **New Year's** Но́вы Год, 1-га сту́дзеня

New Zealander [nuˈzi:ləndər] n. жы́хар Но́вае Зэля́ндыі, новазэля́нд|зец -ца *m.*

next [nekst] – adj. насту́пны; суме́жны, суседні: ***next room*** суме́жны пако́й; ***We'll catch the next train*** Мы пасьпе́ем на насту́пны цягні́к; ***the next house to ours*** дом суседні з на́шым; ***my next neighbor*** мой найбліжэ́йшы суседзь; ***next day*** наза́ўтра; ***next year*** нале́та

– adv. 1. пасьля́, затым: ***He is going to write a letter next*** Пасьля́ ён бу́дзе пісаць ліст. 2. па-суседзку, по́бач: ***He lives next door*** Ён жыве́ ў суседнім до́ме, у суседняй кватэ́ры. 3. ***(to)*** а) найбліжэ́й. б) ама́ль; бліз у́

next-door [ˌnekstˈdɔ:r] adj. суседні (*у суседнім до́ме*)

nib [nɪb] n. 1. ко́нчык -а *m.*, вастрыё *n.* 2. вастрыё пяра́ (*для пісаньня*). 3. дзю́ба *f.* (*у пту́шкі*)

nibble [ˈnɪbəl] – v.1. абгрыза́ць, шчыпа́ць, скуба́ць (*траву́*). 2. клява́ць, то́ркаць (*пра ры́бу*). 3. е́сьці мале́нькімі кава́лачкамі *або́* ма́ла. 4. атакава́ць, дро́бязна крытыкава́ць

– n. 1. куса́ньне, абгрыза́ньне *n.* 2. адку́шаны кава́лачак

nice [naɪs] adj. прыго́жы, прые́мны, мі́лы: ***It is not nice*** Гэ́та непрыго́жа; ***a nice face*** прые́мны, мі́лы твар; ***nice weather*** прые́мнае надво́р'е; ***a nice home*** прыго́жы дом. 2. ве́тлівы, ува́жлівы, до́бры: ***He was nice to us*** Ён быў ве́тлівы з на́мі. 3. даліка́тны; то́нкі; ***a nice problem*** даліка́тная спра́ва; ***a nice ear*** то́нкі слых; ***a nice distinction*** то́нкая ро́зьніца. 4. дакла́дны; перабо́рлівы, патрабава́льны: ***nice in his eating*** перабо́рлівы ў е́жы

nicely [ˈnaɪsli] adv. прыго́жа; прые́мна; ве́тліва, ува́жна

nicety [ˈnaɪsti] n., pl. **-ties** 1. дакла́днасьць, акура́тнасьць *f.*: ***Television sets require nicety of adjustment***

Тэлевізары вымагáюць дакладнай рэгулірóўкі. 2. тóнкасьць *f.*; нюáнс -у *m*: ***to a nicety*** якрáз; якрáз упóру

nick [nɪk] – n. зарýбка, засéчка, нарэ́зка *f.*; шчарбíна (*выбітая*): ***to cut nicks*** рабіць нарэ́зкі: ***in the nick of time*** якрáз упóру

– v. рабíць нарэ́зкі, засéчкі

nickel [ˈnɪkəl] – n. 1. нíкель -ю *m.* 2. пяцiцэ́нтавая манэ́та (*зробленая зь нікелю*)

– v. нікеляваць, пакрываць нíкелем

nickname [ˈnɪkneɪm] – n. мянýшка *f.*

– v. даваць мянýшку *камý*

niece [ni:s] n. плямéньніца *f.*

niggard [ˈnɪgərd] – n. скнáпа, жмíндза -ы *m. & f.*

– adj. скнáрлівы, скупы́

niggardly [ˈnɪgərdli] – adj. 1. скупы́, скнáрлівы. 2. малы́, мізэ́рны, скупы́; скýпа вы́дзелены: ***a niggardly gift*** мізэ́рны падарýнак

– adv. скýпа

night [naɪt] – n. 1. ноч *f.*: ***Good night!*** Дабранáч! ***by (at) night*** уночы́; пóначы; ***last night*** учóра ўвéчары; ***to have a good (bad) night*** дóбра (блáга) спаць уночы́. 2. цéмра *f.*; цéмень, цéмрадзь *f.*: ***to go forth into the night*** зьнíкнуць у цéмры нóчы. 3. змрок -у *m.*

– adj. начны́

night blindness курыная сьлепатá

nightfall [ˈnaɪtfɔ:l] n. зьмяркáньне *n.*, прыцемлак -ку *m.*, змрок -у *m.*, надыхóд нóчы: ***before nightfall*** зáвідна

nightgown [ˈnaɪtgaʊn] n. начнáя кашýля

nightingale [ˈnaɪtəŋgeɪl] n. салаўéй, -ўя́ *m.*

nightlong [ˌnaɪtˈlɔ:ŋ] – adj. усянóчны

– adv. усю́ ноч

nightly [ˈnaɪtli] adv. штонóчы, штóнач

nightmare [ˈnaɪtmer] n. 1. кашмáр -у *m.* 2. марá *f.*, прывíд -у *m.*; здань *f.*; наслáньнё *n.*

night school вячэ́рняя шкóла

night watch начнáя вáрта

nimble [ˈnɪmbəl] adj. 1. увішны́, жвáвы, шýстры; шпáркі. 2. кéмлівы, ця́млівы, хýткі на адкáз; разýмны: ***a nimble mind*** жывы́ рóзум

nimbus [ˈnɪmbəs] n., **-buses, -bi** 1. німб -а *m.* (*у сьвятых*); зьзя́ньне. 2. дажджавы́я аблóкі

nine [naɪn] – n., adj. 1. дзéвяць; дзевяцёра; дзевяцёх: ***nine books (cats)*** дзéвяць кніжак (катóў); ***nine children*** дзевяцёра дзяцéй; ***nine boys*** дзевяцёх хлапцóў; ***nine hundred*** дзéвяцьсот; ***nine-hundredth*** дзéвяцьсóты. 2. дзявя́тка *f.* а) кáрта для гульні́. б) камáнда зь дзевяцёх гульцóў

• ***the Nine*** Мýзы

ninefold [ˈnaɪnfoʊld] – adj. 1. дзевяціразóвы. 2. зь дзевяцёх чáстак, у дзéвяць стóлак

– adv. дзéвяць разóў бóльш

nineteen [ˌnaɪnˈti:n] n., adj. дзевятнáццаць

nineteenth [ˌnaɪnˈti:nθ] – adj. дзевятнáццаты: ***the nineteenth*** дзевятнáццатага (*дáта*)

– n. 1. дзевятнáццатая чáстка

ninetieth [ˈnaɪntiəθ] – adj. дзевянóсты

– n. дзевянóстая чáстка

ninety [ˈnaɪnti] n., **-ties** дзевянóста, дзевяцьдзеся́т

ninth [naɪnθ] – adj. дзявя́ты

– n. дзявя́тыы -ага *m.*, дзявя́тая *f.* 2. дзявя́тая чáстка

nip I [nɪp] – v. **(-pp-)** 1. шчыпáць (*і пра марóз*). 2. адкýсваць (*шчыпцамі*), адшчы́кваць. 3. бíць вéтрам; марóзіць (*марóзам*): ***to nip in the bud*** зьнíшчыць у зарóдку

– n. 1. шчыпóк -кá *m.* 2. рэ́зкі хóлад. 3. малы́ кавáлачак, кры́шачка *f.*

nip II [nɪp] n. малáя чáрачка: ***a nip of brandy*** чáрачка брэ́нды

nipple [ˈnɪpəl] n. 1. саclóк -кá, смóчлак -ка *m.* (*грудзéй*). 2. сóска *f.* (*дзіця́чая*)

nit [nɪt] n. гнíда *f.*

niter, Brit. **nitre** [ˈnaɪtər] n. салéтра *f.*

nitric [ˈnaɪtrɪk] adj. азóтны

nitric acid азóтная кіслатá

nitrogen [ˈnaɪtrədʒən] n. азóт -у *m.*

nitrogenous [naɪˈtrɑ:dʒənəs] adj. азóцісты, азóтны

no [nou] – n., pl. **noes** 1. запярэ́чаньне *n.*, адмо́ва *f.*: ***Two noes make a yes*** Два адмаўле́ньні ро́ўныя сьцьвярджэ́ньню; ***He will not take no (for an answer)*** Ён ня прыме адмо́вы. 2. галасы́ супро́ць; ты́я, што галасу́юць су́праць: ***the noes have it*** бальшыня́ су́праць
– adj. ніякі: ***for no reason*** безь ніякае прычы́ны; ***He has no friends*** Ён ня ма́е ніякіх сяброў
– adv. 1. не: ***No, I cannot*** Не, я не магу́. 2. ані́, зусі́м не: ***He is no better*** Ямý ані́ ня лепш; ***no less than*** ня менш, як
• ***by no means*** ніякім пара́дкам, ні ў я́кім ра́зе
• ***no doubt*** безумо́ўна, бясспрэ́чна
• ***no wonder*** ня дзі́ва

nobility [nou'biləti] n., pl. **-ties** 1. шля́хта *f.*, дварáнства *n.* 2. высакаро́днасьць *f.*

noble ['noubəl] – adj. 1. высо́кага пахо́джаньня, ро́ду. 2. высакаро́дны (*і пра мэта́лы*): ***a noble deed*** высакаро́дны ўчы́нак; ***Silver is a noble metal*** Срэ́бра— высакаро́дны мэта́л. 3. выда́тны; ве́лічны, велікапы́шны; імпаза́нтны
– n. чалаве́к высо́кага пахо́джаньня *або́* ра́нгу

nobleman ['noubəlmən] n., pl.**-men** шля́хціц, дваранíн -а *m.*, чалаве́к высо́кага ра́нгу

noblewoman ['noubəl,wumən] n., pl. **-women** шляхця́нка *f.*, жанчы́на высо́кага ра́нгу

nobody ['noubədi] – n., pl. **-bodies** нікчэ́мнасьць, чалаве́к-ніштó
– pron. ніхтó

nocturnal [nɑ:k'tɜ:rnəl] adj. начны́: ***a nocturnal bird (flower)*** начна́я пту́шка (кве́тка)

nocturne ['nɑ:ktɜ:rn] n. 1. Mus. накту́рн -у *m.* 2. начна́я сцэ́на (*карці́на*)

nod [nɑ:d] – v. **(-dd)** 1. ківа́ць галаво́й (*на знак прывіта́ньня, зго́ды, зага́ду*). 2. дзю́баць но́сам. 3. ківа́цца, хіста́цца: ***Trees nod in the wind*** Дрэ́вы хіста́юцца на ве́тры
– n. ківо́к галавы́

nodding ['nɑ:diŋ] adj. кіўко́вы: ***a nodding acquaintance*** павярхо́ўнае знаёмства

node [noud] n. 1. Bot. ву́зел -ла́ *m.* (*сьцябла́, кале́на*). 2. Phys. вузлавы́ пункт. 3. Med. наро́ст -а *m.*, патаўшчэ́ньне *n.* 4. Astron. пункт перасячэ́ньня арбі́таў. 5. Math. пункт перасячэ́ньня дзьвюх ліні́яў

Noël [nou'el] n. Каля́ды *pl.*

noël [nou'el] n. калядна́я пе́сьня, каля́дка *f.*

nohow ['nouhau] adv., Informal ніяк, ані́як; ніяк не; ніякім чы́нам

noise [nɔiz] n. шум, го́ман, зык -у *m.*: ***to make noise*** шуме́ць; гаманíць

noiseless ['nɔizləs] adj. бясшу́мны, ці́хі: ***a noiseless typewriter*** бясшу́мная друкава́льная машы́нка

noisome ['nɔisəm] adj. 1. агі́дны; мо́ташны, сьмярдзю́чы: ***a noisome slum*** сьмярдзю́чыя трушчо́бы. 2. шко́дны; нездаро́вы

noisy ['nɔizi] adj. 1. крыкліvы: ***a noisy boy*** крыкліvы хлапе́ц; ***a noisy quarrel*** крыкліvая сва́рка. 2. шумліvы, гаманкí (*пра ву́ліцу, таварыства*)

nomad ['noumæd] – n. 1. вандро́ўнік, качэ́ўнік -а *m.* 2. падаро́жны -ага *m.*, вандро́ўнік -а *m.*
– adj. 1. качавы́, вандро́ўны. 2. падаро́жніцкі, вандро́ўніцкі

nomadic [nou'mædik] adj. качавы́, качэ́ўны, качэ́ўніцкі (*пра лад, пле́мя, ю́рту*), вандро́ўны, вандро́ўніцкі: ***nomadic way of life*** вандро́ўны спо́саб жыцьця́, качэ́ўніцтва *n.*

nomenclature ['noumenkleitʃər] n. 1. намэнклату́ра *f.* 2. тэрміналёгія *f.*

nominal ['nɑ:mənəl] adj. 1. намінáльны. умо́ўны: а) ***a nominal head of a club*** намінáльны кіраўні́к клю́бу. б) ***a nominal price*** намінáльная цанá (*ве́льмі малáя*). 2. Gram. іме́нны

nominally ['nɑ:mənəli] adv. 1. намінáльна. 2. пайме́нна

nominate ['nɑ:mineit] v.t. 1. выстаўля́ць, вылучáць, прапанавáць кандыдáта (*на вы́барах*). 2. прызначáць на пасáду

nomination [ˌnɑ:mɪˈneɪʃən] n. 1. выстаўле́ньне кандыда́та (*на вы́барах*). 2. прызначэ́ньне на паса́ду

nominative [ˈnɑ:mənətɪv] – adj. назо́ўны: ***nominative case*** назо́ўны склон
– n. 1. назо́ўнік -а *m.* 2. сло́ва ў назо́ўным скло́не

nominee [ˌnɑ:mɪˈni:] n. 1. вы́стаўлены кандыда́т (*на вы́барах*). 2. асо́ба прызна́чаная на яку́ю-н. паса́ду

non- prefix *прыста́ўка, яка́я надае́ адмо́ўны сэнс* не-: ***non-edible*** непрыда́тны да яды́

nonacceptance [ˌnɑ:nəkˈseptəns] n. непрыма́ньне *n.*

nonaggression [ˌnɑ:nəˈgreʃən] n. ненападзе́ньне *n.*: ***a pact of nonaggression*** пакт аб ненападзе́ньні

nonalcoholic [ˌnɑ:nˌælkəˈhɔ:lɪk] безалькагО́льны (*пра напо́і*)

nonappearance [ˌnɑ:nəˈpi:rəns] n. незьяўле́ньне *n.* (*у суд*)

nonattendance [ˌnɑ:nəˈtendəns] n. наведваньне *n.*; адсу́тнасьць *f.*

nonbreakable [ˌnɑ:nˈbreɪkəbəl] adj. нябі́ткі

noncapital murder забо́йства, за яко́е не кара́юць сьме́рцю

nonchalant [ˌnɑ:nʃəˈlɑ:nt] adj. абыя́кавы, нядба́лы

noncombatant [ˌnɑ:nkəmˈbætənt] – n. 1. нестраявы́ -о́га *m.*, нестраявік -а́ *m.* (*напр. ле́кар, сястра́ міласэ́рнасьці ў во́йску*). 2. цывільны жы́хар у ча́се ва́йны́
– adj. нестраявы́; небаявы́; тылавы́: які́ ня ўдзе́льнічае ў баявы́х апэра́цыях

noncommissioned officer падафіцэ́р -а *m.*

noncompliance [ˌnɑ:nkəmˈplaɪəns] n. 1. непадпара́дкаваньне *n.* 2. непрыгры́мваньне; невыкана́ньне, незахава́ньне *n.*

nonconductor [ˌnɑ:nkənˈdʌktər] n. неправадні́к, дыэле́ктрык, ізаля́тар -а *m.*

nonconformist [ˌnɑ:nkənˈfɔ:rməst] n. 1. рэлігі́йны сэкта́нт. 2. нонканфарміст -а, іншадýмлец -ца, адшчапе́нец -ца, дысыдэ́нт -а *m.*

Nonconformist (*у Анге́льшчыне*) пратэста́нт, які́ не але́жыць да англіка́нскае царквы́

nondescript [ˌnɑ:ndɪˈskrɪpt] – adj. някі́дкі, непрыкме́тны, невыра́зны; неапіса́льны; непрыго́жы
– n. някі́дкі чалаве́к

none [nʌn] – pron. 1. ніякі, нівО́дзін: ***None of these is a typical case*** НівО́дзін з гэ́тых выпа́дкаў не тыпО́вы. 2. ніхто́, ніштО́: ***None have arrived*** Ніхто́ не прыйшО́ў; ***None of them knows it*** Ніхто́ зь іх ня ве́дае гэ́тага; ***This is none other but brass*** Гэ́та нічО́га і́ншага, як лату́нь
– adv. ані́, зусі́м не: ***Our supply is none too great*** Наш запа́с ані́ не завялі́кі; ***none the less*** тым ня менш

nonessential [ˌnɑ:nɪˈsenʃəl] – adj. неістО́тны
– n. неістО́тная асО́ба *або́* рэч; не́хта *або́* не́шта неістО́тнае

nonexistence [ˌnɑ:nɪgˈzɪstəns] n. 1. неіснава́ньне *n.* 2. не́шта ня́існае

nonintervention [ˌnɑ:nɪntərˈvenʃən] n. неўмяша́ньне -я *n.*

nonmoral [ˌnɑ:nˈmɔ:rəl] adj. амара́льны

nonpartisan [ˌnɑ:nˈpɑ:rtəzən] adj. 1. бестаро́ньні. 2. які́ не але́жыць да па́ртыі, беспартыі́йны, непартыі́йны

nonproductive [ˌnɑ:nprəˈdʌktɪv] adj. 1. непрадукцыі́йны. 2. не зьвя́заны непасрэ́дна з прадУкцыяй

nonresistance [ˌnɑ:nrɪˈzɪstəns] n. несупраціўле́ньне, непраціўле́ньне *n.*, паслЎнае падпара́дкаваньне

nonresistant [ˌnɑ:nrɪˈzɪstənt] – adj. непраціўленскі; які́ не супраціўля́ецца, пасЛўна падпара́дкуецца
– n. непраціўле́нец -ца *m.*

nonrestrictive [ˌnɑ:nrɪˈstrɪktɪv] adj. які́ не абмяжО́ўвае

nonsense [ˈnɑ:nsens] n. 1. бяссэ́нсіца, дурнО́та, лухта́ *f.*, Sl. 2. недарэ́чнасьць, бяссэ́нсавасьць, бязглу́зьдзіца *f.*

nonsensical [nɑ:n'sensɪkəl] adj. 1. недарэ́чны, бязглу́зды; бязмэ́тны; бяссэ́нсавы; абсу́рдны

non-stop [ˌnɑ:n'stɑ:p] – adj. беспрыпы́нкавы, бесьперасада́чны; безупы́нны – adv. без прыпы́нкаў; безупы́нна, бесьперастáнку

nonviolence [ˌnɑ:n'vaɪələns] n. безгвалто́ўнасьць, адсу́тнасьць гва́лту, неўжыва́ньне мэ́тадаў гва́лту

noodle I ['nu:dəl] n. макаро́н -а *m.*, ло́кшына *f.*

noodle II ['nu:dəl] n., Informal ду́рlань -ня *m.*, дурні́лlа -ы *m.*

nook [nʊk] n. 1. кут -а́ *m.*, кутlо́к -ка́ *m.*; заці́шны куто́чак; заку́тlак, закаву́лlак -ка *m.* 2. бу́хтачка *f.*

noon [nu:n] – n. по́ўдlзень, -ня *m.*: ***at noon*** апо́ўдні, пад по́ўдня – adj. паўднёвы

noose [nu:s] – n. 1. пятля́ *f.*, аркáн -а *m.* 2. па́стка *f.*, сілó *n.* – v.t. 1. рабíць, завя́зваць пятлю́. 2. лавíць сілóм *або́* аркáнам; лавíць у па́стку

nor [nɔ:r] conj. і не; таксáма не; (а)ні́ ... (а)ні́: ***Not a boy nor a girl stirred*** Ні хлапе́ц, ні дзяўчына не варухну́ліся; ***Neither hot nor cold*** Ні го́рача, ні хо́ладна

norm [nɔ:rm] n. но́рма *f.*; мадэ́ль *f.*, узо́р -у *m.*

normal ['nɔ:rməl] – adj. 1. нармáльны; звычáйны; рэгуля́рны. 2. Geom. пэрпэндыкуля́рны – n. 1. нармáльны стан, тып *або́* ўзо́р: ***two pounds above normal*** два фу́нты вышэ́й за нармáльную вагу́. 2. пэрпэндыкуля́р -а *m.*

north [nɔ:rθ] – n. по́ўнач *f.* – adj. паўно́чны: ***North China*** Паўно́чны Кітáй – adv. 1. на по́ўнач: ***Their trip north was long*** Іхнае падаро́жжа на по́ўнач трывáла до́ўга. 2. апо́ўначы

North American – adj. паўно́чнаамэрыкáнскі – n. жы́хар Паўно́чнае Амэ́рыкі

northeast [ˌnɔ:rθ'i:st] – adj. паўно́чна-ўсхо́дні, паўно́чны ўсхо́д: ***a northeast wind*** паўно́чна-ўсхо́дні ве́цер – n. 1. а) паўно́чна-ўсхо́дні кіру́нак. б) паўно́чна-ўсхо́дняя ча́стка кра́ю – adv. 1. на паўно́чны ўсхо́д. 2. з паўно́чнага ўсхо́ду. 3. на паўно́чным усхо́дзе

northeastern [ˌnɔ:rθ'i:stərn] adj. паўно́чна-ўсхо́дні

norther ['nɔ:rðər] n. мо́цны паўно́чны ве́цер

northerly ['nɔ:rðərli] – adj. паўно́чны – adv. 1. на по́ўнач. 2. з по́ўначы

northern ['nɔ:rðərn] adj. паўно́чны: ***northern lights*** паўно́чнае зьзя́ньне

northernmost ['nɔ:rðərnmoust] adj. са́мы паўно́чны, найбо́льш паўно́чны

northward ['nɔ:rθwərd] – adj. паўно́чны, з паўно́чнага бо́ку: ***the northward slope of a hill*** паўно́чны схон узго́рка – n. по́ўнач *f.*

northwardly ['nɔ:rθwərdli] – adj. 1. скіраваны на по́ўнач. 2. (*пра ве́цер*) з паўно́чнага за́ходу – adv. на по́ўнач

northward(s) ['nɔ:rθwərdz] adv. на по́ўнач

northwest [ˌnɔ:rθ'west] – adj. паўно́чна-захо́дні: ***a northwest wind*** паўно́чна-захо́дні ве́цер – n. 1. паўно́чны за́хад. 2. ***the Northwest*** (*у Кана́дзе*) Тэрыто́рыя, што ляжы́ць на паўно́чны за́хад ад Вялі́кіх Азёраў; (*у ЗША*) паўно́чна-захо́дняя штаты - Вашынгто́н, О́рэган і А́йдага – adv. 1. на паўно́чны за́хад. 2. з паўно́чнага за́ходу. 3. на паўно́чным за́ходзе

northwesterly [ˌnɔ:rθ'westərli] adj. 1. у паўно́чна-захо́днім кіру́нку. 2. (*пра ве́цер*) з паўно́чнага за́ходу

northwestern [ˌnɔ:rθ'westərn] adj. паўно́чна-захо́дні

nose [nouz] – n. 1. нос -а *m.*; дзю́ба (*у птýшкі*): ***to blow one's nose*** смарка́цца, вы́смаркацца. 2. нюх -у *m.*: ***a***

dog with a good nose сабáка з дóбрым нюхам. 3. чуцьцё *n.*, кéмлівасьць *f.* 4. нос (*пярэ́дняя ча́стка карабля́, самалёта*)

– v. 1. а) вынюхваць, знахóдзіць па пáху. б) разнюхваць, распазнавáць нюхам: ***to nose out*** давéдвацца пра што-н. тайкóм. 2. нюхаць. 3. асьцярóжна прасóўвацца напéрад (*пра ваплáў*); разразáць нóсам хвáлі

• ***count noses*** лічы́ць прысýтных

• ***follow one's nose*** а) ісьці́ прóста напéрад. б) кіравáцца нюхам, чуцьцём *абó* інсты́нктам

• ***lead by the nose*** вадзíць за нос

• ***on the nose*** дакладна

• ***poke one's nose into*** сóваць нос *куды́*, умéшвацца не ў сваю́ спрáву

• ***turn up one's nose at*** адвярнýць нос (*пастáвіцца да чагó-н. з пагáрдай*)

• ***under one's nose*** пад нóсам, блізка, пóбач; лёгка ўбáчыць, прыкмéціць

nosebleed ['nouzbli:d] n. крывацёк з нóсу

nosedive ['nouzdaiv] – n. 1. пікíраванне *n.* (*самалёта*). 2. раптóўны спад (*цэ́наў*)

– v. 1. пікíраваць. 2. раптóўна зніжáцца (*пра цэ́ны, узрóвень чагó-н.*)

nosey or **nosy** ['nouzi] adj. цікáўны, пранырлівы; хто сýне нос куды́ ня трэ́ба

nostalgia [nɑ:'stældʒə] n. настальгíя *f.*

nostalgic [nɑ:'stældʒik] adj. 1. які́ тýжыць па бáцькаўшчыне. 2. настальгíчны (*настрóй*)

nostril ['nɑ:strəl] n. нóздра *f.*

not [nɑ:t] adv. не: ***That is not true*** Гэ́та няпрáўда; ***I do not know*** Я ня вéдаю; ***not at all*** ані́, зусíм не, аніяк не

notable ['noutəbəl] – adj. 1. славýты, выдáтны, знакамíты; вáрты ўвáгі; асаблíвы: ***a notable painter (man)*** выдáтны мастáк (чалавéк); ***a notable event*** славýтая падзéя. 2. знáчны: ***a notable quantity*** знáчная кóльказьць

– n. вáжны *абó* выдáтны чалавéк

notary ['noutəri] n., pl. **-ries** натáрыюс -а *m.*

notch [nɑ:tʃ] – n. 1. знак -у *m.*; мéтка, засéчка, зарýбка *f.*; зарýбіна *f.* 2. цясьнíна *f.* (*паміж гарáмі*), перавáл -у *m.* 3. ступéнь *f.*, узрóвень -ўню *m.*

– v. засякáць (*мéткі, знáкі*), рабіць зарýбкі

note [nout] – n. зáпіс -у *m.*, зáцемка, тáтка *f.* 2. увáга *f.* 3. заўвáга, нóска, спасы́лка *f.* 4. запíска *f.* 5. (*дыпляматы́чная*) нóта. 6. нóта *f.* 7. птушы́ны сьпеў *абó* крык. 8. пéсьня, мэлёдыя *f.* 9. расьпíска *f.* (*дакумэ́нт*). 10. банкнóт -а *m.*, бáнкаўскі білéт

– v. 1. запíсваць. 2. увáжна глядзéць, уважáць, заўважáць; браць на ўвáгу. 3. пакáзваць на *што*, абазначáць, знáчыць

• ***compare notes*** абмéньвацца дýмкамі

• ***make a note of*** запісáць што-н. для пáмяці

• ***strike the right note*** сказáць *абó* зрабíць што-н. дарэ́чы

• ***take note of*** заўважáць, спасьцерагáць

• ***take notes of*** рабíць натáткі, запíсваць (*лéкцыі*)

notebook ['noutbuk] n. натáтнік -а *m.*, запісна́я кні́жка

noted ['noutid] adj. 1. вядóмы, славýты; выдáтны. 2. заўвáжаны: ***His absence from class was noted*** Ягóная адсýтнасьць у кля́се былá заўвáжаная

noteworthy ['nout,wɜ:rði] adj. вáрты ўвáгі; надзвычáйны; выдáтны

nothing ['nʌθiŋ] – n. 1. нішто́, нічóга: ***nothing else than*** нішто́ і́ншае, як; ***nothing of the kind*** нічóга падóбнага. 2. а) нуль -я́ *m.* б) пустóе мéсца, нішто́: ***People regard him as nothing*** Мáюць ягó за нішто́; ***to think nothing of*** а) лічы́ць лёгкім. б) лічы́ць няважным *абó* бязвáртасным, ігнараваць

– adv. ані́, зусíм не: ***to be nothing wiser than before*** ня быць разумнéйшым, чым ранéй; ***It surprises me nothing*** Гэ́та мянé зусíм не зьдзіўляе

nothingness [ˈnʌθɪŋnəs] n. 1. небыцьцё *n.*, нябы́т -у *m.*, неіснава́ньне *n.* 2. нязна́чнасьць; мізэ́рнасьць *f.* 3. непрыто́мнасьць *f.*

notice [ˈnoʊtəs] – n. 1. назіра́ньне *n.*, ува́га *f.*: ***to take notice*** назіра́ць, заўважа́ць; ***to take no notice of it*** не зварача́ць зусі́м ува́гі на гэ́та. 2. заўча́снае паведамле́ньне, перасьцяро́га. 3. абве́стка *f.* 4. папярэ́джаньне *n.*: ***to give notice*** паведамля́ць; папераджа́ць (*аб звальне́ньні з пра́цы*): ***to give somebody a month's notice*** папярэ́дзіць каго́-н. (*аб звальне́ньні з пра́цы*) ме́сяц напе́рад; ***at (on) short notice*** за́раз жа, незадо́ўга, за каро́ткі тэ́рмін. 5. агля́д -у *m.*, рэцэ́нзія *f.*
– v. 1. заўважа́ць, прыкмяча́ць *каго-што*; зварача́ць ува́гу на *каго́-што*. 2. зга́дваць пра *што*, спасыла́цца на *каго́-што*

noticeable [ˈnoʊtəsəbəl] adj. 1. зна́чны, выда́тны; ба́чны. 2. ва́рты ўва́гі

noticeably [ˈnoʊtəsəbli] adv. зна́чна, заўва́жна

notification [ˌnoʊtɪfɪˈkeɪʃən] n. апавяшчэ́ньне, паведамле́ньне *n.*; нака́з -у *m.*

notify [ˈnoʊtəfaɪ] v., **-fied, -fying** паведамля́ць *каго́*, нака́зваць *каму́*, апавяшча́ць *што*

notion [ˈnoʊʃən] n. 1. паня́цьце, разуме́ньне *n.*: ***He has no notion of what I mean*** Ён ня ма́е ўяўле́ньня, пра што я кажу́. 2. по́гляд, пагля́д -у *m.*, ду́мка *f.*, перакана́ньне *n.* 3. намо́р -у *m.* 4. дурна́я вы́думка; глу́пства
• ***notions,*** pl. галянтэра́я *f.*

notional [ˈnoʊʃənəl] adj. 1. адця́гнены, абстра́ктны; разумо́вы. 2. уя́ўны; нерэа́льны

notoriety [ˌnoʊtəˈraɪəti] n., pl. **-ties** 1. нясла́ва *f.*, блага́я сла́ва, га́ньба. 2. шыро́кая папуля́рнасьць *або́* вядо́масьць *f.* 3. славу́тасьць *f.*, праслáўлены *або́* агу́льнавядо́мы чалаве́к

notorious [noʊˈtɔːriəs] adj. 1. вядо́мы, нясла́ўны, заўзя́ты: ***a notorious thief*** вядо́мы зло́дзей; ***a notorious cheat*** заўзя́ты махля́р. 2. агу́льнавядо́мы, вядо́мы ўсі́м

notwithstanding [ˌnɑːtwɪðˈstændɪŋ] – prep. ня гле́дзячы на *што*
– conj. хоць
– adv. тым ня ме́нш, усё ж, адна́к

nought [nɔːt] n. 1. нуль -я́ *m.* 2. ніштó

noun [naʊn] n., Gram. назо́ўнік -а *m.*

nourish [ˈnɜːrɪʃ] v. 1. карміць; харчава́ць; жывіць. 2. пе́сьціць: ***to nourish a hope*** пе́сьціць надзе́ю

nourishing [ˈnɜːrɪʃɪŋ] adj. спажы́ўны, пажы́ўны; сы́тны

nourishment [ˈnɜːrɪʃmənt] n. 1. спажы́ва, пажы́ва *f.*; е́жа *f.*; харчы́ *pl.* 2. жыўле́ньне, харчава́ньне, кармле́ньне *n.* 3. сы́тнасьць *f.*

novel I [ˈnɑːvəl] n. рама́н -у *m.*

novel II [ˈnɑːvəl] adj. но́вы; дзіўны; неспазна́ны, незнаёмы

novelist [ˈnɑːvəlɪst] n. раманíст -а *m.*, раманíстка *f.*

novella [noʊˈvelə] n., pl. **novellas** навэ́ла *f.*

novelty [ˈnɑːvəlti] n., pl. **-ties** 1. навізна́ *f.* 2. навіна́, навíнка *f.*
• ***novelties*** дро́бныя незвыча́йныя рэ́чы, заба́ўкі; та́нныя ювэлíрныя вы́рабы

November [noʊˈvembər] – n. лістапа́д -а *m.*
– adj. лістапа́давы, лістапа́даўскі

novice [ˈnɑːvəs] n. 1. пачаткóлвец -ўца, навічóк -ка́ *m.* 2. паслу́шнік -а *m.*, паслу́шніца *f.*

now [naʊ] – adv. 1. цяпе́р; ужо́: ***He is here now*** Цяпе́р ён тут; ***She must have reached the city now*** Яна́ му́сіць ужо́ даéхала да го́раду. 2. за́раз жа; адра́зу: ***Do it now!*** Зрабі́ гэ́та за́раз жа! 3. то́лькі што. 4. тады́ (*у апавяда́ньні*): ***It is now clear that ...*** Тады́ ста́ла я́сна, што ... ; ***now and again*** or ***now and then*** час-ад-ча́су, час-часо́м, калí-нікалí; зрэ́дку
– conj. таму́ што; балазе́: ***Now I am older, I have changed my mind*** Балазе́ я пастарэ́ў, дык і зьмяні́ў ду́мку; ***now ... now ...*** то ... то ...; ***now hot, now cold*** то го́рача, то хало́дна

– n. цяпе́рашні час, да́дзены мо́мант: ***before now*** ране́й; ***by now*** дагэ́туль; да гэ́тага ча́су; ***till now*** дасю́ль, да гэ́тага ча́су, да гэ́тай пары́

nowadays ['nauədeiz] – adv. у на́шыя часы́, цяпе́р
– n. сёньняшні дзень, гэ́тыя часы́

noway ['nouwei] adv. ніяк не; ані́; ні ў я́кім ра́зе

nowhere ['nouwer] adv. нідзе́; ніку́ды

noxious ['nɑ:kʃəs] adj. 1. ве́льмі шко́дны; атру́тны. 2. ліхадзе́йны

nozzle ['nɑ:zəl] n. фарсу́нка, наса́дка *f.*, насло́к -ка́ *m.*: ***fire hose nozzle*** фарсу́нка для пажа́рнага шля́нга

nuance ['nu:ɑ:ns] n. адце́ньне *n.*, нюа́нс -у *m.*

Nubian ['nu:biən] – adj. нубі́йскі
– n. нубі́лец -йца *m.*, нубі́йка *f.*

nuclear ['nu:klir] adj. я́дзерны: ***nuclear energy*** эне́ргія а́тамнага ядра́; я́дзерная эне́ргія; ***nuclear fission*** я́дзерны распа́д (*распа́д ядра́ а́таму*)

nuclear fuel я́дзернае па́ліва

nuclear fusion зьліцьцё а́тамных я́драў

nuclear physics я́дзерная фі́зыка

nuclear reactor я́дзерны рэа́ктар

nuclear test я́дзерныя выпрабава́ньні

nuclear weapons я́дзерная зброя́

nucleus ['nu:kliəs] n., pl. **-clei** or **-cleusses** 1. а) ядро́ *n.*, сярэ́дняя ча́стка чаго́-н. б) гало́ўная, найнаве́йшая ча́стка чаго́-н. 2. Phys. ядро́ а́тама. 3. Biol. заро́дак -ка *m.*

nude [nu:d] – adj. го́лы, разьдзе́ты
– n. го́лая фігу́ра

nudeness ['nu:dnəs] n. галі́зна́, аго́ленасьць *f.*

nudism ['nu:dɪzəm] n. нудызм -у *m.*

nudity ['nu:dəti] n. галі́зна́ *f.*; го́лы вы́гляд

nugget ['nʌgit] n. 1. камя́к -а́ *m.*, камячло́к -ка́, кава́лак -ка *m.* 2. самаро́дак зо́лата. 3. не́шта ва́ртаснае

nuisance ['nu:səns] n. 1. назо́ла *f.* (*пра асо́бу і пра рэч*). 2. даку́ка *f.*: ***What a nuisance!*** Што за даку́ка! 3. шко́да *f.*

null [nʌl] adj. 1. юрыды́чна нява́жны. 2. які́ ня ма́е значэ́ньня *або́* ва́ртасьці: ***null and void*** неправамо́цны; які́ страціў зако́нную сі́лу. 3. бязва́ртасны

nullify ['nʌlifai] v., **-fied, -fying** 1. прызнава́ць нява́жным, касава́ць, анулява́ць: ***to nullify a law*** скасава́ць зако́н. 2. рабі́ць бескары́сным, пазбаўля́ць значэ́ньня; адкліка́ць

nullity ['nʌləti] n., pl. **-ties** 1. бескары́снасьць, нява́жнасьць *f.* 2. про́ста ні́чога. 3. скасава́ны зако́н *або́* умо́ва.

numb [nʌm] – adj. зьняме́лы, адубе́лы, скарчане́лы, здраньцьве́лы; зацэ́клы: ***numb with cold*** адубе́лы ад хо́ладу
– v. 1. няме́ць, драньцьве́ць (*ад стра́ху*). 2. (*пра ча́сткі це́ла*) карчане́ць, дубе́ць; захо́дзіцца (*ад хо́ладу*). 3. зацяка́ць (*пра ру́кі ці но́гі*)

number ['nʌmbər] – n. 1. лік -у *m.*: ***2, 14 and 25 are numbers*** два, чатырна́цаць і два́ццаць пяць — гэ́та лі́кі. 2. ко́лькасьць *f.*: ***in great numbers*** вялі́кай ко́лькасьцю. 3. шэ́раг, рад -у *m.*: ***number of reasons*** шэ́раг прычы́наў. 4. ну́мар -у *m.* (*до́ма, аўтамабі́ля*). 5. ну́мар -у *m.* а) праграма́ ў канцэ́рце. б) ну́мар газэ́ты, ча́сапіса. 6. Gram. лік -у *m.*: ***singular number*** адзіно́чны лік
– v. 1. нумарава́ць. 2. налі́чваць, налі́чвацца: ***The city numbers a million inhabitants*** Го́рад налі́чвае мільён жыхаро́ў. 3. лічы́цца, быць у лі́ку: ***numbered among his followers*** у лі́ку яго́ных прыхі́льнікаў
• ***a number of*** не́калькі; мно́гія; шмат
• ***beyond number*** бязь лі́ку (*ве́льмі шмат*)

numberless ['nʌmbərləs] adj. 1. незьлічо́ны, незьлічо́нае мно́ства. 2. бяз ну́мару

numbness ['nʌmnəs] n. зьняме́ньне, зьдзервяне́ньне *n.*; здраньцьве́ласьць *f.*

numerable ['nu:mərəbəl] adj. які́ мо́жа быць зьлі́чаны, пералі́чаны

numeral ['nu:mərəl] n. 1. лі́чба, лі́чбіна *f.*: ***Arabic numerals*** ара́бскія лі́чбы; ***Roman numerals*** ры́мскія лі́чбы. 2. Gram. лічэ́бнік -а *m.*

numerate [ˈnu:məreɪt] v. 1. лічы́ць; падлі́чваць. 2. нумарава́ць
numerator [ˈnu:məreɪtər] n. 1. лі́чнік -а *m.* (*дро́бу*). 2. вылічáльнік -а *m.* (*асо́ба або́ прыбо́р*). 3. асо́ба, што правó-дзіць пе́рапіс
numerous [ˈnu:mərəs] adj. шматлі́кі, у вялі́кай ко́лькасьці
numismatic [ˌnu:məzˈmætɪk] adj. нумізматы́чны
numismatics [ˌnu:məzˈmætɪks] n. нумізма́тыка *f.*
nun [nʌn] n. мана́шка *f.*
nuncio [ˈnʌnsiou] n.,pl. **-cios** па́пскі ну́нцый
nunnery [ˈnʌnəri] n., pl. **-ries** жано́чы манасты́р
nuptial [ˈnʌpʃəl] adj. шлю́бны, вясе́льны
nurse [nɜ:rs] – n. 1. мэдыцы́нская сястрá, мэдсястрá *f.* 2. ня́нька *f.*
– v. 1. быць, працава́ць мэдсястро́й. 2. даглядáць; лячы́ць (*хво́рых і пад.*). 3. ня́ньчыць (*дзяце́й*). 4. кармі́ць (*дзіця́ грудзьмі́*)
• ***nurse a plant*** даглядáць вазо́н
• ***nurse a fire*** падтры́мваць аго́нь
nurseling [ˈnɜ:rslɪŋ] *гл.* **nursling**
nursery [ˈnɜ:rsəri] n., pl. **-eries** 1. дзіця́чы пако́й. 2. рассáднік, гадава́льнік -у *m.* (*дрэ́ваў і і́ншых расьлі́наў*); ***nursery forest*** лясны́ гадава́льнік. 3. я́сьлі
nursery rhyme ве́ршык для дзяце́й
nursery school дзіця́чы садо́к
nursling [ˈnɜ:rslɪŋ] n. 1. грудно́е дзіця́, немаўля *n.* 2. пасту́н -á *m.*
nurture [ˈnɜ:rtʃər] – v. 1. гадава́ць; даглядáць, узгадо́ўваць. 2. аджыўля́ць
– n. 1. дагля́д -у *m.*, узгадо́ўваньне, гадава́ньне *n.* 2. е́жа *f.*, харч -у *m.*, харчава́ньне *n.*
nut [nʌt] – n. 1. арэ́х -а, арэ́шлак -ка *m.* 2. га́йка *f.* 3. Sl. дзіва́к -á *m.*, прыду́рлак -ка *m.*; ***hard nut to crack,*** Informal мо́цны арэ́х (*што-н. цяжко́е для дасягне́ньня*)
– v. рваць арэ́хі
– adj. арэ́хавы
• ***nuts*** дзíўны, прыдуркава́ты
nutcracker [ˈnʌtˌkrækər] n. 1. шчы́пцы для арэ́хаў. 2. арэ́хаўка *f.* (*пту́шка*)
nuthouse [ˈnʌthaus] n., Sl. вар'я́цкі дом, дурдóм -у *m.*
nutlet [ˈnʌtlət] n. 1. арэ́шлак -ка *m.* 2. ко́стачка *f.* пэ́рсіка, сьлі́вы, ві́шні
nutmeat [ˈnʌtmi:t] n. ядро́ арэ́ха
nutmeg [ˈnʌtmeg] n. мускáтны арэ́х
nutrient [ˈnu:trɪənt] – adj. спажы́ўны, пажы́ўны
– n. пажы́ўнае рэ́чыва
nutrition [nuˈtrɪʃən] n. 1. харчава́ньне, жыўлéньне *n.* 2. спажы́ва, е́жа *f.*; харч -у *m.*
nutritious [nuˈtrɪʃəs] adj. пажы́ўны, спажы́ўны
nutritive [ˈnu:trətɪv] adj. 1. харчóвы. 2. пажы́ўны
nutshell [ˈnʌtʃəl] n. арэ́хавая шкарлу́піна
• ***in a nutshell*** ве́льмі ко́ратка, у двух сло́вах
nutty [ˈnʌti] adj. 1. з арэ́хамі, арэ́хавы (*пірóг*). 2. як арэ́х(і). 3. Sl. дзіўны́, дзіва́чны, прыду́ркаваты. 4. Sl. памéшаны на чы́мсьці (*у до́брым сэ́нсе*), захóплены, энтузіясты́чны да *чаго́*
nuzzle [ˈnʌzəl] v., **-zled, -zling** 1. а) ты́цкаць, це́рціся но́сам аб *што* (*пра жывёліну*). 2. прыціскацца, прытуля́цца, прыхіля́цца. 3. ры́ць лычóм
nylon [ˈnailɑ:n] – n. 1. нэйлён -у *m.* 2. ***nylons,*** pl. нэйлёнавыя панчóхі
– adj. нэйлёнавы
nymph [nɪmf] n. 1. ні́мфа *f.* 2. Poetic прыгóжая жанчы́на

O

O *or* **o** [ou] n. **O's** *or* **o's.** 1. *пятна́ццатая лі́тара англе́льскага альфабэ́ту.* 2. нуль

o' [ə] prep. 1. = **of.**: ***man-o'-war*** вае́нны карабе́ль; ***six o'clock*** шо́стая гадзі́на. 2. = **on**: ***to knock o'the head*** уда́рыць па галаве́

O *or* **Oh** [ou] interj. о, ах: ***O my!*** *or* ***O dear me!*** О Бо́жачка! ***Oh, what a lie!*** О, яка́я мана́!

oak [ouk] – n. дуб -а *m.* (*дрэ́ва*) дуб,-у *m.* (*драўні́на*)
– adj. дубо́вы: ***oak leaves*** дубо́выя лісты; ***an oak table*** дубо́вы стол; ***an oak grove*** дубро́ва *f.*

oaken ['oukən] adj. дубо́вы: ***the old oaken bucket*** старо́е дубо́вае вядро́

oar [ɔ:r] – n. вясло́ *n.*: ***to rest on one's oars*** перста́ць працава́ць *або́* стара́цца; спачы́ць на ла́ўрах
– v. весла́ваць

oarsman ['ɔ:rzmən] n., pl. - **men** вясьля́р весьляра́ *m.*

oasis [ou'eisis] n., pl. **- ses** аа́зіс -у *m.*

oat [out] – n. usually, **oats** pl. авёс аўса́ *m.*; ***to sow one's wild oats*** спаганя́ць шал маладо́сьці
– adj. аўся́ны

oatcake ['outkeik] n. аўся́ная ала́дка

oath [ouθ] – n., ***oaths*** 1. прыся́га *f.*: ***under oath*** пад прыся́гай; ***to take an oath*** браць прыся́гу, прысяга́ць. 2. а) бажэ́ньне *n.*, бажбо́ *f.* б) праклі́нань-не *n.*, праклён - у *m.*
– v. 1. прысяга́ць. 2. бажы́цца; кля́сьціся

oatmeal ['outmi:l] n. 1. аўся́ная мука́, кру́пы, аўся́нка *f.* 2. аўся́ная ка́ша, аўся́нка *f.*

oat straw аўся́ная сало́міна, аўся́ная сало́ма

obdurate ['ɑ:bdurət] adj. 1. упа́рты, заця́ты: ***an obdurate refusal*** упа́ртая адмо́ва. 2. чэ́рствы, бязду́шны; заўзя́ты; непапра́ўны: ***an obdurate criminal*** непапра́ўны злачы́нец

obedience [ou'bi:diəns] n. паслухмя́насьць *f.*, паслушэ́нства *n.*; падпара́дкаваньне *n.*

obedient [ou'bi:diənt] adj. паслухмя́ны

obelisk ['ɑ:bəlisk] n. абэлі́ск -а *m.*

obese [ou'bi:s] adj. празьме́рна то́ўсты, сы́ты *або́* тлу́сты

obesity [ou'bi:səti] n. празьме́рная сы́тасьць, тлу́стасьць *f.*

obey [ou'bei] v. слу́хацца, падпарадко́ўвацца

obituary [ou'bitʃueri] – n., pl. **-aries** нэкралёг -у *m.*
– adj. жало́бны, хаўту́рны

object ['ɑ:bdʒekt] – n. 1. прадме́т -у *m.*, рэч *f.* 2. аб'е́кт -у *m.* (*вывучэ́ньня*). 3. сьме́шны *або́* дзіўны тып чалаве́ка. 4. мэ́та *f.*: ***to fail in one's object*** не асягну́ць мэ́ты. 5. Gram. дапаўне́ньне *n.*; ***direct object*** про́стае дапаўне́ньне; ***indirect object*** уско́снае дапаўне́ньне

– v. [əbˈdʒekt] 1. пярэ́чыць; не згаджа́цца з *кім*, выступа́ць супро́ць, супраціўля́цца: ***I object to smoking*** Я супро́ць курэ́ньня. 2. не любі́ць, не цярпе́ць

object glass аб'ектыўны -ва *m.* (*тэлеско́па, мікраско́па*)

objection [əbˈdʒekʃən] n. 1. пярэ́чаньне *n.*; за́кід -у *m.*, засьцяро́га *f.*: ***to raise an objection*** вы́казаць засьцяро́гу, зрабі́ць за́кід, запярэ́чыць. 2. пратэ́ст -у *m.*; неахво́та *f.*; супраціўле́ньне: ***strong objection to working*** вялі́кая неахво́та працава́ць

objective [əbˈdʒektɪv] – n. 1. мэ́та *f.*, імкне́ньне *n.* 2. Gram. уско́сны склон *або́* сло́ва ва ўско́сным скло́не

– adj. 1. мэ́тавы: ***an objective point*** канчатко́вая мэ́та. 2. аб'ектыўны. 3. бесстаро́нні. 4. Gram. уско́сны

objectivity [ˌɑ:bdʒekˈtɪvəti] n. аб'ектыўнасьць *f.*

object lesson 1. нагля́дная ле́кцыя. 2. нагля́дны до́вад

objector [əbˈdʒektər] n. той, хто пярэ́чыць; супраці́ўнік -а *m.*

objurgate [ˈɑ:bdʒərgeɪt] v. сварыцца, крыча́ць на *каго́*. 2. дакара́ць *каго́*

objurgatory [ˌəbdˈʒɜ:rgətɔ:ri] adj. дако́рлівы

obligate [ˈɑ:blɪgeɪt] v. абавя́зваць(ь) (-ца)

obligation [ˌɑ:blɪˈgeɪʃən] n. 1. абавя́зак -ку *m.* 2. абавяза́ньне *n.*: ***to be under an obligation*** быць абавя́заным; ***to put under an obligation*** абавя́заць. 3. доўг удзя́чнасьці. 4. паслу́га *f.*; ла́ска *f.*: ***to repay an obligation*** адпла́ціць за паслу́гу *або́* ла́ску; сплаці́ць доўг удзя́чнасьці

obligatory [əˈblɪgətɔ:ri] adj. прымусо́вы; абавязко́вы; кане́чны

oblige [əˈblaɪdʒ] v. 1. абавя́заць; змуша́ць: ***to be obliged*** быць абавя́заным каму́-н.; ***much obliged!*** ве́льмі ўдзя́чны вам; шчы́ра дзя́кую. 2. рабі́ць паслу́гу, ла́ску *або́* прые́мнасьць: ***She obliged us with song*** Яна́ зрабі́ла нам прые́мнасьць і засьпява́ла пе́сьню

obliging [əˈblaɪdʒɪŋ] adj. ласка́вы; прыве́тлівы, рахма́ны; паслу́жлівы

oblique [əˈbli:k] adj. 1. нахі́лены (*пра пло́скасьць*), ко́сы (*пра лі́нію*): ***oblique angle*** во́стры або́ тупы́ (няпро́сты) кут. 2. ухі́лісты, няя́сны (*пра ада́каз*). 3. патае́мны, скры́тны; закулі́сны; нячы́сты: ***oblique dealings*** нячы́стыя апэра́цыі. 4. Gram. уско́сны: ***oblique case*** уско́сны склон

obliquely [əˈbli:kli] adv. наўско́с, наўскасы́, наўскася́к

obliterate [əˈblɪtəreɪt] v. 1. сьціра́ць; заці́ра́ць; зьнішча́ць: ***Heavy rain obliterated the footprints*** Вялі́кі дождж змыў сьляды́. 2. згла́джваць, гаі́ць: ***Time obliterates sorrow*** Час го́іць боль душы́

obliteration [əˌblɪtəˈreɪʃən] n. сьціра́ньне, заці́ра́ньне, зьнішчэ́ньне *n.*

oblivion [əˈblɪviən] n. 1. забыцьцё *n.*, няпа́мяцтва *n.*: ***to pass into oblivion*** пайсьці́ ў забыцьцё, быць забы́тым. 2. а) бяспа́мяцтва *n.* б) забы́ўлівасьць, няпа́мятлівасьць *f.*; бага́тая па́мяць

oblivious [əˈblɪviəs] adj. 1. забы́ўлівы, няпа́мятлівы, няўва́жны, нядба́йны. 2. бяспа́мятны

oblong [ˈɑ:blɔ:ŋ] – adj. 1. падо́ўжны, прадаўгава́ты. 2. прастаку́тны

– n. прастаку́тнік -а *m.*

obnoxious [ɑ:bˈnɑ:kʃəs] adj. ве́льмі непрые́мны, невыно́сны; пры́кры, бры́дкі; ненави́дны, ненави́сны

obscene [əbˈsi:n] adj. непрысто́йны, бессаро́мны; брыдкі́ (*пра сло́вы*), бру́дны (*мара́льна*)

obscenity [əbˈsenəti] n., pl. **-ties** 1. непрысто́йнасьць, бессаро́мнасьць *f.* 2. а) брыдкі́я сло́вы. б) разбэ́шчанасьць *f.*

obscure [əbˈskjʊr] – adj. 1. няя́сны, ма́ла зразуме́лы, незразуме́лы: ***an obscure style of writing*** няя́сны стыль пісáньня. 2. няве́дамы; малава́жны, нязна́чны: ***an obscure little village*** мала́я няве́дамая вёсачка; ***an obscure poet*** няве́дамы паэ́т; ***an ob-***

scure position малава́жнае стано́вішча. 3. схава́ны, ледзь ба́чны; ***an obscure path*** ледзь ба́чная сьце́жка. 4. невыра́зны, няя́сны: ***an obscure form*** невыра́зная фо́рма; ***obscure sounds*** няя́сныя гу́кі. 5. цёмны, цьмя́ны: ***an obscure corner*** цёмны кут

– v. 1. засланя́ць; закрыва́ць, загараджа́ць сабо́ю. 2. зацьмі́ць: ***Clouds obscured the sun*** Хма́ры зацьмі́лі со́нца

obscurity [əbˈskjʊrəti] n., pl. **-ties** 1. няя́снасьць, незразуме́ласьць *f.* 2. не́што няя́снае, незразуме́лае. 3. няве́дамасьць *f.*: ***to rise from obscurity to fame*** зь няве́дамасьці ўзвы́сіцца да сла́вы. 4. малаве́дамая асо́ба *або́* мясцо́васьць. 5. це́мра, цьмя́насьць *f.*

obsequies [ˈɑ:bsəkwiz] n., pl. пахава́льны цырыманія́л; пахо́віны зь вялі́кай по́мпай

obsequious [əbˈsi:kwiəs] adj. ліськлі́вы, падлі́зьлівы; уго́длівы, даго́длівы, падатлівы

obsequiousness [əbˈsi:kwiəsnəs] n. уго́длівасьць, даго́длівасьць, пада́тлівасьць *f.*; ліськлі́васьць, падлі́зьлівасьць *f.*

observable [əbˈzɜ:rvəbəl] adj. 1. лёгка ба́чны. 2. яко́га тра́ба прытры́мваць; які́ выко́нваецца (*зако́н*)

observance [əbˈzɜ:rvəns] n. 1. прытры́маньне (*зако́ну*), адзнача́ньне *n.* (*сьвя́та*). 2. рэлігі́йны цырыманія́л. 3. пра́віла *або́* звы́чай, яко́га тра́ба трыма́цца. 4. назіра́ньне *n.*

observant [əbˈzɜ:rvənt] adj. 1. назіра́льны, ува́жны. 2. які́ прытры́мваецца (*пра́вілаў, зако́ну, звы́чаяў*)

observation [ˌɑ:bzərˈveɪʃən] n. 1. назіра́льнасьць *f.*, нагля́д -у *m.*: ***to keep under observation*** трыма́ць пад нагля́дам. 2. назіра́ньне *n.*: ***The tramp escaped observation*** Валацу́га ўцёк ад назіра́ньня. 3. назіра́ньне, дасьле́даваньне *n.* 4. заўва́га, за́цемка *f.*, вы́казаная ду́мка, камэнта́р -ý *m.*

observational [ˌɑ:bzərˈveɪʃənəl] adj. назіра́льны

observatory [əbˈzɜ:rvətɔ:ri] n., pl. **-ries** 1. абсэрвато́рыя *f.* 2. назіра́льны пункт

observe [əbˈzɜ:rv] v. 1. назіра́ць, нагляда́ць; заўважа́ць. 2. сказа́ць, заўва́жыць. 3. прытры́мвацца, трыма́цца, захо́ўваць: ***to observe a rule*** трыма́цца пра́вілa; ***to observe silence*** захо́ўваць маўча́ньне. 4. сьвяткава́ць, ушано́ўваць

observer [əbˈzɜ:rvər] n. назіра́льнік, нагляда́льнік -a *m.*

obsess [əbˈses] v. апанава́ць, авало́даць, апанта́ць

obsession [əbˈseʃən] n. 1. насланьнё *n.*, апанта́насьць *f.* 2. неадчэ́пная ду́мка, ідэ́я фікс

obsessive [əbˈsesɪv] adj. апанта́ны

obsolescence [ˌɑ:bsəlˈesəns], n. састарэ́ласьць, перастарэ́ласьць *f.*

obsolete [ˌɑ:bsəlˈi:t] adj. 1. састарэ́лы, які́ ўжо́ ня ўжыва́ецца, які́ вы́йшаў з ужы́тку (*пра сло́ва*). 2. ве́льмі стары́; перастарэ́лы, нямо́дны

obstacle [ˈɑ:bstəkəl] n. перашко́да, замі́нка *f.*; загаро́джа *f.*

obstetrics [əbˈsterɪks] n. акушэ́рства *n.*

obstinacy [ˈɑ:bstɪnəsi] n., pl. **-cies** упо́рыстасьць, упа́ртасьць, наравісьць *f.*

obstinate [ˈɑ:bstɪnət] adj. упо́рысты, упа́рты; наравісты

obstinately [ˈɑ:bstɪnətli] adj. упа́рта; наравіста, упо́рыста

obstruct [əbˈstrʌkt] v. 1. заступа́ць, перагараджа́ць (*даро́гу*), зава́льваць (*прахо́д*). 2. закрыва́ць (*від*). 3. замінава́ць, перашкаджа́ць *каму́*

obstruction [əbˈstrʌkʃən] n. 1. перашко́да, замі́нка *f.* 2. перашкаджа́ньне, перагаро́джваньне *n.* 3. затры́мка *f.*, тармажэ́ньне *n.*: ***the obstruction of progress*** тармажэ́ньне по́ступу

obtain [əbˈteɪn] v. здабыва́ць; даставаць, атры́мваць: ***to obtain knowledge*** здабыва́ць ве́ды; ***to obtain tickets*** даста́ць біле́ты

obtrude [əbˈtru:d] v. 1. навя́зваць: ***Don't obtrude your opinions on others*** Не навя́звай сваі́ по́гляды і́ншым. 2. на-

про́швацца, набіва́цца (*на знаёмства*); урыва́цца, уме́швацца

obtrusion [əbˈtru:ʒən] n. навя́званьне, уме́шваньне, уварва́ньне *n.*

obtrusive [əbˈtru:sɪv] adj. даку́члівы, насты́рлівы, назо́йлівы; упо́рысты

obtuse [əbˈtu:s] n. 1. тупы́: ***obtuse angle*** тупы́ кут. 2. тупы́, няздо́льны, якме́млівы (*пра чалаве́ка*). 3. прыту́плены, аслаблы (*пра слых, зрок*)

obviate [ˈɑ:bvieɪt] v. пазьбяга́ць, пазбаўля́цца, адхіля́ць, ухіля́цца: ***to obviate a difficulty*** пазба́віцца цяжкасьці; ***to obviate danger*** адхілі́ць небясьпе́ку

obvious [ˈɑ:bviəs] adj. я́сны; відаво́чны, я́ўны, бясспрэ́чны: ***It is obvious that two and two make four*** Бясспрэ́чна што два й два — чаты́ры

occasion [əˈkeɪʒən] – n. 1. нагода, акалі́чнасьць *f.*: ***on the occasion of*** з нагоды чаго́-н. 2. спэцыя́льная падзе́я *або́* нагода: ***this festive occasion*** гэтая ўрачы́стая нагода. 3. прычы́на, падста́ва *f.*; зачэ́пка *f.*: ***the occasion of the quarrel*** прычы́на сва́ркі; ***on occasion*** ча́сам, часа́мі, калі́-нікалі́, пры нагодзе

– v. дава́ць падста́ву, быць прычы́най

occasional [əˈkeɪʒənəl] adj. 1. рэ́дкі, выпадко́вы: ***an occasional thunderstorm*** выпадко́вая навальні́ца. 2. прынагодны: ***occasional poetry*** прынагодная паэ́зія

occasionally [əˈkeɪʒənəli] adv. часчасо́м, час ад ча́су, ад ча́су да ча́су

Occident [ˈɑ:ksɪdənt] n. 1. За́хад -у *m.* (*краі́ны Захо́дняй Эўро́пы й Амэ́рыкі*). 2. за́хад -у *m.*

occidental [ˌɑ:ksəˈdentəl] adj. захо́дні

occlude [əˈklu:d] v. 1. забіва́ць; заты́ка́ць; зачыня́ць (*прахо́д*). 2. Chem. убіра́ць (*га́зы*). 3. Dentistry шчы́льна сыхо́дзіцца (*пра зу́бы ве́рхняй і ні́жняй сківі́цы*)

occult [əˈkʌlt] – adj. 1. тае́мны, патае́мны, запаве́тны. 2. звышнатура́льны, містычны

– n. ***the occult*** містычнае вучэ́ньне

occultism [əˈkʌlˌtɪzəm] n. акульты́зм -у *m.* (*ве́ра ў містычныя сілы*)

occupancy [ˈɑ:kjəpənsi] n. заня́ць̂це *n.*; завало́даньне (*зямлёю, до́мам*)

occupant [ˈɑ:kjəpənt] n. 1. жыха́р -а́ *m.* 2. ула́сьнік -а (*до́ма, зямлі́*). 3. той, хто займа́е яко́е-н. стано́вішча. 4. акупа́нт -а *m.*

occupation [ˌɑ:kjəˈpeɪʃən] n. 1. заня́т|ак -ку *m.*, прафэ́сія *f.* 2. акупа́цыя *f.*: ***the occupation of a town by the enemy*** акупа́цыя го́раду во́рагам

occupational [ˌɑ:kjəˈpeɪʃənəl] adj. прафэсі́йны: ***occupational diseases*** прафэсі́йныя хваро́бы

outside [ˌaʊtˈsaɪd] – n. 1. навако́льле, во́нкавы бок, во́нкавая паве́рхня *або́* ча́стка. 2. во́нкавы вы́гляд. 3. навако́льны сьвет
– adj. 1. знадво́рны, во́нкавы. 2. старо́ньні: ***Outside noises disturbed the class*** Го́ман зво́нку перашкаджа́ў ву́чням у кля́се. 3. малы́, невялі́кі: ***an outside chance to win*** малы́ ша́нец вы́йграць
– adv. 1. (where?) во́нкі, на дварэ́. 2. (from where?) зво́нку. 3. (where to?) на двор
– prep., Informal за вы́няткам: ***Outside John, none of us liked the play*** За вы́няткам Янкі, ніко́му з нас п'е́са не спадаба́лася
• ***at the outside*** Informal найбо́льш, у скра́йнім выпа́дку
• ***outside in*** навы́варат, ве́рхам у сярэ́дзіну

outsider [ˌaʊtˈsaɪdər] n. старо́ньні -яга *m.*, старо́ньняя *f.*; прыблу́дa -ы *m. & f.*, нетутэ́йшы

outskirts [ˈaʊtskɜ:rts] n., pl. 1. ускра́ек -йку *m.*, ускра́іна *f.* (*напр. вёскі, ле́су*). 2. прадме́сьце *n.* (*го́раду*). 3. узьле́сьсе *n.*, узьле́сак -ку *m.* (*ускра́іна ле́су*)

outspoken [ˌaʊtˈspoʊkən] adj. гаваркі́, ахво́чы гавары́ць; шчы́ры, адкры́ты: ***an outspoken person*** шчы́ры чалаве́к; ***outspoken criticism*** адкры́тая кры́тыка

outspread [ˈaʊtspred] – adj. распасьцёрты; павяліча́ны, пашы́раны: ***an eagle with outspread wings*** аро́л з распасьцёртымі кры́ламі
– v. [ˌaʊtˈspred] 1. распасьціра́ць (-ца). 2. пашыра́ць (-ца), расьсьціла́ць (ца)

outstanding [ˌaʊtˈstændɪŋ] adj. 1. вялі́кі, выда́тны, які́ выдзяля́ецца. 2. няспла́чаны: ***outstanding debt*** няспла́чаны доўг. 3. вы́тарклы, які́ выдае́ца, выступа́е

outstretched [ˌaʊtˈstretʃt] adj. 1. праця́гнуты. 2. расьця́гнены, які́ расьцягну́ўся: ***to welcome with an outstretched hand*** віта́ць з праця́гнутай руко́й

outward [ˈaʊtwərd] – adj. 1. скірава́ны наво́нкі: ***an outward motion (glance)*** рух (по́зірк) наво́нкі. 2. во́нкавы, знадво́рны; матэрыя́льны; ба́чны; ***outward things*** во́нкавы сьвет
– adv. наво́нкі; ад бе́рагу (*адплысьці*), ад ста́нцыі (*ад'е́хаць*): ***The ship is outward bound*** Карабе́ль пада́ўся ад бе́рагу

outwardly [ˈaʊtwərdli] adv. во́нкавы, знадво́рны; на вы́гляд, з вы́гляду

outwards [ˈaʊtwərdz] adv. *гл.* **outward,** adv.

outwear [ˌaʊtˈwer] v.t. 1. перажыва́ць (*аб рэ́чы*), быць мацне́йшым за *што*. 2. зно́шваць

outweigh [ˌaʊtˈweɪ] v.t. 1. перавага́ць, быць цяжэ́йшым. 2. перавага́ць ва́ртасьцю, ва́жнасьцю *або́* ўплы́вам; браць верх над *чым*

outwit [ˌaʊtˈwɪt] v. перахітры́ць, абхітры́ць

outworn [ˌaʊtˈwɔ:rn] adj. 1. зно́шаны. 2. састарэ́лы (*пра паня́цьці*)

ova [ˈoʊvə] n., *pl. of* **ovum**

oval [ˈoʊvəl] – adj. 1. яйкападо́бны. 2. ава́льны
– n. ава́л -а *m.*

ovary [ˈoʊvəri] n., pl. **-ries** 1. Anat. яе́чнік -а *m.* 2. Bot. за́вязь *f.*

oven [ˈʌvən] n. 1. духо́ўка *f.* 2. печ *f.*

over [ˈoʊvər] – prep. 1. над: а) ***the roof over one's head*** дах над галаво́ю. б) ***We have a captain over us*** Над на́мі стаі́ць капіта́н. 2. па: а) ***all over the country*** па ўсёй краіне. б) ***to travel over Europe*** падаро́жнічаць па Эўро́пе. 3. праз: а) ***He jumped over the ditch*** Ён пераско́чыў праз роў. б) ***bridge over the river*** мост праз ра́чку. 4. за: ***lands over the sea*** краіны за мо́рам. 5. з: ***He fell over the edge of the cliff*** Ён звалі́ўся з кра́ю стро́мы. 6. больш як, звыш: ***It costs over ten dollars*** Гэ́та каштуе́ больш як дзе́сяць даля́раў; ***over two years***

больш як два гады́. 7. па (*уздо́ўж*): ***We drove over the new highway*** Мы е́халі но́вай аўтастра́дай. 8. у ча́се; праз: ***Over the last three years*** Праз апо́шнія тры гады. б) ***to stay over the whole week*** прабы́ць цэ́лы ты́дзень. 9. за *каго́-што*; ***He is troubled over his health*** Ён непако́іцца за сваё здаро́ўе

– adv. 1. (*пака́звае на рух це́раз што-н.*): ***to jump over*** перацко́чыць; ***to swim over*** пераплысці́; ***to boil over*** пабе́гчы (*пра малако́ пры кіпячэ́нні*). 2. (*пака́звае на рух праз адле́гласьць*): ***Go over to the store for me*** Схадзі́ ў кра́му для мяне́; ***Come over here*** Хадзі́ сюды́. 3. (*пака́звае на пазы́цыю зьве́рху*): ***The lamp hangs over the table*** Ля́мпа вісі́ць над сталО́м. 4. (*азнача́е перакру́льваньне, ста́ўленьне дагары́ нага́мі*): ***to turn over the table*** перакулі́ць стол; ***to turn over the page*** перагарну́ць старо́нку. 5. (*пака́звае на перахо́д з рук у ру́кі*): ***Hand it over to them*** Перада́й гэ́та ім. 6. (*пака́звае на паўто́р дзе́яньня*): ***to do over*** перарабі́ць, зрабі́ць нано́ва; ***over again*** яшчэ́ раз; ***over and over (again)*** шмат разо́ў, ізно́ў і зно́ў 7. (*пака́звае на давядзе́ньне дзе́яньня да канца́, на сканчэ́ньне дзе́яньня*): ***to read the story over*** прачыта́ць апавяда́ньне да канца́; ***The meeting is over*** Пасе́джаньне ско́нчылася; ***It is all over*** Усё ско́нчана *або́* Усё прапа́ла. 8. (*пака́звае на паўсю́днасць зья́вы, дзе́яньня*): ***hills covered all over by snow*** узго́ркі скрозь пакры́тыя сьне́гам; ***The wall was painted all over*** Сьцяна́ была́ ўся замалява́ная. 9. (*пака́звае на адле́гласьць*): ***over by the hill*** на тым баку́ пад узго́ркам; ***over there*** Вунь там. 10. (*азнача́е надвы́шку, дада́так*): ***to receive all sum and something over*** атрыма́ць усю́ су́му і крыху́ ў дада́так; ***over and above*** у дада́так да *чаго́*

– adj. 1. зро́блены, ско́нчаны: ***The play is over*** П'е́са ско́нчылася. 2. лі́шні, зали́шні: ***There was a chair for each of the guests and three chairs over*** Было́ кра́сла для ко́жнага з гасьце́й і тры кра́слы лі́шнія. 3. ве́рхні, вышэ́йшы ра́нгам

over- pref. за-, пера-, звыш- (*азнача́е празьме́рнасьць, высо́кую ступе́нь*): ***overcrowded*** перапо́ўнены; ***overfull*** запо́ўны; ***oversize*** завялі́кі (*па-ме́рам*); ***overfast*** звышху́ткі; ***overpolite*** зали́шне ве́тлівы

overall [ˌouvərˈɔ:l] adj. 1. агу́льны; уве́сь, по́ўны: ***overall length*** агу́льная даўжыня́. 2. усеагу́льны

overalls [ˈouvərɔ:lz] n., pl. 1. спэцыя́льная во́пратка, спэцо́ўка *f.* 2. дзіця́чы камбінэзо́нчык

overawe [ˌouvərˈɔ:] v. 1. застра́шваць, перастра́шваць. 2. напаўня́ць стра́хам і глыбо́кай паша́най

overbear [ˌouvərˈber] v. 1. прыгнята́ць. 2. перасі́льваць, перамага́ць. 3. улада́ць

overbearing [ˌouvərˈberiŋ] adj. ула́дны (*го́лас*); улада́рны, катэгары́чны (*тон*); дэспаты́чны, з дыкта́тарскімі зама́шкамі

overboard [ˌouvərˈbɔ:rd] adv. за борт. а) ***throw overboard*** вы́кінуць за борт (*у ваду́*). б) Informal пазбы́цца *каго́-чаго́*; адмо́віцца ад *чаго́*; паки́нуць

overburden [ˌouvərˈbɜ:rdən] – v. перагружа́ць (*і нагрузі́ць звыш ме́ры*)
– n. перагру́зка *f.*

overburdened [ˌouvərˈbɜ:rdənd] v., *p. p.* перагру́жаны

overcame [ˌouvərˈkeim] v., *p. t. of* **overcome**

overcast [ˈouvərkæst] – adj. 1. хма́рны; цёмны; пану́ры. 2. су́мны; хму́рны: ***His face was overcast*** Яго́ны твар быў су́мны. 3. абкіда́ны (*пра бе́раг тканіны*)
– v., **-cast, -casting** 1. пакрыва́ць, зацяга́ць хма́рамі; нахма́рвацца, цямне́ць. 2. абкіда́ць (*шво*)

overcharge [ˌouvərˈtʃɑ:rdʒ] – v. 1. перацэ́ньваць. 2. перагружа́ць, перапаўня́ць. 3. перабо́ршчваць
– n. 1. завысо́кая цана́, запро́с -у *m.* 2. перагру́зка *f.*

overcloud [ˌouvərˈklaud] v. 1. заця́гваць хма́рамі; нахма́рвацца (*пра не́ба*), цямне́ць. 2. пахмурне́ць, рабі́цца су́мным, пану́рым (*пра чалаве́ка*)

overcoat [ˈouvərkout] n. палітó *n.*; плашч -á *m.*

overcome [ˌouvərˈkʌm] v., **-came, -come, -coming** 1. перамага́ць, здо́лець, пераадо́льваць (*страх, благу́ю звы́чку*): ***to overcome an enemy*** перамагчы́ во́рага; ***to overcome all difficulties*** пераадо́лець усе́ ця́жкасьці. 2. зьнясі́льваць, мардава́ць: ***overcome by weariness*** змардава́ны, зьнясі́лены сто́май. 3. бянтэ́жыць

overconfidence [ˌouvərˈkɑ:nfɪdəns] n. празьме́рная пэ́ўнасьць, саманадзе́йнасьць

overconfident [ˌouvərˈkɑ:nfɪdənt] adj. зана́дта саманадзе́йны, пэ́ўны

overcrowd [ˌouvərˈkraud] v. перапаўня́ць (*людзьмі́, жывёлай*)

overdo [ˌouvərˈdu:] v., **-did, -done, -doing** 1. рабі́ць празь ме́ру, перастара́цца. 2. перабо́льшваць. 3. перасма́жваць, перапяка́ць; перава́рваць. 4. ператамля́ць, стамля́ць; мардава́ць

overdose [ˈouvərdous] – n. празьме́рная до́за
– v. [ˌouvərˈdous] дава́ць празьме́рную до́зу, перадазі́раваць

overdraw [ˌouvərˈdrɔ:] v., **-drew, -drawn** 1. перабіра́ць. 2. перавыша́ць свой кра́дыт. 3. перабо́льшваць

overdress [ˌouvərˈdres] – v. празьме́рна шыко́ўна апрана́цца *або́* ўбіра́ць
– n. [ˈouvərdres] ве́рхняя во́пратка

overdue [ˌouvərˈdu:] adj. 1. запо́зьнены, по́зьні: ***The plane (train) is overdue*** Самалёт (цягні́к) по́зьніцца. 2. пратэрмінава́ны: ***The bill is overdue*** Пратэрмінава́ны раху́нак; ***overdue book*** пратэрмінава́ная кні́га

overestimate – v. [ˌouvərˈestɪmeɪt] перацэ́ньваць (*ацэ́ньваць зана́дта высо́ка*) – n. [ˌouvərˈestɪmət] пераацэ́нка *f.*, празьме́рна высо́кая ацэ́нка

overfill [ˌouvərˈfɪl] v. перапаўня́ць (*ва́дкасьцю, рэ́чывам*)

overflow [ˌouvərˈflou] – v. 1. разьліва́цца, выхо́дзіць зь берага́ў (*пра раку́*); перапаўня́ць. 2. залі́ва́ць, затапля́ць: ***The river overflowed my garden*** Рэ́чка затапі́ла мой гаро́д. 3. пераліва́цца, цячы́ празь верх. 4. не зьмяшча́цца: ***The crowds overflowed the little parlor*** Натóўп не зьмяшча́ўся ў малóй прыёмнай; ***an overflowing harvest*** бага́ты ўраджа́й; ***an overflowing kindness*** празьме́рная ве́тласьць, дабрыня́
– n. 1. лі́шлак, збы́тлак -ку *m.* 2. адту́ліна для выплыва́ньня лі́шку ва́дкасьці

overfulfill [ˌouvərfulˈfɪl] v.t. перавыко́нваць

overgrow [ˌouvərˈgrou] v., **-grew, -grown, growing** 1. зарастáць: ***The wall is overgrown with vines*** Сьцяна́ зарóслая вінагра́дам. 2. расьці́ на́дта ху́тка, буя́ць

overgrown [ˌouvərˈgroun] adj. 1. перарóслы: ***an overgrown boy*** перарóслы хлапе́ц. 2. зарóслы; парóслы, абрóслы (*мóхам*): ***an overgrown park*** зарóслы парк; ***overgrown knot*** сук -á *m.* (*у дрэ́ве*)

overgrowth [ˈouvərgrouθ] n. 1. празьме́рна шпа́ркі, бу́йны рост. 2. хмызня́к -ý *m.*, нарóст -у *m.*

overhang [ˌouvərˈhæŋ] v., **-hung, -hanging** 1. навісáць; зьве́швацца над *чым*; выступа́ць, вытыркáцца. 2. вісе́ць пагро́зай

overhead [ˌouvərˈhed] – adv. над галавóй, у не́бе; на вышэ́йшым паве́рсе; угары́: ***The stars shone overhead*** Угары́ сьвяці́ліся зóры
– adj. 1. паве́траны, надзе́мны: ***overhead wires*** правады́ ўгары́. 2. агу́льны; накла́дны (*дадаткóвы*)

– n. [ˈoʊvərhed] накладны́я выда́ткі (*на гаспада́рча-арганізацы́йныя патрэ́бы*)

overhear [ˌoʊvərˈhɪr] v., **-heard, -hearing** падслу́хаць, выпадко́ва пачу́ць

overheat [ˌoʊvərˈhi:t] – v. пераграва́ць; пераграва́цца

– n. перагрэ́ў -ву *m.* (*катло́ў*)

overindulgence [ˌoʊvərɪnˈdʌldʒəns] n. празьме́рная пабла́жлівасьць, празме́рнае патура́ньне, празме́рнае ўжыва́ньне: ***Overindulgence is as bad for children as overstrictness*** Празьме́рная паблажлі́васьць для дзяце́й така́я ж шко́дная як і празме́рная патрабава́льнасьць

overjoyed [ˌoʊvərˈdʒɔɪd] adj. празьме́рна ра́ды

overland [ˈoʊvərlænd] adv., adj. па су́шы; сухазе́мны, сухапу́тны: ***travel overland*** падаро́жнічаць па су́шы

overlap [ˌoʊvərˈlæp] v., **(-pp-)** накрада́ць, захо́дзіць адно́ на адно́; перакрыва́ць, перакрыжо́ўвацца

overleap [ˌoʊvərˈli:p] v. 1. пераско́кваць. 2. прапуска́ць

overload [ˌoʊvərˈloʊd] – v. перагружа́ць

– n. перагру́зка *f.*, перагру́жанасьць *f.*

overlook [ˌoʊvərˈlʊk] – v. 1. недагле́дзець, не заўва́жыць (*памы́лку*). 2. не зварача́ць ува́гі на *што*, дарава́ць: ***to overlook an offence*** дарава́ць зьнява́гу. 3. мець від на што-н. з гары́: ***This high window overlooks half the city*** З гэ́тага высо́кага акна́ відаць паўго́раду. 4. дагляда́ць *што* (*гаспада́рку*); кірава́ць *чым*. 5. глядзе́ць на *каго́-што*, назіра́ць за *кім-чым*

– n. [ˈoʊvərlʊk] наглядна́льны пункт

overlord [ˈoʊvərlɔ:rd] n. валада́р -а́, сюзэрэ́н -а́ *m.*

overnice [ˌoʊvərˈnaɪs] adj. а) празьме́рна вы́танчаны. б) празьме́рна патрабава́льны, прыдзі́рлівы

overnight [ˌoʊvərˈnaɪt] – adv. 1. на́нач; на адну́ ноч, праз ноч: ***to stay overnight*** пераначава́ць. 2. ра́птам, адра́зу, ху́тка. 3. учо́ра ўве́чары

– adj. [ˈoʊvərnaɪt] 1. начны́: ***an overnight stop*** прыпы́нак на́нач, начны́ прыпы́нак. 2. які́ адбы́ўся ўчо́ра ўве́чары

– n. учо́рашні ве́чар

overpopulation [ˌoʊvərˌpɑ:pjəˈleɪʃən] n. перанасяле́ньне *n.*

overpower [ˌoʊvərˈpaʊər] v. 1. адо́льваць, перамага́ць, аслі́льваць (*супраці́ўніка*). 2. адо́льваць, апано́ўваць: ***The heat overpowered me*** Гарачыня́ адо́лела мяне́

overpowering [ˌoʊvərˈpaʊərɪŋ] adj. неадо́льны; прыгнята́льны

overproduction [ˌoʊvərprəˈdʌkʃən] n. перавытво́рчасьць *f.*

override [ˌoʊvərˈraɪd] v., **-rode, -ridden, riding** 1. адкіда́ць *што*, не зважа́ць, не глядзе́ць на *што*: ***to override advice*** or ***objections*** не зважа́ць на пара́ды або́ пярэ́чаньні. 2. пераважа́ць; мець перава́гу над *чым*. 3. перае́хаць (*канём*). 4. прае́хаць (*усю́ вако́ліцу*). 5. заганя́ць каня́

overrule [ˌoʊvərˈru:l] v. 1. адкіда́ць (*прапано́ву*), адхіля́ць (*про́сьбу*), не прыма́ць пад ува́гу пярэ́чаньне. 2. перамага́ць, бра́ць верх над *чым*

overrun [ˌoʊvərˈrʌn] v., **-ran, -run, -running** 1. заглуша́ць (*пра зе́льле*), апано́ўваць, рабі́ць набе́г (*на чужы́ край*). 2. разраста́цца: ***Vines overran the wall*** Вінагра́д разро́сься на ўсю́ сьцяну́. 3. перадо́ўжваць, перабіра́ць (*да́дзены час*): ***The speaker overran the time set for him*** Прамо́ўца перабра́ў да́дзены ямў час. 4. пераліва́цца, цячы́ празь верх

oversea [ˌoʊvərˈsi:] adv., [ˈoʊvərsi:] adj. *гл.* **overseas**

overseas [ˌoʊvərˈsi:z] – adv. за мо́рам; за мяжо́ю

– adj. [ˈoʊvərsi:z] замо́рскі, заме́жны: ***overseas trade*** замо́рскі або́ заме́жны га́ндаль

overseer [ˌoʊvərˈsi:ər] n. 1. наглядчык -а *m.*, наглядчыца *f.*; надзо́рлац -ца *m.* 2. Can. (*у некато́рых правінцыях*) галава́ гарадзко́е ра́ды

overshadow [ˌouvərˈʃædou] v. 1. зацьмява́ць *каго́* (*ва́жнасьцю*). 2. зацямня́ць, засьці́ць; заслання́ць

overshoe [ˈouvərʃu:] n. галёш, бо́ці́к -а *m.*

oversight [ˈouvərsaɪt] n. 1. недагля́д -у *m.*, хі́ба *f.*; нядба́йнасьць *f.* 2. нагля́д -у *m.*

oversize [ˈouvərsaɪz] – adj. празьме́рны, завялі́кі

– n. памер, бо́льшы як патрэ́бны *або́* бо́льшы за звыча́йны

oversleep [ˌouvərˈsli:p] v., **-slept, sleeping** праспа́ць, заспа́цца, заспа́ць

overstate [ˌouvərˈsteɪt] v. перабо́льшваць, перавялі́чваць

overstatement [ˌouvərˈsteɪtmənt] n. перабо́льшаньне *n.*

overstay [ˌouvərˈsteɪ] v. засе́дзецца, загасьцява́цца, загасьці́цца

overstep [ˌouvərˈstep] v. 1. перасяга́ць, перакро́чваць. 2. пераступа́ць

overstrain [ˌouvərˈstreɪn] – v. перапру́жваць|ь (-ца), ператамля́ць

– n. празьме́рнае напру́жаньне

overstrict [ˌouvərˈstrɪkt] adj. празьме́рна стро́гі, застро́гі; празьме́рна патрабава́льны

overstrung [ˌouvərˈstrʌŋ] adj. зашма́т наця́гнуты *або́* напру́жаны; зана́дта нэрво́вы, празьме́рна ўра́жлівы: ***overstrung nerves*** празьме́рна напру́жаныя нэ́рвы

overtake [ˌouvərˈteɪk] v., **-took, -taken, taking** 1. даганя́ць і пераганя́ць. 2. захапля́ць зьняна́цку *або́* зьнячэ́ўку: ***A storm overtook the children*** Дзяцёй зьнячэ́ўку захапі́ла навальні́ца

overtax [ˌouvərˈtæks] v. 1. наклада́ць празьме́рныя пада́ткі. 2. перагружа́ць

overthrow [ˌouvərˈθrou] – v., **-threw, -thrown, -throwing** 1. скіда́ць (*ура́д, уладара́*). 2. скасо́ўваць; зьнішча́ць: ***to overthrow slavery*** скасава́ць нявво́льніцтва. 3. пераку́льваць

– n. 1. пераваро́т -у *m.*; скасава́ньне *n.* 2. разбурэ́ньне, папсава́ньне *n.* (*напр. чыі́х-н. пля́наў*)

overtime [ˈouvərtaɪm] – n. 1. звыш ча́су: ***overtime work*** пра́ца звыш усталява́нага ча́су; ***overtime pay*** пла́та за таку́ю пра́цу. 3. (*у спо́рце*) дадатко́вы час, овэрта́йм -у *m.*

– adj. звышчасо́вы; звышпрагра́мны

overtook [ˌouvərˈtuk] n., *p.t. of* **overtake**

overture [ˈouvərtʃur] n. 1. залёт -у *m.*, прапано́ва *f.* 2. увэрту́ра *f.*

overturn [ˌouvərˈtɜ:rn] – v. 1. пераку́льваць. 2. пераку́львацца, пераваро́чвацца, перакіда́цца (*і пра чо́вен*). 3. скіда́ць (*ура́д*)

– n. 1. пераваро́т -у *m.* 2. перакуле́ньне *n.*

overuse [ˌouvərˈju:s] n. празьме́рнае ўжыва́ньне

overweening [ˌouvərˈwi:nɪŋ] adj. пыхлі́вы; самаўпэ́ўнены, празьме́рна самана дзе́йны; наха́бны, бесцырымо́нны

overweight [ˈouvərweɪt] – adj. зацяжкі́, заважкі́, затаўсты́

– n. 1. залі́шняя ва́га. 2. лі́шак вагі́, перава́жка *f.*, гак -у *m.*

– v. [ˌouvərˈweɪt] перагружа́ць (*ваго́н*)

overwhelm [ˌouvərˈhwelm] v. 1. ахапля́ць; апано́ўваць (*пра пачу́цьці*). 2. ашаламля́ць, ура́жваць, прыбіва́ць: ***overwhelmed with grief*** прыбі́ты го́рам. 3. залі́ва́ць, пакрыва́ць, закі́дваць (*напр. пыта́ньнямі*)

overwhelming [ˌouvərˈhwelmɪŋ] adj. 1. прыгнята́льны. ашаламля́льны. 2. перава́жны: ***an overwhelming majority of votes*** перава́жная бальшыня́ галасо́ў

overwork [ˈouvərwɜ:rk] – n. 1. перапрацава́насьць *f.*, празьме́рна цяжка́я пра́ца. 2. дадатко́вая пра́ца

– v. [ˌouvərˈwɜ:rk] 1. працава́ць зана́дта ця́жка *або́* до́ўга. 2. перапрацо́ўвацца; перамо́ўчвацца; перамо́ўчваць. 3. зана́дта дакла́дна, празь ме́ру апрацо́ўваць (*кні́гу, прамо́ву*). 4. аздабля́ць. упрыго́жваць усю́ паве́рхню чаго́-н.

ovum [ˈouvəm] n., *pl.* **ova**, Biol. яйцо́ *n.*, яйцакле́тка *f.*

owe [ou] v., **owed, owing** 1. быць вінава́тым. 2. быць абавя́заным, быць у даўгу́: ***We owe a great deal to our parents*** Мы шмат чым абавя́заны на́шым бацька́м

owing ['ouɪŋ] adj. 1. ві́нны, ві́нен; вінава́ты: ***a man owing money*** чалаве́к вінава́ты гро́шы. 2. нале́жны: ***pay what is owing*** заплаці, што нале́жыць. 3. які́ выніка́е з *чаго́* ***owing to*** з прычы́ны *чаго́*; дзя́куючы *таму́*; у вы́ніку *чаго́*, праз *што*

owl [aul] n. сава́ *f.*

owlet ['aulət] n. савяня́ *n.*

owlish ['aulɪʃ] adj. саві́ны; падо́бны да савы́

own [oun] – adj. 1. со́бскі, ула́сны: ***The house is her own*** Дом е́йны ўла́сны. 2. ро́дны: ***my own father*** мой ро́дны ба́цька

– n. со́бскасьць

– v. 1. мець (*як ула́снасьць*): ***He owns much land*** Ён ма́е шмат зямлі́. 2. прызнава́ць сваі́м: ***He owned his guilt*** Ён прызна́ў сваю́ віну́; ***His father will not own him*** Яго́ны ба́цька не прызнае́ яго́ сваі́м

• ***come into one's own*** а) атрыма́ць нале́жнае. б) дасягну́ць уда́чы *або́* прызна́ньня

• ***hold one's own*** настая́ць на сваі́м, не саступа́ць

• ***of one's own*** свой, ула́сны: ***I have nothing of my own*** Я нічо́га ня ма́ю свайго́

• ***on one's own,*** Informal самасто́йна; на сваю́ адка́знасьць, на сваé сро́дкі: ***He was on his own*** Ён му́сіў сам сабе́ дава́ць ра́ды

owner ['ounər] n. со́бсьнік, ула́сьнік, улада́льнік -а, гаспада́р -а́ *m.*

ownerless ['ounərləs] adj. безгаспада́рны (*пра маёмасьць*), без ула́сьніка

ownership ['ounərʃɪp] n. улада́ньне *n.* чым-н.; ула́снасьць *f.*; пра́ва на ўла́снасьць

ox [ɑ:ks] n., pl. **oxen** вол вала́ *m.*

oxbow ['ɑ:ksbou] n. 1. ярмо́ *n.* 2. за́вадзь *f.*

oxcart ['ɑ:kskɑ:rt] n. воз запрэ́жаны вала́мі

oxidation [ˌɑ:ksɪ'deɪʃən] n. акісьле́ньне *n.*

oxide ['ɑ:ksaɪd] n. во́кіс -у *m.*

oxidize ['ɑ:ksədaɪz] v. 1. акісьля́ць (-ца). 2. іржаве́ць

oxtail ['ɑ:kstеɪl] n. вало́вы *або́* каро́він хвост (*мя́са на суп*)

oxygen ['ɑ:ksɪdʒən] – n. кісларо́д -у *m.*

– adj. кісларо́дны

oxygenate ['ɑ:ksɪdʒəneɪt] v. 1. насыча́ць кісларо́дам. 2. акісьля́ць

oyster ['ɔɪstər] n. 1. ву́стрыца *f.* 2. Informal ве́льмі замкну́ты, маўкліві́ чалаве́к: ***oyster farm*** ву́стрычны пруд

oz., *abbr. of* **ounce, ounces** у́нцыя *f.*

ozone ['ouzoun] n. азо́н -у *m.*

ozoniferous [ˌouzə'nɪfərəs] adj. які́ ма́е ў сабе́ азо́н

P

P, p [pi:] n.,pl. **P's** or **p's** *шасна́ццатая лі́тара анге́льскага альфаба́ту*

pa [pɑ:] n., Informal та́та, тат'

pabulum ['pæbjələm] n. 1. е́жа, пажы́ва *f.* 2. духо́ўная пажы́ва

pace [peɪs] – n. 1. хада́ *f.*; ху́ткасьць *f.*, тэмп -у *m.* 2. крок -у *m.*, даўжыня́ кро́ку. 3. спо́саб хады́ *або́* бе́гу каня́ (*рысь, галёп*), алю́р -у *m.* 4. і́нахадзь *f.* (*ко́нскі бег*); ***keep pace with*** не адстава́ць ад *кага́*, ісьці́ наро́ўні з *кім*; ***set the pace*** а) задава́ць тэмп. б) быць прыкладам для і́ншых
– v. 1. задава́ць тэмп *або́* ху́ткасьць (*у спабо́рніцтвах*). 2. кро́чыць, хадзі́ць; ***pace the floor*** хадзі́ць сюды́-туды́ па пако́і, ме́раць кро́камі пако́й. 3. ісьці́ звыча́йным кро́кам. 4. ме́раць, вымяра́ць кро́кам. 5. практыкава́ць (*каня́*). 6. ісьці́ і́нахадзьдзю (*пра каня́*)

pacemaker ['peɪsmeɪkər] n. 1. стымуля́тар се́рца. 2. рэгуля́тар ры́нку. 3. лі́дэр -а *m.*; задава́льнік то́ну

pacific [pə'sɪfɪk] adj. 1. мі́рны, міралю́бны, міратво́рны: ***a pacific nation*** міралю́бны наро́д. 2. спако́йны, ці́хі: ***a pacific nature*** спако́йная нату́ра

pacification [ˌpæsɪfɪ'keɪʃən] n. уціхамі́рваньне, здушэ́ньне *n.* (*бу́нту, паўста́ньня*)

pacifier ['pæsɪfaɪər] n. 1. міратво́рац -ца *m.* 2. со́ска-пусты́шка *f.*

pacifism ['pæsɪˌfɪzəm] n. пацыфі́зм -у *m.*

pacifist ['pæsɪfɪst] n. пацыфі́ст -а *m.*

pacify ['pæsɪfaɪ] v., **-fied**, **-fying** 1. супако́йваць; сьціша́ць. 2. уціхамі́рваць, здуша́ць (*бу́нт, паўста́ньне*)

pack I [pæk] – n. 1. клу́нак -ка, па́чак -ка, паке́т -а *m.*; вя́зка *f.* 2. гру́па, ба́нда *f.*; мно́ства *n.*: ***a pack of crooks*** ба́нда круцялёў; ***a pack of nonsense*** адна́ лухта́. 3. зграя́ *f.*: ***a pack of dogs*** саба́чая гайня́; ***a pack of wolves*** во́ўчая зграя́. 4. кало́да *f.* (*ка́ртаў*). 5. арганізацы́йная адзі́нка ў ска́ўтынгу
– v. 1. склада́ць (*у што-н.*). 2. склада́цца, пакава́цца (*пе́рад ад'е́здам*). 3. запако́ўваць(ца): ***Pack your trunk*** Запаку́й бага́жнік. 4. запаўня́ць, перапаўня́ць; упі́хваць. уціска́ць: ***A hundred men were packed into one small room*** У адзі́н малы́ пако́й было́ ўці́снута сто чалаве́к
• ***pack off*** or ***away*** а) пасыла́ць, адпраўля́ць: ***The child was packed off to bed*** Дзіця́ адпра́вілі спаць. б) рапто́ўна пайсьці або́ пае́хаць; выехаць
• ***pack up*** Informal а) сапсава́цца; перастаць дзе́яць. б) памёрці

pack II [pæk] v. запаўня́ць сваі́мі прыхі́льнікамі: ***to pack a jury*** падбіра́ць прыхі́льных сабе́ прыся́жных

package ['pækɪdʒ] – n. 1. клу́нак, паку́нак, па́чак -ка *m.* 2. упако́ўка *f.*
– v.t. уклада́ць у клу́нкі. 2. рабі́ць паку́нкі, па́чкі; пакава́ць

packer [ˈpækər] n. 1. упако́ўшчык -а *m.*, упако́ўшчыца *f.* 2. нарыхто́ўшчык -а *m.*, нарыхто́ўшчыца *f.* (*садавіны́, гаро́дніны*)

packet [ˈpækət] n. 1. паке́т -а, малы́ па́чак, скру́тлак -ка *m.*: ***a packet of cigarettes*** па́чак цыгары́таў. 2. пашто́вы карабе́ль

packhorse [ˈpækhɔ:rs] n. ую́чны конь

packing [ˈpækɪŋ] n. 1. упако́ўка, закако́ўка *f.*; ушчыльне́ньне (*матэрыя́л*) *n.* 2. нарыхто́ўка мя́са, садавіны́, гаро́дніны для про́дажу

pact [pækt] n. міжнаро́дная дамо́ва, пагадне́ньне; пакт -у *m.*

pad I [pæd] n. 1. мя́ккая набі́ўка, падкла́дка *f.*; паду́шка *f.*: ***shoulder pad*** наплі́чнік -а *m.* 2. мя́ккае сядло́. 3. а) паду́шачка *f.* (*на ступня́х у саба́кі, лісі́цы*). б) ла́па (*саба́кі, лісі́цы*). 4. ліст бе́лага гарла́чыка. 5. блёк папе́ры (*для піса́ньня, малява́ньня*). 6. паду́шачка для пяча́ткі

padding [ˈpædɪŋ] n. 1. набі́ўка *f.*, матэрыя́л для напіха́ньня. 2. непатрэ́бныя сло́вы ў прамо́ве або́ пісьмо́вай пра́цы

paddle I [ˈpædəl] – n. 1. вясло́ *n.* 2. весла́ва́ньне *n.* 3. лапа́тка грабно́га ко́ла
– v. 1. весла́ва́ць. 2. плы́сьці вяслу́ючы. 3. Informal адшлёпаць

paddle II [ˈpædəl] v. 1. плю́хацца (*у вадзе́*). 2. пля́скаць, ля́паць (*па вадзе́*)

paddle III [ˈpædəl] n. плаўні́к -а *m.* (*у ка́чкі*)

paddock [ˈpædək] n. вы́ган для ко́ней

padlock [ˈpædlɔ:k] – n. віся́чы замо́к
– v. замкну́ць на віся́чы замо́к

pagan [ˈpeɪgən] – n. пага́нін -а, пага́нлец -ца, язы́чнік -а *m.*; пага́нка, язы́чніца *f.*
– adj. 1. пага́нскі, язы́чніцкі. 2. нехрысьція́нскі

paganism [ˈpeɪgənˌɪzəm] n. пага́нства, язы́чніцтва *n.*

page I [peɪdʒ] – n. 1. старо́нка, бало́нка, бачы́на *f.* 2. пэры́яд -у *m.*, эта́п у гісто́рыі
– v. нумарава́ць старо́нкі

page II [peɪdʒ] n. 1. хлапе́ц для пасы́лак, пабяга́ч пабегача́, пасы́льны -ага *m.* 2. паслу́жнік -а *m.* (*у парля-мэ́нце*). 3. паж (*у бібліятэ́цы*). 4. Hist. паж -а *m.*

pageant [ˈpædʒənt] n. 1. пы́шнае відо́вішча; працэ́сія *f.*; по́мпа *f.* 2. дзе́йства (*інсцэніро́ўка зь гісто́рыі ці леге́ндаў*): ***beauty pageant*** спабо́рніцтвы прыгажо́сьці

pageantry [ˈpædʒəntri] n.,**-ries** 1. пы́шнасьць, пара́днасьць *f.*, бляск -у *m.*, по́мпа *f.* 2. відо́вішча на пака́з

pagination [ˌpædʒɪˈneɪʃən] n. нумара́цыя старо́нак, пагіна́цыя *f.*

paid [peɪd] – adj. 1. пла́тны, наня́ты (*рабо́тнік*). 2. вы́плачаны (*доўг, пазы́ка*). 3. запла́чаны
– v., *p.t. and p.p. of* **pay I**

pail [peɪl] n. вядро́ *n.*; вядзе́рца *n.*

paillasse or **palliaze** [pæˈljæs] n. сяньні́к сеньніка́ *m.*

pain [peɪn] – n. 1. бо́ль -ю *m.*, цярпе́ньне *n.*: ***to be in pain*** адчува́ць боль; цярпе́ць; ***a sharp pain in one's back*** во́стры боль у сьпі́не; ***on*** or ***under pain of*** пад пагро́зай чаго́-н.; ***pain in the neck,*** Sl. даку́члівы чалаве́к *або́* рэч
– v. 1. рабі́ць балю́ча, спрычыня́ць боль; му́чыць *каго́*. 2. боле́ць
• ***pains,*** pl. а) турбо́ты, намага́ньні, стара́ньні: ***to take pains*** прыклада́ць стара́ньні, стара́цца, турбава́цца. б) радзі́льныя бо́лі

pained [peɪnd] adj. 1. пакры́ўджаны; засму́чаны. 2. збале́лы, спаку́таваны, зму́чаны: ***a pained face*** зму́чаны твар

painful [ˈpeɪnfəl] adj. 1. балю́чы; непрые́мны, клапатлі́вы: ***a painful illness*** боле́сная хваро́ба; ***a painful problem*** балю́чае пыта́ньне; ***a painful duty*** непрые́мны абавя́зак. 2. цяжкі

painfully [ˈpeɪnfəli] adv. балю́ча

painkiller [ˈpeɪnˌkilər] n. болеспато́льны *або́* болесуцяша́льны сро́дак

painkilling [ˈpeɪnkilɪŋ] adj. болеспато́льны, болесуцяша́льны.

painless [ˈpeɪnləs] adj. безбале́сны, бяз бо́лю

painlessly [ˈpeɪnləsli] adv. безбале́сна

painstaking [ˈpeɪnzˌteɪkɪŋ] adj. карпатлі́вы, стара́нны, дакла́дны

painstakingly [ˈpeɪnzˌteɪkɪŋli] adv. карпатлі́ва, стара́нна, дакла́дна

paint [peɪnt] – n.1. фа́рба *f.* 2. румя́ны *pl. only.* (*касмэ́тыка для тва́ру*)
– v. 1. фарбава́ць (*дом, ткані́ну, ву́сны*). 2. малява́ць, піса́ць (*карці́ну*). 3. апі́сваць, во́бразна прадстаўля́ць сло́вамі
• ***paint black*** падава́ць у чо́рным сьвятле́
• ***paint bright*** падава́ць у ружо́вым сьвятле́, ідэалізава́ць

paintbrush [ˈpeɪntbrʌʃ] n. пэ́ндзаль -ля *m.*, пэ́ндзлік -а *m.*

painter [ˈpeɪntər] n. 1. жывапі́сец -ца *m.*; маста́к -а́ *m.*, маста́чка *f.* 2. маля́р -а́ *m.* (*які́ фарбу́е дамы́*)

painting [ˈpeɪntɪŋ] n. 1. малю́нак -ка *m.*, карці́на *f.*, абра́з -у *m.* 2. жы́вапіс -у *m.*, выяўле́нчае маста́цтва *n.* 3. маля́ва́ньне; фарбава́ньне *n.*

pair [per] – n., **pairs** *або́ ча́сам пасьля́ лічэ́бнікаў* **pair** 1. па́ра *f.*: ***a pair of shoes (horses)*** па́ра чарави́каў (ко́ней); ***a pair of scissors*** нажні́цы; ***a pair of trousers*** нагави́цы; ***six pairs of socks*** шэсьць па́раў шкарпэ́так. 2. жані́мская *або́* зару́чаная па́ра; па́ра (*у та́нцы, у ка́ртах*)
– v. 1. разьмяшча́ць (-ца), расстаўля́ць (-ца) па́рамі, дабіра́цца. 2. спалуча́цца шлю́бам
• ***pair off*** разьдзяля́ць (-ца) на па́ры; спа́рваць (-ца); аб'яднó ўваць у па́ры для сумéснай рабóты

pal [pæl] – n. ся́бра -ы *m.*, тава́рыш -а *m.*; партнэ́р -а *m.*, партнэ́рка *f.*
– v. сябрава́ць

palace [ˈpæləs] n. пала́ц -а *m.*

palatable [ˈpælətəbəl] adj. 1. смакаві́ты, сма́чны; прые́мны. 2. прыма́льны

palatal [ˈpælətəl] adj.1. паднябе́нны (*напр. косьць*). 2. Phon. паднябе́нны, пала́тальны; мя́ккі, зьмя́кчаны (*гук*)

palate [ˈpælət] n. 1. паднябе́ньне *n.* 2. смак -у *m.* (*пачуцьцё*). 3. схі́льнасьць *f.*: ***to have a palate for wine*** зна́цца на ві́нах

pale I [peɪl] – adj. 1. бляды́, бле́дны. 2. цьмя́ны. 3. слабы́; вя́лы; няя́сны, невыра́зны (*пра ко́лер*)
– v. бляднéць

pale II [peɪl] n. 1. кол кала́ *m.* (*у плóце*). 2. мяжа́ *f.*

palette [ˈpælət] n. 1. пали́тра *f.* 2. камплéкт фа́рбаў на пали́тры. 3. падбóр фа́рбаў у твóрчасьці мастака́

palisade [ˌpælɪˈseɪd] – n. 1. частако́л -у *m.* 2. кол з частако́лу
– v.t. абвéсьці, абгарадзі́ць частако́лам
• ***palisades,*** pl. рад стрóмкіх ска́лаў

pall [pɔ:l] n. 1. по́крыва *n.* (*на труне́*). 2. цёмнае пану́рае по́крыва (*наагу́л*): ***a pall of smoke*** цёмнае по́крыва ды́му, дымава́я завéса

pallbearer [ˈpɔ:lˌberər] n. асóба, яка́я нясé *або́* суправаджа́е труну́ (*у ча́се пахо́вінаў*)

pallet [ˈpælət] n. 1. пасьцéль з салóмы, сяньні́к сеньніка́ *m.* 2. малы́, прóсты ло́жак; на́ры *pl. only*, палóк -ка́ *m.*, пол пала́ *m.* (*у сяля́нскай ха́це*)

pallid [ˈpælɪd] adj. бляды́, бле́дны (*твар*); бле́клы (*ко́лер*); слабы́

pallor [ˈpælər] n. бле́днасьць *f.*

palm I [pɑ:lm] – n. 1. далóнь, даланя́ *f.* (*і адзі́нка ме́ры*), далóнька *f.* 2. ступня́ пярэ́дняе ла́пы ў зьвяро́ў
– v. 1. хава́ць у руцэ́. 2. Informal дава́ць *або́* браць ха́бар. 3. дакрана́цца руко́ю
• ***grease the palm of*** дава́ць ха́бар, падма́зваць, падкупля́ць
• ***have an itching palm*** быць пра́гным на гро́шы
• ***palm off*** усу́нуць *або́* вы́цягнуць ашука́нствам

palm II [pɑ:lm] n. 1. па́льма *f.* 2. перамóга *f.*, трыю́мф -у *m.*
• ***bear or carry off the palm*** быць перамóжцам, атрыма́ць па́льму першынства́

• ***yield the palm to*** уступі́ць па́льму першынства́, прызна́ць сябе́ пераможаным

palm oil 1. па́льмавы алей. 2. Brit., Sl. гро́шы, да́дзеныя як ха́бар

Palm Sunday ве́рбная нядзе́ля, ве́рбніца *f.*

palpable [ˈpælpəbəl] adj. 1. відаво́чны, выра́зны, я́ўны: ***a palpable error*** відаво́чная памы́лка. 2. адчува́льны, зна́чны; які́ ўспрыма́ецца до́тыкам, во́бмацкам

palpate [ˈpælpeɪt] v. абма́цваць, пальпава́ць, дасьле́даваць абма́цваньнем (*хво́рага*)

palpitate [ˈpælpɪteɪt] v.i. 1. мо́цна бі́цца (*пра се́рца*). 2. дрыжэ́ць, трэ́сьціся (*ад стра́ху*)

palpitation [ˌpælpɪˈteɪʃən] n. 1. біцьцё *n.* (*се́рца*), пульса́цыя *f.* 2. трапята́ньне, дрыжа́ньне *n.*

palpus [ˈpælpəs] n., pl. **palpi** шчу́пальца *n.* (*у шасьці́но́жкі, павуко́ў, ра́каў*)

palsy [ˈpɔ:lzi] – n., **-sies** пара́ліч, пара́люш -у *m.*
– v. параліжава́ць

pampas [ˈpæmpəs] – n., pl. пампа́сы *pl.* (*паўдзённаамэрыка́нскія стэ́пы*)
– adj. пампа́савы

pamper [ˈpæmpər] v. пе́сьціць, расьпе́шчваць

pampered [ˈpæmpərd] adj. расьпе́шчаны

pamphlet [ˈpæmflət] n. 1. брашу́ра *f.* 2. памфле́т -у *m.*

pamphleteer [ˌpæmfləˈtir] – n. памфлетты́ст -а *m.*, памфлетты́стка *f.*
– v. піса́ць і публікава́ць памфле́ты

pan [pæn] – n. 1. патэ́льня; ро́нд|аль -ля *m.*, кастру́ля *f.* 2. мі́са, мі́ска *f.* (*і да мыцьця́*). 3. Geol. падгле́бавы пласт. 4. ша́ля *f.* (*у ва́гах*)
– v. 1. вары́ць у кастру́лі, пячы́ ў патэ́льні. 2. ***to pan gold*** прамыва́ць залатано́сны пясо́к. 3. Informal во́стра крытыкава́ць, разно́сіць

panacea [ˌpænəˈsi:ə] n. панацэ́я *f.*, універса́льны сро́дак

pancake [ˈpænkeɪk] n. блін -а́ *m.*, блінцо́к -ка́ *m.*; але́дка *f.*

pancreas [ˈpæŋkriəs] n. падстра́ўнікавая зало́за

pandemonium [ˌpændəˈmoʊniəm] n. 1. сядзі́ба ўсіх чарце́й, пе́кла *n.* 2. ме́сца непара́дку *або́* беззако́ннасьці. 3. сумятня́ *f.*, бязла́дзьдзе *n.*, гармі́дар, вэ́рхал -у *m.*

pander [ˈpændər] – n. зво́днік -а *m.*, зво́дніца *f.*
– v.t. зво́днічаць; падбухто́рваць да дрэ́нных учы́нкаў

pane [peɪn] n. шы́ба, шы́біна *f.* (*у акне́, дзьвяра́х*)

panegyric [ˌpænəˈdʒɪrɪk] n. панегі́рык -у *m.*

panegyrist [ˌpænəˈdʒɪrɪst] n. панегірыст -а *m.*, панегірыстка *f.*

panel [ˈpænəl] – n. 1. панэ́ль, філёнга *f.* (*у дзьвяра́х*). 2. по́лка *f.* (*у су́кні*) 3. даўга́я ву́зкая карці́на *або́* фатагра́фія. 4. сьпіс прысяжны́х су́дзьдзяў; прысяжны́я су́дзьдзі. 5. дыскусі́йная група
– v.t. абабіва́ць панэ́ляй; ашалёўваць

pang [pæŋ] n. 1. раптоўны во́стры боль. 2. паку́та *f.*: ***a pang of remorse*** дако́ры сумле́ньня

panic [ˈpænɪk] – n. 1. па́ніка *f.*, пярэ́палах -у *m.*, сумятня́ *f.* 2. Sl. ве́льмі забаўная асо́ба *або́* рэч
– adj. пані́чны
– v. 1. мо́цна хвалява́цца, нэрвава́цца, панікава́ць. 2. мо́цна забаўля́ць, выкліка́ць захапле́ньне

panicky [ˈpænɪki] adj. ахо́плены па́нікай; пані́чны, панікёрскі

panicstricken [ˈpænɪkˌstrɪkən] adj. ахо́плены пані́чным стра́хам

panorama [ˌpænəˈræmə] n. 1. панара́ма *f.* а) шыро́кі від на вако́ліцу. б) малю́нак краяві́ду. 2. по́ўны агля́д яко́га-н. прадме́ту

panoramic [ˌpænəˈræmɪk] adj. панара́мны

pansy [ˈpænzi] – n., **-sies** 1. бра́ткі *pl. only* (*кве́ткі*). 2. Sl. гомасэксуалі́ст -а *m.*; жанчы́нападо́бны мужчы́на

– adj. Sl. гомасэксуа́льны; жанчы́-нападо́бны

pant [pænt] v. 1. ця́жка й ча́ста ды́хаць, задыха́цца. 2. гаварыць задыха́ючыся. 3. мо́цна пра́гнуць, тужы́ць

panther [ˈpænθər] n. **-thers,** esp. coll. **-ther** пантэ́ра *f.*

panties [ˈpæntiz] n. 1. жано́чыя тру́сікі, ма́йткі *pl.* 2. дзіця́чыя по́ртачкі

pantomime [ˈpæntəmaɪm] – n. пантамі́ма *f.*

– v. выка́заць што-н. жэ́стамі

pantry [ˈpæntri] n., pl. **-tries** кладо́ўка *f.*; палі́чкі (*для по́суду, прадукта́ў*)

pants [pænts] n., pl., Informal 1. нагавіцы, по́ркі, штаны́ *pl. only.* 2. спо́днікі; жано́чыя по́ртачкі

papa [ˈpɑːpə] n. ба́цькa -і *m.*, та́тa -ы *m.*

papacy [ˈpeɪpəsi] n., pl. **-cies** 1. па́пства а) паса́да, ула́да па́пы. б) пэры́яд ула́ды па́пы. 2. усе́ па́пы

papal [ˈpeɪpəl] adj. па́пскі

paper [ˈpeɪpər] – n. 1. папе́ра *f.*: ***ruled paper*** лінава́ная папе́ра. 2. дакумэ́нт -у *m.*, папе́ры *pl.* 3. газэ́та *f.* 4. артыку́л -у *m.*, эсэ́ *n.* 5. пісьмо́вы экза́мэн. 6. вэ́кcаль -ля *m.*, банкно́ты. 7. папяро́выя гро́шы. 8. шпале́ры *pl. only.*

– adj. 1. папяро́вы; для папе́ры. 2. які́ існу́е то́лькі на папе́ры, тэарэты́чны: ***His paper profits disappeared*** Яго́ныя прыбы́ткі на папе́ры зьні́клі

– v. 1. заго́ртваць, закру́чваць у папе́ру. 2. абкле́йваць шпале́рамі. 3. Sl. запаўня́ць тэа́тр гледача́мі без апла́ты

• ***on paper*** а) на папе́ры (*запіса́на, але́ ня вы́канана*). б) у тэо́рыі

• ***papers*** пасьве́дчаньне асо́бы

paperback [ˈpeɪpərbæk] n. кні́га ў мя́ккай во́кладцы

paperboy [ˈpeɪpərbɔɪ] n. газэ́тчык -а *m.*, прадаве́ц газэ́таў

paper hanger абі́ўнік, шпале́рнік -а *m.*

paper knife нож для папе́ры

paperweight [ˈpeɪpərweɪt] n. прыціска́ч -а́ *m.*(*для папе́ры*), прэс-пап'е́ *n., indecl.*

paperwork [ˈpeɪpərwɜːrk] n. 1. пісані́на ды і́ншая канцыля́рская пра́ца. 2. пісьмо́вая пра́ца ву́чня

papery [ˈpeɪpəri] adj. то́нкі, як папе́ра; папяро́вы, як папе́ра

pappus [ˈpæpəs] n., pl. **pappi** Bot. пушло́к -ка́ *m.* (*на насе́ньні асо́ту або́ дзьмухаўца́*)

pappy [ˈpæpi] adj. мя́ккі, як мя́зга

paprica [pəˈpriːkə] n. па́прыка *f.*

papyrus [pəˈpaɪrəs] n., **-ri** папі́рус -а і -у *m.*

parabola [pəˈræbələ] n.,**-las** Geom. пара́бала *f.*

parabole [ˈpærəbəl] n. 1. прыпавесьць *f.* 2. алего́рыя *f.*

parabolic [ˌpærəˈbɑːlɪk] adj. парабалі́чны

parachute [ˈpærəʃuːt] – n. парашу́т -а *m.*

– v. 1. спуска́цца з парашу́там. 2. скіда́ць з парашу́там

parachutist [ˈpærəʃuːtɪst] n. парашуты́ст -а *m.*

parade [pəˈreɪd] – n. 1. пара́д -а *m.*; урачы́сты марш, працэ́сія. 2. выстаўля́ньне напака́з: ***to make a parade of*** выстаўля́ць напака́з, задава́цца, выхваля́цца. 3. ме́сца, дзе адбыва́ецца пара́д. 4. вайско́вы пака́з, агля́д во́йска. 5. пляцо́ўка для вайско́вых вучэ́ньняў, пара́даў, пляц-пара́д

– v. 1. ісьці́ пара́дам напака́з. 2. ісьці́ ў працэ́сіі. 3. выстаўля́ць напака́з. 4. стро́іць (-ца) для вайско́вага агля́ду *або́* інспэ́кцыі; маршыра́ваць

parade ground пляцо́ўка для вайско́вых вучэ́ньняў, пара́даў, пляц-пара́д

paradise [ˈpærədaɪs] n. раі́й -ю *m.*

paradox [ˈpærədɑːks] n. парадо́кс -у *m.*

paradoxical [ˌpærəˈdɑːksɪkəl] adj. парадакса́льны

paraffin [ˈpærəfɪn] – n. парафі́н -у *m.*

– adj. парафі́навы

paragraph [ˈpærəgræf] – n. 1. абза́ц -а *m.*, пара́граф -а *m.*: ***to begin a new paragraph*** пача́ць з адсту́пу. 2. газэ́тная за́цемка, ната́тка *f.*

– v. 1. дзяліць на пара́графы. 2. піса́ць за́цемкі ў газэ́ту

parallel [ˈpærəlel] – adj. 1. паралéльны; Geogr. шырынны. 2. падóбны да чагó-н., аналягíчны: ***parallel instance*** аналягíчны выпадак
– n. 1. паралéльная лíнія *абó* павéрхня, паралéль *f.* 2. Geogr. паралéль *f.* 3. адпавéднасьць, аналёгія *f.* 4. параўнáньне *n.*: ***To draw a parallel between this winter and last winter*** Правéсьці параўнáньне памíж гэ́тай і лéташняй зíмамі. 5. Electr. паралéльнае злучэ́ньне
– v. 1. быць паралéльным, прахóдзіць паралéльна да чагó-н.: ***The street parallels the railway*** Вýліца ідзé паралéльна да чыгýнкі. 2. адпавядáць. 3. параўнóўваць

paralysis [pəˈræləsɪs] n., pl. **-ses** (-sez) парáлюш, парáліч -у *m.*

paralytic [ˌpærəˈlɪtɪk] – adj. 1. паралíтычны (*прыпáдак*). 2. паралізавáны
– n. паралíтык -а *m.*

paralyze, Brit. **paralyse** [ˈpærəlaɪz] v. паралізавáць

paramount [ˈpærəmaʊnt] adj. першарáдны, надзвычáйны (*мэ́та, значэ́ньне*)

paranoia [ˌpærəˈnɔɪə] n. паранóя *f.*

paranoiac [ˌpærəˈnɔɪæk] – n. паранóік -а *m.*; хвóры на паранóю
– adj. паранаíчны

parapet [ˈpærəpɪt] n. 1. парапэ́т -а *m.*, (*невысóкая сьцянá, агарóджа ўздóўж балькóну, страхí*). 2. вал -у, нáсып -у *m.* (*для ахóвы ад вóрага*)

paraphrase [ˈpærəfreɪz] – v. перакáзваць, перафразóўваць
– n. перакáз -у *m.*, парафрáза *f.*

parasite [ˈpærəsaɪt] n. паразы́т -а *m.*, паразы́тка *f.*; дармаéд -а *m.*

parasitic(al) [ˌpærəˈsɪtɪkəl] adj. 1. паразы́тны (*пра расьлíны, чэ́рві*). 2. паразыты́чны. 3. паразытáрны (*пра захвóрваньні*)

parasol [ˈpærəsɔ:l] n. парасóн -а *m.* (*ад сóнца*)

paratroops [ˈpærətru:ps] n., pl. дэсáнтныя вóйскі

parcel [ˈpɑ:rsəl] – n. 1. пакýнlак, клýнlак -ка *m.*, пáчка *f.* 2. дзяля́нка *f.*: ***a parcel of land (forest)*** дзяля́нка зямлí (лéсу). 3. грýпа *f.*; кýча, бáнда *f.*: ***a parcel of scamps*** бáнда нягóднікаў
– v., **-celed, celed** or (esp. Brit.) **-celled, -celling** пакавáць (*у пáчку*). 2. ***to parcel out*** дзялíць на дзяля́нкі, раздавáць дзяля́нкі, чáсткі

parch [pɑ:rtʃ] v. 1. лёгка падсмáжваць, прáжыць (*ячмéнь, кукурýзу*), сушы́ць . 2. палíць, пячы́ (*пра сóнца*), выклікáць смáгу. 3. перасыхáць (*пра рот, гóрла*), сьмя́гнуць (*пра вýсны*): ***parched lips*** пасьмя́глыя вýсны

parchment [ˈpɑ:rtʃmənt] n. 1. пэргáмэнт -у *m.* 2. старажы́тны рýкапіс, пíсаны на пэргáмэнце. 3. абгóртачная, пэргáмэнтная папéра

pardon [ˈpɑ:rdən] – n. 1. дараванáньне *n.* 2. выбачэ́ньне *n.* 3. памíлаваньне *n.* (*вызвалéньне асýджанага ад пакараньня*)
– v. 1. дараваць. 2. выбачáць: ***pardon (me)*** выбачáйце 3. памíлаваць

pardonable [ˈpɑ:rdənəbəl] adj. дараваль́ны; выбачáльны, прабачáльны

pare [per] v. 1. абразáць, зразáць; абіráць (*бýльбіну, я́блык*). 2. адразáць • ***pare down*** уразáць; скарачáць: ***to pare down expenses*** скарацíць выдáткі

parent [ˈperənt] n. 1. бáцькa -і *m. абó* мáці *f., indecl.* **parents** бацькí *pl.* 2. першапачáтlак -ку *m.*, крынíца, прычы́на *f.*: ***Envy is the parent of hate*** Зáйздрасьць — крынíца нянáвісьці

parentage [ˈperəntɪdʒ] n. 1. пахóджаньне (*ад бацькóў*), лíнія рóднасьці, радавóд -у *m.* 2. бацькóўства, мацяры́нства *n.*

parental [pəˈrentəl] adj. бацькóўскі

parent company галóўная фíрма, якáя кантралюе падлéглыя сабé фíрмы

parenthesis [pəˈrenθəsɪs] n., pl. **-ses** 1. пабóчнае слóва, пабóчны сказ. 2. крýглыя дýжкі

parenthesize [pəˈrenθəsaɪz] v.t. 1. браць у дýжкі. 2. устаўля́ць пабóчнае слóва *абó* пабóчны сказ. 3. зазначáць, заўважáць мімахóдзь, збóку

parenthetic [ˌpærənˈθetɪk] adj. 1. азначáльны, вытлумачáльны (*сказ абó слóва*). 2. узя́ты ў дýжкі. 3. пабóчны

parenthood [ˈperənthʊd] n. бацькóўства, мацяры́нства *n.*

pariah [pəˈraɪə] n. 1. ізгóй -я, выгнáнец -ца *m.* 2. пáрыя -і *m.*

parietal [pəˈraɪətəl] n., Anat. цемяннáя косьць

paring [ˈperɪŋ] n. 1. абрэ́зкі; лупíны *pl.* карá *f.* 2. абірáньне, абрэ́званьне лупíнаў; зьдзірáньне кары́

parish [ˈpærɪʃ] n. 1. парáфія *f.*; прыхóд -у *m.* (*царкóўны*). 2. парафія́не *pl.* 3. адміністрацы́йная акрýга

parishioner [pəˈrɪʃənər] n. парафія́нін -а *m.*, парафія́нка *f.* (*у каталікóў*); прыхаджáнін -а *m.*, прыхаджáнка *f.* (*у праваслáўных*)

Parisian [pəˈrɪʒən] – adj. пары́скі
– n. парыжáнін -а *m.*, парыжáнка *f.*

parity [ˈpærəti] n. рóўнасьць *f.*; падабéнства *абó* адпавéднасьць у якíх-н. адносінах

park [pɑ:rk] – n. 1. парк -у *m.* (*гарадскí*). 2. запавéднік -у *m.* 3. парк -у *m.* (*аўтамабíльны, трамвáйны*)
– v.t. 1. паркавáць (*аўтамабíль*). 2. стáвіць у парк (*вайскóвы трáнспарт, артылéрыю*). 3. Informal стáвіць, пакідáць

parking lot паркóўка, стаянка аўтамабíляў

parking meter аўтамáт для аплáты за паркаванне

parking ticket штраф за нелегáльнае паркаванне

parkway [ˈpɑ:rkweɪ] n. 1. алéя *f.* 2. дарóга (*дóбраўпарáдкаваная па маляўнíчых вакóліцах*). 3. аўтастрáда *f.*

parliament [ˈpɑ:rləmənt] – n. парлямэ́нт -у *m.*
– adj. парлямэ́нцкі

parliamentarian [ˌpɑ:rləmenˈteriən] n. парлямэнтáрый -я *m.*

parliamentary [ˌpɑ:rləˈmentəri] adj. парлямэ́нцкі (*палітычны лад*)

parlor, Brit. **parlour** [ˈpɑ:rlər] n. 1. гасьцёўня *f.*; гасьцíны пакóй, агýльны пакóй. 2. атэльé *n.*, *indecl.*, кабінэ́т -у *m.*: ***a beauty parlor*** салён прыгажóсьці, касмэтычны кабінэ́т; ***parlor car*** пасажы́рскі вагóн з выгóдамі

Parmesan [ˈpɑ:rməzɑ:n] n. пармэзáн -а *m.* (*гатýнак італьянскага сы́ру*)

parochial [pəˈroʊkiəl] adj. 1. парафія́льны (*напр. шкóла*). 2. абмежавáны, вýзкі: ***a parochial viewpoint*** абмежавáнае глéдзішча

parodist [ˈpærədɪst] n. парадыст -а *m.*

parody [ˈpærədi] – n., pl. **-dies** парóдыя *f.*
– v.t. **-died, -dying** 1. рабíць парóдыю, пацьвéльваць з чагó-н. 2. няўдáла пераймáць

parole [pəˈroʊl] – n. 1. умóўнае звальнéньне з турмы́. 2. слóва гóнару
– v.t. выпускáць умóўна (*вя́зьня*)

parquet [pɑ:rˈkeɪ] – n. 1. паркéт -у *m.*, паркéтная падлóга. 2. партэ́р -у *m.* (*у тэáтры*)
– v.t. клáсьці паркéт

parrot [ˈpærət] – n. папугáй -я *m.*
– v. папугáйнічаць, паўтараць, як папугáй

parry [ˈpæri] – v., **-ried, -rying** адбівáць (*удáр*), ухіля́цца (*ад удáру, ад пытáньняў*), пары́раваць
– n. адбівáньне, ухілéньне *n.*

parsley [ˈpɑ:rsli] n., pl. **-leys** пятрýшка *f.*

parsnip [ˈpɑ:rsnɪp] n. пастарнáк -у *m.*

part [pɑ:rt] – n. 1. чáстка *f.*: а) ***He ate part of an apple*** Ён зьéў чáстку я́блыка; ***western part of the country*** захóдняя чáстка крáю. б) ***A radio has many parts*** Рáдыё складáецца са шматлíкіх чáстак; ***spare parts*** запасны́я чáсткі (*мэханíзму*). 2. удзéл -у *m.*; налéжная чáстка чагó-н., дóля *f.*; абавя́зак -ку *m.*: ***to take part in*** браць удзéл; ***Everyone must do his part*** Кóжны мýсіць выкóнваць сваю́ дóлю; ***I have done my part*** Я зрабíў сваю́ чáстку. 3. бок -у *m.* (*у дыскýсіі*): ***He always takes his brother's part*** Ён заўсёды стаíць на брáтавым бакý. 4. рóля *f.* (*у п'éсе цí ў жыцьцí*): ***to play a part*** грáць рó-

лю. 5. прабо́р, прадзе́л -а, рад|ок -ка́ *m.* (*у валасо́х*). 6. Mus. па́ртыя *f.* а) адзі́н з галасо́ў *або́* інструмэ́нтаў: ***The four parts in singing are soprano, alto, tenor and bass*** Чатыры галасы́ ў сьпе́ве — сапра́на, а́льт, тэ́нар і бас. б) но́ты для аднаго́ го́ласу *або́* інструмэ́нту. 7. часьці́на *f.*: ***part of speech*** часьці́на мо́вы

– v. 1. дзяліць на ча́сткі. 2. разьдзя|ля́ць|ь (-ца). 3. расстава́цца; разыхо́дзіцца: ***They parted in anger*** Яны́ разыйшлі́ся ў зло́сьці. 4. расчэ́сваць валасы́ на радо́к

– adj. няцэ́лы, няпо́ўны

– adv. у не́йкай ме́ры, у не́йкай ступе́ні; часткова́

• ***for my part*** or ***on the part of me*** з майго́ бо́ку, што датычыцца мяне́, што да мяне́

• ***in part*** часткова́

• ***on (for) the most part*** перава́жна, у бо́льшасьці

• ***part from*** расста́цца, разыйсьці́ся з кім

• ***part with*** адмо́віцца ад *чаго́*, пакі́нуць *што*

• ***take part*** браць або́ мець удзе́л у чым-н.

partake [pɑ:r'teɪk] v., **-took, -taken, -taking** 1. браць удзе́л у чым-н., далуча́цца, удзе́льнічаць у чым-н. 2. пачастава́цца, зье́сьці, вы́піць чаго́-н.: ***We are eating lunch, will you partake?*** Мы палу́днуем, ці і вы не далу́чыцеся?

partial ['pɑ:rʃəl] adj. 1. няпо́ўны, часткó-вы: ***a partial eclipse*** часткóвае зацьме́ньне. 2. небесстаро́нны, неаб'екты́ўны, прадузя́ты; які́ ма́е сла́басьць, ця́гу да каго́-чаго́-н.: ***He is partial to sports*** Спо́рт — ягóная сла́басьць

partiality [ˌpɑ:rʃi'æləti] n. **-ties** 1. небесстаро́ннасьць, неаб'ектыўнасьць, прадузя́тасьць *f.* 2. сла́басьць, схі́льнасьць *f.*

participant [pər'tɪsɪpənt] n. удзе́льнік -а *m.*, удзе́льніца *f.*

participate [pɑ:r'tɪsɪpeɪt] v.i. удзе́льнічаць; браць удзе́л у чым-н.: ***He participated in the discussion*** Ён браў удзе́л у дыскýсіі

participation [pɑ:rˌtɪsɪ'peɪʃən] n. удзе́л, саўдзе́л -у *m.*

participator [pɑ:rˌtɪsɪpeɪtər] n. удзе́льнік, саўдзе́льнік -а *m.*

participial [pɑ:rtə'sɪpiəl] adj., Gram. дзеепрыме́тны: ***a participial adjective (noun)*** дзеепрыме́тны прыме́тнік (назо́ўнік)

participle ['pɑ:rtəsɪpəl] n., Gram. дзеепрыме́тнік -а *m.*

particle ['pɑ:rtɪkəl] n. 1. часьці́нка, крупі́нка *f.*: ***a particle of dust*** пыліна *f.* 2. Gram. часьці́ца *f.*

particular [pər'tɪkjələr] – adj. 1. асо́бны; спэцыфі́чны: ***That particular chair is already sold*** Якра́з то́е крэ́сла ўжо́ прада́дзенае. 2. асабліві, незвыча́йны, спэцыфі́чны: ***a particular friend*** асабліві, ве́льмі бліскі ся́бра. 3. перабо́рлівы (*у е́жы*); патрабава́льны, дакла́дны. 4. падрабя́зны, грунто́ўны: ***a particular account*** падрабя́зная справазда́ча

– n. дэта́ль *f.*, пункт -у *m.*

• ***in particular*** асабліва

particularity [pərˌtɪkjə'lærəti] n., pl. **-ties** 1. падрабя́знасьць, грунто́ўнасьць *f.* 2. асабліва́я дба́йнасьць, ру́пнасьць *f.* 3. дро́бязная ўва́жлівасьць. 4. асабліва́я ры́са, асабліва́сьць *f.* 5. перабо́рлівасьць, патрабава́льнасьць *f.*

particularly [pər'tɪkjələrli] adv. 1. асабліва, у асабліва́сьці. 2. падрабя́зна, грунто́ўна. 3. у прыва́тнасьці

parting ['pɑ:rtɪŋ] – n. ад'е́зд, вы́езд -у *m.*; расстава́ньне, расста́ньне *n.* 2. разьдзяле́ньне: ***parting of the roads*** ро́стань *f.*, раздаро́жжа *n.* 3. прабо́р, прадзе́л -у *m.* (*у валасо́х*)

– adj. 1. разьвіта́льны. 2. які́ ад'яжджа́е. 3. які́ разьдзяля́е

partisan ['pɑ:rtəzən] – n. 1. прыхі́льнік -а *m.*, прыхі́льніца *f.* 2. партыза́н -а *m.*, партыза́нка *f.*

– adj.1. фанаты́чны, які́ сьле́па ве́рыць. 2. партыза́нскі

partition [pɑ:rˈtɪʃən] – n. 1. разьдзе́л -у *m.* (*маёмасьці*), падзе́л -у *m.*: ***partition of a country into provinces*** падзе́л краі́ны на правінцыі. 2. ча́стка *f.* 3. а) перагаро́дка *f.* (*у ша́фе і ў пако́і*). б) перасьце́н|ак -ка *m.*, пераго́рка *f.* (*у пако́і*)

– v. 1. падзяля́ць на ча́сткі, разьдзяля́ць: ***to partition an empire among ...*** падзяліць імпэ́рыю памі́ж ...; ***to partition a house into rooms*** падзяліць дом на пако́і. 2. перагарадзіць перасьце́нкам (*пако́й*)

partly [ˈpɑ:rtli] adv. часткова́

partner [ˈpɑ:rtnər] n. 1. удзе́льнік, саўдзе́льнік -а *m.*: ***My sister was a partner in my sorrow*** Мая сястра́ падзяля́ла маё го́ра. 2. а) кампаньён, супо́льнік -а *m.*, супо́льніца *f.* (*у фі́рме ці кампа́ніі*). б) напа́рнік -а *m.*, напа́рніца *f.* (*у спра́ве*). 3. партнэ́р -а *m.*, партнэ́рка *f.* (*у та́нцы, гульні́*)

partnership [ˈpɑ:rtnərʃɪp] n. 1. супо́льніцтва, партнэ́рства, напа́рніцтва, таварыства *n.* 2. сяброўства *n.*

part of speech часьці́на мо́вы (*як назо́ўнік, дзеяслоў*)

partridge [ˈpɑ:rtrɪdʒ] n., pl. **-tridges** or (esp. coll.) **partridge** курапа́тка *f.*

part time няпо́ўны працо́ўны дзень

part-time [ˌpɑ:rtˈtaɪm] adj. зь няпо́ўнай працо́ўнай нагру́зкай: ***a part-time worker*** рабо́тнік, які́ працу́е няпо́ўны працо́ўны дзень

party [ˈpɑ:rti] n., pl. **-ties** 1. па́ртыя *f.*: ***The Liberal, Conservative or New Democratic Party*** Па́ртыя Лібэра́лаў, Кансэрва́тараў або́ Но́вадэмакра́таў. 2. гру́па людзе́й, таварыства *n.*: ***a wedding party*** вясе́льнае таварыства. 3. таварыскі ве́чар, вечары́нка: ***a birthday party*** вечары́нка з нагоды дня наро́дзінаў. 4. саўдзе́льнік -а, памага́т|ы -ага *m.*: ***He was a party to our plot*** Ён быў памага́тым у на́шай змо́ве. 5. бок -у *m.*: ***the parties to a contract*** баkі кантра́кту

parvenue [ˈpɑ:rvənu:] n. вы́скачк|а -і *m. & f.*, парвэню́, *m., indecl.*

pass [pæs] – v., **passed, passed** or **past** 1. прахо́дзіць паўз *што*; праяжджа́ць, міна́ць: ***Many people pass our house every day*** Шмат людзе́й прахо́дзіць паўз на́ш до́м штодня́; ***The parade passed*** Прайшо́ў пара́д; ***We passed the street*** Мы прае́халі ву́ліцу. 2. а) перадава́ць, падава́ць: ***Read this and pass it on*** Прачыта́й гэ́та і перада́й дале́й; ***Pass the salt, please!*** Калі́ ла́ска, пада́йце соль! б) перахо́дзіць: ***His farm passed to his children*** Яго́ная гаспада́рка перайшла́ да дзяце́й. 3. здава́ць: ***to pass the examination*** здаць экза́мен. 4. а) прыма́ць, правяда́ць (*зако́н, рэзалю́цыю*): ***to get a bill passed*** правясьці законапрае́кт. б) правяда́ць, ба́віць час: ***We passed the days happily*** Мы ве́села правяда́лі дні. 5. перахо́дзіць: а) ***Water passes from a liquid to a solid state when it freezes*** Вада́ перахо́дзіць з ва́дкага ста́ну ў цьвёрды, калі́ замярза́е; ***Money passes from person to person*** Гро́шы хо́дзяць з рук у ру́кі. 6. прапуска́ць: ***to pass an insult*** не зварача́ць ува́гі на абра́зу. 7. перадава́ць: ***to pass the ball*** падава́ць мя́ч, пасава́ць. 8. (*у гульні́ ў ка́рты*), пасава́ць – n. 1. прахо́д -у *m.* 2. зда́ча экза́мэну без адзна́кі. 3. про́пуск -у *m.*; бясплатны біле́т. 4. фо́кус штукара́. 5. ву́зкая даро́га, сьце́жка *f.*, цясьні́на ў гара́х. 6. пас -у *m.* (*у гульні́ ў ка́рты*). 7. Informal зале́ты *pl.* 8. стан -у *m.*, стано́вішча *n.*, сытуа́цыя *f.*: ***Things have come to a strange pass*** Спра́вы дайшлі́ да дзіўнага ста́ну

• ***pass away*** а) ско́нчыцца. б) памёрці

• ***pass by*** не заўва́жыць; прайсьці мі́ма; праглядзець, ня ўзя́ць пад ува́гу

• ***pass each other*** разьмінуцца

• ***pass for*** лічы́цца *кім-чым*, удава́ць сябе́ за *каго́*

• ***pass on*** а) перадава́ць (*адно́ адна́му́*). б) памёрці
• ***pass out*** а) Informal самлёць, стра́ціць прытомнасьць. б) раздава́ць (*улёткі*), пашыра́ць (*газэ́ту*)
• ***pass up*** а) адмо́віцца ад *чаго́*. б) не скарыста́ць з нагоды, прапусьці́ць зру́чны мо́мант

passable [ˈpæsəbəl] adj. 1. до́сыць до́бры, пасрэ́дны, магчы́мы: ***a passing knowledge of geography*** до́сыць до́брыя ве́ды з геагра́фіі. 2. прахо́дны; праёзны (*пра даро́гу*); суднахо́дны (*пра раку́*). 3. ужыва́ны, дзе́йны: ***passable coin*** до́брая манэ́та (*цяпе́р ва ўжы́тку*). 4. які́ лёгка правёсьці: ***a passable bill*** законапраёкт магчы́мы для правядзе́ньня

passably [ˈpæsəbli] adv. давО́лі; до́сыць; ніштО́

scanty ['skænti] adj. 1. недастатко́вы, бе́дны, слабы́: а) ***His scanty clothing did not keep out the cold*** Ягóная слаба́я во́пратка не баране́ла ад хо́ладу. б) ***a scanty harvest*** бе́дны ўраджа́й

scapegoat ['skeɪpgoʊt] n. ахвя́рны казёл

scar I [skɑ:r] – n. шрам, шнар -а *m.*; рубле́ц -ца́ *m.* (*ад ра́ны*)
– v.t. рабі́ць шрам, дра́піну, шкра́баць
– v.i. зарубцо́ўвацца; заго́йвацца, пакі́нуўшы рубе́ц

scar II [skɑ:r] n. стро́мкая скала́; стро́ма *f.*; про́рва, бе́здань *f.*, прадо́ньне *n.*

scarce [skers] – adj. ра́дкі, нячасты, які́ ця́жка даста́ць: ***Good cooks are scarce*** До́брых ку́хараў няшма́т
– adv. 1. ледзь, ледзь то́лькі. 2. не зусі́м. 3. наўра́д, наўра́д ці: ***He can scarcely have said that*** Наўра́д ці ён мог гэ́та сказа́ць

scarcity ['skersəti] n., pl. **-ties** неста́ча *f.*; недахо́п -у *m.*

scare [sker] v.t. пало́хаць; пужа́ць (*жывёліну*); ляка́ць; ***to become scared*** зьляка́цца, спало́хацца; спужа́цца

scarecrow ['skerkroʊ] n. 1. пу́дзіла *n.* 2. худы́, цыба́ты чалаве́к

scaremonger ['sker,mʌŋgər] n. страхапу́д -а *m.*, панікёр -а *m.*

scarf [skɑ:rf] n. 1. шаль -я *m.*, ша́лік -а *m.*, ху́стачка *f.* 2. га́льштук -а *m.* (*як у ска́ўтаў*)

scarify ['skærɪfaɪ] v., **-fied, -fying** 1. абдзіра́ць, ра́заць (*паве́рхню*). 2. Figur. во́стра крытыкава́ць, зьневажа́ць. 3. рыхлі́ць (*гле́бу*)

scarlatina [,skɑ:rlə'ti:nə] n. *гл.* **scarlet fever**

scarlet ['skɑ:rlət] n. 1. пунсо́вы, я́ркачырво́ны ко́лер. 2. сукно́, ткані́на *або́* во́пратка пунсо́вага ко́леру

scarlet fever шкарлятына́ *f.*

scary ['skeri] adj., Informal 1. страшны́. 2. палахлі́вы

scatter ['skætər] – v.t. 1. раскіда́ць. 2. разганя́ць: ***The police scattered the mob*** Паліцыя разагна́ла нато́ўп. 3. Phys. расьсе́йваць (*про́мні сьвятла́*)
– v.i. разыхо́дзіцца ў ро́зныя бакі́, разьбяга́цца, рассыпацца
– n. раскіда́ньне, разганя́ньне, расьсе́йваньне *n.*

scattered ['skætərd] adj. расьцяру́шаны, раскі́даны (*у ро́зныя ме́сцы*), разагна́ны; Phys. расьсе́яны

scatter rug малы́ дыванок (*на падло́гу*)

scenario [sə'næriou] n., pl. **-os** сцэна́р -а́ *m.*

scenarist [sɪ'nærəst] n. сцэнары́ст -а *m.*, а́ўтар сцэнара́

scene [si:n] n. 1. ме́сца, час дзе́яньня: ***the scene of an accident*** ме́сца здара́ньня; ***scene of my childhood*** часы́ майго́ мале́нства. 2. дэкара́цыя на сцэ́не. 3. зья́ва *f.* : ***"Act I, Scene 2"*** «Акт I, зья́ва 2-а́я». 4. сцэ́на *f.* 5. від -у *m.*; во́браз -у *m.*; відо́вішча *n.*
• ***behind the scenes*** за кулі́самі

scenery ['si:nəri] n., pl. **-eries** 1. дэкара́цыя на сцэ́не. 2. краявід -у *m.*, ві́даль *f.*: ***mountain scenery*** го́рны краявід

scent [sent] – n. 1. пах, во́дар -у *m.*: ***the scent of roses*** пах ру́жаў. 2. нюх -у *m.*: ***a keen scent*** чу́лы нюх. 3. парфу́ма *f.*, духі́ *pl. only.*
– v.t. 1. чуць нюхам. 2. напарфумо́ўваць. 3. напаўня́ць па́хам. 4. падазрава́ць, пранюхваць
• ***be on the scent of*** патра́піць на *чыі́м* сьлед, ісьці́ па *чыі́м* сьле́дзе

scentless ['sentləs] adj. бяз па́ху

sceptic or **skeptic** ['skeptɪk] – n. ске́птык -а *m.*
– adj. скептычны, які́ сумнява́ецца

sceptical or **skeptical** ['skeptɪkəl] adj. недаве́рлівы, які́ сумнява́ецца; скептычны

scepticism or **skepticism** ['skeptɪsɪzəm] n. скептыцы́зм -у *m.*

sceptre or **scepter** ['septər] n. 1. скі́пэтар -ра *m.* 2. каралеўская *або́* імпэра́тарская ўла́да

schedule ['skedʒu:l] – n. расклад -у *m.*; гра́фік, сьпіс -у *m.*
– v.t. рабі́ць расклад; запі́сваць у расклад

scheme [ski:m] – n. 1. праект -у *m.*, праграма дзе́яньня; плян -у *m.* 2. та́йная змо́ва ў эгаістычных мэ́тах, інтры́га *f.* 3. схе́ма *f.*: ***a scheme of postal rates*** схе́ма пашто́вага тары́фу
– v.t. плянава́ць, заду́мваць; рабі́ць змо́ву

schemer ['ski:mər] n. інтрыга́нт -а *m.*, інтрыга́нтка *f.*; змо́ўнік -а *m.*, змо́ўніца *f.*

schism ['sɪzəm, 'skɪzəm] n. раско́л -у *m.*, разьдзяле́ньне *n.* 2. схі́зма *f.*, раско́л цэ́ркваў

schismatic [sɪz'mætɪk, skɪz'mætɪk] *or* **schismatical** [sɪz'mætɪkəl] – adj. раско́льніцкі, схізматы́чны
– n. раско́льнік -а *m.*, раско́льніца *f.*; схізма́тык -а *m.*, схізматы́чка *f.*

schizophrenia [ˌskɪtsə'fri:niə] n. схізафрэ́нія, шызафрэ́нія *f.*

schnook [ʃnʊk] n., Sl. тупі́ца, дуры́ла -ы *m. & f.*

scholar ['skɑ:lər] n. 1. вучо́ны -ага *m.*, вучо́ная *f.*; асо́ба зь вялі́кімі ве́дамі. 2. шко́льнік -а *m.*, шко́льніца *f.*, навучэ́нец -ца *m.* 3. навучэ́нец-стыпэндыя́нт, навучэ́нка-стыпэндыя́нтка

scholarly ['skɑ:lərli] adj. 1. вучо́ны: ***scholarly habits*** звы́чкі вучо́нага. 2. зь вялі́кімі ве́дамі, высо́каадукава́ны. 3. стара́нны; адда́ны нау́цы

scholarship ['skɑ:lərʃɪp] n. 1. вучо́насьць *f.* 2. стыпэ́ндыя *f.*

scholastic [skə'læstɪk] – adj. 1. шко́льны, навуча́льны; адукацы́йны. 2. схаластычны; фарма́льны
– n. 1. схаля́ст -а *m.* 2. сярэднявечны тэо́ляг *або́* філёзаф

scholasticism [skə'læstɪˌsɪzəm] n. схаля́стыка *f.*

school I [sku:l] – n. 1. шко́ла *f.*: ***to attend school*** хадзі́ць у шко́лу, вучы́ца ў шко́ле. 2. нау́ка *f.*; адука́цыя: ***to start school*** пача́ць вучы́цца. 3. ву́чні й наста́ўнікі. 4. шко́льныя заня́ткі: ***There will be no school today*** Сёньня ў шко́ле заняткаў ня бу́дзе. 5. шко́ла (*у нау́цы, літарату́ры, маста́цтве*): ***the Dutch school of painting*** галя́ндзкая шко́ла ў маста́цтве
– v.t. 1. вучы́ць. 2. навуча́ць; прывуча́ць
– v.i. навуча́цца, прывуча́цца: ***School yourself to control your temper*** Навучы́ся стры́мваць сваю́ злосьць
– adj. шко́льны

school II [sku:l] n. кася́к ры́баў

school age 1. шко́льны век. 2. гады́ абавязко́вага навуча́ньня

school board мясцо́вы камітэ́т, які́ кіру́е шко́льніцтвам

schoolbook ['sku:lbʊk] n. падру́чнік -а *m.*

schoolboy ['sku:lbɔɪ] n. шко́льнік -а *m.*

schoolgirl ['sku:lgɜ:rl] n. шко́льніца *f.*

schoolhouse ['sku:lhaʊs] n. шко́льны будынак, шко́ла *f.*

schooling ['sku:lɪŋ] n. 1. навуча́ньне *n.*, адука́цыя. 2. пла́та за вучо́бу

schoolmaster ['sku:lˌmæstər] n. наста́ўнік -а *m.*, кіраўні́к шко́лы

schoolmate ['sku:lmeɪt] n. шко́льны ся́бра

schoolmistress ['sku:lˌmɪstrəs] n. наста́ўніца *f.*, кіраўні́ца шко́лы

schoolroom ['sku:lrʊm] n. кля́са *f.* (*пако́й*)

schoolyard ['sku:ljɑ:rd] n. шко́льны двор

school year навуча́льны год

schooner ['sku:nər] n. 1. шху́на *f.* 2. фурго́н амэрыка́нскіх перасяле́нцаў

sciatic [saɪ'ætɪk] adj. клу́бавы, сяда́лішчны

sciatic nerve сяда́лішчны нэрв

science ['saɪəns] n. 1. ве́да *f.*; нау́ка *f.* 2. галі́ны нау́кі: ***natural sciences*** прыро́дазна́ўчыя нау́кі; ***applied sciences*** прыкладны́я нау́кі. 3. уме́льства *n.*, тэ́хніка *f.*: ***A good boxer must***

have science as well as strength and speed Дóбры баксёр мýсіць мець тэ́хніку гэ́так жа як і сі́лу ды хýткасьць рýхаў

scientific [ˌsaɪənˈtɪfɪk] adj. навукóвы

scientifically [ˌsaɪənˈtɪfɪkli] adv. навукóва

scentist [ˈsaɪəntɪst] n. вучóны -ага, навукóвец -ўца *m.* (*асабліва ў галіне́ дакла́дных навýкаў*)

scintillate [ˈsɪntəleɪt] v.i. іскрыцца, зьзяць, зіхацéць

scion [ˈsaɪən] n. 1. пáрастак, атóжылак -ка *m.* 2. нашчáдак -ка *m.*

scissors [ˈsɪzərz] n., pl. or sing. нажні́цы *pl. only*

sclerosis [skləˈroʊsəs] n., pl. **-ses** склерóз -у *m.*

sclerotic [skləˈrɑ:tɪk] adj. склерóзны, склераты́чны

scoff [skɑ:f] – v.i. (at) кпіць, сьмяя́цца, насьміха́цца

– n. 1. кпі́ны, кéпікі, насьмéшкі *pl.* 2. пасьмéшышча *n.*

scoffer [ˈskɑ:fər] n. насьмéшнік -а *m.*, насьмéшніца *f.*

scoffing [ˈskɑ:fɪŋ] adj. зьдзéклівы, насьмéшлівы

scold [skoʊld] – v.t. прабіра́ць, ла́яць; сварыцца, крыча́ць: ***His father scolded him*** Ба́цька насварыўся на яго́. 2. рабіць вымóву

– n. сварлі́вая асóба

scoop [sku:p] – n. 1. шýфлель -ля *m.* 2. чарпа́к -á *m.* 3. кухóнны апалóнік, чарпа́к *або́* шýфлік -а *m.* 4. эксклюзíлў -ву *m.*, бóмба *f.*, сэнсацы́йная публіка́цыя (*надрукава́ная ране́й за канкурэ́нтаў*)

– v.t. 1. а) чэ́рпаць, налівáць, накладáць чарпакóм. б) выбіра́ць (*зямлю́ зь я́мы*). 1. надрукавáць сэнсацы́йную ве́стку ране́й за канкурэ́нтаў

scoopful [ˈsku:pfəl] adj. пóўны чарпа́к, апалóнік *або́* шýфлік

scoot [sku:t] v.i., Informal хýтка вы́йсьці, уцячы, змы́цца

scooter [ˈsku:tər] n. 1. самака́т -у *m.*, самака́тка *f.* 2. матарóлер -а *m.* 2. бýер -а *m.*

scope [skoʊp] n. 1. ахóп -у *m.*; кругагля́д -у *m.* 2. дастýпнасьць для рóзуму *або́* зразуме́ньня: ***within the scope of child's understanding*** дастýпны для дзіця́чага рóзуму. 2. прастóр -у *m.*, пóле дзе́яньня; магчы́масьць *f.*

scorbutic [skɔ:rˈbjʊtɪk] adj. цынгóтны

scorch [skɔ:rtʃ] v.t. 1. прыпáльваць: ***to scorch the shirt in ironing it*** прыпаліць кашýлю, прасýючы. 2. высýшваць, спáльваць: ***grass scorched by the sun*** травá спáленая сóнцам. 3. Figur. крытыкавáць пякýчымі, зьéдлівымі слóвамі

score [skɔ:r] – n. 1. вы́нік гульні́: ***The score was 9 to 2 in our favor*** Вы́нік гульні́ быў 9:2 на нáшую карысьць. 2. налéжнае *n.*; доўг дóўгу *m.*; рахýнак -ку *m.*: ***to pay the score*** заплаці́ць доўг, налéжнае *або́* рахýнак. 3. два дзяся́ткі, дваццáтка *f.*: ***three scores and ten*** сéмдзесят. 4. Mus. партытýра *f.* 5. рубéц -цá *m.*, зарýбка, нарýбка *f.* (*на дрэ́ве*)

– v.t. 1. вéсьці падлі́к. 2. выйгравáць: ***to score a point*** вы́йграць пункт; ***to score a victory*** атрымáць перамóгу. 3. Mus. а) аркестравáць. б) пісáць партытýру. 4. падкрэ́сьліваць *або́* выкрэ́сьліваць памы́лкі

• ***Don't worry on that score*** Не турбýйся аб гэ́тым

• ***on the score of*** дзéля *чагó*

• ***pay off*** or ***settle a score*** зьвéсьці рахýнкі, адпóмсьціць

• ***scores,*** pl. шмат, вялікая кóлькасьць: ***scores of times*** шмат разóў

scorn [skɔ:rn] – v.t. пагарджáць, грэ́баваць: ***to scorn lying*** не апускáцца да маны́, грэ́баваць манóю

– n. 1. пагáрда *f.* 2. прадмéт пагáрды

scornful [ˈskɔ:rnfəl] adj. пагáрдлівы, зьнявáжлівы, насьмéшлівы, пóўны пагáрды

scornfulness [ˈskɔ:rnfəlnəs] n. пагардлівасьць -і *f.*

scotch [skɑ:tʃ] v.t. 1. абясшкóджваць: ***to scotch a snake*** абясшкóдзіць ву-

жа́ку. 2. спыня́ць пашырэ́ньне (*ве́стки*). 3. надрэ́зваць, глыбо́ка разрэ́зваць. 4. закліньваць, спыня́ць (*напр. рух ко́ла*)

Scotch [skɑ:tʃ] – adj. шатля́ндзкі
– n. жыха́р Шатля́ндыі; шатля́нд|зец -ца *m.*, шатля́ндка *f.* 2. шатля́ндзкае ві́скі

Scotchman ['skɑ:tʃmən] n., pl. **-men** *гл.* **Scotsman**

scotch tape кле́йкая сту́жка, скоч -а *m.*

Scots [skɑ:ts] – adj. шатля́ндзкі
– n., pl. шатля́ндцы; жыхары́ Шатля́ндыі

Scots-Gaelic [ˌskɑ:ts'geɪlɪk] n. шатля́ндзкая *або́* гэ́льская мо́ва

Scotsman ['skɑ:tsmən] n., pl. **-men** *or* **Scot** шатля́нд|зец -ца *m.*; жыха́р Шатля́ндыі

scoundrel ['skaʊndrəl] n. няго́днік -а *m.*, падлю́г|а -і *m. & f.*

scoundrelly ['skaʊndrəli] adj. няго́дніцкі, по́длы

scour I [skaʊr] v.t. шарава́ць; чы́сьціць: ***mother scours the pan*** ма́ці шару́е патэ́льню

scour II [skaʊr] v.t. 1. аб'яжджа́ць, аббяга́ць, абшны́рваць: ***They scoured the country looking for the lost child*** Яны́ абе́зьдзілі ўсю́ мясцо́васьць, шука́ючы прапа́лае дзіця́. 2. шука́ць, вышу́кваць: ***to scour one's memory for a forgotten date*** стара́цца прыпо́мніць забы́тую да́ту

scourge [skɜ:rdʒ] – n. 1. бізу́н -а́ *m.*, пу́га *f.* 2. ка́ра *f.* 3. Figur. напа́сьць, бяда́ *f.*
– v.t. кара́ць

scout [skaʊt] – n. 1. выве́днік, разьве́дчык -а *m.*, выве́дніца, разьве́дчыца *f.* 2. выве́дніцкі самалёт *або́* карабе́ль. 3. выьве́дваньне *n.*, выве́дка, разьве́дка *f.* 4. скаўт -а *m.*
– v.t. а) выве́дваць, разьве́дваць. б) шука́ць: ***Go and scout for firewood*** Ідзі́ і пашука́й дро́ваў для во́гнішча. 2. назіра́ць; сачы́ць

scow [skaʊ] n. вялі́кая плоскадо́нка (*ло́дка*)

scowl [skaʊl] – v.i. хму́рыцца, насу́плівацца
– v.t. выка́заць са зло́сьцю: ***to scowl one's disapproval*** вы́казаць зло́сна сваё незадавальне́ньне
– n. пану́ры, змро́чны вы́гляд

scrabble ['skræbəl] – v. 1. дра́паць, скрэ́бці; кара́скацца. 2. крэ́мзаць, неаха́йна піса́ць. 3. Figur. ро́спачна змага́цца: ***to scrabble for a living*** бі́цца, як ры́ба аб лёд
– n. 1. дра́паньне *n.*; крэ́мзаньне *n.* 2. змага́ньне *n.*

scramble ['skræmbəl] – v.i. 1. узьбіра́цца; праціска́цца. 2. змага́цца, ту́зацца: ***The boys scrambled to get the football*** Хлапцы́ піха́ліся, каб схапі́ць мяч
– v.t. 1. зьбіра́ць, калекцыянава́ць без сыстэ́мы. 2. пячы́ яе́чню-баўту́шку
– n. бо́йка, тузані́на *f.*

scrap I [skræp] – n. 1. кава́лач|ак -ка *m.*, рэ́шткa *f.*; аб'е́дкі: ***scraps of food*** аб'е́дкі. 2. уры́|вак -ўка *m.* (*зь лісьта́, кні́гі*): ***scraps of songs*** уры́ўкі зь пе́сьняў. 3. мэталалом, скрап -у *m.*
– v.t. 1. лама́ць, ператвара́ць у лом. 2. выкіда́ць як непатрэ́бнае
• ***scraps,*** pl. сква́ркі *pl.*

scrap II [skræp] v.i. **(-pp-)** Informal бі́цца; калаці́цца; сварыцца, ва́дзіцца

scrapbook ['skræpbʊk] n. альбо́м для накле́йваньня (*газэ́тных вы́разак, узо́раў*)

scrape [skreɪp] – v.t. 1. саскраба́ць; счышча́ць. 2. абдзіра́ць. 3. шо́ргаць (*нага́мі*); шо́рхаць: ***The branch of the tree scraped against the window*** Галі́на дрэ́ва шо́рхала аб вакно́. 4. выко́пваць, выграба́ць: ***to scrape a hole in the sand*** вы́капаць я́мку ў пяску́. 5. наскраба́ць: ***to scrape together enough money*** зь ця́жкасьцю наскрэ́бці дастатко́ва гро́шай
– n. 1. саскрэ́бваньне, счышча́ньне *n.* 2. дра́піна *f.* 3. скрып -у *m.* 4. ша́рканьне *n.* (*нагóю*). 5. Figur. кло́паты *pl.*, ця́жкасьці *pl.*; бяда́ *f.*: ***Boys often***

get into scrapes Хлапцы́ ча́ста тра-пля́юць у бяду́

• ***just scrape along*** ледзь перабіва́ца, ледзь зво́дзіць канцы́ з канца́мі

• ***scrape through the examination*** ледзь прале́зьці, ледзь здаць экза́мэн

scrap iron мэталалом -у *m.*, жале́знае лама́ча

scrappy I ['skræpi] adj. 1. зро́блены з рэ́штак, аста́ткаў. 2. несуцэ́льны, бязла́дны, бяз су́вязі, няскла́дны

scrappy II ['skræpi] adj., Sl. задзі́рысты; сварлі́вы

scratch [skrætʃ] – v.t. 1. абдзіра́ць; ша́рпаць: ***Your shoes have scratched the floor*** Ты паша́рпаў чаравікамі падло́гу. 2. дра́паць; рабіць дра́піны: ***The cat scratched him*** Кот падра́паў яго́. 3. чу́хаць: ***He scratched his head*** Ён пачу́хаў галаву́. 4. чы́ркаць: ***to scratch a match on the wall*** чыркану́ць запа́лкай аб сьцяну́. 5. крэ́мзаць; пісаць сьпяша́ючыся. 6. зь ця́жкасьцю сабра́ць або́ наскрэ́бсьці (*гро́шай*)

– v.i. 1. дра́цца; дра́пацца. 2. чу́хацца. 3. рыпе́ць, дра́паць (*пра пяро́*). 4. зь ця́жкасьцю дава́ць ра́ды

– n. 1. дра́піна *f.* 2. скрып, рып -у *m.*, дра́панье *n.*: ***the scratch of a pen*** дра́панье пяра́ (*гук*). 3. Sport. лі́нія ста́рту

– adj. 1. сабра́ны насьпе́х, збо́рны: ***a scratch meal*** згатава́ны насьпе́х абе́д *або́* вячэ́ра; ***a scratch football team*** сабра́ная насьпе́х футбо́льная кама́нда. 2. выпадко́вы: ***a scratch shot*** выпадко́вы стрэл

• ***from scratch*** зь нічо́га, з нуля́ (*пачына́ць*)

• ***scratch out*** выкрасьля́ць

• ***up to scratch*** Informal да але́жнае вышыні́; у до́брым ста́не: ***The boxer is training for the fight but he isn't up to scratch yet*** Баксёр рыхту́ецца да ма́тчу, але́ яшчэ́ не дасягну́ў але́жнага ўзро́ўню

scratchy [skrætʃi] adj. 1. які́ дзярэ́, рыпі́ць (*напр. пяро́*). 2. накрэ́мзаны: ***a scratchy drawing*** накрэ́мзаны малю́нак; ***scratchy writing*** неаха́йнае піса́ньне, крэ́мзаньне

scrawl [skrɔ:l] – v.t. неакура́тна, невыра́зна піса́ць, крэ́мзаць

– n. 1. благі́, невыра́зны по́чырк. 2. не́шта накрэ́мзанае насьпе́х

scream [skri:m] – v.i. 1. вішча́ць, верашча́ць, крыча́ць. 2. Figur. нястры́мна рагата́ць, захо́дзіцца ад сьме́ху. 3. го́ласна гаварыць

– n. 1. прарэ́зьлівы крык, віск -у *m.* 2. Informal не́шта *або́* не́хта ве́льмі сьме́шны, адзі́н сьмех

screaming [skri:miŋ] adj. 1. вісклі́вы, верасклі́вы. 2. Figur. ве́льмі сьме́шны: ***a screaming farce*** ве́льмі сьме́шны фарс. 3. Figur. крыклі́вы: а) ***screaming headlines*** крыклівыя загало́ўкі. б) ***screaming colors*** крыклі́выя ко́леры

screech [skri:tʃ] – v. вішча́ць; верашча́ць, крыча́ць

– n. віск, крык -у *m.*

screech owl сава́-сіпу́ха

screen [skri:n] – n. 1. засло́на *f.*; шы́рма *f.*: ***a folding screen*** ство́ркавая шы́рма; ***smoke screen*** ды́мавая засло́на. 2. се́тка ад мух. 3. экра́н -у *m.* (*у кіно́*). 4. кінафі́льмы, фі́льмы *pl.* 5. рэ́шата, сі́та *n.*, падсі́тлак -ка *m.* 6. прыкрыцьцё *n.*; засло́н -а *m.* (*вайско́вы*)

– v.t. 1. хава́ць, абараня́ць, засланя́ць. 2. дэманстрава́ць на экра́не. 3. здыма́ць фільм. 4. а) прасява́ць, прасе́йваць. б) правяра́ць я́касьць *або́* адпаве́днасьць

screw [skru:] – n. 1. шру́ба, шру́бка *f.* 2. паваро́т шру́бы; шру́бавы рух. 3. Informal скна́рла, жмі́ндла -ы *m. & f.* 4. вінт (*самалёта*); грабны́ вінт (*параплава́*)

– v.t. 1. закру́чваць: ***to screw the lid on the jar*** закруціць ве́чка на сло́ік. 2. зашрубо́ўваць а): ***to screw down*** or ***on*** прышрубава́ць *што*, прымацава́ць

да *чаго́* шру́бамі. б) ***to screw off*** адкруці́ць, адшрубава́ць. 3. націска́ць, прыціска́ць: ***to screw information out of a person*** сі́лай вы́цягнуць зь не́кага ве́сткі. 4. перако́шваць, рабі́ць касы́м: ***His face was screwed up with fear*** Твар у яго́ перакасі́ла ад стра́ху
– v.i. круці́цца, як шру́ба
• ***He has a screw loose,*** Sl. У яго клёпкі не стае́
• ***put the screws on,*** Informal націска́ць на *каго́*, сі́лай вымага́ць
• ***screw up,*** Sl. сапсава́ць, спарто́ліць, спарта́чыць
• ***screw up enough courage*** набра́цца адва́гі
• ***tighten the screw*** заціска́ць, закру́чваць га́йкі

screwdriver ['skru:ˌdraɪvər] n. за́шрубка, адвёртка *f.*, шрубакру́т -а *m.*

screw propeller вінт -а *m.* (*параплава́ *або́ самалёта*)

scribble ['skrɪbəl] – v.t. невыра́зна пісаць, чы́ркаць, кро́мзаць; малява́ць абы як
– n. кро́мзаньне *n.*

scribbler ['skrɪblər] n. 1. чарнавы́ сшы́так. 2. піса́кла -і *m. & f.*, пэ́цкаль -я *m.* (*пра слабо́га пісьме́ньніка*)

scribe [skraɪb] n. 1. перапі́шчык кні́гаў; пі́сар -а *m.* 2. а́ўтар, пісьме́ньнік -а *m.*

script [skrɪpt] n. 1. ру́капіс -у *m.* 2. скрыпт -у *m.*; ру́капіс або́ машы́напіс а) п'е́сы, ро́ляў паасо́бных акто́раў, б) тэ́кстаў для ды́ктара ра́дыё або́ тэлеві́зіі. 3. ру́капісны шрыфт (*для дру́ку*). 4. Law арыгіна́л дакумэ́нту (*у адро́зьненьне ад ко́піі*)

scriptural or **Scriptural** ['skrɪptʃərəl] adj. бібліі́йны; паво́дле Сьвято́га пісьма́, які́ абапіра́ецца на Сьвято́е пісьмо́

Scripture ['skrɪptʃər] n. 1. Бі́блія *f.* 2. Сьвято́е пісьмо́. 3. ***Moslem scriptures*** Кара́н -а *m.*, сьвята́я кні́га мусульма́наў

scriptwriter ['skrɪptˌraɪtər] n. 1. сцэнары́ст -а *m.* 2. а́ўтар тэ́кстаў для радыё- і тэлеперада́чаў

scroll [skroʊl] – n. 1. скру́так (*пэрга́мэнту або́ папе́ры*). 2. сьпіс імёнаў, падзе́яў
– v.t. Comput. пракру́чваць

scrotal ['skroʊtəl] adj., Anat. машо́начны

scrotum ['skroʊtəm] n., pl. **-ta, -tums** Anat. машо́нка *f.*

scrounge [skraʊndʒ] v., Sl. 1. выпро́шваць, кля́нчыць. 2. кра́сьці. 3. жыць за чужы́ кошт

scrub I [skrʌb] – v.t. **(-bb-)** шарава́ць, мыць *або́* чы́сьціць, шару́ючы
– n. шарава́ньне *n.*

scrub II [skrʌb] – n. 1. нізкаро́слыя дрэ́вы *або́* кусты́. 2. нізкаро́слы чалаве́к *або́* жывёліна. 3. Sport. рэзэ́рва *f.*, запа́с -у *m.*
– adj. малы́, благі́, слабы́; го́ршы

scrubby ['skrʌbi] adj. ні́зкі, нізкаро́слы; малы́: ***scrubby trees*** нізкаро́слыя дрэ́вы
• ***scrubby land*** за́расьнік -у *m.*

scruff [skrʌf] n. загры́вак -ўку, ка́рлак -ку *m.*: ***to take somebody by the scruff*** узя́ць не́кага за ка́рак

scruple ['skru:pəl] – n. 1. згрызо́та *f.*: ***Man of no scruples*** Чалаве́к без згрызо́таў, нядо́брасумле́нны. 2. сумне́лў -ву *m.*, пачуцьцё няёмкасьці, нязру́чнасьці *або́* со́раму: ***She has scruples about playing cards for money*** Яна́ саро́меецца гуля́ць у ка́рты на гро́шы. 3. скру́пул -а *m.* (*стара́я адзі́нка аптэ́карскае вагі́*). 4. кры́ха *f.*
– v.i. вага́цца, саро́мецца: ***A dishonest man does not scruple to deceive others*** Несумле́нны чалаве́к не вага́ецца ашу́кваць другі́х

scrupulous ['skru:pjələs] adj. 1. добрасумле́нны. 2. дакла́дны да дро́бязяў, скрупулёзны

scrutineer [ˌskru:tən'ɪr] n. 1. назіра́льнік, інспэ́ктар -а *m.* 2. Brit. кантралёр, назіра́льнік на вы́барах

scrutinize ['skru:tənaɪz] v.t. ува́жліва правяра́ць, дасьле́даваць; пі́льна разгляда́ць

scrutiny ['skru:təni] n., pl. **-nies** 1. дакла́днае дасьле́даваньне; ува́жлівая

правёрка, разгля́д. 2. дапы́тлівы по́зірк

scuffle ['skʌfəl] – v.i. бі́цца, чу́біцца – n. бо́йка *f.*

scull [skʌl] – n. 1. кармаво́е вясло́. 2. адно́ з бакавы́х вёслаў. 3. лёгкі го́начны чо́вен – v.i. весла́ваць

sculpt [skʌlpt] v.t., Informal ляпі́ць, вяка́ць, часа́ць (*з ка́меня, ма́рмуру*), выраза́ць скульпту́ру (*з дрэ́ва, ко́сьці*)

sculptor ['skʌlptər] n. разьбя́р -а́ *m.*, ску́льптар -а *m.*

sculptress ['skʌlptrəs] n. разьбя́рка, ску́льптарка *f.*

sculpture ['skʌlptʃər] – n. скульпту́ра *f.* – v.t. 1. высяка́ць; часа́ць, выраза́ць; ляпі́ць. 2. пакрыва́ць *або́* ўпрыго́жваць разьбо́ю

scum [skʌm] – n. 1. шумавіньне *n.*, шум -у *m.*, пе́на *f.*; на́кіп -у *m.* 2. Informal ні́зкі, по́длы чалаве́к: ***scum of the earth*** адкі́ды *pl.*, падо́ньне грама́дзтва – v.i. 1. пе́ніцца, пакрыва́цца пе́най *або́* на́кіпам. 2. здыма́ць пе́ну, на́кіп

scummy ['skʌmi] adj. 1. пе́ністы, зь пе́най. 2. нікчэ́мны, ні́зкі, по́длы

scurf [skɜ:rf] n. пе́рхаць *f.* (*на галаве́*)

scurvy ['skɜ:rvi] – n. цынга́ *f.* – adj. ні́зкі; по́длы; нікчэ́мны

scutch [skʌtʃ] – v.t. трапа́ць (*лён, каноплі*) – n. трапа́льная машы́на *або́* прыла́да

scythe [saɪð] – n. 1. каса́ *f.*: ***handle of the scythe*** касьсё, каси́льна *n.* – v.t. каси́ць

sea [si:] n. 1. мо́ра *n.* 2. вялі́кае во́зера. 3. мо́цная хва́ля: ***a high sea*** высо́кія мо́цныя хва́лі

• ***be at sea*** а) быць у адкры́тым мо́ры; на караблі́. б) Informal гаварыць наўздага́д, пла́ваць; памыля́цца

• ***follow the sea*** быць марако́м

• ***go to sea*** а) пайсьці́ ў маракі́. б) пусьці́цца ў марско́е падаро́жжа

• ***high sea*** а) высо́кія мо́цныя хва́лі. б) адкры́тае мо́ра

• ***put to sea*** пача́ць марско́е падаро́жжа

seabed ['si:bed] n. марско́е дно

sea breeze марскі́ ве́цер, брыз -у *m.*

sea calf фо́ка *f.*, цюле́нь -я *m.*

sea coast марско́е ўзьбярэ́жжа

sea dog 1. стары́, быва́лы, дасьве́дчаны мара́к; марскі́ воўк. 2. цюле́нь -я *m.*

seafood ['si:fu:d] n. ядо́мыя марскі́я прадукты (*ры́бы, ракападо́бныя*): ***seafood restaurant*** ры́бны рэстара́н

seagull марска́я ча́йка

seal I [si:l] – n. 1. пяча́ць, пяча́тка *f.* 2. кляймо́ *n.*; знак -у *m.*, эмбле́ма *f.* 3. кіт -у *m.*, шпаклёўка *f.*; ізаля́тар -у *m.* 4. спэцыя́льная ма́рка: ***Christmas seals*** каля́дныя ма́ркі. 5. Figur. умо́ва; прыся́га: ***under seal of secrecy*** пад сакрэ́там – v.t. 1. прыпяча́тваць, ста́віць пяча́тку: ***The treaty was signed and sealed by both governments*** Умо́ва была́ падпі́саная і прыпяча́таная або́двума ўра́дамі. 2. шчы́льна закрыва́ць, закле́йваць, зама́зваць: ***She sealed the jars of fruit*** Яна́ гэрмэты́чна закры́ла сло́ікі з садавіно́ю; ***to seal the letter*** закле́іць ліст. 3. вырашаць, прадвызнача́ць: ***to seal someone's fate*** прадвы́значыць не́чый лёс

• ***receive (return) the seals*** прыня́ць (здаць) паса́ду міні́стра

• ***set one's seal to*** прыкла́сьці пяча́ць да *чаго́*; ухвалі́ць, апрабава́ць

• ***the seals*** азна́ка дзяржа́ўнай паса́ды

seal II [si:l] – n. **seals** or **seal,** coll. 1. цюле́нь -я *m.*, марскі́ ко́цік. 2. ко́ціка вае фу́тра – v.t. палява́ць на цюле́няў

sealer ['si:lər] n. 1. паляўні́чы на цюле́няў. 2. карабе́ль для палява́ньня на цюле́няў

sea level узро́вень мо́ра

sealing wax сургу́ч -у́ *m.*

seam [si:m] – n. 1. шво *n.* 2. шрам -у *m.*, рубе́ц -ца́ *m.* 3. Geol. пласт -а́ *m.*: ***a seam of coal*** пласт вугля́

– v.t. 1. страчы́ць шво, сшыва́ць швом. 2. Figur. баразьні́ць; зрэ́зваць маршчы́намі, мо́ршчыць: ***Years of worrying seamed his brow*** Гады́ згрызо́таў збаразьні́лі яго́ны лоб маршчы́намі

• ***burst at the seams*** трашча́ць па швах

• ***come apart at the seams*** разарва́цца, разьляце́цца, заняпа́сьці

seaman ['si:mən] n., pl. **-men** радавы́ мара́к, матро́с -а *m.*

seamanship ['si:mənʃɪp] n. майстэ́рства марапла́ваньня; марска́я пра́ктыка

sea mile марска́я мі́ля

seamstress ['si:mstrɪs] n. шва́чка *f.*

seance ['seɪɑ:ns] n. 1. сэа́нс -у *m.* (*пака́з фі́льму*). 2. сьпірыты́чны сэа́нс

seaplane ['si:pleɪn] n. гідрасамалёт, гідрапля́н -а *m.*

seaport ['si:pɔ:rt] n. 1. марскі́ порт. 2. парто́вы го́рад, парто́вае ме́ста

sear [sɪr] v.t. 1. прыпяка́ць, апяка́ць; прыпа́льваць, абпа́льваць: ***The trees were seared by lightning*** Дрэ́вы былі́ апа́леныя мала́нкай. 2. выпяка́ць, высу́шваць. 3. Figur. прытупля́ць: ***seared conscience*** прыту́пленае сумле́ньне

search [sɜ:rtʃ] – v.i. 1. шука́ць, абшу́кваць. 2. пераглядаць. 3. дасьле́дваць, вышу́кваць

– n. по́шукі *pl. only.*

• ***in search of*** у по́шуках *каго́*, шука́ючы *каго́-чаго́*

• ***search out*** а) шука́ць *каго́-чаго́*. б) знайсьці́ ў вы́ніку по́шукаў

searching ['sɜ:rtʃɪŋ] adj. 1. дапы́тлівы: ***a searching gaze*** дапы́тлівы по́зірк. 2. назіра́льны, прані́клівы. 3. Figur. прані́зьлівы, во́стры: ***a searching wind*** прані́зьлівы ве́цер

searchlight ['sɜ:rtʃlaɪt] n. пражэ́ктар -а *m.*

search warrant о́рдэр на ператру́с, во́быск

sea shell марска́я ра́кавінка

sea shore ['si:ʃɔ:r] n. марско́е ўзьбярэ́жжа

seasick ['si:sɪk] adj. які́ це́рпіць ад марско́й хваро́бы

seasickness ['si:sɪknəs] n. марска́я хваро́ба

seaside ['si:saɪd] – n. узмо́р'е *n.*, марско́е ўзьбярэ́жжа

– adj. узьбярэ́жны, на ўзьбярэ́жжы, набярэ́жны

season ['si:zən] – n. 1. пара́ *f.*, *pl.* по́ры. а) адна́ з чатыро́х по́раў го́ду. б) час, пэры́яд -у *m.*: ***the Christmas season*** каля́дная пара́; ***the harvest season*** жніўна́я пара́, час жніва́. 2. сэзо́н -у *m.*: ***the baseball season*** сэзо́н бэйсбо́лу. 3. адпаве́дная пара́

– v.t. прыпраўля́ць, дадава́ць прыпра́вы: ***to season soup with salt*** пасаліць суп. 2. ***to season conversation with wit*** ажыві́ць гу́тарку до́сьціпамі. 3. сушы́ць, высу́шваць, вытры́мваць, рабі́ць прыда́тным будаўні́чы лесаматэрыя́л. 4. прызвыча́йваць да *чаго́*, гартава́ць. 5. зьмякча́ць: ***to season justice with mercy*** зьмя́кчыць прысу́д міласэ́рнасьцю

• ***for a season*** не́йкі час

• ***in good season*** до́сыць ра́на

• ***in season*** а) у сэзо́не. б) у пару́, у час, своечасо́ва

• ***out of season*** не ў пару́, ня ў час

seasonable ['si:zənəbəl] adj. 1. адпаве́дны сэзо́ну. 2. своечасо́вы, у час: ***seasonable aid*** дапамо́га якра́з у час

seasonal ['si:zənəl] adj. сэзо́нны: а) ***a seasonal worker*** сэзо́нны рабо́тнік. б) адпаве́дны пары́ го́ду (*напр. надво́р'е*). 2. пэрыяды́чны

seasoning ['si:zənɪŋ] n. 1. прыпра́вы, спэ́цыі *pl.* 2. Figur. аздо́ба *f.*: ***Conversation with a sesoning of wit*** Гу́тарка ажы́ўленая гу́марам

season ticket сэзо́нны біле́т

seat I [si:t] – n. 1. кра́сла *n.*, ла́ўка *f.*: ***have (take) a seat*** сяда́й. 2. ме́сца ў тэа́тры: ***We have reserved seats in the first balcony*** Мы заказа́лі біле́ты на пе́ршым балько́не. 3. ме́сца ў парля́мэнце: ***to win a seat*** быць вы́бра-

ным (*у парлямэ́нт*): ***to lose one's seat*** ня быць пераабра́ным. 4. сядзе́ньне; сяда́лішча *n.* (*ча́стка це́ла*). 5. паса́дка *f.* (*ко́ньніка*)
– v.t. 1. садзі́ць. 2. зьмяшча́ць; мясці́ць: ***The stadium seats thirty thousand people*** Стадыён ме́сьціць трыццаць ты́сячаў людзе́й
• ***be seated*** а) сяда́ць, се́сьці: ***Please be seated*** Калі ла́ска, сяда́йце. б) быць паса́джаным: ***He was seated in ...*** Ён сядзе́ў у ...

seat II [si:t] n. 1. асяро́дак -ку *m.*, цэнтар -ру *m.*, сядзі́ба *f.*: ***A university is a seat of learning*** Універсыте́т — асяро́дак наву́кі. 2. дом -у *m.*, рэзыдэ́нцыя *f.* 3. месцазнахо́джаньне *n.*

seat belts рамяні́ бясьпе́кі

sea urchin марскі́ во́жык

sea wall да́мба *f.*

seaward ['si:wərd] – adv. у бок мо́ра
– adj. зьве́рнуты ў бок мо́ра

seaweed ['si:wi:d] n. марскі́я во́дарасьці

seaworthy ['si:ˌwɜ:rðɪ] adj. прыда́тны для мараплава́ньня (*пра карабе́ль*)

secant ['si:kənt] – n. Geom. сяку́чая *f.*
– adj. перасяка́льны, перасе́чны

secede [sɪ'si:d] v.i. аддзяля́цца, адшчапля́цца, адступа́цца, выхо́дзіць

secession [sɪ'seʃən] n. выступле́ньне *n.*, вы́хад -у *m.* (*з арганіза́цыі, зьвя́зу*), раско́л -у *m.*

secessionist [sɪi'seʃənɪst] n. адсту́пнік, раско́льнік -а *m.*, адсту́пніца, раско́льніца *f.*

seclude [sɪ'klu:d] v.i. адасабля́цца

secluded [sɪ'klu:dɪd] adj. 1. адасо́блены, само́тны, адзіно́кі. 2. глухі́, заці́шны: ***a secluded place*** заку́так -ка *m.*, заці́шнае ме́сца

seclusion [sɪ'klu:ʒən] n. 1. адасо́бліваньне *n.*, адасо́бленасьць *f.*: ***to live in seclusion*** жыць у само́це, адасо́блена. 2. глухі́ заку́так

second I ['sekənd] – adj. 1. другі́. 2. дру́гасны: ***cloth of second quality*** сукно́ дру́гаснае я́касьці
– n. 1. другі́ -о́га *m.*, друга́я *f.* 2. сэкунда́нт -а *m.*
– v.t. 1. падтры́мваць. 2. ухваля́ць, згаджа́цца: ***to second a motion*** падтрыма́ць прапано́ву
• ***at second hand*** з другі́х рук, пасярэ́дне, праз пасярэ́дніцтва: ***a report received at second hand*** паведамле́ньне, атрыма́нае з другі́х рук (*праз пасярэ́дніка*)
• ***seconds,*** pl. 1. тава́ры друго́га (го́ршага) гату́нку. 2. друга́я по́рцыя (*пры абе́дзе*)

second II ['sekənd] n. 1. сэку́нда (*адзі́нка ча́су*). 2. сэку́нда (*адзі́нка вымярэ́ньня куто́ў*)

secondary ['sekənderi] – adj. 1. пабо́чны, другара́дны. 2. неарыгіна́льны; выто́рны (*пра сло́ва*). 3. Electr. дру́гасны (*пра ток*)
– n. 1 паднача́лены -ага *m.* 2. пабо́чны на́ціск. 3. памо́чнік -а *m.*

secondary school сярэ́дняя шко́ла

second-class [ˌsekənd'klæs] – adj. 1. друго́е кля́сы (*ваго́н, бі́ле́т, по́шта*). 2. другара́дны; го́ршага гату́нку
– adv. 1. ***to travel second-class*** падаро́жнічаць друго́й кля́сай. 2. пасыла́ць по́штай друго́е кля́сы

second hand сэку́ндная стрэ́лка

second-hand [ˌsekənd'hænd] adj. 1. неарыгіна́льны; з другі́х рук. 2. няно́вы, пано́шаны, ужыва́ны: ***a second-hand store*** кра́ма ужыва́ных рэ́чаў

secondly ['sekəndli] adv. па-друго́е.

second-rate [ˌsekənd'reɪt] adj. другара́дны, другая́касны

secrecy ['si:krəsi] n., pl. **-cies** 1. сакрэ́тнасьць *f.*: ***in secrecy*** пад сакрэ́там. 2. скры́тнасьць, няшчы́расьць *f.*

secret ['si:krət] – adj. 1. патае́мны, сакрэ́тны: а) ***a secret marriage*** патае́мнае жані́мства. б) ***a secret society*** та́йнае тава́рыства. в) ***a secret agent*** сакрэ́тны аге́нт (*выве́дкі*). 2. схава́ны, замаскава́ны; скры́ты: ***a secret passage*** схава́ны прахо́д; ***a secret place*** глуха́я мясьці́на

– n. таямні́ца *f.*, сакрэ́т -у *m.*
• ***in secret*** пад сакрэ́там; упо́тай

secretly ['si:krətli] adv. упо́тай, упо́тайкі, упо́тайку; патае́мна, пакрыёма, скры́тна

secretarial [ˌsekrə'teriəl] adj. сакрата́рскі: ***secretarial work*** сакрата́рская пра́ца

secretariat [ˌsekrə'teriət] n. 1. паса́да сакратара́, сакрата́рства *n.* 2. сакратары́ят -а *m.*: ***the United Nations Secretariat*** Сакратары́ят Арганіза́цыі Аб'ядна́ных На́цыяў

secretary ['sekrətəri] n., pl. **-taries** 1. сакрата́р -а́ *m.*, сакрата́рка *f.* 2. міні́стар -ра *m.* (*у Англіі й ЗША*): ***the Secretary of the Treasury*** міні́стар фіна́нсаў. 3. сакрэ́тнік -а *m.* (*пісьмо́вы стол*)

secretary-general n., pl. **-ries-general** генэра́льны сакрата́р: ***the Secretary-General of the United Nations*** Генэра́льны Сакрата́р Арганіза́цыі Аб'ядна́ных На́цыяў

secrete [sɪ'kri:t] v.t. 1. трыма́ць у сакрэ́це; уто́йваць, хава́ць. 2. выдзяля́ць, выраб ля́ць: ***Glands in the mouth secrete saliva*** Зало́зы ў ро́це выдзяля́юць сьлі́ну

secretion [sɪ'kri:ʃən] n. 1. хава́ньне, уто́йваньне, скрыва́ньне *n.* 2. сакрэ́цыя: ***Bile is the secretion of the liver*** Жоўць — сакрэ́цыя пе́чані

secretive ['si:krətɪv] adj. 1. скры́тны, няшчы́ры. 2. [sɪ'kri:tɪv] выдзяля́льны (*пра залозу*)

secret service выве́дная слу́жба, выве́дка *f.*

sect [sekt] n. сэ́кта *f.*

sectarian [sek'teriən] – adj. сэкта́нцкі
– n. сэкта́нт -а *m.*, сэкта́нтка *f.*

section ['sekʃən] – n. 1. ча́стка *f.*, адрэ́заны кава́лак -ка *m.* 2. парагра́ф, падразьдзе́л -у *m.*, ча́стка *f.* (*кні́гі*): ***Chapter X has seven sections*** Дзяся́ты разьдзе́л ма́е сем падразьдзе́лаў. 3. во́бласьць *f.*, раён, рэгіён -у *m.* (*кра́ю*); кварта́л -у *m.* (*ме́ста*): ***The city has a business section and a residential section*** Ме́ста ма́е камэрцы́йны кварта́л і жылы́ кварта́л. 4. рэ́заньне (*на ча́сткі*); разрэ́з -у *m.* 5. адці́нак (*чыгу́нкі, даро́гі*). 6. прэпара́т -а *m.* (*тка́нкі, мінэра́лу*). 7. купэ́, *n., indecl.* (*у ваго́не*)
– v.t. рэ́заць, дзяліць на ча́сткі

sectional ['sekʃənəl] adj. 1. мясцо́вы, рэгіяна́льны: ***sectional interests*** мясцо́выя, рэгіяна́льныя інтарэ́сы. 2. з ча́стак, складны́, разбо́рны: ***a sectional bookcase*** разбо́рная кні́жная этажэ́рка

sector ['sektər] n. 1. Geom. сэ́ктар -у *m.* 2. Milit. уча́стак абаро́ны

secular ['sekjələr] – adj. 1. сьве́цкі, нерэлігі́йны: ***secular music*** сьве́цкая му́зыка; ***a secular education*** сьве́цкая адука́цыя. 2. стогадо́вы, які́ быва́е раз на 100 гадо́ў, векавы́. 3. вечны
– n. сьве́цкі сьвята́р (*не мана́х*)

secure [sɪ'kjʊr] – adj. 1. бясьпе́чны; пэ́ўны; надзе́йны: ***a secure hiding place*** бясьпе́чнае схо́вішча; ***a secure investment*** пэ́ўнае капіта́лаўкладанне. 2. спако́йны, забясьпе́чаны: ***He hoped for a secure old age*** Ён спадзява́ўся на забясьпе́чаную ста́расьць. 3. мо́цны, надзе́йны
– v.t. 1. забясьпе́чваць; гарантава́ць (*пазы́ку*). 2. умацо́ўваць, замацо́ўваць. 3. даставаць, набываць: ***to secure tickets for a play*** набы́ць біле́ты на спэкта́кль
– v.i. забясьпе́чвацца

security [sɪ'kjʊrəti] n., pl. **-ties** 1. бясьпе́ка, бясьпе́чнасьць *f.*; ахо́ва, абаро́на *f.* 2. пэ́ўнасьць, упэ́ўненасьць *f.* 3. забесьпе́чэньне *n.* (*пазы́кі*), гара́нтыя *f.*; пару́ка *f.*; закла́д -у *m.*
securities, pl. каштоўныя папе́ры, аблігацыі, вэ́кслі

Security Council Ра́да Бясьпе́кі

sedan [sɪ'dæn] n. сэда́н -а *m.* (*род аўтамаба́ля*)

sedate [sɪ'deɪt] adj. спако́йны, ці́хі; пава́жны, стры́маны

sedation [sɪˈdeɪʃən] n. заспакаéньне, супакаéньне *n.*

sedative [ˈsedətɪv] – n. заспакаяльны сро́дак
– adj. 1. бо́леспато́льны. 2. заспакая́льны

sedge [sedʒ] n. асака́ *f.*

sediment [ˈsedɪmənt] n. 1. аса́дак -ку *m.* 2. Geol. нано́с -у *m.*

sedimental [ˌsedɪˈmentəl] *or* **sedimentary** [ˌsedɪˈmenteri] adj. 1. аса́дкавы. 2. Geol. утво́раны з аса́дкаў *або́* нано́саў

sedition [sɪˈdɪʃən] n. падбухто́рваньне да бу́нту, агіта́цыя супро́ць ура́ду

seditious [sɪˈdɪʃəs] adj. 1. падрыўны́. 2. бунта́рскі, бунто́ўны; збунтава́ны

seduce [sɪˈdu:s] v.t. 1. спакуша́ць. 2. зво́дзіць, зьбіва́ць з пра́вільнага шля́ху; зьво́дзіць, спакуша́ць да інты́мнае бліскасьці. 3. ашу́кваць; падма́нваць

seducer [sɪˈdu:sər] n. спаку́сьнік -а *m.*

seduction [sɪˈdʌkʃən] n. 1. спакушэ́ньне *n.* 2. спаку́са *f.*

seductive [sɪˈdʌktɪv] n. 1. прына́дны; спаку́сьлівы, спакуша́льны. 2. чаро́ўны; захапля́льны, пана́дны

see I [si:] v.t. **saw, seen, seeing** 1. ба́чыць; глядзе́ць. 2. разуме́ць: ***I see what you mean*** Я разуме́ю, што вы хо́чаце сказа́ць; ***as far as I can see*** нако́лькі я разуме́ю. 3. уважа́ць, глядзе́ць: ***See that you lock the back door*** Глядзі́ то́лькі, каб замкну́ў за́днія дзьве́ры. 4. адве́дваць *каго́*, наве́дваць *што*: ***He went to see a friend*** Ён пайшо́ў адве́даць ся́бра; ***We saw the exhibition*** Мы наве́далі выста́ву
• ***see after*** глядзе́ць *чаго́*, наглядаць, сачы́ць за *чым*: ***to see after the luggage*** наглядаць за багажо́м
• ***see into*** уніка́ць у *што*, разглядаць *што*
• ***see off*** праве́сьці *каго́* (*хто ад'яжджа́е*)
• ***see out*** а) дове́сьці да канца́, ско́нчыць. б) дажы́ць да чаго́
• ***see through*** а) ба́чыць наскро́зь, разуме́ць навылёт. б) дапамага́ць у бядзе
• ***see to*** дагле́дзець, упэ́ўніцца: ***I'll see to it*** Я гэ́та дагле́джу
• ***The blind do not see*** Сьляпы́я ня ба́чаць

see II [si:] n. 1. паса́да, ула́да бі́скупа. 2. бі́скупства *n.*

seed [si:d] – n., pl. **seeds**, coll. **seed** 1. насе́ньне, зе́рне *n., pl.* зярня́ты; зе́рнетка, зярня́тка *n., dim.* 2. насе́нныя клу́бні расьлі́наў, се́янка (*бу́льбы*). 3. крыні́ца, пача́так: ***seeds of trouble*** крыні́ца кло́патаў. 4. Bibl. дзе́ці, нашча́дкі *pl.* 5. спэ́рма *f.*, насе́ньне *n.*
– adj. насе́нны
– v.t. 1. се́яць, засява́ць. 2. абнасе́ньвацца. 3. выбіра́ць зярня́ты
• ***go to seed*** а) абнасе́ньвацца, дава́ць насе́ньне. б) падупада́ць (*сі́лай, бага́ццем*)
• ***seed clouds*** шту́чна выклі́ка́ць дождж

seedbed [ˈsi:dbed] n. парні́к -а́ *m.*

seeder [ˈsi:dər] n. 1. ся|ве́ц- ўца́, се́йбіт -а *m.* 2. се́ялка *f.* 3. прыла́да для выма́ньня зярня́т

seedless [ˈsi:dləs] adj. безь зярня́т (*напр. вінагра́д*)

seedling [ˈsi:dlɪŋ] n. 1. се́ян|ец -ца *m.* 2. раса́да *f.*, са́джан|ец -ца *m.*, флянс -а *m.*; малы́я дрэ́ўцы

seek [si:k] – v.t. **sought, seeking** 1. шука́ць: ***to seek something lost*** шука́ць згу́бленае. 2. шука́ць, спадзява́цца: ***Friends sought his advice*** Сябры́ шука́лі ў яго́ пара́ды. 3. стара́цца, імкну́цца: ***to seek fame*** імкну́цца да сла́вы
– v.i. шука́ць: ***Seek and ye shall find*** Bibl. Шука́йце і зно́йдзеце
• ***be sought after*** быць пажада́ным, мець вялі́кі по́пыт
• ***seek to right a wrong*** стара́цца вы́правіць зло

seeker [ˈsi:kər] n. шука́льнік -а *m.*, шука́льніца *f.*

seem [si:m] v.i. 1. здава́цца, выглядаць: ***He seemed a very old man*** Ён выглядаў ве́льмі стары́м чалаве́кам. 2. ***I still seem to hear the music*** Мне яшчэ́ здае́цца, што чу́ю му́зыку; ***It seems likely to rain*** Выглядае, што бу́дзе дождж

seeming ['si:mɪŋ] – adj. уя́ўны, які́ здае́цца: ***a seeming advantage*** уя́ўная перава́га

– n. вы́гляд -у *m.*: ***It was worse in its seeming than in reality*** На вы́гляд, гэ́та выдава́лася го́ршым, чы́мся было́ ў рэчаі́снасьці

seemingly ['si:mɪŋlɪ] adv. відаць, як відаць, ма́быць, му́сіць: ***This hill is seemingly the highest*** Гэ́ты ўзго́рак, ма́быць, найвышэ́йшы

seemly ['si:mlɪ] – adj. адпаве́дны; прыстойны.

– adv. адпаве́дна; прыстойна

seen [si:n] v., *p.p. of* **see I**

seep [si:p] v.i. сачы́цца; праса́чвацца; ка́паць; цячы́: ***Water seeps through sand*** Вада́ праса́чваецца праз пяса́к

seepage ['si:pɪdʒ] n. 1. працяка́ньне, выцяка́ньне, праса́чваньне *n.*, фільтра́цыя *f.* 2. ві́льгаць *f.*, ва́дкасьць, яка́я праса́чваецца

seethe ['si:ð] – v.i. 1. бурлі́ць, пе́ніцца: ***Water seethed under the falls*** Вада́ бурлі́ла й пе́нілася пад вадаспа́дамі. 2. Figur. хвалява́цца, непако́іцца. 3. мо́кнуць

– v.t. мачы́ць; вымо́чваць

segment ['segmənt] – n. 1. ча́стка *f.*, адрэ́зак -ка *m.*: ***segment of an orange*** до́лька ара́нжыка. 2. Geom. а) сэгме́нт кру́га. б) адці́нак, адрэ́зак -ка *m.* (*лі́ніі*). 3. Biol. чле́нік -а *m.*; сэгме́нт -а *m.*; сэгме́нт пазванка́

– v.t. дзялі́ць на чле́нікі, сэгме́нты

segmental [səg'mentəl] adj. чле́ністы; суста́ўчаты

segregate ['segrɪgeɪt] – v.t. 1. аддзяля́ць (*ад і́ншых*). 2. сэгрэгава́ць, ізалява́ць адну́ ра́су ад другі́х

– adj. ['segrɪgət] адасо́блены, ізалява́ны ад і́ншых, сэгрэгацы́йны

segregation [ˌsegrɪ'geɪʃən] n. 1. адасо́бленьне, ізаля́цыя ад і́ншых. 2. ра́савая сэгрэга́цыя

seismic ['saɪzmɪk] adj. 1. сэйсьмі́чны. 2. спрычы́нены землятру́сам

seize [si:z] v. 1. хапа́цца, хапа́ць; чапля́цца: ***In fright she seized his arm*** Ад стра́ху яна́ ўхапі́лася за яго́ную руку́. 2. зразуме́ць, ухапі́ць: ***to seize an idea*** зразуме́ць ду́мку. 3. сі́лай захапля́ць, займа́ць (*тэрыто́рыю*), бра́ць (*го́рад*). 4. ***A fever seized him*** Яго́ схапі́ла гара́чка. 5. канфіскава́ць

• ***seize on, upon*** а) схапі́ць *што*. б) завало́даць *чы́м*

seizure ['si:ʒər] n. 1. захо́п -у *m.*, канфіска́цыя *f.*; налажэ́ньне а́рышту (*на маёмасьць*). 2. прыпа́дак хваро́бы (*напр. сардэ́чны прыпа́дак, апаплексі́чны ўда́р*)

seldom ['seldəm] adv. ро́дка, ма́ла калі́

select [sə'lekt] – v.t. выбіра́ць: ***Select the book you want*** Вы́беры сабе́ кні́гу, яку́ю хо́чаш

– adj. 1. адбо́рны, выда́тны. 2. першара́дны, найле́пшы. 3. вы́браны: ***a very select club*** клюб для стро́га абра́ных

selection [sə'lekʃən] n. 1. выбіра́ньне *n.*, вы́бар, падбо́р -у *m.*: ***a good selection of hats*** вялі́кі вы́бар капелюшо́ў. 2. Biol. ***natural selection*** натура́льны адбо́р

selective [sə'lektɪv] adj. 1. адбо́рны; здо́льны рабі́ць адбо́р, сэлекты́ўны. 2. сэлекцы́йны

self [self] – n., pl. **selves** 1. сам: ***to be his real self*** быць самі́м сабо́ю; ***A selfish person puts self first*** Эгаі́ст ста́віць сябе́ на пе́ршае ме́сца

– pron. сам: ***a cheque made payable to self*** чэк вы́пісаны на сябе́

self- prefix са́ма-: ***self-control*** самавало́данье, самаапанава́ньне, стры́манасьць, вы́трыманасьць

self-acting [ˌself'æktɪŋ] adj. самадзе́йны, аўтаматы́чны: ***a self-acting machine*** аўтаматы́чная машы́на

self-addressed [ˌselfəˈdrest] adj. адрасава́ны сабе́: ***a self-addressed envelope*** канвэ́рт, адрасава́ны на сябе́

self-assertion [ˌselfəˈsɜ:rʃən] n. самасьцьвярджэ́ньне *n.*

self-assurance [ˌselfəˈʃʊrəns] n., *гл.* **self-confidence**

self-awareness [ˌselfəˈwernəs] n. самасьвядо́масьць *f.*

self-centered [ˌselfˈsentərd] adj. 1. эгацэнтры́чны. 2. эгаі́сты́чны

self-cleaning [ˌselfˈkli:nɪŋ] adj. самаачышча́льны

self-complacency [ˌselfkəmˈpleɪsənsi] n. самазадавО́ленасьць *f.*

self-conceit [ˌselfkənˈsi:t] n. зазна́йства *n.*

self-confidence [ˌselfˈkɑ:nfɪdəns] n. самапэ́ўнасьць, самаўпэ́ўненасьць *f.*

self-confident [ˌselfˈkɑ:nfɪdənt] adj. самапэ́ўны, самаўпэ́ўнены

self-conscious [ˌselfˈkɑ:nʃəs] n. сарамлі́вы, зьбянтэ́жаны

self-contained [ˌselfkənˈteɪnd] adj. 1. замкну́ты ў сабе́. 2. самадастаткО́вы

self-contradictory [ˌselfˌkɑ:ntrəˈdɪktəri] adj. які́ супярэ́чыць само́му сабе́.

self-control [ˌselfkənˈtroʊl] n. самакантрО́лЬ -ю *m.*, самавалО́даньне, самапанава́ньне *n.*; стры́манасьць, вы́трыманасьць *f.*

self-criticism [ˌselfˈkrɪtɪsɪzəm] n. самакры́тыка *f.*, самакрытыцы́зм -у *m.*

self-deception [ˌselfdɪˈsepʃən] n. самаашука́нства *n.*, самападма́н -у *m.*

self-defense [ˌselfdɪˈfens] n. самаабаро́на *f.*

self-denial [ˌselfdɪˈnaɪəl] n. самаадрача́ньне *n.*, адмаўле́ньне ад асабі́стых вы́гадаў

self-denying [ˌselfdɪˈnaɪɪŋ] adj. неэгаістычны, які́ самаадрака́ецца, адмаўля́е сабе́

self-determination [ˌselfdɪˌtɜ:rmɪˈneɪʃən] n. самавызначэ́ньне *n.*

self-devotion [ˌselfdɪˌvoʊʃən] n. самаадда́насьць, самаахвя́рнасьць *f.*

self-discipline [ˌselfˈdɪsəplɪn] n. самадысцыпліна *f.*

self-educated [ˌselfˈedʒəkeɪtəd] adj. самаадукава́ны, самаву́чаны

self-esteem [ˌselfɪˈsti:m] n. 1. самапава́га *f.* 2. самазадавО́ленасьць *f.*

self-evident [ˌselfˈevɪdənt] adj. відавО́чны, я́ўны

self-expression [ˌselfɪksˈpreʃən] n. самавыяўле́ньне *n.*

self-governing [ˌselfˈgʌvərnɪŋ] adj. самаўра́давы, самакірава́льны

self-government [ˌselfˈgʌvərnmənt] n. самаўра́д -у *m.*

self-induction [ˌselfɪnˈdʌkʃən] n., Electr. самаіндУ́кцыя *f.*

self-indulgence [ˌselfɪnˈdʌldʒəns] n. патура́ньне сваім сла́басьцям і пры́хамацям

self-indulgent [ˌselfɪnˈdʌldʒənt] adj. які́ патура́е сваім сла́басьцям і пры́хамацям

self-inflicted [ˌselfɪnˈflɪktɪd] adj. нанЕсены само́му сабе́ (*рана*)

self-interest [ˌselfˈɪntrest] n. асабі́стая вы́гада, карЫсьць; разьлі́к -у *m.*

selfish [ˈselfɪʃ] adj. сябелюбны, эгаісты́чны

self-knowledge [ˌselfˈnɑ:lɪdʒ] n. самапазна́ньне *n.*

self-love [ˌselfˈlʌv] n. 1. самалю́бства *n.*, эгаізм -у *m.* 2. зазна́йства *n.*

self-management [ˌselfˈmænɪdʒmənt] n. самакірава́ньне *n.*

self-pity [ˌselfˈpɪti] n. самарасчу́леньне, самашкадава́ньне *n.*

self-pollination[ˌselfˌpɑ:ləˈneɪʃən] n. самаапыле́ньне, самаапладне́ньне *n.*

self-portrait [ˌselfˈpɔ:rtrət] n. аўтапартрЭт -а *m.*

self-possessed [ˌselfpəˈzest] adj. вы́трыманы, паўстры́млівы, які́ валО́дае сабО́ю

self-possession [ˌselfpəˈzeʃən] n. вы́трыманасьць *f.*, самапанава́ньне, самавалО́даньне *n.*

self-preservation [ˌselfˌprezərˈveɪʃən] n. самазахава́ньне *n.*

self-recording [ˌselfrɪˈkɔ:rdɪŋ] adj. які́ аўтаматы́чна запі́свае

self-reliance [ˌselfrɪˈlaɪəns] n. самана-дзе́йнасьць, самапэ́ўнасьць *f.*

self-reliant [ˌselfrɪˈlaɪənt] adj. самапэ́ўны, упэ́ўнены ў сваé сі́лы

self-reproach [ˌselfrɪˈproʊtʃ] n. самаасу-джэ́ньне, самабічава́ньне *n.*

self-respect [ˌselfrɪˈspekt] n. пашáна да самóга сябé

self-restraint [ˌselfrɪˈstremt] n. стрымáнасьць *f.*

self-righteous [ˌselfˈraɪtʃəs] adj. самазадавóлены, самаўпэ́ўнены; фарысе́йскі

self-sacrifice [ˌselfˈsækrɪfaɪs] n. самаахвя́рнасьць; ахвя́рнасьць, самаадда́насьць *f.*

self-same [ˈselfseɪm] adj. той сáмы

self-satisfaction [ˌselfˌsætɪsˈfækʃən] n. самазадавóленасьць *f.*

self-satisfied [ˌselfˈsætɪsfaɪd] adj. самазадавóлены

self-seeker [ˌselfˈsi:kər] n. своекары́сьлівы чалавéк, кар'еры́ст -а *m.*

self-seeking [ˌselfˈsi:kɪŋ] – adj. своекары́сьлівы

– n. своекары́сьлівасьць *f.*, кар'еры́зм -у *m.*

self-service [ˌselfˈsɜ:rvɪs] n. самаабслугóўваньне *n.*, самаабслýга *f.*

self-starter [ˌselfˈstɑ:rtər] n. самапýск -а *m.*, аўтаматы́чны стартэ́р

self-styled [ˌselfˈstaɪld] adj. самазвáны: ***a self-styled leader whom no one follows*** самазвáны правады́р, якóга нíхтó не прызнаé

self-sufficiency [ˌselfsəˈfɪʃənsi] n. самадастаткóвасьць *f.*, самазабесьпячэ́ньне *n.*

self-sufficient [ˌselfsəˈfɪʃənt] adj. 1. незалéжны (*эканамíчна*). 2. самазабясьпéчаны, самадастакóвы

self-support [ˌselfsəˈpɔ:rt] n. самаўтрымáньне, самападтры́мка *f.*

self-supporting [ˌselfsəˈpɔ:rtɪŋ] *or* **self-sustaining** [ˌselfsəˈsteɪnɪŋ] adj. які́ сам утрымóўвае сябé

self-will [ˌselfˈwɪl] n. самавóльства *n.*, упáртасьць *f.*

self-willed [ˌselfˈwɪld] adj. самавóльны; упáрты

self-winding [ˌselfˈwaɪndɪŋ] adj. які́ аўтаматы́чна накрýчваецца, з аўтаматы́чным завóдам

sell [sel] v.t. **sold, selling** 1. прадавáць: ***to sell a house*** прадáць дом. 2. гандляváць: ***A butcher sells meat*** Мясні́к гандлюе мя́сам. 3. прадавáць, здрáджваць. 4. угавóрваць, перакóнваць *каго́*; папулярызавáць *што*: ***to sell the idea to the public*** перакана́ць людзéй у ідэ́і

• ***sell off*** распрадáць

• ***sell on*** а) намóвіць да *чаго́*. б) перакана́ць у *чым*

• ***sell out*** а) распрадавáць; перапрадавáць (*а́кцыі*). б) вы́даць (*чалавéка вóрагу*)

seller [ˈselər] n. прадаўцé -ўцá *m.*

• ***best seller*** хóдкі тавáр, хóдкая кні́га, бэстсэ́лер -а *m.*

sellout [ˈselaʊt] n. 1. здрáда *f.* 2. распрóдаж -у *m.*

selvage *or* **selvedge** [ˈselvɪdʒ] n. пруг прýга *m.* (*у тканíне*)

selves [selvz] n., *pl. of* **self** самí: ***He had two selves — a good self and a bad self*** У ім былó дзьве асóбы — дóбрая і благáя

semantic [səˈmæntɪk] adj. 1. сэ́нсавы. 2. сэманты́чны

semantics [səˈmæntɪks] n. сэмáнтыка *f.*

semaphore [ˈseməfɔ:r] n. 1. сэмафóр -а *m.* 2. сыстэ́ма сыгналізáцыі

semblance [ˈsembləns] n. 1. вы́гляд -у *m.* 2. падабéнства *n.*, падóбнасьць *f.*

semen [ˈsi:mən] n., pl. **semina** спэ́рма *f.*, насéньне *n.*

semester [səˈmestər] n. сэмэ́стар -ру *m.*, паўгóдзьдзе *n.* (*навучáльнае*)

semi- pref. 1. паў-: ***semicircle*** паўкóла, паўкрýг. 2. часткóва: ***semicivilized*** часткóва цывілізавáны. 3. двóйчы: ***semi-annually*** раз на паўгóда, двóйчы на год

semi-annual [ˌsemiˈænjʊəl] adj. паўгадóвы

semiannually [ˌsemiˈænjʊəli] adv. раз на паўгóда, двóйчы на год

semicircle [ˈsemiˌsɜ:rkəl] n. паўко́ла *n.*, паўкру́г -а *m.*

semicircular [ˌsemiˈsɜ:rkjələr] adj. паўкру́глы

semicolon [ˈsemiˌkoʊlən] n. кро́пка з ко́скай, кро́пка-ко́ска

semiconscious [ˌsemiˈkɑ:nʃəs] adj. напаўпрыто́мны, ама́ль непрыто́мны

semiconsciously [ˌsemiˈkɑ:nʃəsli] adv. напаўпрыто́мна

semidaily [ˌsemiˈdeɪli] adv. дво́йчы на дзень

semidetached [ˌsemidɪˈtætʃt] adj. напаўзлу́чаны: ***semidetached house*** адзі́н з двух дамо́ў, які́я ма́юць супо́льную сьцяну́

semifinal [ˌsemiˈfaɪnəl] n., Sport. паўфіна́л -у *m.*

semifluid [ˌsemiˈflu:ɪd] adj. *or* **semiliquid** [ˌsemiˈlɪkwɪd] ве́льмі густы́, вя́зкі, цягу́чы

semilunar [ˌsemiˈlu:nər] adj. у фо́рме паўме́сяца

semimonthly [ˌsemiˈmʌnθli] – adj. паўме́сячны

– adv. паўме́сячна, дво́йчы ў ме́сяц

– n., pl. **-lies** паўме́сячнік (*ча́сапіс, бюлетэ́нь*)

seminar [ˈsemɪnɑ:r] n. сэміна́р -у *m.*

seminary [ˈsemәneri] n., pl. **-naries** 1. духо́ўная сэміна́рыя. 2. вышэ́йшая шко́ла зь інтэрна́там (*для дзяўча́т*)

semiprecious [ˌsemɪˈpreʃəs] adj. по́ўкашто́ўны: ***semiprecious gem*** по́ўкашто́ўны ка́мень

semiquaver [ˈsemɪˌkweɪvər] n., Mus. шасна́ццатая (*но́та*)

Semite [ˈsemaɪt] n. сэмі́т -а *m.*

Semitic [səˈmɪtɪk] adj. сэмі́цкі

semivowel [ˈsemiˌvaʊəl] n. паўгало́сны -ага *m.*

semiweekly [ˌsemiˈwi:kli] – adj. паўтыднёвы

– adv. двойчы на ты́дзень

– n. паўтыднёвік -а *m.* (*ча́сапіс, газэ́та*)

semiyearly [ˌsemiˈji:rli] – adj. паўгадавы́

– adv. дво́йчы на год

semolina [ˌseməˈli:nə] n. ма́нныя кру́пы

senate [ˈsenət] n. сэна́т -у *m.*

senator [ˈsenətər] n. сэна́тар -а *m.*, сэна́тарка *f.*

senatorial [ˌsenəˈtɔ:rɪəl] adj. сэна́тарскі

send [send] – v.t. **sent, sending** 1. пасыла́ць, адсыла́ць. 2. выпраўля́ць: ***to send a boy to college*** вы́правіць хлапца́ ў кале́дж. 3. адсыла́ць: ***to send a reader to the dictionary*** адсыла́ць, адасла́ць чытача́ да сло́ўніка. 4. насыла́ць, нано́сіць: ***to send destruction*** нане́сьці разбура́ньні. 5. выпуска́ць: ***The volcano sent clouds of smoke*** Вулька́н выкіда́ў клубы́ дыму. 6. перадава́ць (*сыгна́лы*)

– v.i. пасыла́ць: ***send for a doctor*** пасла́ць па ле́кара, вы́клікаць ле́кара

sender [ˈsendər] n. 1. адпра́ўшчык -а, адпраўні́к -а́ *m.* (*ліста́, тава́ру*). 2. тэлегра́фны апара́т

send-off [ˈsendɔ:f] n. про́вады *pl. only*, разьвіта́льны ве́чар *або́* бясе́да

senile [ˈsi:naɪl] – adj. 1. стары́, старэ́чы, састарэ́лы. 2. кво́лы, хі́лы (*ад ста́расьці*). 3. Geol. вы́ветраны: ***a senile rock*** вы́ветраная скала́

– n. састарэ́л|ы -ага *m.*, састарэ́лая *f.*

senility [səˈnɪləti] n. 1. ста́расьць *f.* 2. старэ́чая фізы́чная *або́* разумо́вая кво́ласьць, ляда́шчасьць *f.*; старэ́чая зьдзеціне́ласьць

senior [ˈsi:njər] – adj. 1. старэ́йшы: ***John Parker senior*** Джон Паркер-старэ́йшы. 2. старэ́йшы паво́дле стано́вішча *або́* вы́слугі гадо́ў: ***the senior class*** старэ́йшая кля́са

– n. 1. старэ́йшая асо́ба. 2. ста́ршы ра́нгам *або́* вы́слугай гадо́ў. 3. выпускні́к -а́ *m.*, выпускні́ца *f.*

senior citizen грамадзяні́н у стары́м ве́ку, пэнсіянэ́р -а *m.*, пэнсіянэ́рка *f.*

senior high school вышэ́йшыя кля́сы сярэ́дняе шко́лы (*10, 11 і 12*)

seniority [si:nˈjɔ:rəti] n., pl. **-ties** 1. старшынство́ *n.* 2. працо́ўны стаж

sensation [senˈseɪʃən] n. 1. адчува́ньне *n.* 2. пачуцьцё *n.*, ура́жаньне *n.* 3. сэнса́цыя *f.*

sensational [senˈseɪʃənəl] adj. сэнсацы́йны

sense [sens] – n. 1. пачуццё *n.*: ***Sight, hearing, touch, taste, and smell are the five senses*** Зрок, слых, до́тык, смак і нюх — пяць пачу́ццяў. 2. пачуццё *n.*: ***a sense of security /of duty*** пачуццё бясьпе́кі/абавя́зку. 3. пачуццё *n.*: ***sense of humor*** пачуццё гу́мару. 4. развя́жнасьць, інтэліге́нтнасьць *f.*: ***common*** or ***good sense*** здаро́вы ро́зум, глузд. 5. адчува́ньне *n.*: ***a sense of beauty*** адчува́ньне хараства́; ***a sense of direction*** вычуццё кіру́нку. 6. значэ́ньне *n.*, сэнс -у *m.*: ***He was a gentleman in every sense of the word*** Ён быў джэнтэльме́нам у по́ўным сэ́нсе гэ́тага сло́ва. 7. толк -у *m.*: ***to speak or write sense*** гаварыць або́ пісаць разу́мна. 8. агу́льная ду́мка: ***the sense of the assembly*** агу́льная ду́мка схо́ду

– v. 1. адчува́ць, пачува́ць: ***She sensed that he was tired*** Яна́ адчува́ла, што ён быў сто́млены. 2. разуме́ць

• ***in a sense*** у пэ́ўным сэ́нсе, да пэ́ўнай ступе́ні

• ***make sense*** быць зразуме́лым, мець сэнс

• ***senses*** ро́зум -у *m.*; сьвядо́масьць *f.*: ***in one's senses*** пры сваім ро́зуме (*у нарма́льным псыхі́чным ста́не*); ***to come to one's senses*** а) прыйсьці́ да сябе́, апамята́ацца, апрыто́мнець. б) узя́цца за ро́зум

senseless [ˈsensləs] adj. 1. непрыто́мны. 2. дурны́, неразу́мны. 3. бессэнсо́ўны: ***senseless words*** бессэнсо́ўныя сло́вы. 4. бязмэ́тны, недарэ́чны

senselessly [ˈsensləsli] adv. бяз сэ́нсу, бесталко́ва

sense organ о́рган пачу́ццяя (*во́ка, ву́ха, нос і г.д.*)

sensibility [ˌsensəˈbɪlәti] n., pl. **-ties** 1. ура́жлівасьць *f.* 2. чульлівасьць *f.* 3. ура́жлівасьць, схі́льнасьць ху́тка абража́цца. 4. то́нкае адчува́ньне: ***sensibility for colors*** до́брае разро́зьніваньне ко́леру

sensible [ˈsensəbəl] adj. 1. развя́жны, разу́мны. 2. адчува́льны; відаво́чны; зна́чны: ***a sensible difference in temperature*** адчува́льная ро́зьніца тэмпэрату́ры; ***a sensible reduction in expenses*** зна́чнае зьме́ншаньне выда́ткаў. 3. ура́жлівы, чу́лы. 4. практы́чны

sensibly [ˈsensəbli] adv. 1. развя́жна, разу́мна. 2. адчува́льна, зна́чна

sensitive [ˈsensətɪv] adj. 1.ура́жлівы, ве́льмі чу́лы: ***The eye is sensitive to light*** Во́ка ўра́жлівае на сьвятло; ***a sensitive ear*** чу́йнае ву́ха; ***a sensitive eye*** то́нкі зрок. 2. чу́лы, чульлі́вы; крыўдлі́вы: ***sensitive point(s)*** слабо́е ме́сца, слаба́я стру́нка. 4. адчува́льны, далика́тны: ***a sensitive skin*** далика́тная ску́ра

sensitivity [ˌsensəˈtɪvәti] n., pl. **-ties** ура́жлівасьць *f.*; чу́ласьць, чульлі́васьць *f.*

sensual [ˈsenʃʊəl] adj. 1. пачуццёвы: ***sensual pleasures*** пачуццёвыя асало́ды. 2. палавы́ (*напр. ця́га*); юрлі́вы (*пра асо́бу*)

sensualist [ˈsenʃʊəlɪst] n. сэнсуалі́ст -а *m.*, сэнсуалі́стка *f.*: ***Gluttons and drunkards are sensualists*** Абжо́ры й п'я́ніцы — сэнсуалі́сты

sensuality [ˌsenʃʊˈæləti] n., pl. **-ties** пачуццёвасьць, юрлі́васьць *f.*, юр -у *m.*

sensuous[ˈsenʃʊəs] adj. пачуццёвы

sent [sent] v., *p.t. and p.p. of* **send**

sentence [ˈsentəns] – n. 1. сказ -у *m.* 2. пастано́ва *f.* 3. а) прысу́д -у *m.* б) прысу́джанае пакара́ньне або́ ка́ра *f.*: ***to serve one's sentence*** адбыва́ць пакара́ньне; ***life sentence*** пажыцьцёвае зьняво́леньне. 4. пры́маўка, прыка́зка, сэнтэ́нцыя *f.*; выслоўе *n.*

– v.t. засудзі́ць: ***The judge sentenced the thief to five years in prison*** Судзьдзя́ засудзі́ў зло́дзея на пяць гадо́ў турмы́

sentience [ˈsenʃəns] n. здо́льнасьць адчува́ць, чуццё, адчува́ньне *n.*: ***Some people believe in the sentience of***

flowers Некато́рыя лю́дзі ве́раць у здо́льнасьць адчува́ньня ў кве́так

sentiment [ˈsentəmənt] n. пачуцьцё *n.* 2. чульлі́васьць, сэнтымэнта́льнасьць *f.* 3. по́гляд -у *m.*, ду́мка *f.*; асабі́стае меркава́ньне

sentimental [ˌsentəˈmentəl] adj. чульлі́вы, чу́лы, сэнтымэнта́льны

sentimentalism [ˌsentəˈmentəlɪzəm] n. сэнтымэнталі́зм -у *m.*

sentimentality [ˌsentəmenˈtæləti] n., pl. **-ties** сэнтымэнта́льнасьць *f.*, залі́шняя, празьме́рная чу́льлівасьць

sentinel [ˈsentɪnəl] – n. 1. вартаўні́к -а́ *m.* 2. ва́рта *f.*: ***to stand sentinel*** стая́ць на ва́рце

– v.t. **-nelled** or **-neled, nelling** 1. варта ва́ць. 2. ста́віць ва́рту

sentry [ˈsentri] n., pl. **-tries** 1. вартаўні́к -а́ *m.* 2. вайско́вая ва́рта

sentry box вартаўні́чая бу́дка

sepal [ˈsepəl] n., Bot. падвяно́чкавы ліст о́к

separable [ˈsepərəbəl] adj. які́ мо́жна аддзяліць; падзе́льны

separate [ˈsepəreit] – v.t. 1. аддзяля́ць: а) ***The Atlantic Ocean separates North America from Europe*** Атлянты́чны акія́н аддзяля́е Паўно́чную Аме́рыку ад Эўро́пы. б) ***to separate church and state*** адддзяліць царкву́ ад дзяржа́вы. 2. адбіра́ць, аддзяля́ць: ***Separate your books from mine*** Аддзялі́ сваé кні́гі ад маіх

– v.i. 1. разыхо́дзіцца (*у ро́зныя бакі́*). 2. разыхо́дзіцца, разлуча́цца (*пра му́жа з жо́нкай*). 3. адлуча́цца: ***to separate from a group*** адлучы́цца ад гру́пы

– adj. [ˈsepərət] асо́бны, паасо́бны: ***These are two separate questions*** Гэ́та два асо́бныя пыта́ньні

separated [ˈsepəreitɪd] adj. 1. разьдзе́лены; адлу́чаны, аддзе́лены. 2. які́ не жыве́ ра́зам (*пра му́жа ці жо́нку*)

separately [ˈsepərətli] adv. 1. паасо́бку. 2. асо́бна, разлучы́ўшыся

separation [ˌsepəˈreiʃən] n. 1. аддзяле́ньне, разьдзяле́ньне: разлучэ́ньне *n.* 2. сэпара́цыя *f.* (*у жані́мстве*). 3. палітычнае аддзяле́ньне, адасабле́ньне *n.* (*ад дзяржа́вы*), сэпара́цыя *f.*

separatism [ˈsepərəˌtɪzəm] n. сэпарты́зм -у *m.*

separator [ˈsepəreitər] n. сэпара́тар -а *m.*, мало́чны сэпара́тар; ве́ялка *f.*; трые́р -а *m.*

September [sepˈtembər] n. ве́расень -сьня *m.*

septennial [sepˈteniəl] adj. сямігадо́вы, які́ здара́ецца ко́жныя сем гадо́ў

septic [ˈseptɪk] adj. сэпты́чны

septic tank сэ́птык -а *m.*

sequel [ˈsi:kwəl] n. 1. праця́г -у *m.*, прадаўжэ́ньне *n.* 2. вы́нік -у *m.*

sequence [ˈsi:kwəns] n. 1. пасьлядо́ўнасьць *f.*; чарго́васьць *f.*; пара́дак -ку *m.*: а) ***alphabetical sequence*** альфабэ́тны пара́дак. б) ***sequence of tenses*** пасьлядо́ўнасьць часо́ў. 2. сэ́рыя *f.*: ***a sequence of lessons on one subject*** сэ́рыя ле́кцыяў на тэ́му адна́го прадме́та. 3. вы́нік -у *m.* 4. ка́дар -ру *m.*: ***sequence of a motion picture*** ка́дар фі́льму, эпізо́д -у *m.*

sequent [ˈsi:kwənt] – adj. 1. насту́пны, чарго́вы. 2. пара́дкавы (*напр. ну́мар*); пасьлядо́ўны. 3. які́ вынікае́ з *чаго́*, які́ зьяўля́ецца вы́нікам *чаго́*

– n. вы́нік -у *m.*

sequester [sɪˈkwestər] v.t. 1. ізалява́ць, адасабля́ць, аддзяля́ць. 2. сэквэстрава́ць

sequin [ˈsi:kwɪn] n. бліскаўка (*для упрыго́жваньня адзе́ньня*)

Serbian [ˈsɜ:rbiən] – adj. се́рбскі

– n. 1. сэрб -а *m.*, се́рбка *f.* 2. се́рбская мо́ва

Serbo-Croatian [ˌsɜ:rbəkrouˈeiʃən] adj. сэ́рбска-харва́цкі

sere [sɪr] adj. вы́ветраны, вы́сушаны; зьвя́лы

serenade [ˌserəˈneid] – n. 1. сэрэна́да *f.* 2. лірычны музы́чны твор

– v.t. пяя́ць сэрэна́ду

serene [səˈri:n] adj. 1. спако́йны, ці́хі, ціхамі́рны: ***a serene smile*** спако́йная

ўсьме́шка. 2. сьве́тлы; я́сны, бясхма́рны: ***a serene sky*** я́снае, бясхма́рнае не́ба

serenity [səˈrenəti] n., pl. **-ties** 1. супако́йлю *m.*, ціхамі́рнасьць *f.* 2. я́снасьць, бясхма́рнасьць *f.*

serf [sɜ:rf] n. прыго́нн|ы -ага *m.*, прыго́нная *f.*

serfdom [ˈsɜ:rfdəm] n. прыго́н -у *m.*, прыго́ннае пра́ва

sergeant [ˈsɑ:rdʒənt] n. сяржа́нт -а *m.*

serial [ˈsɪriəl] – n. 1. сэры́йная публіка́цыя; пэрыяды́чнае выда́ньне. 2. фі́льм, пака́званы ча́сткамі
– adj. сэры́йны

serialize or **serialise**, esp. Br. [ˈsɪriəlaɪz] v.t. 1. выдава́ць ча́сткамі. 2. дзяліць на ча́сткі

serial number пара́дкавы ну́мар

sericulture [ˈserəˌkʌltʃər] n. гадо́ўля шаўкапра́даў

series [ˈsɪri:z] n., pl. **-ries** 1. ша́раг -у *m.*: ***a series of rooms opened off the long hall*** ша́раг пако́яў з увахо́дам з до́ўгага калідо́ру. 2. се́рыя *f.*, пасьлядо́ўны ша́раг: а) ***series of experiments*** се́рыя до́сьледаў; ***series of rainy days*** ша́раг дажджлі́вых дзён. б) се́рыя (*тво́раў*) 3. Electr. пасьлядо́ўнае спалуча́ньне

serif [ˈserɪf] n. засе́чка *f.* (*у лі́тары*), спалуча́льная ры́сачка

serious [ˈsɪriəs] adj. 1. сур'ёзны, пава́жны: ***a serious face*** пава́жны твар. 2. вялі́кі, сур'ёзны: ***serious mishap*** вялі́кая непрые́мнасьць. 3. ва́жны: ***a serious matter*** ва́жная спра́ва. 4. небясьпе́чны: ***a serious condition*** небясьпе́чны стан (*у хво́рага*)

seriously [ˈsɪriəsli] adv. пава́жна

seriousness [ˈsɪriəsnəs] n. пава́жнасьць *f.*

sermon [ˈsɜ:rmən] n. 1. ка́зань, про́паведзь, нау́ка *f.* (*рэлігі́йная*): ***to preach a sermon*** прамаўля́ць ка́зань. 2. павуча́ньне, настаўле́ньне *n.*: ***After the guests left, the boy got a sermon on table manners*** Калі го́сьці пайшлі́, хлапе́ц вы́слухаў павуча́ньне, як трыма́цца за стало́м

serpent [ˈsɜ:rpənt] n. вуж -а́ *m.*, вужа́ка, зьмяя́ *f.*

serpentine [ˈsɜ:rpənti:n] – adj. 1. вужа́чы, як вужа́ка. 2. зьвілі́сты, пакруча́сты: ***the serpentine course of a creek*** зьвілі́стая плынь ручая́. 3. хі́тры, няшчы́ры, здра́дніцкі, верало́мны: ***a serpentine suggestion*** няшчы́рая пара́да
– n. 1. сэрпанты́н -у *m.*, зьвілі́стая го́рная даро́га. 2. сэрпэнты́н -у *m.* (*мінэра́л*)

serrate [səˈreɪt] – adj. 1. зубча́ты, зубча́сты; вы́зублены: ***a serrate leaf*** зубча́ты ліст (*расьлі́ны*)
– v.t. 1. нараза́ць зубцы́, назу́бліваць. 2. вышчарбля́ць, вызу́бліваць

serrated [səˈreɪtɪd] adj. *гл.* **serrate**, adj.

serum [sɪˈrəm] n., pl. **serums** or **sera** [sɪˈrə] 1. Med. сы́варатка *f.* 2. сыро́ватка *f.* (*мало́чная*)

servant [ˈsɜ:rvənt] n. 1. слуг|а́ -і́ *m.*, служа́нка *f.*; **servants,** coll. чэ́лядзь *f.*; ***servants' quarters*** чаля́дня *f.* 2. службо́|вец -ўца *m.*, службо́ўка *f.*: ***civil servant*** дзяржа́ўны службо́вец, урадо́|вец -ўца *m.*, урадо́ўка *f.*; ***public servant*** службо́вая асо́ба
• ***servants of God*** слу́гі бо́жыя (*пра духаве́нства*)

servant maid служа́нка, пакаёўка *f.*

serve [sɜ:rv] v. 1. служы́ць: ***to serve in the army*** служы́ць у во́йску; ***He served as a butler*** Ён служы́ў дварэ́цкім. 2. абслуго́ўваць (*пакупніка́, кліе́нта ў рэстара́не*); падава́ць на стол. 3. дапамагчы, услужы́ць: ***Can I serve you in any way?*** Магу́ вам дапамагчы́ ў чым-ко́лечы? 4. служы́ць, быць прыда́тным: ***Boxes served as seats*** Скры́нкі служы́лі як сядзе́ньні
• ***It serves him right!*** Так яму́ й трэ́ба!
• ***serve a term in prison*** адсе́дзець тэ́рмін у астро́зе
• ***serve the ball*** падава́ць мя́ч (*у гульні́*)

server [ˈsɜ:rvər] n. 1. той, хто абслуго́ўвае. 2. міністра́нт -а *m.* (*у касьце́ле*).

3. а) падно́с -а *m.* б) лы́жка, відэ́лец для сэрвава́ньня: ***a cake server*** лапа́тка для то́рта

service ['sɜ:rvəs] – n. 1. слу́жба *f.*: ***to go into service*** паступа́ць на слу́жбу; ***to be in someone's service*** быць на слу́жбе ў каго́. 2. дапамо́га, паслу́га *f.*: ***the services of a doctor*** ле́карская дапамо́га. 3. вайско́вая слу́жба: ***active service*** абавязко́вая вайско́вая слу́жба. 4. прыбо́р -у *m.*: ***a tea service*** гарба́тны прыбо́р. 5. пада́ча (*у тэ́ніce*) – adj. службо́вы: ***service uniform*** службо́вая фо́рма

• ***at your service*** да ва́шых паслу́гаў

• ***be of service*** быць прыда́тным, карысным

• ***church service*** багаслу́жба

• ***of service*** дапамо́жны, карысны

• ***services*** абслугоўванне *n.*

• ***the civil service*** дзяржа́ўная цывільная слу́жба, дзяржа́ўныя ўрадо́ўцы

• ***the service*** or ***the services*** а́рмія, авія́цыя, флёт

serviceable ['sɜ:rvəsəbəl] adj. 1. карысны, прыда́тны. 2. мо́цны (*пра матэрыя́л*)

serviceman ['sɜ:rvəsmən] n., pl. **-men** 1. вайско́вец -ўца *m.* 2. мэха́нік, рамо́нтнік -а *m.*

service road даро́га для мясцо́вага ру́ху

service station 1. бэнзы́нная, запра́вачная ста́нцыя; бэнзазапра́ўка, бэнзакалёнка *f.* 2. рамо́нтная ста́нцыя

servicewoman ['sɜ:rvəs,wʊmən] n. жанчы́на-вайско́вец

serviette [,sɜ:rvi'et] n. сурвэ́тка *f.*

servile ['sɜ:rvəl] adj. 1. нізкапаклО́ньніцкі, ліcьлі́вы, падлі́зьлівы: ***servile flattery*** нізкапаклО́ньніцкае падлі́званьне. 2. ра́бскі; нявО́льнічы: ***servile work*** ра́бская пра́ца. 3. угО́дніцкі: ***servile to public opinion*** падаўкі́ грама́дзкай ду́мцы

servility [sɜ:r'vɪlətɪ] n., pl. **-ties** угО́дніцтва *n.*; сэрвілі́зм -у *m.*

servitude ['sɜ:rvətu:d] n. ра́бства *n.*; нявО́ля *f.* 2. ка́тарга *f.*

session ['seʃən] n. 1. сэ́сія *f.*, насе́джаньне *n.*: ***Parliament is now in session*** Парлямэ́нт цяпе́р на сэ́сіі. 2. рад насе́джаньняў. 3. пэры́яд насе́джаньняў: ***This year's session of Parliament was unusually long*** Сёлета сэ́сія парлямэ́нту была́ незвыча́йна даўга́я. 4. сэ́сія *f.*, трымэ́стар -ру *m.*: ***the summer session*** ле́тні трымэ́стар

• ***be in session*** мець насе́джаньне, сэ́сію; засяда́ць

set [set] – v.t. **set, setting** 1. ста́віць: ***to set the value of*** ацані́ць *што*; ***to set a record*** паста́віць рэкО́рд. 2. устаўля́ць, упраўля́ць: ***to set a broken bone*** упра́віць зламану́ю косьць. 3. настаўля́ць, навО́дзіць: ***to set a clock*** наве́сьці гадзі́ньнік 4. вызнача́ць, прызнача́ць (*час для чаго́*). 5. упрыго́жваць, аздабля́ць: ***a bracelet set with diamonds*** бранзале́т аздО́блены дыямэ́нтамі. 6. садзі́ць квакту́ху (*на я́йкі*). 7. Mus. а) склада́ць, піса́ць мэлёдыю. б) аранжава́ць му́зыку. 8. Print. набіра́ць (*тэкст*)

– v.i. 1. застыва́ць, гусьце́ць: ***jelly sets as it cools*** кісе́ль застыва́е, калі́ ахало́джваецца. 2. захО́дзіць: ***The sun sets in the west*** Со́нца захО́дзіць на за́хадзе. 3. сядзе́ць на я́йках (*пра квакту́ху*). 4. пасава́ць, падыхО́дзіць: ***That coat sets well*** Гэ́нае палітО́ до́бра сядзі́ць (*пасу́е*)

– adj. 1. вы́значаны, усталява́ны, прыня́ты: ***set time*** вы́значаны час; ***set rules*** прыня́тыя пра́вілы. 2. засты́лы, цьвёрды. 3. нава́жаны: ***He is set on going today*** Ён нава́жаны е́хаць сёньня

– n. 1. камплЕкт -у *m.*, пО́ўны набО́р *m.*; прыбО́р -у *m.*: ***a set of dishes*** прыбО́р, камплЕкт пО́суду. 2. радыёапара́т, тэлевізар *абО́* тэлефО́нны апара́т. 3. дэкара́цыя для п'е́сы *абО́* аднО́й дзе́і. 4. кіру́нлак -ку *m.*; схі́ль-

насьць *f.* : ***the set of a current*** кіру́нак плы́ні. 5. за́вязь *f.*
• ***all set*** гато́вы, по́ўнасьцю прыгатава́ны
• ***set about*** прыступа́ць, бра́цца (*за рабо́ту*)
• ***set against*** настро́іць супро́ць; супрацьста́віць
• ***set a good example*** дава́ць до́бры пры́клад
• ***set apart*** адкла́сьці ў бок, вы́дзяліць
• ***set aside*** а) ня ўлі́чваць. б) запа́шваць на бу́дучыню
• ***set back*** затры́мваць, перашкаджа́ць
• ***set forth*** а) выпраўля́цца. б) выка́зваць: ***to set forth one's opinion*** выка́зваць сваю́ ду́мку
• ***set forward*** а) высо́ўвацца. б) выпраўля́цца (*у даро́гу*)
• ***set free/loose*** вызваля́ць: ***The slaves were set free*** Няво́льнікі былі́ вы́звалены
• ***set in*** а) пачына́цца: ***rain set in*** пачаліся дажджы́. б) ***the tide set in*** пача́ўся прыплы́ў
• ***set off*** а) выбуха́ць. б) падава́цца (*у даро́гу*)
• ***set on*** а) напада́ць. б) падгаво́рваць, нацко́ўваць
• ***set on fire*** запа́льваць, падпа́льваць
• ***set out*** а) выруша́ць, падава́цца (*у даро́гу*). б) выстаўля́ць напака́з *або́* на про́даж. в) садзі́ць. г) плянава́ць, маніцца, мець намер (*рабіць*)
• ***set up*** а) будава́ць. б) пачына́ць, засно́ўваць, закрада́ць
• ***set up for*** падрабля́цца пад *каго́*

setback [ˈsetbæk] n. 1. адступле́ньне, затры́мка ў по́ступе; перашко́да, замі́нка *f.* 2. зьме́на на го́ршае, няўда́ча *f.*

setting [ˈsetɪŋ] n. 1. ра́мка *f.* (*карці́ны*); апра́ва (*ка́меня*). 2. дэкара́цыя (*спэкта́кля*). 3. ме́сца, час дзе́і (*п'е́сы або́ рама́на*). 4. асяро́дзьдзе *n.*

settle [ˈsetəl] – v.t. 1. усталёўваць, вызнача́ць (*да́ту, час*), дамаўля́цца: ***to settle on a time for leaving*** вы́значыць час вы́езду, дамо́віцца аб ча́се вы́езду. 2. залаго́джваць, зала́джваць: ***I must settle all my affairs before going away*** Я му́шу зала́дзіць усе́ сваі́ спра́вы пе́рад вы́ездам. 3. апла́чваць: ***to settle a bill*** аплаці́ць раху́нак. 4. засяля́ць; калянізава́ць. 5. супако́йваць: ***A vacation will settle your nerves*** Адпачы́нак супако́іць тваі́ нэ́рвы
– v.i. 1. сяліцца; асяля́цца: ***to settle separately*** расьсяля́цца. 2. ула́джвацца, уладко́ўвацца: ***We are settled in our new home*** Мы ўладкава́ліся ў на́шым но́вым до́ме. 3. вы́гадна ўладко́ўвацца (*напр. у фатэ́лі*). 4. абсяда́ць: ***The end of that wall has settled five centimeters*** Канец то́е сьцяны́ абсе́ў на пяць сантыме́траў
• ***settle differences*** залаго́дзіць супярэ́чнасьці
• ***settle down*** а) усталява́цца. б) супако́іцца: ***At last the children settled down*** Нарэ́шце дзе́ці супако́іліся
• ***settle up*** аплаці́ць раху́нак, расплаці́цца

settled [ˈsetəld] adj. 1. асе́лы. 2. засе́лены: ***a densely settled region*** гу́ста засе́леная мясцо́васьць. 3. усталява́ны, вы́значаны (*пара́дак, да́та, цана́*)

settlement [ˈsetəlmənt] n. 1. урэгулява́ньне, пагадне́ньне, ула́джаньне *n.* (*спра́вы*). 2. вырашэ́ньне, вызначэ́ньне *n.* 3. апла́та *f.* (*до́ўгу*). 4. асяле́ньне *n.* 5. се́лішча *n.*, калёнія *f.* 6. аседа́ньне *n.* (*будыні́ны*)

settler [ˈsetələr] n. 1. пасяле́н|ец -ца *m.*, пасяле́нка *f.* 2. Law асо́ба, яка́я перадае́ ўла́снасьць

settlings [ˈsetəlɪŋz] n., pl. аса́д|ак -ку *m.*

seven [ˈsevən] n., adj. сем, coll. сямёра; сямёрка *f.*

sevenfold [ˈsevənfould] – adv. у сем разо́ў
– adj. 1. сяміразо́вы. 2. зь сямі ча́стак

seven hundred n. сямсо́т, *indecl.*

seven-hundredth adj. семісо́ты

seventeen [ˌsevənˈti:n] n. сямна́ццаць

seventeenth [ˌsevənˈti:ntθ] adj. сямнáццаты
seventh [ˈsevəntθ] adj. сёмы
seventieth [ˈsevəntiəθ] adj. сямідзясóтыя
seventy [ˈsevənti] n., pl. **-ties** сéмдзесят
sever [ˈsevər] – v.t. 1. разразáць, адразáць, адсякáць: ***to sever a rope*** разрэ́заць вярóўку. 2. парывáць (*сувязі, дачынéньні*) – v.i. аддзяля́цца, падзяля́цца: ***to sever into two factions*** падзялíцца на дзьве фракцыі
several [ˈsevrəl] adj. 1. кóлькі, нéкалькі: ***to gain several kilograms*** набráць нéкалькі кілягрáмаў. 2. рóзны, асóбны; індывідуáльны: ***The boys went their several ways*** Хлапцы́ пайшлí рóзнымі дарóгамі
severance [ˈsevərəns] n. 1. аддзялéньне *n.*; падзéл -у *m.* 2. разры́ў -ву *m.*: ***the severance of diplomatic relations*** разры́ў дыпляматы́чных дачынéньняў
severance pay плáта пры звальнéньні з прáцы, выхаднáя дапамóга
severe [sɪˈvɪr] adj. 1. сувóры, суровы, стрóгі: ***a severe sentence*** суровы прысýд. 2. цяжкí: ***a severe illness*** цяжкáя хваробá. 3. вóстры, жóрсткі: ***a severe criticism*** вóстрая крытыка. 5. стрóгі, прóсты (*пра прычóску, адзéньне*)
severity [sɪˈverəti] n., pl. **-ties** 1. стрóгасьць, суровасьць *f.* 2. прóстасьць *f.* (*стылю, гýсту*). 3. вастрынá *f.*; лютасьць, жóрсткасьць *f.*: ***the severity of pain*** вастрынá бóлю; ***the severity of storms*** лютасьць навальніцаў. 4. павáжнасьць (*хваробы*). 5. дакладнасьць, акурáтнасьць *f.*
sew [sou] v.t. **sewed, sewn** or **sewed, sewing** шы́ць, прышываць, сшываць: ***to sew on a button*** прышы́ць гýзік
• ***sew on*** прышы́ць
• ***sew up*** зашы́ць: ***The doctor sewed up the wound*** Дóктар зашы́ў рáну
sewage [ˈsu:ɪdʒ] n. сьцёкавыя вóды, каналізáцыя *f.*
sewer I [ˈsu:ər] n. каналізацы́йная трубá
sewer II [ˈsouər] n. швец -яцá *m.*, швáчка *f.*
sewerage [ˈsu:ərɪdʒ] n. 1. каналізáцыя *f.* 2. сьцёкавыя вóды
sewing [ˈsouɪŋ] n. шытвó *n.*
sewing machine швéйная машы́на
sewn [soun] v., *p.p. of* **sew** шы́ты, пашы́ты
sex [seks] – n. 1. пол -у *m.*: ***the male sex*** мужчы́нскі пол; ***the female sex*** жанóчы пол. 2. сэкс -у *m.* 3. Informal палавáя сýвязь, палавы́я знóсіны – adj. палавы́
• ***the fair, gentle sex*** жанчы́ны
• ***the sterner*** or ***stronger sex*** мужчы́ны
sex appeal фізы́чная прывáбнасьць
sextet or **sextette** [sekˈstet] n. 1. сэкстэ́т -у *m.*, а) кампазы́цыя для шасьцёх галасóў *або́* інструмэ́нтаў. б) грýпа з шасьцёх выканáўцаў. 2. шасьцёрка *f.*
sexual [ˈsekʃuəl] adj. палавы́, сэксуáльны
sexuality [ˌsekʃuˈæləti] n. сэксуáльнасьць *f.*
sexy [ˈseksi] adj. 1. які́ ўзбуджáе сэксуáльныя пачýцьці. 2. сэксуáльны: ***a sexy novel*** сэксуáльны раман
shabby [ˈʃæbi] adj. 1. працёрты, знóшаны (*пра вóпратку*). 2. абдзёрты, абадрáны, абшáрпаны, запýшчаны. 3. Figur. несправядлíвы, нíзкі, пóдлы: ***shabby treatment*** несправядлíвае абыхóджаньне
shack [ʃæk] – n. 1. бýдка *f.*, будáн, шалáш -á *m.* 2. занядбáная хáта, хацíна *f.* – v.i., Sl. жыць, кватаравáць, пражывáць: ***He shacks in a boarding house*** Ён жывé ў пансіёне
• ***shack up*** жыць з кім-нéбудзь
shackles [ˈʃækəlz] – n., pl. кайданы́, акóвы, нарýчнікі *pl.*; Figur. пýты *pl.* – v.t. 1. закóўваць у кайданы́. 2. Figur. утаймóўваць; зьнявóльваць
shade [ʃeɪd] – n. 1. зáсень *f.*, цень -ю *m.*: ***in the shade of a tree*** у зáсені дрэ́ва; ***light and shade*** сьвятлó й цéнь (*і ў пе-*

ранóсным значэ́ньні). 2. заслóна ад сьвятлá, жалю́зі, *indecl.* 3. адцéньне (*кóлеру*). 4. цень *f.*, пры́від -у *m.*

– v.t. завé́шваць, засланя́ць, зáсьціць ад сьвятлá; зацямня́ць

• ***the shades*** пры́цемак, паўзмрóк (*вéчара*); змрок, цéмра (*нóчы*)

shadow [ˈʃædoʊ] – n. 1. цень -ю *m.* (*чалавéка абó прадмéта*). 2. зáсень *f.*, цень -ю *m.* 3. цямнéйшае мéсца ў карціне. 4. кры́шка; малáя ступéнь: ***There's not a shadow of a doubt about his guilt*** Нямá найменшага сумнéву, што ён вінавáты. 5. здань *f.*, пры́від -у *m.* 6. ахóва *f.*, прыстáнішча *n.*

– v.t. 1. засланя́ць ад сьвятлá: ***be shadowed by*** быць у цяні́ *чагó*. 2. кі́даць цень. 3. неадступна хадзíць за *кім*. 4. Figur. засмучáць; азмрóчваць

• ***be afraid of one's own shadow*** бая́цца свайгó цéню

• ***cast a long shadow*** быць уплывóвым

• ***the shadows*** пры́цемлак -ку *m.*, паўзмрóк -у *m.*

• ***under*** or ***in the shadow of*** пад засеньню *чагó*: ***We met in a little cafe under the shadow of the cathedral*** Мы спаткáліся ў невялíкай кавя́рні пад засеньню катэ́дры

shadowy [ˈʃædoʊi] adj. 1. цяні́сты; цёмны. 2. як цень; няя́сны, невырáзны, слабы́, малы́: ***a shadowy outline*** няя́сны абры́с. 3. нерэáльны, пры́відны

shady [ˈʃeɪdi] adj. 1. у цéню; зацéнены. 2. цяні́сты. 3. сумнéўнай сумлéннасьці; цёмны: ***rather shady occupations*** дóсыць цёмныя занáткі

shaft [ʃæft] n. 1. дрэ́ўка дзíды *абó* сьця́га; дзíда *f.*, стралá *f.* 2. прамéнь сьвятлá. 3. аглóбля, аглóбліна *f.* 4. вал -а *m.* (*млынá, турбíны*), вось *f.* 5. рýчка малаткá; тапары́шча. 6. шáхта *f.*: ***an elevator shaft*** лíфтавая шáхта, лíфтавы ствол

shag [ʃæg] n. 1. цьвярды́я, пакудлáчаныя валасы́ *абó* поўсьць, кóсмы *pl.* 2. даўгí, цьвярды́ ворс (*сукнá, тканíны*). 3. калмáтая тканíна. 4. махóрка *f.*

shaggy [ʃægi] adj. лахмáты, бухмáты, калмáты: ***a shaggy dog*** калмáты сабáка

shake [ʃeɪk] – v., **shook, shaken** 1. трэ́сьці; вытрасáць: ***to shake a rug*** вы́трасьці дывáн. 2. страсáць: ***to shake snow off one's clothing*** абтрэ́сьці сьнег з вóпраткі. 3. трэ́сьці, ціснуць, паціскáць: ***to shake hands*** паціснуць рукý. 4. страсáць, скаланáць: ***The explosion shook the town*** Вы́бух страсянýў гóрад. 5. пахіснýць (*вéру*)

– v.i. 1. страсáцца, абтрасáцца: ***Sand shakes off easily*** Пясóк лёгка абтрасáецца. 2. трэ́сьціся, калаці́цца, дрыжэ́ць (*ад хóладу, стрáху*). 3. хістáцца (*пра адвáгу*)

– n. 1. трасéньне *n.* 2. Informal земляцрýс -у *m.* 3. малóчны актэ́йль ***milk shake***. 4. Sl. імгнéньне *n.*: ***I'll be there in two shakes*** я бýду там умóмант

• ***no great shakes*** нічóга вáжнага *абó* незвычáйнага

• ***shake down*** а) страсáць (*плады́ з дрэ́ва*). б) утрасáць. в) уладкóўвацца. г) Sl. вымагáць грóшы

• ***shake off*** пазбы́цца *кагó-чагó*

• ***shake up*** а) устрэ́сваць, узбóўтваць; мяшáць. б) усхваляваць

• ***the shakes*** а) трасýха, ліхамáнка *f.* б) дры́жыкі *pl.*

shaken [ˈʃeɪkən] v., *p.p. of* **shake**

shake-up [ˈʃeɪkʌp] n., Informal ператасóўка, перамяшчэ́ньне службóвых асóбаў: ***a shake-up in the government*** чы́стка ў дзяржáўным апарáце

shaky [ˈʃeɪki] adj. 1. дрыгóткі: ***a shaky voice*** дрыгóткі гóлас. 2. нямóцны, хісткі. 3. няпэ́ўны, ненадзéйны

shale [ʃeɪl] n. слáнец -цу *m.*

shall [ʃæl] v., *pres.* **shall,** *past and cond.* **should**, *neg.* **should'nt** *ужывáецца*: 1. *у 1-ай асóбе для азначэ́ньня бýдучыні*: ***I shall come tomorrow*** Я прыйдý зáўтра; ***We shall consider the matter*** Мы разглéдзім гэ́тую спрáву. 2. *у*

2-ой і 3-яй асо́бах для азначэ́ньня рашу́часьці, прыму́су, абавя́зку або́ неабхо́днасьці: ***You shall do it*** Ты му́сіш гэ́та зрабіць. 3. *у зако́нах і пастано́вах*: ***The fine shall not exceed $50*** Штраф не павінен перавыша́ць 50 даля́раў. 4. *ува ўмо́ўных ска́зах*: ***if he should die*** калі б ён памёр

shallot [ʃə'lɑ:t] n. шалёт -у *m.*, (*расьлі́на, падо́бная да цыбу́лі*)

shallow ['ʃælou] – adj. неглыбо́кі, лёгкі (*пра сон*); плыткі: ***shallow water*** плы́ткая вада́, мель *f.*: ***a shallow dish*** плы́ткая посу́дзіна

– v.i. мяле́ць

shalt [ʃælt] v., Poetic, *2nd pers. sing. p.t. of* **shall**: ***Thou shalt not sin*** Не зграшы́

sham [ʃæm] – n. 1. прыкі́дваньне, удава́ньне *n.*, сымуля́цыя *f.* 2. падро́бка, імітацыя *f.* 3. хлус -а *m.*, манюкіа -і *m.&f.* ; ашука́нец -ца *m.* 4. накі́дка *f.*: ***a pillow sham*** дзённая дэкаратыўная накрыўка на падушку

– adj. удава́ны: ***a sham battle for practice*** удава́ная бітва́ (*на манэ́ўрах*). 2. падро́блены, імітава́ны

– v.t. **(-mm-)** удава́ць, сымулява́ць, прыкіда́цца: ***He shammed sickness*** Ён прыкі́нуўся хво́рым

shamble ['ʃæmbəl] – v.i. плясьціся, валачы́ но́гі

– n. цяжка́я хада́

shambles ['ʃæmbəlz] n., pl. or sing. 1. бо́йня *f.* 2. бо́йня, разьня́ *f.*, вайна́ з ма́савым зьнішчэ́ньнем. 3. по́ўны балага́н

shame [ʃeim] – n. 1. со́рам -у *m.*, сараматá *f.*: ***Shame on you!*** Як табе́ ня со́рамна! 2. га́ньба *f.*: ***to bring shame upon one's family*** прыно́сіць га́ньбу сваёй сям'і. 3. шко́да *f.*; прыкрасьць *f.*: ***It is a shame he is so wasteful*** Прыкра, што ён такі марнатра́ўны; ***What a shame you can't come earlier*** Яка́я шко́да, што ты ня мо́жаш прыйсьці ране́й

– v.t. 1. саро́міць, сарамаці́ць. 2. га́ньбіць

• ***For shame!*** Со́рамна!

• ***put to shame*** а) зга́ньбіць; засаро́міць. б) перасягну́ць, перавы́сіць; зацьмі́ць (*спры́там, працаві́тасьцю*)

shameful ['ʃeimfəl] adj. гане́бны, які́ прыно́сіць со́рам

shameless ['ʃeimləs] adj. 1. бессаро́мны; наха́бны. 2. непрысто́йны, пазба́ўлены пачуцьця́ со́раму, сараматны́: ***a shameless person*** сараматні́к, сараматні́ца

shamelessly ['ʃeimləsli] adv. гане́бна, бессаро́мна

shamelessness ['ʃeimləsnəs] n. наха́бства *n.*, бессаро́мнасьць *f.*

shammy ['ʃæmi] n., pl. **-mies** за́мша *f.*

shampoo [ʃæm'pu:] – v.t. 1. мы́ліць (*валасы́*). 2. мыць (*галаву́, дыва́н*)

– n. 1. шампу́нь -ю *m.* 2. мыцьцё галавы́

shamrock ['ʃæmrɑ:k] n. 1. Bot. трылісьнік -а *m.* (*эмбле́ма Ірля́ндыі*). 2. Bot. кісьліца звыча́йная; дзя́целіна *f.*

shank [ʃæŋk] n. 1. галёнка *f.* 2. цэ́лая нага

shanty ['ʃænti] n., pl. **-ties** ха́тка, хаці́на *f.*, бара́к -а *m.*

shape [ʃeip] – n. 1. фо́рма *f.*: ***the shape of a triangle*** фо́рма трыку́тніка. 2. фо́рма *f.*, абры́с -у *m.*: ***to take the shape of*** прыма́ць фо́рму *каго́-чаго́*. 3. стан -у *m.*, фо́рма *f.*: ***in bad shape*** у слабы́м ста́не; ***to keep oneself in good shape*** трыма́ць сябе́ ў до́брай фо́рме. 4. пара́дак -ку *m.*: ***to get one's thoughts into shape*** прывёсьці сваё ду́мкі ў пара́дак. 5. род -у *m.*: ***dangers of every shape*** небясьпе́кі ўся́кага ро́ду. 6. фо́рма *f.* (*начы́ньне*)

– v.t. 1. фармава́ць. 2. дапасо́ўваць у фо́рме. 3. надава́ць *чаму́* пэ́ўную фо́рму *або́* хара́ктар.

• ***shape up*** а) прыма́ць фо́рму. б.) прыво́дзіць сябе́ ў фо́рму

shapeless ['ʃeipləs] adj. 1. бясфо́рмны. 2. нязгра́бны, няскла́дны

shapely ['ʃeipli] adj. 1. прыго́жа скла́дзены (*пра чалаве́ка*). 2. прые́мнай фо́рмы

share I [ʃer] – n. 1. до́ля, ча́стка *f.*, удзе́л -у *m.*: ***Do your share of the work*** Зрабі́ нале́жную табе́ ча́стку рабо́ты. 2. а́кцыя *f.*; пай -ю *m.*, удзе́л -у *m.*
– v.i. дзяліць; мець супо́льна: ***The sisters share the same room*** Сёстры жыву́ць ра́зам у адны́м пако́і. 2. дзяліцца. 3. браць удзе́л
• ***go shares*** дзяліцца зь не́кім
• ***share and share alike*** дзяліць паро́ўну; дзяліцца паро́ўну

share II [ʃer] n. лямеш лемяша́, наро́г -а *m.* (*плу́га*)

shark I [ʃɑ:rk] n. аку́ла *f.*

shark II [ʃɑ:rk] n. 1. вымага́льнік -а *m.*, махля́р -а́ *m.*, ашука́нец -ца *m.* 2. Sl. выда́тны зна́ўца чаго́-н.

sharp [ʃɑ:rp] – adj. 1. во́стры; до́бра завостраны: ***a sharp knife*** во́стры нож. 2. во́страканцо́вы, сьпіча́сты. 3. рапто́ўны, круты́ (*пра паваро́т*). 4. во́стры, ро́зкі: ***sharp words*** ро́зкія сло́вы. 5. мо́цны, во́стры: ***a sharp pain*** во́стры боль. 6. выра́зны: ***the sharp contrast*** ро́зкі, выра́зны кантра́ст. 7. во́стры, то́нкі; адчува́льны: ***a sharp eye*** до́брае во́ка; ***sharp ears*** чу́йныя ву́шы
– adv. 1. дакла́дна: ***at one o'clock sharp*** дакла́дна, ро́ўна а пе́ршай гадзі́не. 2. рапто́ўна, пі́льна: ***Look sharp!*** Глядзі́ ва ўсе́ во́чы, будзь пі́льны
– n. Mus. дые́з -а *m.*

sharpen [ˈʃɑ:rpən] – v.t. 1. вастры́ць. 2. завастра́ць. 3. тачы́ць, нато́чваць
– v.i. вастры́цца

sharp-eyed [ˌʃɑ:rpˈaɪd] adj. 1. з во́стрым, прані́клівым зро́кам. 2. пі́льны, назіра́льны

sharp-nosed [ˌʃɑ:rpˈnoʊzd] adj. 1. востранО́сы. 2. з до́брым ню́хам

sharpshooter [ˈʃɑ:rpˌʃu:tər] n. ме́ткі страло́к; сна́йпэр -а *m.*

shatter [ˈʃætər] – v.t. 1. разьбіва́ць, растру́шчваць удру́зг (*на кава́лачкі, на дру́зачкі*): ***a stone shattered the window*** ка́мень разьбі́ў акно́. 2. псава́ць, руйнава́ць (*здаро́ўе, не́рвы*); разьбіва́ць, разбура́ць (*надзе́ю*). 3. падрыва́ць (*дове́р, здаро́ўе і г.д.*)
– n. аско́лак -ка *m.*
• ***shatters,*** pl. аско́лкі *pl.*

shave [ʃeɪv] – v.i. **shaved, shaved** or **shaven** галі́цца, бры́цца
– v.t. 1. галі́ць, зго́льваць, брыць (*ву́сы*). 2. кро́іць, ро́заць на то́ненькія скры́лікі. 3. зраза́ць ве́льмі бліска або́ ні́зка (*як траву́*). 4. Figur. зраза́ць: ***The car shaved the corner*** Машы́на ледзь не зачапі́лася за рог
– n. 1. гале́ньне, брыцьцё *n.* 2. струг -а *m.* (*прыла́да*). 3. то́нкі скрылёк
• ***close shave*** на валасо́к ад небяспе́кі

shaven [ˈʃeɪvən] adj. го́лены, бры́ты

shaving [ˈʃeɪvɪŋ] n. 1. often ***shavings*** то́ненькія скры́лікі; габлёнка *f.*, стру́жкі. 2. гале́ньне *n.*

shaving set прыбо́р для гале́ньня

shawl [ʃɔ:l] n. шаль -я *m.*

she [ʃi:] – pron., *sing. nom.* **she**, *poss.* **hers** яна́
– n. асо́ба або́ жывёліна жано́чага ро́ду

sheaf [ʃi:f] n. **sheaves** сноп снапа́, пук -а́ *m.*: ***a sheaf of wheat*** сноп пшані́цы; ***a sheaf of arrows*** пук стрэ́лаў

shear [ʃɪr] – v.t. 1. стры́гчы: ***The farmer sheared his sheep*** Гаспада́р стрыг сваіх аве́чак. 2. абраза́ць
– n. 1. стры́жка *f.* 2. абстры́жаная во́ўна. 3. адна́ ча́стка нажні́цаў

shears [ʃɪrz] n., pl. or sing. но́жны, нажні́цы *pl. only* (*краве́цкія, садо́выя, для стры́жкі аве́чак*)

sheath [ʃi:θ] n., pl. **sheaths** но́жны *pl.*, по́хва *f.* (*для мяча́, нажа́*)

sheathe [ʃi:ð] v.t. 1. уклада́ць у по́хву (*меч*). 2. абвіва́ць, абмо́тваць: ***a mummy sheathed in linen*** му́мія абві́тая палатно́м

sheave [ʃi:v] v.t. зьвя́зваць а) у снапы́ (*збо́жжа*). б) у пукі́ (*лён*)

shed I [ʃed] n. 1. а) хлеў, -ява́ *m.* (*для жывёлы*). б) сьві́лан -на *m.*, пу́ня *f.* (*для се́на*). в) паве́ць, паве́тка *f.* (*для*

дро́ваў). 2. дэпо́, *n., indecl.*: ***a train shed*** чыгу́начнае дэпо́. 4. анга́р -а *m.*

shed II [ʃed] – v., **shed** 1. праліва́ць: ***He shed his blood for his country*** Ён праліва́ў кроў за свой край. 2. разліва́ць. 3. скіда́ць, ліня́ць; мяня́ць: ***The snake sheds its skin*** Вуж мяня́е ску́ру. 4. аддава́ць, распаўсю́джваць: ***The sun sheds light*** Со́нца выпраме́ньвае сьвятло́

– v.i. скіда́ць ску́ру, мяня́ць ро́гі; ліня́ць (*мяня́ць пе́р'е, поўсьць*): ***The snake has just shed*** Вуж то́лькі што скі́нуў ску́ру

• ***shed blood*** праліва́ць кроў, зьнішча́ць жыцьцё, забіва́ць

• ***shed one's own blood*** ахвяраваць сваё жыцьцё

she'd [ʃi:d] = **she had, she would**

sheen [ʃi:n] n. бляск -у, гля́нец -цу *m.*

sheep [ʃi:p] n., pl. **sheep** аве́чка *f.*, бара́н -а́ *m.*

• ***make sheep's eyes*** кіда́ць закаха́ныя по́зіркі

sheepcote ['ʃi:pkout] n. аве́чы хлеў, аўча́рня *f.*, аве́чнік -а *m.*

sheep dog аўча́рка *f.*

sheepherder ['ʃi:p,hɜ:rdər] n. аўча́р -а́ *m.*

sheepman ['ʃi:pmən] n., pl. **-men** 1. авечкагадо́лвец -ўца *m.* 2. аўча́р -а́ *m.* (*пасту́х*)

sheep range аве́чае па́сьбішча

sheepskin ['ʃi:pskɪn] n. 1. аўчы́на *f.* 2. пэрга́мэнт -у *m.* 2. Informal дыплём -у *m.*

sheepskin coat кажу́х -а́ *m.*

sheer I [ʃɪr] – adj. 1. лёгкі, ама́ль празры́сты: ***a sheer white dress*** лёгкая бе́лая суке́нка. 2. по́ўны, абсалю́тны: ***sheer exhaustion*** по́ўнае зьнясі́леньне; ***sheer waste of time*** адна́ трата ча́су. 3. стро́мкі, стро́мы (*спад, скала́*), вэртыка́льны

– adv. 1. ца́лкам, зусі́м. 2. ве́льмі стро́мка

sheer II [ʃɪr] – v.i. адхіля́цца ад ку́рсу; зварочваць у бок

– n. адхіле́ньне ад ку́рсу

sheerly ['ʃɪrli] adv. абсалю́тна; ца́лкам; зусі́м; про́ста: ***sheerly out of curiosity*** про́ста зь цікава́сьці

sheet ['ʃi:t] n. 1. по́сьцілка, прасьціна́ *f.*, прасьціра́дла *n.* 2. ліст -а́ *m.* (*шкла, мэта́лу*), а́ркуш (*папе́ры*). 3. Informal газэ́та *f.* 4. пласт -у *m.*: ***a sheet of ice*** пласт лёду

sheet iron ліставо́е жале́за

sheet lightning зарні́ца *f.*, во́дбліск далёкай навальні́цы

sheik or **sheikh** [ʃi:k] n. шэйх -а *m.*

shelf [ʃelf] n., pl. **shelves** 1. пали́ца *f.*: ***to put on the shelf*** адкладаць, адкіда́ць як непатрэ́бнае *або́* непажада́нае. 2. во́дмель *f.* 3. шэ́льф -а *m.*

• ***off the shelf*** станда́ртны, гато́вы (*прадукт*)

shell [ʃel] – n. 1. а) ра́кавінка *f.* (*сьлімака́, ву́стрыцы*). б) па́нцыр -а *m.* (*ра́ка, кра́ба, чарапа́хі*). 2. шкарлу́піна *f.* (*арэ́ха, я́йка*). 3. гільза патро́на, патро́н -а *m.* 4. снара́д -а *m.*, грана́та *f.*

– v.t. 1. лу́шчыць (*струкі гаро́ху, арэ́хі*). 2. абіра́ць (*зе́рне кукуру́зы*); ***to shell grain (in a mill)*** шатрава́ць жыта (у млыне́). 4. абстрэ́льваць (*снара́дамі*): ***The enemy shelled the town*** Во́раг абстрэ́льваў го́рад артылерыйскім агнём

• ***shell out,*** Informal дава́ць, раздава́ць (*гро́шы*), раскашэ́львацца

she'll [ʃi:l] = **she shall, she will**

shellfish ['ʃelfɪʃ] n., pl. coll. **-fish** or **-fishes** ракападо́бныя *pl.*

shellproof ['ʃelpruf] adj. браніраваны

shellshock ['ʃelʃɑ:k] n. кантузія *f.*

shelter ['ʃeltər] – n. прыту́лак, прыпы́нак -ку *m.*, прыпы́нішча *n.*; схо́вішча *n.*

– v.t. дава́ць прыту́лак, прытуля́ць; засланя́ць, ахо́ўваць (*ад ве́тру, со́нца*); хава́ць ад небясьпе́кі

– v.i. знахо́дзіць прыпы́нак, схо́вішча

shelve [ʃelv] v.t. 1. кла́сьці на пали́цу. 2. адкладаць (*разгля́д, спрэ́чку*)

shelves [ʃelvz] n., *pl. of* **shelf**

shepherd ['ʃepərd] n. 1. пасту́х аве́чак. 2. па́стыр -а *m.*, духо́ўны апяку́н

• ***the Good Shepherd*** Дóбры Пáстыр (*пра Ісýса Хрыстá*)

shepherdess ['ʃepərdəs] n. пастýшка *f.*

sheriff ['ʃerɪf] n. шэры́ф -а *m.*

sherry ['ʃeri] n., pl. **-ies** шэ́ры *n.*, *indecl.*, (*віно́*)

shield [ʃi:ld] – n. 1. шчыт -á *m.* 2. ахóва *f.* 3. Tech. экрáн -а *m.*

– v.t. абараня́ць, ахóўваць, засланя́ць

– v.i. служы́ць абарóнай, ахóвай, заслóнай

shift [ʃɪft] – v.t. 1. перасóўваць (*на і́ншае мéсца*); перадавáць (*другóму*); перакладáць (*у другýю рукý*); зьмяня́ць: ***He shifted the heavy bag from one hand to the other*** Ён перакла́ў цяжкі́ мех з аднаé рукí ў другýю. 2. сьпíхваць (*адкáзнасьць*). 3. замяня́ць (*дэкарáцыю на сцэ́не*). 4. пазбаўля́цца. 5. мяня́ць хýткасьць аўтамабíля

– v.i. зьмяня́цца: ***The wind has shifted to the southeast*** Вéцер зьмяніўся на паўдзённа-ўсхóдні. 2. махлявáць, рабíць змóву. 3. спраўля́цца, давáць сабé рáды

– n. 1. зьмéна *f.*: ***night shift*** начна́я зьмéна. 2. зрух -у *m.*, перамяшчэ́ньне *n.* 3. хíтрыка *f.*, вы́крут, спóсаб -у *m.*: ***to try every shift*** прабавáць усíх спóсабаў. 4. Geol. касóе зрушэ́ньне

• ***make shift*** а) давáць сабé рáды. б) перабівáцца, ледзь давáць сабé рáды. в) рабíць, як выхóдзіць

• ***shift the blame*** звалíць віну́ на другóга

shiftless ['ʃɪftləs] adj. вя́лы, ляні́вы; бездапамóжны, няспрáўны

shifty ['ʃɪfti] adj. 1. хíтры, выкрýтлівы. 2. хýткі, шпáркі, спры́тны, спрáўны

shilling ['ʃɪlɪŋ] n. шы́лінг, 1/20 фýнта (*колішняя брытáнская грашóвая адзíнка*)

shimmer ['ʃɪmər] – v.i. мільгáць, мігáць, мільгацéць, мігацéць, мігцéць; зіхацéць

– n. мігацéньне, мігцéньне *n.*

shimmery ['ʃɪməri] adj. мігатлíвы

shin [ʃɪn] – n. галёнка *f.*

– v.i. карáскацца: ***to shin up a tree*** ускарáскацца на дрэ́ва

shinbone ['ʃɪnboun] n. галёначная косьць

shine [ʃaɪn] – v., **shone** or **shined** 1. сьвяцíць; сьвяцíцца, блíшчэ́ць, зіхацéць. 2. вызначáцца: ***Mary shines in French*** Мары́я вызначáецца вéдамі францýскае мóвы. 3. ваксавáць: ***to shine shoes*** ваксавáць, глянцавáць чаравíкі

– n. 1. сóнечнае сьвятлó *n.* 2. бляск -у, гля́нец -цу *m.* 3. пагóда *f.*; сóнечнае надвóр'е: ***rain or shine*** дождж ці пагóда, у кóжным рáзе

• ***shine up to,*** Sl. паддóбрывацца да *кагó*

• ***take a shine to,*** Sl. спадабáць, упадабáць, мóцна палюбíць *кагó-што*

shingle I ['ʃɪŋgəl] – n. 1. гóнта, дрáнка *f.* 2. Informal малáя шы́льда

– v.t. крыць гóнтамі, дрáнкай (*дах*)

• ***hang out one's shingle,*** Informal адкры́ць кабінэ́т (*пра лéкара, адвакáта*)

shingle roof layer гантáр -á *m.*

shingle II ['ʃɪŋgəl] n. 1. гáлька *f.*, буйнáя жарствá. 2. пляж *абó* мéсца, пакры́тае гáлькай

shingles ['ʃɪŋgəlz] n., pl., Med. íшыяс -у *m.*

shining ['ʃaɪnɪŋ] adj. 1. сьвéтлы, я́сны, бліскýчы. 2. выдáтны, надзвычáйны (*пра здóльнасьці, дасягнéньні*)

shiny ['ʃaɪni] adj. 1. бліскýчы, сьвéтлы, я́сны: ***a shiny new nickel*** бліскýчы нóвы нíкель (*пяціцэ́нтавая манэ́та*). 2. вы́церты, вы́нашаны; зашмальцавáны (*пра вóпратку*)

ship [ʃɪp] – n. 1. карабле́ль -ля́ *m.*, вадаплáлў, параплáлў -ва *m.* 2. самалёт -а *m.*, касьмíчны карабéль. 3. экіпáж карабля́

– v.t., **(-pp-)** 1. грузíць (-ца) на карабéль, правóдзіць пасáдку. 2. сядáць на карабéль, вадаплáў, падарóжнічаць вадаплáвам. 3. пасылáць, перавóзіць тавáр, пасы́лку. 4. набірáць экіпáж. 5. паступáць, наймáцца на слýжбу на караблí: ***He shipped as***

cook Ён наня́ўся на карабе́ль ку́харам
• ***give up the ship*** здава́цца, пакіда́ць карабе́ль
• ***jump ship*** ско́чыць з карабля́, уцячы́
• ***one's ship comes in*** or ***home*** здабы́ць, атрыма́ць бага́цьце; быць у грашо́х
• ***run a tight ship*** быць до́брым кіраўні́ко́м, мо́цна кірава́ць
• ***ship out*** вы́ехаць, зье́хаць

shipboard [ˈʃɪpbɔ:rd] n. караб|е́ль -ля́ *m.* ***on shipboard*** на караблі́

shipload [ˈʃɪploud] n. груз, пакла́жа карабля́

shipmaster [ˈʃɪpmæstər] n. капіта́н карабля́

shipment [ˈʃɪpmənt] n. 1. пагру́зка тава́ру. 2. вы́сылка, перасы́лка тава́раў. 3. груз -у *m.*

shipping [ˈʃɪpɪŋ] n. 1. перасы́лка тава́раў, гру́заў. 2. a) coll. караблі́, гандлёвы флёт. б) агу́льны тана́ж. 3. флёт дзяржа́вы, кампа́ніі

shipwreck [ˈʃɪprek] – n. 1. караблекрушэ́ньне *n.* 2. разьбі́ты карабе́ль. 3. разбурэ́ньне, разьбіцьцё *n.* (*пля́наў*); руі́на *f.*
– v.t. Figur. бурыць, разбура́ць, руйнава́ць; ні́шчыць
– v.i. цярпе́ць караблякрушэ́ньне

shipwright [ˈʃɪpraɪt] n. караблебудаўнік -а́ *m.*

shipyard [ˈʃɪpjɑ:rd] n. вэрф *f.*

shirk [ʃɜ:rk] – v.i. выкру́чвацца, ухіля́цца (*ад пра́цы, абавя́зкаў*)
– n. хітру́н -а́ *m.*, хто ўхіля́ецца

shirt [ʃɜ:rt] n. 1. мужчы́нская кашу́ля, саро́чка *f.* 2. жано́чая блю́зка ў падо́бным сты́лі
• ***keep one's shirt,*** Sl. не хвалява́цца, быць спако́йным
• ***lose one's shirt,*** Sl. заста́цца без кашу́лі; усё стра́ціць, што меў

shirtsleeve [ˈʃɜ:rtsli:v] adj. без пінжака́, нефарма́льны

shiver I [ˈʃɪvər] – v.i. трэ́сьціся, калаці́цца, дрыжэ́ць: ***He is shivering*** Яго́ трасе́; ***to shiver with fever*** калаці́цца ў ліхама́нцы
– n. дрыжа́ньне, дры́жыкі *pl.* (*ад хо́ладу, стра́ху*)

shiver II [ˈʃɪvər] – v.t. драбі́ць (*на кава́лачкі, на дру́зачкі*)
– n. дро́бныя аско́лкі, кава́лачкі

shivery [ˈʃɪvəri] adj. 1. дрыго́ткі. 2. сьцюдзёны

shoal I [ʃoul] n. 1. мель, мяліна *f.* 2. плы́ткае ме́сца

shoal II [ʃoul] n. мно́ства *n.*, ма́са *f.*: ***a shoal of troubles*** ма́са кло́патаў

shock I [ʃɑ:k] – n. 1. уда́р -у *m.*, штуршло́к -ка́ *m.*, гвалто́ўнае страсе́ньне: ***earthquake shocks*** штуршкі́ землятру́су. 2. цяжкі́ (*мара́льны*) уда́р. 3. (*нэрво́вы*) шок, узрушэ́ньне *n.*
– v.t. 1. гвалто́ўна ўда́рыць. 2. ашаламля́ць; ура́жваць; абура́ць. 3. бі́ць электрашо́кам
– v.i. сутыка́цца, сту́кацца зь вялі́кай сі́лай
• ***shock therapy*** лячэ́ньне электрашо́кам

shock II [ʃɑ:k] n. ку́чма *f.*

shock III [ʃɑ:k] n. капа́ *f.*, мэ́ндлік -а *m.*

shock absorber амартыза́тар -а *m.*

shocking [ˈʃɑ:kɪŋ] adj. 1. жахлі́вы, ашаламля́льны. 2. скандальны; агі́дны, гане́бны, абура́льны. 3. Informal ве́льмі благі́

shod [ʃɑ:d] v., *p.t. and p.p. of* **shoe** a) абу́ты. б) падкава́ны (*пра каня́*)

shoe [ʃu:] – n., pl. **shoes** 1. чарані́к -а *m.* 2. падко́ва *f.* (*у каня́*). 3. накане́чнік -а *m.* 4. тармазна́я кало́дка. 5. гумо́вая шы́на
– v.t. **shod, shoeing** 1. абува́ць. 2. падко́ўваць (*каня́*)
• ***be in another's shoes*** быць на ме́сцы другі́га, быць у чужо́й ску́ры
• ***fill another's shoes*** заня́ць ме́сца другі́га

shoeblack [ˈʃu:blæk] n. чысьці́льнік бо́таў

shoehorn [ˈʃu:hɔ:rn] n. ражло́к -ка́ *m.* (*для надзява́ньня абу́тку*)

shoelace [ˈʃu:leɪs] n. шнурло́к, матузло́к -ка́ *m.* (*для чаравíкаў*)
shoemaker [ˈʃu:meɪkər] n. шалве́ц -ўца́ *m.*
shoemaking [ˈʃu:meɪkɪŋ] n. шаве́цтва *n.*
shoe polish ва́кса *f.* (*для чаравíкаў*)
shoeshine [ˈʃu:ʃaɪn] n. 1. чышчэ́ньне, ваксава́ньне абу́тку. 2. чысьцíльнік абу́тку
shone [ʃoʊn] v.i., *p.t and p.p. of* **shine**
shoo [ʃu:] interj. кыш, акы́ш (*праганя́ючы*), прэч! вон!
shook [ʃʊk] v., *p.t. and p.p. of* **shake**
shoot [ʃu:t] – v., **shot, shooting** 1. страля́ць: ***to shoot a rabbit*** застрэ́ліць за́йца; ***to shoot a plane*** зьбіць самалёт. 2. кíдаць: ***He shot question after question at us*** Ён кíдаў нам пыта́ньне за пыта́ньнем. 3. праімча́цца, пране́сьціся: ***A car shot by us*** Машы́на праімча́лася паўз нас. 4. распуска́ца, пуска́ць па́расткі (*пра расьлíны*). 5. фатаграфава́ць
– n. 1. практыкава́ньне *або́* спабо́рніцтва ў стральбе́. 2. па́растlак -ка *m.* 3. нахíлены сьцёк, жо́лаб -а *m.*
• ***shoot down*** а) забíць стрэ́лам. б) зьбіць (*самалёт*)
• ***shoot up*** а) ху́тка расьці. б) вы́сіцца, уздыма́цца ўго́ру. в) Sl. укало́цца (*прыня́ць нарко́тык*)
shooting star зьні́чка *f.*, мэтэо́р -а *m.*
shop [ʃɑ:p] – v.i. **(-pp-)** 1. купля́ць, закупля́цца. 2. прыцэ́ньвацца, хадзíць па кра́мах: ***We shopped all morning for a coat*** Усю́ ра́ніцу мы хадзíлі, каб купіць палíто́
– n. 1. кра́ма *f.* 2. майстэ́рня *f.*: ***a carpenter's shop*** сталя́рня *f.*; ***a barber shop*** цыру́льня *f.*
• ***set up shop*** пача́ць працава́ць *або́* гандлява́ць
• ***shut up shop*** ско́нчыць пра́цу; зачыні́ць кра́му, спыні́ць гандаль
shopkeeper [ˈʃɑ:pˌki:pər] n. кра́мнік -а *m.*, кра́мніца *f.*; ула́сьнік майстэ́рні
shoplifter [ˈʃɑ:pˌlɪftər] n. кра́мны зло́дзей
shopper [ˈʃɑ:pər] n. пакупні́к -а *m.*, пакупні́ца *f.*
shopping [ˈʃɑ:pɪŋ] n. купля́ньне *n.*, за́купы *pl.*
• ***go shopping*** ісьці́ на за́купы
shopping centre or **shopping plaza** гандлёвы кварта́л, цэ́нтар *або́* пляц
shoptalk гу́тарка на прафэсíйныя тэ́мы, прафэсíйны жарго́н
shore [ʃɔ:r] n. 1. бе́раг мо́ра, во́зера. 2. су́ша, зямля́ *f.*
• ***off shore*** ля берага́ў, у мо́ры, на мо́ры
shoreward [ˈʃɔ:rwərd] adv., adj. да бе́рагу
short [ʃɔ:rt] – adj. 1. каро́ткі: ***a short distance*** каро́ткая адле́гласьць; ***a short time*** каро́ткі час. 2. а) нізкарасло́ы. б) ні́зкі: ***short grass*** ні́зкая трава́. 3. няпо́ўны: ***short weight*** няпо́ўная вага́; ***We are short of hands*** У нас не стае́ рабо́тнікаў. 4. рэ́зкі, нецярплі́вы: ***He was very short with me*** Ён быў рэ́зкі са мно́ю
– adv. 1. ко́ратка, каро́тка. 2. ра́птам, нечака́на: ***The horse stopped short*** Конь ра́птам стаў
• ***cut short*** ра́птам зако́нчыць, абарва́ць
• ***fall short*** а) не дасягну́ць. б) не става́ць, не хапа́ць
• ***for short*** карацéй ка́жучы, у скаро́це
• ***in short*** карацéй ка́жучы
• ***run short*** вычэ́рпвацца, спусташа́ца, канча́цца
• ***sell short*** недаацэ́ньваць
• ***short for*** у скаро́це: ***Photo is short for photograph*** Фо́та — фатагра́фія ў скаро́це
• ***short on*** у нястáчы, недахо́пе чаго́-н.
• ***shorts*** каро́ткія по́ртачкі, шо́рты *pl.*
shortage [ˈʃɔ:rtɪdʒ] n. недахо́п -у *m.*; нястáча *f.*
shortbread [ˈʃɔ:rtbred] n. пясо́чны ко́ржык
shortcake [ˈʃɔ:rtkeɪk] n. пiро́г з кра́мам і садавіно́ю
short circuit каро́ткае замыка́ньне
short-circuit [ˌʃɔ:rtˈsɜ:rkət] v.t. 1. выкліка́ць каро́ткае замыка́ньне. 2. Informal пазьбяга́ць, абыхо́дзіць, абміна́ць

shortcoming [ˈʃɔ:rtˌkʌmɪŋ] n. зага́на *f.*, недахо́п, дэфэ́кт -у *m.*

shortcut карацэ́йшая, хутчэ́йшая даро́га

short-cut [ˈʃɔ:rtkʌt] – v.i. **-cut, -cutting** ісьці́ нацянькі́, напрасткі́, наўпро́ст, напражкі́
– v.t. абміна́ць, пайшо́ўшы нацянькі́: ***to short-cut a city*** абмінуць го́рад

shorten [ˈʃɔ:rtən] – v.t. 1. скарача́ць; адрэ́заць. 2. дадава́ць да це́ста тлу́шчу. 3. апуска́ць (*скру́чваць*) ве́тразі
– v.i. скарача́цца

shortening [ˈʃɔ:rtnɪŋ] n. 1. тлушч -у *m.* 2. скарачэ́ньне *n.*

shorthand [ˈʃɔ:rthænd] – n. стэнагра́фія *f.*
– adj. 1. стэнаграфава́ны. 2. які́ стэнагра́фуе: ***shorthand secretary*** стэнагра́фістка *f.*

short-handed [ˌʃɔ:rtˈhændɪd] adj. зь недахо́пам працаўнікоў

short-lived [ˌʃɔ:rtˈlaɪvd] adj. недаўгаве́чны; які́ трыва́е ко́ратка, нядо́ўга

shortly [ˈʃɔ:rtli] adj. неўзаба́ве, за́раз; незадо́ўга да: ***shortly before my arrival*** незадо́ўга да майго́ прые́зду

short-sighted [ˌʃɔ:rtˈsaɪtɪd] adj. 1. бліза́ру́кі. 2. Figur. непрадба́члівы, недальнаба́чны: ***a short-sighted strategy*** недальнаба́чная стратэ́гія

short-tempered [ˌʃɔ:rtˈtempərd] adj. нястры́маны, запа́льчывы, гара́чы, ху́ткі да зло́сьці

short-term [ˌʃɔ:rtˈtɜ:rm] adj. каро́ткатэрмі́но́вы, на каро́ткі час: ***short-term plans*** пля́ны на каро́ткі час; ***short-term investment*** каро́ткатэрмі́но́вы ўкла́д гро́шай

short wave каро́ткая хва́ля (*ра́дыё*)

short-wave [ˈʃɔ:rtweɪv] v.t. перадава́ць на каро́ткіх хва́лях

short-winded [ˌʃɔ:rtˈwɪndɪd] adj. які́ му́чыцца задышкай; ды́хавічны

shot I [ʃɑ:t] – n., pl. **shots** 1. стрэл -у *m.*; страля́ньне *n.*, стральба́ *f.* 2. шраці́на *f.*, шрот -у *m.*, *coll.*; ку́ля *f.*, снара́д -а *m.* 3. стралло́к -ка́ *m.*: ***He is a good shot*** Ён до́бры стралок. 4. здым|ак -ку *m.*; кадр -у *m.* (*сцэ́на з кінафі́льму*). 5. Sl. ча́рка ві́скі. 6. уко́л -у *m.*, ін'е́кцыя *f.*
– v.t. 1. зараджа́ць (*стрэ́льбу, гарма́ту*). 2. спрабава́ць, рабі́ць спро́бу

- ***big shot,*** Informal ва́жная шы́шка
- ***call the shots,*** Informal быць завада́тарам, верхаво́дзіць, ве́сьці рэй
- ***like a shot*** за́раз жа, умі́г, умо́мант
- ***not by a long shot*** ані бліза́ка, зусі́м не
- ***shot in the arm*** а) уко́л у руку́. б) сты́мул

shot II [ʃɑ:t] – v. 1. *p.t. and p.p. of* **shoot**
– adj. заткáны: ***blue silk shot with gold*** сі́ні шоўк заткáны залато́й ні́ткай

- ***shot through with*** по́ўны *чаго́*

should [ʃʊd] v., *p.t. of* **shall**. ***Should*** *ужыва́ецца для выка́заньня* а) *абавя́зку*: ***You should try to make fewer mistakes*** Ты паві́нен стара́цца рабі́ць менш памы́лак; ***I should go*** Мне тра́ба йсьці́. б) *умо́ўнасьці*: ***If he should win the prize, how happy he would be*** Калі б ён вы́йграў узнагаро́ду, які́ б шчасьлі́вы ён быў; ***I should have gone if you had asked me*** Я пайшо́ў бы, калі́ б ты папрасі́ў мяне́. в) *умо́вы або́ прычы́ны*: ***He was pardoned on the condition that he should leave the country*** Яго́ памі́лавалі з умо́вай, што ён пакіне край. г) *у пыта́ньнях з* **why** *пака́звае на беспадста́ўнасьць, невераго́днасьць меркава́ньня*: ***Why should you think that I did not like the book?*** Чаму́ ты ду́маеш, што мне не спадаба́лася гэ́тая кні́га?

shoulder [ˈʃoʊldər] – n. 1. плячо́ *n.*, плячу́к плечука́ *m.* 2. лапа́тка *f.* (*у мяснóй ту́шы*). 3. узбо́чына *f.* (*даро́гі, аўтастра́ды*)
– v.i. 1. узва́льваць на пле́чы, абапра́ць на плячо́. 2. браць на сябе́ (*адказна́сьць, віну́*). 3. прапі́хвацца, прабіштурхо́ўвацца, праціска́цца: ***He shouldered his way through the crowd*** Ён праці́снуўся праз нато́ўп

• ***Shoulder arms!*** На плячо́! (*кама́нда*)
• ***shoulders*** пле́чы *pl.* (*ча́стка це́ла й во́праткі*): ***wide in shoulders*** шы́ракапле́чы
• ***shoulder to shoulder*** плячо́ ў плячо́, а) бл і́зка, по́бач з *кім*, б) у це́сным адзі́нстве, ра́зам
• ***straight from the shoulder*** про́ста з пляча́
• ***turn or give a cold shoulder*** хо́лодна сустрэ́ць *або́* прыня́ць *каго́*

shoulder blade лапа́тка *f.* (*косьць*)

shoulder pad плячу́к плечука́ *m.* (*у жаке́це, суке́нцы*)

shoulder strap 1. шле́йка *f.* (*ста́ніка*). 2. пагон -а *m.*

shouldn't [ˈʃʊdənt] = **should not**

shout [ʃaʊt] – v.i. 1. крыча́ць; гука́ць, галёкаць. 2. гу́чна гаварыць
– n. 1. крык -у *m.*, гамана́ *f.*
• ***shout down*** перакрыча́ць, заглушы́ць крыкам, прымусіць змо́ўкнуць

shouter [ˈʃaʊtər] n. крыку́н -а́ *m.*, гарлапа́н, гарладзёр -а *m.*

shouting [ˈʃaʊtɪŋ] n. го́ман -у *m.*, гамана́ *f.*

shove [ʃʌv] – v.t. 1. пасо́ўваць, папі́хваць (*на ме́сца*); пхаць, піха́ць. 2. шту́рхаць
– n. штурш|о́к -ка́, напо́р -у *m.* (*зза́ду*)
• ***shove off*** а) адапхну́цца, адплы́ць, адвесла́ваць ад бе́рагу. б) Informal адысьці́ся, ад'е́хаць, ру́шыць у даро́гу

shovel [ˈʃʌvəl] – n. 1. лапа́та *f.* ; шу́ф|аль -ля *m.*: ***a coal shovel*** шу́фаль для ву́галю
– v.t. набіра́ць, насыпа́ць шу́флем. 2. адкіда́ць лапа́тай: ***to shovel snow from the road*** адкіда́ць з даро́гі сьнег. 3. пра́гна е́сьці (*пра гало́днага*)

shovelful [ˈʃʌvəlfʊl] n., pl. **-fuls** по́ўны шу́фаль

show [ʃoʊ] – v.t. 1. пака́зваць. 2. растлума́чваць, пака́зваць. 3. дава́дзіць: ***He showed that it was true*** Ён давёў, што гэ́та была́ пра́ўда. 4. ака́зваць, выяўля́ць: ***to show mercy*** аказа́ць ла́ску
– n. 1. а) пака́з -у *m.*, выста́ва, вы́стаўка *f.*: ***a horse show*** пака́з ко́ней. б) спэкта́кль -ю *m.*, прадстаўле́ньне *n.* 2. вы́гляд -у *m.* 3. Informal кінафі́льм -у *m.* 4. пасьме́шышча *n.*: ***Don't make a show of yourself*** Не рабі́ зь сябе пасьме́шышча́! 5. Sport трэ́цяе ме́сца ў спабо́рніцтве
• ***for show*** напака́з, каб прыцягну́ць ува́гу
• ***run the show*** не́сьці абавя́зкі, кама́ндаваць пара́дам
• ***show in*** правадзіць, уво́дзіць (*у дом, пако́й*)
• ***show off*** пуска́ць пыл у во́чы; задава́цца
• ***show out*** вы́весьці, праве́сьці да дзьвярэ́й (*го́сьця*)
• ***show up*** а) вы́крыць, вы́явіць (*ашука́нца*). б) вы́ставіць на пасьме́шышча. в) вылуча́цца *чым*, быць выда́тным у *чым*. г) прыйсьці́, прыбы́ць, зьяві́цца
• ***steal the show*** выклі ка́ць найбо́льш во́плескаў, пахвалы́

show bill тэатра́льная афі́ша

showcase вітры́на *f.*

shower [ʃaʊr] – n. 1. каро́ткі дождж. 2. душ -у *m.* 3. вечары́нка з падару́нкамі ў жанчы́ны, яка́я выхо́дзіць за́муж або́ нараджа́е дзіця́
– v.i. 1. паліва́ць, пы́рскаць вадо́ю. 2. браць душ, мы́цца пад ду́шам. 3. абдаро́ўваць: ***They showered gifts upon her*** Яны́ засы́палі яе́ падару́нкамі

showery [ˈʃaʊri] adj. дажджлі́вы

show-off [ˈʃoʊɔːf] n. 1. задава́ньне, выстаўля́ньне *n.* 2. Informal хвалькло́ -а́ *m.*

showiness [ˈʃoʊɪnəs] n. пы́шнасьць *f.*, раско́ша напака́з, шыко́ўнасьць *f.*

showroom [ˈʃoʊrʊm] n. за́ля для пака́зу

show window вітры́на

showy [ˈʃoʊi] adj. 1. пы́шны; раско́шны; які́ кі́даецца ў во́чы; шыко́ўны (*пра во́праткy*). 2. зана́дта я́ркі, страка́-

ты, крыкліві. 3. паказны, разьлічаны на эфэкт; няшчыры

shrank [ʃræŋk] *v.i., p.t. of* **shrink**

shred [ʃred] – n. 1. шматок -ка́ *m.*, абрэзак -ка *m.*, абрывак (*скуры, тканіны*): ***The wind tore the sail to shreds*** Вецер парваў ветразь на шматкі. 2. кавалак -ка *m.*: ***not a shred of evidence*** ні найменшага доказу
– v.t. 1. рэзаць *або* рваць на малыя кавалачкі. 2. шаткаваць: ***shredded cabbage*** шаткаванка *f.*

shrew [ʃru:] n. 1. сварлівая жанчына, зьлюка *f.* 2. Zool. землярыйка *f.* (*мыш*)

shrewd [ʃru:d] adj. 1. а) разумны, з вострым праніклівым розумам; спрытны: ***a shrewd businessman*** спрытны прадпрымальнік. б) ***a shrewd argument*** трапны довад. 2. дасьціпны, востры

shrewish ['ʃru:ɪʃ] adj. сварлівы, дакучлівы

shriek [ʃri:k] – n. моцны, прарэзьлівы крык, віск, сьвіст -у *m.*,: ***the shriek of an engineer's whistle*** прарэзьлівы гук паравозная сьвістка. 2. гучны рогат
– v.i. прарэзьліва крычаць, вішчаць

shrill [ʃrɪl] adj. рэзкі, пранізьлівы, прарэзьлівы; вісклівы: ***the shrill merriment of children*** вісклівая забава дзяцей

shrimp [ʃrɪmp] n., pl. **shrimps** or coll. **shrimp** 1. крэвэтка *f.* 2. Sl. малы, малаважны чалавек

shrine [ʃraɪn] n. 1. грабніца з мошчамі сьвятога. 2. месца пакланеньня, прошча, сьвятыня *f.* (*рэлігійная або нацыянальная*)

shrink [ʃrɪŋk] – v.i. **shrank** or **shrunk, shrunk** or **shrunken** 1. сьсядацца, садзіцца, зьбягацца (*пра тканіну, адзеньне*). 2. адскокваць, адхінацца (*ад удару*): ***The dog shrank from the whip*** Сабака ўхіліўся ад пугі. б) ухіляцца, унікаць, пазьбягаць: ***A shy person shrinks from making new acquaintances*** Сарамлівы чалавек неахвотна знаёміцца з новымі людзьмі
– v.t.: ***Hot water shrinks wool*** У гарачай вадзе воўна сьсядаецца

shrinking ['ʃrɪŋkɪŋ] n. сьсяданьне, зьбяганьне *n.*

shrinkable ['ʃrɪŋkəbəl] adj. які сьсядаецца

shrinkage ['ʃrɪŋkɪdʒ] n. 1. сьсяданьне, зьбяганьне *n.* (*тканіны*). 2. усадка *f.*: ***a shrinkage of two centimetres*** усадка на два сантымэтры

shrivel ['ʃrɪvəl] – v.t. 1.высушваць, зморшчваць; карабаціць. 2. рабіць бездапаможным *або* непрыдатным
– v.i. 1. ссыхацца; моршчыцца; карабаціцца (*напр. чаравікі*). 2. псавацца, рабіцца непрыдатным

shroud [ʃraʊd] – n. 1. саван -а *m.* 2. покрыва *n.* (*ночы, імглы*)
– v.t. 1. захінаць цела для пахаваньня. 2. пакрываць, ахінаць: ***The earth is shrouded in darkness*** Зямлю ахінула цемра
• ***shrouds*** ванты *pl.* (*для ўмацаваньня ветразяў*)

shrub [ʃrʌb] n. куст -а́ *m.*

shrubbery ['ʃrʌbəri] n., pl. **-beries** 1. кусты, *coll.* 2. хмыз -у, хмызьняк -ý *m.*; зарасьнік -у *m.*

shrubby ['ʃrʌbi] adj. хмызьнякóвы, парóслы хмызьняком

shrug [ʃrʌg] – v.t. **(-gg-)** паціскаць, пацепваць (*плячыма*)
– n. пацепваньне плячыма
• ***shrug off*** адмахнуцца

shrunk [ʃrʌŋk] v., *p.t. and p.p. of* **shrink**

shuck [ʃʌk] – n. 1. шалупіна *f.*; струк -á *m.* 2. Informal лухта, дрэнь *f.*
– v.t. аблупліваць

shucks [ʃʌks] interj. А ліха на яго!

shudder ['ʃʌdər] – v.i. уздрыгваць, дрыжаць, калаціцца
– n. дрыжыкі *pl.*, дрыготка *f.*

shuffle ['ʃʌfəl] – v.i. 1. шоргаць нагамі. 2. ледзь цягаць (*ногі*). 3. тасаваць (*карты*) 4. соўгаць, перакладаць, перастаўляць: ***to shuffle a stack of papers*** перакладаць стос паперы зь месца на месца. 5. віляць, хітрыць

– n. 1. шо́рганьне (*нага́мі*); цяга́ньне (*ног*). 2. та́нец з шо́рганьнем ног. 3. тасава́ньне (*ка́ртаў*). 4. віля́ньне; падтасо́ўка (*фа́ктаў*)
• ***shuffle off*** а) пазбы́цца не́чага. б) ски́нуць. в) адыйсьці

shun [ʃʌn] v.i. уніка́ць, пазьбяга́ць *чаго́*

shunt [ʃʌnt] – v.t. 1. перавóдзіць (*цягні́к*) на запасны́ шлях; перамяшча́ць, манэ́ўрава́ць на чыгу́нцы. 2. Figur. збо́чваць, сыхо́дзіць з даро́гі. 3. Electr. адгаліно́ўваць (*то́к*).
– n. 1. чыгу́начная стрэ́лка *f.* 2. Electr. адгалінава́ньне то́ку, шунт -у *m.*

shut [ʃʌt] **shut, shutting,** v.t. 1. зачыня́ць: ***to shut the door*** зачыні́ць дзьве́ры; ***to shut the eyes*** заплю́шчыць во́чы. 2. замыка́ць: ***to shut in prison*** пасадзі́ць у турму́
– adj. замкнёны, замкну́ты; зачы́нены
• ***shut down*** а) зачыні́ць (*фа́брыку*), спыні́ць часо́ва (*пра́цу*). б) зачыня́ць, ліквідава́ць
• ***shut in*** а) замкну́ць (*у пако́і*). б) абгарадзі́ць
• ***shut off*** а) вы́лучыць (*эле́ктрыку, га́з*). б) зачыні́ць (*ваду́, даро́гу*)
• ***shut out*** не ўпушча́ць
• ***shut up*** а) зачыня́ць, замыка́ць (*дзьве́ры й во́кны*). б) Informal заста́віць змо́ўкнуць. в) замкну́ць (*арышта́нага*)

shutter [ˈʃʌtər] – n. 1. акані́ца *f.*, жалюзі́, *indecl.* 2. за́саўка *f.* (*на дзьвяра́х*); за́сланка *f.* (*у пе́чы*). 3. затво́р -а *m.* (*фотааб'ектыва*)
– v.t. зачыня́ць, замыка́ць

shuttle [ˈʃʌtəl] n. 1. чаўнóк -ака́ *m.* (*у кро́снах*). 2. цягні́к, аўто́бус, самалёт, які́ ча́ста курсу́е: ***shuttle bus*** прыга́радны аўтабу́с, маршру́тнае таксі́

shuttle train прыга́радны цягні́к

shy [ʃaɪ] – adj. 1. нясьме́лы, сарамя́жлівы, сарамлі́вы. 2. баязьлі́вы, палахлі́вы, пужлі́вы: ***A deer is a shy animal*** Казу́ля — пужлі́вая жывёліна. 3. асьцяро́жны, недаве́рлівы. 4. сьці́плы, яко́га ледзь хапа́е: ***We are shy on butter*** У нас не стае́ ма́сла
– v.i. 1. пужа́цца, адско́кваць. 2. уніка́ць

shyness [ˈʃaɪnəs] n. 1. сарамя́жлівасьць, сарамлі́васьць *f.*; няўпэ́ўненасьць *f.* 2. палахлі́васьць, пужлі́васьць *f.*

shyly [ˈʃaɪli] adv. 1. нясьме́ла, сарамлі́ва. 2. пужлі́ва, палахлі́ва. 3. недаве́рліва; чу́йна

Siamese [ˌsaɪəˈmi:z] – adj. сыя́мскі: ***Siamese twins*** сыя́мскія блізьня́ты
– n. 1. сыя́мец -ца *m.* 2. сыя́мская мо́ва

Siberian [saɪˈbɪriən] – adj. сібі́рскі.
– n. сібіра́к -а́ *m.*, сібіра́чка *f.*

sibilant [ˈsɪbɪlənt] – adj. шыпя́чы.
– n. шыпя́чы зы́чны: **S *and* sh *are sibilants*** С ды Ш — шыпя́чыя зы́чныя

sibyl [ˈsɪbɪl] n. Сыбі́ла, праро́чыца, варажбі́тка *f.*; чараўні́ца *f.*

Sicilian [sɪˈsɪliən] – adj. сыцылі́йскі
– n. сыцылі́ец -йца *m.*, сыцылі́йка *f.*
2. сыцылійскі дыяле́кт

sick [ʃɪk] – adj. 1. нездаро́вы, з слабы́м здаро́ўем; хво́ры. 2. Informal яко́му мо́таша, мло́сна: ***I feel sick*** мне мо́таша, мло́сна, нядо́бра. 3. хвараві́ты: ***a sick look*** хво́ры вы́гляд. 4. яко́му абры́дла, надаку́чыла: ***He is sick of school*** Яму́ абры́дла шко́ла. 5. паку́таваць, тужы́ць, ну́дзіцца: ***to be sick at heart*** мо́цна му́чыцца, паку́таваць, тужы́ць, ну́дзіцца. 6. змарне́лы, хвараві́ты. 7. няспра́ўны, пашко́джаны (*карабе́ль*). 8. Figur. нясма́чны; зло́сны, зье́длівы (*пра жарт, гу́мар*)
– n. хво́рыя *pl.*

sick bay шпіта́ль на караблі́

sicken [ˈsɪkən] v.i. 1. захво́рваць. 2. адчува́ць *або́* выклі́ка́ць млосьць

sickening [ˈsɪkənɪŋ] adj. 1. мло́сны, мо́таш ны. 2. агі́дны, пры́кры

sickle [ˈsɪkəl] – n. серп сярпа́ *m.*
– v.t. жаць сярпо́м

sickliness [ˈsɪklinəs] n. хвараві́тасьць, хі́ласьць *f.*

sickly [ˈsɪkli] adj. 1. хвараві́ты, хі́лы. 2. шко́дны, нездаро́вы: ***a sick climate*** нездаро́вы кліма́т. 3. кво́лы, слабы́. 4. Figur. хвараблі́вы, мло́сны: ***sickly sentimentality*** сьлязьлі́вая сэнтымэнта́льнасьць

sickness [ˈsɪknəs] n. 1. недамага́ньне *n.*, хваро́ба *f.* 2. мо́ташнасьць, мло́снасьць *f.*; ваніта́ва́ньне *n.*, вані́ты *pl. only*

side [saɪd] – n. 1. бок бо́ка *i* бо́ку; *pl.* баки́, *радзе́й* бо́кі: а) ***at the side (of the house)*** збо́ку (до́ма); б) ***from all sides*** з усі́х бако́ў; в) ***from side to side*** з бо́ку на бок 2. бок -у *m.*, паве́рхня *f.*: ***the sides of a square*** баки́ квадра́та; ***Write only on one side of the paper*** Пішы́ то́лькі на адны́м баку́ папе́ры; ***the right (wrong) side of the cloth*** пра́вы (ле́вы) бок тканіны. 3. ча́стка *f.*: ***the east side of a city*** усхо́дняя ча́стка го́раду. 4. бок -а *m.* (*ча́стка це́ла чалаве́ка або́ жывёліны*): ***a pain in one's side*** боль у баку́. 5. схон, бок -у *m.*: ***side of a hill*** схо́н узго́рка. 6. бе́раг ракі́. 7. сьце́нка *f.*, борт -а *m.* 8. бок -у *m.* (*у спо́рце, спрэ́чцы*): а) ***Both sides are ready for the contest*** Або́два бакі гато́выя да спабо́рніцтва. б) ***to come over to someone's side*** перайсьці́ на не́чый бок. 9. лі́нія, радня́ *f.*: ***uncle on my mother's side*** дзя́дзька з бо́ку ма́ці

– adj. 1. бакавы́. 2. другара́дны: ***a side issue*** другара́днае пыта́ньне

• ***by one's side*** пры бо́ку, бліза́ка *каго́*

• ***on the side,*** Informal а) у дада́тку да звыча́йных абавя́зкаў. б) дада́так да стра́вы

• ***side by side*** а) по́бач, по́руч, по́плеч. б) ро́ўны з *чым*

• ***side with*** стая́ць на *чы́м* баку́, далучы́цца да *каго́*

• ***split one's sides*** рваць баки́ (*ад сьме́ху*)

• ***take sides*** заня́ць пазы́цыю

side arms збро́я, но́шаная на баку́ (*меч, ша́бля, рэвальвэ́р*)

sideboard [ˈsaɪdbɔ:rd] n. буфэ́т, сэ́рвант -а *m.*

sideburns [ˈsaɪdbɜ:rnz] n., pl. ба́кі *pl.*, баке́нба́рды *pl.*

sidecar [ˈsaɪdkɑ:r] n. бакавы́ прычэ́п (*у матацы́кле*)

side dish дада́так да гало́ўнае стра́вы

side effect пабо́чны, уско́сны вы́нік, непажада́ная рэа́кцыя на лек

side issue пабо́чнае пыта́ньне

side light 1. бакаво́е сьвятло́. 2. нечака́ная інфарма́цыя. 3. распазнава́льныя агні́ на су́днах

sidesaddle [ˈsaɪdˌsædəl] n. да́мскае сядло́

sidetrack [ˈsaɪdtræk] – n. запасны́ шлях

– v.t. 1. перавóдзіць (*цягні́к*) на запасны́ шлях. 2. адця́гваць ад тэ́мы, адця́гваць ува́гу

sidewalk [ˈsaɪdwɔ:k] n. хо́днік, тратуа́р -а *m.*

sideways [ˈsaɪdweɪz] adv., adj. убок, бо́кам; ухі́лісты

siding [ˈsaɪdɪŋ] n. шалёўка *f.*

siege [ˈsi:dʒ] n. абло́га, аса́да *f.*

• ***lay siege (to)*** а) аблажы́ць во́йскам, асадзі́ць (*го́рад, крэ́пасьць*). б) упа́рта намага́цца дасягну́ць *чаго́*

• ***lift a siege*** зьняць абло́гу

sieve [sɪv] – n. рэ́шата, сі́та *n.*

– v.t. прасява́ць, прасе́йваць

sift [sɪft] v.i. 1. прасява́ць, адсе́йваць. 2. пасыпа́ць празь сі́та: ***to sift sugar on top of the cake*** пасы́паць цу́крам пра́г. 3. сы́пацца; церушы́цца: ***The snow sifted softly down*** Сьнег мя́кка церушы́ўся на зямлю́. 4. Figur. дакла́дна разгляда́ць фа́кты, до́вады

sigh [saɪ] – v.i. 1. уздыха́ць. 2. уздыха́ць, сумава́ць, тужы́ць: ***She sighed for home and friends*** Яна́ тужы́ла га до́ме і па сяброх

– v.t. выка́заць уздыхам

– n. уздых -у *m.*, уздыха́ньне *n.*

sight [saɪt] – n. 1. зрок -у *m.* 2. по́зірк -у *m.*: ***love at first sight*** каха́ньне зь пе́ршага по́зірку. 3. по́ле зро́ку: ***Land was in sight*** Віднело́ся су́ша; ***to***

lose sight of згубі́ць *каго́-што* з ва-чэ́й. 4. від -у *m.*, відо́вішча *n.*, прыкме́тнасьць *f.*, выда́тная мясьці́на: ***to see the sights of the city*** агляда́ць прыкме́тнасьці го́раду. 5. відо́вішча *n.*: ***Her clothes were a sight*** Ейная во́пратка была́ цэ́лае відо́вішча. 6. прыцэ́л -у *m.* 7. пункт гле́джаньня, гле́дзішча *n.* 8. назіра́ньне праз тэле-ско́п

– v.t. 1. ба́чыць. 2. назіра́ць. 3. наво́дзіць (*гарма́ту, інструмэ́нт*)

• ***a sight for sore eyes*** прые́мны від

• ***at first sight*** зь пе́ршага по́зірку

• ***at sight*** а) ***to read music at sight*** граць зь лісьта́. б) адра́зу на запатрабава́ньне: ***Some banks will cash a check at sight*** Некато́рыя ба́нкі вы-ме́ньваюць чэ́кі адра́зу на запатрабава́ньне

• ***be in sight of*** а) мець у по́лі зро́ку. б) быць у по́лі зро́ку

• ***catch sight of*** згле́дзець, угле́дзець *каго́-што*

• ***know by sight*** ве́даць *каго́* то́лькі з твару

• ***lose sight of*** забы́цца, занядба́ць

• ***on sight*** як то́лькі паба́чыць, на ме́сцы

• ***out of sight of*** дзе не відаць, дзе не-магчы́ма быць уба́чаным

• ***sight unseen*** не паба́чыўшы, не раз-гле́дзеўшы

sightseeing ['saɪtˌsi:ɪŋ] n. агляда́ньне прыкме́тных мясьці́наў: ***to go sight-seeing*** наве́дваць ціка́выя мясьці́ны

sightseer ['saɪtˌsi:ər] n. наве́днік -а *m.*, наве́дніца *f.*, агляда́льнік -а *m.*

sign [saɪn] – n. 1. знак -у *m.*: ***The four signs of the arithmetic operations*** Чаты́ры зна́кі арытмэты́чных дзе́-ньняў. 2. знак -у *m.*, азначэ́ньне *n.*: ***A nod is a sign of agreement*** Ківо́к га-лаво́й ёсьць зна́кам зго́ды; ***We talked to the deaf man by signs*** З глухі́м чалаве́кам мы гаварылі пры дапамо́зе зна́каў. 3. на́дпіс -у *m.*, шы́льда *f.*, знак -у *m.*: ***The sign reads "Keep off the grass"*** На́дпіс ка́жа: «Не хадзі́ць па траве́». 4. прыкме́та *f.*: ***There are no signs of life about the house*** Каля́ до́ма нема́ ніякіх зна́каў жыцьця́. 5. сьлед -у *m.*, *pl.* сьляды́: ***signs of deer*** сьляды́ казу́лі. 6. Astron. знак задыяку

– v.t. 1. падпі́сваць (*ліст, чэк*). 2. пі-са́ць: ***Sign your initials here*** Напішэ-це тут сваé ініцыя́лы. 3. запі́сваць, найма́ць: ***to sign a new player*** наня́ць но́вага гульца́, падпіса́ўшы ўмо́ву. 4. пака́зваць, азнача́ць, быць прыкме́-тай. 5. дава́ць знак: ***to sign assent*** дава́ць знак на зго́ду. 6. жагна́ць, хрысьці́ць кры́жам. 7. зна́чыць, ме́-ціць, ста́віць ме́тку

– v.i. падпі́свацца: ***They signed for three years*** Яны́ падпіса́лі на тры гады́ (*кантра́кт, дамо́ўленасьць*)

• ***sign away*** перадава́ць (*маёмасьць, правы́*)

• ***sign in*** падпіса́цца аб сваёй прысу́т-насьці; зарэгістрава́цца

• ***sign off*** канча́ць (*радыёперада́чу , працаўладкава́насьць*)

• ***sign on*** а) прыня́ць пра́цу; пасту-пі́ць на вайско́вую слу́жбу, падпі-са́ўшы ўмо́ву. б) пачына́ць радыёпе-рада́чу

signal ['sɪgnəl] – n. 1. сыгна́л, знак -у *m.*; паро́ль -ю *m.*: ***A red light is a signal of danger*** Чырво́нае сьвятло́ — сыгна́л небясьпе́кі

– v. 1. сыгна́ліць, дава́ць знак: ***He signaled the car to stop*** Ён даў знак машы́не спыні́цца. 2. азнача́ць, зна́-чыць; абвяшча́ць, паведамля́ць: ***A bell signals the end of the class period*** Званóк паведамля́е канец ле́кцыі

– adj. сыгналізацы́йны

signal box сыгна́льная бу́дка *або́* скры́нка

signal fire сыгна́льны аго́нь

signal flag сыгна́льны сьцяжо́к

signalize ['sɪgnəlaɪz] v.i. 1. сыгналіза-ва́ць; сыгна́ліць, паведамля́ць, нала́-джваць су́вязь пры дапамо́зе сыгна́-

лаў. 2. адзна́чыцца, праслáвіцца: ***The present century has been signalized by many great inventions*** Цяпе́рашняе стагóдзьдзе адзна́чанае шматлі́кімі вялі́кімі вынахóдзтвамі

signalman ['sɪgnəlmən] n. 1. сыгна́льнік -а *m.*, сыгна́льніца *f.* 2. жаўне́р адзе́лу су́вязі (*у во́йску*), сувязі́ст -а *m.* 3. стрэ́лачнік -а *m.*

signatory ['sɪgnətɔ:rɪ] – n. той, хто падпі́свае (*дакумэ́нт*), сыгната́р -а *m.*
– adj. які́ падпіса́ў

signature ['sɪgnətʃər] n. 1. по́дпіс -у *m.* 2. Mus. ключ -á *m.* 3. Print. а) сыгнату́ра *f.* б) а́ркуш -а *m.* 4. Radio пазыўна́я мэлёдыя

signboard ['saɪnbɔ:rd] n. до́шка для абве́стак

signet ['sɪgnɪt] n. мала́я пяча́тка *f.*

signet ring пярсьцёнак зь пяча́ткай

significance [sɪg'nɪfɪkəns] n. 1. сэнс -у *m.*, значэ́ньне *n.* 2. ва́жнасьць, зна́чнасьць *f.*: ***a matter of significance*** ва́жная спра́ва

significant [sɪg'nɪfɪkənt] adj. 1. зна́чны, ва́жны: ***March 25, 1918, is a significant date for Belarusians*** 25-га сакавіка́ 1918 го́ду — ва́жная да́та для белару́саў. 2. шматзна́чны: ***a significant smile*** шматзна́чная ўсьме́шка

signify ['sɪgnɪfaɪ] v., **-fied, -fying** 1. зна́чыць, азнача́ць: ***"Oh!" signifies surprise*** «О!» азнача́е зьдзіўле́ньне. 2. выка́зваць, дава́ць знак: ***He signified his consent with a nod*** Ён вы́казаў сваю́ зго́ду кіўко́м галавы́. 3. мець вагу́ *або́* значэ́ньне

signpost ['saɪnpoʊst] n. паказа́льнік дарог

Sikh [si:k] n. сыкх -а *m.* (*рэлігі́йная сэ́кта ў Індыі*)

silage ['saɪlɪdʒ] n. сі́лас -у *m.*

silence ['saɪləns] – n. 1. ці́шыня́, ці́ша *f.* 2. маўча́ньне *n.*, маўкліва́сць *f.* 3. замо́ўчваньне, зато́йваньне *n.*, забыцьцё *n.*
– v.t. 1. суніма́ць гу́таркі, супако́йваць го́ман. 2. прымуша́ць маўча́ць. 3. заглуша́ць, спыня́ць (*варо́жы аго́нь*)
• ***in silence*** нічо́га ня ка́жучы, мо́ўчкі

silencer ['saɪlənsər] n. глушы́льнік -а *m.*

silent ['saɪlənt] adj. 1. спако́йны, ці́хі, бясшу́мны. 2. маўкліві́ы (*пра чалаве́ка*). 3. бязгу́чны, які́ не вымаўля́ецца: ***The "l" in "folk" and "walk" is a silent letter*** Лі́тара ***"l"*** у сло́вах ***"folk"*** і ***"walk"*** не вымаўля́ецца. 3. які́ замо́ўчвае, ня зга́двае: ***The report was silent on that point*** У дакла́дзе пра гэ́тую спра́ву ня зга́двалася

silently ['saɪləntlɪ] adv. 1. ці́ха, мо́ўчкі 2. бязгу́чна; бясшу́мна

silhouette [ˌsɪlu'et] n. сылюэ́т -а *m.*

silica ['sɪlɪkə] n., Min., Chem. крэменя́зём -у *m.*

silk [sɪlk] n. шоўк, ядва́б -у *m.*; шаўко́вае валакно́, шаўко́выя ні́ткі, шаўко́вая тканіна

silken ['sɪlkən] adj. 1. шаўко́вы, ядва́бны: ***a silken dress*** шаўко́вая сукенка. 2. як шо́ўк, шаўкавісты: ***silken hair*** шаўкавісты валасы́. 3. ліслі́вы (*го́лас, мане́ры*)

silk-stocking [ˌsɪlk'stɑ:kɪŋ] – adj. бага́ты, замо́жны; элега́нтны, арыстакраты́чны: ***silk-stocking area*** гарадзкі́ кварта́л, дзе жыву́ць бага́тыя
– n. элега́нт -а *m.*, элега́нтка *f.*, замо́жная асо́ба

silkworm ['sɪlkwɜ:rm] n. шаўкапра́д, ядва́бнік -а *m.*

silky ['sɪlkɪ] adj. 1. шаўкавісты. 2. шаўко́вы

sill [sɪl] n. 1. падвако́ньне *n.*, падако́ньнік -а *m.* 2. паро́г -а *m.* (*дзьвярэ́й*). 3. ляжа́к лежака́ *m.*, ні́жні брус (*у бу-дыні́не*)

silliness ['sɪlɪnəs] n. 1. неразу́мнасьць, ду́расьць *f.*, дурно́та *f.* 2. ду́расьць *f.*, дурны́, неразу́мны ўчы́нак

silly ['sɪlɪ] adj. дурны́, неразу́мны, бессэнсо́ўны

silo ['saɪloʊ] n., pl. **-los** 1. сі́ласная будыні́на, сі́ласная я́ма. 2. сі́лас -у *m.*

silt [sɪlt] – n. глей -ю, мул -у *m.*
– v.t. асяда́ць гле́ем

silty ['sɪlti] adj. глéісты, глéйкі

silver ['sɪlvər] – n. 1. срэ́бра, серабро́ *n.* 2. срэ́бныя манэ́ты. 3. стало́вае срэ́бра (*нажы́, відэ́льцы, лы́жкі*)
– adj. 1. срэ́бны, сярэ́браны; серабро́ны, пасярэ́браны: ***silver ore*** срэ́бная руда́; ***silver spoon*** срэ́бная лы́жка. 2. серабры́сты, сівы́: ***silver*** or ***silvery hair*** сівы́я валасы́. 3. чы́сты, звано́кі, як срэ́бра
– v.t. серабры́ць (*пакрыва́ць срэ́брам або́ срэ́бнай амальга́май*)
– v.i. серабры́цца, сіве́ць (*пра валасы́*)
• ***a silver tongue*** здо́льнасьць красамо́ўства *або́* перако́нваньня
• ***be born with a silver spoon in one's mouth*** нарадзі́цца шчасьлі́вым

silverplated [ˌsɪlvər'pleɪtɪd] adj. пасярэ́браны, серабро́ны

silversmith ['sɪlvərsmɪθ] n. ма́йстар срэ́бных рэ́чаў

silver thaw галалёдзіца *f.*

silverware ['sɪlvərwer] n. вы́рабы з срэ́бра, стало́вае срэ́бра

silver wedding срэ́бнае вясе́льле

silvery ['sɪlvəri] adj. 1. серабры́сты: ***silver moonbeams*** серабры́стае ме́сячнае сьвятло́. 2. звано́кі, чы́сты (*пра сьмех, го́лас*)

similar ['sɪmələr] adj. 1. падо́бны, ама́ль такі са́мы. 2. Geom. падо́бны: ***similar triangles*** падо́бныя трыку́тнікі

similarity [ˌsɪmə'lærəti] n., pl. **-ties** падабе́нства *n.*, падо́бнасьць *f.*

similitude [sɪ'mɪlətu:d] n. 1. падабе́нства *n.* 2. параўна́ньне *n.*

simmer ['sɪmər] v. 1. закіпа́ць, кіпе́ць на малы́м агні́. 2. вары́ць на малы́м агні́. 3. Figur. кіпе́ць (*ад зло́сьці*)
• ***simmer down*** а) супако́іцца, астыць ад гне́ву. б) вы́кіпець, вы́парыцца

simoom [sɪ'mu:m] n. саму́м -у *m.* (*гара́чы ве́цер у пусты́ні*)

simple ['sɪmpəl] – adj. 1. лёгкі, няцяжкі: ***a simple problem*** лёгкая зада́ча. 2. про́сты, нескладны́, не састаўны́: а) ***a simple sentence*** про́сты сказ. б) ***a simple one-celled animal*** про́стая аднакле́тачная жывёліна. 3. чы́сты, шчы́ры: ***My answer is the simple truth*** Мой адка́з — чы́стая пра́ўда. 4. звыча́йны, про́сты: ***simple clothes*** про́стая во́пратка; ***simple people*** про́стыя лю́дзі. 5. натура́льны (*пра павадзіны, мане́ры*). 6. прастаду́шны, шчы́ры: ***a simple heart*** шчы́рае сэ́рца. 7. тупы́; дурны́, недаразьві́ты
– n. 1. прастаду́шны, няхі́тры чалаве́к, прасьця́к -а́ *m.* 2. не́шта про́стае, нескладана́е

simple fraction про́сты дроб

simple interest про́сты працэ́нт

simpleminded [ˌsɪmpəl'maɪndɪd] adj. 1. про́сты, недасьве́дчаны, прасьце́цкі. 2. не́вуцкі, неадукава́ны, цёмны; неразу́мны; дурны́. 3. прыду́ркаваты

simpleton ['sɪmpəltən] n. прасьця́к -а́, прасьцячло́к -ка́ *m.*, прасьця́чка *f.*; ду́рань -ня *m.*

simplicity [sɪm'plɪsəti] n., pl. **-ties** 1. про́стасьць *f.* 2. шчы́расьць, няхі́трасьць, дабраду́шнасьць *f.*

simplification [ˌsɪmplɪfɪ'keɪʃən] n. спрашча́ньне *n.*

simplify ['sɪmpləfaɪ] v., **-fied, -fying** спрашча́ць

simply ['sɪmpli] adv. 1. про́ста: ***simply dressed*** про́ста апра́нуты. 2. про́ста, то́лькі: ***The baby did not simply cry, he yelled*** Дзіця́ ня про́ста пла́кала, а захо́дзілася ад пла́чу. 3. па-дурно́му: ***He acted as simply as an idiot*** Ён захо́ўваўся про́ста як ідыёт. 4. абсалю́тна: ***simply perfect*** абсалю́тна даскана́лы

simulate ['sɪmjəleɪt] – v. 1. прыкі́двацца; удава́ць; сымулява́ць (*хваро́бу*). 2. насьляду́ваць; прыпадабня́цца, прыстасо́ўвацца: ***Certain insects simulate leaves*** Некато́рыя кузу́ркі прыстасо́ўваюцца пад лісты́
– adj. удава́ны (*пра хваро́бу, добразычлі́васьць*)

simulation [ˌsɪmjə'leɪʃən] n. 1. удава́ньне, прыкі́дваньне *n.* 2. прыпадабне́ньне, насьляду́ваньне *n.*

simulative [ˈsɪmjələtɪv] adj. які́ прыкідáецца, удае́; сымулю́е

simultaneity [ˌsaɪməltəˈni:əti] n. адначасо́васьць, адначáснасьць *f.*

simultaneous [ˌsaɪməlˈteɪniəs] adj. адначасо́вы, адначáсны

simultaneously [ˌsaɪməlˈteɪniəsli] adv. адначасо́ва, адначáсна

sin [sɪn] – n. грэх граху́ *i* грэ́ху *m.*; нераза́льны ўчы́нак
– v.i. грашы́ць

since [sɪns] – prep. 1. ад: ***I have been here since ten o'clock*** Я тут ужо́ ад 10-ае гадзі́ны. 2. ад, пасьля́: ***We have not seen him since Saturday*** Пасьля́ суббо́ты мы яго́ ня ба́чылі
– conj. 1. ад таго́, як; пасьля́ таго́, як: а) ***He has never written since he left*** Ён ні ра́зу не напіса́ў ад таго́ ча́су, як вы́ехаў. б) ***She has worked hard since she left school*** Яна́ ця́жка працава́ла пасьля́ таго́, як кі́нула шко́лу. 2. пако́лькі; таму́ што: ***Since you feel tired, you should rest*** Ты чу́ешся зму́чаным, таму табе́ трэ́ба адпачы́ць
– adv. 1. ад таго́ ча́су (*і дагэ́туль*): ***He got sick last Monday and has been in bed ever since*** Ён захвары́ў у міну́лы панядзе́лак і ад таго́ ча́су ляжы́ць у ло́жку. 2. пе́рад тым: ***a few days since*** не́калькі дзён таму́; ***long since*** даўно́. 4. пасьля́: ***At first he refused the job, but has since accepted it*** Сьпярша́ ён адмо́віўся ад працы, адна́к пасьля́ прыня́ў

sincere [sɪnˈsɪr] adj. шчы́ры

sincerely [sɪnˈsɪrli] adv. шчы́ра: ***yours sincerely*** з пашáнай да Вас (*у лісьце́*)

sincerity [sɪnˈserəti] n., pl. **-ties** шчы́расьць *f.*

sine [saɪn] n., Math. сынус -а *m.*

sinew [ˈsɪnju:] n. 1. сухажы́льле *n.* 2. Figur. моц, сі́ла *f.*, энэ́ргія *f.*; крыні́ца сі́лы

sinewy [ˈsɪnju:i] adv. 1. му́скулісты. 2. мо́цны, сі́льны

sinful [ˈsɪnfəl] adj. грэ́шны; распу́сны, немара́льны

sing [sɪŋ] – v., **sang** or **sung, sung, singing** 1. пяя́ць, сьпява́ць. 2. калыха́ць, усыпля́ць (*дзіця́тка сьпе́вам*). 3. апява́ць: ***Homer sang of Troy*** Гамэ́р апява́ў Тро́ю. 4. завыва́ць (*пра ве́цер*). 5. зьвіне́ць; сьвіста́ць: ***A bad cold made his ears sing*** Ад вялі́кай засту́ды ў яго́ зьвіне́ла ў вуша́х; ***The teakettle sang*** Засьвіста́ў ча́йнік
– n. 1. шум (*у вуша́х*); сьвіст -у *m.*: ***the sing of a bullet in flight*** сьвіст ку́лі ў лёце. 2. пяя́ньне *n.*, сьпе́ў -ву *m.*, сьпе́ўка *f.*

singe [sɪndʒ] – v.t. 1. абсма́льваць. 2. Informal псава́ць, пля́міць (*рэпута́цыю*)
– n. апёк -у *m.*

singer [ˈsɪŋər] n. сьпява́к сьпевака́ *m.*, сьпява́чка *f.*, пяю́н -а́ *m.*

singing [ˈsɪŋɪŋ] – n. 1. сьпе́ў -ву *m.*, пяя́ньне *n.* 2. звон у вуша́х
– adj. сьпе́ўны; пяву́чы, пяю́чы

single [ˈsɪŋgəl] – adj. 1. адзі́ны; адзіно́чны: ***There is not a single one left*** Не засталó ся нівóднага; ***a single shot*** адзіно́чны стрэл; ***a single bed*** аднаспа́льны ло́жак. 2. сам, адзін, адзіно́кі: ***He came to the party single*** На вечары́нку ён прыйшо́ў адзі́н. 3. а) нежана́ты: ***a single man*** нежана́ты мужчы́на. б) незаму́жняя: ***a single girl*** незаму́жняя дзяўчы́на. 4. сам-на́сам: ***single combat*** адзінабо́рства. 5. асабліві, выключны: ***She showed single devotion to her work*** Яна́ вы́явіла асабліву́ю руплі́васьць да пра́цы
– v.t. вылуча́ць, выбіра́ць

single-breasted [ˌsɪŋgəlˈbrestɪd] adj. аднабо́ртны (*пра палітó, гарні́ту́р*)

single file адзін за адны́м: ***in single file*** гу́жам, цу́гам (*ісьці́*)

single-handed [ˌsɪŋgəlˈhændɪd] adj. 1. аднаасо́бны. 2. аднару́кі

singly [ˈsɪŋgli] adv. 1. індывідуа́льна, асо́бна, паасо́бку. 2. сваймі́ сі́ламі, адзіно́чна

singular [ˈsɪŋgjələr] – adj. 1. надзвыча́йны, незвыча́йны, выключны: ***a story of singular interest to boys*** апавя-

да́ньне надзвыча́йнае ціка́васьці для хлапцо́ў. 2. дзіўны́, своеасабліві, спэцыфі́чны; ***a singular matter*** своеасабліва́я спра́ва. 3. адзі́ны, адзі́нкавы: ***an event singular in history*** падзе́я адзі́нкавая ў гісто́рыі. 4. Gram. адзіно́чны (*пра лік*)
– n. 1. адзіно́чны лік. 2. сло́ва ў адзіно́чным ліку

singularity [ˌsɪŋgjəˈlærəti] n., pl. **-ties** асаблі́васьць, дзіўнасьць, незвыча́йнасьць *f.*

sinister [ˈsɪnɪstər] adj. 1. злаве́сны, ву́сьцішны; пагража́льны: ***a sinister look*** пагража́льны по́зірк. 2. злы, благі́. 3. левабако́вы, ле́вы

sink [sɪŋk] – v., **sank** or **sunk, sunk** or **sunken, sinking**
– v.i. 1. тану́ць, тапі́цца: ***The ship is sinking*** Карабе́ль то́не. 2. зьніжа́цца; асо́ўвацца, апуска́цца: ***The sun is sinking*** Со́нца захо́дзіць; ***She sank to the floor in a faint*** Яна́, абамле́ўшы, асу́нулася на падло́гу. 3. зьмянша́цца, слабе́ць: ***The wind has sunk down*** Ве́цер сьці́шыўся. 4. запада́ць у па́мяць, до́бра запамінацца, засво́йвацца: ***Let the lesson sink into your mind*** До́бра засво́й ле́кцыю. 5. упада́ць: ***to sink into poverty*** упада́ць у бе́днасьць. 6. угрузаць, вя́знуць: ***to sink in the snow*** угру́знуць у сьне́зе. 7. занепада́ць: ***His spirits sank*** Ён заняпа́ў ду́хам. 8. западаць, ува́львацца: ***The sick man's cheeks have sunk*** У хво́рага запа́лі шчо́кі
– v.t. 1. паніжа́ць (*узро́вень вады́*). 2. затапля́ць: ***to sink a ship*** затапі́ць карабе́ль. 3. зьніжа́ць: ***Sink your voice to a whisper*** Зьнізь го́лас да шэ́пту. 4. капа́ць: ***The men are sinking a well*** Мужчы́ны капа́юць сту́дню. 5. замо́ўчваць, наўмы́сна хава́ць: ***to sink evidence*** замаўча́ць до́вад
– n. 1. мы́цельнік, умыва́льнік -а *m.*, кухо́нная ра́кавіна. 2. сьцёк -у *m.* 3. Figur. прыто́н -у *m.* 4. нізі́на *f.*
• ***sink or swim*** пан або́ прапа́ў

sinker [ˈsɪŋkər] n. грузі́ла *n.*

sinking fund амартызацы́йны фонд, фонд пагашэ́ньня

sinless [ˈsɪnləs] adj. бязгрэ́шны

sinner [ˈsɪnər] n. грэ́шнік -а *m.*, грэ́шніца *f.*

sinuous [ˈsɪnjuəs] adj. 1. зьвілі́сты, завілісты (*як рух вужа́кі*). 2. крывы́, пакруча́сты. 3. Figur. несумле́нны, нерашу́чы

sinus [ˈsaɪnəs] n., Anat. сы́нус -а *m.*

sip [sɪp] – v.t. **(-pp-)** сёрбаць, піць глыткамі
– n. глыто́к -ка́ *m.*

siphon [ˈsaɪfən] – n. сыфо́н -у *m.*
– v.t. выпампо́ўваць сыфо́нам

sir [sɜːr] n. 1. сэр -а *m.*; спада́р -а́ *m.*: ***Excuse me, sir*** Вы́бачце, спада́ру. 2. *ты́тул ры́цара або́ баранэ́та*

siren [ˈsaɪrən] n. сырэ́на *f.*

sirloin [ˈsɜːrlɔɪn] n. філе́й -ю *m.* (*валаві́на*)

sissy [ˈsɪsi] n., pl. **-sies** 1. Informal расьпе́шчаны, плаксі́вы хлапе́ц. 2. сярсьтры́чка *f.*

sister [ˈsɪstər] n. 1. сястра́ *f.*; сястры́чка, сястры́ца *f.*: ***a half sister*** зво́дная сястра́. 2. мана́шка *f.* 3. мэдыцы́нская *або́* міласэ́рная сястра́, сядзе́лка *m.*

sisterhood [ˈsɪstərhʊd] n. 1. ро́дная су́вязь сясьцёр. 2. сястры́нтва *n.*

sister-in-law [ˈsɪstərɪnˌlɔː] n., **sisters-in-law** швагерка *f.* (*жо́нчына сястра́*); ятро́ўка *f.* (*жо́нка аднаго́ бра́та жо́нцы другога́ бра́та*); залві́ца, залоўка *f.* (*му́жава сястра́*);

sisterly [ˈsɪstərli] adj. сястры́нскі; сястры́н

Sisyphean [sɪsɪˈfiːən] adj. 1. Сызы́фаў (*пра́ца*). 2. Figur. дарэ́мны, ма́рны, бескары́сны; цяжкі́ і бяскро́нцы

sit [sɪt] **sat,** – v.i. 1. сядзе́ць: ***She sat in a chair*** Яна́ сядзе́ла на крэ́сьле. 2. стая́ць: ***The clock has sat on that shelf for years*** Гадзі́ньнік стаяў на гэ́най палі́цы гада́мі. 3. засяда́ць: ***The court sits next month*** Суд бу́дзе засяда́ць у насту́пным ме́сяцы; ***to sit***

in Parliament быць пасло́м, засяда́ць у парля́мэнце. 4. пазава́ць: ***to sit for a portrait*** пазава́ць для партрэ́та. 5. сядзе́ць на я́йках (*пра пту́шку*). 6. пасава́ць, ляжа́ць: ***The coat sits well*** Пінжа́к до́бра ляжы́ць. 7. даглядаць за дзе́цьмі ў адсу́тнасьці бацько́ў
– v.t. 1. садзі́ць: ***The woman sat the little boy in his chair*** Жанчы́на пасадзі́ла хло́пчыка ў крэ́селца. 2. сядла́ць: ***He sat his horse well*** Ён до́бра трыма́ўся на кані́
• ***sit down*** сяда́ць,
• ***sit in*** браць удзе́л (*у гульні́, канфэрэ́нцыі*), прысу́тнічаць
• ***sit on*** or ***upon*** быць ся́брам камі́сіі, прысяжны́м судзьдзёю
• ***sit out*** а) высе́джваць. б) Informal вычэ́кваць
• ***sit through*** вы́седзець
• ***sit tight*** вычэ́кваць, не саступа́ць
• ***sit up*** а) прыўзьня́цца, се́сьці. б) засе́джвацца, ня кла́сьціся спаць
• ***sit well*** быць да тва́ру, пасава́ць

site [saɪt] – n. 1. ме́сца *n.*, разьмяшчэ́ньне *n.*: ***This home has one of the best sites in town*** Гэ́ты дом знахо́дзіцца ў адны́м з найле́пшых ме́сцаў го́раду. 2. ме́сца, пляц для пабудо́вы: ***site of an ancient town*** гарадзі́шча *n.* 3. Comput. сайт -у *m.*
– v.t. 1. выбіра́ць ме́сца. 2. ста́віць, будава́ць, зьмяшча́ць: ***They sited the new building on a hill*** Яны́ паста́вілі но́вую будыні́ну на ўзго́рку

sit-in сядзя́чы страйк; акупацы́йны страйк

sitter ['sɪtər] n. 1. ня́нька, сядзе́лка *f.* 2. квакту́ха *f.*

sitting ['sɪtɪŋ] n. 1. сядзе́ньне *n.* 2. се́сія (*парлямэ́нту, су́ду*). 3. сэа́нс -у *m.* 4. высе́джваньне *n.* (*птушаня́т*)

sitting room гасьцёўня *f.*

situated ['sɪtʃueɪtəd] adj. разьме́шчаны

situation [ˌsɪtʃu'eɪʃən] n. 1. ме́сцазнахо́джаньне, ме́сца *n.*: ***Choose an attractive spot for our camp*** Вы́берце прыго́жае ме́сца для на́шага ля́геру. 2. абста́віны *pl. only*, сыту́ацыя *f.* 3. стано́вішча *n.*, пра́ца *f.*

six [sɪks] n., adj. шэсьць; шасьцёх; шасьцёра

sixfold ['sɪksfould] – adj. 1. шасьціразо́вы. 2. які́ ма́е шэсьць ча́стак
– adv. у шэсьць разо́ў больш, шасьціразо́ва

six hundred шэсьцьсо́т

six-hundredth шасьцісо́ты

six-pack ['sɪkspæk] n. блёк -а *m.*, упако́ўка *f.* (*шэсьць бляша́нак або бутэ́лек, напр. пі́ва*)

sixteen [ˌsɪk'sti:n] n. шасна́ццаць

sixteenth [ˌsɪk'sti:nθ] adj. 1. шасна́ццаты. 2. адна́ шасна́ццатая ча́стка; шасна́ццатка *f.*

sixteenth note Mus. шасна́ццатая *f.*

sixth [sɪksθ] – adj. шо́сты
– n. шо́стая ча́стка

sixthly ['sɪksθli] adv. па-шо́стае, на шо́стым ме́сцы

sixth sense шо́стае пачуцьцё, інтуі́цыя *f.*

sixtieth ['sɪkstiəθ] – adj. шасьцідзяся́ты: ***sixtieth anniversary*** шасьцідзесяцігадо́вы юбіле́й
– n. адна́ шасьцідзяся́тая ча́стка

six times шэсьць разо́ў, шэсьць у *ко́лькі*, шэсьць па *ко́лькі*, шасьцьма́: ***six times six*** шэсьць у шэсьць, шэсьць па шэ́сьць (*у мно́жаньні*)

sixty ['sɪksti] n., pl. **-ties** шэсьцьдзесят: ***the sixties*** шасьцідзяся́тыя гады́; ***sixty-year-old man*** шасьцідзесяцігадо́вы чалаве́к

size [saɪz] – n. 1. паме́р -у *m.*, велічыня́ *f.*; аб'ём -у *m.* 2. ну́мар, паме́р -у *m.*: ***His shoes are size 10*** Чаравікі ў яго́ дзяся́тага памеру
– v.t. сартава́ць паво́дле велічыні́
• ***cut down to size*** а) падраўня́ць. б) падрэ́заць кры́лы
• ***of a size*** тако́е са́мае велічыні́ *або́* памеру
• ***size up,*** Informal ацані́ць, даць ацэ́нку, скла́сьці ду́мку

sizeable ['saɪzəbəl] adj. до́сыць вялі́кі, абшы́рны

sizzle ['sɪzəl] v. 1. сквірчэ́ць (*пра сква́ранае*). 2. Informal кіпе́ць, кіпяці́цца: ***to sizzle with anger*** кіпе́ць ад зло́сьці

skald [skɔ:ld] n. скальд -а *m.* (*скандына́ўскі паэ́т-пясьня́р*)

skate I [skeɪt] – n. 1.канёк -нька́ *m.*, канькі́ *pl.* 2. ро́лік -а *m.*, ро́лікі *pl.*
– v.i. ко́ўзацца (*на канька́х*); е́зьдзіць (*на ро́ліках*)

skate II [skeɪt] n. скат -а *m.* (*ры́ба*)

skater ['skeɪtər] n. канькабе́жац -ца *m.*

skating rink кат|о́к -ка *m.*, ко́ўзанка *f.*

skein [skeɪn] n. 1. мат|о́к -ка́ *m.* (*ні́так*), скру́т|ак -ка *m.* 2. чарада́ (*дзі́кіх гусе́й або́ ка́чак у палёце*)

skeleton ['skelɪtən] – n. 1. а) шкіле́т -а *m.* б) ра́кавінка (*малю́ска*). 2. шкіле́т -а *m.* (*пра худо́га чалаве́ка*). 3. каркас -а *m.*: ***the steel skeleton of a building*** стальны́ каркас будыні́ны. 4. на́кід, плян -у *m.*
– adj. 1. як шкіле́т, шкіле́тны. 2. Figur. паме́ншаны, часткі́вы: ***a skeleton crew*** скаро́чаны экіпа́ж
• ***skeleton in the closet*** схава́ныя грахі́ (*кампрама́т*); гане́бны сяме́йны сакрэ́т

skeleton key адмы́чка *f.*

skeptic ['skeptɪk] adj., *гл.* **sceptic**

skeptical ['skeptɪkəl] adj., *гл.* **sceptical**

sketch [sketʃ] – n. 1. эскі́з, на́кід -у *m.*, замалёўка (*для карці́ны*), мадэ́ль (*во́праткі*). 2. на́кід, плян літаратў́рнага тво́ру. 3. Theatr. скетч -у *m.*
– v.t. малява́ць эскі́зы, рабіць на́кіды

sketchbook ['sketʃbʊk] n. альбо́м для замалёвак

sketchy ['sketʃi] adj. 1. эскі́зны. 2. Figur. няпо́ўны; невялі́кі, лёгкі; недаскана́лы: ***a sketchy meal*** няпо́ўны абе́д, лёгкая перакў́ска

skew [skju:] – adj. 1. касы́, ко́сы. 2. несымэтры́чны
– n. нахі́л, схіл -у *m.*, пака́тасьць *f.*: ***on the skew*** ко́са. 2. скрыўле́ньне *n.*
– v.t. 1. ско́шваць, рабіць касы́м, крывіць. 2. зваро́чваць убо́к. 3. перакру́чваць
• ***on the skew*** наўско́с

ski [ski:] – n. **skis** or **ski** лы́жа *f.*; лы́жы *pl.*, і́рта *f.*, і́рты *pl.*
– v.i. е́зьдзіць на лы́жах

skid [skɪd] – v. 1. зано́сіць убо́к; ко́ўзацца: ***The car skidded on the slippery road*** Самахо́д зане́сла на ко́ўзкай даро́зе. 2. буксава́ць
– n. 1. буксава́ньне *n.*, зано́с -у *m.* 2. падкалёсная кало́дка

skidoo [skɪ'du:] n. малы́ сьнегахо́д

skier ['ski:ər] n. лы́жнік -а *m.*, лы́жніца *f.*

skilful or **skillful** ['skɪlfəl] adj. майстэ́рскі, уме́лы

skilfully or **skillfully** ['skɪlfəli] adv. па-майстэ́рску, уме́ла

skill [skɪl] n. 1. спра́ўнасьць, спры́тнасьць *f.*: ***with skill*** спра́ўна, спры́тна. 2. уме́льства, майстро́ўства, майстэ́рства *n.*, спрыт -у *m.*; кваліфіка́цыя *f.*, на́вык -у *m.*: ***It takes skill to tune a piano*** Патрэ́бнае ўме́льства, каб нала́дзіць піяні́на; ***He has no skills although he is interested in carpentry*** Ён ня ма́е ніякі́х кваліфіка́цыяў, хоць ціка́віцца сталя́ркай

skilled [skɪld] adj. 1. наву́чаны, дасьве́дчаны; кваліфікава́ны: ***a skilled workman*** кваліфікава́ны рабо́тнік. 2. які́ вымага́е падрыхто́ўкі, кваліфіка́цыі: ***Bricklaying is skilled labor*** Муля́рства — рабо́та, яка́я вымага́е падрыхто́ўкі

skillet ['skɪlɪt] n. 1. патэ́льня, скаварада́ *f.* 2. кастру́ля з даўго́й ру́чкай

skim [skɪm] – v.t. 1. здыма́ць сьмята́ну з малака́; здыма́ць шумавіньне з су́пу. 2. сьлізга́ць: ***The pebble I threw skimmed the little waves*** Каме́нчык, які́ я кі́нуў, сьлізга́ў па малы́х хва́лях. 3. прачы́тваць збо́льшага
– v.i. 1. пла́ўна праплыва́ць, пралята́ць. прано́сіцца. 2. пакрыва́цца то́нкім пласто́м (*лёду, шумові́ньня*)
– n. 1. зьня́тая сьмята́на; шумові́ньне *n.* 2. Sl. ко́лькасьць скра́дзенага

skimmer ['skɪmər] n. шумо́ўка *f.*

skim milk зьня́тае малако́; перагО́н -у *m.*

skimp [skɪmp] v. 1. скупі́цца. 2. ашчаджа́ць: ***She had to skimp to send her son to college*** Яна́ му́сіла ашчаджа́ць, каб магчы́ пасла́ць сы́на ў інстыту́т. 3. рабі́ць недакла́дна, недаскана́ла

skimpy [skɪmpi] adj. 1. каро́ткі, малы́, мізэ́рны, недастатко́вы. 2. ашча́дны, скупы́

skin [skɪn] – n. 1. а) ску́ра *f.* б) вы́раблена шку́ра. 2. ску́рка, абало́нка *f.* а) ад пладо́ў. б) лупі́на *f.*, шалупі́ньне *n.* 3. шку́ра *f.* 4. Sl. махля́р -а́, ашука́нlец -ца *m.*; скна́рla, жмі́ндla -ы *m. & f.* 5. Sl. даля́р -а *m.*

– v.t. 1. а) абдзе́рці ску́ру: ***Jack skinned his knee when he fell*** Янка ўпа́ў і абдзёр кале́на. б) здыма́ць, зьдзіра́ць ску́ру. 2. скіда́ць ску́ру (*пра вужа́каў*). 3. Sl. лупі́ць ску́ру, браць празьме́рую пла́ту

• ***by the skin of one's teeth*** ве́льмі бліза́ка, ама́ль што, ле́дзьве што

• ***get under one's skin*** а) назаля́ць, дакуча́ць; зале́зьці за ску́ру. б) мо́цна ўплыва́ць на *каго́*

• ***have a thick skin*** быць таўстаску́рым, нячу́лым

• ***in*** or ***with a whole skin*** цэ́лы і здаро́вы

• ***jump out of one's skin*** са ску́ры выла́зіць (*ад ра́дасьці, захапле́ньня*)

• ***save one's skin*** вы́ратава́ць сваю́ ску́ру (*уцячы́ цэ́лым*)

• ***skin alive***, Sl. а) му́чыць, мо́цна біць. б) во́стра крытыкава́ць. в) перамагчы́, разьбіць дашчэ́нту

• ***under the skin*** у асно́ўным; не зважа́ючы на во́нкавыя адро́зьненьні

skindiver [ˈskɪndaɪvər] n. вадала́з -а *m.*

skinflint [ˈskɪnflɪnt] n. скна́рla -ы *m.*

skinner [ˈskɪnər] n. 1. скурадзёр, скуралу́п -а *m.* 2. ску́рнік -а *m.*

skinny [ˈskɪni] adj. ве́льмі то́нкі, ве́льмі худы́, ску́ра ды ко́сьці

skin-tight [ˈskɪntaɪt] adj. які́ шчы́льна прыляга́е да фігу́ры

skip [skɪp] – v.i. **(-pp-)** 1. скака́ць, лёгка падско́кваць. 2. го́йсаць, гайса́ць, раско́кваць: ***The girls skipped rope*** Дзяўча́ткі скака́лі празь вяро́ўку. 3. праміна́ць, прапуска́ць, рабі́ць про́пуск: ***He skips as he reads*** Ён ро́біць про́пускі, калі́ чыта́е; ***to skip a grade*** пераско́чыць кля́су; Informal: ***to skip classes*** прапушча́ць ле́кцыі

– n. ско́к, падско́к -у *m.*

skirmish [ˈskɜ:rmɪʃ] – n. 1. мала́я збройная сутычка, перастрэ́лка. 2. спрэ́чка, сва́рка, ля́янка *f.*

– v.i. 1. ве́сьці сутычкі, ваява́ць. 2. спрача́цца, сварыцца, ля́яцца

skirt [skɜ:rt] – n. 1. спадні́ца *f.* 2. мяжа́ *f.*, ускра́йлй -ю *m.*: ***on the skirts of the wood*** на ўзьле́сьсі

– v.i. 1. межава́цца, быць на ўскра́і. 2. быць на мяжы́, уздо́ўж мяжы́, ускра́й

– v.t. абыхо́дзіць *або́* аб'яжджа́ць бо́кам або́ ўскра́й: ***The boys skirted the forest*** Хлапцы́ абыйшлі́ бо́кам лес

skit [skɪt] n. скетч -у *m.*

skulk [skʌlk] v.i. 1. хава́цца, ухіля́цца (*ад адка́знасьці, пра́цы*). 2. кра́сьціся, прабіра́цца ўпо́тай

skull [skʌl] n. 1. ча́рап -а *m.* 2. галава́ *f.*

skull and crossbones ча́рап і ко́сьці (*эмбле́ма сьме́рці або́ знак перасьцяро́гі*)

skullcap [ˈskʌlkæp] n. 1. ха́тняя ша́пачка. 2. скуфе́йка *f.* (*у сьвятаро́ў*). 3. ярмо́лка *f.*; цюбяце́йка *f.* 4. ча́рапная ча́ша

skunk [skʌŋk] n. 1. скунс -а *m.*, шашло́к -ка́ *m.*, сьмярдзю́чка *f.*, 2. фу́тра са ску́нса. 3. Informal падлю́гla -і *m. & f.*, нягодні́к -а *m.*

sky [skaɪ] – n., pl. **skies.** 1. не́ба *n.*: ***a blue sky*** сі́няе не́ба; ***a cloudy sky*** хма́рнае не́ба. 2. нябёсы *pl. only.* 3. надво́р'е *n.*, кліма́т -у *m.*: ***under a warmer sky*** у цяпле́йшым кліма́це, пры цяпле́йшым надво́р'і

– v.i. падбіва́ць, кі́даць *або́* падніма́ць высо́ка ўго́ру

• ***out of a clear (blue) sky*** ра́птам, зьняна́цку, нечака́на, як гром зь я́снага не́ба

• ***praise to the skies*** узно́сіць, усхваля́ць да не́ба
• ***the sky is the limit*** нямá ме́жаў

sky-blue я́сна-блакі́тны ко́лер

sky-high [ˌskaɪˈhaɪ] – adv. ве́льмі высо́ка – adj. ве́льмі высо́кі, да не́ба

skyjack [ˈskaɪdʒæk] n. паве́транае пірáцтва

skylab [ˈskaɪlæb] n. арбіта́льная ста́нцыя

skylark [ˈskaɪlɑ:rk] – n. жаўру́к -á *m.*, жáваранак -ка *m.*
– v.i. свавóліць, пракýдзіць, блазнава́ць

skylight [ˈskaɪlaɪt] n. вакно́ ў страсе́ *або́* сто́лі

skyline [ˈskaɪlaɪn] n. 1. гарызо́нт -у *m.* 2. небасхіл -у, небакра́й -ю *m.*

sky marshal аге́нт слýжбы бясьпе́кі на самалёце

skyscraper [ˈskaɪˌskreɪpər] n. небаскро́б, небасця́г, хмарачо́с, хмарадзёр -а *m.*

slab [slæb] – n. 1. а) плітá *f.* (*з ка́меню, дрэ́ва або́ мэта́лу*). б) скрылЛь -я́ *m.*, кава́лак - ка *m.* (*сы́ру, мя́са*). 2. апóлак -ка *m.*
– v.t. 1. выраза́ць пліты. 2. абпілóўваць апóлкі. 3. выкладáць каме́ннымі пліта́мі

slack I [slæk] – adj. 1. сла́бкі, нямóцна наця́гнуты (*пра вярóўку, ле́йцы*). 2. нядба́лы: ***a slack housekeeper*** нядба́лая гаспады́ня. 3. павóльны: ***at a slack pace*** павóльнай хадóю. 4. вя́лы (*пра га́ндаль, ры́нак*)
– n. 1. застóлй -ю *m.* (*у га́ндлі*); ці́хі пэры́яд, заці́шша *n.*, час бязьдзе́йнасьці. 2. час памíж прыплы́вам і адплы́вам (*мóра*)
– v.t. 1. паслабля́ць. 2. гасíць (*ва́пну*)
– adv. 1. сла́бка. 2. павóлі, мару́дна
• ***slack off*** паслабля́ць, аслабля́ць (*запа́л, стара́ннасьць*)
• ***slack up*** запавóліць (*ход машы́ны, цягні́ка́, бег*)

slack II [slæk] n. ву́гальны шлак

slacken [ˈslækən] – v.t. 1. аслабля́ць (*намага́ньні пры пра́цы*). 2. паслабля́ць (*каню́ папру́гі*)
– v.i. 1. паслабля́цца. 2. запавóльваецца: ***Work slackens on a hot day*** Пра́ца запавóльваецца ў гара́чы дзень

slacker [ˈslækər] n., Informal лайда́к -á, гульта́лй -я́ *m.*; той, хто ўхіля́ецца ад абавя́зкаў

slacks [slæks] n., pl. спартóвыя штаны́

slag [slæg] n. v., **(-gg-)** ператвара́ць (-ца) ў шлак

slam I [slæm] **(-mm-)** – v.t. 1. ля́паць, гру́каць, бра́згаць: ***to slam the door*** бра́знуць дзьвяры́ма. 2. Informal разнóсіць, мóцна крытыкава́ць
– v.i. 1. бра́згаць: ***The door slammed*** Дзьве́ры бра́знулі. 2. мóцна сутыка́цца, сту́кацца
– n. 1. а) ля́паньне, гру́каньне, бра́зганьне, пля́сканьне *n.* б) гру́кат, бра́згат -у *m.*: ***John threw his books down with a slam*** Янка шпурну́ў сваé кні́гі з гру́катам. 2. мóцны ўдар. 3. Informal зьнішча́льная кры́тыка

slam II [slæm] n. (*у ка́ртах*) шлем -у *m.*

slammer [ˈslæmər] n., Sl. турмá *f.*

slander [ˈslændər] – n. 1. Law ілжы́вае абвінава́чаньне; паклёп -у *m.* 2. нагавóры *pl. only*, паклёпніцтва *n.*
– v.i. 1. нагавóрваць, займáцца нагавóрамі, паклёпнічаць
– v.t. абылга́ць, абгаварыць

slanderer [ˈslændərər] n. паклёпнік -а *m.*, паклёпніца *f.*

slanderous [ˈslændərəs] adj. паклёпніцкі, абра́зьлівы

slang [slæŋ] – n. 1. размóўная гýтарка. 2. слэнг, жаргóн -у *m.*
– v. ля́яць, зьневажа́ць: ***They slanged away at each other*** Яны́ ля́яліся адзíн на аднагó

slangy [ˈslæŋi] adj. жаргóнны

slant [slænt] – v.i. 1. нахіля́цца, схіля́ца: ***Most handwriting slants to the right*** Лíтары на пісьмé перава́жна схіля́юцца напра́ва. 2. насьвятля́ць тэндэнцы́йна
– n. 1. спад, схíл -у *m.*: ***a sharp slant*** стрóмкі схíл. 2. нахíл -у *m.*, схíльнасьць *f.* 3. Informal тэндэ́нцыя *f.*

– adj. пахі́лы, пака́ты
• ***on the slant*** наўскó́с; кóса

slantwise ['slæntwaɪz] adv. пахі́ла, пака́та; наўскася́к, наўскó́с

slap [slæp] – n. 1. пляска́ч плескача́ *m.* 2. стро́гая вымо́ва; рэ́зкая адмо́ва
– v.t. **(-pp-)** 1. ля́паць, шлёпаць, пля́скаць. 2. плёскаць: ***waves slapping against the dock*** хва́лі плёскаюць аб док
– adv., Informal 1. про́ста; ра́птам: ***to run slap into the wall*** урэ́зацца про́ста ў сьцяну́
• ***slap in the face,*** Informal а) абра́за, зьнява́га *f.* б) аплява́ўха, по́ўха *f.*
• ***slap on the wrist*** лёгкая нага́на

slash [slæʃ] – v.t. 1. разраза́ць, расьсяка́ць (*мячо́м, нажо́м*). 2. хваста́ць, сьцяба́ць (*пу́гай*). 3. Figur. суро́ва *або́* варо́жа крытыкава́ць. 4. абраза́ць, зьніжа́ць (*зарпла́ту, пада́ткі*). 5. выраза́ць (*напр. ча́сткі кні́гі*), мо́цна зьмяня́ць
– n. 1. рэ́зкі ўда́р. 2. разрэ́з -у *m.*, ра́на *f.* 3. вы́сека, вы́сечка *f.* (*у ле́се*)

slate [sleɪt] – n. 1. сла́нец -ца *m.* 2. грыфэ́льная до́шка. 3. сьпіс кандыда́таў
– v.t. 1. крыць сла́нцам (*напр. дах*). 2. во́стра крытыкава́ць. 3. зано́сіць у сьпіс кандыда́таў
– adj. цёмны сі́ня-шэ́ры
• ***break the slate*** зьняць кандыдату́ру (*на вы́барах*)
• ***wipe the slate clean*** напра́віць памы́лкі, непаразуме́ньні

slaughter ['slɔ:tər] – n. 1. забо́й -ю *m.*, забіва́ньне, зарэ́з -у *m.*: ***slaughter of animals for food*** забо́й жывёлы на мя́са. 2. разьня́ *f.*
– v.t. 1. рэ́заць, забіва́ць (*жывёлу на мя́са*). 2. ма́сава забіва́ць (*на вайне́, падча́с рэпрэ́сіяў*)

slaughter house бо́йня *f.*

Slav [slɑ:v] – n. славяні́н -а *m.*
– adj. славя́нскі

slave [sleɪv] – n. 1. няво́льнік -а *m.*, няво́льніца *f.*, раб -а́ *m.*
– v.i. працава́ць, як раб, ця́жка працава́ць

slave driver 1. нагля́днік над раба́мі. 2. ве́льмі патрабава́льны працада́вец

slaver I ['slævər] – v. сьліні́ць, сьліня́віць
– n. 1. сьлі́на *f.* 2. сьліня́васьць *f.*

slaver II ['sleɪvər] n. 1. гандля́р раба́мі. 2. карабе́ль з раба́мі

slavery ['sleɪvəri] n. 1. няво́ля *f.* 2. няво́льніцтва, ра́бства *n.* 3. цяжка́я пра́ца

Slavic ['slɑ:vɪk] – adj. славя́нскі
– n. славя́нская мо́ва

slavish ['sleɪvɪʃ] adj. 1. няво́льніцкі. 2. уго́дніцкі. 3. Figur. неарыгіна́льны, які́ панява́ўнічую пераймае

slavishly ['sleɪvɪʃli] adv. па-няво́льніцку, па-ра́бску

Slavonic [slə'vɑ:nɪk] – adj. славя́нскі
– n. 1. славяні́н -а *m.*, славя́нка *f.* 2. славя́нская мо́ва

slaw [slɔ:] n. капу́сная сала́та

slay [sleɪ] v.t. **slew, slain** забіва́ць

sled [sled] – n. 1. дзіця́чыя са́нкі. 2. са́ні, са́нкі *pl. only*
– v.i. **(-dd-)** е́зьдзіць у саня́х, на са́нках
– v.t. вазі́ць *каго́-што* саня́мі, у саня́х, на са́нках

sledge I [sledʒ] n. са́ні *pl.*

sledge II [sledʒ] n., *гл.* **sledge hammer**

sledge hammer 1. кава́льскі мо́лат. 2. не́шта мо́цнае й зьнішча́льнае: ***Sarcasm can become a sledge hammer in a debate*** Саркáзм у дыспуце мо́жа ста́ць зьнішча́льным уда́рам

sledge-hammer ['sledʒˌhæmər] – v.t. біць мо́латам *або́* як мо́латам
– adj. мо́цны; зьнішча́льны

sleek [sli:k] – adj. 1. мя́ккі, гла́дкі, прыгла́джаны: ***sleek hair*** гла́дка прылі́заныя валасы́; ***a sleek cat*** кот з мя́ккай, бліскýчай по́ўсьцю. 2. хі́тры, ліслі́вы: ***a sleek salesman*** прадаве́ц зь ліслі́вымі мане́рамі і гла́дкім языко́м
– v.t. прыгла́джваць, прылі́зваць

sleep [sli:p] – v.i. **slept** 1. спаць: ***He cannot sleep*** Ямý ня сьпіцца. 2. дава́ць

начлéг: ***A hotel that sleeps 500 people*** Гатэ́ль, які даé начлéг пяцістáм асóбам

– n. 1. сон сну *m.*: ***to go to sleep*** заснýць; ***to get a sleep*** паспáць; ***to put to sleep*** а) пакláсьці спаць (*дзіця́*). б) усыпля́ць (*жывёлу*); ***eyes heavy with sleep*** заспáныя вóчы. 2. сьпя́чка *f.*

• ***last sleep*** сьмерць

• ***sleep away*** праспáць

• ***sleep in*** а) жыць у дóме, дзе й працýеш. б) пóзна спаць, заспáць

• ***sleep like a log*** спаць, як забíты (*мóцным сном*)

• ***sleep off*** вы́спацца, адаспáцца: ***to sleep off a hangover*** вы́цьверазіцца

sleeper ['sli:pər] n. 1. сьпя́чы -ага *m.* 2. спáльны вагóн (*у цягні́кý*). 3. шпáла *f.* (*на чыгýнцы*). 4. запóзьненая нечакáная папуля́рнасьць

• ***sleepers*** дзіця́чы камбінэзóнчык для спáньня

sleepiness ['sli:pinəs] n. санлíвасьць, сóннасьць *f.*

sleeping ['sli:piŋ] – n. спаньнё *n.*

– adj. 1. які́ сьпіць. 2. спáльны: ***a sleeping car*** спáльны вагóн

sleeping bag спáльны мяшóк

sleeping pill (tablet) снатвóрная таблéтка

sleeping sickness сьпя́чка *f.* (*хварóба*)

sleepless ['sli:pləs] adj. 1. які́ ня сьпіць, які ня мóжа спаць; бяссóнны: ***sleepless night*** бяссóнная ноч. 2. чýйны. 3. заўсёды дзéйны

sleeplessness ['sli:pləsnəs] n. бяссóньніца *f.*

sleepwalker ['sli:pˌwɔ:kər] n. люнáтык -а *m.*

sleepy ['sli:pi] adj. 1. сóнны, санлíвы. 2. бязьдзéйны; ціхі, сóнны: ***sleepy town*** спакóйны гарадóк. 3. які́ навóдзіць сон; які́ ўсыпля́е, усыпля́льны: ***a warm, sleepy day*** цёплы, санлíвы дзень

sleet [sli:t] – n. аблівáха *f.*, аблíвень -ўня *m.*, сьнег *абó* град з дажджóм

– v.i. сьняжы́ць з дажджóм: ***It snowed, then it sleeted; then it rained*** Ішóў сьнег, пасьля́ сьнег з дажджóм, а тады́ ўжо дождж

sleety ['sli:ti] adj. з мóкрым сьнéгам, слóтны: ***a sleety fall*** слóтная вóсень

sleeve [sli:v] n. рукавó *n.*, рукáвў -вá *m.* (*вóпраткі*)

• ***have smth up one's sleeve*** а) мець, трымáць у запáсе. б) мець нéшта задýманае

• ***laugh in or up one's sleeve*** сьмяя́цца ў рукáў, сьмяя́цца ціхa

• ***roll up one's sleeves*** закасáць рукавы́, узя́цца за прáцу

sleeved [sli:vd] adj. з рукавáмі

sleeveless ['sli:vləs] adj. безрукáвы: ***a sleeveless dress*** сукéнка без рукавóў

sleigh [sleɪ] – n. 1. вазлóк -кá *m.*; сáні *pl. only.* 2. дзіця́чыя сáнкі

– v.i. 1. éзьдзіць саня́мі, вазкóм, у вазкý. 2. катáцца на сáнках

sleighing ['sleɪɪŋ] n. 1. яздá саня́мі. 2. сáнная дарóга: ***The warm rain spoiled the sleighing*** Цёплы дождж папсавáў сáнную дарóгу

sleight [slaɪt] n. 1. умéльства *n.*, спрыт -у *m.* 2. спры́тная, хíтрая вы́хадка

sleight of hand 1. спрáўнасьць рук. 2. штýчкі фóкусьнікаў; жанглёрства *n.*

slender ['slendər] adj. 1. высóкі і шчýплы (*пра асóбу*); даўгí й тóнкі: ***a slender piece of wood*** даўгі й тóнкі кавáлак дрэ́ва. 2. невялíкі, малы́; недастаткóвы: ***a slender meal*** невялíкі пасíлак; ***a slender income*** недастаткóвы прыбы́так; ***a slender hope*** слабáя надзéя

slept [slept] v., *p.t. and p.p. of* **sleep**

slew [slu:] v., *p.t. of* **slay**

slice [slaɪs] – n. лýста *f.* (*хлéба, пірагá*); скрылĺь -я́ *m.*, скры́лік -а *m.* (*цыбýлі, каўбасы́*). 2. чáстка *f.*, удзéл -у *m.* 3. Sport. зрэ́заны ўдáр

– v.t. 1. рэ́заць, крóіць, накрóйваць; рэ́заць скрыля́мі. 2. дзялíць на чáсткі *абó* ўдзéлы. 3. Sport. зрэ́зана ўдáрыць

slicer ['slaɪsər] n. 1. прыла́да да кро́ення хле́ба, каўбасы́. 2. той, хто рэ́жа

slick [slɪk] – adj. 1. гла́дкі, бліскўчы, прыгла́джаны (*пра валасы́*). 2. Informal спры́тны; ху́ткі; хі́тры: ***a slick excuse*** хі́тры вы́крут
– adv. гла́дка; хі́тра; спры́тна

slid [slɪd] v., *p.t. and p.p. of* **slide**

– v.i. 1. кíснуць, скіса́ць (*пра малако́*). 2. кíснуць (*псава́цца, пра віно́, суп*) 3. быць не ў настрóі, рабíцца злаcьлíвым

• ***sour weather*** не́пагадзь

source [sɔ:rs] n. 1. вытóк -у *m.* (*ракí, ручая́*); крынíца *f.* 2. крынíца інфарма́цыі, ве́даў

south [sauθ] – n. пóўдзень пóўдня *m.*

– adj. паўдзённы, паўднёвы: ***a south wind*** паўдзённы ве́цер; ***the south window*** акнó, якóе выхóдзіць на пóўдзень

– adv. на пóўдзень: ***The journey south took two days*** Падарóжжа на пóўдзень заняло́ два дні

• ***South*** паўдзённая ча́стка кра́ю

• ***south of*** на паўдзённым баку́ мяжы́

south-bound [ˈsauθbaund] adj. які́ ру́хаецца ў паўдзённым кіру́нку

southeast [ˌsauθˈi:st] n. паўдзённы ўсхо́д

southeasterly [ˌsauθˈi:stərli] adj., adv. паўдзённа-ўсхо́дні; на паўдзённы ўсхо́д; з паўдзённага ўсхо́ду

southeastern [ˌsauθˈi:stərn] adj. паўдзённа-ўсхо́дні: ***a southeastern wind*** паўдзённа-ўсхо́дні ве́цер

southeastward(s) [ˌsauθˈi:stwərdz] adv. у паўдзённа-ўсхо́днім кіру́нку

souther [ˈsʌðər] n. паўдзённы ве́цер *або́* навальні́ца

southern [ˈsʌðərn] adj. паўдзённы: ***the southern side of a building*** паўдзённы бок будынку; ***southern countries*** паўдзённыя краі́

southerner [ˈsʌðərnər] n. жыха́р по́ўдня

South Pole Паўдзённы по́люс

southward [ˈsauθwərd] – adj. паўдзённы
– adv. на по́ўдзень
– n. паўдзённы кіру́нак, бок *або́* пункт

southward(s) [ˈsauθwərdz] adv. на по́ўдзень

southwest [ˌsauθˈwest] n. паўдзённы за́хад

southwesterly [ˌsauθˈwestərli] adj., adv. 1. на паўдзённы за́хад. 2. з паўдзённага за́ходу

southwestern [ˌsauθˈwestərn] adj. паўдзённа-захо́дні

southwestward [ˌsauθˈwestwərd] – adj. паўдзённа-захо́дні
– adv. на паўдзённы за́хад
– n. паўдзённы за́хад

souvenir [ˌsu:vəˈnɪr] n. па́мятка *f.*, па́мятны падару́нак, сувені́р -а *m.*

sovereign [ˈsɑ:vrən] – n. 1. улада́р -а́, мана́рх, сувэрэ́н -а *m.* (*каро́ль, цар, імпэра́тар, хан і г.д.*). 2. сувэрэ́н (*брыта́нская залата́я манэ́та*)
– adj. 1. сувэрэ́нны, незале́жны. 2. найвышэ́йшы, найбо́льшы. 3. даскана́лы: ***a sovereign cure for colds*** дасканалыя ле́кі ад прасту́ды

sovereignty [ˈsɑ:vrənti] n., pl. **-ties** 1. найвышэ́йшая ўла́да *або́* аўтарытэ́т. 2. ранг, ула́да й кампэтэ́нцыя ўладара́. 3. сувэрэ́ннасьць *f.*, сувэрэні́тэт *m.*

soviet [ˈsouviət] – n. саве́т -у *m.* (*у дачыне́ньні да былога́ СССР*): ***village soviets*** се́льскія саве́ты, сельсаве́ты; ***town soviets*** гарадзкія саве́ты, гарсаве́ты; ***Supreme Soviet*** Вярхо́ўны Саве́т
– adj. ***Soviet*** саве́цкі: ***the Soviet Union*** Саве́цкі Саю́з

sow I [sou] v.t. **sowed, sown** or **sowed, sowing** 1. се́яць, засе́йваць: ***He sows more wheat than oats*** Ён се́е пшані́цы больш, чым аўсá; ***The farmer sowed the field with oats*** Фа́рмэр засе́яў по́ле аўсо́м. 2. се́яць, расьсява́ць, раскіда́ць; пашыра́ць: ***to sow (the seeds of) dissention*** се́яць нязго́ду

sow II [sau] n. сьвіньня́, сьвінама́тка *f.*, паро́сная сьвіньня́

sower [ˈsouər] n. 1. се́йбіт -а *m.*, сяве́ц сяўца́ *m.* 2. се́ялка *f.*

sowing [ˈsouɪŋ] – n. сяўба́ *f.*, се́яньне, засява́ньне *n.*
– adj.: ***sowing time*** час сяўбы́

sown [soun] v., *p.p. of* **sow I**

soy [sɔɪ] or **soya** [ˈsɔɪə] esp. Brit. n., со́я *f.*

soybean [ˈsɔɪbi:n] n. со́евыя бабы́

space [speɪs] – n. 1. прасто́р -у *m.*, прасто́ра *f.*, абша́р, абся́г -у *m.* 2. ме́сца *n.*: ***We have plenty of space in our house*** У на́шым до́ме шмат ме́сца. 3. стаянка *f.*: ***a parking space*** паркава́льная стаянка. 4. ко́смас -у *m.*: ***outer space*** касьмічная прасто́ра. 5. праця́г ча́су: ***for the space of ten years*** на працягу́ дзесяці гадо́ў. 6. адсту́п, прабе́л -у *m.*
– v.t. разьдзяля́ць, аддзяля́ць, рабіць адсту́пы памі́ж сло́вамі: ***Space your words evenly when you write*** Пі́шучы, рабі́ ро́ўныя адсту́пы памі́ж сло́вамі

spaceman [ˈspeɪsmæn] n., pl. **-men** астрана́ўт -а *m.*; касмана́ўт -а *m.*

space rocket касьмі́чная раке́та

spaceship [ˈspeɪsʃɪp] n. касьмі́чны карабе́ль

spacious ['speɪʃəs] adj. 1. прасто́рны, вялі́кі; зьмяшча́льны, ёмісты. 2. вялі́зны, шыро́кі

spade I [speɪd] – n. рыдлёўка *f.*
– v.t. капа́ць рыдлёўкаю
• ***call a spade a spade*** называ́ць ра́чы сваі́мі імёнамі

spade II [speɪd] n. ві́ны, пікі (*у ка́ртах*)

spam [spæm] n. няпро́шаная і непажада́ная электро́нная по́шта, спам -у *m.*

span I [spæn] – n. 1. пя́дзя *f.* 2. адле́гласьць памі́ж апо́рамі, праме́жак, пралёт -у *m.*: ***the bridge in three spans*** мост у тры пралёты. 3. адра́зак ча́су: ***Some animals have a short lifespan*** Некато́рыя жывёлы жыву́ць ко́ратка. 4. разма́х -у *m.*: ***wing span*** разма́х кры́лаў. 5. дыяпазо́н -у *m.*
– v.t. 1. ме́раць пя́дзяй. 2. абхапі́ць руко́ю та́лію *або́* запя́сьце рукі. 3. ***to span a river with a bridge*** пабудава́ць мост праз раку́

span II [spæn] n. па́ра ко́ней, вало́ў

Spaniard ['spænjərd] n. гішпа́нец -ца *m.*, гішпа́нка *f.*

Spanish ['spænɪʃ] – adj. гішпа́нскі
– n. 1. гішпа́нцы *pl.* 2. гішпа́нская мо́ва

Spanish onion гішпа́нская цыбу́ля

spank I [spæŋk] – v.t. шлёпаць (*дзіця́*), лупцава́ць
– n. шлёпанец -ца, пляска́ч плескача́ *m.*

spanking ['spæŋkɪŋ] n. лупцо́ўка *f.*, лупцава́ньне *n.*

spare [sper] – v.t. 1. лі́таваць, шкадава́ць; зьлі́тавацца: ***He spared his enemy*** Ён зьлі́таваўся над сваі́м во́рагам. 2. берагчы́, ашчаджа́ць, шкадава́ць: ***We walked uphill to spare the horse*** Мы ішлі́ пад гару́, каб аблягчы́ць каня́. 3. абыхо́дзіцца без *чаго́*: ***Father couldn't spare the car, so John had to walk*** Ба́цька ня мог абысьці́ся бяз а́ўта, дык Янка му́сіў ісьці́ пехато́ю. 4. пакіда́ць: ***Spare some time for reading*** Пакінь кры́ху ча́су на чыта́ньне
– adj. 1. во́льны: ***spare time*** во́льны час. 2. запасны́, лі́шні: ***a spare tire*** запасна́я шы́на; ***spare money*** лі́шнія гро́шы. 3. худы́, хударля́вы
– n. запасны́ -о́га *m.*

spareribs ['sperɪbz] n., pl. сьвіна́я рабры́нка

spark [spɑ:rk] – n. 1. і́скра *f.* 2. про́бліск -у *m.*: ***a spark of light*** про́бліск сьвятла́. 3. Figur. ка́ліва *n.*: ***He had not a spark of interest*** Ён ня меў ні ка́ліва зацікаўле́ньня
– v.i. іскры́цца, дава́ць і́скры
– v.t. 1. запа́льваць і́скрай. 2. Figur. узбуджа́ць (*запа́л, акты́ўнасьць*)

sparkle ['spɑ:rkəl] – v.i. 1. іскры́цца: ***The fireworks sparkled*** Фаерво́ркі іскры́ліся. 2. зіхацэ́ць, зьзяць: ***The diamonds sparkled*** Дыя́манты зьзя́лі. 3. шыпе́ць, пе́ніцца
– n. 1. і́скра *f.* 2. бляск -у *m.* 3. бліскучасьць *f.*; жы́васьць, жва́васьць *f.*

sparkling ['spɑ:rklɪŋ] adj. 1. бліскучы, зіхатлі́вы. 2. шыпучы; іскры́сты: ***sparkling wine*** шыпу́чае віно́

spark plug ['spɑ:rkplʌg] 1. запа́льная сьве́чка. 2. Informal натхня́льнік, завада́тар

sparrow ['spærou] n. верабе́й -б'я́ *m.*

sparse [spɑ:rs] adj. 1. ра́дкі, раскі́нуты: ***sparse population*** ра́дкае жыха́рства. 2. недастатко́вы; бе́дны, мізэ́рны: ***a sparse diet*** мізэ́рнае харчава́ньне

sparsity ['spɑ:rsəti] n. ра́дкасьць *f.*

spasm ['spæzəm] n. спа́зма *f.*

spasmodic [spæz'mɑ:dɪk] adj. су́таргавы, спазматы́чны: ***a spasmodic cough*** спазматы́чны ка́шаль: ***spasmodic movements*** су́таргавыя ру́хі

spat [spæt] v., *p.p., p.t. of* **spit**

spatial ['speɪʃəl] adj. прасто́равы

spatter ['spætər] – v.t. 1. расплю́хваць: ***to spatter mud*** расплю́хваць гразь. 2. пасячы́, зрашаці́ць: ***Bullets spattered the wall*** Ку́лі зрашаці́лі сьцяну́. 4. Figur. абкі́дваць бало́там, гра́зьзю; узво́дзіць паклёп

– v.i. 1. расплю́хвацца: ***Rain spatters on the sidewalk*** Дождж расплю́хваецца на тратуа́ры
– n. ля́скат -у *m.*: ***a spatter of bullets*** град ку́ляў. 2. плю́скат -у *m.* (*дажджу́*). 3. пы́рскі; пля́мы ад пы́рскаў

spatula ['spætʃələ] n. лапа́тачка *f.*, шпа́тэлька -я *m.*

spawn [spɔ:n] – n. 1. ікра́ *f.* 2. вы́вадак -ка *m.* (*зь ікры́*); пло́йма *f.* 3. вы́радак -ка, вы́пладзень -ня *m.*; спараджэ́ньне *n.*
– v.i. 1. нераставаць, кла́сьці ікру́. 2. пладзі́цца, разво́дзіцца, размнажа́цца
– v.t. пладзі́ць (*пра людзе́й — грэ́бліва*), разво́дзіць

spawning season не́раст -у *m.*

spay [speɪ] v.t. абясплодж|ваць (*ко́тку або́ су́чку*)

speak [spi:k] v.i. **spoke, spoken** 1. гаварыць. 2. выступа́ць з прамо́вай, прамаўля́ць: ***Who is going to speak at the meeting?*** Хто бу́дзе прамаўля́ць на схо́дзе? 3. гаварыць, размаўля́ць: ***Do you speak French?*** Ці ты гаво́рыш па-францу́ску?
• ***so to speak*** так сказа́ць, так сказа́ўшы, так бы мо́віць
• ***speak for*** гаварыць ад *чыйго́* імя́, прадстаўля́ць *каго́*
• ***speak of*** гаварыць аб кім-чым
• ***speak out*** or ***up*** а) гаварыць гу́чна й выра́зна. б) гаварыць свабо́дна, нічо́га не замо́ўчваючы
• ***speak well for*** гаварыць прыхі́льна пра *каго́*

speaker ['spi:kər] n. 1. прамо́|вец -ўца *m.*, дакла́дчык -а *m.*; старшыня́ схо́ду. 2. гало́сьнік -а *m.*

Speaker of the House сьпі́кер -а *m.*

speaking ['spi:kɪŋ] – n. гаварэ́ньне, прамаўля́ньне *n.*
– adj. 1. які́ гаво́рыць, прамаўля́е. 2. выра́зны, вымо́ўны: ***speaking eyes*** вымо́ўныя во́чы

spear I [spɪr] – n. дзі́да, пі́ка *f.*
– v.t. прабіва́ць дзі́дай

spear II [spɪr] n. сьцябло́ *n.*, асьце́нь -я *m.*, асьцю́к -а́ *m.*, былі́нка *f.* (*травы́, збо́жжа*)

spearman ['spɪrmæn] n., pl **-men** дзіда-но́сец

spearmint ['spɪrmɪnt] n. мя́та *f.*

spear side мужчы́нская лі́нія ў ро́дзе

special ['speʃəl] adj. 1. адмысло́вы, спэцыя́льны. 2. асабліві, своеасабліві: ***of special interest*** асабліва зацікаўле́ньня. 3. э́кстраны, спэцыя́льны: ***special train*** спэцыя́льны цягні́к; ***special edition*** спэцыя́льнае выда́ньне

special delivery тэрмінова́я даста́ўка (*лісто́ў, тава́ру*)

specialist ['speʃəlɪst] n. спэцыялі́ст -а, адмысло́|вец -ўца *m.*

speciality [ˌspeʃi'ælətɪ] n., pl. **-ties** 1. адмысло́вы хара́ктар, адмысло́васьць, адме́тнасьць *f.* 2. спэцыя́льнасьць *f.*

specialize ['speʃəlaɪz] v.i. 1. спэцыялізава́цца. 2. рабі́ць (-ца) спэцыфі́чным; прыстасо́ўвацца; абмяжо́ўваць, звужа́ць

specially ['speʃəli] adv. адмысло́ва, спэцыя́льна; асабліва; незвыча́йна

specialty ['speʃəlti] n. 1. спэцыя́льнасьць *f.* 2. асаблівасьць *f.*

species ['spi:ʃi:z] n., pl. **-cies** Biol. від -у, гату́нак -ку *m.*
• ***the species*** род чалаве́чы

specific [spə'sɪfɪk] – adj. 1. канкрэ́тны: ***There was no specific reason for the quarrel*** Не было́ канкрэ́тнае прычы́ны для сва́ркі. 2. характэ́рны, уласьці́вы. 3. спэцыфі́чны. 4. Biol. ві́давы: ***specific difference*** ві́давая ро́зьніца
– n. спэцыфі́чны сро́дак (*лек*): ***Quinine is a specific for malaria*** Хінін — спэцыфі́чны сро́дак ад маля́рыі

specification [ˌspesəfɪ'keɪʃən] n. 1. спэцыфіка́цыя *f.* 2. дэталіза́цыя *f.*

specific gravity удзе́льная вага́

specific heat удзе́льная цеплыня́

specify ['spesəfaɪ] v.t. 1. дакла́дна вызнача́ць (*час, ме́сца*). 2. канкрэтызава́ць

specimen ['spesəmɪn] n. 1. экзэмпля́р -а́ *m.*, пры́клад -у *m.*, асо́біна *f.* 2. тып -а

m.: ***What a specimen!*** Што за тып! Ну й тып!; ***queer specimen*** дзіва́к -а́ *m.* 3. ана́ліз -у *m.*, про́ба *f.*

specious [ˈspi:ʃəs] adj. 1. зру́чна вы́думаны: ***The teacher saw through John's specious excuse*** Наста́ўнік распазна́ў Янкаў вы́думаны вы́крут. 2. до́брапрысто́йны, паказны́: ***a specious hypocrite*** до́брапрысто́йны крываду́шнік

speck [spek] – n. 1. пля́мка *f.*; кра́піна, кра́пінка *f.* 2. ча́стачка, крупінка *f.*: ***a speck of dust*** пыли́нка *f.*
– v.t. пля́міць

speckle [ˈspekəl] – n. кра́піна, кра́пінка *f.*: ***This hen is gray with white speckles*** Гэ́тая ку́рыца шэ́рая ў бе́лыя кра́пінкі
– v.t. зна́чыць кра́пінамі, пярэ́сьціць, сьпярэ́шчваць

speckled [ˈspekəld] adj. пярэ́сты, рабы́; у кра́піны: ***speckled hen*** пярэ́стая ку́рыца, ку́рка ра́бка

spectacle [ˈspektəkəl] n. 1. відо́вішча *n.* 2. публі́чны пака́з, выста́ва *f.* 3. Figur. пасьме́шышча *n.*: ***to make a spectacle of oneself*** зрабіць зь сябе́ пасьме́шышча

spectacles [ˈspektəkəlz] n. акуля́ры *pl. only*, пэнсне́ *n., indecl.*

spectacular [spekˈtækjələr] adj. ве́ліч-ны, імпаза́нтны; эфе́ктны

spectator [ˈspekteɪtər] n. глядач гледа-ча́ *m.*

spectral [ˈspektrəl] adj. 1. спэктра́льны. 2. пры́відны

spectrum [ˈspektrəm] – n., pl. **-tra** *or* **-trums**, Phys. спэктар -ру *m.*
– adj. спэктра́льны: ***spectral analysis*** спэктра́льны ана́ліз

speculate [ˈspekjəleɪt] v.i. 1. меркава́ць; разважа́ць. 2. уга́дваць. 3. спэкуля-ва́ць

speculation [ˌspekjəˈleɪʃən] n. 1. прыпу-шчэ́ньне, разважа́ньне *n.*; здага́дка, меркава́ньне *n.* 2. спэкуля́цыя *f.*: ***His speculations in stock made him poor*** Спэкуля́цыі на бі́ржы зрабі́лі яго́ бе́дным

speculative [ˈspekjəleɪtɪv] adj. 1. спэкуля-цы́йны, пабудава́ны на прыпушчэ́ньнях. 2. абстра́ктны. 3. рызыко́ўны

speculator [ˈspekjəleɪtər] n. спэкуля́нт -а *m.*

sped [sped] v., *p.t. and p.p. of* **speed**

speech [spi:tʃ] n. 1. мо́ва, гаво́рка *f.*: ***His native speech was Belarusian*** Яго́ная ро́дная мо́ва была́ белару́ская. 2. прамо́ва *f.*, сьпіч -у *m*: ***to make a speech*** вы́ступіць з прамо́вай; ***gift of speech*** дар красамо́ўства

speechless [ˈspi:tʃləs] adj. 1. анямо́лы: ***He was speechless with anger*** Ад зло́сьці ямý заняло́ мо́ву. 2. ці́хі, маўклі́вы: ***Her frown gave a speechless reply*** Нахмýраныя бро́вы бы́лі е́йным маўклі́вым адка́зам

speed [spi:d] – n. 1. шпа́ркасьць, ху́т-касьць *f.*, хутчыня́ *f.*: ***to gather speed*** пабо́льшваць ху́ткасьць, набіра́ць ху́ткасьці. 2. а) ход -у *m.*: ***The boys ran at full speed*** Хлапцы́ бе́глі по́ўным хо́дам. б) ***slow speed*** паво́льны ход. в) ***half speed*** сяро́дні ход
– v.i., **sped** or **speeded, speeding** 1. ху́тка ісьці́, е́хаць, імча́ць: ***The boat sped over the water*** Ло́дка імча́ла па вадзе́. 2. перавыша́ць дазво́леную ху́ткасьць
– v.t. прысьпе́шваць
• ***speed limit*** максыма́льна дазво́ле-ная ху́ткасьць; абмежава́ньне ху́т-касьці
• ***speed up*** а) падганя́ць. б) паска-ра́ць ху́ткасьць, прысьпе́шваць хаду́

speedily [ˈspi:dɪli] adv. сьпяша́ючыся, сьпе́хам, насьпе́х, на ху́ткую руку́; зь вялі́кай ху́ткасьцю

speeding [ˈspi:dɪŋ] n. язда́ з ху́ткасьцю бо́льшай за дазво́леную

speedy [ˈspi:di] adj. ху́ткі, шпа́ркі: ***speedy workers*** шпа́ркія рабо́тнікі; ***a speedy change*** ху́ткая зьме́на; ***speedy progress*** ху́ткі по́ступ

spell I [spel] v.t., **(-ll-)** or **spelt** 1. падава́ць сло́вы па лі́тарах. 2. піса́ць гра́матна: ***She cannot spell well*** Яна́ ня ўме́е

гра́матна піса́ць; ***How do you spell your name?*** Як пі́шацца ва́ша імя́?
• ***spell out*** а) падава́ць, чы́таць па лі́тарах. б) удакладня́ць, вытлума́чваць

spell II [spel] n. ча́ры *pl.*: ***to cast a spell on*** насла́ць ча́ры на *каго́*, зачарава́ць
• ***under a spell*** зачарава́ны

spell III [spel] n. 1. пры́ступ -у *m.*, каро́ткі пэры́яд ча́су: ***a spell of coughing*** or ***coughing spell*** пры́ступ ка́шлю; ***a spell of hot weather*** час гара́чага надво́р'я. 2. Informal часі́нка, хвілі́нка *f.*: ***rest for a spell*** адпачні́ хвілі́нку

spelling ['spelɪŋ] n. пра́вапіс -у *m.*, арфагра́фія *f.*; палі́тарнае чыта́ньне, вымаўле́ньне

spelt [spelt] v., *p.t. and p.p. of* **spell**

spend [spend] v.t. **spent** 1. выдаткó̆ўваць, тра́ціць: ***She spent ten dollars today*** Яна патра́ціла сёньня дзе́сяць доля́раў. 2. марнава́ць, тра́ціць: ***Don't spend any more time on that*** Не марну́й больш ча́су на гэ́та. 3. правóдзіць, ба́віць час: ***to spend a day at the beach*** праве́сьці дзень на пля́жы. 4. марнатра́віць

spendthrift ['spendθrɪft] – n. марнатра́лвец -ўца *m.&f.*; манта́ч -а́ *m.*, манта́чка *f.*
– adj. марнатра́ўны

spent [spent] v., *p.t., p.p. of* **spend.** adj. 1. ужы́ты, скарыста́ны: ***spent gas*** адпрацава́ны газ. 2. змардава́ны, змóраны, загна́ны: ***a spent horse*** загна́ны конь; ***a spent swimmer*** змóраны плыве́ц

sperm [spɜ:rm] n. спэ́рма *f.*

sphere [sfɪr] n. 1. ку́ля, сфэ́ра *f.* (*зямна́я*). 2. сфэ́ра, ні́ва *f.*, по́ле дзе́йнасьці: ***sphere of influence*** сфэ́ра ўплы́ву

spherical ['sferɪkəl] adj. сфэры́чны

sphinx [sfɪŋks] n., pl. **sphinxes** сфінкс -а *m.*

spice [spaɪs] – n. 1. спэ́цыі, пе́рнасьці *pl.*, прыпра́ва *f.*: ***Pepper, cinnamon and cloves are spices*** Пе́рац, кары́ца, гвазьдзі́ка — гэ́та пе́рнасьці. 2. піка́нтнасьць *f.* 3. адце́ньне *n.*, прысмак -у *m.*, прыме́шка *f.*
– v.t. 1. прыпраўля́ць. 2. дадава́ць піка́нтнасьці, ціка́васьці

spicery ['spaɪsəri] n., pl. **-eries** 1. прыпра́вы *pl.* 2. во́стры смак; рэ́зкі, во́стры пах

spick-and-span [ˌspɪkən'spæn] adj. аха́йны, акура́тны; чы́сты, чысьцю́сенькі, чысьцю́ткі; элега́нтны: ***a spick-and-span room*** чысьцю́сенькі пако́й

spicy ['spaɪsi] adj. 1. пе́рны, во́стры (*пра смак*); во́стры, рэ́зкі (*пах*), духмя́ны; прыпра́ўлены (*пра стра́ву*). 2. жывы́, гара́чы: ***spicy conversation*** жыва́я, гара́чая гу́тарка. 3. піка́нтны, салёны, не зусі́м прысто́йны: ***Some of his stories were a bit spicy*** Некато́рыя зь яго́ных апавяда́ньняў былі́ крыху́ салёныя

spider ['spaɪdər] n. 1. паву́к -а́ *m.* 2. трыно́жка *f.*

spider web павуці́на *f.*, павуці́ньне, павучы́ньне *n.*

spigot ['spɪgət] n. 1. шпунт -а *m.*, затычка *f.* 2. кран -а *m.*

spike I [spaɪk] – n. 1. болт балта́, шпень шпяня́, кастыль -я́ *m.* 2. шып -а *m.* 3. Sport чаравікі з шыпа́мі
– v.t. 1. злуча́ць, змацо́ўваць балта́мі. 2. набіва́ць шы́пы (*на падэ́швы*). 3. спыня́ць (*пля́ны, намага́ньні*). 4. Informal рабіць ярша́, дадава́ць алькаго́лю (*да напо́ю*). 5. Sport зраза́ць (*мяч*)

spike II [spaɪk] n. ко́лас -а *m.*

spike heel высо́кі то́нкі абца́с, шпі́лька *f.*

spill I [spɪl] – v.t. **spilled** or **spilt** 1. а) расплю́хваць, разьліва́ць: ***to spill milk*** разьлі́ць малако. б) рассыпа́ць: ***to spill salt*** рассы́паць соль. 2. пралі́ва́ць (*кроў*). 3. Informal скіда́ць, вывальваць, выварóчваць (*з каня́, во́за*). 4. Sl. выдава́ць (*сакрэ́т*)
– v.i. 1. разьліва́цца, расплю́хвацца: ***Water spilled from the pail*** Вада́ расплю́халася зь вядра́; рассыпа́цца. 2. зва́львацца; выварóчвацца

spill II [spɪl] n. падпа́лка, лучы́на, трэ́ска *f.*

spilt [spɪlt] v., *p.t., p.p. of* **spill I**

spin [spɪn] – v.t. **spun, spinning** 1. пра́сьці, снава́ць: ***A spider spins a web*** Павук сну́е павуці́ну. 2. круці́ць: ***to spin a top*** запуска́ць ваўчо́к. 3. склада́ць (*пе́сьні, ве́ршы*), ве́сьці апавяда́ньне. 4. Sl. тлума́чыць на сваю́ карысьць

– v.i. 1. круці́цца. 2. імча́цца

– n. 1. прадзе́ньне *n.* 2. кручэ́ньне *n.* 3. імча́ньне *n.* 4. Av. што́пар -у *m.* 5. прае́здка *f.*: ***We went for a spin*** Мы пае́халі пракаці́цца. 6. Sl. тлумачэ́ньне на сваю́ карысьць

spinach ['spɪnɪtʃ] n. шпіна́т -у *m.*

spinal ['spaɪnəl] – adj. хрыбе́тны, сьпі́нны

– n., Informal абязбо́леньне хрыбе́тніка

spinal column хрыбе́тнік -а *m.*, хрыбе́т -та́ *m.*

spinal cord сьпі́нны мозг

spindle ['spɪndəl] n. 1. верацяно́ *n.* 2. ме́рка пра́дзіва

spine [spaɪn] n. 1. хрыбе́тнік -а *m.*, хрыбе́т -та́ *m.* 2. Figur. адва́га, рашу́часьць *f.* 3. це́рнь -я *m.*, калю́чка *f.* 4. Zool. го́лка *f.* (*у во́жыка*). 5. сьпі́нка кні́гі

spineless ['spaɪnləs] adj. бесхрыбе́тны; бесхара́ктарны

spinning ['spɪnɪŋ] n. 1. прадзе́ньне *n.* 2. сьпі́нінг -а *m.*

spin-off ['spɪnɔ:f] n. пабо́чны вы́нік

spinster ['spɪnstər] n. 1. пра́льля *f.* 2. стара́я дзе́ўка

spiny ['spaɪnɪ] adj. 1. калю́чы, цярно́вы: ***a spiny cactus*** калю́чы ка́ктус; ***a spiny porcupine*** калю́чы дзікабра́з. 2. Figur. цяжкі́, турбо́тны; цярні́сты

spiral ['spaɪrəl] – n. сьпіра́ль *f.*

– adj. сьпіра́льны: ***a spiral spring*** сьпіра́льная спружы́на

spirant ['spaɪrənt] n., Gram. фрыкаты́ўны зы́чны

spire I [spaɪr] – n. 1. сьпіча́к -а́ *m.*; шпіль -я *m.* (*ве́жы, хво́і*). 2. пік -а *m.*

– v.i. вы́сіцца, уздыма́цца ўго́ру

spire II [spaɪr] n. скру́тлак -ка *m.*, сьпіра́ль *f.*

spirit ['spɪrɪt] – n. дух -у *i* -а *m.*, душа́ *f.*: ***spirit of the law*** дух пра́ва; ***in (the) spirit*** у ду́ху, ду́хам: ***He is present in spirit*** Ён душо́ю тут

– v.t. 1. натхня́ць; узьніма́ць (*настро́й*); падбадзёрваць

• ***the Holy Spirit*** Сьвяты́ Дух

• ***Great Spirit*** Вялі́кі Дух (*у індзе́йцаў*)

• ***spirits,*** pl. 1. хара́ктар-у *m.*, натура *f.*; настро́й -ю *m.*: ***in high spirits*** у прыўзьня́тым настро́і; ***in low spirits*** or ***out of spirits*** прыгне́чаны, марко́тны. 2. алькаго́льныя напо́і, тру́нкі *pl.*

spirited ['spɪrɪtɪd] adj. 1. ажы́ўлены, ціка́вы, жывы́. 2. натхнёны: ***spirited speech*** натхнёная прамо́ва

spiritism ['spɪrɪtɪzəm] n. сьпірыты́зм -у *m.*

spiritless ['spɪrɪtləs] adj. без жыцьця́, без настро́ю, вя́лы; нясьме́лы

spiritual ['spɪrɪtʃuəl] – adj. 1. духо́вы, духо́ўны. 2. рэлігі́йны, царко́ўны

– n. сьпірыча́л -у *m.* (*нэгрыцця́нская рэлігі́йная пе́сьня*)

spiritualism ['spɪrɪtʃuˌlɪzəm] n. сьпірытуалі́зм -у *m*, сьпірыты́зм -у *m.*

spirituous ['spɪrɪtʃuəs] adj. 1. алькаго́льны. 2. дыстылява́ны, гна́ны (*пра алькаго́ль*)

spit I [spɪt] **spat** or **spit, spitting** – v.t. 1. плява́ць. 2. выплёўваць

– v.i. 1. плява́цца. 2. трашчэ́ць, шыпе́ць (*пра сьве́чку, аго́нь*); пы́рхаць, фы́ркаць (*пра ката́*). 3. церушы́ць (*пра дро́бны сьнег*), імжэ́ць (*пра дождж*)

– n. 1. сьліна́ *f.*; пля|во́к -ўка́ *m.* 2. плява́ньне *n.* 3. дро́бны дождж або́ сьнег

• ***spitting image*** вы́літая ко́пія

spit II [spɪt] – n. 1. ражо́н -на́ *m.* (для сма́жаньня мя́са). 2. каса́ *f.*, мыс -у *m.*

– v.t. 1. натыка́ць, наткну́ць (на ражо́н). 2. прабіва́ць, прабі́ць; пракало́ць

spite [spaɪt] – n. злосьць, зло́снасьць, зларадна́сьць *f.*

– v.i. рабі́ць на злосьць каму́; дакуча́ць, дапяка́ць
• ***in spite of*** нягле́дзячы, не зважа́ючы на каго́-што

spiteful ['spaɪtfəl] adj. зло́сны, злаcьлі́вы; злапо́мны

spittle ['spɪtəl] n. сьлі́на *f.*; пля|во́к -ўка́ *m.*; харкавіньне *n.*, харк -у *m.*

splash [splæʃ] – v.t. 1. распы́рскваць (*ваду́, гразь*). 2. абдава́ць, аблі́ва́ць ваго́ю, пы́рскаць: ***The waves splashed on the beach*** Хва́лі распы́рскваліся на пля́жы. 3. замо́чваць, абпы́рскваць, захлю́пваць
– v.i. 1. шлёпацца, бо́ўтацца, хлю́пацца. 2. хлю́паць, хлёпаць: ***He splashed across the brook*** Ён прахлю́паў праз ручаі́
– n. 1. хлюпата́ *f.* 2. пы́рсканьне, распы́рскваньне, плю́ханьне *n.* 3. пы́рска, кля́кса *f.* 4. плёскат, пляск -у *m.*: ***to fall into water with a splash*** уваліцца ў ваду́ з плёскатам. 5. пля́ма *f.* : ***She has splashes of grease on her dress*** На е́йнай суке́нцы былі́ пля́мы тлу́шчу
• ***make a splash,*** Informal зрабі́ць сэнса́цыю

splatter ['splætər] – v.i. хлю́паць
– v.t. мясі́ць гразь; расплю́хваць
– n. хлюпата́ *f.*

spleen [spli:n] n. 1. Anat. селязёнка, каса́ *f.* 2. благі́ настро́й; злосьць *f.* 3. хандра́ *f.*

splendid ['splendɪd] adj. 1. бліскуўчы: ***a splendid victory*** бліскуўчая перамо́га. 2. пы́шны, велікапы́шны; цудо́ўны: ***a splendid palace*** велікапы́шны пала́ц; ***a splendid sunset*** цудо́ўны за́хад со́нца. 3. ве́льмі до́бры; выда́тны: ***a splendid chance*** выда́тная нагода́

splendor, Brit. **splendour** ['splendər] n. 1. бляск -у *m.* 2. пы́шнасьць, велікапы́шнасьць *f.*; раско́ша *f.*, шык -у *m.*, по́мпа *f.*

splint [splɪnt] n. 1. лубкі *pl.*, шы́на *f.* (*для зламанай ко́сьці*). 2. луб -у *m.*

splinter ['splɪntər] – n. стрэ́мка *f.*; дро́бны во́стры кава́лачак, аско́л|ак -ка *m.*: ***The mirror broke into splinters*** Лю́стра разьбі́лася на дро́бныя кава́лачкі
– v.t. расьсяка́ць, расшчапля́ць, кало́ць (*дро́вы*)
– v.i. адступа́цца, адшчапля́цца, аддзяля́цца

splinter group *or* **party** адшчапе́нцы, раско́льнікі *pl.*

split [splɪt] – v.t. **split, splitting** 1. расшчапля́ць. 2. разьбіва́ць; разьдзяля́ць (*на ча́сткі*), дзяліць: ***to split the profits*** падзяліць прыбы́ткі
– v.i. дзялі́цца на ро́зныя гру́пы, па́ртыі
– n. 1. разьбіцьцё *n.*, раско́л -у *m.* (*у арганіза́цыі, па́ртыі*). 2. расшчэ́піна, раско́ліна, шчы́ліна *f.*
– adj. расшчэ́плены; разьбі́ты, падзе́лены
• ***splits*** шпага́т -у *m.* (*у гімна́стыцы*)

splitting ['splɪtɪŋ] adj. які́ адшчэ́пліваецца *або́* расшчэ́пліваецца
• ***splitting headache*** галава́ трашчы́ць (*ад бо́лю*)

splotch [splɑ:tʃ] – n. бру́дная пля́ма
– v.t. запы́рскваць, заплёхваць

spoil [spɔɪl] – v.t. 1. шко́дзіць, псава́ць. 2. распушча́ць; разбэ́шчваць, расьпе́шчваць (*дзяцёй*). 3. кра́сьці; рабава́ць
– v.i. псава́цца: ***The fruit spoiled*** Садавіна́ сапсава́лася
• ***spoils*** ваенныя трафэі

spoke I [spouk] v.i., *p.t. of* **speak**

spoke II [spouk] n. 1. сьпі́ца *f.* (*ко́ла*). 2. папярэ́чка *f.*, прыстýпка *f.* (*драбі́ны*)
• ***put a spoke in a wheel*** ста́віць па́лкі ў ко́лы

spoken ['spoukən] – v., *p.p. of* **speak**
– adj. ска́заны: ***the spoken word*** ска́занае сло́ва

spokesman ['spousmən] n., pl.**-men** прэ́савы прадстаўні́к, выка́зьнік -а *m.* (*пагля́даў, стано́вішча*)

sponge [spʌndʒ] – n. гу́бка *f.*

– v.t. 1. выціра́ць гу́бкай. 2. уця́гваць, убіра́ць
• ***sponge on*** жыць за чужы́ кошт
sponge bath абціра́ньне, абмыва́ньне
sponger ['spʌndʒər] n. 1. той, што зьбіра́е гу́бкі. 2. Informal дармае́д, нахле́бнік -а *m.*
spongy ['spʌndʒi] adj. 1. губча́ты, губкава́ты: ***spongy dough*** пы́шнае це́ста. 2. зь дзі́ркамі, дзіра́вы
sponsor ['spɑ:nsər] – n. 1. паруча́льнік -а, апяку́н апекуна́ *m.* 2. спо́нсар -а, дабрадзе́й -я *m.* 3. хро́сны ба́цька, хро́сная ма́ці
– v.t. падтры́мваць (*асабліва грашы́ма*)
sponsorship ['spɑ:nsərʃɪp] n. 1. апяку́нства *n.* 2. фінансава́ньне *n.*
spontaneous [spɑ:n'teɪniəs] adj. 1. адво́льны, спанта́нны: ***spontaneous cheers*** спанта́нныя во́клічы. 2. самаадво́льны, стыхі́йны
spontaneous combustion самаўзгара́льнасьць *f.*
spook [spu:k] n., Informal здань *f.*, прывід -у *m.*
spool [spu:l] – n. шпу́ля, шпу́лька *f.*; цэ́ўка *f.*
– v.t. навіва́ць (*на шпу́льку*); сука́ць (*цэ́ўку*)
spoon [spu:n] – n. лы́жка, лы́жачка *f.*
– v.t. чэ́рпаць лы́жкаю
• ***born with a silver spoon in one's mouth*** наро́джаны ў кашу́лі, наро́джаны шчасьлі́вым
sporadic [spə'rædɪk] adj. 1. нерэгуля́рны, спарады́чны. 2. паасо́бны, адзі́нкавы: ***sporadic cases of scarlet fever*** паасо́бныя выпа́дкі шкарлятыны
sporadically [spə'rædɪkəli] adv. тут і там; у ро́зных ме́сцах; тады́-сяды́, калі́-нікалі́; паасо́бку; спарады́чна
spore [spɔ:r] n., Biol. спо́ра *f.*
sport [spɔ:rt] – n. 1. спорт -у *m.* 2. Informal до́бры хло́пец
– v.i. 1. забаўля́цца, гуля́ць. 2. папі́свацца, франці́ць
– adj. спартыўны, спарто́вы
• ***Good sport!*** Малайчы́на!
• ***in*** or ***for sport*** жа́ртам, для заба́вы; дзе́ля сьме́ху
sporting ['spɔ:rtɪŋ] adj. 1. спартыўны, спарто́вы. 2. Informal рызыко́ўны. 3. ро́ўны, адно́лькавы: ***All teams had a sporting chance at the trophy*** Усе́ кама́нды ме́лі адно́лькавы шанц на трафэ́й
sports car спарто́вы аўтамабі́ль
sportscast ['spɔ:rtskæst] n. спарто́вая перада́ча
sport shirt спарто́вая кашу́лька
sportsman ['spɔ:rtsmən] n., pl. **-men** 1. ама́тар спо́рту (*паляўні́чы, рыба́к*). 2. спартсме́н -а *m.* 3. рызыка́нт -а *m.*
sportsmanlike ['spɔ:rtsmənˌlaɪk] adj. прысто́йны, высакаро́дны (*у спабо́рніцтвах*)
sportsmanship ['spɔ:rtsmənʃɪp] n. 1. спра́ўнасьць да спо́рту. 2. прысто́йнасьць у спо́рце
sportswear ['spɔ:rtswer] n. спарто́вая во́пратка
sportswoman ['spɔ:rtsˌwʊmən] n. спарто́ўка, спартсме́нка *f.*
sporty ['spɔ:rti] adj. 1. хва́цкі, зухава́ты, уда́лы. 2. фарсі́сты
spot [spɑ:t] – n. 1. пля́ма, пля́мка *f.*: ***a spot of ink*** чарні́льная пля́ма. 2. га́ньба *f.*; хі́ба, зага́на *f.*: ***His character is without a spot*** У яго́ беззага́нны хара́ктар. 3. кра́пінка, кра́пка *f.*: ***a blue tie with white spots*** сі́ні га́льштук зь бе́лымі кра́пінкамі. 4. мясьці́на *f.*; ме́сца *n.*: ***From this spot you can see the ocean*** З гэ́тага ме́сца мо́жна ба́чыць акія́н
– v.t. (**-tt-**) 1. пля́міць. 2. га́ньбіць. пля́міць (*рэпута́цыю*). 3. ста́віць расстаўля́ць, раскі́дваць. 4. Informa вылуча́ць; заўважа́ць: ***The teache spotted every mistake*** Наста́ўнік заўва́жыў ко́жную памы́лку
• ***in spots*** ме́сцамі
• ***it hit the spot,*** Informal прыйшло́ся да гу́сту, задаво́ліла

• ***on*** or ***upon the spot*** а) тут жа, на ме́сцы. б) адра́зу, за́раз жа. в) Sl. у кло́паце, у цяжкі́м стано́вішчы
• ***spot answer*** гато́вы адка́з

spot check вы́барачная праве́рка

spotless ['spɑ:tləs] adj. чысьцю́ткі, незапля́млены; беззага́нны

spotlight ['spɑ:tlaɪt] n. 1. пражэ́ктар -а *m.* 2. цэнтар ува́гі: ***to be in the spotlight*** быць у цэ́нтры ўва́гі

spotted ['spɑ:təd] adj. 1. папля́млены. 2. пярэ́сты, пля́місты: ***a spotted cow*** пярэ́стая каро́ва. 3. запля́млены, зга́ньблены, абняслаўлены: ***a spotted reputation*** запля́мленая рэпута́цыя

spouse [spaʊs] n. сужэ́нец -ца *m.*; муж -а *m. або́* жо́нка *f.*

spout [spaʊt] – v.t. пуска́ць струме́нь: ***A whale spouts water when it breathes*** Кіт выпуска́е струме́нь вады́, калі́ ды́хае
– v.i. бі́ць струме́нем, лі́цца цурко́м, цурчэ́ць: ***Water spouted from a break in the pipe*** Вада́ бі́ла струме́нем зь дзі́ркі ў трубе́
– n. 1. струме́нь -я *m.* 2. ры́на *f.* (*для сьцёку*). 3. дзю́бка *f.*; ры́лца *n.* (*пля́шкі*). 4. Zool. ды́хальная адту́ліна (*у кіта́*)
• ***up the spout,*** Sl. а) закла́дзены (*у лямба́рд*). б) дове́дзены да руіны

sprain [spreɪn] – v.t. расьця́гваць (*зьвя́зкі, сухажы́лькі*)
– n. расьцяжэ́ньне *n.* (*зьвя́зак, сухажы́льляў*)

sprang [spræŋ] v.i., *p.t. of* **spring**

sprawl [sprɔ:l] – v.i. 1. распасьціра́цца. 2. ляжа́ць *або́* сядзе́ць разваліўшыся, разваліцца. 3. піса́ць вялі́кім размашыстым по́чыркам
– n. 1. распасьцёртасьць *f.* 2. развалістасьць *f.*

spray I [spreɪ] – n. 1. пы́рскі *pl.* 2. спрэй -ю *m.*, ва́дкасьць для пульвэрыза́цыі. 3. ***a spray gun*** пульвэрыза́тар, распыля́льнік, абпы́рскваль нік -а *m.* – v.t. 1. пы́рскаць, абпы́рскваць; крапі́ць, пакрапі́ць. 2. распыля́ць. 3. абсыпа́ць: ***to spray the enemy with bullets*** абсы́паць во́рага ку́лямі

spray II [spreɪ] n. сьцябліна *f.*, мала́я галі́нка: ***a spray of lilacs*** галі́нка бэ́зу; ***a spray of berries*** сьцябліна я́гадніку

sprayer ['spreɪər] n. пульвэрыза́тар, распыля́льнік, абпы́рскваль нік -а *m.*

spread [spred] – v.t. **spread, spreading** 1. расьсьціла́ць. 2. распасьціра́ць: ***to spread one's arms*** шыро́ка раскі́нуць ру́кі. 3. расклада́ць, адклада́ць, расьця́гваць: ***to spread a shipment over two months*** разлажы́ць даста́ўку тава́ру на два ме́сяцы. 4. пашыра́ць, шы́рыць (*ідэ́і, нави́ны, чу́ткі*). 5. ма́заць: ***She spreads each slice with butter*** Ко́жную лу́стачку яна́ ма́жа ма́слам. 6. накрыва́ць: ***to spread the table*** накры́ць стол
– v.i. 1. ляжа́ць, далёка праця́гвацца *або́* расьця́гвацца, раскі́нуцца: ***Fields of corn spread out before us*** Прад на́мі раскі́нуліся жытнёвыя ні́вы. 2. разыхо́дзіцца, пашыра́цца, распаўсю́джвацца: ***The sickness spread rapidly*** Хваро́ба ху́тка пашыра́лася. 3. кла́сьціся: ***This paint spreads evenly*** Гэ́тая фа́рба ро́ўна кладзе́цца. 4. разго́ртвацца; раскрыва́цца
– n. 1. а) разма́х -у *m.* (*кры́лаў пту́шкі*). б) расьця́жнасьць *f.*: ***the spread of elastic*** расьця́жнасьць гу́мкі. 2. распаўсю́джваньне, пашырэ́ньне *n.*: ***to fight the spread of an infection*** змага́цца з пашырэ́ньнем зара́зы. 3. шыр -ы *f.*, прасьця́г, прасто́р -у *m.*: ***a great spread of green fields*** вялі́кі прасьця́г зялёных палёў. 4. абру́с -а *m.*; по́сьцілка *f.* (*на ло́жак*). 5. ро́зьніца ў цане́ ку́плі й про́дажу

spreadsheet ['spredʃi:t] n., Comput. табліца *f.*

spree [spri:] – n. 1. свавольства *n.*, вясёлая гуля́нка. 2. вы́піўка, папо́йка *f.*
– v.i. гуля́ць

sprig [sprɪg] n. 1. па́растак, ато́жылак -ка *m.*, гали́нка *f.* 2. арна́мэнт *або́* ўзо́р у вы́глядзе гали́нкі. 3. малады́ чалаве́к; юна́к -а́ *m.*, падле́т|ак -ка *m.* 4. ато́жылак, нашча́д|ак -ка *m.* (*жартаўлі́ва*)

sprightly ['spraɪtli] adj. жывы́, ціка́вы, займа́льны; жва́вы, вясёлы

spring [sprɪŋ] – v.i. **sprang** or **sprung, sprung, springing** 1. уско́кваць, ху́тка ўстава́ць: ***The boy sprang to his feet*** Хло́пец уско́чыў на но́гі. 2. пераско́кваць: ***to spring over a fence*** пераско́чыць праз плот. 3. узвыша́цца: ***to spring into fame*** узвы́сіцца да сла́вы. 4. браць пача́так; расьці́: ***Plants sprang up from the seeds we planted*** Расьлі́ны вы́расьлі з насе́ньня, яко́е мы насе́ялі. 5. пахо́дзіць ад *каго́*. 6. біць; сы́пацца: ***Sparks sprang from the fire*** Іскры сы́паліся ад агню́. 7. паўстава́ць, зьяўля́цца: ***New towns are springing up*** Паўстаю́ць но́выя гарадкі́

– n. 1. скок, падско́к -у *m.*: ***a spring over the fence*** скок праз плот. 2. спружы́на *f.*: ***Beds have wire springs*** Ло́жкі ма́юць драцяны́я спружы́ны. 3. пру́ткасьць, спружы́ністасьць, эластычнасьць *f.* 4. вясна́ *f.* 5. крыні́ца *f.* 6. пача́т|ак -ку *m.*; прычы́на *f.* 7. раско́ліна, трэ́шчына, расшчэ́піна *f.*; вы́гін -у *m.*

– adj. 1. спружыно́вы, спружы́нны. 2. веснавы́, вясно́вы, вясьня́ны. 3. крыні́чны: ***spring water*** крыні́чная вада́

• ***spring a leak*** дава́ць це́чу, пацячы́

• ***spring a lock*** адчыні́ць замо́к

• ***spring a surprise*** зрабі́ць неспадзе́ўку

springy ['sprɪŋi] adj. пру́гкі, спружы́ністы; гну́ткі

sprinkle ['sprɪŋkəl] – v.t. 1. абсыпа́ць, насыпа́ць. 2. крапі́ць; пы́рскаць, абпы́рскваць

– v.i. кра́паць, пы́рскаць (*пра малы́ дождж*), імжы́ць

– n. 1. кра́паньне, пы́рсканьне, абсыпа́ньне, насыпа́ньне *n.* 2. дро́бны до́жджык; імжа́ *f.*

sprinkler ['sprɪŋklər] n. 1. спы́рсквальнік, паліва́льнік -а *m.* 2. крапі́ла *n.*

sprint [sprɪnt] – v.i. бе́гчы на каро́ткую дыста́нцыю

– n. Sport спрынт -у *m.*

sprite [spraɪt] n. эльф -а *m.*, фа́я *f.*

sprout [spraʊt] – v.i. 1. узыхо́дзіць; пуска́ць па́расткі: ***Seeds sprout*** Насе́ньне прараста́е. 2. распуска́цца: ***Buds sprout in the spring*** Пупы́шкі распуска́юцца ўве́сну. 3. ху́тка, шпа́рка разьвіва́цца

– n. 1. па́раст|ак, ато́жыл|ак -ка *m.* 2. малы́ хлапе́ц

• ***sprouts*** брусэ́лька *f.* (*капу́ста*)

spruce I [spru:s] n. 1. е́лка, яли́нка *f.* 2. е́льнік -у *m.*

spruce II [spru:s] – adj. аха́йны, эле-га́нтны.

– v.i. убіра́цца, выстро́йвацца

sprung [sprʌŋ] v., *p.t. p.p. of* **spring**

spry [spraɪ] adj. жва́вы, руха́вы, шпа́ркі; увішны́, спры́тны, паваро́тлівы

spume [spju:m] – n. пе́на *f.*, шум, на́кіп -у *m.*

– v.i. пе́ніцца

spumous ['spju:məs] or **spumy** ['spju:mi] adj. пакры́ты пе́най; пе́ністы

spun [spʌn] v., *p.t., p.p. of* **spin**

spur [spɜ:r] – n. 1. шпо́ра *f.* 2. сты́мул -у *m.*, падахво́чваньне *n.* 3. адро́ст|ак -ка *m.*, адгалінава́ньне *n.*: ***cock's spurs*** пе́ўневы шпо́ры; ***a spur of the railway*** адгалінава́ньне чыгу́нкі, ве́тка *f.*

– v.t. 1. шпо́рыць, прышпо́рваць. 2. пабуджа́ць, заахво́чваць, дадава́ць адва́гі, падбадзёрваць

• ***on the spur of the moment*** адра́зу, умо́мант

spurious ['spjʊriəs] adj. падро́блены, фальшы́вы: ***a spurious coin*** фальшы́вая манэ́та; ***a spurious document*** падро́блены дакумэ́нт

spurn ['spɜ:rn] – v.t. 1. адмаўля́цца з пага́рдай; пага́рдліва адкіда́ць. 2. пі-ха́ць, адпі́хваць нагóю

– v.i. праці́віцца, супраці́ўля́цца; мо́цна пратэстава́ць
– n. 1. пага́рдлівая адмо́ва; пага́рдлівае ста́ўленьне. 2. удар -у *m.*, вы́сьпят|ак -ка *m.*

sputter ['spʌtər] – v.i. 1. шыпе́ць, трашча́ць (*пра аго́нь*), сквірча́ць (*пра сква́ркі*). 2. пы́рскаць, плява́цца, выплёўваць. 3. лапата́ць
– n. 1. шыпе́ньне *n.*, трэ́скат -у *m.*; сквірча́ньне *n.* 2. лапата́ньне *n.*

sputum ['spju:təm] n., pl. **-ta** 1. сьлі́на *f.* 2. фле́гма *f.*, харкавіньне *n.*

spy [spaɪ] – n., pl. **spies** 1. шпіён -а *m.* 2. шпег -а *m.*, шпік -а́ *m.*; та́йны аге́нт
– v.i. сачы́ць, назіра́ць, разьве́дваць. 2. шпегава́ць; шпіёніць

spyglass ['spaɪglæs] n. падзо́рная трубá

squabble ['skwɑ:bəl] – n. сва́рка, спрэ́чка *f.*, бу́ча *f.*: ***children's squabbles*** дзіця́чыя крыклівыя сва́ркі
– v.i. сварыцца, спрача́цца: ***I won't squabble over a nickel*** За дро́бязь ня бу́ду сварыцца; За ану́чу ня бу́ду ўздыма́ць бу́чу

squad [skwɑ:d] n. 1. аддзе́л -у *m.*, кама́нда, гру́па, брыга́да *f.* 2. Milit. аддзе́л жаўне́раў, разьлі́к -у *m.*

squad car дыжу́рная паліцэ́йская машы́на

squadron ['skwɑ:drən] n. 1. эска́дра караблёў, самалётаў. 2. эскадрон -у *m.*; кавалерыі́йскі дывізіён. 3. эскадры́льля *f.* 4. гру́па *f.*

squall I [skwɔ:l] n. 1. шквал -у *m.*, віхо́р ві́хру *m.* 2. Informal кло́паты *pl.*, бядá *f.*

squall II [skwɔ:l] – v.i. 1. крычэ́ць, гарла́ніць, гарлапа́ніць. 2. вішчэ́ць: ***The baby squalled*** Дзіцё вішчэ́ла
– n. 1. крык -у *m.*, гарла́ньне *n.* 2. віск -у *m.*, вішчэ́ньне *n.*

squally ['skwɔ:li] adj. 1. бу́рны: ***squally weather*** бу́рнае надво́р'е. 2. пары́вісты (*пра ве́цер*). 3. Informal пагро́зьлівы; неспако́йны, трыво́жны

squander ['skwɑ:ndər] v.t. растра́чваць; марнатра́віць, ма́рна тра́ціць, прагу́льваць (*час, сі́лы*)

squanderer ['skwɑ:ndərər] n. манта́ч -а́, гуля́к|а -і, марнатра́|вец -ўца *m.*

square [skwer] – n. 1. Geom. квадра́т -а *m.* 2. кварта́л -а *m.*: ***The large factory fills a whole square*** Вялі́кая фа́брыка займа́е цэ́лы кварта́л. 3. сквэр -у *m.* 4. пло́шча *f.* 5. Math. квадра́т лі́ку, лік у друго́й ступе́ні: ***16 is the square of 4*** 4 у квадра́це бу́дзе 16
– adj. 1. квадра́тны: ***a room five meters square*** пако́й на пяць квадра́тных мэ́траў. 2. прастаку́тны: ***a square corner*** про́сты кут. 3. справядлі́вы, сумле́нны. 4. катэгары́чны: ***square refusal*** катэгары́чная адмо́ва. 5. у квадра́це. 6. Sl. старамо́дны, адста́лы, кансэрваты́ўны
– v.t. 1. рабі́ць квадра́тным; выпро́стваць. 2. Math. узво́дзіць у квадра́т. 3. Figur. палаго́джваць
• ***back to square one*** пача́ць з пача́тку, на́нава
• ***on the square*** сумле́нна, справядлі́ва
• ***square oneself,*** Informal аплаці́ць, разьлічы́цца, кампэнсава́ць
• ***square up*** расплаці́цца, залаго́дзіць
• ***square with*** згаджа́цца з *чым*, адпавяда́ць *чаму́*: ***His acts do not square with his promises*** Яго́ныя ўчы́нкі не адпавяда́юць яго́ным абяца́ньням

square bracket квадра́тная ду́жка

square dance кадры́ля *f.*

square measure ме́ра пло́шчы

square root квадра́тны ко́рань

squash I [skwɑ:ʃ] – v.t. 1. душы́ць, раздýшваць: ***The boy squashed the bug*** Хло́пчык раздушы́ў казя́ўку. 2. здýшваць (*бунт*). 3. Informal разьбіва́ць (*спрэ́чку, аргумэ́нт*)
– v.i. 1. раздýшвацца. 2. то́ўпіцца, ці́скацца ў нато́ўпе
– n. 1. раздýшаная, расьцертая ма́са. 2. сквош -у *m.* (*гульня́, падо́бная да тэ́нісу*). 3. Brit. напо́й з фрýктавым со́кам: ***lemon squash*** ліманáд -у *m.*

squash II [skwɑ:ʃ] n., pl **squash** *or* **-es** гарбýз -а́ *m.*; кабачо́к -ка́ *m.*

squashy ['skwɑ:ʃi] adj. 1. які́ лёгка разду́шваецца. 2. гра́зкі: ***squashy ground*** гра́зкая, размо́клая зямля́

squat [skwɑ:t] – v.i. **squatted**, **squatting** прысяда́ць на ку́кішкі; сядзе́ць на ку́кішках. 2. прыніка́ць, прыпада́ць да зямлі́ (*пра зьвяра́*). 3. самавво́льна асяля́цца на чужо́й кватэ́ры
– adj. 1. каржакава́ты; прыса́дзісты. 2. прыплю́снуты
– n. 1. сядзе́ньне на ку́кішках *n.* 2. самавво́льнае асяле́ньне; нара́, бярло́га *f.*

squeak [skwi:k] – v.i. 1. пішчэ́ць. 2. гаварыць пісклі́вым го́ласам. 3. Sl. выдава́ць, дано́сіць. 3. Informal ледзь праціска́цца
– n. піск -у *m.*

squeaky ['skwi:ki] adj. пісклі́вы

squeal [skwi:l] – v.i. 1. вішчэ́ць, пішча́ць. 2. верашча́ць. 3. нарака́ць; ныць. 4. Sl. выдава́ць дано́счыка
– n. 1. віск -у *m.* (*сьвіньні*); піск -у *m.* 2. Informal 1. дано́с -у *m.* 2. стука́ч -а́ *m.*

squeamish ['skwi:mɪʃ] adj. 1. празьме́рна ўра́жлівы. 2. зана́дта перабо́рлівы; скрупулёзны. 3. яко́му мо́таша, мло́сна: ***He turned squeamish at the sight of blood*** Яму́ ста́ла мло́сна, калі́ паба́чыў кроў

squeeze [skwi:z] – v.t. 1. ці́снуць, сьціска́ць. 2. абдыма́ць, мо́цна прыціска́ць да сябе́. 3. упіха́ць, упі́хваць. 4. абцяжа́рваць, уціска́ць (*пада́ткамі*). 5. Informal вымага́ць, выціска́ць
– v.i. 1. выціска́цца: ***Sponges squeeze easily*** Гу́бкі лёгка выціска́юцца. 2. праціска́цца
– n. 1. по́ціск рукі. 2. цясно́та, таўкатня́, ціскані́на *f.* 3. Informal дамага́ньнне прыму́сам, шанта́ж -у́ *m.*: ***tight squeeze*** цяжко́е стано́вішча

squint [skwɪnt] – v.i. 1. жму́рыцца. 2. касаву́рыцца. 3. быць касаво́кім
– adj. касаво́кі
– n. зірк, намёк -у *m.*

squirrel ['skwɜ:rəl] – n. вавёрка *f.*
– v.t. **-reled** or **relled** (away) прыхо́ўваць; адкладда́ць для пазьне́йшага ўжы́тку: ***She squirrelled away some of her food*** Яна́ схава́ла напасьля́ ча́стку сваіх харчо́ў

stab [stæb] – v.t. **(-bb-)** 1. прабіва́ць, ра́ніць (*чым во́стрым*). 2. Figur. ра́ніць: ***The mother was stabbed to the heart by her son's lack of gratitude*** Як нож у се́рца была́ для ма́ці сы́нава няўдзя́чнасьць
– n. 1. а) уда́р -у *m.* (*асабл. чым во́стрым*). б) ра́на. 2. ра́неньне (*пачу́ццяў*). 3. Informal спро́ба *f.*
• ***have*** or ***make a stab at*** спрабава́ць, рабі́ць спро́бу
• ***stab in the back*** нечака́ная здра́да

stability [stə'bɪləti] n., pl. **-ties** 1. трыва́ласьць, усто́йлівасьць, стабі́льнасьць *f.* 2. вы́трыманасьць (*хара́ктару*), непахі́снасьць *f.* 3. усто́йлівасьць *f.* (*карабля́*)

stabilization [ˌsteɪbɪlə'zeɪʃən] n. стабілізацыя *f.*, стабілізава́ньне *n.*

stabilize ['steɪbəlaɪz] v.t. стабілізава́ць
рабіць усто́йлівым (*валю́ту*), усто́йлівым (*карабе́ль*)

stable I ['steɪbəl] – n. 1. ста́йня *f.* 2. хлеў -ява́ *m.* 3. бегавы́я ко́ні аднаго ўла́сьніка, канюшня *f.*, ко́нны завод
– v.t. ста́віць у ста́йню, трыма́ць у ста́йні
• ***stables***, pl. ста́йні і манэ́жная пляцо́ўка

stable II ['steɪbəl] adj. 1. усто́йлівы, стабі́льны; трыва́лы: ***stable currency*** усто́йлівая валю́та; ***stable foundation*** трыва́лы падму́рак. 3. усто́йлівы (*самалёт*)

stack [stæk] – n. 1. стог -а *m.*, тарпа́ *f.*, торп -а *m.*, сьці́рта *f.*. 2. шта́бе́ль -я *m.*: ***a stack of wood*** шта́бель дро́ваў. 3. Informal ку́па *f.*
– v.i. 1. стагава́ць, складда́ць у стог. 2. складда́ць дро́вы ў шта́белі
• ***stacks*** а) кні́жныя палі́цы. б) кнігасхо́вішча

stadium ['steɪdiəm]n., pl. **-diums**, **-dia** стадыён -у *m.*

staff [stæf] n., pl. **staves** (*for 1, 2*), or **staffs** (*for 3*) 1. кіл ій -я *m.*; жэ́рдка *f.*; кол кала́, *m.* 2. ма́чта *f.* 3. працаўні кі *pl.*, пэрсана́л -у *m.*: ***office staff*** канцыля́рскі пэрсана́л; ***editorial staff*** рэдакцы́йны пэрсана́л, рэдакцы́йная кале́гія. 4. Milit. штаб -у *m.*

• ***musical staff*** пяць но́тных лінéек

staff officer штабны́ афіцэ́р

stag [stæg] n. 1. але́нь-саме́ц. 2. жарабле́ц -ца́ *m.* 3. са́мlец -ца *m.* (*і́ншых зьвяро́ў*). 3. Informal а) кавале́р бяз да́мы (*на ве́чары*). б) кавале́рская вечарына

stage [steɪdʒ] – n. 1. ста́дыя, фа́за *f.*; эта́п -у *m.* 2. сцэ́на, эстра́да *f.*, памо́ст -у *m.* 3. тэа́тlар -ру *m.*; дра́ма *f.*; акто́рства -а *n.*: ***to write for the stage*** пі са́ць для тэа́тру. 4. перагó н -у *m.*, прыпы́нlак -ку *m.*, ста́нцыя *f.*

– v.t. 1. ста́віць п'е́су (*на сцэ́не*), інсцэнізава́ць. 2. правó дзіць фа́замі. 3. Figur. разы́грываць, падрабля́ць, інсцэнізава́ць: ***The boxing match was staged*** Баксёрскі матч быў інсцэнізава́ны

– v.i. быць сцэні́чным, быць адпаве́дным для інсцэніза́цыі

stagecoach [ˈsteɪdʒkoʊtʃ] n. дыліжа́нс -а *m.*

stagger [ˈstægər] – v. 1. хістáцца (*ідучы́*). 2. вага́цца (*ад няпэ́ўнасьці*). 3. залóмвацца, паддава́цца. 4. ашаламля́ць: ***He was staggered by the news of his friend's death*** Яго́ ашаламі́ла ве́стка аб сьме́рці ся́бра

– n. 1. хіста́ньне *n.* 2. вага́ньне *n.*

staggering [ˈstægərɪŋ] adj. 1. ашаламля́льны, жахлі́вы. 2. агро́мністы, велічэ́зны

stagnant [ˈstægnənt] adj. 1. засто́йны. 2. за́тхлы. 3. Figur. ле́ны, вя́лы; тупы́

stagnation [stægˈneɪʃən] n. засто́лй -ю *m.*, засто́йнасьць *f.*: ***industrial stagnation*** засто́й у прамысло́васьці

stain [steɪn] – n. 1. пля́ма *f.* 2. пля́ма *f.*, ценlь -ю *m.*, га́ньба *f.* (*на рэпута́цыі*). 3. фа́рба *f.*; каляро́вы пако́ст

– v.t. 1. пля́міць, заплямваць. 2. га́ньбіць, зьнеслаўля́ць (*рэпута́цыю*). 3. фарбава́ць, афарбо́ўваць: ***to stain a microscopic specimen*** афарбава́ць мікраскапі́чны прэпара́т

stained glass вітра́ж -а́ *m.*

stainless [ˈsteɪnləs] adj. бяз пля́мы (-аў), чы́сты, беззага́нны

stainless steel нержаве́ючая сталь

stair [ster] n. прыстýпка *f.*, прыстýплак -ка *m.* (*схо́даў*)

• ***stairs,*** pl. схо́ды *pl.*

staircase [ˈsterkeɪs] n. схо́ды *pl.*

stairwell [ˈsterwel] n. ле́сьвічная кле́тка, ша́хта *f.*

stake [steɪk] – n. 1. калóк -ка́ *m.*; кол кала́ *m.*, ты́чка *f.* 2. ста́ўка *f.* (*у гульні́ на гро́шы*)

– v.t. 1. прывяза́ць да калка́, падпіра́ць калóм; абгарóджваць калка́мі. 2. рызыкава́ць; рабіць ста́ўку (*у гульні́*)

• ***at stake*** паста́ўлены на ка́рту, на ры́зыку

• ***stakes,*** pl. вы́йгрыш на го́нках *або́* ў спабóрніцтве

• ***the stake*** а) слуп, да яко́га прывя́звалі асу́джанага на спале́ньне. б) спале́ньне жывы́м

stale I [steɪl] – adj. 1. ча́рствы: ***stale bread*** ча́рствы хлеб. 2. нясьве́жы, які́ вы́тхнуўся (*напр. пі́ва*). 3. Figur. стары́, састарэ́лы, плы́ткі: ***a stale joke*** стары́ жарт; анэкдо́т з барадо́ю

– v.i. 1. чарсьцьве́ць. 2. вытыха́цца

stale II [steɪl] – n. мача́ *f.* (*каня́, бы́дла*)

– v.i. мачы́цца (*пра каня́, бы́дла*)

stalemate [ˈsteɪlmeɪt] – n. 1. мат -у *m.* (*у ша́хматах*). 2. безвыхо́днае стано́вішча, тупі́к -а́ *m.*

– v.t. 1. ста́віць у безвыхо́днае стано́вішча. 2. ста́віць ма́т

stalk I [stɔ:k] – n. 1. сьцябло́ *n.*, сьцяблі́нка *f.* 2. чаранóк, хвастóк -ка́ *m.* (*ліста́*); но́жка *f.* (*ча́ркі*); пладано́жка *f.*: ***cabbage stalk*** хра́пка *f.* 3. высо́кі фабры́чны ко́мін

stalk II [stɔ:k] – v.i. 1. падкрада́цца (*да дзічы́ны*). 2. ісьці́ крадко́м. 3. пашы-

ра́цца, шы́рыцца: ***Disease stalked through the land*** Хвароба шы́рылася ў краі́. 4. кро́чыць ганары́ста
– n. 1. напы́шлівая хада́. 2. падкра́дваньне *n.*

stall I [stɔ:l] – n. 1. ста́йня *f.*, хлеў -я́ва́ *m.* 2. сто́йла *n.* 3. кіёск -а *m.* 4. Brit. ме́сцы ў пе́ршых радо́х парте́ру (*у тэа́тры*). 5. адзі́н з па́льцаў пальча́ткі
– v.t. 1. ста́віць жывёліну ў сто́йла. 2. затры́мваць, прыпыня́ць
– v.i. 1. стая́ць у хляве́, ста́йні *або́* сто́йле. 2. затры́мвацца, спыня́цца (*пра аўтамашы́ну*). 3. загразна́ць. 4. тра́ціць ху́ткасьць (*пра самалёт*)

stall II [stɔ:l] v. адця́гваць, цягну́ць, ухіля́цца, мару́дзіць: ***You have been stalling long enough*** Хо́піць табе́ мару́дзіць

stallion ['stæljən] n. жарабле́ц -ца́ *m.*

stamen ['steɪmen] n., Bot. тычы́нка *f.*

stamina ['stæmɪnə] n. жыцьцёвая сі́ла; жыву́часьць *f.*; трыва́ласьць, вытрыва́ласьць *f.*

stammer ['stæmər] – v.i. заіка́цца; запіна́цца
– n. заіка́ньне *n.*; запі́нка *f.*

stammerer ['stæmərər] n. заі́кла -і *m.&f.*

stammering ['stæmərɪŋ] – adj. заі́клівы, заіка́сты
– n. заіка́ньне *n.*

stamp [stæmp] – v.t. ту́паць: ***to stamp one's foot in anger*** ту́пнуць нагу́ю са зло́сьці. 2. адбіва́ць, урэ́зваць: ***His words were stamped on my mind*** Яго́ныя сло́вы мо́цна ўрэ́заліся мне ў па́мяць. 3. абіва́ць: ***to stamp the snow from one's boots*** абіва́ць сьнег з бо́таў. 4. выбіва́ць узо́ры, на́дпісы. 5. ста́віць пяча́тку; штэмплява́ць. 6. накле́йваць ма́рку (*на ліст*)
– n. 1. пашто́вая ма́рка. 2. штэ́мпель -я *m.*; пяча́тка *f.* 3. ту́пат -у *m.*, ту́паньне *n.*. 4. адбі́так -ку *m.*: ***Her face bore the stamp of suffering*** На е́йным абліччы ляжа́ў адбі́так паку́ты. 6. тып, скла́д -у *m.*: ***Men of his stamp are rare*** Мужчы́ны яго́нага скла́ду трапля́юцца ра́дка
• ***stamp out*** а) затапта́ць. б) сі́лай здушы́ць, зьні́шчыць

stampede [stæm'pi:d] – n. 1. пані́чныя ўцёкі (*ста́тку, нато́ўпу*). 2. стыхі́йны ма́савы рух. 3. каўбо́йскія спабо́рніцтвы
– v.i. пані́чна ўцяка́ць, разьбяга́цца
– v.t. выкліка́ць пані́чныя ўцёкі

stamp pad падў́шачка для пячаткі

stand [stænd] – v.i. **stood, standing** 1. стая́ць. 2. устава́ць: ***He stood when she entered the room*** Ён уста́ў, калі́ яна́ ўвайшла́ ў пако́й. 3. стая́ць за *што*: ***to stand for fair play*** стая́ць за справядлі́вы падыхо́д. 4. трыва́ць; зно́сіць; цярпе́ць: ***Some plants cannot stand cold*** Некато́рыя расьлі́ны ня мо́гуць перано́сіць хо́ладу. 6. дзе́яць, заставацца ў сі́ле: ***the law still stands*** зако́н яшчэ́ ў сі́ле
– v.t. ста́віць: ***Stand the box here*** Паста́ў скры́нку сюды́
– n. 1. стая́ньне *n.* 2. спыне́ньне *n.*, прыпы́нак -ку *m.*: ***to bring to a stand*** спыні́ць, затрыма́ць. 3. супраці́ў -ву *m.*: ***to take a stand against*** даць супраці́ў, супраці́віцца. 4. прыпы́нак -ку *m.* (*вандро́ўнага тэа́тру*): ***a one-night stand*** прыпы́нак для аднаго́ спэкта́клю. 5. ме́сца *n.*; пазы́цыя *f.* 6. пункт гле́джаньня, гле́дзішча *n.*, погля́д -у *m.* 7. стая́нка *f.*: ***a stand for taxis*** or ***a taxi stand*** стая́нка такс́і. 8. кіёск, стэнд -а *m.*, падста́ўка, этажэ́рка *f.* 9. ні́ва, ураджа́й на ко́рані: ***a good stand of wheat*** густа́я ні́ва пшані́цы. 10. а) трыбу́на *f.* б) пульт -а *m.*: ***conductor's stand*** дырыге́нцкі пульт
• ***stand a chance*** мець ша́нец
• ***stand by*** а) быць набл́зу. б) стая́ць на *чы́м* баку́; дапамага́ць *каму́*; падтры́мваць *каго́*, в) датры́мваць: ***to stand by one's promise*** датрыма́ць абяца́ньне, г) быць напагато́ве
• ***stand for*** а) прадстаўля́ць, стая́ць за *каго́*. б) быць кандыда́там
• ***stand in*** а) быць у дове́ры. б) замяшча́ць

• ***stand on*** а) грунтава́цца на *чым*; зале́жаць ад *чаго́*. б) дамага́цца
• ***stand out*** а) выдава́цца, вытыркáцца, утвара́ць вы́ступ, б) вылуча́цца; кі́дацца ў во́чы, в) не здава́цца, трыма́цца. г) вы́трываць да канца́
• ***stand up*** а) уста́ць. б) вы́трымаць выпрабава́ньне
• ***stand up for*** вы́ступіць у абаро́не *каго́*, заступі́цца за *каго́*
• ***stand up to*** адва́жна сустрака́ць *што*, быць на вышыні́

standard ['stændərd] – n. 1. ме́рка, но́рма *f.*: ***to be not up to standard*** не адпавяда́ць но́рме. 2. узро́|вень -ўню, станда́рт -у *m.*: ***standard of living*** жыццёвы ўзро́вень. 3. эталён -у *m.* 4. парыта́т -у *m.*: ***the gold standard*** парыта́т зо́лата. 5. ба́за ва́ртасьці (*валю́ты*). 6. сьцяг, штандáр -а *m.*, эмбле́ма *f.*, сы́мбал|ь -ю *m.* 7. падста́ўка *f.*, стаяк -á *m.*: ***The floor lamp has a long standard*** Ля́мпа ма́е высо́кі стаяк
– adj. 1. норма́льны, станда́ртны. 2. тыпо́вы. 3. унармава́ны: ***standard language*** унармава́ная мо́ва

standardbearer ['stændərd,berər] n. 1. сьцяганó|сец -ца *m.*, сьцяжн|ы́ -о́га *m.*, хару́ж|ы -ага *m.* (*у во́йску*). 2. правады́р -á *m.*

standardize ['stændərdaɪz] v.t. стандартызава́ць, нармалізава́ць: ***The parts of an automobile are standardized*** Ча́сткі аўтамабі́ля стандартызава́ныя

strike [straɪk] – v., **struck, struck** *or* **stricken, striking** 1. удара́ць; нано́сіць уда́р: ***to strike a person in anger*** ударыць каго́ са зло́сьці; ***strike a blow in self-defence*** нане́сьці ўда́р у самаабаро́не. 2. выбіва́ць, адбіва́ць, чака́ніць: ***to strike a medal*** адбі́ць мэда́ль. 3. высяка́ць (*агóнь*), чы́ркаць, запа́льваць: ***to strike a match*** запалі́ць запа́лку. 3. здава́цца, ура́жваць, рабі́ць ура́жаньне: ***The plan strikes me as silly*** Плян здае́цца мне неразу́мным. 6. біць: ***It has just struck four*** То́лькі што прабі́ла чаты́ры. 7. мо́цна ўра́жваць, ахапля́ць: ***They were struck with terror*** Іх ахапі́ў жах. 8. атакава́ць: ***The enemy will strike at dawn*** Во́раг пачне́ ата́ку на до́сьвітку. 9. прыйсьці́ ў галаву́: ***An amusing thought struck her*** Заба́ўная ду́мка прыйшла́ ёй у галаву́. 10. баставаць, страйкава́ць: ***The coal miners struck*** Вугляко́пы страйкава́лі. 11. выкрасьля́ць, выкасо́ўваць: ***Strike out the last word*** Вы́красьлі апо́шняе сло́ва; ***Strike his name off the list*** Вы́красьлі яго́нае імя́ са сьпі́су. 10. сутыка́цца, урэ́зваццa: ***The car struck a fence*** Машы́на ўрэ́залася ў плот
– n. 1. уда́р -у *m.* 2. адкрыцьцё пакла́даў (*руды, на́фты*); нечака́ная ўда́ча. 3. забасто́ўка *f.*, страйк -у *m.*
• ***on strike*** на стра́йку, на забасто́ўцы: ***to be on strike*** баставаць, страйкава́ць
• ***strike a balance*** падво́дзіць баля́нс
• ***strike an agreement*** прыйсьці́ да пагадне́ньня
• ***strike it rich,*** Informal а) адкры́ць бага́тыя пакла́ды (*руды́, на́фты*). б) мець нечака́ную ўда́чу
• ***strike up*** пача́ць, завяза́ць: ***to strike up a friendship*** завяза́ць сяброўства, пасябрава́ць; ***to strike up a song*** пача́ць пя́ць пе́сьню

strike-bound ['straɪkbaʊnd] adj. ахо́плены стра́йкам

strikebreaker ['straɪkˌbreɪkər] n. штрэйкбрэ́хер -а *m.*

strikebreaking ['straɪkˌbreɪkɪŋ] n. прымусо́вае спыне́ньне стра́йку

striker ['straɪkər] n. забасто́ўшчык -а, страйко́|вец -ўца *m.*, забасто́ўшчыца *f.*

striking ['straɪkɪŋ] adj. 1. які́ страйку́е. 2. які́ ўра́жвае, уражáльны; імпаза́нтны, выда́тны

string [strɪŋ] – n. 1. шнур -а́ *m.*, шнур|о́к -ка́ *m.*: ***string of beads*** шнуро́к па́церак. 2. струна́ *f.*: ***the strings of a violin*** стру́ны скры́пкі. 3. чарада́ *f.*: ***A string of cars came down the street*** Чарада́ машы́наў гу́жам прайшла́ па ву́ліцы. 4. Informal умо́ва *f.*: ***an offer with strings attached to it*** прапано́ва з умо́вай, дада́дзенай да яе́. 5 валакно́ *n.*; жы́лка *f.* (*у расьлі́не*)
– v.t. **strung, strung** or (rare) **stringed, stringing** 1. нізаць, нані́зваць. 2. зьвя́зваць, прывя́зваць шнурко́м. 3. ве́шаць, падве́шваць: ***to string a picture*** павесіць карці́ну. 4. нацягваць (*стру́ны*). 5. ру́хацца, е́хаць гу́жам (*адзі́н за адны́м*)
• ***on a string*** пад кантро́лем; на павадку́, у зале́жнасьці
• ***pull strings*** уплыва́ць, рабі́ць ціск

• ***pull the strings*** кантраляваць, кіраваць
• ***string out,*** Informal празьмерна расьцягваць (*праграму*)
• ***strings,*** pl. а) струнныя інструмэнты. б) частка аркестру, якая складаецца са струнных інструмэнтаў
• ***string up,*** Informal вешаць (*злачынца*)

string bean стручковая фасоля

string instrument струнны музычны інструмэнт

string quartet струнны квартэт

stringy ['strɪŋi] adj. 1. валакністы. 2. цягучы. 3. жылісты: ***stringy meat*** жылістае мяса

strip I [strɪp] v.t. **stripped** or (rare) **stript, stripping** 1. агаляць; разьдзяваць дагала. 2. разьдзяваць; здымаць вопратку. 3. абдзіраць, здымаць (*скурку, кару*). 4. зьдзіраць; абіраць: ***to strip paper from a wall*** зьдзіраць шпалеры са сьцяны; ***to strip fruit from a tree*** абіраць садавіну з дрэва. 5. пустошыць: ***to strip a house of its furniture*** вынесьці з дому мэблю. 6. рабаваць, абкрадаць; забіраць: ***Thieves stripped the house of everything valuable*** Злодзеі забралі з дому ўсё каштоўнае. 7. выдойваць карову дачыста (*не пакінуць малака*)
• ***strip of*** а) забіраць, адбіраць. б) пазбаўляць (*грошай, маёмасьці*). в) рабаваць

strip II [strɪp] n. 1. паласа, палоска *f.* (*тканіны, паперы, мэталу*). 2. шнур, палоска (*поля*); паласа (*лесу, балота*). 3. узьлётна-пасадачная паласа (*для самалётаў*). 4. паласа (*у газэце*): ***a comic strip*** паласа коміксаў (*у газэце*)

stripe [straɪp] n. 1. паclак -ка *m.*, палоска, паласа *f.*: ***A tiger has stripes*** Тыгар мае шкуру ў палоскі. 2. тканіна ў паскі. 3. Figur. гатунак -ку *m.*; тып -у *m.*: ***of quite a different stripe*** зусім іншага гатунку
• ***stripes,*** pl. нашыўкі (*на мундзіры*)

striped [straɪpt] adj. паласаты; у паскі; з нашыўкамі: ***striped fabric*** тканіна ў палоскі

stripling ['strɪplɪŋ] n. юнак -а *m.*, падлетак -ка *m.*

striptease ['strɪpti:z] n. стрыптыз -у *m.*

strive [straɪv] v.i. **strove** or **strived, striven, striving** 1. моцна старацца, імкнуцца дасягнуць: ***strive for self-control*** старацца авалодаць сабою; ***Always strive forward*** Заўсёды імкніся наперад. 2. змагацца: ***The swimmer strove against the tide*** Плывец змагаўся з плыньню

striven ['strɪvən] v., *p.p. of* **strive**

strode [stroud] v., *p.t. of* **stride**

stroke I [strouk] – n. 1. удар -у *m.*: ***stroke of lightning*** удар маланкі; ***They have not done a stroke of work*** Яны пальцем аб палец ня ўдарылі. 2. удар (*гадзіньніка*): ***We arrived on the stroke of nine*** Мы прыбылі роўна а дзявятай гадзіне. 3. біцьцё *n.*, удар -у *m.* (*сэрца, пульсу*), пульсаваньне *n.* 4. штрых -а *m* (*пэндзля, пяра*). 5. інсульт -у *m.* 6. (*у плаваньні*): граблок -ка, узмах -у *m.* 7 (*у веславаньні*): а) грабок вяслом. б) кармавы вясьляр
– v.i. 1. веславаць. 2. выкрэсьліваць, перакрэсьліваць
• ***keep strokes*** трымаць такт
• ***stroke of bad luck*** няўдача *f.*, цяжкі ўдар
• ***stroke of fate*** удар лёсу
• ***stroke of luck*** удача *f.*

stroke II [strouk] v.i. гладзіць, лашчыць: ***She stroked the kitten*** Яна пагладзіла кацянятка
• ***stroke the wrong way*** а) гладзіць супроць шэрсьці. б) злаваць

stroke oar 1. кармавое вясло. 2. кармавы вясьляр

stroll [stroul] – v.i. 1. праходзіцца; прагульвацца. 2. вандраваць: ***strolling gypsies*** вандроўныя цыганы
– n. прагулянка *f.*, шпацыр -у *m.*

stroller ['stroulər] n. 1. шпацырант -а *m.* 2. вандроўны артыст. 3. бадзяга -і

m. 4. складны́ дзіця́чы вазо́к (*сядзя́чы для гуля́ньня*)

strong [strɔ:ŋ] adj. 1. ду́жы, мо́цны: ***a strong wind*** мо́цны ве́цер; ***a strong man*** ду́жы чалаве́к. 2. магу́тны: ***a strong nation*** мо́цны наро́д. 3. цьвёрды: ***a strong will*** цьвёрдая во́ля. 4. ко́лькасьцю: ***We were 100 strong*** Нас было́ 100 чалаве́к. 5. мо́цнадзе́йны: ***a strong poison*** мо́цнадзе́йная атру́та. 6. мо́цны, канцэнтрава́ны: ***a strong tea*** мо́цная гарба́та; ***a strong drink*** мо́цны алькаго́льны напо́й. 7. во́стры (*пах, прыпра́ва*)

• ***get stronger*** дужэ́ць, мацне́ць

strong-arm ['strɔ:ŋɑ:rm] – adj., Informal які́ ўжыва́е сі́лу *або́* гва́лт, сілавы́: ***strong-arm methods*** сілавы́я ме́тады

– v.t. ужыва́ць сі́лу *або́* гва́лт

stronghold ['strɔ:ŋhould] n. 1. цьвярды́ня, цытадэ́ль, крэ́пасьць *f.* 2. бясьпе́чнае ме́сца

strongly ['strɔ:ŋli] adv. мо́цна

strongman ['strɔ:ŋmæn] n., pl. **-men** 1. аси́лак -ка *m.* 2. дыкта́тар, дэ́спат -а *m.*

strong-minded [ˌstrɔ:ŋ'maɪndɪd] adj. мо́цнай во́лі, валявы́; упа́рты, насто́йлівы

strove [strouv] v., *p.t. of* **strive**

struck [strʌk] v., *p.t. and p.p. of* **strike**

structural ['strʌktʃərəl] adj. 1. будаўні́чы, канструкцыйны: ***structural steel*** будаўні́чая сталь. 2. структу́рны

structure ['strʌktʃər] – n. 1. будыні́ак -ка *m.*, будыні́на *f.* 2. будо́ва, структу́ра *f.*: ***the structure of a molecule*** будо́ва малёкулы; ***the structure of society*** структу́ра грама́дзтва

– v.t. будава́ць

struggle ['strʌgəl] – v.t. 1. змага́цца, хо́дацца: ***to struggle for a living*** змага́цца за кава́лак хле́ба; ***to struggle for freedom*** змага́цца за во́лю; ***to struggle against the difficulties*** змага́цца зь ця́жкасьцямі. 3. намага́цца, рабі́ць нату́гі: ***The old man struggled to his feet*** Стары́ чалаве́к з нату́гай уста́ў на но́гі

– n. 1. змага́ньне, хо́даньне *n.* 2. вы́сіл|ак-ку *m.*, намага́ньне *n.*

strung [strʌŋ] v., *p.t. and p.p. of* **string**

strut I [strʌt] v.i. хадзі́ць *або́* ісьці́ ве́лічна, го́галем

strut II [strʌt] – n. падпо́ра, падпо́рка *f.*

– v.t. падпіра́ць

stub [stʌb] – n. 1. аблóм|ак, агры́з|ак -ка *m.*: ***the stub of a pencil*** агры́зак алавікá. 2. карэ́нчык -а *m.*, канец бі́ле́та, квіта́. 3. кало́да *f.*, абру́б|ак -ка *m.* (*дрэ́ва, пале́на*). 4. пень пня *m.* 5. недаку́р|ак -ка *m.*

– v.t. 1. выкарчо́ўваць; выко́пваць (*з ко́ранем*). 2. сту́кнуць нагóй аб не́шта: ***to stub one's toe against the door sill*** спатыкну́цца аб парóг 3. гасі́ць недаку́рак

stubble ['stʌbəl] n. 1. (і)ржэ́ўнік -у *m.*, (і)ржы́шча *n.* 2. шчаці́на, шчэць *f.*, шчаці́ньне *n.* (*на няго́леным тва́ры*)

stubborn ['stʌbərn] adj. 1. заця́ты: ***stubborn resistance*** заця́ты супраці́ў. 2. упо́рысты, упа́рты

stubbornness ['stʌbərnəs] n. заця́тасьць, упа́ртасьць *f.*

stubby ['stʌbi] adj. 1. прыса́дзісты; каржакава́ты (*пра чалаве́ка*); каро́ткі й таўсты́. 2. шчаці́ністы, са шчаці́най: ***a stubby beard*** шчаці́ністая барада́. 3. іржы́сты; пні́сты

stucco ['stʌkou] – n., pl. **-coes, -cos** 1. тынк -у *m.*, атынко́ўка *f.* 2. тынкава́ньне

– v.t. тынкава́ць, атынко́ўваць

stuck [stʌk] v., *p.t. and p.p. of* **stick**

• ***get stuck*** загра́знуць, угру́знуць; засе́сьці

stuck-up [ˌstʌk'ʌp] adj. ганары́сты, фанабэ́рысты, задава́сты

stud I [stʌd] – n. 1. пле́шка, гало́ўка *f.* (*цьвіка́*). 2. за́пінка *f.* (*у адзе́ньні*). 3. шу́ла, сто́йка *f.* (*у будаўні́цтве*)

– v.t. **(-dd-)** усе́йваць, усы́пваць; раскі́дваць: ***gem-studded crown*** каро́на, усы́паная кашто́ўнымі камяня́мі

stud II [stʌd] – n. 1. ко́нны завóд. 2. жараб|е́ц -ца́ *m.* .

– adj. завадзкі, парóдзісты: ***a stud horse*** завадзкі жарабéц

student ['stu:dənt] n. 1. студэ́нт -а *m.*, студэ́нтка *f.* 2. вýч|ань -ня *m.*, вýчаніца *f.* 3. дасьлéднік -а *m.*

• ***students,*** coll. студэ́нцтва *n.*, вучнёўская мóладзь

studied ['stʌdɪd] adj. 1. вы́вучаны, завýчаны. 2. старáнна прадýманы, абдýманы: ***a studied essay*** прадýманая пісьмóвая прáца. 3. наўмы́сны: ***a studied insult*** наўмы́сная зьнявáга

studio ['stu:dioʊ] n. 1. стýдыя *f.* (*мастакóўская*). 2. рáдыёстýдыя, кінастýдыя, тэлестýдыя *f.* 3. аднапакаёвая кватэ́ра

studious ['stu:diəs] adj. 1. які́ любіць вучы́цца, старáнны. 2. дбáйны, рýплівы; увáжлівы. 3. прадýманы, разьлíчаны, наўмы́сны: ***studied simplicity*** прадýманая прастатá

study ['stʌdi] – n., pl. **studies** 1. вывучáньне *n.*; вучэ́ньне *n.* 2. дасьлéдаваньня; галíна, кірýнак навýкі: ***Arithmetic, spelling, and geography are three school studies*** Арытмэ́тыка, прáвапіс і геаграфія — тры шкóльныя прадмéты; ***to study the causes of a depression*** дасьлéдаваць прычы́ны дэпрэ́сіі. 4. працóўны кабінэ́т. 5. навукóвая прáца. 6. нáкід -у *m.* (*малю́нку, апавяда́ньня*)

– v. 1. вывучáць; вучы́цца: ***to study history*** вывучáць гістóрыю; ***He studies most of the time*** Бальшыню́ чáсу ён вýчыцца. 2. старáнна, увáжліва разглядáць, вывучáць: ***We studied the map to find the shortest road home*** Мы увáжліва разглéдзелі кáрту, каб знайсьці найкарацéйшую дарóгу дамóў. 3. абдýмваць, абмяркóўваць. 4. вучы́ць, завýчваць

• ***studies*** навучáньне, навýка (*у шко́ле, універсытэ́це*)

stuff [stʌf] – n. 1. матэрыя́л -у *m.* 2. тканíна, матэ́рыя *f.* 3. рэ́чыва *n.*, рэч *f.* 4. рэ́чы *pl.*; нажы́ткі *pl.*: ***He was told to move his stuff out of the room*** Ямý сказáлі вы́несьці сваé рэ́чы з пакóю. 5. хлам -у *m.*; глóмазд -у *m.*; дрэнь *f.* 6. глýпства *n.*, лухтá *f.*

– v.t. 1. пакавáць, напаўня́ць. 2. набіваць, напíхваць (*чýчала*). 3. начыня́ць, фаршыраваць. 4. упíхваць. 5. закладáць, забіваць: ***My nose is stuffed*** Мнé залажы́ла нос. 6. наядáцца, напíхвацца

• ***stuff a ballot box*** кідáць у вы́барчую ýрну падрóбленыя бюлетэ́ні

• ***stuffed shirt*** чапýрысты, напы́шлівы

stuffing ['stʌfɪŋ] n. фарш -у *m.*, начы́нка *f.*

stuffiness ['stʌfinəs] n. духатá, задýха *f.*

stuffy ['stʌfi] adj. 1. дýшны: ***a stuffy room*** дýшны пакóй. 2. нýдны: ***a stuffy speech*** нýдная прамóва

stumble ['stʌmbəl] – v.i. 1. спатыкáцца. 2. ісьцí хíсткай, няпэ́ўнай хадóю: ***The tired old man stumbled along*** Змóраны стары́ ішóў спатыкáючыся. 3. гаварыць запінáючыся. 4. чýцца зьнявáжаным; вагáцца, хістáцца

– n. 1. прóмах -у *m.*, прóхібка *f.*; няпráвільны крок *або́* рух. 2. запíнка затры́мка *f.*

• ***stumble upon*** прыпáдкам натыкнýцца

stumbling block перашкóда *f.*, кáмень спатыкнéньня

stump [stʌmp] – n. 1. пень пня *m.* 2. абрýбак -ка *m.* (*нагí*), кýкса *f.* 3. каржакавáты чалавéк. 4. імправізавáная трыбýна *f.* (*для палітычных прамóўцаў*). 5. цяжкí крок, цяжкáя хадá. 6. драўляна́я нагá

– v.1. карчавáць пні. 2. чыкільгáць. 3. аб'яжджáць з агітáцыяй

stun [stʌn] – v.t. **(-nn-)** 1. глушы́ць, аглушáць (*удáрам*). 2. ашаламля́ць

– n. ашалóмленасьць, агалóмшанасьць *f.*

stunned ['stʌnd] adj. ашалóмлены, ачмурэ́лы

stung [stʌŋ] v., *p.t. and p.p. of* **sting**

stunk [stʌŋk] v., *p.t. and p.p. of* **stink**

stunt I [stʌnt] – v.t. прыпыня́ць рост, разьвіцьцё
– n. спыне́ньне ро́сту, разьвіцьця́
stunt II [stʌnt] n., Informal шту́ка *f.*, трук, фо́кус -у *m.*
stunt man каскадзёр -а *m.*
stunted ['stʌntɪd] adj. ча́злы (*пра расьлі́ну, жывёліну*)
stupefy ['stu:pɪfaɪ] v.t. **-fied, -fying** 1. чмуці́ць, ачмура́ць, адура́ць, адурма́ньваць; атупля́ць (*і ро́зум, пачу́цьці*). 2. зьдзіўля́ць; ашаламля́ць, агало́мшваць: ***They were stupefied by the calamity*** Яны́ былі́ ашало́мленыя няшча́сьцем
stupendous [stu'pendəs] adj. захапля́льны, дзіво́сны, цудо́ўны; велізарны
stupid ['stu:pəd] – adj. 1. дурны́, бязглу́зды; тупы́: ***a stupid person*** дурны́ чалаве́к. 2. неціка́вы: ***a stupid book*** неціка́вая кні́га
– n. дурны́ -о́га *m.*, дурна́я *f.*; ду́рань -ня *m.*
stupidity [stu'pɪdəti] n., pl. **-ties** 1. ту́пасьць, дурно́та, бязглу́здасьць *f.* 2. ду́расьць *f.*, глу́пства *n.*
stupor ['stu:pər] n. 1. аслупяне́ньне, зьняме́ньне *n.* 2. Med. сту́пар -у *m.*
sturdy ['stɜ:rdi] adj. 1. мо́цны, здаро́вы; мажны́, таўсты́: ***sturdy legs*** мо́цныя но́гі. 2. ***sturdy resistance*** мо́цны супраці́ў. 3. непахі́сны, му́жны: ***sturdy defenders*** му́жныя абаро́нцы
sturgeon ['stɜ:rdʒən] n., pl. **-geon**, coll. **-geons** ася́цёр -тра́ *m.* (*ры́ба*)
stutter ['stʌtər] – v.i. 1. заіка́цца. 2. запіна́цца, гаварыць запіна́ючыся
– n. заіка́ньне *n.*
stutterer ['stʌtərər] n. заіка *m. & f.*
sty I [staɪ] n. 1. сьвіна́рнік -а *m.* 2. Figur. сьвіну́шнік -а *m.* (*бру́дны пако́й*)
sty II or **stye** [staɪ] n., pl. **sties** ячме́нь (*на во́ку*)
style [staɪl] – n. 1. мо́да *f.*, фасо́н -у *m.*: ***dresses in the latest style*** суке́нкі найнаве́йшага фасо́ну. 2. стыль -ю *m.*: ***The Gothic style of architecture*** Гаты́чны стыль у архітэкту́ры. 3. стыль -ю *m.*, мане́ра *f.*: ***Kupala's style*** купа́лаўскі стыль. 4. густ -у *m.*: ***She dresses in style*** Яна́ адзяе́цца з гу́стам. 5. стыло́ *n.*, *indecl.*, пяро́ *n.* 6. Bot. шы́йка пе́сьціка
– v.t. 1. мадэлява́ць: ***dresses styled by a famous designer*** суке́нкі змадэлява́ныя славу́тым куцюр'е́. 2. тытулава́ць
• ***New Style (Gregorian calendar)*** но́вы стыль (Грыгар'я́нскі каляндар)
• ***Old Style (Julian calendar)*** стары́ стыль (Юлія́нскі каляндар)
stylish ['staɪlɪʃ] adj. са сты́лем; сты́льны, стылёвы, мо́дны, густо́ўны (*пра адзе́ньне*)
stylist ['staɪlɪst] n. стыліст -а *m.*, стыліс́тка *f.*
stylistic [staɪ'lɪstɪk] adj. стылісты́чны
stylus ['staɪləs] n. 1. іго́лка для патэфо́на. 2. стыло *n.*, *indecl.*
styptic ['stɪptɪk] – adj. кроваспыня́льны
– n. кроваспыня́льны сро́дак
suave [swɑ:v] adj. 1. ве́тлівы, пачці́вы, далікатны; сьве́цкі. 2. лагодны, мяккі́ (*пра віно́*)
sub-, prefix 1. пад-: ***subway*** падзе́мка; ***submarine*** падво́дная ло́дка. 2. суб-, бліз́у, каля́: ***subalpine*** субальпі́йскі
subacid [ˌsʌb'æsɪd] adj. кіслава́ты; зье́длівы
subarctic [ˌsʌbɑ:rktɪk] – adj. субарктычны, пе́радпаля́рны
– n. Суба́рктыка *f.*
subcommittee ['sʌbkəˌmɪti] n. падкамітэ́т -у *m.*
subconscious [sʌb'kɑ:nʃəs] adj. падсьве́дамы
subdivide [ˌsʌbdɪ'vaɪd] v.t. 1. разьдзя́ляць, дзяля́ць. 2. падзяля́ць (*зямлю́ на пляцы*)
subdivision ['sʌbdɪˌvɪʒən] n. 1. дзяле́ньне *n.* (*на ча́сткі*). 2. падразьдзе́л -у *m.*, падразьдзяле́ньне *n.*
subdue [səb'du:] v.t. 1. падбіва́ць, заваёўваць; падпарадко́ўваць, скара́ць: ***to subdue nature*** падпара́дкаваць прыро́ду. 2. стры́мваць, утаймо́ўваць: ***We***

subdued a desire to laugh Мы стрымáлі сьмех; ***to subdue passion*** утаймóўваць жáрсьці. 3. зьмякчáць (*кóлер, сьвятлó*). 4. зьніжáць; зьмяншáць: ***to subdue a fever*** зьбíць гарáчку

subdued [səbˈdu:d] adj. 1. перамóжаны; падпарáдкаваны. 2. сьцíшаны, панíжаны (*тон*); зьмякчаны (*кóлер, сьвятлó*): ***subdued voices*** прыглýшаныя галасы́

subeditor [ˌsʌbˈedətər] n. памóчнік, намéсьнік рэдáктара

subhead [ˈsʌbhed] n. 1. падзагалóвак -ўка *m.* 2. падразьдзéл (*у кнíзе*). 3. застýпнік, намéсьнік -а *m.*

subject [ˈsʌbdʒekt] – n. 1. тэ́ма *f.* 2. прадмéт -у *m.* (*вывучэ́ньня*), аб'éкт -у *m.* (*дасьлéдаваньня*). 3 дысцыплíна *f.*, шкóльны прадмéт. 4. падда́ны -ага *m.*: ***Queen's subject*** падда́ны каралéвы. 5. Gram. дзéйнік -а *m.* 6. тэ́ма *f.*, сюжэ́т -у *m.* (*твóру*)

– adj. 1. падулáдны, падпарáдкаваны: ***We are subject to our country's laws*** Мы падпарадкóўваемся закóнам нáшай краíны

– v.t. [səbˈdʒekt] 1. падбівáць, заваёўваць, падпарадкóўваць. 2. паддаваáць: ***to subject to torture*** паддаваáць катаванью

• ***subject to*** а) пад улáдай, уплы́вам. б) схíльны да: ***subject to colds*** схíльны да застýды. в) залéжны ад *чаго́*

subjection [səbˈdʒekʃən] n. 1. падпарáдкаваньне *n.* 2. падлéгласьць, падпарáдкаванасьць *f.*

subjective [səbˈdʒektɪv] adj. 1. суб'екты́ўны. 2. асабíсты, прывáтны (*дýмка, пагляд*). 3. Gram. дзéйнікавы: ***subjective case*** назóўны склон

subjectivity [ˌsʌbdʒekˈtɪvəti] n. суб'екты́ўнасьць *f.*

subjoin [ˌsʌbˈdʒɔɪn] v.t. дадаваáць; далучáць (*у канцы́*)

subjugate [ˈsʌbdʒəgeɪt] v.t. 1. падбівáць, заваёўваць. 2. скарáць, занявóльваць

subjugation [ˌsʌbdʒəˈgeɪʃən] n. завяваáньне, панявóленьне *n.*

sublease [ˈsʌbli:s] – n. субарэ́нда *f.*

– v.t [ˌsʌbˈli:s] субарандаваáць

sublet [ˌsʌbˈlet] v.t. перааарандаваáць

sublimate [ˈsʌblɪmeɪt] – v.i. Chem. 1. сублімаваáць. 2. ачышчáць

– adj. сублімаваны

– n. сублімáт -у *m.*

sublime [səˈblaɪm] – adj. узьнёслы, прыўзьняты (*пра настрóй*); вéлічны

– n. узьнёсласьць *f.*

• ***from the sublime to the ridiculous*** з аднаé крáйнасьці ў другýю; ад весялóсьці да злóсьці

submarine [ˈsʌbməri:n] – adj. падвóдны: ***submarine plants*** падвóдныя расьлíны

– n. падвóдная лóдка

submerge [səbˈmɜ:rdʒ] v.t., v.i 1. затапляць: ***land submerged by a flood*** абшáр, затóплены павóдкай. 2. заглыбляць, пагружáць; апушчáць(ь) (-ца), апускáць(ь) (-ца) (*пад вадý*)

submergence [səbˈmɜ:rdʒəns] n. *гл.* **submersion**

submerse [səbˈmɜ:rs] v., *гл.* **submerge**

submersible [səbˈmɜ:rsəbəl] adj. які́ мóжна акунáць, апускáць у вадý

submersion [səbˈmɜ:rʒən] n. пагружэ́ньне, заглыбле́ньне *n.* (*у вадý*)

submission [səbˈmɪʃən] n. 1. падлéгласьць, падпарáдкаванасьць *f.* 2. паслухмя́насьць, пакóрлівасьць *f.* 3. перадáча *f.*, прапанаваáньне *n.* (*на разгля́д*)

submissive [səbˈmɪsɪv] adj. 1. падáтлівы; састýплівы. 2. паслухмя́ны; пакóрны

submit [səbˈmɪt] – v.i. **(-tt-)** здаваáцца; скараáцца; саступáць: ***submit to one's fate*** скарыцца сваёй дóлі

– v.t. 1. унóсіць, падаваáць: ***to submit a project for consideration*** унéсьці праéкт на разгля́д. 2. прызнаваáць, згаджáцца: ***I submit that more proof is needed*** Я прызнаю́, што патрэ́бныя дадаткóвыя дóказы

subordinate [səˈbɔ:rdmət] – adj. 1. падначáлены. 2. ніжэ́йшы рáнгам: ***A lieu-***

tenant is subordinate to a captain Лейтэна́нт ніжэ́йшы ра́нгам за капіта́на. 3. другара́дны. 4. Gram. дада́ны: ***subordinate clauses*** дада́ныя ска́зы
– n. паднача́лены -ага *m.*, паднача́леная *f.*
– v.t. [səˈbɔ:rdəmeɪt] падпарадко́ўваць

subordination [səˌbɔ:rdɪˈneɪʃən] n. 1. падпара́дкаванне, паднача́ленне *n.* 2. субардына́цыя *f.*

suborn [səˈbɔ:rn] v.t. 1. падкупля́ць сьве́дку. 2. схіля́ць (*да злачы́нства*)

subpoena [səˈpi:nə] – n., Law по́звa ў суд – v.t. выкліка́ць по́звай у суд

subscribe [səbˈskraɪb] v.t. 1. падпі́свацца (*на газэ́ту*): ***to subscribe to a magazine*** падпіса́цца на ча́сапіс. 2. падпі́свацца пад *чым*, падпі́сваць *што*: ***to subscribe the petition*** падпіса́ць пэты́цыю. 3. Figur. падтры́мваць, згаджа́цца: ***to subscribe to an idea*** падтрыма́ць ду́мку

subscriber [səbˈskraɪbər] n. падпі́шчык -а *m.*, падпі́шчыца *f.*

subscription [səbˈskrɪpʃən] *n.* 1. падпі́ска *f.* 2. по́дпіс -у *m.* (*пад дакумэ́нтам*)

subsequent [ˈsʌbsɪkwənt] adj. насту́пны, пазьне́йшы: ***subsequent events*** насту́пныя падзе́і
• ***subsequent to*** пасьля́; насту́пны: ***on the day subsequent to your call*** на другі́ дзень пасьля́ твайго́ звanку́

subserve [səbˈsɜ:rv] v.i. быць карысным, дапамага́ць: ***Chewing food well subserves digestion*** До́брае пераво́ўваньне е́жы дапамага́е страва-ва́ньню

subservient [səbˈsɜ:rviənt] n. 1. пако́рлівы, пада́тлівы. 2. прыслу́жлівы, падхалі́мскі. 3. карысны, прыда́тны

subside [səbˈsaɪd] v.i. 1. спада́ць: ***flood waters subsided*** павóдка спа́ла; ***The fever subsided*** Гара́чка спа́ла. 2. зьмянша́цца, суцішáцца, суніма́цца: ***The storm finally subsided*** Навальні́ца нарэ́шце сунялáся

subsidiary [səbˈsɪdieri] – adj. 1. дапамо́жны, дадатко́вы: ***a subsidiary occupation*** дадатко́вы заня́так. 2. падле́глы, другара́дны; адгалінава́ны. 3. субсыдыява́ны
– n. 1. дапамо́жнік -а *m.* 2. філія́л -у *m.*

subsidize [ˈsʌbsɪdaɪz] v.t. субсыдыява́ць, фінансава́ць

subsidy [ˈsʌbsədi] n., pl. **-dies** грашо́вая дапамо́га, субсы́дыя *f.*

subsist [səbˈsɪst] v.i. 1. ледзь існава́ць. 2. ліпе́ць

subsoil [ˈsʌbsɔɪl] n. падгле́ба *f.*

substance [ˈsʌbstəns] n. 1. матэ́рыя, субста́нцыя *f.*, рэ́чыва *n.*: ***Ice and water are the same substance in different forms*** Лёд і вада́ — то́е са́мае рэ́чыва ў ро́зных ста́нах. 2. існасьць, су́тнасьць *f.* 3. су́тнасьць *f.*, сэнс -у *m.*: ***Give the substance of your speech*** Перада́й су́тнасьць сваé прамо́вы. 4. гусьціня́, гушчыня́, кансыстэ́нцыя *f.* 5. бага́цьце, майно́ *n.*
• ***in substance*** а) па і́снасьці, па су́тнасьці; гало́ўным пара́дкам. б) фактычна

substandard [səbˈstændərd] adj. субстандáртны, ніжэ́йшай я́касьці

substantial [səbˈstænʃəl] adj. 1. матэрыя́льны, рэа́льны, рэ́чыўны. 2. салі́дны, грунто́ўны: ***substantial criticism*** здаро́вы крытыцы́зм; ***substantial evidence*** ва́жкае сьве́дчаньне. 3. вялі́кі, істо́тны, зна́чны: ***a substantial improvement*** зна́чнае ўдасканáленьне. 4. замо́жны, бага́ты

substantiality [səbˌstænʃiˈæləti] n., pl. **-ties** 1. рэчаíснасьць *f.* 2. ва́жкасьць, зна́чнасьць *f.* 3. сапра́ўдная ва́ртасьць *f.*

substantiate [səbˈstænʃieɪt] v.t. давóдзіць, пацьвярджа́ць

substation [ˈsʌbˌsteɪʃən] n. падста́нцыя *f.*, аддзяле́ньне *n.*: ***Besides the main post office in our city, there are six substations*** Акрамя́ гало́ўнае по́шты ў на́шым го́радзе ёсьць шэсьць пашто́вых аддзяле́ньняў

substitute [ˈsʌbstɪtu:t] – n. 1. заме́на, падме́на *f.* 2. наме́сьнік, засту́пнік -а *m.*, засту́пніца *f.* 3. дублёр -а *m.* (*пра акто́ра*), падме́на *f.* (*у спо́рце*)

– v.t. 1. падмяня́ць. 2. замяня́ць. 3. заступа́ць, замяня́ць (*на пра́цы*)

substitute teacher наста́ўнік на заме́ну; заме́на *m.& f.*

substitution [ˌsʌbstɪˈtu:ʃən] n. 1. заме́на, падме́на *f.* 2. заступа́ньне *n.*

substitutional [ˌsʌbstɪˈtu:ʃənəl] or **substitutive** [ˌsʌbstɪˈtu:tɪv] adj. заме́нны, які́ заступа́е

subtenant [ˌsʌbˈtenənt] n. субарэнда́тар, субкватара́нт -а *m.*

subterranean [ˌsʌbtəˈreɪnɪən] adj. 1. падзе́мны: ***a subterranean passage*** падзе́мны прахо́д *або́* ход. 2. сакра́тны, падпо́льны

subtitle [ˈsʌbˌtaɪtəl] – n. 1. падзагало́вак -ўку *m.* 2. субты́тры *pl.*

– v.t. 1. дава́ць падзагало́вак. 2. дава́ць субты́тры

subtle [ˈsʌtəl] adj. 1. даліка́тны; то́нкі, вы́танчаны: ***a subtle odour of perfume*** даліка́тны во́дар парфу́мы. 2. ледзь заўва́жны; тае́мны, зага́дкавы: ***a subtle smile*** ледзь заўва́жная ўсьме́шка. 3. хі́тры, спры́тны. 4. укра́длівы

subtract [səbˈtrækt] v. адыма́ць, адніма́ць

subtraction [səbˈtrækʃən] n. аднима́ньне *n.*

subtrahend [ˈsʌbtrəhend] n. адні́мнік -а *m.*, аднима́нае *n.*

subtropical [sʌbˈtrɑ:pɪkəl] adj. субтрапі́чны

subtropics [sʌbˈtrɑ:pɪks] n. субтро́пікі *pl.*

suburb [ˈsʌbɜ:rb] n. пры́гарад -у *m.*, прадме́сьце *n.*

• ***the suburbs*** пры́гарадныя раёны, прадме́сьці

suburban [səˈbɜ:rbən] adj. пры́гарадны, прадме́сны

subversion [səbˈvɜ:rʒən] n. 1. разбура́ньне, руйнава́ньне *n.* 2. падрыўна́я дзе́йнасьць

subversive [səbˈvɜ:rsɪv] – adj. падрыўны́, разбура́льны: ***subversive activities*** падрыўна́я дзе́йнасьць

– n. падпо́льшчык -а *m.*

subvert [səbˈvɜ:rt] v.t. 1. скіда́ць, зрына́ць (*ула́ду*). 2. разбура́ць, падрыва́ць

subway [ˈsʌbweɪ] n. 1. падзе́мка *f.*, мэтро́ *indecl.*, мэтрапалітэ́н -у *m.* 2. Brit. падзе́мны перахо́д, тунэ́ль -ю *m.*

succeed [səkˈsi:d] v.i. 1. удава́цца; скан-ча́цца по́сьпехам: ***His plans succeeded*** Яго́ныя пля́ны ўдалі́ся. 2. быць насту́пнікам: ***the generation that succeeds us*** бу́дучае пакале́ньне

success [səkˈses] n. уда́ча *f.*, по́сьпех -у *m.*: ***He has had little success in life*** Ямý ў жыцьці́ не шанцава́ла

successful [səkˈsesfəl] adj. 1. пасьпяхо́вы, уда́лы. 2. уда́члівы

succession [səkˈseʃən] n. 1. пасьлядо́ўнасьць *f.*, шэ́раг -у *m.*. 2. перае́мнасьць *f.*

• ***in succession*** адзі́н за адны́м, за́пар

successive [səkˈsesɪv] adj. пасьлядо́ўны, чарго́вы: ***It rained for three successive days*** Дождж ішо́ў тры дні за́пар

successor [səkˈsesər] n. насту́пнік -а *m.*, насту́пніца *f.*

succinct [səkˈsɪŋkt] adj. сьці́слы, вы́казаны ко́ратка і я́сна

succinctness [səkˈsɪŋktnəs] n. сьці́сласьць *f.*

succor, Brit. **succour** [ˈsʌkər] – n. 1. дапамо́га *f.*

– v.t. дапамага́ць; падтры́мваць

succory [ˈsʌkəri] n. цыко́рыя *f.*

succulence [ˈsʌkjələns] n. сакаві́тасьць *f.*

succulent [ˈsʌkjələnt] adj. 1. сакаўны́, сакаві́ты. 2. Figur. сакаві́ты (*пра стыль*), не сухі́. 3. мясі́сты

such [sʌtʃ] – adj. 1. гэ́ткі; такі́: ***I have never seen such a sight*** Я нікó́лі ня ба́чыў гэ́ткага відо́вішча. 2. такі́: ***He is such a liar*** Ён такі́ манюка

– pron. 1. гэ́ткі (такі́, які́): ***Take from the blankets such as you need*** Вы́беры сабе́ з пле́даў такі́, які́ табе́ патрэ́бны

• ***as such*** а) як такі́. б) сам сабо́ю

• ***such and such*** такі́ і такі́: ***The accident occurred in such and such place*** Выпа́дак зда́рыўся ў такі́м і такі́м ме́сцы

• ***such as*** а) такі, як. б) як пры́кладам: ***members of the dog family, such as the wolf, fox, and jackal*** такі́я прадстаўні́кі сямёйства саба́чых, як пры́кладам: воўк, ліс, і шака́л

suchlike ['sʌtʃlaɪk] adj. такі́, падо́бны: ***volcano eruptions and earthquakes and suchlike forces of nature*** вывяржэ́ньні вулька́наў, землятру́сы і падо́бныя зья́вы прыро́ды

suck [sʌk] – v.t. 1. смакта́ць, ссаць. 2. усмо́ктваць. 3. уця́гваць, засмо́ктваць (*пра вадзяны́ вір*)

– n. смакта́ньне, ссáньне; усмо́ктваньне *n.*

sucker ['sʌkər] n. 1. сысу́н -á *m.* 2. по́ршань -ня *m.* (*по́мпы*). 3. Sl. наі́ўны прасьця́к. 4. лядзя́ш на па́лачцы

suckle ['sʌkəl] v.t. 1. карміць грудзьмі́. 2. ссаць ма́тчыны гру́дзі. 3. жывіць; узгадо́ўваць

suckling ['sʌklɪŋ] n. сысу́н -á *m.* (*пра маладу́ю жывёліну*); смакту́н -á *m.* (*пра немаўля́*)

suction ['sʌkʃən] n. ссáньне, усмо́ктваньне *n.*

sudden ['sʌdən] adj. нечака́ны; раптóўны • ***all of a sudden*** раптóўна

suddenly ['sʌdənli] adv. ра́птам, раптóўна; неўспадзе́ўкі, зьнячэ́ўку, зьняна́цку

suds [sʌdz] n., pl. 1. пе́на *f.* 2. Sl. пі́ва *n.*

sue [su:] v.t. **sued, suing** 1. падава́ць у суд на *каго́*, пачына́ць судо́вую спра́ву су́праць *каго́*. 2. прасíць: ***Messengers came suing for peace*** Пасланцы́ прыйшлí прасíць мíру

suède or **suede** [sweɪd] – n. 1. за́мша *f.*, замш -у *m.* 2. іміта́цыя за́мшу (*тканíна*)

– adj. за́мшавы

suet ['su:ɪt] n. лой -ю *m.*

suety ['su:ɪti] adj. з ло́ю, ло́евы

suffer ['sʌfər] v.i. 1. паку́таваць, му́чыцца. 2. цярпе́ць, паку́тліва перажыва́ць. 3. зазнава́ць няўда́чу, стра́ты: ***His business suffered greatly during the war*** Яго́нае прадпрые́мства шмат пацярпе́ла ў ча́се вайны́. 4. цярпе́ць; трыва́ць: ***I will not suffer such insults*** Я не сьцярплю́ такíх абра́заў

sufferer ['sʌfərər] n. паку́тнік -а *m.*, паку́тніца *f.*

suffering ['sʌfərɪŋ] n. 1. паку́та *f.*, паку́ты *pl.*; бол|ь -ю *m.* 2. цярпе́ньне *n.*

suffice [sə'faɪs] v.i. 1. става́ць, быць дастатко́вым; хапа́ць: ***The money will suffice for one year*** Гро́шай хо́піць на адзíн год. 2. задаво́льваць: ***A small amount sufficed him*** Мало́й ко́лькасьці ямý хапíла

• ***suffice to say*** дастатко́ва сказа́ць

sufficiency [sə'fɪʃənsi] n., pl. **-cies** дастатко́васьць *f.*: ***sufficiency of provisions*** дастатко́вая ко́лькасьць прадýктаў харчава́ньня. 2. адпаве́днасьць, задаво́ленасьць *f.*

sufficient [sə'fɪʃənt] adj. дастатко́вы; задавальня́льны

sufficiently [sə'fɪʃəntli] adv. до́сыць, даво́лі, дастатко́ва

suffix ['sʌfɪks] n. су́фікс -а *m.*

suffocate ['sʌfəkeɪt] – v. душы́ць

– v.i. душы́цца; задыха́цца

suffocation [ˌsʌfə'keɪʃən] n. задушэ́ньне, уду́шша *n.*

suffrage ['sʌfrɪdʒ] n. 1. пра́ва го́ласу. 2. галасава́ньне *n.*

suffragette [ˌsʌfrə'dʒet] n. суфражы́стка *f.* (*удзе́льніца ру́ху за вы́барчыя правы́ жанчы́н*)

suffuse [sə'fju:z] v.t. разьлíва́ць, залíва́ць (*пра ва́дкасьці, ко́лер*); пакрыва́ць (*пра румя́нец*)

sugar ['ʃʊgər] – n. 1. цу́кар -ру *m.* 2. Chem. цу́кры *pl.*

– v.t. 1. пасыпа́ць цу́крам. 2. цукрава́ць, зацукро́ўваць

sugar beet цукро́вы бура́к

sugar bowl цукарні́ца

sugar cane цукро́вы трысьнёг

sugar-coat ['ʃʊgərˌkoʊt] v.t. 1. пакрыва́ць цу́крам. 2. Figur. прыхаро́шваць

sugar cube цу́кар-рафіна́д

sugar daddy, Sl. старэ́йшы мужчы́на, шчо́дры на падару́нкі маладо́й жанчы́не

sugar mill цукрава́рня *f.*
sugarplum ['ʃʊgərplʌm] n. ляндры́нка *f.*, лядзя́ш ледзяша́ *m.*
sugar tongs шчы́пцы для цу́кру
sugarworks ['ʃʊgərwɜ:rks] n. цукрава́рня *f.*, цукро́вы заво́д
sugary ['ʃʊgəri] adj. 1. цукро́вы; сало́дкі. 2. Figur. саладжа́вы, ліслі́вы
suggest [səg'dʒest] v.t. 1. падка́заць. 2. прапано́ўваць; ра́іць. 3. намяка́ць, рабі́ць намі́нку
suggestion [səg'dʒestʃən] n. 1. прапано́ва, ду́мка *f.*: ***to make a suggestion*** пада́ць ду́мку, прапано́ўваць. 2. намёк -у *m.* 3. падка́зка *f.*
suggestive [səg'dʒestɪv] adj. то́е, што наво́дзіць на ду́мку
suicidal [ˌsu:ɪ'saɪdəl] adj. 1. самагу́бны. 2. згу́бны, пагі́бельны
suicide ['su:ɪsaɪd] n. 1. самагу́бства *n.* 2. самагу́бца *m. & f.*
• ***commit suicide*** ско́нчыць самагу́бствам
suit [su:t] – n. 1. гарні́ту́р, касьцю́м -а *m.* 2. Law суд о́вая спра́ва. 3. масьць *f.* (*у ка́ртах*). 4. заляца́ньне, сва́таньне *n.*
– v.t. 1. дастасо́ўваць, дапасо́ўваць: ***well-suited colors*** до́бра дапасава́ныя ко́леры. 2. спрыя́ць, адпавяда́ць. 3. спраўля́ць во́пратку. 4. быць адпаве́дным, падыхо́дзіць: ***Which day suits you best?*** Які́ дзень найле́пш табе́ падыхо́дзіць? 5. падыхо́дзіць, пасава́ць: ***Her hat suits her*** Капялю́ш ёй пасу́е. 6. дагаджа́ць: ***It is hard to suit everyone*** Ця́жка ўсі́м дагадзі́ць
• ***follow suit*** ісьці́ сьле́дам, ісьці́ за прыкладам
• ***suit oneself*** рабі́ць па-сво́йму
• ***suit yourself*** рабі́, як хо́чаш
suitable ['su:təbəl] adj. 1. адпаве́дны. 2. зда́тны, прыда́тны, прыго́дны
suitcase ['su:tkeɪs] n. чамада́н -а *m.*, вали́зка *f.*, куфэ́рлак -ка *m.*
suit coat or **suitcoat** ['su:tkoʊt] n. пінжа́к -а́ *m.* (*мужчы́нскі*), жаке́тка *f.* (*жано́чая*)
suite [swi:t] n. 1. апартамэ́нты *pl.*; ну́мар люкс (*у гатэ́лі*). 2. камплє́кт мэ́блі. 3. Mus. сюі́та *f.* 4. сьві́та *f.*, картэ́ж -у *m.*
suiting ['su:tɪŋ] n. ткані́на на гарні́ту́ры
suitor ['su:tər] n. 1. кавале́р, залётнік -а *m.* 2. Law пазо́ўнік -а, ісьце́ц істца́ *m.* 3. про́сьбіт -а *m.*
Sukkoth ['sʊkəs] n. ку́чкі *pl.*, суко́т (*юдэ́йскае сьвя́та*)
sulfate or **sulphate** ['sʌlfeɪt] n. сульфа́т -у *m.*
sulfid(e) or **sulphid(e)** ['sʌlfaɪd] n. сульфі́д -у *m.*
sulfur or **sulphur** ['sʌlfər] n. 1. се́ра *f.* 2. се́рка *f.*
sulfuric or **sulphuric** [sʌl'fjʊrɪk] adj. се́рны: ***sulfuric acid*** се́рная кісла́та
sulk [sʌlk] v.i. надзіма́цца; насу́пліваца; крыі́ўдзіцца; крыві́цца
sulky ['sʌlki] adj. надзьму́ты; незадаво́лены; сярдзі́ты, змро́чны
sullen ['sʌlən] adj. 1. надзьму́ты, насу́плены, у дрэ́нным настро́і, сярдзі́ты. 2. Figur. змро́чны, пану́ры, цёмны: ***The sullen skies threatened rain*** Змро́чнае не́ба пагража́ла дажджо́м
sullied ['sʌlid] adj. запэ́цканы, забру́джаны; папля́млены
sully ['sʌli] v.t. **-llied, -llying** пэ́цкаць, бру́дзіць; пля́міць
sultan ['sʌltən] n. султа́н -а *m.*
sultry ['sʌltri] adj. 1. гара́чы, па́рны, ду́шны: ***sultry weather*** ду́шнае надво́р'е. 2. сапрэ́лы (*ад гарачыні́*) 3. Figur. пажа́длівы: ***a sultry look*** пажа́длівы по́зірк
• ***sultry sun*** распа́ленае со́нца
sum [sʌm] – n. су́ма, ко́лькасьць: ***He paid a large sum for the house*** Ён заплаці́ў вялі́кую су́му за дом
– v.t. **(-mm-)** 1. склада́ць, знахо́дзіць су́му, падсумо́ўваць. 2. зьбіра́ць: ***to sum up strength*** сабра́ць сі́лы
• ***in sum*** адны́м сло́вам, ко́ратка ка́жучы
• ***sum total*** агу́льная су́ма
summarize ['sʌməraɪz] v.t. **-rized, -rizing** падсумо́ўваць, рэзюмава́ць, падво́дзіць вы́нікі

summary ['sʌmərɪ] – n., pl. **-ries** падсумава́ньне; рэзюмэ́ *n.* : ***The history book had a summary at the end of each chapter*** У падру́чніку гісто́рыі ў канцы́ ко́жнага разьдзе́лу было́ зьме́шчанае рэзюмэ́
– adj. 1. сьці́слы, каро́ткі: ***summary account*** каро́ткая справаздача. 2. безадкла́дны: ***summary dismissal*** звальне́ньне на ме́сцы
summer ['sʌmər] – n. ле́та *n.*
– adj. ле́тні
• ***in summer*** уле́тку.
• ***summer clothes*** ле́тняя во́пратка
summer cottage, house ле́тні дом, да́ча *f.*, ле́цішча *n.*
summerhouse ['sʌmərhaʊs] n. альта́нка *f.*
summer resort ле́тні куро́рт
summertime ['sʌmərtaɪm] n. ле́тняя пара́, ле́та *n.*
• ***in the summertime of life*** у ро́сквіце сі́лаў
summit ['sʌmɪt] n. 1. верх -у *m.*, вяршы́ня *f.* 2. зэні́т -у *m.*: ***the summit of a career*** зэ́ніт кар'е́ры. 3. са́міт -у *m.*, канфэрэ́нцыя, нара́да ў вярха́х
summon ['sʌmən] v.t. 1. выкліка́ць: ***He was summoned to the court*** Яго́ вы́клікалі ў суд. 2. скліка́ць: ***to summon an assembly*** скліка́ць зьезд. 3. заклі́ка́ць: ***to summon men to defend their country*** заклі́ка́ць людзе́й бараніць сваю́ краі́ну
• ***summon one's courage*** набра́цца адва́гі
summons ['sʌmənz] n., pl. 1. по́звa *f.* 2. по́звa ў суд: ***He received a summons for fast driving*** Ён атрыма́ў судо́вую по́зву за ху́ткую язду́
sumptuous ['sʌmptʃuəs] adj. пы́шны, раско́шны: ***a sumptuous banquet*** пы́шны банке́т
sun [sʌn] – n. 1. со́нца *n.* 2. со́нечнае сьвятло́ й цяпло́: ***to sit in the sun*** сядзе́ць на со́нцы
– v.t. **(-nn-)** выстаўля́ць на со́нца; грэць, сушы́ць на со́нцы
• ***from sun to sun*** ад усхо́ду да захо́ду со́нца
• ***under the sun*** на зямлі́, на сьве́це
sun-baked ['sʌnbeɪkt] adj. 1. су́шаны на со́нцы: ***sun-baked pottery*** су́шаныя на со́нцы ганча́рныя вы́рабы. 2. сьцьвярдзе́лы, перасо́хлы на со́нцы: ***the sun-baked earth*** вы́палаеная со́нцам зямля́
sun bath со́нечныя ва́нны
sunbathe ['sʌnbeɪð] v.i. загара́ць, грэ́цца на со́нцы
sunbeam ['sʌnbi:m] n. со́нечны праме́нь
sunburn ['sʌnbɜ:rn] – n. со́нечны апа́л, зага́р ску́ры
– v.t. спаліць ску́ру на со́нцы
– v.i. спаліцца на со́нцы
sunburnt ['sʌnbɜ:rnt] v., *p.t. and p.p. of* **sunburn** загарэ́лы, апа́лены со́нцам
sunburst ['sʌnbɜ:rst] n. про́бліскі со́нца
sundae ['sʌndeɪ] n. маро́зіва з сыро́пам, садавіно́й, арэ́хамі
Sunday ['sʌndeɪ] n. нядзе́ля *f.*
Sunday school нядзе́льная шко́ла (*найчасьце́й для навуча́ньня рэлі́гіі*)
sundial ['sʌndaɪəl] n. со́нечны гадзі́ньнік
sundown ['sʌndaʊn] n. за́хад со́нца
sundried ['sʌndraɪd] adj. вы́сушаны на со́нцы
sundry ['sʌndri] adj. разная́кі, разнаста́йны: ***sundry trinkets*** ро́зная дро́бязь
sunfast ['sʌnfæst] adj. які́ не ліня́е на со́нцы
sunflower ['sʌnˌflaʊr] n. слане́чнік -а *m.*: ***sunflower seeds*** се́мечкі
sung [sʌŋ] v., *p.t., p.p. of* **sing**
sunglasses ['sʌnˌglæsəz] n., pl. со́нечныя акуля́ры
sunk [sʌŋk] v., *p.t., p.p. of* **sink**
sunken [sʌŋkən] adj. 1. зато́плены: ***a sunken ship*** зато́плены карабе́ль. 2. запа́лы: ***sunken cheeks*** запа́лыя шчо́кі
sunlight ['sʌnlaɪt] n. со́нечнае сьвятло́
sunlit ['sʌnlɪt] adj. асьве́тлены со́нцам
sunny ['sʌni] adj. 1. со́нечны. 2. сьве́тлы; ра́дасны; шчасьлі́вы: ***a sunny smile*** шчасьлі́вая ўсьме́шка

sun porch вэра́нда *f.*

sunproof ['sʌnpru:f] adj. со́нцанепранікальны, які́ не выгара́е на со́нцы: ***These sunproof curtains will not fade*** Гэ́тыя со́нцанепранікальныя фіра́нкі ня вы́гараць

sunray ['sʌnreɪ] n. со́нечны прамень

sunrise ['sʌnraɪz] n. 1. усхо́д со́нца. 2. зо́лак -ку *m.*, сьвіта́ньне *n.*, сьвіта́нак, до́сьвітак -ку *m.*: ***at sunrise*** на до́сьвітку

sunset ['sʌnset] n. 1. за́хад со́нца. 2. змрок -у *m.*, зьмяркава́ньне *n.*, прыцемкі *pl.*

sunshade ['sʌnʃeɪd] n. 1. заслóна ад со́нца; парасо́н -а *m.*; маркі́за *f.* (*над вакно́м, дзьвяры́ма*)

sunshine ['sʌnʃaɪn] n. 1. со́нечнае сьвятло́ *або́* праме́ньне. со́нечнасьць *f.* 2. со́нца *n.*, пагóда *f.*, со́нечнае надво́р'е. 3. шча́сьце *n.*

sunspot ['sʌnspɑ:t] n. пля́ма на со́нцы

sunstroke ['sʌnstrouk] n. со́нечны ўда́р

suntan ['sʌntæn] n. 1. со́нечны загáр. 2. сьве́тлы жаўта́ва-руды́ ко́лер
– adj. сьве́тлы жаўта́ва-руды́

suntanned ['sʌntænd] adj. загарэ́лы на со́нцы

sunward(s) ['sʌnwərdz] adv. у бок со́нца

sup I [sʌp] v., **(-pp-)** вячэ́раць; дава́ць вячэ́ру, частава́ць вячэ́рай

sup II [sʌp] – v., **(-pp-)** сёрбаць; піць малы́мі глыткáмі
– n. малы́ глыто́к, каўтло́к -ка́ *m.*

super ['su:pər] – n. Informal статы́ст -а *m.*, статы́стка *f.* (*у тэа́тры*)
– adj., Figur. дасканáлы; надзвычáйны, цудо́ўны

superabundance [ˌsu:pərə'bʌndəns] n. празьме́рнасьць *f.*, збы́так -ку *m.*: ***a superabundance of rain*** празьме́рнасьць дажджу́

superb [su'pɜ:rb] adj. ве́лічны; пы́шны, раскóшны, цудо́ўны: ***a superb dinner*** багáты абе́д

superconductivity [ˌsu:pərˌkɑ:ndʌk'tɪvəti] n., Phys. звышправо́днасьць *f.*

superficial [ˌsu:pər'fɪʃəl] adj. 1. паве́рхневы, во́нкавы: ***His burns were superficial and soon healed*** Апёкі ў яго́ былі паве́рхневыя і ху́тка загаі́ліся. 2. павярхо́ўны: ***a superficial education*** павярхо́ўная адука́цыя

superficially [ˌsu:pər'fɪʃəli] adv. павярхо́ўна; паве́рхнева

superfine ['su:pərfaɪn] adj. 1. ве́льмі то́нкі, далікáтны. 2. найвышэ́йшай я́касьці

superfluity [ˌsu:pər'flu:əti] n., pl. **-ties** 1. лішлак, збы́так -ку *m.* 2. празьме́рнасьць *f.*: ***Luxuries are superfluities*** Прадме́ты раскóшы — гэ́та збы́так

superfluous [su:'pɜ:rfluəs] adj. 1. лішні: ***In telegrams omit superfluous words*** У тэлегрáмах ня ўжывáйце лішніх слоў. 2. непатрэ́бны

superfluously [su:'pɜ:rfluəsli] adv. лішне, празьме́рна

superhuman [ˌsu:pər'hju:mən] adj. надчалаве́чы, звышчалаве́чы: ***a superhuman effort*** надчалаве́чае намагáньне

superintend [ˌsu:pərɪn'tend] v.t. наглядáць (*за рабо́тай*), загáдваць, кіраваць

superintendent [ˌsu:pərɪn'tendənt] n. наглядчык, дагляда́чык, загáдчык -а *m.*

superior [su:'pɪriər] – adj. 1. вышэ́йшы выдáтны. 2. ле́пшага гату́нку, першарáдны: ***a superior blend of coffee*** першарáдны гату́нак кáвы. 3. вышэ́йшы станóвішчам, рáнгам, вáжнасьцю: ***a superior officer*** стáршы афіцэ́р. 4. ганары́сты, пагáрдлівы: ***superior manners*** ганары́стыя павóдзіны
– n. 1. стáршы -ага *m.*, начáльнік -а *m.* 2. настаяцель -я *m.*, настаяцельніца *f.*: ***Father Superior*** ігу́мен -а *m.*; ***Mother Superior*** ігу́меньня *f.*
• ***superior to*** а) вышэ́йшы за, які́ перавышáе. б) ле́пшы, дасканáлейшы за: ***A wise man is superior to flattery*** Разу́мнага чалаве́ка ліcьлівасьцю не возьмеш

superiority [su:ˌpɪri'ɔ:rəti] n. вышэ́йшасьць *f.*

superlative [su:ˈpɜ:rlətɪv] – adj. 1. найбо́льшы, ве́льмі вялі́кі, веліза́рны; найвышэ́йшы. 2. перабо́льшаны; празьме́рны: ***Such superlative praise could not be sincere*** Тако́е празьме́рнае расхва́льваньне не магло́ быць шчы́рым
– n. 1. верх -у *m.* (*даскана́ласьці, адва́гі*). 2. Gram. найвышэ́йшая ступе́нь
• ***talk in superlatives*** перабо́льшваць
superman [ˈsu:pərmæn] n., pl. **-men** супэрмэ́н, звышчалаве́к -а *m.*
supermarket [ˈsu:pərˌmɑ:rkət] n. супэрма́ркет -у *m.*
supernational [ˈsu:pərˌnæʃənəl] adj. *гл.* **supranational**
supernatural [ˈsu:pərˌnætʃərəl] adj. звышнатура́льны, надпрыро́дны
• ***the supernatural*** звышнатура́льныя зья́вы
supernumerary [ˌsu:pərˈnu:mərəri] – adj. дадатко́вы, звышшта́тны.
– n. 1. звышшта́тны працаўні́к. 2. статы́ст -а *m.*, статы́стка *f.* (*у тэа́тры*)
superpose [ˈsu:pərˌpoʊz] v.t. накладаць (*адну́ рэч на другу́ю*)
superpower [ˈsu:pərˌpaʊər] n. 1. звышдзяржа́ва *f.* 2. звышсі́ла *f.*
supersaturate [ˌsu:pərˈsætʃəreɪt] v.t. перанасыча́ць (*раство́р*)
supersaturation [ˌsu:pərˌsætʃəˈreɪʃən] n. 1. перанасыча́ньне *n.* 2. перанасы́чанасьць *f.*
superscript [ˈsu:pərskrɪpt] – adj. надрадко́вы
– n. надрадко́вы знак (*лік, лі́тара*)
supersonic [ˌsu:pərˈsɑ:nɪk] – adj. звышгукавы́
superstition [ˌsu:pərˈstɪʃən] n. забабо́н -у *m.*
superstitious [ˌsu:pərˈstɪʃəs] adj. забабо́нны
supervise [ˈsu:pərvaɪz] v.t. 1. наглядаць, кіраваць: ***He supervised the group's activities*** Ён кірава́ў дзе́йнасьцю гру́пы. 2. зага́дваць
supervision [ˌsu:pərˈvɪʒən] n. кірава́ньне *n.*; нагля́д -у *m.*: ***The house was built under the careful supervision of an architect*** Дом будава́ўся пад ува́жным нагля́дам архітэ́ктара
supervisor [ˈsu:pərvaɪzər] n. нагля́дчык -а *m.*, нагля́дчыца *f.*; зага́дчык -а *m.*, зага́дчыца *f.*; кіраўні́к -á *m.*, кіраўні́ца *f.*
supper [ˈsʌpər] n. вячэ́ра *f.*: ***to have supper*** вячэ́раць
supplant [səˈplænt] v.t. выжыва́ць, выцясня́ць; падмяня́ць
supple [ˈsʌpəl] – adj. 1. гну́ткі, мя́ккі: ***a supple birch tree*** гну́ткая бяро́за; ***a supple leather*** мяккая ску́ра. 2. падаўкі́, пада́тлівы, згаво́рлівы (*пра чалаве́ка*). 3. ліслі́вы
– v. рабі́ць (-ца) гну́ткім
supplement [ˈsʌplɪmənt] – n. дапаўне́ньне *n.*, дада́так -ку *m.*
– v.t. дапаўня́ць
supplemental [ˌsʌplɪˈmentəl] adj. дапаўня́льны
supplementary [ˌsʌplɪˈmentəri] adj. дадатко́вы: ***supplementary instruction*** дадатко́вае навуча́ньне, інструкта́ж -у *m.*
suppliant [ˈsʌpliənt] – adj. умо́льны, упраша́льны: ***a suppliant message for help*** умо́льная про́сьба аб дапамо́зе
– n. пако́рлівы про́сьбіт
supplicant [ˈsʌplɪkənt] n., adj. *гл.* **suppliant**
supplicate [ˈsʌplɪkeɪt] v.t. умо́льваць, пако́рліва ўпро́шваць. 2. шчы́ра малі́цца
supplication [ˌsʌplɪˈkeɪʃən] n. 1. умо́льваньне, упро́шваньне *n.* 2. шчы́рая, пако́рлівая про́сьба *або́* малі́тва
supply I [səˈplaɪ] – v.t. **-pplied, -pplying** 1. дастаўля́ць; забясьпе́чваць. 2. закрыва́ць, вяртаць: ***to supply a deficiency*** вярта́ць за недахо́п, закрыва́ць нястачу. 3. задавальня́ць (*жада́ньне, патрэ́бы*). 4. замяня́ць, папаўня́ць. 5. часо́ва заступа́ць
– n., pl. **-pplies** 1. забесьпячэ́ньне, даста́ўка, паста́ўка *f.* 2. запа́с -у *m.*: ***a supply of coffee*** запа́сы ка́вы. 3. пра-

панава́ньне *n.*: ***supply and demand*** прапано́ва і по́пыт. 4. часо́вы засту́пнік. 5. бюджэ́тныя асыгнава́ньні
• ***in short supply*** дэфіцы́тны
• ***in supply*** наяўны: ***Apples are in plentiful supply this year*** Яблыкаў сёлета ў по́ўным доста́тку

supply II [ˈsʌpəlli] adv. гну́тка, мя́кка

support [səˈpɔ:rt] – v.t. 1. падпіра́ць, трыма́ць: ***Walls support the roof*** Сце́ны трыма́юць страху́. 2. падтры́мваць: ***Hope supports us in trouble*** Надзе́я падтры́мвае нас у бядзе́. 3. утры́мваць: ***to support one's family*** утры́мваць сваю́ сям'ю́. 4. падтры́мваць, быць прыхі́льнікам: ***He supports the Liberals*** Ён падтры́мвае лібэра́лаў. 5. падмацо́ўваць: ***The facts support his statement*** Фа́кты падмацо́ўваюць ягóнае цьве́рджаньне
– n. 1. падтры́мка, дапамо́га, падпо́ра *f.*: ***He needs our support*** Яму́ патрэ́бная на́шая падтры́мка. 2. утрыма́ньне *n.* 3. падпо́рка *f.*

supporter [səˈpɔ:rtər] n. 1. прыхі́льнік -а *m.* 2. той, хто падтры́мвае *або́* ўтрымо́ўвае

suppose [səˈpouz] v.i. 1. дапушча́ць, дапуска́ць: ***Suppose you are late, what excuse will you make?*** Дапу́сьцім, вы спазьні́ліся, чым вы бу́дзеце апра́ўдвацца? 2. меркава́ць; ду́маць, уважа́ць: ***I suppose she will come as usual*** Мяркую́, што яна́ прыйдзе, як звыча́йна; ***He was supposed to come yesterday*** Ён ме́ўся прыйсьці́ ўчо́ра

supposing [səˈpouzɪŋ] conj. у выпа́дку, што; калі́ б: ***Supposing it rains, shall we still go?*** Калі б ішо́ў дождж, ці мы ўсё адно́ по́йдзем?

supposition [ˌsʌpəˈzɪʃən] n. дапушчэ́ньне, меркава́ньне *n.*

suppository [səˈpɑ:zətɔ:ri] n., pl. **-ries,** Med. супазыто́рый -я *m.*, сьве́чка *f.*

suppress [səˈpres] v.t. 1. душы́ць (*паўста́ньне, бунт*). 2. стры́мваць (*зяха́ньне, плач*). 3. прытры́мваць, прыпыня́ць: ***to suppress a newspaper*** прыпыні́ць газэ́ту. 4. стры́мваць, спыня́ць: ***to suppress bleeding*** спыні́ць крывацёк. 5. зато́йваць: ***to suppress the truth*** затаі́ць пра́ўду

suppression [səˈpreʃən] n. 1. здушэ́ньне *n.* (*бу́нту*). 2. стрыма́ньне, абмежава́ньне: ***suppression of human rights*** абмежава́ньне правоў чалаве́ка. 3. зато́йваньне

suppurate [ˈsʌpjəreɪt] – v.t. 1. нагно́йваць (*ра́ну*), вы́клікаць гнае́ньне, запале́ньне.
– v.i. гнаі́цца (*пра ра́ну*), выдзяля́ць гной

suppuration [ˌsʌpjəˈreɪʃən] n. 1. гнае́ньне, нарыва́ньне *n.* (*ра́ны*). 2. гной -ю *m.* (*з ра́ны*)

suppurative [ˈsʌpjərətɪv] – adj. нагно́ены, гно́йны, гнаявы́ (*пра ра́ну*)
– n. сро́дак, які́ прысьпяша́е нагно́йваньне

supranational [ˌsu:prəˈnæʃənəl] adj. наднацыяна́льны: ***supranational corporations*** наднацыяна́льныя карпара́цыі

supremacy [suˈpreməsi] n. 1. вяршэ́нства *n.*, супрэма́цыя *f.* 2. найвышэ́йшая ўла́да, перава́га (*сі́лы, ула́ды*)

supreme [suˈpri:m] adj. 1. найвышэ́йшы: ***a supreme ruler*** найвышэ́йшы валада́р; ***supreme power*** найвышэ́йшая ўла́да. 2. найбо́льшы, скра́йні: ***supreme courage*** надзвыча́йная адва́га. 3. крыты́чны, экстрэма́льны (*мо́мант*)
• ***the supreme sacrifice*** найвышэ́йшая ахвя́ра; ахвя́ра жыцьцём

Supreme Court Найвышэ́йшы Суд, Вярхо́ўны Суд

surcharge [ˈsɜ:rtʃɑ:rdʒ] – n. 1. дапла́та, прыпла́та *f.* 2. перагру́зка *f.* 3. дадатко́вы пада́так
– v.t. 1. спаганя́ць дадатко́вую пла́ту. 2. пераацэ́ньваць, выстаўля́ць завы́шаную цану́. 3. перагружа́ць

sure [ʃʊr] – adj. 1. пэ́ўны, упэ́ўнены; перакана́ны: ***We are sure to meet him*** Мы ўпэ́ўненыя, што спаткае́мся з

ім; ***I am sure of his guilt*** Я ўпэ́ўнены, што ён вінава́ты; ***sure proof*** бясспрэ́чны до́вад. 2. пэ́ўны, надзе́йны: ***a sure messenger*** надзе́йны пасланец
– adv., Informal напэ́ўна
• ***be sure*** глядзі́, не забу́дзься: ***Be sure to lock the door*** Не забу́дзься замкну́ць дзьве́ры
• ***for sure,*** Informal напэ́ўна: ***He's coming for sure*** Ён прыйдзе напэ́ўна; ***That's for sure*** Гэ́та пэ́ўна
• ***make sure*** упэ́ўніцца, перакана́цца: ***Make sure you have the key*** Глядзі́, каб меў ключ
• ***to be sure*** зразуме́ла, вядо́ма, безумо́ўна

sureness [ˈʃʊrnəs] n. пэ́ўнасьць, упэ́ўненасьць *f.*

surely [ˈʃʊrli] adv. 1. бясспрэ́чна, пэ́ўна, упэ́ўнена. 2. бада́й, хіба́: ***Surely it will not rain all week*** Дождж бада́й ня бу́дзе йсьці цэ́лы ты́дзень
• ***slowly but surely*** павóлі, але́ ўпэ́ўнена

surety [ˈʃʊrəti] n., pl. **-ties** 1. гара́нтыя, зару́ка, пару́ка *f.* 2. паручы́цель -я, пару́чаньнік -а *m.*, паручы́целька, пару́чаньніца *f.*: ***to stand*** or ***be surety for*** паручы́цца за *каго́*

surf [sɜ:rf] n. прыбо́й -ю *m.*

surface [ˈsɜ:rfəs] – n. 1. пове́рхня *f.*, верх -у *m.* 2. бок -у *m.*: ***A cube has six surfaces*** Куб ма́е шэсьць бако́ў. 3. ве́рхні пласт (*сьне́гу, зямлі́*). 4. Geom. пло́шча *f.*
– adj. 1. пове́рхневы. 2. Informal павярхо́ўны: ***surface knowledge*** павярхо́ўныя ве́ды
– v.t. 1. пакрыва́ць: ***to surface a road*** пакры́ць даро́гу. 2. вывóдзіць на пове́рхню: ***to surface a submarine*** вы́весьці падво́дную ло́дку на пове́рхню
– v.i. усплыва́ць на пове́рхню

surface mail назе́мная по́шта

surface tension, Phys. пове́рхневае нацяжэ́ньне

surface to surface missile раке́та ты́пу зямля́-зямля́

surge [sɜ:rdʒ] – v. 1. уздыма́цца й апада́ць, хвалява́цца (*пра ваду́, нато́ўп*). 2. раптóўна наплыва́ць (*пра кроў, ду́мкі, пачу́цьці*)
– n. 1. вялі́кая хва́ля; бу́рнае хвалява́ньне. 2. Figur. бу́рныя пачу́цьці, пры́ступ -у *m.*: ***a surge of anger swept over him*** пры́ступ зло́сьці апанава́ў яго́

surgeon [ˈsɜ:rdʒən] n. хіру́рг -а *m.*

surgery [ˈsɜ:rdʒəri] n. 1. хірургі́я *f.* 2. апэра́цыя *f.* 3. кабіне́т хіру́ргa, апэрацы́йная за́ля

surgical [ˈsɜ:rdʒɪkəl] adj. хірургі́чны

surly [ˈʃɜ:rli] adj. зло́сны; не ў гумóры, бурклі́вы

surmise [sərˈmaɪz] – v.i. прыпушча́ць; меркава́ць, здага́двацца
– n. 1. прыпушчэ́ньне, меркава́ньне *n.* 2. здага́дка *f.*

surmount [sərˈmaʊnt] v.i. 1. перамага́ць, пераадóльваць: ***He surmounted many dificulties*** Ён перамóг шмат цяжкасьцяў. 2. вы́сіцца, узвыша́цца (*над навако́льлем*). 3. перахóдзіць: ***to surmount a hill*** перайсьці ўзго́рак

surname [ˈsɜ:rneɪm] – n. 1. про́зьвішча *n.* 2. мяну́шка *f.*: прыйме́ньне *n.*: ***Prince Usiaslau of Polacak had the surname "the Wizard"*** По́лацкі князь Усяслáў меў прыйме́ньне «Чарадзе́й»
– v.t. 1. называ́ць *каго́* па про́зьвішчы. 2. дава́ць і́ншае імя́

surpass [sərˈpæs] v.t. перасяга́ць; перавыша́ць, перавыша́ць; ***to surpass expectations*** перавы́сіць усе́ спадзява́ньні

surpassing [sərˈpæsɪŋ] adj. найдасканалейшы, недася́жны, нераўзы́йдзены

surplice [ˈsɜ:rpləs] n. стыха́р -а́ *m.*

surplus [ˈsɜ:rplʌs] – n. лі́шак -ку *m.*, рэ́шта, аста́ча *f.*
– adj. 1. лі́шні, збыткóўны, надме́рны. 2. рэ́шткавы, аста́ткавы

surprise [sərˈpraɪz] – n. 1. зьдзіўле́ньне *n.* 2. неспадзява́нка *f.*, сюрпры́з -у *m.*
– adj. неспадзява́ны: ***surprise attack*** неспадзява́ны напа́д

– v.i. 1. зьдзіўля́ць, ура́жваць 2. напада́ць, засьпява́ць зьняна́цку

• ***take by surprise*** засьпява́ць зьняна́цку

surprised [sərˈpraɪzd] adj. зьдзі́ўлены, ура́жаны; засьпе́ты зьняна́цку

surprising [sərˈpraɪzɪŋ] adj. неспадзява́ны; дзі́ўны

surprisingly [sərˈpraɪzɪŋli] adv. неспадзява́на; на дзі́ва

surreal [səˈri:əl] adj. нерэа́льны, дзі́ўны

surrealism [səˈri:əˌlɪzəm] n. сюррэалі́зм -у *m.*

surrealistic [səˌri:əˈlɪstɪk] adj. сюррэалі́стычны

surrender [səˈrendər] – n. здава́ньне *n.*, зда́ча, адмо́ва, сту́пка *f.*; капітуля́цыя *f.*

– v.t. 1. здава́ць. 2. адмаўля́цца, саступа́ць

– v.i. здава́цца, капітулява́ць; адда-ва́цца *чаму́*: ***to surrender oneself to grief*** адда́цца журбе́, го́ру

surreptitious [ˌsɜ:rəpˈtɪʃəs] adj. патае́мны, зро́блены ці́шко́м

surreptitiously [ˌsɜ:rəpˈtɪʃəsli] adv. патае́мна, пакрыёма, ці́шко́м

surrogate [ˈsɜ:rəgət] – n. 1. сурага́т, заме́ньнік -у *m.* 2. судзьдзя́ ў спра́вах спа́дчыны і апе́кі

– adj. падстаўны́: ***surrogate mother*** падстаўна́я ма́ці

– v.t. заступа́ць, замяня́ць *каго́ кім*

surround [səˈraʊnd] v.i. абкружа́ць, акаля́ць, атача́ць, абступа́ць

surrounding [səˈraʊndɪŋ] adj. навако́льны

surroundings [səˈraʊndɪŋz] n. 1. мясцо́васьць *f.*, вако́ліцы *pl.* 2. асяро́дзьдзе, атачэ́ньне *n.*

surtax [ˈsɜ:rtæks] n. дадатко́вы пада́так

surveillance [sərˈveɪləns] n. нагля́д -у *m.*; сачэ́ньне *n.*: ***under surveillance*** пад нагля́дам

survey [sərˈveɪ] – v.t. 1. аглядаць, 2. дасьле́даваць, інспэктава́ць

– n. [ˈsɜ:rveɪ] 1. агля́д -у *m.*, інспэ́кцыя *f.* 2. межава́ньне *n.*, землямерная *або́* тапаграфі́чная зды́мка

surveyor [sərˈveɪər] n. 1. землямер, тапо́граф, камо́рнік -а *m.* 2. інспэ́ктар, кантралёр -а *m.*

survival [sərˈvaɪvəl] n. 1. выжыва́ньне *n.* 2. перажы́так -ку *m.*

survive [sərˈvaɪv] – v.t. перажыва́ць, перано́сіць

– v.i. выжыва́ць

survivor [sərˈvaɪvər] n. ацале́лы; той, хто вы́жыў

susceptibility [səˌseptəˈbɪlətɪ] n. ура́жлівасьць, успрыма́льнасьць *f.*

susceptible [səˈseptəbəl] adj. 1. ура́жлівы, чу́лы, чульлі́вы: ***susceptible nature*** ура́жлівая нату́ра. 2. успрыма́льны, пада́тлівы, схільны: ***a theory susceptible of proof*** тэо́рыя, яку́ю лёгка дове́сьці

suspect [səˈspekt] – v.i. 1. падазрава́ць. 2. здага́двацца, меркава́ць; ду́маць: ***You are pretty tired after your journey, I suspect*** Я ду́маю, ты мо́цна змо́раны пасьля́ падаро́жжа. 3. сумнява́цца: ***I suspect the authenticity of the document*** Я сумнява́юся ў аўтэнты́чнасьці дакумэ́нта

– n. [ˈsʌspekt] падазрава́ны -ага *m.*, падазрава́ная *f.*

– adj. падазро́ны; які́ выклі́ка́е падо́зраньне

suspend [səˈspend] v. 1. падве́шваць: ***The lamp was suspended from the ceiling*** Ля́мпа была́ падве́шаная да сто́лі. 2. спыня́ць, прыпыня́ць: ***to suspend work*** прыпыні́ць пра́цу. 3. прыпыня́ць часо́ва, адкладаць: ***The court suspended judgment until next Monday*** Суд адкла́ў прысу́д да насту́пнага панядзе́лка. 4. часо́ва звальня́ць (*з па-са́ды*); часо́ва выключа́ць. 5. стры́маць: ***to suspend payment*** стрыма́ць спла́ту (*даўго́ў*)

suspenders [səˈspendərz] n. падця́жкі, шле́йкі *pl. only*

suspense [səˈspens] n. 1. напру́жанасьць, няпэ́ўнасьць, нерашу́часьць *f.* 2. непако́й -ю *m.*, трывога *f.*

suspension bridge падве́сны мост

suspicion [səˈspɪʃən] n. 1. падо́зраньне, падазрэ́ньне *n.* 2. адце́ньне *n.*: ***She spoke with a suspicion of spite*** Яна́ гаварыла з адце́ньнем зласьлівасьці; ***above suspicion*** па-за падо́зраньнем; ***on suspicion*** пад падо́зраньнем

suspicious [səˈspɪʃəs] adj. які́ падазраé, падазро́ны: ***to be suspicious*** падазрава́ць, быць падазро́ным

suspiciously [səˈspɪʃəsli] adv. падазро́на

sustain [səˈsteɪn] v.t. 1. падтры́мваць: ***Hope sustains him in his misery*** Надзе́я падтры́мвае яго́ ў бядзе́. 2. утры́мваць: ***to sustain an army*** утры́мваць а́рмію. 3. трыма́ць, падпіра́ць: ***Arches sustain the weight of the roof*** Скляпе́ньне трыма́е цяжа́р страхі́. 4. вытры́мваць (*уда́ры*). 5. цярпе́ць: ***to sustain a great loss*** пане́сьці вялі́кую стра́ту. 6. пацьвярджа́ць, падтры́мваць: ***The facts sustain his theory*** Фа́кты пацьвярджа́юць яго́ную тэо́рыю

sustenance [ˈsʌstənəns] n. 1. сро́дкі на пражы́так: ***He gave money for the sustenance of a poor family*** Ён дава́ў гро́шы бе́днай сям'і́ на пражы́так. 2. е́жа *f.*, харчы́ *pl*: ***He has gone for a week without sustenance*** Ён пражы́ў тыдзень бязь е́жы

swaddle [ˈswɑːdəl] – v.t. 1. спавіва́ць. 2. ту́га абкру́чваць (*палатно́м, бінто́м*) – n. спавіва́льнік -а, спавіва́ч -а́ *m.*; бінт -а́ *m.*

swagger [ˈswægər] – v.i. 1. хадзі́ць з ва́жным вы́глядам; ва́жна кро́чыць. 2. выхваля́цца, хвалі́цца; ганары́цца. 3. блефава́ць

– n. фарсі́стая *або́* ва́жная хада́; фанабэ́рыстасьць *f.*

– adj., Informal ве́льмі мо́дны, па апо́шняй мо́дзе

swaggerer [ˈswægərər] n. франт -а *m.*, ганарлі́вец -ўца *m.*; задава́кла -і *m.&f.*

swallow I [ˈswɑːloʊ] – v.t. 1. глыта́ць. 2. прыма́ць на ве́ру: ***He will swallow any story*** Ён усяму́ пове́рыць. 3. цярпе́ць: ***He had to swallow the insult*** Ён му́сіў сьцярпе́ць зьнява́гу

– n. 1. глытло́к -ка́ *m.* 2. гло́тка *f.*

• ***swallow up*** праглыну́ць; схава́ць, (*пра хва́лі, це́мру*); ца́лкам захапі́ць

• ***swallow words said in anger*** забра́ць наза́д ска́занае са зло́сьці

swallow II [ˈswɑːloʊ] n. ла́стаўка *f.*

swallow-tailed coat [ˌswɑːloʊˈteɪld] n. фрак -а *m.*

swam [swæm] v., *p.t. of* **swim**

swamp [swɑːmp] – n. бало́та *n.*; ба́гна, дрыгва́ *f.*

– v. 1. залива́ць, затапля́ць: ***The wave swamped the boat*** Хва́ля затапі́ла чо́вен. 2. засыпа́ць, зава́льваць: ***He was swamped with letters*** Яго́ засы́палі ліста́мі

• ***moss swamp*** імша́ра, імша́рына *f.*

swamp fever малярыя *f.*, бало́тная ліхама́нка, тра́сца *f.*

swampland [ˈswɑːmplænd] n. бало́ты *pl.*, ба́гнішча *n.*, бало́тная зямля́

swamp ore бало́тная руда́

swampy [ˈswɑːmpi] adj. 1. бало́цісты, багні́сты. 2. гра́зкі (*як ба́гна*)

swan [swɑːn] – n. 1. ле́бедзь -я *m.*; лябёдка *f.*

– adj. лебядзі́ны

swan song лебядзі́ная пе́сьня

swap [swɑːp] v.t. выме́ньваць, абме́ньваць (-ца), мяня́ць (-ца)

swarm [swɔːrm] – n. 1. рой -ю *m.* (*пчалі́ны*). 2. пло́йма *f.* 3. гурт -у *m.*, гурма́ *f.*: ***swarm of children*** гурма́ дзяцей

– v.i. 1. раі́цца, вылята́ць ро́ем. 2. кішэ́ць: ***The mosquitoes swarmed around us*** Вако́л нас кішэ́лі камары́; ***The swamp swarmed with mosquitoes*** Бало́та кішэ́ла камара́мі. 3. то́ўпіцца

swarthy [ˈswɔːrði] adj. смугля́вы, сму́глы, цемнава́ты

swastika [ˈswɑːstɪkə] n. сва́стыка *f.*

swath [swɑːθ] n. 1. пракóс -у *m.* 2. паласа́ *f.*

• ***cut a swath*** фарсі́ць, франці́ць

sway [sweɪ] – v.i. хіста́цца; калыха́цца

– v.t. 1. хіста́ць, калыха́ць: ***The wind sways the grass*** Ве́цер калы́ша тра-

ву́. 2. пахіснýць (*у перакана́ньнях, наме́рах*), уплыва́ць: ***to sway the audience*** уплыва́ць на аўдыто́рыю, вало́даць аўдыто́рыяй
– n. 1. хіста́ньне *n.* 2. ула́да *f.*, уплы́ў -ву *m.*: ***Presently the world is under the sway of economics*** Цяпе́рашні сьвет знахо́дзіцца пад уплы́вам экано́мікі

swear [swer] – v., **swore** *or* (Archaic) **sware**, **sworn, swearing,** – v.i. 1. бажы́цца. 2. прысяга́ць: ***to swear an oath*** дава́ць прыся́гу, прысяга́ць
– v.t. 1. браць прыся́гу, вымага́ць абяца́ньне: ***Members of the club were sworn to secrecy*** Сябры́ клю́бу прысяга́лі захо́ўваць таямні́цу; ***to swear a witness*** прыве́сьці сьве́дку да прыся́гі. 2. дава́ць абяца́ньне, ахвярава́цца. 3. блюзьне́рыць; клясьці́ся, праклі́на́ць
• ***swear by*** а) прысяга́ць на *каго́-што*. б) мо́цна ве́рыць у *каго́-што*
• ***swear in*** прыво́дзіць да прыся́гі
• ***swear off*** зарака́цца: ***to swear off drink*** зарачы́ся ня піць

sweat [swet] – n. 1. пот -у *m.*: ***He was in a cold sweat from fear*** Яго́ абліло́ хало́дным по́там ад стра́ху. 2. ві́льгаць *f.* (*на шы́бах, тру́бах*)
– v.i. **sweat** or **sweated, sweating** 1. паце́ць, патне́ць, макрэ́ць, управа́ць. 2. паце́ць, запацява́ць (*пра шкло*). 3. Informal паце́ць, ця́жка працава́ць. 4. хвалява́цца: ***to sweat over delay*** нэрвава́цца з прычы́ны затры́мкі
– v.t. 1. упа́рваць, заганя́ць (*каня́*). 2. прымуша́ць ця́жка працава́ць. 3. прылітво́ўва́ць, паяць (*мядзя́ныя тру́бы*)
• ***sweat it out,*** Informal нецярпліва, нэрво́ва чака́ць

sweater [ˈswetər] n. свэ́тар, швэ́дар -ра *m.*

sweat gland по́тавая зало́за

sweat shirt баваўня́ны пуло́вер

sweaty [ˈsweti] adj. 1. спаце́лы, спатне́лы; по́тны. 3. цяжкі́ (*аб пра́цы*)

Swede [swi:d] n. швэд -а *m.*, шве́дка *f.*

Swedish [ˈswi:dɪʃ] – adj. шве́дзкі
– n. 1. шве́ды *pl.* 2. шве́дзкая мо́ва

sweep [swi:p] – v.t. **swept, sweeping** 1. а) замята́ць, падмята́ць; ме́сьці. б) чы́сьціць: ***to sweep a chimney*** чы́сьціць ко́мін. 2. ме́сьці (*пра завіру́ху*). 3. зьмята́ць, зрыва́ць, зно́сіць: ***A flood swept away the bridge*** Павод-ка сарва́ла мост. 4. цягну́цца па падло́зе (*пра до́ўгую суке́нку*). 5. ахапля́ць, апано́ўваць: ***The idea of independence swept the country*** Ідэ́я незале́жнасьці ахапі́ла краі́ну
– v.i. распасьціра́цца, цягну́цца. ***The shore sweeps for miles*** Бе́раг ця́гнецца мі́лямі
– n. 1. вымята́ньне, падмята́ньне *n.* 2. паве́лў -ву *m.* 3. плынь *f.*. 4. узма́х -у *m.*: ***He cut the grass with strong sweeps of his scythe*** Ён касі́ў траву́ мо́цнымі ўзма́хамі касы́. 5. прасто́ра, паласа́ *f.* (*зямлі́*). 6. камінар -а *m.* 7. падмята́йла -ы *m. & f.* . 8. во́чап -а *m.* (*кало́дзежнага жураўля́*). 9. канчатко́вая перамо́га, по́ўны вы́йгрыш (*у спо́рце*)

sweeper [ˈswi:pər] n. 1. падмята́йла -ы *m. & f.* 2. прыла́да для падмята́ньня

sweeping [ˈswi:pɪŋ] – adj. шыро́кі, маштабны: ***sweeping changes*** маштабныя зьме́ны
– n. ***sweepings***, pl. а) сьме́цьце *n.*, адкі́ды *pl.* б) бязвартасныя, нікчэ́мныя лю́дзі: ***the sweepings of the society*** адкі́ды грама́дзтва

sweet [swi:t] – adj. 1. сало́дкі. 2. пры-е́мны. 3. прыго́жы, мі́лы: ***a sweet smile*** мі́лая ўсьме́шка. 4. сьве́жы ***sweet milk*** сьве́жае малако́. 5. несалёны: ***sweet butter*** несалёнае ма́сла
– n. 1. сало́дкае *n.*, дэсэ́рт -у *m.* 2. лю́бая, каха́ная *f.*; лю́бы, каха́ны -ага *m.* 3. сало́дкасьць *f.*
• ***be sweet on*** or ***upon***, Informal быць закаха́ным у *каго́*
• ***sweets,*** pl. ласу́нкі *pl.* (*цукёркі, пе́чыва*)

sweeten ['swi:tən] – v.t. саладзі́ць
– v.i. саладзе́ць, рабі́цца сало́дкім
sweetener ['swi:tənər] n. сало́дзіва *n.*, рэ́чыва, які́м сало́дзіцца
sweetening ['swi:tənɪŋ] n. 1. не́шта, што сало́дзіць. 2. саладжэ́ньне *n.*
sweetheart ['swi:thɑ:rt] n. лю́бы, каха́ны -ага *m.*; лю́бая, каха́ная *f.*; лю́бка, лю́бачка *f.*
sweetie ['swi:ti] n. даражэ́нькі -ага *m.*, даражэ́нькая *f.*
sweetish ['swi:tɪʃ] adj. саладкава́ты, саладжа́вы
sweetly ['swi:tli] adv. со́ладка
sweetmeats ['swi:tmi:ts] n., pl. цукерка *f.*; цука́т -у *m.*
sweetness ['swi:tnəs] n. 1. сало́дкасьць, сло́дыч *f.* 2. саладжа́васьць *f.*
sweet pea духмя́ны гаро́шак (*кве́тка*)
sweet-scented [ˌswi:t'sentɪd] adj. духмя́ны, паху́чы, па́хкі
sweet talk ліслі́выя сло́вы, ліслі́васьць *f.*
sweet-tempered [ˌswi:t'tempərd] adj. ла́годны, рахма́ны
sweet tooth ця́га да сало́дкага
sweet william *or* **sweet William,** Bot. гваздзі́к -а́ *m.*
swell [swel] – v.i. **swelled, swelled** or **swollen, swelling** 1. пу́хнуць, распуха́ць, апуха́ць: ***His cheek is swollen*** У яго́ напу́хла шчака́. 2. падыхо́дзіць, падыма́цца, рабі́цца бо́льшым: ***The river is swollen by rain*** Вада́ ў рэ́чцы падняла́ся пасьля́ дажджу́. 3. нараста́ць, мацне́ць, узраста́ць (*пра гук, го́ман*). 4. Figur. напаўня́цца: ***to swell with pride*** напо́ўніцца го́нарам. 5. Figur. надзіма́цца, фанабэ́рыцца
– n. 1. апу́хласьць *f.*; распу́хлае ме́сца. 2. нараста́ньне, падыма́ньне, мацне́ньне *n.* 3. узбурэ́ньне *n.* (*мо́ра*)
– adj., Informal шыко́ўны; Sl. фа́йны: ***He is a swell guy*** Ён фа́йны хлапе́ц
swelling ['sweliŋ] n. пухлі́на *f.*
swelter ['sweltər] – v.i. па́рыцца, пячы́ся, зьнемага́ць ад сьпяко́ты
– n. сьпяко́та, сьпёка *f.*
swept [swept] v., *p.t. and p.p. of* **sweep**
swerve [swɜ:rv] – v.i. рэ́зка абміна́ць: ***The car swerved to avoid a dog*** Аўтамашы́на рэ́зка зьвярну́ла, каб абміну́ць саба́ку
– n. адхіле́ньне ўбо́к, абміна́ньне *n.*
swift [swɪft] – adj. ху́ткі, шпа́ркі, бо́рзды; жва́вы; імкліві
– adv., *гл.* **swiftly**
– n. 1. стрыж -а́ *m.* (*пту́шка*). 2. матавілка *n.*
swift-footed [ˌswɪft'fʊtɪd] adj. ху́тканого́гі
swiftly ['swɪftli] adv. ху́тка, шпа́рка, бо́рзда; імкліва; жва́ва
swiftness ['swɪftnəs] n. ху́ткасьць, шпа́ркасьць *f.*
swill [swɪl] – n. 1. памы́і *pl. only* . 2. по́йла для сьвіне́й. 3. бурда́ *f.* 4. вялікі глыто́к
– v.t. 1. пра́гна піць, жлу́кціць, хлябта́ць, лакта́ць. 2. паласка́ць
swim [swɪm] – v., **swam** or (Archaic) **swum, swimming** пла́ваць, плы́сьці, плыць
– n. пла́ваньне *n.*: ***to go for a swim*** пайсьці́ папла́ваць
• ***be in the swim*** а) быць мо́дным. б) быць дзе́йным у плы́ні жыцьця́
• ***swim by (through)*** праплыва́ць мі́ма
• ***swim off*** адплыва́ць
• ***swim out*** выплыва́ць
• ***swim up (to)*** падплыва́ць
swim bladder пла́вальны пухі́р (*у рыбы*)
swimmer ['swɪmər] n. плывец -ўца́ *m.*, плыўчыха *f.*
swimming ['swɪmɪŋ] – n. пла́ваньне *n.*
– adj. пла́вальны; плывучы: ***a swimming pool*** пла́вальны басэ́йн
swimmingly ['swɪmɪŋli] adv. гла́дка, безь перашко́даў
swimsuit ['swɪmsu:t] n. купа́льнік -а *m.*
swindle ['swɪndəl] – v.t. 1. ашу́кваць; махлява́ць,; абду́рваць. 2. вымантачваць, выма́ньваць, выду́рваць
– n. ашука́нства, махля́рства, круце́льства *n.*

swindler [ˈswɪndlər] n. ашука́н|ец -ца, махля́р -а́, круц|е́ль -ля́, чмут -а́ *m.*

swine [swaɪn] n. 1. сьві́ньня *f.* 2. coll. сьві́ньні, парсюкі́ *або́* вепрукі́

swineherd [ˈswaɪnhɜ:rd] n. сьвінапа́с -а *m.*

swing [swɪŋ] – v., **swung, swung, swinging** 1. гу́шкацца, го́йдацца, калыха́цца. 2. хіста́цца, ківа́цца, вага́цца (*як ма́ятнік, ківа́ч*). 3. маха́ць, разма́хваць: ***He swings his arms as he walks*** Ён разма́хвае рука́мі, калі́ йдзе. 4. развара́чваць, круці́ць: ***He swung his partner as they danced*** Ён крутану́ў партнэ́рку ў та́нцы

– n. 1. калыха́ньне, го́йданьне, гу́шканьне, хіста́ньне *n.* 2. го́йданка *f.* 3. калы́ска, гу́шкалка *f.* 4. рытм -у *m.* 5. сьвінг -у *m.* (*музы́чны стыль, та́нец*)

• ***in full swing*** на по́ўным хо́дзе, у са́мым разга́ры, у по́ўні

swingle [ˈswɪŋgəl] n. траплó *n.* (*для трапа́ньня лёну*)

swing music сьві́нгавая му́зыка

swirl [swɜ:rl] – v. 1. віраваць: ***A stream swirls over rocks*** Струме́нь бурлі́ць на ска́лах. 2. круці́цца: ***dust swirling in the air*** пыл кру́ціцца ў паве́тры. 3. ві́цца, кучара́віцца, завіва́цца (*пра валасы́*)

– n. 1. віраванье *n.*, вір -у *m.*, клуб -у *m.* (*пы́лу, ды́му*). 2. ку́дзер -а *m.*, ло́кан -а *m.*

swish [swɪʃ] – v.t. 1. сьвіста́ць: ***The whip swished through the air*** Пу́га сьві́снула ў паве́тры. 2. шо́ргаць

– n. шо́ргат -у *m.*

Swiss [swɪs] – adj. швайца́рскі

– n. швайца́р|ац -ца *m.*, швайца́рка *f.*

switch [swɪtʃ] – n. 1. уключа́льнік, улуча́льнік, пераключа́льнік -а *m.* 2. чыгу́начная стрэ́лка. 3. заме́на *f.*; перада́ча *f.*: ***a switch of votes to another candidate*** перада́ча галасо́ў другі́ому кандыда́ту. 4. прут -а́ *m.*

– v.t. 1. улуча́ць; уключа́ць. 2. перавóдзіць, перавóдзіць: ***to switch a train to another track*** перавé́сьці цягні́к на і́ншыя рэ́йкі. 3. зьмяня́ць: ***to switch the subject*** зьмяні́ць тэ́му. 4. удара́ць, маха́ць: ***The horse switched his tail to drive off the flies*** Конь махну́ў хвасто́м, каб адагна́ць мух

– v.i. мяня́цца; замяня́цца: ***The boys switched hats*** Хлапцы́ памяня́ліся ша́пкамі

switchboard [ˈswɪtʃbɔ:rd] n. пульт -у *m.*

switchman [ˈswɪtʃmən] n. **-men** стрэ́лачнік -а *m.*

swollen [ˈswoʊlən] adj. 1. напу́хлы, успу́хлы, распу́хлы: ***a swollen ankle*** напу́хлая шчы́калатка. 2. набрыня́лы

swoop [swu:p] – v.i. 1. накіда́цца, налята́ць, раптóўна напада́ць (*зьве́рху*). 2. хапа́ць

– n. імкне́ньне ўні́з

sword [sɔ:rd] n. меч мяча́ *m.*, рапі́ра, шпа́га *f.*, пала́ш -а́ *m.*

• ***be at sword's points*** быць ве́льмі варо́жым, быць на нажа́х

• ***cross swords*** змага́цца; сварыцца, калаці́цца

• ***draw the sword*** пача́ць вайну

• ***the sword*** а) вайна́, б) сі́ла зброі́

swordsman [ˈsɔ:rdzmən] n. **-men** фэхтава́льнік -а *m.*

swore [swɔ:r] v., *p.t. of* **swear**

sworn [swɔ:rn] v., *p.p. of* **swear**

swum [swʌm] v., *p.p. of* **swim**

swung [swʌŋ] v., *p.t. and p.p. of* **swing**

sycophancy [ˈsɪkəfənsi] n. падхалі́мства, падлі́зьніцтва *n.*

sycophant [ˈsɪkəfənt] n. падхалі́м -а падлі́з|а -ы *m.*

sycophantic [ˌsɪkəˈfæntɪk] adj. падхалі́мны, ліськлі́вы, падлі́зьлівы

syllabic [sɪˈlæbɪk] adj. 1. Gram. складо́вы. 2. складаўтвара́льны

syllabify [sɪˈlæbɪfaɪ] v.t. **-fied, -fying** дзяліць на склады́

syllabize [ˈsɪləbaɪz] v.t. 1. дзяліць на склады́. 2. вымаўля́ць, чыта́ць па складо́х

syllable [ˈsɪləbəl] – n. Gram. склад -у *m.* 2. гук-у *m.*, сло́ва *n.*: ***He never uttered a syllable*** Ён не сказа́ў ні сло́ва

– v.t. вымаўля́ць па складо́х

syllabus [ˈsɪləbəs] n., pl **-buses, -bi** [ˈsɪləbaɪ] канспэ́кт -у *m.* (*прамо́вы, кні́гі, ку́рсу*)

symbol [ˈsɪmbəl] – n. 1. сы́мбаль -ю *m.* 2. знак -у *m.*
– v.t. сымбалізава́ць

symbolic [sɪmˈbɑ:lɪk] adj. 1. які́ сымбалізу́е. 2. сымбалі́чны

symbolically [sɪmˈbɑ:lɪkəli] adv. сымбалі́чна

symbolism [ˈsɪmbəlɪzəm] n. сымбалі́зм -у *m.*

symbolist [ˈsɪmbəlɪst] n. сымбалі́ст -а *m.*, сымбалі́стка *f.*

symbolize [ˈsɪmbəlaɪz] v.t. сымбалізава́ць

symmetric [sɪˈmetrik] or **symmetrical** [sɪˈmetrikəl] adj. сымэтры́чны

symmetrically [sɪˈmetrikəli] adv. сымэтры́чна

symmetry [ˈsɪmətri] n., pl. **-tries** сымэ́трыя *f.*

sympathetic [ˌsɪmpəˈθetɪk] adj. 1. спага́длівы, спачува́льны. 2. Informal які́ пагаджа́ецца, ухваля́е, зго́дны

sympathetically [ˌsɪmpəˈθetɪkəli] adv. спага́дліва, спачува́льна

sympathize [ˈsɪmpəθaɪz] v.i. 1. спагада́ць, спачува́ць. 2. сымпатызава́ць

sympathy [ˈsɪmpəθi] n., pl. **-thies** 1. спага́да *f.*, спачува́ньне *n.* 2. зго́днасьць, зго́да *f.*: ***He is in sympathy with my plan*** Ён згаджа́ецца з маі́м пля́нам

symphonic [sɪmˈfɑ:nɪk] adj. 1. сымфані́чны. 2. Figur. суго́чны

symphony [ˈsɪmfəni] – n., pl. **-nies** 1. сымфо́нія *f.* 2. гармо́нія гу́каў. 3. гармо́нія
– adj. сымфані́чны: ***symphony orchestra*** сымфані́чны аркестар

symposium [sɪmˈpoʊziəm] n., pl. **-siums** or **-sia** сымпо́зіюм -у *m.*

symptom [ˈsɪmptəm] n. 1. сымпто́м -у *m.* 2. прыкме́та *f.*: ***Quaking knees and paleness are symptoms of fear*** Дрыго́тка ў кале́нях і бле́днасьць — адзна́кі стра́ху

synagogue [ˈsɪnəgɑ:g] n. сынаго́га *f.*

synchronism [ˈsɪŋkrəˌnɪzəm] n. сынхрані́зм -у *m.*, адначасо́васьць *f.*

synchronize [ˈsɪŋkrənaɪz] – v.i. адбыва́ць адначасо́ва
– v.t. сынхранізава́ць

synchronous [ˈsɪŋkrənəs] adj. сынхрані́чны, аднача́сны, адначасо́вы, сынхро́нны

syndicate [ˈsɪndɪkət] – n. сындыка́т -у *m.*
– v. [ˈsɪndɪkeɪt] злуча́ць(ь) (-ца) у сындыка́т

synod [ˈsɪnəd] n. сыно́д -у *m.*

synodal [ˈsɪnədəl] adj. сыно́дзкі, сынада́льны

synonym [ˈsɪnənɪm] n. сыно́нім -а *m.*

synonymous [sɪˈnɑ:nəməs] adj. сынані́мічны

synopsis [sɪˈnɑ:psɪs] n., pl. **-ses** сыно́псіс, канспэ́кт -у *m.*

syntactic [sɪnˈtæktɪk] or **syntactical** [sɪnˈtæktɪkəl] adj. сынтаксі́чны

syntax [ˈsɪntæks] n., Gram. сы́нтаксіс -у *m.*

synthesis [ˈsɪnθəsɪs] n., pl. **-ses** сы́нтэз -у *m.*, злучэ́ньне; абагульне́ньне *n.*

synthesize [ˈsɪnθəsaɪz] v.t. сынтэзава́ць

synthetic [sɪnˈθetɪk] adj. 1. сынтэты́чны: ***synthetic chemistry*** сынтэты́чная хі́мія. 2. сынтэты́чны, шту́чны. 3. Ling. сынтэты́чныя мо́вы

synthetic fiber шту́чнае валакно́

synthetics [sɪnˈθetɪks] n. сынтэ́тыка *f.*; сынтэты́чныя матэрыя́лы

syphilis [ˈsɪfɪlɪs] n. сы́філіс -у *m.*, пра́нцы *pl. only*

syphilitic [ˌsɪfəˈlɪtɪk] – adj. сыфілітычны
– n. сыфіліты́к -а *m.*

syphon *гл.* **siphon**

Syriac [ˈsɪriæk] n. старажытнасырыйская мо́ва

Syrian [ˈsɪriən] – adj. сырыйскі
– n. сырыец -йца *m.*, сырыйка *f.*

syringe [sɪˈrɪndʒ] – n. шпрыц -а *m.*; спрынцо́ўка *f.*
– v.t. спрынцава́ць

syrup or **sirup** [ˈsɪrəp] n. сыро́п -у *m.*
• ***cough syrup*** мікстýра ад ка́шлю

system [ˈsɪstem] n. 1. сыстэ́ма *f.* 2 Biol. сукýпнасьць вóрганаў, арганíзм -у *m.* 3. лад -у *m.*: ***the social system*** грамáдзкі лад

systematic [ˌsɪstəˈmætɪk] or **systematical** [ˌsɪsteˈmætɪkəl] adj. 1. сыстэматы́чны. 2. мэтады́чны

systematize [ˈsɪstəmətaɪz] v.t. сыстэматызавáць, прывóдзіць у сыстэ́му

systemic [sɪˈstemɪk] adj. 1. сыстэ́мны 2 Biol. датычны да ўсягó арганíзму, саматы́чны

T

T, t [ti:] n., pl. **T's, t's** *дваццáтая лíтара англéльскага альфабэ́ту*

tab I [tæb] – n. 1. язычлóк -ка *m.*, налéпка *f.* (*картатэ́кі, каталёгу*). 2. вýшка *n.*, пяцéлька *f.*
– v.t. пазначáць налéпкай
• ***keep tabs*** or ***a tab on*** трымáць вóка на *кім*; трымáць улíк

tab II [tæb] Informal рахýнлак -ка (*за éжу ў рэстарáне*), квітлóк -кá *m.*, чэк -а *m.*

tab III [tæb] табуля́тар -а *m.*

tabernacle ['tæbərnækəl] n. 1. дом малéньня, малéльня. 2. даразахавáльніца, скíнія *f.* (*у царквé*), табэрнáкулюм -а *m.* (*у касьцéле*)
• ***Feast of Tabernacles*** кýчкі, сукóт (*юдэ́йскае сьвя́та*)

table [teɪbəl] – n. 1. стол сталá *m.* 2. стол (*éжа*). 3. таблíца *f.*, рóўная павéрхня, рóўня *f.*: ***table of contents*** зьмест (*сьпíс разьдзéлаў*). 4. драўля́ная, камéнная плітá; скрыжáль *f.*
– v.t. 1. адкладáць разгля́д (*закóна праéкту, прапанóвы*), клáсьці пад сукнó. 2. Brit. падавáць на разгля́д (*прапанóву*)
• ***set the table*** накрывáць (на) стол
• ***under the table*** цішкóм, пакрыёма, з-пад палы́

tableau ['tæbloʊ] n., pl. **-leaux** or **-leaus** 1. маляўнíчая сцэ́на; карцíна *f.* 2. жывáя карцíна

tablecloth ['teɪbəlklɔ:θ] n. абрýс -á *m.*, настóльнік -а *m.*

tableland ['teɪbəllænd] n. пласкагóр'е, плятó *n.*, *indecl.*

tablespoon ['teɪbəlspu:n] n. сталóвая лы́жка

tablet ['tæblət] n. 1. дóшчачка, таблíчка (*для пісáньня, маляváньня*). 2. натáтнік, блякнóт -а *m.* 3. таблíчка, дóшчачка з нáдпісам. 4. таблéтка *f.*

tableware ['teɪbəlwer] n. начы́ньне *n.*, пóсуд -у *m.*

table wine сталóвае вінó

tabloid ['tæblɔɪd] – n. 1. таблóід -а (*газэ́та мéншага фармáту, звычáйна бульвáрнага зьмéсту*). 2. таблéтка *f.*
– adj. сьцíслы, кандэнсавáны

taboo [tə'bu:] – v.t. забараня́ць; накладáць табý
– n. 1. забарóна *f.* 2. табý *n.*, *indecl.*
– adj. забарóнены

tabular ['tæbjələr] adj. таблíчны, тáбельны, у вы́глядзе таблíцы; у слупкí. 2. плóскі (*як стол*): ***a tabular rock*** плóская скалá

tacit ['tæsɪt] adj. 1. ціхі, бяз слоў: ***a tacit prayer*** ціхая малíтва. 2. бясслóўны. 3. маўклíвы, нямы́

taciturn ['tæsɪtɜ:rn] adj. маўклíвы, негаваркí: ***taciturn person*** маўчýн -á *m.*

tack [tæk] – n. 1. цьвік зь вялíкай плéшкай для абíўкі мэ́блі: ***carpet tacks*** цьвікí для дыванóў; ***thumbtacks*** кнóпкі. 2. фастры́га *f.* 3. курс -у, кі-

ру́нlак -ку *m.*; падыхо́д -у *m.*: ***to take a right tack*** пра́вільна падыйсьці́
– v. 1. прымацо́ўваць. 2. фастрыгава́ць. 3. далуча́ць, дадава́ць: ***He tacked the postscript to the end of the letter*** Ён дада́ў постскры́птум у канцы́ ліста́. 4. зьмяня́ць падыхо́д

tackle ['tækəl] – n. снасьць *f.* а) ***fishing tackle*** рыба́цкая снасьць. б) снасьць для ве́тразяў
– v. 1. бра́цца: ***to tackle the problem*** бра́цца за праблє́му. 2. хапа́ць, лавіць. 3. запрага́ць

tact [tækt] n. 1. такт -у *m.* 2. такто́ўнасьць *f.*

tactful ['tæktfəl] adj. такто́ўны

tactfully ['tæktfəlı] adv. такто́ўна, з та́ктам

tactical ['tæktıkəl] n. 1. тактычны. 2. уме́лы

tactician [tæk'tıʃən] n. 1. та́ктык -а *m.* 2. арганіза́тар -а *m.*

tactics ['tæktıks] n. 1. ваенная та́ктыка; ваенныя апэра́цыі. 2. мэто́дыка, та́ктыка

tactless ['tæktləs] adj. нетакто́ўны, бестакто́ўны; недалікатны: ***a tactless person*** нетакто́ўны чалаве́к

tadpole ['tædpoul] n., Zool. апало́нік -а *m.*

taffeta ['tæfətə] n. тафта́ *f.*

tag I [tæg] – n. 1. ярлы́к -а́ *m.*, этыке́тка, бі́рка, ме́тка *f.* 2. ве́шалка *f.* (*пятля́*). 3. накане́чнік на шнурку́. 4. бле́шня. 5. цыта́та *f.* (*эпі́граф*). 6. Theatr. заключна́я рэ́пліка *f.*
– v.t. **(-gg-)** дадава́ць, прышпіля́ць (*для аздо́бы, эфэ́кту*)
– v.i. **(-gg-)** ісьці́ сьле́дам за *кім*

tag II [tæg] – n. гульня́ ў даганя́лкі
– v.t. **(-gg-)** засту́каць (*у гульні́*)

tag day дзень збо́ру ахвяраваньняў на дабрачы́нныя мэты

Tahitian [tə'hi:ʃən] – n. 1. жыха́р абто́ку Таі́ты. 2. таі́цкая мо́ва
– adj. таі́цкі

tail [teıl] – n. 1. хвост хваста́ *m.* 2. зад -у *m.* 3. хво́сьцік -а *m.* (*прычо́ска*). 3. Sl. шпік, шпег -а, дэтэкты́ў -ва *m.*
– v.t. 1. быць у хвасьце́. 2. Sl. хадзі́ць, сачы́ць за *кім*
– v.i. заніка́ць, прападаць; ме́ншаць
– adj. за́дні, у хвасьце́
• ***a tail wind*** спадаро́жны ве́цер
• ***at the tail of*** у хвасьце́
• ***tail light*** за́дняе сьвятло́ (*у аўтамабі́лі, цягніку́*)
• ***tails*** а) рэ́шка (*манэ́ты*). б) Informal фрак -а *m.*
• ***tail off,*** Informal заніка́ць, зьмяншацца
• ***turn tail*** адступі́ць, даць цяга́

tailor ['teılər] – n. краі́ве́ц -ўца́ *m.*
– v.t. 1. шыць: ***well tailored*** до́бра пашы́ты. 2. прыла́джваць, падганя́ць (*адзе́жыну*)

tailored ['teılərd] adj. дапасава́ны; пашы́ты на замо́ву

tailoring ['teılərıŋ] n. краве́цтва *n.*

tailor-made [ˌteılər'meıd] adj. 1. пашы́ты краўцо́м. 2. зро́блены на замо́ву (*пра во́пратку*)

taint [teınt] – n. 1. пля́ма, зага́на *f.* 2. мара́льная пля́ма; га́ньба *f.*
– v.t. пэ́цкаць, пля́міць; псава́ць (*і мара́льна*), зара́жаць
– v.i. пэ́цкацца, пля́міцца; зара́жацца, псава́цца

take [teık] – v., **took, taken, taking** 1 браць: ***He took her by the hand*** Ён узя́ў яе́ за руку́. 2. хапа́ць: ***to be taken by surprise*** быць засьпе́тым зьняна́цку. 3. здабыва́ць: ***He took first prize*** Ён узя́ў пе́ршую ўзнагаро́ду. 4. убіра́ць: ***Wool takes a dye well*** Во́ўна до́бра ўбіра́е фа́рбу; ***to take cold*** засту́джвацца. 5. займа́ць: ***It takes time and patience to learn how to drive an automobile*** Трэ́ба час і цярплі́васьць, каб навучы́цца кірава́ць аўтамабі́лем. 6 адыма́ць: ***If you take 2 from 7, you have 5*** Калі́ адыме́ш два ад сямёх, застане́цца пяць. 7. ве́сьці: ***Where will this road take me?*** Куды́ гэ́тая даро́га мяне́ завядзе́? 8. правадзіць, завозіць ***Take her home*** Завязі́ яе́ дамо́ў. 9 прыма́цца: ***The vaccination did not take*** Прышчэ́пка не прынялася

– n. 1. здабы́ча (*на палява́ньні*); улó|ў -ву *m.*: ***a great take of fish*** вялі́кі ўлóў ры́бы. 2. вы́ручка, збор (*гро́шай*). 3. кінака́д|ар -ра *m.*

• ***take aback*** засьпе́ць зьняна́цку, неспадзе́ўкі

• ***take about*** вадзі́ць (*па музэ́і, го́радзе*)

• ***take a drink*** піць

• ***take after*** а) быць падо́бным да *кагó*. б) бе́гчы за *кім*, лавіць *кагó*. в) браць прыклад з *кагó*

• ***take a photograph*** рабіць здымак, фатаграфава́ць

• ***take a rest*** адпачыва́ць

• ***take a seat*** сяда́ць, садзі́цца

• ***take a vacation*** браць адпачы́нак

• ***take a walk*** хадзі́ць, шпацырава́ць; ***Take a walk!*** Informal Пайшо́ў прэч!

• ***take back*** а) забра́ць наза́д (*пра сло́ва, абяца́ньне*). б) прыпо́мніць мінулае

• ***take dictation*** запі́сваць

• ***take down*** а) запі́сваць. б) прыніжа́ць. в) здыма́ць

• ***take food*** е́сьці

• ***take for*** прыма́ць за *кагó-што* (*памылко́ва*)

• ***take in*** а) прыма́ць, браць (*кватара́нтаў*), б) убіра́ць, звужа́ць (*суке́нку*). в) спуска́ць ве́тразі, г) зразуме́ць, уця́міць. д) ашука́ць, абдуры́ць

• ***Take it or leave it*** Выбіра́й або́ – або́

• ***take off*** а) узьня́цца, узьляце́ць (*пра самалёт*). б) Informal ху́тка вы́йсьці; пайсьці́; уцячы́, сарва́цца

• ***take on*** а) прыма́ць (*на пра́цу*). б) бра́цца за *кагó-што*. в) гладчэ́ць, таўсьце́ць

• ***take one's time*** не сьпяша́цца

• ***take out*** 1. браць навы́нас. 2. вывó-дзіць: ***to take out the dog*** вывóдзіць сабáку 3. вывóдзіць (*пля́му*). 4. а) пазыча́ць (*кні́гу зь бібліятэ́кі*). б) атрыма́ць (*дазвóл, патэ́нт*). 5. адпóмсьціцца

• ***take part*** браць удзе́л

• ***take place*** зда́рыцца, адбы́цца

• ***take over*** пераня́ць

• ***take temperature*** ме́раць тэмпэратýру

• ***take to*** палюбі́ць, прызвыча́іцца

• ***take up*** а) уця́гваць, убіра́ць (*ваду́*). б) узя́цца за спра́ву. в) пераня́ць

taken [ˈteɪkən] v., *p.p. of* **take**: ***taken aback*** зьбянтэ́жаны, разгýблены

take-off [ˈteɪkɔ:f] n. 1. узьлёт -у *m.* (*самалёта*). 2. падскóк -у *m.* 3. трамплі́н -а *m.* 4. Informal парóдыя, карыкатýра *f.*

takeover [ˈteɪkˌouvər] n. пераня́ньце (*ула́ды, ула́снасьці, кірава́ньня*)

taking [ˈteɪkɪŋ] – adj. прыва́бны, прые́мны; зара́зьлівы (*пра ўсьме́шку*)

– n. 1. затрыма́ньне *n.*, а́рышт -у *m.* 2. улó|ў -ву *m.*

takings, pl. вы́ручка

talc [tælk] n. тальк -у *m.*

talcum [ˈtælkəm] n. 1. пýдра *f.* 2. тальк -у *m.*

tale [teɪl] n. 1. апавяда́ньне *n.*, апóвесьць *f.*; пада́ньне *n.*, ка́зка *f.* 2. вы́думка, мана́ *f.* 3. плётка *f.*

• ***tell tales*** плятка́рыць, маніць, выдумля́ць

talent [ˈtælənt] n. 1. та́лент -у *m.*, здóльнасьці *pl.*: ***a talent for music*** здóльнасьці да мýзыкі. 2. чалаве́к з та́лентам

talented [ˈtæləntəd], adj. таленавíты, з та́лентам

talisman [ˈtæləsmən] n., pl. **-mans** талісма́н -а *m.*

talk [tɔ:k] – v. 1. гýтарыць, гавары́ць, маніць: ***Baby is learning to talk*** Дзіця́тка вýчыцца гаварыць. 2. кансультава́ць, ра́іцца: ***to talk with one's doctor*** ра́іцца зь ле́карам. 3. размаўля́ць; паразумля́цца: ***to talk by signs*** размаўля́ць на мі́гі. 4. плятка́рыць, абгавóрваць: ***She talked behind their backs*** Яна́ плятка́рыла ў іх за сьпі́наю. 5. гаварыць, дыскутава́ць: ***to talk politics*** гаварыць пра палі́тыку

– n. 1. гýтарка *f.*; гаварэ́ньне *n.*; мóва *f.* 2. размóва *f.* 3. нара́да, канфэрэ́н-

цыя *f.* 4. плётка, чу́тка *f.* 5. прадме́т гу́тарак, плётак: ***She is the talk of the town*** Пра яе́ пляткара́ць у го́радзе. 6. Informal пусты́я сло́вы: ***His threats were just talk*** Яго́ныя пагро́зы былі́ то́лькі пусты́мі сло́вамі

• ***talk away*** балбата́ць

• ***talk back,*** Informal агрыза́цца, адка́зваць няве́тліва, без паша́ны

• ***talk big,*** Sl. хвалі́цца, выхваля́цца

• ***talk down*** гаварыць пага́рдліва, з пага́рдай; прыніжа́ць, зьмяншаць

• ***talk English*** гаварыць па-анге́льску

• ***talk out*** а) дакла́дна прадыскутава́ць што. б) Brit. заця́гваць дыску́сію, каб адкла́сьці галасава́ньне (*у парля́манце*)

• ***talk over*** дыскутава́ць; абмяркоўваць

• ***talk sense*** гаварыць да то́лку, разу́мна

talkative ['tɔ:kətiv] adj. гаваркі́, гаманкі́

talker [tɔ:kər] n. 1. прамо́ўца -ы *m.&f.*, ле́ктар -а *m.* 2. гавару́н -а́ *m.*: ***idle talker*** балбату́н -а́ *m.*, траплю́ -а́ *m. & f.*

tall [tɔ:l] adj. 1. высо́кі. 2. увы́шкі: ***six feet tall*** шэсьць фу́таў увы́шкі. 3. Informal вялі́кі; перабо́льшаны; празме́рны: ***a tall price*** празме́рна вялі́кая цана́; ***a tall tale*** непраўдападо́бная гісто́рыя, апо́вед; ***to stand tall*** быць го́рдым, упэ́ўненым у сабе́

tallow ['tælou] – n. 1. лой -ю *m.* (*для вы́рабу сьве́чак, мы́ла*)

– v.t. ма́заць ло́ем

tallowy ['tælouɪ] adj. 1. ло́епадо́бны, як лой; тлу́сты. 2. жаўта́ва-бе́лы, бляды́. 3. тлу́сты (*пра жывёлу*)

tall ship высакама́чтавы карабе́ль

talon ['tælən] n. кіпцю́р -а́ *m.*

tally ['tæli] – n., pl. **-lies** 1. бі́рка *f.* 2. рэ́з, знак -у *m.* 3. падлі́к -у *m.*; вы́нік гульні́. 4. ярлы́к -а́ *m.*, нале́пка, этыке́тка *f.*

– v.t. 1. адзнача́ць на бі́рцы, запі́сваць; ве́сьці ўлі́к. 2. накле́йваць, прывя́зваць ярлыкі́, этыке́ткі. 3. адпавяда́ць, супада́ць: ***Your account tallies with mine*** Твой падлі́к супада́е з маі́м

tamarack ['tæməræk] n. амэрыка́нская лісто́ўніца (*дрэ́ва і матэрыя́л*)

tambour ['tæmbur] n. 1. бу́бен -на *m.* (*басаві́ты*). 2. пя́льцы (*для вышыва́ньня*)

tamburine [ˌtæmbə'ri:n] n. тамбуры́н -а *m.*

tame [teɪm] – adj. 1. сво́йскі (*пра жывёлу, пту́шку*). 2. прыру́чаны, ручны́ (*пра зьвяра́*): ***a tame bear*** прыру́чаны мядзьве́дзь. 3. Figur. пако́рлівы. 4. Figur. ну́дны, неціка́вы: ***a tame story*** ну́днае апавяда́ньне

– v.t. 1. прыручы́ць (*зьвяра́*). 2. утаймо́ўваць, уціхамі́рваць

– v.i. прыручы́цца, утаймо́ўвацца

tamp [tæmp] – v.t. 1. трамбава́ць (*зямлю́, сьце́жку*). 2. набіва́ць (*лю́льку*). 3. закупо́рваць (*адту́ліну пры ўзрыва́ньні*)

– n. пыж, клак -а́ *m.*

tamper ['tæmpər] v.i. 1. уме́швацца, сува́цца. 2. (with) падкупля́ць; падрабля́ць, падмяня́ць

tampon ['tæmpɑ:n] n. тампо́н -а *m.*

tan [tæn] – v.t. **(-nn-)** 1. выраблять, дубі́ць ску́ры. 2. Informal дуба́сіць

– v.i. загара́ць, запаля́цца

– n. 1. сьве́тла-руды́ ко́лер; ко́лер загара́; загар -у *m.* 2. дубі́льнік -а *m.* 3. дубо́вая кара́. 4. тані́н -у *m.*

– adj. 1. сьве́тла-руды́. 2. дубі́льны

tanbark ['tænbɑ:rk] n. дубо́вая кара́, дубі́льная кара́

tandem ['tændəm] n. 1. цуг -у *m.* 2 тандэ́м -у і -а *m.* (*пра ро́вар*)

• ***in tandem*** цу́гам, гу́жам, у тандэ́ме

tang I [tæŋ] – n. во́стры смак: ***the tang of mustard*** во́стры смак гарчы́цы. 2. прысмак -у *m.*; рэ́зкі пах. 3. адце́ньне *n.* 4. шпень (*прыла́ды, на які́ наса́джваюцца тро́нкі*)

– v.t. надава́ць во́стры смак

tang II [tæŋ] – n. бра́згат, звон -у *m.*

– v. бра́згаць (*по́судам*); званіць

tangency ['tændʒənsɪ] n. датычнасьць *f.*

tangent ['tændʒənt] – adj., Geom. датычны

– n. 1. датычная *f.* 2. Trigonom. тангенс -а *m.*

tangerine [ˌtændʒəˈri:n] n. мандарын -а *m.*

tangible [ˈtændʒəbəl] – adj. 1. які можна абмацаць, успрыняць дотыкам. 2. рэальны; фактычны; відавочны, выразны: ***tangible evidence*** відавочны доказ. 3. матэрыяльны, найўны: ***Real estate is tangible property*** Нерухомая маёмасьць – найўная ўласнасьць

– n. матэрыяльныя вартасьці

tangle [ˈtæŋgəl] – v.t. 1. блытаць, зблытваць (*ніткі*). 2. заблытваць; зьбіваць з панталыку

– v.i. 1. заблытвацца. 2. біцца, сварыцца

– n. 1. нешта заблытанае. 2. блытаніна *f.*: ***a tangle of contradictory statements*** блытаніна супярэчлівых выказваньняў. 3. кудлы *pl.*, скудлачаныя валасы

tank I [tæŋk] – n. 1. бак -а *m.*: ***gas tank*** бэнзабак -а *m.*; цыстэрна *f.*, рэзэрвуар -а *m.* 2. басэйн, вадаём -у *m.* (*асабліва штучны*)

– v.t. уліваць у бак, цыстэрну; захоўваць, трымаць у баку, цыстэрне

tank II [tæŋk] n. танк -а *m.*

tankage [ˈtæŋkɪdʒ] n. 1. ёмістасьць (*цыстэрны, бака, рэзэрвуара*). 2. захоўваньне, трыманьне ў цыстэрне. 3. плата за захоўваньне ў цыстэрне

tank car вагон-цыстэрна

tanker [ˈtæŋkər] n. 1. танкер -а *m.* 2. вагон *або* грузавік з цыстэрнай. 3. танкіст -а *m.* 4. самалёт-запраўнік

tanner [ˈtænər] n. гарбар -а́ *m.*, дубільшчык -а *m.* (*скураў*)

tannery [ˈtænəri] n., pl. **-neries** гарбарня, дубільня *f.*

tannin [ˈtænɪn] n. танін -у *m.*

tanning [ˈtænɪŋ] n. 1. дубленьне *n.* 2. загараньне, запальваньне (*на сонцы*). 3. Informal лупцаваньне *n.*

tantalize [tæntəlaɪz] v.t. мучыць, дражніць; спакушаць

tap I [tæp] – v.i. **(-pp-)** 1. лёгка стукаць: ***to tap on a window*** пастукаць у вакно. 2. прытупваць: ***She tapped her foot on the floor*** Яна тупала нагой аб падлогу. 3. адбіваць, выстукваць: ***to tap a rhythm*** адбіваць рытм; ***to tap time*** адбіваць такт. 4. выбіваць, вытрасаць: ***to tap the ashes out of a pipe*** выбіваць попел зь люлькі

– v.t. падбіваць (*набойкі*)

– n. 1. лёгкі стук : ***There was a tap at the door*** Пачуўся стук у дзьверы. 2. набойка *f.* 3. чачотка *f.* (*танец*)

tap II [tæp] – n. 1. вадаправодны кран. 2. коплак -ка *m.*, затычка *f.*; шпунт -а *m.* 3. проба (алькагольнага напітку). 4. Electr. гняздо *m.*, адвод -у *m.* 5. падслухоўваньне тэлефонных гутарак

– v.t. 1. рабіць падсочку. 2. адкаркоўваць, адкаркаваць: ***to tap a cask*** адкаркаваць бочку і ўставіць кран. 3. выпускаць вадкасьць. 4. Med. рабіць праколл (*для выпусканьня вадкасьці*). 5. падслухоўваць (*тэлефонную гутарку*). 6. рабіць нутраны нарэз (*у трубе*)

• ***on tap*** гатовы для спажываньня

tap dance чачотка *f.*

tape [teɪp] – n. 1. тасьма, тасёмка *f.* 2. стужка *f.* 3. сантымэтар (*прылада*). 4. ***Scotch tape*** клейкая стужка, скоч -у *m.* 5. а) магнітафонная стужка. б) магнітафонны запіс

– v.t. 1. зьвязваць тасьмой; заклейваць плястырам. 2. вымяраць сантымэтрам. 3. запісваць на магнітафонную стужку

• ***breast the tape*** перарваць фінішную стужку

tape measure сантымэтар -ра *m.*, рулетка *f.*

tape-record [ˌteɪprɪˈkɔ:rd] v.t. запісваць на магнітафон

tape recorder магнітафон -а *m.*

tapestry [ˈtæpɪstri] n., pl. **-tries** 1. тканіна для абіваньня мэблі. 2. габэлен -а *m.*

tapeworm [ˈteɪpwɜ:rm] n. саліцёр -а *m.*

tapioca [ˌtæpiˈoʊkə] n. тапіёка *f.*

taps [tæps] а) адбой -ю *m.* б) сыгнал горна (*жалобны*)

tar [tɑ:r] – n. 1. смала́ *f.* 2. вар -у *m.* (*смала́*); дзёг|аць -цю *m.*
– v.t. 1. смалі́ць, засма́льваць; ма́заць, насыча́ць смало́ю (*напр. чо́вен*). 2. Figur. пэ́цкаць: ***tarred by his own bad reputation*** спэ́цканы сваёй благо́й сла́ваю
• ***tarred with the same brush*** або́е рабо́е, адны́м лы́кам шы́тыя

tardily ['tɑ:rdɪli] adv. запо́зьнена, запаво́лена, мару́дна; з затры́мкамі

tardy ['tɑ:rdi] adj. 1. спо́зьнены, по́зьні. 2. паво́льны, мару́дны

tare I [ter] n. 1. Bot. ві́ка *f.* 2. пустазе́лье *n.*

tare II [ter] – n. 1. вага́ та́ры. 2. скі́дка на та́ру
– v.t. тарава́ць

target ['tɑ:rgət] n. 1. мішэ́нь, мэ́та, цэль *f.*: ***target practice*** страля́ньне ў цэль. 2. Figur. мішэ́нь *f.*, прадме́т -у *m.* (*кпі́наў, жа́ртаў і пад.*): ***His crazy ideas made him the target of jokes*** Ягóныя вар'я́цкія заду́мы зрабілі яго́ прадме́там жа́ртаў. 3. сыгна́льны дыск (*на чыгу́нцы*)

tariff ['tærɪf] – n. 1. тары́ф -у *m.* (*мы́тны, чыгу́начны*). 2. мы́та *n.*, пада́ткі *pl.* 3. расцэ́нка *f.*, шкала́ цэ́наў: ***the tariff at the hotel*** шкала́ цэ́наў у гатэ́лі
– v.t. наклада́ць тары́ф

tarnish ['tɑ:rnɪʃ] – v.i. 1. тра́ціць бляск; цямне́ць: ***Silver tarnishes quickly*** Срэ́бра ху́тка цямне́е. 2. нясла́віць, зьнеслаўля́ць (*сваё і́мя, го́нар*); пэ́цкаць, пля́міць. 3. бля́кнуць
– n. 1. цьмя́насьць *f.*, пацямне́лая паве́рхня. 2. Figur. зага́на *f.*

tart I [tɑ:rt] adj. 1. кі́слы, да́ўкі. 2. Figur. ко́лкі, зье́длівы: ***a tart reply*** зье́длівы адка́з

tart II [tɑ:rt] n. піражо́к з садавіно́ю наве́рсе

tart III [tɑ:rt] n., Sl. прастыту́тка *f.*

tartan ['tɑ:rtən] n. шатля́ндка *f.* (*ткані́на*), та́ртан -у *m.*; плед -а *m.*

tartar ['tɑ:rtər] n. 1. зубны́ ка́мень. 2. аса́д|ак -ку m. (*у віне́*)

Tartar ['tɑ:rtər] *гл.* **Tartar**

task [tæsk] – n. 1. зада́дзеная пра́ца, зада́ньне *n.*; абавя́з|ак -ку *m.*
– v.t. 1. дава́ць зада́ньне; нагружа́ць пра́цай. 2. абцяжа́рваць; напру́жваць: ***Lifting the heavy box tasked him beyond his strength*** Падня́ць цяжку́ю скры́нку было́ яму́ не пад сі́лу
• ***take to task*** дава́ць вымо́ву; прыця́гваць да адка́знасьці

task force апэрацы́йная гру́па; гру́па са спэцыя́льным зада́ньнем

tassel ['tæsəl] n. 1. кута́с -а́, кута́сік -а *m.* 2. Bot. ката́х -а́ *m.* (*кукуру́зы, вярбы́*)

taste [teɪst] – n. 1. смак -у *m.*: ***to the taste*** да сма́ку. 2. пачуцьцё сма́ку: ***Her taste is unusually keen*** У яе́ незвыча́йна то́нкае пачуцьцё сма́ку. 3. густ -у *m.*: ***Her house is furnished in excellent taste*** Ейны дом умэблява́ны ве́льмі густо́ўна. 4. прабава́ньне, каштава́ньне *n.*
– v.t. 1. каштава́ць, спрабава́ць, смакава́ць. 2. чуць смак: ***She tasted almond in the cake*** Яна́ пачу́ла смак міндáлю ў пірагу́. 3. мець прысмак: ***The soup tastes of onion*** Суп ма́е прысмак цыбу́лі. 4. Figur. зазнава́ць, адчува́ць: ***to taste freedom*** адчу́ць смак во́лі
• ***in bad (poor) taste*** бяз гу́сту
• ***in good taste*** з гу́стам
• ***suit your own taste*** выбіра́й, што табе́ падаба́ецца
• ***take a taste*** паспрабу́й, пакашту́й
• ***tastes differ*** гу́сты быва́юць ро́зныя
• ***to one's taste*** пад густ, даспадо́бы

tasteful ['teɪstfəl] adj. 1. з до́брым гу́стам (*пра асо́бу*). 2. густо́ўны, зро́блены з гу́стам (*пра прадме́т*)

tasteless ['teɪstləs] adj. 1. нясма́чны, бяз сма́ку (*пра е́жу*). 2. безгустóўны, бяз гу́сту (*пра чалаве́ка*)

tastelessly ['teɪstləsli] adv. 1. нясма́чна. 2. бяз гу́сту

tastelessness ['teɪstləsnəs] n. безгусто́ўнасьць *f.*

taster [ˈteɪstər] n. 1. дэгуста́тар -а *m.* 2. прыла́да *або́* пасу́дзіна для дэгуста́цыі

tasty [ˈteɪsti] adj. сма́чны, смачны́. 2. густо́ўны, з гу́стам

Tatar [ˈtɑ:tər] – n. тата́рын -а *m.*, тата́рка *f.*
– adj. тата́рскі

tattle [ˈtætəl] – v.i. балбата́ць; мало́ць языко́м; пляткарыць
– n. 1. балбатня́ *f.* 2. плёткі *pl.*

tattoo [tæˈtu:] – v.t. татуі́раваць, татува́ць
– n. татуіро́ўка *f.*, татува́ньне *n.*, татуаж -у *m.*

taught [tɔ:t] v., *p.t., p.p. of* **teach**

taunt [tɔ:nt] – v.t. дакара́ць; насьміха́цца
– n. дако́р -у *m.*; насьме́шка *f.*

taupe [ˈtoʊp] adj. бруна́тна-сівы́, руда́ва-сівы́

taut [tɔ:t] adj. ту́га наця́гнуты: ***a taut rope*** ту́га наця́гнутая вяро́ўка. 2. дагле́джаны: ***a taut ship*** чы́ста дагле́джаны карабе́ль. 3. падця́гнуты; нару́жаны (*пра чалаве́ка*)

tavern [ˈtævərn] n. 1. тавэ́рна *f.* 2. карчма́ *f.*, зае́зны двор

tawdry [ˈtɔ:dri] adj. крыкліва безгусто́ўны

tawny [ˈtɔ:ni] adj. рыжава́та-руды́

tax [tæks] – n. пада́так -ку *m.*
– v.t. 1. абкладаць пада́ткам. 2. Figur. абцяжа́рваць, напру́жваць: ***Reading in a poor light taxes the eyes*** Чыта́ньне пры благі́м сьвятле́ напру́жвае во́чы. 3. га́ніць; абвінава́чваць: ***to be taxed with negligence*** быць абвінава́чаным у нядба́йнасьці

taxable [ˈtæksəbəl] adj. пада́ткаабкладна́льны: ***Churches are not taxable*** Цэ́рквы не падлягаю́ць пада́ткаабкладна́ньню

taxation [tækˈseɪʃən] n. 1. пада́ткаабкладна́ньне *n.*; таксо́цыя *f.* 2. пада́ткі *pl.*

tax-exempt [ˌtæksɪgˈzempt] adj. звольнены ад пада́тку; не пада́ткаабкладна́льны

taxi [ˈtæksi] – n., pl. **-is** or **-ies** таксі́, *n., indecl.*
– v.i. рулява́ць (*пра самалёт*)

taxicab [ˈtæksikæb] n. таксі́, *n., indecl.*

taximan [ˈtæksimæn] n. таксі́ст -а *m.*

taximeter [ˌtæksiˈmi:tər] n. таксамэ́тар -ра *m.*, лічы́льнік -а *m.* (*у таксі́*)

taxpayer [ˈtæksˌpeɪər] n. пада́ткапла́тнік -а *m.*

tax rate падатко́вая но́рма

TB [ˌti:ˈbi:] Informal тубэркулёз -у *m.*, сухо́ты *pl. only*

tea [ti:] n. 1. гарба́та *f.*, чалй -ю *m.* (*напо́й і ліcьце*). 2. esp. Brit. падвячо́рак з гарба́тай. 3. гарба́та (*пачасту́нак*)
• ***another cup of tea,*** Informal зусі́м не́шта і́ншае
• ***one's cup of tea*** то́е, што не́хта лю́біць

tea bag гарба́та ў пакеціку

teach [ti:tʃ] v.t. **taught, teaching** 1. вучы́ць, навуча́ць. 2. выкладаць, вучы́ць: ***He teaches mathematics*** Ён выкладае матэма́тыку. 4. працава́ць наста́ўнікам, наста́ўнічаць. 5. правуча́ць: ***I will teach him a lesson*** Я яго́ правучу́

teacher [ˈti:tʃər] n. наста́ўнік -а *m.*, наста́ўніца *f.*; выкла́дчык -а *m.*, выкла́дчыца *f.*

teaching [ˈti:tʃɪŋ] n. 1. навуча́ньне *n.* 2. вучэ́ньне *n.*, дактры́на *f.*

tea cozy чахо́л на імбры́к

teacup [ˈti:kʌp] n. ку́бак на гарба́ту
• ***storm in a teacup*** бу́ра ў шкля́нцы вады́

teahouse [ˈti:haʊs] n. чайна́я *f.*

teak [ti:k] n. ці́к -а, -у *m.* (*дрэ́ва, матэрыя́л*)

teakettle [ˈti:ˌketəl] n. гарба́тнік -а *m.*

team [ti:m] – n. 1. кама́нда, дружы́на *f.*; брыга́да *f.*: ***a football team*** футбо́льная кама́нда. 2. запрэ́жка *f.*
– v.t. 1. аб'яднаво́ўвацца, злуча́цца. 2. працава́ць брыга́даю
• ***team up*** злучы́цца ў дружы́ну

team leader лі́дэр гру́пы, брыгадзі́р

teamster [ˈti:mstər] n. фурма́н, вяза́к -а́ *m.*; шафёр грузавіка́

teamwork [ˈti:mwɜ:rk] n. 1. пра́ца брыга́дай. 2. це́снае супрацо́ўніцтва

teapot ['ti:pɑ:t] n. імбры́чlак, ча́йнiк -ка *m.*

tear I [tɪr] n. 1. сьляза́ *f.*: ***to break into tears*** запла́каць, распла́кацца. 2. кро́пля расы́, смалы́
• ***in tears*** у сьлёзах, з пла́чам

tear II [ter] – v.t. **tore, torn, tearing** 1. дзе́рці, прадіра́ць, дра́ць; рва́ць: ***She tore a hole in her dress*** Яна́ прадзе́рла дзі́рку ў суке́нцы. 2. разьдзе́рці, парэ́заць: ***The jagged stone tore his skin*** Ён парэ́заў ску́ру аб во́стры ка́мень
– v.i. 1. рва́цца: ***Lace tears easily*** Кару́нкі лёгка рву́цца. 2. адрыва́цца: ***He could not tear himself from that spot*** Ён ня мог адарва́цца ад таго́ ме́сца. 3. ірвану́ць, ірвану́цца
– n. 1. прадзёртае ме́сца, прарэ́з -у *m.*, дзі́рка *f.* (*у тканіне*). 2. вы́бух гне́ву, зло́сьці. 3. вялі́кі сьпех
• ***tear along*** пране́сьціся, праімча́цца: ***An automobile came tearing along*** Пранёсься аўтамабі́ль
• ***tear down*** а) зрыва́ць: ***He tore down the enemy's flag*** Ён сарва́ў варо́жы сьцяг. б) разбуры́ць, зруйнава́ць, зьне́сьці
• ***tear oneself away*** адарва́цца
• ***tear up*** парва́ць, разарва́ць (*на ка-ва́лкі*)

tear bomb бо́мба са сьлезаце́чным га́зам

teardrop ['tɪrdrɑ:p] n. 1. сьляза́, сьлязі́на, сьлязі́нка *f.* 2. пухірло́к -ка́ *m.* (*у шкле*)

tearful ['tɪrfəl] adj. 1. запла́каны, по́ўны сьлёз. 2. сьлязьлі́вы, плаксі́вы

tearfulness ['tɪrfəlnəs] n. плаксі́васьць *f.*

tear gas сьлезаце́чны газ

tear-gas ['tɪrgæs] v.t. 1. ужыва́ць сьлезаце́чны газ. 2. разганя́ць сьлезаце́чным газам

tea rose ча́йная ру́жа

teary ['tɪri] adj., *гл.* **tearful**

tease [ti:z] – v.t. 1. цьвяліць, дражні́ць; раздражня́ць. 2. жартава́ць, пацьве́льваць з *каго́*. 3. часа́ць (*во́ўну, лён*). 4. варсава́ць, рабіць варсі́стым (*сукно́*). 5. узьбіва́ць (*валасы́*)
– n. жартаўні́к -а́ *m.*; той, хто лю́біць дражні́ць, дражні́цца; спаку́сьнік -а *m.*

tea set гарба́тны набо́р, сэрві́з -у *m.*

teaspoon ['ti:spu:n] n. гарба́тная лы́жка *або́* лы́жачка

teat [ti:t] n. cacло́к -ка́ *m.*

tea wagon сто́лік на ко́лцах для пада-ва́ньня гарба́ты

technical ['teknɪkəl] adj. 1. тэхні́чны. 2. тэхні́чны, спэцыя́льны: ***technical term*** спэцыя́льны тэ́рмін; ***technical skill*** тэ́хніка *f.* (*на́выкі, уме́льства*)

technicality [ˌteknɪ'kæləti] n., pl. **-ties** 1. тэхні́чны вы́раз, тэ́рмін -у *m.* 2. фарма́льнасьць *f.* (*дэталёвая*)

technically ['teknɪkəli] adv. тэхні́чна

technician [tek'nɪʃən] n. тэ́хнік -а *m.*

technics ['teknɪks] n. 1. тэ́хніка *f.*. тэхні́чныя навы́кі. 2. тэ́хніка *f.* (*сьпева-ка́, мастака́*)

technique [tek'ni:k] n. тэ́хніка *f.*: ***The pianist's technique was excellent*** Тэ́хніка ў піяні́ста была́ даскана́лая. 2. мэ́тад -у *m.*: ***a new technique*** но́вы мэ́тад

technological [ˌteknə'lɑ:dʒɪkəl] adj тэхналягі́чны

technologist [tek'nɑ:lədʒɪst] n. тэхно́ляг -а *m.*

technology [tek'nɑ:lədʒi] n. 1. тэхналёгія, тэ́хніка *f.*; тэхні́чныя і ужытко́выя навы́кі. 2. тэхні́чная намэнкля-ту́ра *або́* тэрміналёгія

tectonic [tek'tɑ:nɪk] adj. тэктані́чны

ted [ted] v.t. **(-dd-)** раскіда́ць, разьбіва́ць (*пако́сы*)

tedder ['tedər] n. се́наразьбіва́лка *f.* (*машы́на*)

teddy bear мядзьве́дзік -а *m.* (*ца́цка*)

tedious ['ti:diəs] adj. ну́дны, надаку́члівы

tee [ti:] n. падста́ўка *f.* (*для мя́чыка ў го́льфе*)

teem [ti:m] v.i. кішэ́ць, быць перапо́ўненым

teenage ['ti:neɪdʒ] adj. падле́ткавы (*ад 13 да 19 гадо́ў*)

teenager ['ti:neɪdʒər] n. падлéтак -ка *m.* (*ад 13 да 19 гадóў*)

teens [ti:nz] n., pl. узрóст ад трынаццаці́ да дзевятнаццаці́

teepee ['ti:pi:] n. вігвáм -а *f.* (*жытлó амэрыкáнскіх індыя́наў*)

teeter ['ti:tər] – n. 1. хістáньне, калыхáньне, гóйданьне *n.* 2. гóйданка *f.* – v. 1. хістáцца, калыхáцца. 2. гóйдацца, калыхáцца

teeter-totter [ˌti:tər'tɑ:tər] n. гóйданка, гýшкалка *f.*

teeth [ti:θ] n., *pl. of* **tooth** зýбы: ***armed to the teeth*** мóцна ўзбрóены, узбрóены да зубóў
• ***get one's teeth into*** шчы́ра ўзя́цца за нéшта; учапíцца ў нéшта
• ***grit one's teeth*** скрыгатáць зубáмі
• ***show one's teeth*** паказáць злосьць, пагражáць; шчэ́рыць зýбы (*пра сабáку*)

teethe [ti:ð] v.i. прарэ́звацца (*пра зýбы*)

teething ['ti:ðɪŋ] n. прарэ́званьне зубóў

telecast ['teləkæst] – v.t. **-cast** or **-casted, -casting** перадавáць на тэлевíзіі – n. 1. тэлевізíйная праграмá. 2. тэлевізíйная перадáча

telecommunication [ˌteləkəˌmju:nɪ'keɪʃən] n. сýвязь на адлéгласьці, дáльняя сýвязь

telegram ['telɪgræm] n. тэлегрáма *f.*

telegraph ['teləgræf] n. тэлегрáф -у *m.*

telepathy [tə'lepəθi] n. тэлепáтыя *f.*

telephone ['teləfoʊn] – n. тэлефóн -у *m.* – v.t. тэлефанавáць, званíць: ***He decided to telephone her*** Ён вы́рашыў пазванíць ёй – adj. тэлефóнны

telephone book, *гл.* **telephone directory**

telephone booth тэлефóнная бýдка

telephone directory тэлефóнны давéднік

telephone pole тэлефóнны слуп

telephone receiver тэлефóнная трýбка

telescope ['teləskoʊp] – n. тэлескóп -а *m.* – adj. тэлескóпны

telescopic [ˌtelə'skɑ:pɪk] adj. тэлескапíчны

televiewer ['teləˌvju:ər] n. глядáч тэлевíзіі, тэлеглядáч -едачá *m.*

televise ['teləvaɪz] n. надавáць тэлевізíйную перадáчу, перадавáць па тэлевíзіі

television ['teləˌvɪʒən] n. 1. тэлевíзія *f.*, тэлебáчаньне *n.* 2. тэлевíзар -а *m.*

tell [tel] v.t. **told, telling** 1. раскáзваць, апавядáць. 2. казáць: ***Tell the truth*** Скажы́ прáўду. 3. пазнавáць, разрóзьніваць: ***He couldn't tell which house it was*** Ён ня мог пазнáць, катóры гэ́та быў дом. 4. загáдваць: ***I was told to show my passport*** Мне сказáлі паказáць пáшпарт
• ***Don't tell me*** Ах, не кажэ́це! Не кажэ́це нáват!
• ***I (can) tell you*** Алé, запраўды́; Я вам кажý
• ***tell of*** сьвéдчыць, быць пакáзьнікам *чагóсь*: ***His hard hands told of physical labor*** Ягóныя цьвёрдыя рýкі сьвéдчылі пра фізы́чную прáцу
• ***tell off*** а) Sport., Milit. а) адабрáць, прызнáчыць (*для адпрáўкі на задáньне*). б) прабрáць, аблáяць *кагóсь*
• ***tell on*** а) данóсіць на *кагóсь*; нагавóрваць, плятка́рыць на *кагóсь*. б) адбівáцца на *чым*: ***The strain told on his health*** Цяжкíя выпрабавáньні адбíліся на ягóным здарóўі

teller ['telər] n. 1. касíр -а *m.*, касíрка *f.* (*у бáнку*). 2. апавядáльнік -а *m.*

telltale ['telteɪl] n. 1. плятка́р плеткарá *m.*, плятка́рка *f.*; балбатýн -á *m.*, балбатýха *f.* 2. сыгнáльная прылáда. 3. знак -у *m.*, прыкмéта *f.*

temper ['tempər] – n. 1. настрóй -ю, гумóр -у *m.*: ***She was in a good temper*** Янá былá ў дóбрым настрóі. 2. гнеў -ву *m.*, злосьць *f.*: ***In her temper she broke a vase*** Са злóсьці янá пабíла вázу. 3. самавалóданьне *n.*: ***He became angry and lost his temper*** Ён узлавáўся і стрáціў самавалóданьне. 4. гушчыня́, замéшка сýмесі: ***The temper of the clay was right for shaping*** Гушчыня́ глíны былá адпавéдная для вы́рабу. 5. замéшка ўжы́тая ў сýмесі

– v.t. 1. зьмякча́ць, зьмяншы́ць (*пакара́ньне*). 2. а) мясі́ць (*гліну*), б) мяша́ць фа́рбу. в) гартава́ць (*сталь*). 3. Mus. нала́джваць (*інструме́нт*)

tempera [ˈtempərə] n. тэ́мпэра *f.*

temperament [ˈtempərəmənt] n. 1. хара́ктар -у *m.*, нату́ра *f.*: ***shy temperament*** сарамлі́вая нату́ра. 2. тэмпэра́мэнт -у *m.*

temperamental [ˌtempərəˈmentəl] adj. тэмпэра́мэнтны

temperate [ˈtempərət] adj. 1. памярко́ўны. 2. лагодны, ураўнава́жаны (*пра го́лас, мане́ры*). 3. памярко́ўны (*пра кліма́т*)

temperature [ˈtempərətʃər] n. 1. тэмпэратура *f.* 2. павы́шаная тэмпэратура

tempest [ˈtempɪst] n. 1. навальні́ца, бу́ра *f.* 2. Figur. забурэ́ньне *n.*, бу́ра, бу́ча *f.*: ***a tempest of anger*** бу́ра гне́ву

tempestuous [temˈpestʃuəs] adj. 1. бурлі́вы, бу́рны, навальні́чны: ***a tempestuous night*** навальні́чная ноч. 2. Figur. бу́рны, шумлі́вы: ***a tempestuous argument*** бу́рная спрэ́чка

template [ˈtempleɪt] n. шаблён, трафарэ́т -у *m.*

temple I [ˈtempəl] n. сьвятыня *f.*, храм -а *m.*

temple II [ˈtempəl] n. скронь *f.*

tempo [ˈtempou] n. 1. Mus. тэмп -у *m.*: ***waltz tempo*** тэмп ва́льсу. 2. рытм, тэмп -у *m.*: ***the fast tempo of modern life*** ху́ткія тэ́мпы сучасна́га жыцьця́

temporal I [ˈtempərəl] adj. 1. часо́вы. 2. мінучы, сьве́цкі, зямны́. 3. Gram. які́ азнача́е час: ***temporal adverb*** прыслоўе ча́су

temporal II [ˈtempərəl] adj. скро́невы

temporary [ˈtempəreri] adj. часо́вы, ня ста́лы

tempt [tempt] v.t. 1. спакуша́ць. 2. на́дзіць, ва́біць, прыва́бліваць. 3. правакава́ць, падбухто́рваць: ***to tempt the fate*** шука́ць бяды́. 4. схіля́ць, прыхіля́ць: ***to be tempted to disagree*** быць схі́льным не пагаджа́цца

temptation [tempˈteɪʃən] n. 1. спакуша́ньне *n.* 2. спаку́са, прына́да *f.*: ***to resist temptation*** стрыма́цца ад спаку́сы

tempter [ˈtemptər] n. спаку́сьнік -а *m.*, спаку́сьніца *f.*

• ***the Tempter*** чорт -а, сатана́ -ы́ *m.*

tempting [ˈtemptɪŋ] adj. спаку́сьлівы, прына́дны, прыва́бны

ten [ten] – n., adj. 1. дзе́сяць. 2. дзесяцёра (*дзяце́й, людзе́й*); дзесяцёх (*хлапцо́ў*). 3. дзяся́так -ка, дзесятко́к -ка́ *m.*: ***ten eggs*** адзі́н дзесятко́к я́ек. 4. дзяся́тка *f.* (*ка́рта*)

tenacious [tɪˈneɪʃəs] adj. 1. мо́цны, учэпісты. 2. які́ мо́цна трыма́ецца: ***a person tenacious of his rights*** асо́ба, яка́я мо́цна трыма́ецца сваіх правоў. 3. упа́рты; насто́йлівы: ***a tenacious salesman*** насто́йлівы прадаве́ц. 4. трыва́лы: ***a tenacious memory*** трыва́лая па́мяць. 5. вя́зкі; лі́пкі, кле́йкі

tenancy [ˈtenənsi] n. арэ́нда *f.*

tenant [ˈtenənt] n. 1. кватара́нт -а *m.* 2. арандатар -а *m.*

tench [tentʃ] n. **tench,** coll., pl. **tenches** лінь -я́ *m.* (*ры́ба*)

Ten Commandments Дзе́сяць За́паведзяў

tend I [tend] v.i. 1. мець тэндэ́нцыі, схіля́цца. 2. кірава́цца, падава́цца: ***The coastline tends to the south*** Лі́нія ўзьбярэ́жжа тут кіру́ецца напаўдня́

tend II [tend] v.t. даглядаць; па́сьвіць: ***He tends shop for his father*** Ён даглядае майстэ́рню ба́цькі; ***A shepherd tends his flock*** Пастух па́сьвіць свой ста́так. 2. абслугоўваць

tendency [ˈtendənsi] n., pl. **-cies** схі́льнасьць *f.*, нахі́л -у *m.*: ***Boys have a tendency to fight*** Хлапцы́ ма́юць схі́льнасьць бі́цца

tendentious [tenˈdenʃəs] adj. прадузя́ты, неаб'ектыўны, тэндэнцыйны: ***a tendentious statement*** тэндэнцыйнае цьвярджаньне

tender I [ˈtendər] adj. 1. мя́ккі, далікатны. 2. ласка́вы, чу́лы, пяшчо́тны: ***She spoke tender words to the child***

Яна́ гаварыла да дзіця́ці пяшчо́тнымі сло́вамі; ***tender loving hands*** далікатныя, пяшчо́тныя ру́кі. 3. адчува́льны, чу́лы, балю́чы: ***a tender wound*** балю́чая ра́на; ***a tender heart*** чу́лае се́рца. 4. Figur. далікатны: ***a tender situation*** далікатнае стано́вішча

tender II [ˈtendər] – v.t. 1. прапанава́ць: ***to tender one's thanks*** афіцыйна выказаць падзя́ку. 2. прапанава́ць ку́плю *або́* про́даж чаго́
– n. 1. прапано́ва: ***tender of marriage*** прапано́ва жані́мства. 2. тэ́ндэр -у *m.* (*у га́ндлі*)

tender III [ˈtendər] n. 1. дагля́дчык -а *m.* 2. тэ́ндэр -а *m.*

tenderize [ˈtendəraɪz] v.t. зьмякча́ць (*мя́са*)

tenderloin [ˈtendərlɔɪn] n. паляндві́ца, вы́разка *f.*, філе́ *n.*

tenderly [ˈtendərli] adv. ласка́ва; далікатна; чу́льліва, пяшчо́тна

tendon [ˈtendən] n. сухажы́льле *n.*

tendril [ˈtendrəl] n., Bot. ву́сік -а *m.*

tenement [ˈtenəmənt] n. паме́шканьне, жытло́ *n.*
• ***tenement house*** шматкватэ́рны дом

tenfold [ˈtenfould] – adj. дзесяціразо́вы
– adv. у дзе́сяць разо́ў; дзесяціразо́ва

tennis [ˈtenɪs] – n. тэ́ніс -у *m.*
– adj. тэ́нісны

tennis ball тэ́нісны мя́чык

tennis court тэ́нісная пляцо́ўка, корт -у *m.*

tennis racket тэ́нісная раке́тка

tennis shoes тэнісо́ўкі

tenor [ˈtenər] n. 1. уклад жыцьця́: ***the calm tenor of her life*** спако́йны ўклад е́йнага жыцьця́. 2. накіраванасьць, су́тнасьць *f.* (*прамо́вы, арты́кулу*). 3. тэ́нар -у, -а *m.* (*го́лас, сьпява́к*)

tense I [tens] – adj. 1. ту́га наця́гнуты: ***a tense rope*** ту́га наця́гнутая вяро́ўка. 2. напру́жаны: ***tense nerves*** напру́жаныя нэ́рвы; ***a tense moment*** напру́жаны мо́мант
– v.t. 1. мо́цна, ту́га нацягваць. 2. напру́жваць: ***He tensed his muscles*** Ён напру́жыў муску́лы

tense II [tens] n., Gram. час -у *m.* (*дзеясло́ва*)

tensible [ˈtensɪbəl] adj. расьцяжны́

tensile [ˈtensəl] adj. 1. датычны напру́жаньня: ***tensile force*** сі́ла напру́жаньня; ***tensile strength*** мяжа́ трыва́ласьці на разры́ў. 2. расьцяжны́

tensility [tenˈsɪləti] n. расьця́жнасьць *f.*

tension [ˈtenʃən] n. 1. напру́жаньне *n.* 2. наця́гнутасьць, напя́тасьць *f.*, расьця́гненьне *n.*: ***The tension of the spring is caused by the weight*** Расьця́гненьне спружы́ны выклі́каецца цяжа́рам. 3. напру́жанасьць (*нэрво́вая*). 4. Figur. наця́гнутасьць *f.*, напру́жаньне *n.*: ***political tension*** палітычнае напру́жаньне. 5. вальта́ж -у́ *m.*, напру́жаньне *n.*: ***high-tension wires*** лі́ніі высо́кага напру́жаньня. 6. пру́гкасьць, пру́ткасьць *f.* (*га́зу, па́ры*)

tensity [ˈtensəti] n. наця́гнутасьць, напру́жанасьць *f.*

tent [tent] – n. намёт -а *m.*, пала́тка *f.*, шальцёр -тра́ *m.*
– v.i. жыць у намёце
– v.t. накрыва́ць (*як намётам*)

tentacle [ˈtentəkəl] n. 1. Zool. шчу́пальца *n.* 2. Bot. залозісты валасо́к

tentacular [tenˈtækjələr] adj. шчу́пальцавы

tentative [ˈtentətɪv] adj. 1. про́бны, до́сьледны: ***a tentative plan*** про́бны плян. 2. няўпэ́ўнены

tenth [tenθ] – adj. дзяся́ты.
– n. дзяся́тая ча́стка

tenure [ˈtenjər] n. 1. тэ́рмін знахо́джаньня на пра́цы, кадэ́нцыя *f.* 2. гара́нтыя ста́лай пра́цы. 3. валоданьне (*зямлёю*). 4. умо́вы валоданьня

tepee [ˈtiːpiː] n. *гл.* **teepee**

tepid [ˈtepɪd] adj. цеплава́ты, ле́тні (*напр. вада́*)

tercentenary [ˌtɜːrsenˈtenəri] – adj. трохсотгадо́вы
– n., pl. **-naries** трохсотго́дзьдзе *n.*

tercentennial [ˌtɜːrsenˈteniəl] adj., n. *гл.* **tercentenary**

term [tɜ:rm] – n. 1. тэ́рмін -а *m.*: ***medical terms*** мэды́чныя тэ́рміны. 2. час трыва́ньня; тэ́рмін паўнамо́цтва, кадэ́нцыя *f.*: ***a president's term of office*** тэ́рмін паўнамо́цтваў прэзыдэ́нта. 3. пэры́яд (*шко́льнага навуча́ньня*): ***the fall term*** во́сеньскі сэмэ́стар. 4. вы́значаны тэ́рмін для выкана́ньня ўмо́ваў. 5. Math. член прапо́рцыі
– v.t. называ́ць: ***He might be termed handsome*** Яго́ мо́жна назва́ць прыго́жым
• ***bring to terms*** схіліць *каго́* згадзі́цца на *што*; прымусіць прыня́ць умо́вы
• ***come to terms*** прыйсьці́ да пагадне́ньня, пагадзі́цца
• ***in terms of money*** пералічы́ўшы на гро́шы
• ***terms*** а) умо́вы: ***the terms of a treaty*** умо́вы тракта́ту. 2) узае́мадачыне́ньні *n.*: ***to be on good terms*** быць у до́брых, прыя́зных дачыне́ньнях, зго́дна, до́бра жыць. в) сло́вы, вы́разы: ***He talked about you in very flattering terms*** Ён адзыва́ўся аб табе́ ве́льмі пахва́льнымі сло́вамі

terminable ['tɜ:rmɪnəbəl] adj. 1. які́ мо́жна ско́нчыць, спыні́ць, анулява́ць, які́ канча́ецца: ***The contract was terminable by either party*** Кантра́кт мог быць анулява́ны хоць любы́м з бако́ў. 2. абмежава́ны тэ́рмінам, тэрміно́вы: ***a loan terminable in 10 years*** пазы́ка на 10 гадо́ў

terminal ['tɜ:rmɪnəl] – adj. 1. канцавы́. 2. канча́льны: ***terminal illness*** невыле́чная хваро́ба. 3. паграні́чны
– n. 1. канцы́ -ца́ *m.*, канчатко́вая ча́стка. 2. канцава́я ста́нцыя (*чыгу́начная, аўто́бусная*). 3. тэрміна́л -а *m.* 4. Electr. кле́ма *f.*

terminate ['tɜ:rmɪneɪt] – v.t. 1. зако́нчыць, ско́нчыць; пакла́сьці кане́ц: ***to terminate a partnership*** спыні́ць супо́льніцтва, разьвяза́ць супо́лку. 2. зво́льніць
– v.i. канча́цца: ***His contract terminates soon*** Яго́ны кантра́кт ху́тка канча́ецца

termination [ˌtɜ:rmɪ'neɪʃən] n. 1. заканчэ́ньне *n.*, канцы́ -ца́ *m.* 2. канча́так сло́ва

terminological [ˌtɜ:rmənə'lɑ:dʒɪkəl] adj. тэрміналагі́чны

terminology [ˌtɜ:rmə'nɑ:lədʒi] n., pl. **-gies** тэрміналёгія *f.*

termite ['tɜ:rmaɪt] n., Zool. тэрмі́т -а *m.*

termless ['tɜ:rmləs] adj. неабмежава́ны ўмо́вамі ні тэ́рмінам

terrace ['terəs] n. 1. тэра́са *f.* (*зяме́льная, го́рная*). 2. тэра́са, вэра́нда *f.*, балько́н -а *m.*

terrain [tə'reɪn] n. 1. мясцо́васьць *f.* 2. грунт -у *m.* 3. Figur. по́ле *n.*: ***His terrain of knowledge*** Яго́нае по́ле ве́ды

terrestrial [tə'restriəl] adj. 1. зямны́: ***terrestrial magnetism*** зямны́ магнэты́зм. 2. сухазе́мны: ***terrestrial animals*** сухазе́мныя жывёліны; ***terrestrial plants*** сухазе́мныя расьлі́ны. 3. сьве́цкі, зямны́

terrible ['terəbəl] adj. 1. страшны́, гро́зны. 2. жахлі́вы: ***the terrible suffering caused by the war*** жахлі́выя цярпе́ньні, спрычы́неныя вайно́ю. 3. Informal страшэ́нны, жахлі́вы

terrier ['teriər] n. тэр'е́р -а *m.* (*паро́да саба́каў*)

terrific [tə'rɪfɪk] adj. 1. страшэ́нны, застраша́льны. 2. Informal цудо́ўны. 3. Informal ве́льмі суро́вы, мо́цны

terrified ['terəfaɪd] adj. мо́цна спало́ханы, напо́ўнены жа́хам; перапало́ханы, напало́ханы

terrify ['terəfaɪ] v.t. **-fied, -fying** напаўня́ць жа́хам, жаха́ць; мо́цна пало́хаць

terrifying ['terəfaɪŋ] adj. вусьцішны, застраша́льны

territorial [ˌterə'tɔ:riəl] adj. тэрытарыя́льны: ***Many wars have been fought for territorial gain*** Шмат во́йнаў вяло́ся за пашырэ́ньне тэрыто́рыі

territory ['terətɔ:ri] n., pl. **-ries** 1. тэрыто́рыя *f.*: ***Much territory in Africa is desert*** Вялі́кая тэрыто́рыя Афры́кі занята́я пусты́няй. 2. раён -у *m.*, абша́р зямлі́: ***The company leased a large***

territory for oil exploration Кампа́нія ўзяла́ ў арэ́нду вялі́кі абша́р зямлі́ для по́шукаў на́фты. 3. галіна́, сфэ́ра *f.* (*наву́кі*)

• ***Territory*** тэрыто́рыя, край (*адміністрацы́йная адзі́нка*): ***the Yukon Territory*** тэрыто́рыя Юко́н

terror [ˈterər] n. 1. жах, страх -у *m.* 2. тэро́р -у *m.* 3. Informal страхо́цьце *n.*

terrorism [ˈterərˌɪzəm] n. тэрары́зм -у *m.*

terrorist [ˈterərɪst] n. тэрары́ст -а *m.*, тэрары́стка *f.*

terrorize [ˈterəraɪz] v.t. 1. напаўня́ць стра́хам, запало́хваць, тэрарызава́ць. 2. улада́ць *або́* паняво́льваць тэро́рам

terror-stricken [ˈterərˌstrɪkən] adj. ахо́плены жа́хам

terry cloth во́рсавая тканіна

terse [tɜːrs] adj. сьці́слы, выра́зны, лякані́чны (*стыль*)

test [test] – n. 1. а) экза́мэн, тэст, іспы́т -у *m.*; кантро́льная рабо́та: ***a test in arithmetic*** кантро́льная рабо́та па арытмэ́тыцы. б) выпрабава́ньне *n.* (*уме́льства*). 2. ме́рка *f.*, крыта́рый -ю *m.* 3. Chem. аналі́з -у *m.* 4. выпрабава́ньне *n.*, тэст -у *m.*: ***nuclear weapon test*** выпрабава́ньне я́дзернае зброі́

– v.t. 1. спраўджа́ць (*ве́ды, сумле́ннасьць*). 2. выпрабо́ўваць, правяра́ць

testament [ˈtestəmənt] n. тэстамэ́нт -у *m.*

Testament Запаве́т -у *m.*: ***the Old Testament*** Стары́ Запаве́т; ***the New Testament*** Но́вы Запаве́т

testator [ˈtesteɪtər] n. завяшча́льнік, адказа́льнік, тэста́тар -а *m.*

test ban пагадне́ньне аб забаро́не выпрабо́ўваньня я́дзернае зброі́

tester [ˈtestər] n. экзамэна́тар -а *m.*

testicle [ˈtestɪkəl] n. яе́чка *n.* (*у самца́*)

testify [ˈtestɪfaɪ] v., **-fied, -fying** 1. сьве́дчыць (*у судзе́*). 2. сьве́дчыць, каза́ць: ***The excellence of his plays testifies to his genius*** Даскана́ласьць яго́ных п'е́саў сьведчыць аб яго́най генія́льнасьці. 2. пацьвярджа́ць: ***to testify one's appreciation*** вы́казаць сваё прызна́ньне

testimony [ˈtestəmouni] n., pl. **-nies** 1. сьве́дчаньне *n.*: ***give testimony*** сьве́дчыць, пацьвярджа́ць. 2. азна́ка, до́каз -у *m.*: ***in testimony of our respect*** у до́каз на́шае паша́ны. 3. ***testimonies*** Бо́жыя зако́ны, Бо́жыя нака́зы

test tube, Chem. прабі́рка *f.*

tetanus [ˈtetənəs] n., Med. слупня́к -а́ *m.*

tether [ˈteðər] – n. вяро́ўка, пры́вязь *f.*

– v.t. прывя́зваць

• ***at the end of one's tether,*** Informal выбіва́цца з апо́шніх сро́дкаў *або́* сі́лаў

tetravalent [ˌtetrəˈveɪlənt] adj., Chem. чатыро́хва́ртасны, чатыро́хвале́нтны

Teuton [ˈtuːtən] – n. 1. тэўто́н -а, не́мец -ца *m.* 2. герма́нец -ца *m.*

– adj. нямецкі; тэўто́нскі; герма́нскі

Teutonic [tuˈtɑːnɪk] adj. 1. старагерма́нскі. 2. нямецкі, тэўто́нскі: ***Teutonic knight*** тэўто́нскі ры́цар, крыжа́к -а́ *m.*

Texan [ˈteksən] – adj. тэ́ксаскі, тэха́скі

– n. тэ́ксасец, тэха́сец -ца *m.*: ***Texas Rangers*** ко́нная пало́ція ў Тэ́ксасе

text [tekst] n. 1. тэкст -у *m.* 2. падру́чнік -а *m.* 3. цыта́та зь Бі́блii (*тэ́ма ка́зані*)

textbook [ˈtekstbʊk] – n. падру́чнік -а *m.*

– adj. тыпо́вы, станда́ртны, агульнапрыня́ты

textile [ˈtekstaɪl] – adj. 1. тка́ны: ***Cloth is a textile fabric*** Палатно́ — гэ́та тка́ны матэрыя́л. 2. тка́цкі: ***the textile art*** тка́цтва *n.*, тка́цкае ўме́льства *або́* маста́цтва

– n. тканіна *f.*

textual [ˈtekstʃuəl] adj. тэ́кставы

texture [ˈtekstʃər] n. 1. тканіна *f.*; я́касьць тканіны: ***coarse (fine) texture*** грубая́ (то́нкая) тканіна. 2. будо́ва, структу́ра, тэкстýра *f.*

than [ðæn] conj. 1. як, за, чы́мся: ***This train is faster than that one*** Гэ́ты цягні́к хутчэ́йшы за той. 2. іна́кш, як, як не: ***How else can we come than on foot?*** Як іна́кш мо́жам прыбы́ць, як не пехато́й?

thank [θæŋk] – v.t. 1. дзя́каваць: ***I thank you*** Дзя́кую. 2. ***You may thank yourself for that*** Ты сам у гэ́тым вінава́ты

– n. удзя́чнасьць, падзя́ка *f.*
• ***thanks*** дзя́куй: ***many thanks*** вялі́кі дзя́куй
• ***thanks to*** дзя́куючы чаму́; з прычы́ны чаго́

thankful ['θæŋkfəl] adj. удзя́чны

thankfully ['θæŋkfəli] adv. з падзя́кай, з удзя́чнасьцю

thankless ['θæŋkləs] adj. няўдзя́чны

thanksgiving ['θæŋks,gɪvɪŋ] n. аддава́нье падзя́кі, дзя́каваньне *n.*
Thanksgiving Day Дзень дзя́каваньня

that [ðæt] – adj., pl. **those** [ðouz] той, гэ́ны: ***Do you know that boy?*** Ці ты зна́еш гэ́нага хлапца́?
– pron. 1. гэ́та: ***That is the right way*** Гэ́та пра́вільны спо́саб; ***That's a good boy!*** До́бры хло́пец!; ***That's what it is*** То ж бо. 2. то́е: ***I like that better than this*** То́е мне больш падаба́ецца, чым гэ́тае. 3. хто, які́: ***the members that were present*** сябры́, якія былі́ прысу́тныя; ***the book that I'm reading*** кні́га, яку́ю я чыта́ю. 5. у які́м, калі́: ***the year that we went to Europe*** год, у які́м мы е́здзілі ў Эўро́пу
– conj. 1. што: ***I know that 6 and 4 are 10*** Я ве́даю, што 6 і 4 ёсьць 10. 2. каб: ***He ran fast that he might not be late*** Ён шпа́рка бег, каб не спазьні́ца. 3. калі́ б (*як вы́каз жада́ньня*): ***Oh, that she were here!*** О, калі́ б яна́ была́ тут!
– adv. гэ́так, гэ́тулькі, да таго́: ***He was that angry he couldn't say a word*** Ён быў да таго́ зло́сны, што ня мо́г сло́ва сказа́ць
• ***that's it,*** Informal гэ́та ўсё, вось і ўсё

thatch [θætʃ] – n. 1. сало́ма *або́* трысьцё для крыцьця́ стрэ́хаў. 2. страха́ з сало́мы. 3. Informal чупры́на *f.*
– v.t. крыць страху́ сало́май

thaw [θɔ:] – v.t. 1. растапля́ць: ***Salt was put on the sidewalk to thaw the ice*** Хо́днік пасы́палі со́льлю, каб растапі́ць лёд. 2. адта́йваць, размаро́жваць: ***to thaw frozen meat*** размаро́зіць замаро́жанае мя́са
– v.i. 1. адтава́ць: ***It will probably thaw today*** Сёньня магчы́ма бу́дзе адтава́ць. 2. Figur. растава́ць, паступо́ва зьніка́ць (*пра суро́васьць*); мякчэ́ць, дабрэ́ць (*пра се́рца*)
– n. 1. растава́ньне (*лёду*); адта́йваньне, размаро́жваньне *n.* (*мя́са*). 2. адле́га, адлі́га *f.*: ***a January thaw*** сту́дзеньская адле́га. 3. Figur. адлі́га *f.*: ***political "thaw"*** палітычная «адлі́га»

the I [ðə] *не пад на́ціскам пе́рад зы́чным*; [ði:] *перад гало́сным і пад на́ціскам — азнача́льны арты́кль.* 1. *азначае не́што до́бра вядо́мае або́ ўніка́льнае*: ***the*** [ðə] ***prodigal son*** блу́дны сын (*бібліі́йны*); ***the*** [ði:] ***Alps*** А́льпы; ***the*** [ðə]***sun*** со́нца *n.*: ***the*** [ðə] ***moon*** ме́сяц -а *m.* 2. *пака́звае, што прадме́т ці асо́ба зьяўля́ецца найбо́льш адпаве́дным*: ***He is the man for the position*** Ён адпаве́дны чалаве́к на гэ́тае стано́вішча. 3. *азначае ча́стку це́ла*: ***hang the head in shame*** апусьці́ць галаву́ ад со́раму. 4. *пе́рад прыме́тнікам у ро́лі назо́ўніка*: ***to visit the sick*** наве́даць хво́рых

the II [ðə] adv. 1. у параўна́ньні з папярэ́днім ста́нам: ***He has been on vacation and looks the better for it*** Ён быў у адпачы́нку і выгляда́е параўна́льна лепш. 2. ***the... the...*** чым... тым: ***the more the merrier*** чым больш, тым весяле́й; ***the sooner the better*** чым хутчэ́й, тым лепш

theater, Brit. **theatre** ['θi:ətər] n. тэа́тар -ру *m.*

theatergoer ['θi:ətər,gouər] n. наве́днік тэа́тру, тэатра́л -а *m.*

theatrical [θɪ'ætrɪkəl] – adj. 1. тэатра́льны: ***theatrical performances*** тэатра́льныя пастано́ўкі, спэкта́клі; ***a theatrical company*** тэатра́льная тру́па. 2. тэатра́льны, паказны́, ненатура́льны, разьлі́чаны на эфэ́кт
– n. ***theatricals,*** pl. а) тэатра́льныя пастано́ўкі, спэкта́клі (*асабл. ама́тарскія*). б) тэатра́льнае маста́цтва

thee [ði:] pron., Archaic цябе́ (*вінава́льны склон ад* ***thou,*** *ты*)

theft [θeft] n. зладзе́йствa -а *n.*; крадзе́ж крадзяжу́ *m.*: ***The man was put in prison for theft*** Чалаве́ка пасадзі́лі ў турму́ за зладзе́йства

their [ðer] adj. і́хны; свой: ***They like their school*** Яны́ лю́бяць сваю́ шко́лу

theirs [ðerz] pron. 1. і́хны: ***Those books are theirs, not mine*** Гэ́ныя кні́гі і́хныя, а не маé

theism ['θi:ɪzəm] n. тэі́зм -у *m.*

them[ðem] pron. *уско́сны скло́н ад* **they**: ***of them*** іх; ***to them*** ім; ***with them*** зь і́мі

thematic [θi:'mætɪk] adj. тэматы́чны

theme [θi:m] n. 1. тэ́ма *f.*; прадме́т -у *m.* (*дакла́ду, ле́кцыі*). 2. Mus. гало́ўны маты́ў

themselves [ðem'selvz] pron. 1. (*узмо́цненая фо́рма ад* **they** *або́* **them**) са́мі: ***They did it themselves*** Яны́ зрабі́лі гэ́та са́мі. 2. (*зваро́тная фо́рма ад* **them**) сябе́: ***They washed themselves*** Яны́ памы́ліся. 3. са́мі сабо́ю: ***They were ill and were not themselves*** Яны́ былі́ хво́рыя і не былі́ са́мі сабо́ю

then [ðen] – adv. 1. тады́: ***Prices were lower then*** Цэ́ны тады́ былі́ ніжэ́йшыя. 2. по́тым, тады́: ***The noise stopped, and then began again*** Го́ман спыні́ўся, а тады́ пача́ўся ізно́ў. 3. апрача́ таго́, да таго́ ж: ***The dress seems too good to throw away, and then it is very attractive*** Суке́нка здае́цца яшчэ́ зана́дта до́брай, каб яе́ вы́кінуць, да таго́ ж яна́ ве́льмі прыго́жая. 4. дык: ***If Joe broke the window, then he should pay for it*** Калі Ю́зік разьбі́ў акно́, дык ён паві́нен заплаці́ць за яго́
– n. той час, та́я пара́: ***By then we should know the result*** Да таго́ ча́су мы паві́нны ве́даць вы́нікі
– adj. тагача́сны, тады́шні: ***the then Prime Minister*** тады́шні прэм'е́рмініcтар
• ***but then*** а́ле аднача́сна; а́ле з другі́ м бо́ку
• ***now and then*** час-часо́м, ча́сам
• ***then and there*** на ме́сцы; ту́т жа; адра́зу ж

thence [ðens] adv. 1. ад таго́ ме́сца, адту́ль. 2. таму, дзе́ля таго́. 3. ад таго́ ча́су: ***a year thence*** год ад таго́ ча́су

thenceforth [ˌðens'fɔ:rθ] *or* **thenceforward** [ˌðens'fɔ:rwərd] з таé пары́, з таго́ ча́су

theologian [ˌθi:ə'loudʒiən] n. багасло́лў -ва, тэалёг -а *m.*

theological [ˌθi:ə'lɑ:dʒɪkəl] adj. багасло́ўскі, тэалягі́чны

theology [θi'ɑ:lədʒi] n., pl. **-gies** багасло́ўе *n.*, тэалёгія *f.*

theorem ['θi:ərəm] n. тэара́ма *f.*

theoretical [ˌθi:ə'retɪkəl] adj. тэарэты́чны

theoretician [ˌθi:ərə'tɪʃən] n. тэара́тык -а *m.*

theory ['θi:əri] n., pl. **-ries** тэо́рыя *f.*

therapeutic [ˌθerə'pju:tɪk] *or* **therapeutical** [ˌθerə'pju:tɪkəl] adj. тэрапэ́ўты́чны, лячэ́бны

therapeutics [ˌθerə'pju:tɪks] n. тэрапі́я *f.*

therapy ['θerəpi] n., pl. **-pies** лячэ́ньне *n.*, тэрапі́я *f.*

there [ðer] – adv. 1. там, та́мака: ***Sit there*** Сядзі́ там. 2. туды́: ***Go there at once*** За́раз жа ідзі́ туды́. 3. тут, у гэ́тым: ***You are mistaken there*** Тут вы памыля́цеся. 4. (з ***is, are***) ёсьць, тут ёсьць: ***There are three new houses on our street*** На на́шай ву́ліцы ёсьць тры но́выя дамы́; ***Is there a bus stop near here?*** Ці ёсьць тут бліzка аўто́бусны прыпы́нак? 5. вось: ***There he goes*** Вось ён ідзе́; ***There he goes again*** Ён зноў пачына́е то́е са́мае
– n. то́е ме́сца: ***from there*** адту́ль, ад таго́ ме́сца; ***up to there*** да таго́ ме́сца
– interj. ну!: ***There, there! Don't cry*** Ну, ну! Ня плач
• ***all there,*** Informal а) пі́льны, чу́йны; бы́стры (пра ро́зум). б) пры сваім ро́зуме, норма́льны
• ***Here you are!*** а) Вось і вы. б) Вось вам; Вось то́е, што вам тра́ба

thereabouts [ˌðerə'bauts] adv. 1. паблі́зу, недалёка. 2. каля́ гэ́тага: ***The book cost me two dollars or thereabouts*** Кні́га каштава́ла мне два даля́ры ці не́шта каля́ гэ́тага

thereafter [ˌðerˈæftər] adv. 1. пасьля́ таго́, ад таго часу; пасьля́, по́тым. 2. адпаве́дна
thereby [ˌðerˈbaɪ] adv. 1. пры дапамо́зе чаго́; такі́м спо́сабам, гэ́так: ***travel and thereby study the customs of other countries*** падаро́жнічаць і гэ́так пазнава́ць звы́чаі і́ншых краёў. 2. у су́вязі з тым. 3. набл і́зу, бл і́зка
therefor [ˌðerˈfɔːr] adv. на гэ́та; для гэ́тага
therefore [ˈðerfɔːr] adv. дзе́ля таго́; таму́: ***He was the only candidate; therefore he was elected*** Ён быў адзі́ным кандыда́там, таму́ яго́ вы́бралі
therein [ˌðerˈɪn] adv. 1. у тым. 2. у той спра́ве; пад тым по́глядам
thereof [ˌðerˈʌv] adv. ад таго́; з тае́ прычы́ны
thereon [ˌðerˈɑːn] adv. 1. на тым. 2. за́раз жа пасьля́ таго́
thereto [ˌðerˈtuː] adv. 1. да таго́, да яго́. 2. у дада́так; такса́ма; апрача́ таго́; звыш таго́
thereupon [ˌðerəˈpɑːn] adv. 1. і адра́зу пасьля́ таго́. 2. з прычы́ны таго́; таму́
thermal [ˈθɜːrməl] adj. 1. цеплавы́. 2. тэрмі́чны
thermodynamic [ˌθɜːrmoʊdaɪˈnæmɪk] adj. тэрмадынамі́чны
thermodynamics [ˌθɜːrmoʊdaɪˈnæmɪks] n. тэрмадына́мі ка *f.*
thermoelectric [ˌθɜːrmoʊɪˈlektrɪk] adj. тэрмаэлектры́чны
thermometer [θɜːrˈmɑːmətər] n. тэрмо́мэт|ар -ра *m.*
thermos bottle тэ́рмас -а *m.*
thermostat [ˈθɜːrməstæt] n. тэрмаста́т -а *m.*
these [ðiːz] adj., pron, *pl. of* **this**
thesis [ˈθiːsɪs] n., pl. **-ses** [-siːz] 1. тэ́зіс -у *m.*, тэ́за *f.*, прыпушчэ́ньне *n.* 2. цьвёрджаньне, палажэ́ньне *n.* 2. дысэрта́цыя *f.*: ***doctoral thesis*** до́ктарская дысэрта́цыя
they [ðeɪ] pron. 1. *мно́жны лік ад* **he, she** *або́* **it** яны́. 2. Informal лю́дзі: ***they say*** лю́дзі ка́жуць
they'd [ðeɪd] *скаро́т ад*: 1. **they had.** 2. **they would**
they'll [ðeɪl] *скаро́т ад*: 1. **they will.** 2. **they shall**
they're [ðer] *скаро́т ад*: **they are**
they've [ðeɪv] *скаро́т ад*: **they have**
thick [θɪk] – adj. 1. то́ўсты, таўсты́, грубы́,: ***thick stone walls*** таўсты́я каме́нныя сьце́ны; ***two centimeters thick*** два сантыме́тры таўшчыні́. 2. густы́: ***thick hair*** густы́я валасы́. 3. густы́, цягу́чы: ***thick liquid*** цягу́чая, густа́я ва́дкасьць. 4. тума́нны, хма́рны (*пра надво́р'е*). 5. ні́зкі; грубы́, хры́плы: ***a thick voice*** хры́плы го́лас. 6. дурны́, тупы́: ***He has a thick head*** Ён ма́е дурну́ю галаву, ён тупагало́вы
– adv. то́ўста; гу́ста
– n. 1. гу́шча *f.*: ***in the thick of the fight*** у гу́шчы бо́ю, у гара́чым баі
• ***lay it on thick,*** Informal празьме́рна хвалі́ць *або́* га́ніць
• ***through thick and thin*** у до́лі й нядо́лі
thicken [ˈθɪkən] – v.t. згушча́ць
– v.i. 1. згушча́цца, згуса́ць. 2. гусьце́ць. 3. Figur. блы́тацца, ускладня́цца: ***The plot thickens*** Фа́була ўскладня́ецца
thickened [ˈθɪkənd] adj. 1. згу́шчаны. 2. згусьце́лы, загусьце́лы (*кісе́ль*)
thickening [ˈθɪkənɪŋ] n. 1. сро́дак для згушчэ́ньня (*рэ́чыва, напр. крухма́л*). 2. згу́ст|ак -ка *m.* 3. згушчэ́ньне *n.*
thicket [ˈθɪkɪt] n. за́расьні к, гушча́р -у *m.*
thick-headed [ˌθɪkˈhedɪd] adj. дурны́, тупы́, тупагало́вы
thickly [ˈθɪkli] adv. 1. гу́ста: ***a thickly settled region*** гу́ста насе́леная мясцо́васьць. 2. ча́ста. 3. хры́пла
thickness [ˈθɪknəs] n. 1. гушчыня́ *f.* 2. таўшчыня́ *f.* 3. пласт -а́ *m.*, сто́лка *f.*
thick-set or **thickset** [ˌθɪkˈset] adj. 1. гу́ста засе́яны, заса́джаны *або́* насе́лены ***a thick-set hedge*** гу́ста заса́джаны жывапло́т. 2. каржакава́ты: ***a thick-set man*** каржакава́ты мужчы́на
thick-skinned [ˌθɪkˈskɪnd] adj. таўстаску́ры, а) з таўсто́ю ску́рай *або́* ску́ркай: ***a thick-skinned orange*** таўста

ску́ры ара́нжык. б). Figur. неадчува́льны

thick-witted [ˌθɪkˈwɪtɪd] adj. дурны́, тупагало́вы

thief [θi:f] n., pl. **thieves** зло́дзе|й -я *m.*

thieve [θi:v] v. кра́сьці

thievery [ˈθi:vəri] n. 1. зладзе́йства *n.* 2. пакра́жа *f.*

thieves [θi:vz] n., *pl. of* **thief**

thievish [ˈθi:vɪʃ] adj. 1. зладзе́йскі. 2. як зло́дзей, скры́ты, та́йны; хі́тры

thigh [θaɪ] n. сьцягно́ *n.*

thigh bone сьцегнава́я косьць

thill [θɪl] n. агло́бля *f.*

thimble [ˈθɪmbəl] n. напа́рст|ак -ка *m.*

thin [θɪn] – adj. 1. то́нкі, це́нкі: ***thin paper*** то́нкая папе́ра; ***thin wire*** то́нкі дрот. 2. худы́, шчу́плы: ***a thin person*** худа́я асо́ба. 3. ра́дкі: ***He has thin hair*** У яго́ ра́дкія валасы́. 4. невялі́кі: ***a thin audience*** мала́я ко́лькасьць гледачо́ў *або́* слухачо́ў. 5. ра́дкі, разба́ўлены: ***thin milk*** ра́дкае малако́. 6. то́нкі, це́нкі, слабы́: ***thin voice*** то́нкі го́лас. 7. Figur. слабы́, непераканá ўчы: ***a thin excuse*** непераканá ўчая адгаво́рка

– adv. то́нка, це́нка; ра́дка; шчу́пла

– v.t. 1. рабіць танчэ́йшым, радзе́йшым, а) разра́джваць. б) прара́джваць: ***to thin a row of beets*** прара́дзіць радо́к бурако́ў

– v.i. 1. тане́ць, танчэ́ць. 2. радзе́ць. 3. пусьце́ць (*пра ме́сца*); ме́ншаць (*пра нато́ўп*)

thing [θɪŋ] n. 1. рэч *f.*, прадме́т -а *m.*: ***All the things in the house were burned*** Усе́ ра́чы ў до́ме згара́лі. 2. спра́ва, рэч *f.*; здара́ньне *n.*: ***A strange thing happened*** Дзі́ўная рэч зда́рылася; ***How are things going?*** Як іду́ць спра́вы?; ***The fire was a tragic thing*** Пажа́р быў траги́чным здара́ньнем. 3. Figur. асо́ба, істо́та *f.*: ***a silly old thing*** стары́ ду́рань; ***a mean thing*** падлю́га; ***a poor thing*** небара́ка

• ***know a thing or two*** зна́ацца на *чым*, до́бра разьбіра́цца ў *чым*

• ***make a good thing of,*** Informal скарыста́ць з *чаго́*, до́бра зарабі́ць на *чым*

• ***see things*** мець галюцына́цыі

• ***things,*** pl. ра́чы, во́пратка *f.*: ***Put on your things*** апрані́ся

think [θɪŋk] v., **thought, thinking** 1. мы́сьліць; ду́маць: ***You must learn to think clearly*** Вы му́сіце навучы́цца я́сна мы́сьліць. 2. ду́маць, ма́рыць: ***He thinks of nothing but sports*** Ён ні аб чым ня ду́мае, як то́лькі аб спо́рце. 3. ду́маць, уважа́ць; меркава́ць: ***Do what you think fit*** Рабі́ так, як уважа́еш патра́бным. 4. уяўля́ць: ***You can't think how surprised I was*** Ты ня мо́жаш сабе́ ўявіць, як я быў зьдзі́ўлены. 5. ду́маць, разважа́ць: ***I must think before answering*** Я му́шу паду́маць пе́рад тым, як даць адка́з. 6. прыпаміна́іць, прыга́дваць: ***I can't think of his name*** Я не магу́ прыга́даць яго́нае імя́. 7. спадзява́цца: ***I did not think to find you here*** Я не спадзява́ўся сустра́ць цябе́ тут

• ***think better of*** а) быць ле́пшае ду́мкі пра *каго́-што.* б) пача́ць ду́маць разважне́й, разумне́й

• ***think out*** 1. разва́жыць; разьвяза́ць (*зада́чу*), разгада́ць (*зага́дку*). 2. абду́маць да канца́

• ***think over*** стара́нна абмеркава́ць

• ***think twice*** до́бра абду́маць, усебако́ва ўзва́жыць

thinker [ˈθɪŋkər] n. мысьля́р -а́ *m.*; філёзаф -а *m.*

thinking [ˈθɪŋkɪŋ] – adj. які́ ду́мае, мы́сьліць; разва́жны

– n. мы́сьленьне *n.*; ду́мка *f.*

think tank мазгавы́ трэст

thinly [ˈθɪnli] adv. то́нка, це́нка; ра́дка

thinned [θɪnd] adj. 1. разра́джаны, разьве́дзены (*ва́дкасьцю*). 2. прара́джаны (*лес*)

thinner [ˈθɪnər] n. разра́джвальнік -у *m.*, ра́чыва для разра́джваньня (*напр. фа́рбы*)

thinness [ˈθɪnnəs] n. 1. то́нкасьць *f.* 2. ра́дкасьць *f.*

thinnish [ˈθɪnɪʃ] adj. танкля́вы
thin-skinned [ˌθɪnˈskɪnd] adj. 1. танкаску́ры. 2. лёгка абра́зьлівы
third [θɜ:rd] – adj. трэ́ці
– n. 1. трэ́ці -яга *m.* 2. траці́на *f.*: ***one-third*** адна́ траці́на
third-class [ˌθɜ:rdˈklæs] adj. трэ́цяй кля́сы
thirdly [ˈθɜ:rdli] adv. трэ́цяе, па-трэ́цяе
third person Gram. трэ́цяя асо́ба
third-rate [ˌθɜ:rdˈreɪt] adj. трэцяра́дны: трэ́цяй кля́сы
thirst [θɜ:rst] – n. 1. сма́га *f.* 2. пра́га *f.*: ***a thirst for adventure*** пра́га прыго́даў
– v.i. 1. зьнемага́ць ад сма́гі, сма́гнуць. 2. пра́гнуць
thirstily [ˈθɜ:rstɪli] adv. пра́гна
thirstiness [ˈθɜ:rstɪnəs] n. сасма́гласьць, пра́гнасьць *f.*
thirsty [ˈθɜ:rsti] adj. 1. сасма́глы, перасо́хлы; зьнямо́жаны ад сма́гі. 2. пра́гны
thirteen [θɜ:rˈti:n] n. трына́ццаць; трына́ццатка *f.*
thirteenth [θɜ:rˈti:nθ] – adj. трына́ццаты
– n. трына́ццатая ча́стка
thirtieth [ˈθɜ:rtiəθ] – adj. трыцца́ты
– n. адна́ трыцца́тая
thirty [ˈθɜ:rti] n, pl. **-ties** 1. тры́ццаць. 2. трыцца́тка *f.*: ***a man of thirty*** трыццацігадо́вы мужчы́на
• ***the thirties*** трыцца́тыя гады́, чацьве́ртае дзесяціго́дзьдзе
this [ðɪs] – adj., pl. **these** 1. гэ́ты, гэ́тая, гэ́тае: ***this child*** гэ́тае дзіця́; ***After this you must go home*** Пасьля́ гэ́тага ты му́сіш ісьці́ дамо́ў. 2. ***This is newer than that*** Гэ́ты наве́йшы за той
– pron. гэ́та: ***This is my brother*** Гэ́та мой брат
– adv. 1. гэ́та, гэ́так: ***before this*** пе́рад гэ́тым; ***like this*** так, гэ́так; ***this much*** гэ́тулькі
thistle [ˈθɪsəl] n., Bot. асо́т -у *m.*
thither [ˈðɪðər] – adv. туды́; там, гэ́нам
– adj. той, тамтой, гэ́ны (*дале́йшы*)
thorax [ˈθɔ:ræks] n., pl. **thoraxes, thoraces** [-si:z] 1. Anat., Zool. грудна́я кле́тка. 2. (*у членістано́гіх*) ту́лава *n.*

thorn [θɔ:rn] n. 1. церне *n.*; калю́чка *f.* (*на расьлі́не*). 2. це́рні -яў *pl.*
• ***thorn in the flesh*** (or ***side***) як бяльмо́ на во́ку
thorny [ˈθɔ:rni] adj. 1. цярні́сты, калю́чы, пакры́ты це́рнем. 2. Figur. цярні́сты, паку́тны
thorough [ˈθɜ:rou] adj. 1. по́ўны, дакла́дны: ***a thorough search*** дакла́дныя по́шукі. 2. грунто́ўны, вычарпа́льны
thoroughbred [ˈθɜ:roubred] adj. 1. чыстакро́ўны, чы́стай паро́ды, паро́дзісты (*пра жывёліну*). 2. до́бра ўзгадава́ны (*пра чалаве́ка*)
thoroughfare [ˈθɜ:roufer] n. 1. прахо́д, прае́зд -у *m.*, прае́зная даро́га. 2. гало́ўная даро́га *або́* аўтастра́да
• ***no thoroughfare*** нямá праéзду
thoroughly [ˈθɜ:rouli] adv. ца́лкам; по́ўнасьцю; дакла́дна, грунто́ўна
those [ðouz] adj., pron., *pl. of* **that**
thou [ðau] pron., Archaic ты
though [ðou] conj. 1. ня гле́дзячы на то́е, што; хоць: ***Though it was pouring, the girls went to school*** Хоць і лі́ў дождж, дзяўча́ты пайшлі́ ў шко́лу. 2. адна́к, яшчэ́; тым ня менш: ***He is better, though not yet cured*** Яму́ пале́пшала, адна́к ён яшчэ́ не зусі́м ачуня́ў. 3. на́ват, калі́: ***Though I fail, I shall try again*** Нават калі́ я ня здам іспы́т, бу́ду спрабава́ць здава́ць ізно́ў; ***as though*** як бы́ццам, як бы, бы: ***You look as though you were tired*** Вы выглядáеце змýчана
thought [θɔ:t] – n. 1. ду́мка *f.*: ***A thought occurred to me*** Мне прыйшло́ на ду́мку. 2. ду́маньне *n.* 3. ро́здум -у *m.*: ***on second thought*** разду́маўшыся. 4. ува́га, ува́жлівасьць , пава́га *f.*: ***Show some thought for others*** Ма́йце не́йкую крыху́ ўва́гі да і́ншых. 5. ду́мка *f.*, намéр -у *m.*: ***His thought was to avoid controversy*** Яго́ным намéрам было́ ўні́кнуць супярэ́чнасьці
– v., *p.t. and p.p. of* **think**
thoughtful [ˈθɔ:tfəl] adj. 1. уду́млівы, заду́маны. 2. руплі́вы, дба́йны, ува́ж-

лівы: ***She is always thoughtful of her mother*** Яна́ заўсёды ру́піцца пра сваю́ ма́ці

thoughtfully [ˈθɔ:tfəli] adv. 1. задуме́нна. 2. асьцяро́жна, аба́чліва; абду́мана. 3. рупліва, дба́йна; ува́жліва (*да і́ншых*)

thoughtless [ˈθɔ:tləs] adj. 1. бяздýмны; легкадýмны. 2. няўва́жны, без пава́гі да і́ншых

thoughtlessly [ˈθɔ:tləsli] adv. бяздýмна; неабдýмана; легкадýмна

thoughtlessness [ˈθɔ:tləsnəs] n. 1. бяздýмнасьць, легкадýмнасьць *f.* 2. няўва́га *f.*

thought-out [ˌθɔ:tˈaʊt] adj. до́бра, грунто́ўна абдýманы

thousand [ˈθaʊzənd] – n. ты́сяча *f.*
– adj. ты́сячны

thousandfold [ˈθaʊzəndfoʊld] adj., adv. ты́сячу разо́ў бо́льшы, ты́сячу разо́ў бо́льш

thousandth [ˈθaʊzəndθ] – adj. ты́сячны
– n. адна́ ты́сячная

thrash [θræʃ] – v.t. 1. біць, сьцябáць бізуно́м; паганя́ць пýгай (*каня́*); лупі́ць, лупцаваць: ***The man thrashed the boy for stealing the apples*** Чалаве́к лупцава́ў хлапца́ за то́е, што ён краў я́блыкі. 2. малаці́ць (*збо́жжа*)
– v.i. 1. бі́цца, кі́дацца: ***thrash about*** кі́дацца з бо́ку на бо́к. 2. бі́цца, а) біць адзі́н аднаго́. б) удара́цца, сту́кацца: ***branches thrashing against a window*** галі́ны б'ю́цца аб шы́бу. 3. малаці́ць збо́жжа
• ***thrash out*** Figur. абмяркó́ўваць
• ***thrash over*** Figur. перамо́лваць

thrasher [ˈθræʃər] n. 1. той, хто б'е або́ мало́ціць; малацьбі́т -á *m.* 2. мала-та́рня *f.*

thread [θred] – n. 1. ні́тка *f.* 2. ніць *f.*: ***the thread of the story*** гало́ўная ніць апавяда́ньня. 3. нарэ́зка *f.*, нарэ́з -а *m.* (*вінтá*). 4. Geol. про́жылак -ка *m.*
– v.t. 1. усо́ўваць ні́тку (*у го́лку*). 2. нізáць, нані́зваць: ***She threaded a hundred beads*** Яна́ нанізáла со́тню пáцерак. 3. Figur. прабірáцца: ***He threaded his way through the crowd*** Ён прабрáўся праз натóўп. 4. разáць, рабíць нарэ́зку
• ***hang by or on a thread*** вісéць на валаскý

threadbare [ˈθredber] adj. працёрты да ні́ткі, пано́шаны (*пра во́пратку*)

thready [ˈθredi] adj. 1. нітковáны, нітка-падо́бны. 2. валакні́сты. 3. слабы́

threat [θret] n. 1. гразьбá *f.* 2. пагро́за *f.*: ***the threat of war*** пагро́за вайны́

threaten [ˈθretən] v.t. 1. грази́ць, пагражáць. 2. пагражáць, быць прыкмéтай: ***Black clouds threaten a storm*** Чóрныя хмáры пагражáюць навальні́цай

threatening [ˈθretənɪŋ] adj. пагражáльны, пагро́зьлівы

threateningly [ˈθretənɪŋli] adv. пагражáльна, пагражáючы, пагро́зьліва

three [θri:] – n., adj. 1. а) тры: ***three books*** тры кні́гі, б) трóе, *coll.*: ***There are three of us*** Нас трóе; ***three children*** трóе дзяцéй. 2. трóйка *f.*

three-D or **3-D** [ˌθri:ˈdi:] adj. стэрэаскапі́чны, у трох вымярэ́ньнях, трохвымéрны

three-decker [ˌθri:ˈdekər] – n. трохпáлубны вадаплáў
– adj. 1. трохпавярхóвы. 2. трохслаёвы

three-dimensional [ˌθri:daɪˈmenʃənəl] adj. у трох вымярэ́ньнях, трохвымéрны

threefold [ˈθri:foʊld] – adj. 1. патрóйны, з трох чáстак; у тры стóлкі; трайны́. 2. патрóены, у тры разы́ бóльшы.
– adv. патрóйна; патрóена

three hundred тры́ста

three-hundredth трохсóты

three-lane [ˈθri:leɪn] adj. трохпалóсны: ***three-lane highway*** трохпалóсная аўтастрáда

three-ply [ˈθri:plaɪ] adj. у тры стóлкі, пласты́

three-pronged [ˈθri:prɑ:ŋd] adj. трохзýбы, трохкірýнкавы

threequarter [ˌθri:ˈkwɔ:rtər] adj. трохчвэ́ртны: ***three quarter time*** памéр на тры чацьвéртыя
three thousand тры ты́сячы
three-thousandth трохты́сячны
thresh [θreʃ] – v.t. малаці́ць
– v.i. кі́дацца з бо́ку на бок
• ***thresh out*** грунто́ўна абмяркó́ўваць
• ***thresh over*** Figur. таўчы́ ваду́ ў ступе́
thresher [ˈθreʃər] n. 1. малацьбі́т -á *m.* 2. малата́рня *f.* 3. від аку́лы
threshing [ˈθreʃɪŋ] n. малацьба́ *f.*
threshing floor ток -у *m.*
threshold [ˈθreʃhould] n. паро́г -а *m.*
threw [θru:] v., *p.t. of* **throw**
thrice [θraɪs] adv. тро́йчы
thrift [θrɪft] n. ашча́днасьць, ашча́дліва́сьць *f.*
thriftless [ˈθrɪftləs] adj. неашча́дны; раскі́длівы, марнатра́ўны
thrifty [ˈθrɪfti] adj. 1. ашча́дны; гаспада́рлівы. 2. пы́шны, квітне́ючы. 3. замо́жны: ***The countryside had many fine, thrifty farms*** У вако́ліцы было́ шмат прыго́жых, замо́жных гаспада́рак
thriftily [ˈθrɪftɪli] adv. ашча́дна, гаспада́рліва
thrill [θrɪl] – n. 1. пачуццё захапле́ньня. 2. трымце́ньне, дрыжэ́ньне *n.*
– v.t. захапля́ць; хвалява́ць
– v.i. трымце́ць; дрыжэ́ць: ***Her voice thrilled with terror*** Е́йны го́лас дрыжэ́ў ад стра́ху
thriller [ˈθrɪlər] n. трылер -у *m.*
thrive [θraɪv] v.i. **throve** or **thrived, thrived** or **thriven, thriving** 1. бу́йна расьці́, расквіта́ць: ***Flowers will not thrive without sunshine*** Кра́скі ня бу́дуць квітне́ць бяз со́нца. 2. до́бра ме́цца; багаце́ць; мець вялі́кую ўда́чу
throat [θrout] n. 1. го́рла *n.*, гарта́нь, гло́тка *f.* 2. стрававó́д -у *m.*; ды́хальны шлях. 3. ву́зкі прахо́д, вузка́я адту́ліна; жарало́ вулька́на, гарлаві́на *f.*
• ***jump down someone's throat*** Informal накі́нуцца на каго́сь; заткну́ць каму́сь го́рла
• ***lump in one's throat*** камяк у го́рле
• ***stick in one's throat*** засе́сьці ў го́рле (*напр. пра сло́вы*)
throaty [ˈθrouti] adj. 1 гарта́нны: ***a throaty sound*** гарта́нны гук. 2. гарлавы́: ***a throaty voice*** гарлавы́ го́лас
throb [θrɑ:b] – v., **(-bb-)** 1. мо́цна бі́цца, пульсава́ць. 2. раўнамéрна бі́цца. 3. дрыжэ́ць (*ад узру́шанасьці, трывó́гі*)
– n. 1. раўнамéрнае бі́цьцё: ***the throb of a pulse*** раўнамéрнае бі́цьцё пу́льсу. 2. уздры́гваньне, дрыго́тка *f.*
thrombosis [θrɑ:mˈbousəs] n., Med. трамбо́з -у *m.*
throne [θroun] n. 1. трон, прасто́л, паса́д -у *m.* 2. ула́да караля́, каралéвы. 3. валада́р -а́ *m.*
throng [θrɔ:ŋ] – n. 1. нато́ўп -у *m.*, вялі́кі гурт (*людзéй*). 2. мно́ства *n.*
– v.i. 1. то́ўпіцца; напаўня́цца нато́ўпам. 2. зьбіра́цца нато́ўпам. 3. напіра́ць нато́ўпам
throttle [θroun] – n. 1. Auto. дро́сэль -я *m.*: ***at full throttle*** по́ўным хо́дам. 2. Informal гло́тка *f.* (*напр. у каня́*)
– v.i. зду́шваць; спыня́ць
through [θru:] – prep. 1. праз: а) ***The soldiers marched through the town*** Жаўне́ры прамаршырава́лі празь ме́ста. б) ***to cut a tunnel through a mountain*** прабі́ць тунэ́ль праз гару́. 2. па: ***We travelled through Belarus*** Мы падаро́жнічалі па Белару́сі. 3. пры дапамо́зе *чаго́*, дзя́куючы *таму́*: ***He became rich through hard work*** Ён разбагацéў дзя́куючы цяжко́й пра́цы. 4. на працягу, праз: ***through the year*** на працягу́ го́ду; ***through entire life*** праз усё жыцьцё
– adv. 1. навылёт, наскро́зь: ***The bullet hit the wall and went through*** Ку́ля ўды́рыла ў сьцяну́ і прайшла́ навылёт. 2. ца́лкам, зусі́м: ***He was wet through*** Ён зусі́м прамо́к. 3. ад пача́тку да канца́: ***She read the book through*** Яна́ прачыта́ла ўсю́ кні́гу. 4. аж да: ***The train goes through to Miensk*** Цягні́к ідзе́ да са́мага Ме́нску

– adj. скразны́: ***a through train*** скразны́ цягні́к; ***through traffic*** скразны́ прае́зд
• ***Are you through?*** Ці вы ско́нчылі?
• ***through and through*** по́ўнасьцю, дашчэ́нту

throughout [θruˈaʊt] prep. праз уве́сь час; усю́ды, ува ўсі́х адно́сінах: ***throughout the war*** праз усю́ вайну́; ***throughout the country*** па ўсёй краі́не

throve [θroʊv] v., *p.t. of* **thrive**

throw [θroʊ] – v.t. **threw, thrown, throwing** 1. кі́даць; шпурля́ць: ***to throw a ball*** кі́нуць мя́чык; ***to throw a stone at*** а) шпурну́ць ка́менем у *каго́*. б) Figur. асуджа́ць, закіда́ць *каму́*, кіда́ць ка́мень у *не́чы* агаро́д. 2. скіда́ць: ***His horse threw him*** Яго́ны конь скі́нуў яго́. 3. кі́даць: ***to throw a man into prison*** пасадзі́ць чалаве́ка ў турму́; ***Throw some clothes on*** Наки́нь што на сябе́. 4. кі́даць, уво́дзіць: ***to throw a person into confusion*** прывёсьці чалаве́ка ў замяша́ньне, зьбянтэ́жыць. 5. скіда́ць: ***A snake throws its skin*** Вужа́ка скіда́е ску́ру. 6. зьві-ва́ць, скру́чваць у ні́ткі (*шоўк*). 7. Informal ла́дзіць, арганізо́ўваць: ***to throw a party*** зла́дзіць вечары́нку
– v.i. кі́даць: ***How far can you throw?*** Як далёка ты мо́жаш кі́нуць?
– n. 1. кі́даньне *n.*, кід|о́к -ка́ *m.* 2. далёкасьць кідка́. 3. шаль -я, ша́лік -а *m.*; лёгкая наки́дка *або́* по́крыўка на кана́пу
• ***throw a glance*** кі́нуць во́кам
• ***throw a monkey wrench (into, in)*** ста́віць па́лкі ў ко́лы
• ***throw away*** а) вы́кінуць, б) змарнава́ць
• ***throw cold water on*** як хало́днай вадо́й абліць
• ***throw in*** а) да́ць у прыда́чу. б) устаўля́ць заўва́гу
• ***throw oneself at*** накіда́цца, набіва́цца, напро́швацца
• ***throw open*** а) шыро́ка расхіну́ць, адчыні́ць на́сьцеж. б) адхіліць усе́ перашко́ды *або́* абмежава́ньні
• ***throw out*** а) вы́кінуць. б) адкі́нуць. в) вы́гнаць
• ***throw up*** а) Informal ваніта ва́ць. б) зда́цца, адступі́ць, адмо́віцца

thrush [θrʌʃ] n. дрозд дразда́ *m.*

thrust [θrʌst] – v.t. **thrust, thrusting** 1. усо́ўваць: ***He thrust his hands into his pockets*** Ён усу́нуў ру́кі ў кішэ́ні. 2. прабіва́ць; убіва́ць, утыка́ць: ***They thrust the pole deep into the ground*** Яны́ ўбі́лі кол глы́бака ў зямлю́. 3. пуска́ць: ***The tree thrust its roots deep into the ground*** Дрэ́ва пусьці́ла карэ́ньне глы́бака ў зямлю́
– n. 1. штуршло́к -ка́ *m.* 2. уда́р -у *m.* 3. напа́д -у *m.* 4. Arch. апо́ра *f.*, упо́р -у *m.*

thumb [θʌm] – n. 1. вялі́кі па́лец (*на руцэ́, у рукаві́цы*). 2. Arch. вы́ступ карні́за
– v.t. 1. пэ́цкаць па́льцамі. 2. гарта́ць (*кні́гу*)
• ***all thumbs*** нязгра́бны
• ***thumb a ride***, Informal праці́ць падве́зьці, галасава́ць
• ***thumbs down*** знак неўхвале́ньня, неўхвале́ньне *n.*
• ***thumbs up*** знак ухва́лы, ухва́ла *f.*
• ***under the thumb of*** пад *не́чай* ула́дай або́ ўплы́вам, пад абца́сам

thumbprint [ˈθʌmprɪnt] n. адбітак вялі́кага па́льца

thumb-sucking [ˌθʌmˈsʌkɪŋ] n. звы́чка смакта́ць вялі́кі па́лец

thumbtack [ˈθʌmtæk] – n. кно́пка *f.*
– v.t. прымацо́ўваць кно́пкай, прышпіля́ць

thump [θʌmp] – v.t. 1. біць, сту́каць: ***He thumped the table with his fist*** Ён біў кулако́м аб стол. 2. гру́каць. 3. Informal біць, лупі́ць, лупцава́ць
– v.i. 1. гвалто́ўна бі́цца (*пра се́рца*). 2. ступа́ць, ісьці́ цяжко́й хадо́ю
– n. 1. стук -у *m.*, цяжкі́ ўда́р. 2. гук ад уда́ру, сту́ку

thunder [ˈθʌndər] – n. 1. гром -у *m.*, грыма́ты *pl.* 2. гул -у *m.*: ***the thunder of Niagara Falls*** грыма́тны гул Ніяга́рскага вадаспа́ду

– v.i. 1. грыме́ць, груката́ць. 2. мо́цна гаварыць; крычэ́ць, грыме́ць

thunderbolt ['θʌndərboʊlt] n. 1. мала́нка з гро́мам. 2. Figur. не́шта нечака́нае; гром зь я́снага не́ба. 3. Figur. дынамі́чны чалаве́к

thunderclap ['θʌndərklæp] n. 1. трэск перуна́. 2. нечака́нае здарэ́ньне *або́* ве́стка

thunderstorm ['θʌndərstɔ:rm] n. навальні́ца *f.*

thunderstruck ['θʌndərstrʌk] adj. агало́мшаны; як гро́мам уда́раны

Thursday ['θɜ:rzdeɪ] n. чацьвле́р -ярга́ *m.*, чэ́цьвер -а *m.*

thus [ðʌs] adv. такі́м пара́дкам; так, гэ́так: ***He spoke thus*** Ён гэ́так каза́ў

thy [ðaɪ] adj., Archaic твой

thyme [taɪm] n., Bot. чабло́р -ару́ *m.*

ti [ti:] n., Mus. ci (*но́та*)

tiara [tiˈærə] n. 1. дыядэ́ма *f.* 2. тыя́ра *f.*

tick I [tɪk] – n. 1. ці́каньне *n.* (*гадзі́ньні-ка*). 2. Informal мо́мант -у *m.*, хвілі́нка *f.*: ***I'll be with you in a tick*** Я прыйду́ за хвілі́нку. 3. птýшка *f.* (*значо́к*)

– v.i. ці́каць

– v.t. пазнача́ць птýшкай

• ***tick off*** а) адзна́чыць. б) загне́вацца, вы́бухнуць

tick II [tɪk] n., Zool. клешч кляшча́ *m.*

tick III [tɪk] n. 1. на́сыпка *f.*, сяньні́к сеньніка́ *m.* 2. Informal *гл.* **ticking**

ticket ['tɪkɪt] – n. 1. біле́т -а *m.*, квітло́к -ка́ *m.* 2. ярлы́к -а́ *m.*, этыке́тка *f.* 3. сьпіс кандыда́таў адно́й па́ртыі (*на вы́барах*). 4. штра́фны квіто́к

– v.t. чапля́ць ярлы́к

ticking ['tɪkɪŋ] 1. палатно́ на сеньнікі́, матра́цы, на́сыпкі. 2. ці́каньне *n.*

tickle ['tɪkəl] – v.t. 1. казыта́ць. 2. прые́мна ўзбуджа́ць, це́шыць, захапля́ць: ***The child was tickled with his new toys*** Дзіця́ было́ ўсьце́шанае сваі́мі но́вымі ца́цкамі. 3. адчува́ць ко́зыт: ***My nose tickles*** У мяне́ казы́ча ў но́се

– n. 1. ко́зыт -у *m.* 2. казыта́ньне *n.*

ticklish ['tɪkəlɪʃ] adj. 1. казытлі́вы. 2. Figur. даліка́тны: ***a ticklish situation*** далі́ка́тнае стано́вішча. 3. крыўдлі́вы

tidal ['taɪdəl] adj. зьвяза́ны з прыліво́м і адліво́м, прыліўна-адліўны

tidbit ['tɪdbɪt] n. 1. сма́чны кава́лак, ласу́нак -ка *m.* 2. піка́нтная, ціка́вая навіна

tide [taɪd] n. 1. прыліў і адліў акія́ну. 2. плынь *f.*; пато́к -у *m.* 3. пара́ *f.*, час -у *m.*: ***Eastertide*** велікоднáя пара

• ***go with tide*** ісьці́ з плы́ньню

• ***swim against the tide*** плы́сьці супро́ць плыні

• ***tide over*** а) ператрыва́ць. б) пераадо́лець (*цяжкасьці*)

• ***turn the tide*** зьмяні́ць кіру́нак на адваро́тны

tidiness ['taɪdɪnəs] n. аха́йнасьць, акура́тнасьць *f.*

tidings ['taɪdɪŋz] n., pl. навіны, зьве́сткі *pl.*; інфарма́цыя *f.*

tidy ['taɪdi] – adj. 1. аха́йны, акура́тны. 2. Informal салі́дны: ***a tidy sum of money*** салі́дная су́ма гро́шай. 3. Informal до́сыць до́бры, неблагі́

– v.t. пара́дкаваць; прыбіра́ць: ***She tidied the room*** Яна́ прыбра́ла пако́й

tie [taɪ] – v., **tied, tying** 1. зьвя́зваць, перавя́зваць, перавя́заць; прывя́зваць: ***to tie a package*** зьвяза́ць паку́нак; ***to tie a dog to a tree*** прывяза́ць саба́ку да дрэ́ва. 2. завя́зваць: ***tie one's apron strings*** завяза́ць матузы́ фартуха́; ***to tie one's shoes*** зашнурава́ць чарані́кі. 3. Figur. быць зьвя́заным, прывя́заным: ***to be tied to one's job*** быць зьвя́заным пра́цай. 4. атрыма́ць нічы́йны вы́нік: ***The two teams tied*** Кама́нды згуля́лі ўнічыю

– n. 1. ву́зел -ла́ *m.* 2. шнурло́к -ка́ *m.*, вяро́ўка, пры́вязь *f.* 3. бант -а *m.* 4. га́льштук -а *m.* 5. су́вязь *f.*; по́вязі *pl. only*: ***family ties*** сямёйныя по́вязі. 6. шпа́ла *f.* (*на чыгу́нцы*). 7. ро́ўная ко́лькасьць галасо́ў; нічыя́ *f.*, ро́зыгрыш -у *m.* (*у гульні*)

• ***tie down*** а) абмежава́ць. б) прывяза́ць

• ***tie in*** а) злуча́ць, улуча́ць. б) увя́зваць

• ***tie up*** а) зьвяза́ць, завяза́ць. б) закруці́ць, загарну́ць у *што*, в) перашко́дзіць. г) быць заня́тым: ***I can't come tomorrow; I'm all tied up*** Я не магу́ за́ўтра прыйсьці́; я ве́льмі заня́ты

tie-in ['taɪɪn] n. су́вязь, лу́чнасьць *f.*

tier [tɪr] n. я́рус -а *m.*

tiger ['taɪgər] n. ты́гар -ра *m.*

tight [taɪt] – adj. 1. тугі́: ***a tight knot*** тугі́ ву́зел. 2. шчы́тны, шчы́льны. 3. це́сны: ***tight clothing*** це́сная во́пратка. 4. непранікальны. 5. сьці́слы (*пра стыль*). 6. стро́гі, суро́вы: ***to rule with a tight hand*** быць стро́гім і суро́вым уладаро́м, кіраўніко́м. 7. Informal скупы́

– adv. мо́цна, це́сна

• ***sit tight*** Informal а) мо́цна трыма́цца, не здава́ць сваіх пазы́цыяў. б) не варушы́цца. в) вычэ́кваць

• ***uptight*** Sl. у напру́жаньні, у хвалява́ньні

tighten ['taɪtən] – v.t. сьціска́ць; падця́гваць: ***to tighten one's belt*** тужэ́й падцягну́ць папру́гу; ***to tighten discipline*** падцягну́ць дысцыпліну

– v.i. тужэ́ць, цясьне́ць

tightfisted [ˌtaɪt'fɪstɪd] adj. скупы́, скна́рлівы, скна́рны

tight rope а) наця́гнуты кана́т. б) цяжка́я *або́* небясьпе́чная сытуа́цыя

tights [taɪts] n. трыко́ *indecl., n.*, калго́ткі *pl.*

tight squeeze а) цяжко́е *або́* безвыхо́днае стано́вішча. б). це́сны прахо́д

tile [taɪl] – n. 1. дахо́ўка *f.* 2. пліткa, ка́фля *f.*

– v.t. пакрыва́ць пліткамі; крыць дахо́ўкаю

– adj. кафля́ны: ***a tile floor*** кафля́ная падло́га

till I [tɪl] – prep. да, да тага́ ча́су: ***The children played till eight*** Дзе́ці гуля́лі да во́сьмае гадзі́ны

– conj. пакуль; да тага́. як; перад тым, як: ***till now*** дасю́ль, дагэ́туль; ***till then*** датуль, да таé пары́

till II [tɪl] v.t. абрабля́ць: ***Farmer tills the land*** Гаспада́р абрабля́е зямлю́

tilt [tɪlt], – v.t. нахіля́ць, схіля́ць

– v.i. 1. пахіля́цца, нахіля́цца; каcі́цца. 2. бі́цца дзі́дамі, змага́цца ў турні́ры

– n. 1. нахі́л, схіл -у *m.*; спад -у *m.* 2. суты́чка *f.*

• ***at full tilt*** по́ўным хо́дам; з усяé мо́цы

• ***tilt at*** атакава́ць

timber ['tɪmbər] n. 1. лесаматэрыя́л -у *m.* 2. будаўні́чы матэрыя́л: ***timber yard*** склад будаўні́чых матэрыя́лаў. 3. бервяно́ *n.*; кало́да *f.*; бэ́лька *f.* 4. дрэ́вы *pl.*; лес на пні

timbre ['tæmbər] n. тэ́мбар -ру *m.* (*го́ласу*)

time [taɪm] – n. 1. час -у *m.* 2. пара́, эпо́ха *f.*: ***the time of "Nasha Niva"*** нашані́ўская пара́. 3. тэ́рмін -у *m.*, час слу́жбы, зьнявбо́леньня. 4. гадзі́на *f.*: ***What time is it?*** Като́рая гадзі́на?; ***At what time?*** А като́рай гадзі́не? 5. рытм -у *m.* (*у паэ́зіі*). 6. Mus. тэмп, такт -у *m.* 7. Sport тайм -у *m.*

– v.t. ме́раць, вымяра́ць, засяка́ць час

• ***about time*** пара́; насьпе́ў час

• ***at the same time*** а) у той са́мы час, аднача́сна. б) адна́к, тым ня менш

• ***at times*** час-часо́м; ча́сам, зрэ́дку

• ***behind the times*** старамо́дны

• ***buy time*** заця́гваць

• ***do*** or ***serve time,*** Informal адбыва́ць тэ́рмін

• ***for the time being*** паку́ль што, да пары́ да ча́су, тымчасо́ва

• ***from time to time*** час-часо́м; зрэ́дку, ча́сам

• ***have a good time*** до́бра, ве́села правóдзіць час: ***She had a good time at the party*** Яна́ ве́села ба́віла час на вечары́нцы

• ***in due time*** у свой час, своечасо́ва

• ***in good time*** а) упару́. б) сваім ча́сам

• ***it is time*** пара́: ***It is time to eat*** пара́ е́сьці

• ***in no time*** во́бмігам, імгне́нна

• ***in time*** а) неўзаба́ве. б) до́сыць ху́тка. в) у такт (*у му́зыцы, та́нцы*)

• ***keep time*** а) ісьці́ пра́вільна (*пра гадзі́ньнік*). б) вытры́мваць такт. в) засяка́ць час
• ***kill time*** марнава́ць час
• ***on time*** упару́; не запо́зна
• ***one (two) at a time*** па адны́м (па два)
• ***once upon a time*** кали́сьці, адно́йчы
• ***Take your time*** Не сьпяша́йся
• ***tell time*** пазнава́ць час на гадзі́ньніку
• ***time after time*** or ***time and again*** раз за ра́зам, раз-по́раз, неаднаразо́ва
• ***time of life*** век (*чалаве́ка*); ***at my time of life*** на маім вяку
• ***time of one's life*** Informal незабы́ўны, шчасьлі́вы час
• ***times,*** pl. памно́жыць на: ***three times four*** тры памно́жыць на чаты́ры

time bomb а) бо́мба запаво́ленага дзе́яньня. б) Figur. выбухо́вая сытуа́цыя

weeper [ˈwi:pər] n. 1. пла́кса *f.*; плаксу́н -а́ *m.*, плаксу́ха *f.* 2. пла́чка, галасі́льніца *f.* (*па нябо́жчыку*)
weepiness [ˈwi:pɪnəs] n. плаксі́васьць *f.*
weeping [ˈwi:pɪŋ] – adj. 1. які́ пла́ча. 2. ні́цы: ***weeping willow*** ні́цая вярба́
– n. плач -у *m.*: ***soft weeping*** хлі́паньне *n.*, хліп
weepy [ˈwi:pi] adj. хліпасьлі́вы, плаксі́вы
weft [weft] n. уто́к -у *m.* (*у тканіне*)
weigh [weɪ] – v.t. 1. ва́жыць: ***to weigh oneself*** пава́жыцца. 2. (out) адва́жваць: ***The grocer weighed out five pounds of sugar*** Кра́мнік адва́жыў пяць фу́нтаў цу́кру. 3. дакла́дна абду́мваць, узва́жваць: ***to weigh the advantages and disadvantages*** узва́жыць вы́гады й нявы́гады. 4. ацэ́ньваць
– v.i. 1. ва́жыць: ***She weighed 140 pounds*** Яна́ ва́жыла 140 фу́нтаў. 2. мець значэ́ньне, вагу́. 3. Naut. здыма́цца зь я́кара
• ***weigh down*** абцяжа́рваць: ***weighed down with troubles*** абцяжа́раны кло́патамі
• ***weigh on*** быць цяжа́рам *каму́*
weight [weɪt] – n. 1. вага́ *f.*: ***to lose weight*** худне́ць; ***to put on weight*** папра́віцца, патаўсьце́ць. 2. цяжа́р -у *m.* 3. гі́ра *f.* 4. груз -у *m.*, цяжа́р -у *m.*: ***The pillars support the weight of the roof*** Калёны трыма́юць цяжа́р да́ху. 5. цяжа́р турбо́таў, адка́знасьці: ***It will be a weight off my mind*** Гэ́та здыма́е мне кло́пат з галавы́. 6. уплы|ў -ву *m.*; ва́жнасьць, ва́жкасьць *f.*: ***a matter of great weight*** спра́ва вялі́кай ва́жнасьці; ***men of weight*** уплыво́выя, аўтарытэ́тныя лю́дзі
– v.t. 1. нагружа́ць; абцяжа́рваць. 2. надава́ць вагі́, значэ́ньня
• ***by weight*** на вагу́: ***to sell the apples by weight*** прадава́ць я́блыкі на вагу́
• ***carry weight*** быць ва́жным, уплыво́вым
weightless [ˈweɪtləs] adj. 1. бязва́жкі. 2. безуплыво́вы, малава́жкі
weightlessness [ˈweɪtləsnəs] n. бязва́жкасьць *f.*
weighty [ˈweɪti] adj. 1. цяжкі́; ва́жкі. 2. ва́жны, уплыво́вы; ва́жкі, пераканаўчы: ***weighty arguments*** ва́жкія, пераканаўчыя аргумэ́нты
weir [wɪr] n. 1. гаць *f.* 2. запру́да *f.*
weird [wɪrd] adj. 1. незямны́, таёмны. 2. дзіўны, дзівакава́ты; фантасты́чны
welcome [ˈwelkəm] – interj. віта́ем: ***Welcome home!*** З прые́здам! Зь вярта́ньнем!
– n. 1. віта́ньне *n.* 2. сардэ́чная сустрэ́ча: ***You will always have a welcome here*** Вы заўсёды бу́дзеце тут жада́ным го́сьцем
– v.t. 1. сардэ́чна віта́ць. 2. гасьці́нна прыма́ць
– adj. 1. пажада́ны, прые́мны: ***a welcome letter*** пажада́ны ліст. 2. быць запро́шаным: ***You are welcome to pick the flowers*** Калі́ ла́ска, вы мо́жаце нарва́ць сабе́ кве́так
• ***wear out one's welcome*** перасядзе́ць час гасьці́ннасьці
• ***You are (quite) welcome*** Калі́ ла́ска; Нама́ за што (*адка́з на падзя́ку*)
weld [weld] – v. 1. спа́йваць, зва́рваць: ***He welded two rods together*** Ён спаяў два пруты́. 2. це́сна злуча́ць, гуртава́ць: ***Working together for a month welded them into a strong team*** Супо́льная пра́ца на працягу ме́сяца спаяла іх у мо́цную кама́нду. 3. спа́йвацца: ***Some metals weld better than others*** Некато́рыя мэта́лы спа́йваюцца лепш за і́ншыя

– n. 1. зва́рка, спа́йка *f.* 2. спа́йваньне *n.*

welder ['weldər] n. зва́ршчык, спа́йшчык -а *m.*

welfare ['welfer] n. 1. дастáт|ак -ку *m.*; дабрабы́т -у *m.* 2. сацыя́льная апе́ка

welfare work сыстэ́ма сацыя́льнага забесьпячэ́ньня

well I [wel] – adv. **better, best** 1. до́бра: ***The job was well done*** Пра́ца была́ до́бра вы́кананая; ***Shake well before using*** До́бра ўзбо́ўтайце пе́рад ужыва́ньнем. 2. шмат; далёка: ***He is well past forty*** Ямý далёка за со́рак. 3. у сапра́ўднасьці: ***I couldn't very well refuse*** У сапра́ўднасьці я ня мо́г адмо́віць

– adj. 1. до́бры, пра́вільны, у пара́дку: ***All is quite well with me*** У мяне́ ўсё ў пара́дку. 2. здаро́вы: ***I am very well*** Я чу́юся зусі́м здаро́вым; Я ма́юся до́бра

– interj. ну (*выража́е зьдзіўле́ньне, зго́ду*): ***Well! Well! Here's John*** Ну і ну! Вось і Янка; ***Well, I'm not sure*** Ну, я ня пэ́ўны; ***Well, what next?*** Ну, а што дале́й?

• ***as well*** а) таксáма; апрача́ таго́, б) адно́лькава

• ***as well as*** а) у дада́так да; а таксáма, б) гэ́так жа, як

• ***do well*** а) ме́цца до́бра. б) до́бра зрабі́ць

• ***get well*** вы́здаравець, ачуня́ць

well II [wel] – n. 1. кало́дзеж -а *m.*, сту́дня *f.* 2. сьвідраві́на *f.* 3. крыні́ца *f.*; жарало́ *n.* 4. пралёт (*ле́сьвішы*); ша́хтавы *або́* лі́фтавы ствол

– v.i. 1. біць крыні́цай, хлы́нуць. 2. налівáцца, напаўня́цца : ***Tears welled up in her eyes*** Ейныя во́чы напо́ўнілі́ся сълязьмі́

we'll [wi:l] *скаро́чанае* **we shall, we will**

well-adjusted [ˌwelə'dʒʌstɪd] adj. ураўнава́жаны; до́бра нала́джаны

well-advised [ˌwelədˈvaɪzd] adj. 1. разва́жлівы. 2. до́бра паінфармава́ны, з до́брай пара́дай

well-aimed [ˌwel'eɪmd] adj. до́бра нацэ́лены, тра́пны

well-appointed [ˌwelə'pɔɪntɪd] adj. до́бра забясьпе́чаны, асна́шчаны *або́* абсталя́ва́ны

well-balanced [ˌwel'bælənst] adj. 1. ураўнава́жаны, урэгуля́ва́ны. 2. разва́жлівы; псыхі́чна ўраўнава́жаны

well-behaved [ˌwelbɪ'heɪvd] adj. прыстóйны, добрапрыстóйны; вы́хаваны

wellbeing [ˌwel'bi:ɪŋ] n. дабрабы́т -у *m.*; памы́снасьць *f.*

well-born [ˌwel'bɔ:rn] adj. радавíты

well-bred [ˌwel'bred] adj. 1. до́бра вы́хаваны. 2. до́брага заво́ду; чыстакро́ўны (*пра жывёлу*)

well-defined [ˌweldɪ'faɪnd] adj. дакла́дна азна́чаны, акрэ́сьлены

well-disposed [ˌweldɪ'spoʊzd] adj. добразычлі́вы, спрыя́льны; прыхі́льны

well-dressed [ˌwel'drest] adj. прыбра́ны, прыго́жа апра́нуты

well-fed [ˌwel'fed] adj. нако́рмлены, адко́рмлены; сы́ты, гла́дкі

well-founded [ˌwel'faʊndɪd] adj. абгрунтава́ны

well-grown [ˌwel'groʊn] adj. ро́слы

wellhead ['welhed] n. крыні́ца *f.*; жарало́ *n.*

well-informed [ˌwelɪn'fɔ:rmd] adj. до́бра паінфармава́ны

well-kept [ˌwel'kept] adj. до́бра дагле́джаны; до́бра захава́ны

well-known [ˌwel'noʊn] adj. 1. агу́льна ве́дамы (*факт*). 2. шыро́ка ве́дамы, славу́ты

well-meaning [ˌwel'mi:nɪŋ] adj. добразычлі́вы

well-off [ˌwel'ɔ:f] adj. 1. у до́брым ста́не. 2. бага́ты, пры грашо́х, забясьпе́чаны

well-read [ˌwel'red] adj. начы́таны

wellspring ['welsprɪŋ] n. крыні́ца *f.*

well sweep, n. журавéль -ўля́ *m.* (*пры сту́дні*)

well-timed [ˌwel'taɪmd] adj. своечасо́вы

well-to-do [ˌweltə'du:] adj. замо́жны

well-wisher ['welˌwɪʃər] n. добразычлі́вец -ўца *m.*

Welsh [welʃ] – adj. валíйскі
– n. валíец -йца *m.*, валíйцы *pl.* 2. валíйская мóва
Welshman [ˈwelʃmən] n., pl. **-men** валíец -йца *m.*
welt [welt] – n. 1. рант -а *m.* (*у абýтку*). 2. аблямóўка, абшы́ўка *f.* 3. Informal піся́г -á *m.* 4. Informal удáр -у *m.*
– v.t. 1. аблямóўваць. 2. Informal ласавáць
welter [ˈweltər] – n. сумбýр, бязлáд -у *m.*, блытанíна *f.*
– v.i. 1. патанáць, бóўтацца, валя́цца. 2. уздымáцца
welterweight [ˈweltərweɪt] n. баксёр сярэ́дняй вагí
wen [wen] n. тлушчáк, тлушчавíк -á *m.*
Wend [wend] n. вэнд -а *m.*, лýжыцкі сэрб
went [went] v., *p.t. of* **go**
wept [wept] v., *p.t., p.p. of* **weep**
were [wɜːr; *unstressed* wər] v., *p.t. of* **be** быў, былí. 2. *subjunctive of* **be**: ***If I were rich, I would travel*** Калí б я быў багáты, я б падарóжнічаў
we're [wɪr] *скарóчанае* **we are**
weren't [wɜːrnt] *скарóчанае* **were not**
west [west] – n. зáхад -у *m.*
– adj. захóдні
• ***West*** Зáхад, краíны захóдняга сьвéту
• ***the West*** захóдняя чáстка Злýчаных Штáтаў, Канáды
• ***west of*** на зáхад ад
westbound [ˈwestbaʊnd] adj. якí ідзé (вядзé) на зáхад (*пра кірýнак*)
westerly [ˈwestərli] – adj., adv. 1. на зáхад. 2. з зáходу, захóдні.
– n. захóдні вéцер
western [ˈwestərn] – adj. 1. захóдні. 2. у захóдняй чáстцы
– n. Informal вэ́стэрн -у *m.* (*каўбóйскі фільм абó апавядáньне з жыцьця́ амэрыкáнскага Зáходу*)
Western civilization захóдняя цывілізáцыя
Westerner [ˈwestərnər] n. чалавéк з захóдняй чáсткі Злýчаных Штáтаў *абó* Канáды
Western Hemisphere Захóдняя Паўкýля
westernmost [ˈwestərnmoʊst] adj. найбóльш захóдні, найдалéй на зáхадзе
Westphalian [westˈfeɪlɪən] adj. вэстфáльскі
westward [ˈwestwərd] – adv. на зáхад, у захóднім кірýнку: ***to sail westward*** плы́сьці на зáхад
– adj. накірава́ны на зáхад, захóдні: ***the westward slope of the hill*** захóдні схон узгóрку
westwards [ˈwestwərdz] adv., *гл.* **westward, adv.**
wet [wet] – adj. **wetter, wettest** 1. мóкры. 2. нявы́сахлы: ***Don't touch: wet paint*** Не дакранáйся — пафарбавáна. 3. дажджлíвы, мóкры: ***wet weather*** дажджлíвае, мóкрае надвóр'е. 4. вільгóтны
– v.t. 1. мачы́ць, замóчваць
– v.i. 1. мóкнуць; макрэ́ць. 2. мачы́цца, выдзяля́ць мачý.
– n. 1. макратá, макрыня́ *f.* 2. вільгóтнасьць, вíльгаць *f.*, макрóцьце *n.*
• ***wet behind the ears*** недасьвéдчаны, зялёны
wether [ˈweðər] n. вы́легчаны барáн
wetland [ˈwetlænd] n. балóта *n.*; дрыгвá *f.*
wetness [ˈwetnəs] n. макрыня́ *f.*; макрэ́ча *f.*
wet nurse мáмка, кармíліца *f.*
wet-nurse [ˈwetnɜːrs] v.t. быць мáмкай
wettish [ˈwetɪʃ] adj. макравáты, вільгóтны
we've [wiːv; unstressed wɪv] *скарóчанае* **we have**
whack [hwæk] – n. удáр -у *m.*
– v.t. лупцавáць
• ***out of whack*** у бязлáдзьдзі, ня ў фóрме
• ***take a whack at*** Sl. паспрабавáць *што* (*анý ўдáсца*)
whacky [hwæki] *гл.* **wacky**
whale I [hweɪl] – n. кіт -á *m.*
– v.i. палявáць на кітóў; лавíць кітóў
whale II [hweɪl] v.t., Informal бíць, хвастáць; сьцябáць, лупцавáць
whaleboat [ˈhweɪlboʊt] n. кітабóйная лóдка

whalebone [ˈhweɪlboʊn] n. кітóвы вус
whaler [ˈhweɪlər] n. кіталóлў -ва *m.*, кітабóлй -я *m.*
whaling [ˈhweɪlɪŋ] n. 1. лóўля кітóў. 2. кітабóйны прóмысел
wharf [hwɔ:rf] n., pl. **wharves** or **wharfs** 1. верф *f.* 2. прычáл -у *m.*
what [hwʌt] – pron. 1. *пытáльны:* што, якí: ***What is it?*** Што гэ́та? ***What of it?*** Што з гэ́тага? ***So what?*** Ну, дык што з гэ́тага? ***What is the matter?*** Што ста́лася? У чым спра́ва? ***What is your name?*** Тваё імя́? Як цябе́ зваць? 2. *адно́сны:* ***I know what you mean*** Я ве́даю, што ты хо́чаш сказа́ць; ***Do what you please*** Рабí, што табе́ хо́чацца
– adj. 1. якí, като́ры : ***What time is it?*** Като́рая гадзíна? 2. той, якí; якí: ***Put back what money is left*** Палажы́ наза́д гро́шы, што засталíся. 3. што за: ***What a beautiful day!*** Што за прыго́жы дзень! ***What a pity!*** Шкада́! ***What luck!*** Што за шча́сьце!
– adv. як, нако́лькі: ***What does it matter?*** Яко́е гэ́та ма́е зна́чаньне?
– interj. што: ***What! Are you late again?*** Што? Ты ізно́ў спазьні́ўся?
• ***and what not*** і ўсё íншае: ***She collected buttons, beads, bangles, and what not*** Яна́ зьбірáла гýзікі, па́церкі, бранзале́ты і ўсё íншае
• ***what for*** чаму́; наво́шта
• ***what have you,*** Informal і да тагó падо́бнае
• ***what if*** што ста́лася б, калí б
• ***what's what,*** Informal што да чагó
whatever [hwʌtˈevər] – pron. 1. усё, што; што б ні: ***Do whatever you like*** Рабí, што хо́чаш; ***I am right, whatever you think*** Мая́ пра́ўда, што б ты сабе́ ні ду́маў.
– adj. 1. абы́-якí, які б ні быў: ***for whatever reason*** дзе́ля яко́й бы ні было́ прычы́ны. 2. якí-не́будзь: ***I have no plans whatever*** Я ня ма́ю аніякíх пля́наў; ***Is there any hope whatever?*** Ці ёсьць хоць яка́я надзе́я?
whatnot [ˈhwʌtnɑ:t] n. 1. уся́кая ўся́чына, барахло́ *n.* 2. палíчка для дро́бязі
what's [hwʌts] *скаро́чанае* **what is**
whatsoever [ˌhwʌtsoʊˈevər] pron., adj. *гл.* **whatever**
wheal [hwi:l] n. пухíр -á *m.*
wheat [hwi:t] n. пшаніца *f.*
wheaten [ˈhwi:tən] adj. пшанíчны
wheel [hwi:l] – n. 1. ко́ла *n.* 2. руль -я́ *m.*, абара́нак -ка *m.*; круг -а *m.*: ***a ship's wheel*** стырно́ *n.*, рулявóе ко́ла, штурва́л -а *m.*; ***a potter's wheel*** ганча́рны круг. 3. Figur. машы́на *f.*, мэханíзм -у *m.*: ***the wheels of state*** дзяржа́ўная машы́на. 4. Informal самахо́д -а *m.*; ро́вар, веласіпе́д -а *m.*
– v. 1. круціцца, вярце́цца. 2. ве́зьці на ко́лах. 3. Informal калясíць
• ***at the wheel*** а) за стырно́м. б) на кіраўні́чым стано́вішчы
• ***big wheel*** вялíкая шы́шка (*пра ва́жную асо́бу*)
• ***wheels*** а) мэханíзм -у *m.* б) структу́ра *f.* в) апара́т (*дзяржа́ўны*)
• ***wheels within wheels*** склада́ныя абста́віны
wheelbarrow [ˈhwi:lˌbærоʊ] n. та́чка *f.*
wheelchair каля́ска *f.* (*для інвалíдаў*)
wheeler-dealer [ˌhwi:lərˈdi:lər] n., Sl. дзялле́ц -ца́, дзялло́к, -ка́ *m.*
wheelhouse [ˈhwi:lhaʊs] n. ру́бка *f.*, кабíнка стырнавóга
wheelwright [ˈhwi:lraɪt] n. калёсьнік -а *m.*
wheeze [ˈhwi:z] – v.i. сапцí, хрыпе́ць
– n. 1. сапе́ньне *n.*, сап -у *m.*; хрыпе́ньне *n.*, храп -у *m* . 2. Sl. зьбíты вы́раз, стары́ анекдо́т
wheezy [ˈhwi:zi] adj. сапа́ты, хрыпа́ты
when [hwen] – adv. калí: ***When does the store close?*** Калí зачыня́ецца кра́ма?
– conj. 1. калí: а) ***Rise when your name is called*** Устань, як цябе́ вы́клічуць. 2. тады́, калí: ***You cry when you should laugh*** Ты пла́чаш, калі тро́ба сьмя́яцца
– n. час -у *m.*: ***the when and where of an act*** час і ме́сца дзе́і
whence [hwens] adv. адку́ль

whenever [hwen'evər] conj., adv. калі́; калі́-ко́лечы, калі́ б ні было́

where [hwer] – adv. 1. дзе: ***Where is he?*** Дзе ён? 2. куды́: ***Where are you going?*** Куды́ ідзе́ш? 3. адку́ль, дзе: ***Where did you get this book?*** Дзе ты доста́ў гэ́тую кні́гу?
– conj. 1. там, дзе: ***The keys are where you left them*** Ключы́ там, дзе ты іх паки́нуў. 2. куды́: ***I will go where you go*** Я пайду́, куды́ ты по́йдзеш

whereabout *гл.* **whereabouts**

whereabouts ['hwerəbauts] – adv., conj. дзе паблі́зу, бліза́ка; дзе? ***Whereabouts can I find a doctor?*** Дзе тут паблі́зу мо́жна знайсьці ле́кара?
– n., pl. прыблі́знае месцазнахо́джаньне *n.*: ***Do you know his whereabouts?*** Ці вы ве́даеце, дзе ён знахо́дзіцца?

whereas [hwer'æz] conj. 1. тым ча́сам, як; хаця́; а: ***Some people like opera whereas others do not*** Некато́рым лю́дзям падаба́ецца о́пэра, а і́ншым не. 2. дзе́ля таго́ што, так як

whereby [hwer'bai] adv., conj. пры дапамо́зе *чаго́*; чым; як: ***There is no other way whereby he can be saved*** Нямá ніякага і́ншага спо́сабу яго́ вы́ратаваць

wherefore [hwer'fɔ:r] – adv. 1. наво́шта; чаму́. 2. дзе́ля таго́, таму́
– conj. дзе́ля яко́е прычы́ны; чаму́
– n. прычы́на *f.*

wherefrom [hwer'frʌm] adv. адку́ль; з чаго́: ***Wherefrom has he so much wisdom?*** Адку́ль у яго́ гэ́тулькі му́драсьці?

whereof [hwer'ʌv] adv., conj. з чаго́; зь яко́га; пра каго́

whereupon [ˌhwerə'pɑ:n] adv., conj. 1. на чым, на яки́м. 2. у яки́м, пасьля́ яко́га

wherever [hwer'evər] conj., adv. дзе; дзе ж, куды́ ж; хоць дзе, хоць куды́: ***Wherever are you going?*** Куды́ ж ты ідзе́ш?; ***Sit wherever you like*** Сядзь дзе хо́чаш

whet [hwet] v.t. 1. тачы́ць: ***to whet a knife*** натачы́ць нож. 2. Figur. узбуджа́ць; завастра́ць (*апэты́т, жада́нье*)

whether ['hweðər] conj. ці: ***I don't know whether he is here*** Я ня ве́даю, ці ён тут
• ***whether ... or*** ці ... ці: ***It matters little whether we go or stay*** Гэ́та мала-ва́жна, ці мы по́йдзем, ці застане́мся
• ***whether or not*** так ці іна́кш; ва ўся́кім выпа́дку; ня гле́дзячы ні на што

whetstone ['hwetstoun] n. тачы́ла *n.*, асялло́к, брусло́к -ка́ *m.*

whey [hwei] n. сыро́ватка *f.*

which [hwitʃ] – pron. 1. які́, като́ры, хто: ***Which of you am I to thank?*** Каму́ з вас падзя́каваць?; ***Which way shall we go?*** У які́ бок мы по́йдзем? 2. які́, като́ры, што: ***the sight which I saw*** відо́вішча, яко́е я паба́чыў
– adj. які́, като́ры: ***Which boy won the prize?*** Като́ры хлапе́ц здабы́ў узнагаро́ду?

whichever [hwitʃ'evər] pron., adj. 1. які́ хаця́, які́ то́лькі, като́ры то́лькі: ***Buy whichever hat you like*** Купля́й капялю́ш, які́ то́лькі табе́ падаба́ецца. 2. які́ б ні, като́ры б ні: ***Whichever side wins, I shall be satisfied*** Като́ры б бок ні вы́граў, я бу́ду задаво́лены

whiff [hwif] – n. 1. паве́ў -ву *m.*, по́дых -у *m.* (*ве́тру*). 2. пах -у *m.* 3. дымо́к -ка́ *m.* (*цыгары́ты*)
– v.i. 1. дзьмуць; дзьму́хаць. 2. пы́хкаць, пуска́ць дымо́к

whiffle ['hwifəl] v.i. 1. падзьму́хваць, павява́ць (*пра ве́цер*). 2. хіста́цца, быць нерашу́чым

while [hwail] – n. час -у *m.*, адрэ́зак ча́су: ***a long while*** до́ўга; ***in a little while*** неўзаба́ве; ***a little while ago*** нядаўна; ***for a while*** на не́йкі час
– conj. 1. тады́ як; калі́, паку́ль: ***While I was speaking, he said nothing*** Калі́ я гаварыў, ён нічо́га не каза́ў. 2. хоць: ***While I like the color of***

your hat, I do not like its shape Хоць мне падаба́ецца ко́лер твайго́ капелюша́, не падаба́ецца мне ягóны фасóн

• ***while away (time)*** ба́віць, правóдзіць час

whim [hwɪm] n. прыхамаць *f.*, капрыз -у *m.*, захапле́ньне *n.*: дзіва́цтва *n.*: ***Her whim for gardening won't last long*** Ейнае захапле́ньне гаро́дніцтвам до́ўга не патрыва́е

whimsical [ˈhwɪmzɪkəl] adj. 1. капры́зны; перабо́рлівы. 2. дзівакава́ты, эксцэнтры́чны

whine [hwaɪn] – v.i. 1. скавыта́ць; скуго́ліць; ека́таць (*пра саба́ку*). 2. піш-ча́ць, хны́каць (*пра дзіця́*). 3. нарака́ць; ска́рдзіцца

– n. 1. скавыта́ньне, скуго́леньне *n.* 2. піск -у *m.*, хны́каньне, нарака́ньне *n.*

whinny [ˈhwɪni] – n. іржа́ньне *n.* (*каня́*)

– v.i. іржа́ць

whip [hwɪp] – v., **whipped** or **whipt, whipping,**

– v.t. 1. а) удара́ць; біць; лупцава́ць; сьцёбаць, паганя́ць: ***to whip a horse on*** паганя́ць каня́ пу́гай. 2. а) зрыва́ць, зьдзіра́ць зь сябе́: ***He whipped off his coat*** Ён сарва́ў зь сябе́ плашч. б) схапі́ць, наки́нуць на сябе́: ***She whipped on her robe*** Яна́ наки́нула на сябе́ капо́ту. 3. узбуджа́ць, уздыма́ць, падахво́чваць: ***to whip up some enthusiasm*** уздыма́ць энтузія́зм. 4. зьбіва́ць (*я́йка, сьмята́ну*). 5. закіда́ць ву́ду

– v.i. шуга́ць: ***The thief whipped behind a corner and escaped*** Зло́дзей шугану́ў за рог і ўцёк

– n. 1. пу́га *f.*, бізу́н -а́ *m.* 2. сьцёбаньне *n.* (*пу́гай, бізуно́м*). 3. кіраўні́к парля́мэнцкай фра́кцыі. 4. фурма́н -а́ *m.*

whipping [ˈhwɪpɪŋ] n. 1. біцьцё, лупцава́ньне *n.*; сьцёбаньне, паганя́ньне *n.* 2. абмо́тка *f.*, абмо́тваньне *n.*: ***We fastened the broken rod with a whipping of wire*** Зламáны прут мы абмата́лі дро́там

• ***whipping boy*** ахвя́рны казёл

whipstock [ˈhwɪpstɑ:k] n. пугаўё *n.*

whipt [hwɪpt] v., *p.t., p.p. of* **whip**

whirl [hwɜ:rl] – v.i. 1. круці́цца, кружы́цца; віхры́цца, вірава́ць: ***The leaves whirled on the wind*** Ліcьце кружы́лася на ве́тры. 2. прано́сіцца; праімча́цца, пракаляcі́ць. 3. Figur. адчува́ць галавакружэ́ньне: ***My head is whirling*** У мяне́ закружы́лася галава́

– n. 1. круце́ньне, кружэ́ньне *n.* 2. вір -у *m.*. 3. Figur. вір (*падзе́яў*): ***social whirl*** вір тава́рыскага жыцьця́. 3. галавакружэ́ньне *n.*

• ***whirl away*** імча́ць

whirlpool [ˈhwɜ:rlpu:l] n. вадзяны́ вір -у *m.*, вадавaро́т -у *m.*; жаку́зі *n., indecl.*

whirlwind [ˈhwɜ:rlwɪnd] n. віхо́р ві́хру *m.*, сьмерч -у *m.*

whirr [hwɜ:r] – v.i. гудзе́ць

– n. гудзе́ньне *n.*, гуд -у *m.*

whish [hwɪʃ] – n. шэ́лест, шо́лах -у *m.*; шо́рах *m.*

– v.i. шалясьце́ць, шамата́ць

whisk [hwɪsk] – v.t. 1. зьмята́ць; зма́хваць. 2 . зьбіва́ць (*я́йкі, сьмята́ну*)

– v.i. шмы́гаць: ***The mouse whisked into its hole*** Мыш шмыгну́ла ў но́рку

– n. 1. лёгкі, жва́вы рух, узма́х -у *m.* 2. ве́нічlак -ка *m.*, мяцёлка *f.* 3. калато́ўка (*для зьбіва́ньня*)

• ***whisk away*** паімча́ць

whisker [ˈhwɪskər] n. 1. валасі́на. 2. ву́сы (*у ката́, ты́гра*)

• ***whiskers,*** pl. бакенба́рды, ба́кі *pl.*

whiskered [ˈhwɪskərd] adj. 1. з бакенба́рдамі *або́* ба́камі. 2. з ву́самі (*пра зьвяро́ў*)

whiskey [ˈhwɪski] n., pl. **-kies** ві́скі *n.*

whisper [ˈhwɪspər] – v. 1. шапта́ць. 2. гаварыць пад сакрэ́там, шапта́цца: ***It is whispered that his health is failing*** Хо́дзяць чу́ткі, што ў яго́ здаро́ўе падупада́е. 3. шапаце́ць; шамаце́ць: ***The wind whispered in the trees*** Ве́цер шапаце́ў у дрэ́вах

– n. шэпт -у *m.*, шапта́ньне *n.*: ***to speak in a whisper*** гаварыць шэ́птам. 2. шапаце́ньне *n.*, шо́рах -у *m.*

whist [hwɪst] n. віст -у *m.* (*гульня́ ў ка́рты*)

whistle [ˈhwɪsəl] – v.i. 1. сьвіста́ць. 2. сьвіста́ць у сьвісто́к. 3. кліка́ць, сыгналізава́ць *або́* кірава́ць сьві́стам *або́* сьвістко́м: ***The police officer whistled the automobile to stop*** Паліцыя́нт сьвістко́м спыні́ў аўтамабі́ль. 4. высьві́стваць: ***to whistle a tune*** высьві́стваць мэлёдыю

– n. 1. сьвіст -у *m.*, сьвістло́к -ка́ *m.* (*гук*). 2. сьвістло́к -ка́ *m.* (*інструме́нт*)

• ***whistle for*** Informal чака́ць надарэ́мна

• ***whistle in the dark*** падбадзёрваць сябе́ ў стра́ху

• ***wet one's whistle,*** Informal памачы́ць губу́, вы́піць

whistler [ˈhwɪslər] n. сьвістуно́н -а́ *m.*

white [hwaɪt] – n. 1. бе́лы ко́лер. 2. бель *f.*, бе́льле *n.*, белізна́, бе́ласьць *f.* 3. бе́лая фа́рба, бяліла *n.* 4. бе́лая во́пратка. 5. бе́лыя пля́мы ў дру́ку. 6. бе́лы чалаве́к (*бе́лае ра́сы*)

– adj. 1. бе́лы. 2. бяля́вы, белава́ты. 3. бле́дны: ***to turn white with fear*** зьбяле́ць ад стра́ху. 4. серабры́сты, сівы́: ***white hair*** сівы́я валасы́. 5. сьне́жны: ***a white winter*** сьне́жная зіма́. 6. беззага́нны; чы́сты; нявінны. 7. бе́лы (*у палітычным сэ́нсе*)

• ***bleed white*** а) абабра́ць *ка́го* да ні́тку; вы́маташ, вы́цягнуць гро́шы. б) пазба́віць *ка́го* сі́лы

• ***white of an egg*** бялко́к я́йка

• ***white meat*** бе́лае мя́са (*як куры́ца, цяля́ціна*)

• ***white wines*** бе́лыя ві́ны

• ***whites of the eyes*** бялкі́ вачэ́й

white birch бе́лая бяро́за

white clover дзя́целіна *f.*, дзя́цельнік -у *m.*

white coal бе́лы ву́галь, гідраэнэ́ргія *f.*

white-collar [ˌhwaɪtˈkɑ:lər] adj. канцыля́рскі, канто́рскі, белакашу́льны: ***white-collar worker*** службо́вец -ўца *m.*, канцыля́рскі працаўні́к

whitefish [ˈhwaɪtfɪʃ] n. сіг -а *m.*

white flag бе́лы сьцяг (*сы́мбаль замі-рэ́ньня або́ капітуля́цыі*)

white frost шэ́рань *f.*

white-hot [ˌhwaɪtˈhɑ:t] adj. 1. распа́лены дабяла́. 2. ве́льмі ўзбу́джаны

Whitehall [ˈhwaɪthɔ:l] n. 1. Уайтгол (*ву́ліца ў Лёндане, на яко́й знахо́дзяцца ўра́давыя ўстано́вы*). 2. Informal брыта́нскі ўра́д

White House 1. Бе́лы Дом (*у Вашынгто́не*). 2. Informal ура́д ЗША

white matter тка́нка мазго́ў, сьпіннО́га мо́згу

whiten [ˈhwaɪtən] – v.t. бяліць, выбе́льваць

– v.i. бяле́ць

whiteness [ˈhwaɪtnəs] n. бель, бе́ласьць, белізна́ *f.*

white supremacy тэо́рыя перава́гі бе́лае ра́сы над і́ншымі

whitewash [ˈhwaɪtwɑ:ʃ] – n. 1. бялі́ла *n.* 2. апра́ўдваньне; выбе́льваньне *n.*

– v.t. 1. бяліць. 2. выбе́льваць; апра́ўдваць

whither [ˈhwɪðər] adv., conj. куды́

whitish [ˈhwaɪtɪʃ] adj. белава́ты, бяля́вы

whity [ˈhwaɪti] adj. белава́ты, бяля́вы

whiz or **whizz** [hwɪz] – n. 1. сьві́ст -у *m.* (*паве́тра*); гудзе́ньне, шыпе́ньне *n.* 2. Sl. ма́йстlар -ра *m.*, знаlве́ц -ўца́ *m.*

– v.i. сьвіста́ць; шыпе́ць: ***An arrow whizzed past his head*** Страла́ прасьвіста́ла паўз яго́ную галаву́

who [hu:] pron. 1. хто. 2. які́, яка́я: ***The girl who spoke last is my best friend*** Дзяўчы́на, яка́я выступа́ла апо́шняя — мая́ найле́пшая сяброўка. 3. хто, той: ***Who is not for us is against us*** Хто ня з на́мі, той супро́ць нас

• ***who's who*** хто ёсьць хто

whoever [huˈevər] pron. 1. хто-ко́лечы; абы́ хто, хто заўго́дна: ***Whoever wants the book may have it*** Хто заўго́дна мо́жа ўзя́ць гэ́тую кні́гу

whole [hoʊl] – adj. 1. цэ́лы, увёсь: ***He worked the whole day*** Ён працава́ў цэ́лы дзень. 2. непашко́джаны, цэ́лы: ***to get out of a fight with a whole skin*** вы́йсьці з бо́йкі цэ́лым, бяз дра́пінкі. 3. цэ́льны: ***whole milk*** нязьня́тае, цэ́льнае малако́
– n. цэ́ласьць *f.*
• ***as a whole*** як адна́ цэ́ласьць; ра́зам
• ***on the whole*** а) агу́лам беручы́, нао́гул, уво́гуле; перава́жна, у бо́льшасьці. б) у канчатко́вым вы́ніку, у ро́шце рэшт

whole note Mus. цэ́лая но́та

whole number цэ́лы лік

wholesale ['hoʊlseɪl] – n. гуртавы́, апто́вы га́ндаль, га́ндаль гу́ртам: ***He buys at wholesale and sells at retail*** Ён купля́е гу́ртам, а прадае́ ўраздро́б
– adj. 1. гуртавы́, апто́вы: ***the wholesale price*** гуртава́я цана́. 2. Figur. павярхо́ўны, беспадста́ўны: ***Avoid wholesale condemnation*** Высьцерага́йцеся беспадста́ўных, павярхо́ўных асуджэ́ньняў. 3. Figur. агу́льны, ма́савы: ***wholesale slaughter*** ма́савае зьнішчэ́ньне, разьня́ *f.*
– adv. ма́сава; гу́ртам, агу́лам; у вялі́кіх паме́рах
– v.t. прадава́ць гу́ртам

wholesaler ['hoʊlseɪlər] n. гуртаві́к -а́ *m.*

wholesome ['hoʊlsəm] adj. здаро́вы; дабратво́рны: ***wholesome food*** здаро́вая е́жа

whole-wheat ['hoʊlhwi:t] adj. непытлява́ная пшані́чная мука́

who'll [hu:l] *скаро́чанае* **who will, who shall**

wholly ['hoʊli] adv. зусі́м, ца́лкам

whom [hu:m] pron. каму́, каго́: ***To whom it may concern*** Таму́, каго́ ты́чыцца

whomever [hu:'mevər] pron. каго́-ко́лечы. 2. хоць каму́

whoop [hu:p] – n. 1. во́клік, гік -у *m.* 2. курлы́каньне, гі́каньне *n.*
– v.t. 1. крыча́ць. 2. галёкаць, паганя́ць кры́кам: ***to whoop horses on*** паганя́ць ко́ней кры́кам. 3. гі́каць

whoopee ['hwʊpi:] – interj. во́кліч ра́дасьці, захапле́ньня
– n. шу́мная гуля́нка

whooping cough ['hu:pɪŋkɔ:f] n. ко́клюш -у *m.*

whop [hwɑ:p] – v.t. **(-pp-)** Informal лупі́ць, лупцава́ць
– n. цяжкі́ ўда́р

whopper ['hwɑ:pər] n., Informal 1. не́шта вяліза́рнае. 2. несусьве́тная хлусьня́

whopping ['hwɑ:pɪŋ] adj., Informal вялічэ́зны, вяліза́рны

whore [hɔ:r] – n. 1. прастыту́тка *f.* 2. блудні́ца, распу́сьніца *f.*
– v.i. распу́сьнічаць

whorehouse ['hɔ:rhaʊs] n. публі́чны дом

who's [hu:z] *скаро́чанае* **who is, who has**

whose [hu:z] pron. чый

whosesoever [ˌhu:zsoʊ'evər] pron. чый-бы ні: ***I will accept whosesoever aid is offered*** Я прыму́ дапамо́гу, чыя́ б яна́ ні была́

whosoever [ˌhu:soʊ'evər] pron. хто-ко́лечы

why [hwaɪ] – adv. 1. чаму; чаго́: ***Why did you do it?*** Чаму́ ты гэ́та зрабі́ў?; ***Why are you crying?*** Чаго́ ты пла́чаш? 2. чаму́, дзе́ля чаго́: ***That is the reason why he failed*** Гэ́та — прычы́на, чаму́ ён пацярпе́ў няўда́чу
– n. прычы́на, падста́ва *f.*: ***She tried to find out the whys and wherefores of his behavior*** Яна́ стара́лася раскры́ць прычы́ны й мэ́ты яго́ных паво́дзінаў
– interj. *выка́звае зьдзіўле́ньне, сумне́ў*: ***Why! It's all gone!*** Што ж гэ́та! Ужо́ ўсё паїшло́! ***Why not?*** Чаму ж не?
• ***that is why*** вось чаму́; таму, дзе́ля чаго́
• ***the whys of it*** прычы́ны, асно́вы гэ́тага

wick [wɪk] n. кнот -а *m.*

wicked ['wɪkɪd] – adj. 1. дрэ́нны, злы, ліхі́; немара́льны; грэ́шны: ***a wicked person*** злы, ліхі́ чалаве́к; ***wicked***

deeds немара́льныя ўчы́нкі. 2. гарэ́зьлівы, свабо́льны, зласьлі́вы: ***a wicked smile*** зласьлі́вая ўсьме́шка. 3. Informal непрые́мны; суро́вы: ***a wicked task*** непрые́мнае зада́ньне; ***a wicked storm*** страшэ́нная навальні́ца
– n. гро́шнік -а *m.*

wicker [ˈwɪkər] – n. 1. лаза́ (*для пляце́ньня*). 2. рэч, сплёценая з лазы́
– adj. пле́цены з лазы́: ***wicker baskets*** кашы́, пле́ценыя з лазы́; ***wicker chair*** пле́ценае кро́сла

wickerwork [ˈwɪkərwɜ:rk] n. вы́рабы пле́ценыя з лазы́

wicket [ˈwɪkɪt] n. 1. бра́мка *f.* 2. вако́нца *n.*: ***Buy your tickets at this wicket*** Купі́ бі́леты ў го́тым вако́нцы. 3. бра́мка *f.* (*у крыкеце*)

wide [waɪd] – adj. 1. шыро́кі: ***a wide street*** шыро́кая ву́ліца. 2. просто́рны
– adv. шыро́ка: ***Open your mouth wide*** Раскры́й шыро́ка рот
• ***far and wide*** усю́ды, далёка й шыро́ка
• ***the wide*** вялі́кі абша́р, неабся́жная прасто́ра
• ***wide apart*** далёка адзі́н ад аднаго́
• ***wide choice*** шыро́кі, вялі́кі вы́бар
• ***wide open*** на́сьцеж
• ***wide world over*** ва ўсі́м сьве́це

wide-awake [ˌwaɪdəˈweɪk] adj. 1. ца́лкам прачну́ўшыся. 2. Figur. пі́льны; чу́йны

wide-eyed [ˌwaɪdˈaɪd] adj. 1. наі́ўны, няві́нны. 2. мо́цна зьдзі́ўлены

widely [ˈwaɪdlɪ] adv. 1. шы́рака, шыро́ка: ***a man who is widely known*** шыро́кавядо́мы чалаве́к. 2. ве́льмі, кра́йне: ***two widely different accounts*** два ве́льмі ро́зныя ро́спаведы

widen [ˈwaɪdən] – v.t. шы́рыць, пашыра́ць
– v.i. пашыра́цца

widespread [ˈwaɪdspred] adj. шыро́ка распасьцёрты, шыро́ка раскі́нуты: ***widespread wings*** шыро́ка распасьцёртыя кры́лы

widow [ˈwɪdoʊ] n. удава́ *f.*

widowed [ˈwɪdoʊd] adj. аўдове́лы

widower [ˈwɪdoʊər] n. удаўве́ц -ўца́ *m.*

widowhood [ˈwɪdoʊhʊd] n. стан удавы́

width [wɪdθ] n. 1. шырыня́ *f.* 2. по́лка, сто́лка *f.*: ***curtain taking two widths of cloth*** фіра́нка зь дзьвюх по́лак матэ́рыі

wield [wi:ld] v.t. вало́даць: ***A writer wields the pen*** Аўтар вало́дае пяро́м

wiener [ˈwi:nər] n. саcі́ска *f.*

wife [waɪf] n., pl **wives** жо́нка *f.*

wifely [ˈwaɪflɪ] adj. 1. жо́нчын. 2. жано́чы

wig [wɪg] – n. пары́к -а́ *m.*: ***The bald man wore a wig*** Лы́сы мужчы́на насі́ў парык
– v.i. **(-gg-)** 1. надзява́ць парык. 2. Informal сварыцца, прабіра́ць

wiggle [ˈwɪgəl] – v.i. ту́зацца, ёрзаць: ***The restless child wiggled in his chair*** Неспако́йнае дзіця́ ёрзаць у кро́сьле
– v.t. 1. варушы́цца. 2. ту́заць: ***to wiggle the toes*** варушы́ць па́льцамі ног
– n. ёрзаньне, ту́заньне *n.*

wiggly [ˈwɪglɪ] adj. 1. варухлі́вы. 2. хва́лісты: ***a wiggly line*** хва́лістая лі́нія

wigwam [ˈwɪgwɑ:m] n. вігва́м -а *m.*

wild [waɪld] – adj. 1. дзі́кі. 2. нецывілізава́ны: ***wild man*** дзіку́н -а́ *m.* 3. разгу́льны, распу́сны: ***to live a wild life***: жыць распу́сным жыцьцём. 4. запусьце́лы. 5. ашале́лы, разьюшаны: ***wild with rage*** ашале́лы ад гне́ву. 6. бу́рны: ***a wild storm*** бу́рная навальні́ца. 7. неверагодны, дзі́ўны, недарэ́чны. 8. жо́рсткі, лю́ты
– n. 1. дзіч, дзі́касьць *f.* 2. пусто́ча *f.*; аблога *f.*
– adv. дзі́ка, да дзі́касьці
• ***drive wild*** давадзіць да ша́лу
• ***run wild*** дзі́ка разгу́льваць
• ***take a wild stab*** рабіць наўздага́д
• ***wild fire*** вялі́кі пажа́р (*які́ цяжка патушы́ць*)
• ***wild flower*** палява́я *або́* лясна́я кве́тка

• ***wild goose chase*** бессэнсо́ўная заду́ма, пагóня за пусты́м
• ***wild land*** дзі́кі, ненасе́лены край
wild animals зьверына́ *f., coll.* зьвяр'ё *n.*
wild boar дзік -а́ *m.*
wildcat ['waɪldkæt] n. 1. Zool. рысь *f.* 2. запа́льчывы чалаве́к. 3. рызыко́ўнае гандлёвае прадпрые́мства
• ***wildcat stocks*** рызыко́ўныя а́кцыі
• ***wildcat strike*** нелега́льная забасто́ўка
wilderness ['wɪldərnəs] n. пусты́ня *f.*, дзі́кая мясьці́на *або́* абша́р
wildlife ['waɪldlaɪf] n. жыва́я прыро́да (*зьвяры́ й расьлі́ны*)
wild West or **Wild West** Дзі́кі За́хад (*захо́дняя ча́стка ЗША да ўсталява́ньня там стабі́льнай ула́ды*)
wile [waɪl] – n. хі́трасьць *f.*; хі́трыкі *pl.*, ашука́нства *n.*
– v.t. ва́біць, прыва́бліваць хі́трасьцю; прына́джваць
• ***wile away*** ба́віць час
wilful ['wɪlfəl] adj., *гл.* **willful**
will I [wɪl] *дапамо́жны дзеяслóў, пака́звае* 1. *бу́дучы час*: ***He will come soon*** Ён прыйдзе неўзаба́ве. 2. *зго́ду*: ***I will do what you want*** Я зраблю́, што ты хо́чаш. 3. *нязьме́ннасьць*: ***Boys will be boys*** Хлапцы́ бу́дуць хлапца́мі. 4. *зага́д, забавяза́ньне*: ***You will do it at once!*** Ты зро́біш гэ́та за́раз жа! 5. *праця́гласьць дзе́яньня*: ***She will read for hours*** Яна́ чыта́е гадзі́намі
will II [wɪl] – n. 1. во́ля *f.*: ***a strong will*** цьвёрдая во́ля. 2. во́ля *f.*; хаце́ньне, жада́ньне *n.*: ***He came and went at will*** Ён прыхо́дзіў і сыхо́дзіў калі́ хаце́ў. 3. Law. тэстамэ́нт -у *m.*
– v.t. 1. пастанаўля́ць, прымуша́ць сябе́: ***She willed to keep awake*** Яна́ сі́лай во́лі змо́сіла сябе́ не засну́ць. 2. выраша́ць, прадвызнача́ць: ***Fate has willed it otherwise*** Лёс вы́рашыў гэ́та іна́чай. 3. адпі́сваць, перадава́ць у спа́дчыну (*тэстамэ́нтам*): ***to will a house to someone*** запіса́ць ха́ту на не́кага
• ***against one's will*** супро́ць сваёй во́лі
• ***at will*** дастатко́ва, уво́лю
• ***good will*** до́бразычлі́васьць *f.*
• ***have one's will*** дамагчы́ся свайго
• ***ill will*** незычлі́васьць
• ***will power*** сі́ла во́лі
• ***with a will*** энэргі́чна, рашу́ча
willed [wɪld] adj. 1. рашу́чы, валявы́: ***strong-willed*** зь цьвёрдай во́ляй, хара́ктарам. 2. упа́рты
wil(l)ful ['wɪlfəl] adj. 1. самаво́льны, упа́рты. 2. сьвядо́мы, абду́маны; наўмы́сны: ***willful murder*** наўмы́снае забо́йства; ***willful waste*** сьвядо́мае марнатра́ўства
wil(l)fully ['wɪlfəlɪ] adv. 1. дабраахво́тна, па сваёй во́лі. 2. абду́мана, з наме́рам
willing ['wɪlɪŋ] adj. 1. зго́дны: ***He is willing to wait*** Ён зго́дзен пачака́ць. 2. ахво́тны, ахво́чы: ***a willing worker*** ахво́чы рабо́тнік. 3. схі́льны
willingly ['wɪlɪŋlɪ] adv. 1. ахво́ча, ахво́тна. 2. зго́дна
willingness ['wɪlɪŋnəs] n. гато́васьць *f.*, жада́ньне *n.*
will-o'-the-wisp [ˌwɪlədə'wɪsp] n. 1. блука́ючы аге́ньчык. 2. Figur. не́шта няўло́ўнае, недася́жнае
willow ['wɪloʊ] – n. вярба́ *f.*
– adj. зро́блены зь вярбы́
willowy ['wɪloʊɪ] adj. гну́ткі, стро́йны
willy-nilly [ˌwɪlɪ'nɪlɪ] adv. 1. хо́цькі-няхо́цькі, во́ляй-няво́ляй, хо́чаш-няхо́чаш. 2. без пара́дку, абы-я́к: ***Books were piled willy-nilly*** Кні́гі былі́ зва́леныя абы-я́к
wilt [wɪlt] v.i. 1. вя́нуць. 2. тра́ціць сі́лы, сла́бнуць. 3. занепада́ць ду́хам
wily [waɪlɪ] adj. хі́тры, падма́нны
wimble ['wɪmbəl] n. сьве́рдзел -дла *m.*
wimp [wɪmp] n., Sl. слабахара́ктарны, бязво́льны чалаве́к, хлю́пік -а *m.*
win [wɪn] – v.t. **won, winning** 1. выйграва́ць: ***to win the battle*** вы́йграць бітву́. 2. здабыва́ць: ***to win fame*** здабы́ць сла́ву; ***to win a prize*** здабы́ць уз-

нагаро́ду, прыз. 3. здабыва́ць, заваёўваць (*прыхі́льнасьць*), выклі́каць (*зацікаўле́ньне*): ***The speaker soon won his audience*** Прамо́ўца ху́тка завая-ва́ў прыхі́льнасьць слухачо́ў
– n., Informal вы́йгрыш -у *m.*; уда́ча *f.*; перамо́га *f.*
• ***win back*** адыгра́ць, адваява́ць
• ***win over*** перакана́ць, схіліць на свой бок: ***Mary won her mother over to her side*** Марыя схіліла ма́ці на свой бок

wince [wɪns] – v.i. уздры́гваць, мо́ршчыцца
– n. уздры́г -у *m.*; уздрыгне́ньне *n.*

winch [wɪntʃ] n. калаўро́т -а *m.*, лябёдка *f.* (*для падыма́ньня гру́зу*)

wind I [wɪnd] – n. 1. ве́цер ве́тру *m.* 2. віхо́р ві́хру -ру *m.* 3. Figur. га́зы (*у стра́ўніку, кі́шках*). 4. Mus. а) духавы́ інструме́нт. 5. дыха́ньне *n.*: ***to lose one's wind*** задыха́цца. 6. а) пустаме́льства *n.*, балбатня́ *f.* б) пыхлі́васьць *f.*, зазна́йства *n.*
– v.t. 1. ве́трыць, праве́трываць. 2. пранюхваць. 3. задыха́цца, выкліка́ць задышку. 4. дава́ць перадыхну́ць: ***They stopped in order to wind the horses*** Яны́ прыпыні́ліся, каб даць ко́ням перадыхну́ць
• ***be out of wind*** задыха́цца, стаміцца
• ***break wind*** псава́ць паве́тра
• ***down (the) wind*** зь ве́трам, у кіру́нку ве́тру
• ***fair wind*** спадаро́жны ве́цер
• ***get wind of*** дове́дацца, пачу́ць, б) пранюхаць
• ***in the eye*** or ***teeth of the wind*** про́ста супро́ць ве́тру
• ***in the wind*** нешта прадба́чанае, што ма́е ста́цца
• ***on the wind*** па ве́тру
• ***the way the wind blows*** як ве́цер дзьме, у які́м кірру́нку ве́цер паве́е
• ***throw caution to the wind*** быць неасьцяро́жным, дзе́яць неабду́мана
• ***winds,*** pl. духавы́я інструме́нты (*ча́стка аркє́стру*)

wind II [wamd] – v., **wound, winding** v.i. 1. ві́цца, абві́ва́цца: ***A brook winds through the woods*** Руча́й ві́е́цца празь лес; ***The vine winds around the pole*** Вінагра́д ві́е́цца вако́л слупа́. 2. кружы́ць: ***We wound our way through the narrow streets*** Мы кружы́лі па ву́зкіх ву́лках. 3. скру́чвацца: ***The hedgehog winds itself into a ball*** Во́жык скру́чваецца ў клубо́к
– v.t. 1. абві́ва́ць, абкру́чваць. 2. ма-та́ць, абмо́тваць, сука́ць. 3. завóдзіць: ***to wind a clock*** заве́сьці гадзі́ньнік; ***This clock winds easily*** Гэ́ты гадзі́ньнік лёгка завóдзіцца. 4. нала́джваць (*музы́чны інструмэ́нт*)
– n. 1. вы́гін -у *m.*; залóм -у *m.* 2. варо́т, заварóт -у *m.* 3. вітло́к -ка́ *m.*, абарóт сьпіра́лі
• ***wind down*** а) паступо́ва згóртвацца, спыня́цца. б) распру́жвацца
• ***wind off*** размóтваць, раскру́чваць
• ***wind up*** а) зако́нчыць, заве́сьці да канца́: ***I am winding up my work*** Я зако́нчваю сваю́ пра́цу. б) напру́жыцца, хвалява́цца: ***Sometimes he gets wound up*** Ча́сам ён ро́біцца нэрвóвы
• ***wind up in*** апыну́цца, ско́нчыць: ***He wound up in jail*** Ён ско́нчыў у турме́

wind-blown ['wɪndbloʊn] adj. наве́яны, нане́сены ве́трам

windbreak ['wɪndbreɪk] n. заслóна ад ве́тру

windbreaker ['wɪndbreɪkər] n. лёгкая спартóвая ку́ртка, вятро́ўка *f.*

winded ['wɪndɪd] adj. задыханы

windfall ['wɪndfɔ:l] n. 1. не́шта сарва́нае ве́трам. 2. апа́д -у *m.*: ***These apples are windfalls*** Гэ́тыя я́блыкі — апа́дкі. 3. Figur. нечака́ная ўда́ча

windflower ['wɪnd,flaʊr] n., Bot. курасьле́п -у *m.*, анэмóна *f.*

winding ['waɪndɪŋ] – n. 1. намóтваньне *n.*; скру́чваньне. 2. зьві́ліна, зві́ліна *f.*; вы́гін -у *m.*; заварóт -у *m.* 3. скру́тлак -ка *m.*, сьпіра́ль *f.*
– adj. 1. зьві́лісты, зві́лісты, лучы́сты; пакруча́сты. 2. сьпіра́льны: ***winding stairs*** сьпіра́льныя схóды

wind instrument духавы́ інструме́нт

windmill ['wɪndmɪl] n. 1. вятра́к ветрака́, млын -а́ *m.* 2. Informal верталёт -а *m.*

window ['wɪndoʊ] n. 1. акно́ *n.* 2. шы́ба *f.* 3. аке́нца *n.* (*на по́шце, у ба́нку, у канвэ́рце для а́драсу*). 4. вітры́на *f.* 5. аке́нца *n.* (*на экра́не кампу́тара*)

window dressing 1. ула́джваньне вітры́наў. 2. Figur. ствары́ньне фальшы́вага ўра́жаньня

windowpane ['wɪndoʊpeɪn] n. шы́ба, шы́біна *f.*

window-shop ['wɪndoʊʃɑ:p] v.i. агляда́ць вітры́ны кра́маў

window sill падвако́ньнік -а *m.*, падвако́ньне *n.*

windpipe ['wɪndpaɪp] n. ды́хальнае го́рла, трахе́я *f.*

windshield ['wɪndʃi:ld] n. ветраво́е, лабаво́е шкло (*у аўтамабі́лі*)

windshield wiper, Auto дво́рнік -а *m.*

windstorm ['wɪndˌstɔ:rm] n. віхо́р ві́хру *m.*; віху́ра *f.*

windward ['wɪndwərd] – adv. супро́ць ве́тру, пад ве́цер

– adj. наве́траны

– n. 1. наве́траны бок. 2. кіру́нак, зь яко́га дзьме ве́цер

windy ['wɪndi] adj. 1. ве́траны, вятры́сты: ***windy weather*** ве́транае надво́р'е. 2. шматсло́ўны, гаваркі́, гаварлі́вы. 3. які́ пу́шыць, выклі́кае га́зы

wine [waɪn] – n. 1. віно́ *n.* 2. цёмна-чырво́ны, бардо́вы, бурачко́вы ко́лер

– v.t. частава́ць віно́м: ***They were wined and dined*** Іх кармі́лі-паі́лі

winebibber ['waɪnˌbɪbər] n. той, хто п'е шмат віна́

wine cellar ві́нны склеп

wineglass ['waɪnglæs] n. бака́л -а *m.*

winegrower ['waɪnˌgroʊər] n. вінагрода́р -а́ *m.*

wine press давільны прэс

winery ['waɪnəri] n., pl. **-eries** вінаро́бны заво́д

wing [wɪŋ] – n. 1. крыло́ *n.* 2. крыло́ *n.* (*будынка*). 3. крыло́ *n.*, ча́стка, фра́кцыя *f.*: ***the left/right wing of the party*** ле́вае/пра́вае крыло́ па́ртыі. 3. кулі́сы (*у тэа́тры*)

– v.i. 1. акрыля́ць. 2. лётаць, узьлята́ць. 3. Figur. падганя́ць, прысьпе́шваць: ***Terror winged his steps*** Жах прысьпе́шваў ягоныя кро́кі. 4. пара́ніць у крыло́ *або́* руку́: ***The bullet winged the bird but did not kill it*** Ку́ля пара́ніла пту́шку ў крыло́, але не забі́ла яе́

• ***be on (the) wing*** а) ляце́ць. б) быць заўсёды дзе́йным, у ру́ху. в) перабіра́цца. г) ад'яжджа́ць, адлята́ць

• ***take wing*** адлята́ць

• ***under the wing of*** пад чыі́м апяку́нствам

• ***wing its way*** ляце́ць

• ***wings,*** pl. адзна́ка, дава́ная пілёту

wing case надкры́лье *n.*, надкры́лы *pl.*

winged ['wɪŋd] adj. 1. крыла́ты, з кры́ламі. 2. ху́ткі, бо́рзды, жва́вы

wingless ['wɪŋləs] adj. бяскры́лы

wingspread ['wɪŋspred] n. разма́х кры́лаў

wink [wɪŋk] – v.i. 1. мо́ргаць, мірга́ць. 2. падмі́ргваць. 3. мига́ць, мігаце́ць, мігце́ць

– n. 1. мо́рганьне, падмі́ргваньне *n.* 2. мига́ньне, мігце́ньне, мігаце́ньне *n.* 3. міг -у *m.*: ***in a wink*** мі́гам, во́бмільгам

• ***forty winks***, Informal каро́ткі сон; дрымо́та *f.*

winker ['wɪŋkər] n. 1. міргу́н -а́ *m.* 2. Informal ве́я, ве́йка *f.* 2. мо́ргаўка *f.*

winner ['wɪnər] n. перамо́жлац -ца *m.*

winning ['wɪnɪŋ] adj. 1. які́ выйгра́е, перамо́жны: ***winning team*** кама́нда, яка́я выйгра́е. 2. перамо́жны, прына́дны, прые́мны: ***a winning smile*** прына́дная усьме́шка

• ***winnings*** pl. вы́йгрыш -у *m.*

winnow ['wɪnoʊ] – v.t. 1. ве́яць. 2. адве́йваць. 3. аддзяля́ць, адсе́йваць: ***winnow truth from falsehood*** аддзяля́ць пра́ўду ад хлусьні́

– n. 1. ве́ялка *f.* 2. ве́яньне збо́жжа

winsome [ˈwɪnsəm] adj. прыва́бны, прые́мны: ***a winsome girl*** прыва́бная дзяўчы́на

winter [ˈwɪntər] – n. 1. зіма́ *f.*: ***in winter*** узі́мку. 2. Figur. апо́шні пэры́яд жыцця́; час заняпа́ду, прыгне́чанасьці
– adj. 1. зімо́вы. 2. азі́мы
– v.i. зімава́ць

wintertime [ˈwɪntərtaɪm] n. зімо́вы час, зімо́вая пара́

wintery [ˈwɪnteri] adj., *гл.* **wintry**

wintry [ˈwɪntri] adj. 1. зімо́вы: ***a wintry sky*** зімо́вае не́ба. 2. а) хало́дны, маро́зны. 3. нявы́тлы: ***a wintry smile*** хало́дная, нявы́тлая ўсьме́шка

wipe [waɪp] v.t. 1. сьціра́ць: ***to wipe the table*** сьце́рці стол. 2. абціра́ць, выціра́ць: ***Wipe away your tears*** Вы́тры сьлёзы. 3. зацірáць, змыва́ць: ***The rain wiped away all the footprints*** Дождж змыў усе́ сьляды́. 4. працірáць: ***to wipe one's glasses*** працірáць акуля́ры
• ***wipe out*** а) зьні́шчыць, пазабіва́ць. б) зьні́шчыць, разбуры́ць дашчэ́нту: ***The disease wiped out the entire population*** Хваро́ба вы́нішчыла ўсё насе́льніцтва. в) анулява́ць, скаса-ва́ць: ***The generous man wiped out all the debts owed him*** Шчо́дры чалаве́к дарава́ў усе́ даўгі́ сваі́м даўжні́ко́м

wire [waɪr] – n. 1. дрот -у *m.* 2. драця́ная се́тка. 3. про́вад -у *m.* 4. тэлегра́ф -у *m.*, тэлегра́ма *f.*: ***He sent a message by wire*** Ён паслáў тэлегра́му
– adj. драцяны́: ***wire netting*** драцяна́я се́тка.
– v.t. 1. рабі́ць правó́дку: ***to wire a house for electricity*** праве́сьці эле́ктрыку ў дом. 2. зьвя́зваць дро́там: ***He wired the two pieces together*** Ён зьвязáў два кава́лкі дро́там. 3. абгаро́джваць дро́там. 4. Informal пасыла́ць тэлегра́му
• ***get one's wires crossed*** заблы́тацца
• ***pull wires,*** Informal рабі́ць уплы́ў

wire cutter нажні́цы для ро́заньня дро́ту, шчыпцы́ *pl. only* , куса́чкі *pl. only*

wire gauge прыла́да для ме́раньня дыяме́тра дро́ту, драця́ны кало́бар

wireless [ˈwaɪrləs] – adj. бяздро́тавы
– n. ра́дыё *n.*
– v.t. перадава́ць праз ра́дыё

wire service про́савае аге́нцтва

wiretapping [ˈwaɪrˌtæpɪŋ] n. падслухо́ўваньне тэлефо́нных гу́тарак

wireworm [ˈwaɪrwɜːrm] n. 1. драця́нік -а *m.* 2. рабáк, гліст -á *m.*

wiring [ˈwaɪrɪŋ] n. электры́чная правó́дка

wiry [ˈwaɪri] adj. 1. драця́ны. 2. жы́лісты; мо́цны, ду́жы

wisdom [ˈwɪzdəm] n. му́драсьць, развáжнасьць *f.* 2. ро́зум -у *m.* 3. ве́да, эруды́цыя *f.*

wise [waɪz] adj. 1. му́дры, развáжны. 2. разу́мны: ***wise advice*** разу́мная пара́да. 3. зь вялі́кімі ве́дамі, вучо́ны: ***to be wise to,*** Sl. быць сьве́дамым *чаго́*; быць у ку́рсе спра́вы
• ***wise up,*** Sl. а) усьве́даміць, сьця́міць. б) паразумне́ць

wisely [ˈwaɪzli] adv. му́дра, разу́мна; развáжна

wisecrack [ˈwaɪzkræk] n., Sl. тра́пная заўва́га; дасьці́пны адка́з

wise guy [ˈwaɪzgaɪ] n., Sl. усёве́д, разу́мнік -а *m.*

wish [wɪʃ] – v. 1. хаце́ць, жада́ць. 2. жада́ць, зы́чыць: ***I wish you a Happy New Year*** Зы́чу Вам шчасьлі́вага Но́вага Го́ду. 3. ма́рыць
– n. 1. жада́ньне *n.* 2. пажада́ньне *n.*: ***best wishes*** найле́пшыя пажада́ньні. 3. не́шта жада́нае: ***The girl got her wish*** Дзяўчы́нка атрыма́ла то́е, што яна́ хаце́ла. 4. ма́ра *f.*

wishbone [ˈwɪʃboʊn] n. гру́дная ко́стка (*у птýшак*), ві́лка *f.*

wishful [ˈwɪʃfəl] adj. по́ўны жада́ньня, пра́гны

wishful thinking прыма́ньне жада́нага за сапра́ўднае, самападман -у *m.*

wishy-washy [ˈwɪʃiˌwɑːʃi] adj. 1. ро́дкі, вадзяні́сты. 2. няўпэ́ўнены, невыра́з-

ны; слабы́: ***a wishy-washy excuse*** слабо́е апраўда́ньне

wisp [wɪsp] n. 1. жмутло́к, шматло́к -ка́ *m.*: ***a wisp of hay*** жмуто́к се́на. 2. мала́я ча́стачка, кры́ха *f.*: ***a wisp of smoke*** малы́ клубо́к ды́му

wistful ['wɪstfəl] adj. 1. мро́йны. 2. тужлі́вы. 3. журбо́тны, су́мны; марко́тна заду́ме́нны

wit [wɪt] n. 1. ро́зум -у *m.*; дасьці́пнасьць *f.*, до́сьціп -у *m.* 2. ке́млівасьць *f.*: ***People with quick wits learn easily*** Ке́млівым лю́дзям лёгка вучы́цца

• ***be at one's wits' end*** ня ве́даць, што рабі́ць, быць у адча́і, разгу́бленасьці

• ***be out of one's wits with fright*** губля́ць галаву́ ад стра́ху

• ***have*** or ***keep one's wits about one*** а) не разгубі́цца. б) мець ро́зум у галаве́

witch [wɪtʃ] – n. 1. ве́дзьма, чараўні́ца *f.* 2. стара́я зла́я жанчы́на. 3. Informal надзвыча́йна прыго́жая дзяўчы́на *або́* жанчы́на

– v.t. 1. чарава́ць, зачаро́ўваць. 2. ачаро́ўваць

witchcraft ['wɪtʃkræft] n. чараўні́цтва, вядзьма́рства *n.*, ча́ры *pl.*; магі́чная сі́ла

witch doctor зна́хар -а *m.*, зна́харка *f.*, шапту́н -а́ *m.*, шапту́ха *f.*

witchery ['wɪtʃəri] n. 1. ча́ры. 2. Figur. чаро́ўнасьць, прыва́бнасьць *f.*

witch hunt, Sl. палява́ньне на ве́дзьмаў

with [wɪð] prep. 1. з: ***I agree with you*** Я згаджа́юся з ва́мі; ***a man with initiative*** чалаве́к зь ініцыяты́вай. 2. пры дапамо́зе *чаго́*, чым: ***to cut meat with a knife*** рэ́заць мя́са нажо́м. 3. з *чаго́*: ***We are pleased with it*** Мы задаво́леныя з гэ́тага. 4. у *каго́*: ***Leave the dog with me*** Пакі́нь саба́ку ў мяне́, са мной. 5. ад *чаго́*: ***to shake with cold*** Трэ́сьціся ад хо́ладу; ***to die with thirst*** паміра́ць ад сма́гі. 6. з *кім*, супро́ць *каго́*: ***The English fought with the Germans*** Анге́льцы ваява́лі зь не́мцамі. 7. ня гле́дзячы на *што*: ***With all his weight he was not a strong man*** Нягле́дзячы на ўсю́ яго́ную вагу́, ён ня быў ду́жым мужчы́нам

• ***be with it,*** Sl. быць у ку́рсе

• ***keep in with*** падтры́мваць знаёмства *або́* сяброўства з *кім*

• ***with thanks*** з падзя́кай

withdraw [wɪð'drɔ:] – v.t. **-drew, drawn, -drawing** 1. адыма́ць, прыма́ць, вы́маць: ***He quickly withdrew his hand from the hot stove*** Ён ху́тка адхапі́ў руку́ ад гара́чае пліты́. 2. адкліка́ць. 3. выма́ць, забіра́ць: ***He withdrew his savings from the bank*** Ён забра́ў сваé ашча́днасьці з ба́нку

– v.i. 1. выхо́дзіць: ***She withdrew from the room*** Яна́ вы́йшла з пако́ю. 2. Milit. адступа́ць

withdrawal [wɪð'drɔ:əl] n. 1. адыма́ньне *n.* 2. забра́ньне (*ашча́днасьцяў з ба́нку*). 3. адкліка́ньне *n.* 4. адыхо́д, вы́хад -у *m.* 5. Milit. адступле́ньне *n.*

withdrawn [wɪð'drɔ:n] adj. скры́тны, замкнёны (*сам у сабе́*)

wither ['wɪðər] – v.i. вя́нуць; высыха́ць, пятрэ́ць, марне́ць: ***The grass withered in the hot sun*** Трава́ пятрэ́ла на гара́чым со́нцы

– v.t. 1. высу́шваць: ***Age had withered the old lady's face*** Век вы́сушыў твар старо́й. 2. Figur. спапяля́ць: ***She withered him with a scornful look*** Яна́ спапяліла яго́ сваім пагардлівым по́зіркам

• ***wither away*** адмі́ра́ць, ча́хнуць

withered ['wɪðərd] adj. вы́сахлы, завя́лы, зачахлы; змарне́лы

withhold [wɪð'hould] v.t., **withheld, holding** 1. адмаўля́ць: ***to withhold one's consent*** ня даць зго́ды. 2. устры́мваць; уто́йваць. 3. адлі́чваць

within [wɪ'ðɪn] – prep. 1. у ме́жах, на праця́гу *чаго́*: ***within the man's powers*** у ме́жах людзкі́х сі́лаў; ***within a week*** на праця́гу ты́дня. 2. у сярэ́дзіне, уну́тры *чаго́*

– adv. 1. у сярэ́дзіне, унутры́: ***The house has been painted within and***

without Дом быў пафарбава́ны ўся-ро́дзіне й звО́нку. 2. у сабе́, у душы́: ***to keep one's grief within*** трыма́ць свой боль у сабе́

without [wɪ'ðaut] – prep. 1. без: ***I drink tea without sugar*** Я п'ю гарба́ту бяз цу́кру. 2. без тагО́ каб: ***She walked past without looking at us*** Яна́ прайшла́, не зірну́ўшы на нас; ***not without reason*** не без прычы́ны

– adv. звО́нку, знадвО́рку, навО́нкі: ***The house is clean within and without*** Дом чы́сты ўнутры́ і знадвО́рку; ***The idea came from without*** Ідэ́я прыйшла́ звО́нку

withstand [wɪð'stænd] v.i. вытры́мваць; трыва́ць; супрацьстая́ць

witless ['wɪtləs] adj. 1. бязглу́зды; неразу́мны. 2. бяздзе́ючы

